ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Да чытача

У кожнага з нас на зямлі ёсць куточак, які бачыш у снах, з якім на ўсё жыццё злучана твая душа і да якога заўсёды імкнецца гваё сэрца, а ўспаміны пра яго, здаецца, даюць больш сілы, розуму, натхнення на добрыя здзяйсненні. Гэты куток — твая радзіма, дзе нарадзіўся, вырас. Для многіх з нас радзімай стала Глушчына — адна з прывабнейшых мясцін роднай Беларусі.

Прырода, як добрая і клапатлівая маці, дала гэтай зямлі ўсё, што толькі магла даць свайму любімаму дзіцяці: лясы і рэкі, азёры, багацце падземных нетраў — «чорнае золата».

Глушчына, мой родны кут! Над табой узнімаюцца ў блакітную высь стромкія сосны і беластвольыя бярозы. Іх вершаліны-шапкі гойдаюцца ў золаце сонечных промняў, шэпчуцца аб нечым з воблакамі і лёгкімі хмаркамі.

Твае лясныя абшары цягнуцца на дзесяткі кіламетраў, то падступаючы ўшчыльную да вёсак, то адыходзячы ад іх у смугу далечыні. Здаецца, месцамі зусім блізка падбягаюць да берагоў ціхаплыннай Пцічы, быццам хоць краем вока хочуць зазірнуць у люстраную гладзь, удыхнуць свежы рачны водар.

Шапоча, плешчацца рака. Коціць свае цёмныя воды паўз берагі задуменнага лесу, высокія дубы ахоўваюць яе спакой. Ніцыя вербы мочаць доўгія косы ў цёплай вадзе. Высокія берагі з мурожнай гравой падступаюць да яе, абрываюцца і пераходзяць у светлы пясочак, які лашчаць лёгкія хвалі, што серабрацца ў промнях летняга сонца. І гэтае жывое срэбра ўецца цёмнай стужкай усё далей і далей, сцелецца праз шырокія лугавіны, аздобленыя купамі вербалоззя, алешніку, чаромхі. Пціч бяжыць, спяшаецца да сваёй сястры Прыпяці, каб расказаць, што бачыла, што чула...

Цудоўныя твае прасторы, Глушчына, у любую пару года.

Але ні з чым не параўнаць твае прыгажосці ў вясну, калі на дрэвах хтосьці развешвае лёгкія карункі кволай лістоты, а паветра звініць ад мноства галасоў неспакойнага птаства, і кожная жывая істота быццам пасылае бласлаўленне свайму Стваральніку, радуецца абуджэнню пасля зімовага сну.

Па вечарах здалёк нясецца клёкат працавітых буслоў ды лічыць узрост тваім насельнікам мудрая зязюля, напамінаючы ўсім нам аб вечнасці жыцця і бессмяротнасці роднай зямлі, аб сувязі часу і пакаленняў.

Як жа можна не любіць гэты край!

Рака Пціч каля в. Гарадок.

* * *

Гэта кніга працягвае серыю гісторыка-дакументальных Хронік Памяці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Іх паяўленне — значная падзея ў культурным жыцці беларускай нацыі, прыкметны крок у яе адраджэнні, узнаўленні гістарычнай спадчыны. На жаль, аб захаванні гэтай духоўнай скарбніцы, асабліва невялікіх населеных пунктаў і рэгіёнаў, доўгі час мала хто клапаціўся. Таму згублены многія звесткі, сцерліся ў памяці цікавыя факты з жыцця гэтых мясцін. З сумам прыходзіцца гаварыць аб тым, што яшчэ застаюцца невядомымі імёны многіх салдат і партызан, якія аддалі сваё жыццё за сённяшні мірны дзень, імёны далёка не ўсіх рэпрэсіраваных вернуты з чорнага небыцця. У сувязі з гэтым стваральнікі кнігі не могуць гарантаваць поўную вычарпальнасць прыведзеных пра раён звестак. Але пошукавыя работы не спыняюцца.

У падрыхтоўцы кнігі прымалі ўдзел навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пры дапамозе грамадскасці складзены адзін з асноўных раздзелаў хронікі — спісы загінуўшых воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага генацыду, а таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Глушчыны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы многіх архіваў, музеяў і Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Стваральнікі кнігі прыносяць сваю ўдзячнасць работнікам гэтых устаноў, арганізацыйна-метадычнаму цэнтру па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Дзяржкамітэта Рэспублікі Беларусь па друку, а таксама іншым арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў падрыхтоўцы і выданні гэтай кнігі.



Глускі раён размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924. Плошча 1,3 тыс. км^2. Насельніцтва 22,4 тыс. чалавек, з іх 13,9 тыс. сельскіх жыхароў (1998). Цэнтр — г.п. Глуск; 107 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на 9 сельсаветаў: Бярозаўскі, Завалочыцкі, Казловіцкі, Калаціцкі, Каткаўскі, Кіраўскі, Клятнянскі, Слаўкавіцкі, Хваставіцкі.

Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны і Прыпяцкага Палесся. Рэльеф плоскі, ёсць узгоркі і дзюны. Карысныя выкапні: 2 радовішчы нафты (Барысаўскае і Драздоўскае), 58 радовішчаў торфу, найбольш буйное з якіх «Кіраўскае», 9 радовішчаў цагельна-чарапічнай сыравіны, 3 радовішчы пясчанікаў, прыгодных толькі для вырабу сценавых блокаў, найбольш буйное з якіх «Паляна». Сярэдняя тэмпература студзеня -6,5 °С, ліпеня 18,1 °С. Ападкаў — 601 мм за год. Вегетацыйны перыяд 192 сут. Галоўная рака Пціч з прытокамі Зарудзеча, Даколька (правыя), Ліса, Бежыца (левыя). Азёры: Выгада і Дзікае. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў дзярнова-падзолістыя (38,4%), у тым ліку дзярнова-падзолістыя забалочаныя (19,3%), тарфяна-балотныя (30,1%), алювіяльныя дзярнова-балотныя (9,2%). З мінеральных глеб 51,7% супясчаных, 46,2% пясчаных, 2,1% суглінкавых. Якасная ацэнка глеб у балах: ворных зямель — 34 (цана бала 0,28 ц/га збожжа), усіх сельскагаспадарчых угоддзяў — 35. Пад лесам 53% тэрыторыі.

Раён спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Прадпрыемствы пераважна ў Глуску: масласырзавод, плодаагароднінны завод, мэблевая фабрыка, камбінат кааператыўнай прамысловасці, райаграпрамтэхснаб, райсельгасхімія, лясгас з тарным цэхам і інш. У раёне 12 калгасаў, 2 саўгасы, эксперыментальная база «Глуск». Дзейнічаюць 11 сярэдніх, 6 базавых (у т.л. 1 санаторнага тыпу), 3 пачатковыя школы, школа мастацтва і музычная школа, дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі; 18 дамоў культуры, 11 клубаў, 27 бібліятэк, 16 кінаўстановак; 2 бальніцы, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 1 амбулаторыя; раённы камбінат бытавога абслугоўвання, 2 комплексныя прыёмныя пункты і інш. На поўначы раён перасякае шаша Слуцк — Бабруйск. Глуск злучаны аўтадарогамі з Бабруйскам, Любанню, Акцябрскім і інш. Выдаецца раённая газета «Радзіма».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

г.п. Глуск

Бярозаўскі сельсавет: Бярозаўка, Жукавічы, Згода, Зелянковічы, Зубарэвічы, Падлужжа, Поблін, Розлевічы.

Завалочыцкі сельсавет: Арыжня, Бабірова, Гарадзішча, Гарадок, Горнае, Дварэц, Завалочыцы, Заполле, Кнышы, Масціцца, Паляна, Рудня, Сіманавічы, Туркі, Ясенцы, Яўсеевічы.

Казловіцкі сельсавет: Залессе, Засценак Усцярхі, Казловічы, Кастрычнік, Крукаўшчына, Нязнанне, Поўстка, Прыплавы, Сцяпанаўка, Усцярхі, Уюнішча, Чыкілі.

Калаціцкі сельсавет: Барысаўшчына, Жалвінец, Засценак Дуброва, Калацічы, Калюга, Краснае, Макавічы, Макраны, Пагост, Сельцы, Юзафова.

Каткаўскі сельсавет: Бабровічы, Дзяржынскі, Замасточча, Заракуша, Касарычы, Катка, Пціч, Слабодка, Халопенічы.

Кіраўскі сельсавет: Балашэвічы, Бервы, Вільча, Доўгі Лес, Зарэчча, Карпавічы, Кіраўскае, Кляшчоўка, Прыварацце, Старое Сяло.

Клятнянскі сельсавет: Байлюкі, Барбарова, Баянава, Бярэжкі, Вайцяхова, Даколь, Зара, Клетнае, Красны, Малінава, Нова-Андрэеўка, Пагарэлае, Пяценка, Старына, Сялец, Цяснова.

Слаўкавіцкі сельсавет: Амур, Заеліца, Зорка, Малкава, Слаўкавічы, Сцяг, Чапаева.

Хваставіцкі сельсавет: Баравішча, Бараціна, Брады, Веснава, Вольніца, Гарадзішча, Дасціжэнне, Дуброва, Заполле, Карніца, Лучкі, Мыслоціна, Падзамша, Падкаленда, Слабодка, Турыно, Хваставічы.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Дакладна ўстанавіць час, калі пачалося пранікненне чалавека на тэрыторыю раёна, даволі складана. Па-першае, таму, што засяленне большай часткі Беларусі адбылося ў сярэднекаменным веку — мезаліце. 11—7 тысяч гадоў таму на землях сучаснай Беларусі рассяліліся і пражывалі вандроўна-паляўнічыя плямёны.

Спачатку яны займалі тэрыторыі абапал вялікіх рэк — Сожа, Дняпра, Друці, Бярэзіны, Прыпяці, Нёмана. Аб гэтым пераканаўча сведчаць такія археалагічныя помнікі, як стаянкі мезалітычнага часу. На жаль, апошнія пакуль што не зафіксаваны ў межах Глускага раёна. Аднак нават тыя археалагічныя знаходкі, што выяўлены тут, даюць падставу гаварыць аб жыцці першабытных людзей у гэтай мясцовасці ўжо ў эпоху неаліту — новага каменнага веку.

Першыя звесткі пра помнікі старасветчыны на тэрыторыі Глускага раёна маюцца ў Апытальных лістах Наркамасветы БССР за 1924 г. Гэта крыніца захоўваецца ў архіве Інстытута гісторыі Нацыянальнай АН Беларусі. Сапраўдны пачатак археалагічнаму вывучэнню далёкай спадчыны быў пакладзены А.Рынейскім. Ён у 1930 г. правёў разведку — візуальна агледзеў і падрабязна апісаў некалькі археалагічных помнікаў, што знаходзяцца ўздоўж правага берага р. Пціч. Крыху пазней, з канца 1950-х гадоў, іх абследавалі шэраг даследчыкаў: В.М.Мельнікоўская, В.В.Сядоў, Л.Д.Побаль, Ю.І.Драгун, В.Ф.Капыцін, А.А.Егарэйчанка, М.І.Лашанкоў, А.В.Іоў, М.М.Крывальцэвіч, Н.М.Дубіцкая, Г.М.Сагановіч, І.У.Ганецкая. Стацыянарныя раскопкі праводзілі толькі А.А.Егарэйчанка, Н.М.Дубіцкая, М.М.Крывальцэвіч, Г.М.Сагановіч, І.У.Ганецкая. Па выніках прац навукоўцаў удакладнены спіс археалагічных помнікаў, што ёсць у раёне. Найбольш раннія з іх адносяцца да каменнага (4—3-е тысячагоддзі да н.э.) і бронзавага (2-е тысячагоддзе — пачатак 1-га тысячагоддзя да н.э.) вякоў. Затым частка іх утрымлівае матэрыялы эпохі жалеза (1-е тысячагоддзе да н.э. — 1-е тысячагоддзе н.э.). Нарэшце, перыяд летапісных славян-дрыгавічоў (IX—XIII ст.) прадстаўлены паселішчамі і курганнымі могільнікамі, а таксама адзінкавымі курганамі.

Каля вёсак Барысаўшчына, Падлужжа і каля Глуска, ва ўрочышчы Дубень, ці Пяскі, выяўлена вялікая колькасць абломкаў посуду неалітычнага часу.

Тут, на левым беразе Пцічы, знойдзены сляды паселішчаў эпохі неалі-

ту, бронзы і ранняга жалеза. На выдмах мысападобнага выступу тэрасы ракі археолаг М.М.Крывальцэвіч сабраў матэрыялы адзначаных часоў на пляцоўцы памерам 200х400 м.

Каля в. Барысаўшчына, за 2—2,5 км на поўдзень ад яе, на месцы, дзе ўпадае р. Камарынка ў Пціч (правы бераг), ёсць паселішча неаліту з адкладаннем культурнага пласта. Яно размешчана на мысападобным выступе тэрасы ў поплаў р. Пціч. Вышыня яго над поплавам да 3 м. Памеры разглядаемага помніка прыкладна 100х70 м. Ён выцягнуты з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход.

У 1994 г. і 1997 г. помнік шурфаваўся і раскопваўся М.М.Крывальцэвічам. Даследаваная плошча складае 48 м². Таўшчыня культурнага пласта на паселішчы 0,4 м. У час раскопак знойдзены кераміка і вырабы з крэменю эпохі неаліту. На глыбіні каля 0,2 м выяўлена згрувашчванне абломкаў вастрадоннай пасудзіны. Гаршчок удалося рэканструяваць. На даследаванай плошчы раскопу знойдзена каля 100 дробных абломкаў посуду. Прыкладна палавіна сценак была без аздаблення. Другая частка іх утрымлівала разнастайны арнамент, выкананы ў выглядзе ямкавых уціскванняў на знешняй паверхні посуду. Крамянёвы інвентар прадстаўлены адходамі апрацоўкі зыходнай сыравіны: адшчэпамі, абломкамі, луской, пласцінкамі і нуклеусамі[1]. Усяго каля 300 адзінак. Прылад працы значна менш, але асартымент іх даволі разнастайны: мікрапласцінкі (2 шт.) і вастрыі (4 шт.) з прытупленай спінкай, скрабкі (14 шт.), разец, рэтушоры (2 шт.), нажы (3 шт.), краявыя сколы (2 шт.) і адшчэпы (3 шт.) з участкамі рэтушы. Вынікі раскопак дазваляюць гаварыць аб тым, што тут жылі плямёны днепра-данецкай неалітычнай культуры і, у прыватнасці, яе ўсходнепалескага варыянту. Менавіта носьбітам гэтай культуры належала касцяная матыка, якая была знойдзена ў час раскопак. Прылада працы выраблена з рога лася. У яе верхняй частцы, крыху вышэй сярэдзіны, ёсць адтуліна для мацавання на драўлянае дзяржанне. Падобныя матыкі знойдзены ў час раскопак ранненеалітычнага тарфянікавага паселішча, што каля в. Зацэнне ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці, і датуюцца канцом 4-га тысячагоддзя да н.э. Глускую знаходку, відаць, трэба адносіць да гэтага часу.

Паселішчы каменнага веку размяшчаліся на ўзвышаных берагах Пцічы, дзе былі зручныя мясціны, каб займацца рыбалоўствам, паляваннем і збіраннем дароў лесу. Істотнай рысай, што характарызуе дадзеную эпоху, з'яўляецца тое, што чалавек навучыўся свідраваць адтуліны ў розных прыладах.

Вялікім адкрыццём менавіта гэтага часу было вынаходніцтва глінянага посуду. Старажытныя майстры ў глінянае цеста дадавалі ў якасці штучных паглынальнікаў раслінныя дамешкі. Гэты тэхналагічны прыём надаваў большую трываласць іх вырабам — вастрадонным пасудзінам з выпуклым тулавам. Ляпны посуд добра апрацоўваўся, асабліва вонкавая паверхня, да таго ж ён аздабляўся разнастайнымі ўціскамі. Даследчыкі не раз звярталі ўвагу на дзівоснасць карункавых узораў, што ўпрыгожваюць посуд эпохі неаліту.

У гэты ж перыяд старажытныя людзі пачынаюць авалодваць прымітыўнымі навыкамі ў жывёлагадоўлі і земляробстве. Калі сабака быў прыручаны яшчэ ў канцы мезаліту, то іншая жывёла (карова, свіння, конь, каза, авечка) стала хатняй толькі ў канцы неаліту і ў пачатку эпохі бронзы.

Бронзавы век пачаўся на Беларусі ў 2-м тысячагоддзі да н.э. і працягваў-

[1]Нуклеус — крамянёвы абабіты жаўлак, ад якога адбівалі або адціскалі пласціны ці адшчэпы для вырабу прылад працы.



Неалітычная кераміка (1—10) і крамянёвыя вырабы (11—20) з паселішча Барысаўшчына-1.

ся да пачатку (першай чвэрці) 1-га тысячагоддзя да н.э. Вызначальнай прыкметай гэтага часу было выкарыстанне людзьмі побач з разнастайнымі каменнымі прыладамі працы бронзавых вырабаў. Галоўным чынам гэта былі ўпрыгожанні. Шырокага ўкараненне бронзавых вырабаў не магло адбыцца, таму што на тэрыторыі рэспублікі і побач з ёю няма адпаведных крыніц сыравіны: медзі і волава. Таму на новай ступені грамадскага развіцця, як і раней, ужываліся каменныя, пераважна крамянёвыя прылады працы. Яшчэ больш, чым у неаліце, першабытныя майстры ўдасканальваюць шляхі апрацоўкі каменю. У эпоху бронзы яны карыстаюцца такімі спосабамі, як шліфаванне, пілаванне, паліроўка, свідраванне.

Аднак змяненні адбываліся не толькі ў тэхніцы апрацоўкі крэменю і іншых каменных парод, але і ў формах саміх вырабаў (напрыклад, у трохвугольных наканечніках стрэл і інш.).

Крамянёвыя наканечнікі стрэл у каменным веку выраблялiся галоўным чынам для палявання, а ў час бронзы яны пачалі адыгрываць ролю зброі. Апошняе сведчыць аб зменах, што адбываліся ў грамадстве. Больш моцныя калектывы адваёўвалі сабе лепшыя тэрыторыі, рабавалі суседзяў. Зброя стала даволі разнастайнай: акрамя наканечнікаў да стрэл і коп'яў выраблялiся яшчэ наканечнікі да дроцікаў і баявыя сякеры. З прылад працы вылучаліся крамянёвыя сярпы і каменныя сякеры. Іх з'яўленне было выклікана ўкараненнем новай галіны гаспадаркі — земляробства.

Менавіта гэта і прывяло да шырокага распаўсюджвання каменных сякер. Іх выпадкова знаходзілі ў розных мясцінах Глускага раёна не адзін раз. У сярэдзіне 1970-х гадоў у трэцім выпуску «Археалагічнай карты Бела-



Выпадковыя знаходкі прылад працы з косці (1; захоўваюцца ў глускай СШ № 2) і каменю (2,3; захоўваюцца ў глускай СШ № 1).

русі» У.Ф.Ісаенкі гаворыцца толькі пра адну каменную абушковую сякеру з адтулінай. Яе знайшлі ў полі за 1 км ад Гарадка (гарадзішча ранняга жалезнага веку каля в. Халопенічы) у напрамку в. Катка. У канцы 1990-х гадоў іх сабрана яшчэ 8 адзінак. Крамянёвую сякеру-клін з прышліфаваным лязом знайшлі ў 1988 г. у в. Слабодка Каткаўскага сельсавета. Захоўваецца яна цяпер у Каткаўскім музеі народнай славы.

У гэтым жа музеі ёсць яшчэ адна сякера, выкрабленая з граніту, якую прынеслі сюды з Гарадка вучні мясцовай школы ў пачатку 1980-х гадоў.

Дзве сякеры, выкрабленыя з граніту чорна-шэра-зялёнага колеру, знойдзены ў ваколіцах Глуска — трапецападобныя сякеры-кліны. Трэцюю сякеру знайшлі ў 1985 г. каля правага берага р. Пціч у вадзе, непадалёку ад в. Калацічы. Яна клінападобнай формы, мае адтуліну. Абушок прамавугольны з закругленымі гранямі. Яшчэ дзве сякеры знойдзены ў Сіманавічах. Адна — у час археалагічных раскопак, а другая — выпадкова, на левым беразе р. Пціч. Вышэйназваныя прылады працы — каменныя сякеры, матыкі (касцяныя і з граніту), што захоўваюцца ў глускіх гарадскіх школах, гавораць аб тым, што гэтыя прылады (за выключэннем касцяной матыкі) належаць да бронзавага веку. У эпоху бронзы тэрыторыя Беларусі, у тым ліку і Глушчына, была пакрыта лесам. Але менавіта ў гэты час ішло станаўленне земляробства. Каб расчысціць тэрыторыі ад хмызняку і лесу, людзям патрэбны былі сякеры. Праца ж гэтая была калектыўная, і таму патрэба ў сякерах была даволі значная, чым і тлумачыцца вялікая колькасць знаходак.

Яшчэ ў канцы 3-га тысячагоддзя да н.э. плямёны сярэднедняпроўскай культуры, рухаючыся з поўдня ў Верхняе Падняпроўе, асімілявалі мясцовае неалітычнае насельніцтва днепраданецкай культуры. Старажытныя людзі эпохі бронзы займалі паўднёваўсходнюю частку Беларусі, куды ўваходзіла, відаць, і тэрыторыя Глускага раёна. Жылі «сярэднедняпроўцы» іншы раз на неалітычных паселішчах. Аб гэтым сведчаць матэрыялы, атрыманыя ў выніку павярхоўных зборaў каля в. Падлужжа і Глуска, ва ўрочышчы Дубень. Ёсць сляды стаянкі і каля в. Барысаўшчына, дзе беларускім археолагам М.М.Крывальцэвічам сабрана кераміка бронзавага веку на месцы ўпадзення р. Камарынка ў Пціч. Абломкі посуду 2-га тысячагоддзя да н.э., крамянёвыя пласціны і адшчэпы з рэтушшу, канцавыя скрабкі, фрагмент каменнай свідраванай сякеры і перапаленыя косці знойдзены археолагам В.Ф.Капыціным на стаянцы каля в. Згода, што ў Бярозаўскім сельсаве-



Знаходкі з пахавання бронзавага веку каля в. Барысаўшчына: 1—3 — рэшткі касцяных вырабаў; 4,8—10 — скрабкі; 5,7 — нажы; 6 — сякера (крэмень); 11 — шматвалікавая гліняная пасудзіна; 12 — план і профіль пахавання.

це. Наканечнік стралы, адшчэпы з крэменю, рэшткі керамікі з пацеркавым арнаментам, знойдзеныя каля в. Кнышы Завалочыцкага сельсавета, гавораць аб тым, што тут жылі прадстаўнікі тшцінецкай культуры. Месцазнаходжанні матэрыялаў бронзавага веку ёсць і каля в. Поблін. На стаянцы, што на паўднёва-ўсходняй ускраіне в. Сіманавічы, таўшчыня культурнага пласта 0,2 м. На ёй былі знойдзены нуклеус, пласціны і адшчэпы з крэменю, рэшткі посуду. У час абследавання помніка ўстаноўлены яго памер — 30х120 м. Археолаг К.М.Палікарповіч выявіў кераміку бронзавага веку і каля в. Слабодка Каткаўскага сельсавета.

Асаблівую цікавасць сярод пералічаных археалагічных помнікаў выклікае знойдзенае месца пахавання нашых продкаў. З аднаго боку, яно дае падставу меркаваць аб наяўнасці могільніка эпохі бронзы ў межах нашага раёна, а з другога — дазваляе праса-

чыць, як хавалі нябожчыкаў у той далёкі час.

На левым беразе р. Камарынка, што працякае за 2 км на поўдзень ад в. Барысаўшчына, ва ўрочышчы Горы вядомым беларускім археолагам Л.Д.Побалем у 1964 г. сабраны кальцыніраваныя косці, крамянёвыя пласцінкі і некалькі дзесяткаў абломкаў посуду бронзавага веку. За 130 м на ўсход ад паселішча было знойдзена і даследавана грунтавое пахаванне, якое вызначалася плямай на фоне жоўтага пяску. Знаходзілася яно ў паўночнай частцы пясчанага ўзвышша, што выступала ў поплаў Камарынкі. Пахаванне было ў ямцы дыяметрам каля 0,5 м і прыкладна такой жа глыбіні. Яма была запоўнена дробнымі вугольчыкамі, попелам, перапаленымі касцямі, і ўсё гэта захоўвалася ў змешаным стане. У верхняй яе частцы траплялiся кавалкі керамікі ад шматвалікавай пасудзіны. Сярод кальцыніраваных касцей ляжалі перапаленыя крамянёвыя вырабы. Некаторыя з іх былі разламаны і знаходзіліся ў розных месцах. Тут жа выяўлены абломкі касцяных прадметаў, хутчэй за ўсё гарпуноў, якія не пашкоджаны агнём. У верхняй палавіне пахавальнай ямы знойдзены наступны крамянёвы інвентар: сякера, чатыры скрабкі і некалькі адшчэпаў. У ніжняй яе частцы, дзе не было перапаленых рэчаў, знаходзіліся 2 крамянёвыя нажы і частка чэрапа чалавека. Гліняную пасудзіну ўдалося аднавіць: склеіць і атрымаць поўную форму. Яна багата арнаментавана. Пахавальны абрад — няпоўнае трупаспаленне. Крамянёвы інвентар, гліняная пасудзіна, як і звычай пахавання, гавораць аб прыналежнасці нябожчыка да плямён культуры шматвалікавай керамікі. Яго пахаванне адбылося, як гэта вынікае з матэрыялаў, недзе ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н.э. Яно сведчыць аб рэдкай з'яве пранікнення ў паўночную частку Беларускага Палесся плямён шматвалікавай керамікі, якія пражывалі на поўдні ў лесастэпавых і стэпавых раёнах.

Вывучаючы помнікі бронзавага веку, археолаг М.М.Крывальцэвіч устанавіў, што ранні яго перыяд звязаны са з'яўленнем на поўдні Беларусі плямён сярэднедняпроўскай культуры. У сувязі з тым, што помнікі эпохі бронзы ў Глускім раёне не раскопваліся, вучоныя абапіраюцца на добра даследаваныя паселішчы суседняга Любанскага раёна, дзе прадстаўлены і элементы культуры «сярэднедняпроўцаў». Можна меркаваць, што ў першай палавіне 2-га тысячагоддзя да н.э. носьбіты гэтай матэрыяльнай культуры пражывалі і на землях сучаснай тэрыторыі Глускага раёна, паколькі плямёны яе займалі ў той час не толькі поўдзень, але і паўднёвы ўсход Беларусі. Матэрыялы сярэдняга перыяду бронзавага веку ў Глускім раёне маюцца на паселішчах каля в. Кнышы і каля Глуска, ва ўрочышчы Пяскі.

Жалезны век на поўдні Беларусі пачынаецца недзе ў сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н.э. Спачатку гэта быў час, калі старажытныя майстры імкнуліся авалодаць спосабам атрымання жалеза з прыроднай сыравіны — балотнай руды. Жалеза здабывалася шляхам прамога аддзялення з руды ў печах-домніцах пры высокай (да 1350 °С) тэмпературы. Металургі былі адначасова і кавалямі. Яны пракоўвалі гарачыя ці нагрэтыя крыцы для атрымання нарыхтовак альбо неабходных рэчаў. Адходы прымітыўнай металургіі — шлакі сустракаюцца даволі часта на помніках жалезнага веку і Кіеўскай Русі. Дастаткова адзначыць, што іх знаходзілі пад час раскопак гарадзішчаў за межамі раёна і селішчаў, што побач з вёскамі Сіманавічы, Жалвінец. Што ж датычыць печаў-домніц, то археолагі не знайшлі іх рэшткаў у Глускім раёне. Цэлыя печы-домніцы ўвогуле на тэрыторыі Беларусі пакуль што не выяўлены, а вось рэшткі іх неаднара-

зова трапляліся ў цэнтральнай і паўночнай частках рэспублікі.

Выкарыстанне жалеза ў паўсядзённым жыцці прывяло да карэнных змен у тагачасным грамадстве. Яно садзейнічала далейшаму развіццю рамёстваў і земляробства. Людзі пачалі атрымліваць больш прадуктаў харчавання, чым маглі спажыць. Менавіта лішак запасаў ежы быў нічым іншым, як дадатковым прадуктам, што і складала багацце таго або іншага першабытнага калектыву (роду). У рабоце «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» Ф.Энгельс у сувязі з гэтым пісаў: «Багацце суседзяў узбуджае прагнасць народаў, у якіх набыццё багацця становіцца ўжо адной з галоўных жыццёвых мэт» (Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. 2 изд. Т. 21. С. 164). Таму, каб засцерагчы сваю маёмасць ад пагрозы пастаяннай небяспекі з боку суседзяў, першабытныя людзі пачалі ўмацоўваць свае паселішчы. Такім чынам, з'яўленне гарадзішчаў (умацаваных паселішчаў) — з'ява заканамерная. Падобныя помнікі на тэрыторыі Глускага раёна ёсць каля вёсак Даколь, Зелянковічы, Халопенічы. Каля Даколі і Халопеніч па адным гарадзішчы, а каля Зелянковіч іх тры, і ўсе знаходзяцца ў розных напрамках ад вёскі: ва ўрочышчах Гарадок, Засека ці Дубовае і Старына. Усе яны размяшчаюцца ў паўднёвай частцы раёна на раўнінна-нізіннай мясцовасці. Жыхарам навакольных вёсак у большасці выпадкаў яны добра вядомы пад назвай Гарадок або Гарадзішча.

Менавіта ад такіх помнікаў паходзяць назвы ўрочышчаў, што захаваліся да цяперашняга часу. Гарадзішчы звычайна вылучаюцца на мясцовасці штучнымі абарончымі збудаваннямі, якія ўяўляюць сабой насыпы земляного вала (аднаго або двух) у спалучэнні з ровам (часам двума). Старажытныя паселішчы маюць кругавую сістэму абароны, таму вал заўсёды замкнёны. Такія помнікі ў плане бываюць круглай (Зелянковічы-1, Зелянковічы-3, Халопенічы), няправільнай прамавугольнай (Зелянковічы-2) формы. Насельнікі будавалі свае гарадкі ў глухіх месцах на ледзь бачных пагорках сярод паплавоў і балот, таму падысці да іх незнаёмцам было немагчыма.

З 5 гарадзішчаў, што ёсць у раёне, раскопкі праводзіліся толькі на адным. У 1978 г. А.А.Егарэйчанка даследаваў 240 м^2 на гарадзішчы каля в. Халопенічы. Ён вывучаў абарончыя збудаванні і пляцоўку паселішча ў паўночна-заходняй частцы помніка. Размешчана паселішча на невысокім пагорку сярод балот, якія цяпер асушаны. Пляцоўка круглай формы ўмацавана па перыметры земляным валам. Даследчыкам устаноўлена, што спачатку паселішча было ўмацавана драўлянай сцяной або плотам. Аб гэтым пераканаўча сведчаць ямкі ад слупоў у мацерыку пад насыпам вала. Пасля пажару жыхары насыпалі земляны вал шырынёй 7,5 м



План гарадзішча каля в. Халопенічы.

і вышынёй больш за 1 м. Насып узведзены з супеску шэрага колеру з дамешкамі вугольчыкаў і попелу. Наяўнасць жа абломкаў посуду ў ім гаворыць аб выкарыстанні ў гэтых мэтах і культурнага пласта. Нельга выключаць магчымасці існавання драўлянай агароджы на вяршыні першапачатковага вала. Ускосна аб гэтым гавораць і цёмныя плямы, што меліся на ім.

Паселішча было заснавана недзе ў IV ст. да н.э. плямёнамі мілаградскай культуры. Менавіта яны будавалі драўляныя ўмацаванні, а затым і першапачатковы земляны вал. Чарговае і апошняе падмацаванне сістэмы абароны помніка было звязана ўжо са зменай насельніцтва. Новыя жыхары павялічылі памеры вала. Вышыня яго дасягала, відаць, 2 м, а цяпер мае 1,6 м. Шырыня была каля 10—11 м. Гарадзішча некалькі гадоў разворвалася, таму вал панізіўся і пашырыўся. Даследчык лічыць, што на гарадзішчы Халопенічы на змену мілаградскаму насельніцтву прыйшлі плямёны зарубінецкай культуры. На маю думку, сюды, у Паўночнае Палессе, недзе ў апошніх стагоддзях да н.э. (II—I) прыйшлі плямёны культуры штрыхаванай керамікі. Гарадзішча функцыянавала, напэўна, да I ст. да н.э. ці рубяжа эр.

Культурны пласт паселішча мае матэрыялы, якія ў нейкай ступені характарызуюць насельнікаў гарадзішча і іх заняткі. У мацерыку пляцоўкі раскопу было шмат ям ад слупоў, калкоў гаспадарчага прызначэння. Нягледзячы на тое, што слупавыя ямы гавораць аб наяўнасці пабудоў слупавой канструкцыі, тым не менш знайсці рэшткі жытлаў на даследаванай плошчы не ўдалося. Ямы звонападобнай і чашападобнай у вертыкальным разрэзе формаў маглі выкарыстоўвацца для захавання прадуктаў, што ў гэты час было ўласціва для насельніцтва паўднёвых раёнаў. Некаторыя з авальных і акруглых у плане ям мелі ў запаўненнях разам з супескам чорнага колеру абломкі посуду, косці жывёлы, вугольчыкі, а іншы раз і абпаленыя камяні. Відаць, у іх скідалі смецце. У другім пласце (0,2—0,4 м) недалёка ад вала знаходзіліся камяні, якія бессістэмна прасціраліся ўздоўж вала з ухілам да цэнтра помніка. Прызначэнне іх не зусім зразумела. Кучы камянёў у выглядзе каменных вымастак накшталт пляцовак — з'ява характэрная для плямён, якія жылі ў цэнтральнай і паўночнай частках Беларусі. У вучоных няма пакуль што адзінага погляду на такія аб'екты старажытнасці. Адны мяркуюць, што імі абкладвалі агнішчы, другія — што іх выкарыстоўвалі ў абарончых мэтах і г.д.

Нельга сказаць, што культурны пласт халопеніцкага гарадзішча багата насычаны матэрыяламі. З даследаванай плошчы помніка сабраны 2122 экзэмпляры знаходак. Сярод іх 1999 абломкаў посуду, 72 косткі жывёлы, 41 крэмень, 10 індывідуальных прадметаў. Крамянёвыя пласціны, адшчэпы, як і кавалкі, гавораць аб тым, што жыхары паселішча апрацоўвалі крэмень. З яго яны выраблялі прылады працы. У раскопе апошнія не знойдзены, але ёсць адходы апрацоўкі гэтай сыравіны.

Дробны крамянёвы інвентар — наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, скрэблы разам з адшчэпамі — выяўлены на гарадзішчы Пятровічы, што ў Гарохаўскім сельсавеце Бабруйскага раёна. Адлегласць паміж помнікамі каля 50 км. Апрацоўваўся не толькі крэмень, але і іншыя пароды каменю, з якіх выраблялі сякеры, зерняцёркі і іншыя патрэбныя рэчы.

Даследаванне касцей паказала, што належаць яны наступным відам хатняй жывёлы: буйной і дробнай рагатай, каню, свінні. З дзікіх — высакароднаму аленю. Адсюль вынікае, што насельніцтва паселішча займалася жывёлагадоўляй і паляваннем. Вырошчвалі буйную рагатую жывёлу, авечак, коз, свіней, коней. Людзі палявалі не толькі на аленяў, але і на дзікоў,

ласёў, баброў, барсукоў, зайцоў, ліс, вавёрак.

Жалезны нож для жніва (серп) гаворыць аб занятках жыхароў гарадзішча земляробствам. Яно было падсечна-агнявое, як і на большай частцы тэрыторыі Беларусі. Высявалі хутчэй за ўсё ячмень, пшаніцу, жыта, проса, гарох, віку. Абвугленае зерне знаходзілі двойчы на археалагічных помніках за межамі раёна. Апошні раз у 1988 г. на гарадзішчы ранняга жалезнага веку каля в. Мыслі, што ў Капыльскім раёне Мінскай вобласці.

Яно было ў паўзямлянкавым жытле, а паселішча датуецца апошнімі стагоддзямі да нашай эры — першымі стагоддзямі нашай эры. Нажы для жніва выкарыстоўваліся не толькі для ўборкі ўраджаю збожжавых культур, але і для назапашвання сухіх кармоў для жывёлы на зімовы перыяд. Зброя на помніку прадстаўлена толькі абломкам наканечніка кап'я.

Большую палавіну індывідуальных прадметаў складаюць прасліцы, што надзяваліся на верацяно ў якасці махавічкоў. У калекцыі тры цэлыя і тры палавінкі прасліц, вылепленых з гліны. Яны плоскія, дыяметрам 2,5—3,5 см і таўшчынёй 0,4—0,7 см. Адтуліны ў іх 0,8—1,0 см. Іншы раз яны зроблены асіметрычна.

Жанчыны паселішча карысталіся ўпрыгожаннямі з бронзы. Насілі яны пласціністыя падвескі і бранзалеты. Падвескі трапецападобнай формы з адтулінай у верхняй частцы. Бранзалет дыяметрам 6,5 см. Ён спіралепадобны і зроблены з пласцін-стужак. Шырыня стужак 0,5—0,6 см. Стужкі-пласціны шчыльна сыходзяцца і накладваюцца адна на другую, да таго ж яны спаяны. Шырыня бранзалета 2,1 см.

Насельніцтва халопеніцкага гарадзішча карысталася ляпным посудам. Добра вядома, што «мілаградцы» ляпілі кругладонныя пасудзіны з акруглым тулавам, звужанай шыйкай і адагнутым вонкі венцам. Большасць гаршкоў мела лейкападобную верхнюю частку. Іншы раз у іх назіраліся пэўныя адрозненні ў афармленні менавіта верхняй часткі посуду. Ляпілі яны і начынне без шыйкі, але рэшткі апошніх сярод знойдзеных у раскопе венцаў адсутнічаюць. Сценкі гаршкоў таўшчынёй 0,5—1,0 см. Паверхня іх добра загладжана. Зярняты жарствы на паверхні амаль нябачны. Посуд добра абпалены на адкрытым агнішчы. Афарбоўка яго ад светлага да цёмна-бурага колеру. Знойдзеныя венцы сведчаць, што ў посудзе яны былі адагнуты вонкі. Самыя вялікія з іх дасягалі 6 см. Краі венцаў маюць закругленую форму. Каля палавіны венцаў аздоблены.



Знаходкі з гарадзішча каля в. Халопенічы: 1 — падвеска; 2 — бранзалет; 3—5, 8—10 — прасліцы; 6 — фрагмент дзіды; 7 — серп; 11 — сякера; 12 — прылада працы; 13 — адбойнік (1, 2 — бронза, 3—5, 8—10 — гліна, 6, 7 — жалеза, 11—13 — камень).

Арнамент наносіўся па шыйцы пасудзіны ці паміж шыйкай і краем венца. Па тэхніцы выканання ён уяўляе сабой ямкавыя ўціскання, зробленыя са знешняга боку вырабу круглай у сячэнні палачкай, якая ставілася перпендыкулярна да паверхні. Ямачкі ўціскаліся праз адпаведныя інтэрвалы і ўтваралі, такім чынам, ланцужок-кольца.

Змена насельніцтва недзе ў II ст. да н.э. добра прасочваецца і на керамічным матэрыяле. Посуд у «штрыхавікоў» істотна адрозніваецца ад мілаградскага. Ён быў пласкадонны. Сценкі тулава хаця і звужаліся да дна, але былі крыху выгнутыя. Плечукі паступова звужаліся да шыйкі. Верхнія часткі венцаў з закругленымі краямі адгіналіся крыху вонкі альбо ставіліся амаль вертыкальна. Гэты посуд быў больш грубы. Донцы таўшчынёй 0,7—1,2 см, а сценкі 0,5—1,0 см. Колер посуду светла-буры. Жарства выступае на паверхні вырабаў. Знешняя паверхня асобных венцаў пакрыта штрыхамі. А ўвогуле сярод усіх фрагментаў посуду абломкі са штрыхоўкай складаюць 15%. Майстры-керамісты цалкам задавальнялі патрэбы жыхароў умацаванага паселішча ў гліняным посудзе.

У Гарадку каля Халопеніч маглі пражываць адна альбо дзве вялікія патрыярхальныя сям'і. Але не кожнае гарадзішча ў той далёкі час з'яўлялася месцам пражывання адпаведных старажытных калектываў. Сустракаюцца гарадзішчы, на якіх культурны пласт адсутнічае. Хутчэй за ўсё, яны выконвалі функцыю сховішча ў небяспечны час. Цікава, што на трох помніках каля Зелянковіч адкладанні культурнага пласта не назіраюцца, а на Дакольскім гарадзішчы таўшчыня слоя дасягае 0,35 м.

У пачатку 1-га тысячагоддзя н.э. назіраецца новая з'ява. Людзі пакідаюць умацаваныя паселішчы (гарадзішчы) і рассяляюцца спачатку непадалёку, затым і воддаль ад іх. Такі від археалагічных помнікаў, калі старажытнае насельніцтва пражывала на неўмацаваных паселішчах, называецца селішчамі. Працэс перасялення з гарадзішчаў на селішчы быў не імгненны, а паступовы і доўжыўся ў некаторых плямён на працягу стагоддзяў.

Селішчы 1-га тысячагоддзя н.э. у Глускім раёне маюцца каля вёсак Гарадзішча ва ўрочышчы Царковішча; Жалвінец ва ўрочышчах Селішча і Старыя Клады; Зелянковічы ва ўрочышчы Мікуціны, каля балота Казакі; Кастрычнік ва ўрочышчы Гарадок; Падлужжа на ўсходнім ускрайку вёскі і ва ўрочышчы Замікольшчына; Поблін на ўсход ад могілак; Сіманавічы ва ўрочышчах Селішча і Цямшава Поле; Уюнішчы ва ўрочышчы Гарадок; у Глуску паміж ракой і могілкамі на паўднёвай ускраіне. Па два такія помнікі археолагамі зафіксаваны каля Жалвінца, Падлужжа і Сіманавіч. Матэрыялы абследавання, пераважна абломкі посуду, гавораць аб тым, што не ўсе яны датуюцца адным часам. Без раскопак, безумоўна, цяжка дакладна ўстанавіць адпаведны час функцыянавання кожнага з пералічаных селішчаў. Папярэдне іх датаванне можа быць вызначана наступным чынам: да ўсяго 1-га тысячагоддзя н.э. адносяцца селішчы ў Глуску, Побліне і 2 каля Падлужжа; да 2-й палавіне 1-га тысячагоддзя — у навакольлях Гарадзішча, Жалвінца (2), Зелянковіч, Кастрычніка, Сіманавіч. А на такіх паселішчах, як Гарадок, Зелянковічы, Сіманавічы ва ўрочышчы Селішча прысутнічае і ганчарная кераміка эпохі Кіеўскай Русі — X—XIII ст. Гэта сведчыць аб тым, што селішчы жалезнага веку выкарыстоўваліся і пазней, у дзяржаўны перыяд. На іх пражывалі ўжо летапісныя дрыгавічы.

З селішчаў жалезнага веку ў Глускім раёне даследавалася пакуль што толькі адно. Яно знаходзіцца на ўскраіне в. Сіманавічы ва ўрочышчы Цямшава Поле. У 1987, 1989, 1990, 1997 і 1998 гадах Н.М.Дубіцкая раскрыла 468 м^2

помніка. Таўшчыня культурнага пласта на ім не ўсюды аднолькавая, ад 0,2 да 1 м. Слой супеску цёмна-шэрага і чорнага колераў утрымлівае абломкі посуду, косці жывёлы, шлакі ад вытворчасці жалеза, кавалкі глінянай абмазкі, крэмень і разнастайныя вырабы. У двух раскопах 1987 г. і 1989 г. глінянай абмазкі сабрана 4 кавалкі, шлакаў — 11, зубоў і касцей жывёлы 52 адзінкі і 20 экзэмпляраў крэменю. За ўсе гады раскопак атрымана добрая калекцыя розных старажытных рэчаў. Сярод іх 13 гліняных прасліц пераважна біканічнай формы і іх абломкаў. З гліны трапіліся мініяцюрная пасудзіна, кавалачкі тыгляў — чарачак для плаўлення бронзы і льячкі — лыжачкі для яе разліву. Вырабы з бронзы два: кольца з тонкага дроту і пацерка ў выглядзе колца дыяметрам каля 0,5 см. З позніх — манета Вялікага княства Літоўскага. Прадметаў з каменю не шмат. Гэта — два шарападобныя, абломак шліфаванай сякеры-кліна і частка ліцейнай формы. Дзве знаходкі са шкла — пацеркі: адна жоўтага колеру з блакітнымі вочкамі і белымі абадкамі вакол іх, другая з пазалотай. Крыху болей жалезных прадметаў: 6 нажоў дрэннай захаванасці, посахападобная шпілька, рыбалоўны кручок, два язычкі ад спражак, шыла, зубіла і цвікі. Усе згаданыя прадметы з селішча Сіманавічы, несумненна, розначасовыя. Значна большую частку калекцыі складаюць абломкі посуду. За 4 гады раскопак іх сабрана 3032 фрагменты, у тым ліку і развалы гаршкоў. Абломкі ад ляпных пасудзін перавышаюць 2708 экзэмпляраў. Рэшткі ж ганчарнага посуду складаюць каля 12% (321 экз.). Але найбольш раннімі з'яўляюцца некалькі сценак ад пасудзін, якімі карысталася насельніцтва ў эпоху неаліту або бронзы (3-е — 2-е тыс. да н.э.). Наяўнасць такой ранняй керамікі ў спалучэнні з крамянёвымі вырабамі (наканечнік стралы, абломак сякеры-кліна) і адходамі апрацоўкі крэменю (адшчэпамі) сведчыць аб тым, што тут, на правым беразе р. Пціч, у той час існавала стаянка людзей каменнага або бронзавага веку.

Значна пазней, ужо ў пачатку 1-га тыс. н.э., гэту мясцовасць абжываюць плямёны жалезнага веку. Матэрыялы менавіта гэтага часу насельніцтва дамінуюць на селішчы Сіманавічы. Па часе яны адпавядаюць 2-й і 3-й чвэрцям 1-га тыс.

Раскопкі селішча ў в. Сіманавічы. 1998 г.

н.э. Увесь посуд плямён жалезнага веку з помніка ляпны з грубай фактурай. Майстры-керамісты падсыпалі ў глінянае цеста жарству — здробнены камень і шамот — керамічны бой. Паколькі паверхня пасудзін апрацоўвалася не вельмі якасна, то яны мелі шурпаты, грубы выгляд. Таўшчыня сценак посуду 0,4—1,5 см, а донцаў — да 2 см. Краі венцаў у такіх пасудзін адгіналіся вонкі. Акрамя гаршкоў, ва ўжытку былі міскі, кубкі і ёмістасці з ручкамі ў выглядзе невялікіх гаршкоў. Паводле прызначэння посуд падзяляўся на сталовы, кухонны і для захавання прадуктаў харчавання (пераважна сыпучай збажыны). Зрэдку траплялі ся глянцаваныя і добра загладжаныя пасудзіны, якія, відаць, можна звязваць з асобым іх прызначэннем. У час раскопак на селішчы знойдзены рэшткі чатырох жытлаў. Тры з іх былі наземныя, а чацвёртае паўзямлянкавае. Падлога паўзямлянкі заглыблена ў зямлю на 0,4 м. Пабудова мела памеры 1,3х1,7 м. Унутры жытлаў былі агнішчы, складзеныя з камянёў, з попелам і вуголлем. Усе шкляныя, бронзавыя, гліняныя і ў большасці сваёй жалезныя прадметы, знойдзеныя на селішчы Сіманавічы, належаць насельніцтву эпохі жалеза, якое пражывала ў дадзенай мясцовасці некалькі стагоддзяў. Па меркаванні даследчыка раскопак помніка, гэта былі носьбіты кіеўскай культуры. Шэраг даследчыкаў атаясамлівае іх з раннімі славянамі. З'явіліся яны на правым беразе р. Пціч недзе ў канцы II ст. н.э., а замірае жыццё на гэтым паселішчы толькі ў трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э.



Рэчы з селішча Сіманавічы (урочышча Цямшава Поле): 1, 2 — посуд, 3—7 — прасліцы; 8 — ліцейная форма (1—7 — гліна, 8 — камень).

Пасля перапынку ў некалькі стагоддзяў сюды зноў прыходзяць людзі. Але ў апошні раз на Цямшавым Полі былі ўжо не першабытныя пасяленцы, а летапісныя славяне-дрыгавічы. Дрыгавічы асвойваюць тэрыторыю абапал Пцічы ў раннедзяржаўны час. Сляды іх прысутнасці на помніку, які разглядаем, ёсць. Гэта ганчарны посуд X—XIII ст. і абломак каменнай ліцейнай формачкі з ружовага сланцу.

Ганчарны посуд быў прадстаўлены галоўным чынам гаршкамі і міскамі. У сваю чаргу ён быў розначасовы. Адна частка керамікі па формах венцаў адпавядала X—XIII ст., а другая — XIV—XVI ст. Менавіта ў апошні час насельніцтва перамясцілася з гэтага паселішча далей у паўночным накірунку да сучаснага ўрочышча Селішча. Разведачны шурф плошчай 16 м², які зрабіла Н.М.Дубіцкая, дазволіў устанавіць пераважную большасць керамікі XIV—XVI ст. на другім селішчы каля в. Сіманавічы.

Наяўнасць селішчаў з адкладаннямі апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. і матэрыялаў эпохі Кіеўскай Русі гаворыць аб тым, што ў гэты час тэрыторыя раёна, як і ўвогуле левабярэжжа Пры-

пяці, засялялася летапіснымі дрыгавічамі. Іх пранікненне на поўнач ад Прыпяці адбывалася, на думку П.Ф.Лысенкі, у IX—X ст. н.э. Менавіта ў гэты час яны з'явіліся і на тэрыторыі Глускага раёна. Аб рассяленні тут дрыгавічоў гавораць не толькі матэрыялы паселішчаў, але і нешматлікія курганныя могільнікі. Апошнія зафіксаваны археолагамі каля вёсак Даколь, Дуброва, Зелянковічы (40 курганоў), Кнышы, Поблін, Слаўкавічы, Сіманавічы, Усцярхі, Юзафова (4). Былі яны і каля Глуска. На жаль, большая частка курганоў у выніку дзейнасці чалавека не захавалася. Да таго ж рэшткі паселішчаў паблізу курганных могільнікаў не выяўлены. На большасці з вядомых селішчаў папярэдніх часоў матэрыялы аб прысутнасці славян-дрыгавічоў слабыя. Але ёсць на правым і левым берагах р. Пціч дрыгавіцкія паселішчы з добрымі культурнымі пластамі. Адным з такіх помнікаў, дзе доўгі час пражывалі летапісныя дрыгавічы, з'яўляецца ўрочышча Царковішча каля вёсак Гарадзішча і Гарадок, што ў Завалочыцкім сельсавеце. Паселішча займала плошчу каля 5—6 га. Ёсць меркаванні, што яно было нават умацаваным. Сабраныя на ім абломкі ганчарнага посуду адносяцца да XI—XV ст. Другім помнікам, дзе жылі некаторы час славяне, з'яўляецца селішча каля в. Жалвінец, на правым беразе Пічы, злева ад моста. Культурны слой на ім таўшчынёй да 0,3 м. Ён добра насычаны фрагментамі посуду, зробленага на ганчарным крузе. Ёсць у пласце і кавалкі шлакаў, што сведчыць аб занятках майстроў паселішча металургіяй жалеза. На падставе атрыманых матэрыялаў, галоўным чынам венцаў, помнік датуецца X—XIII ст.

У межах Глускага раёна як селішчы, так і курганныя могільнікі IX—XIII ст. археолагамі не раскопваліся, тым не менш археалагічныя помнікі гэтага часу на поўдні Беларусі вывучаны добра. Сведчаннем таму з'яўляюцца працы П.Ф.Лысенкі па даследаваных гарадах — «Города Туровской земли», «Берестье» і пахавальных помніках — «Дреговичи». Рэшткі гарадоў на тэрыторыі Глускага раёна не вядомы, а вось сельскія паселішчы, як адзначалася вышэй, існавалі. Лічу, што Глуску больш позніх часоў (XIV—XVIII ст.) папярэднічала невялікае паселішча дрыгавіцкага насельніцтва, якое і было яго першазаснавальнікам. Але развіццё Глуска ў больш позні перыяд са значнымі інжынернымі перапланіроўкамі (пабудовай замка) магло цалкам знішчыць адкладанні культурных напластаванняў папярэдніх часоў. Каб даказаць сказанае, трэба правесці грунтоўныя археалагічныя даследаванні.

У другой палавіне 1-га тысячагоддзя працягваўся працэс удасканалення рамёстваў і гаспадарчай дзейнасці жыхароў неўмацаваных паселішчаў. Як ужо адзначалася, на рубяжы і ў пачатку новай эры ў грамадстве адбываўся паступовы пераход ад родаплемяннога ладу да сельскай абшчыны. Патрыярхальныя сем'і пакідалі гарадзішчы і рассяляліся па берагах рэк. Змена формаў паселішчаў сведчыла і аб разлажэнні першабытнаабшчыннага ладу. Кроўна-родавыя адносіны ў тагачасных калектывах саступілі месца адносінам, якія вынікалі ўжо з тэрытарыяльнай абшчыны. Сам працэс распаду родавых сувязей працягваўся да VIII—IX ст. Сельская земляробчая абшчына 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя яшчэ аб'ядноўвала ў сабе элементы мінулага і рысы новых адносін, якія мелі тэндэнцыі да індывідуалізацыі вытворчасці. Гаспадарча-тэрытарыяльныя сувязі сельскай абшчыны вылучаліся большай разнастайнасцю. Абшчыннае землеўладанне ў ёй спалучалася з індывідуальным вядзеннем гаспадаркі. У нетрах сельскай абшчыны зарадзілася і існавала маёмасная нераўнасць. Менавіта гэта акалічнасць і была асновай для ўтварэння класаў. Спачатку маёмасныя, а потым і сацыяльныя адрозненні прывялі да класа-

вых адносін у грамадстве. Як бачым, класавыя адносіны зараджаліся ў дадзяржаўны перыяд і былі ўласцівы як славянскаму, так і балцкаму насельніцтву на працягу VI—VIII ст. Кіруючы клас у дафеадальны час утвараў дружыны, якія складаліся з воінаў-прафесіяналаў. Асобныя плямёны славян аб'ядноўваліся, каб стварыць саюз плямён. Так узнікалі племянныя княжанні, прадвеснікі дзяржавы. Вельмі важнай падзеяй было стварэнне ў IX ст. Старажытнарускай дзяржавы. Сельскае насельніцтва дрыгавічоў, што пражывала на селішчах у межах Глускага раёна, з'яўлялася неад'емнай часткай спачатку племяннога княжання дрыгавічоў, а з канца X ст. і Тураўскага княства. У межах апошняга яно знаходзілася недзе да 2-й палавіны 60-х—1-й палавіны 70-х гадоў XII ст., калі адбыўся падзел Тураўскага княства на больш дробныя: Клецкае, Пінскае, Слуцкае і Тураўскае.

Сярод старажытнасцей Глушчыны каштоўнымі з'яўляюцца і так званыя культавыя камяні. Напрыклад, цікавасць уяўляе камень «След Хрыста» ва ўрочышчы Хвашчоўка каля в. Катка. Наогул, такія камяні вядомы ва ўсім свеце. На іх бачны паглыбленні (прыродныя ці выбітыя рукой чалавека), якія нагадваюць след чалавека або жывёліны. У выніку комплекснага вывучэння камянёў-следавікоў вучоныя прыйшлі да вываду, што знакі ступні чалавека ці жывёл у старажытнасці былі сімваламі жыцця, урадлівасці і адлюстроўвалі культ Бога Сонца. З распаўсюджваннем хрысціянства царкоўнікі прыстасавалі такія камяні да сваіх мэт, і так з'явіліся паданні аб слядах Божай Маці ці Хрыста і розных святых.

Ёсць на Глушчыне яшчэ адзін цікавы помнік — каменны крыж каля курганоў, што паблізу былой в. Зялёнкі. Дарэчы, каменныя крыжы ёсць ва ўсёй Еўропе. Яны звычайна ставіліся на перакрыжаваннях шляхоў, водных пераправах, на ўскраінах вёсак як сродак заступніцтва ад ворагаў і ад эпідэмій, на месцах бітваў, на межах зямель, у гонар знамянальных падзей і інш. Гэтыя крыжы ўстанаўлівалі жыхары і пакланяліся ім.

Крыніцы:

Археалагічныя помнікі Магілёўшчыны (бібліяграфічны даведнік). Магілёў, 1998. С. 55—57.

Ганецкая І.У. Справаздача аб археалагічным даследаванні Глускага замка ў чэрвені—жніўні 1996 года. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1643.

Ганецкая І.У. Справаздача аб археалагічных раскопках у 1997 годзе Глускага замка. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1674.

Ганецкая І. Замчышча адкрывае сакрэты хоць і не адразу, а паступова, але ўсё ж гісторыя дзеліцца сваімі тайнамі // Радзіма. 1997. 15, 18, 22 кастр. і 1 ліст.

Драгун Ю.И.Отчет об археологической разведке БГУ имени В.И.Ленина в июне 1963 года. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 221.

Дубицкая Н.Н. Отчет о полевых исследованиях в 1987 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1056.

Дубицкая Н.Н. Отчет о полевых исследованиях в 1989 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1131.

Дубицкая Н.Н. Отчет о полевых исследованиях в 1990 году в Глусском районе Могилевской области и Октябрьском районе Гомельской области. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1553.

Дубицкая Н.Н. Археологические памятники // Могилевщина. Могилев, 1991. С. 8.

Дубицкая Н.Н. Отчет о полевых исследованиях в Жлобинском районе Гомельской области и Глусском районе Могилевской области летом 1997 г. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1675.

Дубицкая Н.Н. Раннеславянское селище Симоновичи на р. Птичь // Старажытнасці Бабруйшчыны. Бабруйск, 1998. С. 5—17.

Дубіцкая Н.М. і Дучыц Л. Старажытнасці Глушчыны // Магілёўская праўда. 1989. 23 вер.

Егорейченко А.А. Обследование памятников в бассейнах Лани и Птичи // Археологические открытия 1977 года. М., 1978. С. 413.

Егорейченко А.А., Скрипченко Т.С. Исследование памятников раннего железного века в Белорусском Полесье // Археологические открытия 1978 г. М., 1979. С. 433—434.

Егорейченко А.А. Отчет о полевых археологи-

ческих работах в 1978 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 595.

Егорейченко А.А. Раскопки городища у д. Холопеничи // Древности Белоруссии и Литвы. Мн., 1982. С. 67—71.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Исаенко В.Ф. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 3. Мн., 1976. С. 135.

Крывальцэвіч М.М. Справаздача аб палявых даследаваннях 1986 года на тэрыторыі цэнтральных раёнаў Прыпяцкага Палесся Беларусі. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 985.

Крывальцэвіч М.М. Справаздача аб палявых даследаваннях ва Усходнім Палессі Беларусі ў 1994 годзе. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1532.

Крывальцэвіч М.М. Справаздача аб палявых даследаваннях 1997 года на тэрыторыі Палесся і Верхняга Падняпроўя. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1707.

Лошенков М.И. Отчет о полевых работах в Глусском, Бобруйском и Речицком районах в 1987 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1017.

Лошенков М.И. Отчет о работах в Бобруйском, Глусском и Березинском районах в 1990 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1253.

Лошенков М.И. Отчет об обследованиях летом 1992 года в Белыничском, Бобруйском и Глусском районах Могилевской области. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1430.

Лошенков М.И. Отчет о раскопках Петровичского городища и обследованиях летом 1993 года. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1471.

Лошенков М.И. Обследование археологических памятников в Глусском районе и случайные находки // Гістарычныя лёсы Верхняга Падняпроўя. Магілёў, 1995. Ч. І. С. 74—85.

Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991.

Мельниковская О.Н. Отчет о работах Гомельского отряда Верхнеднепровской экспедиции Института истории материальной культуры СССР в 1957 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 26.

Мельниковская О.Н.Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.

Опросные листы 1924 г. по Бобруйскому уезду. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 69.

Поболь Л.Д. Погребение эпохи бронзы близ д. Борисовщина Могилевской области // Советская археология. 1966. № 2.

Поболь Л.Д. Славянские древности Белоруссии. Мн., 1974. С. 261—265.

Поболь Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983. С. 398—401.

Рынейскі А. Археалагічныя разведкі на р. Пціч // Запіскі аддзелу гуманітарных навук Беларускай акадэміі навук. Кн.: Працы секцыі археалогіі. Мн., 1932. Т. 3. С. 209.

Сагановіч Г.М. Справаздача аб палявых даследах у чэрвені і жніўні 1988 года. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 1114.

Седов В.В. Отчет о полевых археологических работах на территории Белорусской ССР в 1961 году. — Архіў ІГ НАН Беларусі. Справа № 115.

Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991.

Чирук Г. О древних умельцах // Коммерческий курьер. 1997. 20 сент.

Чирук Г. Археологические раскопки в Симоновичах // Коммерческий курьер. 1998. 19 авг.

Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Мн., 1971. С. 216—217.

М.І.Лашанкоў.

Помнікі археалогіі Глускага раёна

Арыжня-1, Завалочыцкі сельсавет. За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Арыжня, на полі сустракаюцца крамянёвыя вырабы (нуклеус, скобля, абломак пласціны з рэтушшу). Знаходкі выяўлены М.М.Крывальцэвічам у 1997 г. на ўчастку тэрасы рэчкі памерам 200х300 м.

Арыжня-2. За 0,7 км у паўночна-ўсходнім кірунку ад вёскі, на ўчастку тэрасы р. Арыжня, на полі — сляды паселішча. Вышыня тэрасы да 3 м. Абломкі крэменю знойдзены М.М.Крывальцэвічам у 1997 г. на плошчы 2000 м^2. Сярод знаходак кавалкі крэменю і адшчэпы, ножападобная пласціна, скол падпраўкі нуклеуса і нуклеус.

Арыжня-3. Прыкладна за 400 м ад крайніх хат ва ўсходнім кірунку, на полі, што цягнецца па краі рачной тэрасы, М.М.Крывальцэвічам знойдзена керамікa бронзавага веку. Абломкі посуду тшцінецка-сосніцкага тыпу. Яны аздоблены зубчатым і ружанцовым арнаментам. У калекцыі ёсць 4 крамянёвыя адшчэпы.

Арыжня-4. На адлегласці 200 м ад крайніх хат у паўночна-ўсходнім напрамку — сляды селішча жалезнага веку. Яно размяшчаецца на самай узвышанай частцы поля на правай тэрасе р. Арыжня. Зна-

ходкі трапляюцца на плошчы каля 500 м². Вышыня тэрасы — 4—5 м над поплавам рэчкі. У калекцыі пад'ёмных матэрыялаў абломкі керамікі з гладкасценнай, штрыхаванай і глянцаванай паверхнямі, нуклеус, два адшчэпы, ножападобная пласціна з рэтушшу па краях. Помнік адкрыты ў 1997 г. М.М.Крывальцэвічам.

Бабірова, Завалочыцкі сельсавет. На сучасных вясковых могілках знаходзіцца старажытны курганны могільнік. Курганы мясцовыя жыхары называюць «шведскімі магіламі». У 1964 г. Л.Д.Побаль налічыў 20 насыпаў. Гэту групу ў 1990 г. абследавала Н.М.Дубіцкая.

Барысаўшчына-1, Калаціцкі сельсавет. Бескурганны могільнік бронзавага веку знаходзіцца за 2 км на поўдзень ад вёскі на левым беразе р. Камарынка пры ўпадзенні яе ў р. Пціч, ва ўрочышчы Горы. Пахаванне даследавана Л.Д.Побалем у 1964 г. Яно знаходзілася ў яме дыяметрам 0,5 м. Уяўляла сабой рэшткі спалення ў выглядзе кальцыніраваных касцей з дробным вуголлем. Акрамя таго, у пахавальнай яме былі крамянёвыя прылады працы: нажы, скрабкі, сякера, раструшчаная пасудзіна — гаршчок і частка чэрапа чалавека. Гэты могільнік абследавалі В.Ф.Капыцін у 1977 г., М.І.Лашанкоў і Н.М.Дубіцкая ў 1987 г., М.М.Крывальцэвіч у 1986, 1994, 1997 гг. У 1998 г. раскопкі праводзіў М.М.Крывальцэвіч, які раскрыў 48 м². Культурны пласт таўшчынёй 0,4 м. Знойдзена вастрадонная пасудзіна неалітычнага часу і 300 адзінак дробнага крамянёвага інвентару: прылад працы і адходаў апрацоўкі крэменю.

Барысаўшчына-2. За 250 м на поўнач ад вусця Камарынкі ёсць другі мысападобны выступ тэрасы ў поплаў р. Пціч. У 1997 г. М.М.Крывальцэвіч сабраў на ім паверхневы матэрыял: ножападобную пласціну, адшчэп, абломак ножападобнай пласціны з рэтушшу па краі.

Барысаўшчына-3. За 2 км на поўдзень ад вёскі на адным з мысападобных выступаў у поплаў р. Пціч, які ўзвышаецца на 2—5 м, зафіксаваны рэшткі паселішча. У 1997 г. М.М.Крывальцэвіч залажыў шурф памерам 1х1 м на ўсходняй ускраіне ўзвышша. Таўшчыня культурнага пласта 0,53 м. Абломкі посуду фіксаваліся да глыбіні 0,3 м, а ніжэй — вырабы з крэменю. Кераміка жалезнага веку — 2-й палавіны 1-га тысячагоддзя н.э. са штрыхаванай паверхняй. Крамянёвыя знаходкі ў выглядзе абломкаў нуклеусаў, адшчэпаў, часткі шліфаванай сякеры.

Гарадзішча, Завалочыцкі сельсавет. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Царковішча, на левым беразе р. Пціч, селішча. Культурны пласт 0,2 м. У 1964 г. Л.Д.Побаль знайшоў на ім ляпную кераміку жалезнага веку і ганчарную эпохі Кіеўскай Русі. Плошча каля 1 га.

Гарадзішча, Хваставіцкі сельсавет. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Раманаўшчына, 30 курганоў вышынёй 1—2,5 м. Па неўдакладненых звестках, атрыманых у мясцовых жыхароў, на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Мухава Стойла, маецца яшчэ 10 курганоў.

Гарадок, Завалочыцкі сельсавет. На правым беразе р. Пціч, па дарозе ў вёску Кнышы, ёсць група курганоў. У 1963 г. Ю.І.Драгун налічыў у ёй 22 насыпы. Вышыня іх да 3 м.

Глуск-1, цэнтр раёна. Паселішча каменнага і бронзавага вякоў ёсць каля Глуска, на левым беразе р. Пціч, ва ўрочышчы Дубень. На паверхні пясчаных выдмаў М.М.Крывальцэвіч сабраў пад'ёмны матэрыял. У калекцыі абломкі посуду, крамянёвыя скрабкі, скоблі, нажы, праколкі, наканечнікі стрэл, мікрапласцінкі, адшчэпы і абломкі крэменю.

Глуск-2. Селішча 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіцца на паўднёва-ўсходняй ускраіне Глуска, паміж поплавам і сучаснымі могілкамі. Помнік адкрыў у 1929 г. А.Рынейскі. У 1964 г. яго абследаваў Л.Д.Побаль. Ён выявіў грубаляпную кераміку ў агаленнях берага тэрасы на адлегласці 300 м ад дарогі на в. Поблін. У 1985 г. яго абследаваў А.В.Іоў, а ў 1987 г. М.І.Лашанкоў і Н.М.Дубіцкая.

Глуск-3. У цэнтры Глуска, на правым беразе р. Пціч, захаваліся рэшткі замка XVI — XVIII ст. Ёсць пяць бастыёнаў і пашкоджаныя абарончыя валы з поўначы і поўдня. Цяпер тут пабудаваны спартыўныя пляцоўкі. У 1988 г. невялікія раскопкі на ім правёў Г.Н.Сагановіч. У канцы 1990-х гг. яго даследавала І.У.Ганецкая. Яна знайшла шматлікія матэрыялы, якія характарызуюць побыт жыхароў замка. Глускі замак абследаваўся неаднаразова А.Рынейскім, Л.Д.Побалем, М.А.Ткачовым, М.І.Лашанковым,

Л.У.Калядзінскім, Н.М.Дубіцкай, М.М.Крывальцэвічам.

Даколь, Клятнянскі сельсавет. Гарадзішча знаходзіцца ва ўрочышчы Акоп за 7—8 км на паўднёвы захад ад вёскі. Па перыметры ўмацавана кальцавым валам. Шырыня вала каля 10 м і вышыня каля 2 м. У 1965 г. Л.Д.Побаль шурфаваў яго. Таўшчыня культурнага пласта 0,3 м. Гарадзішча адносіцца да жалезнага веку. Помнік абследавалі ў 1985 г. А.В.Іоў, у 1990 г. Н.М.Дубіцкая.

Жалвінец-1, Калаціцкі сельсавет. Селішча знаходзіцца на захад ад вёскі, на правым беразе р. Пціч, ва ўрочышчы Селішча, каля моста. Тэраса ўзвышаецца над поплавам на 4—5 м. Помнік адкрыты ў 1930 г. А.Рынейскім. У 1965 г. яго абследаваў Л.Д.Побаль, які зафіксаваў таўшчыню культурнага пласта 0,3—0,5 м. У 1987 г. селішча шурфавалі М.І.Лашанкоў і Н.М.Дубіцкая з правага боку ад грунтавой дарогі. Шурф памерам 1х1 м. Культурны пласт — супесак чорнага колеру 0,4 м. Выяўлены пераважна ганчарная кераміка, кавалкі шлакаў ад вытворчасці жалеза, жалезны нож. На выдмах пераважаюць абломкі ляпнога посуду 1-га тысячагоддзя н.э. Плошча помніка каля 2 га.

Жалвінец-2. Селішча 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіцца за 0,3—0,4 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Старыя Клады, што на левым беразе р. Пціч. Тэраса ўзвышаецца над поплавам на 3—4 м. Адкрыў і абследаваў у 1964 г. Л.Д.Побаль. Прыкладная плошча каля 2 га. У 1985 г. помнік абследаваў А.В.Іоў.

Згода, Бярозаўскі сельсавет. За 1 км ад вёскі, на правым беразе р. Пціч, на пясчаных узгорках ёсць паселішча (стаянка) бронзавага веку. Яго адкрыў у 1930 г. А.Рынейскі. У 1970 г. абследаваў В.Ф.Капыцін. Культурны пласт 0,1 м. У ім знойдзены абломак каменнай свідраванай сякеры, крамянёвыя скрабкі і пласціна з рэтушшу, абломкі пасудзін і перапаленыя косці.

Зелянковічы-1, Бярозаўскі сельсавет. Селішча 2-й палавіны 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіцца за 0,3—0,5 км на ўсход ад вёскі ва ўрочышчы Мікіціны. Тэраса ўзвышаецца над поплавам на 3—5 м. Плошча помніка каля 1 га. Культурны пласт 0,5 м.

Зелянковічы-2. За 5 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Дзяружкі, у лесакварталe № 18 сярод балота гарадзішча. Пляцоўка яго акруглай формы, дыяметрам каля 170 м. Умацавана двума валамі і ровам паміж імі. Адкрыў яго ў 1964 г. Л.Д.Побаль, абследавалі ў 1985 г. А.В.Іоў, у 1990 г. Н.М.Дубіцкая.

Зелянковічы-3. Гарадзішча жалезнага веку знаходзіцца за 6 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Старына. У плане помнік круглай формы. Паселішча ўмацавана двума валамі і ровам. Помнік адкрыў Л.Д.Побаль ў 1964 г., абследавалі ў 1985 г. А.В.Іоў, у 1990 г. Н.М.Дубіцкая. Гарадзішча разбураецца, захавалася частка сістэмы ўмацаванняў. Пашкоджана ў час меліярацыі ў канцы 1980-х гг.

Зелянковічы-4. За 300 м ад Зелянковіч, каля дарогі на в. Зубарэвічы, ва ўрочышчы Акоп або Горкі, ёсць курганная група. У 1985 г. А.В.Іоў абследаваў гэты могільнік і налічыў у ім 40 курганоў. Курганы паўсферычнай формы вышынёй 1,5—2,5 м. У плане круглыя дыяметрам 5—10 м. У 1990 г. Н.М.Дубіцкая адзначыла, што ў могільніку засталося 25 курганоў.

Зубарэвічы, Бярозаўскі сельсавет. Курганны могільнік з 8 насыпаў знаходзіцца за 1 км на паўночны захад ад вёскі ў полі, ва ўрочышчы Уланаўскі Брод. Дыяметр курганоў 6—12 м. Вышыня да 2 м. Мясцовыя жыхары называюць іх «шведскімі магіламі». Частка іх знішчана пры будаўніцтве дарогі. Могільнік адкрыты Н.М.Дубіцкай у 1990 г.

Кастрычнік, Казловіцкі сельсавет. Селішча жалезнага веку (2-й палавіны 1-га тысячагоддзя) знаходзіцца за 1—1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі ва ўрочышчы Гарадок. Плошча каля 1 га. Помнік адкрыў Л.Д.Побаль у 1965 г. У калекцыі паверхневых зборaў абломкі ляпной керамікі VI—VIII ст., кавалкі шлакаў і фрагмент біканічнага прасліца.

Кнышы, Завалочыцкі сельсавет. Стаянка бронзавага веку знаходзіцца за 1 км на паўночны захад ад вёскі, на правым беразе р. Пціч, каля дарогі на в. Гарадок. Выявіў у 1930 г. А.Рынейскі, абследавалі ў 1963 г. Ю.І.Драгун і ў 1964 г. Л.Д.Побаль. Знойдзены абломкі ляпнога посуду, крамянёвы наканечнік стралы, пласціны, адшчэпы.

Нова-Андрэеўка-1, Клятнянскі сельсавет. У вёсцы, каля школы, была курганная група. У 1964 г. Л.Д.Побаль налічыў у ёй 25 насыпаў.

Нова-Андрэеўка-2. Курганны могільнік знаходзіцца на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, у лесе. У ім налічваецца больш за 10 насыпаў. Дыяметр іх да 15 м, а вышыня 1,5—2 м. Частка курганоў пашкоджана. Могільнік адкрыты Н.М.Дубіцкай у 1990 г. Належыць дрыгавічам.

Падлужжа-1, Бярозаўскі сельсавет. За 0,5 км на захад ад вёскі ў напрамку в. Рылавічы (Розлевічы), на правым беразе р. Пціч ёсць паселішча каменнага (неаліту) і бронзавага вякоў. Яно размяшчаецца на пясчаных узгорках. Памер 40х120 м. Помнік выявіў у 1930 г. А.Рынейскі. У 1977 г. яго абследаваў В.Ф.Капыцін. На ім знойдзены абломкі ляпнога посуду, крамянёвыя пласціны і адшчэпы.

Падлужжа-2. Селішча 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі, на тэрасе правага берага р. Пціч. Выявіў у 1964 г. Л.Д.Побаль. У агаленнях берага знойдзены абломкі ляпных гаршкоў. Яны прасочваліся ўздоўж берага на 70—100 м. Таўшчыня культурнага пласта ў абрывах складала 0,3—0,5 м. Гэты помнік абследавалі ў 1985 г. А.В.Іоў, у 1987 г. М.І.Лашанкоў і Н.М.Дубіцкая.

Падлужжа-3. Селішча пераважна з ганчарнай і ляпной керамікай знаходзіцца за 0,4 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Замікольшчына, на правым беразе р. Пціч. Адкрыў яго ў 1930 г. А.Рынейскі. Па звестках Л.Д.Побаля, які абследаваў гэты помнік у 1964 г., плошча яго 2 га. У 1985 г. яго абследаваў А.В.Іоў, у 1990 г. Н.М.Дубіцкая. Таўшчыня культурнага пласта на ім 0,3 м.

Поблін-1, Бярозаўскі сельсавет. Стаянка бронзавага веку знаходзіцца на паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р. Пціч, у хвойніку паміж сучаснымі могілкамі і жывёлагадоўчай фермай. Выявіў яе ў 1930 г. А.Рынейскі. У 1977 г. абследаваў В.Ф.Капыцін. Знойдзены кавалкі ляпнога посуду і расшчэплены крэмень.

Поблін-2. Селішча 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіцца за 1 км на поўнач ад вясковых могілак, на правым беразе р. Пціч. Яго адкрыў у 1929 г. А.Рынейскі, абследаваў у 1965 г. Л.Д.Побаль. Таўшчыня культурнага пласта 0,2—0,4 м. На ім знойдзена ляпная гладкасценная кераміка. Помнік датуецца Л.Д.Побалем II—VIII ст. н.э. Яго абследавалі ў 1985 г. А.В.Іоў, у 1987 г. М.І.Лашанкоў і Н.М.Дубіцкая. Знойдзены абломкі ганчарнага посуду.

Сіманавічы-1, Завалочыцкі сельсавет. На ўсходняй ускраіне в. Сіманавічы, ва ўрочышчы Цямшава Поле, на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Пціч зафіксаваны сляды паселішча эпохі неаліту і бронзы. Знойдзены абломкі посуду таго часу, крамянёвыя рэчы (ножападобныя пласціны, скрабкі, сякера, нуклеусы) і адходы апрацоўкі крэменю (адшчэпы). Усяго 45 адзінак. Згаданыя матэрыялы, як і помнік, папярэднічалі неўмацаванаму паселішчу 2-й і 3-й чвэрцей 1-га тысячагоддзя н.э., раскопкі на якім у 1987, 1989, 1990, 1997, 1998 гг. праводзіла Н.М.Дубіцкая. Помнік адкрыты А.Рынейскім у 1930 г. Яго абследаваў у 1977 г. В.Ф.Капыцін. Памер яго 30х120 м. Культурны пласт 0,2 м. Паводле меркавання В.Ф.Капыціна, стаянка адносіцца да бронзавага веку.

Сіманавічы-2. Могільнікі курганны і грунтавы. У вёсцы, на правым беразе р. Пціч, ва ўрочышчы Цямша захаваліся 2 курганы. Па звестках Н.М.Дубіцкай, у канцы 1990-х гадоў адзін з іх раскопвалі мясцовыя жыхары. Даўней у гэтым могільніку даследчыкі адзначалі 4 насыпы. Побач з імі зафіксаваны бескурганны могільнік. Першыя звесткі аб могільніку ёсць у Апытальных лістах Наркамасветы па Бабруйскім павеце за 1924 г. Затым іх абследавалі ў пачатку 1930-х гадоў А.Рынейскі, у пачатку 1960-х — В.М.Мельнікоўская, у 1964 г. Л.Д.Побаль, у 1977 г. В.Ф.Капыцін.

Сіманавічы-3. Селішча 2-й і 3-й чвэрцей 1-га тысячагоддзя н.э. ёсць на ўсходняй ускраіне вёскі, ва ўрочышчы Цямшава Поле, на тэрасе правага берага р. Пціч, на поўнач ад шашы Бабруйск — Слуцк. Даўжыня ўздоўж ракі 250 м. Вышыня тэрасы над поплавам 5—6 м. Культурны пласт таўшчынёй 0,2—0,9 м. Ён складаецца з супеску цёмна-шэрага і чорнага колераў і ўтрымлівае кераміку, косці жывёлы, шлакі, кавалкі глінянай абмазкі, расшчэплены крэмень. Помнік выявіў у 1930 г. А.Рынейскі, абследавалі ў 1964 г. Л.Д.Побаль, у 1985 г. А.В.Іоў, у 1987 г. М.І.Лашанкоў. Раскопкі на ім правозіць Н.М.Дубіцкая. У 1987, 1989, 1990, 1997, 1998 гг. яна раскрыла 468 м². Выяўлены рэшткі 4 па-

будоў і шматлікі матэрыял, які характарызуе жыхароў паселішча.

Сіманавічы-4. Селішча канца 1-га тысячагоддзя н.э. і феадальнага часу знаходзіцца за 0,5 км на захад ад вёскі ва ўрочышчы Селішча. Яно размяшчаецца на тэрасе правага берага р. Пціч і ўзвышаецца над поплавам на 4—5 м. Адкрыў і абследаваў у 1964 г. Л.Д.Побаль. Кераміка сустракаецца ўздоўж берага на 1 км. У разведачным шурфе плошчай 16 м², які зрабіла Н.М.Дубіцкая, на гэтым помніку пераважае ганчарная кераміка XIV—XVI ст. У 1985 г. яго абследаваў А.В.Іоў.

Сіманавічы-5. Прыблізна за 3 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе, што расце ўздоўж тэрасы правага берага р. Пціч, ёсць 2 курганныя насыпы. Размяшчаюцца злева, каля лясной дарогі за 300 м ад моста цераз прыток р. Пціч. Вышыня курганоў 1,5 м, дыяметр — 8—10 м. Адзін з іх пашкоджаны дарогай. Адкрыў у 1997 г. М.М.Крывальцэвіч.

Сіманавічы-6. За 3,6 км ад Сіманавіч у паўночна-заходнім напрамку, за 600 м ад двух курганоў, знаходзіцца курганная група. Яна размешчана справа ад дарогі, у лесе, адразу за мостам цераз невялікі ручай. У групе 5 насыпаў. З іх 2 малыя, вышынёй 0,5 м і дыяметрам 5 м. Тры — вялікія курганы дыяметрам каля 10 м і вышынёй 1,7 м. Адзін пашкоджаны дарогай. Курганны могільнік адкрыў у 1997 г. М.М.Крывальцэвіч.

Сіманавічы-7. Група з 2 курганоў знаходзіцца на левым беразе р. Пціч, прыкладна за 6—7 км уверх па цячэнні, ва ўрочышчы Тоўсты Лес. Яны размяшчаюцца з правага боку дарогі на вёску Тоўсты Лес. Дыяметр насыпаў 10 м, вышыня каля 1 м. Могільнік адкрыла Н.М.Дубіцкая ў 1990 г.

Слабодка, Каткаўскі сельсавет. За 1 км на поўдзень ад вёскі, на пясчаных узвышшах правага берага р. Пціч ёсць рэшткі паселішча эпохі бронзы. Яшчэ ў 1930 г. А.Рынейскі сабраў калекцыю крамянёвых вырабаў і абломкі посуду. У 1988 г. на агародзе аднаго з жыхароў вёскі знойдзена крамянёвая сякера-клін з зашліфаваным лязом.

Усцярхі, Казловіцкі сельсавет. За 1 км на паўночны захад ад вёскі ёсць курганны могільнік. У 1965 г. яго абследаваў Л.Д.Побаль, які зафіксаваў у ім 130 курганоў. Гэты могільнік абследаваў яшчэ ў 1930-я гады А.Рынейскі, а значна пазней Ю.У.Кухарэнка.

Уюнішча, Казловіцкі сельсавет. За 0,5 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, у лесе, селішча. Выявіў яго ў 1964 г. Л.Д.Побаль. Плошча каля 1 га.

Халопенічы-1, Каткаўскі сельсавет. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадзішча, сярод асушаных балот, ёсць умацаванае паселішча. У плане круглай формы, дыяметрам 74 м. Умацавана земляным валам вышынёй каля 1 м. Шырыня вала на падэшве 12—13 м. Культурны пласт — супесак шэрага колеру. Ён насычаны абломкамі посуду, касцямі жывёлы, вырабамі з крэменю і металаў. У 1978 г. яго даследаваў А.А.Егарэйчанка, які раскрыў на помніку 240 м². Датуецца гарадзішча IV—I ст. да н.э. Заснавалі яго плямёны мілаградскай культуры. Помнік неаднаразова абследаваўся археолагамі А.Рынейскім, Ю.У.Кухарэнкам, В.М.Мельнікоўскай, В.В.Сядовым, Л.Д.Побалем, А.В.Іовым, М.І.Лашанковым, Н.М.Дубіцкай.

Халопенічы-2. За 0,7 км ад гарадзішча Халопенічы, у паўднёва-ўсходнім напрамку, ёсць селішча. Вядома з 1924 г. Плошча каля 3 га. Утрымлівае ляпную і ганчарную кераміку 1-га тысячагоддзя н.э. Яго абследавалі А.Рынейскі, Л.Д.Побаль, А.В.Іоў.

Халопенічы-3. Курганны могільнік знаходзіцца ўздоўж шашы Глуск—Акцябрскі. Група размяшчаецца ў лесе, прыкладна за 100 м ад моста цераз р. Пціч, пры першым павароце ўлева на грунтавую дарогу. Даўней у ёй налічвалася 69 курганоў. Адкрыў могільнік у 1930-я гг. А.Рынейскі, у 1960-я гг. яго абследавалі Ю.У.Кухарэнка, В.М.Мельнікоўская, В.В.Сядоў, Л.Д.Побаль і ў 1992 г. М.І.Лашанкоў. У 1990 г. Н.М.Дубіцкая налічыла 30 насыпаў. Дыяметр да 15 м. Вышыня 2—2,5 м.

Юзафова, Калаціцкі сельсавет. У курганнай групе 4 насыпы. Вышыня іх каля 2 м, дыяметр 8—12 м. Група знаходзіцца за 0,5 км на паўночны захад ад вёскі каля прасёлачнай дарогі на в. Сяльцы і далей на Завалочыцы. Могільнік адкрыты ў 1992 г. М.І.Лашанковым.

Падрыхтаваў М.І.Лашанкоў.

Дрыгавічы

Вучоныя-археолагі ўстанавілі, што ў старажытнасці тэрыторыю сучаснага Глускага раёна засялялі прадстаўнікі аднаго з племянных аб'яднанняў усходніх славян — дрыгавічы. Першыя гісторыка-геаграфічныя звесткі пра іх жыццё і працэс рассялення змешчаны ў старажытным летапісе, які напісаны каля 1113 г. кіеўскім манахам Нестарам. Першы запіс у «Аповесці мінулых гадоў» датаваны 852 годам. Што ж адбывалася ў тыя далёкія часы на тэрыторыі сучаснай Беларусі, а таксама сённяшняга Глускага раёна?



Бронзавыя ўпрыгожанні і рэчы з курганоў дрыгавічоў: 1, 2, 4, 8, 9,15 — пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы з заходзячымі канцамі; 3, 6,10 — скроневыя кольцы з завіткамі на адным канцы; 7, 14,16, 22 — трохпацеркавыя скроневыя кольцы; 5, 11 — 13, 17 — 21 — зярнёныя пацеркі; 23 — падвеска-конік; 24 — 26 — манетападобныя падвескі; 27, 32 — падковападобныя зашпількі; 28, 31, 33 — пярсцёнкі вітыя; 29 — месяцападобная падвеска; 30 — якарападобная падвеска; 34 — бранзалет; 35 — прасліца (глінянае); 36, 37 — спражкі прамавугольная (36) і ліраподобная (37).

Межы аселасці дрыгавічоў ішлі паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной. Але названыя рэкі, як сведчаць археалагічныя даследаванні, не акрэслівалі дрыгавіцкую тэрыторыю. На ўсходзе яна цягнулася да Дняпра, паўночная мяжа рассялення праходзіла ў сярэдняй частцы Беларусі прыкладна па лініі цяперашніх гарадоў Заслаўе — Лагойск — Барысаў. Тут дрыгавічы перамешваліся з полацкімі крывічамі. Паўднёвая мяжа тэрыторыі дрыгавічоў знаходзілася крыху на поўдзень ад Прыпяці, дзе яны былі суседзямі з драўлянамі. У напрамку на захад мяжа перасякала Заходні Буг, што пацвярджаюць матэрыялы шматгадовых даследаванняў курганных могільнікаў у Сярэднім Пабужжы.

Найбольш распаўсюджана думка, што назва «дрыгавічы», верагодна, паходзіць ад слова «дрыгва» (балота). Таму дрыгавічы — жыхары сырой, балоцістай мясцовасці. Аднак наконт гэтага існуе і іншае меркаванне. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што назва «дрыгавічы» паходзіць не ад слова «дрыгва», якая была характэрнай асаблівасцю мясцовасці, дзе яны асялі, а ад славянскага імя Драгавіт, як радзімічы ад Радзіма, вяцічы ад Вяткі. Гэта тым больш верагодна, што ў візантыйскага гісторыка Канстанціна Багранароднага і ў «Жыціі Дзмітрыя Салунскага» яны выступаюць як «другавіты», «драгувіты» і «дрогувіты».

Як правіла, нашы продкі выбіралі месца для пражывання даволі прадумана і ўзважана: улічваліся прыроднае асяроддзе, наяўнасць рэк і азёр, лясоў, спрыяльны клімат. Гэта абумоўлівалася надзённымі патрэбамі чалавека ў пітной вадзе, ежы, паліве і г.д. Таму і на Глушчыне многія паселішчы цесна звязаны з мясцовай ракой Пціч, якая чалавека і паіла, і карміла.

З летапісу мы даведваемся, што рэлігія дрыгавічоў — язычніцкая. Яны абагаўлялі навакольную прыроду — сонца і месяц, камяні і горы, рэкі і азёры, дрэвы і розныя расліны, «духам» якіх прыносілі ахвяры. Як указвалася вышэй, нябожчыкаў дрыгавічы хавалі ў курганах з папярэдняй крэмацыяй памерлых. У магілу клалі розныя рэчы, якія нібыта маглі спатрэбіцца ў «замагільным жыцці». Гэта былі ўпрыгожанні, зброя, прылады працы і рэчы хат-

няга ўжытку, нават ежа ў гаршках. Паводле вельмі даўніх язычніцкіх вераванняў, агонь быў свяшчэннай ачышчальнай сілай. Яму і аддавалі цела нябожчыка разам з яго рэчамі, спальваючы ўсё на вогнішчы. Так працягвалася да таго часу, пакуль у 988 г. не было прынята хрысціянства і яго абвясцілі афіцыйнай рэлігіяй Кіеўскай Русі.

Ва ўсіх усходніх славян прылады працы, рэчы хатняга ўжытку, зброя былі аднолькавыя. Іншая справа жаночыя ўпрыгожанні.

У розных плямён яны былі розныя.

Распаўсюджаным упрыгожаннем дрыгавічанак з'яўляліся скроневыя кольцы — бронзавыя ці сярэбраныя падвескі. Іх уплятаці ў валасы ці насілі на шнурках каля скроняў. На драцяное скроневае кольца жанчыны надзявалі металічныя буйныя пацеркі — адну, дзве альбо тры. Пацеркі былі зроблены з дроту, зверху яны ўпрыгожваліся зерню — дробнымі напаянымі шарыкамі, выраблены са срэбра і медзі. Такое спалучэнне розных металаў надавала вырабу асаблівую прыгажосць. Зярнёныя пацеркі лічацца характэрнай племянной адзнакай дрыгавічоў. Жанчыны насілі іх разам з маністамі па адной або некалькі штук.

Дрыгавічы належалі да найбольш развітых у сацыяльных адносінах плямён, знаходзіліся на заключнай стадыі распаду родаплемяннога ладу і мелі сваё палітычнае аб'яднанне — «княжанне». Сельскае насельніцтва дрыгавічоў, што пражывала на селішчах у межах Глускага раёна, з'яўлялася неад'емнай часткай спачатку племяннога княжання дрыгавічоў, а з канца X ст. і Тураўскага княства. Самому Глуску папярэднічала невялікае паселішча дрыгавіцкіх насельнікаў, якія і былі яго першазаснавальнікамі.

Яны займаліся земляробствам, агародніцтвам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, а таксама прадзеннем і ткацтвам. Доказам высокага ўзроўню жыцця дрыгавічоў з'яўляецца ўзнікненне і развіццё гарадоў. Археалагічныя раскопкі іх засведчылі высокі ўзровень развіцця жалезаапрацоўчага, ювелірнага, касцярэзнага, гарбарнага, ганчарнага, дрэваапрацоўчага і іншых рамёстваў.

Аб развіцці культуры дрыгавічоў сведчаць манументальнае будаўніцтва, знаходкі высокамастацкіх вырабаў з каляровых металаў, каменю, косці і інш.

Дзе размяшчаўся першапачаткова цэнтр дрыгавічоў, дакладна невядома. Магчыма, гэта быў Тураў, летапісныя звесткі пра які адносяцца да 980 г.

Відаць, Тураў — адзіны горад X ст. на пасяленні дрыгавічоў, і быў племянным цэнтрам самастойнага «княжання». Тут знаходзілася рэзідэнцыя князя, які збіраў даніну з навакольнага насельніцтва. Тут праходзіла племяннае веча, абмяркоўваліся племянныя і судовыя справы, наладжваліся таргі.

У складзе Тураўскага княства

Першым князем раннефеадальнага княства з цэнтрам у Тураве, якое склалася на тэрыторыі рассялення дрыгавічоў у канцы 1-га тысячагоддзя н.э., быў, як сведчыць летапіс, Тур. Затым княжыў Святаполк Акаянны (988 – 1015). Полацкае і Тураўскае княствы сталі першымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Пасля Святаполка Тураўскае княства было ўключана Яраславам Мудрым у склад Кіеўскай Русі. І хоць яно пазбавілася палітычнай самастойнасці, паколькі знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Кіева, аднак у складзе Кіеўскай Русі заставалася цэнтральным княствам, а ў сувязі з актыўнай палітыкай Кіева на захадзе ў XI ст. яно лічылася адным з найважнейшых старажытнарускіх княстваў.

Матэрыялы археалагічных раскопак сведчаць, што Тураўскае княства мела шырокія гандлёвыя сувязі з Кіевам, Паўночным Прычарнамор'ем, Блізкім Усходам, Сярэдняй Азіяй, Прыбалтыкай і Валынню. У 1052 г. княства было аддадзена Ізяславу Яраславічу, а пазней, у 1073 г. перайшло да Усевалада Яраславіча, у 1076 г. — зноў да Ізяслава, а ў 1078 г. — да яго сына Яраполка.

З 1087 да 1113 г. Тураўскім княствам правіў Святаполк Ізяславіч, а затым яно перайшло ва ўладанне да вялікага князя кіеўскага.

Тураўскае княства на поўначы межавала з Полацкай зямлёй, якая мела на гэтай лініі пагранічныя крэпасці — Мінск і Ізяслаўль. З боку Тураўскай зямлі ім супраць-

стаялі такія ж пагранічныя гарады-крэпасці — Клецк і Слуцк. На невялікай адлегласці ад апошняга знаходзіліся землі сучаснай Глушчыны.

У апошні раз дрыгавічы названы ў летапісе пад 1149 г. у сувязі з тым, што «гарады Слуцк, Клецк і ўсе дрыгавічы» часова апынуліся пад уладай чарнігаўскага князя.

У 1158 г. унук Святаслава Ізяславіча Юрый Яраславіч дамогся незалежнасці Тураўскага княства і аднавіў на тураўскім троне дынастыю Ізяславічаў. Пры яго сынах у 2-й палавіне XII ст. Тураўская зямля страціла сваё былое значэнне, яна падзялілася на больш дробныя княствы — Тураўскае, Пінскае, Дубровіцкае, Клецкае, Свіслацкае, Слуцкае і інш.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Працэс драблення быў вызначальным у гэты час не толькі для Турава-Пінскай зямлі. Ён ахапіў усе княствы беларускай тэрыторыі і стаў уласцівым наогул для ўсёй Кіеўскай Русі, эканамічнае і палітычнае становішча якой, пачынаючы з канца XI — пачатку XII ст. адпавядала ўжо ўмовам новага перыяду — феадальнай раздробленасці. Адасобленыя княствы, як адзначаў М.Доўнар-Запольскі, фактычна страцілі характар дзяржавы, ператварыліся ў маёнткі, часам вельмі дробныя. На Беларусі ўзнікла каля 20 удзельных княстваў, якія знаходзіліся ў стане амаль бесперапыннай міжусобнай вайны. Гэта прыводзіла да разбурэння гарадоў і сёл, знішчэння пасеваў, жывёлы. Міжусобіцы цяжарам клаліся на плечы працоўных, вельмі аслаблялі ўдзельныя княствы.

Але не толькі ад феадальных міжусобіц цярпелі землі старажытнай Беларусі. Асабліва небяспечная сітуацыя стварылася для іх у першай чвэрці XIII ст., калі з захаду ўзмацнілася экспансія немцаў-крыжакоў, а з паўднёвага ўсходу навісла страшэнная пагроза мангола-татарскага нашэсця. Дзеянні тых і другіх парушылі існаваўшыя раней сувязі паміж усходнеславянскімі землямі.

Ва ўмовах бязлітаснай барацьбы са знешнімі ворагамі паступова складваўся ваенна-палітычны саюз славян з балцкімі плямёнамі, які стаў асновай для ўтварэння Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Такім чынам, зямля Глушчыны, як і іншыя беларускія землі ў XIV — 1-й палавіне XVI ст., знаходзілася ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Шматлікія ўнутрыпалітычныя супярэчнасці ў краіне стваралі ўмовы для незадаволенасці, хваляванняў, адкрытых бунтаў і змоў, накіраваных супраць вялікага князя.

Так, у 1481 г. некалькі праваслаўных князёў — слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч, Іван Гальшанскі, валадар Глуска, Фёдар Бельскі, стрыечны брат слуцкага князя, і іншыя арганізавалі змову, каб скінуць Казіміра і захапіць уладу ў Вялікім княстве Літоўскім, а ў выпадку няўдачы — перайсці на службу да маскоўскага князя, далучыць частку беларускіх зямель да Маскоўскага вялікага княства. Змова аднак, не ўдалася, некаторыя яе ўдзельнікі былі пакараны смерцю, а князь Бельскі ўцёк у Маскву.

У пачатку XVI ст. становішча застаецца напружаным, нестабільным: тут з новай сілай разгараецца ўнутрыпалітычная барацьба. Па-ранейшаму заставалася нявырашаным так званае «рускае пытанне», звязанае з абмежаваннем у палітычных правах беларускіх, украінскіх і іншых праваслаўных феадалаў. Некаторыя з іх у час войнаў ВКЛ з Маскоўскім княствам нярэдка адкрыта пераходзілі на бок апошняй. Вясной 1507 г. узнімае паўстанне князь Міхаіл Глінскі з братамі Іванам і Васілём. Яно ахапіла значную тэрыторыю княства, галоўным чынам беларускія і ўкраінскія землі.

Міхаіл Глінскі быў тады вядомы

стаялі такія ж пагранічныя гарады-крэпасці — Клецк і Слуцк. На невялікай адлегласці ад апошняга знаходзіліся землі сучаснай Глушчыны.

У апошні раз дрыгавічы названы ў летапісе пад 1149 г. у сувязі з тым, што «гарады Слуцк, Клецк і ўсе дрыгавічы» часова апынуліся пад уладай чарнігаўскага князя.

У 1158 г. унук Святаслава Ізяславіча Юрый Яраславіч дамогся незалежнасці Тураўскага княства і аднавіў на тураўскім троне дынастыю Ізяславічаў. Пры яго сынах у 2-й палавіне XII ст. Тураўская зямля страціла сваё былое значэнне, яна падзялілася на больш дробныя княствы — Тураўскае, Пінскае, Дубровіцкае, Клецкае, Свіслацкае, Слуцкае і інш.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Працэс драблення быў вызначальным у гэты час не толькі для Турава-Пінскай зямлі. Ён ахапіў усе княствы беларускай тэрыторыі і стаў уласцівым наогул для ўсёй Кіеўскай Русі, эканамічнае і палітычнае становішча якой, пачынаючы з канца XI — пачатку XII ст. адпавядала ўжо ўмовам новага перыяду — феадальнай раздробленасці. Адасобленыя княствы, як адзначаў М.Доўнар-Запольскі, фактычна страцілі характар дзяржавы, ператварыліся ў маёнткі, часам вельмі дробныя. На Беларусі ўзнікла каля 20 удзельных княстваў, якія знаходзіліся ў стане амаль бесперапыннай міжусобнай вайны. Гэта прыводзіла да разбурэння гарадоў і сёл, знішчэння пасеваў, жывёлы. Міжусобіцы цяжарам клаліся на плечы працоўных, вельмі аслаблялі ўдзельныя княствы.

Але не толькі ад феадальных міжусобіц цярпелі землі старажытнай Беларусі. Асабліва небяспечная сітуацыя стварылася для іх у першай чвэрці XIII ст., калі з захаду ўзмацнілася экспансія немцаў-крыжакоў, а з паўднёвага ўсходу навісла страшэнная пагроза мангола-татарскага нашэсця. Дзеянні тых і другіх парушылі існаваўшыя раней сувязі паміж усходнеславянскімі землямі.

Ва ўмовах бязлітаснай барацьбы са знешнімі ворагамі паступова складваўся ваенна-палітычны саюз славян з балцкімі плямёнамі, які стаў асновай для ўтварэння Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Такім чынам, зямля Глушчыны, як і іншыя беларускія землі ў XIV — 1-й палавіне XVI ст., знаходзілася ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Шматлікія ўнутрыпалітычныя супярэчнасці ў краіне стваралі ўмовы для незадаволенасці, хваляванняў, адкрытых бунтаў і змоў, накіраваных супраць вялікага князя.

Так, у 1481 г. некалькі праваслаўных князёў — слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч, Іван Гальшанскі, валадар Глуска, Фёдар Бельскі, стрыечны брат слуцкага князя, і іншыя арганізавалі змову, каб скінуць Казіміра і захапіць уладу ў Вялікім княстве Літоўскім, а ў выпадку няўдачы — перайсці на службу да маскоўскага князя, далучыць частку беларускіх зямель да Маскоўскага вялікага княства. Змова аднак, не ўдалася, некаторыя яе ўдзельнікі былі пакараны смерцю, а князь Бельскі ўцёк у Маскву.

У пачатку XVI ст. становішча застаецца напружаным, нестабільным: тут з новай сілай разгараецца ўнутрыпалітычная барацьба. Па-ранейшаму заставалася нявырашаным так званае «рускае пытанне», звязанае з абмежаваннем у палітычных правах беларускіх, украінскіх і іншых праваслаўных феадалаў. Некаторыя з іх у час войнаў ВКЛ з Маскоўскім княствам нярэдка адкрыта пераходзілі на бок апошняй. Вясной 1507 г. узнімае паўстанне князь Міхаіл Глінскі з братамі Іванам і Васілём. Яно ахапіла значную тэрыторыю княства, галоўным чынам беларускія і ўкраінскія землі.

Міхаіл Глінскі быў тады вядомы

дзяржаўны дзеяч і, як адзначае гісторык М.Доўнар-Запольскі, адзін з самых адукаваных людзей свайго часу. Адукацыю ён атрымаў, пабыўшы за мяжой, у еўрапейскіх краінах. У ВКЛ М.Глінскі не толькі займаў высокія дзяржаўныя пасады, але і карыстаўся асабістай дружбай вялікага князя Аляксандра Казіміравіча, да якога быў прыбліжаны. Тады ён практычна быў першай прыдворнай асобай у княстве.

Аднак у 1506 г. пасля смерці Аляксандра М.Глінскі быў адлучаны ад велікакняжацкага двара і трапіў у нямілась да новага гаспадара, што, як лічаць некаторыя гісторыкі, і стала прычынай яго незадаволенасці. Безумоўна, асабістыя крыўды адыгралі сваю ролю. Але прычыны паўстання нельга звесці толькі да гэтага, яны звязаны былі з тымі супярэчнасцямі, якія ўжо даўно існавалі ўнутры пануючага класа ВКЛ.

М.Глінскі добра ведаў настрой праваслаўных феадалаў так званых «рускіх зямель» ВКЛ і спадзяваўся, што яго выступленне будзе падтрымана імі, ды і не толькі імі, але і больш шырокімі слаямі насельніцтва гэтых зямель. Разлічваў ён і на дапамогу з Масквы, з прадстаўнікамі якой уступаў у перагаворы. Для гэтай мэты было выбрана схаванае сярод глухіх лясоў і аддаленае ад бойкіх шляхоў-гасцінцаў мястэчка Глуск. Сюды для сустрэчы з князем Міхаілам Глінскім прыбыў пасланец вялікага князя маскоўскага князь Шыгона-Паджошны.

У пачатку 1508 г. атрады Глінскага падышлі да Бабруйска і штурмам узялі яго, а потым горад заняло маскоўскае войска. Князь М.Глінскі, які знаходзіўся ў Глуску, прыехаў сюды, каб весці перагаворы з маскоўскім ваяводам князем Васілём Іванавічам Шамячычам.

Глінскі, разлічваючы на падтрымку з Масквы, хацеў стварыць асобную дзяржаву з рускіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель, што ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Аднак, нягледзячы на дапамогу 20-тысячнага рускага войска, спроба аддзяліцца ад Вялікага княства Літоўскага не мела поспеху. Глінскі вымушаны быў пакінуць ВКЛ і перайсці на службу да маскоўскага князя.

Ваенныя канфлікты паміж княствамі Літоўскім і Маскоўскім працягваліся па некалькі гадоў. Шмат вёсак, невялікіх мястэчкаў было зруйнавана за гэты перыяд. Усё тое, што было набыта за стагоддзі простым людам, гінула, знішчалася ў агні вайны. А барацьба не спынялася. Войны аднаўляліся ў 1513, 1519, 1534 і 1536 гг. І тыя, і другія, змучаныя змаганнем, пайшлі зноў на згоду, якая цягнулася толькі 35 гадоў.

У баку ад гэтых ваенных канфліктаў не заставалася Глушчына. Новыя выпрабаванні выпалі на яе долю пад час чарговай вайны 1534 — 1537 гг.

Глушчына ў канцы XVI ст.

Дзве маскоўскія арміі дзейнічалі на поўначы Беларусі, іх шлях ляжаў на Вільню, а трэцяя ішла па поўдні Беларусі. Камандаваў ёю ваявода князь Фёдар Васільевіч Целяпнёў — Аўчына-Абаленскі. Як сведчыць расійскі Піскароўскі летапісец, зімой 1534—1535 гг. «воеводы же великого князя князь Фёдор Осчина с товарищи воевали королеву землю: Речицу, Свислач, Горвал, Петров-город, [Петрыкаў], Мозырь, Случеск, Рогачев, Боруеск [Бабруйск], Туров, Брагин, Любоч, и до Новогрудка Литовского и посады у городов жгли и села, жгли и люди и живот, и животину выимали, а иное выжгли и вышли по-здорову» (Материалы по истории СССР. Вып. 2. М., 1955. С. 28—29). Праўда, маскоўскае войска не здабыло ніводнай крэпасці, але неўмацаваныя пасады гарадоў і іх наваколле спустошыла.

У 1564—1566 гг. Віленскі сейм правёў тэрытарыяльную рэформу, паводле якой ліквідаваны вялікія па памерах ваяводствы. Замест іх з'явіліся новыя. Яны ў сваю чаргу падзяліліся на паветы. Усяго на тэрыторыі ВКЛ у XVI ст. было створана 8 ваяводстваў, большасць якіх цалкам або часткова ахоплівала землі Беларусі. Колькасць паветаў даходзіла да 30, 16 з іх знаходзіліся ў межах сучаснай дзяржаўнай тэрыторыі нашай рэспублікі. У склад паветаў уваходзілі воласці. Такі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел праіснаваў да канца XVIII ст.

Згодна з гэтым падзелам тэрыторыя сучаснай Глушчыны аказалася ў складзе некалькіх паветаў і ваяводстваў. Значная частка яе адышла да зноў утворанага Рэчыцкага павета новага Мінскага ваяводства. Некаторыя сёлы і вёскі апынуліся ў Навагрудскім павеце Навагрудскага ваяводства ВКЛ. Сёлы, што мяжуюць з Бабруйшчынай, увайшлі ў Бабруйскае староства Рэчыцкага павета, якое перадавалася буйным феадалам у пажыццёвае кіраванне і валоданне. Яго ўладарамі ў свой час былі прадстаўнікі вядомых магнацкіх родаў Радзівілаў, Гаштольдаў, Глябовічаў, Трызнаў і інш. Тэрыторыя і гарады больш ці менш падрабязна адлюстраваны на дзвюх картах Вялікага княства Літоўскага. Адна з іх складзена ў 90-х гадах XVI ст. і была выдадзена ў Амстэрдаме ў 1613 г. (так званая Радзівілаўская карта, складзеная нясвіжскім картографам Т.Макоўскім), другая выдадзена ў 1665 г. Карты ўтрымліваюць умоўныя абазначэнні, якія паведамляюць аб невялікай частцы найбольш буйных пасяленняў. Глуск пазначаны на абодвух з іх як мястэчка. Яны былі далёка не поўнымі. На карце 1665 г. не пазначаны шэраг гандлёвых і прамысловых мястэчкаў Навагрудскага ваяводства, якія ўпамінаюцца ў падатковых дакументах за 1661 г. Сярод іх і Глуск Пагарэлы.

Удакладняе ўяўленне аб населеных пунктах Глушчыны карта, складзеная нашым сучаснікам гісторыкам М.Ф.Спірыдонавым. На ёй ужо пазначаны такія сёлы, як Даколь, Касарычы, Казловічы, Зелянковічы, Калацічы, якія ў гэты час з'яўляліся найбольш буйнымі пасяленнямі Глушчыны.

На ўзбярэжжы ракі ціхаплыннай

Рака Пціч пачынаецца каля вёскі Нарэйкі, што на Міншчыне, і прабягае да Прыпяці больш за 400 км. На гэтым шляху прытуліла яна да сваіх берагоў нямала сёл, вёсачак і нават невялікія гарадкі тыпу Глуска. Рака паіла, карміла, звязвала са знешнім светам і абараняла ад ворагаў першых пасяленцаў. У далёкія часы тут знайшлі прытулак і нашы прашчуры, якім прыйшліся да спадобы і гэтая ціхая рачная плынь, багатая рыбай, і лясы з іх дзічынай, грыбамі і ягадамі. На правым узвышаным беразе Пічы ўзнікла старажытнае селішча, якое з цягам часу ўсё больш і больш разрасталася. Так нарадзіўся Глуск.

Назва яго, верагодна, з'явілася ў выні-

ку трансфармацыі, змены асновы слоў: глухі, глуш. А магчыма, яна ўзнікла як характарыстыка месца, дзе размясцілася селішча: удалечыні ад гандлёвых і транспартных шляхоў, глухое, далёкае.

Першыя пісьмовыя звесткі пра яго датаваны канцом XIV ст., калі Глуск становіцца вядомым як буйная княжацкая вотчына. Гэта быў час далейшага ўзвышэння Вялікага княства Літоўскага. Глуская воласць лічылася велікакняжацкім уладаннем, і ў 1396 г. яе атрымаў князь Іван Гальшанскі (упамінаецца ў дакументальных крыніцах ў 1379—1401), сын легендарнага Альгімонта Гальшанскага, князя з Навагрудка. Малады Гальшанскі стаў намеснікам князя ў Кіеве. Як вядома, вялікі князь Вітаўт у час свайго княжання (1392—1430), як і яго папярэднік Ягайла, рабіў многа падараванняў для пашырэння прыватнага землеўладання арыстакратыі ВКЛ, і ў першую чаргу сваіх сваякоў і прыбліжаных.

Буйныя феадалы — магнаты былі спадчыннымі ўладальнікамі многіх зямель. Як вядома, князі Гальшанскія былі ў сваяцтве з домам вялікага князя літоўскага Вітаўта, і той падараваў Івану Гальшанскаму вялікія воласці Глуск і Парэчча на р. Пціч, Дубровіцкае княства на р. Гарынь (Украіна). У 1413 г. Глуск разам з іншымі гарадамі быў уключаны Літоўскім сеймам у Навагрудскае ваяводства.

Пазней род князёў Гальшанскіх яшчэ больш умацаваўся. У Віленскім павеце ў розных месцах былі раскіданы маёнткі князёў Гальшанскіх, патомкаў князя Івана Альгімонтавіча. У XV ст. Глуск і Тураў, Мінск і Масты, Вількамір (цяпер г. Укмерге, Літва) і Паставы былі межамі Гальшанскага княства. Род гэты з цягам часу падзяліўся на дзве галіны: князёў Гальшанскіх, у якіх галоўным маёнткам быў замак Гальшаны на р. Гальшанка, якая ўпадае ў прыток Нёмана р. Бярэзіна, і князёў Дубровіцкіх, якія валодалі замкам Дубровіца ў зямлі Валынскай на р. Гарынь. З даравальнай граматы князя Юрыя Сямёнавіча Кіева-Пячэрскаму манастыру бачна, што ім, акрамя таго, належалі воласці Глуская і Парэцкая, пазней гэтыя воласці адышлі сямейству Гаштольдаў. Яшчэ пры каралю Казіміру ў 1486 г. усе «тыя именья, што была правая вотчина князью Андрею Семеновичу» (брата вышэйзгаданага князя Юрыя), а менавіта Даркгішкі, Больнікі і частка Глуска, прысуджаны пані Ганне, жонцы ваяводы трокскага Марціна Гаштольда. З каралеўскага пацвярджэння (21 лістапада 1507) падзелу маёнткаў паміж князем Аляксандрам Юр'евічам Гальшанскім і яго братанічам князем Юрыем Іванавічам Дубровіцкім бачна, што нашчадкам князя Івана Альгімонтавіча, акрамя таго, належалі Мяшалы, Жыцін, Станкава, Рамашава, Залацеева, Гарбачова, Падаляне.

У 1501 г. глускія воласць і «двор» належаць ужо князю Рыгору Іванавічу Юрэвічу. Затым гаспадарамі гэтых мясцін становяцца князі Дубровіцкія. Па прозвішчу аднаго з іх Глуск да сваёй назвы далучыў дадатак «Дубровіцкі», мабыць, для таго, каб адрозніваць яго ад другога аднайменнага населенага пункта, які знаходзіўся вышэй па р. Пціч і называўся Старым Глускам, а пазней Глускам Пагарэлым.

Сын Івана Дубровіцкага (у 1508—1510 ваявода кіеўскі) Юрый Дубровіцкі (каля 1480—1536) заснаваў у сваёй галоўнай вотчыне замак і мястэчка і дабіўся розных прывілей як для сябе, так і для насельніцтва, якое тут пражывала.

Глуск Дубровіцкі агіналі сухапутныя дарогі, якія гістарычна склаліся і ішлі ад чатырох важнейшых пунктаў: Мінска, Мазыра, Пінска і Слуцка. Гэтыя гарады сталі эканамічнымі цэнтрамі вялікіх тэрыторый, паміж якімі ўсталяваліся пастаянныя і ажыўленыя гандлёвыя сувязі. У сферу іх уплыву трапляе і Глуск. Яго добрае месцазнаходжанне дапаўняла р. Пціч. Гэта водная артэрыя, перасякаючы тутэйшыя мясціны з поўначы на поўдзень, жывіла наваколле і служыла асноўным шляхам зносін паміж тымі, хто жыў на гэтай зямлі ці, гаворачы сённяшняй мовай, перасякаў яе транзітам. Усё гэта спрыяла хуткаму развіццю Глуска і ператварэнню яго ў гандлёвы пункт. Захавалася грамата караля Казіміра, дадзеная мінскаму купцу Церашковічу, на права бясплатнага гандлю ў гарадах Вялікага княства Літоўскага, сярод якіх названы і Глуск.

На княжацкі «двор» усё большы ўплыў аказвалі яго сувязі са Слуцкам, які адным з першых беларускіх гарадоў атрымаў магдэбургскае права і славіўся сваімі майстрамі-рамеснікамі, шырокім гандлем. Слуцкі саф'ян, шарсцяныя панчохі і шкарпэткі, прыгожыя медныя пярсцёнкі, разнастайныя шавецкія, металічныя і іншыя вырабы гарадскіх умельцаў трап-

ляюць у Глуск і прадаюцца тут з вялікім поспехам, як і тавары, завезеныя слуцкімі купцамі з суседніх краін.

На невялікай ад Глуска адлегласці (усяго 43 вярсты) знаходзіўся Бабруйск, суседства з якім таксама вельмі станоўча адбілася на далейшым развіцці мястэчка. Пашырэнне сферы таварна-грашовых адносін усё больш і больш уцягвала ў гандаль Глуск і суседнія з ім сёлы.

У 1525 г. вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Жыгімонт II Аўгуст па просьбе жыхароў Глуска даў грамату на правядзенне ў мястэчку кірмаша, што садзейнічала яшчэ большаму яго ўзвышэнню. Глуск рос і развіваўся як эканамічны цэнтр. Паступова тут складвалася мяшчанскае саслоўе.

Кірмашы сталі важным фактарам развіцця рамёстваў і ўнутранага гандлю, уносілі ў яго жыццё вялікае ажыўленне. На перыяд кірмашоў (а яны працягваліся па некалькі дзён) здымаліся ўсе забароны, абмежаванні і паборы ў гандлі.

Крыху больш як праз стагоддзе гісторыя паўтарылася зноў: даравальную грамату кароля Уладзіслава IV атрымлівае новы ўладар Глуска — шляхціц Палубінскі, якому дазвалялася наладжваць штогод кірмаш у яго мястэчку Глуск Дубровіцкі: «... Мы, кароль Уладзіслаў IV, гэтай граматай дазваляем ... наладжваць кірмаш. ... адзін раз у год, перад рускімі запустамі за 2 тыдні да Капыльскага кірмашу. Кірмаш павінен цягнуцца ўвесь тыдзень, бо звычайна купцы, якія накіроўваюцца з розных украінскіх гарадоў на кірмаш у Капыль, з'язджаюцца і спыняюцца ва ўказаным мястэчку...»

Спасылаючыся на гістарычныя крыніцы, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што Глуск заўсёды быў гандлёвым пунктам. У ім кожны тыдзень па нядзелях наладжваліся таксама таргі, што было характэрнай рысай жыцця мястэчка. У лаўках гандлявалі вырабамі ўласнай вытворчасці рамеснікі, сюды прывозілі тавары заезджыя купцы і перакупшчыкі. У іх, у сваю чаргу, набывалі прадметы гандлю асобы, якія развозілі набытыя тавары па сёлах і там імі гандлявалі.

Сяляне суседніх вёсак прывозілі на таргі мёд, сала, марожаную і салёную рыбу, яблыкі, арэхі, пшано, драўняную кару, драўляны посуд, смалу, дзёгаць. Важным прадметам гандлю на ўнутраным рынку служыла збожжа: з яго выраблялася даволі многа алкагольных напіткаў, якімі забяспечвалася мясцовая карчма.

Аднак не заўсёды селянін вёз на кірмаш толькі лішкі, часцей за ўсё ён прадаваў тое, што яму самому было неабходна. Хіба не пра гэта было сказана на Сінодзе адным прапаведнікам: «Самі яны, бедалагі, ядуць мякіну, як свінні, а зерне вымушаны прадаваць для ўплаты чыншу і іншых паборaў». Чынш свайму пану, «на чьем грунте живут», павінны былі плаціць і гараджане, якія займаліся рамесніцтвам і гандлем, а таксама «выполнять услуги, как договорились», г. зн. несці розныя павіннасці па ўтрыманні і ахове замка.

Раз у год — у дзесятую пятніцу пасля Вялікадня — у мястэчку збіраўся кірмаш. Яго адзначалі як вялікае свята, бо звычайна ў гэты дзень адусюль з'язджалася радня, гатаваліся лепшыя стравы. А на рынку прадавалася мноства рознага тавару: жывёла, мяса, скуры, футра, воск, пянька, вырабы сельскага і гарадскога рамяства, прапаноўвалі прыгожыя рэчы заезджыя купцы... Гандаль у Глуску трывала развіваўся і некалькімі стагоддзямі пазней.

Па меры гэтага разрасталася сетка дарог. На поўдні Беларусі праходзіла дарога Слуцк — Глуск — Гомель. Яна мела важнае гандлёвае значэнне. Акрамя таго, было многа мясцовых дарог, якія пралягалі ад мястэчка да сёл і вёсак. Яны звязваліся паміж сабой «шляхамі», «гасцінцамі», «зімнікамі», «летнікамі», г. зн. пастаяннымі і часовымі дарогамі. З ростам таварнага абмену павялічвалася іх колькасць.

Паколькі Глуск з воласцю лічыўся велікакняжацкім уладаннем, ён часта перадаваўся на ўтрыманне розных асоб. У першай палавіне XVI ст. мястэчка памяняла некалькі гаспадароў: пасля князёў Дубровіцкіх Глуск зноў належаў князям Гальшанскім, а з 1551 г. аказаўся ў валоданні самога караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста, якому яго падараваў князь Павел Гальшанскі, біскуп віленскі. Кароль у сваю чаргу дорыць мястэчка князю Яну Хадкевічу з тытулам графа Глускага. У 1561 г. у адпаведнасці з граматай гэтага караля адбыўся падзел Глуска паміж сёстрамі-княгінямі: Кузьмінай (па мужу Заслаўскай) і Аляксандрай (па мужу Палубінскай) Гальшанскімі і дачкой першай сястры Настассяй Юр'еўнай, якая выходзіла замуж за князя Чартарыйскага.

У дамове паміж князямі Заслаўскімі і Настассяй Чартарыйскай аб падзеле маёнтка Глуск ад 20 ліпеня 1571 г. названы некаторыя пабудовы: драўляны замак, які налічваў 34 гародні і 3 вежы (адна глухая, другая з форткай для выхаду з крэпасці, трэцяя — брама з узводам і мостам перад ёй). На замкавым дзядзінцы стаялі 4 свірны, дом на падклецці, з дзвюма святліцамі, каморай і сенцамі, дом з дзвюма святліцамі цераз сенцы і каморай пры адной з іх, склеп. Каля вежы з форткай знаходзілася вялікая святліца без сенцаў.

Замак падзялілі папалам: «...почавши от узводу замковою по половице вежи уездные, в замок, половицу вежи новое, тые две вежи по половице замок делять». Граматай зацвярджаўся сумесны рамонт гародняў, якія стаялі «непокрыты» і сумесна «з ободвух сторон плот поправовати або изнову будовати». Таксама падзялілі замкавую зброю: «...стрельбы замковые и пушки и иншие речи ку замку належачие».

Мястэчка, у якім цэнтральнай вуліцай лічылася Вялікая, у той час таксама мела ўмацаванне і адны вароты — Слуцкую «браму от уезду Слуцкого». Іншых брам дакументы не згадваюць.

У 1551 г. у Глуску налічвалася 124 дамы. Побач з замкам стаялі дом на падклецці, канюшня, свіран, камора, пякарня, кухня, лазня. Магчыма, яны складалі замкавы фальварак. У самім мястэчку на рынку (размяшчаўся каля р. Пціч) знаходзілася карчма і 12 крам.

Які ж выгляд меў рынак знешне? На плошчы, якая ўяўляла сабой замкнуты прамавугольнік, размяшчаліся ларкі, крамы, склады, прылаўкі. З цягам часу месца для лавак на рынку стала не хапаць, і іх пачалі будаваць ужо за межамі плошчы. Унутры прамавугольніка лаўкі ўтваралі прафесійныя рады: шавецкі, мясны, ганчарны, хлебны, рыбны, суконны, шавецкі, кушнерскі і інш.

Падзел рынку на рады быў як бы абавязковым правілам, і яго парушэнне лічылася недапушчальным.

У 1581 г. князі Заслаўскія прадалі Чартарыйскім за 50 тысяч польскіх злотых палавіну Глускага замка, палавіну мястэчка і палавіну воласці.

Тагачасныя гаспадары Глуска князі Юрый Чартарыйскі і Аляксандр Палубінскі, відаць, не вельмі ладзілі адзін з адным. Паміж іх падданымі таксама ўзнікалі розныя спрэчкі. Адна з іх, напрыклад, закончылася судом, калі ў жніўні 1596 г. слугі князя Чартарыйскага разам з баярамі, з глускімі мяшчанамі — чалавек 150 — наехалі ва ўрочышча Ганчароўскае, якое ўваходзіла ў маёнтак князя Палубінскага, і забралі 150 коп аўса, ячменю і іншых зерневых культур. Чатырох слуг князя Палубінскага, якія адстойвалі дабро свайго пана і ўгаворвалі баяр і мяшчан «не рабіць такога бяспраўя і шкоды», людзі князя Чартарыйскага забілі насмерць. Яны ўварваліся ноччу ў сяло Асоўскае, што належала князю Палубінскаму, і, пазбіваўшы замкі з клецей, учынілі грабеж: пазабіралі ў сялян рознае дабро. Князі судзіліся, мірыліся, а цярпелі ад гэтага больш за ўсё сяляне.

Потым Глускам цалкам завалодалі князі Палубінскія ў сувязі з тым, што 4 ліпеня 1626 г. князь М.Ю.Чартарыйскі саступіў сваю частку Глуска і воласці за 50 тысяч польскіх злотых маршалку слонімскаму К.А.Палубінскаму.

Значнае месца ў гаспадарчым жыцці насельніцтва Глуска таго часу адводзілася розным промыслам. Глускія мяшчане займаліся рыбалоўствам, паляваннем, рамізніцтвам, некаторыя мелі млыны. А асноўным заняткам насельніцтва было земляробства. Большасці жыхароў належалі ворныя землі і сенажаці. Занятак гандлем і рамяством таксама спалучаўся з земляробствам і промысламі, бо і гандаль, і рамяство не былі самастойнымі галінамі гаспадаркі.

Насельніцтва паводле сацыяльнага складу і маёмаснага становішча не было аднародным. У Глуску жылі пераважна мяшчане, падданыя феадала, многія з іх паходзілі з сялян. Тут жа пражывалі таксама слугі феадала. Сярод мяшчан былі дастаткова багатыя гандляры, рамеснікі, якія мелі значныя зямельныя ўчасткі. Асноўная ж маса мяшчан — гэта сярэднія і бедныя слаі працоўнага люду.

Крыніцы:

Археографический сборник. Т. 1. Вильно, 1867.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960.

Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1966.

Любавский М.К. Областное деление и местное

управление Литовско-Русского государства по времени издания первого Литовского Статута. М., 1892.

Люты А.М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў канцы XVIII — першай палавіне XIX ст. Мн., 1987.

Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба Минской губернии. Составитель И.Зеленский. СПб., 1864.

Россия. Полное географическое описание. М., 1905.

Ткачоў М. Замкі і людзі. Мн., 1991.

Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии. Мн., 1991.

Дакументы сведчаць

ПАДАРАВАННЕ КНЯЗЕМ ГАЛЬШАНСКІМ КІЕВА-ПЯЧЭРСКАМУ МАНАСТЫРУ СЯЛЯН З ДАНІНАЙ

1396[1]

Мы, князь Юрий Семенович, узрели семо в грамоту деда нашого Ивана Олегимонтовича, нашли есмо, иж тые люди продкове наши и отцы наши придали светой богородици печерской люди на имя Ивинищевичи и с землею и с данью у Глуской волости, давати им мера меду, а рубль грошей литовских.

И мы, по тому месту в то ся не вступили, што наш дед дал светой богородици печерской и поновили есмо сим нашим местом иж не надобе в тым люди вступаться...»

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 92.

ГРАМАТА КАРАЛЯ КАЗІМІРА МІНСКАМУ КУПЦУ ЦЕРАШКОВІЧУ НА ПРАВА БЯСПОШЛІННАГА ГАНДЛЮ Ў ГАРАДАХ ВКЛ

5 мая 1480 г.

Казимир божью милостью.

Князем нашим, и паном, и наместником, и тивуном, и бояром, и мытником, и всим заказником тот наш чоловек, мещанин менский Лука Терешкович, торгуесь нашим дубасом бобруйским троцкое половины и нашими пенязьми; а от того нам прибытку дает. И вы бы от нашего дубаса и от его комяги мыта не брали бы. Есте в Глуску, в Погосте, в Чорторыску, у Куликовичох, в Чет, в Ертни, в Луцку, у Вострозе, в Степани, в Дубровицы, в Городку, у Турове, у Паустьи, в Пинску, в Берестьи, в Дорогичине, в Камянцы, в Слониме, в Ковне, в Новегородцы Литовском, в Менску, в Смоленску, в Орши, в Могилеве, в Рогачеве, в Лучине, в Стрешине, в Речицы, Гомьи, в Чичерску, в Проростку, в Кричове, в Мстиславли, в Дорогобужи, у Вязме, в Новегородцы Северском, в Радогощи, в Трубецку, в Брянску, в Стародубе, в Чернигове, у Вышегороде, в Киеве, в Путивли, в Черкасех, в Житомири, в Чуднове, во в Уречьем, в Чорнобыли, в Мозыри, в Нозове, в Любочи, в Грезску, по всим нашим мытом, и по князским, и по панским, и по боярским, сухим и водою. А который бы хотели через наш лист силу ему чинити, а мыто взяти от нашего дубаса и от его комяг, тот нам великую вину заплатить.

Писан у Вильни мая 5 день, индикт 6.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 261.

ГРАМАТА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА І КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА КНЯЗЮ ЮРЫЮ ДУБРОВІЦКАМУ АБ ЗАСНАВАННІ ГОРАДА ГЛУСКА

20 снежня 1522 г.

Жикгимонт божю млстю король польский великий князь Литовский руский княжа пруское жемойтский и иных.

Бил нам чолом князь Юрий Иванович Дубровицкий и поведал перед нами штож он збудовал собе у выймени своем замок у Глуску и просил в нас абыхмо ему дозволили там место садити и торг и корчмы мети... Што мы з ласки нашое на его чоломбите то вчинили иж мает там при замку его глуском место садити и торг и корчмы мети... И на то есмо ему дали сес нам лист з нашоюе печатью. Писан у Ломазе под леты божею нароженя 1522 мца декабря 20.

Хрестоматия по истории БССР. Мн., 1976. Ч. 1. С. 14.

[1]Из текста не видно, отчего такая дата. Сам текст не датирован. Юрий Гольшанский просто повторил решение своего деда, которое могло быть действительно датировано 1396 годом, но могло и не быть.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У 1569 г. Глушчына апынулася ў складзе Рэчы Паспалітай. Ледзь толькі быў падпісаны акт аб Люблінскай уніі 1569 г., як сейм зацвердзіў «паборавы універсал», які значна пабольшыў падаткі. Праз 20 гадоў стаўкі падатку з дамоў мяшчан Глуска і з іх рамеснай дзейнасці павялічыліся ў 1,5 — 2 разы. Падатковыя паборы сталі непамерныя, што нават у феадалаў выклікала абурэнне і пратэст.

Палітычны саюз з польскімі магнатамі літоўскія і беларускія феадалы выкарыстоўвалі для таго, каб узмацніць эксплуатацыю сялянства. Калі становішча польскага селяніна, прыгнечанага прыгоннай няволяй было вельмі цяжкае, то жыццё сялян у ВКЛ было яшчэ горшае. Апрача цяжкіх феадальных павіннасцей, яны былі абавязаны на працягу 53 дзён утрымліваць на свой кошт пагранічныя гарнізоны (крэпасці) супраць Масковіі.

З 2-й палавіны XVI ст. на Беларусі праводзіцца зямельная рэформа — валочная памера, у ходзе якой паступова знішчалася сялянская абшчынная ўласнасць на зямлю і ў той жа час значна пашыралася феадальнае землеўладанне, якое ажыццяўлялася за кошт арганізацыі так званых фальварковапаншчынных гаспадарак на тэрыторыі маёнткаў. Рэформа актывізавалася з прыняццем у 1557 г. «Уставы на валокі».

Асновай рэформы з'яўлялася павелічэнне сялянскіх павіннасцей і уніфікацыя сялянскага надзелу, рост даходаў дзяржавы за кошт упарадкавання падатковага абкладання насельніцтва. Пераход да фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання ў цэлым працягваўся больш за 100 гадоў.

Паўсюдна праводзіліся суцэльны абмер усіх зямель, разбіўка іх на валокі — участкі памерам у 21,36 га (да 1917 г. — 20 дзесяцін).

Адным з самых важных мерапрыемстваў валочнай памеры была ліквідацыя цераспалосіцы, калі сярод дзяржаўных знаходзіліся землі магнатаў, шляхты, духавенства і, наадварот, сярод земляў магнатаў былі дзяржаўныя. Пры перамеры дзяржаўных уладанняў усе прыватныя землі адбіраліся, а ўласнікам давалі ўзамен надзелы дзе-небудзь па-за межамі дзяржаўных. Такая замена была магчыма толькі пасля таго, як велікакняжацкія рэвізоры ўпэўніваліся, што ўласнік меў адпаведныя дакументы на валоданне зямлёй. Хто не мог іх прад'явіць, траціў уладанне: землі проста адбіралі ў дзяржаўную казну. Рэвізорамі, як правіла, прызначаліся асобы з вядомых магнацкіх ці шляхетных родаў (напрыклад, Радзівіл, Сапега). Апошнія правяралі дзейнасць мернікаў, назіралі, каб месцы для пабудовы новых вёсак выбіраліся ў адпаведнасці з Уставай, давалі абмены, вызначалі месцы, дзе павінны былі ўтварацца новыя фальваркі, кантралявалі дзейнасць мясцовай адміністрацыі і г.д. Таму, калі праводзілася памера, то, зразумела, самыя лепшыя землі часта адбіраліся ў сялян і адводзіліся пад фальваркі. Так утвараліся буйное феадальнае землеўладанне. Магнаты скуплялі зямлю ў дробнай шляхты і прадстаўнікоў старой знаці, а нярэдка і захоплівалі яе сілай. Да буйных феадалаў Беларусі адносіліся і ўладальнікі Глуска Гальшанскія, Заслаўскія, Чартарыйскія, Радзівілы і іншыя.

На тэрыторыі тагачаснай Глушчыны было некалькі маёнткаў, якія разам з землямі і людзьмі належалі праваслаўнай царкве, а менавіта — Кіева-Пячэрскаму манастыру. Неаднойчы адбываліся захопы гэтых зямель пад выглядам правядзення валочнай памеры ўладальнікам Глуска князем Аляксандрам Палубінскім.

Так, у 1592 г. князь Аляксандр Палубінскі, сабраўшы да 500 чалавек уз-

броеных слуг, «наехал в урочище Липники и Выжери, принадлежащие монастырю, выгнал оттуда монастырских крестьян, отнял у них волов, топоры, сермяги и пр. и присоединил эти урочища к своему имению — замку Глуску Дубровицкому, изменив бывшую «спокон веку» границу» (Киевский митрополит Петр Могила и его сподвижники. Опыт исторического исследования С.Голубева. Киев, 1883. Т. 1. С. 75).

Супраць княжацкага захопу справу ў судзе ўзбудзіў кіева-пячэрскі архімандрыт Нікіфар Тур, але рашэнне яе зацягнулася надоўга.

На дзяржаўных землях была праведзена палавінчатая рэформа — павялічваліся грашовыя выплаты сялян і дакладна вызначаліся натуральныя паборы, ураўноўваліся зямельныя ўчасткі, устанаўлівалася плата і павіннасць за іх. Пакідаючы плацяжы насельніцтва «па старыне», урад змяніў адзінку падатковага абкладання: цяпер феадальныя павіннасці браліся не са службы (надзел ворнай зямлі плошчай у 1 валоку), а з дыма — сялянскага двара. Аднак у 1-й палавіне XVI ст. валочная памера ўвогуле не адбылася не толькі ва ўладаннях многіх дробных і сярэдніх феадалаў, але і ў некаторых магнацкіх вотчынах. Так, да 1597 г. «на службах» сядзелі сяляне маёнтка Глуск.

Працягвалі выкарыстоўвацца і старыя, хоць і не зусім дакладныя, але апрабаваныя і даволі танныя ў рэалізацыі метады, якія не заўсёды суправаджаліся перамерамі зямлі на валокі. Цікавасць у гэтым сэнсе выклікаюць звесткі, змешчаныя ў двух інвентарах маёнтка Глуск. Першы — інвентар часткі Глускага маёнтка, складзены ў 1571 г. Ён належаў княгіні Заслаўскай разам з вёскамі Восава, Карытна, Замошша, Мінкавічы, Сымонавічы, Пагост, Сяльцы, Рудаковічы, Дварэц, Ясень, Балашэвічы, Рыгаў. Сялянская зямля ў гэтым інвентары вызначана ў бочках высеянага збожжа, сенакосы — у вазах сена. Гэтыя паказчыкі дакладна прыведзены для кожнай сялянскай гаспадаркі разам з пералікам дарослых сыноў, а таксама жывёлы, валоў і коней у ёй. Тут жа пазначаны памеры феадальнай рэнты (даніна і чынш), якія знаходзіліся ў залежнасці ад колькасці зямлі і сенакосаў у дыме, а таксама забяспечанасці сялянскіх гаспадарак цяглавай жывёлай.

Інвентар часткі маёнтка Глуск Пагарэлы, якая належала Аляксандру Палубінскаму, складзены ў 1597 г., адлюстроўвае іншае становішча. Зямля ў вёсках Залессе, Заполле, Няводнікі і фальварках, якія адносіліся да гэтага маёнтка, таксама не перамерана на валокі. Сялянскія надзелы пазначаны ў службах, памеры якіх не вызначаны. Як налічваліся павіннасці, таксама невядома. Гэтыя два прыклады, што паказваюць становішча па сутнасці суседніх вёсак, даюць магчымасць зафіксаваць як розныя формы гаспадарання (чынш і даніна дакладных памераў у першым выпадку, фальварак і паншчына без дакладнага ўліку сялянскай зямлі ў другім), так і розныя спосабы вызначэння велічыні надзелаў сялян.

І ўсё ж многія землеўладальнікі заходняй і цэнтральнай частак Беларусі да сярэдзіны XVII ст. следам за вялікім князем і магнатамі правялі ў сваіх маёнтках валочную памеру. Большасць інвентароў паказвае, што вымярэнне зямлі ў прыватных уладаннях звычайна суправаджалася стварэннем ці павелічэннем фальваркаў.

Валочная памера ўнесла значныя змены і пакінула вялікі след у жыцці Беларусі на цэлыя стагоддзі. Прыбыткі вялікага князя ўзраслі, дзяржава атрымала пэўныя звесткі аб сваіх землях, а становішча сялян значна пагоршылася. Памера замацоўвала сялян на месцы і вяла да далейшага росту павіннасцей у самай цяжкай форме — паншчыны, яна ў значнай ступені разбурала грамадскае землекарыстанне і ўво-

дзіла падворнае. Планаванне сялянскіх сядзіб і вёсак на цэлыя стагоддзі засталося такім, як гэта вызначыла Устава 1557 г. Да 1917 г. колькасць зямлі на Беларусі вылічвалася ў валоках і маргах, хаця афіцыйнай мерай была дзесяціна.

Сяляне аказвалі доўгае і ўпартае супраціўленне правядзенню валочнай памеры. У прыватнасці, у вёсках Казловічы і Зелянковічы, якія ўваходзілі ў Бабруйскае староства, у 1611 г. знішчаліся межавыя знакі. Улады былі вымушаны праводзіць тут валочную памеру паўторна з 1611 да 1639 г.

Незадаволенасць узмацненнем феадальнага прыгнёту паступова пачынае прымаць масавы характар. У 1595 г. успыхнула буйное антыфеадальнае казацка-сялянскае паўстанне, якое ўзначаліў Севярын Налівайка. Яно пачалося на Украіне, а потым перакінулася на Беларусь: уся тэрыторыя паміж Оршай і Мазыром была ахоплена паўстаннем. Атрады пад кіраўніцтвам С.Налівайкі, заняўшы у канцы кастрычніка Петрыкаў, сталі рухацца да Слуцка. Пасля трохдзённага штурму магутных замкавых умацаванняў горад быў узяты. Тут да паўстанцаў далучыліся сяляне, гарадская беднота і дробныя служылыя людзі. Паўстанне распаўсюдзілася на наваколле Слуцка.

Казацкія раз'езды разам з сялянамі грамілі ў ваколіцах Слуцка магнацкія і шляхецкія маёнткі. Крыштоф Радзівіл, гетман Вялікага княства Літоўскага, пачаў спешна сцягваць войскі да раёна паўстання.

Атрад Шавулы, паплечніка Налівайкі, у гэты час захапіў Глуск, Бабруйск, Свіслач, Ігумен. Далейшае знаходжанне ў Слуцку стала для паўстанцаў небяспечным, бо шляхецкія харугвы на чале з Радзівілам імкліва рухаліся да Клецка, Мінска, Оршы. Вечарам 27 лістапада атрад Налівайкі пакінуў горад. Затым паўстанцы накіраваліся да Бабруйска. Налівайка выводзіў атрад з-пад магчымага ўдару шляхецкага войска. Не дайшоўшы да Бабруйска, яны павярнулі на паўночны ўсход, да Магілёва. Бясспрэчна, што адсюль яны разлічвалі пайсці ў Расію.

13 снежня атрад Налівайкі, які да гэтага часу павялічыўся да 2 тысяч чалавек, параўнальна лёгка авалодаў Магілёвам.

Пасля бітвы з войскамі Радзівіла на Буйніцкім полі каля Магілёва Налівайка пакінуў гэты раён, пачаргова займаючы на шляху руху Рагачоў, Рэчыцу, Петрыкаў, Тураў, Пінск. Знаходжанне яго ў гэтых мясцінах суправаджалася выступленнем беларускага сялянства. Сяляне аказвалі паўстанцам усебаковую дапамогу: перапраўлялі артылерыю цераз рэкі і балоты, рыхтавалі гаці і пераправы. Вясной 1596 г. Налівайка з атрадам пайшоў на Валынь. У выніку здрады кіруючай вярхушкі рэестравага казацтва Налівайка ў ліпені 1596 г. быў выдадзены палякам і пасля катаванняў пакараны смерцю ў Варшаве.

Народны рух на чале з Налівайкам нанёс мацнейшы ўдар па прыгоннай сістэме Рэчы Паспалітай. Ён ахапіў значную частку Беларусі і амаль усю Украіну. Было б няправільным уяўляць раён паўстання ў Беларусі як вузкую паласу маршруту паўстанцаў. Казацкія раз'езды сумесна з беларускімі сялянамі грамілі магнацкія і шляхецкія маёнткі, якія знаходзіліся на значнай адлегласці ад галоўных сіл паўстанцаў.

Уцягваліся ў антыфеадальную барацьбу і сяляне тых раёнаў, куды казакі не прыходзілі. Гэтыя факты даюць падставы меркаваць, што раз'езды Налівайкі маглі пабываць і на тэрыторыі Глушчыны, асабліва ў сёлах, якія знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці да Бабруйска ці Слуцка, што ў антыфеадальнай барацьбе ў той час маглі прымаць удзел і жыхары гэтага краю.

Пасля падаўлення паўстання Севярына Налівайкі казацкія атрады працягвалі паяўляцца на Беларусі, і нават

у Глуску. Аб гэтым сведчыць наступны факт. У лістападзе 1616 г. праз Глуск у напрамку Смаленска ішоў чарговы вялікі атрад «людзей рыцарскіх, шляхты, абывацелей розных паветаў Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага, на паслузе яго каралеўскае міласці і Рэчы Паспалітай будучыя». Узначальваў атрад каралеўскі ротмістр Яраш Сянкевіч. Глускія баяры і мяшчане з часткай казакоў, якія знаходзіліся тут (усяго каля 200 чалавек), «збунтаваўшыся, — як пісаў польскі ротмістр, — супраць зверхнасці яго каралеўскай міласці і Рэчы Паспалітнай», вырашылі не прапусціць далей гэты атрад і зрабілі засаду каля Глуска. Калі польскія жаўнеры праходзілі паўз мястэчка і «ўзышлі на грэблю, з-за яе ўдарылі, пастралялі пахопнікаў і паразбівалі вазы...» (Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 441—442).

Ротмістр Яраш Сянкевіч скардзіўся ў суд, што глускія мяшчане «пана Яна Шумскага падстрэліўшы... а потым яго замардаваўшы, цела ўтапілі». Шляхціца Юрыя Грушэўскага «забілі і цела, несць вядома, дзе задзелі і іншых слуг ротмістраўскіх» многіх перабілі. Дасталося пры гэтым і самому ротмістру: прапала яго шкатулка, у якой было «адзінаццаць сот злотых», ды і сама шкатулка каштавала шэсцьдзесят злотых.

За «бунт», за знявагу яго каралеўскай міласці, — як гаварылася ў асэсарскай пастанове, — многіх жыхароў мястэчка падверглі зверскім катаванням. Галоўных зачыншчыкаў — «Васіля Кандратовіча, Івана Капшовіча, Саву Рабковіча, Майсея Груду» ў Глуску білі дубцамі каля слупа, а двух глускіх мяшчан Рыгора Струся і Тышку Ахрамовіча пакаралі смерцю.

Люблінская унія 1569 г. садзейнічала пашырэнню польскага ўплыву на Беларусі. Праўда, ён існаваў і раней, але цяпер для гэтага ўплыву не было ніякіх перашкод.

Пачынаецца ганенне на праваслаўную веру, а ў Польшчы шырыцца рэфармацыйны рух езуіцтва. Становіцца зразумелым, што за Люблінскай уніяй павінна была з'явіцца і унія царкоўная.

І ў 1596 г. адбылася Брэсцкая унія, якая абвясціла аб злучэнні цэркваў — каталіцкай і праваслаўнай. Значная частка вернікаў была супраць уніяцтва, часцей гэта былі праваслаўныя, паколькі каталіцтва захавала права на заняцце вышэйшых урадавых пасад.

Рэлігійныя супярэчнасці закранулі таксама і Глушчыну. Старажытная праваслаўная Богаяўленская царква, якая існавала ў мястэчку з XVI ст., стала уніяцкай.

Уладальнік Глуска Канстанцін Палубінскі ў 1628 г. пісаў, напрыклад, што ў горадзе часта бывалі «бунты і разрухі», бо ён хацеў «просьбою и грозбою привести их до унии». Далей ён прызнаваўся: «А не могучи их до того протянуть позволяю им церковь одну... и от того часу обещаю им жадное перешкоды в том не чинить». У гэты ж час адзін з ватыканскіх дзеячаў прызнаваўся: «Няма ніякай надзеі, што гэтыя гордыя і ўпартыя людзі (беларусы) калі-небудзь масава пяройдуць у унію».

У тым жа 1628 г. у Глуску была пабудавана новая праваслаўная царква, а ў 1667 г. — касцёл і кляштар бернардзінцаў. За апошнім замацоўвалася каля дзесятка сёл, жыхары якіх павінны былі плаціць манахам падатак: хлеб, мёд, курэй, гусей, грыбы, вырабы з палатна.

Значная частка шляхты ВКЛ, арыентуючыся на польскую і не жадаючы адстаць ад яе, прыняла каталіцтва і паланізавалася. Пры гэтым былі перанятыя і элементы польскай шляхетнай культуры, лад жыцця, мова, ідэалы.

Ва ўмовах гвалтоўнага навязвання унія выклікала шырокі народны пратэст.

Глускі замак

На ўсходняй ускраіне гістарычнай часткі Глуска захавалася замчышча. Яно прымыкае да старыцы р. Пціч з паўночна-ўсходняга боку, а з супрацьлеглага пады-ходзіць да гарадскога цэнтра. Замчышча плошчай 41 750 м² мае форму пяціканцовай зоркі. Пляцоўка калісьці была абнесена высокімі валамі і абкружана глыбокімі равамі. Валы і бастыёны фрагментарна захаваліся да сённяшняга дня. Мураваныя і драўляныя пабудовы рознага прызначэння, якія існавалі ў замку на працягу 300-гадовай яго гісторыі, не захаваліся. Уезд на тэрыторыю замчышча знаходзіцца прыкладна на тым самым месцы, што і ў даўнія часы — з боку цэнтральнай плошчы і парка. З замчышчам звязаны шматлікія легенды аб падземных хадах.

Глускі замак, хоць і не адносіцца да добра даследаваных помнікаў даўніны, усё ж не абдзелены ўвагай даследчыкаў. Найбольш істотны ўклад у справу вывучэння гісторыі замка зроблены выдатным беларускім гісторыкам і археолагам М.А.Ткачовым. Яму ўдалося адшукаць нямала пісьмовых дакументаў, якія дапамагаюць адказаць на пытанні, як выглядаў замак у розныя часы, як было наладжана яго жыццё і падтрымліваўся парадак, хто валодаў замкам, жыў і працаваў там. Цікавыя архіўныя звесткі знаходзім у працах гісторыка архітэктуры Ю.А.Якімовіча. Археалагічныя даследаванні помніка пачаты ў 1988 г. Г.М.Сагановічам, працягнуты раскопкі з 1996 г. І.У.Ганецкай.



План-схема глускіх умацаванняў: 1 — замак, 2 — горад.

Рэшткі вала і бастыёна замка.

Энцыклапедыя сведчыць

ГЛУСКІ ЗАМАК. Існаваў у XVI—XVIII ст. у Глуску Дубровіцкім. Займаў узвышаную частку правага берага р. Пціч на месцы гарадзішча эпохі ранняга жалезнага веку і Кіеўскай Русі. Як велікакняжацкі «двор» Глуск вядомы з XIV ст. У XV ст. ён належаў кн. Гальшанскім. У 1501 г. глускія «добра» і «двор» перайшлі кн. Рыгору Іванавічу Юрэвічу, потым князям Дубровіцкім, пасля зноў Гальшанскім, якія ў 1551 г. падаравалі глускія ўладанні каралю Жыгімонту II Аўгусту. Пазней Глускі «замочек... с местом и волостью...» пераходзіў па чарзе то да Гальшанскіх, то да Чартарыйскіх, якія ўрэшце парадніліся. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, у XVI ст. замак меў земляны абарончы вал з драўлянымі сценамі-гароднямі і бланкаваннем, 2 драўляныя вежы, уязную вежу-браму з пад'ёмным мостам — «узводам» і малой брамкай-«форткай», якая вяла да Пцічы. У цэйхгаузе замка знаходзіліся «стрельбы замковые и пушки и иншые речи ку замку належачие». Паводле граматы 1571 г., там былі жалезныя гармата, гакаўніцы, ручніцы, вялікія коп'і-рагаціны, даспехі — «зброи бляховые», шлемы-капалыны, порах, сера, салетра і інш. Да 1581 г. замкам і ўсім ваенным рыштункам валодалі князі Заслаўскія і Чартарыйскія. Потым Заслаўскія сваю «половицу замку Глуского и места Глуского и половину усее волости Глуское» прадалі Чартарыйскім за 50 тыс. злотых. 4.6.1626 г. князь М.Ю.Чартарыйскі прадаў частку гэтых уладанняў маршалку слонімскаму К.А.Палубінскаму. У канцы XVII—XVIII ст. замак належаў Радзівілам. На мяжы XVI—XVII ст. на месцы старога драўлянага ўзведзены новы 5-бастыённы замак, апяразаны глыбокім і шырокім ровам, які жывіўся водамі Пцічы. Насыпаныя з гліны і культурнага пласта валы-курціны і бастыёны ўзвышаліся на 5—7 м над замкавым дваром. Унутры земляных валоў ішоў скляпеністы каменна-цагляны падземны ход. Па ім з бастыёна на бастыён пераходзілі ў час абстрэлу і аблогі стралкі. З замка вёў да Пцічы 2-і падземны ход, які вырашаў праблему водазабеспячэння ў перыяд аблогі. Замкавая брама размяшчалася бліжэй да наружнага бастыёна, адкуль фланкіраваліся подступы да яе. Падвойныя створкі варот брамы былі акаваны жалезнымі палосамі. Зверху на ланцугах калаўротам спускалася засцерагальная дубовая герса, акаваная жалезам. Замкавая брама мела выгляд 3-ярусной мураванай вежы. Ніз займала праезная частка, тут жа былі 2 скляпы з дзвярамі ў выглядзе драўляных кратаў. Справа да брамы прымыкаў корпус гарнізоннай казармы, злева знаходзілася «кардыгарда». У сценах кардыгарды размяшчаліся байніцы для кругавога абстрэлу. На 2-м ярусе вежы было 4, на 3-м — 3 акны-байніцы. Вакол ішла баявая галерэя-памост. Завяршалася брама купалам з «баняй» і бляшаным флюгерам-харугвачкай. На замкавым двары размяшчаліся розныя пабудовы, у т.л. цэйхгауз «прускага муру» (фахверкавай канструкцыі), студня, кухня, стайня і сажалкі, дзе гадавалася рыба. У XVII ст. тут пабудаваны касцёл. У дакументах канца XVII ст. упамінаецца яшчэ адна замкавая брама — «Водная». Яна мела 2 паверхі і, відаць, знаходзілася ў адной са звернутых у бок Пцічы курцін. Трапіць у замак можна было па доўгім мосце з некалькімі пад'ёмнымі секцыямі-«ўзводамі». Доступ на мост запірала бервяно-«кабыліна», была і спецыяльная будка-«вартоўня».

На сярэдзіне моста знаходзілася прамежкавая брамка з 2 уваходнымі «фортамі».

У XVI—XVIII ст. Глускі замак лічыўся магутнай цытадэллю. У мірны і асабліва ў ваенны час тут знаходзіўся спецыяльны гарнізон, які складаўся ў асноўным з мясцовых жыхароў. Паводле інвентара 1692 г., у замку быў пастаянны гарнізон з 21 «жаўнера». Згадваюцца таксама «генерал» Аградзінскі, падхарунжы Скіндзер, барабаншчык, 3 пушкары — «Каза-пушкар, Стафан-пушкар, Абрам Навіцкі-пушкар». Сярод рамеснікаў замка людзі розных прафесій: «кавалі Сямён, Верамей, Іван, муляр Апанас Сяструх, Раман-руднік, маляр Якуб, рымар Даніла, Ян Тарасевіч-злотнік, катляры Навум, Васька і два Яны, Севярын Тарасевіч-злотнік, слесар Піліп, зегармістр Грышка, сталяр Лявон, шабельнік Якуб». Яны цалкам забяспечвалі надзённыя ваенна-тэхнічныя патрэбы замка. У 1708 г. Глускі замак ахоўвалі выбранцы — наёмныя салдаты, якіх набіралі з глускіх мяшчан, а таксама з вольных людзей, сялян Кольчыцкага войтаўства, дробнай шляхты. Днём выбранцы працавалі па

дамах, з'яўляліся ў замку ў выпадку ваеннай небяспекі. Несці варту ў замку рэгулярна пасылалі 4 вартаўнікоў з сялян Балашоўскай воласці. Воласць да таго ж насыпала «грэблю» пад замкам, вазіла дровы і лес, неабходныя для будаўніцтва, рамонту і ацяплення. Ваенна-рамонтныя работы сяляне праводзілі ў 2 этапы: з 2 красавіка да канца чэрвеня на працягу 12 тыдняў і восенню з 1 верасня да канца лістапада. Доглядам і рамонтам фартыфікацыі распараджаўся спецыяльны гараднічы. Для гэтага і на ўтрыманне гарнізона замка трацілася 600 злотых, з іх 500 давалі мяшчане. З XVI ст. пад аховай замка пачаў разрастацца і г. Глуск, вакол яго таксама з'явіліся драўляна-земляныя ўмацаванні. Гістарычныя крыніцы згадваюць адну браму — «брону от уезда Слуцкого», якая адчыняла шлях на цэнтральную вуліцу «места» — вуліцу Вялікую. У XVII—XVIII ст. планавая кампазіцыя гарадскіх умацаванняў не змянілася. Дакументы гэтага часу раскрываюць структуру ваеннай арганізацыі і павіннасцей гараджан. Усё мужчынскае насельніцтва аб'ядноўвалася ў 4 баявыя сотні на чале з сотнікамі. Старшым і «радцаю» над імі быў спецыяльны «палкоўнік». Кожная сотня падраздзялялася на 10 дзесяткаў на чале з дзесятнікамі. Сотня і дзесятка неабавязкова налічвала 100 ці 10 чалавек. Дзесяткі лічыліся не толькі ваеннай, але і пажарнай адзінкай. Усе жыхары Глуска тройчы ў год разам са сваімі старшымі абранымі праводзілі паводле загаду «попіс» са зброяй. Абавязкамі глускіх мяшчан з'яўляліся начная варта ў гарадской браме і на рынку, насыпанне і рамонт замкавай грэблі і мастоў у горадзе і каля яго. Геаграфічнае размяшчэнне замка надавала яму ранг важнага стратэгічнага пункта на шляху загонаў крымскіх татар у XVI ст., потым ён выконваў ролю цытадэлі супраць казацкіх паходаў з Украіны ў канцы XVI—XVII ст. У 1648 г. Глуск апынуўся ў гушчыні падзей антыфеадальнай барацьбы на Украіне і Беларусі. У кастрычніку 1648 г. яго занялі паўстаўшыя беларускія сяляне і ўкраінскія казакі, якія потым рушылі на Бабруйск. Глуск і замак моцна пацярпелі тады і ад праходу войска Рэчы Паспалітай, а таксама ў вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. У 1655 г. сейм Рэчы Паспалітай, улічваючы страты, нанесеныя гораду і яго войску на працягу «казацкай вайны» і ў сувязі з новымі ваеннымі падзеямі, ад якіх Глуск «агнём і мечам датла разбуран», вызваліў яго ад экстраардынарных падаткаў на 10 гадоў. Глускі замак праіснаваў да канца XVIII ст., пасля прыйшоў у заняпад. У 1988 г. у ходзе земляных работ на тэрыторыі замка археолагам Г.М.Сагановічам выяўлены кераміка жалезнага веку (фрагменты ляпных гаршкоў), кафля і гаршкі XVI ст., посуд і геральдычная кафля XVII ст., рэчы побыту XVII—XVIII ст., а таксама мураваныя сутарэнні.

М.А.Ткачоў.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С.174—175.

Замак на Пцічы

У выніку археалагічных раскопак і архіўных пошукаў устаноўлена, што Глускі замак існуе з XVI ст.

Выяўленыя пісьмовыя звесткі, дзе згадваецца замак, датуюцца толькі 2-й палавінай XVI ст. У XVI ст. сістэма ўмацаванняў замка была тыповай для драўлянай фартэцыі таго часу. Асноўную ролю ў абароне адыгрывалі гародні[1] і вежы, якія закрывалі сабой замкавую пляцоўку. У выяўленай Ю.Якімовічам дамове паміж князямі Заслаўскімі і Н.Чартарыйскай аб падзеле маёнтка Глуск, якая датуецца 20 ліпеня 1571 г., гаворыцца, што паміж гароднямі стаялі тры абарончыя вежы. Адна глухая, другая мела невялікую брамку — «фортку» для выхаду за фартэцыі да ракі, трэцяя — брама з «узводам» (пад'ёмным мостам).

Пералічваецца ў дакуменце таксама зброя: «дело [дзела — гармата] железное с зелезником, гаковниц [ручная агнястрэльная зброя са спецыяльна прыстасаваным крукам у ніжняй частцы ствала] три, ручниц две, зброй [камплект металічных даспехаў] бляховых две, капалыны два, рогатин [колючая зброя ў выглядзе вялікага

[1]Гародні — прамавугольныя зрубы, запоўненыя зямлёй і камянямі, пастаўленыя тарцамі адзін да аднаго па перыметры замкавай пляцоўкі. На версе гародняў месціліся баявыя галерэі, пакрытыя дахам з гонты і дранкі.

цяжкага кап'я з пяром не менш за 40 см] две, порохи, селитру, серу — то по половине разделили». На дзядзінцы стаялі два вялікія дамы, кожны з дзвюма святліцамі, сенцамі і каморай. Адзін з гэтых будынкаў быў на падклецці, другі меў падвал. Трэцяе жылое памяшканне знаходзілася каля вежы з брамкай — вялікая святліца без сенцаў.

Згадваюцца ў грамаце таксама гаспадарчыя пабудовы — чатыры свірны: вялікі каля сцяны, два каля брамы, адзін «ля сцяны пад стаўбою». Абслугоўваў замак фальварак, што размяшчаўся паблізу: дом на падклецці, стайня, свіран, камора, пякарня, кухня, лазня.

Самыя значныя падзеі ў жыцці Глускага замка адбываліся ў XVII ст. І парадаксальна, што менавіта за гэты перыяд сярод надрукаваных матэрыялаў амаль не сустракаецца пісьмовых крыніц.

У XVII ст. праведзена рэканструкцыя замка, у выніку якой была цалкам зменена сістэма фартыфікацыі. Але калі тое адбылося: у пачатку XVII ст., як лічыць М.А.Ткачоў, ці пазней? Паколькі маўчаць пісьмовыя крыніцы, паслухаем, што нам скажа археалогія. На падставе даных, атрыманых у выніку праведзеных раскопак, можна сцвярджаць, што рэканструкцыя адбылася ў другой палавіне XVII ст. А папярэднічалі ёй падзеі, якія пакінулі пра сябе пісьмовыя сведчанні, звязаныя з актыўнымі ваеннымі дзеяннямі пад час вайны сярэдзіны XVII ст.

Перыяд драўлянага замка пакінуў свой след у культурных адкладаннях на тэрыторыі помніка. Самым раннім з'яўляецца невялікі пласт, насычаны вугалем, што сведчыць аб пажарах. Ён зафіксаваны ў паўднёва-ўсходняй частцы пляцоўкі, з паўднёвага боку, каля самага ўвахода ў замак. На жаль, гэты слой у межах даследаванай тэрыторыі надзвычай бедны на знаходкі, ды і знаходкі тыя вельмі невыразныя: косці жывёлы, нешматлікія фрагменты керамічнага посуду, пра які толькі і можна сказаць, што выраблены ён не пазней XVI ст. Потым, пачынаючы з XVII ст., на вывучаным участку жыццё стала больш інтэнсіўным і культурныя адкладанні з'яўляюцца на шырэйшай плошчы. Яны аддзелены ад ранейшых напластаванняў чырвонай глінай і жоўтым пяском і ўтрымліваюць фрагменты керамічнага і шкляного посуду XVII ст. Ні бітай цэглы, ні кафлі тут яшчэ няма. Далей ідзе слой вялікага пажару. Пажар быў моцны, пра што сведчыць не толькі вялікая плошча, якую ён ахапіў, але і таўшчыня вугальнай праслойкі.

Фактычна адразу пасля пажару пачынаецца рэканструкцыя фартэцыі і ўзводзіцца мураваная вежа-брама, адкрытая ў час раскопак. Тонкая праслойка з матэрыяламі XVII ст. і праслойка вялікага пажа-

Раскопкі Глускага замка. 1998 г.



Жалезныя вырабы XVII ст., знойдзеныя пры раскопках замка: 1 — падкоўка на абцас; 2 — ключ; 3—7 — цвікі; 8 — дзвярная ручка.

ру над ёй вертыкальна прарэзаны выкапаным пры будаўніцтве катлаванам. Час узвядзення мураванага корпуса датуецца па кафлі, на якой прысутнічаюць даты 1670 і 1675, манетах (самыя ранія — соліды-барацінкі 1660-х гадоў), па знаходках, якія датуюцца не раней сярэдзіны XVII ст.

Час захаваў для нас дакумент, у якім зафіксавана канкрэтная дата моцнага разбурэння замка, дзе сказана, што ў сакавіку 1655 г. атрад казакоў Залатарэнкі паводле загаду маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча горад Глуск «...добывши, огнем выпалили, много врагов и недругов вашего царского величества, там пребывающих, под меч подклонили» (Сагановіч Г. Невядомая вайна. Мн., 1995. С. 38). Гэта падзея і адпавядае зафіксаванаму археолагамі пажару і сінхронным з ім масавым пахаваннем на паўднёва-ўсходняй частцы замкавай пляцоўкі. У дакументах XVI ст. могілкі ў замку не згадваюцца нідзе.

Такім чынам, археалагічныя раскопкі сведчаць, што вялікія работы па перабудове замка адбыліся хутка пасля вялікага пажару і масавых пахаванняў XVII ст., верагодней за ўсё пасля заканчэння вайны ў 1667 г. Пасля вайны Глуск як моцна пацярпелы быў вызвалены на дзесяць гадоў ад падаткаў. Грошы мяшчане павінны былі выкарыстаць для аднаўлення прыватных



Археалагічныя знаходкі з тэрыторыі замка: 1 — лыжка; 2—3 — відэльцы; 4 — гузік; 5 — люлька; 6 — донца гаршка з кляймом.

Геральдычная кафля з выявай герба Аляксандра Палубінскага (злева) і радзівілаўскага герба (справа).

і грамадскіх будынкаў і ўмацаванняў. Дарэчы, менавіта ў 1667 г. на замкавай пляцоўцы быў узведзены вялікі барочны касцёл бернардзінцаў. Паколькі ў гады вайны замак быў разбураны, то адразу пасля яе заканчэння пачалося будаўніцтва новых умацаванняў, якія б адпавядалі патрэбам сучаснай фартыфікацыі. У выніку Глускі замак ператварыўся ў сапраўды магутную цытадэль. Замак набыў высокія (да 7 м) валы, якія мелі форму пяцівугольніка, і пяць бастыёнаў на кутах. Па перыметры ён быў абкружаны глыбокім і шырокім (асабліва з боку мястэчка) вадзяным ровам.

Уся велізарная праца па рэканструкцыі фартэцыі была праведзена Аляксандрам Палубінскім, чые герб і манаграмы адлюстраваны на знойдзеных кафлях з датамі 1670 і 1675. Замкавыя збудаванні дэталёва апісаны ў інвентары 1720 г. Кафля з выявамі радзівілаўскага герба ў выглядзе арла сведчыць аб тым, што Радзівілы, парадніўшыся з Палубінскімі, сталі потым гаспадарамі замка.

Апроч таго, шмат якія тыпы кафлі абсалютна ідэнтычныя ўзорам са Слуцка — другой сталіцы Радзівілаў.

Інвентар 1755 г. паказвае манументальную 3-павярховую мураваную браму з 6 склепамі, 2 заламі, жылымі і гаспадарчымі памяшканнямі. Тут жа мясціліся турма і каплічка. Жылыя пакоі і кардэгарда прымыкалі да брамы з двух бакоў. На першым паверсе брамы былі зроблены байніцы, якія фланкіравалі подступы да ўвахода. На другім паверсе было 4 акны, на трэцім — 3. Пры раскопках было знойдзена шмат аконнага шкла ад круглых і прамавугольных шыбак XVII—XVIII ст. Паверх быў абкружаны драўляным памостам, дзе можна было несці варту і трымаць абарону. Жылыя пакоі ацяпляліся кафлянымі печамі. У 2-й палавіне XVII ст. печы былі паліхромнымі. Потым, у пачатку XVIII ст., у адпаведнасці з модай, яны былі заменены на гладкасценныя з кафлі ручной работы. Прыкладна праз 50 гадоў зноў адбыўся рамонт, зноў былі перароблены печы. Гэтым разам выкарысталі кафлі мануфактурнай работы, хутчэй за ўсё са Свержанскай фаянсавай мануфактуры. Гэту інфармацыю ўдалося атрымаць, дзякуючы археалагічным даследаванням. Уся пабудова была ўвенчана купалам з «харугаўкай» (флюгерам). Вежа-брама стаяла не пася-

рэдзіне курціны паміж двума бастыёнамі, а была зрушана бліжэй да паўднёва-заходняга бастыёна, рэшткі якога цяпер прымыкаюць да двара будынка раённага вузла сувязі. З паўднёвага боку да сутарэнняў вежы прымыкаў падземны ход з мураванымі сценамі і скляпеннямі, які выводзіў на роў за межы замка. Пры расчыстцы выхада з яго ў час раскопак быў выяўлены дзвярны праём з дзвюма вялікімі каванымі завесамі.

У пісьмовых дакументах згадваецца, як і раней, яшчэ адна — двухпавярховая «водная» брама, якая стаяла з боку ракі. Праблему водазабеспячэння замка дапамагала вырашаць і студня са страхой.

Касцёл бернардзінцаў у Глуску. XVII ст.

У XVII ст. у замку быў заснаваны кляштар бернардзінцаў, у 1667 г. узведзены манументальны касцёл. Ю.Якімовіч і В.Баравы адшукалі ў Цэнтральнай бібліятэцы Літвы піктаграфічную карту «Provincia Litvana Ord. S. Francisci O. Sdm. Observation(es)...» Аўтарства карты належыць вядомаму нясвіжскаму гравёру Гершку Ляйбовічу, які працаваў пры двары Радзівілаў. Карта, паводле меркаванняў даследчыкаў, выгравіравана ў 1750—1760 гг. Г.Ляйбовіч карыстаўся арыгінальнымі малюнкамі бернардзінскіх кляштараў, зробленых адным з вучняў рысавальшчыка з друкарні Радзівілаў у Нясвіжы. Паводле даволі падрабязнага малюнка, мураваны касцёл, пабудаваны ў 1667 г. у Глуску, быў крыжовы ў плане, з больш нізкай апсідай. Усе аб'ёмы мелі двухсхільныя пакрыцці і ўтваралі на тарцах трохвугольныя шчыты з круглымі вокнамі ў цэнтры поля. Над сяродкрыжжам узвышалася двух'ярусная купальная вежачка — так званы васьмярык на чацверыку. Да бакавых крылаў крыжа прыбудаваны прытворы, галоўны фасад фланкіравалі дзве вежы: двух'ярусная купальная і аднаярусная з аднасхільным дахам. Як бачым, пазней касцёл выглядаў некалькі інакш. Потым (невядома калі) касцёл быў крыху перабудаваны. Нарошчана аднаярусная вежачка да вышыні другой, ураўнаважыўшы архітэктурныя аб'ёмы заходняга фасаду. Абедзвюм нададзена аднолькавае рашэнне. Такім чынам, вежачкі стварылі сіметрычную кампазіцыю галоўнага парта-

Выхад з падземнага хода.

ла храма. У паўночнай частцы замчышча стаяў мураваны кляштарны будынак. Дарэчы, на згаданай карце добра паказаны курціны і бастыёны замка.

У цэнтры дзядзінца сярод гаспадарчых будынкаў стаяла галоўная пабудова — вялікі драўляны барочны палац на каменным падмурку з залай у цэнтры і галерэяй. Будынак завяршала мансарда, аздобленая разным картушам з выявамі арла і лебедзя.

Вось такім паўстае Глускі замак са старонак старажытных рукапісаў і з глыбінь археалагічных раскопаў. XVIII ст. было апошнім у жыцці замка. Недзе на мяжы з XIX ст. ён знікае. Але і архівы, і зямля яшчэ хаваюць шмат якія таямніцы гісторыі слаўнай фартэцыі.

Крыніцы:

Баравы Р., Якімовіч Ю. Каштоўны дакумент па гісторыі беларускай графікі і архітэктуры XVIII ст. // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. Мн., 1985. С. 113—122.

Рабцэвіч В.Н. Глускі манетны скарб // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 175.

Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 116—120.

Ткачоў М.А. Глускі замак // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн, 1993. С. 174—175.

Якімовіч Ю. Драўляныя замкі Беларусі XVI—XVIII ст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Мн., 1989. С. 120—124.

І.У.Ганецкая.

Глуская воласць

Існавала ў XIV — XVIII ст. У канцы XIV ст. належала князю І.А.Гальшанскаму. У XV — XVI ст. уладанне Гальшанскіх. На поўначы да яго належалі вёскі Мязовічы, Дзераўцы, Ясень (цяпер у Асіповіцкім раёне), на поўдні мяжа праходзіла прыкладна па р. Арэса. Пасля смерці князя Ю.С.Гальшанскага ў 1457 г. воласць падзелена паміж яго сынамі Сямёнам, Іванам, Аляксандрам і дачкой Ганнай (жонка М.Гаштольда), прычым паўночная частка воласці са Старым Глускам (пазней Глуск-Пагарэлы, сучасная в. Гарадок) трапіла, верагодна, да Сямёна, а пасля шлюбу яго дачкі Таццяны — да яе мужа князя К.І.Астрожскага. Цэнтрам уладання Івана стала паселішча (пазнейшы Глуск-Дубровіцкі, сучасны Глуск). Яго сын Юрый, імкнучыся зрабіць свае ўладанні ў Глускай воласці кампактнай тэрыторыяй, ажыццявіў некалькі замен з дзядзькам Аляксандрам, з сынам М.Гаштольда Альбрэхтам і князем К.І.Астрожскім. У 1522 г. ён узяў у М.Гаштольда сёлы Восава і Ясень, а ўзамен аддаў Дзераўну і Дарогі (цяпер Старыя Дарогі). Пасля яго смерці ў 1536 г. частка Глускай воласці перайшла да сыноў — Януша, Уладзіміра і Сямёна, а потым да яго шасці дачок, у 1560 г. Глуск і навакольныя вёскі дасталіся Настассі (удава князя К.І.Заслаўскага) і Соф'і (жонка князя А.І.Палубінскага). Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ у 1565—1566 гг. іх уладанні апынуліся часткова ў Новагародскім ваяводстве, часткова ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. З канца XVI ст. саўладальнікамі Глускай воласці сталі Палубінскія і Чартарыйскія. Паводле інвентара 1571 г., доля Чартарыйскіх складалася з сёл Балашэвічы, Восава, Дварэц, Замошша, Карытна, Міньковічы, Пагост, Рудаковічы, Сіманавічы, Сяльцы і Ясень, а таксама мястэчка Глуск, замка з 3 вежамі і 34 гароднямі. У 1626 г. князь М.Ю.Чартарыйскі прадаў сваю долю Глускай воласці князю К.А.Палубінскаму, які стаў адзіным уладальнікам часткі воласці. Каля 1640 г. яго ўдава незаконна далучыла да Глускай воласці некалькі сёл сумежнага Бабруйскага староства, за што староста падаў на яе ў суд. Пасля смерці А.Палубінскага ў 1679 г. і хуткай смерці двух яго сыноў частка Глускай воласці перайшла да яго дачкі Ганны, жонкі Дамініка Мікалая Радзівіла. Нашчадкі іх сына Мікалая Фаўстына ўтварылі асобную глускую галіну роду Радзівілаў.

Другая частка Глускай воласці належала нашчадкам К.І.Астрожскага, М.Гаштольда, А.Ю.Гальшанскага. Пасля згасання роду Гаштольдаў (1542) і смерці віленскага біскупа Паўла (сын А.Ю.Гальшанскага) іх часткі адышлі да вялікага князя ВКЛ. Устава на валокі 1557 г. называе

Глускую воласць сярод дзяржаўных валасцей. Неўзабаве яна была падаравана магнатам Хадкевічам. Ян Хадкевіч прадаў сваю частку князю Ю.Ю.Алелькавічу-Слуцкаму. Доля К.І.Астрожскага перайшла да яго сына Ілыі, а пасля яго смерці — да яго ўдавы Беаты Касцялецкай, якая пазней выйшла замуж за А.Ласкага. Частка Глускай воласці, якая была запісана на Кіева-Пячэрскі манастыр Гальшанскімі і Астрожскімі, была выкуплена ляхавіцкім дзяржаўцам А.Забалоцкім, пазней перайшла да князя А.Палубінскага. Крыштоф Радзівіл Пярун, які пасля шлюбу з дачкой К.К.Астрожскага Альжбетай стаў уладальнікам часткі Глускай воласці, выкупіў у Палубінскага ў 1593 г. Глуск-Пагарэлы з сёламі Заелле, Заполле, Няваднікі, Яўсеевічы, Сіманавічы, Картына, Восава, Ясень, Вельча, Жалвінец, Калацічы, Мыслоцін, Паўстовічы, Барысаўцы, Парэчча і Зарэкуці (больш за 300 сялянскіх дымоў). Пасля шлюбу Соф'і Юр'еўны Слуцкай з сынам Крыштофа Радзівіла Янам гэта частка Глускай воласці была далучана да Слуцкай латыфундыі Радзівілаў. У XVIII ст. Глуская воласць звалася графствам, у 1708 г. яна ўключала сёлы Балашэвічы, Будзевічы, Вольніца, Дуброўна, Даколь, Калюгі, Кольчыцы, Макавішча, Міньковічы, Межылессе, Мыслоцін, Пагост, Палажэвічы, Рудаковічы, Сяльцо, Хвастовічы. У 1793 г. у выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай апынулася ў складзе Расійскай імперыі, увайшла ў Бабруйскі павет Мінскай губерні. Належала Радзівілам, Бжастоўскім.

В.Л.Насевіч.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1996. Т. 3. С. 48—49.

Дакументы сведчаць

ПОЗВА КНЯЗЮ ЮРЫЮ ЧАРТАРЫЙСКАМУ ПА СПРАВЕ АБ НАЕЗДЗЕ ЯГО ПАДДАНЫХ НА МАЁНТАК КНЯЗЯ АЛЯКСАНДРА ПАЛУБІНСКАГА

20 красавіка 1597 г.

Жикгимонт третий, Божью милостью король Польский, великий князь Литовский, Русский, Пруский, Жомойтский, Мазовецкий, Ифлянтский и дедичный Шведский король.

Князю Юрию Ивановичу Чорторыйскому. Жаловал у суду нашого земского Новгородского каштелян Новгородский князь Александер Полубенский о том, штож дей року прошлого тисеча пятсот деветдесятого, месяца Августа, двадцать семого дня, врадник вашей милости именья замку Глуска Дубровицкого, лежачого в земли Новгородской, Мартин Рогуля, наславшы бояр и подданых вашей милости Глуских, меновите Васка Романовича а Тимоша Ивановича Волчков з бояры Осовскими ж, Глускими ж Степаном а Василем Богдановичи, Федором и Романом Яцкевичы Горностаевичы и с поддаными села Осовского, з Глуска послаными; Борысом Семеновичем Голенищем, Отрохимом Галкевичом, Осипом Микитичом и з иншыми многими поддаными, человеков о полторасто на власный к грунт подданых пана Новгородского села Осовского, до Глуска замку Городка погорелого, лежачого в земли Новгородской, прислухающого, врочыщом названого Гончаровский, а там де на том к грунте збожья коп сто десеть к гвалтом побрали, то есть: овса коп тридцать, ярицы коп тридцать, пшеницы коп двадцать пять, ячменю коп десеть, гороху коп пять, проса коп десять, власного сеянья подданых пана Новгородского села Осовского, на име: Якова Уляшевича Свирида, Дениса и Марка Хорошевичов. И кгды дей тые подданые памененые, вышедши з села, почали бояр и подданых вашей милости упоминати, абы такого беспрявья и шкоды им не чынили, то пак дей за разам погож дня тые бояре и подданые вашей милости, звыш помененые, тых подданых пана Новгородского: Якова Уляшевича, Свирида, Дениса и Марка Хорошевичов на том кгрунте их Гончаровском на смерть побили и помордовали, а тела трех: Свирида, Дениса и Марка Хорошевичов побравшы, не ведати дзе подевали, а при четвертом трупе тела Якова Уляшевича одного з забойцов Евтуха Борысовича Голеникуса на вчынку было поймано и на враде оказывано; а збоже пожатое тые бояре и подданые вашей милости до села вашей милости Осовского отвезли...

Писан у Новогородку лета от Нароженья Сына Божего тисеча пятьсот деветьдесят семого месяца Апреля двадцатого дня.

Ян Головня земский Новгородский писарь.

Археографический сборник. Вильно, 1867. Т. 1. С. 202—205.

СА СКАРГІ РОТМІСТРА СЯНКЕВІЧА Ў СУВЯЗІ З НАПАДАМ НА ЯГО АТРАДА КАЗАКОЎ І ГЛУСКІХ МЯШЧАН

15 снежня 1616 г.

... В року теперешнем 1616, кгды дей рота под хоруговью помененого е.м. пана Яроша Сенкевича шла и прудко ее поспешала, водлуг универсалов ясневельможного пана, е.м. пана Яна Кароля Ходкевича, воеводы виленского, гетмана Вел.кн.Лит., абы на часе, им назначоном, могла ее втавити на границы московской под Смоленском, то пак будучи им в тягненью кгды в сем року 1616 месяца ноября 6 дня, кгды шли и тягнули мимо место и замок Глуский е.к.вел. Чарторыского на Клеваню и. м. кн. Костантого и кн. Александра Полубенского у воев. Новгородском лежачый, и не ведаючы о жадной здраде и о засадках здрадливых разбойницких, также не ведаючы ни о яких людех, своволных збойцах и лупежцах, беспечне идучы гостинцом, дорогою добровольною, и проходячы мимо место Глуск, зышли на греблю, которая была на двое стреленье з луку от места Глуского, то пак вышей помененые врадники глуские кн. Чарторыского и кн. Полубенских Василей Зборомирский и Грыгорей Клюйвода с тыми выше имены помененными бояры, мещане и подданые панов своих и иншыми многими, которых они сами знают и имена их ведают, сполкучи и переставаючи з людьми своволными, збойцами и лупежцами и переховываючы их у себе, снать з росказанья панов своих, в месте Глуску потаемне, а меновите: Самуеля и Криштофа Коптев и неяких Телицу и Тенюку и иншых до двух сот козаков гултайства. Которые тые Копти з Телицою и Тенюкою и з иншыми, будучы в полку збойцы Тупальского, много лупежества людем почынили и многих пороздияли и з розгромленого и побитого полку того збойцы Тупальского поутекали, збунтовавшыся звирхности е.к.м. и Речи Посполитое, забороняючы люботи е.к.м. и Речи Посполитое будучому добровольного истья гостинцом звыклым, дорогою добровольною мимо Глуск учынившы так коло тое гребли, яко и в млыне, на той гребле збудованым, засадзки патаемные, первей на возы, которые шли наперод через тую греблю, з тых засадзок своих, на том урочищу на гребле и в млыне починеных, крыянкою потаемне з за тое гребли з млыну и з заугольня млынового ударыли, пахоликов постреляли, возы порозбияли и иншые з конми и з возами и зо всею маетностью, ранштунками военными загорнувшы до места Глуского разбойным, кгвалтовным обычаем забрали и одного товарыша шляхтича учтивого, который возы провадил, на име пана Яна Сунского подстреливши и живого порвавшы, а потом его замордовавшы, тело утопили, альбо дей они ведомость мают, же еще жывого гдесь закопали.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 441—442.

ГРАМАТА КНЯЗЯ КАНСТАНЦІНА ПАЛУБІНСКАГА ПРАВАСЛАЎНЫМ ЖЫХАРАМ ГЛУСКА АБ ПАБУДОВЕ ЦАРКВЫ БОГАЯЎЛЕННЯ

15 сакавіка 1628 г.

Константин Полубенский, каштелян Мстиславский.

Видечы я быть частые бунты и розрухи в месте моем Глуску Дубровичском, за чым ми се спусошенье стало в местности для веры Греческое, же им дотуль боронил зверхности митрополита Киевского и церкви им не позволял, хотечы оных прывести прозбою и грозбою до унии. А не могучы их до того притянуть, позволяю им церковь одну задоженья Богоявленья и од того часу обецую им жадное перешкоды в том не чынить, а ни потомкам, варуючи еднак межы ними, жебы як попы межы собою, так теж и мещане в том покой заховали под виною на мене самого и караньем. Вольно будеть каждому з их до которое хочеть церкви ходить. Свещенник свершоны маеть быти до тое церкви од митрополита Киевского и з благословенства патриархы Константынопольского. А перед выежджыми митрополита униованого тот священник становити се не маеть. И кгды вжо в Глуску месте моем мещане священника до тое церкви мети будуть, перед мене самого ставити мають для потверженья; которому доход здавна належачы од мещан и подданых моих доходить маеть. А попы, як унитове, так поп тамтое церкви до того их кгвалтом примушать не мають и могчы не будуть, але каждый на своем переставать маеть. На которую церковь фундацыя в селе Рудиновичах служеб две без подданых и место Глуск огулом аперат належачые до тое церкви на особливым реестре списано и с подписом руки моее дано. И на том дал сесь мой лист с печатью моею и с подписом руки моее. Писан у Глуску, месеца Марца петнадцатого дня, року тысеча шестьсот двадцать осмого. Константин Полубенски, каштелян Мстиславский.

Внизу видны три печати: одна оттиснутая на бумаге и две сургучевые. Писан на поллисте и подклеен другим поллистом. Хранится в рукописном отделении Виленской публичной Библиотеки. Найден Попечителем Виленского Учебного Округа Ив. П.Корниловым в поездку по Могилевской губернии в 1866 году.

Археографический сборник. Вильно, 1867. Т. 1. С. 267.

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ УЛАДЗІСЛАВА IV ШЛЯХЦІЦУ ПАЛУБІНСКАМУ З ДАЗВОЛАМ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ШТОГАДОВАГА КІРМАШУ Ў ЯГО МЯСТЭЧКУ ГЛУСК

20 снежня 1646 г.

Мы, Владислав IV...(Т), объявляем этой нашей грамотой, кому об этом знать надлежит, что т.к. доблестные рыцари, досточтимые сановники и все жители нашего государства не представляют себе большего счастья, чем свобода, за которую они готовы не только отдать свое имущество, но и рисковать жизнью, то мы нисколько не противимся их стремлениям, но, наоборот, относимся к ним со всей нашей благосклонностью и любовью и никому из этих мужественных людей не отказываем в своей королевской милости. Так, благосклонно снизойдя к внесенному нам прошению сына пернавского воеводы, благородного Александра Полубинского, принимая во внимание его благородное происхождение и заслуги его предков перед Речью Посполитой, мы этой грамотой разрешаем ему устраивать ярмарку в его местечке, именуемом Глусском Дубровицким, расположенном в Новогрудском пов., один раз в год, перед русскими запустами, за 2 недели до Копыльской ярмарки. Ярмарка должна длиться всю неделю, т.к. обычно купцы, направляющиеся из различных украинских городов на ярмарку в Копыль, съезжаются и останавливаются в указанном выше местечке.

Гарантируем нашим именем и именем наших королевских наследников, что, начиная с числа, указанного в этой грамоте, ярмарки будут проводиться в мест. Глусское неизменно, и другие окрестные местечки не будут чинить этой ярмарке препятствий.

Разрешаем по примеру других наших городов и местечек, находящихся в Вел. кн. Лит., людям любого сословия приезжать ежегодно на упомянутую ярмарку со всеми товарами в таком количестве, какое у них имеется, продавать эти товары, а также покупать, торговать или обменивать. Однако в указанном местечке не должно быть таких людей, которым общее право запрещает предоставлять убежище.

Подтверждая все это, для большей достоверности собственноручно подписав эту грамоту, мы приказали приложить к ней печать Вел. кн. Лит.

Дано в Варшаве дня 20 декабря месяца года господня 1646, царствования нашего польского года 14, а шведского 15.

Владислав, король.

Франциск Гаховский, референдарный и п[исарь] Вел. кн. Лит.

Пераклад з польскай мовы.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 186–187.

Славуты майстар-гравёр

Размова пойдзе пра аднаго з выдатных майстроў графікі канца XVII – пачатку XVIII ст. Аляксандра Тарасевіча, глушчаніна, які стаў еўрапейскай знакамітасцю. Вучыўся ён, як мяркуюць, у заходнееўрапейскіх гравёраў і, як лічаць мастацтвазнаўцы, яны і «паставілі» руку будучаму мастаку-гравёру.

Аляксандр Тарасевіч працаваў на Беларусі, у Літве, на Украіне. Асноўныя яго творы — кніжная графіка і партрэты — выкананы ў тэхніцы афорта спосабам гравюры па медзі. Цяпер вядома каля 90 гравюр А.Тарасевіча. Сярод іх эстампы «Радаслоўнае дрэва А.Палубінскага», серыя партрэтаў і інш. Пераважная большасць работ была зроблена на Беларусі. З творчасцю А.Тарасевіча звязаны вышэйшыя дасягненні мастацтва барока ў беларускай гравюры.

У XVIII ст. у гэтым стылі выконваліся гравюрныя ілюстрацыі ў кнігах, што выйшлі з друкарняў Еўя, Куцейна, Магілёва, Супрасля, Нясвіжа, Вільні, Брэста. Але амаль ніводзін з тагачасных ілюстратараў не дасягнуў мастацкага ўзроўню А.Тарасевіча. У яго ілюстрацыях ёсць шмат сугучнага ілюстрацыям Ф.Скарыны, ме-

дзярытам нясвіжскага майстра Т.Макоўскага. Пазней і творы самога А.Тарасевіча моцна паўплывалі на творчасць многіх мастакоў 2-й палавіны XVII ст.

Давайце хоць на імгненне перанясёмся ў той далёкі час, у Глуск, па вуліцах якога хадзіў гэты таленавіты майстар. Дзесьці на адной з іх жыў ён сам, праводзячы многа часу ў майстэрні, адсюль пачынаўся шлях у жыццё яго неўміручых твораў. І што асабліва прыемна, большасць іх прысвячалася простаму люду, які жыў побач. Мастак умеў захапляцца гэтым простым жыццём бедняка, майстэрствам рамесніка, наіўнай хітрасцю дробнага гандляра і многае з таго, што прыкмячаў і бачыў, рабіў сарцавінай сваёй чарговай работы, якая праз стагоддзі ўтрымлівае велізарную цікавасць для гісторыкаў, этнографаў, мастацтвазнаўцаў, бо дакладна перадае сцэны з жыцця, народнага побыту той далёкай пары. Паводле іх можна меркаваць пра тагачасную архітэктуру, адзенне, прылады працы. У гэтым велізарная каштоўнасць творчасці А.Тарасевіча, які не пайшоў па слядах сваіх сучаснікаў, не стаў звяртацца, як яны, толькі да рэлігійных сюжэтаў, што было найбольш уласціва мастацтву таго часу. Тым самым ён змог значна перасягнуць іх і ўзняцца на вяршыню сапраўднага майстэрства і таленту.

Асаблівую цікавасць у гэтым плане маюць гравюры, змешчаныя ў кнізе «Разарыум...», выдадзенай у 1678 г. у Аўгсбургу. Сярод мастацтвазнаўцаў яны вядомы як гравюры каляндарнага цыкла пад назвай «Поры года» А.Тарасевіча. Усе гэтыя ілюстрацыі зроблены ў Глуску і адлюстроўваюць тое асяроддзе, у якім жыў і працаваў мастак, побыт мясцовых сялян.

Каляндарны цыкл складаецца з дванаццаці медзярытаў. На большасці — сялянская праца ў розныя поры года: сяўба, касьба, жніво, нарыхтоўка дроў і г.д. Зверху — адпаведны знак Задыяка, паводле якога можна прыблізна вызначыць месяц, калі адбываецца дзеянне.

Мы можам падрабязна разгледзець, як на пачатку лета стрыгуць авечак, апрацоўваюць воўну; як косяць, згрэбаюць, стагуюць сена; зімой смаляць, разбіраюць кабаноў.

Некаторыя ілюстрацыі складаюцца з некалькіх жанравых сцэнак. Напрыклад, у «Жніўні» большасць жне, а двое, адклаўшы сярпы, селі ў цяньку перакусіць з таго, што прынесла клапатлівая кабета. У «Верасні», у той час як селянін, якога мы бачым у глыбіні кампазіцыі, арэ, двое заможных паляўнічых з сабакамі і сокалам бавяць час — выпраўляюцца ў лес па здабычу.

А вось што на дзвюх іншых ілюстрацыях — «Сакавік» і «Лістапад».

На першай — сялянін-сейбіт адной рукой прытрымлівае прыпол з насеннем, другой рассыпае яго па раллі. Крыху далей — араты, ён паганяе валоў. Відаць, працуюць яны ўжо не першую гадзіну. Валы стаміліся і з напружаннем цягнуць саху. Ды і сам селянін сагнуўся ад стомы. У глыбіні бачны сілуэт яшчэ аднаго сейбіта. Сярод дрэў высяцца вялікія маёнткі феадалаў, воддаль — сялянскія хаты.

«Сакавік». Гравюра. 1678 г.

Медзярыт выкананы вельмі адмыслова: штрых тонкі, дакладны і выразны. Вабіць вока танальная гармонія, дасканала пабудаваная кампазіцыя.

Не менш жыццёвая ілюстрацыя «Лістапад». Сяляне ссякаюць дрэвы — нарыхтоўваюць на зіму дровы, кормяць свіней. Сюжэт і вобразы нібы ўвасоблены з натуры. Завершанасць кампазіцыі, майстэрскае адлюстраванне прасторы, адчуванне перспектывы робяць твор адным з лепшых у цыкле.

У цэлым па сіле рэалістычнага паказу і майстэрству выканання, як адзначыў кандыдат мастацтвазнаўства В.Шматаў, каляндарны цыкл А.Тарасевіча не мае сабе роўных у тагачаснай беларускай графіцы.

Мастак, відавочна, вельмі сімпатызуе сваім героям. Рытм іх працы не парушае, а натуральна дапаўняе прыродную гармонію. Вечныя рупліўцы, сяляне шануюць, пераўтвараюць прыроду. Услаўляючы земляробаў, А.Тарасевіч падтрымлівае традыцыйныя ў народзе маральныя каштоўнасці: працалюбства, сумленнасць, жыццёвы аптымізм.

У 80-я гады XVII ст. А.Тарасевіч працаваў у Вільні, дзе паказаў сябе як таленавіты партрэтыст, затым пераехаў у Кіеў. Тут прыняў чарнецтва і новае імя Антоній. Сярод твораў гэтага перыяду партрэты чарнігаўскага архіепіскапа Лазара Барановіча, лаўрскага архімандрыта Мялеція Вуяхевіча і інш.

Н.Б.Сандамірскі.

* * *

Аднак найбольшую каштоўнасць для гісторыі беларускага мастацтва маюць два тытульныя лісты «Разарыума», адзін з іх падпісаны «Alexander Tarasowicz sculpsit anno 1672 w Hlusku» (Аляксандр Тарасовіч выразаў году 1672 у Глуску). Гэта першая звестка з творчай біяграфіі Аляксандра Тарасевіча. Затым існуе загадкавы аўгсбургскі эпізод, вядомы са шматтомнай працы нямецкага даследчыка Наглера, дзе гаворыцца: «Аляксандр Тарасевіч, гравёр па медзі, каля 1678 працаваў у Аўгсбургу». У «Разарыуме і Афіцыуме Дзевы Марыі», які там жа з'явіўся, ёсць розныя віньеты, падпісаныя ім літарамі «АТ». Невядома, адкуль Наглер здабыў гэтыя звесткі (здаецца, што самой кнігі ён не бачыў), але кароткі яго тэкст задаў нямала працы сучасным даследчыкам біяграфіі Тарасевіча. Большасць з іх прыняла на веру паведамленне аб выданні ў Аўгсбургу выдатнай кнігі, у тым ліку і ўкраінскі аўтар адзінай пакуль што манаграфіі пра Аляксандра Тарасевіча Дзмітро Стэпавік. Аднак варшаўская даследчыца Марыя Цумбжыньска, вывучыўшы ўсе экзэмпляры «Разарыума» ў польскіх бібліятэках, прыйшла да вываду, што аўгсбургскага выдання наогул не было. Два выданні знакамітай кнігі надрукаваны ў Віленскай акадэмічнай друкарні: спачатку лацінскае (у 1678—1679), з прысвячэннем Дамініку і Крыштофу, сынам уласніка Глуска Аляксандра Палу-

«Лістапад». Гравюра. 1678 г.

бінскага, а крыху пазней (да 1686) польскі варыянт, прысвечаны Ганне (жонцы Радзівіла) і Ізабэле, Алене, дочкам Аляксандра Палубінскага.

І ўсе ж Тарасевіч быў у Аўгсбургу і, мяркуючы па ўсім, працаваў над гравюрамі для «Разарыума» ў той самы час, калі Віленская друкарня друкавала тэкст кнігі, пакідаючы свабоднае месца для ілюстрацый. Там жа, ці ўжо вярнуўшыся на радзіму, майстар падрыхтаваў іншы варыянт тытульнага ліста для «Разарыума». Другі ліст таксама поўнасцю падпісаны Аляксандрам Тарасевічам, але ні дата, ні месца выканання не ўказаны. Захавана агульная кампазіцыя і ўсе святыя персанажы, аднак мастацкі стыль рашуча памяняўся.

Лічыцца, што Тарасевіч ездзіў вучыцца ў Кіліянаў. Аднак вучыцца беларускі майстар мог толькі на творах знакамітых нямецкіх майстроў кніжнай графікі, бо першага пакалення найбольш таленавітых Кіліянаў у гэты час ужо не было ў жывых. Адзначым, што і першы тытульны ліст 1672 г. награвіраваны дасканала, гэта не праца навучэнца, яна сведчыць і аб таленце Аляксандра Тарасевіча, і аб добрай школе, якую ён дзесьці прайшоў яшчэ да Аўгсбурга. Характэрна, што ні на адной іншай гравюры Тарасевіча не пазначана назва горада, дзе яна выканана, няма там назвы Вільні, Аўгсбурга ці Кіева. Безумоўна, знаёмства з лепшымі ўзорамі заходнееўрапейскай графікі ўдасканаліла майстэрства Тарасевіча, і трэба сказаць, што ні ў Вільні, ні ў Кіеве пазней ніхто з яго вучняў і паслядоўнікаў не ўзняўся да ўзроўню настаўніка.

Няясна, калі дакладна Тарасевіч жыў у Глуску, а калі — у Вільні. Падзяліць яго творчасць на глускі і віленскі перыяды немагчыма, не ўдалося выявіць і дом Тарасевіча ў Вільні. Глускам падпісана буйнафарматная гравюра радаслоўнага дрэва Аляксандра Палубінскага. Дз.Стэпавік сцвярджае, што апошняя, пазначаная Глускам, гравюра, — партрэт біскупа Мікалая Слупскага — датавана 1677 г. і што Тарасевіч пакінуў Глуск пасля смерці Аляксандра Палубінскага (1679). Але яшчэ раней ён ужо выконваў заказы не толькі Палубінскага, але і Віленскай акадэміі. Можна меркаваць, што гэтыя заказы майстру наладзіў яго апякун Аляксандр Палубінскі, які ў маладосці вучыўся ў акадэміі. Вярнуўшыся на радзіму, Аляксандр Тарасевіч вельмі плённа працаваў для Віленскай акадэмічнай друкарні і жыў, напэўна, у Вільні. Існуе думка, што ў 1680-я гг. кнігі з ілюстрацыямі Тарасевіча выдаваліся і ў іншых месцах, але тут патрабуюцца больш уважлівыя даследаванні. У спадчыне Тарасевіча асабліва трэба адзначыць серыю партрэтаў Яна Сабескага (1680), мінскага харунжага Казіміра Клакоцкага, Міхала Паца, уніяцкага мітрапаліта Кіпрыяна Жахоўскага, пісара ВКЛ Андрэя Завішы, манаха Іазафата Бражыца, звязанага з цудатворным абразом Маці Божай Барунскай.

А затым адбываецца загадкавая перамена: мастак пераязджае ў Кіеў, які толькі што разам з Правабярэжнай Украінай адышоў да Маскоўскай дзяржавы, і становіцца манахам Антоніем Кіева-Пячэрскай лаўры. Ён стаў пачынальнікам школы медзярыту ў лаўрскай друкарні, але ўласных гравюр стварыў усяго некалькі. Паказальна, што найлепшымі ў мастацкіх адносінах з'яўляюцца якраз партрэты — таленавітага і недаацэненага гісторыкамі палітычнага дзеяча Васілія Галіцына (1690), Мялеція Анціахійскага (1693), адукаванага чарнігаўскага архіепіскапа Лазара Барановіча (1693). З 1705 г. Антоній вядомы як намеснік Свенскага манастыра (каля Бранска). Закончыў ён свой жыццёвы шлях ігуменам Кіева-Пячэрскай лаўры — знакамітага ўсходнеславянскага рэлігійнага і культурнага цэнтра. Дз.Стэпавіку па архіўных дакументах удалося даволі дакладна ўстанавіць дату смерці Александра Тарасевіча — паміж 12 чэрвеня і 15 жніўня 1727 г.

У гісторыі мастацтва побач з Аляксандрам Тарасевічам заўсёды стаіць Лявонцій Тарасевіч, таксама выдатны майстар медзярыту. Яго працы віленскага перыяду вядомы з пачатку 1680-х гг. — гравюры з цудатворных абразоў Маці Божай, партрэты, ілюстрацыі да кніг. Пераехаўшы адначасова з Аляксандрам (ці крыху пазней) у Кіеў, Лявонцій не парваў сувязі з радзімай, пра што сведчыць афармленне ім вядомага віленска-супрасльскага «Летургікона» (Служэбніка) 1692—1695 гг. Цікавы эпізод яго біяграфіі — стварэнне партрэта царэўны Соф'і Аляксееўны і паездка з гэтай мэтай у Маскву. Аднак, безумоўна, вяршыняй творчасці Лявонція Тарасе-

віча сталі гравюры да «Кіева-Пячэрскага пацерыка» (1702): іх уплыў можна заўважыць не толькі ў мастацве гравюры, але і ў іканапісе XVIII ст.

Паходжанне такой выдатнай фігуры, як Аляксандр Тарасевіч, з незвычайнай біяграфіяй, даўно інтрыгавала гісторыкаў мастацтва. Дзе ён нарадзіўся каля 1650 г. (па падліках Стэпавіка), у якой сям'і, дзе атрымаў першыя ўрокі прафесіі гравёра? Стварыўшы немалую мастацкую спадчыну, Аляксандр Тарасевіч не пакінуў пра сябе ніякіх дакументальных сведчанняў, апрача подпісаў пад гравюрамі. Дз.Стэпавік паспрабаваў аднавіць жыццёвы шлях выдатнага майстра гравюры. Зыходзячы з таго, што Тарасевіч ездзіў за мяжу, а пазней узняўся даволі высока ў царкоўнай іерархіі, даследчык лічыць, што паходзіць ён мусіў з заможнага ці сярэдняга слою грамадства. Больш таго, Стэпавік выказаў гіпотэзу, што Аляксандр Тарасевіч з'яўляецца сваяком вядомага рэлігійнага дзеяча Закарпацця мукачаўскага епіскапа Васіля Тарасевіча. Адтуль ён трапляе ў Аўгсбург, а закончыўшы там навучанне, у 1672 г. Тарасевіч з'яўляецца ў Глуску пры двары Аляксандра Палубінскага. Так гіпатэтычна выглядае пачатак творчай біяграфіі Аляксандра Тарасевіча. Але што прывяло яго менавіта ў Глуск да Палубінскага?

Аляксандр Гіляры Палубінскі (6.8.1626–3.11.1679) атрымаў адукацыю ў Віленскай і Замойскай акадэміях і ў Кракаве. Каля 1643 г. аддадзены бацькамі да каралеўскага двара, у 1644 г. адпраўлены каралём за мяжу (у Галандыю і Францыю) для навучання мовам, норавам і звычаям. Зусім малады чалавек, у 1646 г. ён пасол на сейме ад Слонімскага павета. Вызначыўся як храбры і таленавіты военачальнік — са сваёй сотняй гусараў біўся з казакамі пад Мазыром і Лоевам (1649), Белай Царквой (1650), пазней — з маскоўскімі войскамі пад Шкловам, Быхавам і Магілёвам, Палонкай. Вызваляў ад маскоўскіх войскаў Мінск, Барысаў, Шклоў, Оршу. Сучаснікі сцвярджалі, што Палубінскі карыстаўся ў войску вялікім аўтарытэтам, два разы ён прэтэндаваў на пасаду польнага гетмана, але перайшлі дарогу магнаты Пацы. Палубінскі стаў вялікім маршалкам (1669) і пасля смерці Міхала Карыбута разам з Пацамі і Агінскімі падтрымліваў як кандыдата на каралеўскі трон цара Аляксея Міхайлавіча. Быў буйнейшым магнатам, таму што апрача спадчынных Дзярэчына, Глуска і Рудобелкі па тэстаменту Казіміра Льва Сапегі атрымаў Дзятлава, Зэльву, Бешанковічы, Чарнобыль і мноства вёсак. Меў палацы ў Вільні і Варшаве. Ад другой жонкі Соф'і Канстанцыі Валадковіч меў сыноў Дамініка Яна (памёр у Венгрыі ў час Венскага паходу Сабескага 1683) і Крыштофа Канстанціна. Пабудаваў кляштары дамініканцаў у Дзярэчыне (там ён быў і пахаваны), бернардзінаў у Глуску (1662 — 1667), дамініканак у Вільні (1679), 47 уніяцкіх цэркваў (у т.л. у Бабруйску, Горках, Дзятлаве) і касцёлаў пабудаваў ці забяспечыў, даў грошы на каштоўную вечную лямпу перад Жыровіцкім абразом Маці Божай, які асабліва шанаваў. Вызначаўся аскетычнасцю ў жыцці, незвычайнай набожнасцю і сціпласцю, завяшчаў пахаваць сябе без пышных цырымоній, у простай труне, як манаха ці жабрака. Ён фінансаваў выданне знакамітага «Разарыума», да таго ж быў яго ўкладальнікам. Сыны памерлі, не пакінуўшы наследнікаў, уласнасць дасталася дочкам, такім чынам Глуск у якасці пасагу Ганны Марыяны дастаўся Дамініку Мікалаю Радзівілу.

Інвентар Глуска 1692 г., Дамініка Мікалая Радзівіла, складзены рэвізорам канцлера ВКЛ Радзівіла Канстантыем Казімірам Кандратовічам, дае магчымасць вызначыць як найбольш верагоднае глускае паходжанне гравёраў Тарасевічаў. У Глуску, «на вуліцы на Падзамчы па правай руцэ ідучы да замка жылі Даніель рымар, Ян Тарасовіч, злотнік, Ян Катляр, Якуб Мечнік... У завулку над возерам — Севярын Тарасовіч, злотнік, свяшчэннік Уваскрэсенскай царквы Юзаф, катляры Навум і Васко...» (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 694. Воп. 7. Спр. 845). Адзначым, што абодва злотнікі былі вольнымі, не плацілі чыншу. Сярод жыхароў вёскі Балашэвічы, якія мелі надзелы ў розных месцах, у гэты ж час былі Сямён, Васко, Яцко, Іван і два Івашкі Тарасовічы. Раней, у 1638 г., у Глуску ўпамінаецца злотнік Тарасовіч. Прозвішчы Тарасовічаў сустракаюцца ў Глуску ў сярэдзіне XVIII ст. Паміж Глускам і Асіповічамі і зараз існуе вёска Тарасовічы, дарэчы самі гравёры падпісвалі свае працы «Tarasowicz».

Вядома, што большасць віленскіх майстроў кніжнай гравюры 1650—1660 гг. выйшлі з асяроддзя злотнікаў. У той час Аўгсбург лічыўся буйнейшым цэнтрам нямецкага злотніцтва эпохі барока, на Беларусі вельмі цаніліся вырабы «аўшпоркскай работы» і, напэўна, не адзін віленскі малады злотнік адбыў «вандроўку» ў Аўгсбург. Таму найбольш верагодна, што вядомыя беларускія майстры гравюры Аляксандр і Лявонцій Тарасевічы паходзяць з глускіх злотнікаў, падданых Аляксандра Палубінскага, і гэта ён паслаў адсюль таленавітага маладога майстра Аляксандра Тарасевіча ў далёкі Аўгсбург павышаць кваліфікацыю і працаваць над гравюрамі для «Разарыума». Не выпадкова першыя свае гравюры Аляксандр Тарасевіч падпісаў Глускам, так, як у пачатку XVI ст. Францішак Скарына напісаў на надрукаванай ім Бібліі пра сваё паходжанне «з Полацка».

А.А.Ярашэвіч.

Глускі манетны скарб

Знойдзены ў г.п.Глуск у 1960 г. у збане з чырвонай медзі.

Вядома 760 сярэбраных і білонных манет: польскія соліды, паўтаракі, шастакі, орты, літоўскі солід Жыгімонта III Вазы (1587—1632); польскія шастакі і злотыя (30-грашовікі), літоўскія шастакі Яна II Казіміра (1648—68), польскія шастакі і орты Яна III (1674—96), польскі і літоўскі шастакі 1697, 1706, 1709—33 Аўгуста II — манетныя двары Быдгашч, Кракаў, Львоў, Мальбарк, Познань, Вільня, Гродна, Коўна; зэхсгрошэры і орты Фрыдрыха Вільгельма (1640—88), Фрыдрыха III (1688—1701) — манетныя двары Кёнігсберг і Берлін; зэхсгрошэры Фрыдрыха I (1701—13), Фрыдрыха II (1740—86) — манетны двор Кёнігсберг; соліды і драйпёлькеры Густава II Адольфа (1611—32), солід Крысціны Аўгусты (1632—54) — манетныя двары Рыгі і Эльблёнга. Асаблівую цікавасць выклікае літоўскі шастак Аўгуста II, выпушчаны ў 1706 г. Гродзенскім манетным дваром, і польскі шастак Яна III 1678 (?) з кантрамаркай у выглядзе вензеля аднаго з князёў Патоцкіх. Ухаваны ў канцы 1750 г. Захоўваецца скарб часткова ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі і Бабруйскім краязнаўчым музеі.

В.Н.Рабцэвіч.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 175.

Супраць феадальнага прыгнёту

Патрэбна была толькі невялікая іскра, каб заняўся велізарны пажар. І гэтай іскрай стала паўстанне запарожскага казацтва на Украіне, якое ўзначаліў Багдан Хмяльніцкі. Яно адыграла важную ролю ва ўздыме народнага руху на Беларусі супраць заняволення і пераўтварыла яго ў антыфеадальную вайну, на якую, пачынаючы з 1648 г., узняліся абодва братнія народы.

Глуск таксама апынуўся ў гушчыні падзей антыфеадальнай барацьбы, якая нібы пажарам ахоплівала ўсё новыя і новыя раёны Беларусі. У кастрычніку 1648 г. горад над Пціччу займалі «купы паўстаўшых сялян, беларускіх і ўкраінскіх казакоў, якія затым рушылі да Бабруйска».

Новы ўздым антыфеадальнага руху наступіў з аднаўленнем вайны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай (1654—1667). З аднаго боку, ён з'явіўся лагічным працягам папярэдніх масавых антыфеадальных выступленняў народных мас, а з другога — быў ідэалагічна падрыхтаваны Масквой, якая выстаўляла сябе абаронцай інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва Беларусі. У палітыцы маскоўскага цара прадугледжваліся таксама напрамкі, звернутыя да шляхты і духавенства. Ім цар абяцаў пацвердзіць сваімі граматамі правы на валоданне ранейшымі маёнткамі і былыя прывілеі, калі яны пажадаюць служыць яму.

Натуральна, такія захады не маглі не адбіцца на настроі насельніцтва пагранічных з Расіяй беларускіх зямель. Шмат у якіх месцах ніхто не аказваў якога-небудзь супраціўлення наступленню рускіх войскаў, якое пачалося 21 мая 1654 г. На дапа-

могу ім з Украіны было накіравана некалькі палкоў казакоў на чале з наказным гетманам Іванам Залатарэнкам.

Насельніцтва беларускіх гарадоў і вёсак, асабліва бяднейшае, пры падыходзе рускіх войскаў схілялася на бок Масквы, сустракала атрады рускіх стральцоў са святымі абразамі і хлебам-соллю, а ў шэрагу месцаў і ўлівалася ў маскоўскае войска, даўшы прысягу на вернасць Расіі.

Аднак у асобных населеных пунктах, дзе стаялі буйныя гарнізоны і меліся ўмацаванні, вяліся цяжкія баі. Гарады, якія былі захоплены сілай, разбураліся, а насельніцтва вынішчалася.

Глуск не здолеў яшчэ ліквідаваць тыя разбурэнні, якія панёс у гады антыфеадальнай вайны, як навакольныя тэрыторыі зноў апынуліся ў зоне баявых дзеянняў. Яны моцна пацярпелі ад абодвух бакоў. Казацкія палкі Івана Залатарэнкі занялі паўднёва-ўсходнюю Беларусь. Пад Бабруйск і ў суседнія з ім воласці пастаянна насылаліся яго разведвальныя атрады, каб сачыць за перамяшчэннем войск Вялікага княства Літоўскага. Большая частка рускай арміі пасля авалодання ўсходняй Беларуссю пайшла да вясны на зімовыя кватэры, пакінуўшы толькі ў буйных гарадах невялікія гарнізоны.

Гэту акалічнасць не магло не скарыстаць у сваіх мэтах войска ВКЛ, якое пасля шэрагу панесеных паражэнняў пачало рыхтавацца да контрудараў.

Зімой 1655 г., не сустракаючы супраціўлення, яно перайшло Бярэзіну і практычна бесперашкодна авалодала Бабруйскам, заняло Глуск, Оршу і іншыя гарады.

На сваім шляху, як і маскоўскія ратныя людзі ў недалёкім мінулым, войска ВКЛ пакідала выпаленыя і разрабаваныя вёскі, гарады, мястэчкі. Руйнаваліся ў першую чаргу тыя населеныя пункты, якія перад гэтым перайшлі на бок Расіі. Глуск і суседнія воласці падвергліся сапраўднаму вынішчэнню. А некалькімі месяцамі пазней, у час летняй кампаніі, якая пачалася даволі ўпэўненым наступленнем рускай арміі, а таксама казакоў на чале з Іванам Залатарэнкам, мястэчка і навакольныя мясціны апынуліся ў руках апошніх і былі амаль што ўшчэнт зруйнаваны і спустошаны. Вось што паведамляў 17 сакавіка 1655 г. у пісьме цару Аляксею Міхайлавічу наказны гетман: «...по написанию сего листа моего пришел подъезд наш, который посылали мы до гор. Глуска. Там же город добывали и, добывши, огнем выпалили, много врагов и недругов... там пребывающих, под меч подклонили».

Запісы аб знаходжанні казацкіх атрадаў у маёнтках Глуск, Парэчча Навагрудскага павета і ў Рудобелцы Мазырскага ваяводства і аб спусташэнні іх, зробленыя 11 жніўня 1661 г. у актавай кнізе Навагрудскага гарадскога суда, сведчаць аб тым, што гэтыя населеныя пункты і сумежныя тэрыторыі заставаліся вельмі спустошанымі, разбуранымі і спаленымі: «... так что сейчас не более со всего имения Глуского, кроме города, оселых дымов четырнадцать... в имении Поречье с Колчицами оселых дымов двадцать шесть...»

Улічваючы шкоду, нанесеную Глуску на працягу ўсёй «казацкай вайны» ад войска Рэчы Паспалітай і яго абозу, а таксама ад новых непрыяцельскіх разбурэнняў, ад якіх горад «агнём і мячом датла разбураны», сейм вызваліў яго ад экстраардынарных падаткаў на 11 гадоў. Грошы мяшчане павінны былі выкарыстаць для аднаўлення замкавых пабудоў і інш. Паўторна гэта валоданне маршалка Вялікага княства Літоўскага Аляксандра Палубінскага ў 1673 г. было вызвалена сеймам на 12 гадоў ад розных падаткаў, за выключэннем старога мыта, прыбыткі ад якога ішлі каралю. Пры гэтым характэрна, што «лібертацыю» атрымала не проста паселішча, а «парубежны горад, магутны ваенны аплот, закладзены ад казацкай рэбеліі і ўкраінскай».

Вайна прынесла галечу і разбурэнне не толькі Глуску. Беларусы заплацілі за яе жудасную цану: з 1651 па 1667 г. колькасць насельніцтва на Беларусі скарацілася з 2,9 млн. чалавек да 1,4 млн. Не стала кожнага другога беларуса. У выніку ваенных дзеянняў, што амаль не спыняліся з 1648 г., многія гарады і сёлы былі разграблены, разбураны, спалены. З насельніцтва браліся велізарныя паборы на ваенныя мэты. Сельская гаспадарка і рамесніцтва прыйшлі ў заняпад. Страшэнны голад, эпідэміі выклікалі вялікую смяротнасць.

Пасля заканчэння вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай і заключэння Андрусаў-

скага перамір'я 1667 г. Глуск і суседнія воласці аказаліся ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. Для аднаўлення з попелу сялянскіх гаспадарак, рамесніцтва, гандлю спатрэбілася больш чым два дзесяцігоддзі.

Цяжкія наступствы ваеннага ліхалецця ўскладняліся захоўваннем і ўмацаваннем фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадаркі, кансервацыяй найбольш застарэлых формаў прыгонніцтва, феадальнай анархіяй. Вёска перажывала далейшае маёмаснае расслаенне. У маёнтку Глуск, напрыклад, у 1692 г. 24,8 % цяглых гаспадарак мелі надзелы па 1—4 валокі і менш, а 2,1 % карысталіся надзеламі ў 1,5 валокі. Нямала сялян было пазбаўлена сродкаў вытворчасці. Адны з іх нават не мелі сваіх хат і жылі ў іншых людзей, некаторыя будавалі сабе жытло на чужых сядзібах. У той жа час павялічвалася магутнасць буйнейшых зямельных магнатаў, адбывалася далейшае закабаленне вясковага насельніцтва.

У канцы XVII — пачатку XVIII ст. Глуск і воласць з шасцю войтаўствамі, дзе налічвалася ўжо 739 дамоў, перайшлі ў валоданне Радзівілаў, найбуйнейшага магнацкага роду ў ВКЛ, прадстаўнікі якога ў XV—XVIII ст. займалі вышэйшыя дзяржаўныя, адміністрацыйныя і ваенныя пасады. Яны мелі сваё войска з шляхты і ваеннаслужылых людзей. Радзівілы адыгрывалі значную ролю ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай і ў сваіх уладаннях трымаліся, як удзельныя князі.

Як пісаў паэт Уладзіслаў Сыракомля, насельніцтва многіх земляў прыносіла князям даніну «за хлеб свой, за свае лясы, за рыб, што ў водах, за птушку і пчол, што ў паветры, і, хто ведае, можа, за само паветра». На іх карысць прыгонныя адпрацоўвалі шматлікія павіннасці. Інвентар 1708 г. маёнтка Глускага графства князя Мікалая Радзівіла, аднаго з прадстаўнікоў гэтага роду, сведчыць аб тым, што прыбыткі князя былі амаль казачныя. Адной толькі гадавой рэнты ад сваіх арандатараў і корчмаў Радзівіл атрымліваў амаль 24 тысячы злотых.

Для сялян рэнта грашыма (чыншам) не вычэрпвалася. Грашовыя ўклады «свайму» пану павялічваліся за кошт самых разнастайных падаткаў. Напрыклад, пры ўплаце чынша сяляне аплачвалі таго ж запіснога, аканома — па 1 злотаму з валокі. Існаваў такі падатак, як жарнавое, што спаганяўся панам са сваіх прыгонных за права мець уласныя жорны. За карыстанне лясны мі ўгоддзямі плаціліся таксама падаткі грашыма, як угайнае і інш. Але ж, нягледзячы на гэта, карыстацца багаццямі лясоў просты люд не мог. Так, сялянам была забаронена высечка лесу для асабістых патрэб. Падданым дазваляўся ўваход у лес па спецыяльна вызначаных днях. І гэта ж за грошы! А парушальнікаў строга каралі.

Акрамя грашовых паборaў, сяляне выконвалі і розныя іншыя павіннасці. Напрыклад, у Балашоўскім войтаўстве «с каждой тяглой чиншевой волоки должны платить по 32 злотых... А если б кто куда либо самовольно пошел прочь, то тогда должны платить всей деревней, чтобы княжеская казна не понесла никакого ущерба...»

Пустуючыя валокі, якія знаходзіліся паблізу вёскі Балашэвічы, сяляне павінны былі апрацоўваць для панскага двара ўсёй воласцю — араць, баранаваць, з поля ўраджай збіраць, сенакосы касіць у свабодныя дні, а не за лік паншчыны. Пакуль гэтыя валокі не былі падзелены паміж сялянамі, яны павінны былі апрацоўваць іх апрача паншчыны, якая складала з кожнай валокі па 4 дні ў тыдзень.

Войтаўствы Балашоўскае, Дакольскае, Пагосцкае і Хваставіцкае, якія знаходзіліся на паншчыне, абавязаны былі, акрамя іншых павіннасцей, па чарзе накіроўваць штодзённа па 17 вартаўнікоў: у замак, у кляштар бернардзінцаў, у фальварак Лучкі, у сядзібу гараднічага Устарбоўскага (Калацічы), пані Шыманоўскай. А ў час знаходжання ў Глуску князя гэтыя ж войтаўствы па чарзе накіроўвалі вартаўнікоў (па меры неабходнасці).

Сяляне пасылалі таксама падводы з кожнай валокі ў Нясвіж, з 2 валок — у Пескаўцы, з 3 валок — у Вільна.

Акрамя пералічанага, штогод патрэбна было адпрацаваць некалькі так званых гвалтаў (згоны, талокі) па ўказанні панскага двара. Часцяком працягласць гвалта не абмяжоўвалася адным толькі днём. Як сведчыць той жа інвентар маёнтка 1708 г., павін-

насцю сялян Пагосцкага войтаўства была неабходнасць штогод адпрацаваць 9 гвалтаў. Гэта выкананне такіх работ, як тралёўка лесу, стагаванне сена, рамонт і будаўніцтва дарог-гасцінцаў, мастоў, маёнткавых збудаванняў і інш. У выпадку якой-небудзь небяспекі сяляне павінны былі з'яўляцца ў замак і несці варту. У дні ўрачыстых свят і па нядзелях усе абавязаны пад пагрозай штрафу і пакарання хадзіць у царкву і пасціцца ад старога да малога, пачынаючы з дзесяці гадоў.

Князь-дабрадзей і гаспадар дабіваўся, каб паства добрасумленна выконвала рэлігійныя абрады і найлепшым чынам захоўвала царкоўныя правілы. Як бачна, гэтыя патрабаванні былі ўключаны нават у інвентар радзівілаўскага ўладання.

Кляштар, капітул і князь утрымлівалі вялікі апарат прымусу. Войты і дзесятнікі абавязаны былі ажыццяўляць нагляд за кожным прыгонным, рэгламентаваць розныя бакі жыцця сялян.

Непаслушэнства царкве строга каралася. Дзесятнік, які ўтойваў правіннасці сялян і не паведамляў пра іх у замак, падвяргаўся штрафу ў 11 грошаў і атрымліваў 100 бізуноў. Той, хто не прыходзіў на споведзь, павінен быў працаваць на замак чатыры тыдні з валамі, пачынаючы з красавіка.

Акрамя штрафаў ужываліся розныя сродкі запалохвання. Сялян папярэджвалі, што чалавек, які не бывае на споведзі ў Вялікдзень, не будзе пахаваны на могілках, ён асуджае сябе на вечныя мукі ў пекле і г.д.

Аднак сялянства Глушчыны не вельмі імкнулася да збліжэння з прыходскім касцёлам. Нягледзячы на пагрозы цялесных пакаранняў, сельскія жыхары захавалі ў сваім побыце, у земляробчых абрадах і сямейна-бытавых святах элементы язычніцтва, што і з'яўлялася адной з формаў пратэсту супраць феадальнага запрыгоньвання.

Глускія мяшчане прадмесця Карпілаўка плацілі чынш тутэйшаму кляштару ксяндзоў-бернардзінцаў. У год яны ўносілі 916 злотых. Тым не менш яны прыцягваліся і да выканання некаторых работ: праполка дваровага агароду, уборка агароднiны, нарыхтоўка яе на зіму, лоўля рыбы для патрэб двара і капітула. Мяшчане абавязаны былі рамантаваць масты і дамбы. Інвентар 1787 г. увёў дадатковыя павіннасці для мяшчан. Яны павінны былі разносіць пісьмы, вазіць дваровы хлеб на млын, па чарзе адбываць конную вартавую службу па ахове двара.

У Глуску быў заснаваны касцельны шпіталь, які павінен быў займацца дабрачыннасцю, клапаціцца аб калеках, састарэлых, жабраках. Гэта садзейнічала ўмацаванню аўтарытэту і ўплыву касцёла на мясцовае насельніцтва.

Некаторае ажыўленне ў развіцці Глуска і навакольных тэрыторый, якое намецілася ў гэты час, было спынена Паўночнай вайной. Зноў на працягу некалькіх гадоў ваенныя дзеянні адбываліся на беларускай зямлі, закрануўшы сваім полымем і глускі край. І без таго цяжкае становішча людзей пагоршылася ў выніку засухі. Масавыя эпідэміі з 1707 г. да 1711 г. ахапілі гэтыя мясціны і завяршылі спусташэнне мястэчка і суседніх валасцей.

Праходзіў час. Ён загойваў раны не толькі ў душах людзей, але і на зямлі. Пераадольваючы страшэнную разруху, адбудоўваўся Глуск. Цяпер мястэчка складалася з дзвюх частак: замкавай (асноўнай) і прадмесця Карпілаўка. У 1758 г. тут быў 471 двор, трэцяя частка сядзіб належала яўрэям. Цэнтрам архітэктурнай кампазіцыі з'яўлялася 12-вугольная ў плане гандлёвая плошча. На ёй стаялі 47 крам, 25 камор, якія ўтваралі замкнёныя гандлёвыя рады, драўляныя Васкрасенская і Троіцкая цэрквы, шпіталь, школа, непадалёку — мураваны Троіцкі касцёл, пабудаваны разам з кляштарам бернардзінцаў. Плошча звязвалася дарогай з Глускім замкам. У мястэчку было 12 вуліц, сярод якіх галоўныя выводзілі на дарогі ў напрамку на Мінск, Слуцк, Мазыр, Бабруйск. Яны называліся: Мінская, Слуцкая, Рымарская, Школьная, Украінская, Лучкоўская, Святога Антона і інш.

У гэты час Глускае графства было здадзена М.Радзівілам у арэнду Станіславу Вейняловічу.

У мястэчку зноў развіваюцца розныя рамёствы, пашыраецца гандаль, працуе шмат крам, многія з іх утрымліваліся ў дамах гандляроў. Асабліва хутка расце колькасць такіх рамеснікаў, як кавалі, слесары, цесляры, шаўцы, краўцы, гарбары,

злотнікі. Паступова Глуск вяртае сваё значэнне важнага гандлёвага цэнтра Прыпяцкага Палесся.

Але ў яго жыцці бывалі і чорныя старонкі. Драўляныя пабудовы ў мястэчку часта гарэлі. У агні гінула значная колькасць жылля: з 1758 г. да 1865 г. у Глуску згарэлі 53 двары. У 1775 г. здарыўся страшны пажар, які знішчыў значную частку мястэчка, і сейм Рэчы Паспалітай вымушаны быў вызваліць Глуск на 10 гадоў ад усялякіх падаткаў.

Уладары мястэчка, каб атрымліваць з мясцовых жыхароў і гандляроў чынш за занятую імі ўнутры горада зямлю, устанавілі за яе плату ў адпаведнасці з месцазнаходжаннем і велічынёй зямельных плошчаў. У 1784 г. было прынята рашэнне, у адпаведнасці з якім былі абследаваны ўсе пляцы, занятыя дамамі, гандлёвымі прадмесцямі і іншымі пабудовамі, і ўстаноўлена адпаведная плата за іх. Тыя гаспадары, хто займаў у горадзе найбольш прэстыжнае месца пад свае двары і крамы, адпаведна плацілі і большы чынш. Мястэчку належала 3 валокі, 4 маргі і 80 прэнтаў зямлі, якія прыносілі з 1784 г. штогадовы прыбытак 713 руб. 84 кап.

Радзівілы праводзяць рэканструкцыю свайго Глускага замка, у выніку чаго ён страчвае абарончыя функцыі і перараджаецца ў замкава-палацавы ансамбль. Палац у Глуску, збудаваны ў першай палавіне XVIII ст. з брусоў на цагляным падмурку, складаўся з трох памяшканняў. Цэнтральная група ўключала вялікую парадную залу і двое сенцаў, а бакавыя крылы — па чатыры пакоі. З тыльнага боку да залы прылягала галерэя. Увесь будынак завяршаўся ламаным дахам.

Прыгожымі архітэктурнымі збудаваннямі з'яўляліся і мясцовыя цэрквы. Адна з іх была з двума, другая з трыма вярхамі, што з'яўлялася характэрнай рысай храмавых пабудоў таго часу.

Калі гаварыць наогул пра дойлідства на Глушчыне, то яно ўзнікла тут з XVI ст., калі паявіліся «замкавыя дойліды». Рост мястэчка, будаўніцтва маёнткаў і сельскіх пасяленняў, іх рэканструкцыя патрабавалі значнай колькасці кваліфікаваных дойлідаў, спецыяльных цяслярскіх арцелей, якія б выконвалі найбольш адказныя работы. У XVI ст. для кожнага горада і мястэчка было абавязковым вылучэнне дзяржаўнай пасады дойліда, вакол якога групаваўся будаўнічы калектыў. Гэта было характэрна і для Глуска, дзе дойліды працавалі ўжо ў XVI — XVII ст.

Да 60-х гадоў XVIII ст. паступова аднавілася сельская гаспадарка Глускай і суседніх валасцей. Але становішча сялянства тут, як і ва ўсёй Беларусі, заставалася такім жа паднявольным, як і раней. Панавала ўсё тая ж безабароннасць перад жорсткасцю і свавольствам пастаяннага ці часовага пана-гаспадара. У любы час той мог адабраць у свайго падданага зямельны надзел, перасяліць яго ў іншае месца, прадаць прыгоннага з усёй яго маёмасцю, зямлёй і без яе другому феадалу, закласці пад пэўную грашовую суму, пры гэтым даваў пакупніку ці крэдытору поўнае права распараджацца лёсам селяніна — судзіць, караць, нават пазбаўляць жыцця. Жорсткая эксплуатацыя выклікала сур'ёзныя хваляванні сялян у Глускім графстве Радзівіла. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў інвентары 1756 г., дзе гаворыцца, што сяляне Пагосцкага войтаўства раней узнімалі «бунт і паўстанне, выходзілі з паслушэнства, здзяйснялі разбойныя дзеянні». Адміністратару ад імя магната прадпісвалася дабівацца ад падданых паслушэнства, строга караць непакорных, утаймоўваць бунты і свавольствы.

Сярэдзіна XVIII ст. — гэта час заняпаду федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай, якую раздзіралі сацыяльна-класавыя канфлікты. Яна перажывала глыбокі эканамічны і палітычны крызіс, які асабліва абвастрыўся ў пачатку 1770-х гадоў. Унутраную слабасць краіны выкарыстоўвалі ўрады суседніх дзяржаў — Прусіі, Аўстрыі, Расіі, якія бесперапынна ўводзілі свае войскі для дасягнення ўласных палітычных мэт. Гэтыя дзяржавы выношвалі планы раздзялення Рэчы Паспалітай, імкнуліся пашырыць свае межы за кошт яе тэрыторыі. І гэта ім удалося: у 1772 г. адбыўся 1-ы падзел Рэчы Паспалітай паміж трыма дзяржавамі — Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Для ўсходніх зямель Беларусі пачаўся новы гістарычны этап — яны былі далучаны да Расіі.

Т.А.Матусевіч.

Дакументы сведчаць

ЗАПІС У АКТАВАЙ КНІЗЕ НАВАГРУДСКАГА ГАРАДСКОГА СУДА АБ ЗНАХОДЖАННІ КАЗАЦКІХ АТРАДАЎ У ГЛУСКУ, ПАРЭЧЫ НАВАГРУДСКАГА ПАВЕТА І Ў РУДОБЕЛЦЫ МАЗЫРСКАГА ВАЯВОДСТВА І АБ СПУСТАШЭННІ ІХ

11 жніўня 1661 г.

Лета от нароженя сына божого тысеча шестьсот шестьдесят первого м[ося]ца августа одынадцатого дня.

На рочках судовых кгродских августовых на дате звышвписаной прыпалых...[1] в замку г[оспо]дарском Новгородском отправочных, перед нами, Яном з халежа Халенским Стефаном Бруханским, судею, а Станиславом Жайдою, писаром, урадниками судовыми кгродскими земли Новгородское Становился перед нами пан Ежи Косожицкий, слуга посланных урядников от вельможного е[го] м[ило]сти пана Александра Хиларего Полубинского, писара польного В[еликого] к[няжес]тва Лит[овско]го, старосты Слонимского пана Адама Свидерского и пана Кшистофа Пшездецкого, которые перед нами, урядом, положили протестацию с реляцией генеральского осмотра об опустошении и сожжении владения названного Глуск и другого владения названного Поречье в воеводстве Новгородском расположенных со всеми к тем владениям принодлежностями. Из которого процесса и реляции указано то, что те владения Глуск и Поречье, [а] также имение Рудобелка от года тысяча шестьсот пятьдесят четвертого в руки неприятельские казацкие доставшиеся. Все те годы в руках неприятельских оставаясь очень опустошенными, разрушенными и сожженными остались. Поэтому не только те подати подымного в скарб отдавать неподо... но и до... поданные тамошние в гроде становиться не могли. Как сам декрет трибунала скарбового в году тысяча шестьсот пятьдесят девятом по либертации сеймовой года тысяча шестьсот пятьдесят пятого установленного в Гродно...

Напоследок, где войско его коро[левской] м[ило]сти полка ясновельможного его м[ило]сти пана Чарнецкого, воеводы русского, края русского и полесского, а при том те имения Глуск и Поречье тоже на Руси в Поелесье будучи [находящиеся] в руки неприятельские казацкие попали. Тогда до последнего для нужд солдат те имения опустошили, а после выхода войска коронного из тех краев снова... враждебное начала колония казацкая враждебная дотла опустошая те края, как то Глуск и Поречье, так и имение названное Рудобелка в повете Мозырском расположенное. Которое решение сейма недавнопрошедшего... его м[ило]сти, пану писарю польному ВКЛ... и в имениях его главных, названных Глуска и Поречья относящееся, только в июле начало осуществляться [проводиться] Слуцка, из имения Глусского, Поречского и из Рудобелки неприятеля выгнали и его м[ило]сть пан Оскирка полковник его кор[олевской] м[ило]сти, в том году тысяча шестьсот шестьдесят первом сначала... оный очистил край, потом, когда те враждебные казаки в часть только края Полесского отступили, а слуги вельможного его м[ило]сти пана писаря польного В[елико]го к[няжеств]а Лит[овского] после отступления неприятеля владения еще освобождения... Имения те Глуск и Поречье остались, потому, что и до того еще неприятель миловал, тогда и вышевыраженные урядники, глусский и порецкий, применительно к решению сейма недавнопрошедшего в том году тысяча шестьсот шестьдесят первом в Варшаве оконченного через слугу своего пана Косорицкого ставили к присяге перед нами, урядом, трех войтов глусских, поречских и рудобельских, которые перед нами, урядом, о таковом опустошении и присягу выполнили теми словами: Я, Андрей Печалейко, я, Олифер Кулич и я, Степан Молока, войты волости Глусской, Поречской и Рудобельской, присягаем пану Богу всемогущему в Тройце Святой единому на том, что те имения Глуск, Поречье и Рудобелка от года тысяча шестьсот пятьдесят четвертого аж до этого времени в руках казацких неприятельских оставаясь, очень разрушенными, сожженными и опустошенными осталось, так что сейчас не более со всего имения Глусского, кроме города, который Конституцией освобожден, оседлых дымов четырнадцать; в имении Поречье с Колчицами оседлых дымов двадцать шесть; а в имении Рудобелке, в котором перед тем подати до Мозыря отдавали с оседлых дымов восьми, остальные все дома впусте остались. На чем и

[1]Тэкст гэтага дакумента ў многіх месцах пашкоджаны.

как справедливо присягаем, так нам господи помоги, а если несправедливо, то господь нас покарай.

Которую присягу мы, уряд, выслушав, ее до скарба ВКЛ сейчас выдаем.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1730. Воп. 1. Спр. 2. Л. 1757—1758.

З ІНВЕНТАРА ГЛУСКАГА ГРАФСТВА МАЁНТКА КНЯЗЯ МІКАЛАЯ РАДЗІВІЛА (ПЕРАЛІК ДАХОДАЎ З МАЁНТКА, КОЛЬКАСЦЬ ЗЯМЛІ, ПАВІННАСЦЕЙ І ГРАШОВЫХ ВЫПЛАТ СЯЛЯН)

1708 г.

Общая ведомость годового дохода с Глусского владения

Чинш за стации:

	зл.	гр.
с гор. Глуска	3439	27
с дер. Балашевичи	516	10
с войтовства Кольчицкого	1854	7
с дер. Кольчиц Подлусских	918	—
с дер. Доколи	556	15
с дер. Хвастовичи	407	15
с дер. Мыслотино	618	15
с дер. Рудакович	171	—
с дер. Ольница	612	—
с дер. Дубровны	408	—
с дер. Межилесье	510	—
с приселка Палашевич	230	—
с дер. Буденич	751	15
с дер. Погост	353	—
с дер. Макарович	199	5
с дер. Сельцо	215	22 1/2
с дер. Калюги	87	15
с дер. Минковичи	500	—
Всего	11 898	26 1/2

Годовой аренды от глусских арендаторов и потаенных корчем, кроме чопового и шеляжного налога, 12 000. Всего 23 898 зл. 26 1/2 гр.

К этому дяклу: бочки меры дякловой — ржи 157 5/24, ячменя 10, пшеницы 2, гороха 2, овса 14 224 меры дякловой топтанной.

Штуки: гусей 70 23/24, кур 285 1/6, каплунов 19, яиц 210, грибов 1500, белок 42, хмеля солянок 6, ниток на невод мотков 900, дран 577 1/3, меда 1 камень 5/6 безмена.

В этом имении находится: волок тяглых 84 13/24, волок чиншевых 101 11/24, волок, засеваемых двором, 32 8/24, волок свободных у разных лиц 18 1/12. Всего 236 10/24. Всего в вол. Глусской и в городе домов 739, волов в волости 441, коней в волости 38, сыновей 196.

І. Войтовство Балашевичское, волок 40

Из них 21 2/3 1/6 волок тяглых чиншевых, 12 1/2 пустующих, засеваемых двором, 4 свободных пани Шимановской, 1 3/4, 1/12 вольных у столяра, мельника и стрельцов.

Годовой доход с Балашевич: с 21 2/3 1/6 волок тяглых чиншевых по 22 зл. — 480 зл. 10 гр., яловичного, кроме пани Шимановской, 36 зл. Всего 516 зл. 10 гр.

К этому дяклу: ржи 21 2/3 1/6 бочек дякловой меры, овса 21 2/3 1/6 бочек меры дякловой топтанной, кур 45 2/9 шт., гусей 10 3/4 1/12 шт., ниток на невод 132 мотка, дранки 87 1/4 коп.

Повинность Балашевичской вол.

1. С каждой тяглой чиншевой волоки должны платить по 22 зл. Чинш должны платить без всякого остатка серебряной монетой из расчета твердый талер по 8 зл. согласно нынешнему курсу, а в дальнейшем по будущему курсу, а если б кто куда-либо самовольно пошел прочь, то тогда должны платить всей деревней, чтоб княжеская казна не понесла никакого ущерба.

2. Яловичного должны давать с каждой волоки по 1 зл., исключая пани Шимановскую.

3. Пустующие волоки, находящиеся возле дер. Балашевичи, должны обработать для господского двора всей волостью: запахать, заборонить, с поля собрать, сенокосы скосить в свободные дни, а не за счет барщины. Пока эти волоки не разделяют между собой, они должны обрабатывать их, помимо барщины.

4. Кроме этого, они должны отработать барщину, с каждой волоки по 4 дня в неделю, с чем накажет двор: со скотом или пешие. Это значит: в неделю с волоки 4 дня, с полуволоки 2 дня, с четверти 1 день, с трети в 1-ю и 2-ю недели 1 день, а в 3-ю неделю с трети 2 дня, с шестой и восьмой частей по 1 дню в каждую неделю.

5. При этом в Глусский замок они должны давать дякло с волоки: а) по бочке ржи дякловой клейменной меры до краев без верха и б) бочке овса меры топтанной до краев без верха.

6. Должны отдавать с волоки кур 2, гусей 1/2, ниток на невод 6 мотков, дранки 4 копы.

7. Войтовство Балашевичское, Докольское, Погостское, Хвастовичское, которые находятся на барщине, должны по очереди направлять еженедельно по 17 сторожей, это значит в замок 3 сторожей и 4-ю сторожиху; в монастырь ксендзов — бернадинов 2 сторожей, на фольв. Лучки 3 сторожей и 1 сторожиху; в усадьбу замкового городничего Устарбовского Колотичи 2 сторожей, пани Шимановской — одного. А во время пребывания в Глуске князя эти же войтовства поочередно направляют сторожей по мере надобности.

8. Они должны посылать подводы с каждой волоки в Несвиж, с 2 волок — в Песковцы и с 3 волок — в Вильно.

9. Если бы господское зерно и весь глусский урожай продавались волости по виленской цене, как это принято по старому обычаю, а волость не пожелала бы уплатить по этой цене, то они должны на своих подводах отвести это зерно в Вильно.

Подводы на более близкие расстояния они должны предоставлять по очереди.

10. Ежегодно они должны отработать 9 гвалтов, а именно: на подъеме паров или на вспашке под рожь — 3 гвалта, причем должны выходить на работу все, кроме свободных, со всей упряжкой.

А на жатве также 3 гвалта. Когда будут выходить на жатву, надо следить за тем, чтобы из каждого дома выходили все, оставив одного для предотвращения пожара. Ежегодно 3 гвалта для доставки дров из леса по указанию господского двора. Кроме этого, они должны насыпать плотину под замком в случае её разрушения и чинить плотину у мельницы.

11. Согласно старому обычаю, все войтовства должны сдавать нити для сетей и вязать из них неводы, сети для птиц и зверей, следить за этими сетями и выходить на облавы.

12. В местах, где могут быть заезжие корчмы, они должны строить новые и исправлять старые.

13. Там, где в прежние времена деревни исправляли мосты и гати, они должны и теперь исправлять, чтобы был по возможности лучший проезд. Сверх этого ни в какой другой повинности, направлению посыльных подвод, выполнению работ или каких-нибудь надуманных повинностей как войтовство Балашевичское, так и Погостское, Докольское и Хвастовицкое не должны привлекаться на дальнейшее усмотрение и милость е.св. князя-благодетеля господина Глуска и Поречья.

14. При уплате чинша они должны давать вписаное на управляющего — по 1 зл. с волоки.

Все другие повинности в соответствии с уставом, выданным Балашевичскому войтовству, они должны во всем выполнять под угрозой штрафа и наказания, указанных в этом уставе.

II. Войтовство Кольчицкое, служб 30

Из них 27 1/6 служб чиншевых оседлых, 2 5/6 служб свободных у пана Кольчицкого.

Годовой доход с этого войтовства: с 27 1/6 служб по 60 зл. — 1630 зл., с 460 моргов и 15 прентов по 12 гр. — 184 зл. 7 гр., яловичного в общей сумме с войтовства 40 зл. Всего 1854 зл. 7 гр.

К этому дякла: ржи 27 1/6 бочек дякловой меры, овса 27 1/6 бочек топтанных дякловой меры, ячменя 10 бочек стации, пшеницы 2 бочки стации, гороха 2 бочки стации.

Повинности Кольчицкого войтовства

1. В Кольчицком войтовстве находится 27 1/6 служб.

С каждой службы ежегодно должен уплачиваться в княжескую казну чинш по 60 зл. без остатка в серебряных талерах по их нынешнему, а затем по будущему курсу. А если кто-либо самовольно уйдет, тогда должны платить всем войтовством, чтобы княжеская казна не понесла ущерба.

2. Все Кольчицкое войтовство должно выплачивать ежегодно по 40 зл. яловщины.

3. С пользующихся 460 моргами и 15 прентами по 12 гр. с морга, всего 184 зл. 7 гр.

4. Ржи 27 1/6 бочек дякловой клейменной меры по 96 виленских гарнцев до краев без верха, они должны вывозить эту рожь на господское поле для посева. Каждый свою рожь должен посеять и забороновать на барщине, а остаток ее отвести в замок.

5. Овса 27 1/6 бочек той же клейменной дякловой меры, топтанной до краев без верха, они должны сдавать замку.

6. Ячменя с этого Кольчицкого войтовства 10 бочек той же меры дякловой до краев без верха, пшеницы 2 бочки, гороха 2 бочки они должны сдавать Глусскому замку, как стацию.

7. Кроме того, начиная со 2 апреля вплоть до конца июня, в течение 12 недель они будут направлять по 20 работников с топорами, каждого на 3 дня в неделю. Таким же образом осенью, начиная с 1 сентября до конца ноября, они должны направлять пеших с топорами либо посылать их после сева до наступления зимы или же 10 работников должны работать по 6 дней еженедельно в замке или фольв. Лучки на вывозке леса в замок или на фольв. Лучки.

8. Они должны насыпать плотину и ремонтировать кольчицкую мельницу, если в этом будет необходимость.

Все войтовство обязано ежегодно в порядке гвалта косить все господские сенокосы, именуемые Жолвинец и Лучки, и сено сметать в стога.

10. Они должны выходить на облаву и к неводу на Кольчицком озере.

11. Из улова крупной рыбы 2 части должны быть отданы князю-благодетелю, а 3-я часть хозяину.

12. Подводы за солью высылаются по мере надобности к порту и далее к Песковцам. За полученную соль деньги в соответствии с ценой должны быть отданы в положенный срок.

13. А когда будут отсылать деньги за чинш и соль, то в 1-й год подводу должно дать, однако, не дальше Дятлович войтовство Балашевичское, а затем по очереди, год за годом, как записано в инвентаре, будут давать другие войтовства.

14. Если бы господское зерно продавалось целой волости по виленской цене, как это принято по старому обычаю, а волость не пожелала уплатить по этой цене, то они должны на всех подводах отвести его в Вильно.

15. Выбранных лиц нельзя принуждать к несению стражи в замке и посылать куда-либо, пусть теперь работают дома на себя. Но в случае какой-либо, упаси бог, опасности все они должны тотчас же являться в замок. Сверх этого войтовство Кольчицкое не будет привлекаться ни к одной другой повинности, посылкам, подводам, работам или облагаться какими-либо надуманными поборами.

В дни торжественных праздников и по воскресеньям все обязаны ходить в церковь от стара до млада, начиная с 10 лет, под угрозой штрафа и наказания, какие определены в уставе, данном Кольчицкому войтовству.

III. Дер. Кольчицы Подлусские, волок 20

Из них 18 волок чиншевых оседлых, 2 волоки подлусской церкви свободные.

Годовой доход с этой деревни: с 18 чиншевых волок по 50 зл. — 900 зл., яловичного по 1 зл. с волоки — 18 зл. Всего 918 зл.

Дякла: ржи 9 бочек дякловой меры, овса 9 бочек меры дякловой топтанной, гусей 9 шт., кур 96 шт., ниток на невод 108 мотков, дранки 72 копы.

Повинность дер. Кольчицы Подлусские

1. Чинша с каждой волоки по 50 зл., уплачиваемых без остатка в казну князя-благодетеля серебряной монетой, какая имеется теперь и какая будет в обращении в будущем. А если кто-либо самовольно уйдет, тогда должны платить всей деревней, чтобы казна князя-благодетеля не понесла никакого ущерба.

2. Они должны платить яловщины по 1 зл. с волоки.

3. Ржи с каждой волоки по полбочки дякловой клейменной меры до краев без верха. Овса также по полбочки топтанной дякловой клейменной меры до краев без верха. Кур 2, гуся 1/2, ниток на невод 6 мотков, дранки 4 копы.

4. Они должны выделять по 5 сторожей и не более, поочередно, начиная с Балашевич и никого не минуя.

5. Если бы господское зерно глусского урожая продавалось целой волости по виленской цене, как это принято по старому обычаю, а волость не пожелала бы уплатить по этой цене, то они должны на своих подводах отвести его в Вильно.

6. Выборных лиц нельзя принуждать к несению стражи в замке и посылать куда-либо. Пускай работают дома на себя. Но в случае, упаси бог, какой-либо опасности все они должны тотчас же являться в замок. Сверх этого деревня не будет привлекаться ни к каким повинностям, посылкам, подводам, работам или облагаться какими-либо надуманными поборами.

7. Они должны давать управляющему по 1 зл. с волоки, а для взимания чинша должны ежегодно выбирать из этой же деревни надежного и справедливого сборщика.

8. Все другие повинности определены точнее в уставе, выданном этой деревне, согласно которому они должны поступать.

IV. Войтовство Докольское

Дер. Доколье, волок 24

Из них 23 3/4 оседлых тяглых, 1/4 вольная у бондаря. Годовой доход с этой деревни: с 23 3/4 волок тяглых по 22 зл. — 522 зл. 15 гр., с застенков и моргов 10 зл., яловичного с волоки по 1 зл. Всего 556 зл. 15 гр.

Кроме этого дякла: ржи 23 3/4 бочек дякловой меры, овса 23 3/4 бочек дякловой меры, гусей 11 7/8, кур 47 1/2 шт., ниток на невод 42 1/2 мотков, дранки 95 коп.

Повинность Докольского войтовства

1. С каждой тяглой волоки по списку, указанному в инвентаре, они должны платить чинш по 22 зл. без остатка серебряной монетой, считая твердый талер по его нынешнему, а затем по будущему курсу. А если кто-либо самовольно уйдет, тогда должны платить всей деревней, чтобы княжеская казна не понесла ущерба.

2. Яловичного они должны давать по 1 зл. с волоки, а с застенков и моргов, которыми они пользуются, должны платить по 10 зл.

3. Кроме того с волоки по бочке ржи дякловой клейменной меры до краев без верха, составляющей 96 виленских гарнцев. Овса также с каждой волоки по бочке топтанной дякловой меры до краев без верха. Это дякло должно быть сдано в Глусский замок. Кур с волоки по 2, гусей 1/2, ниток на невод 6 мотков, дранки 4 копы.

4. Выставлять сторожей с находящихся на барщине войтовств Балашевичского, Докольского, Погостского, Хвастовичского согласно установленной очереди.

5. Другие повинности, как гвалты, подводы, выход на облавы, вязание сетей для птиц, работы на плотинах, мостах, гатях и затворах, подробнее описаны в уставе Балашевичского войтовства, согласно которому эти повинности во всем должны выполняться.

А сверх этого ни к какой другой повинности, подводам, посылкам, работам это Докольское войтовство в соответствии с записанным под Балашевичами уставом, данном этому войтовству, не должно быть привлечено и никакие надуманные поборы не должны с него взиматься.

V. Дер. Хвостовичи, волок 20

Из них 17 волок оседлых тяглых, 3 волоки глусской аренды и мельника.

Годовой доход с этой деревни: с 17 волок оседлых по 22 зл. — 374 зл., яловичного с волоки по 1 зл. — 17 зл., с застенков 16 зл. 15 гр. Всего 407 зл. 15 гр.

Кроме этого дякла: ржи 8 1/2 бочек дякловой меры, овса 17 топтанных липовых бочек.

Повинность дер. Хвостовичи

1. С каждой волоки по списку, указанному в инвентаре, они должны без всякого остатка вносить по 22 зл. серебряной монетой по ее нынешнему, а затем по будущему курсу.

2. Яловичного с волоки по 1 зл., а с застенков 16 зл. и 15 гр.

3. Дякла: ржи с волоки по полбочки дякловой клейменной меры до краев без верха. Бочка вмещает 96 виленских гарнцев. Овса с волоки по 1 липовой бочке топтанной меры до краев без верха. Кур, гусей, ниток и дранки не дают.

4. По старому обычаю барщина должна отрабатываться по 4 дня с волоки в неделю, с чем прикажут: со скотом или пешими, с полуволоки 2 дня в неделю, с четверти 1 день и во 2-ю неделю 1 день, а в 3-ю неделю 2 дня, с шестой и восьмой частей каждой недели по 1 дню.

5. Охрану должны нести по очереди с находящимися на барщине войтовствами и в порядке барщины поочередно возить зерно на мельницу для размола либо выделить для этого одного.

6. Подводы и другие повинности дер. Хвостовичи должна выполнять по данному ей уставу, записанному для дер. Балашевичи.

VI. Дер. Мыслотино, волок 6 5/6

Из них 4 1/2 волок тяглых, 2 1/3 волок приемных.

Кроме этого, с заст. Веретеи и земли Жуковской всей волостью платят 5 зл., а за 5 вновь разработанных Туринских шнуров всей волостью теперь должны платить 9 зл. 5 гр.

Годовой доход с этой деревни: с 4 1/2 волок тяглых по 25 зл. — 112 зл. 15 гр., с 2 1/3 волок приемных по 15 зл. — 35 зл.; с заст. Веретеи 5 зл. Яловичного с волоки по 1 зл. — 6 зл. 25 гр. С 5 Туринских шнуров 9 зл. 5 гр. Всего 168 зл. 15 гр.

К этому разного дякла: ржи 4 1/2 бочки дякловой меры, овса 2 1/2 бочки дякловой меры, особо ржи 4 1/2 липовых бочки, гусей 4 1/2 шт., кур 18 шт., каплунов 14, яиц 90 шт., грибов 450 шт., белок 18, меда 1 камень 5/6 безмена.

Повинность дер. Мыслотино

1. С тяглой волоки вносить без всякого остатка по 25 зл. чинша, а с приемной по 15 зл. Яловичного с волоки по 1 зл. С заст. Веретеи и земли Жуковской вся деревня должна платить по 5 зл. и с 5 вновь разработанных Туринских шнуров — по 9 зл. и 5 гр.

2. Ржи с волоки по 1 бочке клейменной меры, составляющей 96 гарнцев, до краев без верха, и особо ржи с волоки по 1 липовой бочке; овса по 1/2 бочки топтанной меры, гуся 1 с волоки, кур 4, яиц 20 с дыма и по 1 куре, грибов с волоки 100, белок с волоки по 4, меда 1 камень 5/6 безмена.

3. У бернардинов должна выполняться такая же работа, как и в прежние времена, а в казну князя-благодетеля ежегодно должна отдаваться подать.

4. Никакие подводы не должны посылаться, кроме как в Слуцк или Несвиж за вином по распоряжению бернардинов.

5. Дер. Мыслотино должна выделять поочередно с другими находящимися на барщине войтовствами двух сторожей.

6. На управляющего при сборе чинша они должны давать вписное по 1 зл. с волоки, а другие повинности выполнять по уставу, данному дер. Мыслотино.

7. Сверх этого дер. Мыслотино не должна привлекаться ни к какой повинности, посылкам, подводам, работам и облагаться какими-либо надуманными поборами до дальнейшего распоряжения князя-благодетеля Глуска и Поречья.

VII. Дер. Рудаковичи, волок 8

Из них 3 волоки тяглые, 3 волоки приемные, 2 волоки вольные с глусского попа.

Годовой доход с этой деревни: с 3 волок тяглых по 30 зл. — 90 зл., с 3 волок приемных по 25 зл. — 74 зл., яловичного по 1 зл. с волоки — 6 зл. Всего 171 зл.

Кроме этого дякла: 6 бочек овса топтанной дякловой меры, гусей 3 шт., кур 12 шт., каплунов особо 5 шт., яиц 120 шт., белок 24 шт., хмеля 6 солянок, ниток на невод 36 мотков.

Повинность дер. Рудаковичи

1. С волоки тяглой чинша по 30 зл., а с чиншевой по 25 зл., причем чинш должен выплачиваться без остатка.

Яловичного с волоки по 1 зл.

2. Дякла: 6 бочек топтанной дякловой меры до краев без верха. Со всей волости 1 гусь, кур 4, яиц 40, грибов 100 и особо с дыма по 1 каплуну, белок с волоки 4, хмеля солянка 1.

3. Все поочередно должны изготовлять солод для отцов-бернардинов и для замка.

4. Вписаное управляющему при взимании чинша по 1 зл. с волоки.

5. В случае надобности выезда в Дятловичи за князем-благодетелем они должны выделять подводы.

6. В праздники и по воскресеньям все должны ходить в церковь и говеть в великий пост под угрозой штрафа и наказания, указанных в данном им уставе.

7. А сверх того господский двор не должен привлекать их ни к какой другой повинности, посылкам, подводам и работам до дальнейшего распоряжения и милости его светлости князя на Глусске и Поречье.

8. С мельничного застенка в Крапивной, которым пользуется Леон Глаз, арендующий мельницу у попа Могильницкого, ежегодно следует платить по 5 зл. Рекомендуется управляющему выехать для обмера площади этого застенка с тем, чтобы либо засевать господским двором, либо установить за него большую плату, чем 5 зл.

VIII. Буденичское войтовство

Дер. Ольница, волок 12

Из них волок чиншевых 12.

Годовой доход: с 12 волок по 50 зл. — 600 зл., яловичного с волоки по 1 зл. — 12 зл. Всего 612 зл.

Кроме этого дякла: ржи 6 бочек дякловой меры, овса 2 липовые бочки топтанной меры, кур 24 шт., гусей 6 шт., ниток на невод 72 мотка, дранки 48 коп.

Повинность дер. Ольницы как и части чинша, так и дякла и во всем другом должна соответствовать повинностям, записанным для дер. Буденичи, и уставу, данному Буденичскому войтовству.

IX. Дер. Дуброва, волок 8

Из них 8 волок чиншевых.

Годовой доход с этой деревни: с 8 волок чиншевых по 50 зл. — 400 зл., яловичного с волоки по 1 зл. — 8 зл. Всего 408 зл.

Кроме этого дякла: ржи 4 бочки дякловой меры, овса 6 липовых бочек топтанной меры, кур 16 шт., ниток на невод 48 мотков, дранки 32 копы.

Повинность дер. Дуброва должна во всем соответствовать повинности, указанной в уставе, данном Буденичскому войтовству, который записан для дер. Буденичи.

X. Дер. Межилесье, волок 10

Из них 10 волок чиншевых.

Годовой доход с этой деревни: с 10 волок чиншевых по 50 зл. — 500 зл., яловичного с волоки по 1 зл. — 10 зл. Всего 510 зл.

Кроме этого дякла: ржи 5 бочек дякловой меры, овса 10 топтанных липовых бочек, кур 20 шт., гусей 5 шт., ниток на невод 60 мотков, дранки 40 коп.

Повинность дер. Межилесье должна во всем соответствовать повинности, предусмотренной уставом, данным Буденичскому войтовству и записанным для дер. Буденичи.

XI. Пос. Палашевичи, волок 5

Из них 4 1/2 волок чиншевых, 1/2 волоки свободной у буденичского войта.

Годовой доход с этой деревни: с 4 1/2 волок чиншевых по 50 зл. — 225 зл., яловичного с волоки по 1 зл. — 5 зл. Всего 230 зл.

Кроме этого дякла: ржи 2 1/4 бочки дякловой меры, овса 2 1/4 бочки топтанной меры, кур 9 шт., гусей 1 1/4 шт., ниток на невод 27 мотков, дранки 18 коп.

Повинность дер. Палашевичи во всем должна соответствовать повинности, описанной в уставе Буденичского войтовства для дер. Буденичи.

XII. Дер. Буденичи, волок 20

Из них 14 1/2 волок чиншевых, 4 волоки пана поручика, 1 1/2 волоки буденичской аренды.

Годовой доход с этой деревни: с 14 1/2 волок чиншевых по 50 зл. — 725 зл., с 4 волок пана поручика по 3 зл. — 12 зл. В этом 1708 г. пан поручик Алехнович освобождается от обложения податями по усмотрению князя-благодетеля. Яловичного по 1 зл. с волоки — 14 зл. 15 гр.

Кроме этого дякла: ржи 17 бочек дякловой меры, овса 14 1/4 липовых бочек топтанной меры, кур 29 шт., гусей 7 1/2 шт., ниток на невод 87 мотков, дранки 58 коп.

Повинность Буденичского войтовства

1. С каждой волоки, согласно списку, имеющемуся в инвентаре, чинш по 50 зл. с волоки, который должен выплачиваться в казну князя-благодетеля серебряной талеровой монетой по ее нынешнему, а затем по будущему курсу.

2. Отдельно с 4 волок поручик Алехнович по 3 зл. — 12 зл.

3. Яловичного с каждой волоки, исключая поручика Алехновича, по 1 зл. без всякого остатка.

4. В случае, избави бог, какой-либо опасности все должны являться в замок согласно старому обычаю.

5. Для ускорения сбора чинша из каждой деревни избирается сборщик, добросовестный порядочный человек.

6. При сборе чинша они должны давать по 1 зл. на управляющего.

7. А сверх этого дер. Буденичи и все Буденичское войтовство не должны привлекаться ни к каким другим повинностям.

8. Другие ж повинности должны выполняться согласно уставу, данному Буденичскому войтовству.

Войтовство Погостское

XIII. Дер. Погост, волок 15

Из них 15 волок чиншевых.

Годовой доход с этой деревни: с 15 волок чиншевых по 22 зл. — 330 зл., с застенков 8 зл., яловичного с каждой волоки по 1 зл. — 15 зл. Всего 353 зл.

Кроме этого дякла: ржи 15 бочек дякловой меры, овса 15 бочек топтанной меры, кур 30 шт., гусей 7 1/2, ниток на невод 90 мотков, дранки 60 шт.

Повинность войтовства Погостского

1. С каждой тяглой волоки, согласно списку, имеющемуся в инвентаре, они должны платить по 22 зл. чинша без остатка и притом серебряной монетой из расчета твердый талер по 8 зл. по его нынешнему курсу, а потом по будущему курсу.

2. Из этих 15 волок прирезаны дер. Калюга, с которых они должны отдавать только чинш и дякло, а отбывать барщину и нести охрану не должны.

3. Яловичного с каждой волоки они должны давать по 1 зл.

4. С заст. Чесноковщины с выгона 8 зл.

5. Барщину они должны отбывать, с чем прикажут: со скотом или пешком, еженедельно по 4 дня с волоки, по 2 дня с полуволоки, с четверти 1 день, с третьей части в 1-ю неделю 1 день, во 2-ю 1 день, а в 3-ю неделю 2 дня, с шестой и восьмой частей они должны отработать по одному дню в неделю.

6. Кроме этого они должны отдавать замку без всякого остатка с волоки: ржи по 1 бочке дякловой клейменной меры до краев без верха вместимостью 96 виленских гарнцев. Овса с волоки по бочке топтанной дякловой меры до краев без верха. Дякло должны сдавать замку без всякого остатка.

С волоки дается кур по 2, гусей 1/2, ниток на невод 6 мотков, дранки 4 копы.

7. Войтовства Балашевичское, Докольское, Погостское и Хвостовичское, находящиеся на барщине, обязаны поочередно, каждую неделю выделять по 17 сторожей, а именно: в замок 3 сторожей и 1 сторожиху, в монастырь бернардинов 2 сторожей, глусскому арендатору 4 сторожей, в Лучки 3 сторожей и 1 сторожиху, пану Устарбовскому 2 сторожей и пани Шимановской в Колотичи 1 сторожа. А во время пребывания в Глусске князя-благодетеля из тех же войтовств в порядке очередности охрана выделяется по мере надобности, но не чрезмерно туда, где она нужна.

8. Должны высылаться по одной подводе в Несвиж с каждой волоки, в Песковцы одна подвода с 2 волок, в Вильно одна подвода с 3 волок.

9. Если все господское зерно Глусского урожая будет продаваться всей волости по вилейской цене, как это принято по старому обычаю, а волость не пожелает платить по этой цене, то они должны на своих подводах отвести его в Вильно. Подводы для других более близких поездок должны выделяться по очереди.

10. С этого войтовства должно быть отработано 9 гвалтов в год, т.е. на подъеме паров или на вспашке под рожь 3 гвалта, на жатве 3 гвалта, на вывозке дров или леса 3 гвалта.

11. Все другие повинности должны выполняться согласно уставу, записанному и данному этому Погостскому войтовству, под угрозой наказания и штрафа за невыполнение. А к другим повинностям, не указанным в уставе, никто не может привлекаться.

XIV. Дер. Маковище, волок 16 1/2

Из них 8 1/2 волок тяглых, 8 господских пустующих волок.

Годовой доход с деревни: с 8 1/2 волок тяглых по 22 1/2 зл. — 183 зл. 10 гр., яловичного с волоки по 1 зл. — 8 зл. 15 гр., за огороды 7 зл. 10 гр. Всего 199 зл. 5 гр.

Кроме этого дякла: ржи 8 1/3 бочек дякловой меры, овса 8 1/3 бочек топтанной меры, кур 16 2/3 шт., гусей 4 2/3 шт., ниток на невод 46 мотков, дранки 32 2/3 копы.

Повинность дер. Маковище

1. Они должны платить по 22 зл. чинша с волоки согласно спискам, записанным в инвентаре.

2. С огородов 7 зл. 10 гр. Яловичного с волоки по 1 зл. без какого-либо остатка.

3. С пустующих волок, которые засеваются для господского двора, они не должны платить, а целой деревней обработать эти земли в свои дни, а не в счет барщины и засеять их

господским зерном. Эти земли они должны будут обрабатывать до тех пор, пока не разделят их между собой.

4. Эта деревня должна давать дякло, пшеницу и выполнять всякие повинности, записанные в уставе для дер. Погоста.

5. Лесничему Герману вменяется в обязанность выгонять на облавы и стеречь птичьи сети. Он освобождается от подвод и очередной охраны до дальнейшего распоряжения и милости князя-благодетеля.

XV. Дер. Селец, волок 9 3/4

Из них 6 1/8 волок тяглых, 3 волоки на общей плате без дякла, 5/8 волоки чиншевых. Годовой доход с деревни: 1. С 6 1/8 волок тяглых по 22 зл. — 134 зл. 22 1/2 гр., с 3 волок на общей плате 40 зл., с 5/8 волок чиншевых по 50 зл. — 31 зл. 7 1/2 гр., яловичного 6 зл. 22 1/2 гр., с застенка 3 зл.; всего 215 зл. 22 1/2 гр.

1. К этому дякла: ржи 6 1/2 бочек дякловой меры, овса 6 3/4 бочек топтанной меры, гусей 3 1/6 шт., кур 12 1/2 шт., ниток на невод 36 2/3 мотков, дранки 24 1/2 коп.

Повинность дер. Селец во всем одинакова с повинностью, описанной для дер. Погост; только с 3 волок, которые состоят на общей оплате, без дякла, не дают кур, гусей, ниток, дранки. Яловичного они платят 40 зл.

Василий Стрельченя с 1/2 и 1/8 волоки должен платить большой чинш — по 31 зл. 7 1/2 гр. яловичного и должен давать рожь и овес, а кур, гусей, нитки и гонт не дает и никаких повинностей не должен выполнять, кроме поездок в подводы, в то время, когда они будут отправляться чиншевиками, и то он не должен ехать один со своей подводой, а должен сложиться с кем придется. Во время приезда князя-благодетеля он должен заботиться о птицах.

После окончания составления инвентаря дети Федора Антюшени просили и мы их освобождаем от несения стражи и барщины, кроме обязательного выхода на жатву и гвалт.

XVI. Дер. Калюга, волок 2 1/2

Из них 2 1/2 волоки тяглых.

Годовой доход от этой деревни: 1. С 2 1/2 волок тяглых по 22 зл. — 55 зл., яловичного 3 зл. 15 гр., с заст. Сущика 30 зл. Всего 87 зл. 15 гр.

2. К этому дякла: ржи 2 1/2 бочки дякловой меры, овса 2 1/2 бочки топтанной меры, кур 5 шт., гусей 1 1/4, ниток на невод 15 мотков, дранки 10 коп.

Повинность дер. Калюги

1. С каждой тяглой волоки чинша по 22 зл., а с заст. Сущика всей деревней должны платить ежегодно 30 зл. Яловичного с волоки по 1 зл.

Дякла: ржи с волоки по 1 бочке клейменной меры до краев без верха вместимостью 96 гарнцев, овса с волоки по 1 бочке дякловой топтанной меры без верха, кур 2, гусей 1/2, ниток на невод 6 мотков, дранки 4 копы.

2. Барщину они должны отрабатывать, с чем прикажут; со скотом либо пешком по 4 дня с волоки в неделю. С 1/2 волоки в одну неделю 1 день, во 2-ю 1 день и в 3-ю неделю 2 дня, с шестой и восьмой частей по 1 дню на неделю, однако если пойдет мужчина, то не пойдет женщина, а если пойдет женщина, то мужчина не должен идти.

3. Другие повинности они должны выполнять в полном соответствии с уставом этого Погостского войтовства под угрозой наказания.

XVII. Дер. Минковичи, волок 10

Из них 10 волок чиншевых.

Годовой доход от этой деревни: с 10 волок чиншевых по 50 зл. — 500 зл.

К этому дякла: ржи бочек 5 дякловой меры, овса 10 топтаных липовых бочек, гусей 10 шт., кур 20 шт.

Повинность дер. Минковичи

1. С каждой чиншевой волоки, согласно списку, имеющемуся в инвентаре, по 50 зл. Чинш они должны выплачивать в казну князя-благодетеля ежегодно без какого-либо остатка серебряной монетой по ее нынешнему, а в дальнейшем по будущему курсу.

2. Яловичного и за морги они должны платить по той причине, что во время комиссии Константина Кондратовича были оставлены 4 пустые волоки, причем деревня была освобождена от уплаты 16 зл. яловичного и моргового на дальнейшее усмотрение и милость князя-благодетеля.

3. Кроме того, с волоки: ржи по 1/2 бочки дякловой клейменной меры до краев без

верха из расчета одна бочка — 96 виленских гарнцев, овса с волоки по 1 липовой бочке дякловой меры, гуся 1/2, кур 2. Дубовые бочки для пушечных колес, клен и дуб для лафетов следует давать тогда, когда это необходимо, а других досок они не должны давать.

4. Они обязаны вязать неводы и сети для птиц и зверей, стеречь последние и ходить на облавы.

5. Корчмы новые строить и старые ремонтировать. Там, где эта деревня издавна ремонтировала мельницы, плотины, гати и заторы, она и теперь то же самое должна делать.

6. Ездить в подводы за солью до порта и не дальше. Покупать соль и отдавать за нее деньги в установленный срок, а когда деньги чиншевые и за соль будут отсылаться, то они должны отвозить их не далее чем до Дятлович.

7. А если господское зерно и весь глусский урожай продается всей волости по виленской цене, как издавна установлено обычаем, а волость не пожелает платить по этой цене, то они должны отвести его на своих подводах в Вильно.

8. При уплате чинша они обязаны давать пану управляющему по 1 зл. вписанного с каждой волоки.

9. А сверх этого ни к какой другой повинности, посылкам, подводам, работам эта деревня не должна привлекаться и не может облагаться никакими надуманными поборами.

10. В дни торжественных праздников и по воскресеньям все должны посещать церковь и каждый должен говеть под угрозой наказания, указанного в уставе этой деревни, в соответствии с которым она должна выполнять все повинности.

Пераклад з польскай мовы.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 210—223.

СКАРГА ГЛУСКІХ МЯШЧАН КНЯЗЯМ РАДЗІВІЛАМ НА ШЛЯХЦІЦА Ю.СКІНДАРА

Жнівень 1728 г.

Ваши милости, светлейшие князь и княгиня, милостивые господа!

Поливая кровавыми слезами господские стопы, мы всем гор. Глусском, не только взрослые, но и дети наши, плача горькими слезами, жалуемся на враждебного вам, нашим милостивым господам, и злостного шляхтича, вернее разбойника, пана Юзефа Скиндера, владельца Орешкович, расположенных в Минском воев. Указанный шляхтич, будучи пьяным, в сопровождении пьяных крестьян, напав на глусских мещан Павла Ребуху, Еску Лапотя и двоих других помоложе — Петра и Степана, находившихся в доме хозяина Никиты в дер. Блужи, спросил их: «Откуда вы мужики?». Они сказали: «Из Глусска, милостивый пан». После чего он, ничтожная особа, начал поносить ваших светлостей, наших милостивых господ. Видя, что в нем заиграла злая кровь или, вернее, что паном Скиндером овладел злой дух, двое из названных лиц, что помоложе, Петр и Степан, глусские мещане, убежали из дома. А тех двоих, Павла Ребуху и Еську Лапотя, запер, стал бить их по лицам, затем велел им танцевать, что они и вынуждены были сделать. Когда же они, будучи трезвыми, не желали и от усталости не могли больше танцевать, он повалил их на пол и начал безбожно избивать поленьями. Бил, не глядя, куда попало — по голове, по бокам, по спине, топтал ногами, давил поленьями грудь и животы. И до тех пор вместо с пьяными мужиками издевался над ними, пока они не потеряли сознание, т.к. у них еле теплилась жизнь. А он похвалялся, что (людям), избитым без всякого повода, уплатит.

Они же вместе с теми, хотя и перепуганными, но здоровыми, что сбежали, еле добрались после этого истязания до дер. Дричин за 4 мили. Один из избитых, Павел Ребуха, на 4-й день после этого истязания, т.е. 29 ноября в субботу вечером, умер и 30 дня, в воскресенье, текущего 1724 г. был при участии священника похоронен в той же дер. Дричин. А другой, Еська Лапоть, лежит и теперь избитым при смерти. Тела обоих, как покойника, так и живого, до того избиты, что целого не осталось даже с ноготь. Все избито, невыносимо истерзано. Даже выбиты глаза и кости на боках переломаны. Вероятно, и другой не выживет, хотя душа в нем еще держится. Лежит он в деревне, т.к. его невозможно перевести в Глусск.

Об этой внезапной смерти глусских мещан, убитых паном Скиндером, докладываем вам, нашим наследственным владельцам. Не соизвольте, господа, это оставить, потому что всех нас перебьют. Немало разбоев творится не только под городом, но и в самом городе из-за этих пьяниц. Нет возможности выйти из дому. И еще докладываем, что покойник Ребуха

задолжал разным людям в гор. Глусске свыше 100 зл. Двое малых деток его остались сиротами. Дом его опустел. Со слезами докладываем об этом вам, нашим господам, и слезно молим отомстить за нанесенное вам оскорбление и за своих наследственных подданных. Не дайте же нам окончательно погибнуть от этих разбойников. А мы, видя вашу милостивую защиту, будем вечно слать молитвы за своих господ к престолу господнему. Наследственные подданные и нижайшие слуги ваших милостей, светлейших князя и княгини.

Остап Лапоть
Тимох Рабуха+
Влас Рабуха+
Прокоп Туз+
И весь город+
Иохим Крысенко, войт глусский
Матвей Робыш
Александр Лосеко +
Григорий Лосовский +
Александр Довидович собственноручно
Ян Шопына.

Пераклад з польскай мовы.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 2. С. 300—301.

Уладанні Кіева-Пячэрскага манастыра на Глушчыне

Царква, як і дзяржава, і феадалы, належала да ліку самых буйных і багатых землеўладальнікаў у ВКЛ. Гэта найбольш выразна і пераканаўча можна прасачыць на прыкладзе Кіева-Пячэрскага манастыра, які ў канцы XVI ст. валодаў шматлікімі землямі і ўгоддзямі ва ўсіх паветах Кіеўскай губерні. Ды і не толькі тут. Уладанні манастыра цягнуліся далёка за межы гэтай мясцовасці; яму належалі таксама многія маёнткі ў Белай Русі і Літве, у паветах: Слуцкім, Лагойскім, Бабруйскім, Глускім, Магілёўскім і Віленскім. Як сведчыць вопіс, складзены ў красавіку 1593 г., старажытнаму праваслаўнаму манастыру належалі два гарады (Васількаў і Радамышль), два мястэчкі, да 50 вялікіх сёл, 5 селішчаў, 3 выселкі, 5 сядзіб, 2 двары, 2 замкі, розныя рыбныя лоўлі, млыны, рачныя перавозы, мядовыя і грашовыя даніны, бабровыя гоны і іншыя ўгоддзі.

У зборніках актаў манастыра ўтрымліваюцца дакументы: розныя запісы і духоўныя завяшчанні багатых феадалаў, якія пацвярджаюць яго правы землекарыстальніка. Гэта «пацвярджальная грамата князя Юрыя Сямёнавіча на валоданне землямі і людзьмі ў Глушскай і Парэцкай валасцях, раней 1480 г.; запіс — адмова князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага на маёнтак Гарадок з выселкамі і Вольніцу ў Глушскай воласці, 1516 г. сакавіка 6».

Кіева-Пячэрскі манастыр меў у глускіх землях і так званыя прывілеі, атрыманыя ім ад розных князёў, якія некалі валодалі тутэйшымі землямі, з пацвярджэннем гэтых правоў каралямі. Гэта прывілей князя Юрыя Васільевіча «на имене на Ясень у Глуской волости»; прывілей князя Сямёна Сямёнавіча «на имене у Глуской волости на Косоричи, на имене Иванищовичи»; прывілей князя Сямёна Альгімонтавіча «на имене Хоромцы у Глуску»; прывілей князя Сямёна Юр'евіча, старосты слуцкага, «на имене у Глуску на Велче»; прывілей князя Юрыя Юр'евіча «на имене Порече»; прывілей князя Васіля Юр'евіча «у Глуской волости на Ясенев и Осово»; ...«привилей княгини Семеновое... на имене Хоромцы»; прывілей княгіні Ульяны Юр'еўны на «имене у Глуску на Косоричи»...

Князі абавязваюцца за сябе і за нашчадкаў сваіх даваць Кіева-Пячэрскаму манастыру даніну ў выглядзе розных прадуктаў харчавання і грашовай дапамогі. Аднак пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай, у перыяд, калі каталіцызм пачынае ўзмоцнена ўкараняцца на беларускіх тэрыторыях, багаты Кіева-Пячэрскі манастыр даволі значны час не мае магчымасці належным чынам карыстацца сваімі велізарнымі матэрыяльнымі сродкамі. Імі імкнуцца завалодаць асобы, якія перайшлі на бок каталіцкай царквы і прагнулі нажывы.

Гэта адбывалася па той прычыне, што ў Паўднёва-Заходняй Русі замяшчэнне вышэйшых духоўных пасад залежала пераважна ад польскіх каралёў, якія прысвоілі сабе назву «вярхоўных падатканосьбітаў сталіц духоўных і ўсіх хлябоў духоўных» і карысталіся неабмежаванымі правамі пры раздачы епіскапстваў і манастыроў. Такі парадак суправаджаўся для праваслаўнай царквы гібельнымі вынікамі. На вышэйшыя іерархічныя месцы сталі пазіраць, у большасці выпадкаў, як на даходныя, як на сродак хуткай нажывы. Іх дамагаліся (пускаючы ў ход самыя розныя сродкі) не асобы, падрыхтаваныя да выканання высокіх духоўных абавязкаў, а радавітыя шляхціцы, занятыя толькі пытаннямі аб царкоўных маёнтках.

Прадметам падобных дамаганняў з боку свецкіх асоб быў і багацейшы Кіева-Пячэрскі манастыр. У яго вопісах маецца нямала запісаў, якія сведчаць аб тым, што глускія князі, якія сталі ўладальнікамі гэтай мясцовасці, усяляк ухіляліся выконваць абавязацельствы, некалі ўзятыя іх продкамі перад манастыром. Гэта асабліва стала відавочным у перыяд, калі гаспадаром Глуска стаў князь Аляксандр Іванавіч Палубінскі. Кіеўскі архімандрыт Іларыён, пачынаючы з 1557 г., падае неаднаразова на князя ў каралеўскі суд, імкнучыся ўсталяваць справядлівасць. Але дарэмна. Палубінскі на працягу дзесяці гадоў не плаціць «грашовай і мядовай даніны» са сваіх маёнткаў Даколь і Парэчча. Яго падданыя захопліваюць манастырскі востраў Весны, сенажаці, зямлю ворную на востраве Арэскім. «Забаронена манастырскім сялянам лавіць рыбу ў рэчцы Арэсе, у вольніцкіх і межылескіх праваслаўных сялян выдраны пчолы княжацкімі сялянамі-хвастаўлянамі; у манастырскіх сялян захоплены сенажаці ва ўрочышчах Ваўсарожжы і Бярозках» і да т.п.

Праз некалькі гадоў дамаганні князя на маёмасць праваслаўнага манастыра становяцца больш настойлівымі. У маі 1576 г. ён захоплівае сяло Іванішчавічы, якое належала Кіева-Пячэрскаму манастыру. Сяло было далучана да княжацкага маёнтка Глуска, з сялян сабраны паборы і пакінуты ў іх княжацкі ўраднік. Праз год кіева-пячэрскі архімандрыт Мялецій Храбтовіч скардзіцца каралеўскай уладзе на захоп князем Аляксандрам Палубінскім манастырскага маёнтка Вольніца.

Яшчэ пазней з князем Палубінскім, каштелянам навагрудскім, яго жонкай княгіняй Соф'яй Юр'еўнай, народжанай Гальшанскай, з сынам князем Аляксандрам Аляксандравічам Палубінскім, каштелянам навагрудскім, судовую цяжбу вядзе ўжо архімандрыт Кіева-Пячэрскага манастыра Нікіфар Тур. Сутнасць прэтэнзій усё тая ж — «затрыманне розных данін, якія павінны брацца з яго маёнткаў на карысць манастыру, і аб зробленых ім зямельных захопах». І толькі ў 1597 г. справа заканчваецца мірным пагадненнем. Даніны з гэтых месцаў, запісаныя яшчэ князямі Гальшанскімі і «княгінямі дому Астрозскага», былі вернуты манастыру. Пры Нікіфары Туры правы Кіева-Пячэрскага манастыра былі адноўлены і, акрамя таго, князь Палубінскі абавязаўся выплаціць буйную штрафную суму (1300 коп грошаў), аднак не захацеў стрымаць сваіх абавязацельстваў і зрабіў перавод спрэчных паселішчаў на ваяводу віленскага, князя Крыштофа Радзівіла, супраць чаго Нікіфар Тур не замарудзіў заявіць свой пратэст. Мітрапаліт Міхаіл Рагоза дамогся, каб гэта сума была прысуджана і аддадзена яму, мітрапаліту. Пасланнік Нікіфара Тура быў схоплены па загадзе мітрапаліта, і ў яго адабралі дакументы, якія былі пры ім. Справа яшчэ больш ускладнілася пасля скаргі агрэбленага манаха.

Як сведчаць дакументы больш позняга перыяду, маёнткі, што належалі Кіева-Пячэрскаму манастыру, застаўшыся пад уладай Польшчы пасля адыходу Кіева да Расіі (1669), былі адабраны ў яго рознымі асобамі, якія, карыстаючыся ваенным часам, захапілі гэтыя маёнткі, учынілі наезды, грабяжы, бойкі, спусташэнне, знішчылі ранейшыя межавыя знакі і зрабілі новыя. «Гэта адбылося ў Іванішчавічах, пад Глускам і ў іншых месцах. Некаторымі праваслаўнымі архіепіскапамі была незаконна ўзята ўлада над манастырамі, у выніку чаго разарылі гэтыя манастыры і даходы іх зварочвалі на сябе і на сваіх родзічаў» (Киевский митрополит Пётр Могила и его сподвижники. Опыт исторического исследования С.Голубева. Киев, 1883. Ч. 1. С. 204).

Т.А.Аляксандрава.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У 1772 г. у выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай усходнія землі Беларусі былі далучаны да Расійскай імперыі. Граніца паміж Польшчай і Расіяй пасля гэтага падзелу праходзіла па Заходняй Дзвіне да Віцебска, затым паварочвала на поўдзень і ішла па прамой да вытокаў Друці, праходзіла ўздоўж гэтай ракі да ўпадзення яе ў Дняпро і працягвалася па Дняпры.

Рэчыцкі павет Мінскага ваяводства, у які ўваходзіў у гэты час Глуск і суседнія воласці, аказаўся, такім чынам, пагранічнай тэрыторыяй з Расіяй, а цэнтр павета — Рэчыца — быў на дзяржаўнай мяжы, на правым беразе Дняпра. Усё гэта прымусіла дзяржаўныя ўлады Рэчы Паспалітай пайсці на змяненне геаграфічнага цэнтра павета і з Рэчыцы перанесці яго ў Бабруйск, што было больш зручна для жыхароў.

Гэтыя крокі па далейшым адміністрацыйным упарадкаванні тэрыторыі краіны не толькі ўзнялі статус Бабруйска, які ў той час знаходзіўся ў занепадзе, але і прылеглых да яго тэрыторый, у тым ліку і суседніх валасцей — Гарадоцкай (у шэрагу дакументаў сустракаецца напісанне Гарадкоўская воласць), Глускай і іншых. Заўважалася ажыўленне эканамічнага жыцця гэтага краю, пашырэнне маштабаў унутранага гандлю і рамяства. У 1791 г. былі ўнесены некаторыя змены ў адміністрацыйны падзел краіны. Глуск аказаўся ўключаным у склад Случарэцкага павета Навагрудскага ваяводства. У студзені 1793 г. адбыўся 2-і падзел Рэчы Паспалітай. Але Расія фактычна завалодала зноў набытымі землямі яшчэ ў канцы 1792 г. Тады ж пад кантроль расійскай улады трапіў і Глуск.

Трактат аб 2-м падзеле Рэчы Паспалітай быў ратыфікаваны Гродзенскім сеймам 1793 г., апошнім сеймам Рэчы Паспалітай, якая дажывала свае апошнія дні і праз 2 гады знікла з карты Еўропы. Гэта адбылося ў выніку 3-га падзелу ў 1795 г. Так спыніла сваё існаванне адна з самых буйных дзяржаў на еўрапейскім кантыненце. Каля 3 мільёнаў чалавек, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, аказаліся ў складзе Расійскай імперыі.

Насельніцтва беларускіх зямель на працягу месяца пасля апублікавання ўказа аб іх уключэнні ў склад Расійскай імперыі прыводзілася да прысягі. Асобы, якія адмаўляліся прысягаць, павінны былі ў 3-месячны тэрмін выехаць за мяжу. Ім дазвалялася на працягу гэтага тэрміну прадаваць нерухомую маёмасць, у адваротным выпадку яна перадавалася ў казну.

Пераважная большасць шляхты, якая не жадала губляць сваё багацце, прынесла прысягу. Яна атрымала ўсе правы і прывілеі, якімі карысталася дваранства паводле законаў Расійскай імперыі.

Руская адміністрацыя з асаблівай увагай адносілася да шляхты і ўсімі сродкамі ахоўвала яе інтарэсы (настойліва адшуквалі і вярталі ўладальнікам збеглых сялян, сачылі, каб не адбылося «падрыву ў промыслах арандароў і ў даходах уладальнікаў» і інш.). Дваранству і купецтву беларускіх зямель дазвалялася выбраць дэпутатаў для выпрацоўкі праекта новага агульнарасійскага ўлажэння. Інтарэсы польскіх і беларускіх феадалаў-католікаў абараняла даравальная грамата Кацярыны II аб заснаванні Беларускай каталіцкай епархіі. Грамата захоўвала каталіцкую веру і свабоднае выкананне абрадаў. Маёмасць каталіцкіх цэркваў і манастыроў заставалася ў недатыкальнасці. Аднак каталіцкаму і уніяцкаму духавенству катэгарычна забаранялася схіляць у іх веру праваслаўных.

Рускі ўрад разам з тым рашуча ліквідаваў на далучанай тэрыторыі Беларусі амаль неабмежаваную самастойнасць буйных феадалаў, адмяніў

права трымаць уласныя войскі, мець свае крэпасці і г.д. На гарады Беларусі былі пашыраны прынцыпы кіравання, якія вызначаліся ў даравальнай грамаце гарадам Кацярыны II.

Адміністрацыйнае кіраванне наладжвалася накшталт расійскай сістэмы. Устанаўліваўся падзел на губерні і паветы. Глуск трапіў у склад новаўтворанай Мінскай губерні, а калі суседні Бабруйск атрымаў статус павятовага горада і стаў цэнтрам даволі вялікага па тэрыторыі (12,2 тыс. м²) павета Мінскай губерні (1796), Глуск увайшоў у гэты павет як цэнтр воласці. Паводле звестак генерал-пракурора сената аб колькасці насельніцтва беларускіх губерняў па 5-й рэвізіі, праведзенай у 1796 г., у павеце на той час пражывалі 35 762 чалавекі. У параўнанні з ранейшай колькасцю душ яна павялічылася на 7368 чалавек.

Сяляне ў далучаных губернях засталіся ў тым жа самым становішчы, у якім яны знаходзіліся пры польскім кіраванні: павінны былі выконваць усе ранейшыя павіннасці і плацяжы і заставацца ў поўным паслушэнстве ў сваіх паноў. На апошнія абставіны руская адміністрацыя звяртала асаблівую ўвагу і нават прадпісвала земскім судам карыстацца ваеннымі камандамі для ўціхамірвання «упорствующих против своих владельцев».

Нярэдка адбываліся ўцёкі сялян ад аднаго памешчыка да другога. Жадаючы спыніць гэтае «беззаконне», мінскі губернатар прадпісаў усім уладальнікам не прымаць ні ў якім разе людзей без пісьмовых пасведчанняў ад іх памешчыкаў. Забаранялася пераходзіць з месца на месца і людзям вольным.

Такая настойлівасць рускай адміністрацыі ва ўтрыманні на ранейшым месцы жыхарства не толькі прыгонных, але і вольных людзей, бясспрэчна, узмацніла панаванне шляхты над сельскім насельніцтвам. Раней яна вымушана была ўжываць розныя льготы, каб утрымліваць сялян ад уцёкаў, цяпер жа можна было звярнуцца да ўлад, і збеглыя без прамаруджвання адшукваліся і вярталіся сваім уладальнікам.

У канцы XVIII ст. павялічыліся адработачныя павіннасці сялян. У пачатку XIX ст. у некаторых памешчыкаў сяляне працавалі на паншчыне да 6 дзён у тыдзень незалежна ад колькасці і якасці зямлі, якой яны карысталіся.

На далучаных да Расіі тэрыторыях першыя 2 гады не збіраліся і не спаганяліся падаткі. Але з 1795 г. зноў быў уведзены падушны падатак і яго памер значна павялічыўся: на сем грыўняў грашыма і на трыццаць капеек хлебам з душы, прычым хлебны збор у выпадку неўраджаю ў некаторых месцах замяняўся грашыма.

Вельмі цяжкім было становішча сялян у тых глускіх сёлах, якія ўваходзілі ў дзяржаўнае памесце — Бабруйскае староства. Па сваіх павіннасцях яны падраздзяляліся на паншчынныя і аброчныя, часта паншчына дапаўнялася яшчэ і аброкам (прадуктовым і грашовым). Акрамя аброку з сялян спаганяліся і іншыя грашовыя зборы.

На Глушчыне пражывала нямала яўрэяў. Іх становішча, як і ў іншых месцах, першапачаткова было вызначана вядомым маніфестам генерала Крачэтнікава ад 27 сакавіка 1793 г., у якім гаварылася: «Еврейские общества, жительствующие в присоединенных к империи Российской городах и землях, будут оставлены и сохранены при всех тех свободах, коими они... пользуются».

Аднак праз год імператрыца Кацярына II вызначыла мяжу яўрэйскай аселасці, куды ўвайшло некалькі губерняў, у тым ліку і Мінская. Некалькі пасяленняў яўрэяў было і на Глушчыне.

Па гарадах на гэтых тэрыторыях яўрэям дазволена было запісвацца ў мяшчанства і купецтва, але з той умовай, каб яны плацілі ўстаноўленыя

падаткі «вдвое противу положенных с мещан и купцов христианского закона разных исповеданий», а калі б хтонебудзь з яўрэяў не пажадаў застацца, то ім дазвалялася, пасля ўплаты трохгадовага двайнога падатку, выехаць за межы Расіі.

Да гэтага патрэбна дадаць і тое, што з 1775 г. дзейнічаў яшчэ адзін загад імператрыцы — аб наладжванні яўрэйскіх таварыстваў. Такім чынам, яўрэі былі абмежаваны ў правах рассялення на тэрыторыі Расійскай імперыі і абкладзены двайным падаткам, але ў астатнім яны мелі роўныя правы з купцамі і мяшчанамі хрысціянскага веравызнання. Яны маглі займацца гандлем і рознымі промысламі, маглі займаць розныя пасады, толькі ў справах, што датычылі «абрадаў, законаў і богаслужэнняў», павінны былі падпарадкоўвацца яўрэйскім кагалам.

У руках рускіх яўрэяў быў сканцэнтраваны ўнутраны рынак і асноўны гандаль. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі прыметна ўзрасла колькасць купцоў-яўрэяў, пашырыўся гандаль. У яго развіцці па-ранейшаму важную ролю адыгрывалі кірмашы.

У мястэчку таргі адбываліся штотыднёва па нядзелях, а кірмашы збіраліся раз на год — «у дзесятую пятніцу пасля Вялікадня».

Сюды прыязджалі купцы з многіх беларускіх гарадоў і нават з Расіі, прывозілі мноства рознага тавару. Глускія гандляры прадавалі на рынку скупленыя імі ў сялян навакольных вёсак сельскагаспадарчыя прадукты і вырабы рамёстваў, а таксама сукно, шкуры, чай.

Уцягненне Беларусі ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму дабратворна ўплывала на развіццё ўсіх галін яе эканомікі, у тым ліку і сельскай гаспадаркі. Больш выгадныя ўмовы і пашырэнне рынку збыту сельскагаспадарчых прадуктаў, адмена пошлін на іх продаж, ліквідацыя ўнутраных мытняў стымулявалі рост іх вытворчасці.



План Глуска. XIX ст.

З 1793 г. Глуск і воласць пераходзяць у прыватную ўласнасць графа Юдыцкага, зяця Радзівіла. Генерал-паручнік польскіх войскаў Іосіф Юдыцкі ў хуткім часе пабудаваў тут медны завод. Звестак аб тым, колькі на ім працавала рабочых, колькі вырабляласа прадукцыі, не засталося. Амаль ва ўсіх вёсках на Глушчыне ў пачатку XIX ст. існавалі гуты, на якіх выраблялiся ў вялікай колькасці паташ, смала і дзёгаць. Суднаходная Бярэзіна дазваляла наладжваць іх сплаў аж у Херсон і Крамянчуг. І як паведамляў у 1804 г. мінскі губернатар, хоць гуты і «не ўваходзяць у род фабрык, але па тым прыбытку, які яны прыносяць гаспадарам сваім, іх работа заслугоўвае вялікай увагі».

На Глушчыне, як у цэлым на Беларусі, ствараюцца сялянскія ссыпныя (збожжазапасныя магазіны). Гэта былі своеасаблівыя страхавыя склады, заснаваныя на штогадовых прымусовых узносах у натуры, якія паступалі ад усіх сялян воласці. Такія магазіны меліся ў вёсках Гарадок, Слаўкавічы, Вольніца і іншых.

Адразу ж на далучаных да Расіі беларускіх тэрыторыях пачалося будаўніцтва паштовых станцый, якіх там яшчэ не было. Імянным указам імператрыцы Кацярыны II прадугледжвалася за 3 гады, пачынаючы з 1795 г., пабудаваць на ўсіх станцыях паштовыя

дамы. На гэтыя мэты Мінскай губерні выдаткоўвалася 69 тысяч рублёў. Меркавалася, што пошту будуць вазіць 1—2 разы ў тыдзень, а з абедзвюх сталіц — па 2 разы ў месяц.

Было складзена апісанне беларускіх паштовых дарог, якія будаваліся для ўнутранай паштовай сувязі і для зносін з іншымі гарадамі і царскімі рэзідэнцыямі, з пералічэннем усіх станцый на шляху руху і населеных пунктаў, дзе меркавалася іх пабудаваць. Для кожнай з іх устанаўлівалася пэўная колькасць паштальёнаў і коней для прагону.

Па маршруце, які праходзіў па тэрыторыі Глушчыны (ад Нясвіжа праз Слуцк і Бабруйск да Рагачова), планавалася пабудаваць 9 паштовых станцый, у тым ліку 2 з іх прыпадалі на гэтую мясцовасць і знаходзіліся ў Глуску і в. Вільча. На паштовых станцыях меркавалася ўтрымліваць 4 паштальёнаў і 8 коней.

Грошы на ўзвядзенне станцый збіраліся з насельніцтва, існаваў спецыяльны паштовы збор па 7,5 кап. срэбрам з кожнай душы. Памешчыкі павінны былі пастаўляць для будаўніцтва лес, даваць фурманкі і сялян.

Адначасова з узвядзеннем паштовых станцый на вызначаным маршруце пачалося будаўніцтва паштовай дарогі. Яна была шырокай, прамой, балоцістыя мясціны асушаліся. Паабапал дарогі капалі канавы для адводу вады, за імі ў два рады садзілі бярозы. Паляпшэнне стану шляхоў зносін садзейнічала пашырэнню на Глушчыне гандлёвых сувязей.

Пэўнае ажыўленне ў жыццё глускага краю ўнесла будаўніцтва Бабруйскай крэпасці, якое пачалося паводле рашэння імператара Аляксандра I у 1810 г. Узвядзенне гэтага ваеннага аб'екта на месцы старога замка расцэньвалася як адна з важнейшых ваенна-абарончых работ у Расіі. Пасля таго як стары рубеж Прыбалтыйскага ўмацаванага раёна, створаны пры Пятры I, у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай апынуўся ў глыбіні значна пашыранай тэрыторыі Расійскай імперыі, паўстала пытанне, як абараніць набытыя землі, калі пачнецца вайна. Яшчэ Кацярына II у час паездак па Беларусі ў апошнія гады свайго праўлення звярнула ўвагу на ўдалае размяшчэнне г. Бабруйска. Горад стаў перавалачнай базай рускай арміі. Пасля таго як яна пацярпела некалькі паражэнняў ад напалеонаўскіх войскаў за мяжой і французскі імператар у адкрытую стаў гаварыць пра сусветнае панаванне, стала зразумела — вайны не пазбегнуць. Таму г. Бабруйск, дзе меўся мураваны езуіцкі кляштар і іншыя будынкі, якія лёгка было рэканструяваць, выбралі для будаўніцтва ваеннай крэпасці ў лініі абароны на захадзе імперыі.

Сюды дастаўляліся будаўнічыя матэрыялы з Карэліі, Украіны, нават Каўказа, Урала. У асноўным усё перавозілася коньмі і рачным шляхам. Можна ўявіць, колькі працы было ўкладзена і якой цяжкай. На ўзвядзенне крэпасці зганялі і прыгонных сялян з Магілёўскай, Мінскай і Чарнігаўскай губерняў. Ад кожнай губерні патрабавалі, акрамя таго, 500 фурманак, будаўнічыя матэрыялы. Аднак асноўны цяжар па выкананні работ на ўзвядзенні крэпасці, безумоўна, клаўся на плечы сялян навакольных вёсак. Здаралася якая няўпраўка, і ў першую чаргу на яе ліквідацыю бралася рабочая сіла, фурманкі менавіта адсюль.

У пачатку ліпеня 1810 г. ужо некалькі тысяч гараджан і сялян былі размеркаваны па розных работах. У асноўным, яны будавалі цагельны завод і пазней працавалі на ім, іх выкарыстоўвалі на распрацоўцы лесу для крапасных збудаванняў і ўзвядзенні палісадаў, на нарыхтоўцы дроў для спальвання іх на вугаль, на падвозе матэрыялаў на будаўнічыя пляцоўкі крэпасці.

Будаўніцтва вялося вельмі актыўна. Ужо да канца наступнага 1811 г.

амаль усе форты ўяўлялі сабой грозную сілу. А ў сярэдзіне 1812 г. Бабруйская крэпасць была ў асноўным пабудавана.

Пад сценамі крэпасці знайшлі свой апошні прытулак не адна сотня салдат і прыгонных сялян.

Т.А.Матусевіч.

Вайна 1812 г.

Прадбачанні аб непазбежнасці вайны з Напалеонам спраўдзіліся: 24 чэрвеня 1812 г. армія французскага імператара (каля 600 тыс. чалавек), якая была ў гэты час сканцэнтравана на рускай мяжы, перайшла Нёман і без аб'яўлення вайны напала на Расію. З першых жа дзён тэрыторыя Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў.

Супраць французаў Расія магла выставіць 3 арміі агульнай колькасцю 200 тысяч чалавек пад камандаваннем Барклая дэ Толі , П.І.Багратыёна і А.П.Тармасава. Пад націскам перавышаючых сіл непрыяцеля рускія арміі пачалі адступленне ў глыб краіны. 1-я армія Барклая дэ Толі ішла ад Вільні на Віцебск, 2-я П.І.Багратыёна — з Ваўкавыска праз Нясвіж, Слуцк рухалася на Бабруйск, Магілёў на злучэнне з 1-й. Адступленне суправаджалася сутычкамі з непрыяцелем, які ўжо захапіў Мінск.

Насустрач арміі Багратыёна, якая адступала, па загадзе камандуючага гарнізонам Бабруйскай крэпасці Г.А.Ігнацьева выступілі шматлікія абозы з прадуктамі і фуражом, каб стомленыя людзі і коні змаглі падмацавацца. Было накіравана звыш 600 фурманак, на якіх вывезлі ўсе гарматы, параненых, хворых салдат Багратыёна. Жыхарам Гарадоцкай воласці прыйшлося назіраць рух адступаючай 2-й арміі Багратыёна, якую праследавалі войскі французскага генерала Даву. Бясконцым патокам ішлі стомленыя салдаты, доўгім ланцугом цягнуліся абозы з параненымі, правіянтам, са статкамі жывёлы, што значна стрымлівала рух. Дарога вяла ў асноўным глухімі лясамі, дзе не вельмі паскорыш крок.

Навокал паспяваў добры ўраджай збожжавых, але мала хто думаў сабіраць яго. Многа хлеба было патаптана і патраўлена, частка знішчана ў снапах, а месцамі нават спалена, каб ён не дастаўся ворагу.

Жыхары вёсак пакідалі хаты, забіралі маёмасць і ўцякалі ў лясы.

Ужо з 15 ліпеня часці генерала Багратыёна пачалі падыходзіць да Бабруйскай крэпасці, а 18 ліпеня ўся армія спынілася каля магутных крапасных сцен.

Рускія войскі стаялі тры дні, збіраліся выступіць на Магілёў, але паступілі звесткі, што горад ужо захоплены французамі, і тады Багратыён выбраў наступны маршрут: Стары Быхаў — Мсціслаў — Смаленск, дзе і далучыў свае войскі да арміі Барклая дэ Толі. Дзве арміі злучыліся, атрымаўшы магчымасць нарошчваць сілы. За час знаходжання ў Бабруйску 2-я армія атрымала падмацаванне (з ліку крапаснога гарнізона), папоўніла запасы харчавання, пакінула ў крэпасці хворых і параненых. Неўзабаве пад Бабруйскам сталі лагерам напалеонаўскія войскі — тут быў разгорнуты ўзмоцнены пяхотай 4-ы кавалерыйскі корпус Латур-Мабура. У гэты ж час генерал Ігнацьеў аддаў своечасовы загад па Бабруйскім павеце, які непасрэдна датычыўся ваенных падзей і асаднага становішча дадзенай мясцовасці. Ён строга прадпісваў памешчыкам, уладальнікам, арандатарам, аканомам выконваць распараджэнні каменданта крэпасці. У выпадку ж нейкай валакіты ці свядомага невыканання вінаватага чакала смяротнае пакаранне. Мястэчкі і вёскі, у якіх не збіраліся падпарадкоўвацца ці аказвалі рускім войскам супраціўленне, павінны былі вынішчацца агнём. Смерць пагражала і тым людзям, якія па сваёй ахвоце пачалі б нарыхтоўку фуражу для захопнікаў. Рэкамендавалася на той выпадак, калі да вёскі набліжалася непрыяцельская калона, усім без выключэння ўцякаць у лясы, запасы прадуктаў знішчаць агнём. Той, хто не выконваў гэтага пункта загаду, лічыўся здраднікам — яго чакаў расстрэл, а маёмасць перапісвалася ў казну.

Пры наведванні населеных пунктаў рускімі войскамі прадпісвалася, наадварот, вёскі не пакідаць і спакойна займацца сваімі справамі, бо ад праходзячых войскаў «нікому знявагі не будзе». Вельмі суровае пакаранне пагражала

тым памешчыкам і ўласнікам, якія пад агаворкай, што робяць гэта з мэтай уласнай абароны ад рабункаў, задумалі б узброіць сваіх сялян. Больш таго, гаварылася, што кожны ўзброены ў вёсках і лясах Бабруйскага павета будзе расстраляны на месцы.

У цытадэлі працягвалі рыхтавацца да рашучых баёў з непрыяцелем. Змагацца яе абаронцам давялося не з французамі, а з польскім корпусам генерала Дамброўскага, які ўваходзіў у армію Напалеона. Палякі змянілі каля сцен Бабруйскай крэпасці корпус Латур-Мабура. Дывізіі Дамброўскага былі таксама падначалены 28-я лёгкая кавалерыйская брыгада Д.Дзеваноўскага і асобныя французскія часці, што размяшчаліся ў Мінскай губерні (усяго каля 12 тыс. чалавек пры 20 гарматах). Глуск і суседнія воласці таксама аказаліся ў руках польскіх заваёўнікаў. У мястэчку, а таксама ў Вільчы і Гарбацэвічах размясціліся іх прадуктовыя склады.

Нельга абысці ўвагай той факт, што ў польскім грамадстве памкнуліся выкарыстаць вайну Напалеона з Расіяй для таго, каб вярнуць дзяржаўнасць, узняўшы паўстанне, і аб'яднаць правінцыі, якія некалі належалі Польшчы, у адзінае цэлае. У Варшаве з гэтай мэтай адбылася Генеральная канфедэрацыя 1812 г., якая прыняла адпаведны акт.

На тэрыторыях, занятых французскімі войскамі, праводзілася работа з заклікам да аб'яднання былых польскіх правінцый. У многіх паветах Мінскай губерні былі падпісаны акты аб далучэнні. Бабруйскі павет прымкнуў да канфедэрацыі ў мястэчку Глуск пад кіраўніцтвам генерала Ражнецкага.

Аблога Бабруйскай крэпасці працягвалася. Авалодаць ёй у адкрытую вораг не асмельваўся. Для бамбардзіроўкі патрабавалася асадная артылерыя, а не тыя 20 палявых гармат, якія былі ў Дамброўскага. Тым болей, што на флангу знаходзіўся корпус Эртэля (11 тыс. чалавек пры 18 гарматах). Таму польскі генерал вырашыў проста трымаць крэпасць у аблозе, перакрыўшы сваімі войскамі дарогі, што вялі да Бабруйска. Але разлікі захопнікаў не ажыццявіліся. Галоўныя сілы корпуса Эртэля (каля 5 тыс. чалавек) скрытна падышлі 14 верасня да Глуска, выбілі з яго слабы польскі гарнізон і рушылі на Бабруйск. Дамброўскі не паспеў сканцэнтраваць свае сілы. На наступны дзень у баі каля в. Гарбацэвічы рускія атрымалі рашучую перамогу, аднак Эртэль не працягваў наступленне і, знішчыўшы прадуктовыя склады французаў у Глуску і ваколіцах, вярнуўся ў Мазыр. Аднак і Дамброўскі вымушаны быў сканцэнтраваць войска каля Свіслачы, маючы на ўвазе ўжо не столькі дзеянні супраць Бабруйскай крэпасці, колькі прыкрыццё напрамку на Мінск, дзе войска Напалеона атрымала ўдар ад арміі адмірала Чычагова, у выніку якога Мінск быў вызвалены ад французаў. 12 кастрычніка Дамброўскі фактычна зняў блакаду і адышоў на Ігумен, пакінуўшы невялікія атрады каля Глуска і Свіслачы. У лістападзе апошнія польскія і французскія часці выйшлі з-пад Бабруйска, іх праследаваў вылучаны Эртэлем атрад.

Вайна 1812 г. прынесла велізарныя бедствы. У раёнах баявых дзеянняў многія гарады і вёскі былі моцна разбураны, шмат загінула людзей. У час гэтай вайны моцна пацярпеў Глуск і навакольныя тэрыторыі. У глускіх вёсках засталося вельмі мала жывёлы, бо ўся яна за невялікім выключэннем была выкарыстана для харчавання гарнізона Бабруйскай крэпасці, а таксама корпуса генерал-лейтэнанта Эртэля і для іншых ваенных патрэб. Не хапала коней, многія палі засталіся незасеянымі азімымі на 1813 г., хоць і адчувалася вострая патрэба ў хлебе. Ад голаду і холаду ў вёсках і мястэчку пачаліся масавыя эпідэміі, якія давяршылі тое, што не давяла да канца вайна: загінула і памерла шмат людзей. Глушчына ўяўляла паўсюднае разбурэнне — немінучы вынік вайны.

Наступны 1813 г. выдаўся вельмі цяжкім. «Почти половинная часть полей озимых и яровых хлебом не была засеяна», адзначаў мінскі губернатар, «и хотя всходы по весне и начале лета обещали изобильную жатву, но напоследок продолжавшиеся беспрестанно дожди при холоде не допустили в свое время собрать зерно, что много повредилось на корне и даже в снопах, так что неспособен уже был к новому посеву, а на низких местах остался не снятым или снесенным водой...» (Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1961. Т. 3. С. 166.)

Т.А.Матусевіч.

Грамадска-палітычны рух у першай палавіне XIX ст.

Беларусь пасля вайны не выходзіла з неўраджайных і галодных гадоў. Асабліва цяжкімі былі 1820—1822 гг. Аднак царскі ўрад і ў гэтых умовах працягваў адстойваць прыгонныя парадкі, нават вярнуў канфіскаваныя маёнткі панам, якія падтрымлівалі Напалеона ў час ваенных дзеянняў 1812 г. Дарэмна сяляне, што ўдзельнічалі ў барацьбе супраць акупантаў, чакалі палёгкі свайго становішча. Прыгнёт іх з боку памешчыкаў яшчэ больш узрос. Апошнія, імкнучыся кампенсаваць страты, панесеныя ў час вайны, узмацнялі прымус сялян і яшчэ больш іх разаралі.

Першая палавіна XIX ст. — час узмацнення грамадска-палітычнага руху ў Беларусі, як і ў Расіі ў цэлым. Ён развіваўся пад уплывам рускай рэвалюцыйнай думкі, а таксама польскіх нацыянальна-вызваленчых ідэй. Рэвалюцыйныя падзеі ў Заходняй Еўропе сустракалі тут жывы водгук. Асобныя прадстаўнікі дваранскай моладзі, атрымаўшы адукацыю ў замежных універсітэтах, блізка ўспрымалі перадавыя ідэі таго часу.

Патрабаванні дваранскіх рэвалюцыянераў ліквідаваць самадзяржаўе і прыгоннае права, якія станавіліся тормазам у далейшым жыцці краіны, сталі асноўнай праграмай дзеянняў і руху дзекабрыстаў. Нягледзячы на тое, што паўстанне дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу 14 снежня 1825 г. пацярпела паражэнне, рух дзекабрыстаў ускалыхнуў многія гарады і вёскі, бо гэта было першае адкрытае ўзброенае выступленне супраць прыгоннага самадзяржаўнага ладу. Сяляне маёнтка Халопенічы, у які ўваходзілі вёскі Катка, Касарычы, былі вельмі ўзрушаны, даведаўшыся, што супраць цара «пайшоў» таксама сын памешчыка Лапы, якому належаў гэты маёнтак. Сапраўды, ураджэнец Бабруйскага павета Міхаіл Лапа — адзін з беларускіх дзекабрыстаў.

Менавіта дзекабрысты паклалі пачатак рускаму вызваленчаму руху. Сам факт паўстання, хоць яно і не дасягнула высакароднай мэты аблягчэння лёсу працоўнага народа, з'явіўся высокім маральным прыкладам лепшай часткі дваранскай моладзі яе гатоўнасці да самаахвяравання ў імя лепшага будучага радзімы.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Глушчыны ў першай палавіне XIX ст.

Велізарны попыт на хлеб у першыя два дзесяцігоддзі XIX ст. выклікаў хуткі эканамічны рост памешчыцкіх гаспадарак. У 1840-я гады пад збожжавымі культурамі ў большасці глускіх маёнткаў было занята 30—50% усёй ворнай зямлі.

Важнае значэнне ў сельскагаспадарчай вытворчасці мела хуткае павелічэнне пасеваў бульбы, ператварэнне яе з агароднай у палявую культуру, якая стала адной з важнейшых крыніц даходаў у памешчыцкіх гаспадарках.

Як адзначалася ў справаздачах мінскага губернатара за гэты перыяд, у губерні галоўным чынам развіваецца «земляробства і вінакурства, заснаванае на перапрацоўцы бульбы... Вырошчванне бульбы з году ў год узмацняецца...»

У параўнанні з паляводствам жывёлагадоўля, у прыватнасці, мяса-малочная, на працягу першай палавіны XIX ст. яшчэ не стала таварнай галіной.

Паступова ў памешчыцкіх гаспадарках пачынае развівацца танкарунная авечкагадоўля. І хоць у Мінскай губерні пагалоўе авечак было значна ніжэйшае, чым у Гродзенскай, але развядзеннем мерыносаў была занята вялікая колькасць памешчыцкіх гаспадарак. Воўна паступала як за мяжу, так і ў гарады Расіі, а таксама на мясцовыя суконныя прадпрыемствы. У маёнтку Завалочыцы ў 1843 г. існавала суконная мануфактура, дзе выраблялася тавараў на суму 15 000 рублёў. Тут жа працаваў медны завод, на якім вытворчасць тавараў складала 5400 рублёў. У маёнтку Дварэц, які, як і Завалочыцы, належаў памешчыкам Быкоўскім, меўся невялікі гарбарны завод.

Але ж галоўнай галіной многіх памешчыцкіх гаспадарак з'яўлялася вінакурства. Цяжкасць збыту зерня і выгаднасць продажу гарэлкі і спірту спрыялі развіццю ў Мінскай губерні вінакурства, асабліва з

1820-х гадоў, калі ў якасці сыравіны стала шырока ўжывацца бульба.

Гэтым даходным відам дзейнасці займаліся і ў вотчынных гаспадарках на Глушчыне. У маёнтку Халопенічы, які належаў памешчыкам Лапам, у 1836 г. быў заснаваны вінакурны завод, а праз некалькі гадоў такі ж завод адкрыўся ў маёнтку Хваставічы. У сярэднепамесных памешчыкаў існавалі больш дробныя вінакурні. Выгаднасць іх утрымання заключалася ў асноўным праве, якое называлася прапінацыйным і было ўстаноўлена польскімі каралямі ў XIII—XIV ст. Некалькімі стагоддзямі пазней гэтае права распаўсюдзілася на многія правінцыі. Сутнасць яго заключалася ў тым, што памешчыкі мелі права не толькі гнаць віно ў сваіх броварах, але і прадаваць яго ў сваёй гаспадарцы. Прапінацыйнае права служыла важнай крыніцай для абагачэння памешчыкаў, якія прадавалі віно ў корчмах без правозу і амаль за налічныя грошы.

Значнай крыніцай папаўнення грашовых сродкаў многіх памешчыкаў Глушчыны быў продаж лесу. У 1840-я гады ў Мінскай губерні ён быў значна пашыраны. Мінскі губернатар у справаздачы за 1836 г. адзначаў, што ў Бабруйскім і іншых паветах наладжаны даволі актыўны гандаль з Краменчугом, Херсонам і Адэсай страявым лесам. Рака Пціч у многіх месцах была загароджана плацінамі і мастамі, і гэта значна перашкаджала сплаву лесу. Плытагонам прыходзілася перацягваць звязкі бярвенняў па адной калодзе. Вось што пісаў пра Пціч Г.Штугенберг у 1830 г.: «Ад пачатку ракі да в. Сіманавічы Бабруйскага павета лічыцца 90 вёрстаў. Тут пачынаюць узвышацца сярод балот лясістыя берагі ракі, так што ўжо крыху вышэй гэтага пункта наладжваецца сплаў лесу, для пропуску якога ў Сіманавіцкай млынавай плаціне зроблена адтуліна. Адсюль да Гарадка на адлегласці 8 вёрстаў сплаў ажыццяўляецца з цяжкасцямі, таму што млынавая плаціна загароджвае раку і прымушае перацягваць лес, які сплаўляецца, па адной калодзе; зручней сплаўляць бярвенні ад в. Гарадзішча, якая ляжыць за 3 вярсты ніжэй Гарадка, але і тут паблізу Барысаўшчыны (12 вёрстаў ад Гарадка) сплаў зноў запавольваецца з-за моста. Далей у 8 вярстах ніжэй, паблізу в. Заполле, перашкаджае сплаву запруда, зробленая для лоўлі рыбы. За 4 вярсты ад Заполля ляжыць м. Глуск, якое служыць цэнтральным пунктам для гандлю па Пцічы. Каля тутэйшага млына выкапаны адводны канал даўжынёй 500, шырынёй 7 сажняў, так што сплаў тут ажыццяўляецца без цяжкасцей».

У буйных маёнтках памешчыкі спрабавалі выкарыстаць навейшыя рацыянальныя спосабы вядзення гаспадаркі. Яны набывалі сельскагаспадарчыя машыны (у асноўным малатарні і веялкі, сячкарні, у меншай меры сеялкі, жняркі). Падобныя імкненні асобных памешчыкаў мелі вельмі абмежаванае распаўсюджванне. Гэта былі асобныя з'явы, якія патаналі ў агульнай масе адсталай сялянскай гаспадаркі пры прыгонніцкіх адносінах і прымітыўнай тэхніцы.

Большасць памешчыкаў Глушчыны, як і ўсёй Мінскай губерні, прытрымлівалася традыцыйнай трохпольнай сістэмы земляробства, дзе пераважала вырошчванне збожжавых культур. Прымусовая праца паўсюдна панавала на памешчыцкай зямлі, якая апрацоўвалася цяглавай сілай прыгонных сялян.

Як і раней, зямля ўзорвалася сахой, баранавалася драўлянай бараной. Толькі ў асобных выпадках пры ўборцы хлеба ўжываліся сярпы і жалезныя бароны. Малацілі збожжа драўлянымі цапамі, зерне, прызначанае для ўласнага спажывання, часцей за ўсё не веялі.

Нізкі агратэхнічны ўзровень земляробства ва ўмовах паншчыны выклікаў частыя неўраджаі. Асабліва значны з іх ахапіў усе губерні Беларусі ў 1844—1845 гг. Ён суправаджаўся масавай гібеллю жывёлы і наклаў свой адбітак і на наступныя гады, на працягу якіх сяляне не змаглі ўзняць гаспадарку.

У першай палавіне XIX ст. значна павялічылася колькасць паншчынных сялян. Да сярэдзіны стагоддзя яны складалі звыш 97% усіх памешчыцкіх сялян.

Паказчыкам заняпаду сельскай гаспадаркі ў 1850-я гады і цяжкага становішча сялянства быў няспынны рост нядоімак.

Заняпад сялянскай гаспадаркі абумовіў і крызісны стан памешчыцкай. Аб гэтым сведчыла зніжэнне даходнасці большасці маёнткаў. Хутка павялічвалася колькасць закладзеных маёнткаў, здадзеных у аднаку за нявыплату даўгоў, прададзеных з публічных таргоў.

Не змог устаяць пад ударамі крызісу, што пачынаў скаланаць ужо прыгонную сістэму, і ўладальнік глускага маёнтка граф Іосіф Юдыцкі. Ён запазычыў значныя сумы грошай і не змог іх вярнуць. Прыйшлося за даўгі аддаць крэдыторам значную частку свайго маёнтка. Так, у 1838 г. в. Балашэвічы была падзелена паміж І.Бжастоўскім, В.Грынеўскім і Г.Свідам. Апошні стаў таксама гаспадаром вёсак Заполле, Калацічы, Лучкі, часткі Мыслоціна. Літаральна па некалькі двароў былі раздадзены крэдыторам вёскі Рылавічы і Калюга. Сельцы таксама аказаліся падзеленымі паміж некалькімі гаспадарамі: 5 двароў (35 жыхароў) адышлі Т.Тышкевічу, 3 двары (22 жыхары) — С.Свіду і г.д. Пагост набыла Г.Валоўская.

Аднак разарэнне графа Юдыцкага на гэтым не спынілася, яно працягвалася, і праз некалькі гадоў ён пазбавіўся і Хваставіч — адной з лепшых вёсак свайго маёнтка, дзе ў 1841 г. быў пабудаваны вінакурны завод. Яна адышла І.Бжастоўскаму.

У 1847 г. былі страчаны таксама вёскі Даколь, Розлевічы і інш. Яны сталі ўласнасцю новых гаспадароў.

Каб спыніць нарастаючы заняпад, пазбегнуць сялянскіх хваляванняў, некалькі аслабіць сацыяльныя супярэчнасці, якія падрывалі феадальна-прыгонніцкую сістэму, царскі ўрад прыняў у гэтыя гады шэраг мер. Але яны не далі жаданых вынікаў.

Пануючы клас пачаў усё больш усведамляць неабходнасць карэнных змен у сістэме гаспадарання і кіравання сялянамі. У шэрагу месцаў самі памешчыкі прапаноўвалі ўжыць «надзвычайныя» меры — адмовіцца ад прыгоннага права. Усю недасканаласць існуючай прыгоннай сістэмы раскрыла Крымская вайна. Яна, па сутнасці, стала тым апошнім штуршком, які паскорыў адмену прыгоннага права.

Першая палавіна XIX ст. увайшла ў гісторыю Расійскай імперыі як час падаўлення ўсялякага пратэсту і незадавальнення ў краіне. Пасля паўстання дзекабрыстаў і паўстання 1830—1831 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі Мікалай I прыняў жорсткія захады супраць якога б там ні было вальнадумства. Гэта выявілася перш за ўсё ў вялікадзяржаўным непрызнанні нацыянальнай самастойнасці беларускай мовы. Паводле ўказа ад 25 чэрвеня 1840 г. адмянялася дзеянне Літоўскага статута ў тых губернях, дзе ён яшчэ дзейнічаў, уводзілася рускае заканадаўства. Усе адміністрацыйныя і дзяржаўныя акты павінны былі пісацца толькі па-руску. Выкладанне ў навучальных установах таксама павінна было весціся толькі на рускай мове. Беларусь страціла гістарычную назву сваёй тэрыторыі, яна стала называцца Паўночна-Заходнім краем.

Народная асвета на Глушчыне ў гэты час была прадстаўлена толькі некалькімі царкоўнапрыходскімі школамі. У1857 г. у мястэчку пражывала 3278 душ, з іх яўрэяў 3000 душ, мелася 430 двароў, мураваны каталіцкі касцёл, бернардзінскі кляштар, 2 драўляныя праваслаўныя царквы, 5 яўрэйскіх школ.

Дарэчы, Глуск у гэты час быў ужо не адзіным мястэчкам у тутэйшым краі. У 1846 г. статус мястэчка набыла в. Гарадок, якая ўваходзіла ў склад маёнтка Дварэц.

У Мінскай губерні ў гэты час працягваліся работы па паляпшэнні стану шляхоў зносін паміж гарадамі, мястэчкамі, сёламі. Шашэйных дарог тут дагэтуль не было. У 1839 г. пабудавана дарога з м. Гарадок, якая выводзіла на Бабруйск. З 1843 г. вялося будаўніцтва шашы Брэст—Бабруйск. З Глуска ішлі 2 дарогі: на Багушоўку (33 вярсты) і на Сіманавічы (28,5 вярсты). Яны адносіліся да дарог 2-га разраду і на сваёй агульнай працягласці мелі 6 мастоў і 15 гацей. Гэтыя транспартныя шляхі зносін шырынёй ад 3 да 6 сажняў выкарыстоўваліся як паштовыя, знаходзіліся пад наглядам земскай паліцыі і рамантаваліся за кошт земскіх натуральных павіннасцей.

Мелася ўжо 1430 вёрстаў паштовых дарог, з якіх трэцяя частка пралягала па месцах нізінных, забалочаных, і ўтрыманне іх у спраўным стане патрабавала вялікіх намаганняў. Паштовыя дарогі дзяліліся на ўчасткі, апошнія, таксама як і масты, і плаціны на іх, утрымліваліся асабістымі павіннасцямі сялян і мяшчан.

У час будаўніцтва шашы Брэст—Бабруйск на ўчастку каля в. Сіманавічы былі ўзведзены паштовая станцыя і неабходныя для яе гаспадарчыя пабудовы. У 1900 г. станцыю ўзначальваў С.С.Сергучоў.

Т.А.Матусевіч.

Дакументы сведчаць

З ЗАПІСКІ МІНСКАГА ГУБЕРНАТАРА ПРА ПАДЗЕІ ВАЙНЫ 1812 г. У ГУБЕРНІ

31 мая 1838 г.

Во второй половине июня 1812 г. войска Наполеона вступили в Минскую губернию тремя колоннами. 1-я из них, составлявшая главную армию, следовала через Вилейский и Дисненский уу., 2-я под начальством кн. Экмюльского — через Минский и Игуменский, а 3-я под командою генерала Латур-Мобура — через Слуцкий, Бобруйский и Игуменский же уезды. Вслед за российскими войсками под командованием кн. Багратиона шел корпус генерала Латур-Мобура, держа направление через мест. Глуск, мимо крепости Бобруйска, и переправясь через р. Березину в мест. Свислочи и дер. Панюшкевичах в 14 и 40 верстах от крепости Бобруйска. Принадлежащая к сему корпусу дивизия генерала Домбровского, отделясь от своего отряда, заняла лежащее в 40 верстах от крепости Бобруйска мест. Свислочь и протянулась на пространстве от гор. Слуцка до гор. Старого Быхова Могилевской губ., составив, таким образом, наблюдательный корпус за крепостью Бобруйском. Главная же армия следовала через Вилейский, Дисненский и Борисовский уу. по Смоленской дороге.

Проходя по этому направлению Минскую губ., французские войска не только разоряли везде жителей самопроизвольными и непомерными поборами, но и грабили даже имущество частных лиц, дозволяя себе при сих случаях всевозможные злоупотребления и насилия... переход французских войск через Минскую губ. и кратковременное пребывание в оной некоторой части из них до того обеднил как городских жителей, так равно помещиков и крестьян, что по изгнании неприятеля многие не в состоянии были уплачивать обыкновенных податей.

В то же самое время, когда в Литовском крае составлялись ...временные управления и приводились в исполнение разорительные для туземцев их действия, в Варшаве под влиянием и с утверждением короля саксонского герцога варшавского Фридриха Августа, под управлением кн. Адама Чарторийского составлялась генеральная конфедерация, целью которой было распространить во всех провинциях, некогда принадлежавших к Польше, мысль о восстании и соединить их в одно целое. В этом же духе собранные в Варшаве на сейм штаты составили акт и прислали оный в гор. Вильно. Литва приступила к сей конфедерации 14 июля 1812 г., а прочие места сообразно времени занятия их французскими войсками и призыву их к сему соединению. И так, в Минском у. принят акт конфедерации под председательством губернатора Минского департамента генерала французских войск Брониковского 19 июля, в Слуцком подписан акт присоединения еще в первых числах июля в имении кн. Иосифа Радзивилла, в Дисненском принят сей акт в мест. Глембоком во время бытности там Наполеона, Бобруйский у. приступил к конфедерации в мест. Глуске под управлением генерала Рожнецкого...

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 378. Воп. 44. Спр. 1376. Л. 46—56.

Айчыне прысвяцілі душы цудоўныя парывы

У гісторыю дзекабрысцкага руху трывала ўвайшлі імёны дзекабрыстаў — ураджэнцаў Беларусі. Шкада, што памяць пра іх пакуль што ўшанавана слаба. Гэта былі людзі, якія ў імя шчасця і свабоды Айчыны ахвяравалі сваім прывілеяваным становішчам, бліскучай кар'ерай, будучым, пайшлі на смерць, на катаргу, у ссылку.

Членам Паўночнага тайнага таварыства дзекабрыстаў быў і наш зямляк Міхаіл Дзям'янавіч Лапа. Яго дзед Іосіф Якаўлевіч у XVIII ст. валодаў у Бабруйскім павеце маёнткам Рудобелка, у які ўваходзілі вёскі Халопенічы, Касарычы, Катка. Пасля смерці І.Я.Лапы ў 1759 г. па яго завяшчанні маёнтак перайшоў да сына Дзям'яна Лапы, у якога 1 кастрычніка 1798 г. нарадзіўся сын Міхаіл (Мацвей).

Ён вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Магілёве, у пансіёне ў Пецярбургу. Ведаў французскую, італьянскую і нямецкую мовы, вывучаў матэматыку, гісторыю, фартыфікацыю, добра іграў на скрыпцы.

У чэрвені 1819 г. Міхаіл быў прыняты

на службу падпрапаршчыкам у лейб-гвардыі Ізмайлаўскі полк, а праз тры гады ён быў узведзены ў чын прапаршчыка. Да сакавіка 1824 г. М.Дз.Лапа даслужыўся да падпаручніка. Ізмайлаўскі гвардзейскі полк быў адным з тых, на каго разлічвалі дзекабрысты ў час паўстання. У ім было не менш 10 афіцэраў, звязаных ў той ці іншай ступені з тайным таварыствам. Найбольш актыўнымі былі І.І.Багдановіч, Кажэўнікаў, Фока і Лапа. Ізмайлаўцы прысутнічалі на сходах у Рылеева і Абаленскага напярэдадні выступлення.

У час паўстання на Сенацкай плошчы Ізмайлаўскі полк знаходзіўся ў Пецяргофе. Яму прадпісвалася ў выпадку неабходнасці прыйсці на дапамогу дзекабрыстам у Пецярбургу. Але дапамога не спатрэбілася. Удзел дзекабрыстаў-ізмайлаўцаў у падзеях 14 снежня 1825 г. выражаўся агітацыяй сярод салдат, выказваннем пратэсту ў час прысягі.

Пасля няўдачы на Сенацкай плошчы пачаліся арышты дзекабрыстаў. З 25 снежня М.Дз.Лапа знаходзіўся сярод арыштаваных у Кранштацкай крэпасці, потым іх перавялі ў Петрапаўлаўскую. На допытах Лапа ўсё браў на сябе, каб палегчыць лёс сваіх сяброў, на другіх не даносіў і не раскайваўся.

Следчы камітэт Вярхоўнага крымінальнага суда вёў расследаванне справы Лапы да 17 мая 1826 г. З 1 па 10 чэрвеня ішло пасяджэнне суда. У імянным указе Мікалая I, дадзеным Вярхоўнаму суду, гаварылася, што злачынцамі 9-га разраду, асуджанымі Вярхоўным крымінальным судом да пазбаўлення чыноў, дваранства і да высылкі лічацца мічман Пятро Бястужаў, лейтэнант Акулаў, падпаручнік Фока і падпаручнік Лапа. Пакаранне ўчыніць па прыгаворы суда і выслаць іх у дальнія гарнізоны.

З матэрыялаў Петрапаўлаўскага краязнаўчага музея відаць, што першым з дзекабрыстаў, сасланых у крэпасць святога Пятра, быў прывезены былы падпаручнік Ізмайлаўскага палка М.Дз.Лапа. Ён павінен быў служыць радавым у гарнізонным батальёне да выслугі. Туды яго адправілі ў спецыяльным экіпажы ў суправаджэнні жандараў з Пецярбурга. 2 верасня 1826 г. ён убачыў месца свайго выгнання.

М.Дз.Лапа праслужыў у Петрапаўлаўскім гарнізонным батальёне да 2 студзеня 1827 г. Потым дзекабрыстаў, якія адбывалі пакаранне ў Петрапаўлаўску, перавялі на Каўказ. Тут М.Дз.Лапа служыў восем гадоў ва ўмовах пастаянных баявых дзеянняў рускай арміі з Турцыяй і Іранам. Прыходзілася яму ўдзельнічаць і ў буйных бітвах. Ён вылучаўся ў баях мужнасцю і смеласцю. Гэта пацвярджае загад па Асобнаму Каўказскаму корпусу: радавы Тыфліскага палка Лапа, які вызначыўся пры асадзе крэпасці, узведзены ў унтэр-афіцэры. У чэрвені 1833 г. ён становіцца прапаршчыкам.

Служыць Міхаілу на Каўказе заставалася нядоўга. Знаходжанне на працягу многіх гадоў у цяжкіх умовах падарвалі здароўе. Ён піша прашэнне на імя Мікалая I, каб выйсці ў адстаўку. Яго просьбу задавальняюць. Міхаіл Дзям'янавіч едзе на жыхарства ў маёнтак Рудобелка, дзе ў той час жыў яго малодшы брат Аляксандр.

Хворы на туберкулёз, ён быў амаль пазбаўлены сувязей са знешнім светам. Па распараджэнні царскага ўрада за ім устанавілі сакрэтны паліцэйскі нагляд і забаранілі наведваць сталіцы. Гэта не магло не адбіцца на фізічным і псіхічным стане чалавека, які прысвяціў сваё жыццё барацьбе за справядлівасць, за вызваленне свайго народа.

Хвароба прагрэсіравала. Жыць Міхаілу заставалася зусім мала. Менш чым праз год ён памёр, пражыўшы ўсяго 41 год. У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь захоўваецца пахавальны запіс у метрычнай кнізе аб памерлых па Харамецкім касцёле: «15 жніўня 1840 года ў Рудобелцы памёр Міхаіл Лапа, падпаручнік войскаў расійскіх, па прычыне шматгадовай хваробы сухоты і кашлю, жанаты не быў».

Кароткае, але яркае жыццё пражыў гэты чалавек, адзін з дваранскіх рэвалюцыянераў, якія жадалі лепшага лёсу сваёй Радзіме. У жыцці ён праявіў лепшыя якасці чалавека: грамадзянскасць і патрыятызм, жаданне бачыць сваю Айчыну свабоднай і квітнеючай.

Т.А.Аляксандрава.

Жыў і тварыў па законах сумлення

Сярод плеяды ўжо вядомых у нашай рэспубліцы літаратараў з Глушчыны ёсць чалавек, які ў свой час зрабіў вельмі многа для развіцця беларускай літаратуры, стаяў каля яе вытокаў, але неапраўдана забыты толькі таму, што творчасць яго развівалася ў мінулым стагоддзі і дайшла да нас у вельмі сціплым выглядзе: многія творы згубіліся. Ды і само імя гэтага чалавека яшчэ нядаўна не было вядома нам, яго нашчадкам і землякам. І сёння прыемна гаварыць аб тым, як многа зроблена менавіта журналістамі глускай раённай газеты, як ашчадна і скрупулёзна збіраліся імі звесткі аб жыцці, творчай дзейнасці нашага славутага земляка, равесніка і паплечніка Ф.Багушэвіча, як было рассакрэчана імі імя Альгерда Абуховіча. Менавіта пра яго і ідзе гаворка.

Марна шукаць пад такім прозвішчам творы ў беларускай літаратуры другой палавіны XIX стагоддзя. «Я падпісваюся на маіх беларускіх творах «Граф Бандынэлі», — так зазначыў пра сябе аўтар гэтых радкоў. У наш час спатрэбіліся шматлікія даследаванні, каб устанавіць сувязь паміж прозвішчам Альгерд Абуховіч і граф Бандынэлі, даказаць, што гэта адна і тая ж асоба.

Альгерд Якуб (другое імя па каталіцкаму звычаю надавалі па імі святога, у дзень якога нарадзіўся) Абуховіч нарадзіўся 25 ліпеня 1841 г. у маёнтку Калацічы цяперашняга Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і старадаўняга дваранскага роду, карані якога маюць італьянскае паходжанне. «Бандынэлі, — піша ў сваіх «Мемуарах» А.Абуховіч, — гэта прозвішча маёй бабкі, апошняй з гэтага роду... Мой прашчур Аляксандр граф Бандынэлі, падкаморы дэрпцкі, дзядзька маёй бабкі, бачачы згасанне свайго роду, усынавіў род Абуховічаў».

Як адзначае далей пісьменнік, з'яўленне яго на свет не прынесла вялікай радасці, бо нарадзіўся ён калекам. Відаць, гэтая акалічнасць паўплывала і на характар будучага літаратара, пра што ён таксама піша ў мемуарах.

Аб жыцці Альгерда Рышардавіча Абуховіча мала што вядома. Загінуў увесь яго архіў. Дайшлі звесткі, што вучыўся ён дома ў настаўнікаў, а ў 1852 г. маці вазіла яго ў Кіеў на аперацыю да вядомага тады прафесара Кіеўскага універсітэта Караваева. Пасля цяжкай, але паспяховай аперацыі прадаўжаў вучобу ў Слуцкай гімназіі. Прыкладна з 1855 г. жыў за мяжой, спачатку ў Швейцарыі, а потым у Францыі. Абуховіч меў магчымасць многа падарожнічаць, пабываў амаль ва ўсіх краінах Заходняй Еўропы. Гэта спрыяла ўдасканаленню ў мовах, і ён выключна свабодна валодаў англійскай, французскай, нямецкай, італьянскай, а калі сюды дадаць польскую, рускую, і, натуральна, беларускую, то можна смела казаць, што ён быў сапраўдным паліглотам.

Але такі, як кажуць, дар Божы Альгерд Абуховіч не скарыстоўваў толькі сабе «ва блага». Ён многа чытаў твораў еўрапейскіх літаратараў і актыўна займаўся перакладамі гэтых твораў на беларускую мову. Дыяпазон самы шырокі: «Фауст» І.В.Гётэ, «Разбойнікі» Ф.Шылера, Дж.Байран, Дантэ, В.Гюго... з рускай класікі ў асноўным А.Пушкін, М.Лермантаў, польскай — А.Міцкевіч і інш.

Гэта была прыкметная і каларытная фігура на тагачасным літаратурным небасхіле Беларусі. Знаёмства з жыццём народаў найбольш развітых еўрапейскіх краін, ідэі дэмакратычнага развіцця грамадства зрабілі пэўны ўплыў на светапогляд Абуховіча.

Дзесьці, відаць, у канцы 1862 г. ці пачатку 1863 г. ён вярнуўся на Беларусь і прыняў актыўны ўдзел у паўстанні 1863—1864 гг. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве, прычым быў самым актыўным паслядоўнікам дзейнасці К.Каліноўскага, рэзка крытыкаваў шляхту за тое, што яна грэбавала сялянствам. Пасля паражэння паўстання Альгерд Абуховіч быў асуджаны і сасланы ў Сібір, але прабыў там не больш трох гадоў. Родзічы не падзялялі яго поглядаў у адносінах да сялян, таму, калі Абуховіч вярнуўся са ссылкі дадому, адбыўся разрыў сувязей з імі: Альгерд Рышардавіч назаўсёды парваў са сваім асяроддзем.

Ён жыў затым у Слуцку, а на жыццё зарабляў прыватнымі ўрокамі і ўвесь час аддаваў свайму прызванню — літаратуры, перапісваўся з Францішкам Багушэвічам, іншымі літаратарамі таго часу.

Яго творы — узор крытычнага рэалізму, а асноўным жанрам была байка. Так што Абуховіча, як і Ф.Багушэвіча, можна лічыць аўтарам першых беларускіх баек, заснавальнікам гэтага жанру. На жаль, да нас дайшлі толькі некалькі баек («Ваўкалак», «Старшына», «Сход», «Суд», «Воўк і ліса»), адзін верш, а таксама «Мемуары».

Байкі паэта востра сацыяльныя па накіраванасці. У іх падкрэсліваецца, што з любой сітуацыі багаты і дужы выходзіць пераможцам у няроўнай барацьбе. Ён выкрывае хцівасць, хлусню, асуджае несправядлівасць. Нават тое, што ўдалося захаваць, сведчыць, што Альгерд Абуховіч быў арыгінальны, таленавіты літаратар. Шкада, што мы пазбаўлены магчымасці поўнасцю пазнаёміцца з яго творчай спадчынай. Праўда, у апошні час прыйшла вестка, што яшчэ да рэвалюцыі ў адным з выданняў за мяжой друкаваўся раман «Багацце і грошы», і там нібыта сцвярджалася, што гэта пераклад з беларускай мовы. А ў рамане расказвалася пра багатыя салоны вядомых еўрапейскіх дамоў. Як сцвярджаюць даследчыкі, мажлівасць да такога пазнання тады меў толькі граф Бандынэлі — Альгерд Абуховіч.

Яркім помнікам яго эпохі засталіся і фрагменты з «Мемуараў». Яны напісаны свабодна, шчыра, каларытна, жывой народнай мовай, што зноў жа сведчыць аб выдатных літаратурных якасцях твораў Альгерда Абуховіча.

Альгерд Абуховіч.

Але ж мы сёння адзначаем, што не толькі гэтыя рысы былі ўласцівы яму. Альгерд Абуховіч паўстае перад сваімі нашчадкамі як чалавек, які ў ліку самых першых на Беларусі публічна, смела і адкрыта сказаў аб бяспраўным становішчы сялян пад прыгонам, іх барацьбе супраць памешчыкаў, хто не пабаяўся выказаць сваю спачувальную пазіцыю да народа, жадаў яму лепшай долі. А гэта выклікае асаблівую павагу і гонар да нашага слаўнага земляка.

Т.А.Матусевіч.

МЕТРЫЧНЫ ВЫПІС АБ НАРАДЖЭННІ І ХРЫШЧЭННІ АЛЬГЕРДА АБУХОВІЧА

Выпись метрики о рождении и крещении двуименного Ольгер(а) Яков(а), сын(а) Рихарда и Каролины Обуховичов, из подлинной книги Глусского римско-католического приходского костела, страницы 17, требующей стороне выдана.

Из Колатич, 1840 года июля 27 дня ксендз Петр Конто(но)вич, викарный Глусского костела, крестил самою только водою по опасности жизни ребенка, нареченного двумя именами Ольгер Яков, сына благородных Рихарда и Каролины урожденной Эстко Обуховичов, законных супруг(ов), судей Мозырского уезда, родившегося во дворе Калатичах 25 (го) числа текущего месяца и года. Восприемниками были коллезский советник и кавалер доктор Бобруйского уезда Август Погль с женою судьи того уезда г(оспожо)ю Елизаветою Эстковою, сопровождали благородный Иван Недзведский с благор(одною) Анелею Погоржельской, девицею. С польским верно: бывший Минской палаты гражданского суда переводчик тит. совет. Поплавский.

Что сия метрика о крещении Ольгерда Якова сына Рихарда и Каролины Обуховичов с подлинною Глусского костела, бывшею в рассмотрении комиссии, высочайше утвержденной, верна и имеет законную достоверность, в том с приложением костельной печати собственноручно свидетельствую.

Числа 30 месяца апреля года 1857-го.

Ксендз Викентий Томашевич, настоятель костела Глусского и депутат уезда Бобруйс(кого).

Пераклад з польскай мовы.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2292. Л. 23.

Карані Максіма Багдановіча

Ужо даўно інтрыгуе той факт, што на Глушчыне ёсць шмат людзей, якія носяць прозвішча Багдановіч. Выпадковасць гэта ці нешта іншае? Ці не маюць гэтыя людзі нейкіх адносін да вядомага беларускага паэта Максіма Багдановіча?

Уласна кажучы, тое, што ведаем пра яго, не дае падстаў ні пагадзіцца з такой думкай, ні абвергнуць яе, бо сам паэт не пакінуў ніякіх аўтабіяграфічных звестак. Паводле ўспамінаў бацькі паэта, Адама Ягоравіча Багдановіча, вядомага беларускага этнографа і пісьменніка, які на працягу ўсяго свайго жыцця настойліва збіраў усё, што датычыла яго сям'і, можна сцвярджаць, што радзімай продкаў Максіма Багдановіча з'яўляецца Глушчына.

«МОИ ВОСПОМИНАНИЯ»

З успамінаў Адама Багдановіча[1]

Косаричи и Рудобелка

...Я — ранний выходец из среды белорусского крестьянства, — выходец, имеющий голос. На мне лежит долг — я это чувствую — рассказать про то, что лично переживал и что переживали мои близкие, что я видел, наблюдал и слышал от других людей, людей старого поколения, заслуживающих доверия, про людей и их дела, заслуживающие внимания... Так как я имею в виду прежде всего и больше всего потомство своей родни, то для освещения вопроса о наследственности, — вопроса, на мой взгляд, первостепенной важности, — я постараюсь охарактеризовать, насколько смогу, всех своих кровных в восходящем порядке.

Но понимание человека невозможно без понимания среды и прошлого. С этого я и начну. Тут задача осложняется: мои родители из разных мест в 50 миль расстоянием одно от другого. Отец Юрий Лукьянович родом из с. Косарич Лясковичской волости Бобруйского уезда, из белорусского Полесья; а мать Анеля Томашова Осьмак по фамилии — из местечка Холопенич Борисовского уезда той же Минской губернии по старому административному делению...

...Итак — мои предки с Птичи-реки отличались более буйным нравом, чем предки по матери с Исы-реки.

...А теперь возвратимся к реке Птичи в село Косаричи. Это родина моего отца, деда и прадеда и, может быть, более далеких предков.

Типичные в этом селе фамилии Ковзун, Костка, Коберник (чуть не Коперник!), Пинчук (видимо, выходец из окрестностей Пинска), Зубач, Пацай (весьма своеобразная фамилия в роде литовского Паца) и Юневич. Последняя — самая славянская и самая красивая из всех — и это фамилия моей бабушки Арины Ивановны Юневич! Я ее никогда не видал, как и деда Лукьяна Степанова. Но с нежным чувством представляю ее юной и прекрасной, в цветном андараке самоткаком (юбка из разноцветной шерсти на льняной основе), в цветной, может быть атласной, шнуровке (это корсаж) и в тонкой, белой, как снег, рубахе с широкими рукавами, стянутой на шейке цветной лентой с бантом, и цветном шерстяном платке, повязанном тюрбаном, с бахромой и кистями, и многими разноцветными лентами в косе, когда она со спокойным и гордым выражением лица, полным сознания великой внутренней силы и чувства собственного достоинства, как княгиня, предстала в 1832 году, имея от роду 18 или 20 лет, в Георгиевской церкви села Косаричи, чтобы сочетаться браком с садовником Лукьяном Степановым Богдановичем, известным по некоторым церковным документам еще под фамилией Скоклича[7]. Ему было 24 года, ибо он, судя по ревизской сказке, родился в 1808 г., а по исповедным ведомостям[8] — в 1807 г.

... Недолго прожила моя бабушка Арина: что-то около 42—43-х лет, ибо умерла она в половине 50-х годов.

Надо думать, что при редких радостях немало она вынесла горя и невзгод за 22—23 года своей брачной жизни. Одни роды и смерти детей чего стоили!

За 19 лет родилось у нее восьмеро. Вот эта плоть и кровь материнская, недосыпание ночей, тяжесть труда и слезы...

Дед Лукьян скончался около 80 года —

[1]Друкуецца паводле публікацыі ў час. «Нёман». 1994. № 5.

72 или 73 лет от роду, — скончался весной, в саду, где он окапывал и подрезал крыжовник. Видимо — сел на пригорочке закурить, ибо в руке у него была набитая махоркой трубка, возле лежал кисет, трут и огниво. Блаженная смерть!

Ему давали больше его лет, даже до 90, и хотя год рождения его мне не известен, но по документальным данным это не оправдывается. По словам отца, дед Лукьян брил бороду и носил усы, как и отец мой, как и я по родовой традиции...

Хорошее ремесло было у деда, завидное: копайся себе в саду, среди цветущих и благоухающих груш и яблонь, слив и вишен. Подчищай, подвязывай, обмазывай, прививай, ухаживай, как за детьми, за зеленеющими питомцами; закладывай парники, сажай «шпарагі» (спаржу), «кавуны та дыні», и в награду первый вкушай сочные пахучие плоды. И все это на свежем воздухе, залитом солнечным светом, жизнь вроде праотца Адама в раю. Меня, обреченного глотать книжную суть, примирять непримиримое, невольно зависть берет.

Еще про деда я знаю, что он чрезвычайно искусно плел корзинки из тонких приречных корешков ивы. Такая корзинка дедовой работы была у моего отца, бывала с ним в дорогах без числа, чего только не вынесла, и по наследству досталась мне в Минске. Побывала в Гродно, где мои дети Вадим и Максим, долго в ней, как в санях, катались по полу и, наконец, — доконали. Службы беспримерной ее было, по меньшей мере, лет 50. Лучше укладки не придумаешь: легка, изящна, прочна, непроницаема для пыли и воды. В молодости она отливает серебром и перламутром, потом желтеет и переходит, под старость, в коричневый цвет...

Но продолжим генеалогические изыскания вглубь. Впрочем, далеко зайти мне не пришлось. Ревизские сказки — единственные геральдические документы для крестьянства, а в них больше заботятся о податных единицах, как бы там они себе не назывались, и потому в именах и фамилиях большая путаница.

По русским ревизским сказкам у помещика Бобруйского уезда Иосифа Вищинского, по деревне Косаричи, за 1834 год показана такая семья:

Ничипор (Никифор) Богданович — 64 лет. Сын его Кузьма. Пасынок Ничипора.

Ягор Лук'янавіч Багдановіч з другой жонкай. Пасля 1880 г.

Адам Багдановіч.

Степан (умер в 1826 году).

Сын его (Степана) Змитер (Димитрий) и Лукьян — 27 лет. Его (Лукьяна) сын Фронка, и конец.

Лукьян — это мой дед, а Фронка дядя. Степан — прадед, а Ничипор Богданович, глава семьи, предок — эпоним, передавший фамилию Богданович своему пасынку Степану, который по отцу мог называться Скокличем. Отсюда двойственность в исповедных ведомостях и других церковных документах: то Богдановичи, то Скокличи.

Гражданские документы этой путаницы не знают: там сплошь Богдановичи.

Предок — эпоним Ничипор, по словам моего отца, был бондарь по ремеслу, т.е. бочар, и хороший бочар: большие дубовые чаны в панском броваре (винокуренном заводе) и бочки в подвале были его работы и моего прадеда Степана, который занимался тем же делом. Ясно, что это была

безнадельная или малонадельная семья из дворовых: работали на двор и для собственного прокормления... Ну, кажется, довольно этих генеалогических изысканий: до Ничипора-имедавца добрались: от него идет фамилия Богдановичей, может быть, и не совсем по праву доставшаяся моему прадеду Степану. Мне и моим детям выпало на долю сделать ее более известной, во всяком случае далеко выходящей за пределы узкого косаричского круга.

Дед Лукьян, в качестве садовника, был форменным дворовым и ничем больше. Числился по селу Косаричи, но принадлежал и помещичьему «двору» (усадьбе) Рудобелке, в нескольких верстах от Косарич, как мы видели, пана Юзефа Вищинского, генерала войск польских... Рудобелка, где мои предки 6 дней в поте лица работали, а седьмой, сходив в церковь и воздав должное Господу, а затем угождали грешной плоти в корчме или дома, чинно за столом.

Рудобелка — лесное имение. Местность там редко населенная, но леса бесконечные. Сколько там разного зверя водилось! Лесной и водной птицы! Лоси, кабаны, сарны (дикие козы), медведи, волки, лисицы, куницы, хорьки и пр. Охота была богатейшая и по-видимому имела промышленный характер, ибо, по словам отца, какая-то французская охотничья компания снимала там охоту с промышленными целями...

Но главное богатство имения был лес. Из него строили барки на Птичи, делали клепку и грузили в барки и гоняли плоты по Птичи и Припяти, в Кременчуг и даже в Херсон, через пороги. Лавреин — войт был самым искусным строителем барок, и он же водил барки и плоты через днепровские пороги — всегда удачно, — такой был искусник. Это было в 40-х и 50-х годах. Но, по-видимому, и в последнее время имение эксплуатировалось как лесное: туда проведена из Бобруйска железнодорожная ветка, которая кончается в Рудобелке...

В имении были крупные винокуренный и пивоваренный заводы. Они, надо думать, составляли центр хозяйства, ибо с ними была связана выкормка быков на барде и выкормка свиней.

Все это солилось и коптилось впрок, шло в значительной части для личного потребления и приема гостей, на прокорм многочисленной дворни, а излишки сбывались в крупные центры, каким был Киев для этого края, связанный водным и грунтовым путем, куда обычно паны отправлялись «на контракты» (Киевскую ярмарку) для продажи сельскохозяйственных продуктов и закупки разной бакалеи, мануфактуры и прочего в запас, особенно того, чего нельзя было достать на мелких местечковых и уездных рынках.

... Отец находил, что его семье жилось неплохо «за панами». Он даже был склонен идеализировать эту жизнь...

Насчет воспитания дворовых он говорил:

— Якая майму бацьку была забота насчет выхованьня дзяцей? Усё пан кіраваў, як яму хацелася. Дарма панскага хлеба есьці не будзеш. Усё, бывала, ідзець своім пайстком. Мяне з пяці год ужо застаўлялі панскіх гусей пасьці. А там целят, парасят, а там і свіней у падпасках ганяць. Так я ўсю гэту навуку прайшоў.

Гэта нічога: работа лёгкая; толькі трудно было ўставаць рана. А вот, калі мне было 10 гадоў, казаў пан атдаць мяне к краўцу ў навуку. Ну, тут я ня выцерпеў: уставай рана, лажысь позна. Ён сядзіць, шыіць, а я яму лучынай свяці. Ды, глядзі, каб роўна гарэла, каб ня дыміла. Сядзіш гэта ранкам і вечарам, носам клюеш... А ён за віскі як дзёрніць... Ну, тут усхопіься... слёзы пасыплютца. Ня вытрымаў-такі — і даў драла дамоў. Лепей свіней пасьціць ды ў жалейку іграць.

Дома, звесна, высеклі. Алі бацька стаў пана прасіць, каб мяне ў кухцікі атдаць. Так пан і зрабіў, — і пайшоў я на кухню к Станіславу ў навуку...

— Часта мяне малога секлі. Бывала, звернісься на лаўцы в абаранок, заснеш, а бацька рамнём сцібанець:

— Як ты лёг, сукін сын, задам к абразам.

Перавернісься ў другую старану — і то неладна: там цэрква стаіць. Ну, гэта пустое — раз-другій рамнём перэцягнуць. А вот раз, помню, дужа мяне сільна секлі.

Было вялікодня. Еў я свянцонае — косьць сабацэ кінуў. Божа мой — што тут было! Бацька і матка як ашалелі: крычаць не сваім голасам, кінуліся косьць атбіраць. Я спужаўся — і ня ведаю, што рабіць. Косьць-такі атабралі і к другім касьцям палажылі, каб на Юрья закапаць у руні.

А тады за мяне прыняліся. Звізалі два пучка розаг. Палажылі мяне на ўслон удо-

вуж. Вяроўкай прывязалі. І давай сеч па голаму целу, бацька с адной, а матка с другой стараны. Здорава тут усыпалі. Секлі, пакуль кроў не паказалася. Патом доўга я пачосоаваўся.

Это, конечно, было ритуальное наказание, своего рода религиозный акт, чтобы отвратить неминучее бедствие от виновника и от всей семьи, которая не внушила, как надо обращаться со святыней и допустила такое кощунство...

Тяжела работа повара, а еще тяжелее «кухціка», поваренка. На нем топка плиты, печей, мытье и чистка посуды, чистка овощей, фруктов, очистка птицы от перьев, поросят от шерсти, потрошение и чистка рыбы, снимание шкур с дичи, свежевание битых животных, рубка мяса, сбивание белков, сливок, верчение мороженого, беготня из кухни в кладовую к охмистрине, из кладовой в погреб, на ледник, — в жаре, в духоте, в кипучей работе, требующей бдительности, сосредоточенного внимания, — иначе — там перестоится, там перекипит, там пригорит и за всякий недосмотр влетит от кухаря затрещина, а то и больше. Надо рано вставать и поздно ложиться — и все время на ногах, в беготне. Каторга, а не работа.

Однако отец от нее не сбежал...

Дело, видимо, пришлось по нутру батюшке, и он с успехом проходил выучку у старых искусных поваров.

... В конце 40-х годов имение Рудобелку купил пан Александер Лапа (пишется: Лаппо, но это шляхетское стремление скрасить невзрачную предметную фамилию, чтобы она казалась более замысловатой) у доброй пани Вищинской. Лапа, судя по всему, что я о нем знаю, был большой делец, человек предприимчивый, в 50-х годах губернский маршалок (предводитель дворянства). Он да секретарь дворянства Гаусман немало состряпали дворянских документов, за хорошие деньги, мелкой шляхте, судя по самому красивому зданию в Минске — каменице Гаусмана, в которой десятки лет помещалось общественное собрание, по Подгорной, против бульвара.

Пан Лапа, в качестве маршалка и притом губернского, должен был иметь хорошую кухню и в городе, и в деревне: это вековая традиция, требование добрых нравов. И потому должен был подготовлять хороших поваров и притом — про запас, для больших аказий...

Так, в числе других, он посылал моего отца изучить маслобойное и пивоваренное дело, а также для усовершенствования в поварском деле, или, если хотите, искусстве, он посылал его на год на кухню пана Булгака, не знаю какого, но, очевидно, знаменитого гастронома.

Так что из отца к 20 годам вышел хороший повар...

А самым важным было то, что в начале 50-х годов пан Лапа купил местечко Холопеничи Борисовского уезда у пана Хрептовича.

Это имело важное последствие для холопеничских крестьян, которых новый пан тасовал, как карты: одних переводил из Холопенич в Рудобелку, а других из Рудобелки в Холопеничи, в том числе и моего отца. Последнее повело к женитьбе этого неукротимого чумака на моей матери, а стало быть, обусловило мое появление на свет — в той форме, в какой я есмь и пребываю...

КОММЕНТАРИИ:

...7. Прадед Адама Богдановича — Степан первым стал носить фамилию Богданович — по фамилии своего отчима Никифора Богдановича. По отцу он должен был быть Скокличем.

8. Исповедные ведомости — документ, который официальная православная церковь обязана была предоставлять государственным властям в Российской империи. Происходило это ежегодно. Ведомости перечисляли всех, кто ходил к исповеди; были свидетельства законопослушания, благонравия.

У парэформенны час

Сяляне, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, як правіла, складалі адну сельскую грамаду, якая на сходзе выбірала сельскага старасту і іншых службовых асоб. Сельскія старасты падначальваліся валасному праўленню, улада якога пашыралася на сялян вёсак, якія, як правіла, адносіліся да пэўнага царкоўнага прыхода.

На валасных сходах сельскія старасты і выбраныя ад сельскай грамады (па адным ад 10 хат) выбіралі валаснога старшыню. Сельскія старасты і валасныя праўленні былі абмежаваны ў сваіх правах. Органы сельскай улады займаліся рас-



Глушчына на спецыяльнай карце Еўрапейскай Расіі. 1868 г.

кладкай і зборам подацей і сачылі за выкананнем сялянамі павіннасцей. Выконвалі некаторыя адміністрацыйныя і паліцэйскія функцыі: аб'яўлялі сялянам законы і распараджэнні, сачылі за грамадскім парадкам.

У 1883 г. у Глускай воласці старшынёй быў Тарас Шарамет, пісарам Міхаіл Галубовіч.

Пры раздзеле зямлі памешчыкі мелі магчымасць забіраць у сялян лепшыя землі, выганы, пашу, вадапоі і іншыя ўгоддзі. У Глускай воласці гэта прывяло да цераспалосіцы панскіх і сялянскіх зямель. Амаль усе лясы, лепшыя сенажаці, азёры, без якіх сяляне не маглі абысціся, засталіся ў руках памешчыкаў, надзелы выдзяляліся на няўдобіцах — «пясочках», далёка ад вёскі. Словам, большасць «вызваленых» сялян была пастаўлена ў такія ўмовы, пры якіх яны не маглі весці самастойную гаспадарку і былі вымушаны ісці ў кабалу да сваіх учарашніх гаспадароў.

За карыстанне надзелам да яго выкупу патрэбна было адбываць паншчыну ці плаціць памешчыку аброк. У Мінскай губерні павіннасці памяншаліся супраць інвентароў толькі на 10%. Для аброку быў устаноўлены максімум не вышэй 3 руб. з дзесяціны, а для паншчыны — не больш 23 дзён у год. Кожны селянін асабіста адказваў за выкананне павіннасцей.

Памешчык мог прымусіць часоваабавязаных сялян працаваць на паншчыне ў любы дзень, за выключэннем святочных. Сялянам давалася права праз год пасля рэформы патрабаваць пераводу з паншчыны на аброк, але пры ўмове, што за імі няма нядоімак.

Усё гэта сведчыла аб тым, што ўведзеныя павіннасці мала чым адрозніваліся ад дарэформенных. Рэформа 1861 г. пакінула сялянам цяжкую працу за нізкую плату.

Паводле закону селянін павінен быў заплаціць памешчыку выкуп і за зямлю, і за сваё вызваленне ад прыгонніцтва. Выкуп асабістай свабоды быў замаскіраваны шляхам завышэння цаны на зямлю. Памер выкупу значна перавышаў фактычны кошт зямлі: напрыклад, рыначны кошт у Мінскай губерні складаў 7,5 руб. за дзесяціну, а па выкупе сяляне павінны былі заплаціць за яе больш за 31 руб.

Зразумела, што такіх грошай у іх не было, памешчыкі ж хацелі атрымаць выкуп адразу. Таму ўрад пайшоў на наступны крок: пры выкупе сяляне плацілі 20% патрэбнай сумы, астатнюю частку за селяніна плаціла дзяржава ў выглядзе каштоўных папер, якія памешчыкі маглі прадаваць або закладваць. Такім чынам, дзяржаўная пазыка для селяніна ператваралася ў доўг, які цягнуўся дзесяткамі гадоў. Дарэчы, выплачвалася не толькі сума пазыкі, але і вялікія працэнты за яе. Выкупныя плацяжы спаганяліся аж да першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Потым царскі ўрад быў вымушаны тэрмінова адмяніць іх. За гэты час сяляне выплацілі ўраду ў 3 разы больш, чым каштавала купленая імі зямля. Яны ішлі на гэта, бо бачылі ў зямлі сродак, з дапамогай якога разлічвалі вызваліцца ад памешчыка, набыць сапраўдную свабоду.

Размеркаванне зямлі паміж памешчыкамі і сялянамі, а таксама абавязкі сялян замацаваны дакументамі, якія называліся ўстаўнымі граматамі. Іх складаннем займаўся сам памешчык, таму, зразумела, што гэтыя акты вызначалі пазямельнае ўладкаванне і павіннасці так, як гэта было больш выгадна памешчыку і служыла яму на карысць.

Адкрыты грабеж сялянства пры правядзенні рэформы выклікаў незадаволенасць, моцнае супраціўленне ўвядзенню ўстаўных грамат. Урадавая адміністрацыя была асабліва незадаволена ходам гэтай работы ў Мінскай губерні, дзе да канца сакавіка 1862 г. ні адна грамата не была ўведзена ў дзеянне.

Незадаволенасць рэформай расла, сялянскія хваляванні ахоплівалі ўсё новыя і новыя маёнткі, набывалі масавы характар. І літаральна ў кожным выпадку для іх падаўлення ўжываліся войскі і паліцыя. Галоўная прычына гэтых выступленняў — грабежніцкі характар рэформы 1861 г., якая асуджала сялян на галечу і бяспраўнае існаванне. Але былі і іншыя прычыны, якія вымушалі сялян сілай адстойваць свае інтарэсы. І перш за ўсё гэта парушэнне памешчыкамі асноўных артыкулаў «Мясцовых палажэнняў». У палявы надзел нярэдка адводзіліся дрэнныя або забалочаныя ўчасткі, сялян наогул пазбаўлялі зямлі. У вёсцы Зубарэвічы Бабруйскага павета памешчык адабраў у сялян іх землі, адвёўшы паводле ўстаўных грамат пустэчы. 12

студзеня 1862 г. зубарэвіцкія сяляне скардзіліся ў Мінскую губернскую прысутнасць па сялянскіх справах аб захопе памешчыкам іх ворнай зямлі, лугоў і пашаў. Ім ён аддаў сваю зямлю за балотам, якая была за 16 вёрстаў ад сялянскіх сядзіб, самую горшую і пустую.

Узмацненне сялянскіх хваляванняў у пачатку 1863 г., пачатак паўстання 1863—1864 гг. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве прымусіла царскі ўрад пайсці на некаторыя ўступкі ў вёсцы. Паводле царскага ўказа ўводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў у Мінскай і шэрагу іншых губерняў. Часоваабавязанае становішча сялян тут спынілася з 13.5.1863 г., яны пераводзіліся ў разрад сялян-уласнікаў. Выкупныя плацяжы зніжаліся на 20%.

У кожным павеце былі ўтвораны праверачныя камісіі, якім даручалася праверка і выпраўленне ўстаўных грамат і складанне выкупных актаў. Мінская губерня вызначалася малаўрадлівымі землямі і нізкай ураджайнасцю. Па прадукцыйнасці глебы яе можна падзяліць на тры групы. Бабруйскі павет, дзе пераважалі пясчаныя землі з нізкай урадлівасцю, адносіўся да трэцяй групы. Зямля тут не мела вялікай каштоўнасці, і памешчыкі ішлі на завышэнне надзелаў сялянам, а пасля атрымлівалі магчымасць патрабаваць ад іх больш высокія павіннасці. Таму праверка ў гэтым павеце выявіла велізарную неадпаведнасць паміж сапраўднымі памерамі сялянскіх надзелаў і паказанымі ва ўстаўных грамат ах. Упершыню паўсюдна праводзіўся абмер сялянскіх надзелаў. Устаўныя граматы прыводзіліся ў адпаведнасць з імі.

Выкупныя акты замацоўвалі за сялянамі права карыстання сервітутамі, што было вельмі важна, бо, напрыклад, у Мінскай губерні сервітутамі карысталася больш за палавіну сялянскіх двароў.

Усе гэтыя меры прывялі да таго, што ў сялян Мінскай губерні павялічылася колькасць зямлі. Стала больш палявых надзелаў, у прыватнасці, у Бабруйскім павеце. Тут у землекарыстанне была ўключана значная частка пустэч і забалочаных участкаў.

Аднак і пасля некаторых урадавых уступак сутнасць рэформы не змянілася, яна па-ранейшаму заставалася грабежніцкай, асуджала сялян на беднасць, бо нават павялічаныя надзелы не маглі задаволіць патрэбы сялянскай сям'і, таму што на Беларусі было шмат малаўрадлівай пясчанай і сугліністай глебы. Значная частка яе была забалочана. Таму частка сялян павінна была на кабальных умовах арандаваць зямлю ў памешчыкаў.

Выкуп зямлі для іх быў таксама непасільны. Нядоімкі па выкупных плацяжах увесь час раслі. Таму ўрад у снежні 1881 г. пайшоў на зніжэнне выкупных плацяжоў. Усё ж, нягледзячы на гэта, вынікі рэформы 1861 г. час ад часу станавіліся прычынай узнікнення сялянскіх хваляванняў.

Сялянская хата.

Галоўнай прычынай іх былі спробы мясцовых улад і памешчыкаў пераправерыць сялянскія надзелы, перагледзець павінасці сялян на карысць землеўладальнікаў. Праверачным камісіям было загадана адрэзаць у сялян «лішкі» зямлі, калі высветліцца, што яе ў іх больш, чым указана ў выкупных актах.

Сялянскія хваляванні мелі месца і на Глушчыне. Вясной 1865 г. сяляне в. Вольніца здзейснілі парубкі ў лесе памешчыка. У 1877 г. сяляне в. Жалвінец, незадаволеныя правядзеннем межавання, аказалі супраціўленне і не дапусцілі да выканання гэтай работы землямера.

Адмена прыгоннага права абумовіла неабходнасць правядзення іншых рэформаў – земскай (мясцовае кіраванне), судовай (увядзенне суда прысяжных), вайсковай (скасаванне рэкрутчыны), а таксама мерапрыемстваў культурна-адукацыйнага зместу (рэарганізацыя школьнай справы) і інш. Аднак гэтыя пераўтварэнні праводзіліся марудна і не паўсюдна. Яны мелі непаслядоўны і супярэчлівы характар. На тэрыторыі Беларусі адны рэформы не былі ажыццёўлены зусім, а іншыя трансфарміраваліся ў залежнасці ад палітычных абставін.

Палавінчаты, непаслядоўны характар рэформаў выклікаў пратэст не толькі з боку сялянства, але і радыкальна настроенай грамадскасці.

Рэформа 1861 г. падарвала асновы паншчыннай сістэмы гаспадарання і стварыла ўмовы для больш шпаркага пераходу да капіталізму, для далейшага развіцця Расійскай імперыі, якая ўвайшла ў першыя рады еўрапейскіх дзяржаў. У гэтым станоўчае значэнне праведзеных рэформаў, нягледзячы на іх недахопы.

Галоўнай галіной эканомікі Беларусі пасля адмены прыгоннага права па-ранейшаму заставалася сельская гаспадарка, характэрнай асаблівасцю якой было спалучэнне капіталістычных адносін з перажыткамі прыгонніцтва. Апошняя акалічнасць вызначыла для Беларусі павольны, паступовы шлях аграрнай эвалюцыі, пры якім буйная памешчыцкая гаспадарка, перарастаючы ў буржуазную, надоўга захавала свае прыгонніцкія рысы. Галоўная з іх — перавага памешчыцкага землеўладання, велізарная канцэнтрацыя зямель у прыватных руках (дваранству і памешчыкам у Мінскай губерні ў 1870—1880 гг. належала 51,8% агульнай плошчы землеўладання, сялянам — 6,8%). Існавала, з аднаго боку, дробная зямельная ўласнасць, а з другога — буйныя і буйнейшыя дваранскія маёнткі-латыфундыі. Буйнапамеснае землеўладанне было найбольш вялікае ў Мінскай губерні. Кучка магнатаў трымала ў сваіх руках неабсяжныя зямельныя плошчы. У кожнай з 1183 латыфундый знаходзілася ў сярэднім па 3514 дзесяцін зямлі.

Буйных землеўладальнікаў было нямала і на Глушчыне. Гэта памешчыца А.С.Жылінская, якой належаў маёнтак Завалочыцы, а з ім 7149 дзесяцін зямлі, вадзяны млын з сукнавальняй; калежскі асэ-

Сяляне Глускай воласці.

сар С.В.Нерэзіуш, гаспадар маёнтка Зарэчча з хутарам Падзамша валодаў 3196 дзесяцінамі зямлі, вадзяным млынам і карчмой; 4762 дзесяціны зямлі належалі двараніну Іосіфу Сцяпанавічу Рэйтану, а яго маёнткі знаходзіліся ў Слуцкім і Бабруйскім паветах. Толькі ў Слаўкавічах Рэйтан валодаў 2461 дзесяцінай. Акрамя гэтага, ён меў вінакурны і цагельны заводы, два ветраныя і адзін вадзяны млыны, сукнавальню. У Слаўкавічах яму належалі млын і карчма. Заможнымі ўладальнікамі на Глушчыне лічыліся і браты Лапы: Дамінік, Вячаслаў і Антон, якія валодалі маёнткам Халопенічы з уваходзячымі ў яго вёскамі і больш чым 4 тысячамі дзесяцін зямлі.

Крыху меншай колькасцю зямлі распараджаліся памешчыкі маёнткаў Туркі Р.К.Булгак (1357 дзесяцін) і Ф.Е.Буяноўскі (1897), Э.І.Беліновіч з Бабірова (1508), М.В.Герман з маёнтка Згода і ўрочышча Язвінь (1448), Б.І.Ланеўскі-Воўк, лейб-гвардыі паручнік з Барысаўшчыны (2375), І.І.Лісоўскі з Зубарэвіч (1450). Дваранін Альгерд Рышардавіч Абуховіч атрымаў у спадчыну ў 1875 г. маёнтак Калацічы з вёскамі Дуброва і Заполле, у які ўваходзілі 1456 дзесяцін зямлі, 2 вадзяныя млыны і карчма. Але, як вядома з пазнейшых звестак, Альгерд Абуховіч, вярнуўшыся з сібірскай ссылкі, адмовіўся ад гэтага багацця і жыў як аскет на сродкі, якія зарабляў прыватнымі ўрокамі.

Асобныя памешчыкі, якія мелі перадавыя погляды на вядзенне сельскай гаспадаркі, землеўладанні якіх часткова або ў значнай меры былі пагоршаны па прычыне моцнай пераўвільготненасці зямель, імкнуліся палепшыць іх стан, заняўшыся асушэннем балот. Упершыню такія работы ў парадку эксперыменту былі праведзены памешчыкам Жылінскім на землях свайго маёнтка Завалочыцы. А з 1874 г. у Мінскай губерні пад кіраўніцтвам таго ж Г.Жылінскага, палкоўніка генеральнага штаба, пачалося ажыццяўленне яго праекта па асушэнні балот ужо на больш значных плошчах. Паспяховае правядзенне гэтых работ падавала надзею, што на велізарнай тэрыторыі, дзе панавала спрадвечная багна, адкрыюцца новыя масівы не толькі пад лугавыя землі, але і прыдатныя для земляробства, вырошчвання збожжа. Звесткі, якія меліся ў камітэтах аб ходзе работ Г.Жылінскага, сведчылі аб тым, што ўсяго на Палессі асушана 150 тысяч дзесяцін балот. Асушана да такой ступені, што мала чым адрозніваюцца ад іншых забалочаных зямель, існуючых у іншых мясцовасцях Расіі, якія лічацца сухімі і не патрабуюць работ па сваім асушэнні.

Праведзеная меліярацыя на ўпамянутых 150 тыс. дзесяцін датычыла велізарнай балотнай плошчы, размешчанай паміж Дняпром, Прыпяццю і Бярэзінай. Вынікі яе былі ашаламляльныя: на масіве каля 20 000 дзесяцін зямлі недаступнай раней багны, да якой можна было падступіцца ў выключна сухія гады, з'явіліся новыя сенакосы і пашы. Ад 10 да 20 тыс. дзесяцін дрэнных сенакосаў перайшлі ў разрад дабраякасных. Каля 30 000 дзесяцін забалочанага лесу атрымліваюць правільны рост, раней непраходныя і недаступныя мясціны зрабіліся нават зручнымі для праезду. Лясы, аддаленыя ад рэк, атрымалі добрыя сплаўныя шляхі, што паспрыяла больш правільнаму вядзенню лясной гаспадаркі. Але, нягледзячы на гэтыя ўнушальныя паказчыкі, праект Жылінскага не атрымаў далейшага развіцця з-за недахопу грошай у дзяржаўнай казне.

Адмена прыгоннага права паскорыла працэс разлажэння сялянства і развіцця ў вёсцы капіталістычных адносін, узровень якіх залежаў ад таго, у якой меры сяляне пасля рэформы былі надзелены зямлёй. Яе па-ранейшаму не хапала, надзел па губернях вагаўся ад 3,9 да 5,1 дзесяціны на рэвізскую душу.

Памяншэнне і раздрабленне сялянскіх надзельных зямель не было агульным і раўнамерным. Толькі бяднейшая частка вёскі губляла зямлю, якая затым канцэнтравалася ў руках заможнага сялянства.

У мясцовых умовах толькі надзел у 15—20 дзесяцін мог забяспечыць самастойнае вядзенне сялянскай гаспадаркі.

Большасць сялянскіх двароў на Глушчыне адчувалі значнае малазямелле, не маглі пражыць на ўласных надзелах. Вострая патрэба ў ворных землях, пашах, сенакосах і лясах штурхала сялян у кабалу да буйных зямельных уласнікаў, якія, карыстаючыся гэтым, шырока ўводзілі ў

сваіх гаспадарках адработачную сістэму. У Бабруйскім павеце, напрыклад, у памешчыцкіх маёнтках, як правіла, адпрацоўвалі за пашу для жывёлы, за ўзятую на адзін ураджай зямлю або сенакос.

На гэтым агульным фоне малазямелля на Глушчыне вылучалася група сялян, заможных гаспадароў, якія маглі набыць зямлю ў прыватную ўласнасць. Зразумела, што пайсці на гэты крок мог толькі той селянін, які меў лішак прадуктаў і збываў іх на рынку, каб назапасіць грошай. Бо для пакупкі значнага ўчастка зямлі патрэбны былі немалыя грашовыя сродкі, тым больш, што цэны на зямлю ўвесь час павышаліся. У Мінскай губерні, напрыклад, з 1863 г. да 1900 г. цана дзесяціны зямлі павялічылася з 14 да 34 рублёў. На Глушчыне ў гэты перыяд больш за 70 сялян набываюць зямлю «ў складчыну», купіўшы групамі ўчасткі ад 50 да 100 дзесяцін, а некаторыя становяцца і ўладальнікамі маёнткаў.

Так, у 1869 г. 11 сялян на чале з Іванам Бурдзейкам купілі маёнтак Макавічы (1200 дзесяцін), 46 сялян з Усцярхоў на чале з Фёдарам Бурдзейкам, аб'яднаўшыся ў таварыства, набылі ў 1872 г. гэты маёнтак (3577 дзесяцін) з усімі яго ўгоддзямі, млыном, карчмой, садам і сукнавальняй.

У 1874 г. сталі ўладальнікамі 200 дзесяцін з маёнтка Стараселле 6 сялян на чале з Іванам Бенікам. Гаўрыла Валадковіч разам з 8 таварышамі купілі ў сумеснае валоданне 469 дзесяцін у маёнтку Жукавічы.

Такім чынам, на адным полюсе групаваліся сяляне, якім належалі ўчасткі да 10 дзесяцін, а на другім — заможныя ўласнікі, уладальнікі ўчасткаў да 20 дзесяцін і болей. Яны трымалі ў сваіх руках большую палову купчай зямлі (58,8%).

Цяжкае эканамічнае становішча сялян заканчвалася поўным разарэннем, прыводзячы іх у армію сельскага пралетарыяту. Ні адна праслойка рабочых не несла такога цяжару эксплуатацыі і не была такой бяспраўнай.

Т.А.Матусевіч, А.М.Філатава.

Барацьба сялян за зямлю

Малазямелле і галеча, уціск памешчыкаў, палітычнае бяспраўе падымалі шырокія слаі сельскага насельніцтва на барацьбу. Сялянскі рух у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. разгортваўся ачагамі, хвалепадобна. Яго пік прыходзіцца на 1880-я гады, калі паступова пачала складвацца новая рэвалюцыйная сітуацыя, выкліканая рэзкім пагаршэннем становішча сялян, што прывяло да абвастрэння барацьбы за зямлю.

Характэрнай рысай сялянскага руху ў Мінскай губерні, у тым ліку і на Глушчыне, з'яўлялася разнастайнасць формаў і метадаў барацьбы. Яна галоўным чынам выліваласа ў выступленні супраць размежавання, самавольныя парубкі лесу, у адстойванні права на сервітуты. У 1885 г. сяляне в. Клетнае секлі панскі лес для ўласных патрэб, у 1890 г. паўторна «бунтавалі» сяляне в. Вольніца, якія таксама здзейснілі парубкі ў лесе памешчыка. Летам 1891 г. у в. Даколь узнікла хваляванне сялян пры абмеры палявых надзелаў. У гэты ж час у в. Слаўкавічы сяляне ў знак пратэсту выгналі сваю жывёлу на памешчыцкія ўгоддзі і там яе пасвілі.

Своеасаблівай формай масавага руху была барацьба за перасяленне на «вольныя» землі ў Сібір і іншыя месцы. У 1884 г. яна набыла значны размах у Мінскай губерні, ахапіла некаторыя вёскі Бабруйскага, Ігуменскага і Слуцкага паветаў. Сяляне натоўпамі прыходзілі ў павятовыя гарады, каб падаць прашэнне на выдачу дапамогі для перасялення. Паліцыя затрымлівала іх і вяртала назад. У Бабруйскім павеце, паводле паведамлення паліцыі, пашырыліся чуткі, што «гасудар загадаў адабраць зямлю ў паноў і даць беззямельным сялянам па 7 дзесяцін на душу».

Сялянскі рух у цэлым заставаўся стыхійным і лакальным, выступленні былі разрозненыя і неарганізаваныя. Унутрыкласавыя супярэчнасці ў сялянскім руху ў той час амаль не праяўляліся — яшчэ не прыйшла пара выстаўляць палітычныя патрабаванні. Барацьба ў вёсцы была накіравана ў асноўным супраць памешчыкаў і царскай адміністрацыі, супраць перажыткаў прыгонніцтва, што аб'ектыўна адлюстроўвала змест буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якая наспявала ў Расіі.

Развіццё капіталізму

Канец XIX ст. характарызуецца таксама далейшым паглыбленнем грамадскага падзелу працы, канчатковым аддзяленнем прамысловасці ад земляробства, узмацненнем канцэнтрацыі прамысловасці, развіццём гандлю, шляхоў зносін. У лістападзе 1873 г. быў пабудаваны ўчастак Лібава-Роменскай чыгункі, які злучыў цэнтр павета г. Бабруйск з партамі Балтыйскага і Чорнага мораў, прамысловымі гарадамі Беларусі, Украіны, Польшчы, Расіі. Гэта садзейнічала больш шырокаму развіццю ўнутранага і знешняга гандлю.

Бабруйск прадстаўляў значны транспартны вузел, дзе спалучаліся чыгуначны, водны і сухапутны шляхі зносін, што прывяло да прыкметнага ажыўлення ў развіцці мясцовай прамысловасці не толькі ў самім горадзе, але і ў валасцях Бабруйскага павета.

На Глушчыне важным відам капіталістычнай прадпрымальнасці, як у памешчыкаў, так і ў заможных сялян, становіцца далейшы рост вінакурства. У Бабруйскім павеце дзейнічала больш за 71 вінакурны завод, дзе выраблялася 218 300 вёдзер спірту.

Асноўнай сыравінай для яго спачатку служыла зерне, пераважна жыта, але з 1870-х гадоў пачынае хутка расці і ўдзельная вага бульбы, крыху пазней вінакурства на бульбяной сыравіне дасягнула ў Мінскай губерні значных поспехаў, а Бабруйскі павет быў у гэтай справе ў ліку першых.

Важкі ўклад у вытворчасць спірту ў павеце ўносілі вінакурныя прадпрыемствы Глушчыны. Да ліку найбольш буйных адносіліся заводы, якія дзейнічалі ў маёнтках Халопенічы (заснаваны ў 1836), дзе атрымлівалі па 50 тыс. вёдзер, Завалочыцы (заснаваны ў 1888), Слаўкавічы (заснаваны ў 1889) — па 20 тыс. вёдзер, Веснава (заснаваны ў 1874), Вільча (заснаваны ў 1893) — па 13 тыс. вёдзер.

З 1884 г. да 1895 г. на гэтых заводах былі ўстаноўлены паравыя машыны, тут працавала ад 6 да 10 наёмных рабочых. Крыху меншыя вінакурні існавалі ў маёнтках Бярозаўка (заснавана ў 1877), Юзафова (заснавана ў 1889).

Большасць вінакурных прадпрыемстваў на Глушчыне былі старой канструкцыі з даволі прымітыўнымі пабудовамі, з сырымі сценамі, абвіслай столлю і з вельмі слабым асвятленнем. Людзі працавалі тут у самых шкодных, антысанітарных умовах.

Прыватнаўласніцкая прамысловая дзейнасць не зводзілася толькі да вінакурнай вытворчасці. Памешчыкі Глушчыны, улічваючы вялікае багацце лясоў гэтага краю і значны попыт на розныя лясныя вырабы паўднёвых раёнаў Расіі і Украіны, наладжвалі рамесна-саматужныя прадпрыемствы мануфактурнага тыпу па першаснай апрацоўцы лесу.

У 1898—1900 гг. у маёнтку Даколь дзейнічала лесапільная мануфактура. У год заснавання на ёй працавала 50 наём-

Адна з вуліц Глуска. На заднім плане — касцёл.

ных работнікаў. У 1900 г. было выпушчана дошак і розных драўляных вырабаў на 85 тыс. рублёў.

Каля 1900 г. адкрылася Глуская драўнянастружкавая мануфактура, дзе працавалі мужчыны і жанчыны. У 1914 г. на ёй ужо было занята 120 чалавек, устаноўлена 50 станкоў. Асноўны капітал складаў 22 тыс. рублёў, выраблена 60 тыс. штук стружкавай тканіны, па 20 кап. за штуку. На прадпрыемстве выраблялі банты, а з адходаў — стружку для ўпакоўкі посуду. На вытворчасць стружкі было зрасходавана 3 тыс. пудоў асіны. Заработная плата ў месяц складала ў мужчын — 80 руб., у жанчын — 24 руб.

Зацяжны сельскагаспадарчы крызіс, які пачаўся ў 1870-я гады, працягваўся да сярэдзіны 1890-х гадоў, і звязаныя з гэтым фінансавыя цяжкасці вымушалі ўладальнікаў станавіцца на шлях узмоцненага продажу лесу.

Бурнае развіццё расійскай прамысловасці, інтэнсіўнае будаўніцтва чыгунак у апошняй чвэрці XIX ст. патрабавалі шмат лесаматэрыялаў. Цэны на лес раслі. Памешчыкі стараліся з большай выгадай прадаць лес і мелі ад гэтага значныя барышы. Таму вялікая колькасць насельніцтва Мінскай губерні ў вольны ад сельскагаспадарчых заняткаў час працавала на лесасеках, апрацоўцы драўніны і перавозцы яе да месцаў лесасплаву і чыгуначных станцый. У Бабруйскім павеце на вырубцы і перавозцы лесу ў 1894 г. было занята 15 600 чалавек.

Апрача таго, шмат работнікаў працавала на вырабе розных матэрыялаў — брусоў, шпал, крокваў, дахавай гонты, бандарнай клёпкі, абадоў для колаў, санных палазоў, а таксама на карчаванні пнёў, вырабе вугалю, здабычы смалы, нарыхтоўцы рагожы, лубу, мачал, лапцяў, гонты, дзёгцю і шкіпінару.

Важнае месца сярод іншых гаспадарчых заняткаў мелі здабываючыя промыслы — рыбалоўны, бортніцкі. Жыхары прырэчных вёсак у вялікай колькасці лавілі рыбу не толькі летам, але і ў зімовы перыяд, сушылі яе або свежамарожанай везлі цэлымі абозамі ў Слуцк, Бабруйск і Мінск.

Паўднёва-заходняя частка Бабруйскага павета, куды адносілася і Глушчына, была самай балоцістай мясцовасцю ў павеце, бо яна з'яўлялася працягам прыпяцкіх балот. Большасць насельніцтва гэтага краю займалася земляробствам, сеяла жыта, авёс, іншыя збожжавыя і крупяныя культуры, садзіла бульбу.

У лепшыя гады ўраджай азімых раўняўся 5,5 чацвярціны, яравых — 5, бульбы — 5,3 чацвярціны. У 1898 г. было сабрана да 700 тысяч чацвярцін зерня і звыш 990 тысяч чацвярцін бульбы, галоўным чынам для вінакурства.

Пасевы бульбы з кожным годам павялічваліся. Гэта было звязана з пашырэннем яе ўжывання сялянамі ў якасці больш таннага, чым хлеб, прадукта харчавання. На малаўраджайных пясчаных і супясчаных землях бульба ў параўнанні са збожжавымі культурамі давала больш высокія ўраджаі (у некалькі разоў). У гэтых умовах яна стала для сялян, асабліва для беднаты, другім хлебам.

Вось што пісала ў канцы жніўня 1893 г. афіцыйная палітычная і літаратурная газета «Віленскі веснік», у якой асвятлялася жыццё ўсяго Паўночна-Заходняга краю, аб становішчы сялян у яго палескай частцы: «Пры пясчанай і балоцістай глебе ў Палессі, раскіданасці сялянскіх надзелаў часам на 30—50 вёрстаў, пры цяжкасці апрацоўкі гэтых кавалачкаў, што ляжаць сярод балот, пры недахопе лугоў і немагчымасці трымаць неабходную колькасць рабочай жывёлы, нарэшце, пры неўрадлівасці гэтых пясчаных месцаў сяляне не толькі не могуць выручыць ад зямлі сродкі для ўплаты падаткаў, але не маюць дастатковага хлеба на пракорм.

Ёсць вёскі, надзелы якіх так раскінуты сярод балот і лясоў, далёка ад сядзіб, што сяляне не ў стане рабіць агароды пры вёсках і павінны вырошчваць агародніну за балотам, на ўчастках, з якімі ўстанаўліваюцца зносіны па мастках... У іншых месцах пакосы толькі балотныя, і ўборку сена можна зрабіць толькі ў той час, калі балоты замярзаюць... Але ўсё гэта цярпіма пры больш або менш спрыяльным зыходзе ўраджаяў. Здарыўся ж недарод, становішча нашага сялянства аказваецца безвыходным.

А тое, што край наш не гарантаваны ад магчымасці такога недароду... сведчыць прыкметнае амаль што не з кожным годам пагаршэнне ўраджаяў... Ураджаі, напрыклад, якіх-небудзь 15—20 гадоў таму былі амаль удвая большыя, чым цяпер...»

На Глушчыне шырокае распаўсюджванне мела льнаводства. Лён сеялі ў кожнай гаспадарцы, бо для асноўнай масы сялянства ён служыў з даўніх часоў сыравінай для вырабу тканіны ў хатніх умовах. Вырошчванне гэтай культуры і ўвесь працэс падрыхтоўкі яе для ткацтва клаліся пераважна на плечы жанчын.

Але сяляне вырошчвалі лён не толькі дзеля ўласных патрэб. Яго валакно служыла ў вёсках Бабруйскага павета прадметам гандлю. Лён, як і бульба, быў крыніцай даходаў сялянскіх гаспадарак.

На Глушчыне многа вырошчвалі грэчкі, што было наогул асаблівасцю ўсяго Бабруйскага павета, сеялі на корм жывёле кукурузу, якая тут даволі добра радзіла. Сяляне займаліся таксама вырошчваннем цукровых буракоў, для іх перапрацоўкі ў Бабруйскім павеце былі спецыяльныя заводы.

Важнае месца ў земляробстве адводзілася таксама канапляводству. Каноплі былі сялянскай культурай, з іх атрымлівалі канапляны алей, вырабы пяньковай пражы, семя, якое збывалася на рынку ў іншыя расійскія губерні.

Сяляне Глушчыны займаліся авечкагадоўляй. Аднак яна насіла спажывецкі характар, забяспечвала патрэбы сялян у прадуктах харчавання, адзенні. З шэрсці выраблялі сукно.

У Глуску значная колькасць насельніцтва была занята ў сферы дробнай вытворчасці. Сярод рамеснікаў меліся прадстаўнікі самых розных спецыяльнасцей: у мястэчку жылі сталяры, краўцы, гарбары, ганчары, кушняры, медзяры, металісты, ткачы. Рамесныя вырабы, як правіла, былі невысокай якасці, таму яны прадаваліся пераважна на мясцовым рынку. Звычайна майстэрні рамеснікаў былі невялікія, нават размяшчаліся ў хаце. Працавалі ў іх самі гаспадары (майстры) з 2—3 наёмнымі рабочымі, а нярэдка і без іх. Збытам выраблянага тавару займаўся спачатку сам гаспадар. Затым гэтыя функцыі перайшлі да скупшчыка — прадстаўніка гандлёвага капіталу. Забяспечваючы сыравінай і пазычаючы грошы рамеснікам, скупшчыкі ператваралі іх у наёмных рабочых.

Т.А.Матусевіч, А.М.Філатава.

У складзе Бабруйскага павета

У 1897 г. адбыўся першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі. На тэрыторыі сучаснага Глускага раёна знаходзіліся былыя Глуская, Гарадоцкая (Гарадкоўская), часткова Ляскавіцкая, Новадарожская і Брожская воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні.

У Глускай воласці меліся 33 сялібы, 502 двары, у межах валасной тэрыторыі 49 519 дзесяцін зямлі, у тым ліку сялянскія таварыствы валодалі 15 921 дзесяцінай, у валоданні прыватных асоб знаходзілася 33 129 дзесяцін, 100 дзесяцін належала казне.

Важнейшымі населенымі пунктамі воласці лічыліся мястэчка Глуск і некалькі бліжніх да яго сёл: Слаўкавічы, Касарычы, Вольніца, Поблін. У Глуску знаходзіліся валасное праўленне, народнае вучылішча, царкоўнапрыходская школа, 2 праваслаўныя царквы, 1 касцёл, 7 яўрэйскіх малітоўных дамоў, 125 крам, 9 заезных двароў, медаварня, сельская лячэбніца, паштова-тэлеграфная станцыя, вінны склеп, пражывала 4778 жыхароў. У сераду, пятніцу і нядзелю ў Глуску праходзілі таргі.

У мястэчку Гарадок у 1897 г. было 100 дамоў і 679 жыхароў, валасное праўленне, 1 праваслаўная царква, капліца, школа, яўрэйскі малітоўны дом, 4 крамы, збожжазапасны магазін, вадзяны млын, народнае вучылішча, заезны двор.

Важнейшымі населенымі пунктамі Гарадоцкай воласці з'яўляліся сёлы Вільча і Сіманавічы, Ляскавіцкай — Касарычы і Слаўкавічы, Новадарожскай — Бабірова, Брожскай — Гарадзішча (у складзе маёнтка Глуша), Зелянковічы.

Бабруйскі павет займаў тэрыторыю ў 10 721 кв. вярсту, у 1897 г. у ім пражываў 290 271 чалавек, сярод іх беларусаў было 174 115, рускіх — 35 256. У павеце жыло многа яўрэяў. Паводле саслоўяў насельніцтва падзялялася на дваран — 10 222 чалавекі, прадстаўнікоў духавенства — 801, купцоў — 877, мяшчан — 91 660 і сялян — 185 577 чалавек. Колькасць пісьменнага насельніцтва складала толькі 15,7%.

Т.А.Матусевіч, А.М.Філатава.

Народная адукацыя на Глушчыне ў другой палавіне XIX—пачатку XX ст.

У першай палавіне XIX ст. у Беларусі праведзена рэформа народнай адукацыі. У ходзе яе ствараліся пачатковыя школы рознага тыпу для сялян і рамеснікаў. Першая пачатковая школа (народнае вучылішча) была адкрыта ў Глуску ў 1864 г., крыху пазней — у Гарадку і Касарычах. Зразумела, што пачатковае навучанне было неабавязковым, таму школу наведвала нязначная колькасць дзяцей школьнага ўзросту. Бацькі, як правіла, пасылалі вучыцца толькі хлопчыкаў. Пераважная маса насельніцтва заставалася непісьменнай. Нават у пачатку XX ст. у Глуску маглі напісаць якую-небудзь судовую паперу ці прашэнне ўсяго 1—2 жыхары мястэчка, сам жа валасны старшыня (па цяперашнім часе старшыня райвыканкома) распісваўся звычайным крыжыкам, як і тысячы простых жыхароў воласці.

З цягам часу кантынгент навучэнцаў у народных вучылішчах некалькі павялічыўся. Гэты працэс найбольш характэрны для канца XIX ст. Бацькі сталі адпраўляць на вучобу і дзяўчынак. Напрыклад, у 1888/89 навучальным годзе ў Глускім народным вучылішчы займаліся 54 хлопчыкі і адна дзяўчынка, у Гарадкоўскім — 55 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак, у Касарыцкім — 31 хлопчык і 4 дзяўчынкі.

У Гарадку ў гэты час адкрылася таксама руска-латышская пачатковая школа, дзе настаўнічаў Карл Грэйзін.

У воласці пражывала нямала яўрэйскага насельніцтва. Яно аб'ядноўвалася ў абшчыну. Жылі яўрэі адасоблена, прытрымліваліся сваіх законаў і традыцый, мелі свой суд і самакіраванне. У Глуску знаходзілася сінагога, якая з'яўлялася цэнтрам жыцця ўсёй абшчыны, 7 малітоўных дамоў. Апошнія меліся таксама ў тых населеных пунктах, дзе сяліліся яўрэі.

Яўрэйская сінагога ў Глуску размяшчалася на цяперашняй вуліцы Сацыялістычнай, мела два паверхі. Гэта быў адзін з самых прыкметных будынкаў у мястэчку. Тут яўрэі маліліся, слухалі даклады вядомых рабінаў, якія прыязджалі з розных гарадоў, гутарылі, абмяркоўвалі ўсе пытанні свайго жыцця. У пятніцу вечарам па вуліцах, дзе жылі яўрэі, хадзілі служкі сінагогі, стукалі ў вокны лавак, каб іх гаспадары канчалі работу: наступала субота, якая лічылася святым днём. Гэтыя традыцыі перадаваліся з пакалення ў пакаленне і іх прытрымліваліся.

Яўрэйскай і старажытнаяўрэйскай мовам, а таксама старазапаветнаму закону яўрэйскіх дзяцей навучалі ў хедары (яўрэйская рэлігійная пачатковая школа для хлопчыкаў).

У 1884 г. было выдадзена палажэнне аб утварэнні пры царкоўных прыходах школ, якія падпарадкоўваліся мясцоваму праваслаўнаму духавенству. У Глуску адкрыліся крыху пазней дзве школы: пры Богаяўленскай царкве для хлопчыкаў, дзе духоўным выхавацелем быў свяшчэннік Рункевіч Рыгор. У школе навучалася не больш 30 дзяцей, яе памяшканне захавалася да нашых дзён (цяпер жылы дом на вуліцы Кірава побач з былым будынкам райаддзела міліцыі). Пры Васкрасенскай царкве дзейнічала царкоўнапрыходская школа для дзяўчынак. Яе начальніцай лічылася матушка, а навучанне дзяцей за мізэрную плату вялі малаадукаваныя царкоўныя служкі Рудзько Фёкла і Махнач.

Пры валасным праўленні працавала пачатковая земская школа з чатырохгадовым навучаннем, разлічаная на навучанне дзяцей дробных чыноўнікаў, местачковых служачых, а таксама заможных сялян з бліжэйшых вёсак. Гэта была агульнаадукацыйная школа павышанага тыпу. Сюды прымаліся дзеці, якія скончылі пачатковую аднакласную школу — народнае вучылішча.

Настаўніцай у Глускай земскай школе працавала Савіч, якая славілася жорсткімі адносінамі да сваіх выхаванцаў.

Заканчэнне земскай школы давала права паступаць у адпаведныя класы сярэдніх навучальных устаноў — гімназіі, прагімназіі, рэальнае вучылішча, якія меліся ў павятовым цэнтры — г. Бабруйск. Паступаючым неабходна было здаваць экзамены па замежных мовах.

У царкоўнапрыходскіх і земскай школах вучылі грамаце, Закону Божаму, царкоўнаславянскай мове, царкоўным спевам, чыстапісанню, арыфметыцы, знаёмілі з геаграфіяй Расійскай імперыі, дынастыяй Раманавых. Заняткі ў школах пачыналіся глыбокай восенню і заканчваліся як толькі

сыходзіў снег. Некалькі больш цягнуўся курс навучання ў старшай групе, якая звычайна экзаменавалася благачынным з г. Бабруйска пасля велікодных дзён. Для ўсіх школьнікаў абавязковым было наведванне царквы, захоўванне пастоў, споведзь.

1 ліпеня 1909 г. у Глуску адкрылася гарадское 4-класнае вучылішча на базе земскай пачатковай школы. Гэта была надзвычайная падзея для насельніцтва воласці. Навучальных устаноў такога тыпу на Глушчыне больш не было.

Да 1916 г. на яе тэрыторыі некалькі ўзрасла колькасць аднакласных пачатковых школ. Яны адкрываліся дзе-нідзе і па сёлах — звычайна там, дзе знаходзілася царква. Так, працавалі школы ў Вольніцы (настаўнік І.Ф.Шалінкевіч), Дуброве (настаўніца Хаціменак), Слаўкавічах (настаўнік Маеўскі), у вёсках Бабірова, Кнышы, Катка, Баянава, Жалвінец, Калюга, Падлужжа, Зубарэвічы, Казловічы.

Названыя вышэй навучальныя ўстановы працавалі да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. З ёю быў зроблены новы крок у развіцці народнай адукацыі: паявіліся прыватныя вучэбныя ўстановы. Так, былы інспектар гарадскога вучылішча М.Я.Танкевіч выкарыстаў велізарную цягу насельніцтва да асветы ў інтарэсах асабістага абагачэння. Ён дабіўся ад улады права на адкрыццё ў Глуску так званай прыватнай гімназіі. Памяшканне, вучэбныя дапаможнікі, інвентар, фізічны кабінет і г.д. склала маёмасць былога гарадскога вучылішча. У якасці настаўнікаў гімназіі былі прыцягнуты амаль выключна члены сям'і Танкевіча і яго самыя блізкія родзічы: дырэктар і выкладчыкі гімназіі Танкевіч Мікалай Якаўлевіч, яго брат Уладзімір Якаўлевіч, сястра Вольга Якаўлеўна, другі брат Дзмітрый Якаўлевіч і жонка Мікалая Якаўлевіча. За першы год існавання гэтай гімназіі Танкевіч набыў ва ўласнасць ад Малчадскіх усе пабудовы і тэрыторыю (цэлы квартал) гарадскога вучылішча, завёў багатую гаспадарку, ператварыўся ў буйнога ўласніка. Неўзабаве па ініцыятыве «новых» людзей, якія з'явіліся ў Глуску, была адкрыта другая гімназія, ужо пад шыльдай «грамадская гімназія».

Памяшканне для яе арандавалася ва ўладальніка дома Кветнай (гэты дом знаходзіўся на цяперашняй вуліцы Сацыялістычнай). Дырэктарам грамадскай гімназіі быў выбраны Лукашэвіч Уладзімір Міхайлавіч, ён жа выкладаў латынь і гісторыю. Чалавек старога складу, заўзяты чыноўнік, ён набыў за свае асабістыя якасці даволі выразную мянушку — Люпус (лацінскае — воўк). У гімназіі таксама працавалі: інспектар і выкладчык геаграфіі Корбун Іван Анікеевіч — былы настаўнік Бабруйскай прыватнай гімназіі, выкладчык рускай мовы і літаратуры Грэценскі Іван Васільевіч, выкладчык матэматыкі Залескі Сцяпан Уладзіміравіч (у 1940—1950-я гады ён працаваў настаўнікам матэматыкі ў Гарадкоўскай сярэдняй школе), выкладчык нямецкай мовы Таваніус, выкладчык Закона Божага свяшчэннік С.Зубкевіч і інш. Абедзве гімназіі працавалі па старых вучэбных планах, старых падручніках, у прыстасаваных памяшканнях, без усялякага абсталявання кабінетаў, бібліятэкі і г.д. Кантынгент навучэнцаў складаўся пераважна з найбольш заможных слаёў насельніцтва воласці і Глуска (Корбуты, Крукоўскія, Кернажыцкія, Дзіковічы, Махорты, Сыцькі, Фейнштэйны і інш.).

У.А.Вінель, А.М.Філатава.

Глускае гарадское вучылішча

У памятнай кніжцы Віленскай вучэбнай акругі на 1909—1910 гг. ёсць запіс, які сведчыць аб адкрыцці ў мястэчку Глуск Бабруйскага павета з 1 ліпеня 1909 г. чатырохкласнага гарадскога вучылішча. Такім чынам, 68 маленькіх жыхароў Глуска і навакольных вёсак, а таксама суседніх валасцей атрымалі ў тым годзе магчымасць набываць веды, спасцігаць таямніцы навукі, да якой з такой глыбокай павагай ставіліся іх бацькі. У гарадскім вучылішчы навучаліся многія яўрэйскія дзеці, дзеці больш заможных сялян. Наплыў навучэнцаў быў вялікі, таму ў першы клас прыём вёўся на падставе экзаменаў. За навучанне бралася плата ў памеры 10 рублёў у год (на той час немалая сума). Але, нягледзячы на гэта, праз год колькасць навучэнцаў рэзка ўзрасла: у вучылішча было прынята 158 дзяцей.

Перад многімі з іх адкрывалася перспектыва далейшай вучобы, бо тыя, хто

вывучаў замежную мову (французскую ці нямецкую) мог затым паступіць у адпаведныя класы сярэдніх школ (гімназію, прагімназію) у павятовым цэнтры — Бабруйску. І гэта таксама прыцягвала бацькоў, хоць за навучанне замежным мовам прыходзілася плаціць кожнаму дадаткова па 8 рублёў.

Вучылішча размяшчалася ў прыватным доме на вуліцы Слуцкай (цяпер вуліца Сацыялістычная, тэрыторыя былога дзіцячага дома № 1, пазней — Глускай райпаліклінікі). За арэнду патрэбна было плаціць яго гаспадару — мясцоваму гандляру Малчадскаму 800 рублёў у год. Крыху пазней да вучылішча адышлі яшчэ некалькі пабудоў, якія належалі Малчадскаму.

Загадваў вучылішчам калежскі асэсар Кірыла Міронавіч Барысавец. Ён закончыў курс Вілейскага настаўніцкага інстытута і па тым часе небеспадстаўна лічыўся вельмі адукаваным, а таму паважаным у мястэчку чалавекам.

Глускае гарадское вучылішча знаходзілася ў распараджэнні Міністэрства народнай асветы. На яго ўтрыманне з дзяржаўнай казны штогод адпускалася 4250 рублёў. Гэтай сумай не вычэрпваліся ўсе расходы навучальнай установы. Але цяга да ведаў у насельніцтва была настолькі велізарнай, што частку затрат добраахвотна ўзяло на сябе мясцовае мяшчанскае таварыства, якое штогод ахвяравала вучылішчу па тысячы рублёў, толькі б дзеці вучыліся.

Перад навучальнымі ўстановамі такога тыпу, як і раней, ставілася задача ўмацоўваць у народзе рэлігійныя паняцці і распаўсюджваць веды. Яны мелі адзіны вучэбны план, у якім на першае месца ставілася вывучэнне Закона Божага. У вучылішчы выкладаліся таксама такія прадметы, як чыстапісанне, руская мова, царкоўнаславянская мова, арыфметыка, геаметрыя, геаграфія, гісторыя, прыродазнаўства, чарчэнне, маляванне, замежныя мовы.

Гарадское вучылішча было даволі добраўпарадкавана: вялікі двор, фізкультурны гарадок, гардэробная, буфет для навучэнцаў, сад. Мела яно добры для свайго часу фізічны кабінет і цэлы шэраг дапаможнікаў па ўсіх прадметах. У вызначаныя дні з бібліятэкі можна было атрымаць мастацкую літаратуру і часопісы.

Зразумела, што ўся выхаваўчая і вучэбная работа вучылішча была падпарадкавана інтарэсам старога грамадскага ладу царскай Расіі. Царскія дні, гістарычныя падзеі і даты (трохсотгоддзе дома Раманавых, 50-я гадавіна з дня вызвалення сялян ад прыгоннага права, стагоддзе вайны 1812 г.) адзначаліся ўрачыстымі сходамі, вечарамі і пачастункамі. Да гэтых дзён хор вучылі-

Глускае гарадское вучылішча.

Богаяўленская царква ў Глуску.

шча развучваў песні пэўнага зместу, яго выступленні звычайна пачыналіся выкананнем царскага гімна «Боже, царя храни».

Каб мець уяўленне аб ідэйным і мастацкім змесце музычных нумароў, якія развучваліся хорам, прыводзім толькі адзін прыклад у сувязі са святкаваннем 50-годдзя царскага маніфеста аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці. Выконвалася наступная песня:

Ах, ты воля, моя воля,
Золотая ты моя!
Воля — сокол поднебесный,
Воля — светлая заря.
Не с росой ли ты спустилась?
Не во сне ли вижу я?
Знать, горячая молитва
Долетела до царя...

Тыя, хто заканчваў гарадское вучылішча, на падставе найвысачэйшага ўказа аб вышэйшых пачатковых вучылішчах, атрымлівалі правы на прысваенне чыноў і воінскай павіннасці нароўні з асобамі, якія заканчвалі 4 класы мужчынскіх гімназій Міністэрства народнай адукацыі.

У 1912 г. экзамены за выпускны клас здалі П.М.Бедгер (1895 г. нар.), А.К.Баброўнік (1892 г. нар.), Л.З.Вальфсон (1896 г. нар.), М.Е.Варанец (1892 г. нар.), М.Д.Гальперын (1897 г. нар.), Н.І.Дробаў (1890 г. нар.) і інш.

У якасці гарадскога Глускае вучылішча праіснавала да 1 студзеня 1913 г., потым яно было пераўтворана ў вышэйшае пачатковае вучылішча.

У.А.Вінель, А.І.Мардусевіч, А.М.Філатава.

Царкоўныя прыходы

У Глуску ў пачатку XX ст. пражывала звыш 5100 чалавек, з якіх палавіна адносілася да яўрэйскага насельніцтва. Яўрэі вялі гандаль жывёлай, а таксама займаліся так званай фабрыкацыяй глускай гарбаты, прыпраўляючы яе зеллем, падобным на чай. Праваслаўныя, у асноўным земляробы, гадавалі жывёлу і дабіваліся неблагіх вынікаў у развіцці гэтай галіны. Даходнымі промысламі былі рыбалоўства і пчалярства. Апошняе найбольшае распаўсюджанне атрымала ў вёсках Падлужжа, Розлевічы, Сімановічы і інш.

У канцы XIX — пачатку XX ст. у Глуску было 2 царквы — Богаяўленская і Васкрасенская, рымска-каталіцкі касцёл, мураваны кляштар. У самых буйных сёлах і вёсках таксама дзейнічала больш за дзесяць праваслаўных храмаў.

Царква займала ў жыцці людзей важнае месца. Яна была тым светлым астраўком на змрочным фоне будзённасці, дзе чалавек хоць на нейкі момант мог забыцца пра свае надзённыя справы, далучыцца да нечага светлага і ўзвышанага. Тут ён здабываў надзею і веру на лепшае, тут яго знямоглая ад цяжкіх штодзённых турбот душа адпачывала, набіралася цярпення і сілы. Храм служыў асяродкам культуры, ён замяняў простым людзям, што жылі ў сельскай мясцовасці, і тэатр, і музей, і іншыя ачагі культуры, якіх яны былі паз-

баўлены. Царква вучыла прыхаджан правільным узаемаадносінам паміж сабой, была крытэрыем маральнасці, старалася прывіць высокія духоўныя каштоўнасці.

Праваслаўныя храмы разам з вёскамі воласці адносіліся да шэрагу царкоўных прыходаў, якіх на Глушчыне было некалькі.

Першы Глускі прыход складаўся з часткі м. Глуск і 11 вёсак з 3297 прыхаджанамі. Прыход абслугоўвала Глуская Богаяўленская царква (мураваная, пабудаваная ў 1863 г.) і прыпісаная да яе царква, што мелася на могілках у в. Барысаўшчына. Другі Глускі прыход складаўся з часткі Глуска і 10 вёсак, сюды ўваходзіла 3010 прыхаджан, Глуская Васкрасенская царква (драўляная, пабудаваная ў 1898 г.) і царква ў в. Машніцы. Да Зелянковіцкага прыхода адносіліся 6 вёсак і адзін засценак, дзе пражывала 2076 прыхаджан, з цэрквамі — Свята-Троіцкай, узведзенай у 1766 г. у в. Зелянковічы, і прыпісанай да яе царквой у в. Зубарэвічы.

Меўся таксама Касарыцкі прыход, які ўключаў 9 вёсак з 2021 прыхаджанінам. Яго абслугоўвалі мясцовая Георгіеўская царква (драўляная, пабудаваная ў 1900 г.) і прыпісаная да яе царква ў в. Харомцы. Слаўкавіцкі прыход быў самы невялікі: сюды адносілася само сяло і в. Стражы, у прыходзе мелася 1143 прыхаджаніны, а таксама Казьмадзям'янаўская царква, пабудаваная ў Слаўкавічах у 1796 г.

Самы вялікі царкоўны прыход быў у Гарадку: у яго ўваходзілі само мястэчка і 16 вёсак, дзе пражывала 4730 чалавек, мясцовая Казьмадзям'янаўская царква (драўляная, узведзеная ў 1866 г.) з дзвюма прыпісанымі да яе цэрквамі прыхода.

А.М.Філатава.

З недалёкага мінулага школы

З артыкула У.М.Ігнатоўскага ў часопісе «Вестник народного комиссариата просвещения». 1922 г. № 11—12

Перада мною ляжыць некалькі дакументаў з жыцця школы на Беларусі ў 1910-м годзе. Чытаем лісточкі папер і здаецца, што гэта было ў сярэднія вякі, многа сот год таму назад, але на паперах ясна, чорным па белым напісана, што ўтварыліся гэтыя паперкі ў снежні 1910 году.

Ёсць на Беларусі добра вядомае нам мястэчка Глуск Бабруйскага павету. Перад рэвалюцыяй цэнтрам асветы мястэчка было чатырохкласавае гарадзкое вучылішча. Адну з першых скрыпак у школе іграў ацец законавучыцель гр.Рункевіч. Ён, як відаць, быў з «увучоных», бо пісаў артыкулы ў «Минские Епархиальные ведомости». Сваёй спецыяльнасцю ён лічыў крытыку. Прычым крытыку ён разумеў вельмі глыбока, што відаць з яго артыкулу аб Л.Н.Талстым. Артыкул невялікі, але затое моцны. З яго мы даведываемся, што Л.Н.Талстой ёсць ніхто іншы як «сучасны рускі гадарынскі беснаваты». Што датычыць да вучонага міру, то ён чамусь па думцы паважанага нашага крытыка «упадобіўся жыхаром старажытнага горада Гадары». Гэтыя вучоныя (жыхары Гадары) аплакуюць сьмерць Талстога (гадарынскага беснаватага), што вельмі не падабаецца аўтару Рункевічу. Па яго думцы, трэба не аплакваць Талстога, а падзякаваць за тое, што німа ўжо «вялікага пісьменніка зямлі рускай», каторага крытык называе ўжо новымі імёнамі — апакаліпсічным зьверам, прадцечаю антыхрыста, сынам пагібельным, другім ірадам, другім Арыем і другім Юліянам Адступнікам. На гэтым крытыка канчаецца.

15-га сьнежня 1910 году знамяніты крытык прыйшоў у вучылішча, каб вучыць дзяцей. Пачаў з гісторыі уніі, а скончыў сваім артыкулам. Аўтарскі зуд не даваў яму супакою. Як назло ў клясу ўвайшоў інспектар вучылішча Барысавец і прыпыніў чытанне артыкулу, каторы ня меў адносінаў да уніі, чым паставіў Рункевіча, па яго ўласным словам, «в конфуз перед учениками и подорвал перед ними авторитет» такога знаменітага крытыка і прафесара.

Вышэйуказаны факт апісуецца самім Рункевічам у афіцыяльнай паперы, каторую ён піша 21 сежня, як «донесение» свайму непасрэднаму начальству: «Его преосвященству, преосвященнейшему Михаилу, епископу Туровскому и Минскому и разных орденов кавалеру». Свой донос

Рункевіч, як чалавек «предусмотрительный» матывуе тым, што інспэктар будзе вясці з ім барацьбу і трэба зрабіць напад на ворага, не чакаючы пакуль ён пачне сваю барацьбу.

Добра вядомы ў Менску біскуп Міхаіл, атрымаўшы «смиреннейшее донесение» свайго дастойнага слугі, накіраваў яго, як належыць, па начальству, і папера папала да менскага дырэктара народных вучылішч, пад вышэйшым загадам каторага знаходзілася Глускае гарадзкое вучылішча. Ад дырэктара папера пашла да інспэктара Барысаўца, ад Барысаўца да дырэктара і г.д. Адным словам, бюракратычная машына запрацавала і пашла пісаць губерня.

У выніку ўсяго мы маем такія матар'ялы.

Наш паважаны крытык быў яшчэ і добрым разказчыкам-балагурам; божы закон ён ілюстраваў «анекдотамі і шуткамі». Што датычыцца да «анекдотов», то яны былі з пахучым душком цынізму і з заборыстымі словамі, якія мы тут не прыводзім дзеля іх «скромнасьці». Вучні слухалі і «благавейна» рагаталі так, што ў другіх клясах ня можна было працаваць.

Рункевіч быў чалавек з многагранаю душою і вельмі развітым мозгам. Дзеля ўсяго гэтага па яго выкладах вучні мелі магчымасць даведацца аб вельмі цікавых і размаітых рэчах. Рункевіч даваў вычэрпуючыя адказы на такія, напрыклад, запытанні: колькі ў пэрсіцкага шаха жонак; зачым яны яму патрэбны ў такім вялікім ліку; колькі дзяўчат у працягу года вывозіцца з Расіі на прадажу; куды яны вывозяцца і з якімі мэтамі... гдзе жыве душа супрацоўніка Пятра Феафана Пракаповіча; як ён, Рункевіч паставіў на калені ні больш, ні менш 80 генералаў; аткуль вядуць свой род тутэйшыя суседнія папы; як яны жывуць; колькі яны маюць дзяцей ад жонак і колькі ад прыслугі і г.д.

Маем мы яшчэ перад сабою адзін з вурокаў Рункевіча ад пачатку да канца. Мы астановімся на больш выдатных частках вурока. Пачаўся вурок з таго, што выкладца даў апавяданьне сваіх абавязкаў, як яны вялікі і многатрудны, як цяжка яму выпаўняць гэтыя абавязкі. Потым ён перайшоў да таго, што ў яго, Рункевіча, ёсць шмат ворагаў, каторыя точуць на яго зубы і хочуць зрабіць яму шкоду; але ён не баіцца сваіх ворагаў, бо сумленьне яго чыстае, як крыштал. Тут, відаць тон лекцыі быў біблейны і аўтар карыстаўся скаргамі на ворагаў псальмапеўца Давіда. У канцы ўрока неспадзевана наш глускі псальмапевец прыпыніў свой біблейны тон і загаварыў на больш сучасны лад. Інспэктар Барысавец у сваёй паперы на імя «Его Высокородия, Господина Директора Народных училищ Минской губерни» так апісуе лекцыі. «Затем он (Рункевич) перешел к тому, как часто ему приходится ездить по приходу ради исполнения треб и как иногда для этой цели приезжает за ним женщина. Он ее выругает и прогонит, и с ней не поедет; а другие священники и рады бывают такому случаю, напр., С. (Барысавец поўнай фамілії не вызначае). Он нарочно оттянет поездку к вечеру, а потом выедет за местечко и всю дорогу... Здесь мною опущено слово, употребленное о.законоучителем в классе, но не употребительное в печати». Так скончыў сваю лекцыю Рункевіч. Пачаў «за здравие», а скончыў «за упокой». Даваць коммэнтарыі да гэтай лекцыі, мне здаецца, няма сэнсу. Лекцыя гаворыць сама за сябе.

З дакументаў відна, што Рункевіч быў яшчэ і знамяніты царкоўны аратар, так сказаць. Ян Златавусны мястэчка Глуска. Яго прамовы насілі «обличительный» напрамак. Вызначым толькі, што гэты «вучоны» прамоўца найбольш абураўся сьвецкай навукай і адукацыяй. У выразах адчуваў сябе вольна. Па данесеньню Барысаўца — «иную проповедь церковную Рункевича не пропустила бы никакая цензура, тем более для детей».

Чым кончылася гісторыя, невядома. Дакументы даюць толькі адрывачны матар'ял. Але даволі і гэтага. Рэвалюцыя вымяла з школы Рункевічаў і больш яны туды не вярнуцца.

Медыцынскае абслугоўванне

На нізкім узроўні знаходзілася ў Мінскай губерні і медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Сельская медыцына ўзнікла тут толькі ў 1869 г. на аснове зацверджанага 24 снежня 1868 г. «Палажэння аб наладжванні сельскай урачэбнай медыцыны ў гу-

бернях, дзе не ўведзена ў дзеянне палажэнне аб земскіх установах». На ўсю губерню ў той час было ўсяго 9 урачоў (па адным на кожны павет), 74 сельскія фельчары і 27 павітух. У год сельскі ўрач атрымліваў 500 руб., фельчар — 80, а павітуха — 30 руб. Сельскіх бальніц было вельмі мала, у Бабруйскім павеце яны знаходзіліся ў мястэчках Глуск і Парычы.

У лячэбнай установе Глуска, кошт утрымання якой складаў за год 2285 рублёў, мелася толькі 10 ложкаў, у 1896 г. паслугамі сельскай бальніцы карысталася 226 чалавек.

Пры вялікай тэрыторыі кожнага павета і пры адсутнасці добрых шляхоў зносін сельскія ўрачы вельмі рэдка траплялі ў вёскі да хворых. Урачэбную дапамогу ў асноўным аказвалі фельчары, але і іх было толькі 8 на павет, кожнаму на год выдзялялася на медыкаменты для аптэкі ўсяго 10 рублёў. Гэта была сапраўды кропля ў моры розных хвароб, якімі пакутавалі людзі, і эпідэмій, што даволі часта ўспыхвалі ў вёсках.

У 1888 г. у Мінскай губерні колькасць урачоў павялічылася ўдвая, працавала ўжо 120 фельчараў, было адкрыта 18 сельскіх лячэбных і 36 фельчарска-прыёмных пунктаў. Аднак гэтага не хапала, каб задаволіць патрэбнасць у медыцынскай дапамозе, і гэтага не маглі не прызнаць царскія чыноўнікі.

Трывожныя сігналы з «нізоў» аб стане медыцыны ў краіне прымусілі царскі ўрад ажыццявіць некаторыя крокі па яе паляпшэнні. Гэтыя змены закранулі і Глушчыну.

Крыху пазней быў створаны Глускі ўрачэбны ўчастак, які абслугоўваў каля 50 тысяч чалавек. На гэту колькасць насельніцтва прыходзіўся адзін урач, 7 фельчараў і павітуха. Зразумела, што такая колькасць медыцынскага персаналу не магла ахапіць усіх хворых, аказаць ім патрэбную дапамогу. Тым не менш медыкі працавалі з велізарнай самаадданасцю, ахвяруючы нярэдка і сваім часам, і здароўем, а то і жыццём. У 1906 г. на Глускім участку было прынята, напрыклад, каля 33 тысяч хворых. У 1908 г. урачом тут працаваў Талачынскі (атрымліваў 112 руб. у год).

Яшчэ горшым было становішча ў ветэрынарыі. І калі ўспыхвалі эпідэміі, то насельніцтва практычна не магло разлічваць на якую-небудзь кваліфікаваную дапамогу, бо яе практычна не было адкуль чакаць. У 1907 г. на ўвесь Бабруйскі павет прыходзіліся ветурач С.І.Каморніцкі, 2 бабруйскія ветфельчары — А.Урбанаў і Т.В.Сыценка, парыцкі ветфельчар І.І.Апухоўскі.

А.М.Філатава.

Эпідэмія халеры ў 1893 г.

Першая хваля эпідэміі халеры пракацілася па Міншчыне ў 1892 г. У ліпені таго ж года губернатар распарадзіўся неадкладна прывесці ў належны санітарны стан усе населеныя пункты губерні. А месяцам пазней у гарадах і паветах пачалі дзейнічаць санітарна-выканаўчыя камісіі, якія сачылі за абавязковым выкананнем усіх супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў.

На адным з пасяджэнняў губернскага камітэта грамадскага здароўя адзначалася, што хвароба на прасторы губерні занесена параходамі, якія плавалі па Дняпры і яго прытоках.

А ў другой палавіне 1893 г. зноў адбылася ўспышка халеры. Першы выпадак захворвання выяўлены 25 ліпеня на параходзе, што прыбыў з Кіева ў Пінск. Хворай аказалася актрыса, якую адразу ж ізалявалі ў халернае аддзяленне гарадской бальніцы.

Уважлівы санітарна-паліцэйскі агляд выявіў на тым жа параходзе качагара з прызнакамі халеры.

Зазначым, што яшчэ да пачатку эпідэміі ў Бабруйскім павеце былі створаны два медыцынскія ўчасткі — Парыцкі і Глускі. У склад Глускага ўваходзілі 11 валасцей (Глуская, Гарадоцкая, Асавецкая, Забалацкая, Новадарожская, Горкаўская, Жыцінская, Свіслацкая, Замошская, Ляскавіцкая і Рудобельская). На тэрыторыі ўчастка размяшчаліся адна бальніца і два прыёмныя пакоі.

Першы выпадак захворвання на Глускім участку (Новадарожская воласць) адзначаны 30 ліпеня. Напярэдадні селянін Тарас Лосік ездзіў у Бабруйск і заходзіў у карчму, дзе былі падазроныя на халеру людзі. Вярнуўшыся дадому, ён адразу ж адчуў сябе дрэнна і на другі дзень памёр. У час хваробы Лосіка да яго наведалася

ўнучка, атрымала прывезеныя з горада ласункі і таксама захварэла, а 1 жніўня памерла.

Цяжкімі аказаліся вынікі эпідэміі для сялян в. Макарычы. Тут з 14 халерных хворых памерлі 10. Захворвалі пераважна дзеці 3—7 гадоў і людзі старэйшыя за 55 гадоў.

Па назіраннях спецыялістаў на Глускім участку з 10 верасня новых захворванняў не было. Наогул жа заўважана, што ў тых людзей, якія галадалі і не злоўжывалі спіртнымі напіткамі, халера праяўлялася меней.

У в. Кассё Свіслацкай воласці, дзе сяляне жылі ў чыстаце, халера ўзнікла толькі ў некалькіх хатах, куды яе занеслі з Бабруйска. У некаторых вёсках Глушчыны захворванні былі адзінкавымі. Ды і ўзнікалі яны большай часткай у тых, хто наведваў хаты, дзе былі халерныя хворыя.

Цячэнне хваробы нагадвала атручэнне нейкім ядам: мацнейшая апатыя, санлівасць, ледзь улоўны пульс, сутаргі. Найменшая працягласць хваробы 14—18 гадзін, звычайна канчалася смерцю, а найбольшая — 8—10 дзён, і наступала выздараўленне.

Здавалася б, што ў час якіх-небудзь зборышчаў, царкоўных працэсій і свят эпідэмія павінна пашырацца. Аднак, як сцвярджаў губернскі ўрачэбны інспектар, доктар медыцыны П.М.Пятроў, нічога падобнага не адзначана. Наадварот, хрэсны ход дабратворна ўплываў на сельскае насельніцтва, уздымаў дух і энергію, рассейваў панічны страх.

Насельніцтва з разуменнем ставілася да ўсіх прафілактычных мерапрыемстваў, што праводзіліся санітарна-выканаўчымі камісіямі.

В.У.Ляшчынскі.

Развіццё рэвалюцыйнага руху

У канцы 1860—пачатку 1870-х гадоў ва ўмовах далейшага развіцця ў краіне капіталістычных адносін, разарэння сялянства і нарастання яго супраціўлення памешчыцкаму прыгнёту ў рускім рэвалюцыйным руху, вяршыняй якога стала паўстанне 1863 г., сярод разначыннай інтэлігенцыі пачала фарміравацца новая плынь, вядомая ў гісторыі пад назвай народніцтва. Рэвалюцыйныя народнікі былі самаадданымі барацьбітамі супраць царскага самадзяржаўя, супраць памешчыцкай і капіталістычнай эксплуатацыі, выразнікамі і абаронцамі інтарэсаў сялянства ў яго барацьбе за зямлю і волю.

Пад уплывам народнікаў узмацнілася самаадукацыя рабочых, расло знаёмства з нелегальнай літаратурай, абуджалася цікавасць да палітычнага жыцця, да марксісцкай ідэалогіі.

Гэта падрыхтавала глебу для стварэння ў другой палавіне 1880—пачатку 1890-х гадоў гурткоў пралетарскага тыпу, да паступовага пераходу ад гурткавай работы да масавай агітацыі сярод рабочых. Але неабходна было злучыць навуковы сацыялізм з рабочым рухам і ўтварыць на гэтай аснове рэвалюцыйную марксісцкую партыю.

На рубяжы дзвюх гістарычных эпох у Расіі з марксісцкіх гурткоў нарадзілася рэвалюцыйная партыя рабочага класа, якая ўзяла на сябе велізарную гістарычную місію — перавесці ў плоскасць практыкі ідэі пабудовы новага грамадства на сацыялістычнай аснове.

Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў 2-й палавіне 1890-х гадоў узнікаюць у многіх беларускіх гарадах. З гэтага часу практычна спыняюцца стыхійныя выступленні рабочых. На змену ім прыходзяць арганізаваныя забастоўкі, стачкі. Іх удзельнікі патрабуюць вырашэння многіх эканамічных пытанняў, галоўныя з якіх — павышэнне заработнай платы, скарачэнне працягласці рабочага дня і г.д. Менавіта пад такімі лозунгамі ў цэнтры Бабруйскага павета ў снежні 1898 г. прайшла першая стачка. Яна падтрымала намаганні 13 рабочых горада, якія больш месяца вялі барацьбу з гаспадаром аднаго з прадпрыемстваў, патрабуючы ад яго скарачэння рабочага дня да 12 гадзін. У рэшце рэшт уладальніку прыйшлося ўступіць.

Адгалоскі гэтых падзей у Бабруйску, безумоўна, не маглі не дайсці да вясковага насельніцтва павета. Сяляне зацікаўлена абмяркоўвалі пачутае, выказвалі спачуванне рабочым, жыццё якіх таксама было цяжкім і паднявольным. Далейшае

развіццё і пранікненне капіталістычных адносін у сельскую гаспадарку прывяло вёску да расслаення. Паводле размеркавання зямлі, цяглавай сілы і іншых сродкаў вытворчасці сяляне Беларусі ў пачатку XX ст. падзяляліся на наступныя сацыяльныя групы: беднату (складала прыблізна 61%), сераднякоў (29%) і кулакоў (10%). Важнейшым паказчыкам гэтага працэсу з'яўлялася абеззямельванне сялян, у выніку якога палавіна дарослага насельніцтва беларускай вёскі не магла быць занята на ўласнай гаспадарцы і не магла існаваць без продажу сваёй рабочай сілы. Гаспадаркі памешчыкаў і заможных сялян былі не ў стане паглынуць залішняе мноства незанятых рабочых рук, што з'явіліся ў вёсцы.

Малазямелле, нізкая ўраджайнасць палёў, абумоўленая панаваннем трохпольнай сістэмы і апрацоўкай зямлі прымітыўнымі прыладамі, недахоп угнаенняў, падзеж жывёлы, рэшткі прыгонніцтва, — усё гэта паскарала разарэнне сялянскіх гаспадарак, гнала людзей з родных мясцін, ад сям'і ў горад, на адыходніцтва, якое ўцягвала сельскіх жыхароў у шумны вір грамадскага жыцця. Насельніцтва страчвала сваю векавую аседласць — пошукі лепшага жыцця, кавалка зямлі перамяшчалі людзей, як тое перакаці-поле, у іншыя рэгіёны краіны, знішчалі іх шматвяковую забітасць, павышалі паволі пісьменнасць, нараджалі новыя запатрабаванні, звычкі ў культуры, побыце.

Многія адыходнікі паступова парывалі сувязь з вёскай і ператвараліся ў пастаянных прамысловых рабочых.

Вёска шукала выхаду з беспрасветнай кабалы і, не знаходзячы яго, накіроўвала свой гнеў на крыўдзіцеляў — памешчыкаў. У аснове сялянскіх выступленняў па-ранейшаму была барацьба за зямлю і асабліва з-за размежавання. Як вядома, пасля рэформы 1861 г. на Беларусі памешчыцкія і сялянскія землі не былі размежаваны. У многіх месцах такое становішча захоўвалася да пачатку XX ст.

З развіццём гандлёвага земляробства памешчыкі ўсяляк імкнуліся павялічыць свае ўладанні, і найбольш зручным выпадкам для гэтага было размежаванне. Так, летам 1891 г. сяляне в. Даколь аказалі супраціўленне ўладам пры правядзенні такіх работ.

Вострыя супярэчнасці паміж сялянамі і памешчыкамі выклікаў такі перажытак прыгонніцтва, як сервітуты. У Беларусі сервітуты ў большасці выпадкаў заключаліся ў праве сялян карыстацца ў якасці пашы некаторымі ўгоддзямі, якія юрыдычна належалі памешчыкам, — лясамі, папарамі і незасеянымі аблогамі, а таксама сенакосамі пасля ўборкі траў.

У руках памешчыкаў, такім чынам, аказаліся вельмі важныя ўчасткі зямлі — выганы, пашы і іншыя ўгоддзі, якімі яны распараджаліся як хацелі. Пазбаўленне сялян сервітутаў наносіла вялікі ўдар па сялянскай гаспадарцы. На гэтай глебе не раз абвастраліся ўзаемаадносіны паміж сялянамі в. Слаўкавічы і мясцовым памешчыкам. Справа прыняла такі абарот, што на працягу некалькіх гадоў (1890 — 1893) сяляне сталі самавольна пасвіць сваю жывёлу на памешчыцкіх угоддзях.

Узмацненне сялянскага руху вымушаны былі прызнаць царскія ўлады.

Урад прыняў тэрміновыя захады, накіраваныя супраць сялянскіх выступленняў. У сельскай мясцовасці з мая 1903 г. уводзілася паліцэйская вахта. У той жа час улады вымушаны былі пайсці на некаторыя ўступкі. 12 сакавіка 1903 г. была адменена кругавая парука пры спагнанні казённых земскіх і грамадскіх паборaў, а маніфестам ад 11 жніўня 1904 г. адмяняліся цялесныя пакаранні для сялян па прыгаворах валасных судоў; была адменена частка нядоімак па выкупных плацяжах, казённых і земскіх паборах, што назбіраліся да студзеня 1904 г.

Падачкі царызму не маглі задаволіць сялянскія масы, якія дабіваліся не дробных уступак, а ліквідацыі памешчыцкай зямельнай уласнасці. Паступова складвалася думка, што зямля не можа належаць памешчыку, які асабіста яе не апрацоўвае, а павінна быць падзелена паміж сялянамі, якія працуюць на гэтай зямлі. Гэтак жа паступова нараджалася і перакананне, што царскі суд, паліцыя і чыноўнікі заўсёды стаялі і будуць стаяць на баку памешчыкаў, што інтарэсы апошніх ахоўваюцца ўсім самадзяржаўна-паліцэйскім апаратам. Такому прасвятленню сялян у пачатку XX ст. спрыяла планамерная работа, якую разгарнулі ў вёсцы мясцовыя арганізацыі рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. У канцы 1903 г. і на працягу 1904 г. група

РСДРП сфарміравалася таксама і ў цэнтры павета Бабруйску.

Бабруйская арганізацыя РСДРП устанавіла трывалыя і рэгулярныя кантакты з некаторымі вёскамі, шырока разгарнула агітацыю сярод сялян Бабруйскага і часткі Слуцкага паветаў. У ліпені 1904 г. яна выпусціла пракламацыю «Да народа», у якой падкрэслівалася, што царскі ўрад распачаў руска-японскую вайну для таго, каб прадухіліць рэвалюцыю, «адцягнуць увагу народа ад яго сапраўдных ворагаў». Паражэнні, якія цярпела Расія ў вайне, тлумачыліся «гніласцю самадзяржаўнага ладу, не згоднага весці колькі-небудзь сур'ёзную справу». Як адзначалася ў паліцэйскім данясенні, гэтыя пракламацыі раскідваліся «выключна каля сялянскіх дамоў».

З канца 1904 г. у краіне хутка нарастаў рэвалюцыйны рух рабочага класа. Паражэнне царскіх войскаў у Маньчжурыі і здача японцам Порт-Артура абвастрылі ўнутрыпалітычнае становішча ў Расіі, наблізілі рэвалюцыйную развязку.

У пачатку 1905 г. барацьба сялян праяўлялася галоўным чынам у самавольных парубках, якія набывалі характар прамога і адкрытага захопу памешчыцкай уласнасці. Па актыўнасці і колькасці гэтых актаў найбольш вылучаўся Бабруйскі павет, дзе парубкі памешчыцкага лесу адбываліся ў многіх яго валасцях.

Вясной і летам сялянскі рух развіваўся ў форме патраў і самавольнага выпасу жывёлы на памешчыцкіх землях, захопу сенакосаў і іншых угоддзяў.

Для барацьбы з рэвалюцыйным рухам па асобных гарадах і мястэчках Мінскай губерні былі раскватараваны казацкія і іншыя часці.

Пад непасрэдным уплывам падзей, што адбываліся ў краіне і ў цэнтры павета, бурліў і Глуск. У пачатку года правялі забастоўку рабочыя драўнянастружкавай мануфактуры. 25 ліпеня ў мястэчку адбыўся мітынг, на якім прысутнічала каля 1500 чалавек, а 5 верасня прайшла дэманстрацыя, удзел у якой прынялі 200 рабочых. У кастрычніку новы акт непадпарадкавання ўскалыхнуў усю воласць. 17 кастрычніка ў Глуску ўзбунтаваліся навабранцы. Іх выступленне не з'яўлялася праяўленнем анархічнага буйства, як гэта спрабавалі сцвярджаць паліцыя і ваенныя чыноўнікі. Адбыўся стыхійны ўзрыў прыгнечаных мас сялянства супраць памешчыкаў і органаў іх дзяржаўнай улады.

Паведамляючы аб здарэнні міністру юстыцыі, пракурор Мінскага акруговага суда ў тэлеграме адзначаў, што навабранцы... «заставили прекратить воинское присутствие в Глуске, прервана телефонная связь с уездом». Каб усмірыць бунтаўшчыкоў, губернатар паслаў войскі.

Хваля ўсенароднага пратэсту, што ўзнялася ў пачатку студзеня 1905 г., з кожным месяцам усё больш мацнела. Восенню рэвалюцыйны рух ахапіў усю Расію. Кастрычніцкая палітычная стачка, якая пачалася ў Маскве і праводзілася пад лозунгамі звяржэння самадзяржаўя і ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі, стала сапраўды Усерасійскай, бо яе падтрымлівалі дзесяткі гарадоў і мястэчкаў і прынялі ў ёй удзел мільёны працоўных. Стачка паралізавала ўсё жыццё краіны і дзейнасць урада.

Каб збіць рэвалюцыйны накал, царскі ўрад пайшоў на некаторыя палітычныя ўступкі. 17 кастрычніка цар Мікалай II падпісаў маніфест, у якім заявіў аб дараванні народу грамадзянскіх свабод, — свабоду друку, сходаў, саюзаў і інш., а таксама надзяляў Дзяржаўную думу заканадаўчымі паўнамоцтвамі і пашырыў кантынгент выбаршчыкаў.

У пачатку снежня 1905 г. урад паспрабаваў авалодаць становішчам у краіне, адмяніўшы раней аб'яўленыя свабоды: былі закрыты многія дэмакратычныя газеты, пачаліся арышты, забаранялася дзейнасць асобных саюзаў.

У адказ на гэта пралетарыят Масквы пачаў 7 снежня Усеагульную палітычную стачку, якая перарасла ва ўзброенае паўстанне.

У вёсках таксама было не спакойна. У гэты перыяд сялянскі рух вызначаўся палітычнай актыўнасцю. У Мінскай губерні ўлады спрабавалі прыцягнуць да актыўнай барацьбы з сялянскім рухам памешчыкаў. У мінскага губернатара ў пачатку снежня адбылася нарада павятовых прадвадзіцеляў дваранства. Удзельнікі губернскай нарады выказаліся за ўзмацненне рэпрэсій супраць сялян. 10 снежня Мінская губерня была аб'яўлена на становішчы надзвычайнай аховы.

Але рэвалюцыйны рух у вёсцы працягваў узмацняцца. І толькі ў пачатку студзеня 1906 г. ён прыкметна спаў, гэтаму са-

дзейнічалі паўсюдныя рэпрэсіі супраць рэвалюцыйна настроеных сялян.

Рэвалюцыя пайшла на паступовае затуханне, якое расцягнулася на паўтара года. Паўстанні ў Маскве і іншых гарадах і раёнах Расіі былі задушаны ўзброенымі сіламі. Паліцыя і чарнасоценныя банды ўчынялі пагромы насельніцтва, а царскія войскі расстрэльвалі народныя мітынгі. У многіх паветах дзейнічалі карныя вайсковыя экспедыцыі і атрады паліцэйскіх стражнікаў. Ім было загадана любымі мерамі аднавіць парушаны парадак, апіраючыся на сакрэтны цыркуляр міністра ўнутраных спраў Расіі, у якім прапаноўвалася «пры падаўленні сялянскіх смут і беспарадкаў дзейнічаць без усялякіх ваганняў, самым рашучым чынам, знішчаючы мяцежнікаў узброенымі сіламі, без усялякай літасці, не саромеючыся прымянення самых суровых мер».

У абставінах жорсткіх рэпрэсій, спаду рабочага руху вёска ў 1-й палавіне 1906 г. таксама перажывала перыяд зацішша. Але ўжо ў сакавіку газета «Северо-Западный голос» паведамляла, што тут вельмі трывожны настрой, што памешчыкі і мясцовыя ўлады крайне занепакоены ў чаканні веснавых падзей.

Гэта занепакоенасць не была выпадковай. У Мінскай губерні, напрыклад, у пачатку вясны зноў пачаліся захопы памешчыцкіх зямель. Сяляне спяшаліся завалодаць перш за ўсё тымі ўчасткамі, якія яны лічылі сваімі сервітутамі або спрэчнымі, яшчэ спадзеючыся, што Дзяржаўная дума так ці інакш узаконіць іх фактычнае валоданне. У першыя дні мая 1906 г. у маёнтку Хваставічы сяляне не дазволілі сагнаць сваю жывёлу з луга памешчыка. Каб уціхамірыць бунтаўшчыкоў, памешчык выклікаў паліцыю, якая арыштавала начыншчыкаў Яфіма Муху, Мяленція Буневіча, Мікіту Муху і іншых. У Бабруйскім павеце адзначаліся таксама забастоўкі батракоў і падзёншчыкаў. Паліцыя з дапамогай вайскоўцаў правяла масавыя арышты сялян, бабруйская турма была перапоўнена сельскімі бунтаўшчыкамі.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. была жорстка задушана царызмам. Аднак сацыяльна-эканамічныя прычыны не былі ліквідаваны.

Ход рэвалюцыі паказаў, што разлікі царскага ўрада абаперціся на сялянства, якое быццам бы захавала вернасць самадзяржаўю, аказаліся глыбока памылковымі. Сяляне гатовы былі вырашыць праблему зямлі сілай.

У гэтых умовах царскі ўрад ажыццявіў круты паварот ва ўсёй аграрнай палітыцы, разлічаны ўжо не на ўсё сялянства, а толькі на заможныя вярхі. Сталыпінская аграрная рэформа прадугледжвала знішчэнне абшчыны, замацаванне надзельнай зямлі ў асабістай уласнасці, насаджэнне хутароў і водрубаў.

Сяляне Мінскай губерні як маглі супраціўляліся насаджэнню хутарызацыі. На працягу 1907—1915 гг. тут перайшло да хутарскога землекарыстання толькі 4,6% сялянскіх двароў, што было ў 2—3 разы менш, чым у іншых губернях.

Састаўная частка аграрнай палітыкі царызму — перасяленне сялян на ўскраіны краіны. За 8 гадоў (1907—1914) на Мінскую губерню прыпадала 18,5 % ад усёй колькасці перасяленцаў.

Асноўную катэгорыю перасяленцаў складала бяднейшае сялянства. Яно ехала ў Сібір з надзеяй, што, нарэшце, выратуецца ад галечы і голаду. Аднак у большасці сваёй гэтым надзеям не было суджана збыцца, бо царская адміністрацыя не змагла належным чынам арганізаваць перасяленчую справу. На тыя невялікія сродкі, што сем'і перасяленцаў атрымалі ад дзяржавы ды выручылі ад продажу свайго надзелу і гаспадаркі на радзіме, не ўсім удалося разжыцца на новым месцы. Для апрацоўкі адведзенага зямельнага ўчастка (часта гэта былі балоты, заросшыя лесам, землі, далёкія ад жылля і г.д.) патрэбны былі коні, сельскагаспадарчыя прылады і, зразумела, грашовыя сродкі.

Большасць перасяленцаў гэтага не мела. Да таго ж дрэнныя санітарныя ўмовы выклікалі розныя захворванні і вялікую смяротнасць сярод перасяленцаў. У выніку значная частка іх канчаткова разарылася і вымушана была вярнуцца ў родныя мясціны. Многія перасяленцы паміралі ў дарозе.

У гэты перыяд пачаўся масавы выезд за мяжу, галоўным чынам у ЗША, Канаду, Германію.

Сталыпінская аграрная рэформа пацярпела крах, пакінуўшы недатыкальным буйное памешчыцкае землеўладанне. Ранейшае малазямелле і прыгнёт памешчыкаў засталіся галоўнымі прычынамі аб-

вастрэння сацыяльных супярэчнасцей у вёсцы. Як і раней, распаўсюджанымі формамі барацьбы былі парубкі і патравы, але мелі месца і больш жорсткія меры сялянскай помсты. 14 кастрычніка 1907 г. у маёнтку Макраны, які належаў двараніну Піліпу Корсаку, загарэлася гумно. Сена і збожжа, што захоўваліся ў ім, згарэлі. Пажар знішчыў таксама тры гаспадарчыя двары, нанесеныя страты склалі да 2 тыс. рублёў. У данясенні ў дэпартамент паліцыі ўказвалася, што ўзнікшы пажар — нішто іншае, як падпальванне, якое ўчынілі некалькі сялян з в. Барысаўшчына. Іх неаднаразова прыцягвалі да судовай адказнасці за самавольныя парубкі памешчыцкага лесу.

У гады рэакцыі сялянскі рух у параўнанні з перыядам першай рускай рэвалюцыі некалькі аслабеў, стаў менш масавым, больш стыхійным і разрозненым, але не спыніўся зусім, як гэтага дабіваліся царскія ўлады.

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы суправаджалася тэхнічным прагрэсам у земляробстве. Хоць і павольна, але саха, драўляны плуг і драўляная барана замяняліся ўдасканаленымі сельскагаспадарчымі прыладамі, машынамі, аднак забяспечанасць імі ў Беларусі была яшчэ нязначнай.

Т.А.Матусевіч, А.М.Філатава.

У гады 1-й сусветнай вайны

Цяжкія выпрабаванні насталі для жыхароў Глушчыны з пачаткам 1-й сусветнай вайны летам 1914 г. З прычыны свайго геапалітычнага становішча Беларусь зноў стала арэнай жорсткіх баявых дзеянняў, месцам гібелі мноства мірных грамадзян, знішчэння матэрыяльнага і духоўнага багацця, якое стваралася намаганнямі не аднаго пакалення.

Мінская губерня з 18 ліпеня была аб'яўлена на ваенным становішчы, а па меры набліжэння да яе тэатра ваенных дзеянняў тут усталяваўся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым. Цяжар вайны цалкам лёг на яе жыхароў, тысячы якіх, як і з іншых мясцін, былі мабілізаваны на ваенна-абарончыя работы.

З лета 1915 г. большая частка Беларусі стала прыфрантавой зонай. Царскія ўлады ўсімі сіламі імкнуліся забяспечыць тут «спакой», «падтрымаць належны парадак». Але гэта не заўсёды ўдавалася. У сувязі з ваенным часам усялякія нарады на работы настолькі пачасціліся і так сталі турбаваць людзей, што ў Бабруйскім павеце ў асобных валасцях насельніцтва перастала выконваць распараджэнні паліцыі і ўдзельнічаць у ваенных работах. Сяляне многіх вёсак адкрыта высякалі і падпальвалі памешчыцкія лясы, захоплівалі сенажаці і пашы, нападалі на маёнткі, уступалі ў сутычкі з паліцыяй.

На працягу многіх гадоў сяляне в. Слаўкавічы вялі барацьбу з мясцовымі памешчыкамі за сервітуты. Найбольш значныя іх выступленні былі зарэгістраваны ў 1891 г. і 1892 г. Гэтая барацьба не спынялася і пазней. Павятовы спраўнік у сваім рапарце мінскаму губернатару вясной 1915 г. паведамляў, «што быў шэраг судовых рашэнняў аб самавольнай пасьбе сялянамі жывёлы з прысуджэннем сялянам у карысць памешчыка ўзнагароды, і, нягледзячы на гэта, яны працягваюць выпас сваёй скаціны па-ранейшаму». 9 красавіка памешчык аб'явіў сялянам, што дазваляе пасвіць жывёлу задарма салдаткам, і прапанаваў ім падаць у абласное праўленне звесткі аб колькасці жывёлы ў іх гаспадарках, а на наступны дзень уся вёска паранейшаму пагнала жывёлу на памешчыцкі луг. Больш таго, праз некаторы час, 21 чэрвеня, сяляне Слаўкавіч выказалі новы пратэст памешчыку Грабоўскаму: яны паехалі ў графскі лес і зрабілі самавольную парубку. На наступны дзень у вёску з'явіўся аканом маёнтка разам з паліцыяй і лясной вартай. У селяніна Ахрамейкі яны знайшлі некалькі калод і намерваліся забраць іх, але натоўп сялян (больш за 50 чалавек), што сабраліся з нагоды прыезду прадстаўнікоў улады, узброеныя палкамі і камянямі, аказалі супраціўленне, збілі паліцыю і вартаўнікоў. Такія ж выпадкі адбываліся ў вёсках, што межавалі з маёнткам Слаўкавічы.

Ваенныя дзеянні на франтах складваліся не на карысць Расійскай імперыі. Ужо з першых дзён вайны адчуваўся востры недахоп зброі і боепрыпасаў. Тэхніка-эка-

намічная адсталасць Расіі, адсутнасць моцнага тылу, гніласць і прадажніцтва дзяржаўнага апарату пацягнулі за сабой шэраг паражэнняў рускай арміі ў ваеннай кампаніі 1915 г. Рускія салдаты змагаліся мужна і самаадданa, але дрэнна ўзброеныя, без належнага забеспячэння вымушаны былі адступаць, тысячамі гінулі на франтах.

Вайна балюча закранула жыццё насельніцтва прыфрантавой паласы, якое масава пакідала свае мясціны, родную зямлю. Адыход рускіх войскаў са сваіх пазіцый і наступленне немцаў выклікалі масавы паток бежанцаў. І на тое былі прычыны. Па рускай арміі быў прыняты загад, у якім патрабавалася: «Уводить мужское население возрастом от 18 до 50 лет, местных жителей... с домашним необходимым имуществом».

Для тых, хто не хацеў пакідаць родную хату, прымусова ствараліся ўмовы, пры якіх заставацца далей каля фронту было немагчыма з-за рэквізіцый: «тем кто не выходит из дому, оставлять одну корову и сена на один месяц». Тыя ж, хто «добровольно угоняет скот и уводит припасы в тыл армии, не подлежит реквизиции». Акрамя таго, на жыхароў вайсковага тылу вялікім цяжарам ляглі абавязкі ўтрымліваць за свой кошт маршавыя роты, якія не вельмі добразычліва ставіліся да насельніцтва. Нездарма загадам па рускай арміі «за мародёрство вводилась смертная казнь через повешение».

У такіх умовах мало хто рызыкаваў застацца ў прыфрантавой паласе. Яшчэ большы паток хлынуў на ўсход з тымі, хто ратаваўся ад акупацыйнага нямецкага рэжыму, бо на акупіраваных тэрыторыях быў жорсткі рэжым дэспатызму, рабаўніцтва і гвалту. Жыхары павінны былі здаць увесь авёс, шкуры, воўну, масла, пражу, шчацінне, паперу, метал, косці, анучы і інш. Усё насельніцтва ва ўзросце ад 15 да 50 гадоў павінна было плаціць падушны падатак, спаганяліся шматлікія штрафы. Акрамя гэтага, нямецкія войскі чынілі здзекі і гвалты, тысячы мірных грамадзян вывозілі на работы ў Германію.

Становіцца зразумелым, чаму пачаліся масавыя ўцёкі мірнага насельніцтва на ўсход, галоўным чынам жанчын, старых і дзяцей. Лавіна бежанцаў расцягнулася па дарогах Беларусі на сотні кіламетраў. Гэты шлях быў усеяны магільнымі крыжамі і ўзгоркамі.

Становішча ўсёй гэтай масы людзей было надзвычай цяжкім. Толькі на станцыі Мінск пад адкрытым небам знаходзілася 13 тысяч чалавек. За некалькі дзён тут было пахавана больш за 1500 чалавек.

Гэтыя людзі ператварыліся ў масу жабракоў, галодных і бяздомных, пазбаўленых сродкаў існавання. Рушыць далей у глыб краіны яны не мелі магчымасці. У пачатку верасня 1915 г. хваля бежанцаў дасягнула Бабруйскага павета.

У Мінскай губерні знайшлі прытулак да 100 тысяч бежанцаў.

Востры недахоп тавараў народнага спажывання, падзенне жыццёвага ўзроўню народа — усё гэта выклікала нарастанне крытычнай масы для выбуху незадаволенасці насельніцтва палітыкай царскага ўрада. У выніку Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. працоўныя Расіі скінулі самадзяржаўе. Аб тым, як аднесліся да гэтага паведамлення сяляне, пісала газета «Речь» 15 сакавіка 1917 г.: «Зачытаны маніфесты аб адрачэнні Мікалая II і адказе Міхаіла. Гэтыя акты зрабілі глыбокае ўражанне на сялян. Адзінагалосны вывад: «так і патрэбна», «даўно пара».

Спадзяванні народных мас, што будзе спынена вайна, не збыліся. Часовы ўрад працягваў ваенныя дзеянні з Германіяй.

Т.А.Матусевіч, А.М.Філатава.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Глушчыны

Глуская драўнянастружкавая мануфактура. Заснавана каля 1900 г. у мяст. Глуск Бабруйскага пав. (цяпер г.п. Глуск). У 1914 г. працавала 120 чал. (у т.л. 60 мужчын і 60 жанчын), мела 50 станкоў. Асноўны капітал складаў 22 тыс. рублёў, выраблена 60 тыс. штук стружкавай «тканіны», па 20 кап. за штуку. Выраблялі банты, а з адходаў — стружку для ўпакоўкі посуду. На вытворчасць стружкі зрасходавана 3 тыс. пудоў асіны. Заработная плата ў месяц: мужчыны — да 80 руб., жанчыны — да 28 руб. У 1905 г. рабочыя ўдзельнічалі ў забастоўцы.

Дакольская лесапільная мануфактура. Дзейнічала ў 1898—1900 гг. у маёнтку Даколь Бабруйскага павета (цяпер вёска ў Клятнянскім сельсавеце Глускага раёна). У 1898 г. працавала 50 чалавек. У 1900 г. выпушчана дошак і розных драўляных вырабаў на 85 тыс. руб.

Друкуецца па кн.: Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988. С. 60, 74.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ МІНСКАГА ГУБЕРНАТАРА АБ АДНОСІНАХ СЯЛЯНСТВА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ДА СПРАВЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

1900 г.

... Что крестьянское население Минской губ. любит и дорожит народною школою, доказывается не только переполнением училищ Министерства народного просвещения, но и теми весьма крупными затратами, которые производятся ежегодно крестьянскими обществами на содержание этих училищ. В отчетном году крестьяне израсходовали из собственных средств на постройку и ремонт училищных зданий более 16 000 руб., постоянный же ежегодный расход крестьянских обществ на содержание 299 народных училищ губернии выражается крупною суммою в 72 987 руб., в то время как казна на содержание тех же училищ расходует всего 48 359 руб. 11 коп.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 262.

ТЭЛЕГРАМА ПРАКУРОРА МІНСКАГА АКРУГОВАГА СУДА МІНІСТРУ ЮСТЫЦЫІ АБ ХВАЛЯВАННЯХ НАВАБРАНЦАЎ У МЯСТЭЧКУ ГЛУСК БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА, НАВАГРУДСКІМ І МІНСКІМ ПАВЕТАХ

17 кастрычніка 1905 г.

Мест. Глуске Бобруйского, Новогрудском и Минском уу. новобранцы произвели беспорядок, заставили прекратить воинское присутствие, Глуске прерван телеграф, губернатор послал войска. Я предложил приступить следствию немедленно по восстановлении порядка.

Минске же забастовка проходит без беспорядков, движение железных дорог предполагается восстановить завтра.

Прокурор Бибиков.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1405. Воп. 107. Спр. 6278. Л. 14.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МІНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ АБ ПАДПАЛЕ ХЛЕБА І ЖЫВЁЛЫ Ў МАЁНТКУ МАКРАНЫ ПАМЕШЧЫКА КОРСАКА СЯЛЯНАМІ в. БАРЫСАЎШЧЫНА ГАРАДОЦКАЙ ВОЛАСЦІ БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА

25 кастрычніка 1908 г.

Секретно

14-го сего октября в 8 час. вечера в им. Макраны Городокской вол. Бобруйского у. у владельца названного имения дворянина Филиппа Юстиновича Корсака загорелось гумно, которое сгорело с находящимся в нем сеном, овсом и рожью, а от горевшего гумна загорелись три скотских сарая, которые также сгорели. Всего в гумне сгорело разного хлеба в снопах и сена на 4000 руб., каковое имущество было застраховано в Минском взаимном сельскохозяйственном обществе в 5000 руб. Сгоревшие же постройки стоили 2000 руб., а застрахованы были в 3000 руб. Так что в общей сложности от пожара пострадало страховое общество, а не Корсак.

По заявлению жены Корсака М.С.Корсак, пожар начался от поджога и притом она заявила подозрение на 6 чел. крестьян дер.Борисовщина, неоднократно замеченных в самовольной порубке леса, а особенно сильное подозрение было заявлено на крестьянина И.Ф.Ахремчика, который летом этого года говорил будто бы леснику Корсака, что как только его хозяин уберет урожай с поля в гумно, то он сожжет гумно. Названный Ахремчик чаще других привлекался к суду за самовольные порубки леса и за это мстил Корсаку...

Полковник (подпись)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. ДП, IV справаводства, 1908 г. Спр. 40. Ч. 1. С. 24.

ПРАШЭННЕ ЎЛАДАЛЬНІКА МЯСТЭЧКА ГЛУСК АРТУРА ТВІДАВІЧА РУБОМА АБ СПАГНАННІ ПЛАЦЯЖУ З МЯСЦОВАГА ГАНДЛЯРА ЗА КАРЫСТАННЕ ЗЯМЛЁЙ УНУТРЫ ГЛУСКА

31 сакавіка 1910 г.

Его Высокоблагородию
Господину земскому начальнику 6-го уч. Бобруйского уезда
владельца м. Глуск Артура Твидовича Рубома,
жит. в им. Хвастовичи

ПРОШЕНИЕ

Решением суда Минской Гражданской Палаты, состоящимся 19 августа 1840 года, признано, что жители м. Глуска обязаны платить в пользу собственника онаго за пользование плацами во внутри местечка лежащими чинш, размер которого определен по местоположению каждого плаца. И для того, как сказано в том решении, чтобы собственнику и чиншевым содержателям было в точности известно, сколько земли каждый плац имеет и быть уплачиваемо чинша, было поручено Судебному Приставу и землемеру того же суда Иосифу Календе составить на месте точную опись всем вообще плацам, показывая в частности, какое пространство земли занимает каждый из них и какая с него согласно определению Палаты следует чиншевая плата.

Поручение это исполнено 12 ноября того же года составлением инвентарного описания м. Глуска с указанием № каждого плаца на плане, имен чиншевых владельцев, размера земли и платежа чинша, следуемого с каждого плаца. Плац, о котором идет настоящее дело значится в том инвентарном описании под № 12 и размер платежа за пользование оным указан в сумме 1 руб. 20 коп. в год. Плац этот находится в пользовании у ответчика, который до 1909 г. платил чинш аккуратно, а с 1909 г. прекратил платеж, и таким образом мне следует с 1909 по 1910 гг. всего 1 руб. 20 коп. А потому представляя при сем выписи из решения Палаты и инвентарного описания и ссылаясь в подтверждении того, что плац находится в пользовании ответчика, который до 1909 г. платил на свидетеля (прозвішча не разборліва. — *Рэд.*), жив. в м. Глуске.

Имею честь покорнейше просить Ваше Высокоблагородие постановить взыскать в пользу мою с Филиповича за пользование плацем в течение времени с 1909 по 1910 г. включительно 1 руб. 20 коп. с судебными издержками за ведение дела, обратить решение к предварительному исполнению. Ответчик жив. в м. Глуске.

Подпись. Марта 31. 1910 г.

На обратной стороне:

ВЫПИСЬ ИЗ РЕШЕНИЯ СУДА МИНСКОЙ ГРАЖДАНСКОЙ ПАЛАТЫ, СОСТОЯЩЕГОСЯ 19 АВГУСТА 1840 г.

Тысяча восемьсот сорокового года месяца августа девятнадцатого дня. Во второй категории относительно города Глуска, чиншевых площадей и жителей онаго и т.д.

Суд Минской Гражданской Палаты при приглашенном из Минской Греко-Российской Консистории Депутат относительно земских собственностей трех Глусских церквей и объявленных Управлением Духовенства претензий постановляет следующее решение (следуют решения по неотносящимся к чиншам спорам).

В 9-х, что касается чиншев с лежащих внутри города Глуска площадей, занимаемых тамошними жителями, хотя (следуют собрания), а посему во исполнение Сенатского указа от 13 января 1831 г., возвращая чиншевую оплату к эпохе, как было до открытия губерний при Польском Правительстве и принимая к сему Решение в Глуске 1784 г. Радзивиловской экс-дивизии, состоявшееся немногим раньше этого времени, основанием к установлению навсегда между жителями местечка Глуска и бывшим его же вотчинникам спокойствия верности в уплате с будущих чиншей, Минская Гражданская Палата постановляет сообразовать с местоположением площадей и обширностью оных согласно геометрическим измерениям прентов, по мере более или менее выгодного их положения, ибо меньшия улицы, вдали от рынка и лавок, второстепенные улочки и переулки не могут иметь тех выгод, какими пользуются чиншевые содержатели, имеющие площадь в самом рынке или в главных улицах города, а посему сообразно местоположению определяется с Глуских площадей следующая оплата: 1) с 13 площадей, расположенных в рынке, за каждый квадратный геометрический прент по 8 коп. — 75 руб. 44 коп. 2) с 11 площадей по Рымарской улице по 6 коп. с прента — 37 руб. 98

коп.; 3) с 4-х площадей, расположенных тоже по Рымарской улице по 5 коп. с прента — 7 руб. 75 коп., с 12 площадей, находящихся в Минской улице, равным образом по 5 коп. с каждого прента — 33 руб. 87 коп. С 6-ти площадей, расположенных между Слуцкой и Школьной улицею тоже по 5 коп. с прента — 18 руб., с 16-ти площадей по улицам Св. Антона и Лучковской по 5 коп. — 41 руб. 35 коп.; 4) с 16 площадей по Минской улице по 4 коп. — 22 руб. 96 коп., с 30 площадей по Слуцкой улице по 4 коп. с прента — 45 руб. 8 коп.; 5) с 8 площадей по Клецкой улице по 1 коп. — 11руб. 63 коп., с 2 площадей на Кавалевщине по 1 коп. — 3 руб. 57 коп.; 6) с 6 площадей по Украинской улице по 12 коп. — 21 руб. 40,5 коп., с 5 площадей на Кавалевщине по 1,5 коп. — 7 руб. 77 коп.; 7) остальные же 402 площади, расположенные по разным переулкам в местечке Глуске, обозначенные в геометрической описи номерами — по 2 коп. с прента составляют 377 руб. и таким образом все вышеупомянутые чиншевые площади, заключающие 3 уволоки 4 морга 80 прента имеющие давать согласно эксдивизорскому решению с 1784 г. ежегодного дохода 713 руб. 84 коп. Бесплатные же учредительные Глуские площади заключают 6 моргов 253 прентов, одна площадь. Мариянiток на 84 прента, площадь, некогда занимаемая ксендзом Шевцем, ныне же предназначенная накануне для братства Глуских церквей, составляет один морг 10 прентов. Большая площадь еврейской школы занимает 256 прентов, в общем всей земли под площадями 103 морга 83 прента, дабы следовательно домовладельцу и чиншевым содержателям было в точности известно сколько с каждой площади имеет быть уплачиваемого чинша. Судебный пристав господин Иосиф Календа имеет составить на месте точную опись всем вообще площадям, показывая в частности, какое пространство земли занимает каждая из них и какая с ней согласно изложенным определениям следует чиншевая оплата, каковой то описи один экземпляр будет им вручен, поместившему капитал под его расписку, другой же представлен при рапорте настоящему суду для приобщения его к приложениям.

Опись из инвентарного описания местечка Глуска, с показанием в оном количестве плацев земли, а также оценки оным и следуемого к получению годового дохода, сочиненного сходно решению Минской Гражданской Палаты 19 августа 1840 года, состоявшемуся.

1840 г. Ноября 12 дня. Таковое инвентарное описание м.Глуска сходно решению Минской Гражданской Палаты 19 августа 1840 г. состоявшемуся, сочиненное мною, по которому числится плацев вообще с фудушевыми 555, земли под оными 103 морга 83 прента и годового дохода к получению следующего 713 руб. 84 коп. серебром. Собственноручно подписываюсь на подлинном землемер Иосиф Календо.

Что настоящая копия с подлинным инвентарным описанием м. Глуска, составленным землемером Иосифом Календо и ныне хранящимся в Минском Губернском Межевом Архиве при делах б. Глуско-Каманско-Эксдивизорского Суда, учрежденного по делам о несостоятельности Графа Юдицкого верна и выдана из межевого отделения Минского Губернского правления поверенному м. Глуска жены Капитана 9 Саперного Батальона Анастасии Юстиновны Мещерской, частному поверенному Руфину Лихтерману согласно поданному им Лихтерманом 19 июня 1889 г. в Губернское правление о том прошению, в том надлежащим подписом с приложением казенной печати удостоверяется.

Июля 19 дня 1889 г. гербовый сбор и канцелярских пошлин уплачены.

Подписи: Губернского землемера и И.д. делопроизводителя

(М.П.)

№ 433. Настоящая выписи верны и подлинные по предъявлению обратно получил.

Подпись Арт. РУБОМ.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ РАШЭННІ БАБРУЙСКАГА ПАВЯТОВАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ВЫКАЗАЦЬ НЕДАВЕР ПАВЯТОВАМУ КАМІСАРУ ЧАСОВАГА ЎРАДА

3 ліпеня 1917 г.

Уездный крестьянский съезд Бобруйского уезда из выборных всех волостей уезда, состоявшийся 24 и 25 июня, постановил выразить недоверие уездному комиссару Воронцову-Вельяминову. Избран комиссаром — окончивший Киевский университет Павел Николаевич Ефрем. Съезд просит об утверждении последнего. Постановление крестьянского съезда сообщено отделом губернскому комиссару для сведения и соответствующего представления Министерству внутренних дел.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т. 1. С. 437.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Устанаўленне савецкай улады

25 кастрычніка ў Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне, у выніку якога Часовы ўрад быў звергнуты. Сярод удзельнікаў Кастрычніцкіх падзей у Петраградзе былі і ўраджэнцы Глушчыны. Разам з іншымі ветэранамі 7-й роты лейб-гвардыі Паўлаўскага палка, які першым перайшоў на бок Саветаў, штурмаваў Зімні Лука Фядосавіч Малаковіч, кавалер трох георгіеўскіх крыжоў, ураджэнец в.Зубарэвічы. У шарэнгах рэвалюцыйных маракоў былі глушчане, якія 25 кастрычніка ўстанаўлівалі ў Петраградзе савецкую ўладу і ў той час служылі на Балтыйскім флоце. Гэта Піліп Канстанцінавіч Шумскі – матрос, Фёдар Фаміч Кісялевіч – рулявы падводных лодак, Рыгор Аляксеевіч Шаўрукоў – матрос, Мікалай Ільіч Гурын – машыніст-утрымальнік, Цімафей Захаравіч Радзько – матарыст, Якаў Рамаснавіч Храпко – матрос. Горача подтрымалі Кастрычніцкую рэвалюцыю, з якой звязвалі свае спадзяванні на лепшае жыццё, Адам Данілавіч Астрэйка, камандзір аддзялення, салдаты Майсей Навумавіч Патапенка, Іван Сцяпанавіч Лях, памочнік лекара Ігнат Данілавіч Лугін і многія іншыя нашы землякі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя, нібы магутны ўраган, уздыбіла ўсю Расію. 25 кастрычніка Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў узяў уладу ў свае рукі. У гэты ж дзень незвычайна бурліў Бабруйск – цэнтр павета, у які ў той час уваходзіла Глуская воласць. Як толькі з далёкага Петраграда сюды паступіла тэлеграма аб перамозе рэвалюцыі, на бабруйскай гарадской плошчы адбыўся шматлюдны мітынг. Рэвалюцыйна настроеныя часці, якія былі раскватараваны ў Бабруйскай крэпасці (25-я і 57-я пяхотныя, 94-я і 75-я

П.М.Серабракоў.

П.Ф.Равінскі.

Сібірская, 75-я грэнадзёрская дывізіі), на заклік бабруйскіх бальшавікоў П.М.Серабракова, П.Ф.Равінскага і іншых заявілі аб сваёй падтрымцы савецкай улады. І тут жа паведамілі ў Петраград ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту, што яны гатовы па першаму ж закліку выступіць на абарону ўлады Саветаў і ён можа цалкам разлічваць на іх. З гэтых часцей тут жа была сфарміравана ахова Бабруйскай крэпасці, складоў з боепрыпасамі і зброяй. Салдаты ахоўвалі ўстановы горада, наладзілі на яго вуліцах патруляванне, а таксама неслі дзяжурства ў камітэце бальшавікоў, у Савеце дэпутатаў і г.д. Чырвонагвардзейскі атрад, што быў створаны з рабочых па ініцыятыве Бабруйскага камітэта РСДРП(б), неадкладна заняў пошту, тэлеграф, тэлефонную станцыю, вакзал, электрастанцыю і іншыя жыццёва важныя для горада аб'екты і ўстанавіў іх ахову.

22 лістапада быў заключаны дагавор аб перамір'і з немцамі. Атрыманая мірная перадышка давала магчымасць пачаць ліквідацыю мясцовых органаў Часовага ўрада і стварацъ савецкія органы кіравання. У канцы 1917 – пачатку 1918 г. фарміраваліся павятовыя органы ўлады. У Бабруйску пачалі дзейнічаць рэўком і Бабруйскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а ў канцы студзеня быў створаны аналагічны павятовы Савет.

Валасныя органы савецкай улады ў павеце арганізоўваліся крыху пазней. На Глушчыну па даручэнні Бабруйскага павятовага камітэта РСДРП(б) некалькі раней быў накіраваны з групай рэвалюцыйна настроеных салдат бальшавік Сямён Вілюга. Яны праводзілі падрыхтоўчую работу па выбарах дэпутатаў ва Устаноўчы сход з тым, каб сяляне воласці прагаласавалі за спіс бальшавікоў. Тут іх і застала вестка аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе. Не марудзячы, С.Л.Вілюга разам са сваім таварышам і земляком Максімам Зелянковым выраШылі правесці ў Глуску мітынг і расказаць людзям пра гэтую важную падзею. Патрэбна было абысці і аб'ехаць многія вёскі і хутары, каб сабраць сялян, і да гэтай работы падключыліся мясцовыя бальшавікі Дзмітрый Жыжкевіч, Іван Мазалеўскі, яго пляменнік Сцяпан Жданко і іншыя рэвалюцыйна настроеныя салдаты, якія вярнуліся з фронту дамоў.

Як толькі С.Л.Вілюга атрымаў з Бабруйска «Известия Центрального исполнительного комитета и Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов», а таксама невялікія афішкі з тэкстамі надрукаваных першых дэкрэтаў Савецкага ўрада, у Глуску быў сабраны мітынг сялян Глускай воласці, на які прыйшлі таксама жыхары з бліжэйшых вёсак Гарадкоўскай і іншых валасцей – усяго больш за 10 тысяч чалавек.

«У сваім выступленні, — успамінаў пазней С.Л.Вілюга, — я расказаў пра рэвалюцыю, якая адбылася ў Петраградзе, зачытаў Дэкрэты аб міры і зямлі. Першае! — я чую, як натоўп заціхае, быццам на плошчы і не стаіць некалькі тысяч чалавек, — уласнасць паноў на зямлю адмяняецца неадкладна без усялякага выкупу. Другое! – яшчэ мацней выгукваю я, – панскія маёнткі, так, як і ўсе землі ўдзельныя, манастырскія, царкоўныя, з усім іх

жывым і мёртвым інвентаром, сядзібнымі будынкамі і ўсімі прыладамі, пераходзяць у распараджэнне валасных зямельных камітэтаў і павятовых Саветаў сялянскіх дэпутатаў...»

С.Л.Вілюга гаварыў пра тое, што забараняецца псаваць панскую маёмасць, якая цяпер належыць народу, што права прыватнай уласнасці на зямлю адмяняецца назаўсёды, што зямлю нельга ні прадаваць, ні купляць, ні аддаваць у арэнду, што зямля пераходзіць у карыстанне ўсіх тых, хто на ёй працуе. Сяляне сустрэлі гэтыя словы гучнымі крыкамі «ўра». На мітынгу выступіў таксама П.М.Караткевіч, які быў праездам у Глуску.

Была прынята рэзалюцыя: «Усімі мерамі і сіламі ўмацоўваць уладу Саветаў і абараняць яе ад ворагаў. Памешчыцкія маёнткі з усёй маёмасцю неадкладна ўзяць на ўлік і ўстанавіць кантроль упаўнаважаных сялян за яе захоўваннем». Пасля гэтых падзей на тэрыторыі воласці пачаў дзейнічаць рэвалюцыйны камітэт, які ўзначаліў С.Л.Вілюга. У склад камітэта ўвайшлі таксама С.Л.Аношка, батрак з в.Макавічы, Д.А.Жыжкевіч, дэмабілізаваны салдат-бальшавік, П.К.Шумскі, матрос-балтыец, які нядаўна вярнуўся дадому ў в.Жалвінец.

У Глускай воласці, як і паўсюдна, фарміраваліся органы савецкай улады, скасоўваліся старыя дзяржаўныя структуры. Усю работу па ўліку зямлі, жывога і іншага інвентару з памешчыцкіх маёнткаў, падрыхтоўцы да пераразмеркавання зямлі, вырашэння харчовых і іншых пытанняў павінен быў узяць у свае рукі валасны зямельны камітэт, які неабходна было сфарміраваць. Таму, як толькі ў Глуску атрымалі распараджэнне аб роспуску земскай самаўправы, адразу ж пачалася падрыхтоўчая работа па выбарах гэтага камітэта. Было вырашана правесці агульнаваласны сход дэлегатаў

С.Л.Аношка.

М.Р.Зелянкоў.

ад сялян, каб вызначыць яго склад. Па вёсках праходзілі сходы, у якіх з задавальненнем прымалі ўдзел усе сяляне, ім растлумачвалася сутнасць Дэкрэта аб зямлі, шляхі яго ажыццяўлення. У ходзе гэтай работы шырокія слаі працоўнага сялянства далучаліся да барацьбы за ўмацаванне савецкай улады.

Валасны сход сялянскіх дэлегатаў, пісаў пазней ва ўспамінах С.Л.Вілюга, праходзіў як урачыстасць, прысвечаная перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі, і быў вельмі актыўным. Валасны зямельны камітэт быў выбраны з сямі чалавек. У яго ўвайшлі Максім Зелянкоў з Баянава, Кастусь Малаковіч з Касарыч, Сцяпан Аношка з Макавіч, Кіпель і іншыя. Зямельны камітэт узначаліў С.Л.Вілюга. Адначасова была створана камісія з 5 чалавек, якая павінна была ўзяць на ўлік усе памешчыцкія маёнткі, іх інвентар.

У суседняй Гарадкоўскай воласці, тэрыторыя якой належыць сучаснаму Глускаму раёну, падзеі разгортваліся аналагічна. Тут вёў работу сярод насельніцтва бальшавік Максім Архіпавіч Ляўкоў, накіраваны сюды Бабруйскім павятовым камітэтам РСДРП(б) адразу ж пасля звяржэння царскай улады. Ён многае зрабіў, каб узняць рэвалюцыйны настрой жыхароў воласці, прыцягнуць іх да актыўнага палітычнага жыцця. Таму падзеі

Кастрычніка 1917 г. тут сустрэлі прыхільна. З ліку моладзі М.Ляўкоў арганізаваў атрад добраахвотнікаў для абароны савецкай улады. Быў створаны таксама рэвалюцыйны камітэт, які на першым часе сканцэнтраваў уладу ў сваіх руках. У яго ўвайшлі найбольш адукаваныя, адданыя савецкай уладзе людзі. Старшынёй рэўкома стаў малады хлапец, які вывучыў азбуку палітычнай барацьбы, служачы на флоце, Міхаіл Мацвеевіч Сінькевіч, сакратаром – Аляксандр Буднік. Розныя аддзелы рэўкома ўзначалілі Нічыпар Чабан, Максім Шардыка, Арцём Шыла, Сцяпан Мікалаеў, Мікалай Сеўба.

Працоўнае сялянства Глускай, Гарадкоўскай і суседніх валасцей Бабруйскага павета з энтузіязмам сустракала ажыццяўленне першых сацыялістычных пераўтварэнняў у народнай гаспадарцы і заяўляла, што будзе падтрымліваць новую ўладу ўсімі сіламі. Таму невыпадкова, што некаторыя сяляне з яўнай варожасцю ўспрынялі спробы прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху не прызнаваць савецкай улады на Беларусі і, у прыватнасці, не падтрымалі пазіцыю Вялікай беларускай рады, якая паставіла сваёй мэтай дамагацца самавызначэння Беларусі як адасобленай ад Савецкай Расіі буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі.

Сяляне в.Межылессе і с.Вольніца Глускай воласці ў пачатку снежня 1917 г. прынялі на сходах рэзалюцыю аб падтрымцы савецкай улады і гатоўнасці абараняць яе. Яны прыслалі ў рэдакцыю газеты «Советская правда» пісьмо, у якім выказвалі свой пратэст супраць, як яны называлі, «здрадніцкіх» паводзін Беларускай рады і заяўлялі аб сваёй вернасці і адданасці Савецкаму ўраду, які «даў ім мір, свабоду і зямлю» (Советская правда. 1918. 13 студз.).

Але ажыццявіць на справе гэтыя спрадвечныя жаданні сялянства Глушчыны ў той час так і не змагло. Узняў мяцеж 1-ы польскі корпус легіянераў пад камандаваннем генерала І.Р.Доўбар-Мусніцкага, які дыслацыраваўся ў раёне Рагачоў – Жлобін – Бабруйск. Сфарміраваны з дазволу Часовага ўрада з салдат-палякаў пад маркай аховы маёмасці памешчыкаў-палякаў, гэты корпус на працягу лістапада – снежня 1917 г. неаднаразова праводзіў акцыі, скіраваныя супраць мясцовых органаў савецкай улады. 12 студзеня 1918 г. ён афіцыйна аб'явіў вайну Савецкай Расіі. Палітычныя мэты мяцежнікаў зводзіліся да ліквідацыі савецкай улады ў Беларусі і далучэння Мінскай і Магілёўскай губерняў да польскай дзяржавы, якая яшчэ не была абвешчана. У канцы 1917 г. штаб корпуса размяшчаўся ў Бабруйску. Мяцежнікам не складала вялікай цяжкасці расправіцца з мясцовымі атрадамі Чырвонай гвардыі і разагнаць Бабруйскі Савет, а потым пачаць граміць савецкія органы і ў суседніх валасцях. Легіянеры паўсюдна разганялі сялянскія камітэты, рабавалі насельніцтва, забівалі актывістаў. На часова захопленай тэрыторыі быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым. Усё гэта выклікала ўсеагульнае абурэнне працоўных Глушчыны, не магло не абудзіць іх патрыятычных пачуццяў, не ўзняць на барацьбу з польскімі захопнікамі.

Як толькі ў Глуску было атрымана паведамленне аб тым, што ў Бабруйску ўзняў мяцеж корпус польскіх легіянераў і імі разгромлены Савет рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, тут тэрмінова па распараджэнні рэўкома пачалі арганізоўваць узброеныя атрады. Падбіралі надзейных, адданых рэвалюцыі людзей: дэмабілізаваных салдат, сялян. Але не хапала зброі. Тады старшыня рэўкома С.Л.Вілюга цераз Старыя Дарогі паехаў у Мінск да галоўнакамандуючага Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікова, каб вырашыць гэта пытанне. «На ст. Асіповічы, – пісаў пазней С.Л.Вілюга, – я сустрэў нека-

торых дэпутатаў Бабруйскага Савета – тт.Серабракова П.М., Равінскага П.Ф. і іншых. Расказаў ім, што намі ў Глускай воласці арганізоўваюцца партызанскія атрады і я еду прасіць для іх зброю. П.М.Серабракоў паведаміў мне, што ён таксама прыступае да арганізацыі атрадаў чырвоных партызан...

Камандуючага на месцы не застаў, мяне прыняў ад'ютант Мяснікова, які тут жа вырашыў пытанне аб зброі: аддаў распараджэнне ў воінскую часць, што стаяла на ст. Старыя Дарогі, каб нам адпусцілі 5 тысяч вінтовак іншаземнага ўзору з патронамі.

— А ў дапамогу вам, таварыш Вілюга, — сказаў на развітанне ад'ютант Мяснікова, — накіроўваем са Старых Дарог 51-ы рэвалюцыйны полк. Камандзір палка Іваноў, калі мяне памяць не падводзіць, быццам бы з вашых мясцін...»

Атрыманую зброю на фурманках перавезлі са Старых Дарог, потым раздалі яе па атрадах. У выніку ў Глуску была створана даволі баяздольная група з трох буйных атрадаў: Балашэвіцкага, Межылескага, Мыслоцінскага і 51-га палка Р.Л.Іванова. Былі ўзброены таксама некалькі больш дробных атрадаў. Камандаванне ваеннай групай прыняў С.Л.Вілюга.

На барацьбу з мяцежнымі войскамі Савецкі ўрад накіраваў чырвонагвардзейскія атрады, знятыя з фронту. Рашаючы ўдар быў нанесены пад Рагачовам і Жлобінам. Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі пачаліся павальныя ўцёкі легіянераў з часцей польскага корпуса. Многія яго салдаты ўступалі ў рады рэвалюцыйных войскаў. Распад корпуса стаў неабарачальным працэсам. Чырвонагвардзейскія атрады і партызаны паўсюдна раззбройвалі легіянераў. Некалькі эскадронаў кавалерыі і пяхотных часцей былі акружаны і здаліся ў палон пад Бабруйскам. Рэшткі разбітых мяцежнікаў схаваліся ў Бабруйскай крэпасці. Іх канчатковаму разгрому перашкодзіла ваенная інтэрвенцыя Германіі, якая 16 сакавіка 1918 г. паведаміла Савецкай Расіі, што тэрмін перамір'я скончыўся і «пачынаецца зноў стан вайны». Праз два дні ваенныя дзеянні на савецка-германскім фронце аднавіліся.

Прыйшоўшыя на змену палякам немцы, да якіх на першым часе прымкнулі недабітыя часці корпуса Доўбар-Мусніцкага, прынеслі на акупіраваныя тэрыторыі яшчэ больш жорсткі рэжым. Імі былі захоплены значная частка Беларусі, Прыбалтыка і частка Украіны. У першую чаргу акупанты пачалі ліквідоўваць органы савецкай улады, адмяняць яе рашэнні, вяртаць старыя парадкі. Узнаўлялася памешчыцкая ўласнасць на зямлю і жорстка праследаваліся актывісты.

Хваля народнага гневу супраць чужынцаў паступова нарастала. Карныя экспедыцыі нямецкіх акупантаў, спаленыя вёскі, публічныя экзекуцыі над мірным насельніцтвам, канцлагеры не змаглі спыніць барацьбы за аднаўленне ўлады Саветаў, за нацыянальную незалежнасць. На гэтую барацьбу разам з рабочымі ўзнялося працоўнае сялянства.

Вясной 1918 г. моцныя сялянскія хваляванні адбыліся ў Бабруйскім павеце. Паступова выступленні сялян перараслі ва ўзброенае супраціўленне. На Глушчыне шырока разгарнуўся партызанскі рух.

Баявую актыўнасць у тыле ворага накіроўваў Бабруйскі падпольны раённы камітэт, які дзейнічаў пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) з мая да лістапада 1918 г. У яго склад уваходзілі П.Ф.Равінскі (парт.псеўд. Раеўскі) – старшыня, П.М.Серабракоў (парт. псеўд. Павел Балашоў) – нам.старшыні, В.Нейман (парт.псеўд. Новікаў) — сакратар, С.Капілаў, І.А.Вайнер, П.Д.Малаковіч, П.П.Фёдараў (парт. псеўд. Пятроў), Шумілін. Пад-

польны райком ставіў задачы аднавіць партыйныя арганізацыі ў гарадах і вёсках, арганізаваць агітацыйную работу сярод насельніцтва, наладзіць рэгулярную сувязь з іншымі партыйнымі арганізацыямі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Цэнтрам разгортвання партызанскага руху стала партыйная ячэйка ў м. Глуск. Камуністы выпускалі лістоўкі, у якіх раскрываліся грабежніцкія планы германскіх захопнікаў, заклікалі рабочых і сялян да ўзброенай барацьбы супраць акупантаў. Паўсюдна дзейнічалі партызанскія атрады, якія перахоплівалі на дарогах нямецкія часці, затрымлівалі абозы, адбіралі коней і зброю, захоплівалі ў палон афіцэраў. На Глушчыне ў гэты час сталі вядомыя сваімі дзеяннямі супраць акупантаў партызанскія атрады Максіма Уса, Максіма Ляўкова, Андрэя Драпезы, Нічыпара Званковіча, Пятра Шантара, агульнае кіраўніцтва якімі ажыццяўляў Аляксандр Салавей, жыхар Рудабельскай воласці. У гэтых атрадах змагаліся супраць кайзераўскіх салдат многія жыхары Глушчыны.

Разгалінаваная сетка партыйных ячэек была аб'яднана ў валасныя падраённыя (Глускую, Рудабельскую, Старадарожскую, Ясеньскую) і Бабруйскую гарадскую партыйныя арганізацыі. Былі наладжаны сувязі з падпольнымі арганізацыямі Барысава, Гомеля, Жлобіна, Магілёва, Мазыра, Пухавіч, Рагачова. Старшынёй Глускага падраённага камітэта РКП(б) выбралі Івана Ануфрыевіча Мазалеўскага, жыхара Глуска. З жыхароў воласці быў створаны паўстанцкі атрад, які цесна ўзаемадзейнічаў з Бабруйскай баявой дружынай і з атрадамі суседніх валасцей.

Паспяхова вяла работу ў тыле ворага падпольная партыйная арганізацыя м.Глуск. Гэта была моцна згуртаваная, добра арганізаваная партыйная ячэйка, у якую ўваходзілі 22 камуністы. Яна карысталася аўтарытэтам не толькі ў насельніцтва мястэчка, але і ў жыхароў навакольных вёсак і сёл, дзе камуністы сістэматычна праводзілі палітычную работу сярод насельніцтва. Яе ўзначальваў Іван Ануфрыевіч Мазалеўскі. Ён разам з таварышамі – дэлегатамі ад Глускай партыйнай арганізацыі прымаў удзел у Бабруйскай канферэнцыі падпольных бальшавіцкіх арганізацый, якая адбылася 20 кастрычніка 1918 г. і на якой прысутнічалі таксама прадстаўнікі 156 вясковых і 10 гарадскіх ячэек Бабруйскага, Рагачоўскага, Слуцкага і часткова Рэчыцкага і Мазырскага паветаў. Канферэнцыя ўпаўнаважыла ўсе партыйныя арганізацыі ў рашаючы момант барацьбы з нямецкімі захопнікамі аб'яўляць сябе Ваенна-рэвалюцыйнымі камітэтамі.

Пад ударамі Чырвонай Арміі і партызан, а таксама пад уплывам рэвалюцыйнага ўздыму ў самой Германіі і рэвалюцыйных настрояў сярод нямецкіх салдат акупацыйны рэжым развальваўся. Пачалося вызваленне Беларусі. Германскае камандаванне, баючыся канчатковага распаду акупацыйнай арміі, 16 лістапада аддало загад эвакуіраваць яе з Расіі. Бабруйскі падпольны камітэт РКП(б) заклікаў працоўных павета ўсяляк змагацца супраць рабаўніцкіх дзеянняў нямецкіх войскаў. Мясцовыя ўзброеныя атрады сумесна з чыгуначнікамі не далі адправіць з Бабруйска 109 паравозаў і некалькі эшалонаў з харчаваннем.

28 лістапада быў ачышчаны ад праціўніка цэнтр павета г. Бабруйск. Адбыўся кароткі мітынг, на якім выступіў наш зямляк з в.Зубарэвічы ваенком Бабруйскага павета Пракоп Дзянісавіч Малаковіч.

У гэты ж дзень на аснове падпольнага камітэта РКП(б) была створана раённая бальшавіцкая арганізацыя, у якую ўлілося 400 падпольшчыкаў.

Т.А.Матусевіч.

польны райком ставіў задачы аднавіць партыйныя арганізацыі ў гарадах і вёсках, арганізаваць агітацыйную работу сярод насельніцтва, наладзіць рэгулярную сувязь з іншымі партыйнымі арганізацыямі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Цэнтрам разгортвання партызанскага руху стала партыйная ячэйка ў м. Глуск. Камуністы выпускалі лістоўкі, у якіх раскрываліся грабежніцкія планы германскіх захопнікаў, заклікалі рабочых і сялян да ўзброенай барацьбы супраць акупантаў. Паўсюдна дзейнічалі партызанскія атрады, якія перахоплівалі на дарогах нямецкія часці, затрымлівалі абозы, адбіралі коней і зброю, захоплівалі ў палон афіцэраў. На Глушчыне ў гэты час сталі вядомыя сваімі дзеяннямі супраць акупантаў партызанскія атрады Максіма Уса, Максіма Ляўкова, Андрэя Драпезы, Нічыпара Званковіча, Пятра Шантара, агульнае кіраўніцтва якімі ажыццяўляў Аляксандр Салавей, жыхар Рудабельскай воласці. У гэтых атрадах змагаліся супраць кайзераўскіх салдат многія жыхары Глушчыны.

Разгалінаваная сетка партыйных ячэек была аб'яднана ў валасныя падраённыя (Глускую, Рудабельскую, Старадарожскую, Ясеньскую) і Бабруйскую гарадскую партыйныя арганізацыі. Былі наладжаны сувязі з падпольнымі арганізацыямі Барысава, Гомеля, Жлобіна, Магілёва, Мазыра, Пухавіч, Рагачова. Старшынёй Глускага падраённага камітэта РКП(б) выбралі Івана Ануфрыевіча Мазалеўскага, жыхара Глуска. З жыхароў воласці быў створаны паўстанцкі атрад, які цесна ўзаемадзейнічаў з Бабруйскай баявой дружынай і з атрадамі суседніх валасцей.

Паспяхова вяла работу ў тыле ворага падпольная партыйная арганізацыя м.Глуск. Гэта была моцна згуртаваная, добра арганізаваная партыйная ячэйка, у якую ўваходзілі 22 камуністы. Яна карысталася аўтарытэтам не толькі ў насельніцтва мястэчка, але і ў жыхароў навакольных вёсак і сёл, дзе камуністы сістэматычна праводзілі палітычную работу сярод насельніцтва. Яе ўзначальваў Іван Ануфрыевіч Мазалеўскі. Ён разам з таварышамі – дэлегатамі ад Глускай партыйнай арганізацыі прымаў удзел у Бабруйскай канферэнцыі падпольных бальшавіцкіх арганізацый, якая адбылася 20 кастрычніка 1918 г. і на якой прысутнічалі таксама прадстаўнікі 156 вясковых і 10 гарадскіх ячэек Бабруйскага, Рагачоўскага, Слуцкага і часткова Рэчыцкага і Мазырскага паветаў. Канферэнцыя ўпаўнаважыла ўсе партыйныя арганізацыі ў рашаючы момант барацьбы з нямецкімі захопнікамі аб'яўляць сябе Ваенна-рэвалюцыйнымі камітэтамі.

Пад ударамі Чырвонай Арміі і партызан, а таксама пад уплывам рэвалюцыйнага ўздыму ў самой Германіі і рэвалюцыйных настрояў сярод нямецкіх салдат акупацыйны рэжым развальваўся. Пачалося вызваленне Беларусі. Германскае камандаванне, баючыся канчатковага распаду акупацыйнай арміі, 16 лістапада аддало загад эвакуіраваць яе з Расіі. Бабруйскі падпольны камітэт РКП(б) заклікаў працоўных павета ўсяляк змагацца супраць рабаўніцкіх дзеянняў нямецкіх войскаў. Мясцовыя ўзброеныя атрады сумесна з чыгуначнікамі не далі адправіць з Бабруйска 109 паравозаў і некалькі эшалонаў з харчаваннем.

28 лістапада быў ачышчаны ад праціўніка цэнтр павета г. Бабруйск. Адбыўся кароткі мітынг, на якім выступіў наш зямляк з в.Зубарэвічы ваенком Бабруйскага павета Пракоп Дзянісавіч Малаковіч.

У гэты ж дзень на аснове падпольнага камітэта РКП(б) была створана раённая бальшавіцкая арганізацыя, у якую ўлілося 400 падпольшчыкаў.

Т.А.Матусевіч.

Рэвалюцыя стала іх лёсам

С.Л.Вілюга.

У гады першай сусветнай вайны сотні жыхароў Глушчыны былі мабілізаваны ў царскую армію. Многія з іх загінулі на фронце, пакінуўшы свае сем'і без кармільца. А тыя, што ўцалелі, атрымлівалі кароткачасовыя водпускі дамоў, дзе бачылі, што сялянскае жыццё мала чым адрозніваецца ад ранейшага, дарэвалюцыйнага. Сярод салдат расла незадаволенасць палітыкай Часовага ўрада.

У арміі працягвалі існаваць тыя ж муштра, рукапрыкладства, знявага чалавечай годнасці салдат.

Аднак салдаты былі ўжо не тыя забітыя, паднявольныя вясковыя людзі. Абуджаныя Лютаўскай рэвалюцыяй і захопленыя яе поспехамі, яны пацягнуліся да палітыкі, да грамадскага жыцця, хоць і не заўсёды добра разбіраючыся ў праграмах і тактыцы палітычных партый і груповак, якіх у той час у арміі дзейнічала нямала.

Але час быў настолькі бурны, людскія страсці так моцна кіпелі, што, здаралася, за некалькі дзён чалавек праходзіў такую жыццёвую школу, для якой у звычайных умовах яму спатрэбіліся б месяцы і нават гады. У жыцці многіх салдат-глушчан, як у кроплі расы, адлюстраваліся шматлікія падзеі, і яны так цесна перапляталіся, што сталі лёсам гэтых людзей.

На Гомельскім Усерасійскім перасыльным пункце

З успамінаў Сямёна Лазаравіча Вілюгі

Вілюга С.Л.нарадзіўся 2.7.1891 г. у в.Усцярхі Глускага раёна Мінскай вобласці. Член КПСС з верасня 1917 г. З 1915 г. у арміі. У 1917 г. вёў рэвалюцыйную барацьбу сярод салдатаў, член палкавога камітэта. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі ўстанаўліваў савецкую ўладу ў Глускай і Ляскавіцкай валасцях Бабруйскага павета. У студзені – лютым 1918 г. арганізаваў атрады чырвонай гвардыі для барацьбы з корпусам Доўбар-Мусніцкага. У 1919 г. старшыня Глускага рэўкома, начальнік партызанскіх атрадаў у Бабруйскім і Рагачоўскім паветах, узначальваў асобы батальён імя Бабруйскага рэўкома. 3 мая 1920 г. упаўнаважаны Рэўваенсавета Заходняга фронту па дэзарганізацыі тылу белапольскай арміі. У 1924 – 1956 гг. на гаспадарчай рабоце. Памёр 7.1.1961г.

Імем С.Л.Вілюгі названы вуліца і завулак у г.п.Глуск.

В июле 1917 г., после месячного лечения в Бобруйском военном госпитале, я был направлен на 143-й этап нестроевых солдат Гомельского Всероссийского пересыльного пункта. Здесь на одном из собраний меня избрали членом солдатского комитета.

На Гомельском пересыльном пункте в то время шла острая борьба между большевиками и соглашательскими партиями за солдатские массы. На площади, возле парка Паскевича, где раньше при отправке маршевых рот на фронт служились молебны за «христолюбивое воинство», ежедневно происходили митинги. На них представители разных партий выступали по нескольку раз в день.

Авторитет ораторов-большевиков, выступавших на митингах, с каждым днем рос. Лозунги большевиков «Долой войну!», «Мир без аннексий и контрибуций!», «Конфискация земли помещиков и передача ее крестьянам без выкупа!» и т.д. были очень популярны среди солдат. В то же время авторитет эсеров и меньшевиков сильно падал. Солдаты не хотели слушать соглашателей и часто стаскивали их с трибуны.

В первых числах сентября в Гомельском Совете рабочих и солдатских депутатов обсуждался вопрос о войне и мире. На заседание Совета пришло несколько тысяч солдат пересыльного пункта. Большая часть их расположилась лагерем в парке вокруг дворца князя Паскевича, в котором заседал Совет.

На заседании Совета очень активно выступали ораторы всех партий. Эсеры и

меньшевики до хрипоты кричали, настаивая на продолжении войны до полной победы.

Большевики доказывали, что продолжение войны является гибелью для России и революции. России грозит полное разорение, голод и порабощение иностранными державами. Они требовали немедленного прекращения войны.

Заседание Совета проходило очень бурно. Выступления эсеро-меньшевистских ораторов все время прерывались криками солдат. Большевистских ораторов слушали с большим вниманием и награждали громом аплодисментов.

Выступления закончились. Приступили к голосованию проектов резолюций, вынесенных фракциями Совета. Председатель президиума – эсер предупредил, что голосовать имеют право только депутаты Совета. Солдаты заволновались. В зале поднялся шум. Эсеры перетрусили. Для восстановления порядка была вызвана полковая учебная команда. Когда команда во главе с офицером вошла в парк, солдаты немедленно окружили и разоружили ее. Заседание Совета уже не возобновилось. Солдаты разошлись по своим баракам.

В 9 часов утра к нашим баракам в сопровождении эсеров и меньшевиков, заседавших вчера в Совете, явился помощник комиссара Юго-Западного фронта поручик Кудрявцев и приказал собрать солдат. Мы собрались.

— Приказываю через 20 минут построиться и идти на станцию для отправки по назначению! – подал команду Кудрявцев.

Мы, члены солдатского комитета, запротестовали и потребовали пропустить нас на Центральный пункт для выяснения причин срочной отправки. Наше требование дружно поддержали солдаты. Кудрявцев вынужден был пропустить нас и вместе с нами отправился на Центральный пункт.

Прибыли мы туда в самый разгар солдатского митинга. Кудрявцев вскочил на бочку, которая служила трибуной, и, осыпая бранью большевистских агитаторов, угрожал им расправой. Солдаты закричали:

— Долой контрреволюцию!

Они опрокинули бочку вместе с поручиком, обезоружили его, избили и отвели на гауптвахту пункта.

После расправы солдат с Кудрявцевым среди офицеров пересыльного пункта началась паника. Они попрятались в подвалы, а начальник пункта полковник Сергеев нашел себе убежище в полигонной церкви.

В солдатский комитет явился комиссар Юго-Западного фронта Филоненко. Он признал, что беспорядки на пункте вызваны излишней горячностью поручика Кудрявцева, и просил помочь успокоить солдат. Филоненко заверил, что никакой отправки солдат пока не предполагается. Что касается Кудрявцева, то он попросил разрешения отправить его в госпиталь.

Вечером на пересыльном пункте был вновь созван митинг. Солдаты приняли резолюцию, в которой требовали немедленного прекращения войны и заключения мира, предания суду и казни генерала Корнилова и его приверженцев и т.д. Здесь же была избрана делегация в составе трех человек — старшего унтер-офицера Ивана Старченко, младшего унтер-офицера Василия Сулковского и меня – для посылки в петроградский Совет рабочих и солдатских депутатов с целью вручения принятой резолюции.

Поздно ночью мы выехали в Петроград. Через несколько дней прибыли на место. Мы сразу же отправились в Смольный и связались с большевистской фракцией Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов. Нас принял высокий человек с подстриженной уже седой бородкой. Он приветливо здоровается и спрашивает, откуда прибыли, помогает снимать вещевые мешки и усаживает нас к столу. Мы рассказали, что нас послали солдаты Гомельского пересыльного пункта с просьбой передать Петроградскому Совету их требования, изложенные в резолюции. Внимательно прочитав нашу резолюцию, принявший нас товарищ одобрительно отозвался о ней и обещал передать ее в президиум Петроградского Совета.

В конце беседы мы попросили выдать нам партийные билеты, так как, находясь на фронте и в госпиталях, не имели возможности их получить. Товарищ написал записку в ЦК РСДРП(б). Мы отправились в ЦК РСДРП (б), где нам и выдали временные партийные билеты.

Через день, получив инструктаж и необходимую литературу, мы срочно выехали в Гомель. Возвратились в Гомель в тот момент, когда по приказу Керенского происходило расформирование пересыльного пункта.

Врачебные комиссии почти всем солдатам предоставляли отпуск на 2—3 месяца.

Мы созвали митинг солдат, доложили о нашей поездке в Петроград и посоветовали уезжавшим в отпуск солдатам оружие не сдавать, так как оно на местах пригодится для борьбы с контрреволюцией.

С партией солдат в количестве 10 человек я уехал в свой уездный гор. Бобруйск. Отсюда мы разъехались по своим волостям. Мой путь лежал в Глусскую волость, где я по поручению Бобруйского комитета РСДРП(б) проводил агитационную работу среди крестьян.

В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Мн., 1957. С.353—355.

П.М.Караткевіч.

Т.П.Караткевч.

Жыццё, як бляск маланкі

КАРАТКЕВІЧ Піліп Мацвеевіч. Беларускі палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў Глуску 2.11.1881 г. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1901), працаваў настаўнікам. На першым Усерасійскім з'ездзе сялянскіх дэпутатаў (май 1917, Петраград) увайшоў у групу «чатырнаццаці беспартыйных» з Беларусі на чале з М.В.Фрунзе, якая па многіх пытаннях падтрымлівала бальшавікоў, абраны членам Выканкома Усерасійскага савета сялянскіх дэпутатаў. З лістапада 1917 г. намеснік старшыні Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў, у снежні 1917 г. узначаліў (з В.Селіванавым) Беларускі аддзел Наркамнаца. Дэлегат Усебеларускага з'езда 1917 г. У 1918 і 1919 гг. арыштоўваўся нямецкімі і польскімі акупацыйнымі ўладамі. У 1920 г. у Бабруйску, інструктар аддзела народнай адукацыі, загадчык школы ў в. Любонічы Бабруйскага павета. Памёр 20.3.1921 г. Яго імем названа вуліца і завулак у Глуску.

З успамінаў Таццяны Піліпаўны Караткевіч

У Глуску ёсць вуліца, якая носіць імя Піліпа Мацвеевіча Караткевіча. Гэта мой бацька. Ён рана пакінуў жыццё, і толькі пазней, ужо дарослай, я зразумела, што гэта быў за цудоўны чалавек. Захаваліся дакументы, якія сведчаць, што Піліп Мацвеевіч Караткевіч выказаў нямала клопатаў аб лёсе роднага беларускага народа, інтарэсы якога ён адстойваў усё сваё жыццё. Вялікая заслуга яго і ў справе развіцця народнай асветы ў Бабруйскім павеце, і ў прыватнасці на Глушчыне.

З расказаў маці многае ў жыцці бацькі атрымала новае асэнсаванне, стала вядома нам, яго дзецям. Мы бачыліся з ім вельмі рэдка, ён пастаянна быў заняты грамадскімі справамі, і тыя кароткія хвіліны, якія нам удавалася правесці разам, нагадвалі свята, надоўга западалі ў памяці...

Дзяцінства бацькі было падобна на сотні іншых: ён рос, не ведаючы вясёлых дзіцячых забаў, нароўні з дарослымі зарабляў на кавалак хлеба. Наш дзед далёка славіўся сваім майстэрствам шорніка. Багацеі прыязджалі да яго ў Глуск, з задавальненнем куплялі і заказвалі яму прыгожыя распісныя збруі, сёдлы, вуздзечкі. Але гэтых заработкаў вялікай сям'і Караткевічаў ніколі не хапала.

У бацькі былі свае клопаты: уставаць рана і напасвіць каня, каб днём старэйшыя маглі на ім працаваць.

— Вырасцеш — маю справу прадоўжыш, — гаварыў дзед бацьку. Але заўважыў, што сын імкнуўся зусім да іншага: употайкі, каб не бачылі дарослыя, ён адольваў прамудрасці навукі, азы якой пераняў ад старэйшых хлопцаў у час начлегаў каля вогнішча. Імкненне да вучобы ў бацькі было такое вялікае, што дзед Мацвей нарэшце ўступіў:

— Вучыся.

Але часта забываў пра гэты дазвол, і зноў усё ішло па-ранейшаму. Бацька на сваю рызыку хадзіў у школу, а калі вечарам патрэбна было пісаць ці чытаць, дзед

гасіў лямпу. Пераканаўшыся, што ўсе заснулі, бацька запальваў дымны казінец, прымошчваўся за комінам і пераносіўся ў дзіўны свет, адкрыты кнігамі. А калі ён закончыў царкоўнапрыходскую школу, у сям'і лічылі Піліпа вельмі пісьменным чалавекам.

— Зямля ды гаспадарка — вось твая навука, хопіць лайдачыць,— сказаў, як адрэзаў, дзед Мацвей.

І ўсё ж бацька з вялікімі цяжкасцямі скончыў у 1901 г. Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. З таго часу праз усё кароткае жыццё вяла яго адзіная мэта: абудзіць думкі і жаданні забітых царызмам сялян, навучыць іх новаму жыццю — шчаслівому, вольнаму.

Але мара гэтая здзейснілася не скора. Толькі не забываў пра яе мой бацька ні ў салдацкіх акопах, калі ішла першая імперыялістычная вайна, ні пазней, калі ён удзельнічаў у рабоце 1-га Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў, у складзе фракцыі беспартыйных дэлегатаў ад Мінскай вобласці.

Прыйшоў Кастрычнік. Ён змёў урад Керанскага, але бацька, які не раз уголас марыў пра той час, калі ён сабярэ ў школу сялянскіх дзяцей і стане вучыць іх грамаце, не мог узяцца за любімую справу. Патрэбней, чым што іншае, зараз была абарона маладой савецкай улады. У Бабруйскім павеце ўзнялі мяцеж польскія легіянеры пад камандаваннем генерала Доўбар-Мусніцкага. У гэтыя поўныя трывогі і драматызму дні мы наогул не бачылі бацьку. Пазней даведаліся, што ён разам з бальшавікамі Бабруйска Серабраковым і Равінскім збіралі атрады добраахвотнікаў. У раёне Асіповіч, каб супрацьстаяць легіянерам, якія пачалі бязлітасна грабіць насельніцтва, П.М.Караткевіч і сам прымаў удзел у баявых дзеяннях. Але сілы былі занадта няроўныя, і легіянеры пачалі ўстанаўліваць свае парадкі, вярнулі старую ўладу. На змену ім прыйшлі нямецкія акупанты.

У гэты час ад падпольнага камітэта бальшавікоў Бабруйска бацька атрымаў заданне весці агітацыю сярод польскіх і нямецкіх салдат, збіраць звесткі пра планы акупантаў. Гэтая задача была ажыццёўлена. З дапамогай бабруйскіх падпольшчыкаў удалося сярод нямецкіх салдат выявіць тых, хто не хацеў ваяваць супраць Савецкай Расіі і на службу ў арміі глядзеў, як на турэмнае зняволенне. Ад іх Піліп Мацвеевіч даведваўся пра планы нямецкага камандавання, ім жа ён перадаваў «з волі» надрукаваныя на тонкай паперы нумары газеты, якую выпускалі спецыяльна для нямецкіх салдат, лістоўкі, праклямацыі з заклікам павярнуць штыкі супраць сваіх багацеяў, вярнуцца на радзіму і змагацца за новую Германію.

Але бацька быў западозраны і арыштаваны. Відаць, баючыся, што ён можа ўцячы, яго пасадзілі ў Бабруйскую крэпасць. Сваё зняволенне Піліп Мацвеевіч адбываў да прыходу ў Бабруйск Чырвонай Арміі.

Пачалася кароткая мірная перадышка, і наша сям'я хоць рэдка, але стала бачыць бацьку. Ён пачаў працаваць загадчыкам школьнага аддзела Бабруйскага рэўкома.

У жніўні 1919 г. тэрыторыя Бабруйскага павета аказалася акупіраванай белапалякамі. Нам не ўдалося выехаць з Бабруйска, і бацьку зноў арыштавалі. Некалькі месяцаў ён прасядзеў у мінскай турме. Маці наведвала яго, вярнуўшыся дамоў і расказваючы нам, плакала, бо бацька моцна кашляў, схуднеў і адчуваў сябе дрэнна. Здароўе яго настолькі пагоршылася, што акупацыйныя ўлады вызвалілі яго з турмы пад нагляд жандармерыі.

Аднак гэтая ўяўная свабода была такой жа цяжкай, як і турэмнае зняволенне. Пастаянны нагляд. Нельга кроку ступіць без дазволу жандараў, цярпець іх пастаянныя здзекі. І Піліп Мацвеевіч рашаецца на пабег з акупіраванай тэрыторыі. З дапамогай сяброў яму ўдалося перайсці праз лінію фронту на савецкую тэрыторыю.Тут ён прымаў удзел у шэрагу з'ездаў Саветаў у Быхаве і Рагачове, расказваў людзям аб цяжкім становішчы на захопленай ворагам тэрыторыі.

Разам з войскам Чырвонай Арміі бацька вярнуўся ў Бабруйск. І хоць здароўе яго было канчаткова падарвана, ён не сядзеў без справы: пачаў працаваць у аддзеле народнай адукацыі інструктарам школ. Але хвароба падточвала штодзённа яго сілы. Урачы прызналі, што ў бацькі туберкулёз лёгкіх. Яму параілі паехаць працаваць на вёску, бо там людзі жылі не так голадна, як у горадзе. Некаторы час Піліп Мацвеевіч працаваў у в.Любонічы, дзе загадваў мясцовай школай, але хутка працаваць не

змог, і ў выніку хваробы і моцнага знясілення ў сакавіку 1921 г. памёр.

Яго пахаванне было падобна на шматлюдную маніфестацыю. Тысячы жыхароў горада Бабруйска і навакольных вёсак прыйшлі, каб правесці Піліпа Мацвеевіча Караткевіча ў апошні шлях.

Бабруйскі павятовы аддзел народнай адукацыі так адазваўся на смерць аднаго з лепшых сваіх работнікаў: «Ён валодаў велізарнымі арганізатарскімі здольнасцямі, рэдкай настойлівасцю, праводзіў у жыццё задачы Савецкай улады і савецкай школы. Ён увесь гарэў ідэямі новага свету».

Пасля смерці бацькі мы з матуляй (гэта я і два маіх браты – Уладзімір і Леанід) пераехалі на яго радзіму ў Глуск. Старэйшы брат Георгій застаўся жыць у Бабруйску. Ён у той час ужо працаваў у павяткоме камсамола, раз'язджаў і хадзіў пехатой па вёсках, агітаваў моладзь уступаць у камсамол. Ведаю, што яго намаганнямі былі арганізаваны многія камсамольскія ячэйкі і на Глушчыне.

Рэўком у Гарадку дзейнічаў

З успамінаў А.Будніка

У в.Гарадзішча я нарадзіўся, тут нарадзіліся мае бацькі і дзяды. На дзень лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у вёсцы налічвалася 37 гаспадарак, якія мелі 120 дзесяцін зямлі, 27 коней, 10 пар валоў. Свайго хлеба хапала толькі да новага года, затым даводзілася зарабляць у розных месцах. Садоў тады ў вёсцы амаль ні ў кога не было.

Дрэнныя справы былі і з адукацыяй. Самым адукаваным быў Ігнат Сінькевіч, які закончыў у 1913 г. Магілёўскую фельчарскую школу. Нямногім удавалася закончыць двухкласнае вучылішча, дзяўчаты амаль не вучыліся. Усе нашы бацькі былі непісьменныя.

Наступіў 1917 г., адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. Да нас у вёску прыбыў накіраваны партыяй для работы сярод насельніцтва Максім Архіпавіч Ляўкоў. Ён арганізаваў народ для падтрымкі бальшавіцкай партыі і развіцця рэвалюцыйнага руху ў былой Гарадоцкай воласці.

Таварыш Ляўкоў знаходзіўся заўсёды з моладдзю. Ён расказваў нам аб задачах, якія ставіць перад сабой бальшавіцкая партыя, аб тым, што чакае народ пасля таго, як ён возьме ўладу ў свае рукі. Моладзь падтрымлівала Ляўкова і была гатова выконваць любы яго загад. Мы далі яму пісьмовую клятву, што будзем сумленна, не шкадуючы жыцця, выконваць усе даручэнні партыі. Нас было 30 чалавек. Таварыш Ляўкоў стварыў з падпісаўшыхся атрад для абароны савецкай улады. Быў арганізаваны таксама рэвалюцыйны камітэт. Старшынёй яго быў Міхаіл Мацвеевіч Сінькевіч, сакратаром — аўтар гэтых радкоў (А.Буднік). Загадчыкамі розных аддзелаў былі: Нічыпар Чабан, Максім Шардыка, Арцём Шыла, Сцяпан Мікалаеў, Мікалай Сеўба.

Пяць чалавек з нашага атрада былі накіраваны на работу ў Бабруйск. Сярод іх былі Пётр Сінькевіч, Міхаіл Елін, Сяргей Ешчык, Язэп Казачок.

З наступленнем у 1918—1919 гг. польскіх легіянераў, а затым немцаў членам Гарадоцкага рэўкома прыйшлося пайсці ў падполле. У гэтыя гады загінуў першы старшыня валаснога рэўкома Міхаіл Сінькевіч, яго забілі ў Бабруйску белапалякі па даносе правакатара.

26 чэрвеня 1920 г., калі былі выгнаны з воласці акупанты, рэўком зноў прыступіў да сваёй работы. Мы арганізавалі камітэты беднаты, дзялілі зямлю. Потым пачалі ствараць калгасы, ссяляць хутары.

Дакументы сведчаць

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «ИЗВЕСТИЯ ЦИК СОВЕТА РАБОЧИХ И СОЛДАТСКИХ ДЕПУТАТОВ»

1917 г., № 244

В НАРОДНОМ КОМИССАРИАТЕ ПО НАЦИОНАЛЬНЫМ ВОПРОСАМ

На днях Филипп Короткевич, товарищ председателя Белорусского областного комитета, вошел в Народный комиссариат по национальным делам со следующим предложением о совместной работе.

Из беседы Короткевича с народным комиссаром Сталиным выяснилось, что группа белорусских делегатов Всероссийского крестьянского съезда (всего 70 делегатов) представляет чисто крестьянскую организацию, стоящую на почве конфискации помещичьих земель и признания Советской власти в центре и на местах, что Комитет этот в ближайшее время созывает краевой съезд крестьянских депутатов в целях укрепления Советской власти в Белоруссии и т.д. Тов.Сталин выразил свое согласие, предложив через тов. Короткевича Белорусскому областному комитету прислать своих представителей в Комиссариат. Вчера в ответ на это предложение Белорусский областной комитет делегировал в качестве представителей Белоруссии при Центральной Российской власти товарищей Короткевича и Селиванова, при чем эти товарищи уполномачиваются действовать по директивам Белорусского областного комитета. Приняты при этом следующие условия совместной работы:

1. Действовать во всем в контакте с Советом рабочих и солдатских депутатов в Минске.
2. Краевая власть должна принадлежать Краевому Совету рабочих и солдатских депутатов, избранному при краевом съезде.
3. Краевой съезд Белоруссии созывается от имени Белорусского областного комитета и Совета депутатов совместно.
4. Немедленная передача без выкупа всех помещичьих земель в ведение земельных комитетов, реорганизованных на строго демократических началах.
5. Власть Совета рабочих, крестьянских и солдатских депутатов на местах.
6. Безоговорочное и полное право свободного самоопределения белорусского народа.

Организовать белорусский отдел при Народном комиссариате по национальным делам. Во главе отдела будут стоять тт.Короткевич и Селиванов.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА Ў САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ ПІЛІПА КАРАТКЕВІЧА

1917 г.

Под влиянием бесчинств, допускаемых в последнее время польскими войсками по отношению к трудовому крестьянству в районе Белоруссии, под влиянием вызывающего поведения польских помещиков края, заявляющих, что их земли есть исконное достояние Польши и что сама Белоруссия так или иначе будет присоединена к Польше, в среде белорусов-воинов, распыленных в настоящее время по всем фронтам, вспыхнуло стихийное движение в пользу создания специальных белорусских кадров в целях самозащиты и сохранения неделимости Белоруссии, на части которой предъявляют свои требования и Польша, и Литва, и Украина. Эти же обстоятельства, а так же и целый ряд вопросов, свойственных местным особенностям края, в особенности же всеобщая разруха, как результат непрерывных трехлетних военных операций в крае, беженский вопрос и многое другое,— послужили причиной такого же движения и в среде самого народа. Словом, перед трудовыми массами Белоруссии во всю ширь встал вопрос о создании местного краевого самоуправления.

Ничего не имея против этого движения, берущего свое начало в самых низах белорусского трудового народа, я опасаюсь, как бы это движение не было возглавлено элементами, способными повернуть его в сторону использования его в своих интересах местной польской буржуазией и аристократией.

Мои опасения и моя тревога имеют веские основания. Еще весною, в марте месяце, крупнейшие представители местной польской знати – кн.Друцкий-Любецкий, кн.Радзивил, Скирмунт, Войнилович и др. – сделали попытку навязать сверху идею самоопределения Белоруссии, использовав для этой цели существующую уже в крае Белорусскую Социалистическую Громаду, состоящую из элементов с явными признаками польской ориентации. 27 марта этой группой в Минске был созван съезд «общественных деятелей» Белоруссии, на котором был поставлен вопрос о белорусском самоопределении, но в таком направлении, которое игнорировало волю народа и противоречило его кровным интересам. И вот тогда, в противовес этому, социал-демократом большевиком Михайловым и мною было создано чисто крестьянское движение, в результате которого народ на целом ряде крестьянских съездов – губернских и уездных – отмежевался от этого течения и отложил вопрос о самоопределении до более благоприятных обстоятельств, исходя из соображений государственного характера.

Но, потерпев неудачу, вдохновители колонизации края, бездействовавшие в течение всего лета, воспрянули духом с началом стихийного движения в белорусских воинских массах.

Вторично, 15 – 25 октября, в Минске у них состоялся второй съезд «Общественных деятелей», на котором, не считаясь с волей народа, они создали верховный краевой орган – Великую Белорусскую Раду – с Исполнительным ее комитетом и Генеральным секретариатом. И для того, чтобы обеспечить этот орган, на реальной силе «общественные деятели» Белоруссии использовали состоявшиеся в октябре съезды белорусов-воинов в Минске и Витебске. Это им почти удалось, что видно из приложенных к сему резолюций войсковых съездов. Солдаты-белорусы, не посвященные в закулисную сторону деятельности этой группы, охотно согласились на возглавление Великой Белорусской Радой национального движения в их среде, и делу трудового народа Белоруссии грозит опасность снова попасть в руки своих бывших угнетателей. Совместно с белорусами-воинами, как видно из прилагаемых отчетов, в Минске на 5 декабря ими назначен съезд с участием крестьян, от которого эта группа имеет в виду получить согласие на предоставление этой новоявленной раде всей полноты власти в крае. В этом случае солидарность обманутых солдат с «деятелями» Рады может послужить причиной того, что крестьянство санкционирует все начинания «общественных деятелей» Рады.

Опасаясь этого, я решил создать такие условия, в которых движение среди белорусов было бы возглавлено самим крестьянством в лице его полномочных представителей в Советах крестьянских депутатов, центральных и местных. С этой целью мною и группою сочувствующих мне лиц из представителей Белоруссии на Чрезвычайном и 2-ом Всероссийском съезде крестьян составлен Белорусский областной Комитет в числе 70 человек, который поставил своей целью взять в свои руки руководство белорусским движением.

Ближайшими нашими задачами является:

1. На минском съезде 5 декабря открыть глаза белорусам-солдатам на истинную сущность Великой Белорусской Рады и ее стремлений.

2. Созвать 15 декабря в Рогачеве крестьянский белорусский съезд, на который бы перешли с Минского съезда все солдаты-белорусы, и на этом съезде поставить белорусский вопрос во всей его полноте и разрешить его в соответствии с кровными интересами трудовых масс, создав краевую крестьянскую, рабочую и солдатскую власть.

Первые шаги Комитетом сделаны. Дальнейшие затрудняются вследствие полного отсутствия средств. И вот, на основании полномочий, данных мне Белорусским Областным Комитетом, я обращаюсь в Совет Народных Комиссаров о выдаче комитету из государственных сумм 55 195 рублей на расходы по организации съезда согласно прилагаемой при сем сметы.

Приложение: смета и резолюции.

Тов.председателя Белорусского обл. комитета Ф.Короткевич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 96. Л. 188 – 189.

З ЛІСТА СЯЛЯН ВЁСАК МЕЖЫЛЕССЕ І ВОЛЬНІЦЫ ГЛУСКАЙ ВОЛАСЦІ БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКАЯ ПРАВДА» АБ БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ РАДЫ

13 студзеня 1918 г.*

ТОВАРИЩ РЕДАКТОР!

Не откажите поместить в вашей уважаемой газете «Советская правда» несколько слов о Белорусской раде. Сегодня, читая статью, помещенную в газете «Советская правда» №21 под заглавием «Это ли дело народа?», мы прямо-таки удивлялись тому нахальству руководителей Белорусской рады и тех, кто ее организует. Имеют ли эти лица согласие белорусского народа?

Мы, крестьяне дер.Межилесье Глусской вол(остной) земской управы, совместно с объединенным сельским комитетом дер.Межилесье и с.Ольницы, протестуем против руководителей Белорусской рады и не позволим никому, если бы даже дело дошло вплоть до вооруженной силы, играть нашей судьбой в такое время. Мы всецело подчиняемся только народным комиссарам и их помощникам, которые нам дают мир, свободу и землю, и только за них мы сумеем в борьбе за правое дело погибнуть, если до этого дойдет дело, но больше ни за кого... И горе нашим смутителям и мирским крабам, которые не идут навстречу народу, а притягивают свои осклизлые щупальцы и пробуют в лице нашем у себя под ногами почву, намечая нас как жертвы для своей защиты.

* Дата публікацыі ў газеце.

Товарищи крестьяне Минской губ.! Вас мы призываем ко всеобщему объединению, подайте и вы от себя голос, что никакой Белорусской рады вы не признаете, т.к. ни в одной волости по Минской губ. объяснений не было по поводу Белорусской рады, и нас никто не в праве самовольно отделить от великороссов.

Когда наши дети и братья с 1914 г. были вовлечены в войну, то почему руководители нынешней Белорусской рады не открыли своего буржуазного заседания тогда в гор.Минске? Да потому, что мы тогда клали свои головы за них и их батьку – кровавого Николая; когда же полетел вверх ногами кровавый Николай и они видят, что теряют голову в круговороте своего омута, то они для своей защиты делят нас на рады, — Малороссию они отделили, им там ничего не страшно, теперь им только остается нас отделить, но им это не удастся, мы все за одного и один за всех. Нам не нужны их королевства, нам нужно всеобщее единение, мир, свобода и земля; если же они нас поделят на партии и отдельные королевства, то тогда они нас своими щупальцами так обовьют, что все равно как паук муху в свою паутину.

Берегитесь, товарищи крестьяне, Белорусской самозванной рады и тех, кто ее организует. Они ведь заседали не по почину народа, а по почину своему, т.к. их никто не собирал в гор.Минск обсуждать белорусские народные интересы. Эта кучка буржуазии не даст нам, белорусам, ни свободы, ни мира, ни хлеба.

За председателя объединенного комитета И.Парахневич
За секретаря ком(итета) Т.Рипинский

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ЧЛЕНАЎ ГЛУСКАГА ВАЛАСНОГА КАМІТЭТА

15 лютага 1919 г.

Присутствовало 7 человек
Председательствовал тов.Вилюга
Секретарь Буевский
ПОРЯДОК ДНЯ:
1. Распределение обязанностей между членами исполкома
2. Организация продовольственной комиссии

Товарищ Вилюга предложил вновь избранным членам волостного исполкома распределить между собой обязанности, при чем пояснил, что в волостном исполкоме полагается организовать следующие отделы: 1) отдел управления, 2) отдел продовольствия, 3) отдел земельный и лесной при нем подотдел, 4) отдел народного образования и подотдел социального обеспечения при нем, 5) отдел труда и 6) отдел народного и местного хозяйства.

После обсуждения вопроса члены исполкома заняли следующие отделы, а именно: отдел управления – Семен Вилюга, отдел продовольствия – Степан Оношко и Алексей Соловей, отдел земельный – Василий Кабанович, отдел народного образования – Дмитрий Танкевич, отдел труда – Иван Малашук, отдел народного и местного хозяйства – Филипп Шумский, при чем Шумский является и товарищем председателя исполкома и на случай его отъезда исполняет обязанности председателя волостного исполкома.

Представитель КОМпрода Белоруссии тов.Берсон предложил исполкому создать продовольственную комиссию из членов исполкома в составе трех человек. В комиссию избраны Степан Оношко (зав. прод. отделом), Алексей Соловей (тов. зав. прод. отделом) и Константин Молокович, причем Соловей и Молокович в качестве членов продовольственной комиссии, утвержденной исполкомом.

Председатель исполкома Вилюга
Секретарь Буевский

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 330. Воп. 1. Спр. 54. Л. 69.

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛЬНАГА ПАСЯДЖЭННЯ ГЛУСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА АБ ДАПАМОЗЕ ПАГАРЭЛЬЦАМ

6 мая 1919 г.

СЛУШАЛИ:

Доложено, что в ночь с 5 на 6 мая 1919 года пожаром, происшедшим по неизвестной причине, уничтожены постройки, все продукты продовольствия, одежды и пр., 28 домохозяев граж-

дан Хвастовичи, при чем из них у 21 домохозяина в буквальном смысле уничтожено все, даже у некоторых домохозяев скот и лошади. Убытки пожаром причинены колоссальные, приблизительно 882 070 руб.

В связи с этим необходимо оказать погорельцам помощь.

ПОСТАНОВИЛИ:

Отпустить из имеющегося количества фондового зерна 200 пудов такового для выдачи погорельцам, запросив разрешение уездного компрода. Реквизировать по селениям Глусской волости продукты продовольствия, одежды, лошадей и выдать погорельцам соразмерно степени их нужды.

Копия верна: Секретарь Буевский

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 330. Воп. 1. Спр. 54. Л. 80.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ГЛУСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА АБ РАБОЦЕ МЛЫНОЎ У ВОЛАСЦІ

17 мая 1919 г.

Председательствовал тов.Шумский

Секретарь Буевский

На повестке дня:

1. О мельницах.

СЛУШАЛИ:

Доложено, что зачастую арендаторы и владельцы мельниц, расположенных в районе Глусской волости, под разными предлогами останавливают мельницы, чем создается ненормальное положение. Посему необходимо назначить вполне компетентное лицо для наблюдения за всем этим, а также которое доставляло бы для мельницы нужный материал.

ПОСТАНОВИЛИ:

Старшим контролером над всеми мельницами, расположенными в пределах Глусской волости, вместе с тем и агентом по доставке для этих же мельниц нужного материала назначить товарища Адольфа Вольфсдорфа, на содержание которого и другие расходы установить помимо существующей платы за помол еще по 20 коп. от пуда для всех.

Денежные средства поступают в распоряжение местного продовольственного отдела, которому поручается за всем этим следить.

Заседание закрывается в 8 часов вечера 17 мая 1919 года.

За председателя волостного исполкома Кабанович

Секретарь Буевский

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 330. Воп. 1. Спр. 54. Л. 95.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «САВЕЦКАЯ ВЁСКА»

12 ліпеня 1925 г.

ЗВЕРСКІЯ РАСПРАВЫ ЛЕГІЯНЕРАЎ

... Страшнымі былі зверствы карнікаў-легіянераў, якія ў студзені 1920 г. уварваліся ў вёскі паўднёвай часткі Глушчыны. Маючы перавагу над партызанамі ў 1500 штыкоў, пры 30 кулямётах, карнікі спалілі многа вёсак, насілавалі жанчын, забівалі мірных жыхароў. У няроўным баі загінулі партызаны Лявон Адзінец, Майсей Раговіч, Усмакін, Васіль Званковіч, Сцяпан Рыгоравіч Падута, Віктар Войчыч, Дзяніс Макейч, браты – Кузьма, Максім і Рыгор Кавалевічы; Рыгор і Фама Пальцавы, Андрэй Афанасенка, браты – Васіль і Фёдар Данілевічы, Ульян Жынко і інш. Легіянеры расстралялі 12 заложнікаў. У той жа час партызаны нанеслі немалыя страты карнікам, знішчыўшы 75 легіянераў і параніўшы больш 100.

У гарніле грамадзянскай вайны

Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г., грамадзянская вайна... Гісторыя адлюстравала гэты час як круты паварот у лёсах мільёнаў людзей, што апынуліся ў эпіцэнтры барацьбы за новы свет. Многія нашы землякі актыўна ўдзельнічалі ў гэтых гістарычных падзеях.

На Балтыйскім флоце ў той грозны час служылі рулявы падводных лодак Фёдар Фаміч Кісялевіч (родам з в. Пагост); мат-

дан Хвастовичи, при чем из них у 21 домохозяина в буквальном смысле уничтожено все, даже у некоторых домохозяев скот и лошади. Убытки пожаром причинены колоссальные, приблизительно 882 070 руб.

В связи с этим необходимо оказать погорельцам помощь.

ПОСТАНОВИЛИ:

Отпустить из имеющегося количества фондового зерна 200 пудов такового для выдачи погорельцам, запросив разрешение уездного компрода. Реквизировать по селениям Глусской волости продукты продовольствия, одежды, лошадей и выдать погорельцам соразмерно степени их нужды.

Копия верна: Секретарь Буевский

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 330. Воп. 1. Спр. 54. Л. 80.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ГЛУСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА АБ РАБОЦЕ МЛЫНОЎ У ВОЛАСЦІ

17 мая 1919 г.

Председательствовал тов.Шумский

Секретарь Буевский

На повестке дня:

1. О мельницах.

СЛУШАЛИ:

Доложено, что зачастую арендаторы и владельцы мельниц, расположенных в районе Глусской волости, под разными предлогами останавливают мельницы, чем создается ненормальное положение. Посему необходимо назначить вполне компетентное лицо для наблюдения за всем этим, а также которое доставляло бы для мельницы нужный материал.

ПОСТАНОВИЛИ:

Старшим контролером над всеми мельницами, расположенными в пределах Глусской волости, вместе с тем и агентом по доставке для этих же мельниц нужного материала назначить товарища Адольфа Вольфсдорфа, на содержание которого и другие расходы установить помимо существующей платы за помол еще по 20 коп. от пуда для всех.

Денежные средства поступают в распоряжение местного продовольственного отдела, которому поручается за всем этим следить.

Заседание закрывается в 8 часов вечера 17 мая 1919 года.

За председателя волостного исполкома Кабанович

Секретарь Буевский

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 330. Воп. 1. Спр. 54. Л. 95.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «САВЕЦКАЯ ВЁСКА»

12 ліпеня 1925 г.

ЗВЕРСКІЯ РАСПРАВЫ ЛЕГІЯНЕРАЎ

... Страшнымі былі зверствы карнікаў-легіянераў, якія ў студзені 1920 г. уварваліся ў вёскі паўднёвай часткі Глушчыны. Маючы перавагу над партызанамі ў 1500 штыкоў, пры 30 кулямётах, карнікі спалілі многа вёсак, насілавалі жанчын, забівалі мірных жыхароў. У няроўным баі загінулі партызаны Лявон Адзінец, Майсей Раговіч, Усмакін, Васіль Званковіч, Сцяпан Рыгоравіч Падута, Віктар Войчыч, Дзяніс Макейч, браты — Кузьма, Максім і Рыгор Кавалевічы; Рыгор і Фама Пальцавы, Андрэй Афанасенка, браты – Васіль і Фёдар Данілевічы, Ульян Жынко і інш. Легіянеры расстралялі 12 заложнікаў. У той жа час партызаны нанеслі немалыя страты карнікам, знішчыўшы 75 легіянераў і параніўшы больш 100.

У гарніле грамадзянскай вайны

Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г., грамадзянская вайна... Гісторыя адлюстравала гэты час як круты паварот у лёсах мільёнаў людзей, што апынуліся ў эпіцэнтры барацьбы за новы свет. Многія нашы землякі актыўна ўдзельнічалі ў гэтых гістарычных падзеях.

На Балтыйскім флоце ў той грозны час служылі рулявы падводных лодак Фёдар Фаміч Кісялевіч (родам з в. Пагост); мат-

Ц.З.Радзько.

рос Рыгор Аляксеевіч Шаўрукоў (ураджэнец в. Гарадок); машыніст Мікалай Ільіч Гурын (родам з хутара Лагадаўка Завалочыцкага сельсавета); матарыст Цімафей Захаравіч Радзько (ураджэнец в. Баянава); матрос з лінкора «Севастополь» Якаў Раманавіч Храпко (ураджэнец в. Жалвінец) і іншыя.

Па-рознаму склаўся іх лёс у паслякастрычніцкі перыяд. Адам Данілавіч Астрэйка, які жыў ва Усцярхах і прызываўся ў армію ў 1910 г., сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю на фронце, камандзірам аддзялення 3-га пантоннага батальёна. У 1918 г. ён добраахвотнікам уступіў у Аршанскі полк Магілёўскай дывізіі, а ўжо ў канцы мая гэтага ж года быў назначаны камандзірам узвода палка Заходняга ўчастка заслоны ў Беларусі. Пазней полк быў пасланы на Усходні фронт супраць чэхаславацкіх мяцежнікаў.

Трывожныя весткі з Поўначы: караблі пад чужымі флагамі з нахабнай бесцырымоннасцю баразняць воды Балтыйскага мора, спакойна расстрэльваюць савецкія караблі, якія сустракаюць на сваім шляху. Фёдар Фаміч Кісялевіч у гэты час нёс службу на падводнай лодцы «Пантера». Нябачная для ворага субмарына з глыбокіх вод падтрымлівала дзеянні надводных караблёў. Дзень 31 жніўня 1919 г. нічым не адрозніваўся ад папярэдніх. У 5 гадзін 30 мінут раніцы «Пантера» выйшла з Кранштата ў Капорскі заліў у пошуках праціўніка. Праз 9 гадзін плавання ў перыскоп з надводнага становішча быў знойдзены варожы эсмінец, які неўзабаве пайшоў на поўнач. У 17 гадзін і 18 гадзін 05 мін былі заўважаны яшчэ два эсмінцы, за якімі «Пантера» больш за дзве гадзіны вяла назіранне. Крыху пазней караблі праціўніка сталі на якар усходней востраваў Сескар, дзе глыбіня не перавышала 20 м. На «Пантеры» вырашылі атакаваць іх. У 20 гадзін 15 мін лодка ўсплыла на глыбіню 7 м і пачала павольна лавіраваць, каб наблізіцца да цэлі. Кожны член экіпажа падлодкі па загаду камандзіра А.Н.Бахціна заняў сваё месца, рыхтуючыся да атакі. Марудна паўзлі мінута за мінутай, і толькі крыху больш як праз гадзіну з дыстанцыі 4—5 кабельтаў (740—925 м) «Пантера» выпусціла дзве тарпеды. Прыцэл быў трапным: неўзабаве навейшы англійскі эсмінец «Виктория» пачаў тануць. У гэтым кароткім баі дакладна дзейнічала ўся каманда, але асаблівым майстэрствам вызначаліся дзеянні рулявога Фёдара Кісялевіча: ён і пасля бою не пакінуў сваё месца. «Пантера» лягла на зваротны курс. Так не ўсплыўшы на паверхню, у падводным становішчы без рэгенерацыі паветра яна прайшла больш як 75 міль (138,9 км) на працягу 28 гадзін, што з'явілася па тым часе своеасаблівым рэкордам. У 13 гадзін 1 верасня «Пантера» вярнулася на сваю базу. Фёдар Фаміч Кісялевіч за гэты бой неўзабаве быў узнагароджаны імянным гадзіннікам (на той час даволі высокая ўзнагарода).

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны ён быў дэмабілізаваны з падлодкі «Пантера» і накіраваны ў бестэрміновы водпуск.

Вось што паведаміў аб далейшым жыццёвым шляху Ф.Ф.Кісялевіча яго пляменнік Рыгор Дзянісавіч Кісялевіч:

— Дадому, у в. Пагост, Фёдар вярнуўся не адзін. З ім ехала яго маладая жонка. Яны чакалі нараджэння дзіцяці. Заслужанага марака-балтыйца на радзіме сустрэлі цёпла і ўважліва. Даведаўшыся пра яго жаданне асесці і гаспадарыць у вёсцы, старшыня валаснога выканкома распарадзіўся, каб Кісялевічу выдзелілі валоў для апрацоўкі зямлі і ўчастак зямлі ў в. Краснае. Вясной Фёдар яго засеяў, чакаў першага ўраджаю. Але не дачакаўся...

Маладая сям'я жыла ў бацькі Фамы Кісялевіча. У Пагосце ў той час арудавала банда з мясцовых жыхароў, якія змагаліся супраць савецкай улады і яе актывістаў. Сваё гняздо яны звілі аж у Слаўкавічах. Вяртанне Фёдара Кісялевіча з Ленінграда, горада, які быў калыскай рэвалюцыі, а таксама бальшавіцкія погляды марака прыйшліся не па нутры бандытам. І адной-

чы, уварваўшыся ноччу ў хату старога Фамы, яны ўчынілі дзікую расправу: закалолі спячага Фёдара штыком. Жонка з маленькім дзіцём пасля пахавання мужа паехала назад у Ленінград, і быццам у ваду канула. Ніякія пошукі не далі звестак аб месцы яе знаходжання...

Не менш трагічна склаўся лёс і Цімафея Захаравіча Радзько з в. Баянава. Удзельнік першай сусветнай вайны і дзвюх рэвалюцый 1917 г., ён з 10 красавіка служыў на эсмінцы «Автраил», каманда якога займалася ўстаноўкай мінных загарод каля Шэпелеўскага маяка.

Вечарам 26 снежня «Автраил» выйшаў у мора, каб разам з эсмінцам «Спартак», які адправіўся на заданне першым, правесці разведку праціўніка на Рэвельскім рэйдзе, абстраляць берагавыя аб'екты, затым адысці пад прыкрыццем лінкора «Андрей Первозванный» і крэйсера «Олег».

Але выкананне пастаўленай караблям задачы нечакана ўскладнілася. Па поўдні «Спартака» заўважыў праціўнік, і савецкі эсмінец быў вымушаны прыняць няроўны бой з двума англійскімі крэйсерамі і эсмінцам. Не мог ён разлічваць і на дапамогу: у ходзе варожай атакі была пашкоджана радыёсувязь. Адыходзячы ад праследавання караблёў праціўніка, «Спартак» нечакана сеў на каменную падводную граду і не змог рухацца далей. Эсмінец і яго каманду англічане захапілі ў палон.

На «Автраиле» не ведалі, што здарылася са «Спартаком». Раніцай наступнага дня на эсмінцы заўважылі каля вострава Рамусар некалькі англійскіх караблёў. «Автраил» вырашыў не ўвязвацца ў бой і пачаў адыходзіць. Але літаральна праз гадзіну ў раёне вострава Экхольм эсмінец сутыкнуўся з англійскім крэйсерам і двума эсмінцамі. Як тыя драпежнікі, накінуліся яны на савецкае судна. Яго каманда мужна і стойка абаранялася ад насядаючых англійскіх караблёў, але сілы былі вельмі няроўныя. На «Автраиле» перастала працаваць радыёсувязь, ён атрымаў некалькі сур'ёзных пашкоджанняў, страціў ход і праз паўгадзіны быў захоплены англічанамі.

Нашы лінкор і крэйсер з-за адсутнасці радыёсувязі з захопленымі караблямі не маглі аказаць ім дапамогі і вярнуліся ў Кранштат.

Абодва савецкія эсмінцы і іх экіпажы англічане перадалі ўраду буржуазнай Эстоніі, а 251 марак аказаўся ў палоне. У студзені 1919 г. 36 маракоў-камуністаў былі расстраляны на востраве Нарген, многія памерлі ад голаду і холаду. У1919—1920 гг. з палону ўдалося ўцячы 94 маракам. А як жа склаўся лёс нашага земляка Цімафея Захаравіча Радзько?

Аб гэтым расказала яго дачка, жыхарка Бабруйска Тамара Цімафееўна Цэрна:

— Бацька не спадзяваўся, што застанецца жывым і нават калі-небудзь вернецца на радзіму, бо палонныя ці паміралі ад голаду, ці іх проста знішчалі. Гаспадары-эстонцы, да якіх Ц.З.Радзько трапіў з іншымі палоннымі, «рассартавалі» ўсіх іх па спецыяльнасцях. Радзько быў каваль – і не просты, а адмысловы майстар. Калі яму даручылі першую работу, ён хутка і якасна яе выканаў. Зробленая дэталь выклікала ў гаспадара задавальненне, і ён даў зразумець Ц.З.Радзько, што такія людзі, як ён, паміраць не павінны. Так і выратавалі Цімафея Захаравіча і ад смерці, і ад палону яго залатыя рукі.

Пазней, калі вярнуўся дамоў, гэтыя ж рукі кармілі ўсю яго сям'ю: не было ў навакольных вёсках таго двара, адкуль бы гаспадар не звярнуўся да каваля за якой-небудзь патрэбай. Потым сям'я ўступіла ў калгас. І зноў Цімафей Захаравіч быў у вялікай пашане ў людзей за свае рукі майстра. Любілі і паважалі яго за добры характар, за сардэчнасць, за ўменне жыць з людзьмі ў міры і згодзе.

І.Я.Краўцоў, Т.А.Матусевіч.

Вызваляў родную зямлю

З успамінаў Майсея Навумавіча Патапенкі, жыхара в. Зелянковічы

Я нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1915 г. быў узяты ў царскую армію. На нямецкім фронце быў паранены і кантужаны. Лютаўская рэвалюцыя застала мяне ў Бабруйску на зборным пункце, Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя – у Бесарабіі, у Бендэрскім рабочым батальёне.

15 лістапада 1917 г. я ў Адэсе добраахвотнікам уступіў у атрад Чырвонай гвар-

М.Н.Патапенка.

дыі і ў яго саставе ўдзельнічаў у многіх баях супраць нямецкіх акупантаў на Украіне, румынскіх і пятлюраўскіх бандафарміраванняў. Быў паранены ў баі з немцамі. Дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі ў 1918 г., калі немцы поўнасцю акупіравалі Украіну, частку Беларусі. У канцы 1918 г., калі немцы пакінулі Бабруйск, добраахвотнікам уступіў у 1-ы Бабруйскі каравульны батальён. У сакавіку 1919 г. у саставе батальёна ўдзельнічаў у разгроме стракапытаўскага мяцяжу ў Гомелі, затым у баях супраць палякаў у Маладзечне, Мінску і Бабруйску.

У кастрычніку 1919 г. я ўступіў у партызанскі атрад М.А. Ляўкова і ўдзельнічаў у многіх баях з белапалякамі ў вёсках Зелянковічы, Зубарэвічы, Дуброва, Шкава, Азарычы і інш. Хутка партызаны атрада імя 3-га Інтэрнацыянала ўступілі ў адзін з палкоў Чырвонай Арміі (508 полк. — *Рэд.*). Тут мне давялося змагацца з белапалякамі ў раёне Калінкавіч, Мазыра, Васілевіч, Рэчыцы і інш. У 1920 г. разам са сваім палком наступаў на Варшаву.

У 1922 г. дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі. Пасля служыў у міліцыі Бабруйска.

Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. З 22 жніўня 1941 г. партызан атрада імя Кірава 37-й брыгады імя Пархоменкі, ваяваў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступеней, «За перамогу над Германіяй» і інш. Член КПСС з 1947 г., член «Саюза 1926 года», інвалід Айчыннай вайны 2-й групы.

З фондаў Бабруйскага краязнаўчага музея.

Першыя крокі савецкай улады

Для неадкладнага ажыццяўлення ваеннай і грамадзянскай улады на вызваленай ад нямецкіх акупантаў тэрыторыі павета ў першыя ж дні пачаў дзейнічаць надзвычайны орган улады Ваенны Савет.Яму часова належала ўся палітычная, адміністрацыйная і ваенная ўлада. Адначасова ішоў працэс арганізацыі рэўкомаў і Саветаў. На сумесным пасяджэнні Бабруйскага гарадскога і раённага камітэтаў Камуністычнай партыі была прынята пастанова, у якой гаварылася аб неабходнасці стварэння рэвалюцыйнага камітэта горада Бабруйска і павета. Рэўком узначаліў П.Ф.Равінскі. У першым жа сваім загадзе рэўком аб'явіў насельніцтву, што ўся грамадзянская ўлада ў горадзе і павеце пераходзіць да рэўкома. Перад ім стаяла задача не толькі аднавіць, але і ўмацаваць савецкую ўладу, пры неабходнасці падавіць супраціўленне контррэвалюцыйных элементаў, правесці максімум неадкладных мерапрыемстваў і падрыхтаваць глебу для выбрання пастаянных органаў дзяржаўнай улады — Саветаў.

У павеце праводзілася работа па фарміраванні чырвонаармейскіх часцей і ўзброеных атрадаў. Яе накіроўваў ваенны камісар Пракоп Дзянісавіч Малаковіч разам з прысланым па заданні штаба Заходняга фронту Кастусём Данілавічам Пінчуком.

На працягу студзеня 1919 г. быў створаны Бабруйскі павятовы ваенны камісарыят на чале з П.Д.Малаковічам. Патрэбна было фарміраваць валасныя камісарыяты па вайсковых справах.

Нямала добраахвотнікаў з Глушчыны ўлілося таксама ў спецыяльныя часці асобага прызначэння, створаныя ў Бабруйску. Іх узначаліў ураджэнец в. Чыкілі Ціт Тоўсцік.

У пачатку снежня 1918 г. для абароны заваёў савецкай улады ў Бабруйску быў арганізаваны 1-ы Бабруйскі рэвалюцыйны полк, пазней ён прайшоў перафарміраванне ў 1-ы і 2-і каравульныя батальёны. Камандзірамі батальёнаў былі прызначаны рудабельскія балышавікі: Сцяпан Жынко і Аляксандр Салавей. Ствараласяпавято-

вая рабоча-сялянская міліцыя. Яе начальнікам стаў П.П.Сінкевіч , ураджэнец в. Гарадзішча. Яго першым намеснікам прызначаны Лука Фядосавіч Малаковіч з в. Зубарэвічы. У ліку першых добраахвотнікаў уступіў у міліцыю Якаў Марус, жыхар в.Слаўкавічы.

У павеце ішоў бурны працэс новых пераўтварэнняў, у рукі працоўных пераходзілі фабрыкі, заводы, майстэрні, чыгунка, тэлеграфная і тэлефонная сувязь, маёнткі, лес, склады і г.д. У адным дакуменце таго часу паведамлялася, напрыклад, што тэлефонная справа пасля ўходу немцаў зусім рэарганізавана. Створана ўпраўленне ўсёй тэлефоннай сеткай, набраны адпаведны штат служачых, прыняты меры да аднаўлення зносін як у горадзе, так і ў павеце з пунктамі Парычы, Асіповічы, Пухавічы, Глуша, Старыя Дарогі, Гарбацэвічы, Глуск і Ігумен.

Для перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі ў новых умовах на месцах ствараліся рэўкомы. Глускі валасны рэўком узначаліў Іван Мазалеўскі, салдат, дэмабілізаваны з рэвалюцыйных войскаў, які з 1917 г. звязаў свой лёс з партыяй бальшавікоў. Пазней яму ў дапамогу быў накіраваны С.Л.Вілюга. Апошні з 1919 г. узначаліў валасны рэўком.

Яшчэ ў чэрвені 1918 г. ВЦВК заклікаў органы ўлады арганізоўваць на месцах камітэты вясковай беднаты. Але на Глушчыне ў сувязі з нямецкай інтэрвенцыяй гэтая работа праводзілася значна пазней, у 1919 г.

Абапіраючыся на створаныя ў вёсках батрацкія камітэты і групы беднаты, рэўком браў на ўлік маёнткі і ўстанаўліваў іх ахову, прымаў меры, каб вярнуць раскрадзеную жывёлу і сельскагаспадарчы інвентар. Прадбачачы канец нямецкай акупацыі і збіраючыся ўцякаць, памешчыкі разбуралі і знішчалі ў маёнтках сельгасмашыны, абсталяванне, распрадавалі або раздавалі сваім блізкім маёмасць, насенне і г.д. Многія маёнткі ў воласці былі разрабаваны, былыя іх уладальнікі, карыстаючыся абаронай нямецкіх штыкоў, самым варварскім спосабам знішчалі ўсё, што маглі, каб яно не дасталося сялянам, часта многа дабра асядала ў кулакоў.

У другой палавіне снежня 1918 г. Мінгубрэўком выдаў загад аб арышце і высяленні з маёнткаў памешчыкаў. Валасным Рэўкомам і Саветам прадпісвалася неадкладна ўзяць на ўлік такія маёнткі, скласці падрабязныя вопісы жывога і нерухомага інвентару. Для выканання гэтай работы падключаліся камбеды і групы беднаты, якія станавіліся важнейшым сродкам умацавання савецкай улады ў вёсцы. Яны дапамагалі забяспечваць сялян-беднякоў, чырвонаармейскія сем'і насеннем, фуражом, жывёлай, цяглавой сілай, сельскагаспадарчымі прыладамі працы, наладжвалі ў вёсках улік вытворчасці прадуктаў і ўстанаўлівалі кантроль за іх размеркаваннем, займаліся перараэмеркаваннем канфіскаванай у памешчыкаў зямлі і сельгасінвентару, забіралі хлебныя лішкі ў кулакоў.

Аднак у гэты перыяд было зроблена шмат памылак. Зачастую камбедаўцы, выконваючы распараджэнні мясцовых органаў улады, не вельмі абцяжарвалі сябе размежаваннем, дзе кулак, а дзе заможны селянін. Было, як кажуць, наламана нямала дроў. Тым больш што для самавольства добрым прыкрыццём служыла харчразвёрстка, пад выглядам якой у многіх, нават і не багатых сялян, забіралі ўсё збожжа, бульбу (у тым ліку насенне) у фуражны фонд. Гэта, вядома, парадзіла незадаволенасць сялянства. Палітыка «ваеннага камунізму» апусташала вёску, выклікала скарачэнне пасяўных плошчаў і памяншэнне калькасці апрацоўваемых зямель. Паколькі лішкі прадукцыі ў сялян адбіраліся, ім было нявыгадна павялічваць вытворчасць хлеба. Харчразвёрстка ігнаравала інтарэсы сялян і з'явілася прычынай голаду як у горадзе, так і ў сельскай мясцовасці. Патрабавалася новая палітыка, якая б улічвала зацікаўленасць працоўных сялян і рабочых.

Разруха, прынесеная народнай гаспадарцы Бабруйскага павета 1-й сусветнай вайной і нямецкай інтэрвенцыяй, стварала велізарныя цяжкасці.

Для наладжвання нармальнага жыцця ў горадзе і вёсках не хапала сродкаў. Паранейшаму вострым заставалася пытанне аб забеспячэнні насельніцтва харчаваннем. Рэўкомам быў назначаны павятовы камісар харчавання, якому даваліся самыя шырокія паўнамоцтвы. Ім стаў Ліакумовіч. 10 студзеня 1919 г. рэўком па яго прапанове аддаў загад аб правядзенні ў горадзе рэквізіцыі тавараў і прадуктаў: яны пера-

даваліся аддзелу забеспячэння. Быў уведзены надзвычайны рэвалюцыйны парадак для прадстаўнікоў маёмасных класаў горада і павета. У якасці часовай меры выпускалася спецыяльная марка рэўкома для мясцовага збору.

Аналагічныя праблемы даводзілася вырашаць рэўкому Глускай воласці. Насельніцтва мястэчка, якое дасягнула 9 тысяч душ, сяляне-беднякі мелі вострую патрэбу ў прадуктах харчавання. У многіх сем'ях па тыднях не бачылі хлеба, не хапала бульбы. Нямецкія акупанты забралі з сялянскіх свірнаў апошняе зерне, адабралі жывёлу, коней. Становішча пагражала сацыяльным выбухам. Як адзначалася на адным з пасяджэнняў валаснога рэўкома, калі «патрабаванні насельніцтва ў паляпшэнні харчавання застануцца незадаволенымі, то на гэтай глебе могуць узнікнуць непажаданыя эксцэсы». Таму валасны рэўком у пачатку лютага 1919 г. вырашыў неадкладна прыступіць да рэквізіцыі лішкаў хлеба ў кулакоў.

Праз местачковы савецкі кааператыў для глушчан з харчовага склада адпускалася 200 пудоў жыта і дазвалялася вывезці з маёнтка Веснава 500 пудоў бульбы, закупленай у былога памешчыка.

На тэрыторыі воласці ішла падрыхтоўчая работа па выбранні пастаянных органаў улады — Саветаў. Працэс іх фарміравання праходзіў у студзені — лютым 1919 г., калі былі праведзены выбары ў Саветы. На Глушчыне пасля выбараў у першай палавіне лютага 1919 г. адбыўся з'езд Саветаў, на якім быў выбраны выканаўчы камітэт з сямі чалавек. Яго ўзначаліў С.Л.Вілюга. З выбраннем выканкома валасны рэўком вычарпаў свае паўнамоцтвы і спыніў дзейнасць як надзвычайны орган улады.

З першых жа крокаў сваёй дзейнасці камітэт яшчэ больш рашуча працягваў пачатую работу па нацыяналізацыі памешчыцкай уласнасці. У адпаведнасці з Дэкрэтам аб зямлі патрэбна было правесці дакладны ўлік зямель, уладанняў і гаспадарак з жывым і нерухомым інвентаром, насеннага фонду, арганізаваць сельскагаспадарчыя кааператывы і накіроўваць іх работу.

Праводзімыя валасным выканкомам мерапрыемствы выклікалі зацікаўленасць у сельскіх жыхароў, бо канфіскацыю памешчыцкай зямлі чакалі і падтрымлівалі ў вёсках самыя розныя слаі насельніцтва — ад кулакоў да беззямельных сялян. Аднак у кожнай групы, вядома, былі свае, даволі розныя інтарэсы. Таму, чакаючы размеркавання канфіскаванай памешчыцкай зямлі, вёска жыла ў стане пэўнай сацыяльнай напружанасці.

Гэтая напружанасць яшчэ больш узрасла, калі сялянам стала зразумела, што пытанне аб надзяленні іх зямлёй чамусьці пераносіцца на невядома які час. Здарылася гэта таму, што ў Мінскай губерні вясной 1919 г. пры ажыццяўленні аграрнай палітыкі, вызначанай Дэкрэтам аб зямлі, былі дапушчаны грубыя памылкі. Урад Літбел ССР не пайшоў насустрач спадзяванням сялян і не правёў сярод іх размеркаванне часткі канфіскаванай памешчыцкай зямлі. Замест гэтага быў узяты курс на арганізацыю ў памешчыцкіх маёнтках галоўным чынам саўгасаў. Саўгаснае будаўніцтва было паскорана пасля зацвярджэння ВЦВК «Палажэння аб сацыялістычным землеўпарадкаванні і мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства» (14 лютага 1919 г.). Праз тры тыдні пасля гэтага Камісарыят земляробства выдаў дырэктыву, у адпаведнасці з якой павятовым упраўленням нацыяналізаванымі маёнткамі прапаноўвалася разгрупаваць усе маёнткі па трох катэгорыях. Да 1-й катэгорыі адносіліся маёнткі, якія адпавядалі чатыром патрабаванням: наяўнасці тэхнічных сродкаў, развіццю спецыяльных галін сельскай гаспадаркі, агульнаму культурнаму стану, адлегласці ад эканамічных цэнтраў. Астатнія маёнткі адносіліся да 2-й і 3-й катэгорыі. Маёнткі 1-й катэгорыі прызначаліся для арганізацыі ў іх саўгасаў, астатнія для калектыўных гаспадарак.

Да сярэдзіны сакавіка 1919 г. у воласці была праведзена значная работа па разгрупіроўцы маёнткаў. У Бабруйскім павеце да 1-й катэгорыі адносіліся 30 маёнткаў. Сярод іх па Глускай воласці перадаваліся 11 маёнткаў з фальваркамі, у Гарадкоўскай такая ж колькасць, з Рудабельскай фальварак Касарычы і маёнтак Зубарэвічы, Ляскавіцкай — 15 маёнткаў і фальваркаў, сярод якіх Слаўкавічы, Халопенічы, Катка, Слабодка і інш.

У стварэнні саўгасаў урад рэспублікі аказваў вялікую матэрыяльную дапамогу. Яшчэ ў лютым 1919 г. былі адпушчаны на

гэтую справу Бабруйскаму павету 45 тыс. рублёў. На Глушчыне першая сельская гаспадарка была арганізавана ў 1919 г. на базе маёнтка Завалочыцы. Праз год узніклі народныя гаспадаркі ў Дварцы, Скубейцы. Першы ж год агульнага гаспадарання прынёс ім эканамічныя паказчыкі, якія высокімі не назавеш. У Завалочыцах, напрыклад, атрымалі 924 пуды жыта, 150 — саломы, 30 – мякіны. З 80 дзесяцін накошвалі 2278 пудоў сена. Тут было 37 галоў буйной рагатай жывёлы, 8 коней. У Скубейцы і Дварцы і таго менш: вырасцілі 130 пудоў бульбы, бо займаліся свінагадоўляй, пасеялі больш зерневых і атрымалі : пшаніцы – 59 пудоў, аўса – 200, ячменю – 130, грэчкі – 20 пудоў. У Дварцы меўся дойны статак – 15 кароў.

Як бачна, гэтыя і ім падобныя першыя калектыўныя гаспадаркі былі невялікія, дрэнна забяспечаныя сельгасінвентаром, мелі нязначную колькасць рабочай сілы і пры нізкай тэхніцы апрацоўкі зямлі не маглі асвойваць вялікія пасяўныя плошчы, атрымліваць добрыя ўраджаі. Яны не толькі не давалі прадукцыі дзяржаве, але самі не маглі пазбавіцца ад беднасці. Тым не менш згубны курс на арганізацыю саўгасаў, якія ствараліся на базе многіх нацыяналізаваных памешчыцкіх маёнткаў, працягваўся ў губерні і пазней. Многія ж сяляне, якія востра адчувалі патрэбу ў зямлі, яе не атрымалі, што па сутнасці было ігнараваннем Дэкрэта аб зямлі. Толькі 24 мая 1920 г. ЦК КП (б) ЛіБ прыняў «Тэзісы па аграрным пытанні», у адпаведнасці з якімі пад саўгасы магло адводзіцца не больш як 25 працэнтаў былых памешчыцкіх маёнткаў. Астатні свабодны фонд непрацоўных зямель павінен быць размеркаваны бясплатна сярод беззямельных і малазямельных сялян і батракоў.

Але вырашэнне пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва рэспублікі было спынена ў сувязі з польскай інтэрвенцыяй. У лютым 1919 г. войскі буржуазнай Польшчы пры падтрымцы амерыканскіх, англійскіх і французскіх імперыялістаў уварваліся на тэрыторыю Беларусі. У многіх паветах, у тым ліку і Бабруйскім, было ўведзена ваеннае становішча. Аднак затрымаць наступленне інтэрвентаў не ўдалося, сіл на Заходнім фронце было недастаткова. Урад Літбел ССР і рэспубліканскія партыйныя органы вымушаны былі ў канцы красавіка пераехаць у Мінск. Да сярэдзіны ліпеня 1919 г. тры чвэрці тэрыторыі Літбела ССР былі акупіраваны інтэрвентамі. Адбылася рэарганізацыя ўрада рэспублікі, які перадаў кіраўніцтва свабоднымі ад польскіх акупантаў паветамі Мінгубрэўкому. Амаль месяц працягваліся баі на подступах да Мінска, і 8 жніўня горад быў захоплены польскімі войскамі. Мінгубрэўком у канцы ліпеня пераехаў у Бабруйск. Але ў наступным месяцы ваеннае становішча ў рэспубліцы настолькі ўскладнілася, што горад і павет у канцы жніўня аказаліся ў руках белапалякаў, якія мелі вялікую перавагу ў жывой сіле і тэхніцы.

На захопленай тэрыторыі польскія інтэрвенты знішчалі ўсё тое, што было зроблена за кароткі час савецкай уладай: адмяняліся яе дэкрэты, забаранялася дзейнасць савецкіх устаноў, былым гаспадарам вярталіся нацыяналізаваныя прадпрыемствы і канфіскаваная маёмасць.

Акупанты ўстанавілі рэжым палітычнага бяспраўя, гвалту і рабунку. Масавым разбоем вызначалася іх гаспадаранне ў Бабруйскім павеце. Мясцовае насельніцтва прымушалі карыстацца толькі польскай мовай, а хто яе не ведаў, пазбаўляліся працы. Акупанты рабавалі жыхароў вёскі, вывозілі ў Польшчу абсталяванне, харчовыя прадукты, сыравіну, лесаматэрыялы.

У час польскай акупацыі партыйныя органы накіравалі на захопленую тэрыторыю для разгортвання падпольнай работы вялікую колькасць камуністаў. У Бабруйску і павеце са жніўня 1919 г. да ліпеня 1920 г. дзейнічаў Бабруйскі падпольны камітэт КП(б) ЛіБ, які быў выбраны за некалькі дзён да акупацыі. У яго склад увайшлі Я.Готліб (партыйны псеўданім Райскі), С.Заводнік і М.Ляўкоў. Для арганізацыі партыйнай работы на вёсцы быў створаны батрацкі цэнтр у складзе Гулякевіча, Лук'янчыка, Шапіры, Юркевіча.

У кастрычніку 1919 г. для ўмацавання кіраўніцтва падпольнай работай у Бабруйск з Беластока быў накіраваны Ф.Л.Каменскі (партыйны псеўданім Фалк), потым са Смаленска прыбылі рабочы, член партыі з 1905 г. П.П.Фёдараў (партыйны псеўданім Пятроў-Дняпроўскі) і 23-гадовая работніца М.А.Браніна (партыйны псеўданім Баброва). Яны ўвайшлі ў склад камітэта, які ўзначаліў Каменскі.

Партыйны камітэт разгарнуў шырокую дзейнасць у тыле ворага. Актыўна працавала падпольная камсамольская арганізацыя на чале з М.Гальштэйнам. У Глуску і Ясені былі створаны падпольныя склады бальшавіцкай літаратуры, сярод насельніцтва павета распаўсюджваліся друкаваныя лістоўкі. У канцы 1919 г. пад кіраўніцтвам партыйнага камітэта ў павеце дзейнічала 15 падпольных сялянскіх партыйных ячэек. Бабруйская падпольная партыйная арганізацыя наладзіла сувязь з Мінскай, Рагачоўскай, Быхаўскай, Слуцкай і іншымі падпольнымі партыйнымі арганізацыямі, з Палескім камітэтам РКП(б), з падпольшчыкамі Украіны і Літвы.

У тыле акупантаў ствараласа разгалінаваная сетка партызанскіх атрадаў. Адказным за гэту работу быў прызначаны Максім Ляўкоў, які пазней узначаліў адзін з партызанскіх атрадаў у Бабруйскім павеце. Восенню партызанскі рух значна пашырыўся. Актыўна дзейнічалі атрады Аляксандра Салаўя, Ігната Жынко, Максіма Уса, Андрэя Падуты. У атрадзе імя III Інтэрнацыянала, камандзірам якога быў Андрэй Пуцята, партызанілі многія сяляне з глускіх вёсак. Гэта браты Майсей і Тарас Патапенкі, Цярэнцій Голуб, Іван Лях, Яўсей Падаляк, Лявонцій Падаляк, Феадосій Падаляк з Зелянковіч, Ігнат Лугін з Бабірова і інш.

З партызанскіх атрадаў Рудабельскай воласці і воласцей Рагачоўскага павета, што з ёй межаваліся, Бабруйскі падпольны камітэт сфарміраваў асобы партызанскі батальён імя Бабруйскага рэўкома, у якім налічвалася 600 байцоў. Быў створаны штаб партызанскага руху на чале з С.Л.Вілюгам. Аб'яднанне сіл павысіла баяздольнасць партызан, дало магчымасць весці баявыя дзеянні супраць буйных часцей акупантаў. Вось што расказваў пра адну з аперацый асобага партызанскага батальёна імя Бабруйскага рэўкома яго камандзір С.Л.Вілюга: «У пачатку снежня 1919 г. акупанты захапілі мястэчка Парычы, а таксама в. Казлоўка і пачалі рабаваць мірнае насельніцтва. Бабруйскі рэўком загадаў батальёну выбіць захопнікаў з занятых імі пунктаў. 13 снежня батальён выйшаў на аперацыю. Ноччу, пасля старанной разведкі, батальён падышоў да мястэчка Парычы, раптоўна напаў на гарнізон і разграміў яго. Многія былі забіты, астатнія ў паніцы ўцяклі ў Бабруйск. Партызаны захапілі шмат зброі».

Партызанскія атрады ўзаемадзейнічалі з часцямі Заходняга фронту. Штаб фронту каардынаваў іх дзеянні, дапамагаў фарміравацца, набываць узбраенне, распрацоўваць планы баявых аперацый. Сумеснымі намаганнямі чырвонаармейцаў і партызан з верасня 1919 г. і да другой палавіны студзеня 1920 г. утрымлівалася левабярэжжа Пцічы. Гарнізонную службу неслі сяляне і батракі. Атрады партызан нападалі на польскія часці, знішчалі жывую сілу, захоплівалі зброю і прадукты.

У пачатку лістапада 1919 г. партызаны сумесна з чырвонаармейцамі атрымалі загад захапіць в. Зубарэвічы. Галоўныя сілы праціўніка знаходзіліся ў в. Бярозаўка. Нападбыло вырашана зрабіць ноччу. Чырвонаармейцы наступалі з фронту, а партызаны занялі рубеж паміж Зубарэвічамі і Бярозаўкай. Палякі, выбітыя з Зубарэвіч, кінуліся ўцякаць па шляху да Бярозаўкі, дзе іх агнём сустрэлі партызаны. У гэтым баі было знішчана многа белапольскіх салдат.

Студзеньскія трыццаціградусныя маразы значна скоўвалі дзеянні партызан. У гэты час белапалякі вырашылі нанесці сакрушальны ўдар. У ноч з 14 на 15 студзеня яны кінулі ў бой з партызанамі часць колькасцю 1500 чалавек, з артылерыяй і трыццаццю кулямётамі. Бой быў няроўны, вораг значна пераўзыходзіў партызан у зброі і жывой сіле. У гэтым баі партызаны вымушаны былі адступіць, але і палякі страцілі больш за 150 чалавек. Захапіўшы вёскі, інтэрвенты пачалі дзікую расправу над насельніцтвам. Яны падпальвалі сялянскія хаты, а жыхароў, якія выбягалі з агню, расстрэльвалі. Застаўшыхся ў жывых адпраўлялі ў Бабруйскую крэпасць. Захопленых партызан ворагі люта каралі. На грудзях жывога Зіновія Раговіча легіянеры выразалі чырвонаармейскую зорку, выкалалі вочы, адрэзалі язык і затым пасеклі на часткі.

Акупанты не раз імкнуліся задушыць партызанскі рух. Але супраціўленне захопнікам мацнела з кожным днём. Ні карныя экспедыцыі, ні дзеянні правакатараў, ні рэпрэсіі супраць мірных жыхароў — нішто не магло спыніць усенародную барацьбу супраць чужынцаў.

Да вясны 1920 г. былі створаны партызанскія атрады ў вёсках Радуцічы, Сімана-

вічы, Паставічы, Фалічы і шэрагу іншых. Гэта населеныя пункты, якія размешчаны каля шашы і каля мастоў цераз р.Пціч. Партызаны знішчалі лініі сувязі, спальвалі масты, захоплівалі склады з боепрыпасамі. Так партызанамі былі знішчаны масты цераз р. Пціч у вёсках Бярозаўка і Халопенічы.

У красавіку 1920 г. у час павятовай партыйнай канферэнцыі, якая была добра заканспіравана, польскім жандарам удалося напасці на след падпольшчыкаў. У 3 гадзіны дня, калі канферэнцыя пачалася ўжо і анкеты дэлегатаў былі запоўнены сапраўднымі імёнамі, наляцела польская жандармерыя. Былі арыштаваны члены камітэта Баброва, Каменскі і Фёдараў. Апошні цаной свайго жыцця даў магчымасць уцячы астатнім удзельнікам канферэнцыі і паспеў знішчыць партыйныя дакументы. Патрыётаў кінулі ў турму, катавалі іх і, не атрымаўшы ніякіх звестак, расстралялі.

Падпольны партыйны камітэт у маі зноў пачаў дзейнічаць пад старшынствам Блюменталя. У яго складзе былі і бундаўцы, якія заявілі аб сваёй падтрымцы камуністычнай дактрыны. Але і новы састаў камітэта неўзабаве быў арыштаваны і 7 мая 1920 г. расстраляны.

Акупанты нанеслі ўдар і па камсамольскім падполлі: найбольш актыўныя яго прадстаўнікі таксама былі схоплены і знішчаны. Таварышы адпомсцілі за іх смерць: пусцілі пад адхон цягнік з боепрыпасамі і забілі некалькіх польскіх афіцэраў. Але барацьба не спынялася. У горадзе і вёсках хадзілі па руках лістоўкі, па начах грымелі выбухі. Гэта дзейнічалі партызаны. Яны, як і раней, нападалі на склады, узрывалі масты, разбіралі чыгуначнае палатно, псавалі тэлеграфныя правады. У адной са зводак савецкага камандавання гаварылася аб тым, што ў канцы мая 1920 г. у Глуску чатыры дні дзейнічала савецкая ўлада. Толькі карная экспедыцыя «аднавіла становішча». У многіх месцах успыхвалі сялянскія паўстанні.

У маі камандаванне Заходняга фронту распрацавала план ваенных дзеянняў, яму была аказана велізарная дапамога. Асабовы састаў павялічыўся, войскі папоўніліся ўзбраеннем, боепрыпасамі, абмундзіраваннем і рыштункам. Такім чынам, былі створаны ўмовы для паспяховых наступальных аперацый. І ў пачатку ліпеня пачалося іх ажыццяўленне.

Калоны адступаючых палякаў неўзабаве запоўнілі Глуск. Ноччу 8 ліпеня пады шоў батальён 1-га Пазнанскага палка з кулямётнай камандай і батарэяй. Белапалякі размясціліся ў цэнтры базарнай плошчы і прыступілі да грабяжу і насілля. Яны ўрываліся ў дамы, збівалі людзей, забіралі ўсё, што трапляла пад руку, гвалтавалі жанчын і дзяўчат. Рабаванне і здзекі працягваліся ўвесь наступны дзень. Салдаты расцягнулі ўсё, што было ў крамах, а вечарам каля 80 крам падпалілі.

Першыя банды гэтым жа вечарам змяніў 4-ы Пазнанскі полк, вядомы сваімі грабяжамі і разбоем. Але рабаваць ужо не было чаго. Гэта выклікала яшчэ большую лютасць ворагаў. І яе спагналі на мірных жыхарах.

Спецыяльны атрад легіянераў, сагнаўшы на плошчу гараджан, прымусіў іх секчы тэлеграфныя і тэлефонныя слупы. Працавалі ноччу. Канвойныя прыкладамі і дубінкамі збівалі працуючых. Урэшце, каб канчаткова замучыць людзей, загадалі адным капаць ямы, а другім — тут жа іх закопваць. Затым канваіры запатрабавалі развесяліць іх песнямі. Пасля многіх здзекаў жыхароў, нарэшце, адпусцілі дамоў. Падобныя зверствы і здзекі былі ўчынены ў іншых захопленых белапалякамі вёсках.

Але панаванню акупантаў наступіў канец. Раніцай 10 ліпеня пад ударамі Мазырскай групы польскія войскі пакінулі Бабруйск, прыйшло вызваленне ў іншыя мясціны павета. А неўзабаве ўся тэрыторыя Беларусі была ачышчана ад акупантаў.

Т.А.Матусевіч.

Не скарыўся ворагам герой-патрыёт

Бацька яго быў героем Шыпкі. Ён вызначыўся пры абароне Шыпкінскага перавалу праз Балканы і штурме крэпасці Плеўны ў час руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. Яго магутныя грудзі ўпрыгожвалі Георгіеўскі крыж і медалі, якія ён атрымаў за праяўленыя мужнасць і гераізм. Аднавяскоўцы паважалі яго, дзеці ганары-

Л.Ф.Малаковіч.

ліся сваім бацькам. Ім ён завяшчаў самае дарагое — любіць Радзіму і не даваць яе нікому ў крыўду.

Лука Фядосавіч Малаковіч добра памятаў свайго бацьку і сваю клятву: быць дастойным чалавекам, годным бацькоўскай славы. У гады 1-й сусветнай вайны Лука Малаковіч ваяваў у складзе лейб-гвардыі Паўлаўскага палка. У1916 г. Лука атрымаў цяжкія раненні. На яго грудзях у гэты час ужо красаваліся тры Георгіеўскія крыжы — адзін чацвёртай і два трэцяй ступеней. Малаковіч быў залічаны ў сёмую роту запаснога батальёна, які размяшчаўся ў Петраградзе. Гэта рота 26 лютага 1917 г. першай перайшла на бок рэвалюцыі. А здарылася гэта так. Салдаты, даведаўшыся, што вучэбная каманда іх палка будзе накіравана для ўціхамірвання дэманстрантаў і, магчыма, прыменіць зброю, абурыліся. Яны спрабавалі ўгаварыць салдат вучэбнай каманды адмовіцца выконваць гэты загад, але тыя не згадзіліся. І тады сёмая рота захапіла боепрыпасы з цэйхгаўза і выступіла ў абарону паўстаўшага народа.

Адбылася перастрэлка салдат роты з гарадавымі і паліцэйскімі на набярэжнай Екацярынінскага канала на Неўскім праспекце. У хуткім часе для падаўлення паўстаўшых былі выкліканы салдаты Праабражэнскага палка. Яны акружылі паўлаўцаў і загналі іх назад у казармы. Але больш за два дзесяткі салдат з сёмай роты паспелі далучыцца да калоны рабочых. А 19-га ноччу зачыншчыкі беспарадкаў былі арыштаваны і накіраваны ў турму Трубяцкога бастыёна Петрапаўлаўскай крэпасці.

28 лютага арыштаваных салдат-паўлаўцаў вызвалілі рабочыя-дружыннікі і з крыкамі «Ура» вынеслі іх на руках з варот крэпасці.

У ліку першых Малаковіч уварваўся ў Зімні палац у малую сталовую, дзе заселі міністры Часовага ўрада. Яны потым былі арыштаваны і накіраваны ў Петрапаўлаўскую крэпасць.

У лютым 1918 г. Л.Ф.Малаковіч, як і тысячы іншых рэвалюцыйных салдат-петраградцаў, быў накіраваны бальшавікамі для ўстанаўлення савецкай улады ў пралетарскія цэнтры. Так воляй лёсу ён апынуўся ў Магілёве, потым шлях ляжаў на Бабруйск. Адпраўляючыся ў павятовы цэнтр, у гэты час ужо заняты польскімі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, Лука Фядосавіч вёз пад двайным насцілам саней рэвалюцыйную літаратуру для бабруйскіх падпольшчыкаў. Ён выконваў многія даручэнні падпольнага камітэта партыі і многае зрабіў для таго, каб нямецкія акупанты хутчэй пакінулі яго родныя мясціны і была ўсталявана савецкая ўлада.

Л.Ф.Малаковіч прыклаў шмат сіл і энергіі для стварэння ў Бабруйскім павеце рабоча-сялянскай міліцыі. Сам ён у той час працаваў першым намеснікам начальніка міліцыі, затым інструктарам па ўсенавучу Бабруйскага павета. Ён арганізаваў першы камбед у в. Зубарэвічы. Камбедаўцы правялі канфіскацыю маёмасці бярозаўскага памешчыка Лянкевіча і глускай памешчыцы Беразоўскай.

Глушчына зноў стагнала пад каванымі ботамі чужынцаў. Белапалякі ў Зубарэвічах арыштавалі жонку Лукі Малаковіча Параску і яго маці Раісу Антонаўну. Над імі доўга здзекаваліся, падвешвалі на вяроўцы, каб даведацца што-небудзь пра Луку. Але дарэмна. У студзені 1920 г. белапалякам усё ж удалося высачыць Малаковіча і схапіць. Па даносе кулака Р.Шульгі з в. Зубарэвічы ён быў арыштаваны і дастаўлены ў Глуск. Шмат здзекаў давялося вытрымаць мужнаму патрыёту. Колькі разоў прывозіў Луку на допыты ў Зубарэвічы начальнік зубарэвіцкага гарнізона паручнік Кіеўскі, каб прымусіць расказаць, з кім ён трымае сувязь, назваць імёны падпольшчыкаў. Але Малаковіч нікога не выдаў. Ён трапіў у Бабруйскую крэпасць, дзе трымалі чырвонаармейцаў, а таксама асоб палітычна ненадзейных. Калі Чырвоная Армія прагнала акупантаў, Л.Ф.Малаковіч прыйшоў з палону дамоў. Крыху паправіўшы здароўе, зноў узяўся за

добра знаёмыя справы: арганізацыю Саветаў, барацьбу з разрухай, стварэнне сельскагаспадарчых арцеляў, камун. У 1931 г. ён узначаліў калгас у в. Зубарэвічы. Супраць калектывізацыі ўзняліся мясцовыя кулакі на чале з С.Ц.Харытановічам, які пазней, у час Вялікай Айчыннай вайны, пайшоў служыць у паліцыю.

Вялікая Айчынная вайна застала Л.Ф.Малаковіча ў Ляскавічах, дзе ён працаваў сакратаром партарганізацыі маслазавода. Калі тэрыторыя раёна была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Малаковіч разам з іншымі камуністамі партарганізацыі стварыў баявую групу, якая ў далейшым стала ядром партызанскага атрада імя Чапаева.

Вясной 1942 г. Лука Фядосавіч цяжка захварэў. З атрада яго даставілі дамоў у в. Забалацце, разлічваючы, што тут ён хутчэй акрыяе. Але , відаць, хтосьці выдаў Малаковіча. Ноччу ў хату ўварваліся немцы і

Г.П.Караткевіч.

схапілі хворага. Нічога не дабіўшыся ад Малаковіча, фашысты расстралялі яго ў в. Ляскавічы.

Лука Фядосавіч быў пахаваны ў в. Забалацце. У памяць аб гэтым чалавеку на адным з будынкаў в. Зелянковічы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

М.Бакіноўскі, І.Фядосаў.

Першыя камсамольцы

... Канец 1918 года. Бабруйскі павет, у які ўваходзіла і Глуская воласць, за гэты год перажыў не адно нашэсце чужынцаў.

У апошнія месяцы нямецкай акупацыі склалася і пачала дзейнічаць патрыятычная група сярод навучэнцаў г. Бабруйск. Яе ўзначаліў Васіль Падбярозны, жыхар м. Глуск, які ў гэты час вучыўся ў 7-м класе Бабруйскай гімназіі.

Прадстаўнікі перадавой рэвалюцыйна настроенай моладзі змагаліся супраць інтэрвентаў, збіралі звесткі пра акупантаў і перадавалі іх падпольшчыкам, выпускалі лістоўкі, праводзілі тайныя сходкі, дзе заклікалі моладзь весці барацьбу з інтэрвентамі.

Калі павет быў вызвалены ад нямецкіх акупантаў, пачаў шырыцца рух за стварэнне камсамола. Група Васіля Падбярознага стала ядром новай маладзёжнай арганізацыі, якая арганізацыйна аформілася на агульным сходзе моладзі г. Бабруйск і павета. Сход гэты быў сабраны па ініцыятыве Бабруйскага павятовага камітэта РКП(б). На ім старшыня Бабруйскага рэўкома Платон Фёдаравіч Равінскі звярнуўся да маладых хлопцаў і дзяўчат з заклікам актыўна дапамагаць савецкай уладзе ў пабудове новага грамадства.

— Сёння вы бачыце вакол разруху, перажываеце голад і холад, — горача казаў П.Ф.Равінскі, звяртаючыся да залы. — Але мы, бальшавікі, з усім гэтым справімся абавязкова, і прыйдзе новае, лепшае жыццё, у яго ўсталяванні дапаможаце нам вы, камсамольцы.

Моладзь выбрала павятовы камітэт камсамола, прыняла Праграму і Статут.

У павятком увайшлі М.І.Гальштэйн, Г.П.Караткевіч, А.Я.Станкевіч, М.Р.Адзінец, Я.Х.Ізакаў, В.Волкаў і інш. Першым сакратаром камітэта быў выбраны М. І. Гальштэйн.

Яшчэ не скончылася грамадзянская вайна, і камсамольцы лічылі сваім абавязкам змагацца разам са старэйшымі за свабоду і незалежнасць Айчыны. Многія з іх пайшлі на фронт. А 28 жніўня 1919 г. павет захапілі палякі. Барацьба з ворагам працягвалася ў падпольных умовах. Больш за 20 камсамольцаў улілося ў рады падпольшчыкаў. Сярод іх былі Васіль Падбярозны і Сцяпан Шэйка. За час польскай акупацыі камсамольцы многае зрабілі. Яны выконвалі даручэнні партыйнага падполля, здабывалі для партызан разведданыя, распаўсюджвалі ў горадзе лістоўкі, газеты «Звязда», «Молат», якія

з'яўляліся спецыяльным агітацыйным выданнем для польскіх салдат.

Але ў падпольную партыйную арганізацыю пранік правакатар. Пачаліся масавыя арышты, многія члены падпольнага камітэта партыі і камсамольцы былі схоплены. У засценках Бабруйскай крэпасці апынуліся Васіль Падбярозны, Сцяпан Шэйка, М. Гальштэйн і іншыя найбольш актыўныя ўдзельнікі камсамольскага падполля.

Вось што пісаў у сваіх успамінах першы старшыня Глускага местачковага выканкома, адзін з арганізатараў партызанскага руху ў 1918 г. у трохкутніку Глуск — Старыя Дарогі — Асіповічы Арон Мееравіч Райхман:

«Васіль Падбярозны быў яшчэ зусім маладым, вучыўся, здаецца, у Бабруйскай прагімназіі і заўсёды хадзіў з кніжкамі ў руках. Жыў ён на Слабодскай вуліцы, на кватэры ў нейкага Мядзьведзева, жонка якога была родам з Глуска. Кіраваў падпольнай работай, падтрымліваў сувязь з усімі глускімі таварышамі, якія аказаліся ў Бабруйску. Жыхар Глуска Юркевіч Піліп Васільевіч таксама знаходзіўся на нелегальным становішчы.

У пачатку 1920 г. польская жандармерыя ўчыніла ў горадзе масавыя арышты многіх рэвалюцыйных актывістаў, у тым ліку арыштавала і Васіля Падбярознага. Па прыгаворы белапольскага ваенна-палявога суда ён, як і многія іншыя падпольшчыкі, быў расстраляны». Сярод загінуўшых М.Гальштэйн, Сцяпан Шэйка і іншыя камсамольцы.

10 ліпеня 1920 г. Бабруйскі павет быў вызвалены ад белапалякаў. Камсамольцы разам з дарослымі ўзяліся за мірныя справы: дапамагалі ствараць школы, выязджалі ў вёскі, арганізоўвалі канцэрты, вучылі сельскіх хлопцаў і дзяўчат грамаце, збіралі для байцоў Чырвонай Арміі адзенне, абутак, махорку і іншыя неабходныя ў армейскім побыце рэчы.

У канцы 1920 г. у павяткоме пачала працаваць інструктарам Вера Харужая. Яна не раз бывала ў Глускай воласці, праводзіла з моладдзю сходы, сустрэчы, дапамагала наладжваць канцэрты, вяла работу па арганізацыі на Глушчыне камсамола.

Нястомным арганізатарам і выканаўцам розных тэатральных сцэнак і спектакляў быў Георгій Караткевіч, сын Піліпа Мацвеевіча Караткевіча, вядомага нашага земляка. Георгій быў адным з найбольш здольных камсамольскіх работнікаў, умелым арганізатарам моладзі ў вёсцы. У гэтым яму вельмі дапамагалі някепскія артыстычныя здольнасці. У 1928 г. Глуск наведаў Беларускі вандроўны тэатр Галубка. Уладзіслаў Іосіфавіч, выдатны драматург, акцёр і рэжысёр, прыкмеціў здольнага хлопца, які за некалькі дзён пасябраваў і зблізіўся з артыстамі, і прапанаваў Георгію ехаць разам. Хлопец быў вельмі рады. Беларускі вандроўны тэатр, які набыў у той час шырокую вядомасць, заваяваў сімпатыі людзей, вёў вялікую культурна-асветніцкую работу сярод працоўных. Яго агітбрыгады ўдзельнічалі ва ўсіх кампаніях, што праводзіліся ў вёсцы. Па ўсёй Беларусі раз'язджаў і Георгій Караткевіч, але артыстам ён не стаў, а звязаў свой лёс з арміяй.

Вось такімі былі першыя камсамольцы Глушчыны — таленавітыя, мужныя, працавітыя. Не патрабуючы нічога для сябе, яны вельмі клапаціліся аб лёсе краіны і зусім не думалі пра тое, як увайсці ў гісторыю.

Т.А.Матусевіч.

Кветкі як памяць аб мужнасці

Кожны, хто праходзіў або праязджаў па дарозе, што злучае Бярозаўку і Зубарэвічы, не мог не заўважыць з левага боку ад яе высокі помнік. Гэта памяць аб тых, хто ў далёкія гады грамадзянскай вайны змагаўся з ворагамі і аддаў сваё жыццё за савецкую ўладу.

... 1918 год. Перадавыя людзі в. Зубарэвічы Міхаіл Фільчанка, Сідар Чурун, Лука Малаковіч, Харытон Малаковіч і іншыя арганізавалі камітэт сялянскай беднаты, які аб'яднаў народ на барацьбу супраць кулакоў і памешчыкаў і заклікаў моладзь уступаць у рады Чырвонай Арміі. Многія жыхары Зубарэвіч пайшлі на фронт, каб змагацца з белапалякамі і салдатамі кайзераўскай Германіі. Яны служылі ў Слуцкім добраахвотніцкім батальёне. Калі ж родныя мясціны апынуліся ў руках белапольскіх акупантаў, многія з добраахвотніцкага батальёна перайшлі ў падполле і ўключыліся ў партызанскую барацьбу.

Аднойчы цёмнай студзеньскай ноччу 1920 г. партызаны пад камандаваннем жыхара в. Зубарэвічы Анікея Кандратавіча Сяленчыка напалі на гарнізон белапалякаў, які размяшчаўся ў іх роднай вёсцы. Частка партызан атакавала ўмацаванні ворага ва ўрочышчы Гара паміж Зубарэвічамі і Бярозаўкай. Другая частка зняла ўсе варожыя пасты і зайшла ў Зубарэвічы. Палякі, якіх атака застала знянацку і якіх не дагналі партызанскія кулі, адступілі ў Бярозаўку. Большасць гарнізона загінула. Белапалякі былі выбіты і з умацаванняў каля ракі. Але пры гэтым загінулі 12 партызан. Камандзір атрада Анікей Сяленчык быў цяжка паранены. Паўзком дабіраўся ён да Зубарэвіч, але заўважыў і застрэліў яго халуй памешчыка Лісоўскага Андрэй Шастаковіч.

Пазней, у жніўні 1920 г., кулакі забілі яшчэ аднаго актыўнага барацьбіта за савецкую ўладу Яўсея Сідаравіча Чуруна, які быў членам атрада харчразвёрсткі ў Брожскай воласці. Яго схапіла кулацкая банда Караткевіча і па-зверску расправілася.

Лістападам адшумеў не адзін дзесятак гадоў. Са старой гвардыі тых, хто змагаўся з ворагамі савецкай улады ў першыя гады яе станаўлення, нікога не засталося ў жывых. Але ў Зубарэвічах і сёння помняць Ціхана Якаўлевіча Сяленчыка, Дзяніса Навумавіча Фільчанку, Мікалая Іосіфавіча Фільчанку і іншых змагароў за народнае шчасце. Жыхары вёскі наведваюць магілу сваіх мужных аднавяскоўцаў, загінуўшых ад рук белапалякаў у далёкім дваццатым годзе. Тут заўсёды гараць чырванню кветкі.

П.Дз.Малаковіч.

І.Малаковіч.

Ён умеў пераадольваць цяжкасці

МАЛАКОВІЧ Пракоп Дзянісавіч (20.7.1895—26.9.1937), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады грамадзянскай вайны, дзяржаўны дзеяч БССР.

Нарадзіўся ў в. Зубарэвічы Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Член КПСС з 1917 г. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. Вёў рэвалюцыйную работу сярод салдат Асобай і 2-й армій Паўднёва-Заходняга фронту, у 1917 г. старшыня палкавога камітэта. Адзін з арганізатараў ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу Доўбар-Мусніцкага і барацьбы супраць нямецкіх акупантаў у Бабруйскім павеце. У 1918—1920 гг. ваенны камісар Бабруйскага, Дарагабужскага паветаў, ваенны камісар сувязі Заходняга фронту. З 1920 г. старшыня Бабруйскага павятовага выканкома, з 1922 г. нарком унутраных спраў БССР, з 1923 г. старшыня Амурскага губрэўкома, выканкома. З 1927 г. старшыня Гомельскага акруговага камітэта КП (б)Б. З 1931 г. у наркамаце сувязі СССР. Член ЦБ КП(б)Б у 1922—1923 гг. і ЦК КП (б)Б у 1927—1930 гг., кандыдат у члены Бюро ў 1928 г. і член Бюро ЦК КП(б)Б у 1929—1930 гг. Член ЦВК БССР у 1920—1923 гг. і 1927—1931 гг. ,кандыдат у члены Прэзідыума ЦВК БССР у 1927—1929 гг.

Імем П.Дз.Малаковіча названа вуліца ў г. Бабруйск.

З успамінаў Ціта Макаравіча Тоўсціка

Жыццё, поўнае веры ў светлыя ідэалы, пражыў Пракоп Дзянісавіч Малаковіч. Нарадзіўся ён і вырас у сям'і селяніна-беднякa, дзе ніколі не хапала хлеба, жылі, перабіваючыся з бульбы на квас ды лебяду. У дзяцінстве хлопчык пасвіў памешчыцкую жывёлу, спаўна зведаў гора, нястачу і галечу.

На працягу дзесяці гадоў працаваў я побач з Пракопам Дзянісавічам. Усе ведалі яго як ініцыятыўнага, рашучага, энергічнага работніка. Памятаю, у пачатку красавіка 1918 г. прабіраліся мы з Рудабелкі ў Бабруйск. У в. Зелянковічы падышлі да групы сялян, і Малаковіч пачаў расказваць, чаго дабіваецца савецкая ўлада і што нясуць працоўнаму народу польскія легіянеры. А яны ў гэты час рыскалі па вёсках і жорстка распраўляліся з тымі, хто спачуваў новай уладзе. Тут жа Малаковіч параіў сялянам хаваць ад легіянераў хлеб і жывёлу, пачаў заклікаць, каб уступалі ў партызанскі атрад, які фарміраваўся ў Рудабелцы пад камандаваннем Аляксандра Салаўя.

Малаковіч быў выдатным агітатарам і прамоўцам, мог «запаліць» слухачоў простым даходлівым словам. Арганізацыйныя здольнасці Малаковіча праяўляліся ў любой справе: ці была то работа ў Рудабельскім, а потым у Бабруйскім рэўкоме, ці фарміраванне першых падраздзяленняў Чырвонай Арміі. Менавіта пры яго непасрэдным удзеле былі сфарміраваны два батальёны, па сутнасці, першыя часці чырвонаармейцаў у Бабруйскім гарнізоне, якія ўзначалілі партызанскія камандзіры Сцяпан Жынко і Аляксандр Салавей. У час вайны з белапалякамі бабруйскія батальёны ўвайшлі ў склад 10-га Мінскага палка, якім пазней камандаваў А.Салавей.

У пачатку сакавіка 1919 г. у Гомелі нечакана паўсталі супраць савецкай улады 67-ы і 68-ы пяхотныя палкі. Арганізавалі мяцеж царскі штабс-капітан Стракапытаў і палкоўнік Сцёпін. У небяспечны час для разгрому ворагаў рэвалюцыі быў тэрмінова накіраваны з Бабруйска атрад пад камандаваннем А.Салаўя. Малаковіч таксама быў у складзе гэтай групы. Ён камендант Жлобінскага баявога ўчастка, куды ўваходзілі, акрамя атрада бабруйчан, групы магілёўскіх маладых курсантаў, будучых камандзіраў, а таксама добраахвотнікі са Жлобіна і Рагачова. З Бранска на дапамогу ішла пяхотная дывізія на чале з Убарэвічам. Баявы і партыйны вопыт П.Дз. Малаковіча спатрэбіўся і тут. Ворагі не раз спрабавалі знішчыць нястомнага камісара.

У канцы 1920 г. на тэрыторыі Глускай вобласці пачала дзейнічаць банда Караткевіча. Бандыты вырашылі забіць Малаковіча. З гэтай мэтай яны накіравалі ў Бабруйск нейкага Кір'янава, сястра якога працавала машыністкай у ваенкамаце. Позна ўвечары, у дамоўлены час, Кір'янаў прыйшоў у ваенкамат і, калі яго хацелі затрымаць, выстраліў у Малаковіча, але прамахнуўся.

Неўзабаве пасля гэтага П.Дз. Малаковіч быў выбраны старшынёй павятовага выканаўчага камітэта. Але працаваць на гэтай пасадзе Пракопу Дзянісавічу давялося нядоўга. Ён быў выкліканы ў Мінск і прызначаны наркомам унутраных спраў Беларускай рэспублікі, а ў пачатку 1923 г. яго накіроўваюць на Далёкі Усход. Патрэбы тагачаснай сітуацыі прымушалі ўмацаваць Амурскі губернскі рэўком выдатнымі кадрамі. Тут Малаковічу давялося весці актыўную барацьбу з кулацтвам і бандытамі.

У гэты час я ўжо працаваў у Амурскім губернскім аддзеле АДПУ і быў сведкам той вялікай і цяжкай работы, якую праводзіў Малаковіч па барацьбе з бандытызмам і кулацтвам.

Праз некаторы час ЦК партыі накіраваў яго ў Гомель, дзе ён працаваў старшынёй акруговага выканкома і сакратаром акруговага камітэта партыі.

Мая апошняя сустрэча з Пракопам Дзянісавічам адбылася ў Маскве. Ён тады быў ужо членам калегіі Наркамата сувязі СССР. У гутарцы са мной Пракоп Дзянісавіч паскардзіўся, што ўмовы для працы вельмі цяжкія, пануе дух падазронасці.

Працуючы ў НКУС Казахскай ССР, я ў пачатку 1938 г. з болем у сэрцы даведаўся, што бальшавік-ленінец П.Дз.Малаковіч стаў ахвярай самавольства ў сакавіку 1937 г. П.Дз.Малаковіч быў неабгрунтавана рэпрэсіраваны.

Пасля XX з'езда КПСС Пракоп Дзянісавіч Малаковіч быў рэабілітаваны.

Успамінаюць паплечнікі

Жонка старшыні Бабруйскага рэўкома П.Ф.Равінскага:

Малаковіч быў мужным, моцным чалавекам з валявым характарам. Смелы і рашучы ў дзеяннях, праяўляў сябе пры гэтым і добрым аратарам. Быў душой рэўкомаўцаў, зараджаў іх сваёй энергіяй.

Русанаў К.М., бальшавік:

Пракоп Дзянісавіч карыстаўся велізарным аўтарытэтам сярод камуністаў і працоўных. У яго было дзіўнае ўменне знаходзіць здольных людзей, прыцягваць іх да актыўнай работы. Асаблівы клопат праяўляў ён аб кадрах, іх вучобе.

Многім рабочым і сялянскім хлопцам даў пуцёўку ў жыццё ваенны камісар Малаковіч. Так, у красавіку 1919 г. ён накіраваў мяне, Кірылу Арлоўскага і А.М.Рабцэвіча на курсы чырвоных камандзіраў у Мінск. Пазней многія з яго «хроснікаў» сталі ўмелымі камандзірамі, арганізатарамі вытворчасці. Асабліва праславіўся Кірыла Пракопавіч Арлоўскі.

П.Дз.Малаковіч быў арганізатарам мітынгу ў Бабруйску, на якім выступіў М.І.Калінін, наведаўшы ў чэрвені 1918 г. Беларусь з агітпоездам «Кастрычніцкая рэвалюцыя». Затым Малаковіч суправаджаў Калініна ў в. Гарбацэвічы на сустрэчу з сялянамі.

Загінуў ад рук бандытаў



С.Д.Багам'я.

Адгрымела грамадзянская вайна. Сямён Багам'я вярнуўся ў родныя Бабровічы. Тут нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і, тут жыў. Значыць, тут і новае жыццё будаваць. Ды і ўзрост ужо не так каб вельмі малады, як-ніяк пад трыццаць. Пара, нарэшце, і сям'ёй абзаводзіцца. Чаго ж дзесьці на старане шчасця шукаць? Тым больш што ўжо і наваяваўся ўдосталь: на франтах грамадзянскай амаль з першых жа дзён стварэння Чырвонай Арміі.

Вяскоўцы быццам ужо чакалі яго, амаль адразу выбралі старшынёй Савета. Маўляў, каму ж, як не табе, Сямён, займацца сельсавецкімі справамі. Праўда, паступова прыйшлося прывыкаць да больш паважлівага звароту — Сямён Данілавіч. Аднак да такіх «субардынацыйных» тонкасцей прызвычаіцца было не так і цяжка. Значна цяжэй да іншага: да варожых вылазак праціўнікаў савецкай улады, якія не давалі спакою людзям. Арганізоўваліся банды, якія распраўляліся з актывістамі, грабілі, падпальвалі... Былі такія банды і на тэрыторыі Бабруйскага павета.

Ці мог пры такой сітуацыі былы баецчырвонаармеец змірыцца з падобным становішчам? У адказ на павышаную дзейнасць ворагаў арганізуе Сямён Багам'я актыў вёскі на барацьбу з імі. Усё часцей і часцей ворагам савецкай улады прыходзілася туга.

Бандыты пайшлі на крайнюю меру: вырашылі расправіцца са старшынёй Савета, яго блізкімі, сваякамі. Зыходзілі з таго, што менавіта ён, Багам'я, вінаваты ва ўсіх іх няўдачах. І вось 28 жніўня 1922 г. нечакана напалі на Бабровічы. Налёт узначальваў сам верхавода банды Караткевіч. Уварваліся ў хату Багам'і, і Караткевіч выстраліў у Сямёна, параніў яго ў руку. А той, паспеўшы да гэтага схапіць рэвальвер, таксама стрэліў па бандыце. Сямён аказаўся больш трапным стралком, бо забіў Караткевіча напавал.

Але, на жаль, гэта быў апошні ў жыцці Багам'і выстрал. Бандыты хутка зрабілі тое, чаго не ўдалося іх атаману. Больш таго, затым яны расправіліся і са шваграм Сямёна, падпалілі вёску.

У барацьбе з бандытамі загінулі браты Сямёна — Трафім, Тарас і Апанас, некаторыя іншыя яго сваякі.

Пагаравалі, паплакалі аднавяскоўцы над смерцю Сямёна Данілавіча Багам'і. Адзінае, што маглі зрабіць яны для свайго першага старшыні сельскага Савета, — пахаваць як героя.

Вось як адазваўся на смерць Багам'і вядомы ў той час ва ўсёй Рудабелцы член ЦВК Беларускай ССР М.А.Ляўкоў: «Таварыш Багам'я Сямён Данілавіч, — пісаў ён, — як старшыня сельскага Савета ўсе свае сілы накіроўваў на выкараненне бандытызму. Сярод работнікаў Ляскавіцкай воласці т. Багам'я быў найбольш адданы і стойкі барацьбіт за справу кастрычніцкіх заваёў».

Памятае аб першапраходцы савецкай улады і сённяшняе пакаленне: пра С.Д.Багам'ю расказваюць матэрыялы, сабраныя ў Каткаўскім музеі баявой і працоўнай славы.

Ц.С.Яльчык.

Вы прасілі хлеба...

Каля дома з зялёнай бляшанай шыльдай «Глускі рэўком» спыніліся двое незнаёмых. Адзін з іх сярэдняга росту, каржакаваты, бялявы хлопец гадоў пад 27, другі — высокі, хударлявы, з чорнымі, як смоль, валасамі, якія выбіваліся з-пад вайсковай шапкі. На першы погляд, яму можна было даць гадоў за 40, але на самай справе ён быў значна маладзей. Відаць было, што чалавек багата перажыў за сваё жыццё, і гэта наклала адбітак на яго аблічча.

Увайшоўшы ў памяшканне, хлопцы ўбачылі мужчыну ў паўваенным фрэнчы, круглы смуглявы твар якога быў чыста паголены, а з-пад прыпухлых павекаў на наведвальнікаў з цікавасцю пазіралі пра-

нікнёныя вочы. Ён хутка падняўся і запрасіў хлопцаў сесці. Пазнаёміўшыся, яны даведаліся, што перад імі Іван Мазалеўскі, былы партызан. Назваліся і прыбыўшыя: старэйшы Смірновым, малодшы Саламаціным. Яны прыехалі з горада, каб правесці для галадаючых рабочых нарыхтоўку хлеба.

У гутарцы высветлілася, што хлеб у вёсках ёсць, але ж узяць яго цяжка. Кулакі, а таксама некаторыя сераднякі, паддаўшыся кулацкай агітацыі, хаваюць хлеб. Па лясах яшчэ бадзяюцца недабітыя балахоўцы, пагражаючы расправай усім, хто дапамагае мясцовым уладам, а тым больш, хто здае хлеб дзяржаве. Мазалеўскі параіў упаўнаважаным пабываць у бліжэйшых вёсках: Бярозаўцы, Жукавічах, Розлевічах, Побліне і Балашэвічах.

Так і развіталіся. Да вечара яны дабраліся да Бярозаўкі. Іх падводчык, высокі, дужы селянін, усю дарогу ціха расказваў аб жыцці ў вёсцы, аб тым, што хлеба ў іх няма. Калі сілай прымусяць, можна даць пудоў некалькі, а добраахвотна — не. У сельсавеце сакратар Малаковіч Мішка, як усе тут звалі яго, сказаў, што пудоў па сем хлеба на гаспадарку сяляне могуць даць, а некаторыя і больш.

Увечары адбыўся сход. Народу прыйшло шмат: людзі стаялі і сядзелі, некаторыя нават на падлозе. Малаковіч пазнаёміў прысутных з прыехаўшымі. Смірноў расказаў сялянам пра задачы, якія стаяць перад маладой савецкай рэспублікай у горадзе і вёсцы, пра цяжкасці ў аднаўленні разбуранай грамадзянскай вайной народнай гаспадаркі. Асабліва цяжка рабочым. У Паволжы засуха. Рабочыя і іх сем'і галадаюць. У вёсцы ёсць хлеб, сяляне могуць і павінны даць лішкі хлеба гораду. Ад гэтага залежыць поспех сацыялістычнага будаўніцтва.

Сяляне, як маглі і ўмелі, выказвалі свае думкі. Яны вырашылі: калі патрэбна іх дапамога, дык яны акажуць яе.

Назаўтра фурманкі з хлебам адправіліся на станцыю Ратміравічы. Так было і ў іншых вёсках Бярозаўскага сельсавета.

У Балашэвічах сяляне таксама не адмовіліся дапамагчы хлебам. Позна, пасля сходу, Смірноў і Саламацін, задаволеныя поспехамі, пайшлі адпачываць у гумно. Прыемна пахла сена сонцам і летам, і ад гэтага думкі былі лёгкія і ясныя. Сябры ціха гутарылі. Саламацін расказваў пра сваю вёску на Дняпры, саламяныя стрэхі на хатах. Успомніў сваю каханую, яе блакітныя, поўныя шчырасці вочы, сумныя-сумныя ў час развітання...

Сон асабліва моцны пад раніцу. Сябры не чулі, як у вёску падкраліся бандыты-балахоўцы. Здраднік паказаў, дзе яны начуюць. Ворагі спагналі ўсю сваю нянавісць над упаўнаважанымі: распаролі жываты, насыпалі туды зерня і пакінулі запіску: «Вы шукалі хлеба, вы яго знайшлі...»

***

Людзі памятаюць імёны загінуўшых. Іх астанкі былі перанесены з Глускага сквера, дзе спачатку былі пахаваны Смірноў і Саламацін, на брацкія могілкі ў Хваставічы. Тут, на помніку, што стаіць на брацкай магіле воінаў Савецкай Арміі, першыя ў спісе прозвішчы Смірнова і Саламаціна, упаўнаважаных па прадразвёрстцы, загінуўшых ад рук бандытаў.

Р.А.Корбут.

Дакументы сведчаць

З АРТЫКУЛА Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЕЗДА» «ЗДРАДА І ЗВЕРСТВЫ ПОЛЬСКІХ ПАНОЎ»

4 лістапада 1919 г.

Один товарищ, все время остававшийся в польской оккупации, собственными глазами видевший их подвиги, пишет нам следующее:

«Паны показали себя сразу вовсю. Так, например, быв. управляющий советского имения Холопиничи (Лясковичской вол.) Вандрович, конторщик этого имения Хацкевич, управляющий советскими имениями Хоромцы — Чирейс, быв. врач в одной из частей Красной Армии в г. Бобруйске Брзежовский, вернувшись в свое имение Слободка, и другие придираются к каждому крестьянину и служат польским белогвардейцам не за страх, а за совесть. Своей жестокостью особенно отличаются: бывший почтово-телеграфный работник при волости Раковец Емельян (село Кривоносы Осовецкой волости), некий Вержбицкий, сын рабочего им. Холопиничи (Лясковичской вол.) во время советской власти был в отряде при исполкоме, выдавая себя за ярого сторонника советской власти, ныне же один из преданнейших негодяев польских панов.

Шляхтичи местных волостей, в том числе и многие из зажиточных граждан — поповских сынков, по своей инициативе организовали особые отряды для борьбы против большевиков. Вождем этой организации является штабс-капитан Волк-Леонович из застенка Берково Лясковичской воласти.

З ДАКЛАДА ЧЛЕНА БАБРУЙСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА НАЧАЛЬНІКУ ТЫЛА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АБ ФАРМІРАВАННІ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ У ПАВЕЦЕ

26 лістапада 1919 г.

Сообщаю для вашего сведения, что Бобруйским ревкомом начато формирование партизанских отрядов еще до получения приказа №12 начальника тыла Западного фронта. Отряд начал формироваться 11 ноября 1919 г. и к настоящему дню имеется партизан 60 человек. Начальником партизанских отрядов по Бобруйскому у. назначен член Бобруйского ревкома тов. Вилюга помощником его тов. Пархимович (Федоров), член РКП(б), военспец. Имеется штаб из трех человек, партийных, надежных, хороших товарищей. Отряд принимал участие в разведках, давших хорошие сведения о противнике.

Имеется 2-й отряд на территории Бобруйского у. в Рудобельской вол., организованный тов. Левковым под названием «(отряд) Раскольникова». Этот отряд существует со дня эвакуации г. Бобруйска, много раз разбивал противника и не допустил вторжения противника на свою территорию... Число людей в отряде около 100 человек, до сих пор питавшегося на местные средства, не получавшего до настоящего времени никакой поддержки. Необходимо денежное пособие.

В срочном порядке вышлите все распоряжения, а также переведите кредит царскими деньгами, каковые необходимы для цели шпионажа и самих партизан, когда они отправляются в тыл противника.

Член Бобруйского революционного комитета,
начальник партизанских отрядов Вилюга

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов. Мн., 1971. Т.2. С.236-237.

З ДЫРЭКТЫВЫ КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ КАМАНДАВАННЮ МАЗЫРСКАЙ ГРУПЫ І 16-Й АРМІІ АБ ФАРСІРАВАННІ Р. БЯРЭЗІНЫ І ВЫХАДЗЕ НА ЛІНІЮ БАБРУЙСК—ГЛУСК

5 ліпеня 1920 г. 2 гадз. 45 хвіл. № 01932 оп—сек,Смоленск

Части Мозырской группы, успешно наступая, выходят на линию Паричи — Шкава — Курин, заняв левофланговыми частями м.Скрыгалов — Казимировка. Приказываю решительно развивать успех, для чего:

1. Командарму -16 левофланговыми частями форсировать р. Березину в районе м. Любовичи — Паричи, оказать содействие частям Мозырской группы.

2. Мозырской группе развивать главный удар в северо-западном направлении, 7 июля выйти на линию Бобруйск — Глуск — Лясковичи — Медухов, имея сильный правый фланг. Обеспечить свой левый фланг занятием района Старушки — Снядынь. О получении сего донести.

Командзап Тухачевский
Член Реввоенсовета Уншлихт
Наштазап Шварц

Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов. Мн., 1971. Т.2. С.353.

З ПАЛІТЫЧНАЙ ЗВОДКІ ПАЛІТАДДЗЕЛА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АБ ДЗЕЯННЯХ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ У БЕЛАРУСІ ЗА ПЕРЫЯД З 20 ЧЭРВЕНЯ ПА 1 ЛІПЕНЯ 1920 г.

6 ліпеня 1920 г.

10-я дивизия, 30-я бригада.

В игуменском направлении в тылу противника действуют партизанские отряды, в которых участвуют 70-летние старики. Одним из таких отрядов в районе Минска взорваны арт-

склады. В Рудобельских лесах успешно действуют партизаны. 28 мая в Глуске была на 4 дня восстановлена Советская власть; карательной экспедицией часть повстанцев расстреляна, многие арестованы (сведения не проверены). В м. Дукоры расстреляно 8 партизан. В Бобруйском и Слуцком у. отмечаются массовые случаи порчи телеграфных проводов и шоссе. Несмотря на репрессии, порча продолжается.

В связи с крестьянскими восстаниями настроение польских солдат подавленное, зарегистрировано несколько случаев продажи польскими солдатами оружия крестьянам за плату или в обмен на продукты.

Начпозап Шутко
Начагентотделения позапа Верховский

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов. Мн., 1971. Т.2. С.359.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ПАЛЯВОГА ШТАБА РЭЎВАЕНСАВЕТА РЭСПУБЛІКІ АБ ВЫЗВАЛЕННІ ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ М. ГЛУСК БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА

12 ліпеня 1920 г.

№ 4135-оп

На слуцком направлении нами заняты дер. Мосеевичи, Край, Хальки, Радушичи, 20 вер. юго-западнее стн. Осиповичи, идет бой у Новых Дорог на шоссе Бобруйск — Слуцк. По форсировании р. Птичь наши части заняли м. Глуск и выдвинулись на линию Красное — Выгода — Доколь — Малиново — Лясковичи, наше наступление продолжается.

Начоперсовет Шапошников
Военком Клим

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов. Мн., 1971. Т.2. С.377.

З АРТЫКУЛА Ў ГАЗЕЦЕ «КОММУНИСТ» «ДОЎГА БУДЗЕМ ПАМЯТАЦЬ ГЭТЫ ДЗЕНЬ»

11 ліпеня 1924 г.

Все ближе и ближе приближались эти дни. В бессильной злобе зарвавшиеся паны издевались над «хлопами». Реквизиции, подводы, нагайки, расстрелы. Стонала деревня, стонали местечки и города. Все угрюмее становились лица и шли «туда» — в леса к «своим».

Слухи о близком освобождении заполняли все. Ждали со дня на день. Ждали с момента боев под Шатилками.

За три—четыре дня до памятной даты еще как будто не верилось в освобождение. Еще шляхта и звоношпорые уланы терзали тело умеренной трудовой Белоруссии. Но слухи ползли, и верилось и не верилось.

8-го и 9-го поползли панские подводы со скарбом, сопровождаемые польскими солдатами. Местечко (Глуск.—*Ред.*) начало наполняться войсками. Царила растерянность.

9-го днем начался грабеж лавок, под вечер польские вояки начали грабить квартиры, забирая на переполненные селянским добром телеги все, что можно было взять, или тут же продать скупщикам, но не всегда их находя.

Вечером вдруг загорелся театр рядом с лавками. Бросились несколько человек туда, но скоро вернулись обратно с перебитыми руками шомполами польских солдат, которые, пользуясь случаем, дограбливали еще не разграбленные лавчонки.

Население начало вытаскивать свой скарб из домов. Ходили слухи, что зажгут все местечко. Жители начали собирать деньги коменданту. А на базаре под свет пожарища с музыкой отступали польские бандиты с огромными обозами награбленного добра. Кругом стояло зарево. Горели Березовка, Бояново, Замосточье. Горела Беларусь.

Ночь никто не спал. Молодежь, ожидая, что паны зажгут местечко и начнут грабить или уничтожать оставшийся скарб, небольшой кучкой с 3—5 винтовками залегла в канаве около местечка.

В полночь получили записку, что утром «зеленые» будут у нас.

На рассвете 11 июля последние части, наловив молодежи местечка, приказали рубить столбы телефона и электрическую станцию.

Жуткая тишина была во всем местечке, только слышались иногда крики жителей. Это солдат забрался в квартиру и там хозяйничал «по-культурному» — по-пански.

Устали. Кое-кто заснул. Вокруг тихо-тихо. Никто с час не показывался на улицу.

И вдруг «Интернационал». Улица полна народа. Вот они, избавители, черные, оборванные. Нервы не выдержали, плакали.

Сзади ползли обозы Красной Армии с (не преувеличивая) пляшущими селянами.

Ведь везли своих, ведь шли освобождать своих.

Гнались за увезенным награбленным панами «своим» добром.

Ф.С.Кабернік.

Долго будет помнить Белоруссия эти дни, полные ужаса, будет помнить дни светлой радости — освобождения.

Не давала спакою сумленне

Вялікі жыццёвы шлях прайшоў Фама Сцяпанавіч Кабернік. Нарадзіўся ён у 1896 г. у в. Заракуша. Дзяцінства Фама не бачыў. З шасці гадоў пастух, з дзесяці — падзённы работнік у кулака Варанцова. Бывала, робіш-робіш, а прыйдзе час разлічыцца — амаль нічога не атрымаеш. І маўчы, бо другі раз кулак зусім на працу не прыме і тады — хоць з торбай у свет белы. Жыла шматдзетная сям'я Кабернікаў у курнай бацькавай хаце, жыла ў нястачы і галечы, сядзела на «чацвярціне». Падрасталі хлопцы, на выданні былі дзяўчаты. Падыходзіла пара кожнаму падумаць аб сваёй сям'і. Патрэбен такі-сякі кавалак зямлі, але які надзел мог даць ім бацька з чацвярціны? Пра зямлю заўсёды тужліва гаварыў стары Сцяпан, і Фама ўжо змалку ведаў, у чым іх сялянскае шчасце...

Кастрычнік 1917 г. сустрэў радавым царскай арміі. Потым, калі полк адмовіўся ваяваць за стары рэжым, у пачатку 1918 г. Фама Кабернік вярнуўся на радзіму. Тут сустрэўся з сябрамі дзяцінства, з братамі Аляксандрам і Пятром Шантарамі, з Максімам Касько, Іванам Малаковічам і інш. Усіх іх аб'ядноўвала цяга да новага, яшчэ невядомага, але бязмерна жаданага, да ўсяго таго, што несла савецкая ўлада.

У адну з цёмных лютаўскіх начэй да яго ціхенька пастукаў Пётр Шантар. Не заходзячы ў хату, пачаў расказваць, што ў Халопенічах легіянеры Доўбар-Мусніцкага ледзьве не схапілі яго з братам Аляксандрам. Хлопцы неяк вырваліся з акружанай хаты, і Пятро вырашыў папярэдзіць Фаму.

Фама разумеў, што начаваць у хаце было рызыкоўна, а праводзіць лютаўскую ноч у гумне холадна, і ўсё ж, узяўшы кажух, накіраваўся ў гумно. Не паспеў залезці на сена, як пачуў польскую лаянку. Яго шукалі.

— А хваробу вам, — зларадна падумаў Фама, адкрыў падкоп, некалі спецыяльна падрыхтаваны і старанна замаскіраваны, нырнуў пад сцяну, вылез на агароды і падаўся да бліжэйшага лесу...

Каб адагнаць холад, паставы, дзыбаты, як чапля, легіянер, тупаў па мосце, падбіваў ботамі змерзлыя ледзяшы. Яны падалі на лёд ракі. Адзін з такіх «мячыкаў» не дакаціўся да краю дошак. Салдат падышоў і, любуючыся сваім майстэрствам футбаліста, са смакам моцна ўдарыў яго нагой, але ў гэты момант нехта знізу схапіў яго за нагу і сцягнуў пад мост. Праз некалькі мінут з-пад моста выйшлі двое.

Назаўтра ў Касарычах, Заракушы, Халопенічах легіянеры цэлы дзень шныралі па хатах, шукалі тых, хто за адну толькі ноч бясшумна ліквідаваў сем польскіх паставых.

А ў гэты час група хлопцаў сабралася за ракой ва ўрочышчы Падгорнае. Падлічылі трафеі, прадумалі план дзеянняў на

наступную ноч і зноў з нецярпеннем чакалі змяркання. З гэтага часу акупанты не ведалі спакою. У Глускай, Рудабельскай, Ляскавіцкай і іншых валасцях бушавала полымя партызанскай барацьбы.

Фама Сцяпанавіч уваходзіў у групу касарыцкіх партызан. Хутка палякі былі вымушаны пакінуць гэтыя мясціны, але з'явіліся новыя, больш моцныя і нахабныя захопнікі — немцы.

Савет Народных Камісараў звярнуўся да народа з заклікам: «Сацыялістычная Айчына ў небяспецы». На радзіму, у сваю вёску Касарычы, прыехаў у гэты час Кастусь Данілавіч Пінчук. Ён быў накіраваны органамі савецкай улады для вярбоўкі моладзі ў Чырвоную Армію.

— Мы тут будзем ваяваць, — адказвалі старэйшыя сяляне.

— Мала мы тут, хлопцы, без зброі зробім супраць рэгулярнай варожай арміі, — стаў падтрымліваць Пінчука Кабернік. Аднак пакінуць гэтыя мясціны згадзіліся нямногія партызаны. Усе яны прабіраліся ў Бабруйск, а там з дапамогай падпольшчыкаў далей. Апошнімі адыходзілі Фама Кабернік і Мікалай Юневіч. Удвух, дзе цягніком, а дзе і сваім ходам, дабіраліся да станцыі Орша. За Оршай чырвоныя, але як прайсці? Выручылі чыгуначнікі. Два з іх далі свае пропускі, трэці разам з імі перайшоў граніцу і забраў пропускі, каб вярнуць іх сваім таварышам.

У Чырвонай Арміі Фама Сцяпанавіч амаль месяц праслужыў у Смаленскай губчэка, а потым быў прызначаны камандзірам узвода асобага аддзела пры штабе Рэўваенсавета 11-й Арміі і накіраваны ў Астрахань.

Неаднойчы Фама Сцяпанавіч слухаў выступленні члена Рэўваенсавета 11-й арміі Сяргея Міронавіча Кірава. Магчыма, пад іх уздзеяннем і вырашыў, што яго месца ў партыі бальшавікоў, і ў лютым 1919 г. уступае ў яе рады.

Умовы, што склаліся тады ў 11-й арміі, былі вельмі цяжкія. Салдаты цярпелі ад голаду, холаду і хвароб. Фама Сцяпанавіч захварэў на сыпны тыф. Калі крыху папраўіўся, яго з Астрахані накіравалі ў Беларусь. Так Ф.С.Кабернік трапіў у Бабруйск і служыў камандзірам узвода 2-га Бабруйскага каравульнага батальёна, а калі спатрэбілася, стаў партызанам атрада імя III Інтэрнацыянала Ляскавіцкай і Рудабельскай валасцей, якім камандаваў Пуцята. Фама Сцяпанавіч Кабернік прымаў удзел у паходзе коннай арміі Будзённага на Варшаву.

Усё сваё далейшае жыццё Ф.С.Кабернік працаваў у органах НКУС, вёў барацьбу супраць ворагаў савецкай краіны.

Знаходзячыся на пенсіі, стары бальшавік прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычных падзеях на Глушчыне. Памёр Ф.С.Кабернік у 1987 г.

Г.К.Янкоўскі.

У лютым 1918-га

З успамінаў Сямёна Лазаравіча Вілюгі, былога камандзіра асобага партызанскага батальёна імя Бабруйскага рэўкома

Узброеныя атрады, сфарміраваныя на Глушчыне, і 51-ы рэвалюцыйны полк, пасланы сюды для дапамогі ў барацьбе з польскімі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, не давалі апошнім замацавацца ў воласці. Сяляне вёсак, размешчаных на дарогах, што вядуць з Глуска ў бок Бабруйска, неслі тут пастаяннае дзяжурства. І як толькі заўважалі, што ў тым ці іншым маёнтку альбо вёсцы з'явіўся чарговы атрад уланаў, праз пасыльных тут жа дакладвалі ў наш штаб. Атрады, не марудзячы, рабілі на дарогах засады і знішчалі легіянераў. Вакол Бабруйска, дзе заселі часці корпуса, усё тужэй і тужэй сціскалася кальцо нашых войскаў. Мяцежнікі адчувалі сябе ўсё горш і горш: не хапала харчавання і асабліва фуражу для коней. Усе іх спробы прарвацца да Слуцка, каб папоўніць прыпасы, падаўляліся сілай нашых атрадаў, адбівалі ахвоту пакідаць Бабруйск.

У часцях польскіх легіянераў пачалося бражэнне: узрасло дызертырства, падала воінская дысцыпліна, пачаліся мародзерства, грабяжы і распродаж інтэнданцкіх складоў царскай арміі, што размяшчаліся ў Бабруйскай крэпасці. Абмундзіраванне, медыкаменты і іншая маёмасць прадаваліся са складоў днём і ноччу, і, як кажуць, оптам і ў розніцу.

З боку Асіповіч і Жлобіна, дзе часці польскага корпуса ў баях з чырвонагвар-

дзейскімі атрадамі панеслі значны ўрон, рыхтавалася новае наступленне супраць легіянераў. Аднак ажыццявіць намечаны манеўр партызанам і часцям РСЧА не ўдалося, бо ў Брэсце былі сарваны перагаворы з кайзераўскай Германіяй, і яе войскі аднавілі ваенныя дзеянні.

У лютым 1918 г. Глуск напоўнілі адступаючыя часці рэвалюцыйных атрадаў. 9 лютага адсюль адбыў і 51-ы полк Іванова, а мясцовым атрадам было паслана тэрміновае распараджэнне прыбыць у Глуск. Мы не таілі ад людзей, што наша становішча значна пагоршылася ў сувязі з ваеннай інтэрвенцыяй Германіі і што немцы ў хуткім часе могуць з'явіцца і на Глушчыне. Было выплачана жалаванне салдатам атрадаў і прапанавана падрыхтавацца да заўтрашняга маршу. Тым, хто не пажадаў адступаць у тыл і заставаўся ў родных мясцінах, загадалі здаць зброю.

10 лютага я з Малаковічам К.П. знішчылі штабныя дакументы і схавалі зброю. Вінтоўкі выкапылі закапаць пад падлогай валаснога праўлення, а патроны ў ацынкаваных герметычных скрынках былі апушчаны ў калодзеж, які знаходзіўся непадалёку. Калі ўсе справы былі скончаны, я з Зелянковым Максімам накіраваўся ў Парычы, а затым у Жлобін.

Польскія легіянеры Доўбар-Мусніцкага, даведаўшыся, што Глуск пакінуты, 10 лютага 1918 г. каля дзесяці гадзін вечара ўварваліся ў мястэчка, каб захапіць рэвалюцыйны штаб. Знайшоўшы памяшканне валаснога камітэта пустым, яны ўчынілі тут грабеж. Пакінуўшы каля будынка каравульнага, афіцэр карнага кавалерыйскага атрада загадаў праверыць дамы згодна са спісам, які ў яго меўся, і ўказаных жыхароў арыштаваць.

Усю ноч з 10 на 11 лютага легіянеры шныралі па Глуску, каб схапіць актывістаў, не паспеўшых пакінуць мястэчка. Былі арыштаваны С.А.Аношка, Д.А. Жыжкевіч, А.М.Райхман і некаторыя іншыя, хто не змог своечасова схавацца.

11 лютага 1918 г. у нядзелю польскія акупанты сагналі на плошчу сялян, прыехаўшых на глускі базар, многіх жыхароў Глуска і на вачах у соцень людзей расстралялі сакратара валаснога камітэта Дзмітрыя Андронавіча Жыжкевіча за тое, што паведаміў аб схаванай польскімі панамі ў падвалах Глускага касцёла вялікай колькасці рознага харчавання: пшанічнай мукі, вяндліны і каўбас, сметанковага масла, цукру і інш. Усе гэтыя прадукты былі канфіскаваны і перададзены байцам 51-га рэвалюцыйнага палка і ўзброеных атрадаў.

Публічна на плошчы легіянеры да крыві спаласавалі Сцяпана Аношку, пакараўшы яго 25 ударамі шомпалаў. А.М.Райхмана, старшыню местачковага камітэта, легіянеры моцна збілі, прапаролі штыком нагу і скрываўленага адвезлі ў маёнтак Бярозаўка памешчыка Лянкевіча, дзе звязалі і кінулі ў свінарнік. Каб вызваліць свайго старшыню, грамадзяне Глуска сабралі вялікую суму грошай і прапанавалі іх камандзіру атрада легіянераў. Райхман быў дастаўлены ў Глуск і вызвалены пад залог. Але далей заставацца тут ён не мог і ноччу пакінуў мястэчка.

Атрады ўланаў гэтак жа рыскалі і па вёсках, шукаючы рэвалюцыйна настроеных

Арганізатары партызанскага руху на Глушчыне. Злева направа: К.П.Малаковіч, С.Л.Вілюга, В.Ф.Кабановіч, А.М.Райхман.

А.А.Канцавая.

сялян, арыштоўвалі, збівалі і расстрэльвалі іх. 12 лютага адзін з карных атрадаў уварваўся ў в. Усцярхі, дзе разграбіў маёмасць маіх бацькоў. Уланы забралі каня, збілі да паўсмерці бацьку, арыштавалі брата Рыгора, а таксама жыхара вёскі Андрэя Зубрыцкага і адвялі іх у засценак Усцярхі, дзе адлупцавалі шомпаламі. Мясцовыя жыхары ўступіліся за арыштаваных і далі распіску, што яны ні ў чым не вінаватыя і палітыкай не займаюцца. Толькі пазней тыя былі вызвалены з-пад варты.

Акупанты жорстка расправіліся з групай сялян з вёсак Заполле, Ляскавічы, Слаўкавічы. У крывавых расправах легіянерам дапамагалі мясцовыя памешчыкі, помсцячы за парубкі лесу, падзел зямлі, забраную маёмасць. Але ім нядоўга прыйшлося арудаваць: наступаючыя нямецкія войскі ў хуткім часе раззброілі і распусцілі легіянераў мяцежнага корпуса Доўбар-Мусніцкага.

Якім я памятаю брата

З успамінаў Алены Андронаўны Канцавой (Жыжкевіч)

Нарадзіўся Дзмітрый Жыжкевіч у 1893 г. у Глуску. Сям'я ў нас была самая што ні на ёсць працоўная. Бацька ў асноўным ганчарыў, гаспадарыў на зямлі, а ўсе дзеці, у тым ліку і Дзмітрый, дапамагалі яму ў гэтым.

У 1914 г. брат быў прызваны ў армію. Праз тры гады ён вярнуўся на радзіму членам РСДРП(б), уключыўся ў рэвалюцыйны рух на Глушчыне. Я часта бегала на мітынгі, на якіх выступаў Дзмітрый. Памятаю, якая гордая была, калі ён, высокі і прыгожы, браў слова, а людзі ўважліва яго слухалі. Па іх рэакцыі адчувалася, што гаворыць нешта для іх важнае, хвалюючае.

Словам, не забываецца многае. І ўсё ж не памылюся, калі скажу: той лютаўскі дзень 1918 г. памятаю ва ўсіх дэталях. У Глуску стаялі польскія легіянеры. Да нас у хату ў поспачы заскочыла суседская дзяўчына. Звярнуўшыся да брата (ён якраз снедаў), таропка сказала:

— Міця, многіх арыштоўваюць. Хавацца трэба.

Але толькі паспеў Дзмітрый выйсці з веснічак, як тут яго і схапілі легіянеры. Пры ім жа ў хаце і ў хляве зрабілі вобыск. Знайшлі пяць вінтовак, дзве скрыні з патронамі. Толькі пасля гэтага павялі ў камендатуру. Потым мы даведаліся, што там яго

Сяляне Глускай воласці, прыгавораныя да расстрэлу. 1918 г.

дапытвалі, патрабуючы звестак пра іншых членаў рэўкома. Нічога не дабіўшыся, вырашылі расстраляць.

Сцэна расстрэлу і зараз перад маімі вачыма. Было гэта якраз каля будынка цяперашняга ваенкамата. Народу назганялі многа. Камендант, зачытаўшы прыгавор, прапанаваў Дзмітрыю завязаць вочы, але ён рашуча адмовіўся, сказаў, што яму няма чаго вочы хаваць ад людзей. Маўляў, жыў сумленна і ведае, за што прымае варожую кулю. Так і прыняў смерць, не скарыўшыся легіянерам.

Многа людзей прыйшло і на яго пахаванне. Нават здзіўляюся, чаму легіянеры дазволілі гэта. Больш таго, запомнілася такая дэталь. Калі пахавальная працэсія накіроўвалася на могілкі, насустрач ехалі некалькі уланаў. Яны выстралілі ў паветра, быццам салютавалі мёртваму Дзмітрыю за яго мужнасць і стойкасць.

Ні маці, ні бацька на расстрэле сына не былі. Мама проста не паспела, настолькі хутка ўсё адбылося. Бацьку ж, лічу, проста пашанцавала, паколькі і ён пад уплывам сына актыўна дапамагаў савецкай уладзе. Справа ў тым, што ён па просьбе Дзмітрыя (усе ўжо ведалі, што легіянеры з корпуса Доўбар-Мусніцкага вось-вось будуць у Глуску) на падводзе павёз дакументацыю Савета ў Мазыр. А калі вяртаўся, то каля Баянава (гэта ён мне пазней расказаў) сустрэў чалавека, у якога пацікавіўся, што чуваць у Глуску. Той яму адказаў, што Глуск занялі польскія легіянеры і расстралялі ў нядзелю нейкага Дзмітрыя Жыжкевіча. Бацька адразу зразумеў, чым для яго можа скончыцца яго вяртанне ў мястэчка. Таму павярнуў каня, як кажуць, зусім у іншы бок.

Калі ў Глуску зноў была адноўлена савецкая ўлада, вуліцу, на якой быў расстраляны мой брат, назвалі яго імем.

Бой каля ракі Пціч

З успамінаў Сямёна Лазаравіча Вілюгі

Разам з чырвонаармейцамі партызаны ўмацаваліся на левым беразе Пцічы. З верасня 1919 г. да другой палавіны студзеня 1920 г. яны ўтрымлівалі фронт у гэтым раёне і адстаялі ад ворагаў вёскі Новую Дуброву, Старую Дуброву, Рудабелку, Карнілаўку, Лаўстыкі, Кавалі.

У атрадзе ў гэты час налічвалася больш за 200 чалавек. Гэта былі батракі з Рудабелкі, сяляне-батракі і сераднякі з вёсак Азарыцкай, Парыцкай і Глускай валасцей. Іх узначальвалі камуністы.

З жніўня 1919 г. барацьба актывізавалася. Аднойчы ноччу варожая разведка, якая налічвала 12 чалавек, накіравалася да в. Лаўстыкі. Партызаны з засады напалі на разведку, пяцёра легіянераў былі забіты. Другі раз атрад сустрэўся з акупантамі каля в. Ржаноў. Партызаны пераправіліся цераз Пціч, выбілі варожыя войскі з вёсак, захапілі абоз з харчаваннем і зброяй.

У пачатку лістапада тры роты чырвонаармейцаў і атрад партызан атрымалі загад авалодаць в.Зубарэвічы. Галоўныя сілы праціўніка былі размешчаны ў фальварку Бярозаўка. Як і заўсёды, у час сумесных дзеянняў Чырвонай Арміі і партызан чырвонаармейцы вялі наступленне з фронту, а партызаны з тылу, яны размясціліся паміж Бярозаўкай і Зубарэвічамі.

Падзеі адбываліся ноччу. Напалоханыя нечаканым наступленнем чырвоных, белапалякі кінуліся наўцёк у Бярозаўку, не паспеўшы нават адзець боты і шынялі. Па дарозе яны наткнуліся на партызан. Пачаўся бой. На дапамогу палякам падаспела падмацаванне з Бярозаўкі. Сілы аказаліся няроўнымі, партызаны і чырвонаармейцы адступілі, аднак і акупанты панеслі вялікія страты. Асабліва радаваліся партызаны, што ўдалося захапіць некалькі дзесяткаў вінтовак. Іх адразу аддалі моладзі, якая ўжо даўно прасілася ў атрад.

Пакуль трымалася цяпло, было лёгка. Аднак у студзені пачаліся маразы, якія дасягалі 30 градусаў. Непраходныя балоты сталі праезджымі. Партызаны былі вымушаны перабрацца ў вёскі. Асноўныя сілы Чырвонай Арміі на гэтым участку фронту размяшчаліся з усходу, 200 партызан і невялікі атрад чырвонаармейцаў аказаліся з усіх бакоў акружанымі на левым баку Пцічы. Польскія войскі праз сваю агентуру даведаліся аб сілах і размяшчэнні чырвонаармейцаў і партызан. Узброеныя кулямётамі і артылерыяй, у ноч з 14 на 15 студзеня 1920 г. яны пачалі наступленне.

Асноўны атрад партызан быў размешчаны ў Новай Дуброве. У в.Кавалі знаходзілася 30 чырвонаармейцаў і 20 партызан, у Карпілаўцы 15 чырвонаармейцаў і 10 партызан, у Лаўстыках 20 партызан. Акупанты наступалі з боку Парэчча і Ржанова. Зрабіўшы налёт на в. Шкава і выбіўшы там чырвонаармейскую роту, яны зайшлі ў тыл пазіцыям, якія на левым беразе Пцічы ўтрымлівалі чырвонаармейцы і партызаны. Праціўнік наступаў шырокім фронтам — адначасова на вёскі Новая Дуброва, Карпілаўка, Лаўстыкі і Кавалі. Па Новай Дуброве і па акопах каля вёскі ён адкрыў ураганны артылерыйскі і кулямётны агонь. Чырвонаармейцы і партызаны пачалі прабівацца з Новай Дубровы, яны бачылі, як адразу ў некалькіх месцах загарэлася в. Кавалі. Вырашылі адысці ў Карпілаўку, але заўважылі, што і Карпілаўка гарыць. Партызаны накіраваліся да Смыковіч, але і там ужо былі палякі. Чырвоныя партызаны адступілі да Рудні, выбіўшы ворага са Смыковічаў. Пасля гэтага жорсткага бою партызаны не далічыліся многіх сваіх таварышаў. Па-геройску загінуў памочнік камандзіра атрада Максім Ус. Ён адзін знішчыў каля дзесятка ворагаў і ўпаў цяжка паранены. Загінулі Сцяпан Падута, Васіль Званковіч, Фама і Рыгор Пальцавы, Кузьма і Максім Кавалевічы, Васіль і Фёдар Данілевічы. Аднак і вораг панёс вялікія страты, толькі забітымі ён страціў больш за 150 чалавек.

Выбіўшы партызан з вёсак Дуброва, Кавалі, Лаўстыкі, Карпілаўка, акупанты пачалі крывавую расправу над насельніцтвам. Яны абстралялі Новую Дуброву з гармат. У хаты кідалі бомбы і нікому не давалі тушыць пажар. Усіх мужчын, якія выбягалі з гарэўшых хат, расстрэльвалі на месцы. У агні гінулі жывёла і ўся сялянская маёмасць. Афіцэры і жандары асабліва варожа адносіліся да захопленых у палон партызан і іх сем'яў. Партызан Лявон Адзінец захварэў на тыф і, не жадаючы перашкаджаць таварышам, застаўся ў сябе дома, у Карпілаўцы. Як толькі палякі занялі в. Карпілаўку, кулакі выдалі Адзінца. Пачаліся допыты. Спачатку дапытвалі жонку Адзінца і яго старую маці, патрабуючы, каб яны расказалі аб партызанах і аб тым, дзе яны знаходзяцца. Жанчыны нічога не сказалі. Потым пачалі дапытваць самога Адзінца. Хворага, яго аблівалі на лютым марозе па некалькі разоў вадой, патрабуючы, каб ён выдаў таварышаў. Нічога не дабіўшыся ад яго, ледзьве жывога, з адмарожанымі рукамі і нагамі Адзінца кінулі ў Бабруйскую крэпасць.

Бацька Аляксандра Салаўя пайшоў наведаць сваю дачку. Як толькі стары з'явіўся ў вёсцы, кулакі выдалі яго акупантам. Ён знаходзіўся ў свірне, калі салдаты прыйшлі за ім. Ведаючы, што яго чакае, 60-гадовы стары выйшаў са свірна з вінтоўкай.

— Я загіну, але хоць адзін сабака здохне і ад маёй рукі, — сказаў ён і выстраліў у легіянераў. Ворагі на месцы забілі старога.

Пасля чатырохмесячнай няроўнай барацьбы, пазбавіўшыся сваіх апорных баз на Пцічы і сувязі з часцямі Чырвонай Арміі, рудабельскі атрад не меў магчымасці заставацца ў тыле ворага. Атрад быў адазваны ў Чырвоны Бераг і ўключаны ў асобы партызанскі батальён імя Бабруйскага рэўкома под назвай «4-ы партызанскі рудабельскі атрад». Камандаваў атрадам Ігнат Жынко.

Летам 1920 г. партызаны былі перакінуты ў тыл ворага. Невялікімі групамі перабіраліся яны цераз Бярэзіну і сабраліся ў лесе на беразе Пцічы. Партызаны спалілі драўляныя масты ў Бярозаўцы і Халопенічах, каб перашкодзіць адыходу польскіх войскаў.

Каля Парэчча партызаны сустрэліся з перадавымі часцямі наступаючай Чырвонай Арміі.

Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГОЛУБ Цярэнцій Яфімавіч, н. у 1899 у в.Зелянковічы, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, памёр у 1956.

ЛЯХ Аляксандр, н. у в.Зелянковічы, удзельнік грамадзянскай вайны, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала.

ЛЯХ Іван Сцяпанавіч, н. у 1894 у в.Зелянковічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, з 1919 партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала.

МАЛАКОВІЧ Андрэй Спірыдонавіч, н. у 1898 у в. Зубарэвічы, у 1918—1921 у Чырвонай Арміі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, памёр у 1961.

МАЛАКОВІЧ К.П., адзін з арганізатараў партызанскага руху на Глушчыне ў гады грамадзянскай вайны.

МАЛАКОВІЧ Лука Фядосавіч, н. у 1890 у в.Зубарэвічы, поўны Георгіеўскі кавалер, удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

МАЛАКОВІЧ Пракоп Дзянісавіч, н. у 1895 у в.Зубарэвічы, адзін з кіраўнікоў барацьбы супраць легіянераў корпуса Доўбар – Мусніцкага, нямецкіх і польскіх акупантаў, у 1937 рэпрэсіраваны і расстраляны, рэабілітаваны ў 1957.

МАЛЫ Меер Айзікавіч, н. у 1898 у в.Зелянковічы, у 1919 – 1921 у Чырвонай Арміі, чырвонаармеец 1-га кавалерыйскага палка ў г.Барысаў.

ПАДАЛЯК Васіль, н. у в.Зелянковічы, удзельнік грамадзянскай вайны, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала.

ПАДАЛЯК Лявон Іванавіч, н. у 1899 у в.Зелянковічы, у 1919 – 1920 удзельнік грамадзянскай вайны, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, чырвонаармеец 1-га крапаснога палка.

ПАДАЛЯК Парфен Цітавіч, н. у в.Зелянковічы, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, змагаўся супраць польскіх акупантаў.

ПАДАЛЯК Фядос Яўхімавіч, н. у 1900 у в.Зелянковічы, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, у 1919 – 1920 служыў у 1-м крапасным палку, дайшоў з баямі да Варшавы.

ПАДАЛЯК Яўсей Нічыпаравіч, н. у 1900 у в.Зелянковічы, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, служыў у 1-м крапасным палку, удзельнічаў у баях супраць польскіх акупантаў, прайшоў з баямі ад Дняпра да Варшавы.

ПАТАПЕНКА Аляксей, н. у в.Зелянковічы, партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, змагаўся супраць польскіх акупантаў.

ПАТАПЕНКА Майсей Навумавіч, н. у 1896 у в.Зелянковічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, з канца 1919 партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, ваяваў супраць польскіх акупантаў у 1-м палку Гомельскай крапасной дывізіі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, памёр у 1959.

ПАТАПЕНКА Тарас Навумавіч, н. у 1900 у в.Зелянковічы, у 1919 ваяваў супраць польскіх акупантаў у партызанскім атрадзе імя 3-га Інтэрнацыянала, пазней служыў у 415-м палку 47-й стралковай дывізіі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, памёр у 1959.

СЯЛЕНЧЫК Анікей Кандратавіч, н. у 1918 у в.Зелянковічы, камандзір партызанскага атрада, у баі з польскімі войскамі на дарозе паміж Бярозаўкай і Зубарэвічамі быў цяжка паранены, забіты бандытамі.

СЯЛЕНЧЫК Ціхан Якаўлевіч, н. у в.Зубарэвічы, партызан, змагаўся супраць польскіх акупантаў.

Ц.Я.Голуб.

Т.Н.Патапенка.

С.Е.Жданко.

ФІЛЬЧАНКА Дзяніс Навумавіч, н. у в.Зубарэвічы, у 1918 – 1920 служыў у Смаленскім батальёне корпуса войскаў ВЧК, памёр у 1967.

ФІЛЬЧАНКА Міхаіл Восіпавіч, н. у в.Зубарэвічы, партызан, змагаўся супраць польскіх акупантаў.

ХАРТАНОВІЧ Мікалай, н. у в.Зубарэвічы, служыў у Чырвонай Арміі, змагаўся супраць кайзераўскіх і польскіх войскаў.

ЧУРУН Яўсей Сідаравіч, н. у в.Зубарэвічы, партызан, змагаўся супраць польскіх акупантаў, у жніўні 1920 забіты бандытамі.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ГЛУСК

БЕЦЭР Янкель Фроймавіч, н. у 1891 у Глуску, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, змагаўся з польскімі і кайзераўскімі войскамі.

ДЗЕТЛАВІЦКІ, чырвонаармеец, змагаўся супраць польскіх войскаў.

ЖАРЫНАЎ Павел Аляксеевіч, н. у 1900 у с.Фролаўка Угліцкага раёна Яраслаўскай вобл., з 1919 у Чырвонай Арміі, служыў у асобнай каравульнай роце.

ЖДАНКО Сцяпан Емяльянавіч, н. у 1900 у Глуску, член РКП(б) з 1918, удзельнік бальшавіцкага падполля ў гады польскай акупацыі, партызан.

ЖЫЖКЕВІЧ Дзмітрый Андронавіч, н. у 1900 у Глуску, удзельнік 1-й сусветнай вайны, з канца 1917

В.В.Чарнагубоўскі.

У.П.Шаўчук.

Помнік на брацкай магіле партызан каля дарогі Глуск — Зелянковічы.

член Глускага рэўкома, сакратар валаснога Савета, з 1918 вёў падпольную работу супраць польскіх легіянераў корпуса Доўбар-Мусніцкага, быў схоплены і падвергнуты катаванням, публічна расстраляны ў студзені 1918 (гл. артыкулы «У лютым васемнаццатага», «Якім я запомніла брата»).

ІВАНОЎ Рыгор Лаўрэнавіч, н. у 1895 у Глуску, у 1918 камандзір асобага палка, які на тэрыторыі Глушчыны вёў барацьбу з польскімі легіянерамі.

КАРАТКЕВІЧ Піліп Мацвеевіч, н. у 1881 у Глуску, удзельнік 1-й сусветнай вайны, пасля Лютаўскай рэвалюцыі вярнуўся на радзіму, быў выбраны членам выканкома Бабруйскага Савета сялянскіх дэпутатаў, дэлегатам 1-га Усерасійскага з'езда Саветаў сялянскіх дэпутатаў, членам Выканаўчага камітэта Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў, у час мяцяжу Доўбар-Мусніцкага арганізоўваў партызанскія атрады, прымаў непасрэдны ўдзел у баях з мяцежнікамі, памёр у 1921 (гл. артыкул «Жыццё, як бляск маланкі»).

МАЗАЛЕЎСКІ Іван Ануфрыевіч, н. у 1884 у Глуску, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, радавы, у грамадзянскую вайну вёў падпольную работу, партызан, у 1918—1921 старшыня Глускага рэўкома.

МУХА В.Р., н.у 1889 у Глуску, матрос-балтыец, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе, Мінску, у 1919 камісар аднаго з аддзелаў выканкома Заходняй вобл. і фронту, памёр у 1965.

ПАДБЯРОЗНЫ Васіль Іванавіч, н. у 1900 у Глуску, удзельнік камсамольска-маладзёжнага падполля г.Бабруйск у перыяд польскай акупацыі, расстраляны палякамі 7.5.1920.

РАЙХМАН Арон Мееравіч, н. у 1882 у Глуску, у канцы 1917 узначальваў Глускі местачковы Савет, арганізатар і ўдзельнік чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў, вёў барацьбу супраць польскіх акупантаў у трохкутніку Асіповічы — Глуск — Старыя Дарогі.

СІДАРОВІЧ Фядос Андрэевіч, з пачатку 1918 у Чырвонай Арміі, змагаўся з польскімі і нямецкімі войскамі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, камандзір разведкі ў атрадзе П.М.Юневіча, мабілізаваны ў Савецкую Армію, удзельнік штурму Берліна, узнагароджаны двума ордэнамі Славы.

ЧАРНАГУБОЎСКІ Вульф Восіпавіч, н. у 1889 у Глуску, у 1918—1920 у Чырвонай Арміі, служыў у 4-м палку 2-й стралковай дывізіі, у 1920—1921 чырвонаармеец атрада ЧОН у Мінску.

ШАЎЧУК Уладзімір Панцялеевіч, н. у 1901 у с.Успенаўка Мелітопальскага раёна Запарожскай вобл., у 1918—1920 міліцыянер атрада самаабароны, потым у Чырвонай Арміі, ваяваў супраць польскіх акупантаў, вёў барацьбу з бандытызмам на тэрыторыі Беларусі, жыў і працаваў у Глуску, памёр у 1978.

ШЭЙКА Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1897 у Глуску, удзельнік камсамольска-маладзёжнага падполля ў перыяд польскай акупацыі, расстраляны палякамі 7.5.1920.

ЮРКЕВІЧ Піліп Васільевіч, н. у Глуску ў 1918, вёў падпольную работу ў Бабруйску, змагаўся з польскімі акупантамі.

ЯНУШКЕВІЧ Канстанцін Трафімавіч, н. у 1885 у г.Барысаў, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, жыў у Глуску.

ЗАВАЛОЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АРЦЁМЧЫК Ігнат Фядосавіч, н. у 1898 у в.Бабірова, удзельнік 1-й сусветнай вайны, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, у 1918 удзельнічаў у баях пад Псковам і Нарвай, потым служыў у асобным батальёне 8-й дывізіі па барацьбе з бандытызмам.

БУДНІК Аляксандр, н. у в.Гарадзішча, у 1917 – 1918 сакратар Гарадкоўскага валаснога рэўкома, у перыяд польскай акупацыі вёў падпольную работу.

ГЕРАСІМОВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у в.Заполле, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях з польскімі акупантамі.

ГЕРАСІМОВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. у в.Заполле, змагаўся з легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, нямецкімі і польскімі акупантамі ў складзе 1-га Бабруйскага рэвалюцыйнага палка, у 1918 быў яго казначэем.

ГІНЗБУРГ Янкель, н. у 1891 у в. Гарадок, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ГУРЫН Мікалай Ільіч, н. у 1890 на х. Лагадаўка Гарадкоўскай воласці, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, служыў на Балтыйскім флоце, удзельнік абароны Петраграда ў 1919.

ГУРЫН Парфен Янавіч, н. у 1890 у в.Туркі, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх акупантаў.

ЕЛІН Міхаіл Рыгоравіч, н. у в.Гарадзішча, з 1918 у партызанскім атрадзе М.А.Ляўкова.

ЕРМАЛАЙЧЫК Андрэй Аляксеевіч, н. у 1894 у в.Кнышы, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ЁШЧЫК Сяргей, н. у в.Гарадзішча, з 1918 партызан атрада М.А.Ляўкова.

ЖУЛЕГА Яўсей Яўхімавіч, н. у 1895 у в.Рудня, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

КАЗАЧОК Язэп, н. у в.Гарадзішча, з 1918 у партызанскім атрадзе М.А.Ляўкова.

КАНАВАЛАЎ Дзяніс Цімафеевіч, н. у 1890 у в.Сіманавічы, служыў у Чырвонай Арміі, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ЛУГІН Ігнат Данілавіч, н. у 1894 у в.Бабірова, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, з канца 1919 старшы ўрач 2-й Гомельскай крапасной дывізіі, якая вяла баі з польскімі войскамі, дайшоў да Варшавы.

М.А.Ляўкоў.

ЛЯЎКОЎ Максім Архіпавіч, н. у 1894 у в.Кавалі Бабруйскага р-на. Член КПСС з 1918. У 1917 вёў бальшавіцкую прапаганду. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. З пачатку 1918 ваенны камісар Рудабельскай воласці, кіраўнік партызанскай барацьбы супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага і нямецкіх акупантаў у Бабруйскім павеце, са жніўня 1919 у Чырвонай Арміі, у 1920 адзін з арганізатараў камуністычнага падполля і партызанскіх атрадаў у Бабруйскім павеце. З канца 1920 у ЦКК КП(б)Б. З 1931 нарком юстыцыі і пракурор БССР, старшыня Цэнтральнай камісіі па справах былых чырвонаармейцаў і чырвоных партызан, з 1933 сакратар ЦВК БССР, кандыдат у члены ЦК у 1927 – 1929, член ЦК КП(б)Б у 1932 – 1937, член ЦК КП(б)Б і яе Прэзідыума ў 1929 – 1932, член ЦВК БССР у 1920 – 1922, 1929 – 1932 і яго Прэзідыума ў 1931 – 1937, рэпрэсіраваны, прыгавораны да расстрэлу 28.10.1937 (гл. артыкул «Рэўком у Гарадку дзейнічаў»).

МІШУР Антон Канстанцінавіч, н. у 1893 у в.Туркі, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

НІКАЛАЙЧЫК Пётр Піліпавіч, н.у 1896 у в.Заполле, у 1918 служыў у атрадзе ЧОН Бабруйскага павета, загінуў у 1918 у баі з бандытамі ў Любанскай воласці.

САВОНЧЫК Іларыён К., н. у 1896 у в.Гарадзішча, чырвонаармеец, ваяваў супраць кайзераўскіх і польскіх войскаў.

СІНКЕВІЧ Міхаіл Мацвеевіч, н. у в.Гарадзішча, у 1917 – 1918 узначальваў Гарадкоўскі валасны рэўком, у перыяд польскай акупацыі вёў падпольную работу, забіты польскімі войскамі ў 1919 у Бабруйску.

СІНКЕВІЧ Пётр П., н. у в.Гарадзішча, член Бабруйскага падпольнага камітэта партыі ў перыяд польскай і нямецкай акупацыі, у 1919 першы начальнік міліцыі г.Бабруйск і павета.

ШАЎРУК Янка Кузьміч, н. у 1891 у м.Гарадок, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх акупантаў.

ШАЎРУКОЎ Рыгор Аляксеевіч, н. у 1893 у м.Гарадок, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай

В.І.Гулевіч.

В.І.Кульба.

Ц.М.Тоўсцік.

В.Ф.Кабановіч.

і Кастрычніцкай рэвалюцый, служыў матросам у Кранштаце, удзельнічаў у абароне Петраграда ў 1919.

ШОСТАК Павел, н. у 1873 у в.Сіманавічы, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх акупантаў.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСТРЭЙКА Адам Данілавіч, н. у 1891 у в. Усцярхі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, служыў камандзірам аддзялення 3-га пантоннага батальёна, у 1918 добраахвотнікам уступіў у Аршанскі полк Магілёўскай дывізіі, удзельнік баёў на Усходнім фронце супраць чэхаславацкіх мяцежнікаў.

ВІЛЮГА Сямён Лазаравіч, н. у 1891 у в. Усцярхі, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны, у студзені—лютым 1918 арганізоўваў атрады чырвонай гвардыі для барацьбы з легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, у 1919 старшыня Глускага рэўкома, начальнік партызанскіх атрадаў у Бабруйскім і Рагачоўскім паветах, узначальваў асобы партызанскі батальён імя Бабруйскага рэўкома, памёр у 1961.

ВІШНЕЎСКІ..., н. у 1881 у в.Доўгі Лес, у грамадзянскую вайну служыў у конніцы К.Я.Варашылава.

ГУЛЕВІЧ Васіль Іосіфавіч, н. у 1881 у в. Крукаўшчына, удзельнік руска-японскай вайны, потым да 1918 служыў у кавалерыйскіх войсках у Маньчжурыі, Георгіеўскі кавалер, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ваяваў на Украіне ў складзе конніцы К.Я.Варашылава, быў цяжка паранены, у 1921 дэмабілізаваўся з арміі.

КУЛЬБА Влас Іванавіч, н. у 1897 у в. Усцярхі, ваяваў у складзе Коннай арміі Будзённага, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, дайшоў да Берліна.

ТОЎСЦІК Ціт Макаравіч, н. у 1896 у в. Чыкілі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, у 1918 змагаўся ў бабруйскім падполлі з польскімі легіянерамі, потым узначальваў Бабруйскі атрад ЧОН, ваяваў з белагвардзейцамі на Далёкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі, служыў у войсках НКУС, яму прысвоена званне «Ганаровы чэкіст», жыў у Глуску, памёр у 1979.

КАЛАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНОШКА Сцяпан Лявонавіч, н. у 1891 у в. Макавічы, у 1917—1919 член Глускага рэўкома, удзельнік барацьбы супраць польскіх легіянераў корпуса Доўбар-Мусніцкага (гл. артыкул «У грозным васемнаццатым»).

БАБІЧ Іван, н. у 1890 у в. Жалвінец, змагаўся супраць польскіх акупантаў, памёр у 1936.

БАБРОЎНІК Мікалай Кірылавіч, н. у 1885 у в. Жалвінец, змагаўся з нямецкімі і польскімі войскамі, у Вялікую Айчынную вайну быў у партызанах.

БАБРОЎНІК Арцём Кірылавіч, н. у 1898 у в. Жалвінец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў, загінуў у 1920.

БЕЛЯЧКОЎ Спірыдон Дзянісавіч, н. у в. Юзафова, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, змагаўся з польскімі акупантамі.

ГЛАЗ Іван Антонавіч, н. у 1884 у в. Калацічы, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, змагаўся з польскімі акупантамі, памёр у 1954.

ЗМІТРОВІЧ Васіль Паўлавіч, н. у 1891 у в. Пагост, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

КАБАНОВІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1900 у в. Сельцы, у перыяд польскай акупацыі камандзір атрада партызанскага батальёна імя Бабруйскага рэўкома, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, памёр ад ран у 1944.

КІСЯЛЕВІЧ Фядос Фаміч, н. у 1891 у в. Пагост, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, служыў рулявым падводных лодак на Балтыйскім флоце, удзельнік абароны Петраграда ў 1919.

КУРАЛЕНЯ Максім Мінавіч, н. у в. Жалвінец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ПАРХІМОВІЧ Аляксей Сцяпанавіч, н. у 1895 у в. Буда Старадарожскага раёна, служыў у Чырвонай Арміі, змагаўся з польскімі акупантамі, працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны Усход» (в. Краснае),

рэпрэсіраваны ў 1937, загінуў у лагеры, пасмяротна рэабілітаваны.

ХРАПКО Якаў Раманавіч, н. у 1890 у в. Жалвінец, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, служыў матросам на лінкоры «Севастопаль».

ШУМСКІ Піліп Канстанцінавіч, н. у 1889 у в. Юзафова, служыў матросам на Балтыйскім флоце, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1917—1919 выбіраўся членам Глускага валаснога рэўкома, рэпрэсіраваны ў 1937, пасмяротна рэабілітаваны.

П.К.Шумскі.

К.П.Грабка.

В.А.Корзун.

КАТКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДЗІНЕЦ Пётр Карпавіч, н. у 1902 у в. Катка, у 1918—1922 у Чырвонай Арміі, змагаўся з нямецкімі і польскімі войскамі.

БАГАМ'Я Канстанцін, н. у в. Бабровічы, чырвонаармеец, ваяваў з польскімі войскамі.

БАГАМ'Я Нічыпар, н. у в. Бабровічы, чырвонаармеец, ваяваў з польскімі войскамі.

БАГАМ'Я Сямён Данілавіч, н. у 1896 у в. Бабровічы, з першых дзён арганізацыі Чырвонай Арміі ў яе радах, ваяваў супраць германскіх і польскіх войскаў, забіты бандытамі (гл. артыкул «Загінуў ад рук бандытаў»).

БАГАМ'Я Фама, н. у в. Бабровічы, чырвонаармеец, ваяваў з польскімі войскамі.

БАГУК Якаў Фаміч, н. у 1893 у в. Халопенічы, чырвонаармеец, змагаўся супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ВАРАВА Іван Ціханавіч, н. у 1891 у в. Бабровічы, партызан, змагаўся з польскімі легіянерамі.

ВАРАВА Фама Паўлавіч, н. у в. Бабровічы, удзельнік партызанскага руху, ваяваў з польскімі войскамі.

ГРАБКА Кузьма Пятровіч, н. у 1898 у в. Халопенічы, чырвонаармеец, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

ЗЯНЬКОЎСКІ Дзям'ян Панкратавіч, н. у 1889 у в. Халопенічы, чырвонаармеец.

ЗЯНЬКОЎСКІ Якаў Панкратавіч, н. у 1894 у в. Халопенічы, чырвонаармеец.

КАБЕРНІК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1893 у в. Заракуша, скончыў у Кранштаце вучэбна-лінейны атрад, служыў электрыкам лінейнага карабля «Гангут», на ім ваяваў супраць кайзераўскага флоту на Балтыцы, удзельнічаў у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях, у 1918 з экспедыцыйным атрадам ваяваў супраць англійскіх інтэрвентаў на Поўначы, каля ст. Абазерская Архангельскай губерні, у 1919 абараняў Петраград ад войскаў генерала Юдзеніча, удзельнік ліквідацыі Кранштацкага мяцяжу ў сакавіку 1921, дэмабілізаваны з Кранштацкай крэпасці ў верасні 1921.

КАБЕРНІК Фама Сцяпанавіч, н. у 1896 у в. Заракуша, удзельнік 1-й сусветнай вайны, з 1918 у Чырвонай Арміі, член РКП(б) з 1919, у 1919 партызан атрада імя 3-га Інтэрнацыянала, з 1920 начальнік Асобага аддзела 22-й брыгады 8-й Мінскай стралковай дывізіі, адзін з арганізатараў партызанскіх атрадаў у Ляскавіцкай воласці.

КАНДРАТОВІЧ Міхаіл Фаміч, н.у 1891 у в. Халопенічы, чырвонаармеец.

КОРЗУН Васіль Аляксандравіч, н. у 1882 у в. Пціч, чырвонаармеец, змагаўся з польскімі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага.

КОЎЗУН Захар Апанасавіч, н. у 1896 у в. Касарычы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, з 1918 у Чырвонай Арміі, камандзір бронецягніка, ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войскаў.

КУДРЭЙКА Нічыпар Яўсеевіч, н. у 1883 у в. Касарычы, чырвонаармеец, змагаўся з польскімі войскамі.

ЛЯСУН Восіп Трафімавіч, н. у 1892 у в. Халопенічы, партызан.

НЯХЛЕБАЎ Васіль Андрэевіч, н. у 1896 у в. Бабровічы, партызан, ваяваў супраць польскіх войскаў.

ПАТАПЕНКА Аляксей Селіванавіч, н. у 1888 у в. Катка, партызан, змагаўся з польскімі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, у 1920-я гады ўзначальваў саўгас «Харомцы», загінуў ад рук бандытаў, яго імем названы саўгас і вуліца ў в. Катка.

К.Д.Пінчук.

П.Ц.Шантар.

М.М.Аксюцін.

С.Ф.Гурыновіч.

ПАТАПЕНКА Дзмітрый Ісакавіч, н. у в. Бабровічы, удзельнік партызанскага руху, ваяваў з польскімі войскамі.

ПІНЧУК Восіп Андронавіч, н. у 1892 у в. Касарычы, партызан.

ПІНЧУК Канстанцін Данілавіч, н. у 1889 у в. Касарычы, у 1918 вёў арганізацыйную работу па накіраванні ў Чырвоную Армію жыхароў Глушчыны, партызан.

ТУРЛЫКА Антон, н. у в. Бабровічы, чырвонаармеец, ваяваў з польскімі войскамі.

ШАНТАР Пётр Цімафеевіч, н. у 1892 у в. Пціч, партызан, ваяваў супраць легіянераў корпуса Доўбар-Мусніцкага.

ШАНТАР Уладзімір Цімафеевіч, н. у 1894 у в. Пціч, партызан, ваяваў з польскімі легіянерамі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЮНЕВІЧ Мікалай Іларыёнавіч, н. у 1881 у в. Касарычы, партызан, змагаўся з легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГАЛАМАКА Цімафей Антонавіч, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Бабруйшчыне ў гады грамадзянскай вайны, расстраляны палякамі ў 1920, пахаваны ў в. Вільча.

ГОЛУБ Ілья Захаравіч, н. у 1881 у в. Вільча, змагаўся з польскімі акупантамі, памёр у 1942.

ГОЛУБ Васіль Захаравіч, н. у 1891 у в. Вільча, чырвонаармеец, змагаўся супраць кайзераўскіх і польскіх войскаў, памёр у 1949.

ГОЛУБ Мацвей Кандратавіч, н. у 1896 у в. Вільча, чырвонаармеец, памёр у 1947.

ДЗЯДЗЮЛЯ Фама Емяльянавіч, н. у 1893 у в. Кляшчоўка, служыў у Чырвонай Арміі, камандзір роты, загінуў.

ДОЛБІК Васіль Андрэевіч, н. у 1883 у в. Балашэвічы, чырвонаармеец.

КАРАНЕЦ Фёдар Мінавіч, н. у 1899 у в. Кляшчоўка, у 1919 – 1923 у Чырвонай Арміі, радавы.

КІСЛЯК Уладзімір Несцеравіч, н. у 1882 у в. Вільча, чырвонаармеец, змагаўся з польскімі акупантамі, памёр у 1946.

САЛАВЕЙ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1887 у в. Балашэвічы, у 1918 арганізаваў партызанскі атрад, змагаўся з польскімі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, памёр у 1976.

СТАШЭЎСКІ Андрэй Іванавіч, н. у 1889 у в. Бервы, чырвонаармеец, змагаўся з нямецкімі і польскімі захопнікамі, памёр у 1962.

ШАЎСТРУК Антон Харытонавіч, н. у 1902 у в. Вільча, чырвонаармеец, змагаўся з белапалякамі.

ШАЎСТРУК Харытон Ф., н. у 1875 у в. Вільча, чырвонаармеец, ваяваў супраць германскіх і польскіх акупантаў, памёр у 1942.

КЛЯТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКСЮЦІН Карп Іванавіч, н. у 1888 у в. Барбарова, ваяваў супраць легіянераў корпуса Доўбар-Мусніцкага.

АКСЮЦІН Мікалай Мацвеевіч, н. у 1887 у в. Барбарова, ваяваў супраць польскіх легіянераў.

АКСЮЦІН Цярэнцій Мацвеевіч, н. у 1899 у в. Барбарова, чырвонаармеец, служыў у Кранштаце, змагаўся з замежнымі інтэрвентамі, у 1924 узначальваў Пад'ельскае (в. Барбарова) меліярацыйнае таварыства, з 1937 старшыня калгаса «3-і рашаючы», удзельнік партызанскага руху на Глушчыне, памёр у 1980.

БАСЯКОЎ Восіп Кандратавіч, н. у 1894 у в. Барбарова, змагаўся з польскімі легіянерамі.

БАСЯКОЎ Іван Восіпавіч, н. у 1892 у в. Барбарова, змагаўся з польскімі легіянерамі.

ГУРЫНОВІЧ Сямён Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Пяценка, ваяваў з польскімі легіянерамі.

ДРОБ Міхаіл Яўхімавіч, н. у 1892 у в. Даколь, чырвонаармеец.

ЗЕЛЯНКОЎ Максім Рыгоравіч, н. у в. Баянава, удзельнік 1-й сусветнай вайны, устанаўлення савецкай улады на Глушчыне, член валаснога рэўкома ў 1917 – 1918, служыў у Чырвонай Арміі, памочнік камандзіра дывізіі ў гады грамадзянскай вайны, загінуў пры вызваленні Крыма ад Урангеля.

КІПЕЛЬ Уладзімір Іванавіч, н. у 1889 у в. Нова-Андрэеўка, змагаўся з польскімі войскамі.

КІПЕЛЬ Яўхім Мінавіч, н. у 1892 у в. Нова-Андрэеўка, змагаўся з польскімі легіянерамі.

ЛАЗОВІК Васіль Сямёнавіч, н. у 1893 у в. Вайцяхова, змагаўся з польскімі войскамі.

ЛУГІН Антон Прохаравіч, н. у 1882 у в. Барбарова, ваяваў з польскімі войскамі.

ЛУГІН Міхаіл Варламавіч, н. у в. Вайцяхова, змагаўся з польскімі войскамі.

ЛУЗАН Іван Міхайлавіч, н. у 1879 у в. Пяценка, ваяваў з польскімі войскамі.

МАРОЗ Адам Якаўлевіч, н. у 1897 у в. Барбарова, ваяваў з польскімі акупантамі.

МАРЦІНОВІЧ Цімафей Сяргеевіч, н. у 1896 у в. Барбарова, ваяваў з польскімі войскамі.

МАРЦІНОВІЧ Пётр Захаравіч, н. у 1891 у в. Барбарова, змагаўся з польскімі акупантамі.

РАДЗЬКО Цімафей Захаравіч, н. у 1894 у в. Баянава, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, у 1918 служыў на эсмінцы «Автроил».

СОКАЛ Сцяпан Іванавіч, н. у 1889 у в. Старына, змагаўся з польскімі войскамі.

ТУПІЦА Даніла, н. у 1892 у в. Вайцяхова, ваяваў з польскімі войскамі.

ШАРАМЕТ Ніл Андрэевіч, н. у 1890 у в. Пяценка, ваяваў супраць польскіх войскаў.

ШУМСКІ Васіль Аўрамавіч, н. у 1890 у в. Пяценка, ваяваў супраць польскіх войскаў.

ШУМСКІ Кузьма Міхайлавіч, н. у 1897 у в. Пяценка, удзельнік грамадзянскай вайны, змагаўся з польскімі войскамі.

М.Я.Дроб.

СЛАЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЛЮБАНЕЦ Ціт Сямёнавіч, н. у 1900 у в. Слаўкавічы, камандзір партызанскай групы, ваяваў супраць атрада Булак-Балаховіча, загінуў летам 1922.

МАРУС Якаў Іванавіч, н. у 1897 у в. Слаўкавічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, у 1917 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, радавы 10-га стралковага палка ў г. Магілёў, у 1918—1920 змагаўся з кайзераўскімі і польскімі акупантамі, міліцыянер раённай міліцыі ў Бабруйску, пазней участковы міліцыянер Ляскавіцкага рэўкамітэта, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ХВАСТАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПРЫБЫШ Васіль Канстанцінавіч, н. у 1897 у в. Дуброва, чырвонаармеец, памёр у 1976.

ПРЫЦ Сямён Фядотавіч, н. у в. Веснава, чырвонаармеец, ваяваў супраць кайзераўскіх войскаў.

Час надзей і страт

АДНАЎЛЕННЕ

Грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя пакінула на Глушчыне свае разбуральныя сляды. Многія яе жыхары пазбавіліся жылля і вымушаны былі жыць у зямлянках, буданах, а то і пад адкрытым небам.

Прамысловасці на Глушчыне ў той час бадай што не было. У поўны заняпад прыйшла сельская гаспадарка: зменшыліся ў параўнанні з даваеннымі пасяўныя плошчы, валавыя зборы зерня, дабіваўся апошні сельгасінвентар. Гужавая павіннасць, устаноўленая для падвозу паліўных, харчовых і іншых дзяржаўных грузаў, адмоўна адбілася на цяглавых сродках: у многіх сялянскіх гаспадарках не стала коней, валоў. Запусцелі палі. Бяднейшае сялянства паранейшаму батрачыла на кулацкіх землях. Харчовая развёрстка, якая не пакідала сялянам ні лішку харчавання, выклікала ўсё большае абурэнне. Палітыка «ваеннага камунізму» стала бумерангам, які павярнуўся супраць савецкай улады. Патрабаваліся каардынацыйныя перамены, якія б ажывілі сялянскія гаспадаркі, зацікавілі сялян у лепшым выкарыстанні зямлі.

На X з'ездзе РКП(б)Б (сакавік 1921 г.) востра паўстала пытанне аб тым, каб спыніць падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці, не даць яшчэ больш пагоршыцца жыццёвым умовам працоўных. З'езд прыняў рашэнне аб пераходзе ад харчовай развёрсткі да харчовага падатку. Новая эканамічная палітыка знайшла падтрымку сярод сялянства Глушчыны. 17 красавіка III сесія ЦВК БССР дазволіла свабодны абмен збожжа і фуражу ў Бабруйскім і

некаторых іншых паветах, якія выканалі харчразвёрстку, і ўпаўнаважыла Наркамхарч рэспублікі распаўсюдзіць гэтае рашэнне на іншыя паветы па меры завяршэння імі харчразвёрсткі.

Увядзенне харчовага падатку замест харчразвёрсткі зацікавіла сялян усіх валасцей Бабруйскага павета і дазволіла пашырыць пасевы вясной 1921 г. Тут было засеяна значна больш зямлі, чым планавалася. Сялянскія гаспадаркі, якія ўзбуяніліся за лік памешчыцкіх зямель і адчувалі недахоп насення, інвентару і цяглавай сілы, атрымлівалі ад дзяржавы насенную пазыку, ім была перададзена значная колькасць земляробчага інвентару і рознай тэхнікі.

На падтрымку бяднейшага сялянства была накіравана дзейнасць Глускага валаснога камітэта сялянскай грамадскай узаемадапамогі. Камітэт валодаў велізарнымі правамі: уводзіў самаабкладанне, праводзіў розныя зборы і размяркоўваў атрыманыя ад дзяржавы сродкі для сялян, якія мелі ў гэтым патрэбу, арганізоўваў працоўную дапамогу сялянскай беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам, сіротам і інш. Камітэт сачыў за правільным выкананнем дэкрэта аб ільготах беднаце.

У гэты час на Глушчыне, як і ва ўсім павеце, вялікае распаўсюджванне атрымліваюць суботнікі, якія былі накіраваны на аднаўленне народнай гаспадаркі, барацьбу з разрухай. Актыўна праходзяць «Дні дапамогі сялянству», «Тыдні па рамонце інвентару», «Тыдні па зборы і ачыстцы насення», «Двухтыднёвік чырвонага аратага» і іншыя мерапрыемствы. Паспяхова прайшла на Глушчыне і першая харчова-падатковая кампанія.

Нарыхтоўка сельскагаспадарчых прадуктаў адбывалася таксама па лініі тавараабмену. З гэтай мэтай ў Глускай і іншых валасцях Бабруйскага павета ствараліся тавараабменныя пункты, спажывецкія таварыствы. Спажывецкая кааперацыя з'яўлялася важным звяном, якое ўмацоўвала эканамічную змычку дзяржаўнай прамысловасці з сялянскай гаспадаркай. Дзяржава ўсяляк садзейнічала яе дзейнасці, дапамагаючы рознымі льготамі, субсідыямі, прамысловымі таварамі. Толькі Глускае спажыўтаварыства абслугоўвала 1500 гаспадарак з 9 тысячамі едакоў, адну гандлёвую лаўку і 600 пайшчыкаў. Сярэднямесячны абарот таварыства складаў каля 2 тысяч руб.

У 1921 – 1922 гады небывалы ў гісторыі голад ахапіў больш 10 губерняў Паволжа. Сяляне Глускай і суседніх валасцей Бабруйскага павета разам з іншымі адгукнуліся на гэтую бяду. Яны збіралі і пасылалі прадукты харчавання, узялі на сваё ўтрыманне дзяцей з галадаючых раёнаў Паволжа. У Глуску праводзіліся розныя зборы і ахвяраванні, сабраныя сродкі накіроўваліся ў фонд галадаючым.

У вёсках Глушчыны працягваўся працэс будаўніцтва і ўмацавання саўгасаў. Былі створаны новыя дзяржаўныя гаспадаркі ў Бярозаўцы, Халопенічах. У першыя гады нэпа гэтыя, як і ўсе іншыя саўгасы, былі яшчэ не ў стане паказаць усіх пераваг сацыялістычнага ладу вытворчасці перад прыватнай уласнасцю. Напрыклад, у саўгасе «Звязда» (в. Завалочыцы) працавала толькі 38 рабочых. Аснашчанасць гаспадаркі невысокая: 25 коней, 15 валоў, 112 галоў дойнага статку, 3 быкі-вытворнікі. У

На базарнай плошчы ў Глуску. 1920-я гады.

гаспадарцы налічвалася 676 дзесяцін зямлі, з якіх ворная займала толькі 283 дзесяціны, 188 — сенакосы, 8 — фруктовы сад. Сельгасінвентар быў прадстаўлены 30 плугамі, 32 баронамі, 2 культыватарамі, 3 сеялкамі, 2 касілкамі, 4 жняяркамі, малатарняй, веялкай і нават звычайнай сахой. Іх было да дзесятка. Меўся адзін рухавік. Суседнія саўгасы «Праца» (в. Дварэц), Розы Люксембург (в. Скубейка) былі яшчэ меншымі па колькасці сельгасугоддзяў і, зразумела, бяднейшымі.

Стварэнне калектыўных гаспадарак ішло даволі павольна. У першую чаргу найбольшую жыццяздольнасць атрымлівалі прасцейшыя вытворчыя кааператывы і таварыствы. Сельскагаспадарчая кааперацыя аб'ядноўвала пераважна беднякоў і серадняко ў і ператваралася ў адзін з важнейшых фактараў гаспадарчага і палітычнага развіцця вёскі.

Значную колькасць уваходзячай у Глушчыну тэрыторыі ў той час займалі пераўвільготненыя землі, якія былі працягам Прыпяцкага Палесся. У дваццатыя гады, як і значна раней, тут навокал прасціраліся балоты і непраходная багна. Старажылы вёсак Баянава, Бабровічы, Клетнае, Малінава і іншых добра памятаюць, як прыходзілася зімой дабірацца ад вёскі да вёскі па вузкай грэблі. Восенню і вясной, калі ішлі дажджы, балоты адразалі людзей ад усяго белага свету, і ні праехаць, ні прайсці.

У канцы 1922—1923 гг. у вёсках пачалі арганізоўвацца таварыствы, каб кінуць выклік балотам: асушыць іх і зрабіць адваяваныя ў багны землі памочнікам чалавека ў яго гаспадарчай дзейнасці. У Глуску было створана валасное меліярацыйнае таварыства, у якое ўвайшлі таварыствы, арганізаваныя ў вёсках Калацічы, Клетнае, Барбарова і інш. Работы па асушэнні балот вяліся ўручную. Лапата ў руках селяніна была асноўнай прыладай. Пазней для больш эфектыўнага наступу на балоты прыйшла меліярацыйная тэхніка, і паступова на вачах у людзей адбываўся сапраўдны цуд: балоты пераўтварыліся ва ўраджайныя нівы і сакавітыя сенажаці. Дзесяткі, сотні гектараў урадлівых зямель атрымлівалі сяляне ўзамен былых непраходных балот.

Т.А.Матусевіч.

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ ЗМЕНЫ

Надзвычайны VI Усебеларускі з'езд Саветаў (13—16.3.1924), дэлегатам якога быў і наш зямляк Сава Дзям'янавіч Яльчык, аформіў узбуйненне БССР і прыняў пастанову аб правядзенні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі на акругі, раёны і сельсаветы. У адпаведнасці з планам новага падзелу на тэрыторыі рэспублікі было ўтворана 10 акруг, у тым ліку Бабруйская.

У Бабруйскую акругу ўвайшло 13 раёнаў. Глускі раён з цэнтрам у м.Глуск быў утвораны 17 ліпеня 1924 г. (у Бабруйскай акрузе да 26 ліпеня 1930). 20 жніўня падзелены на 19 сельсаветаў: Азямлянскі,

Глускі прафесіянальны саюз будаўнікоў. 1925 г.

С.Дз.Яльчык.

Бярозаўскі, Гарадоцкі, Гацкі, Германа-Слабадскі, Глускі 1-ы, Глускі 2-і, Дакольскі, Жалвінецкі, Загальскі, Карпілаўскі (21 лістапада 1938 разбуйнены ў Акцябрскі і Новадубраўскі сельсаветы), Каткаўскі, Клятнянскі, Ляскавіцкі, Макавіцкі, Парэцкі, Сіманавіцкі, Слаўкавіцкі, Чыкілёўскі (у верасні 1926 перайменаваны ў Казловіцкі). 24 верасня 1926 г. утвораны Перакальскі нацыянальны латышскі (скасаваны 21 лістапада 1938) і Хваставіцкі сельсаветы. 12 лютага 1935 г. Германа-Слабадскі сельсавет быў перададзены ў Капаткевіцкі раён, 5 красавіка 1936 г. Загальскі сельсавет перададзены ў Любанскі раён, 26 чэрвеня 1939 г. Азямлянскі, Гацкі, Карпілаўскі, Ляскавіцкі, Парыцкі сельсаветы сталі адносіцца да Акцябрскага раёна. З 20 лютага 1938 г. Глускі раён у Палескай вобласці, а з 20 верасня 1944 г. — у Бабруйскай. З 8 студзеня 1954 г. ён быў уключаны ў склад Мінскай, а з 23 студзеня 1960 г. — Магілёўскай вобласці.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 25 снежня 1962 г. Глускі раён быў ліквідаваны, тэрыторыя яго была перададзена Бабруйскаму раёну.

У 1924 г. у раён уваходзіла 419 населеных пунктаў з 9612 гаспадаркамі, у ім пражывала 57 378 жыхароў, у тым ліку насельніцтва Глуска складала 4600 жыхароў, мелася 755 гаспадарак.

Па колькасці населеных пунктаў самым буйным быў Карпілаўскі сельсавет (56 населеных пунктаў), за ім ішоў Макавіцкі (36 населеных пунктаў), на трэцім месцы знаходзіўся Загальскі (33 населеныя пункты).

Па колькасці гаспадарак пераважаў Макавіцкі (804), затым Ляскавіцкі (787), потым Глускі (755). Больш чым дзе пражывала насельніцтва ў Глускім сельсавеце — 4600, Макавіцкім — 4441 і Ляскавіцкім — 4327 жыхароў.

Т.А.Матусевіч.

Глускі раён у 1930-я гады

У 1933 г. у выдавецтве Беларускай акадэміі навук выйшаў эканамічны даведнік «Усе раёны БССР», дзе прыводзяцца статыстычныя звесткі і па Глускім раёне.

Раён размяшчаецца паміж 52°31′ — 53°09′ паўночнай шырыні і 28°18′ — 29°06′ усходняй даўжыні. Раённы цэнтр м.Глуск. Бліжэйшая чыгуначная станцыя Рудабелка. Раён падзяляецца на 20 сельсаветаў, з якіх адзін Перакальскі нацыянальны (латышскі). Мяжуе з раёнамі: на поўначы з Бабруйскім і часткова з Асіповіцкім, на ўсходзе з Парыцкім, на поўдні — з Петрыкаўскім, на захадзе — з Любанскім і Старадарожскім. Агульная тэрыторыя раёна 248,325 га. У тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння 69,3%, лясоў 30,7%. З зямель сельскагаспадарчага прызначэння прыгоднай для ўжывання 87% і непрыгоднай 13%.

Усяго насельніцтва ў раёне 59129 чалавек. Нацыянальны склад у працэнтах: беларусаў — 94,07, яўрэяў — 1,64, палякаў — 1,03, рускіх — 0,72, літоўцаў — 0,04, латышоў — 0,73 і іншых — 1,77.

Па тытульнаму спісу ў 1931 г. па раёне налічвалася 21 прадпрыемства з лікам рабочых — 1099 чал. У ліку прадпрыемстваў былі: электрастанцыя — 1, тарфяных арцеляў — 1, кузняў — 2, мылаварня — 1, цагельны завод — 1, цагельна-ганчарны — 1, дрэваапрацоўчых — 2, бандарная — 1, шавецкіх арцеляў — 2, кравецкая арцель — 1, вадзяных млыноў — 3, лесапільня — 1, баня — 1, кандытарская — 1, броварaў — 2.

У 1932 г. па раёне існавала 11 дзяржаўных і 9 кааператыўных, а ўсяго 20 прамысловых прадпрыемстваў. З іх знаходзілася ў падпарадкаванні Наркамлеспраму — 1, Наркамснабу — 4, Наркамзему — 4, РВК і гарсавету — 2, прамкааперацыі — 9. Персанал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1.12.1932 г. складаў 644 адзінкі, у тым ліку

рабочых (без вучняў і МАП) — 571, служачых — 69. Сярэдняя колькасць рабочых за першае паўгоддзе 1932 г. складала 557 асоб. Сума асноўных фондаў была 333 378 р. Калі валавая прадукцыя ў аптова-адпускных цэнах адпаведнага года за 1931 г. складала 1 320 980 р., то толькі за першае паўгоддзе 1932 г. яна ўжо складала 1 047 321 р. Тры прадпрыемствы мелі рухавікі.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна з'яўляюцца: 1) электрастанцыя ў м. Глуск з лікам рабочых за паўгоддзе 1932 г. 4 чал. і валавой прадукцыяй за гэты ж час у цэнах 1926—1927 гг. (у тыс.р.) 5,20; 2) абутковая арцель «Чырвоны рабочы» ў м. Глуск з лікам рабочых 52 чал. і валавой прадукцыяй 80,27 тыс.р.; 3) швейная арцель «Прагрэс» у м. Глуск з лікам рабочых 78 чал. і валавой прадукцыяй 287,42 тыс.р.; 4) стружачная арцель у м. Глуск з лікам рабочых 247 чал. і валавой прадукцыяй 498,52 тыс.р.; 5) вінакурны завод у саўгасе «Халопенічы» з лікам рабочых 7 чал. і валавой прадукцыяй 44,08 тыс.р.; 6) вінакурны завод, пошта Гарадок з лікам рабочых 7 чал. і валавой прадукцыяй 54,39 тыс.р.

Спажыўкааперацыя раёна мае 13 сельпо з гандлёвай сеткай у 49 адзінак. Пайшчыкаў спажыўкааперацыі 17 118 чал.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: вапнякі — в. Сімanавічы, жалезнякі бурыя і чырвоныя — в. Сімanавічы і в. Жалвінец. У раёне маецца 9092 га балот са значнымі запасамі торфу.

Сельская гаспадарка раёна спецыялізуецца ў жывёлагадоўча-канапляным напрамку. Саўгасаў у раёне 6: 1) Веснава з свінаводчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 620 га і 72 рабочых; 2) Харомцы з свінаводчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 1445 га і 3168 рабочых; 3) Рудабелка з малочна-жывёлагадоўчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 788 га і 76 рабочых; 4) Халопенічы з малочна-жывёлагадоўчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 841,40 га і 73 рабочых; 5) Саколка з малочна-жывёлагадоўчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 978,3 га і 53 рабочымі; 6) Завалочыцы з малочна-жывёлагадоўчай спецыялізацыяй, з тэрыторыяй 2438,6 га і 223 рабочых.

У раёне маецца 9650 гаспадарак, з іх на 1 студзеня 1933 г. калектывізавана 3505, што складае 36,3% і налічваецца 120 калгасаў з плошчай сенапахаці 36,5% ад агульнай плошчы сенапахаці ў раёне.

Аднаасобных гаспадарак у раёне 145.

У калгасах раёна 35 свінаферм (з пагалоўем 1733 на 30 верасня 1932 г.), 36 малочнатаварных ферм (з пагалоўем 3427 на 10 снежня 1932 г.), 35 цялятнікаў (1019 галоў на 10 снежня 1932 г.), 3 конефермы (57 коней на 10 снежня 1932 г.).

У калгасах раёна набыта наступная колькасць складаных сельскагаспадарчых машын: 28 сенакасілак, 55 конных граблей, 60 жняярак самаскідваючых, 8 снопавязалак, 12 бульбакапалак, 81 сеялка хлебная радковая.

Уся пасяўная плошча ў раёне ў 1932 г. складала 54 899 га. У тым ліку зерневых культур — 64,5%, бульбы — 17,5%, тэхнічных культур — 4,4%, палявых траў — 5,6% і інш. — 3%.

Нарыхтоўкі па раёне за 1932 г. на 1 лютага 1933 г. характарызуюцца наступнымі лічбамі ў тонах: льновалакно — 84, пянька — 10, льносемя — 88, каноплі — 10, салома — 399.

Сетка навучальных устаноў раёна: 80 чатырохгодак, дзе 136 настаўнікаў і 5760 вучняў, 16 ШСМ, дзе 1105 настаўнікаў і 3439 вучняў. Працэнт пісьменнасці па раёне 95,0.

Партарганізацыя раёна складаецца з 30 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў 299 чал. Камсамольская арганізацыя налічвае 39 ячэек, у якіх на ўліку стаіць 479 камсамольцаў.

У раёне ёсць 2 палітаддзелы пры саўгасах Халопенічы і Харомцы.

Выдаецца раённая газета «Сцяг калектывізацыі».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 177—179.

Калектывізацыя

У 1927 г. XV з'езд ВКП(б) прыняў праграму калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Задача аб'яднання і пераўтварэння дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектывы была пастаўлена ў якасці асноўнай і ў Глускім раёне. Спачатку калгасы аб'ядноўвалі пераважна сялянскую беднату і былі невялікімі гаспадаркамі. У 1927 г. у в. Шумяцічы (цяпер в. Амур) Слаўкавіцкага сельсаве-

та з сялянскай камуны-арцелі «Іскра» арганізаваўся калгас, у які аб'ядналіся 29 гаспадарак камунараў.

Пазней калгаснікі назвалі сваю калектыўную гаспадарку імем далёкаўсходняй ракі Амур. Адсюль пайшла і новая назва вёскі.

Аднак сяляне ў калгасы не спяшаліся.

У гэты час жорсткага націску на сялян яшчэ амаль не было: дзейнічалі прынцыпы добраахвотнасці, метады пераканання, агітацыі. Калектывісцкія формы земляробства знайшлі пэўнае разуменне ў невялікай часткі сялян. Яны не столькі ўбачылі лепшае жыццё ў існаванні калгасаў, колькі спадзяваліся на яго ў будучым. Менавіта гэтым можна вытлумачыць той факт, што ў 1928 г. у Глускім раёне была створана толькі адна калектыўная гаспадарка — калгас «Ленін» у Германавіцкім сельсавеце.

У вёсцы райкомам партыі праводзілася палітыка апоры на бедняка і саюза з серадняком. Многае рабілася для таго, каб узняць іх класавую свядомасць, і асабліва сельскай беднаты. З гэтай мэтай у раёне ствараліся бядняцка-батрацкія групы пры сельсаветах, кааператыўных арганізацыях, сельскагаспадарчых крэдытных таварыствах, камітэтах сялянскай узаемадапамогі. Напрыклад, на пасяджэнні Гарадкоўскай партячэйкі, якое адбылося 26 кастрычніка 1928 г., былі створаны групы беднаты, у якія ўвайшлі дэпутаты сельсавета, мясцовая інтэлігенцыя, камуністы і беднякі. Пры сельскім Савеце група ў складзе Антона Германа, Сымона Сяргейчыка, Антона Мішура, Сяргея Яшчына, Паўла Гурына. У групу пры спажыўтаварыстве былі выбраны Барыс Гальдштэйн, Рувім Прэсман, Васіль Мельнік, Сымон Гурын, Хведар Сяргейчык. Група беднаты, створаная пры сельскагаспадарчым крэдытным таварыстве, складалася з 10 чалавек, у тым ліку ў яе склад увайшлі Янка Герасімовіч, Кастусь Піліпчык, Міхась Буднік і інш. У групу беднаты пры камітэце сялянскай ўзаемадапамогі былі ўключаны Янка Шаўрук, Кастусь Гурын, Павел Герасімовіч, Тарэнта Сяргейчык, Пятро Сяргейчык — усяго 15 чалавек.

Групы беднаты мелі шырокія правы. Яны абмяркоўвалі пытанні калектывізацыі, падаткаабкладання, нарыхтовак сельгаспрадуктаў, барацьбы з кулацтвам і інш., вялі агітацыю сярод сялянства, уцягвалі яго ў правядзенне сацыялістычных пераўтварэнняў у вёсцы.

З 1929 г. калгасны рух на Глушчыне пачаў шырыцца. Гэтаму спрыяла значная матэрыяльная дапамога дзяржавы калектыўным гаспадаркам. Калгасам выдзяляліся доўгатэрміновыя крэдыты на набыццё складанага сельскагаспадарчага інвентару, машын, мінеральных угнаенняў, рабочай жывёлы, будаўніцтва вытворчых памяшканняў. Яны лепш забяспечваліся насеннем, тут была вышэйшая культура земляробства, лепшай ураджайнасць. Па Бабруйскай акрузе, напрыклад, у 1927 г. збіралі з дзесяціны азімага жыта 43 пуды, у 1928 — 1929 гг. ячменю адпаведна 40 і 48, аўса — 36 і 46, лёну — 20 і 27 і г.д. Але матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя ўмовы ў патрэбных памерах для правядзення калектывізацыі створаны не былі. Яна пачыналася ў асноўным на старой базе сялянскай гаспадаркі. І спадзявацца, што калектыўны спосаб вытворчасці ўжо сам па сабе дасць добрыя вынікі, было па меншай меры беспадстаўна.

Партыйныя арганізацыі Беларусі не ўлічвалі ўсёй складанасці гэтага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага працэсу, канкрэтных умоў, у якіх ён адбываўся, і вельмі імкнуліся паскорыць уцягванне сялян у калгасы. Калектывізацыя ў Бабруйскай акрузе паступова перарастала ў масавую: у 1929 г. у Глускім раёне ўжо мелася 20 калгасаў, а з 1930 г. пачалася суцэльная калектывізацыя, спачатку ў асобных сельсаветах, а потым і ў раёне.

У лістападзе 1929 г. ЦК ВКП(б) і СНК СССР прынялі рашэнне аб мабілізацыі 25 тысяч рабочых для пасылкі ў вёску. Для перабудовы беларускай вёскі выдзелілі 100 лепшых рабочых завода «Чырвонае Сормава» (г.Горкі, цяпер Н.Ноўгарад).

На злёце 25-тысячнікаў Беларусі ў студзені 1931 г. было аднадушна прынята рашэнне: замацаваць усіх рабочых 25-тысячнікаў у калгасах для правядзення суцэльнай калектывізацыі.

Дваццаціпяцітысячнікі працавалі і на Глушчыне. Напрыклад, т. Юхнавец узначаліў калгас «Чырвоны батрак» у Карпілаўскім сельсавеце, у 1931 г. старшынёй калгаса імя Калініна ў Жукавічах таксама стаў прадстаўнік рабочага класа М.І.Лабкоўскі.

Узяты курс на суцэльную калектывізацыю, на жаль, не мог абыйсціся без сіла-

вых метадаў. У вёскі раёна накіроўваліся групы ўпаўнаважаных. У прыватнасці, было створана 20 ударных брыгад па калектывізацыі, якія ў ход пускалі ўсё: агітацыю, угаворванне і нават пагрозы. У пагоні за высокімі тэмпамі, імкнучыся хутчэй адрапартаваць аб стварэнні новых калгасаў, праводзілася прымусовая калектывізацыя, і ўсё больш і больш ішло фарсіраванне гэтага працэсу. Пачалася сапраўдная вайна супраць працоўнага сялянства, якую аб'явіў яму Сталін і яго акружэнне.

У Бабруйскай акрузе, дарэчы, назіралася больш рэальнае разуменне партыйнымі і савецкімі работнікамі сапраўднага становішча спраў і крытычных адносін да дырэктыў зверху. Таму працэнт калектывізацыі тут быў некалькі ніжэй, чым у іншых месцах. Агульна вядома, што вясной 1930 г. адбыўся масавы выхад сялян з калгасаў. Гэта было характэрна для ўсіх акруг Беларусі і з'явілася непазбежным вынікам вялікай паспешнасці, буйных перагібаў, недапрацовак, жорсткіх памылак у ажыццяўленні калектывізацыі. Але раскручаны махавік, які набраў вялікія абароты, ужо не мог збавіць ход. 12 кастрычніка 1930 г. маскоўская газета «Правда» апублікавала паведамленне ТАСС аб росце калгаснага руху ў Беларусі. У ім гаварылася, што «...прыліў у калгасы ў БССР з кожным днём узмацняецца. Узніклі дзесяткі новых калектыўных гаспадарак... У Глускім раёне створаны тры новыя калгасы і ў старыя ўлілося 90 гаспадарак». Па стане на 1 чэрвеня 1931 г. на Глушчыне на шлях калектыўнага гаспадарання ўступілі 1800 сялянскіх гаспадарак, якія аб'ядналіся ў 70 калгасаў. Гэта склала каля 20 працэнтаў ад іх агульнай колькасці. Дарэчы, усяго ў раёне налічвалася 9650 гаспадарак.

На ліпеньскім 1931 г. Пленуме ЦК КП(б)Б выказвалася патрабаванне, каб у асноўным завяршыць калектывізацыю ў 1932 г. Гэта была яўна нерэальная задача, чарговае забяганне наперад. Як і раней, стаўка рабілася на сілавыя метады. Яны былі больш звыклыя і, як-ніяк, давалі рост паказчыкаў.

Калі прааналізаваць дынаміку развіцця калгаснага руху на Глушчыне па гадах, то відавочна, што асноўны пік калектывізацыі прыпадаў на 1932 г.: 1929 г. — створана 5 калгасаў, 1930 г. — 11, 1931 г. — 37, 1932 г. — 50 калгасаў.

Сяляне-аднаасобнікі аказаліся ў цяжкім становішчы: да іх ужываліся розныя меры прымусу, яны не мелі магчымасці атрымліваць крэдыты, адчувалі цяжкасці з набыццём насення, тэхнічнага інвентару, абкладваліся падаткам, дзейнічалі многія іншыя рагаткі, якія перашкаджалі нармальна весці гаспадарку. Сяляне не маглі супрацьстаяць такому націску і рабілі свой выбар на карысць калгасаў. У іншым разе яны аказваліся пад пагрозай быць сцёртымі ў жорнах магутнай рэпрэсіўнай машыны, якая пачынала працаваць у краіне ўсё больш і больш актыўна.

Памылкі і перагібы ў калгасным будаўніцтве былі абумоўлены тымі цяжкасцямі, якія ўзніклі на шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі ў СССР. Тагачасная прамысловасць была яшчэ не ў стане арганізаваць належнае тэхнічнае забеспячэнне калектыўных гаспадарак, не хапала сродкаў для капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку. У 1932 г. у Глускім раёне калгасам належала зусім нязначная колькасць складанай тэхнікі, ды і тую, на жаль, мела далёка не кожная гаспадарка. У гэты час на Глушчыне ўжо налічвалася 120 калгасаў, іх яравы клін складаў 15 500 гектараў, сеялася 8950 гектараў яравых зерневых, 1050 гектараў тэхнічных культур, у тым ліку 600 гектараў ільну; пасадка бульбы займала 3400 гектараў. А якім жа чынам усё гэта ўбіралася?

У распараджэнні калгасаў было толькі 28 сенакасілак, 55 конных грабляў, 60 жняярак-самаскідак, 8 снопавязалак, 12 бульбакапалак, 81 радковая сеялка. Няцяжка ўявіць, што з такой тэхнічнай «узброенасцю» не ўсе калгасныя палеткі своечасова засяваліся і ў патрэбныя тэрміны ўбіраліся. Здаралася, што вырашчаны ўраджай гінуў на карані. Такія абставіны часта параджалі нядбайныя адносіны калгаснікаў да калектыўнай працы, да калгаснай маёмасці, хоць і не без рызыкі трапіць у спісы «ворагаў народа». Менавіта такое ганебнае кляймо клалася на тых грамадзян, якія спакушаліся на грамадскую маёмасць. Гэта выцякала з прынятага ў жніўні 1932 г. закона аб ахове сацыялістычнай маёмасці, які атрымаў у народзе назву «закон пяці каласкоў».

Нават з арганізацыяй у раёне Глускай машынна-трактарнай станцыі (1933), на ўзбраенні якой спачатку было першых 15

Т.А.Казлова.

трактароў, асноўным транспартным сродкам заставалася сялянская фурманка, а цяглавай сілай калгасаў — коні. Іх было 7,2 тыс. Да вясны 1937 г. у раёне была арганізавана Рудабельская МТС. У 1939 г. у абодвух МТС налічвалася 38 трактароў, у тым ліку 15 гусенічных, 6 машын, з іх 4 грузавыя. У гэты час ужо было аб'яднана ў калгасы 3505 сялянскіх гаспадарак (36,3%).

Машынна-трактарныя станцыі адыгралі велізарную ролю ў далейшым развіцці калгасаў і саўгасаў, механізацыі іх вытворчасці. З дапамогай тэхнікі, сканцэнтраванай у МТС, у гаспадарках раёна выконваўся значны аб'ём сельскагаспадарчых работ, скарачаліся тэрміны іх правядзення. За паўгода да адкрыцця Глускай МТС пачалася падрыхтоўка першых механізатарскіх кадраў. Да тэхнікі асабліва цягнулася моладзь, і не толькі хлопцы, але і дзяўчаты. У трыццатыя гады першымі, хто сеў за рычагі трактара, сталі Несцер Ціцішын і Пракоп Кушнер з Барысаўшчыны, Фёдар Шыла з Завалочыц, А.Храпко з Жалвінца, Жлобіч з Калюгі. У ліку першых дзяўчат, каму скарыўся магутны трактар, была Таццяна Казлова з Заракушы. Закончыўшы курсы, яна працавала трактарысткай у Рудабельскай МТС, а прайшоўшы вучобу ў школе механізацыі сельскай гаспадаркі за год да Вялікай Айчыннай вайны, узначаліла ў гэтай МТС трактарную брыгаду. Не здрадзіла аднойчы выбранай прафесіі Таццяна Апанасаўна і пазней, пасля вайны, адпрацаваўшы 15 гадоў брыгадзірам, памочнікам брыгадзіра, учотчыцай трактарнай брыгады. Яе прыкладу паследавалі іншыя дзяўчаты.

Глуская МТС у 1936 г. узяла на абслугоўванне 44 калгасы з пасяўной плошчай 13 905 га, у тым ліку збожжавых і зернебабовых 9092 га, ільну 446 га, бульбы 2535 га. На аднаго працаздольнага калгасніка прыходзілася 2,1 га пасеваў, а на адну жывую і механічную к.с. 7,2 га. Адзін 15-сільны трактар абслугоўваў 357 га. У гэты час у Глускай МТС на ўзбраенні было 36 трактароў агульнай магутнасцю 591 к.с., працавала 70 трактарыстаў. Жанчын сярод іх не было. Вопыту ў трактарыстаў не даставала: толькі 20% іх саставу адпрацавала больш як два сезоны, менш як адзін сезон 44% механізатараў.

У ліпені 1930 г. адкрылася першая Усебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі, якая адлюстравала здабыткі працоўнага сялянства за гады першай пяцігодкі.

Механізаваная пасадка бульбы на Глушчыне. 1933 г.

З Глускага раёна ў выстаўцы ўдзельнічала 379 чалавек, у тым ліку 262 прадстаўнікі калгасаў, 53 чал. ад рабочых, 37 ад інтэлігенцыі, 18 ад саматужных арцеляў. Удзельнікамі выстаўкі сталі два калгасы: «Сарканайс Арайс» з в.Перакалле Латышскага сельсавета і «Зара камуны» з Усцярхоў, якія дэманстравалі свае дасягненні ў развіцці жывёлагадоўлі. Трыццатыя гады — гэта час нараджэння стаханаўскага руху, сацыялістычнага спаборніцтва.

Рэкордных выпрацовак дабіваліся ў розных галінах народнай гаспадаркі рабочыя і калгаснікі Глушчыны. Аб наватарах вытворчасці часта пісала раённая газета «Сцяг калектывізацыі», якая пачала выходзіць на змену газеце «Камунар Глушчыны». Яна сістэматычна асвятляла ход спаборніцтва за ганаровае званне называцца стаханаўцам. На старонках газеты дзяліліся вопытам тыя, хто ўжо заваяваў гэтае ганаровае званне. Яны заклікалі іншых працаваць так, каб Радзіма атрымала ад іх працы найбольшую карысць.

Паведамлялася, напрыклад, што ў калгасе «Серп і Молат» (в. Малінава) калгасніца Ганна Марціновіч жне збажыну сярпом па 24 — 27 сотак пры норме 12. Стаханаўка-льнавод калгаса «Новы шлях» Надзея Хурсевіч таксама дабілася значных поспехаў у працы. Яна націрала па 14,5 кілаграма льновалакна. Праз некаторы час гэты паказчык быў перакрыты яшчэ на 10,5 кілаграма. За ўдарную работу праўленне калгаса «Новы шлях» прэміравала стаханаўку грашовай прэміяй.

Іншыя калгасніцы рабілі па прыкладу Надзеі Хурсевіч. Сярод іх былі льнавод Аўдоцця Адзінец, Матрона Мішур, Параска Канавалава і інш.

Шырыўся стаханаўскі рух і сярод лесанарыхтоўшчыкаў раёна. Іх прадукцыя, калі краіна стала на рэйкі індустрыялізацыі, была вельмі патрэбнай. І гэта разумелі рабочыя лясніцтваў раёна, якія працавалі на лесапавале. Тут ставіліся свае рэкорды. Напрыклад, лесанарыхтоўшчыкі Зелянковіцкага лясніцтва Малаковіч і Адзінец выконвалі нормы на 350 працэнтаў. Гэта штатныя рабочыя Сямён Булка, Антон Патапенка, Мацвей Падаляк. Ад іх не адставалі пасланыя з калгасаў на дапамогу лесанарыхтоўшчыкам калгаснікі з калгаса імя Варашылава Навум Герман, Васіль Кісялевіч, Іван Герман; з калгаса «Сарканайс Арайс» Карп Шталь, Янка Лазовік, Янка Спруня, Віктар Жаўрык. У шэсць-сем разоў перавыконвалі нормы выпрацоўкі лесарубы са Слаўкавіцкага лясніцтва Марк Гардзей, Мукасей, Радвіновіч, Рыгор Сіраж.

У 1936 г. стаханаўскі рух ахапіў усе гаспадаркі, прадпрыемствы і ўстановы раёна. Права называцца стаханаўскімі дабіўся калгас імя Сталіна (в.Слаўкавічы), дзе быў сабраны рэкордны па раёне ўраджай ячменю — па 20 цэнтнераў з гектара; калгас імя Куйбышава (в.Клетнае), дзе з гектара было накапана па 208 цэнтнераў бульбы; калгас «Чырвоная Заракуша», які ў выніку выкарыстання на ўгнаенне торфакрошкі дабіўся значных поспехаў у павышэнні ўраджайнасці сельгаскультур.

Члены саюза лесасплаву пры арцелі «Спатры».

А.Т.Патапенка.

Дзякуючы стаханаўскаму руху, які быў разгорнуты ў швейнай арцелі «Прагрэс», прадпрыемства некалькі кварталаў запар утрымлівала пераходны Чырвоны сцяг абкома КП(б)Б і аблвыканкома. Лепшыя шаўцы арцелі Пётр Брэус, Якаў Яхніч месячныя нормы выконвалі на 140—150%, а па кравецкаму цэху лепшых паказчыкаў дабіліся Надзея Лугіна, Кацярына Дудар. Снежаньскі план 1936 г. яны выканалі на 195%. Дзякуючы старанню працаўнікоў шавецкай майстэрні, іх рабоце па-стаханаўску, арцель выпусціла на 3150 руб. прадукцыі звыш плана.

Стаханаўскі рух адыграў велізарную ролю ў справе па датэрміноваму выкананню планаў першых пяцігодак. Гэтае патрыятычнае пачынанне шырока распаўсюджвалася на прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах і саўгасах і садзейнічала таму, што многія працаўнікі праславілі свае імёны ўдарнай, стаханаўскай работай. Сярод іх быў старшыня калгаса імя Сталіна (в.Слаўкавічы) Аляксей Тарасавіч Патапенка, які ў ліку першых узнагароджаных у 1935—1936 гг. прадстаўнікоў калгаснай вёскі атрымаў ордэн «Знак Пашаны».

Т.А.Матусевіч.

Першая калгасная вясна

З успамінаў Мітрафана Аляксандравіча Тарасевіча

Старое жыццё трымалася ўчэпіста. У вёсцы гэта адчувалася асабліва востра. Беднякі ўсім сваім нутром цягнуліся да новага жыцця, з цікавасцю слухалі сельскіх актывістаў, якія расказвалі аб ленінскім кааператыўным плане, жылі марай стаць гаспадарамі сваёй зямлі. А кулакі таксама не драмалі. Хавалі хлеб, каб не аддаваць яго дзяржаве, падбухторвалі сераднякоў усяляк перашкаджаць праводзімай у вёсцы палітыцы кааперавання сялянскіх гаспадарак. Вясной 1929 г. самыя лютыя кулакі Гурыновіч, Яковіч, Перагуд, Савіцкі былі арыштаваны і высланы з вёсак.

Аднак гэта не знімала з нас, сельскіх актывістаў, адказнасці весці сярод сялян пастаянную агітацыю за калгасы. Да верасня 1929 г. у вёсцы Розлевічы амаль штодзённа праходзілі сходы сялян суседніх вёсак. На іх часта прысутнічаў сакратар Глускага райкома партыі т. Багданаў, які растлумачваў сялянам палітыку партыі і ўрада ў адносінах да сялянства. На адным з такіх сходаў 13 беднякоў з вёсак Жукавічы, Рылавічы і Розлевічы падалі заявы аб уступленні ў калгас. Гэта былі Хаўстовіч Мікалай, Корбут Аляксандр, Гуткоўскі Сцяпан, Тонкі Нічыпар, Баярка Павел і яго сёстры Адар'я і Фрося, Тарасевіч Матрына, Тонкі Барыс, Клімовіч Канстанцін, Клімовіч Іван, Клімовіч Сафрон, Клімовіч Яўхім, Імбра Лукер'я. Па прапанове камсамольца члена сельсавета Хаўстовіча Мікалая калгасу аднагалосна было прысвоена імя М.І.Калініна. На гэтым жа сходзе было выбрана праўленне калгаса. У яго ўвайшлі Мікалай Хаўстовіч, Канстанцін Клімовіч і я. А крыху пазней мяне выбралі старшынёй калгаса. Загадчыкам гаспадаркі (г. зн. брыгадзірам) быў абраны Барыс Тонкі.

З чаго пачаць? — паўстала пытанне. Вопыта кіруючай работы ў мяне не было. Скоса пазіралі кулакі, некаторыя нават пагражалі расправай. Яны разгарнулі вострую агітацыю супраць арганізатараў калгаса, распаўсюджвалі розныя чуткі сярод беднякоў. Патрэбна было канчаць з кулацтвам. У лістападзе члены праўлення зрабілі вопіс маёмасці шасці кулацкіх гаспадарак. Кулакі былі высланы з раёна, а іх маёмасць перадалі ў калгас.

Цяжкім быў гэты год. К вясне 1930 г. у калгасе ўжо налічвалася 105 галоў буйной рагатай жывёлы, 100 авечак, 150 свіней, 45 коней. І ўсю гэтую жывёлу даглядалі першыя ўступіўшыя ў калгас трынаццаць чалавек. Каб весці іншыя работы, не хапа-

ла людзей. А тут вось-вось у поле выязджаць патрэбна. Дзе знайсці выхад? Што рабіць? – гэтыя думкі не давалі мне спакою. А што, калі моладзь клікнуць на дапамогу? – прыйшло аднойчы ў галаву. Сельскія камсамольцы зарэкамендавалі сябе актыўнымі памочнікамі ў правядзенні калектывізацыі. На маю просьбу дапамагчы калгасу адгукнуўся райком камсамола. Ён звярнуўся з заклікам да камсамольцаў Бярозаўскага сельсавета аб уступленні ў калгас. Амаль усе камсамольцы вёсак Зубарэвічы і Зелянковічы падалі заявы і былі прыняты ў калгас на чале са сваім важаком Малаковічам. Спіс членаў калгаса папоўнілі камсамольцы Марыя Лісоўская і яе 14-гадовы брат Сяргей, Якаў Малаковіч, Сямён Сяленчык, Сямён Кірдун, Пётр Патапенка, Арцём Булка, Пётр Тарасевіч, Марфа Тарасевіч, Павел Тарасевіч, Еўдакія Тонкая, Яфім Клімовіч і многія іншыя.

Нялёгкай была першая калгасная вясна. Кулакі і аднаасобнікі, якія засталіся ў вёсцы, вырашылі сарваць наш першы выезд у поле. Перад гэтым яны пагражалі калгаснікам, што расправяцца з кожным, хто стане араць зямлю, пускалі розныя плёткі, каб збіць з толку людзей. Калі ж мы прыехалі ў поле, то сустрэлі тут групу аднаасобнікаў і заможных сялян. Натоўп зацята маўчаў. Як толькі прайшлі першую баразну, на нас кінуліся з каламі. Калгаснікі вымушаны былі пакінуць поле, а аднаасобнікі сталі араць далей пачаты намі палетак. Прыбыўшыя работнікі міліцыі дапамаглі нам навесці ў вёсцы парадак. Назаўтра прама на полі адбыўся мітынг, аратыя заворвалі старыя межы.

Першы год прынёс калгасу добры ўраджай. Многія сяляне, убачыўшы плён нашай працы, пераканаліся ў перавазе калектыўнай гаспадаркі і сталі ўступаць у калгас. Паявілася магчымасць стварыць вытворчыя брыгады, бо раней мы працавалі, як кажуць, талакой. У жывёлагадоўчых брыгадах замацоўвалі жывёлу за кожнай даяркай і свінаркай.

З цягам часу калгас пайшоў угору. Мы арганізавалі грамадскую калгасную сталовую. Да нас сталі прыязджаць сяляне з суседніх вёсак Зубарэвічы, Згоды, Побліна і іншых з просьбай арганізаваць і ў іх вёсках калгасы. Новае перамагала.

З успамінаў Рыгора Аляксандравіча Корбута

Камсамольцы Бярозаўскага сельсавета пад кіраўніцтвам свайго сакратара, вельмі энергічнага і ініцыятыўнага Ігната Малаковіча, прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі і наладжванні новага жыцця.

У доме выселенага кулака Гурыновіча быў створаны клуб і хата-чытальня, куды прыходзілі газеты і часопісы, было набыта крыху кніг мастацкай літаратуры. Гэтая колькасць значна папоўніла бібліятэку ў некалькі соцень кніг, якую падарылі рабочыя г. Бабруйска. У клубе праводзіліся цікавыя вечары, гучная чытка газет і часопісаў, быў арганізаваны лікбез (ліквідацыя непісьменнасці). Вучылі тут грамаце камсамольцы, а таксама настаўнікі Рыла-Розлевіцкай пачатковай школы Некрашэвіч і Рубан, а пазней Малашук і Дзяшчэня. Тут жа дэманстраваліся ў той час яшчэ нямыя кінафільмы, ставіліся п'есы, якія адпавядалі панаваўшай у вёсцы атмасферы. Быў створаны калгасны інтэрнат і сталовая. Пасля высялення кулакоў у вёсках засталося многа свабоднага жылля, у калгас пачалі прыбываць сямейныя людзі: Пятро Тоўсцік, Ілья Шумскі, Іван Шумскі, Арцём Кісель, Антон Лугін, Зелянкоў Павел, Мікалай Палазняк, Сцяпан Прыбыш і інш.

Кулакі, якія заставаліся яшчэ жыць у вёсках, імкнуліся падбухторыць працоўных аднаасобнікаў супраць калгасаў, распаўсюджваючы з гэтай мэтай усялякія небыліцы аб будучым. Пад антыкалгасную агітацыю кулакі стараліся падвесці і «навукова-гістарычную» базу. Неяк на адным сходзе выступіў іх прадстаўнік і павёў такую гутарку:

– Быў выпадак... вот, як і мы, у Англіі парашылі калісьці сацыялісты жыць агульна. Сабралі яны грошы і адзенне, якое было, у кучу і арганізавалі камунію. А толькі з гэтага нічога путнага не выйшла. Памучыліся яны такім вобчаствам з год, пражылі ўсё ў пух і прах і з голаду сталі ў акіяне тапіцца. З таго часу і называюцца яны сацыялісты-утапісты...

Выступаючаму не далі закончыць «лекцыю па гісторыі» і за полы кажуха сцягнулі са сцэны.

Але падобная агітацыя дзейнічала вельмі слаба. Цікава адзначыць, што пасля артыку-

ла Сталіна ў газеце «Правда» ад 2 сакавіка 1930 г. «Головокружение от успехов» ніхто з калгаса імя Калініна не выйшаў.

Вельмі сур'ёзным экзаменам для калгаснага ладу была веснавая сяўба 1930 г. Многія разумелі, што ад яе вынікаў у вялікай меры залежала далейшае ўмацаванне калгасаў, развіццё калектывізацыі, пазіцыя аднаасобнікаў, якія яшчэ ўсё вагаліся, уступаць ці не, і яшчэ шмат якія пытанні. Таму энтузіясты калгаснага ладу рашылі правесці першую калгасную вясну па-святочнаму, нягледзячы ні на якія цяжкасці.

У сем гадзін раніцы калгаснікі з чырвоным сцягам рушылі ў поле. Вецер развяваў сцяг, на якім былі напісаны кароткія простыя словы: «Няхай жыве камунізм!». Камсамолка Фрося Баярка пайшла са сцягам наперадзе, а за ёю рухаліся аратыя: Ігнат Малаковіч, Сямён Сяленчык, Сафрон Клімовіч, Аляксандр Корбут, Сцяпан Гуткоўскі і інш.

Следам за імі пайшлі сяляне — госці з суседніх вёсак, жанчыны і дзеці. Паблізу Жукавіч ляжала поле мінулагодняга жытнішча, апаясанае вузкімі загонамі, іх аддзяляюць адзін ад аднаго цвёрдыя высокія межы з пажоўклай дзікай травой.

Фрося ўзыйшла на пагорак і стала чакаць.

— Адсюль пачнем, — сказаў старшыня калгаса Тарасевіч.

Яшчэ вышэй узняла Фрося сцяг і пайшла ўперад па старой баразне. За Фросяй пагнаў сваю пару Ігнат Малаковіч, і калі плуг адвярнуў і паклаў першы пласт сырой зямлі, араты абярнуўся да сабраўшыхся людзей і з радасцю прамовіў:

— Пачынаем жыццё... новае, калгаснае на зямлі.

Фрося вяла аратых, за ёй шпарка рухаліся пары коней, плугі ўзнімалі барозны. Здавалася, што зямля распрамляе свае грудзі, рвучы паясы межаў, — спрадвечных ланцугоў, што рабілі людзей часам ворагамі. Зямля дыхала, яна, як і людзі, радавалася веснавому сонцу.

Зноў пайшлі ланцужкамі пары коней. Цёмна-шэрая паласа свежай раллі шырылася, займала ўсё большы і большы прастор поля. Людзі разыходзіліся, гаворачы адзін аднаму радасныя словы...

І назвалі вёску ў памяць аб рацэ Амур...

Шумяцічы. На сучаснай карце Глускага раёна вы ўжо не знойдзеце такога населенага пункта, не тутэйшаму чалавеку нічога цікавага не прыгадае гэтая назва. А спытайце ў старых, у людзей, што сталі жывой гісторыяй нашага жыцця, яны вам паведаюць пра Шумяцічы многа цікавага, раскажуць незвычайную біяграфію гэтай знікшай з карты вёскі.

Здавалася, вёска згубілася сярод векавечнага лесу. Цесна хіліліся да яго сялянскія хаткі, як бы просячы ў велікана-волата абароны ад буйных вятроў, цяжкіх дажджоў і частых хвароб. Народжваўся чалавек, узносіў небу праклёны за свой гаротны лёс, паміраў. І нішто не магло змяніць гэты шалёны кругаварот паміж жыццём і смерцю, нішто не парушала спакой гэтай ціхай затокі.

Падзеі Кастрычніка семнаццатага года былі каменем, кінутым у яе плынь. Загаманілі, зашумелі, нібы прачнуліся ад вечнага сну, шумяціцкія сяляне. Кожны пражыты дзень прыносіў у вёску навізну.

І аднойчы...

— Што гэта за камуна і з чым яе ядуць? – у непаразуменні пацікалі плячамі мужыкі. Відаць, слова гэтае моцна засела ў іх галовах, бо некалькі дзён толькі і размоў было на вёсцы, што пра камуну. Збіраліся людзі кучкамі, размаўлялі, спрачаліся, раіліся, думалі нялёгкую думу.

А падумаць сапраўды было над чым. Лёгка сказаць – уступі ў камуну. Значыць, аддай тую палоску, на якой гнуў спіну з таго самага часу, як памятаў сябе. А цяпер на гэтым шнурочку такім жа гаспадаром, як і ты, стануць Лапіцкія, Сушковы, Чалапаны і інш. А ці разамнуць яны рукамі кожны камяк зямлі, ці вырвуць травінку, ці выпрастаюць кожнае сцябло, прытаптанае конскім капытом? А як яно будзе ў той камуне? Можа, яшчэ горш, чым паасобку жыць, бач, людзі кажуць усялякае.

І ўсё ж новае перамагло. Хоць вельмі нялёгка было, з кроўю сэрца адрывалі ад сябе тое, што нажывалі дзесяцігоддзямі, пакідалі старыя звычкі, але шумяціцкія сяляне ўступілі ў камуну, арганізатарам якой стаў Павел Гарбачэўскі. Праўда, спа-

чатку іх было нямнога, не больш дваццаці сем'яў. Прыгожым словам назвалі камунары сваю арцель – «Іскра». А такую ідэю падаў зноў жа Павел Гарбачэўскі. Афармляючы ў раённым зямельным аддзеле неабходныя дакументы, ён сказаў: «Наша камуна – гэта толькі адна іскарка, а хутка ўсе вёскі будуць запалены імі».

І пайшла гуляць аб Шумяцічах гамонка па ўсяму Палессю. Людзі з суседніх вёсак прыходзілі паглядзець, як ідуць справы ў гаспадарцы, як жывуць камунары. Многім настолькі ўсё спадабалася, што пераязджалі сюды, каб уступіць у арцель. У Шумяцічы прыехалі сем'і Івана Лапіцкага, Ульяна Гаўрыліна, Гуранатых, Драздоўскіх і інш.

Ішоў час. Ён прынёс новае папаўненне ў дружную сям'ю іскраўцаў. А жыццё адкрывала перад шумяціцкімі сялянамі новыя невядомыя раней прасторы. Пачулі яны, што недзе на Далёкім Усходзе, на бурным Амуры, пачалася вялікая будоўля. Яна, нібы магнітам, прыцягвала да сябе моладзь. І многія хлопцы і дзяўчаты сабраліся ехаць на ўсход, каб пашукаць там сваё шчасце...

У зямельным аддзеле сядзела група жыхароў з вёсак Катка, Замасточча, Халопенічы. Прывяло іх сюды тое ж жаданне – ехаць на раку Амур, будаваць новы горад. Доўга гутарыў з мужыкамі старшыня райвыканкома Лупсякоў. І напаследак параіў: «Едзьце, паглядзіце, як жывуць у Шумяцічах, магчыма, і не патрэбны вам будзе Амур».

Сапраўды, многія жыхары навакольных вёсак знайшлі тут яшчэ лепшы Амур. Але ў памяць аб сваёй мары рашылі людзі назваць гэтым словам створаны тут неўзабаве калгас. З таго часу і вёска Шумяцічы стала называцца па-новаму. Першым старшынёй калгаса выбралі камуніста Дзмітрыя Багам'ю, селяніна з вёскі Катка.

Гэтак жа рупліва і дбайна, як і ў мінулыя гады, ладзілі сваю гаспадарку шумяціцкія сяляне. Калгас рос, мацнеў. Пасадзілі

І.Р.Варава.

сад, і кожнае лета пад яго дрэвамі кучкаваліся ўсё новыя і новыя хаткі з пчоламі. Змянілася жыццё людзей, трэба і вёску зрабіць прыгожай, рашылі калгаснікі. І застукалі ў Амуры сякеры, запелі пілы. Са смалістых, звонкіх бярвенняў будавалі калгаснікі сабе дамы, аздаблялі іх квеценню садоў.

Новым станавілася ўсё жыццё, па-новаму вылівалася і чалавечая радасць. Доўга памяталі старажылы, як спраўлялі ў калгасе першае вяселле. Старшыня аддаваў замуж за калгаснага сталяра Фёдара Смычніка сваю дачку Марыю. Без папа і вянца ўрачыстым рытуалам, на які сабраліся ў сельскі Савет не толькі жыхары Амура, але і суседзі, пачалося вяселле. На ім гулялі ўсім калгасам. Песнямі, танцамі, жартамі, рознымі падарункамі адорвалі маладых аднавяскоўцы. З таго часу па-новаму, так, як паказалі гэта ў Амуры, спраўлялі вяселле на ўсёй Слаўкаўшчыне...

На сучаснай карце, амаль на самай граніцы з Любанскім Палессем, ты знойдзеш маленькі кружочак і побач з ім слова «Амур» – тую вёску, якая калісьці называлася Шумяцічамі. Змянілася яе назва, сённяшняе пакаленне ўжо і не ведае яе. Але засталіся тут жыць людзі – нашчадкі далёкіх камунараў, — такія ж дружныя, мужныя, працавітыя, дастойныя сваіх продкаў.

Т.А.Матусевіч.

Арганізатары першых калгасаў і актывісты калгаснага руху

ВАРАВА Іван Рыгоравіч (1903—1987), нарадзіўся ў в. Бабровічы, адным з першых у 1931 г. уступіў у калгас «Чырвоны востраў» (в. Бабровічы). У 1934—1936 гг. працаваў старшынёй калгаса «Новае жыццё» (в. Старына), у фінансавых органах, спажыўкааперацыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся ў тыле ворага ў Глускай 100-й партызанскай брыгадзе, інструктар Глускага падпольнага райкома КП(б)Б. Пазней працаваў старшынёй калгасаў «Зара» (в. Халопенічы) і імя Дзяржынскага (в. Катка).

Дз.П.Зянькоўскі.

С.І.Корзун.

А.Я.Коўзун.

І.Г.Левітан.

ГАЛАМАКА Рыгор, нарадзіўся ў 1887 у в. Мыслоціна. Разам з 12 аднавяскоўцамі ў 1931 г. арганізаваў калгас «Чырвоная Мыслоціна» і стаў яго першым старшынёй.

ГОЛУБ Барыс Фёдаравіч (1904—1977), нарадзіўся ў Глуску. У 1924 – 1930 гг. працаваў старшынёй местачковага Савета. У 1931 – 1933 гг. – першы старшыня калгаса «Серп і Молат» (в. Малінава). У 1934 – 1937 гг. працаваў старшынёй Макавіцкага сельскага Савета. У 1937 – 1942 гг. быў рэпрэсіраваны, адбываў пакаранне на прыіску «Туманны» Магаданскай вобласці, у 1942 поўнасцю рэабілітаваны.

ДЗЕМІДОВІЧ Васіль Сцяпанавіч, нарадзіўся ў в. Калюга. Першы старшыня калгаса імя Гікалы, арганізаванага ў вёсцы ў 1931 г. Першапачаткова ў калгас уступіла 11 сем'яў.

ДЗЯШЧЭНЯ Спірыдон Барысавіч (1908—1986), нарадзіўся ў в. Воземля, у 1929 г. у ліку першых уступіў у камуну «Юны камунар» Азямлянскага сельсавета, а ў 1933 – 1934 гг. узначаліў тут калгас «Праўда», у 1938 – 1939 гг. старшыня калгаса «Серп і Молат» у м. Любань. Актыўна ўдзельнічаў ва ўсенароднай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у партызанскім атрадзе імя Чапаева.

ЗЯНЬКОЎСКІ Дзмітрый Панкратавіч (1901—1959), нарадзіўся ў в. Халопенічы, у 1933 – 1937 гг. працаваў старшынёй калгаса «Зара» (в. Халопенічы), у 1937 – 1940 гг. старшыня калгаса «Бальшавік» (в. Катка), з 1940 да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў калгас імя Чапаева (пас. Чапаева). У час вайны радавы партызанскага атрада імя Казлова брыгады № 99. У 1946 – 1948 гг. узначальваў калгас «Чырвоны пераможца» (в. Пагост), пазней працаваў старшынёй калгаса «Бальшавік» (в. Катка), на іншых пасадах у калгасе імя Дзяржынскага (в. Катка).

КНЫШ Аляксей Лявонавіч (1901—1961), нарадзіўся ў п. Кіі Глускага раёна. У 1929 – 1932 гг. працаваў старшынёй Сіманавіцкага сельсавета. Пасля ўзначальваў брыгаду ў саўгасе «Завалочыцы», працаваў брыгадзірам да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Баец групы па арганізацыі партызанскіх атрадаў на Глушчыне. Трапіў у Бабруйскі лагер ваеннапалонных. З 1942 г. у 161-й партызанскай брыгадзе імя Катоўскага.

КОРЗУН Сцяпан Іванавіч, нарадзіўся ў в. Макавічы, першы старшыня арганізаванага тут у 1929 г. калгаса «Чырвоны шлях», у які аб'ядналіся 24 сялянскія гаспадаркі.

КОЎЗУН Антон Яўстратавіч (1901—1953), нарадзіўся ў в. Заракуша. У 1931 – 1933 гг. старшыня калгаса «Новая Заракуша», пазней узначаліў калгас «Чырвоны баец» (в. Стражы). У 1934 – 1937 гг. працаваў старшынёй Слаўкавіцкага сельсавета, з 1939 да пачатку Вялікай Айчыннай вайны старшыня Каткаўскага сельсавета. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны — баец атрада імя Варашылава 161-й партызанскай брыгады. Пасля працаваў на розных кіруючых пасадах.

КРУГАЛЬ Сямён Захаравіч (1901—1966), нарадзіўся ў в. Катка. У 1934 – 1941 гг. працаваў брыгадзірам калгаса «Бальшавік» (в. Катка), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945 – 1946 гг. працаваў старшынёй калгаса «Бальшавік».

ЛЕВІТАН Іцка Гіршавіч (1909—1991), нарадзіўся ў Глуску, у 1928 – 1931 гг. шавец Глускай саматужна-прамысловай арцелі «Чырвоны працаўнік», пазней культработнік гэтай жа арцелі. У 1932 – 1933 гг. працаваў загадчыкам хаты-чытальні ў в. Касарычы. Пасля заканчэння курсаў парторгаў пры ЦК КП(б)Б быў накіраваны на работу ў калгас. У 1934 г. узначальваў калгас «Чырвонае Замасточча», пазней працаваў старшынёй калгаса «Бальшавік» (в. Катка), у 1935 – 1937 гг. старшыня Глускага местачковага Савета. У 1937 – 1940 гг. старшыня калгаса «Рэвалюцыйны ўзрыў» (Глуск).

ЛУЗАН Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў в. Пяценка. У 1931 г. стаў першым старшынёй створанага ў вёсцы калгаса «Вастраў сацыялізма».

НАЗАРАЎ Канстанцін Фёдаравіч (1902—1966), нарадзіўся ў в. Слаўкавічы. У 1931 – 1935 гг. працаваў брыгадзірам калгаса «Сцяг калектывізацыі» (в. Заграбелле), з 1940 г. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў калгас «Сцяг калектыві-

зацыі». У гады вайны прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на Глушчыне. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вучыўся, а потым працаваў старшынёй Слаўкавіцкага сельскага Савета, у 1947 – 1950 гг. старшыня калгасаў «Чырвоны баец» (в. Стражы), «Сцяг калектывізацыі» (в. Заграбелле).

ПАЦАЙ Якім Іванавіч, нарадзіўся ў в. Заракуша, першы старшыня калгаса, які быў створаны ў вёсцы ў 1929 г.

ПІНЧУК Канстанцін Данілавіч, у 1930-я гады старшыня калгаса «XVIII партз'езд» (в. Касарычы).

РАГОВІЧ Аляксей Якаўлевіч (1901—1955), нарадзіўся ў в. Нова-Дуброва Глускага раёна. У 1929 – 1933 гг. першы старшыня калгаса «Сознание» (в. Нова-Дуброва). Пасля заканчэння курсаў цэнтральнай калгаснай школы ў м. Копыль Аршанскага раёна ў 1934 – 1935 гг. узначальваў калгас «Беларуская вёска» (в. Шкава Азямлянскага сельсавета), затым працаваў старшынёй гэтага ж сельсавета, а ў 1936 – 1937 гг. зноў старшыня калгаса «Беларуская вёска», у 1937 – 1941 гг. старшыня Бярозаўскага сельсавета. У гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся ў партызанскім атрадзе імя Шчорса. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў намеснікам старшыні райвыканкома, у 1950 – 1955 гг. узначальваў калгасы «Будаўнік сацыялізма» (в. Турыно) і імя Леніна (в. Дуброва).

СТАНКЕВІЧ Уладзімір Адамавіч (1909—1963), нарадзіўся ў в. Баянава, першы старшыня калгаса «Чырвоны маяк» (в. Баянава), створанага ў 1931 г. Пазней працаваў рахункаводам гэтай жа гаспадаркі, у 1934 – 1935 гг. узначальваў калгас «Чырвоны працаўнік» (в. Вайцяхова), у 1935 – 1939 гг. зноў старшыня калгаса «Чырвоны маяк». У 1939 – 1940 гг. працаваў старшынёй Сімanавіцкага сельскага Савета, пазней загадчыкам дарожнага аддзела Глускага райвыканкома. З першага дня Вялікай Айчыннай вайны змагаўся супраць фашысцкіх захопнікаў у знішчальным батальёне, актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Глушчыне. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў сакратаром па кадрах Глускага райкома КПБ, старшынёй Макавіцкага і Хваставіцкага сельскіх Саветаў, намеснікам старшыні райвыканкома, старшынёй калгаса імя Куйбышава (в. Клетнае).

У.А.Станкевіч.

М.А.Тарасевіч.

А.М.Тоўсцік.

ТАРАСЕВІЧ Мітрафан Аляксандравіч (1902—1972), нарадзіўся у в. Розлевічы, першы старшыня калгаса імя Калініна (в. Жукавічы), створанага ў 1929 г. У 1931 – 1940 гг. працаваў старшынёй Бярозаўскага, Азямлянскага, Макавіцкага сельскіх Саветаў, актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ТОЎСЦІК Апанас Мікалаевіч (1902—1962), нарадзіўся ў в.Чыкілі. У 1931 – 1941 гг. першы старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец». У гады Вялікай Айчыннай вайны быў падпольшчыкам, потым змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў атрадзе імя Шчорса 37-й партызанскай брыгады. Пасля вызвалення раёна ад нямецкіх акупантаў у 1944 – 1953 гг. узначальваў калгас «Чырвоны пуцілавец», потым працаваў намеснікам старшыні калгаса.

І радзіма бывае чужбінай

З успамінаў Алены Фёдараўны Траяноўскай

Мне споўнілася 7 гадоў, як не стала бацькі, яго забілі ў 1914 г. З маці-ўдавой засталіся мы, трое яе дзяцей. Нішто ніякай бяды не прадвяшчала. Жылі і самаддана працавалі ў в. Засценак Усцярхі. Усю мужчынскую справу хутка ўскінула на свае худыя плечы маці: касіла, арала, расціла і сабірала хлеб. У памешчыка купіла за грошы 55 дзесяцін зямлі. У нас было сваё поле, участак лесу і свой сенакос. У дварэ тры-

зацыі». У гады вайны прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на Глушчыне. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вучыўся, а потым працаваў старшынёй Слаўкавіцкага сельскага Савета, у 1947—1950 гг. старшыня калгасаў «Чырвоны баец» (в. Стражы), «Сцяг калектывізацыі» (в. Заграбелле).

ПАЦАЙ Якім Іванавіч, нарадзіўся ў в. Заракуша, першы старшыня калгаса, які быў створаны ў вёсцы ў 1929 г.

ПІНЧУК Канстанцін Данілавіч, у 1930-я гады старшыня калгаса «XVIII партз'езд» (в. Касарычы).

РАГОВІЧ Аляксей Якаўлевіч (1901—1955), нарадзіўся ў в. Нова-Дуброва Глускага раёна. У 1929—1933 гг. першы старшыня калгаса «Сознание» (в. Нова-Дуброва). Пасля заканчэння курсаў цэнтральнай калгаснай школы ў м. Копыль Аршанскага раёна ў 1934—1935 гг. узначальваў калгас «Беларуская вёска» (в. Шкава Азямлянскага сельсавета), затым працаваў старшынёй гэтага ж сельсавета, а ў 1936—1937 гг. зноў старшыня калгаса «Беларуская вёска», у 1937—1941 гг. старшыня Бярозаўскага сельсавета. У гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся ў партызанскім атрадзе імя Шчорса. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў намеснікам старшыні райвыканкома, у 1950—1955 гг. узначальваў калгасы «Будаўнік сацыялізма» (в. Турыно) і імя Леніна (в. Дуброва).

СТАНКЕВІЧ Уладзімір Адамавіч (1909—1963), нарадзіўся ў в. Баянава, першы старшыня калгаса «Чырвоны маяк» (в. Баянава), створанага ў 1931 г. Пазней працаваў рахункаводам гэтай жа гаспадаркі, у 1934—1935 гг. узначальваў калгас «Чырвоны працаўнік» (в. Вайцяхова), у 1935—1939 гг. зноў старшыня калгаса «Чырвоны маяк». У 1939—1940 гг. працаваў старшынёй Сіманавіцкага сельскага Савета, пазней загадчыкам дарожнага аддзела Глускага райвыканкома. З першага дня Вялікай Айчыннай вайны змагаўся супраць фашысцкіх захопнікаў у знішчальным батальёне, актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Глушчыне. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў сакратаром па кадрах Глускага райкома КПБ, старшынёй Макавіцкага і Хваставіцкага сельскіх Саветаў, намеснікам старшыні райвыканкома, старшынёй калгаса імя Куйбышава (в. Клетнае).

У.А.Станкевіч.

М.А.Тарасевіч.

А.М.Тоўсцік.

ТАРАСЕВІЧ Мітрафан Аляксандравіч (1902—1972), нарадзіўся у в. Розлевічы, першы старшыня калгаса імя Калініна (в. Жукавічы), створанага ў 1929 г. У 1931—1940 гг. працаваў старшынёй Бярозаўскага, Азямлянскага, Макавіцкага сельскіх Саветаў, актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ТОЎСЦІК Апанас Мікалаевіч (1902—1962), нарадзіўся ў в.Чыкілі. У 1931—1941 гг. першы старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец». У гады Вялікай Айчыннай вайны быў падпольшчыкам, потым змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў атрадзе імя Шчорса 37-й партызанскай брыгады. Пасля вызвалення раёна ад нямецкіх акупантаў у 1944—1953 гг. узначальваў калгас «Чырвоны пуцілавец», потым працаваў намеснікам старшыні калгаса.

І радзіма бывае чужбінай

З успамінаў Алены Фёдараўны Траяноўскай

Мне споўнілася 7 гадоў, як не стала бацькі, яго забілі ў 1914 г. З маці-ўдавой засталіся мы, трое яе дзяцей. Нішто ніякай бяды не прадвяшчала. Жылі і самааддана працавалі ў в. Засценак Усцярхі. Усю мужчынскую справу хутка ўскінула на свае худыя плечы маці: касіла, арала, расціла і сабірала хлеб. У памешчыка купіла за грошы 55 дзесяцін зямлі. У нас было сваё поле, участак лесу і свой сенакос. У дварэ тры-

А.Ф.Траяноўская.

І.А.Траяноўскі.

малі 6 кароў, 4 коней, 2 цёлкі. Хапала справы рукам. Змалку нас вучыла маці не цурацца цяжкай працы, любіць і паважаць яе. І ўсё ж адчувалася няхватка моцных рук у такой вялікай хатняй гаспадарцы. І маці выйшла замуж у другі раз. Сталі жыць з айчымам.

Мы прачыналіся і загадзя ўжо ведалі, каго якая работа чакае. Ніводнай хвіліны мы не маглі сядзець без справы. Бачым, што маці серп са сцяны знімае і хусцінкай паркалёвай валасы пакрывае — і мы за ёй у поле жаць. З ранку да цямна. І нейкім асаблівым святам і асалодай былі дні, калі паспяхова завяршалі адну справу, каб займацца іншай. Дасканала спазнаўшы свой кавалак зямлі і ўмела ім карыстаючыся, штогод атрымлівалі добры ўраджай. Жывёлу даглядалі найлепшым чынам: на зіму рыхтавалі дастаткова сена, каб не галадала. Мы ніколі не адмаўлялі ў просьбе тым, хто быў бядней нас.

Усіх у в. Засценак Усцярхі налічвалася 48 сем'яў. І вось 12 з іх былі прызнаны ў 1929 г. кулакамі...

Успамінаю адзін з зімовых дзён перад Калядамі, калі ў вёсцы з'явілася «нячыстая сіла» і ўсё ліха змятала, зрывала на сваім шляху. Жывёлу сталі зганяць у адзін двор, усё, чым мы запасліся на зіму, у нас канфіскавалі. А людзей павыганялі з хат. «Кулакі, — заяўлялі нам, — вы зараз нікому не патрэбны». А самі запіхвалі ў рот вялікімі порцыямі нашу «раскулачаную» каўбасу. Як жа брыдка было на ўсё гэта пазіраць. А ў дадатак нехта з «прадстаўнікоў» савецкай улады заявіў, што хаты ўжо не нашы, а нас чакае іншы лёс. Божа літасны, думала я, якія ж мы кулакі, ворагі народа, каму і чым нашкодзілі? Няўжо сваёй працай і любоўю да зямлі бацькоў мы заслужылі такую пагарду да нас і зняважу?

Нас сем'ямі, як лютых ворагаў савецкай улады, пагрузілі на падводы і павезлі невядома куды. Браць, акрамя мяшкоў, нічога не дазвалялі. Так гэта ўсё хутка адбылося, што многія нават скарынкі хлеба не паспелі прыхапіць з сабой. У Старых Дарогах нас пагрузілі ў таварняк, не сказаўшы ні слова, ні паўслова.

Цэлых 12 цяжкіх галодных дзён мы былі ў дарозе. Галодныя дзеці не спалі начамі. А далей было самае страшнае — этапы, перасыльныя пункты. Зараз, зразумейце мяне, вельмі цяжка тлумачыць, што мы адчувалі тады, калі спрабавалі ўсвядоміць, што адбываецца. Я адна з той шматтысячнай арміі ахвяр, што прайшлі праз цяжкія выпрабаванні, якія, здаецца, не можа ўмясціць і вынесці чалавечае жыццё.

Застаўся ў далёкім-далёкім мінулым і голад. Толькі памяць раз-пораз вяртае мяне туды, дзе я была чужой свайму народу, савецкай уладзе.

... Напачатку мы жылі на станцыі Таўда. Пакуль лёд на рацэ не трэснуў. Затым людзей пагрузілі на тры вялікія баржы. Па дарозе іх расфарміроўвалі. Нас выкінулі ў пасёлку Чарняўка. Як зараз памятаю: там адзінока стаяла і бяздзейнічала царква. Мы пасяліліся на святым месцы.

Не паспелі прадыхнуць і дастаць з вымакшых мяшкоў па скарынцы хлеба і паднесці да рота, як нас зноў павялі. Па компасе, у лес, да пасёлка Чаш. А камароў было — не адбіцца. І сталі мы, старыя і малыя, валіць і рэзаць лес, будаваць хаты. Я на Урале добра вывучыла сякерную справу. Нават зараз, у свае 83 гады, я сама калю сабе дровы. У мяне і памяць аб Урале засталася такая ж калючая і рэжучая, як піла-аднаручка, з якой я ўсе 17 страшных гадоў не разлучалася.

А зямля там была гліністая, не такая мяккая і цёплая, як у роднай Беларусі, па якой так сумавала сэрца. З цягам часу заўважылі нашу вялікую працавітасць, змілаваліся над намі, сталі на працаздольнага выдзяляць муку, алей і сухую рыбку і кілаграм крупы на месяц. Увесь наш харч.

Камендант і дзесятнікі не дазвалялі нам ні раіцца з імі, ні звяртацца да іх. Пільна ўсё правяралі: пасылкі, пісьмы.

Ажно цэлых 17 гадоў адхадзіла я ў лапцях. У лапцях выходзіла замуж за Траяноўскага Івана Антонавіча. Першая мая радасць на высылцы — нараджэнне дачкі — была вельмі кароткай і слёзнай. Зусім мала пражыўшы, дачушка памірае. І зараз дрыжыкі бягуць па маім схуднелым старым целе, калі пачынаю варочаць у памяці апошнія хвіліны развітання з ёй.

Непасільная праца на высечках не дазваляла доўга думаць і разважаць. Стала яшчэ горш жыць, калі мужа ні з таго ні з сяго забіраюць за краты ажно на паўтара года. Некаму здалося нават мяккім пакаранне яго высылкай. А ў мяне ўжо падрастаў сынок, мая пацеха.

Хутка нас чакала новае перасяленне — в. Баянаўка Паўночна-Уральскага раёна. Маці і айчыма з намі разлучылі. Я прасілася ў каменданта, каб ён дазволіў мяне і сына пераправіць туды, дзе былі родныя, і нам не адмовілі.

Апошняе месца нашых пакут — Салікамскі раён. Якраз тут мы і даведаліся, што пачалася вайна. Недзе зямля палівалася крывёй, а мы займаліся лесанарыхтоўкамі. Значыць, некаму ў той грозны час было яшчэ горш, чым нам.

Ц.М.Аксюцін.

Падарванае здароўе, загубленая маладосць, страта траіх дзетак — вось цана высылкі. Не заставалася ні променя надзеі. Вайна з фашыстамі два гады як закончылася, а нашы пакуты і бадзянні працягваліся. Настаў 1947 г. — час вызвалення тысяч сямей-беларусаў. Сталі збіраць сходы і аб'яўляць нам: «У каго ёсць радня на радзіме, каго цягне дадому — можа ехаць. Вы свабодныя». А мы плакалі ад свабоды... У той жа дзень ад'язджалі на родную зямлю, з якой нас так надоўга разлучылі.

Запісала Л.П.Слонкіна.

Воля і праца людзей дзіўныя цуды твораць

З успамінаў Цярэнція Мацвеевіча Аксюціна

Недалёка ад в. Барбарова раскінуўся велізарны тарфяны масіў. Тутэйшы калгас «Радзіма» знаходзіцца на мяжы з бясслаўным калісьці Палессем. Былое гэтай тэрыторыі кожны чалавек уяўляе сабе як край дрымучых лясоў і непраходных балот. Так яно і было на самай справе. Да навакольных вёсак ушчыльную падступала гіблае месца, якое некалі атрымала назву Дзікае балота. На ім амаль нічога не расло, а жыхары в. Барбарова штогод з кожнай дзесяціны накошвалі толькі некалькі пудоў сена. А з якімі цяжкасцямі гэта сена даставалася! Было нават і такое, што траву сяляне касілі па пояс у вадзе, асцярожна перабіраючыся з купіны на купіну. Ступіш на яе, а яна пад нагамі раптам правальваецца, і касец акунаецца ў рудую ваду ледзь не з галавой. Аб ураджаі нават і гаварыць няма чаго. З усяго масіву больш за паўтары тысячы гектараў балотных сенажацей накошвалі крыху больш за тысячу тон сена. А каму была справа да таго, што сяляне хварэлі, гнілі зажыва і гінулі ў гэтым, тысячу раз праклятым людзьмі, месцы. Здарыцца восень дажджлівая, дык ад вёскі да вёскі не прабрацца. Жылі палешукі адрэзанымі ад усяго белага свету. Нацярпеліся, нагараваліся людзі, жывучы побач з Дзікім балотам.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вырашылі мужыкі ўзяцца як след за балота, каб яно было не ворагам, а прыносіла карысць людзям. І ў першыя гады савецкай улады прыступілі да ажыццяўлення сваіх задумак.

Аднойчы на сходзе сяляне вырашылі звярнуцца ў Наркамзем БССР з просьбай дапамагчы асушыць гэта балота. Да заявы сялян аднесліся ўважліва, і вясной 1924 г. прыехалі ў вёску інжынер-меліяратар Важаеўскі і гідратэхнік Барысевіч. Пахадзілі, агледзелі прыдзірліва навакольныя тэрыторыі, і неўзабаве было арганізавана

А.Я.Кураленя.

меліярацыйнае таварыства, у склад праўлення якога ўвайшоў і я. Дзяржава аказала нашаму таварыству вялікую дапамогу, прыслаўшы для распрацоўкі балота спецыялістаў-меліяратараў. Яны зрабілі схему будучых асушальных каналаў, пераходаў і г.д. Працаваць было цяжка, тэхнікі ніякай, магістралі і асушальныя каналы капалі ўручную рыдлёўкамі. Але людзі не адступалі, настойлівая праца сялян хутка дала вынік. Да 1926 г. была асушана плошча ў 30 гектараў, і мы пачалі яе апрацоўваць.

Спачатку аралі тарфянікі коньмі. Неўзабаве мяне накіравалі на курсы трактарыстаў. Назад вярнуўся на трактары «Фардзон». На ім мы ўзаралі некалькі гектараў тарфянікаў і засеялі іх шматгадовымі травамі. Ураджай атрымаўся выдатны.

У 1931 г. у вёсцы арганізаваўся калгас «Трэці рашаючы», якому была выдзелена меліярацыйная тэхніка. За кароткі тэрмін асушылі сотні гектараў каштоўнейшых зямель. Штогод кожны з іх даваў да 50 цэнтнераў сена шматгадовых траў. З 1937 г. я ўзначаліў гэты калгас, які стаў удзельнікам сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве, атрымаў дыплом другой ступені і прэмію — матацыкл.

У 1960-я гады ў калгасе ўжо было асвоена 2700 гектараў забалочаных зямель. На былым Малінаўскім балоце сталі вырошчваць штогод добрыя ўраджаі сеяных траў і кукурузы. Добра родзяць на гэтых землях авёс, цукровыя буракі, бульба, азімае жыта. У гаспадарцы не засталося ніводнага гектара забалочаных зямель. Хлебаробы павышаюць ураджайнасць культур, якія вырошчваюцца на тарфяніках. Гэта прыносіць новы дастатак.

З памяці не выкрасліць

З успамінаў Аляксандра Якаўлевіча Куралені

Стаіць паміж лясоў невялікая вёска. Яна, бадай, нічым не адрозніваецца ад дзесяткаў і соцень іншых вёсак Беларусі: такі ж родны няяркі пейзаж, таксама галосна і звонка спяваюць тут улетку раніцай жаўрукі. Назва вёскі таксама звычайная — Макавічы. Старажылы сцвярджаюць, быццам назвалі яе так таму, што з даўніх часоў сяляне на сваіх надзелах (хто больш, а хто менш) абавязкова сеялі мак. Іх сталі называць макаўчанамі, а паселішча, дзе яны жылі, — Макавічы...

Асноўным цяжарам жыцця сялян дарэвалюцыйнай вёскі было беззямелле і малазямелле. 336 дзесяцін ворнай зямлі было ў жыхароў Макавіч. Яны выраблялі 11000 пар лапцей, ткалі 3300 аршын палатна, мелі ва ўласным карыстанні 55 ступ, 30 жорнаў, 165 прасніц, 180 цапоў. Спрадвечныя гора і пакуты прыносілі сялянам непраходныя балоты. Каўтун, малярыя і іншыя хваробы былі пастаяннымі спадарожнікамі іх жыцця. Голад і нястача трывала пасяліліся ў сялянскіх хатах. Уставаў гаспадар на досвітку і ледзь-ледзь выгляне сонейка на небе — ён ужо ў полі, працуе тут дацямна. І так дзень у дзень, з году ў год. Здабыткі яго працы ішлі пану, папу, цару-бацюшку.

Насельніцтва вёскі было непісьменным. Калі хто-небудзь з жыхароў атрымліваў пісьмо, то яму прыходзілася абысці амаль паўвёскі, каб натрапіць на чалавека, які мог бы прачытаць гэты ліст. У такіх выпадках звярталіся сяляне да сваіх аднавяскоўцаў С.Л.Аношкі, К.Л.Пятрэні, А.П.Гараймовіча, А.К.Пятрэні і С.Ф.Скіндзера, якія маглі з вялікай цяжкасцю пісаць і чытаць, але лічыліся самымі вучонымі людзьмі ў нашай вёсцы. Рэха вялікіх перамен, што адбыліся ў сталічных гарадах, дакацілася і сюды, у глухі і далёкі куток беларускай зямлі...

Неўзабаве арганізавалі ў Макавічах калгас «Чырвоны шлях». У 1930 г. у яго аб'ядналіся 24 сялянскія гаспадаркі. Аднымі з першых уступілі ў калгас Адам Аднамах,

Сцяпан Корзун, Міхаіл Калінкін, Сямён Мазуркевіч, Аксіння Кузьміцкая, Аляксандр Мазуркевіч і інш. І абралі яны першым старшынёй свайго аднавяскоўца Сцяпана Корзуна. Амаль 15 гадоў знаходзіўся ён на гэтай пасадзе і многа зрабіў, каб жыццё макаўчан змянілася, стала лепшым.

Небагатай у той час была арцельная гаспадарка: 25 коней, 15 плугоў, 16 барон, 20 кароў. Але моцная была вера людзей у калектыўную працу, у тое, што толькі так змогуць яны пераадолець любыя цяжкасці. А цяжкасцей было шмат...

Адным з першых уступіў у сельгасарцель бядняк Аляксей Кузьміцкі. Потым ён паддаўся агітацыі кулакоў Дамброўскага, Станішэўскага і Міхневіча і выйшаў з калгаса. Не адзін раз прыйшлося гутарыць з ім старшыні калгаса С.І.Корзуну і старшыні сельсавета С.Л.Аношку. Не адразу зразумеў Кузьміцкі, хто сапраўды жадае яму і яго дзецям дабра. Больш паўгода пра калгас і слухаць не хацеў. А калі зразумеў усё, вярнуўся да тых, з кім пачынаў рабіць першыя крокі ў калектывізацыі і неўзабаве стаў адным з перадавых калгаснікаў.

Жыццё паступова пачало наладжвацца. На калгасных палях з'явіўся першы трактар. Паглядзець на яго сабралася ўся вёска — і старыя, і малыя. А трактарыст, яшчэ зусім малады хлапчук, вёў сталёвага каня па шырокай калгаснай вуліцы і радасна ўсміхаўся ўсім сустрэчным. А потым мужчыны яшчэ доўга хадзілі ўслед за трактарам па барознах, правяралі, ці добра ён арэ. Доўга не сціхалі ў вёсцы размовы і, нарэшце, усе прыйшлі да адзінай думкі: «Добрая машына». Калі сяляне ўбачылі перавагу калгаснага ладу, пачалося масавае ўступленне ў калгас.

З 1933 г. заняліся будаўніцтвам першых жывёлагадоўчых памяшканняў, потым арганізавалі работы па асушцы балот. Тэхнікі не было ніякай, таму прыходзілася ўсё рабіць уручную.

Таго, што было, з памяці не выкрасліць. Рос калгас, а разам з ім расла і культура вёскі, мянялася яе аблічча. У Макавічах была адкрыта пачатковая школа, настаўнікам у якой працаваў Лукаш Васільевіч Мажэйка. Надзвычай цяжкія былі ўмовы для працы. Заняткі праводзіліся ў наёмным памяшканні ў дзве змены, не хапала падручнікаў, пісьмовых прылад. Сяляне на агульным сходзе рашылі адвесці ўчастак для пабудовы школы. І кожны селянін абавязаўся аказаць дапамогу ў вывазцы будаўнічых матэрыялаў. Так агульнымі сіламі і на агульныя сродкі было пабудавана школьнае памяшканне.

Знамянальным для настаўнікаў і вучняў з'явілася 1 верасня 1934 г. У гэты дзень у вёсцы быў арганізаваны першы піянерскі атрад, а крыху пазней — камсамольская арганізацыя. Пад кіраўніцтвам дырэктара сямігадовай школы Васіля Рыгоравіча Мельніка камсамольцы і піянеры арганізоўвалі нядзельнікі, дапамагалі на палетках роднаму калгасу, наладжвалі палітычную вучобу і культурны адпачынак вясковай моладзі, усяго насельніцтва вёскі. Школа была тым асяродкам ведаў і культуры, які накладваў свой адбітак на ўсё вясковае жыццё.

Дакументы сведчаць

СПРАВАЗДАЧА ПАЛІТЫЧНАГА ПАДАДДЗЕЛА БАБРУЙСКАГА ПАВЯТОВАГА ЗЕМАДДЗЕЛА АБ АРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ АРЦЕЛЕЙ ЗА ПЕРЫЯД З 1 ПА 25 ВЕРАСНЯ 1920 г.

26 верасня 1920 г.

Политический отдел Бобруйского уземотдела приступил к деятельности 1 сентября 1920 г. в составе заведующего подотделом тов. Балтручука, делопроизводителя Ибшмана, инструкторов: Кабановича, Ранцева, Косиловича и Волкова.

За это время организованы в разных областях 13 сельскохозяйственных трудовых артелей, зарегистрированных подотделом и приступивших к обработке и засеву земли. Из них 5 в Новодорожской вол., 2 в Паричах, которые обследуются и инструктируются инструктором тов. Косиловичем, 4 в Турковской вол., из них артель «Пчелка» уже обработала 30 дес. земли, засеянной озимым хлебом, ей предоставлен фальварк Белятин, землю которого взялась обработать эта артель. Артель «Усохская», обследованная инструктором Ранцевым, состоящая из 8 семейств, обработала 10 дес. земли. За отсутствием лошадей и земледельческих орудий назван-

ная артель не была в состоянии при всем своем желании обсеменить большой участок земли. Политический отдел снабдил Усохскую артель двумя плугами, одной бороной и двумя лошадьми. В настоящее время работа этой артели весьма успешная и плодотворная. Одна артель вновь организовалась в Глусской вол., не обследованная еще инструктором.

Одна артель в Горбацевичской вол., в имении Баневка, состоящая из пяти семейств, обследована 25 сего месяца инструктором Волковым. За неимением живого инвентаря, земельных орудий эта артель не имела возможности обработать более 3 дес. земли. Принимаются меры для снабжения этой артели лошадьми, плугом и бороной. Как видно из доклада инструктора Волкова, Баневская артель дает хорошие результаты.

Политическому подотделу приходится работать при крайне неблагоприятных условиях, не имея никаких денежных средств и субсидий, что стесняет даже командировать инструкторов в уезд, за невозможностью уплатить подводам за проезд, отсутствие инструкций и руководств, отсутствие опытных инструкторов-организаторов — все это не дает возможности расширить деятельность политического подотдела.

Принимаются меры к обследованию нужд трудовых артелей в строительном материале, топливе и семенах, о чем будем ходатайствовать перед соответствующими органами об удовлетворении в первую очередь нуждающихся артелей названными предметами.

Заведующий политическим подотделом Балтручук

Делопроизводитель Ибшман

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Мн., 1971. Т. 2. С. 477— 478.

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ СЯЛЯН ВЁСКІ КАЛАЦІЧЫ ГЛУСКАЙ ВОЛАСЦІ БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА АБ УСТУПЛЕННІ Ў МЕЛІЯРАЦЫЙНЫ КААПЕРАТЫЎ

23 студзеня 1923 г.

1923 г. января 23-го дня. Мы, нижеподписавшиеся, граждане Бобруйского уезда Глусской волости Калатичского сельсовета д. Калатичи, собрались сего числа на сход в числе 38 человек под председательством председателя нашего сельсовета Григория Бычкова, слушали доклад члена инициативной группы организующегося Глусского волостного мелиоративного товарищества о пользе мелиорации для улучшения наших лугов и полей и, обменявшись по этому поводу мнениями, единогласно постановили: войти в состав Глусского волостного мелиоративного товарищества полным составом сельсовета на правах члена, для чего из своей среды избираем уполномоченных наших односельчан: Ивана Яковлевича Давидовского, Ивана Антоновича Глаза и Ивана Прокопиевича Кирдуна, которые будут заменять нас всех при разрешении всех дел товарищества.

Об изложенном записали настоящий наш приговор.

Председатель сельсовета Г.Бычков

Члены: Константин Мороз

Иван Мороз

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2932. Л. 18.

ПАСТАНОВА ГЛУСКАГА РК КП(б)Б ПА ПЫТАННІ АБ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛАСА

1924 г.

На падставе рашэнняў парторганаў правесці наступныя мерапрыемствы:

1. Правесці 31 студзеня пашыраны пленум РК з удзелам усяго партактыву, пасля чаго перанесці гэта пытанне на ячэйкавыя сходы, увязаўшы яго з пытаннем аб правядзенні сяўбовай кампаніі і калектывізацыі, а таксама на пленум райвыканкома і на райкамсамольскую канферэнцыю.

2. Фракцыі РВ, таксама і ўпаўнаважаным па правядзенню вясновай сяўбовай кампаніі зараз жа прыступіць да ўліку ўсёй маёмасці кулацкіх гаспадарак і ў адносінах да тых, якія разбазарваюць жывёлу і вядуць агітацыю супраць калектывізацыі, правесці канфіскацыю маёмасці, перадаць іх суду і выселіць з тэрыторыі калгаса.

3. У асобных выпадках тым кулакам, якія не вядуць актыўнай барацьбы супраць савецкай улады, пакінуць участкі горшай зямлі не больш 5-ці гектараў на гаспадарку, вырашыць пытанне аб ад'ёме ў іх у першую чаргу племянной жывёлы, складаных машын, млыноў і г.д.

4. У тых калгасах, дзе трапілі кулакі (Беркава, Слаўкавічы), ачысціць іх, а сродкі вытворчасці, унесеныя ў калгас, аднесці ў недзялімыя капіталы калгаса.

5. Там, дзе згрупавана кулацкая частка ў засценках (Малінава, Беркава, Жукавічы і г.д.) лічыць неабходным зараз жа правесці работу па арганізацыі калгасаў у акаляючых вёсках з беднякоў і серадняков і папоўніць іх батракамі і беднякамі тутэйшай мясцовасці.

6. Прапанаваць усім спажывецкім і крэдытным таварыствам зараз жа выключыць усе кулацкія гаспадаркі з ліку пайнікаў каапэрацыі, а належачы ім пай і ўклады канфіскаваць.

7. Пры пераглядзе індывідуальнага абкладання дадаткова абкласці на 35% усе кулацкія гаспадаркі.

8. Прапанаваць т. Лотараву і т. Сморчанку перабудаваць работу пракуратуры і судова-следчых органаў у барацьбе з кулакамі.

9. Указаць усім партячэйкам пры выкананні гэтай работы, каб ні ў якім разе не былі закрануты серадняцкія гаспадаркі...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.10. Воп. 3а. Спр. 3. Л. 59.

ТЭЛЕГРАМА № 314

15 сакавіка 1929 г.

Глускаму райкому партыі

Некаторыя раёны заняліся голым раскулачваннем. Цэнтр цяжкасці на будаўніцтва новых калгасаў не перанесены. Такая палітыка зусім няправільная. Акружком растлумачвае, што палітыка партыі састаіць не ў голым раскулачванні, а ў развіцці калгаснага руху, вынікам і часткай якога з'яўляецца раскулачванне. Акружком патрабуе праводзіць раскулачванне толькі ў сельскіх Саветах і раёнах суцэльнай калектывізацыі, абапіраючыся пры гэтым на сапраўды масавы рух беднаты і серадняков. Строга сачыце, каб не было ўдараў па серадняку.

Сакратар Акружкома КП(б)Б Астапенка

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 10. Воп. 3а. Спр. 3. Л. 35.

З ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА РК КП(б)Б ПА ДАКЛАДЗЕ АБ ЗАДАЧАХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ НОВАЙ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ ПА ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛАСА

31 студзеня 1930 г.

2. Нягледзячы на пашырэнне груп беднаты, правядзенне сходаў беднаты, пленум прызнае, што работа з беднатой і батрацтвам пастаўлена нездавальняюча, аб чым сведчыць шэраг фактаў: адмаўленне беднаты ісці ў калгас, скарыстанне асобных батракоў кулацкімі элементамі, з боку асобных партыйцаў і партячэек маецца недаацэнка палітычнай важнасці работы з беднатой і батрацтвам.

3. У лютым правесці праверку работы груп беднаты пры ўсіх сельскіх Саветах і партячэйках. Выдзеліць адказнымі наступных тт.: па Бярозаўскаму сельсавету — Фаяву, Глускаму — Юркевіча, Хваставіцкаму — Каўхуту, Каткаўскаму — Міронава, Ляскавіцкаму — Пятровіча, Парэцкаму — Кулеша, Германа-Слабодскаму — Флідзера, Клятнянскаму — Голуба, Дакольскаму — Мароза, Слаўкавіцкаму — Канавалава, Загальскаму — Валасевіча, Карпілаўскаму — Падуту Янку, Гацкаму — Фіялкіна, Латышскаму — Слушкова, Азямлянскаму — Валодзьку, Гарадоцкаму — Багданава, Жалвінецкаму — Львовіча і Краўчанку, Сіманавіцкаму — Калянкевіча, Казловіцкаму — Жартуна, Макавіцкаму — Бараноўскага.

4. Праверку скарыстаць для афармлення груп, як сапраўды батрацка-сялянскіх, ажыўленне іх работы і арганізацыі новых груп.

5. Бюро РВК уключыць у план сваёй работы пытанне аб рабоце з батрацтвам і беднатой і справаздач ячэек з папярэднім іх аглядам. Заслухоўванне ячэек зацвердзіць наступным парадкам: Глуская, Гарадоцкая, Каткаўская — 7 лютага, Завалочыцкая і Веснаўская — 14, Слаўкавіцкая, Латышская — 21, Лясковіцкая — 18 лютага.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 10. Воп. 3а. Спр. 3. Л. 46—47.

ПАСТАНОВА СНК БССР «АБ ВЫНІКАХ ССЯЛЕННЯ ГАСПАДАРАК ХУТАРСКОГА ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЯ Ў КАЛГАСНЫЯ СЯЛЕННІ ПА ВІЦЕБСКАЙ, ГОМЕЛЬСКАЙ, МІНСКАЙ, МАГІЛЁЎСКАЙ І ПАЛЕСКАЙ АБЛАСЦЯХ У 1939 г. І ПЛАНЕ ССЯЛЕННЯ НА 1940 г.»

5 студзеня 1940 г.

Наряду с этим многими раёнами не выполнена директива партии и правительства о полном сселении в 1939 г. хуторских хозяйств единоличников, в результате чего большое количество этих хозяйств остались не сселенными: по Суражскому району из 900 хозяйств сселено 222, по Сиротинскому из 411 хозяйств сселено 154, по Глусскому из 400 хозяйств сселено 174 и аналогичное положение в Россонском, Старобинском и других районах.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 384. Л. 226.

Прамысловасць

Па даных на 1931 г. у раёне налічвалася 21 прадпрыемства, дзе працавалі 1099 чалавек. Развіваліся хімічная прамысловасць (смалакурныя, каніфольна-шкіпінарныя, лакафарбавыя прадпрыемствы), вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, меліся швейны, абутковы і іншыя саматужныя промыслы.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі былі: электрастанцыя ў м. Глуск, абутковая арцель «Чырвоны працаўнік» (52 рабочыя), швейная арцель «Прагрэс» (78 рабочых) і стружкавая арцель «Спатры» (247 рабочых; пазней стала называцца «КІМ»). Дзейнічалі вінакурныя заводы ў вёсках Халопенічы і Гарадок.

Вытворчая гімнастыка ў ткацкім цэху арцелі «Спатры».

Члены камсамольскай арганізацыі стружкавай арцелі «КІМ». 1940 г.

У пачатку 1930-х гадоў у в. Слаўкавічы быў пабудаваны спіртапарашковы завод, дзе працавалі 200 чалавек. На ім быў наладжаны выпуск драўнянага спірту, шкіпінару, парашку для лакафарбавых прадпрыемстваў і іншых рэчываў.

У Глуску працавалі паштова-тэлеграфнае аддзяленне, дзяржашчадкаса № 3, прамысловае і крэдытнае таварыствы, быў створаны леспрамгас, які займаўся нарыхтоўкай лесаматэрыялаў, неабходных для развіцця прамысловасці і вугальных шахтаў. У 1925 г. пачалося будаўніцтва лесапільнага завода, якое завяршылася праз год. Увядзенне ў дзеянне гэтых аб'ектаў, хоць і часткова, але зняло пытанне працаўладкавання.

Дробная саматужная прамысловасць раёна становіцца на шлях кааперавання. У 1925 г. майстры-адзіночкі «Спатры» аб'ядналіся ў арцель «КІМ», у выніку адметна змяніўся асартымент вырабаў. З'явіліся ткацкі, калёсны і тарны цэхі, але ўсе работы яшчэ выконваліся ўручную. У арцель набіраліся рабочыя новых спецыяльнасцей: ткачыхі, бондары, стругальшчыкі і нават мэбельшчыкі.

У арцель «Чырвоны пекар» аб'ядналіся многія глускія хлебапёкі, кандытары, булачнікі. У асобны ўчастак была выдзелена хлебапякарня, якая забяспечвала вяскоўцаў хлебам, але ў асноўным на сяле хлеб пяклі свой. Таму і млыноў было нямала: і вадзяных, і паравых, бо амаль кожны вёз зерне, каб змалоць яго на муку. Вадзяныя млыны працавалі ў Барысаўшчыне, Пагосце, Мошніцы, Бубнаўцы, Халопенічах, а паравыя — у Глуску, Усцярхах, Гарадку, Ляскавічах, Харомцах, Трайчане.

Пачала дзейнічаць швейная арцель «Прагрэс», спачатку на абсталяванні ўласнікаў, потым на купленым за сродкі арцелі.

На Глушчыне жыло нямала здольных шаўцоў. Абутак, які яны шылі, па сведчанні старажылаў, быў добры і выгляд меў не горшы, чым куплены ў спажывецкай лаўцы. Калі шаўцы аб'ядналіся ў саматужна-прамысловую арцель «Чырвоны працаўнік», то іх вырабы сталі, як фірменныя. Каштаваў іх абутак адносна нядорага толькі ў арцельным магазіне, куды шаўцы здавалі сваю прадукцыю. Але, улічваючы, што цэны на прадукты сельскай гаспадаркі рэзка панізіліся (на Глушчыне пуд хлеба каштаваў 53 кап., карова — 10—12 руб.), то няцяжка ўявіць, што і па такой цане (5 руб. за боты) абутак мала хто з сялян набываў. Калі ў 1913 г. селянін купляў боты за 3—4 пуды жыта (пуд каштаваў 2 залатыя рублі), то ў 1923 г., напрыклад, за такія ж боты трэба было заплаціць 10—15 пудоў зерня.

У Глуску з 1927 г. працавала метэаралагічная станцыя. У 1928 г. пачала дзейнічаць невялікая ўстаноўка па выпрацоўцы электраэнергіі, а ўжо ў 1932 г. была здадзена ў эксплуатацыю першая электрастанцыя магутнасцю 20 кілават. У 1936 г. была ўведзена новая электрастанцыя, магутнасць якой вышэй за папярэднюю больш як у два

Калектыў абутковай арцелі «Чырвоны працаўнік». 1936 г.

разы. Але выпрацоўваемая ёй энергія ішла ў асноўным для асвятлення жылых дамоў, грамадскіх памяшканняў. Яе магутнасці не хапала, каб прывесці ў дзеянне ўсе наяўныя ў сельскай гаспадарцы і на прадпрыемствах Глушчыны электраматоры. Таму даводзілася абыходзіцца пераноснымі генератарамі энергіі.

У 1932 г. у дзеянне ўступіў радыёвузел. У наступным годзе ў раёне ўжо мелася 127 радыёкропак, а ў 1938 г. — 322 радыёкропкі. Працаваў тэлефонны перагаворны пункт. Тут былі ўстаноўлены 2 камутатары, якія маглі забяспечыць сувяззю толькі 148 тэлефонаў, а за гучным словам «тэлеграф» хаваўся вельмі просты апарат — «марзянка».

На 1 студзеня 1940 г. у раёне налічвалася 15 прадпрыемстваў дзяржаўнай і прамысловай кааперацыі. Самымі буйнымі з іх былі Слаўкавіцкі спіртапарашковы завод, крухмальны завод, пабудаваны ў 1936 г. у в. Зарэчча, спіртзаводы ў Халопенічах і Завалочыцах, торфазавод «Звязда».

Жыццё паступова наладжвалася. Людзі, нягледзячы на цяжкасці і драматызм таго часу, не траціліі надзеі, што настойлівай працай яны здабудуць лепшую будучыню. Але светлыя мары азмрочваліся: у сем'і глушчан пачалі прыходзіць пахаронкі з савецка-фінляндскай вайны. Яшчэ мала хто прадчуваў, што надыходзіць час значна большых ахвяр і цяжкіх выпрабаванняў.

Т.А.Матусевіч.

«Пракаці нас, Пятруша, на трактары...»

По дороге неровной, по тракту ли —
Всё равно нам с тобой по пути.
Прокати нас, Петруша, на тракторе,
До околицы нас прокати.

Сёння гэтую песню ўжо рэдка хто ўспамінае. А ў далёкія 1930-я гады яна была на вуснах вельмі многіх, бо ў ёй увасаблялася тагачасная вясковая рэчаіснасць: стварэнне калгасаў, цяга сельскіх хлопцаў і дзяўчат да магутных, паслухмяных рукам чалавека машын-волатаў, што так лёгка спраўляліся з цяжкай сялянскай працай. Менавіта з моладзі і пачынаўся, па сутнасці, механізатарскі летапіс Глускага раёна.

Ішоў 1932 г. У райцэнтры хадзілі чуткі, што хутка будуць арганізоўваць машынна-трактарную станцыю і патрэбна набраць курсантаў, якія стануць затым працаваць у МТС трактарыстамі. Хто ж яны, гэтыя першыя шчасліўчыкі?

Вось адзін з іх — Нестар Ціцішын. Кім ён быў да 19 гадоў? Паляводам у глускім калгасе «Рэвалюцыйны ўзрыў». Сюды штодня прыходзіў ён кіламетраў за сем з хутара Крапіўка. Адзін раз старшыня калгаса Іван Ануфрыевіч Мазалеўскі запытаў: «Як паглядзіш, Нестар, на тое, што мы цябе на курсы трактарыстаў пашлём? Ды не на абы якія, а на першыя...»

Маланкавы адказ сведчыў аб рэакцыі хлопца на такую перспектыўную прапанову. Трактар у пачатку 1930-х гадоў — гэта сапраўдны цуд. Можна зразумець душэўны стан Нестара, калі ён пачуў такую прапанову. Вось так і стаў ён разам са сваім аднавяскоўцам Пракопам Кушне-

Члены праўлення Глускага пажарнага таварыства. 1927 г.

рам слухачом курсаў, дзе асвойвалі новую для сябе прафесію амаль што з паўгода.

Памыліцца той, хто падумае, што гэта нейкі спецклас, дзе мноства наглядных дапаможнікаў, некалькі вучэбных трактароў... Займаліся на пункце ўсенавуча для прызыўнікоў, які знаходзіўся ў Глуску прыкладна ў раёне цяперашняй санаторнай школы-інтэрната... Замест наглядных дапаможнікаў усяго толькі некалькі элементарных схем, выкананых ад рукі. Трактар вывучалі на асобных запчастках і вузлах, што ўдалося раздабыць для курсаў. Аб гэтым паклапаціўся дырэктар Глускай МТС Казлоўскі. А выкладчыкі працэс навучання будавалі ў адпаведнасці з такой простай матэрыяльна-тэхнічнай базай — гэта веданне тэорыі плюс уменне курсантаў абстрактна мысліць. Відаць, не ўсе выдатна асільвалі навуку, бо толькі дзесяці з іх, у тым ліку і Ціцішыну, пашанцавала трапіць на месячную практыку ў Слуцк, і таму лічылі іх, калі вярнуліся назад, ледзь не сапраўднымі асамі. Асабліва калі ўлічыць, што і самі «спасцігалі навуку» больш чым сур'ёзна, з энтузіязмам, вялікім жаданнем авалодаць як мага хутчэй і лепш такой папулярнай тады механізатарскай прафесіяй.

У тым жа годзе, як скончыў курсы, прыгнаў Нестар Міронавіч Ціцішын першы «Фардзон» з Ратміравіч. А праз год ужо на свой айчынны «ХТЗ» перасеў. Так і працаваў, аж да самага пачатку вайны. Пераадолеў і яе, праклятую.

Сорак гадоў адпрацаваў ветэран у сельскай гаспадарцы механізатарам. Выгадаваў з жонкай дзяцей, дачакаўся ўнукаў...

Поруч з Ціцішыным працавалі і многія іншыя юнакі: Марцін Бараноўскі з Краснага, А.А.Храпко з Жалвінца, Жлобіч з Калюгі, Бельскі з Поўсткі, Ц.Д.Бабак з Макранаў. Не прыйшлі з вайны Парахаўнік, Бенеш, І.Бабіч.

Былі сярод трактарыстаў і дзяўчаты, якія горача адгукнуліся на заклік сесці на трактары.

Шура Матусевіч з х. Зарудзечча стала трактарысткай у шаснаццаць няпоўных гадоў. Колькі размоў выклікала гэта яе рашэнне... А такі круты паварот у яе жыцці адбыўся дзякуючы старэйшаму брату Алесю і старшыні калгаса «Усход» (в. Краснае) Н.Пархімовічу. Гэта яны сагітавалі яе вучыцца на трактарыстку і такім чынам вызначылі яе далейшы лёс.

Да дробязей і па сённяшні дзень памятае Аляксандра Фёдараўна Матусевіч (цяпер Кончыц) свае першыя выезды ў поле. Як сустракалі яе ў кожнай вёсцы, дзе прыходзілася працаваць, як з зайздрасцю пазірала на яе моладзь, а дзятва з галёканнем бегла следам. Мужчыны і жанчыны таксама не хавалі свайго захаплення. Бач, дзяўчына-трактарыстка! Гэта ж трэба, трактарам кіруе.

Але трактароў было менш, чым абучаных на курсах трактарыстаў: працавалі па чарзе. І, вядома, у МТС, хоць і не падавалі выгляду, а ўсё ж бераглі дзявочыя рукі. Бо механізатары не толькі сядзелі за рычагамі

Навучэнцы першых курсаў трактарыстаў Глускай МТС. 1932 г.

Е.К.Стрэж.

І.П.Стрэж.

і кіравалі трактарам, але даволі часта і рамантавалі свайго «каня».

Кацярына Пятроўна Курс (потым Шаўрук) з Кнышоў як на цуд дзіўны глядзела на першы трактар, што з'явіўся аднойчы ў іх вёсцы, узнімаючы пыл на дарозе. Збеглася да яго ўся вёска. Вось тады і захацелася ёй сесці самой за рычагі гэтай дзіўнай машыны.

Яна працавала на трактары ў мясцовым саўгасе аж да самай вайны. Бывае, пастух толькі пачынае збіраць кароў па вёсцы, каб гнаць на ранкі, а Кацін трактар ужо лапоча дзесьці ў полі. Потым вайна, гады акупацыі, фашысцкай няволі. І нарэшце — радасны дзень перамогі, які дапамог ёй вярнуцца дамоў на радзіму.

Вось такімі былі нашы першыя трактарысты...

Н.Б.Барысаў, Т.А.Аляксандрава.

А шчасце было так магчыма...

З успамінаў Еўдакіі Купрыянаўны Стрэж, старэйшай жыхаркі в. Слаўкавічы

Мы пажаніліся зусім маладымі. Івану было дзевятнаццаць, а мне толькі два месяцы павярнула на васемнаццаты год. Але жылі дружна і шчасліва. Муж яшчэ служыў у арміі, а я гадавала сынка Іванку, які нарадзіўся ў Піліпаўку 1930 г. Яму споўніўся якраз годзік, калі бацька дэмабілізаваўся. Іван-старшы быў прабіўны, граматны. Прыкмецілі яго адразу і накіравалі старшынёй калгаса ў Слаўкавічы. У вёсцы былі створаны тады два калгасы — імя Чапаева і імя Сталіна, — дык вось калгас імя Чапаева мой Іван і ўзначальваў.

Бачыліся мала. Іван усё на рабоце і на рабоце. У калгас спачатку ішлі неахвотна, людзі баяліся, не былі ўпэўнены, што калектыўна лепш справы пойдуць. Спачатку прыклад паказалі самыя бедныя, потым жа ў калгас пайшлі і сераднякі.

Праз некалькі гадоў калгасы зліліся. Івана зноў «кінулі» на прарыў, адшукалі работу, дзе цяжэй, накіравалі дырэктарам спіртапарашковага завода.

Такое прадпрыемства было пабудавана ў Слаўкавічах у пачатку 1930-х гадоў. Знаходзіўся ён адразу ж пры ўездзе ў вёску, каля лесу. Паўз яго карпусы праходзіла дарога на в. Амур. Па тым часе завод быў немалым і важным прадпрыемствам. Два заводскія карпусы цягнуліся больш як на 20 м. Была пабудавана кантора, магазін, клуб, кватэры для сямейных. Асноўнай прадукцыяй завода быў драўняны спірт. Выкарыстоўваўся ён, відаць, для патрэб авіяцыі.

На заводзе працавала больш за сто чалавек. Сярод іх Анатоль Любанец, Ніна Матусевіч, Валодзя Нанзэвіч, Косцік Кузьміч, Павел Любанец, Якаў Марус — усіх ужо і не помню.

Першым дырэктарам тут працаваў Янкель Левін, потым — Бурдо, пазней прадпрыемствам стаў кіраваць мой муж — Іван Пятровіч Стрэж. Тэхнолагамі (мы іх называлі тэхнарукамі) сюды накіравалі Налегача, пазней — Мікалая Сямёнавіча Лабастава.

Працавалі на заводзе ў тры змены, у кожнай па 6 чалавек. Тэхналогія не была складанай. Спецыяльныя брыгады нарыхтоўвалі ў лесе драўніну (дуб, граб, бярозу), на пільні яе разразалі на двухметровыя чуркі, з якіх на заводзе гналі драўняную жыжку. Яе ў сваю чаргу пераганялі, і атрымліваўся драўняны спірт. З рэшткаў адгону выраблялі чорны парашок. На якія патрэбы ён ішоў, не ведаю. Спажыўцы атрымлівалі з завода і драўняны вугаль.

Вытворчасць была недасканалай, пераважала ручная праца. Таму з ахвотай пры-

малі на работу моладзь — фізічна моцных і здаровых хлопцаў і дзяўчат. За месяц кожная змена выпрацоўвала по 400 вёдзер драўнянага спірту, дзесяткі кілаграмаў парашку, тоны вугалю. За змену моцна стамляліся, але калі ў клубе наладжвалі танцы, пра стому ўжо забывалі.

Побач з заводам працавала смалакурня, тут атрымлівалі шкіпінар.

Заводскі пасёлак уяўляў невялікі гарадок, дзе людзі жылі весела, дружна, адчувалі сябе шчаслівымі. У нас падрастала трое дзетак. Мы з Іванам моцна кахалі адзін аднаго і здавалася, што нашаму шчасцю не будзе канца.

Але лёс распарадзіўся інакш. Хутка пачалася вайна. Іван у першы ж дзень быў прызваны ў армію, думала, хутка вернецца, а пайшоў назаўсёды. Я з трыма дзецьмі засталася ў Слаўкавічах, куды неўзабаве прыйшлі немцы. І пачалося поўнае пакут і гора жыццё на акупіраванай тэрыторыі. Івана я так і не дачакалася з вайны, дзяцей гадавала адна.

Запісала Т.А.Матусевіч.

Дакументы сведчаць

ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СПРАВАЗДАЧА ГЛУСКАГА РАЁНА ЗА 1924 ГОД

1. Промышленность

Промышленность мелкая — кустарная. Землеустройство проводится в двух сельсоветах. Крестьяне расселяются на поселки и хутора. Классовое расселение деревни особенно выявляется при перевыборах сельских Советов.

Совхозов в районе 9, из них хорошо работающих — два, остальные бедные; одна артель сельскохозяйственная «Искра» и один агроучасток.

В районе проводятся лесные разработки Птичским отделением Лесбела. Зарплата крестьянам выплачивается не вполне своевременно, выплачивается в большинстве через Глусское потребобщество.

Продовольственное положение крестьян — картошка с капустой, хлеба у некоторых наблюдается недохват. Рыночные цены на хлеб твердые — 53 коп. за пуд, на скот очень низкие; 10 — 12 руб. стоит корова. Хлебозаготовка идет очень слабо, т.к. крестьяне хлеба на рынок не выбрасывают, в связи с недородами и низкими ценами.

В руках частного рынка находятся мелкие товары крестьянского хозяйства: полотно, мелкий скот, птица.

Стихийные бедствия: поджоги – в Докольском Совете выселяющихся хуторан, в совхозе «Октябрь» — сарай с клевером.

II. Финансовое положение

С вопросами местного бюджета имеются неприятности, так в районе числится три избы-читальни, а по отпущенному кредиту оплачиваются только две.

План по сельхозналогу выполнен.

Мельницы: водяные: Борисовщина, Погост, Мошница, Бубновка, Холопеничи; паровые: Глуск, Устерхи, Лясковичи, Городок, Трайчан, Хоромцы.

III. Политическое состояние

Настроение разное, но в большинстве случаев чувствуется недоброжелательное отношение зажиточной части (шляхты), подзуживание в связи с налогом, низкими ценами на сельхозпродукты.

Политическое состояние не вполне удовлетворительное. В сельсоветах Лясковичи, Октябрьском, Гатьском имеются случаи бандитизма (ограблены кооперативы в Лясковичах, убит приказчик в Касаричах, Октябре, были покушения на ограбление кассы РИКа, больницы), развивается мелкое воровство, как в местечке, так и по району. Самогон хотя продают, но в меньшей мере, чем раньше, но самогоноварение есть и при том более скрытное. Особого религиозного движения нет, имеются отдельные евангелисты, но работы не ведут.

Учительство — настроение хорошее, втягиваются в общественную работу, но пока общественниками работают часть учителей, но некоторые общественную работу отбывают

казенно, отстают учительницы (работает одна). Учительство принимается за свою политподготовку.

Настроение советских служащих, особенно тех работников РИКа, плохое в связи с уменьшением зарплаты.

IV. Культстроительство

Всего по району существует две полные семилетки (Глуске и Городке), одна неполная (еврейская в Глуске), 4-комплектная, 2-комплектная, из них одна латышская; 2 — комплектных, из них одна польская (Зубаревичская Буда) и одна еврейская (Глуск). Кроме того, работает 6 договорных школ. В сравнении с прошлым годом школьная сеть расширена на одну комплектную школу (перевод 4-х комплектов еврейской школы Городковской в 7-летнюю. Про последнюю нужно сказать, что она утверждена под напором крестьянства (посылали ходоков в Бобруйск и Минск), в то время как линия района была против этого. Соответствуя нашей, такую линию вела и Городковская партячейка. В результате как районная организация, так и Городковская ячейка в глазах крестьян потеряла свой авторитет и выиграли противные элементы, которые взялись за «защиту» интересов крестьян.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 10. Воп. 1а. Спр. 11. Л. 25.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО РК КП(б)Б АБ ДРЭННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ЛЕСАВЫВАЗКІ

15 лютага 1930 г.

Нягледзячы на дырэктывы бюро РК КП(б)Б, прыходзіцца канстатаваць, што не толькі няма ніякага пералому ў галіне лесавывазкі, але лічбы 9-12% выканання лесавывазкі гавораць аб зрыве, што бюро РК КП(б)Б лічыць зусім недапушчальным. Галоўнымі прычынамі такога становішча з'яўляюцца:

а) з боку ячэек КП(б)Б і брыгад па пасяўной кампаніі няма разумення палітычнай важнасці лесанарыхтовак, не створана грамадская думка і няма ніякай дапамогі лесанарыхтоўчым арганізацыям, нават імкненне з боку некаторых працаўнікоў (Слаўкавічы — «Амур») тармазіць справу, матывуючы гэта быццам бы інтарэсамі калектывізацыі.

б) райком камсамола мабілізаваў 00 (два нулі) камсамольцаў на лесанарыхтоўкі і супакоіўся, не праверыў выкананне сваёй пастановы, якая фактычна не ажыццёўлена. Для стварэння рашучага пералому ў справе лесанарыхтовак правесці наступнае:

1. Ускласці адказнасць за выкананне плана лесанарыхтовак персанальна на сакратароў ячэек КП(б)Б і ўпаўнаважаных па правядзенню веснавой пасяўной кампаніі.

2. План лесанарыхтовак давесці да двара, калгаса, абмеркаваўшы яго на групах, сходах беднаты і агульных сходах сялян і дабіцца масавага выезду сялян на вывазку лесу.

3. Абавязаць фракцыю РВК зараз жа праверыць выкананне дадзеных цвёрдых заданняў кулацкім гаспадаркам у тых сельскіх Саветах, дзе няма суцэльнай калектывізацыі, прыцягнуць да судовай адказнасці тых, хто гэтае заданне не выканаў.

4. Лічыць зусім ненармальным, што некаторыя калгасы адмаўляюцца ехаць на лесавывазкі, прыкрываючыся неабходнасцю выконваць работу ўнутры гаспадаркі. Прапанаваць т. Багам'і (калгас «Амур»), т.Зяневічу (калгас імя Сталіна) тэрмінова прыняць меры для выезду гэтых калгасаў на лесавывазкі такім чынам, каб гэта не адбілася на правядзенні веснавой пасяўной кампаніі.

5. Абавязаць т. Сіманоўкера зараз жа выправіць ненармальнасці, якія ёсць у прыёмцы лесу і размеркаванні пунктаў; мабілізаваць і паслаць на ўчастак для перабудовы работы ўсіх працаўнікоў партапарату Лесбела. Кожныя 5 дзён інфармаваць райком партыі аб ходзе выканання плана па лесанарыхтоўках.

6. Лічыць неабходным пакінуць для далейшай работы па ўзмацненню лесавывазак студэнтаў-партыйцаў. Для лепшай арганізацыі прафсаюзнай работы па арганізацыі сацспаборніцтва вызваліць т. Мароза ад работы па калектывізацыі.

7. Прапанаваць РК ЛКСМБ зараз жа выканаць сваю пастанову аб мабілізацыі і пасылцы на лесавывазкі камсамольцаў.

8. Заўтра нарачным давесці да ведама ўсіх сельскіх Саветаў, партячэек аб гэтай пастанове.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 10. Воп. 3а. Спр. 3. Л. 39.

Народная асвета

Народная адукацыя на Глушчыне, як і ў цэлым на Беларусі, знаходзілася ў цяжкім стане. За гады 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў і тая невялікая сетка, што існавала, была разбурана, абсталяванне зрабілася непрыгодным, амаль не было падручнікаў, праграм. Востры недахоп адчуваўся ў сшытках і пісьмовых прыладах, не хапала паліва.

У рэспубліцы ў пачатку 1920-х гадоў была зацверджана новая сістэма народнай адукацыі, асноўным звяном якой павінна была стаць 7-гадовая працоўная агульнаадукацыйная і політэхнічная школа з двума паўэтапамі (3 і 4 гады). Такое навучанне было б дастатковым для падрыхтоўкі масавых кадраў прамысловых рабочых і для працягвання навучання ў сярэдняй школе. Узровень агульнай адукацыі, атрыманы ў сямігадовай школе, даваў таксама магчымасць лепш разбірацца ў палітыцы, іншых пытаннях жыцця. Устанаўліваліся тры тыпы навучальных устаноў, на якія была ўскладзена задача падрыхтоўкі спецыялістаў: прафесійна-тэхнічная школа, тэхнікум і інстытут.

У выніку перабудовы ў Глускім раёне ў 1920-я гады народная асвета была прадстаўлена 2 поўнымі сямігадовымі школамі ў Глуску і Гарадку, адной няпоўнай яўрэйскай школай у раённым цэнтры. Дзейнічалі таксама чатырохкамплектныя школы (адна з іх латышская) і двухкамплектныя (адна польская ў в. Зубарэвіцкая Буда і адна яўрэйская ў м. Глуск). Акрамя таго, працавала 6 дагаворных школ, якія сяляне ўтрымлівалі за свой кошт. У параўнанні з мінулым годам школьная сетка павялічылася на адну камплектную школу, ажыццявіўся перавод чатырохкамплектнай яўрэйскай школы ў м. Гарадок у сямігодку. Пра апошні факт варта сказаць асобна. Школа была зацверджана пад напорам сялян вёскі ў той час, як раённыя ўлады і камуністы мясцовай партячэйкі выступалі супраць яе пераводу ў сямігодку. Але сяляне настаялі на сваім, нават хадакоў адпраўлялі ў Мінск і Бабруйск, і пытанне вырашылася станоўча.

У 1924—1925 гг. у рэспубліцы быў упершыню ўведзены раённы бюджет. З'явілася магчымасць значна павялічыць сродкі, якія выдаткоўваліся на народную асвету. У выніку справы значна палепшыліся, умацавалася матэрыяльная база агульнаадукацыйных школ. На Глушчыне пры абсталяванні школ і для ліквідавання гаспадарчых недахопаў (няхватка інвентару, адсутнасць паліва, класных дошак і г.д.) шырока выкарыстоўвалася дапамога насельніцтва. Па вёсках склікаліся агульныя сходы грамадзян, на якіх інспектары аддзела народнай асветы Бабруйскай акругі рабілі даклады аб становішчы школ па сельсаветах. Насельніцтва ішло насустрач і збірала сродкі, каб школы маглі набыць абсталяванне, падручнікі, якіх востра не хапала, сшыткі, інвентар. У выніку такіх сустрэч ажывілася работа ў школах, ліквідаваны цэлы шэраг непаразуменняў паміж настаўнікамі і органамі ўлады.

Адной з важнейшых задач савецкай улады ў галіне народнай адукацыі з'яўлялася забеспячэнне школ настаўніцкімі кадрамі. Як і ўсюды, на Глушчыне таксама не хапала прафесійна падрыхтаваных кадраў, да выкладання ў школах часам прыцягваліся асобы, якія самі мелі толькі агульную або незакончаную сярэднюю адукацыю. Таму ў раёне ў гэтыя гады шырока праводзілася работа па накіраванні ў педагагічныя навучальныя ўстановы рабочых і сялян, якія хацелі стаць настаўнікамі, праяўляліся клопаты аб паляпшэнні матэрыяльнага забеспячэння педагагічнага персаналу.

Рабіліся захады, каб даць працоўным усіх нацыянальнасцей магчымасць атрымаць адукацыю на роднай мове. Навучанне ў існуючых школах стала ажыццяўляцца на беларускай мове. З гэтай мэтай адкрыліся курсы ў Бабруйску, закліканыя весці падрыхтоўку настаўнікаў, якія б маглі выкладаць на беларускай мове. Было афіцыйна заяўлена, што на тэрыторыі БССР прызнаюцца раўнапраўнымі беларуская, яўрэйская і польская мовы. Беларуская мова выбіралася як мова пераважная для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Мовай зносін органаў БССР з органамі СССР і саюзных рэспублік прызнавалася руская.

Праводзілася беларусізацыя дзяржаўных органаў улады і кіравання. Былі ўстаноўлены тэрміны для ажыццяўлення гэтай работы.

Як указвалася вышэй, у раёне працавалі яўрэйскія і латышская школы. Аднак у працэсе беларусізацыі былі істотныя недахопы: не хапала падручнікаў, настаўнікі слаба валодалі беларускай мовай, недастаткова ведалі беларускую літаратуру, гісторыю і геаграфію краю, гаварылі на расійскай мове, карысталіся рускімі падручнікамі з-за недахопу нацыянальных.

І пазней, у пачатку 1930-х гадоў, становішча з падрыхтоўкай педагагічных кадраў заставалася складаным. Іх прафесійны ўзровень быў па-ранейшаму нізкім: многія мелі за плячыма толькі спецыяльныя трохмесячныя курсы. У пачатку 1932 г. са 188 настаўнікаў 150 мелі толькі агульную, або незакончаную сярэднюю адукацыю. Не менш вострым з'яўлялася пытанне размяшчэння школьных устаноў. У 1931 г. у раёне ўжо працавала 85 школ, але з іх толькі 12 мелі ўласныя будынкі, ды і тыя патрабавалі капітальнага рамонту. 24 школы размяшчаліся ў наёмных памяшканнях. Таму райвыканкомам было прынята рашэнне аб перадачы пад школы часткі былых кулацкіх дамоў. Цяга да ведаў была вялікая, і часцяком насельніцтва вёсак брала частку работ па будаўніцтве школ на сябе.

У 1932 г. ужо адзначаліся пэўныя зрухі ў развіцці народнай асветы. Усеагульным абавязковым навучаннем было ахоплена 5393 хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце 8—11 гадоў (97%), якія вучыліся на роднай мове. Для часткі дзяцей былі адкрыты латышская, руская, 3 польскія, 2 яўрэйскія

Пяты клас Глускай сямігодкі. 1927 г.

Выхаванцы Завалочыцкага дзіцячага сада-яслаў. 1940 г.

пачатковыя школы. Удзялялася ўвага політэхнічнаму навучанню падлеткаў. З гэтай мэтай былі арганізаваны раённая майстэрня і рабочыя пакоі ў школах.

Працавала таксама ўзорная школа калгаснай моладзі. Яе ўкамплектавалі лепшымі настаўнікамі, інструктарамі-метадыстамі, тут педагогі раёна знаёміліся з дасягненнямі педагагічнай навукі, методыкай выкладання, пераймалі перадавы вопыт работы. Быў створаны раённы аддзел народнай адукацыі са штатам грамадскіх інструктараў з ліку лепшых настаўнікаў і работнікаў дашкольных устаноў.

У школах для дзяцей пачалі наладжваць гарачае харчаванне. Паступова ствараліся сетка дзіцячых дашкольных устаноў. Першыя яслі былі адкрыты летам 1930 г. у в. Гарадок і саўгасе «Завалочыцы». Але ўжо ў наступным годзе планавалася арганізаваць яслі ў 25 населеных пунктах. У час гарачых сезонных работ для больш шырокага ўдзелу ў іх жанчын-маці ў кожным калгасе ствараліся сезонныя яслі. У Глуску адкрыўся дзіцячы сад на 4 групы. Праводзілася работа, каб ахапіць яслямі і садкамі палавіну дашкольнікаў. З 1932/33 навучальнага года ўводзілася абавязковае навучанне дзяцей на базе сямігадовай політэхнічнай школы.

Глыбокія пераўтварэнні ў галіне народнай адукацыі і культуры запатрабавалі прыступіць да ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. І ў гэтай важнай справе рашаючая роля належала зноў жа настаўнікам. У Глускім раёне педагагічны персанал школ стаў арганізатарам пунктаў лікбезу і школ для малапісьменных. Рашалася цяжкая задача забеспячэння іх памяшканнямі, палівам, вучэбнымі дапаможнікамі, пісьмовымі прыладамі. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што часта жыхары раёна самі праяўлялі ініцыятыву дзеля павышэння іх агульнай адукацыі, культуры. Так, сяляне-беднякі в. Слаўкавічы ў сваім пісьме ад 23 чэрвеня 1927 г. А.В.Луначарскаму прасілі, каб ён выслаў ім кнігі, паперу, карціны і выпісаў часопісы і газеты для таго, каб маглі «падняць сваю малапісьменную гаспадарку і перавесці яе на перадавое культурнае гаспадаранне».

У раёне ў пачатку 1932 г. было адкрыта 150 лікпунктаў, якія абслугоўвалі 4400 чалавек, пачалі працаваць вячэрнія школы для калгаснай і рабочай моладзі ў Акцябры і Глуску. 13 снежня гэтага ж года Глускі раённы выканаўчы камітэт прыняў пастанову «Пра абавязковае навучанне малапісьменных». У ёй указвалася, што для ўсіх рабочых членаў прафсаюза ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў, для астатняга працуючага насельніцтва — ад 16 да 45 гадоў, якія не мелі 4-гадовай політэхнічнай адукацыі, уводзілася ўсеагульнае абавязковае навучанне ў тры тэрміны: з 1 кастрычніка 1932 г., 1933 г. і 1934 г.

Важнымі цэнтрамі ў ажыццяўленні гэтай праграмы павінны былі стаць хаты-чытальні. У 1926 г. у раёне дзейнічала 5 хат-чытальнь,

Ударнікі Глускага раёна па арганізацыі сувязі, распаўсюджванні перыядычных выданняў. 1934 г.

Нардом, Дом селяніна, раённая бібліятэка з кніжным фондам 3500 экзэмпляраў, рабочасялянскі клуб. Пазней сетка хат-чытальняў значна пашырылася, да таго ж у многіх вёсках былі створаны чырвоныя куткі. Усе гэтыя ўстановы праводзілі палітычную асвету рабочых і сялян, садзейнічалі развіццю іх творчых здольнасцей, выхоўвалі свядомыя адносіны да працы. Але нельга гаварыць аб тым, што якасць гэтай работы была высокая: яна залежала ад падрыхтаванасці людзей, якія працавалі тут. У большасці сваёй гэта былі вялікія энтузіясты культуры, якія мелі невысокі ўзровень адукацыі, але прагнулі далучыцца да вялікага мастацтва.

Т.А.Матусевіч.

Вучыліся самі і вучылі іншых

Каб далучыць працоўных Глушчыны да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, патрэбна было ў першую чаргу навучыць іх грамаце. З гэтай мэтай разгарнуўся масавы рух за пісьменнасць у форме культпаходу, ініцыятарамі якога сталі самі камсамольцы ў жніўні 1928 г. У рамках гэтага мерапрыемства праходзіў агітацыйны месячнік «За грамату», які адбыўся з 15 верасня па 15 кастрычніка 1928 г. У час правядзення месячніка цэнтр усёй работы канцэнтраваўся на пашырэнні ўплыву таварыства «Далоў непісьменнасць», актывізацыі дзейнасці яго нізавых арганізацый, іх масавага росту, узмацненні растлумачальнай работы па ліквідацыі непісьменнасці. У выніку правядзення месячніка «За грамату» ў Глускім раёне колькасць ячэек таварыства «Далоў непісьменнасць» у параўнанні з 1927 г. павялічылася з 18 да 37, а колькасць членаў таварыства ўзрасла з 589 да 1245 чалавек.

Месячнік лікбеза вырас у масавы культпаход, які працягваўся да канца пяцігодкі, стаў новай дзейснай формай прыцягнення насельніцтва да культурна-асветніцкай работы і значна пашырыў усенародную барацьбу за ўсеагульную пісьменнасць і культуру. У працэсе правядзення культпаходу ў Глускім раёне пашырылася сетка ліквпунктаў, узрасла колькасць навучэнцаў. Калі ў 1927 – 1928 гг. у раёне было 17 ліквпунктаў, на якіх навучалася 442 чалавекі, то ў 1928/29 навучальным годзе іх колькасць узрасла да 36 з ахопам 1393 чалавек. Актывізавалася работа і па ліквідацыі малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. У 1927 – 1928 гг. у Глускім раёне колькасць школ для малапісьменных павялічылася з 2 да 8, а навучэнцаў у іх з 47 да 230 чалавек.

(Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 81. Воп. 1. Спр. 592. Л. 2).

У наступныя гады работа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва працягвалася. Гэтыя пытанні сістэматычна абмяркоўваліся на прэзідыумах і пленумах райкома партыі, сельсаветаў, на агульных сходах сялян. Так, агульны сход непісьменных в. Падлуг Загальскага сельсавета Глускага раёна, заслухаўшы пытанне аб значэнні ліквідацыі непісьменнасці,

Паход-манеўры Глускай беларускай сямігодкі. 25.5.1928 г.

пастанавіў прыняць меры для таго, каб усе непісьменныя актыўна наведвалі лікпункты на працягу ўсяго навучальнага года.

Актыўны ўдзел у прапагандзе новага, калгаснага ладу, правядзенні розных палітычных і гаспадарчых кампаній прымалі работнікі народнай адукацыі. Так, у в. Гарадок Глускага раёна ў 1929 г. усе 11 настаўнікаў Гарадкоўскага падраёна ўступілі ў калгасы.

В.В.Сафонава.

А.В.Пастушонак.

Я — сведка новых перамен

З успамінаў Алены Васільеўны Пастушонак, жыхаркі г.п. Глуск

Калі пачынаю перабіраць мінулае, спачатку ўспамінаецца першая палавіна 1920-х гадоў і Рагачоўскі педагагічны тэхнікум. Тады я, дачка простага рабочага, атрымала магчымасць вучыцца. Гэта былі першыя гады актыўнага пазнання свету і бескарыслівага сяброўства.

Другая веха, не менш яркая, — першыя гады самастойнай працы ў школе. А пачынаць прыйшлося нялёгка. У Сіманавіцкім сельсавеце, куды мяне накіравалі, у той час былі толькі дзве пачатковыя школы і надзвычай цяжкія ўмовы работы. Наёмнае памяшканне, дзе размяшчалася школа, здавалася цёмным, няўтульным і ні ў якім разе не адпавядала патрэбным нормам. Але і гэта па тым часе было вялікім дасягненнем, бо пачынаць усё прыходзілася на голым месцы. Наглядныя дапаможнікі, якія былі так неабходны ў пачатковай школе, адсутнічалі наогул, і ўсё прыходзілася рабіць самім. Але ўсведамленне таго, што прыйшоў час перадаваць людзям набытыя веды, дапамагала пераадольваць цяжкасці.

Вучыцца хацелі не толькі дзеці, але і дарослыя. У сельсавеце быў арганізаваны спецыяльны пункт ліквідацыі непісьменнасці, і тут таксама прыходзілася многа працаваць. А колькі грамадскіх даручэнняў выконвала я як дэпутат сельскага Савета: лекцыі, сходы, гутаркі з народам — усяго не пералічыш.

Потым гады работы ў такіх школах раёна, як Слаўкавіцкая, Каткаўская і інш. Гэта дало магчымасць добра азнаёміцца са становішчам у народнай адукацыі нашага раёна ў даваенныя гады. Я была сведкай усяго станоўчага і перадавога, што паступова прыносіла з сабой новае жыццё, што дала сялянам і нам, жанчынам, савецкая ўлада.

Потым у школы прыйдуць працаваць настаўнікі новага пакалення — Пётр Чарнушын, Міхаіл Юневіч, Міхаіл Аторын, Навум Майдзель, Марына Храпко, Яфім Балоцін і многія іншыя.

Ах мястэчка, мястэчка...

З успамінаў Сяргея Іванавіча Грахоўскага

Далёкі ад шматмодных гарадоў палескі Глуск у 1920-я гады быў прыкметным культурным асяродкам. У маёй памяці захаваліся некаторыя эпізоды, звязаныя з дзейнасцю найбольш яркіх носьбітаў культуры, якія развівалі яе ў Глуску і навакольных вёсках.

Успамінаю славутага і ўсімі паважанага глускага фельчара сівабародага Нохіма (прозвішча, на жаль, забыў). Ён узначальваў добраахвотную пажарную дружыну і часта наладжваў «парады» пажарнікаў. Акрамя таго, кожны год у Нардоме, дзе цяпер гарадскі парк, глускі фельчар аргані-

зоўваў найцікавейшыя балі-маскарады з танцамі і прызамі.

У тую пару нават у вёсках усе захапляліся тэатральнай самадзейнасцю. У Глуску студэнты ў час канікулаў, а пасля вучні-пераросткі разам з настаўнікамі (З.С.Карчан, Р.І.Кубрыкам) ставілі цікавыя спектаклі. Асаблівай папулярнасцю карысталася п'еса Васіля Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі» пра дукорскіх партызан.

У сям'і майго дзядзькі, каваля Івана Бобрыка, было трое дзяцей — Янка, Мікалай і Марыя. Пазней кожны з іх па-свойму праславіўся: Янка стаў паэтам, Мікалай славутым хірургам, Марыя выдатным урачом. А ў той далёкі час усе яны былі актыўнейшымі «артыстамі» ў глускай самадзейнасці.

Таленавітым і нястомным арганізатарам і выканаўцам быў таксама Георгій Караткевіч, імя яго бацькі носіць адна з глускіх вуліц. У 1928 г. Глуск здзівіў сваімі спектаклямі вандроўны тэатр Галубка. Уладзіслаў Іосіфавіч заўважыў здольнасці Георгія і ўзяў у сваю трупу. Але хлопец не стаў артыстам, далейшае яго жыццё было звязана з Чырвонай Арміяй.

У галодныя 1920-я гады ў Глуск прыехала з розных гарадоў шмат высокаадукаванай інтэлігенцыі: выдатны мастак Лебедзеў, лацініст У.М.Лукашэвіч, Срэценскі, Аляксандр Восіпавіч Белы, жанаты на глушчанцы Марфе Феафілаўне Грудзінскай. Белы выкладаў у нас спевы і арганізаваў выдатны хор. Прыкладна ў 1928 г. у яго нарадзілася дачка Зоя. Калі жыццё палепшала, сям'я Белага выехала ў Маскву. Там Аляксандр Восіпавіч працаваў салістам у хоры Свешнікава, Зоя вучылася вакалу і стала вядучай выканаўцай Маскоўскага тэатра аперэты, заслужанай артысткай РСФСР. Яе жыццю і творчасці прысвечана некалькі перадач Цэнтральнага тэлебачання, якія мне давялося бачыць з удзелам кампазітара Хрэннікава, артыста Шмыгі і інш.

Нельга не ўспомніць і сям'ю Грышы Брэуса, нястомнага працаўніка на зямлі. У яго было чатыры дачкі — Таня, Фроня, Ніна і Аня. Усе яны з вялікім энтузіязмам удзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці, а выраслі — сталі ўрачамі.

З Фроняй мы вучыліся з першага класа. Яна вельмі захаплялася тэатрам, паэзіяй, роднай мовай, амаль усе паэмы Янкі Купалы ведала на памяць, але стала выдатным урачом. З першых дзён вайны яна апынулася ў франтавой медыцынскай службе. Разам з ёй служыў яе муж Федзя Вайткевіч, інжынер-капітан. Разам дайшлі яны да Берліна, і Фроня на сцяне рэйхстага распісалася: «Доктар з Глуска Брэус». У Кёнігсбергу ў канцы вайны раптоўна памёр яе муж, і Ефрасіння Рыгораўна дамаглася, каб перавезці яго цела на радзіму ў Мінск і пахаваць на роднай зямлі.

Да канца свайго жыцця яна заставалася адна, узначальвала псіханеўралагічны дыспансер, стала заслужаным урачом рэспублікі, была членам многіх грамадскіх і ветэранскіх арганізацый, прадстаўляла Беларусь амаль ва ўсіх краінах свету. Бязлітасны лёс забраў Фроню і яе сясцёр назаўсёды...

Іван Бобрык з сынамі Янкам і Мікалаем.

Дакументы сведчаць

З РЭЗАЛЮЦЫІ ПЛЕНУМА БАБРУЙСКАГА АКРУГОВАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ПА ДАКЛАДУ ГЛУСКАГА РАЙВЫКАНКОМА І САДАКЛАДУ КАТКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

31 кастрычніка — 2 лістапада 1926 г.

м. Глуск

Пленум канстатуе шэраг дасягненняў, якія выявіліся ў наступным:

3. Правільным правядзенні нацыянальнай палітыкі, якая выявілася ў адкрыцці нацыянальнай латышскай хаты-чытальні; адкрыцці дадатковага комплексу ў яўрэйскай школе і пераводзе на беларускую мову большасці ўстаноў і арганізацый раёна.

4. Набыцці 10 саломарэзак, 2 малатарань, 3 веялак, 1 трыера, 5 плугоў, пружынных барон і 1 ільнамялкі.

5....Пераводзе на шматполле 392 гаспадарак на плошчы 5363 гектары.

6. ...Будаўніцтве млын-лесапільнага завода ў м. Глуск.

7. Пашырэнні школьнай сеткі на 5 камплектаў.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 868. Л. 430 — 433.

З ПІСЬМА СЯЛЯН-БЕДНЯКОЎ в. СЛАЎКАВІЧЫ ГЛУСКАГА РАЁНА БАБРУЙСКАЙ АКРУГІ

23 чэрвеня 1927 г.

В Наркомпрос, т. Луначарскому

Мы, крестьяне, 12 человек бедняков, обращаемся к Вам, т.Луначарский, с большой бедняцкой просьбой. Мы Вас просим: пришлите нам книжек, бумаги, картин и выпишите журналов и газет. Мы бедные, живем плохо, далеко от города, около 100 верст. Наша темная и глухая дер. Славковичи стоит посередине большого леса, болота и т.д. К нам еще не добралась в деревню ни газета, ни книга. Ничего нет. Наше хозяйство плохое, у нас одна лошадь и одна корова, вот из чего состоит хозяйство. А еще к тому хуже, наша земля еще хуже песковая и мало, по 2 дес. на семью, так что на год нам не хватает хлеба и приходится 3 — 4 месяца есть раз в день, потому что нет за что купить и заработать.

Так и перебиваемся с кваса на воду, то мы, 12 человек бедняков, просим Вас, т.Луначарский, помогите нам, мы хотим почитать, мы не знаем куда обратиться, чтобы нам прислали книг и газет и т.д.

Мы хотим книжками, журналами и плакатами поднять свое малограмотное хозяйство и перевести его на передовое культурное хозяйство....

Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы (1918 — 1941). Мн., 1978. С. 117 — 118.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГЛУСКАГА РК КП(б)Б ЗА 1928 — 1929 гг.

В этом году открыто и работает 36 ликпунктов, которыми охвачено 1393 неграмотных, в прошлом году было 17 ликпунктов и охвачено было 442 человека. Школ для малограмотных в этом году 8 с охватом 230 человек, в прошлом году было 2 школы, с охватом 47 человек. С 15 сентября по 15 октября 1928 г. в районе проходил месячник «За грамоту», в результате которого число ячеек общества «ДН» увеличилось по сравнению с прошлым годом с 18 до 37, число друзей возросло с 589 до 1245. Денег до месячника было 35 руб., а после — 1831 руб. 78 коп.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 81. Воп. 1. Спр. 592. Л. 42.

ПАСТАНОВА ГЛУСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ПРА АБАВЯЗКОВАЕ ЎСЕАГУЛЬНАЕ НАВУЧАННЕ

23 жніўня 1932 г.

На падставе пастановы Саўнаркома БСС (рам. 2 — УШ — 32 г.) пра ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання на базе сямігадовай політэхнічнай школы Глускі РВК пастанаўляе:

1. Увесці ў 1932/33 навучальным годзе абавязковае навучанне дзяцей у аб'ёме 7 год школы па ўсяму Глускаму раёну, устанавіўшы абавязковае праходжанне поўнага курса ся-

мігадовай школы для ўсіх дзяцей, якія канчаюць першы канцэнтр, а таксама і для тых дзяцей, якія зараз навучаюцца ў старэйшым канцэнтры сямігадовай школы.

Старшыня Кірыенка

Сакратар Навуменка

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1600 1р — 6. Воп. 1. Спр. 2881. Л. 161.

ПАСТАНОВА № 12 ГЛУСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ПРА АБАВЯЗКОВАЕ НАВУЧАННЕ МАЛАПІСЬМЕННЫХ

13 снежня 1932 г.

м. Глуск

На падставе палажэння пра выданне абавязковых пастаноў (Збор. Законаў і Загадаў БССР ад 30.05.31 г. № 19, арт. 160) і ў развіццё пастановы СНК БССР ад 4 жніўня 1932 г. за № 407 пра ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных

Глускі раённы выканаўчы камітэт ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Увесці ўсеагульнае абавязковае навучанне ў аб'ёме 4-гадовай політэхнічнай савецкай школы:

а) для ўсіх рабочых — членаў прафсаюзаў ва ўзросце ад 16 да 50 год;

б) для астатняга працуючага насельніцтва ад 16 да 45 год, не маючых ведаў у аб'ёме 4-гадовай політэхнічнай школы.

2. Тэрміны ўвядзення абавязковага навучання па Глускаму раёну ўстанавіць наступныя:

а) З 1 кастрычніка 1932 г. увесці абавязковае навучанне для рабочых і сяброў прафсаюза ва ўзросце ад 16 да 45 год, для астатняга насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 30 год за першую групу пачатковай школы дарослых;

б) з 1 кастрычніка 1933 г. для ўсіх рабочых і сяброў прафсаюза ва ўзросце да 50 год, для астатняга працуючага насельніцтва — да 35 год у аб'ёме 4-гадовай політэхнічнай школы;

в) з 1 кастрычніка 1934 г. — для ўсіх працоўных раёна ва ўзросце да 45 год.

За старшыню РВК (КРЫВАШЭЙ)

Сакратар (НАВУМЕНКА)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 160 с-р-6. Воп. 1. Спр. 2881. Л. 207.

У баях і працы гартаваныя

Нараджэнне камсамола на Глушчыне прыпадае на першыя гады савецкай улады. Так, у пратаколе пленума бюро ячэек ЛКСМБ Глускага раёна, які адбыўся 19 кастрычніка 1924 г., указвалася, што неабходна стварыць яшчэ тры ячэйкі. Сакратарамі чатырох раней існуючых былі выбраны: Дакольскай — Шумоўскі, «Пралетарый» — Журык, Гарадоцкай — Сенькевіч, Глускай — Шэйнік. Былі арганізаваны яшчэ чатыры камсамольскія ячэйкі, сакратарамі якіх з'яўляліся: Парэцкай — Чугайла, Макавіцкай — Буднік, Жалвінецкай — Е.Чабан, Ратміравіцкай — Саковіч.

Першая раённая камсамольская канферэнцыя адбылася 21 верасня 1924 г. На ёй быў выбраны райком камсамола, у які ўвайшлі: Мельнік (сакратар райкома), Кацнельсон, Лось, Галавач, Дымкоў, Лук'яновіч, Долгі. Кандыдатамі РК камсамола былі выбраны Ралько і Раманюк. Камсамол Глушчыны паслаў сваімі прадстаўнікамі на акруговы з'езд Мельніка, Кацнельсона, Лось, Дымкова, Суліма, Долгага, Раманюка.

Раённая камсамольская арганізацыя з кожным днём мацнела, папаўнялася новымі маладымі сіламі. Да сакавіка 1925 г. у яе склад уваходзіла ўжо 17 камсамольскіх ячэек, у якіх налічвалася 186 членаў ВЛКСМ. Пераважалі ў той час у камсамоле юнакі. Сярод камсамольцаў раёна было толькі 28 дзяўчат.

Бадай, не было справы, у якой бы камсамольцы не паказалі сваю настойлівасць, баявітасць, упартасць. У камсамольцаў і моладзі дваццатых гадоў было велізарнае жаданне вучыцца. Усе яны, прыйшоўшыя да народнай улады, былі малаадукаванымі, але хацелі быць камуністамі, будаўнікамі новага грамадства. І камсамольцы аб'явілі паход за ведамі. У пратаколе пленума бюро ячэек ЛКСМБ Глускага раёна быў зроблены такі запіс: «У сетцы палітадукацыі

пачынаць вучобу з 1 лістапада», «Весці работу па ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва». Такіх гурткоў у раёне было створана 14.

Вучыцца тады было куды больш складана і цяжэй, чым сёння. Вышэйшых навучальных устаноў было надзвычай мала, ды і паступіць туды з трох-чатырохкласнай адукацыяй моладзь не магла. У Бабруйску і іншых гарадах былі створаны рабфакі, якія рыхтавалі моладзь у ВНУ. Але і на рабфакі прымалі абмежаваную колькасць жадаючых. Сюды пасылалі па пуцёўках камсамола самых лепшых членаў саюза, рабочых, сялян-беднякоў. З Глушчыны трапілі на рабфак адзінкі.

Набываць веды прыходзілася самастойным шляхам. Вялікую дапамогу аказвалі палітшкола 1-й ступені і школа рабочай моладзі, створаная ў 1928 г. у м. Глуск. У ёй займаліся спачатку 73 вучні, былі створаны тры групы па нацыянальнасцях. Чатыры разы ў тыдзень (у панядзелак, сераду, чацвер і пятніцу) збіралася моладзь на прызыўныя агні школы. Вучыліся самі і вучылі іншых, хоць часта «настаўніку» было не больш як чатырнаццаць гадоў. Але дарасласць у той час была вельмі адносным паняццем. Многія з шаснаццацігадовых камсамольцаў стаялі тады на чале сельскіх Саветаў, былі бібліятэкарамі, загадвалі хатамі-чытальнямі. Напрыклад, у в. Барбарова важакамі перадавой сялянскай моладзі былі камсамольцы Іван Рыгоравіч Варава і Сямён Максімавіч Варава. Гэта яны з'яўляліся ў вёсцы галоўнымі носьбітамі слова партыі ў сялянскія масы. Непадкупныя, простыя, душэўныя людзі, адданыя да канца савецкай уладзе, яны будзілі розумы бабровіцкіх мужыкоў новымі думкамі, паняццямі, запальваючы іх сэрцы агнём сваіх палымяных сэрцаў. Ім верылі, за імі ішлі. Яшчэ больш вырас аўтарытэт мясцовых камсамольцаў, калі Івана Вараву прынялі ў члены ВКП(б).

Камсамольская агітацыя супраць непісьменнасці, п'янства і хуліганства, супраць бескультур'я асабліва актывізавалася ў 1928 г. З 15 верасня па 7 лістапада гэтага года ў раёне праводзіўся культбытпаход. Былі арганізаваны дзесяткі атрадаў «лёгкай кавалерыі», якія вялі барацьбу з п'яніцамі і хуліганамі. «Кавалерысты» рыхтавалі плакаты, лозунгі, з якімі

В.Е.Самуцін.

хадзілі па населеных пунктах, чыталі газеты, праводзілі гутаркі. Гэтыя выступленні, шчырыя размовы адкрывалі сялянам вочы. З іх людзі даведваліся пра апошнія падзеі ў краіне і за рубяжом. Тое, што было зроблена камсамольцамі ў справе агітацыі за новы лад, за калгасы, зараз цяжка ацаніць і знайсці для гэтага патрэбную меру. У большасці выпадкаў камсамольцы агітавалі ўласнымі паводзінамі і прыкладам, бо яны ішлі за камуністамі і разам з імі заўсёды былі на самых цяжкіх, адказных і часцей за ўсё небяспечных месцах, клапаціліся не аб уласным, а агульным дабрабыце. Сваёй самаданай працай, з патрэбным тактам і бальшавіцкай вытрымкай яны дзень за днём заваёўвалі давер'е простых людзей, якія канчаткова пераходзілі на бок сацыялістычнага ладу. Вось чаму такім высокім быў аўтарытэт камсамольца, і нярэдка яго падпільноўвала куля з кулацкага абрэза ці нож у спіну.

Але нават гэта не спыняла моладзь, яе імкненне быць у камсамоле. Так, у пачатку 1927 г. у раёне налічвалася ўжо 35 камсамольскіх ячэек, у якіх былі аб'яднаны 904 члены ВЛКСМ.

Сакратаром райкома камсамола ў тыя гады быў выбраны Васіль Самуцін. Зайздросна склаўся лёс гэтага чалавека. Камсамолец з 1923 г., ён заўсёды быў на пярэднім краі жыцця. Кім толькі не давялося працаваць. Простым рабочым, садоўнікам, сакратаром райкома камсамола. Быў намеснікам і адказным рэдактарам газеты «Чырвоная змена», рэдактарам газеты «Камунар Магілёўшчыны», сакратаром Беластоцкага падпольнага акруговага камітэта Кампартыі Заходняй Беларусі, сядзеў у фашысцкіх турмах. Змагаўся на

М.І.Храпко.

франтах Вялікай Айчыннай вайны. Пад яго кіраўніцтвам выходзілі газеты «Звязда», «Віцебскі рабочы», «Советская Белоруссия». Васіль Емяльянавіч займаў пасаду другога, а пасля першага сакратара Баранавіцкага абкома КПБ, працаваў намеснікам міністра лясной гаспадаркі БССР, а перад выхадам на пенсію рэдактарам часопіса «Сельское хозяйство Белоруссии». І падобных на яго людзей камсамол выхаваў мноства.

Э.І.Дубовік.

З верай у шчаслівую будучыню

З успамінаў Марыны Іванаўны Храпко

Многа пройдзена жыццёвых дарог, але гады юнацтва самыя светлыя і незабыўныя.

У 1930 г. мяне выбралі сакратаром камсамольскай ячэйкі Жалвінецкага сельсавета. У гэты ж час мой брат камуніст Сцяпан Храпко ўзначаліў камуну Юзафова — Калюга, крыху пазней стаў першым старшынёй створанага ў в. Юзафова на базе камуны калгаса «Ударнік».

Адной з першых уступіла ў жалвінецкі калгас імя Молатава мая старэйшая сястра Марыя, дзе і яна, і маці потым былі першымі стаханаўкамі па вырошчванні льну.

Моладзь асабліва ўзрушана сустракала падзеі, якімі было так насычана тагачаснае жыццё: стварэнне калгасаў, барацьба з непісьменнасцю, з кулакамі. Ды ці мала знаходзілася спраў у вёсцы, дзе б маглі прыкласці свае сілы і энергію камсамольцы.

Яны стварылі групу «лёгкай кавалерыі», каб ахоўваць грамадскае дабро: кантралявалі работу вартаўнікоў, конюхаў. Вечарамі вучыліся ў мясцовай хаце-чытальні. Карціна ўяўлялася прыкладна такая. На лаўках, зэдліках, дзе хто і як прыстроіўся, каб толькі хапіла месца пакласці сшытак і правую руку з алоўкам, сядзелі барадатыя, апранутыя хто ў што мужыкі, а побач з імі жанчыны. Іх рукі старанна выводзяць літары, якія паказаў ім «настаўнік», бязвусы юнак. Баляць натруджаныя спіны, ад нязвыклага напружання макрэе лоб і патыліца, але мужчыны і жанчыны стараюцца намаляваць тыя рыскі і кручкі, якія паказаў у сшытку настаўнік. Заняткі заканчваюцца толькі тады, калі хто-небудзь ужо не вытрымлівае і ўголас кажа: «Ужо аловак з рук падае, рука анямела зусім. Можа ўжо хопіць? Ды і заўтра на работу рана ўставаць. Давайце сёння закончым, а заўтра працягнем». Настаўнік згаджаецца. Мужчыны закручваюць самакруткі, а жанчыны накідваюць на галовы хусткі і разыходзяцца па хатах.

Якая справа не ўзнікала, камсамольцы стараліся быць першымі памочнікамі камуністаў, добрасумленна выконвалі іх даручэнні.

Восенню 1932 г. райком камсамола накіраваў мяне для работы з моладдзю ў в. Балашэвічы. Той жа парой тут стварыўся калгас, у які першапачаткова ўступіла 18 сялянскіх гаспадарак. Калгас стаў называцца «15 гадоў Кастрычніка», а яго старшынёй балашоўцы выбралі свайго аднавяскоўца Васіля Доўбіка. Новае жыццё настойліва прабівала сабе дарогу. Калектыўная гаспадарка мацнела і расла. Праўда, яшчэ галасілі жанчыны, калі ў агульны калгасны статак вялі ўласную карову, але мужыцкая рука, што трымала ў руках вяроўку, ужо не дрыжэла. Галасілі ж жанкі больш ад несвядомасці і, як здараецца заўсёды, ад боязі новага.

Пастуквалі штодня сякеры на вёсцы: мужыкі будавалі свірны, жывёлагадоўчыя памяшканні. Неўзабаве з в. Крукаўшчына перавезлі ў Балашэвічы дом кулака і стала ў ім хата-чытальня. Вечарамі тут было людна: моладзь вучылася грамаце, да яе далучылася і дарослае насельніцтва. У вачах хлопцаў і дзяўчат я бачыла не толькі

цікавасць, але і павагу да сябе. Перада мной стаяла задача стварыць у вёсцы камсамольскую ячэйку. Але, як высветлілася на месцы, у вёсцы не ўсё было добра. Моладзь не сябравала паміж сабой, дзялілася на два варожыя лагеры. Таму сама сабе паставіла мэту: прымірыць гэтыя лагеры і з'яднаць моладзь у адзіны маналітны калектыў. Выканаць гэтую задачу мне дапамагала настаўніца пачатковых класаў мясцовай школы Ганна Вавілаўна Хартановіч.

Па святочных днях наладжвалі мы разам з ёй у хаце-чытальні цікавыя мерапрыемствы: рыхтавалі лекцыю ці даклад, а то і проста гутарылі з моладдзю, арганізоўвалі танцы. Я ўмела добра іграць на мандаліне, балалайцы, і калі інструмент звонка і заклікальна пачынаў гаманіць у маіх руках, выбіваючы польку-весялуху, здавалася, ногі самі ў скокі просяцца. Адаб'юць танцоры адну — другую польку ці кадрыль на чыста вымытай вясковымі дзяўчатамі падлозе ў хаце-чытальні, тады і паразмаўляць пра сёе-тое можна. І гэта нам удавалася. Канцэрты, гучныя чытанні, спрэчкі да другіх пеўняў — усё гэта прываблівала.

Першымі ўступілі ў камсамол Іван Баглай, Вольга Салавей, Андрэй Баглай, Пятро Каблаш, Павел Каўхута, Анатоль Анцюшэня, Павел Доўбік, Барыс Каблаш, Сцяпан і Ілья Дзядзюлі.

Прапанавала аднойчы юнакам-камсамольцам прывезці з лесу і ўкапаць уздоўж вясковай вуліцы слупы для радыёлініі. Дружна ўзяліся яны за работу, з раёна дапамаглі хутчэй правесці радыёфікацыю. І вось першы радыёрупар загаварыў у хаце, дзе я кватаравала. Пачуў «дзіва» гаспадар хаты Назар Дыба, борздзенька стаў хрысціцца, потым плюнуў у бок «ерасі» — на чорны круг гучнагаварыльніка, трахнуў па ім палкай з усяе сілы, а мне паказаў на парог: маўляў, з бязбожніцай яму страшна пад адным дахам жыць.

Давялося шукаць новы прытулак. Яго з ахвотай прадаставіла мне Тэкля Каўхута, вясковая маладая жанчына, якая любіла паслухаць, як я іграю. Разам з камсамольцамі і перадавой моладдзю па тым вопыце, які ў мяне ўжо меўся, арганізавалі штаб «лёгкай кавалерыі». У задачу кавалерыстаў уваходзіла праверка работы начных вартаўнікоў, дзейнасці і добрасумленнасці кладаўшчыкоў, работнікаў калгаснай фермы. Калі выяўлялі парушэнні грамадскага парадку, заўважалі безгаспадарчасць, пытанне ставілі перад праўленнем калгаса. І яно не магло не лічыцца з нашымі патрабаваннямі: парушальнікі неслі адказ за свае ўчынкі.

Потым камсамольцы стварылі драмгурток, вялі шырокую антырэлігійную дзейнасць. Першая няўдача (у «святы» дзень не прыйшлі гледачы) нас не напалохала. Мы з яшчэ большым азартам узяліся за справу і дабіліся таго, што мясцовы прыход намнога скараціўся. Не шкадуючы сіл, камсамольцы дапамагалі калгасу выйсці ў перадавыя. Арганізоўвалі нядзельнікі, у час малацьбы працавалі нават ноччу, каб хутчэй адправіць дзяржаве чырвоны абоз са збожжанарыхтоўкай. Мы жылі з верай у лепшую будучыню.

Пазней на ўсю краіну прагучаў заклік «Моладзь — на трактар!» Восем чалавек адразу накіравала Балашэвіцкая камсамольская арганізацыя на курсы трактарыстаў пры Глускай МТС. У яе радах у той час ужо налічвалася 17 камсамольцаў. Сярод гэтых васьмі быў Васіль Каўхута, які адпрацаваў трактарыстам усё сваё жыццё; першая ў калгасе жанчына-трактарыстка Домна Каўхута (Прыгара) таксама далучылася да іх. А мой шлях ляжаў у Мінск, мяне паслалі вучыцца на курсы камсамольскіх работнікаў.

З успамінаў Цярэнція Савіча Яльчыка

Калі я ў свой час загарэўся ідэяй стварыць калгасны музей баявой і працоўнай славы, то вялікую ўвагу ўдзяліў збору матэрыялаў, звязаных з камсамольскім мінулым. Так, сёння ў музеі захоўваюцца камсамольскія білеты Мікалая Барадзіна, Пятра Юневіча, Аркадзя Жывіцкага. Першыя атрымалі іх у даваенныя гады і таксама прайшлі з імі ўсе франтавыя выпрабаванні, а Жывіцкі ўступіў у камсамол у час вайны.

Успамінаю камсамольцаў 1920 — 1930-х гадоў: Мікалая Сліжа, які першы стаў сакратаром камсамольскай арганізацыі ў Катцы, Шолама Эпштэйна (пазней ён многія гады ўзначальваў Глускі райспажыўсаюз), Уладзіміра Патапенку, Аляксандра Шчэцьку, Алеся Вінеля і інш. У той час іх было не так ужо і многа, але бралі

В.Я.Касько.

У.К.Коўзун.

яны, як кажуць, не колькасцю, а энтузіязмам, энергіяй, адданасцю, імкненнем быць першымі ў добрых справах. Гэта менавіта яны чыталі даклады для насельніцтва, арганізоўвалі мастацкую самадзейнасць, два разы ў месяц выступалі на вясковай сцэне з канцэртамі. Памятаю, пастаноўка той ці іншай п'есы звычайна выклікала цікавасць у сяльчан. А хто збіраў грошы ў фонд дапамогі рэвалюцыянерам іншых краін? Зноў жа яны, камсамольцы. Жыхары вёскі добра ведалі кожнага з іх, вучыліся ў іх, ішлі за парадай — дарма што маладыя.

Юнацтва незабыўнага пара

Першая камсамольская ячэйка была створана ў Касарычах у 1923 г. Спачатку камсамольцаў было толькі трое — Даніла Юневіч, Ксенія Пінчук, Іван Якубенка. Крыху пазней да іх далучылася яшчэ некалькі хлопцаў і дзяўчат: Каця Якубенка, Аляксандр Журык, Міхась Юневіч, Фёдар Турлыка, Аляксандр Лабейка, Сцепаніда Пракопчык.

Гэта быў час, калі маладая рэспубліка Саветаў залечвала раны, нанесеныя грамадзянскай вайной. Для ўзнаўлення разбуранай народнай гаспадаркі патрэбны былі і матэрыяльныя, і фінансавыя сродкі. Таму пытанне своечасовай уплаты сялянамі сельгаспадатку мела вялікае дзяржаўнае значэнне, і за яго вырашэнне ўзяліся мясцовыя камсамольцы: на добраахвотных пачатках яны аказвалі дапамогу сельскаму Савету ў зборы падаткаў, растлумачвалі сялянам палітыку партыі і ўрада.

Разам з камуністамі камсамольцы перабудоўвалі на новы лад вясковае жыццё: адыходзілі ў нябыт жорсткая эксплуатацыя, беспрасветная нястача, цемра, невуцтва. Камсамольцы змагаліся з кулацкім уплывам на моладзь, выступалі ў абарону юнакоў і дзяўчат, якія батрачылі ў кулакоў і прыватных прадпрымальнікаў. Акрамя таго касарыцкія камсамольцы ўзяліся за ліквідацыю сярод насельніцтва палітычнай і культурнай адсталасці, змагаліся з непісьменнасцю. Павел і Іван Пінчукі, Каця Якубенка, Уладзімір Кормаз прынялі ўдзел у арганізацыі гурткоў па ліквідацыі непісьменнасці – лікбезаў. Познімі вечарамі пасля заканчэння ўсіх работ, пры цьмяным святле газавай лямпы, вучылі яны грамаце сялян, расказвалі, якім будзе далей жыццё, чыталі газеты, растлумачвалі неабходнасць праводзімай у краіне новай эканамічнай палітыкі.

У памяшканні, дзе яшчэ нядаўна размяшчалася Касарыцкая ўчастковая бальніца, былі клуб і хата-чытальня, якія з цягам часу сталі цэнтрам усёй масавай работы ў вёсцы. Тут па вечарах збіраліся юнакі і дзяўчаты, развучвалі песні, вершы, працавалі над ролямі ў нескладаных сцэнах і п'есах. Выявілася нямала талентаў сярод самадзейных «артыстаў», гурткоўцаў драматычнага «тэатра». Жыхары вёскі захапляліся ігрой Фёдара Турлыкі, Івана Пацая, Пятра Юневіча, Васіля Касько. Апошні быў не толькі добрым майстрам выконваць розныя ролі, але і добрым гарманістам і спеваком. Любіла моладзь, калі Васіль браў у рукі гармонік і, здавалася, зліваўся сам з музычным інструментам: расцягваў мяхі, пальцы бегалі па кнопках гармоніка, а сам гарманіст моцным прыгожым голасам зацягваў песню. І вось ужо на поўную моц гучаць «Тачанка», «Наш паровоз», «Там вдали за рекой». Абступіўшы цесным кругам Васіля, хлопцы і дзяўчаты задуменна спявалі пра сяброўства, каханне, пра новае жыццё. Да самадзейных артыстаў з цягам часу перайшлі найбольш галасістыя ўдзельнікі царкоўнага хору.

У дні рэлігійных свят, апрануўшыся па-святочнаму, збіраліся камсамольцы на спартыўнай пляцоўцы, што была непадалёк ад мясцовай царквы. Хто гуляў у валейбол, хто ў футбол, тут жа спаборнічалі лёгкаатлеты. Пад адкрытым небам наладжваўся канцэрт мастацкай самадзейнасці. І

людзі, асабліва моладзь, больш затрымліваліся тут, чым спяшаліся да свяшчэнніка царквы Лукашэвіча. Юнакі і дзяўчаты ўсё больш цягнуліся да рознабаковага грамадскага жыцця, уступалі ў добраахвотныя таварыствы «Чырвоны крыж», «Асаавіяхім», станавіліся меткімі стралкамі. У будучым дзеці беднякоў закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы, многія звязалі свой лёс з Чырвонай Арміяй. Сярод іх былі Васіль Яфрэмавіч Касько і Уладзімір Кузьміч Коўзун.

Л.К.Куксік.

М.П.Трыбуш.

Цяжкасцям насуперак

З успамінаў Марка Паўлавіча Трыбуша

Марк Паўлавіч Трыбуш нарадзіўся і вырас у в. Поблін. У 1920-я гады ён стаў адным з першых вясковых камсамольцаў. Крыху пазней апрануў чырвонаармейскую форму.

На штурм Берліна ў 1945 г. ішоў ужо начальнікам палітаддзела артылерыйскага злучэння. Шаснаццаццю ўрадавымі ўзнагародамі адзначаны баявы шлях былога палітработніка Савецкай Арміі, сярод якіх і ордэн Леніна. Больш за 30 гадоў аддаў ён цяжкай і ганаровай ваеннай справе.

Звольніўшыся ў запас, Марк Паўлавіч з чэрвеня 1962 г. на працягу доўгага часу працаваў дырэктарам фабрыкі ў Маскве.

Гэта быў 1924 г., сёмы год існавання савецкай улады. Жылі людзі яшчэ бедна, нават моладзь апраналася ва ўсё даматканае — ад кашулі да світкі. І рэдка хто меў боты або чаравікі. Насілі сялянскія хлопцы і дзяўчаты лапці.

У вёсцы панавала амаль поўная непісьменнасць. Толькі адзінкам удавалася атрымаць адукацыю і стаць настаўнікамі. Але такія людзі былі ўжо і ў нас у Побліне. Гэта Сідар Дудар, Рыгор Дудар, Адам Тарасевіч — вось, бадай, і ўсе.

У нашай вёсцы ў той час была пачатковая школа. Але дзеці школьнага ўзросту далёка не ўсе мелі магчымасць вучыцца. Большасць гэтых шчасліўчыкаў былі хлапчукі і вельмі мала дзяўчынак. Ды і з тых, хто вучыўся, рэдка хто праходзіў поўны курс, многія пакідалі школу, скончыўшы два — тры класы. Існавалі дзве прычыны, чаму дзеці не маглі вучыцца. Па-першае, у 1914 г. пачалася 1-я сусветная вайна, а пазней — грамадзянская. Усе дарослыя пайшлі ваяваць, а дзеці замест вучобы павінны былі дапамагаць дома па гаспадарцы. Па-другое, жыццё не балавала сялянскіх дзяцей, крайняя беднасць ішла поруч амаль што з кожным, часам ім не было чаго апрануць або абуць, каб ісці ў школу.

Да таго ж у вёсцы была царква. Былы пан Бунчыкаў умела выкарыстоўваў непісьменнасць насельніцтва. Царква не толькі згубна ўздзейнічала на дарослых, але ўзяла пад свой кантроль і школу. Усе вучні павінны былі акуратна наведваць царкву ў час служэнняў, зубрыць незразумелы Закон Божы. Пану даволі лёгка ўдавалася пераконваць людзей у тым, што існуе Бог, што ад яго волі і жадання залежыць дабрабыт кожнага чалавека. У вёсцы не было ні клуба, ні бібліятэкі, газет амаль ніхто не выпісваў, пра радыё і ўяўленне не мелі, а што ўжо казаць пра кіно! Усе хаты асвятляліся лучынай, у лепшым выпадку — газавымі лямпамі...

Вось тая абстаноўка, у якой паявіліся ў вёсцы першыя камсамольцы і нарадзілася думка стварыць у Побліне камсамольскую арганізацыю.

Да таго часу я закончыў усяго тры класы нашай сельскай школы, мой сябар Алёша Галамака на клас больш і адзін год ужо вучыўся у Глускай школе. Ён разумеў больш за мяне, але думкі нашы заўсёды сыходзіліся на адным: трэба працягваць вучобу самастойна.

У 1923 г. у Побліне пры школе пачала працаваць хата-чытальня. Загадчыка прысылалі з Глуска (на жаль, прозвішча яго не захавалася ў маёй памяці), і ён пачаў пад-

біраць актыў з моладзі. Ён рэкамендаваў нам некаторыя кнігі, потым цікавіўся, што мы зразумелі з прачытанага, даваў заданні арганізоўваць калектыўныя чытанні і распаўсюджваць кнігі сярод тых, хто ўмеў чытаць.

Акрамя кніг загадчык хаты-чытальні выдаваў нам школьныя падручнікі, задаваў практычныя заданні. Гэта было нешта падобнае на вячэрнюю школу. Ад загадчыка хаты-чытальні мы ўпершыню пачулі пра камсамол, і з яго дапамогай сталі рыхтавацца да паступлення ў рады камсамольцаў.

У лютым 1924 г. Алёша Галамака паказаў мне свой камсамольскі білет і параіў мне таксама падаць заяву. Некаторы час я вагаўся, але пад уплывам Галамакі таксама падаў заяву з просьбай аб уступленні ў камсамол і ў пачатку красавіка атрымаў камсамольскі білет. У вёсцы дазналіся, што мы сталі камсамольцамі. Заможныя аднавяскоўцы прама заяўлялі, што з намі зробяць тое ж самае, што зрабілі са Смірновым і Саламаціным у в. Балашэвічы.

Смірноў і Саламацін былі крыху старэйшыя за нас. У 1923 г. камсамольская арганізацыя паслала іх збіраць нядоімку ў в. Балашэвічы. Ноччу юнакоў схапілі кулакі, вывелі за вёску і зверскі замучылі.

У Побліне такіх рэзкіх выпадаў супраць камсамольцаў не было, але да нас адносіліся непрыязна, і ўсе беды гатовы былі звaліць на камсамольцаў. Усё ж па меры сваіх сіл, ведаў і здольнасцей мы праводзілі ў вёсцы работу. Што гэта была за работа? Па-першае, мы ніколі не прапускалі камсамольскіх сходаў, хоць праходзілі яны ў Глуску, да якога ад нашай вёскі каля дзесяці кіламетраў. Там мы атрымлівалі заданні і вярталіся позна ноччу, часта ў дождж ці снег.

Акрамя чытання і распаўсюджвання сярод моладзі кніг мы арганізавалі драмгурток і пачалі ставіць невялікія п'есы. Для гэтага ў адным з класных пакояў абсталявалі прымітыўную сцэну. Акцёры з нас, вядома, былі кепскія. Касцюмаў не было ніякіх, мы не грыміраваліся. Увесь грым заключаўся ў тым, што калі патрабавалася па змесце п'есы, то прывязвалі на нітцы бараду і вусы з кудзелі. І ўсё ж людзі ішлі на такія спектаклі, шчыра апладзіравалі і смяяліся. Смяяліся, зразумела, не столькі над зместам п'есы, колькі над акцёрамі, у якіх раз-пораз адрываліся бароды, падалі вусы, ды ў прыдачу ігралі яны няўмела. Але не гэта было галоўным. Жыхары вёскі цягнуліся на аганёк школы, які свяціў ім як пуцяводная зорка ў лепшае жыццё.

Пазней мы паставілі ў райкоме камсамола пытанне аб тым, каб у нашу вёску прыслалі кінаперасоўку. І вось аднойчы яна завітала да нас. Народу сабралася вельмі многа — поўны пакой, пярэднія сядзелі на падлозе, сярэднія — на лаўках, а ззаду людзі стаялі ўшчыльную. Кінаперасоўка была без рухавіка. Яго функцыі выконвала дынамка, якая прыкручвалася да лаўкі і якую прыходзілася круціць уручную. Работа гэта была цяжкая і стамляльная, і, што горш за ўсё, той, хто круціў дынамку, не мог глядзець фільм, таму добраахвотнікаў не знаходзілася. Мы, арганізатары, павінны былі папераменна круціць дынамку амаль на працягу ўсёй карціны.

Першая дэманстрацыя фільма зрабіла на людзей ашаламляльнае ўражанне. Памятаю, пры першых кадрах карціны адна жанчына нават ускрыкнула ўголас, усплеснуўшы рукамі: «Божа ж ты мой! Жывыя людзі! І як гэта маглі зрабіць?» Пазней кінаперасоўка рэдка прыязджала да нас, але людзі з вялікай ахвотай ішлі глядзець кіно.

Нам не ўдалося ў тыя далёкія гады стварыць у вёсцы сваю камсамольскую арганізацыю. Але крупінкі нашай працы не прапалі марна. Яны ўпалі ў добрую глебу — у вёсцы пазней стала многа камсамольцаў. І калі я ўспамінаю той час, адчуваю, як знікае стомленасць, а душа зноў становіцца маладой.

Так усё пачыналася

З успамінаў Сяргея Іванавіча Грахоўскага

...Неспадзявана ўвосень 1930 г. выйшла распараджэнне ў кожным раёне выдаваць газету. А як, з чаго пачынаць, хто возьмецца за новую справу? Журналістаў у раёне і ў паміне не было. Хто ў мястэчку самы адукаваны і дасведчаны?

Дырэктар школы. Ім быў у Глуску заезджы чалавек, Павел Пятровіч Кроль. Яму і даручылі. А ён і ўяўлення не меў, з чаго пачынаць тую газету.

Я амаль з дзяцінства «грашыў» вершамі, рана пачаў друкавацца, пасля школы працаваў на бабруйскім лесакамбінаце, быў членам літаратурнага аб'яднання і часта аціраўся ў рэдакцыі «Камуніста», ведаў сёе-тое пра журналісцкую працу, што такое «абзац», «макет», «вёрстка», нават назвы некаторых шрыфтоў ведаў.

Так здарылася, што ўвосень 1930 г. я параніўся, працуючы на фугавальным станку, і прыехаў далечвацца дадому. Павел Пятровіч Кроль ведаў пра маё дачыненне да друку і папрасіў дапамагчы зрабіць хоць першы нумар першай у раёне газеты. Узяўся я з ахвотай, бо з маленства марыў пра рэдакцыйную работу.

Райком партыі мясціўся ў былой аптэцы Фрыда, дзе дзесяткі гадоў размяшчаўся пасялковы Савет. Адвялі мне пусты пакой, далі стол, пачак паперы, чарніліцу і ручку і, як хочаш, рабі газету. Ніхто яшчэ не ведае пра яе існаванне, ніякіх артыкулаў і заметак няма. Дзе іх браць і пра што пісаць, ніяк не прыдумаю. Нарэшце, даўмеўся. На калідорах райкома і райвыканкома лаўлю старшынь калгасаў, дзядзькоў і цётак, распытваю пра калгасы, пра школы, пра беды, што прывялі людзей шукаць тут праўду. Усё запісваю і з дазволу расказчыкаў заметкі падпісваю іх прозвішчамі. Упрасіў напісаць узнёслую перадавіцу загадчыка аргаддзела райкома партыі Я.З.Гераўкера, падрыхтавалі свае артыкулы аграном Аляксандр Дымкоў, загадчык райана Бараноўскі, райваенком Аляксандр Замалюцін, старшыня райвыканкома і рабочасялянскай інспекцыі Адамовіч... Матэрыялаў сабралася многа.

Машынкі не было, усе заметкі і артыкулы перапісваў ад рукі, паадзначаў абзацы, нават, як умеў, размясціў шрыфты, на аркушы паперы намаляваў макет першага нумара. Рэдактар Кроль толькі пытаўся: «Калі?» Нарэшце, усе матэрыялы аддаў яму. Кроль адвёз іх у бабруйскую друкарню імя Непагодзіна і праз нейкі тыдзень адтуль прывёз першы нумар раённай газеты «Камунар Глушчыны». Раздавалі і рассылалі яе дарам. І пасыпаліся заметкі з сельсаветаў, з вёсак і школ. «Зляпіў» я і другі нумар, а потым дактары закрылі мой бюлетэнь і я зноў вярнуўся ў Бабруйск.

Бываючы дома, у Глуску, жыва цікавіўся яго навінамі. Даведаўся, што праз некалькі месяцаў прывезлі аднекуль прымітыўную друкарню з ручным наборам. І друкарскую машыну, як сячкарню, круцілі рукамі першыя глускія паліграфісты браты Толя і Аркадзь Сачко. Раёнка заваёўвала ўсё больш і больш чытачоў.

Селькоры — навучэнцы Глускай беларускай сямігодкі. У другім радзе першы справа С.І.Грахоўскі, стаяць М.Куляшэўскі, А.Аліфер, А. Юркевіч.

На пярэднім краі

З успамінаў Льва Захаравіча Рагінскага

Падыходзіў да канца 1930 год.

...У гэты час пачала выходзіць раённая шматтыражная газета «Камунар Глушчыны».

Першыя нумары газеты выдаваліся на грамадскіх пачатках. Была арганізавана рэдкалегія. Першымі аўтарамі газеты з'яўляліся партыйныя, савецкія, камсамольскія і калгасныя актывісты, былыя чырвоныя партызаны і ўдзельнікі грамадзянскай вайны.

Памятаю агранома Аляксандра Дымкова, які ўмела спалучаў любоў да зямлі з любоўю да газеты. Ім было напісана шмат нарысаў з калгаснага жыцця, замалёўкі аб перадавіках калгаснай вытворчасці. Пазней А.Дымкоў працаваў у рэдакцыі штатным супрацоўнікам. Сярод няштатных аўтараў газеты былі загадчык аргаддзела райкома партыі Я.Гераўкер, загадчык аддзела райкома партыі Сугака, загадчык райана Баранoўскі, райваенком Замалюцін, старшыня выканкома Адамовіч, райдарінспектар Ваўчок, рабочы Юхнавец, старэйшы камуніст І.Мазалеўскі, партызаны грамадзянскай вайны Дробаў, Райхман, Новікава, Лупсякоў, Холад, Дзетлавіцкі і многія іншыя.

КАМУНАР ГЛУШЧЫНЫ

Сцяг КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Сацыялістычная ВЕСКА

СЦЯГ РАДЗІМЫ

радзіма

СВЯТА ПАМЯЦІ І НАДЗЕ

На сесіі Вярхоўнага Савета СССР

Пад такімі назвамі выходзіла раённая газета.

Выдавалася газета ў той час ў Бабруйскай друкарні. Рэдакцыя размяшчалася ў адным пакойчыку ў райкоме партыі. Прыходзілася пераадольваць вялікія цяжкасці, каб газета выпускалася ў тэрмін. У той час аўтамашыны былі яшчэ вялікай рэдкасцю. Асноўны від транспарту – коні. На падводзе нам даводзілася везці матэрыялы ў Бабруйск і адтуль дастаўляць газету. Толькі, каб даехаць у адзін канец, затрачвалі па 8—9 гадзін.

Прыемна было, што з першых нумароў газета заваявала вялікую папулярнасць сярод калгаснікаў, рабочых саўгаса і сельскай інтэлігенцыі. Тыраж даходзіў амаль да 5 тысяч экзэмпляраў. Амаль кожны двор выпісваў раённую газету.

Аднымі з першых селькораў былі В.Мішур з в. Жалвінец, Ф.Жураўскі з Казловіцкага сельсавета, настаўнік школы Буклей, работнік райкома камсамола Гурчанка, І.Малаковіч з в. Зубарэвічы і многія іншыя жыхары раёна.

Прыкладна праз паўгода пасля выхаду першага нумара газеты рэдакцыя склікала раённы злёт рабселькораў, на якім прысутнічала больш за 70 чалавек. Удзельнікі яго зацікаўлена гаварылі аб раённай газеце, выказвалі заўвагі і пажаданні, як лепш арганізаваць работу.

Ужо ў пачатку 1931 г. газета пачала выходзіць тры разы ў тыдзень і стала называцца «Сцяг калектывізацыі», а першым адказным рэдактарам быў назначаны былы дырэктар школы П.П.Кроль.

У канцы 1931 г. рашэннем райкома партыі кіраўніцтва газетай даручылі мне. Прычынай для гэтага, відаць, паслужыла тое, што, пачынаючы з першага нумара газеты, я прымаў актыўны ўдзел у яе выпусках, з'яўляўся няштатным карэспандэнтам. У той час з кадрамі газетных работнікаў было цяжка. Нашы навучальныя ўстановы толькі-толькі пачыналі рыхтаваць работнікаў друку і журналістаў.

І вось без спецыяльнай падрыхтоўкі мне прыйшлося ўзяцца за рэдагаванне газеты і стварэнне базы для яе выпуску. Дарэчы, амаль увесь састаў рэдакцыі быў укамплектаваны з ліку актыўных карэспандэнтаў. Недахоп ведаў кампенсаваўся нашым гарачым імкненнем працаваць як мага лепш і больш.

Сіла газеты заключалася ў тым, што яна імкнулася хутка і аператыўна адгукацца на пытанні, якія ставіла жыццё. У гарачую пару веснавой сяўбы, уборкі ўраджаю, хлебанарыхтовак газета выходзіла штодзённа ў выглядзе аператыўнага бюлетэня, змяшчала на сваіх старонках зводкі, а таксама пісьмы з калгасаў і саўгасаў і нарыхтоўчых пунктаў.

Як вядома, ў тыя гады ў краіне ішло велізарнае будаўніцтва. Патрабавалася шмат матэрыялаў. Глускі леспрамгас (у той час буйнейшы ў рэспубліцы) быў закліканы бесперапынна забяспечваць новабудоўлі лесам. Ад выканання планаў лесанарыхтовак у многім залежалі тэмпы індустрыялізацыі краіны. Памятаю, што адзін час адставаў Зелянковіцкі лесаўчастак. Сюды прыбыла выязная рэдакцыя. Яна дапамагала разабрацца ў прычынах адставання. На сваіх старонках газета з нумара ў нумар папулярызавала перадавы вопыт лепшых лесарубаў, брыгад, востра крытыкавала адстаючых і недахопы ў арганізацыі працы і бытавога абслугоўвання лесарубаў. Усё гэта дапамагло ўчастку выйсці з прарыву.

Сваю любоў да газеты сяляне выказвалі па-рознаму. Скажам, у адной з вёсак Слаўкавіцкага сельсавета яны, аб'яднаўшыся ў калгас, назвалі яго імем газеты «Сцяг калектывізацыі». У іншых выпадках (а іх было нямала) калгаснікі арганізоўвалі чырвоныя абозы з хлебам імя газеты «Сцяг калектывізацыі», удзельнічалі ў зборы сродкаў на будаўніцтва трактарнай калоны «Рабселькор». Памятаю, як адной-

Л.З.Рагінскі.

чы са станцыі Ратміравічы быў адпраўлены эшалон з бульбай для Ленінграда, арганізаваны камсамольцамі і рабселькорамі раёна.

Самае каштоўнае — гэта тое, што рабселькоры не толькі пісалі ў газету, выкрывалі недахопы ў рабоце. Яны, як правіла, сваім асабістым прыкладам у працы служылі ўзорам для іншых. І не выпадкова, што многія з іх былі абраны ў састаў праўленняў калгасаў, у сельсаветы, а адзін з першых селькораў В.Мішур быў абраны дэлегатам на II Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў.

Шмат пісем атрымлівала штодзённа рэдакцыя газеты з калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў і ўстаноў. Пры ўсім сваім жаданні рэдакцыя не магла змясціць іх на старонках газеты. І, нягледзячы на гэта, ні адно пісьмо не заставалася без увагі. Частка пісем друкавалася на старонках газет у выглядзе агляду пісем, другая — рассылалася на рэагаванне, а значная частка атрыманых пісем змяшчалася на спецыяльных бланках, якія выходзілі як насценныя газеты пад назвай раённай газеты «Сцяг калектывізацыі». Гэта дапамагала ўзнімаць грамадскую думку супраць выкрытых недахопаў, выпраўляць розныя хібы ў рабоце.

Па старонках газеты «Сцяг калектывізацыі»

7 лістапада 1935 г.

ДЗЕЦІ АКЦЯБРА

Цягнуцца нашы дзеці да тэхнічных ведаў. Гэта бачна з таго, што ў раёне вывучэннем тэхнікі займаецца 250 чалавек. З іх 80 – наведваюць дзіцячую тэхнічную станцыю м. Глуска.

Рабяты з Глуска зрабілі 7 дэтэктарных радыёпрыёмнікаў, 2 электраматоры, 30 авіямадэлей, 2 лятаючыя змеі і шар Мангальф'ера.

Лепшыя юныя тэхнікі — гэта Коля Клімчык, А.Сценько, Шура Пастушонак, Вера Юркевіч, Глод, Маруся Клімчык, Андрэй Салохін, А.Махнач.

В.Дзесюкевіч.

7 лістапада 1935 г.

ГАЗЕТА ДАПАМАГЛА

У 1932 г. газета «Сцяг калектывізацыі» адыграла вялікую ролю ў арганізацыі нашага калгаса «Чырвоная Дуброва». Калі класавыя ворагі стараліся разваліць калгас, газета на сваіх старонках выкрыла ўсе варожыя махінацыі і работа ў калгасе наладзілася.

Селькор Я.Навічонак.

20 лістапада 1935 г.

РАСЦЕ СОЯ Ў КАЛГАСЕ ІМЯ МОЛАТАВА

Я быў удзельнікам II Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў. На з'ездзе многія заключылі дагаворы з Усесаюзным навукова-даследчым інстытутам на правядзенне ў сваіх гаспадарках доследаў па вырошчванню сельскагаспадарчых культур, якія да гэтага там не раслі. Я ад імя сваіх калгаснікаў згадзіўся праверыць, ці будзе расці ў нас такая каштоўная бабовая культура, як соя. Хутка ў наш калгас прыбыло насенне соі і дослед пачаўся.

Ужо ў першы год мы прыйшлі да вываду, што соя ўпаўне можа расці на нашых землях.

В.Мішур.

27 лістапада 1935 г.

ВЯЛІКІ ГОНАР БЫЦЬ СТАХАНАЎКАЙ

Трапальшчыца льну калгаса «Новы шлях» Надзя Хурсевіч дабілася высокіх норм выпрацоўкі. За дзень пры норме 6 кілаграмаў яна націрае 25 кілаграмаў ільна-валакна пры высокай якасці.

За ўдарную працу праўленне калгаса прэміравала Надзю грашовай прэміяй.

С.Савончык.

15 снежня 1935 г.

КАЛГАС СТАНОВІЦЦА БАЛЬШАВІЦКІМ

Сярод векавых імхоў, балот і лясоў за 40 кіламетраў ад райцэнтра ў 1931 годзе арганізаваўся калгас «Чырвоны партызан».

Калгас з кожным днём рос і багацеў. За 4 гады свайго існавання з 32 гаспадарак ён вырас да 78. Зямельная плошча калгаса павялічылася з 96 да 410 гектараў. Рост усёй жывёлы за гэты перыяд склаў ад 70 да 267 галоў.

Калгас у гэтым годзе стаў адным з перадавых у сельсавеце. Ён датэрмінова выканаў усе гаспадарча-палітычныя кампаніі перад дзяржавай. Кіруе калгасам адзін з лепшых былых чырвоных партызан Андрэй Драпеза.

Селькор А.Шэйка.

29 сакавіка 1936 г.

НОВЫ ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ

Па згодзе яўрэйскага працоўнага насельніцтва двухпавярховы будынак сінагогі, што па вул. Сацыялістычнай, 10, перабудаваны ў Дом культуры.

На першым паверсе абсталявана зала для кіно і пастановак, тут жа пакой розных гульняў, раздзявальня. На другім паверсе размясцілася райбібліятэка і чытальная зала.

Да 25 красавіка ў клубе будзе ўстаноўлена гукавое кіно.

28 лютага 1939 г.

ПЕРАДАВОЕ ЗВЯНО

Звяно лесарубаў з калгаса «11-годдзе вызвалення БССР» Бярозаўскага сельсавета, працуючы на Зелянковіцкім лесаўчастку, дабілася выдатных поспехаў у нарыхтоўцы фанернай альхі.

31 студзеня гэтае звяно ў складзе В.Падаляка (звеньявы), С.Хланя, І.Булкі, І.Голуба і Г.Булкі за рабочы дзень нарыхтавала 307 кубаметраў драўніны, перавыканаўшы дзённую норму на 1279 працэнтаў. У астатнія дні звяно выконвала нормы на 500 працэнтаў.

Свае дасягненні звяно прысвяціла адкрыццю XVIII з'езда ВКП(б).

Стружачная вытворчасць у мястэчку Глуск Бабруйскай акругі

У м. Глуск звяртае на сябе ўвагу стружачная вытворчасць, у якой занята цяпер каля 100 сямей. Гэта вытворчасць ёсць у 3-х месцах СССР: у Глуску, у ваколіцах Ленінграда і каля Урала, прычым у Глуску з дрэўнай стружкі каля 1 мм шырыні вырабляецца тканіна, а ў другіх месцах такая афарбаваная тканіна розных нумароў і банты.

Гісторыя гэтай вытворчасці ў Глуску наступная. Стружачная вытворчасць за граніцай аснавана ўжо даўно. Дзякуючы недахопу лясоў за граніцай у 1902 годзе прыехалі ў Глуск, навакол якога ляжаць

велізарныя лясы і пушчы, два прадпрыемцы – італьянец і аўстрыяк і распачалі тут выраб стружкі, але не тканіны. З 1902 да 1905 года працавала чалавек 40. Выраб адпраўляўся за граніцу. Гэтыя першыя прадпрыемцы пагарэлі ў часе забастовак 1905 года. Іх змяніў іх рабочы, глускі мешчанін, Кушнер. Ён з 1906 — 1910 г. працаваў з 2 — 3 толькі людзьмі і адпраўляў свой выраб за граніцу і ў Польшчу, прычым вырабляў толькі стружку, а не тканіну. У Кушнера з 1910 — 1914 г. працавала ўжо 120 чалавек — 60 мужчын і 60 жанчын. У 1914 годзе ён выклікаў сюды з Аўстрыі аднаго немца — майстра, які прывёз з сабой тканіну. Дзеля гэтага ў 1914 г. распаўсюдзіўся тут, у Глуску, выраб тканіны і розных бантаў, размерам ад 1 да 80 мм, прычым вырабы хварбаваліся ў разнастайныя хварбы. У час аб'яўлення вайны загінула шмат гатовага матар'ялу, прыблізна на 14 000 руб.

Цяпер стружачная вытворчасць у Глуску знаходзіцца ў руках групы прадпрыемцаў, на чале з Кушнерам і Цвасманам. Зваротны капітал першага, які абкладаецца падаткам, выражаецца ў суме 14000 руб., а другога – 8000 руб. Плацяць падаткаў:

	Кушнер	Цвасман
1. Патэнт	64 р.	64 р.
2. Зраўнальны збор	360 р.	200 р.
3. Асноўны падаходны збор	25 р. 50 к.	25 р. 50 к.
4. Падаходны збор	312 р.	108 р.
5. Камун. гаспадарцы	75 р.	42 р.
Усяго:	836 р.50 к.	439 р.50 к.

Для гэтай вытворчасці ў Глуску працуюць: 1 майстэрня, 8 — 11 стругалёў і 50 станкоў варстатаў.

У майстэрні Кушнера папраўляюцца папсутыя інструменты і варстаты і робяцца новыя. Прадпрыемцы баяцца канкурэнцыі і дэталі свайго варстата трымаюць у сакрэце.

Стругалі, лік якіх хістаецца ад 8 да 11, вырабляюць матар'ял для тканння, так званую стружку. Стружка вырабляецца з дрэва асіны, якога ідзе ў год каля 300 пудоў... Стругаюць гэблем загранічнай работы (прывезена каля 15 шт. у 1914 г.). Стругаль зарабляе ў месяц каля 80 руб.

Зробленая стругалямі стружка — тонкія, як папера, драўляныя пасмы, даўжынёю каля 28 вяршкоў, — звязваецца пучкамі і раздаецца па дамах жанчынам ткаліцам для тканння на станках-варстатах. Варстат каштуе каля 45 руб. Прадпрыемцы выдаюць варстаты на дом ткаліцам работніцам, абавязаўшы іх нікому не дазваляць прыглядацца да іх пад пагрозай пазбаўлення работы. Варстат мае даўжыню 2 арш., 4 вярш. і вышыню да столі (розную), да якой ён прымацаваны. Галоўныя часці: 1/ навой — барабан, на які накручваецца тканіна, і мае даўжыню 17 — 22 вярш. з дыяметрам да 11 вярш., 2/ ляда, 3/ бёрда, 4/ трыніты і 5/ стойкі, прымацаваныя да столі. На такім варстаце і тчэцца стружка, робяцца з яе палотнішчы шырынёю 17 — 22 вяр. і даўжынёю каля 28 вярш. Ткаліца вырабляе па прафсаюзнай норме 14 палотнішчаў у дзень і зарабляе ў месяц 28 руб., але добрая работніца і на добрым варстаце магла б выткаць каля 20 палотнішчаў. Многа дзесяткаў сямей ад тканння стружкі маюць кавалак хлеба. У месяц усяго вырабляецца ў Глуску каля 5000 шт. гэтых арыгінальных палотнішчаў.

Рынкам збыту з'яўляюцца буйныя гарады СССР, а за межы тканіна не вывозіцца. Кошт аднаго палотнішча — 20 кап. Тавар збываецца асобным камісіянерам партыямі. Збыт за граніцу немагчымы дзеля значных накладных выдаткаў — высокіх падаткаў і дарагоўлі працоўных рук. Перашкодамі для развіцця гэтай прамысловасці ў Глуску з'яўляецца: 1/ тканіна ідзе на капелюшы, але ёсць прадметы, якія яе змяняюць: а/ рагожкі або рашоты, што вырабляюцца ў падмаскоўных губернях саматужнікамі, якія не плацяць падаткаў, б/ «ліно» — фабрычны прадмет і в/ кардон; 2/ высокія падаткі; 3/ канкурэнцыя з іншымі прадпрыемцамі. Аднак, нягледзячы на перашкоды, стружачная вытворчасць у Глуску значна ўзрасла ў параўнанні з мінулым годам.

7 сакавіка 1926 г.
м. Глуск
Каракін.

Наш край. 1926. № 2–3 (5–6). С. 51–52.

Падрыхтаваў В.У.Ляшчынскі.

Вернутыя імёны

У сярэдзіне і другой палавіне 1930-х гадоў рэпрэсіі лавінай абрушыліся на партыйны, савецкі і камсамольскі апарат, камандны састаў арміі. Барацьба з так званымі нацдэмамі, кулакамі змянілася ліквідацыяй агентаў варожых разведак. У выніку ў рэспубліцы надоўга быў спынены працэс фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі. Кампартыя Беларусі страціла больш за 40% свайго саставу, да пачатку 1939 г. з 101 сакратара раённых і акруговых камітэтаў партыі былі рэпрэсіраваны 99. Кампартыя рэспублікі, на жаль, аказалася не ў стане супрацьстаяць сфабрыкаванай органамі НКУС версіі аб існаванні ў БССР вялікага антысавецкага (трацкісцкага) падполля, быццам бы ўзначальваемага партыйнымі і савецкімі работнікамі, дзяржаўнымі дзеячамі, прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі.

Ахвярамі небывалага тэрору сталі і многія супрацоўнікі Акадэміі навук БССР. У дакументах тых гадоў, прадстаўленых НКУС Беларусі ў ЦК ВКП(б), Акадэмія навук характарызавалася як «ачаг контрэвалюцыі і шпіянажу».

Адным з такіх «шпіёнаў» быў ураджэнец в. Гарадзішча Глускага раёна Рыгор Восіпавіч Краснеўскі, які ў 1938 г. выконваў абавязкі дырэктара Інстытута літаратуры і мовы АН БССР. Яму было прад'яўлена абвінавачванне ў тым, што ён з'яўляецца ўдзельнікам нацыянал-фашысцкай трацкісцкай арганізацыі.

У выніку фізічнага ўздзеяння Р.В.Краснеўскі на 52 старонках уласных паказанняў, напісаных 15 мая 1938 г., расказаў аб сваёй «контррэвалюцыйнай дзейнасці». Аднак трэба адразу зазначыць, што пазней ён іх поўнасцю адвергнуў.

Чалавека прымусілі агаварыць самога сябе. Р.В.Краснеўскі заяўляў следчаму, што ён «састаіць у нацыянал-фашысцкай і трацкісцкай арганізацыі» і быў завербаваны ў яе ў 1927 г. у час вучобы на рабфаку былым сакратаром Ляхавіцкага райкома КП(б)Б Валковічам і загаргам гэтага райкома Майсевічам. Чаму менавіта названыя людзі праходзілі па следству? Ды таму, што Р.В.Краснеўскі ў 1927 г. працаваў у Ляхавіцкім райкоме партыі. У 1928 г. ён вучыцца ў БДУ на літаратурным аддзяленні, адначасова працуючы ў «Звяздзе», потым перайшоў на пазаштатную літаратурную работу. Пазней, да канца 1933 г., Краснеўскі вучыўся ў Інстытуце чырвонай прафесуры, а ў лютым быў мабілізаваны на работу ў палітаддзел саўгаса «Васільеўка» Гомельскага раёна ў якасці намесніка начальніка палітаддзела па партыйна-масавай рабоце, а ў лістападзе ўжо быў зацверджаны начальнікам палітаддзела, праўда, папрацаваў у гэтай якасці толькі 3 месяцы.

Вось з такім жыццёвым і навуковым багажом Р.В.Краснеўскі быў накіраваны на работу ў Інстытут літаратуры і мовы АН БССР. Не дзіўна таму, што ён не быў гатовы да гэтай пасады, і дапусціў шэраг памылак, якія інкрымінаваліся яму як шпіянаж.

На допыце ў прысутнасці пракурора Р.В.Краснеўскі адмовіўся ад ранейшых паказанняў і прызнаў сябе вінаватым толькі ў тым, што, «працуючы дырэктарам інстытута, дапусціў выпуск з друку і асабіста рэдагаваў кнігу Замоціна аб Пушкіну, у якой недастаткова падкрэслена роля Пушкіна як вялікага рускага пісьменніка — заснавальніка рускай літаратуры і мовы».

«...Я часткова вінаваты ў тым, што з'яўляюся сурэдактарам кнігі «Матэрыялы па гісторыі беларускай літаратуры», якая была надрукавана ў колькасці 10 тыс. паасобнікаў і якая была знята ў 1936 г. як шкодная...». Шкодная таму, што 4 з 6 аўтараў кнігі былі арыштаваны, а кніга канфіскавана па прычыне таго, што змяшчала артыкулы са станоўчымі ацэнкамі пісьменнікаў, выкрытых пазней як ворагаў народа.

Аднак не толькі гэтая кніга выйшла пад кіраўніцтвам Р.В.Краснеўскага. Як сведчылі матэрыялы камісіі, арганізаванай для праверкі дзейнасці Краснеўскага пасля таго, як ён адмовіўся ад сваіх ранейшых паказанняў, быў надрукаваны малы «Рускабеларускі слоўнік». Як адзначалася, ён утрымліваў у сабе шмат паланізмаў, «... у ім ігнаруюцца словы, падобныя на рускія, што з'яўляецца працягам нацыянал-фашысцкай палітыкі ў галіне мовы. Слоўнік далёкі ад жывой беларускай мовы і засмечаны шэрагам зусім непатрэбных слоў. А таму падлягае канфіскацыі... Бо па свайму на-

кірунку і характару гэтая кніга з'яўляецца шкодніцкай, яна цалкам напісана ў духу вульгарнага сацыялізму. Пры характарыстыцы некаторых пісьменнікаў дарэвалюцыйнай беларускай літаратуры (Купала, Колас, Цётка, Багдановіч, Бядуля) асноўны ўпор робіцца на падкрэсліванне рэакцыйных элементаў, як вядучых у іх творчасці. І тым самым затушоўваюцца рэвалюцыйна-дэмакратычныя элементы ў літаратурнай спадчыне мінулага. І такім чынам, беларуская дакастрычніцкая літаратура ў яе галоўных праяўленнях, прадстаўленая ў кнізе, выглядае як літаратура, неад'емнай асаблівасцю якой з'яўляецца нацыяналізм...».

9 мая 1939 г. Р.В.Краснеўскаму было вынесена абвінавачванне, што ён нібыта па заданні былога прэзідэнта АН БССР, «выкрытага ворага народа Сурты», праводзіў контррэвалюцыйную, нацдэмаўскую варожую лінію ва ўсёй навуковай рабоце Інстытута літаратуры і мовы.

Фінал у гэтай гісторыі сумны: Р.В.Краснеўскі быў асуджаны як вораг народа. Яго лёс паўтарыў трагедыю шматлікіх ахвяр сталінскай эпохі. І толькі пазней Р.В.Краснеўскі быў рэабілітаваны.

У тыя сапраўды крывавыя трыццатыя гады былі рэпрэсіраваны П.Дз.Малаковіч, які працаваў у Наркамаце сувязі СССР, важак Бабруйскага падполля П.Ф.Равінскі, які працаваў членам ЦВК БССР, і многія іншыя верныя сыны і дочкі беларускага народа.

Хваля сталінскіх рэпрэсій захапіла і простых людзей. Сотні, тысячы іх сталі бязвіннымі ахвярамі. Учытайцеся ўважліва ў спісы рэпрэсіраваных грамадзян — жыхароў Глушчыны, паглядзіце, кім былі асобныя з іх: калгаснік, каваль, даярка, настаўнік, святар... У чым іх віна? Розныя гэта людзі, непадобныя і іх лёсы. Адных расстралялі, замучылі адразу, без суда і следства. Другія прайшлі лагернае пекла, дзе кожны дзень глядзелі смерці ў вочы і, не вытрымаўшы нечалавечых катаванняў, ціха і непрыметна пакінулі жыццё. Трэція ж, прайшоўшы суровыя выпрабаванні, усё ж такі выстаялі, выжылі, вярнуліся да жыцця.

У канцы 1938 г. адбыліся змены ў вышэйшым кіраўніцтве НКУС. З'явілася надзея на аднаўленне справядлівасці. Аднак паляванне «за ворагамі народа» спынена не было. Яно працягвалася аж да смерці Сталіна ў 1953 г.

Т.А.Матусевіч.

Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій

Гісторыя заўсёды справядлівая, у ёй наша праўда, наш боль, яна расстаўляе ўсё па сваіх месцах, аднаўляе праўду і справядлівасць.

Тысячы людзей розных нацыянальнасцей у трыццатыя гады былі прызваны «ворагамі народа» і насільна адпраўлены ў лагеры, у месцы спецыяльных пасяленняў.

Як высветлілася пазней, гэтыя людзі антысавецкай дзейнасцю не займаліся і прад'яўленыя ім абвінавачванні былі неабгрунтаваныя. Цяпер нявінна пацярпеўшыя грамадзяне рэабілітаваны гісторыяй.

Многа крыві пралілося, велізарныя страты, страшэнныя ахвяры, перад якімі мы сёння схіляем галовы. Гісторыя вяртае памяць аб іх. Гэтая памяць як самы важны, самы каштоўны дар, які мы перадаём сваім дзецям і ўнукам. Няхай у душах і сэрцах іх заўсёды гарыць агонь нашай памяці. І няхай падобнае больш ніколі не паўторыцца.

На жаль, застаюцца яшчэ і такія, чый лёс невядомы і да сённяшняга дня. Работа ў архівах працягваецца. Намаганнямі многіх людзей вяртаюцца з небыцця ўсё новыя імёны, пазбаўленыя дзесяцігоддзямі права на існаванне.

АДЗІНЕЦ Аркадзь Якаўлевіч, н. 9.8.1895 у в. Парэчча, мовазнаўца, вучыўся ў аспірантуры АН БССР. Арыштаваны 18.7.1930. Асуджаны на 5 гадоў з высылкай у г.Чэбаксары Чувашскай АССР. 25.6.1935 асуджаны паўторна. Рэабілітаваны па абодвух прыгаворах 15.11.1957.

АДНАМАХ Адам Антонавіч, н. у 1887, жыў у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.1.1945. Асуджаны да 15 гадоў катаржных работ. Рэабілітаваны 6.11.1956.

АДНАМАХ Павел Іванавіч, н. у 1902 у в. Макавічы. Арыштаваны 22.10.1940. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.6.1990.

АКУЛІЧ Юльян Іванавіч, н. у 1904 у в. Баравішча, ваеннаслужачы 19-й мехбрыгады г. Асіповічы. Арыштаваны 28.12.1944. Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 16.11.1959.

АЛЕЙНІК Фядос Якаўлевіч, н. у 1904 у в. Харомцы, калгаснік калгаса «Казбек». Арыштаваны 22.4.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 16.11.1959.

АЛЕЙНІК Якаў Яўхімавіч, н. у 1868, жыў у в. Харомцы. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 16.11.1959.

АЛЬХІМОВІЧ Іван Міронавіч, н. у 1903, жыў у в. Веснава, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Арыштаваны 29.12.1944, следчая справа спынена. Рэабілітаваны 15.8.1945.

АНАНІЧ Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1903 у в. Пратасы Парыцкага раёна, культнаглядчык Глускага лясгаса. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 29.10.1957.

АНДАРСАН Ян Карлавіч, н. у 1910, жыў у в.Воземля, загадчык хаты-чытальні. Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

АНДРОСІК Андрэй Міронавіч, н. у 1882 у в. Бярозаўка. Кузнец калгаса «Чырвоная зорка». Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНДРУСЕВІЧ Іосіф Міронавіч, н. у 1889 у в. Воземля, жыў у в. Андрэеўка, старшыня калгаса. Арыштаваны 15.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АНЦЮШЭНЯ Дзмітрый Аляксандравіч, н. у 1906 у в. Макавічы, чырвонаармеец супрацьтанкавага артпалка. Арыштаваны 15.9.1942. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.12.1942.

АРЦЁМЧЫК Аляксандр Паўлавіч, н. у 1923. Высланы разам з бацькамі. Вызвалены ў 1940. Рэабілітаваны 21.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Аляксандра Паўлаўна, н. у 1921. Выслана разам з бацькамі. Вызвалена ў 1940. Рэабілітавана 21.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Аляксандр Цярэнцьевіч, н. у 1905. Высланы разам з бацькамі.

АРЦЁМЧЫК Андрэй Іванавіч, н. у 1908 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 31.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1989.

АРЦЁМЧЫК Ганна Дарафееўна, н. у 1897 у в. Бабірова. Арыштавана ў 1930. Асуджана на 17 гадоў і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 21.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Ева Пятроўна, н. у 1912 у в. Бабірова. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 26.5.1993.

АРЦЁМЧЫК Марыя Міхайлаўна, н. у 1872 у в. Бабірова. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 26.5.1993.

АРЦЁМЧЫК Мікалай Паўлавіч, н. у 1930. Высланы разам з бацькамі. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны 21.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1909. Высланы разам з бацькамі.

АРЦЁМЧЫК Павел Сцяпанавіч, н. у 1896 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны на 17 гадоў і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 21.12.1992.

АРЦЁМЧЫК Рыгор Цярэнцьевіч, н. у 1903. Высланы разам з бацькамі.

АРЦЁМЧЫК Цярэнцій Кандратавіч, н. у 1879 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 31.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.11.1989.

АРЦЁМЧЫК Цярэнцій Кандратавіч, н. у 1879 у в. Бабірова. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 26.5.1993.

АРЦЮХОЎСКІ Архіп Кандратавіч, н. у 1864, жыў у в. Юзафова. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 17.7.1992.

АСТАШЭВІЧ Яраслаў Адамавіч, н. у 1899, жыў у в. Зарэчча, калгаснік калгаса «Пралетарый». Арыштаваны 19.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.6.1956.

АФАНАСЕНКА Фёдар Васільевіч, н. у 1905, жыў у в. Лаўстыкі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1939. Апраўданы 21.6.1939.

АХРЭМЧЫК Агафія Ермалаеўна, н. у 1920, жыла ў в. Цяснова, настаўніца школы. Арыштавана 12.1.1945, з-за недастатковасці ўлік вызвалена 31.7.1945.

БАБАК Міна Паўлавіч, н. у 1902 у в. Барысаўшчына, калгаснік. Арыштаваны 29.2.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 24.10.1989.

БАБІНІЧ Рыгор Максімавіч, н. у 1893 у в. Шкава, цясляр фабрыкі «Чырвоны харчавік». Арыштаваны 23.8.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.7.1990.

БАБІЧ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1896 у в. Жалвінец, калгаснік калгаса імя Чкалава. Арыштаваны 21.6.1946. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.12.1963.

БАБОВІК Сямён Яўсеевіч, н. у 1877 у в. Ляскавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАГДАНОВІЧ Мікалай Андрэевіч, н. у 1868 у в. Харомцы, сталяр калгаса «Казбек». Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАГУК Міхей Макаравіч, жыў у в. Халопенічы. Арыштаваны ў 1932, раскулачаны. Рэабілітаваны 13.4.1993.

БАКУН Дзмітрый Іванавіч, н. у 1906 у в. Амур, старшыня Сіманавіцкага сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

БАНДАРЖЭЎСКАЯ Марыя Пятроўна, н. у 1911 у в. Лысая Гара. Арыштавана ў 1930. Асуджана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 23.6.1992.

БАРАНОК Казімір Францавіч, н. у 1885, жыў у в. Халопенічы, конюх МТС Глускага раёна. Арыштаваны 19.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАРАНОК Пётр Францавіч, н. у 1883 у в. Бяседы Капаткевіцкага раёна, рабочы саўгаса «Харомцы». Арыштаваны 19.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАРАНОЎСКАЯ Марыя Антонаўна, н. у 1916, жыла ў Глуску, сакратар Учдор 704. Арыштавана 29.7.1944, следчая справа спынена 17.9.1945.

БАРАНОЎСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1908, жыў у в. Малкава. Арыштаваны 25.3.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 20.7.1959.

БАРАНОЎСКІ Нічыпар Андрэевіч, н. у 1902 у в. Малкава. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Высланы ў Якуцію. Рэабілітаваны 25.8.1992.

БАРАНОЎСКІ Усцін Андрэевіч, н. у 1894, жыў у в. Малкава. Арыштаваны 26.3.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 20.7.1959.

БАРЫСІК Акула Цярэнцьевіч, н. у 1870 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.10.1937. Рэабілітаваны 9.6.1989.

БАРЫСІК Антон Акулавіч, н. у 1900 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.6.1989.

БАРЫСІК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1892 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.6.1941. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.7.1964.

БАХАНОВІЧ Іван Нічыпаравіч, н. у 1896, жыў у в. Баянава, калгаснік калгаса «Чырвоны маяк». Арыштаваны 23.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕДЗІК Максім Іванавіч, н. у 1876 у в. Заганы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.10.1930. Асуджаны і высланы з жонкай і 5 дзецьмі на Урал. Рэабілітаваны 16.10.1989.

БЕЛЬСКАЯ (САХАР) Лідзія Нічыпараўна, н. у в. Уюнішча. Выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 14.10.1992.

БЕЛЬСКАЯ (КУРЫЛАВА) Любоў Нічыпараўна, н. у в. Уюнішча. Выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 14.10.1992.

БЕЛЬСКАЯ Яўгенія Васільеўна, н. у в. Уюнішча, сялянка. Асуджана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Цюменскую вобл. Рэабілітавана 14.10.1992.

БЕЛЬСКІ Нічыпар Васільевіч, н. у в. Уюнішча, селянін-аднаасобнік. Асуджаны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Цюменскую вобл. Рэабілітаваны 14.10.1992.

БЕРАНШТЭЙН Ісідар Гершавіч, н. у 1905, жыў у Глуску, працаваў загадчыкам сельгасаддзела Глускага РК КПБ. Арыштаваны 9.9.1935. Асуджаны на 3 гады ППЛ на Калыме. Рэабілітаваны 5.4.1957.

БЕТЧАР Іосіф Майсеевіч, н. у 1901 у Глуску, служыў у арміі, чырвонаармеец 4-й роты 395-га асобнага кулямётнага артылерыйскага батальёна. Арыштаваны 23.3.1944. Справа спынена 30.3.1944.

БРАНІЦКІ Людвіг Эдуардавіч, н. у 1909 у в. Баравішча, калгаснік. Арыштаваны 9.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 7.11.1959.

БРАНІЦКІ Станіслаў Эдуардавіч, н. у 1888 у в. Баравішча, загадчык гаспадаркі бальніцы. Арыштаваны 8.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937.

БРУЕК Аляксей Пятровіч, н. у 1890, жыў у в. Зелянковічы, настаўнік школы. Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 27.11.1958.

БРЫЧОНАК Васіль Апанасавіч, н. у 1886, жыў у Глуску, рабочы Глускага райлясгаса. Арыштаваны 1.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 27.11.1957.

БРЭУС (БРЭВУС) Васіль Іванавіч, н. у 1894 у Глуску, статыстык Глускага райзага. Арыштаваны ў 1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.8.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БУДЗЬКО Канстанцін Паўлавіч, н. у 1905 у в. Блюсна Любанскага раёна калгаснік калгаса «Сцяг працы». Арыштаваны 5.2.1946. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ у Краснаярскім краі. У 1954 вызвалены. Рэабілітаваны 29.6.1966.

БУЕЎСКІ Аляксей Васільевіч, н. у 1893 у Глуску, жыў у Мінску, вартаўнік царквы. Арыштаваны 14.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 14.10.1957.

БУЗАК Кім Мацвеевіч, н. у 1928, жыў у Глуску, пажарнік пажарнай аховы. Арыштаваны 29.12.1944. Следчая справа спынена 7.9.1946.

БУЙЧЫКАЎ Рыгор Васільевіч, н. у 1886, жыў у в. Поблін, святар. Арыштаваны 8.8.1928, следчая справа спынена 26.10.1928.

БУЛАВАЦКАЯ Антаніна Аляксандраўна, жыла ў в. Рудня. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Сібір. Рэабілітавана 3.1.1992.

БУЛАВАЦКІ Васіль Іванавіч, н. у 1900 у в. Яўсеевічы, калгаснік калгаса «Чырвоны колас». Арыштаваны 24.4.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.5.1964.

БУЛАЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1906 у в. Яўсеевічы, калгаснік калгаса «Чырвоны колас». Арыштаваны 24.4.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.5.1964.

БУЛГАКАЎ Іван Пятровіч, н. у 1920 у с. Івана-Лебядзянаўка Тамбоўскай вобл. Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 15 гадоў ссылкі на катаржныя работы. Рэабілітаваны 10.9.1947.

ВАЛАДКОВІЧ Вольга Ануфрыеўна, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 25.4.1995.

ВАЛАДКОВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1928 у в. Жукавічы. Высланы разам з бацькамі.

ВАЛАДКОВІЧ Ніна Пятроўна, н. у 1928 у в.Жукавічы. Выслана разам з бацькамі.

ВАЛАДКОВІЧ Пётр Васільевіч, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 25.4.1995.

ВАЛЬФСОН Лейба Зусманавіч, н. у 1908 у Глуску, нідзе не працаваў. Арыштаваны 29.4.1928. Рэабілітаваны 21.5.1928.

ВАРЭНІК Вячаслаў Міхайлавіч, н. у 1904 у в. Поблін, жыў у в. Масты, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ВЕЖНАВЕЦ Мікалай Ігнатавіч, жыў у в. Доўгі Лес. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Рэабілітаваны 2.12.1992.

ВЕЙС Іван Пятровіч, н. у 1895, жыў у в. Рудабелка, калгаснік калгаса «Рудабелка». Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ВЕЙС Пётр Фрыцавіч, н. у 1886, жыў на ст. Ратміравічы, працаваў паштальёнам. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВЕЙС Эрнест Крыштавіч, н. у 1890, жыў на х. Вяцер, калгаснік калгаса «Сараканайс Арайс». Арыштаваны 13.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 17.12.1957.

ВЕЙС Эрнест Эрнеставіч, н. у 1880, жыў на х. Залессе, ветфельчар Азямлянскага, Перакальскага сельсаветаў. Арыштаваны 25.12.1937. Вызвалены 5.6.1939. Рэабілітаваны ў 1939.

ВЕЧАР Аркадзь Якаўлевіч, н. у 1887, жыў у в. Дабрамысль, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ВІЛІМОК Адам Францавіч, н. у 1904, жыў у в. Веснава, кладаўшчык дзіцячага дома. Асуджаны 25.5.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Гомелі 9.8.1938. Рэабілітаваны 28.4.1960.

ВІНЯРСКАЯ Валярына Уладзіславаўна, н. у 1909, жыла ў Глуску, санітарка райбальніцы. Арыштавана 12.6.1938. Асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.7.1959.

ВІТКА Васіль Мітрафанавіч, н. у 1889, жыў у Бабруйску, рабочы арцелі імя Крупскай. Арыштаваны 17.11.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. 14.3.1949 арыштаваны зноў. Асуджаны ў г. Новасібірск, першая рэабілітацыя 22.2.1962, другая – 10.9.1965.

ВІШНЕЎСКАЯ Фёкла Іосіфаўна, н. у 1905, жыла ў Глуску, прыбіральшчыца Глускай аптэкі. Арыштавана 12.6.1938. Асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.7.1959.

ВОРАХ Агафья Сямёнаўна, н. у 1872, жыла ў в. Поўстка. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Рэабілітавана 9.3.1993.

ВОЎК Вячаслаў (Уладзіслаў) Антонавіч, н. у 1907 у в. Севярполь, чорнарабочы Бабруйскага гартопа. Арыштаваны 27.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Памёр у лагеры 13.8.1940. Рэабілітаваны 21.1.1960.

ВЯЛІЧКА Павел Аляксеевіч, н. у 1896 у в. Парэчча, старшыня калгаса «Полымя рэвалюцыі». Арыштаваны 21.9.1935. Апраўданы 15.11.1935.

ВЯРЫНСКІ Іван Сямёнавіч, н. у 1895 у в. Бэркава, калгаснік калгаса «Новае жыццё». Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВЯЧЭРКА Наталля Іванаўна, н. у 1907, жыла ў м. Глуск, бухгалтар Глускага аддзялення Дзяржбанка. Арыштавана 31.12.1944. Следчая справа спынена 3.6.1945.

ГАБРУСЬ Антон Міхайлавіч, н. у 1881 у в. Слаўкавічы, батрак. Арыштаваны 29.9.1931. Асуджаны на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 3.11.1931.

ГАБРУСЬ Пётр Антонавіч, н. у 1907, ст. тэхнік 353-га артпалка 151-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 9.1.1943. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.7.1972.

ГАВАРОЎСКАЯ Анеля Станіславаўна, н. у 1904 у в. Харомцы, калгасніца калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштавана 2.12.1937. Асуджана да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітавана 3.12.1957.

ГАВАРОЎСКАЯ Ева Іванаўна, н. у 1901 у в. Мёдухава, калгасніца калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштавана 2.11.1937. Асуджана да вышэйшай меры пакарання. Загінула 6.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітавана 2.11.1957.

ГАВАРОЎСКІ Адам Канстанцінавіч, н. у 1908 у в. Мёдухава, кузнец калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАВАРОЎСКІ Антон Станіслававіч (Стасевіч), н. у 1864, жыў у в. Мёдухава. Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 6.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ГАВАРОЎСКІ Дамінік Іванавіч, н. у 1904, жыў у в. Мёдухава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1931. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.10.1963.

ГАВАРОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1901 у в. Мёдухава, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937.

Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАВАРОЎСКІ Казімір Фабіянавіч, н. у 1906 у в. Мёдухава, цясляр райпрамкамбіната ў г. Нагінск. Арыштаваны 10.2.1942. Асуджаны 10.4.1942 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.9.1960.

ГАВАРОЎСКІ Фадзей Іванавіч, н. у 1892 у в. Блізніцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.12.1933. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ГАЛАЎКОЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1910 у в. Гарадзішча, старшына 12-га аддзялення кавалерыйскага ўзвода 66-й арміі. Арыштаваны 30.4.1943. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.7.1966.

ГАНЦ Аляксандр Войцехавіч, н. у 1879 у в. Слаўкавічы, жыў у г. Магілёў, рабочы сушыльнага камбіната. Арыштаваны 6.4.1945. Рэабілітаваны 10.8.1946.

ГАНЧАРОЎ Антон Іванавіч, н. у 1864 у в. Забалацце. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ГАРАЙМОВІЧ Зінаіда Міхайлаўна, н. у 1872 у в. Усцярхі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 10 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 12.1.1994.

ГАРАЙМОВІЧ Любоў Мацвееўна, н. у 1922, выслана на 10 гадоў разам з бацькамі.

ГАРАЙМОВІЧ Марыя Мацвееўна, н. у 1923, выслана на 10 гадоў разам з бацькамі.

ГАРАЙМОВІЧ Мацвей Аляксандравіч, н. у 1872 у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на 10 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 12.1.1994.

ГАРАЙМОВІЧ Мікалай Мацвеевіч, н. у 1919, высланы на 10 гадоў разам з бацькамі.

ГАРАЙМОВІЧ Ніна Мацвееўна, н. у 1918, выслана на 10 гадоў разам з бацькамі.

ГАРМАЗІНСКІ Віктар Антонавіч, н. у 1904, жыў у Зуб-Будзе, настаўнік школы. Арыштаваны 15.1.1938. Следчая справа спынена. Рэабілітаваны 15.11.1938.

ГАЎРЫЛАЎ Фёдар Яфімавіч, н. у 1901 у в. Бараціна, майстар гарбарнага завода. Арыштаваны 28.12.1944. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.11.1966.

ГАШКО Іван Карпавіч, н. у 1898 у в. Парэчча, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГЕРМАН Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1901 у в. Яўсеевічы, калгаснік калгаса «Чырвоны колас». Арыштаваны 24.4.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.5.1964.

ГЕРМАН Сяргей Іванавіч, н. у 1884 у в. Яўсеевічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.9.1989.

ГЛАЗ Вольга Сямёнаўна, н. у 1926, жыла ў в. Калацічы, рахункавод райвыканкома. Арыштавана 31.12.1944. Следчая справа спынена 30.6.1945.

ГЛІНСКІ Антон Вікенцьевіч, н. у 1884 у в. Засценак, старшыня калгаса ў в. Глебава Рудня Бабруйскага раёна. Арыштаваны 31.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 17.9.1958.

ГЛІНСКІ Яфрэм Рыгоравіч, н. у 1907, жыў у в. Мёдухава, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 6.12.1937. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ГЛОД Мікалай Сямёнавіч, н. у 1881 у Глуску, шавец лясгаса. Арыштаваны 9.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 7.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ГОГАЛЕВА Вольга Васільеўна, н. у 1914 у в. Бярозаўка. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 30.3.1992.

ГОЖА Карл Янавіч, н. у 1891 у м. Нароўля Нараўлянскага раёна, калгаснік. Арыштаваны 3.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 13.2.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

ГОЛАНД Мейта Зімелеўна, н. у 1908 у Глуску, швачка. Арыштавана 29.4.1928. Рэабілітавана 21.5.1928.

ГОЛУБ Герасім Максімавіч, н. у 1886, жыў у в. Яўсеевічы, селянін. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны ў 1937. Рэабілітаваны 22.11.1992.

ГРАБКА Цімафей Макаравіч, н. у 1878, жыў у в. Косткі, калгаснік. Асуджаны 19.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 28.4.1962.

ГРЫНЕВІЧ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1897, жыў у в. Засценак, цясляр калгаса «Чырвоны востраў». Арыштаваны 1.11.1949. Асуджаны першы раз 31.12.1949, другі 14.1.1950 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.10.1954.

ГРЫНЯВЕЦКІ Вікенцій Карлавіч, н. у 1912 у в. Баравішча, калгаснік. Арыштаваны 26.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 7.12.1959.

ГРЫНЯВЕЦКІ Вячаслаў Станіслававіч, н. у 1910 на х. Заслуз, калгаснік. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ГРЫНЯВЕЦКІ Дамінік Пятровіч, н. у 1891, жыў у в. Асінаўка, калгаснік калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ГРЫНЯВЕЦКІ Канстанцін Іванавіч, н. у 1887 на х. Пуцякова, цясляр. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ГРЫНЯВЕЦКІ Станіслаў Гаўрылавіч, н. у 1901 на х. Пуцякова, калгаснік калгаса «Чыроная зорка». Арыштаваны 10.3.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ.

ГУБСКІ Фёдар Пятровіч, н. у 1904, жыў у в. Лаўстыкі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.8.1938. Следчая справа спынена. Рэабілітаваны 14.4.1939.

ГУРЫНОВІЧ Зінаіда Іосіфаўна, н. у 1912, жыла ў в. Хваставічы. Арыштавана 28.12.1944. Следчая справа спынена. Рэабілітавана 15.6.1946.

ГУРЫНОВІЧ Кацярына Іванаўна, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Ніжні Тагіл. Рэабілітавана 6.1.1993.

ГУРЫНОВІЧ Яўген Іванавіч, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Ніжні Тагіл. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ГУТКОЎСКАЯ Алена Іванаўна, н. у 1877, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 28.12.1992.

ГУТКОЎСКАЯ Аляксандра Мікалаеўна, н. у 1885, жыла ў в. Малкава. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 12.12.1995.

ГУТКОЎСКАЯ Анастасія Міхайлаўна, н. у 1909, выслана разам з бацькамі на 17 гадоў.

ГУТКОЎСКАЯ Вольга Уладзіміраўна, н. у 1917, выслана разам з бацькамі.

ГУТКОЎСКАЯ Ганна Уладзіміраўна, н. у 1923, выслана разам з бацькамі.

ГУТКОЎСКАЯ Марыя Георгіеўна, н. у 1905, жыла ў в. Малкава. Арыштавана ў 1929. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 12.12.1995.

ГУТКОЎСКАЯ Надзея Уладзіміраўна, н. у 1927, выслана разам з бацькамі.

ГУТКОЎСКІ Іван Уладзіміравіч, н. у 1899, жыў у в. Малкава. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл.

ГУТКОЎСКІ Ігнат Пятровіч, н. у 1878 у в. Заазер'е, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 3.1.1933. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГУТКОЎСКІ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1919, высланы разам з бацькамі.

ГУТКОЎСКІ Міхаіл Васільевіч, н. у 1866, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Загінуў у 1931. Рэабілітаваны 28.12.1992.

ГУТКОЎСКІ Уладзімір Арсеньевіч, н. у 1879, жыў у в. Малкава. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 12.12.1995.

ДАЙГОД Васіль Іванавіч, н. у 1917, жыў у в. Крукаўшчына, калгаснік калгаса «Новая Крукаўшчына». Арыштаваны 23.4.1935. Следчая справа спынена 15.9.1935.

ДАМБЕРГ Эрнест Карлавіч, н. у 1882, жыў на х. Волчыцы. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДАШКЕВІЧ Антон Францавіч, н. у 1885, жыў у в. Зуб-Буда, рабочы Учдор 702. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 1.9.1962.

ДАШКЕВІЧ Віктар Іванавіч, н. у 1895, жыў у в. Зуб-Буда, калгаснік калгаса «Чырвоны штандар». Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 29.7.1958.

ДАШКЕВІЧ Станіслаў Данілавіч, н. у 1899 у в. Зуб-Буда. Арыштаваны 3.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ДАШКЕВІЧ Сцяпан Гіляравіч, н. у 1877 у в. Зуб-Буда. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ДАШКЕВІЧ Ульян Адамавіч, н. у 1895 у в. Зуб-Буда, калгаснік калгаса «Чырвоны штандар». Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДАШКОЎСКІ Андрэй Панкратавіч, н. у 1892, жыў у в. Шкава, калгаснік калгаса «Беларуская вёска». Арыштаваны 18.10.1931, следчая справа спынена 18.10.1932.

ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1909 у Глуску, аўтатэхнік-механік Галоўбеллестэхснаб у Мінску. Арыштаваны 8.7.1950. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.7.1990.

ДЗЕНІСЕВІЧ Ганна Міхайлаўна, н. у 1882, жыла ў в. Усцярхі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.1.1993.

ДЗЕНІСЕВІЧ Іван Вікенцьевіч, н. у 1892, жыў на х. Падвяззе, калгаснік калгаса «Зара камуны». Арыштаваны 11.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 28.5.1959.

ДЗЕНІСЕВІЧ Пётр Вікенцьевіч, н. у 1889, жыў у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 16.1.1993.

ДЗЯДЗЮЛЯ Ануфрый Уладзіміравіч, н. у 1885 у в. Балашэвічы, кузнец. Арыштаваны 7.1.1945. Памёр у турме 15.5.1945. Рэабілітаваны 5.7.1990.

ДЗЯДЗЮЛЯ Логвін Іосіфавіч, н. у 1922, жыў у в. Балашэвічы. Арыштаваны 29.7.1944. Следчая справа спынена 14.12.1944.

ДЗЯДЗЮЛЯ Навум Кірылавіч, н. у 1875 у в. Балашэвічы. Арыштаваны 11.10.1937. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.4.1988.

ДЗЯДЗЮЛЯ Пётр Рыгоравіч, н. у 1900, жыў у в. Нова-Андрэеўка, загадчык гаспадаркі дзіцячага дома «Веснава». Арыштаваны 14.1.1939. Следчая справа спынена 16.9.1939.

ДЗЯМЕШЧАНКА Пётр Ціханавіч, н. у 1907 у в. Крупяжына Багушэўскага раёна, слесар спіртзавода «Халопенічы». Арыштаваны 22.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937. Рэабілітаваны 22.9.1989.

ДЗЯШЧЭНЯ Ігнат Данілавіч, н. у 1891 у в. Мыслоціна, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.2.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 16.1.1981.

ДОЛБІК Міхаіл Пятровіч, н. у 1899, жыў у в. Балашэвічы, старшыня калгаса «15 гадоў Кастрычніка». Арыштаваны 7.1.1945. Следчая справа спынена 14.8.1945.

ДОЎНЕР Іван Іосіфавіч, н. у 1902, жыў у Глуску, рамонтнік Учдор 704. Арыштаваны 1.1.1945. Асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 19.5.1962.

ДРОБ Якаў Цімафеевіч, н. у 1899 у в. Даколь, ляснік Глускага лясгаса. Арыштаваны 20.7.1946. Асуджаны на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.4.1972.

ДРЭЕР Абрам Іосіфавіч, н. у 1898 у Глуску, ваеннаслужачы Чарнаморскага флоту. Арыштаваны 8.6.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 23.3.1938. Рэабілітаваны 19.9.1957.

ДУБІНЧЫК Трафім Васільевіч, н. у 1886, жыў на х. Раманоўшчына, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.9.1958.

ЕЛІН Васіль Сцяпанавіч, н. у 1911, жыў у Глуску, слесар дарожна-эксплуатацыйнага участка № 7. Арыштаваны 16.9.1944. Следчая справа спынена 16.5.1945.

ЕРМАЛІНСКАЯ Усціння Андрыянаўна, н. у 1874, жыла ў в. Лучкі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 12.4.1996.

ЕРМАЛІНСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1903, жыў у в. Лучкі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 12.4.1996.

ЕРМАЛІНСКІ Сцяпан Пятровіч, н. у 1873, жыў у в. Лучкі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 12.4.1996.

ЕРМАЛІЦКІ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1901, жыў у в. Сялец, калгаснік калгаса «Беларускі пралетарыят». Арыштаваны 14.1.1938. Следчая справа спынена 15.11.1938.

ЕРМАЛОВІЧ Аляксандр Адамавіч, н. у 1884, жыў у в. Калацічы, конюх Глускай МТС. Арыштаваны 16.4.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 7.5.1958.

ЕРМАЛОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1896, жыў у в. Калацічы, рабочы-будаўнік Глускай МТС. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1962.

ЕРМАЛОВІЧ Яніна Іванаўна, н. у 1916, жыла у в. Калацічы, настаўніца Запольскай школы. Арыштавана 2.12.1944. Асуджана на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 29.3.1963.

ЖАЎРЫД Якім Данілавіч, н. у 1901, жыў у в. Веснава, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Арыштаваны 10.1.1945. Следчая справа спынена 28.3.1946.

ЖЛОБІЧ Міхаіл Цярэнцьевіч, н. у 1897, жыў у в. Сімanавічы, вартаўнік Завалочыцкага спіртзавода. Арыштаваны 19.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 11.1.1940.

ЖУРАЎСКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1899, жыў у в. Завалочыцы, учотчык саўгаса «Завалочыцы». Арыштаваны 9.9.1946. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.9.1960.

ЖЫНКО Іван Яфімавіч, н. у 1906, жыў у в. Лаўстыкі, сакратар сельсавета. Арыштаваны 29.9.1938. Следчая справа спынена 14.4.1939.

ЗАБРОДСКІ Уладзімір Усцінавіч, н. у 1907 у в. Парэчча, намеснік камандзіра роты 97-га стралковага палка 33-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 31.7.1938. Следчая справа спынена 13.12.1938.

ЗАЙЦАЎ Пётр Якаўлевіч, н. у 1898 у в. Даколь, працаваў падатковым інструктарам Глускага райфо. Арыштаваны 16.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 20.7.1959.

ЗАМЖЫЦКІ Анікей Іванавіч, н. у 1913 у в. Карпілаўка, калгаснік. Арыштаваны 17.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.2.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

ЗАММЕРФЕЛЬД Анс Мацісавіч, н. у 1902 на х. Колбік, рахункавод калгаса «Сараканайс Арайс». Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ЗАММЕРФЕЛЬД Фрыдрых Янавіч, н. у 1889, жыў у в. Перавеснае, калгаснік калгаса імя Войкава. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЗАСІМОВІЧ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1903 у в. Парэчча, ветурач саўгаса «Завалочыцы». Арыштаваны 15.1.1938. Следчая справа спынена 6.4.1939.

ЗВАНКОВІЧ Нічыпар Якаўлевіч, н. у 1896 у в. Лескі, зам. начальніка палітаддзела курсаў удасканалення тэхнічнага саставу АБТР РККА. Арыштаваны 13.11.1938. Следчая справа спынена 26.4.1939.

ЗІРНІС Аўгуст Крышавіч, н. у 1915 у в. Залессе, начальнік паштовага аддзялення в. Ратміравічы. Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ЗІРНІС Крыш Янавіч, н. у 1884 у в. Касарычы, калгаснік калгаса «Сараканайс Арайс». Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ЗМІТРОВІЧ Сямён Іосіфавіч, н. у 1899 у в. Пагост, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.8.1944. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.8.1990.

ЗУБАРЭВІЧ Міхаіл Вікенцьевіч, н. у 1901 у м. Гарадок, радавы 50-й арміі. Арыштаваны 25.1.1945. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.3.1965.

ЗЯНКОВІЧ Іван Антонавіч, н. у 1901 у в. Бярэжкі. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы на 16 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 18.4.1995.

ЗЯНКОВІЧ Наталля Іванаўна, н. у 1911 у в. Бярэжкі. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана на 16 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 18.4.1995.

ІВАНІЦКАЯ Ларыса Ларыёнаўна, н. у 1920 у в. Падкаленне Быхаўскага раёна, настаўніца Слаўкавіцкай школы. Арыштавана 28.12.1944. Асуджана на 10 гадоў. Зняволенне адбывала ў Краснаярску. Рэабілітавана 26.5.1961.

ІВАНОЎ Рыгор Лаўрэнцьевіч, н. у 1877 у г. Каўнас Літоўскай ССР, булачнік арцелі «Чырвоны кандытар». Арыштаваны 9.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ІВАНЮК Іван Іосіфавіч (ён жа МАЛЕЦКІ Уладзіслаў Іосіфавіч), н. у 1888 у в. Малінава, калгаснік. Арыштаваны 22.12.1937. Следчая справа спынена 19.2.1939.

ІОШЧЫК Сяргей Паўлавіч, н. у 1893 у в. Вільча, камандзір роты 10-га стралковага палка 4-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11.12.1937. Рэабілітаваны 3.12.1957.

КАБАН Гаўрыла Кірэевіч, н. у 1887 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.8.1960.

КАБАН Сафрон Кірэевіч, н. у 1892 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.9.1989.

КАБАНАЎ Антон Іосіфавіч, н. у 1909 у в. Бабірова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 21.10.1963.

КАБАНАЎ Іван Кірылавіч, н. у 1906 у в. Бабірова, калгаснік калгаса «Шлях да сацыялізму». Арыштаваны 10.1.1945. Зняволенне адбываў у Бабруйску. Рэабілітаваны 24.4.1945.

КАБАНЧУК Купрыян Якаўлевіч, н. у 1897 у в. Заполле, калгаснік калгаса імя Варашылава. Арыштаваны 19.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.9.1938. Рэабілітаваны 5.6.1958.

КАБЛАШ Павел Емяльянавіч, жыў у в. Прыплавы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931, раскулачаны. Рэабілітаваны 6.1.1993.

КАЖАРОНАК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1905 у м. Гарадок, не працаваў. Арыштаваны 20.4.1947. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.12.1966.

КАЗІЦКІ Кірыла Андрэевіч, н. у 1895 у в. Слаўкавічы. Арыштаваны 22.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 20.1.1989.

КАЗЛОЎ Філіп Паўлавіч, н. у 1910 у в. Вялікае Забуроўе Багушэўскага раёна, жыў у Глуску, ст. заатэхнік Глускага райземаддзела. Арыштаваны 23.8.1937. Следчая справа спынена 12.12.1938.

КАЗЛОЎСКІ Аляксандр Віктаравіч, н. у 1899 у в. Загалле, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны і высланы ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 21.10.1963.

КАЛАДЗІНСКІ Канстанцін Станіслававіч, н. у 1909 у п. Падалешка, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 24.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 29.10.1957.

КАЛЕНТА Міхаіл Мітрафанавіч, н. у 1901 у Глуску, інструктар Беларускага куставога прамысловага савета. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 24.11.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 3.10.1957.

КАЛЕНТА Яўген Мітрафанавіч, н. у 1907 у Глуску, шавец Беларускага кааператыўнага трэста. Асуджаны 14.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 15.10.1957.

КАЛІНКЕВІЧ-ПАТАПЕНКА Ганна Пятроўна, н. у 1898 у в. Зубарэвічы, калгасніца калгаса імя Молатава. Арыштавана 4.11.1938. Следчая справа спынена 29.6.1939.

КАМАШЫНСКАЯ Алена Альфрэдаўна, н. у 1913, выслана разам з бацькамі.

КАМАШЫНСКАЯ Кацярына Альфрэдаўна, н. у 1915, выслана разам з бацькамі.

КАМАШЫНСКАЯ Леакадзія Альфрэдаўна, н. у 1928, выслана разам з бацькамі.

КАМАШЫНСКАЯ Соф'я Альфрэдаўна, н. у 1922, выслана разам з бацькамі.

КАМАШЫНСКАЯ Яніна Альфрэдаўна, н. у 1918, выслана разам з бацькамі.

КАМАШЫНСКАЯ Яўгенія Ігнатаўна, жыла ў в. Калацічы. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Рэабілітавана 4.1.1993.

КАМАШЫНСКІ Альфрэд Геранімавіч, н. у 1887 у в. Калацічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.2.1930. Асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАМІНСКАЯ Людвіга Іванаўна, н. у 1887 у г. Беласток, медсястра амбулаторыі м. Глуск. Арыштавана 25.12.1937. Асуджана да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 14.3.1938. Рэабілітавана 7.9.1965.

КАНАВАЛАЎ Трафім Кузьміч, н. у 1889 у в. Заракуша, калгаснік калгаса імя XVIII партз'езда. Арыштаваны 14.3.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

КАНАШЭВІЧ Кірыла Сямёнавіч, н. у 1896, жыў у Глуску, працаваў намеснікам сакратара Глускага РК КПБ. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

КАРАНКЕВІЧ Ігнат Андрэевіч, н. у 1881 у в. Калюга, калгаснік калгаса «Камуніст». Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.5.1990.

КАРАСЁВА Пелагея Іванаўна, н. у 1907, жыла ў в. Галачова. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Архангельскую вобл. Рэабілітавана 6.4.1992.

КАРАФА-КОРБУТ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1892 у в.Сялец, старшыня калгаса «Беларускі пралетарыят». Арыштаваны 12.3.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.8.1938. Рэабілітаваны 15.10.1959.

КАСЬКО Домна Пракопаўна, н. у 1918 у в. Новае Сяло, медсястра амбулаторыі Глускай райбальніцы. Арыштавана 7.1.1945. Следчая справа спынена 16.7.1945.

КІПЕЛЬ Вольга Мікалаеўна, н. у 1937 у в. Клетнае, выслана разам з маці. Рэабілітавана 3.3.1997.

КІПЕЛЬ Ганна Маркаўна, н. у 1913 у в. Клетнае. Арыштавана ў 1945. Асуджана і выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана 3.3.1997.

КІПЕЛЬ Георгій Мікалаевіч, н. у 1938 у в. Клетнае, высланы разам з маці на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітаваны 3.3.1997.

КІПЕЛЬ Надзея Мікалаеўна, н. у 1940 у в. Клетнае, выслана разам з маці на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана 3.3.1997.

КІПЕЛЬ Яўхім Яўсеевіч, н. у 1895 у в. Байлюкі, працаваў сакратаром аддзела прыроды і народнай гаспадаркі Інстытута беларускай культуры. Арыштаваны 28.6.1930. Асуджаны на 5 гадоў і высланы ў г. Нарыльск. Паўторна арыштаваны ў снежні 1935, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены ў снежні 1940. Памёр 27.7.1969 у ЗША. Рэабілітаваны 10.6.1988.

КІРДУН Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1882 у в. Заполле. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 16.4.1960.

КІРДУН Якаў Пракопавіч, н. у 1897 у в. Калацічы. Арыштаваны 4.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

КІСЯЛЕВІЧ Сямён Васільевіч, н. у 1897 у в. Пагост, шавец. Арыштаваны 10.4.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 24.11.1989.

КЛЕЦКІ Аркадзь Міхайлавіч, н. у 1897, жыў у в. Малкава. Арыштаваны 25.3.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 20.7.1959.

КЛЕЦКІ Іосіф Міхайлавіч, н. у 1900, жыў у в. Малкава. Арыштаваны 27.3.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 20.7.1959.

КЛЕЦКІ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1909, жыў у в. Малкава. Арыштаваны 25.3.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 20.7.1959.

КЛЯПАЦКІ Браніслаў Вікенцьевіч, н. у 1903 у в. Бяло Вілейскай губ., сакратар Азямлянскага сельсавета. Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.3.1940.

КНЫШЭЎСКІ Іван Лук'янавіч, н. у 1894 у в. Шэлінск Гродзенскай губ. Асуджаны 20.1.1938 да

Я.Я.Кіпель.

вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.2.1938. Рэабілітаваны 10.7.1989.

КОРАБАЎ Максім Андрэевіч, н. у 1900 у в. Чырвоная Слабада Акцябрскага раёна. Арыштаваны 23.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 25.8.1958.

КОРБУТ Алена Рыгораўна, жыла ў в. Малінава. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на Далёкі Усход. Рэабілітавана 5.3.1992.

КОРБУТ Аляксандр Пятровіч, н. у 1903 у в. Сялец. Высланы разам з бацькамі, рэабілітаваны 17.9.1992.

КОРБУТ Аляксандра Ігнатаўна, н. у 1883, жыла на х. Пагарэлае. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 16.12.1996.

КОРБУТ Андрэй Іванавіч, н. у 1915 у в. Сялец, высланы разам з бацькамі.

КОРБУТ Антаніна Іванаўна, н. у 1922 у в. Сялец, выслана разам з бацькамі.

КОРБУТ Антон Іванавіч, н. у 1895, жыў на х. Воўчы Бор. Арыштаваны 7.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 21.7.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

КОРБУТ Вольга Дзмітрыеўна, н. у 1917, выслана на 11 гадоў разам з бацькамі.

КОРБУТ Ганна Аляксандраўна, н. у 1872, жыла ў в. Сялец. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 4.4.1995.

КОРБУТ Ганна Іванаўна, н. у 1919 у в. Сялец, выслана разам з бацькамі.

КОРБУТ Гаўрыла Паўлавіч, н. у 1892 на х. Добры, калгаснік калгаса імя Карла Маркса. Арыштаваны 20.2.1937. Следчая справа спынена 24.2.1937.

КОРБУТ Еўдакія Іванаўна, н. у 1914 у в. Бярэжкі. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана на 16 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 18.4.1995.

КОРБУТ Дзмітрый Пятровіч, н. у 1881, жыў на х. Пагарэлае. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і

А.І.Крукоўскі.

высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 16.12.1996.

КОРБУТ Зоя Пятроўна, н. у 1930, выслана разам з маці.

КОРБУТ Іван Андрэевіч, н. у 1865, жыў у в. Сялец. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 4.4.1995.

КОРБУТ Іван Віктаравіч, н. у 1882 у в. Засценак, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КОРБУТ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1903, высланы на 17 гадоў разам з бацькамі.

КОРБУТ Ірына Сцяпанаўна, н. у 1906, жыла ў в. Сялец. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 4.4.1995.

КОРБУТ Любоў Пятроўна, н. у 1912 у в. Сялец. Выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 17.9.1992.

КОРБУТ Людміла Станіславаўна, н. у 1903 у в. Блізніцы, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 9.2.1931. Асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 21.10.1963.

КОРБУТ Мікалай Васільевіч, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на Далёкі Усход. Рэабілітаваны 5.3.1992.

КОРБУТ Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1896, высланы на 17 гадоў разам з бацькамі.

КОРБУТ Пётр Іванавіч, н. у в. Сялец, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 17.9.1992.

КОРБУТ Уладзімір Пятровіч, н. у 1929 і высланы разам з маці.

КОРБУТ Ягор Іванавіч, н. у 1910 у в. Сялец, высланы разам з бацькамі.

КОРЗУН Марыя Адамаўна, н. у 1907 у в. Бэркава, працавала настаўніцай у Мсціслаўі. Арыштавана 22.12.1944. Рэабілітавана 9.9.1946.

КОТАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1902 у в. Мірацін Бабруйскага раёна, селянін-аднаасобнік, жыў на х. Кляшчоўка. Арыштаваны 17.8.1930. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 20.10.1989.

КОЎЗУН Пётр Афанасьевіч, н. у 1899 у в. Касарычы, камандзір 11-га мотастралковага палка. Арыштаваны 8.9.1937. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 12.7.1954.

КРАСНЕЎСКІ Рыгор Восіпавіч, н. 27.3.1899 у в. Гарадзішча, в.а. дырэктара Інстытута літаратуры і мовы АН БССР. Арыштаваны 23.3.1938. Следчая справа спынена ў 1939.

КРАЎЧАНКА Марыя Піліпаўна, н. у 1914 у Глуску, настаўніца Запольскай школы. Арыштавана 29.12.1944. Следчая справа спынена 20.11.1945.

КРОЦІК Ілья Піліпавіч, н. у 1876 у Глуску. Арыштаваны 19.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Загінуў 4.2.1942. Рэабілітаваны 13.8.1960.

КРУГЛОЎ Уладзімір Данілавіч (Давыдавіч), н. у 1911 у в. Слабодка, трактарыст. Арыштаваны 14.7.1944. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.1.1972.

КРУГЛОЎ Яфім Клімавіч, н. у 1879 у в. Харомцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.2.1931. Асуджаны на 1 год ППЛ. Рэабілітаваны 21.10.1963.

КРУК Сямён Адамавіч, н. у 1908 у в. Казловічы, калгаснік. Арыштаваны 4.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.5.1989.

КРУКОЎСКІ Аляксандр Іосіфавіч, н. 23.2.1901 у в. Адзеркі, працаваў намеснікам дырэктара Інстытута геалогіі БелАН, старшым гідрагеолагам Белвадгаса. Арыштаваны 9.12.1936. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Памёр 2.8.1945. Рэабілітаваны 30.5.1956.

КРЫЖАНОЎСКІ Зміцер Захаравіч, н. у 1882 у в. Усцярхі, рабочы рамонтна-будаўнічай канторы Бабруйска. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.9.1937. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КРЭС Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1907 у Глуску, упаўнаважаны Глускага сельгасбанка. Арыштаваны 16.9.1944. Следчая справа спынена 15.11.1944.

КУЗЬМІЦКІ Канстанцін Ніканавіч, н. у 1906 у в. Бараціна, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.6.1941. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУЛАКОЎСКІ Сяргей Піліпавіч, н. у 1901 у в. Сялец, калгаснік калгаса імя Будзённага. Арыштаваны 26.4.1935. Апраўданы 6.10.1935.

КУЛЕШ Піліп Андрэевіч, н. у 1868 у в. Альбінск, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны на 3 гады з высылкай у Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 21.10.1963.

КУЛЯШЭЎСКІ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1899 у в. Парэчча, калгаснік калгаса «Камсамольская праўда». Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУНІЦКІ Ігнат Іпалітавіч, н. у 1917 у в. Дзічкі Заслаўскага раёна, слесар Рудабельскага торфазавода. Арыштаваны 28.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУРПАН Рыгор Барысавіч, н. у 1894 у в. Сямежава Слабадскога раёна, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 30.8.1939. Асуджаны на 4 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.8.1960.

КУРЫЛА Іван Мікалаевіч, н. у 1881 у в. Зубарэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.8.1930. Асуджаны на 6 месяцаў зняволення. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУХАРЧЫК Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1883, жыў у в. Прыплавы. Арыштаваны ў 1929, раскулачаны. Рэабілітаваны 10.1.1992.

КУХАРЧЫК Аляксандра Іванаўна, н. у 1883, жыла ў в. Прыплавы. Арыштавана ў 1929, раскулачана. Рэабілітавана 10.1.1992.

КУХАРЧЫК Аляксандра Іванаўна, н. у 1905, жыла ў в. Усцярхі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 26.8.1993.

КУХАРЧЫК Аляксей Сямёнавіч, н. у 1898, жыў у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 26.8.1993.

КУХАРЧЫК Генадзь Аляксеевіч, н. у 1929, высланы разам з бацькамі.

КУХАРЧЫК Глафіра Аляксандраўна, жыла ў в. Прыплавы, выслана разам з бацькамі.

КУХАРЧЫК Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1887 у в. Усцярхі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 1.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ЛАБОВІЧ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1910 у в. Бэркава, настаўнік Парэцкай школы. Арыштаваны 26.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 13.6.1962.

ЛАБОВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1897 у в. Буда, настаўнік Парэцкай школы. Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ЛАБОВІЧ Пётр Феафілавіч, н. у 1892 у Германа-Слабадскім сельсавеце Капаткевіцкага раёна, вартаўнік саўгаса «Харомцы». Арыштаваны ў 1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.7.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЛАВАРЧУК Юлій Аўгуставіч, н. у 1886, жыў у в. Слаўкавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛАНДЫШЭЎСКАЯ Галіна Васільеўна, н. у 1928 у в. Бубнаўка, майстар пераплётнага цэха Бабруйскай друкарні. Арыштавана 24.12.1944. Рэабілітавана 10.5.1945.

ЛАПЦІК Іван Мінавіч, н. у 1875 у в. Ляскавічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 26.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛАШЧ Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1855 у в. Альбінск. Арыштаваны 22.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ЛЕАНОВІЧ Аляксандра Сямёнаўна, н. у 1920, выслана разам з бацькамі.

І.М.Лапцік.

ЛЕАНОВІЧ Анастасія Іванаўна, н. у 1886 у в. Заазер'е, калгасніца. Арыштавана 11.1.1933. Асуджана на 3 гады ППЛ. Рэабілітавана 18.10.1989.

ЛЕАНОВІЧ АнтанінаАнуфрыеўна, н. у 1887, жыла ў в. Бэркава. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітавана 10.1.1995.

ЛЕАНОВІЧ Васіль Сямёнавіч, н. у 1923, высланы разам з бацькамі.

ЛЕАНОВІЧ Ганна Сямёнаўна, н. у 1918, выслана разам з бацькамі.

ЛЕАНОВІЧ Ігнат Лукіч, н. у 1900 у в. Заазер'е, калгаснік. Арыштаваны 9.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ЛЕАНОВІЧ Ніна Сямёнаўна, н. у 1917, выслана разам з бацькамі.

ЛЕАНОВІЧ Сямён Пятровіч, н. у 1884, жыў у в. Бэркава. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 10.1.1995.

ЛЕВІТ Сямён Рыгоравіч, н. у 1913 у м. Смілавічы, рабочы саўгаса «Завалочыцы». Арыштаваны 15.12.1934. Рэабілітаваны 29.12.1934.

ЛЕПІН Ян Людвігавіч, н. у 1897 на х. Залессе, кладаўшчык Глускай МТС. Арыштаваны ў лютым 1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.7.1938. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ЛЕСАВА Акуліна Марцінаўна, н. у 1917, жыла ў в. Заеліца, выслана разам з сям'ёй.

ЛІАКУМОВІЧ Юда Лейбавіч, н. у 1906 у м. Гарадок, старшыня заўкома чарапічнага завода ў м. Гарадок. Арыштаваны 21.6.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.2.1957.

ЛІНЕВІЧ Аляксандра Амбросаўна, выслана разам з бацькамі.

ЛІНЕВІЧ Амброс Адамавіч, жыў у в. Бярэжкі. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 13.1.1993.

ЛІНЕВІЧ Вера Амбросаўна, выслана разам з бацькамі.

ЛІНОЎСКАЯ Юзэфа Адамаўна, н. у 1902 у в. Масцішча, калгасніца калгаса «Камінтэрн». Арышта-

вана 23.6.1941. Асуджана на 5 гадоў ППЛ у Новасібірску. Рэабілітавана 16.11.1963.

ЛІЎШЫЦ Гірш Зэлікавіч, н. у 1895 у в. Азарычы, начальнік сплаўканторы «Лесбел». Арыштаваны 9.9.1935. Асуджаны на 3 гады ў Каракалпакіі. Рэабілітаваны 5.4.1957.

ЛІХАДЗІЕЎСКАЯ Вікторыя Карлаўна, н. у 1930 у в. Баянава, выслана разам з бацькамі.

ЛІХАДЗІЕЎСКАЯ Мальвіна Іванаўна, н. у 1881 у в. Баянава. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 2.2.1995.

ЛІХАДЗІЕЎСКАЯ Марыя Карлаўна, н. у 1914 у в. Баянава, выслана разам з бацькамі.

ЛІХАДЗІЕЎСКАЯ Марыя Якаўлеўна, н. у 1916 у в. Баянава. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 2.2.1995.

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Браніслаў Карлавіч, н. у 1910 у в. Баянава, высланы разам з бацькамі.

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Іосіф Карлавіч, н. у 1923 у в. Баянава, высланы разам з бацькамі.

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Карл Іванавіч, н. у 1882 у в. Баянава. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 2.2.1995.

ЛОБАХ Васіль Сяргеевіч, н. у 1869, жыў у в. Альбінск. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.7.1937. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ЛОБАХ Ганна Ананьеўна, н. у 1876 у в. Харомцы, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 13.2.1931. Асуджана і выслана ва Усходнюю Сібір. Рэабілітавана 21.10.1963.

ЛУЦКОВІЧ (ЛУЦКЕВІЧ) Мікалай Цімафеевіч, н. у 1901, жыў у в. Ляскавічы, калгаснік. Арыштаваны 11.5.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 5.10.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

ЛЮБАНЕЦ Сямён Фёдаравіч, н. у 1907 у в. Слаўкавічы, чырвонаармеец 229-га стралковага палка 8-й стралковай дывізіі, трапіў у палон да фінаў. Арыштаваны 22.8.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.3.1958.

ЛЯПКО Аляксандра Дзмітрыеўна, н. у 1919 у в. Падлужжа, тэх. сакратар Глускага райвыканкома. Арыштавана 31.12.1944. Рэабілітавана 11.11.1945.

ЛЯХ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1884 у в. Зелянковічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.8.1930. Асуджаны на 6 месяцаў зняволення. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛЯХ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1890 у в. Зелянковічы, святар Глускай Васкрасенскай царквы. Арыштаваны 19.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 26.7.1956.

ЛЯШЧЭНЯ Сямён Раманавіч, н. у 1879 у в. Альбінск, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны і высланы ва Усходнюю Сібір. Рэабілітаваны 21.10.1963.

МАГІЛЕВЕЦ Самуіл Ігнатавіч, н. у 1900, жыў у Глуску, працаваў загадчыкам райфа. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

МАЕЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1882 у в. Буда, калгаснік калгаса «Новае жыццё». Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЕЎСКІ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1895 у в. Слаўкавічы, настаўнік Самахвалавіцкага дзіцячага дома. Арыштаваны 10.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 14.11.1967.

МАЖЭЙКА Кацярына Антонаўна, н. у 1902, жыла ў в. Малінава. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Рэабілітавана 9.10.1992.

МАЖЭЙКА Максім Іванавіч, н. у 1884, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 9.10.1992.

МАЗАЛЕЎСКІ Яфім Іванавіч, н. у 1909 у Глуску, брыгадзір трактарнай брыгады Глускай МТС. Арыштаваны 31.12.1944. Следчая справа спынена 13.7.1945.

МАКАРАЎ Піліп Фёдаравіч, н. у 1908 у в. Бараціна, калгаснік калгаса імя Дзімітрава. Арыштаваны 24.6.1941. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАКАРАЎ Яфім Фёдаравіч, н. у 1907 у в. Бараціна, калгаснік. Арыштаваны 23.6.1941. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1989.

МАЛАКОВІЧ Антаніна Іосіфаўна, н. у 1889 у в. Бярозаўка. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 30.3.1992.

МАЛАКОВІЧ Васіль Іванавіч, жыў у в. Зубарэвічы. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 14.2.1992.

МАЛАКОВІЧ Вольга Мікалаеўна, н. у 1890 у в. Цеплякова, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 16.8.1930. Асуджана на 1 год умоўна. Рэабілітавана 16.1.1989.

МАЛАКОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1900 у в. Зубарэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.8.1930. Асуджаны на 6 месяцаў зняволення. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЛАКОВІЧ Кацярына Сямёнаўна, н. у 1919, выслана разам з бацькамі.

МАЛАКОВІЧ Лука Раманавіч, н. у 1910 у в. Заазершчына Азямлянскага сельсавета, калгаснік калгаса «Чырвоны штандар». Арыштаваны 7.2.1938. Следчая справа спынена 25.10.1938.

МАЛАКОВІЧ Мацвей Платонавіч, н. у 1902 у в. Бярозаўка, рахункавод Бярозаўскага сельсавета. Арыштаваны 4.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.7.1959.

МАЛАКОВІЧ Піліп Аляксандравіч, н. у 1896 у в. Заазершчына Азямлянскага сельсавета, калгаснік калгаса «Чырвоны штандар». Арыштаваны 17.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.8.1938. Рэабілітаваны 20.3.1964.

МАЛАКОВІЧ Сямён Васільевіч, н. у 1890 у в. Бярозаўка. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 30.4.1992.

МАЛАКОВІЧ Сямён Нічыпаравіч, жыў у в. Зубарэвічы. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 6.5.1992.

МАЛАШУК Аляксандр Іванавіч, н. у 1923 у в. Даколь, вучань няпоўнай сярэдняй школы. Арыштаваны 26.5.1939. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.11.1989.

МАРЖЭВІЧ Сямён Сяргеевіч, н. у 1897 у в. Старынцы Гродзенскай вобл., жыў у в. Барысаўшчына, ляснік Глускага лясгаса. Арыштаваны 2.3.1938. Рэабілітаваны 13.5.1938.

МАРОЗ Васіль Фёдаравіч, н. у 1896 у в. Сцяпанаўка, ляснічы Глушанскага лясніцтва. Арыштаваны 27.3.1945. Следчая справа спынена 31.10.1945.

МАРОШАК Макс Ісакавіч, н. у 1899 у в. Жыцін Старадарожскага раёна, працаваў у Глуску нам. старшыні райвыканкома. Арыштаваны 1.9.1935. Следчая справа спынена 21.1.1936.

МАРЦІНОВІЧ Аляксандр Васільевіч, н. у 1921 у в. Бярозаўка, чырвонаармеец 559-га стралковага палка. Арыштаваны 3.7.1942. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.12.1989.

МАХАНЬКА Андрэй Навумавіч, н. у 1888, жыў у в. Слаўкавічы. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны і высланы ў Амурскую вобл. Рэабілітаваны 5.2.1992.

МАЦІСОН Эрнест Хрыстафавіч, н. у 1865 у г. Тукум (Латвія), вартаўнік спіртзавода «Халопенічы». Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЦЫЯКА Пётр Мікалаевіч, н. у 1887 у в. Грыгор'еўка Дзмітраўскага раёна (Украіна), загадчык пункта «Саюзтытунь». Арыштаваны 27.7.1933. Следчая справа спынена 27.7.1933.

МЕДЗЬВЯДОК Рыгор Герасімавіч, н. у 1892 у в. Карпавічы, калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.9.1989.

МЕЛЬНІК Васіль Рыгоравіч, н. у 1887 у м. Гарадок. Дырэктар Макавіцкай НСШ. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 30.9.1958.

Васіль Рыгоравіч Мельнік нарадзіўся ў сям'і хлебаробаў. Бацька яго быў яшчэ і царкоўным старастам у мясцовай царкве. Маці, хатняя гаспадыня, даглядала сям'ю, дзяцей ды яшчэ брала сякую-такую работу ў яўрэйскіх сем'ях.

Васіль вучыўся ў царкоўнапрыходскім вучылішчы, дзе паказаў неблагія здольнасці ў вучобе. Хлопчык меў прыгожы голас, добры музычны слых. Мясцовы бацюшка, убачыўшы ўсё гэта, параіў бацькам Васіля, каб яны паслалі яго вучыцца далей, у семінарыю. Так хлопец трапіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Вучыўся добра, з ахвотаю. У гэты ж час у семінарыі авалодваў навукай і будучы народны паэт Беларусі Я.Колас. Ён паступіў годам пазней.

Пасля заканчэння семінарыі Васіль Мельнік прыехаў у роднае мястэчка настаўнічаць. Ажаніўся на вясковай дзяўчыне. Удзельнічаў у 1-й сусветнай вайне, на фронце яго застала і Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Сям'я, падхопленная патокам бежанцаў, у гэты час аказалася ў Тамбоўскай губерні, і толькі пасля рэвалюцыі вярнулася на радзіму. А неўзабаве прыйшоў дамоў і Васіль. Яго як настаўніка па дэкрэце савецкай улады накіравалі займацца мірнай справай — вучыць сялянскіх дзяцей. Але ў пачатку 1918 г. Глушчына была акупіравана мяцежным корпусам генерала Доўбар-Мусніцкага. Васіль Рыгоравіч хутка зарыентаваўся і выбраў правільны для сябе шлях — шлях барацьбы з акупантамі. Ён трымаў сувязь з кіраўні-

Першы выпуск Гарадкоўскай сямігодкі. У трэцім радзе трэці злева В.Р.Мельнік. 1924 г.

ком партызанскага руху на Бабруйшчыне і ў Гарадоцкай воласці Максімам Архіпавічам Ляўковым і дапамагаў мясцовым партызанам. За гэта трапіў у бяду — яго арыштавалі і прыгаварылі да расстрэлу. Акупанты прымусілі яго капаць сабе магілу, але шчаслівы выпадак і мясцовы доктар Савіцкі выратавалі ад смерці Васіля Мельніка.

Пасля вайны актыўным змагаром за новае жыццё ў Гарадку разам з іншымі яго жыхарамі быў і В.Р.Мельнік.

Але асаблівай гордасцю мястэчка была школа. Яна штодзень гула, як пчаліны вулей, ад дзіцячых галасоў, бо тут вучылася моладзь з ўсяго наваколля: Карытняншчыны, Глушы, Забудзяк, Арыжні, Паршчахі, не кажучы ўжо пра бліжэйшыя да Гарадка вёскі. Каб дзецям было зручней вучыцца, пры школе працаваў інтэрнат.

І настаўнікі, і вучні былі актыўнымі ўдзельнікамі драматычнага і харавога гурткоў мастацкай самадзейнасці, якія арганізаваў В.Р.Мельнік. Ён жа навучыў дзяцей нотнай грамаце. Васіль Рыгоравіч тры разы ў тыдзень хадзіў з Гарадка ў Глушу, дзе вучыў непісьменных рабочых гуты. Ён быў выдатны прамоўца, чытаў сярод насельніцтва даклады аб тагачаснай абстаноўцы, задачах партыі і ўрада, наладжваў дыспуты. Яго імя было далёка вядома ў наваколлі, нават у цяперашнім Акцябрскім раёне, які ў тыя гады адносіўся да Глускага раёна.

Некаторы час В.Р.Мельнік працаваў інспектарам аддзела народнай асветы. Ён аб'ездзіў многія вёскі раёна, пабываў у Шкаве, Воземлі, Загаллі, Карпілаўцы і ў іншых мясцінах Акцябршчыны, стараўся наладзіць добрыя ўмовы для работы школ, клапаціўся аб настаўніцкіх кадрах. З яго лёгкай рукі былі створаны раённыя педагагічныя курсы, якія рыхтавалі настаўнікаў малодшых класаў для школ раёна. Сам жа Мельнік чытаў на курсах лекцыі па педагагічным майстэрстве, методыцы і імкнуўся прыцягнуць да гэтай работы як мага больш вопытных настаўнікаў.

Пачалася калектывізацыя. Цяжка, з аглядкай назад, ішло сялянства ў калгасы. Патрэбна была даступная для сялян растлумачальная работа. Раённае кіраўніцтва, ведаючы здольнасці і вопыт В.Р.Мельніка, накіравала яго ў Макавіцкі сельсавет для арганізацыі калгасаў — адзін з найбольш цяжкіх сельсаветаў, дзе справы ішлі горш, чым у іншых месцах. За кароткі тэрмін — два тыдні — з яго дапамогай было створана 13 калгасаў. Старыя людзі з Макавіч памятаюць і зараз словы В.Р.Мельніка, яго агітацыю, якая стала імправізацыяй да вядомай песні «Наш паровоз, вперед лети! В коммуне остановка». Да гэтых слоў Мельнік звычайна дадаваў: «Спяшайцеся людзі добрыя, а то будзе позна, цягнік адыдзе». Яго слухалі і верылі сказанаму, верылі савецкай уладзе, бо Мельніка многія ведалі як сумленнага і справядлівага чалавека. Ведалі, што ён заступаўся за некаторых неаб'ектыўна раскулачаных, нават хаваў у сваёй хаце скарб тых працавітых людзей, якім пагражала раскулачванне. І, магчыма, на гэтай глебе ўзнік аднойчы данос на Васіля Рыгоравіча як чалавека, што спачувае ворагам народа. Відаць, камусьці Мельнік замінаў, стаў упоперак дарогі.

Некаторы час ён працаваў завучам беларускай школы ў Глуску, дырэктарам Макавіцкай сямігодкі. Сям'я яго была дружная, працавітая, з шасці чалавек, мела сваю гаспадарку. Груз хатніх клопатаў цягнула жонка Ганна Васільеўна, жанчына дбайная і кемлівая. У гаспадарцы была карова, розная іншая жыўнасць. Нават у першыя гады савецкай улады Мельнікі мелі свайго каня. З чацвярых дзяцей настаўнікамі сталі трое, а значна пазней і чацвёрты, самы меншы сын. Але бацька аб гэтым ужо не ведаў, бо пакінуў яго ў шасцігадовым узросце. В.Р.Мельніка арыштавалі як ворага народа 6 жніўня 1937 г. Дадому ён так і не вярнуўся. Невядома, дзе і пахаваны.

Такіх, як В.Р.Мельнік, беспадстаўна кінутых у ГУЛАГ, было нямала ў нашым раёне. Ды не толькі ў раёне, а і па ўсёй краіне. Гэта быў страшэнны час, чорны перыяд ў гісторыі нашай дзяржавы.

М.Васільеў.

МЕЛЬНІК Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1891 у м. Гарадок, калгаснік. Арыштаваны 21.1.1943. Следчая справа спынена 6.10.1945.

МЕРЗЛЯКОЎ Іван Емяльянавіч, н. у 1902 у в. Гарадзішча, чорнарабочы склада № 509 г. Бабруйск. Арыштаваны 6.3.1937. Асуджаны на 7 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20.3.1990.

МЕСНІК Павел Якаўлевіч, н. у 1908 у в. Слаўкавічы, служыў у Ленінградзе, чырвонаармеец роты аховы 1-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 25.4.1942. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.3.1943.

МІГУН Аляксей Савінавіч, н. у 1889 на х. Гарудзяці Любанскага раёна. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 21.11.1989.

МІКАЛАЕЎ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1896 у в. Заполле. Арыштаваны 4.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 25.3.1960.

МІХАЙЛОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1915 на х. Воўчы Бор, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 17.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 3.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МІХАЙЛОЎСКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1901 у в. Краснае. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1989.

МІХАЙЛОЎСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1907, жыў у в. Мёдухава, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 25.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 8.8.1989.

МІХНЕВІЧ Антаніна Валянцінаўна, н. у 1908 у в. Пруцілава-Баравішча, жыла ў в. Масцішча, калгасніца калгаса «Камінтэрн». Арыштавана 23.6.1941. Зняволенне адбывала ў новасібірскай турме. Вызвалена 29.1.1942.

МІХНЕВІЧ Іосіф Станіслававіч, н. у 1863 у в. Масцішча. Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 22.5.1989.

МІХНЕВІЧ Фелікс Сцяпанавіч, н. у 1882, жыў у в. Масцішча. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 24.2.1995.

МІШУР Барыс Парфенавіч, н. у 1900 у в. Жалвінец, жыў на х. Падвяззе, калгаснік. Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 28.5.1959.

МІШУР Пракоп Рыгоравіч, н. у 1879 у в. Жалвінец, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.10.1989.

МУРАВЕЙКА Якаў Сцяпанавіч, н. у 1893 у в. Поклічы Любанскага раёна, лесаруб Брожскага леспрамгаса. Арыштаваны 20.2.1941. Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20.3.1990.

МУХА Аляксей Рыгоравіч, н. у 1898 у в. Мыслоціна. Арыштаваны ў 1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 14.1.1990.

МУХА Ганна Сямёнаўна, н. у 1910 у в. Турыно, калгасніца, жыла ў в. Хваставічы. Арыштавана 31.12.1944. Асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 24.12.1945.

МЫШАК Іван Францавіч, н. у 1904 у в. Харомцы, жыў у г. Мінск, ст. палітрук. Арыштаваны 14.7.1938. Рэабілітаваны 11.1.1939.

МЯЦЕЛЬСКАЯ Ганна Фёдараўна, н. у 1917 у в. Ануфрыевічы Слуцкага раёна, жыла ў в. Хваставічы, калгасніца калгаса «Рассвет». Арыштавана 29.12.1944. Асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 24.8.1945.

МЯЦЕЛЬСКІ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1899 у в. Рудабелка, начальнік паштовага аддзялення в. Забалацце. Арыштаваны 15.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.3.1938. Рэабілітаваны 28.5.1959.

НАВІЦКАЯ Алена Фёдараўна, н. у 1907, жыла ў в. Усцярхі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.12.1993.

НАВІЦКІ Канстанцін Мікалаевіч, н. у 1884 у в. Усцярхі, вартаўнік калгаса «Зара камуны». Арыштаваны 20.4.1947. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.7.1956.

НАВІЦКІ Канстанцін Фёдаравіч, н. у 1912 у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 16.12.1993.

НАВІЦКІ Рыгор Дзям'янавіч, н. у 1903 у в. Скурацічы Пінскага раёна, дырэктар Глускага леспрамгаса. Арыштаваны 9.9.1935. Рэабілітаваны 19.2.1936.

НАВІЦКІ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1909, жыў у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 16.12.1993.

НАВІЧОНАК Аляксей Рыгоравіч, н. у 1859 у в. Дуброва, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 19.2.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НАВІЧОНАК Пётр Іванавіч, н. у 1927 у в. Даколь, кінамеханік у Глуску. Арыштаваны 9.5.1945. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 1.6.1990.

НАРАБ Адам Спірыдонавіч, н. у 1878 на х. Асінаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 1.3.1938. Асуджаны на 5 гадоў з высылкай у Казахстан. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НЕВЯРОЎСКАЯ Алена Сільвестраўна, н. у 1927 на х. Градкі, выслана на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕВЯРОЎСКАЯ Анастасія Сільвестраўна, н. у 1924 на х. Градкі, выслана на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕВЯРОЎСКАЯ Пелагея Сільвестраўна, н. у 1905 на х. Градкі, выслана на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕВЯРОЎСКАЯ Юлія Іванаўна, н. у 1883, жыла на х. Градкі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Пермскую вобл. Рэабілітавана 5.9.1995.

НЕВЯРОЎСКІ Іван Сільвестравіч, н. у 1919 на х. Градкі, высланы на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕВЯРОЎСКІ Міхаіл Сільвестравіч, н. у 1920 на х. Градкі, высланы на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕВЯРОЎСКІ Сільвестр Фадзеевіч, н. у 1879, жыў на х. Градкі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 5.9.1995.

НЕВЯРОЎСКІ Фрол Сільвестравіч, н. у 1910 на х. Градкі, высланы на 11 гадоў разам з бацькамі.

НЕКРАШ Іван Іосіфавіч, н. у 1900 у в. Уюнішча, пам. начальніка 1-га аддзялення штаба 56-га пагранатрада НКУС. Арыштаваны 15.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29.1.1938. Рэабілітаваны 16.6.1958.

НЕКРАШЭВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1900 на х. Цагельня, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.11.1930. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 20.10.1989.

НЕКРАШЭВІЧ Людміла Фадзееўна, н. у 1916 у в. Зацішша, студэнтка дарожна-механічнага тэхнікума ў Мінску. Асуджана 9.4.1938.

НЕМЕЦ Антон Канстанцінавіч, жыў у в. Уюнішча. Арыштаваны разам з бацькамі. Рэабілітаваны 24.8.1992.

НЕМЕЦ Канстанцін Васільевіч, жыў у в. Уюнішча. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны і раскулачаны. Рэабілітаваны 24.8.1992.

НЕМЕЦ Марыя Васільеўна, жыла ў в. Уюнішча. Арыштавана ў 1930. Асуджана і раскулачана. Рэабілітавана 24.8.1992.

НОВІК Рыгор Калістратавіч, н. у 1897, жыў у в. Дварэц. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 17.3.1993.

НОВІК Трафім Лявонцьевіч, н. у 1910 у в. Гарачыцы Любанскага раёна, пражываў у в. Мёдухава, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 19.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.7.1956.

НОВІК Фама Калістратавіч, н. у 1887 у в. Дварэц. Арыштаваны ў 1932, раскулачаны. Рэабілітаваны 28.12.1993.

НОВІКАЎ Іван Іларыёнавіч, жыў у в. Галачава. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Архангельскую вобл. Рэабілітаваны 6.4.1992.

ОГУР Зінаіда Марцінаўна, н. у 1910, жыла ў в. Заеліца, выслана разам з бацькамі.

ОГУР Марцін Трафімавіч, жыў у в. Заеліца. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.1.1993.

ОГУР Надзея Антонаўна, н. у 1906, жыла ў в. Заеліца. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 27.1.1993.

ОГУР Фёдар Марцінавіч, н. у 1903, жыў у в. Заеліца, высланы разам з бацькамі.

ОЗІК Міхаіл Маркавіч, н. у 1910 у в. Ляскавічы, жыў у Смаленску. Арыштаваны 20.12.1937. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.9.1956.

ОКРУТ Антоля, н. у 1890 у в. Сіманавічы. Арыштавана ў 1930. Асуджана і выслана на Урал. Рэабілітавана 31.8.1992.

ОКРУТ Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1907, высланы разам з бацькамі. Рэабілітаваны 31.8.1992.

ОКРУТ Сьшклета Цярэнцьеўна, н. у 1914, выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 31.8.1992.

ОКРУТ Цярэнцій Акулавіч, н.у 1873 у в. Сіманавічы, аднаасобнік, жыў у в. Юзафова. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны, раскулачаны і высланы на Урал. Рэабілітаваны 31.8.1992.

ПАБОРЦАЎ Павел Германавіч, н. у 1905 у в. Прудок Хоцімскага раёна Магілёўскай вобл., працаваў старшым аграномам Глускага райземаддзела. Арыштаваны 25.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 11.3.1958.

ПАДУТА Андрэй Максімавіч, н. у 1897 на х. Лаўстыкі, калгаснік калгаса «Маяк». Арыштаваны 28.8.1938. Следчая справа спынена 14.4.1939.

ПАЗНЯК Макар Гаўрылавіч, н. у 1893 у в. Ляскавічы, рабочы ДРТУ-1. Арыштаваны 25.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.1.1938. Рэабілітаваны 5.6.1958.

ПАЛЬЧАНКА Іван Сяргеевіч, н. у 1913 у в. Цяснова, жыў у в. Сялец, калгаснік калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 16.3.1950. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.11.1950.

ПАНАСЕНКА Надзея Сямёнаўна, н. у 1921 у в. Бярозаўка. Арыштавана ў 1931. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 30.3.1992.

ПАСТУШОНАК Гаўрыла Васільевіч, н. у 1901 у Глуску, настаўнік. Арыштаваны 28.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 27.2.1989.

ПАСТУШОНАК Марыя Максімаўна, н. у 1922 у Глуску, машыністка Глускага леспрамгаса. Арыштавана 28.12.1944. Следчая справа спынена 10.8.1946.

ПАСТУШОНАК Рыгор Цімафеевіч, н. у 1883 у Глуску. Працаваў вартаўніком. Арыштаваны 28.10.1937. Следчая справа спынена 4.3.1939.

ПАТАПЕНКА Лідзія Паўлаўна, н. у 1928 у в. Бабірова, сялянка. Арыштавана ў 1930. Раскулачана, асуджана на 14 гадоў і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 21.12.1992.

ПАТАПЕНКА Рыгор Пятровіч, н. у 1903 у в. Зелянковічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 31.3.1940. Асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 21.7.1966.

ПАЎЛОВІЧ Алена Францаўна, н. у 1880, жыла на х. Уцеха. Арыштавана ў 1930. Асуджана на 17 гадоў і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 31.7.1992.

ПАЎЛОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1924, жыў на х. Уцеха. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны на 10 гадоў і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 31.7.1992.

ПАЎЛОВІЧ Іван Пятровіч, жыў у в. Лысая Гара, высланы разам з бацькамі.

ПАЎЛОВІЧ Пётр Іосіфавіч, жыў у в. Лысая Гара. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 23.6.1992.

ПЕРАГУД Алена Іванаўна, н. у 1883, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Асуджана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 24.8.1992.

ПЕРАГУД Анастасія Майсееўна, н. у 1924, жыла ў в. Жукавічы. Выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 24.8.1992.

ПЕРАГУД Вольга Майсееўна, н. у 1915, жыла ў в. Жукавічы. Выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 24.8.1992.

ПЕРАГУД Іван Майсеевіч, н. у 1918, жыў у в. Жукавічы, высланы разам з бацькамі. Рэабілітаваны 24.8.1992.

ПЕРАГУД Майсей Іванавіч, н. у 1880, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны, раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 24.8.1992.

ПЕРАГУД Марыя Майсееўна, н. у 1921, жыла ў в. Жукавічы, выслана разам з бацькамі. Рэабілітавана 24.8.1992.

ПЕРАГУД Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1895 у в. Старыя Дарогі, калгаснік калгаса імя Леніна. Арыштаваны 21.3.1933. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ПЕРАГУД Уладзімір Майсеевіч, н. у 1926, жыў у в. Жукавічы. Высланы разам з бацькамі. Рэабілітаваны 24.8.1992.

ПЕРАГУД Яўген Майсеевіч, н. у 1911, жыў у в. Жукавічы, высланы разам з бацькамі. Рэабілітаваны 24.8.1992.

ПІЛІНСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1901 у в. Баравішча, жыў у в. Мёдухава, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ПІЛІНСКІ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1902 на х. Дуброўка, жыў у в. Мёдухава, паштальён калгаса «Іскра». Арыштаваны 25.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 24.8.1989.

ПРАКОПЧЫК Адам Цярэнцьевіч, н. у 1882 у в. Вольніца, калгаснік калгаса «Пралетарый». Арыштаваны 12.6.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.6.1956.

ПРЫБЫШ Пётр Сямёнавіч, н. у в. Дуброва, працаваў сакратаром Макавіцкага сельскага Савета. Арыштаваны 21.9.1937. Рэабілітаваны ў 1940. У Вялікую Айчынную вайну прызваны ў Савецкую Армію, загінуў на фронце 3.9.1944.

ПРЫБЫШ Сяргей Аляксандравіч, н. у 1904 у в. Дуброва. Арыштаваны 22.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 1.6.1957.

ПРЫГАРА Сямён Ігнатавіч, жыў у в. Падлужжа. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы на Далёкі Усход. Рэабілітаваны 22.5.1992.

ПРЫЖЫЛУЦКІ Васіль Аляксеевіч, н. у 1883 у в. Лучкі, калгаснік. Арыштаваны 2.1.1945. Следчая справа спынена 12.6.1945.

ПРЫЛУЦКІ Канстанцін Адамавіч, н. у 1893 у в. Старына Слуцкага раёна, жыў у в. Малкава, калгаснік. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ПРЫМЖЫЦ (ПРЫМШЫЦ) Купрыян Рыгоравіч, н. у 1880, жыў у в. Баравішча. Арыштаваны 9.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 7.12.1959.

ПРЫНЦ Кузьма Андрэевіч, н. у 1902 у в. Даколь, настаўнік. Арыштаваны 23.2.1937. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.4.1968.

ПРЫНЦ Сямён Фядосавіч, н. у 1895 у в. Веснава, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 29.7.1992.

ПРЭСМАН Гірша Моўшавіч, н. у 1877 у Глуску, рабочы арцелі «Трудгужтранспарт». Арыштаваны 6.8.1932. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 22.2.1960.

ПУПОЛЬ Міхаіл Янавіч, н. у 1871 у в. Рудабелка, пам.тэхкіраўніка спіртзавода «Халопенічы». Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 11.12.1982.

ПУЦЯТА Васіль Пракопавіч, н. у 1887 у в. Парэчча. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны на 11 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПЯРОЎСКІ Васіль Фадзеевіч, н. у 1888 у в. Забалацце, настаўнік НСШ №5 Бабруйска. Арыштаваны 30.8.1945. Рэабілітаваны 22.2.1946.

ПЯТНІЦКАЯ Марфа Сямёнаўна, н. у 1905. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 11.11.1995.

ПЯТНІЦКІ Алімп Іванавіч, н. у 1926, жыў на хутары ў Бярозаўскім сельсавеце, высланы разам з бацькамі.

ПЯТНІЦКІ Васіль Якаўлевіч, н. у 1865, жыў на хутары ў Бярозаўскім сельсавеце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 1.11.1995.

ПЯТНІЦКІ Іван Васільевіч, н. у 1905. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 1.11.1995.

ПЯТРОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1885 у в. Нізок Уздзенскага раёна, жыў у в. Калацічы, аграном Глускай МТС. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 20.10.1956.

РАВІНСКІ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1903 у в. Заазер'е, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 12.10.1989.

РАДЗІЧ Максім Мікалаевіч, н. у 1899 у в. Катка, калгаснік. Арыштаваны 22.12.1944, памёр у турме. Рэабілітаваны 12.4.1990.

РАДЗЬКО Сцяпан Захаравіч, н. у в. Бярозаўка. Арыштаваны ў 1928, раскулачаны. Рэабілітаваны 25.11.1993.

РАМАНОЎСКІ Аляксандр Андрэевіч, н. у в. Рудня. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 3.1.1992.

РАМАНОЎСКІ Ціхан Сямёнавіч, н. у 1890 у в. Бубнаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1989.

РУДАКОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1880 у в. Баравішча, калгаснік. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РУДЗІНСКІ Фёдар Неафітавіч, н. у 1873 у в. Бярэжкі, калгаснік калгаса «Новае жыццё». Арыш-

таваны 17.3.1933. Асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РЫБАК Андрэй Васільевіч, н. у 1888 у в. Яўсеевічы, жыў у в. Восы-Калёсы, калгаснік калгаса «Чырвоны колас». Арыштаваны 24.4.1941. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.5.1964.

РЫБАК Іван Анісімавіч, жыў у в. Яўсеевічы. Арыштаваны ў 1933, раскулачаны. Рэабілітаваны 29.3.1993.

САВАЙТАН Марыя Максімаўна, н. у 1923 у в. Вільча, медсястра Бабруйскага ваеннага шпіталя № 1305. Арыштавана 7.4.1945. Рэабілітавана 17.8.1945.

САВІЦКАЯ Аляксандра Антонаўна, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Сібір. Рэабілітавана 6.3.1992.

САВІЦКАЯ Вольга Антонаўна, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Сібір. Рэабілітавана 6.3.1992.

САВІЦКАЯ Зінаіда Мікалаеўна, н. у 1926, выслана разам з бацькамі.

САВІЦКАЯ Лізавета Антонаўна, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Сібір. Рэабілітавана 6.3.1992.

САВІЦКАЯ Людміла Мікалаеўна, н. у 1926, выслана разам з бацькамі.

САВІЦКАЯ Марыя Львоўна, н. у 1904 у в. Андрэеўка. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 25.10.1993.

САВІЦКІ Адольф Вікенцьевіч, н. у 1881 у в. Блізніцы. Арыштаваны ў 1935, раскулачаны. Рэабілітаваны 4.11.1993.

САВІЦКІ Адольф Людвігавіч, н. у 1879 у в. Андрэеўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 25.2.1938. Рэабілітаваны 3.2.1989.

САВІЦКІ Антон Сямёнавіч, н. у 1915 на х. Вяраты, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

САВІЦКІ Каятан Вікенцьевіч, н. у 1882, жыў у в. Блізніцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

САВІЦКІ Мікалай Антонавіч, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 6.3.1992.

САВІЦКІ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1901 у в. Андрэеўка. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 25.10.1993.

САВІЦКІ Міхаіл Антонавіч, жыў у в. Жукавічы. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 6.3.1992.

САВОНЧЫК Пётр Фёдаравіч, н. у 1896 у в. Гарадзішча, сплаўшчык Глускага лесасплаву. Арыштаваны 1.1.1945. Следчая справа спынена 10.11.1946.

САЕНКА-ГРАХОЎСКАЯ Ганна Іванаўна, н. у 1897 у в. Каліта Слуцкага раёна, хатняя гаспадыня. Арыштавана 8.8.1937. Асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 13.9.1961.

САКОВІЧ Алена Ігнатаўна, н. у 1922, выслана разам з бацькамі.

САКОВІЧ Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1919, высланы разам з бацькамі.

САКОВІЧ Аркадзь Ігнатавіч, н. у 1924, высланы разам з бацькамі.

САКОВІЧ Ганна Аляксандраўна, н. у 1891, жыла ў в. Уюнішча. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана на 17 гадоў у Амурскую вобл. Рэабілітавана 3.2.1997.

САКОВІЧ Ігнат Ігнатавіч, н. у 1883, жыў у в. Уюнішча. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны і высланы ў Амурскую вобл. Памёр у 1934 на спецпасяленні. Рэабілітаваны 3.2.1997.

САМУЙЛІК Сямён Міхайлавіч, жыў у в. Слабодка. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і асуджаны. Рэабілітаваны 4.11.1992.

САНДРОС Марыя Якаўлеўна, н. у 1923 у Глуску, навучэнка педкурсаў г. Бабруйск. Арыштавана 3.1.1945. Следчая справа спынена 10.8.1946.

САПЕГА Васіль Елісеевіч, н. у 1894 у в. Байлюкі, жыў у Глуску, аб'ездчык лясгаса. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 10.10.1966.

САРДЫКА Алена Васільеўна, н. у 1915 у Глуску, хатняя гаспадыня. Арыштавана 28.12.1944. Следчая справа спынена 4.6.1945.

САРНАЦКІ Міхаіл Францавіч, н. у 1885 у в. Мёдухава, калгаснік калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 4.8.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 7.6.1958.

САСНОЎСКІ Венядзікт Карлавіч, н. у 1893 у в. Баравішча, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Арыштаваны 18.9.1940. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1961.

САХАР Восіп Паўлавіч, н. у 1894 у в. Кляшчоўка, старшыня калгаса «Чырвоная Кляшчоўка». Арыштаваны 14.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 28.5.1969.

САХАР Іван Адамавіч, н. у 1922 у в. Кляшчоўка, жыў у Чэлябінску, нарміроўшчык металургічнага завода. Арыштаваны 15.10.1947. Асуджаны на 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.6.1955.

САХОЎСКІ Купрыян Піліпавіч, н. у 1888 у в. Бубнаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 27.11.1989.

САХОЎСКІ Патап Лявонавіч, н. у 1873 у в. Парэчча, калгаснік. Арыштаваны 28.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 13.12.1989.

САЧОК-КУРАЛЕНЯ Карп Ільіч, н. у 1896 у в. Макавічы, калгаснік. Асуджаны 8.10.1937 да вышэй-

шай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 7.9.1963.

СВЕРЖ Міхаліна Казіміраўна, н. у 1895 у в. Клетнае, хатняя гаспадыня. Арыштавана 28.11.1946. Асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 26.6.1956.

СВІРЫД Парфен Іванавіч, н. у 1888 у в. Жалвінец, калгаснік. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.9.1989.

СВІРЫДАЎ Лаўрэн Сямёнавіч, н. у 1876 у в. Жалвінец, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.7.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 12.10.1989.

СЕРАДА Піліп Сцяпанавіч, н. у 1882 у в. Цівіншчына Гродненскай губ. (Польшча), жыў у Глуску, начальнік 30-га лінейнага ўчастка Бабруйскага вузла сувязі. Арыштаваны 4.2.1932. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 12.4.1938. Рэабілітаваны 3.10.1958.

СЕРАДА Фёдар Макаравіч, н. у 1904, старшыня Казловіцкага сельскага Савета. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

СЕЎРУК Валянціна Іосіфаўна, н. у 1920 у в. Дуброва, настаўніца. Арыштавана 29.12.1944. Памерла ў турме. Рэабілітавана 23.2.1990.

СІДАРОВІЧ Восіп Мацвеевіч, н. у 1902 у в. Бубнаўка, калгаснік калгаса «Полымя рэвалюцыі». Арыштаваны 15.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 27.11.1989.

СІДАРОВІЧ Канстанцін Васільевіч, н. у 1886 у в. Бубнаўка, калгаснік калгаса «XIX з'езд Саветаў». Арыштаваны 29.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СІКІРЖЫЦКІ Антон Ігнатавіч, н. у 1895 у в. Воземля, жыў у в. Мёдухава, брыгадзір калгаса «Іскра рэвалюцыі». Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 6.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 5.11.1957.

СІКІРЖЫЦКІ Баляслаў Іванавіч, н. у 1903, жыў у в. Малкава, калгаснік калгаса «Чырвонаармейская праўда». Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання.

СІНКЕВІЧ Трафім Якаўлевіч, н. у 1905 у в. Шкава, старшыня калгаса «Чырвоны штандар». Арыштаваны 15.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.8.1938. Рэабілітаваны 13.11.1959.

СКІНДЗЕР Адам Іосіфавіч, н. у 1870 у в. Калацічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.2.1930. Асуджаны і высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЛАБАДНІК Мікіта Емяльянавіч, жыў у в. Бабровічы. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны. Рэабілітаваны 19.11.1993.

СЛАБАДНІК Якаў Паўлавіч, н. у 1901 у в. Заракуша, старшыня калгаса «Новая Заракуша». Арыштаваны 2.3.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.7.1959.

СМЫЧНІК Васіль Міхайлавіч, н. у 1913, высланы разам з бацькамі.

СМЫЧНІК Клаўдзія Міхайлаўна, н. у 1920, выслана разам з бацькамі.

СМЫЧНІК Матрона Васільеўна, н. у 1870, жыла ў в. Заеліца. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 10.5.1993.

СМЫЧНІК Мікалай Міхайлавіч, н. у 1916, высланы разам з бацькамі.

СМЫЧНІК Міхаіл Фаміч, н. у 1868 у в. Заеліца. Арыштаваны ў 1930, раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 10.5.1993.

СМЫЧНІК Пётр Міхайлавіч, н. у 1910, высланы разам з бацькамі.

СОКАЛ Іван Трафімавіч, н. у 1923 у в. Даколь, вучань школы. Арыштаваны 26.5.1939. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.11.1989.

СОКАЛ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1924 у в. Даколь, вучань школы. Арыштаваны 26.5.1939. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 9.5.1989.

СПУНДА Ян Давыдавіч, н. у 1889, жыў у в. Перакаль, калгаснік. Арыштаваны 13.3.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.8.1938. Рэабілітаваны 31.1.1964.

СТАНІЛЕВІЧ Антон Канстанцінавіч, жыў у в. Арыжня. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны і асуджаны. Рэабілітаваны 2.9.1992.

СТАНІЛЕВІЧ Паліна Людвігаўна, жыла ў в. Арыжня. Арыштавана ў 1931, асуджана. Рэабілітавана 2.10.1992.

СТАНІШЭЎСКІ Канстанцін Уладзіміравіч, н. у 1916 у в. Турыно, дырэктар Дакольскай НСШ. Арыштаваны 28.12.1944. Следчая справа спынена 9.4.1946.

СТАТКЕВІЧ Алена Васільеўна, жыла ў в. Малінава, выслана разам з бацькамі.

СТАТКЕВІЧ Валянціна Васільеўна, жыла ў в. Малінава, выслана разам з бацькамі.

СТАТКЕВІЧ Валянціна Сцяпанаўна, н. у 1923 у в. Малінава, выслана разам з бацькамі.

СТАТКЕВІЧ Галіна Сцяпанаўна, н. у 1927 у в. Малінава, выслана разам з бацькамі.

СТАТКЕВІЧ Васіль Васільевіч, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 12.9.1996.

СТАТКЕВІЧ Кацярына Герасімаўна, жыла ў в. Малінава. Арыштавана ў 1929. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 12.9.1996.

СТАТКЕВІЧ Марыя Андрэеўна, н. у 1896, жыла ў в. Малінава. Арыштавана ў 1929. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 12.9.1996.

СТАТКЕВІЧ Марыя Васільеўна, жыла ў в. Малінава, выслана разам з бацькамі.

СТАТКЕВІЧ Сцяпан Васільевіч, н. у 1891, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 12.9.1996.

СТРАЛЬЧЭНЯ Павел Сцяпанавіч, н. у 1904 у в. Балашэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 28.5.1959.

СТРАЛЬЧЭНЯ Сцяпан Дзянісавіч, н. у 1877 у в. Балашэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СУНА Эрнест Мацісавіч, н. у 1906 у в. Былкава, калгаснік калгаса імя Войкава. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СУРОВАЯ Клаўдзія Майсееўна, н. у 1929, жыла ў в. Жукавічы. Арыштавана ў 1930. Асуджана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 24.8.1992.

СУШКЕВІЧ Вольга Іванаўна, н. у 1903, жыла ў в. Усцярхі. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 1.4.1993.

СУШКЕВІЧ Генадзь Іванавіч, н. у 1926, высланы разам з бацькамі.

СУШКЕВІЧ Іван Савельевіч, н. у 1896, жыў у в. Усцярхі. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 1.4.1993.

СУШКЕВІЧ Ніна Іванаўна, н. у 1929, выслана разам з бацькамі.

СУШКЕВІЧ Тамара Іванаўна, н. у 1924, выслана разам з бацькамі.

СУШКО Эміля Феафілаўна, н. у 1888 на х. Баравое, калгасніца калгаса імя Куйбышава. Арыштавана 16.12.1937. Следчая справа спынена 17.4.1939.

СЦЕЛЬМАШОНАК Восіп Дзмітрыевіч, н. у 1900, жыў у г. Асіповічы, памочнік ляснічага Каленіцкага лясніцтва. Арыштаваны 21.2.1949. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.9.1955.

СЦЯПАНАВА Вера Дзянісаўна, н. у 1905 у г. Ленінград, жыла ў Глуску, рахункавод «Заготзерно». Арыштавана 29.12.1944. Следчая справа спынена 4.6.1945.

СЦЯЦКЕВІЧ Алена Васільеўна, н. у 1903 у в. Малінава, настаўніца в. Цялуша Бабруйскага раёна. Арыштавана 5.1.1945. Рэабілітавана 22.9.1945.

СЫСОЙ Восіп Піліпавіч, н. у 1886 у в. Сцяпанаўка, жыў у в. Залессе, калгаснік калгаса імя Кагановіча. Арыштаваны 30.12.1944. Следчая справа спынена 18.12.1946.

СЫСОЙ Рыгор Піліпавіч, н. у 1895 у в. Сцяпанаўка, калгаснік калгаса імя Кагановіча. Арыштаваны 29.12.1944. Следчая справа спынена 17.9.1945.

СЫЦЬКА Кузьма Антонавіч, н. у 1885 у в. Парэчча, калгаснік калгаса «Новае жыццё». Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЫЦЬКА Марыя Паўлаўна, жыла ў в. Калацічы. Арыштавана ў 1930, раскулачана. Рэабілітавана 4.1.1993.

СЫЦЬКА Уладзімір Кандратавіч, н. у 1877 у в. Клінск Чэрвеньскага раёна, статыстык раённага аддзялення сувязі. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 25.5.1989.

СЫЦЯНКА Пётр Казіміравіч, н. у 1899 у Глуску, цясляр. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 27.4.1962.

СЯЛЕНЧЫК Мацвей Сяргеевіч, н. у 1874 у в. Зубарэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 25.5.1989.

СЯМЁНАЎ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1885 у м. Халмічы Рэчыцкага раёна, жыў у Глуску, загадчык Глускай райбальніцы. Арыштаваны 16.1.1938. Следчая справа спынена 5.3.1939.

ТАЛКАЧОЎ Пётр Мікалаевіч, н. у 1895 у в. Засяленне Асіповіцкага раёна, заатэхнік-пчалавод пры Глускім райза. Арыштаваны 16.9.1944. Рэабілітаваны 10.5.1945.

ТАРАСЕВІЧ Лявон Віктаравіч, н. у 1873 у в. Загалле. Арыштаваны 9.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ТАРАХОВІЧ Восіп Мікалаевіч, н. у 1921 у в. Завалочыцы, чырвонаармеец 3-га пагранатрада. Арыштаваны 21.9.1941. Апраўданы 14.10.1941.

ТАРАХОВІЧ Іван Станіслававіч, н. у 1913 у в. Харомцы, калгаснік. Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 9.12.1937.

ТАРАХОВІЧ Лявон Іванавіч, н. у 1903 у в. Аўцякова, калгаснік. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 3.12.1959.

ТАТУР Адам Браніслававіч, н. у 1912 у в. Балашэвічы, калгаснік. Арыштаваны 14.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 18.5.1989.

ТАТУР Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1906 на х. Беразнякі, вартаўнік Глускага лясгаса. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.4.1960.

ТОЎСЦІК Аліна Фёдараўна, н. у 1895 у в. Казловічы, жыла ў Бабруйску, санітарка тыф. аддзялення Бабруйскай бальніцы. Арыштавана 10.3.1935. Следчая справа спынена 14.4.1935.

ТОЎСЦІК Іван Іванавіч, н. у 1897 у в. Казловічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.12.1940. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.8.1990.

ТОЎСЦІК Карп Германавіч, н. у 1902 у в. Чыкілі, жыў у м. Гарадок. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 24.12.1965.

ТРАЦЭЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1901 у в. Парэчча, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.6.1930. Асуджаны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 16.2.1990.

ТРАЯНОЎСКАЯ Алена Антонаўна, н. у 1914, выслана на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКАЯ Валянціна Антонаўна, н. у 1918, выслана на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКАЯ Ганна Антонаўна, н. у 1907, выслана на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКАЯ Марыя Антонаўна, н. у 1909, выслана на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКАЯ Эвеліна Паўлаўна, н. у 1882, жыла ў в. Малінава. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.12.1993.

ТРАЯНОЎСКІ Антон Сафронавіч, н. у 1880, жыў у в. Малінава. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 16.12.1993.

ТРАЯНОЎСКІ Іван Антонавіч, н. у 1904, высланы на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКІ Мікалай Антонавіч, н. у 1912, высланы на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРАЯНОЎСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1916, высланы на 17 гадоў разам з бацькамі.

ТРЭЙС Роберт Ансавіч (Анісавіч), н. у 1913 на х. Перакалле, рахункавод калгаса «Новы шлях». Арыштаваны 3.1.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 17.8.1960.

ТРЭЙС Ян Эрнеставіч, н. у 1880 у в. Рудабелка, калгаснік. Арыштаваны 22.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 18.5.1989.

ТУМІЛОВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1888 у засценку Турына, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.2.1931. Асуджаны і высланы ва Усходнюю Сібір. Рэабілітаваны 21.10.1963.

ТУМІЛОВІЧ Аўгусцін Напалеонавіч, н. у 1908, высланы разам з бацькамі.

ТУМІЛОВІЧ Браніслаў Восіпавіч, н. у 1883 у в. Турына, калгаснік калгаса «Будаўнік сацыялізма». Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ТУМІЛОВІЧ Войцех Дамінікавіч, н. у 1885, жыў у Бабруйску, грузчык завода №4. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ТУМІЛОВІЧ Ганна Іванаўна, н. у 1888, жыла ў в. Юзафова. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 21.1.1992.

ТУМІЛОВІЧ Дамінік Антонавіч, н. у 1902 у засценку Турына, калгаснік. Арыштаваны 12.11.1933. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ТУМІЛОВІЧ Іван Вікенцьевіч, н. у 1884 у в. Турына, фельчар Дакольскага медпункта. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 25.3.1958.

ТУМІЛОВІЧ Ігнат Уладзіміравіч, н. у 1901 у Глуску, шавец Глускай шавецкай арцелі. Арыштаваны 2.3.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ТУМІЛОВІЧ Лідзія Напалеонаўна, н. у 1912, выслана разам з бацькамі.

ТУМІЛОВІЧ Марыя Напалеонаўна, н. у 1910, выслана разам з бацькамі.

ТУМІЛОВІЧ Мікалай Францавіч, н. у 1892 у засценку Турына, калгаснік. Арыштаваны 12.11.1933. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ТУМІЛОВІЧ Напалеон Вікенцьевіч, н. у 1875, жыў у в. Юзафова. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 21.1.1992.

ТУМІЛОВІЧ Пётр Напалеонавіч, н. у 1920, высланы разам з бацькамі.

ТУМІЛОВІЧ Станіслаў Напалеонавіч, н. у 1910, высланы разам з бацькамі.

ТУМІЛОВІЧ Уладзіслаў Восіпавіч, н. у 1893 у в. Турына, калгаснік калгаса «Чырвоная Мысліціна». Арыштаваны 12.6.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.11.1938. Рэабілітаваны 5.11.1959.

ТУМІЛОВІЧ Фелікс Вікенцьевіч, н. у 1892 у засценку Турына, калгаснік. Арыштаваны 22.11.1933. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

УМІНСКІ Вітольд Купрыянавіч, н. у 1898 на х. Страмавая Шыя, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 31.1.1932. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1989.

УМІНСКІ Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1909 на х. Лясны. Арыштаваны 10.7.1930. Следчая справа спынена 2.4.1934.

ФАЛЕЙ Іван Іванавіч, н. у 1899 у в. Краповічы Лагойскага раёна, калгаснік калгаса «20-годдзе Кастрычніка». Арыштаваны 23.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 14.3.1938. Рэабілітаваны 29.9.1958.

ФАЛЕЦКІ Герасім Язэпавіч, н. у 1890 у в. Поўстка, калгаснік калгаса «Зара камуны». Арыштаваны 2.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.11.1937. Рэабілітаваны 28.9.1962.

ФАСТАВЕЦ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1907, жыў у Глуску, пажарнік. Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 22.7.1967.

ФЕЙГІН Еўзік Данавіч, н. у 1901, старшыня Глускага райвыканкома. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

ФЕЛЬДБЕРГ Карл Фрыцавіч, н. у 1902 на х. Вяцер, калгаснік калгаса імя Войкава. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ФЁДАРАЎ Арцём Цімафеевіч, н. у 1871 у в. Слабодка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны

10.1.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.2.1938. Рэабілітаваны 23.4.1960.

ФІЛІППОВІЧ Адам Фядосавіч, н. у 1894 у в. Воземля, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ФІЛЬЧАНКА Апанас Васільевіч, н. у 1892 у в. Зубарэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.8.1930. Асуджаны на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ФЛІДЭР Гірш Іцкавіч, н. у 1902 у в. Казловічы, цясляр арцелі імя Крупскай. Арыштаваны 2.9.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.7.1956.

ФЛІДЭР Меер Ісакавіч, н. у 1906 у в. Казловічы. Арыштаваны 26.6.1936. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.2.1957.

ФУРС Ганна Андрэеўна, н. у 1920 у в. Бярозаўка, хатняя гаспадыня. Арыштавана 25.12.1944. Рэабілітавана 30.12.1945.

ХАРТАНОВІЧ Мікалай Кірэевіч, н. у 1895 у в. Зубарэвічы, інструктар райзага. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 2.10.1957.

ХАРТАНОВІЧ Сцяпан Ціханавіч, н. у 1894 у в. Зубарэвічы, настаўнік Глускай школы. Арыштаваны 4.7.1944. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.6.1990.

ЦАРЫК Адам Палікарпавіч, н. у 1872 у в. Жалвінец, калгаснік. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 5.3.1960.

ЦАРЫК Іван Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Жалвінец, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.9.1989.

ЦВІРКО Іван Андрэевіч, н. у 1913 у в. Заціша, санітар санчасці 233-га стралковага палка. Арыштаваны 10.5.1937. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены 20.1.1939.

ЦЕРАХОВІЧ Віктар Сцяпанавіч, н. у 1899, жыў у в. Клетнае, аграном калгаса імя Куйбышава. Арыштаваны 9.4.1951. Асуджаны на 25 гадоў ППЛ. Вызвалены 5.6.1956. Рэабілітаваны 7.5.1968.

ЦЕРАХОВІЧ Восіп Савельевіч, н. у 1902 у в. Бубнаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЦЕРАХОВІЧ Іван Сільвестравіч, н. у 1904 у в. Бубнаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЦЕРАХОВІЧ Эдуард Іванавіч, н. у в. Добрае Ляскавіцкага сельсавета, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны і высланы ва Усходнюю Сібір. Рэабілітаваны 21.10.1963.

ЦЕРАХОВІЧ Яраслаў Іванавіч, н. у 1888 у в. Добрае, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.3.1931. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.10.1963.

ЦЯРЛЕЦКІ Мікалай Пятровіч, н. у 1894, жыў у в. Сіманавічы, калгаснік калгаса імя Будзённага. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЧАБАН Васіль Фёдаравіч, жыў на х. Паўдварэчча. Арыштаваны ў 1929, раскулачаны. Рэабілітаваны 17.7.1992.

ЧАРКАСАЎ Емяльян Адамавіч, н. у 1892 у в. Дзяніславічы Жлобінскага раёна, кладаўшчык Халопеніцкага спіртзавода. Арыштаваны 22.3.1938. Следчая справа спынена 5.6.1938.

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Пятровіч, н. у 1907 у в. Рудабелка, кузнец калгаса «Беларуская вёска». Арыштаваны 18.10.1931. Асуджаны 18.10.1932. Апраўданы 18.10.1932.

ШАБУНЯ Антон Феліцыянавіч, н. у 1910 у в. Мыслоціна, рабочы Гомельскага элеватара. Арыштаваны 29.3.1931. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 21.6.1963.

ШАБУНЯ Станіслаў Казіміравіч, н. у 1910. Арыштаваны 12.8.1931. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ШАПЕЛЬ Міхаіл Антонавіч, н. у 1902 у в. Дуброва, калгаснік калгаса «20-годдзе Кастрычніка». Арыштаваны 7.3.1938. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 20.7.1960.

ШАПКО Ксенія Мікалаеўна, н. у 1920 у Глуску, настаўніца Клятнянскай школы. Арыштавана 7.1.1945. Следчая справа спынена 10.8.1946.

ШАПЛЫКА Ануфрый Пятровіч, н. у 1885 у в. Харомцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ШАРАМЕТ Даніла Макаравіч, н. у 1897 у в. Шкава, калгаснік. Арыштаваны 25.4.1935. Следчая справа спынена 11.10.1935.

ШАСТАКОВІЧ Дзям'ян Цімафеевіч, н. у 1890 у в. Зубарэвічы, калгаснік калгаса імя Молатава. Арыштаваны 4.10.1938. Следчая справа спынена 29.6.1939.

ШАСТАКОВІЧ Іван Ніканавіч, н. у в. Заракуша, калгаснік калгаса «Новая Заракуша». Арыштаваны 23.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 26.10.1959.

ШАСТАКОВІЧ Любоў Рыгораўна, жыла ў в. Заракуша. Арыштавана ў 1933, раскулачана. Рэабілітавана 15.1.1993.

ШАСТАКОВІЧ Усцін Цімафеевіч, н. у 1898 у в. Зубарэвічы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.11.1938. Следчая справа спынена 29.6.1939.

ШАСТАКОВІЧ Цімафей Пятровіч, н. у 1868, жыў у в. Зубарэвічы. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 16.5.1989.

ШАЎРУК Антон Іванавіч, н. у 1879 у м. Гарадок, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1930. Следчая справа спынена 15.4.1930.

ШАЎРУК Іван Кузьміч, н. у 1888 у м. Гарадок, загадчык участка саўгаса «Завалочыцы». Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937. Рэабілітаваны 28.8.1959.

ШАЎРУК Сцяпан Данацьевіч, н. у 1891 у м. Гарадок, начальнік санпрапускніка Бабруйска. Арыштаваны 24.12.1944. Рэабілітаваны 31.8.1945.

ШАЎСТРУК Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1882, жыў у в. Вільча. Арыштаваны ў 1932, раскулачаны. Рэабілітаваны 23.3.1992.

ШКЛЯРЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1923 у Глуску, пажарны пажарнай аховы Глуска. Арыштаваны 28.12.1944. Следчая справа спынена 7.9.1946.

ШМІГЕЛЬСКІ Іван Антонавіч, н. у в. Цяснова, калгаснік. Арыштаваны 5.3.1945. Следчая справа спынена 27.3.1946.

ШМІГЕЛЬСКІ Юлік Іосіфавіч, н. у 1903, жыў у в. Масцішча, калгаснік. Арыштаваны 24.6.1941. Памёр у бальніцы 9.9.1941. Рэабілітаваны 12.3.1965.

ШПАК Юрый Лаўрэнцьевіч, н. у 1900 у в. Іванішчавічы Парыцкага раёна, калгаснік. Арыштаваны 25.4.1935. Следчая справа спынена 11.10.1935.

ШПАКОЎСКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. у 1909 у в. Масцішча, калгасніца. Арыштавана 23.8.1940. Асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.12.1968.

ШПАКОЎСКІ Валянцін Адамавіч, н. у 1848 на х. Масцішча, калгаснік калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 22.1.1961.

ШПІЛЕЎСКІ Мечыслаў Іванавіч, н. у 1903, жыў у Глуску, працаваў загадчыкам прыёмнага пункта «Белпушніна». Арыштаваны 31.8.1936. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22.11.1938. Рэабілітаваны 6.8.1965.

ШПІЛЕЎСКІ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1905 у в. Выгада Чырвонаслабодскага раёна Мінскай вобл., загадчык Каткаўскай школы. Арыштаваны 16.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Бабруйску. Рэабілітаваны 6.9.1957.

ШТАЛЬ Карп Ансавіч, н. у 1899 у в. Вяцер, брыгадзір калгаса «Сараканайс Арайс». Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ШУМОЎСКІ Казімір Францавіч, н. у 1897 у в. Карытнае Асіповіцкага раёна, жыў у в. Шумяцічы, культнаглядчык Харомецкай дачы Глускага лясгаса. Арыштаваны 22.8.1938. Асуджаны 15.11.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 2.7.1959.

ШУМСКІ Архіп Канстанцінавіч, н. у 1880 у в. Калюга, жыў у в. Юзафова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Загінуў 7.10.1937. Рэабілітаваны 2.9.1961.

ШУМСКІ Павел Андрэевіч, н. у 1905 у в. Рылавічы, бетоншчык Бабруйскага завода № 4. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.10.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ШУМСКІ Піліп Канстанцінавіч, н. у 1889, жыў у в. Юзафова, калгаснік калгаса імя Гікалы. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЧОРС Юрый Аляксандравіч, н. у 1913 у в. Усцярхі, ваеннаслужачы вучэбнага батальёна 16-й мехбрыгады. Арыштаваны 23.6.1937. Асуджаны на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.7.1966.

ШЧЭРБА Архіп Раманавіч, н. у 1900 у в. Дуброва, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.3.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЧЭРБА Пётр Іванавіч, н. у 1896 у в. Шчэрбы Пружанскага раёна, жыў у в. Заазер'е, калгаснік калгаса «Ударнік». Арыштаваны 20.6.1938. Асуджаны 31.7.1939. Рэабілітаваны 7.6.1939.

ШЫБКО Пётр Міхайлавіч, н. у 1901 у в. Нізок Уздзенскага раёна, старшыня Глускага райвыканкома. Арыштаваны 3.6.1938. Рэабілітаваны 28.4.1939.

ШЫТКО Антаніна Фадзееўна, н. у 1910, выслана разам з бацькамі.

ШЫТКО Іван Фадзеевіч, н. у 1904, высланы разам з бацькамі.

ШЫТКО Марыя Канстанцінаўна, жыла ў в. Язвін. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 16.6.1992.

ШЫТКО Сафія Фадзееўна, н. у 1913, выслана разам з бацькамі.

ШЫТКО Фадзей Феафілавіч, жыў у в. Язвін. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 16.6.1992.

ЭПШТЭЙН Леў Рыгоравіч, н. у 1916, служыў у арміі, стралок 444-га стралковага палка. Арыштаваны 24.4.1945. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.1.1970.

ЮРЭВІЧ Вольга Дзямідаўна, н. у 1887 у Глуску, прыбіральшчыца райаддзела НКУС. Арыштавана 31.12.1944. Следчая справа спынена 16.5.1945.

ЮХНЕВІЧ Індрых Крышавіч, н. у 1889, жыў на х. Залессе, калгаснік. Арыштаваны 4.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 29.11.1989.

ЮХНІК Іван Апанасавіч, н. у 1888 у в. Смыковічы. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.8.1960.

ЯЗВІНСКАЯ Антаніна Іванаўна, жыла на х. Карма. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і асуджана. Рэабілітавана 5.10.1992.

ЯЗВІНСКІ Пётр, жыў на х. Карма. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і асуджаны. Рэабілітаваны 5.10.1992.

ЯЗВІНСКІ Сцяпан Пятровіч, н. у 1919, жыў на х. Карма. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і асуджаны. Рэабілітаваны 5.10.1992.

ЯЗВІНСКІ Уладзімір Аўтуставіч, н. у 1903 у м. Дараганава Старадарожскага раёна, аўтамеханік ДЭУ-704. Арыштаваны 28.12.1944. Следчая справа спынена 1.8.1946.

ЯЛЬНІЦКАЯ Вольга Мікалаеўна, н. у 1899, жыла ў Глуску, настаўніца сярэдняй школы. Арыштавана 29.12.1944. Следчая справа спынена 13.7.1945.

ЯЛЬНІЦКАЯ Людміла Іванаўна, н. у 1928, жыла ў Глуску, вучаніца школы. Арыштавана 29.12.1944. Вызвалена за адсутнасцю матываў злачынства. Рэабілітавана 4.6.1945.

ЯЛЬЧЫК Цярэнцій Цімафеевіч, н. у 1897 у в. Заракуша. Арыштаваны 17.8.1930. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЯНКОЎСКАЯ Анастасія Сямёнаўна, н. у 1919, выслана разам з бацькамі.

ЯНКОЎСКАЯ Варвара Марцінаўна, н. у 1903, жыла ў в. Стражы. Арыштавана ў 1930. Асуджана і выслана на Урал. Рэабілітавана 5.8.1992.

ЯНКОЎСКАЯ Кацярына Раманаўна, н. у 1873, жыла ў в. Заеліца. Арыштавана ў 1930. Раскулачана і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 23.7.1992.

ЯНКОЎСКАЯ Марыя Сямёнаўна, н. у 1912, выслана разам з бацькамі.

ЯНКОЎСКІ Канстанцін Сямёнавіч, н. у 1908, высланы разам з бацькамі.

ЯНКОЎСКІ Карп Сямёнавіч, н. у 1915, высланы разам з бацькамі.

ЯНКОЎСКІ Сямён Захаравіч, н. у 1870, жыў у в. Заеліца. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 23.7.1992.

ЯНКОЎСКІ Сямён Яфімавіч, н. у 1903 у в. Заеліца. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 23.7.1992.

ЯНКОЎСКІ Яфім Сямёнавіч, н. у 1900, жыў у в. Стражы. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны, асуджаны і высланы на Урал. Рэабілітаваны 5.8.1992.

ЯНУШКЕВІЧ Канстанцін Трафімавіч, н. у 1895 у в. Карыца Гродзенскай вобл. Арыштаваны 23.8.1937. Загінуў 21.10.1937. Рэабілітаваны 25.10.1937.

Рэпрэсіраваныя і рэабілітаваныя жыхары Глускага раёна, падрабязныя звесткі аб якіх адсутнічаюць

АДЗІНЦОЎ Сямён Макаравіч, н. у 1899 у в. Замасточча, рэпрэсіраваны ў 1930.

АДНАМАХ Ева Максімаўна, н. у 1923 у в. Бабірова, рэпрэсіравана ў 1932.

АДНАМАХ Максім Іванавіч, н. у 1894 у в. Бабірова, рэпрэсіраваны ў 1941.

АДНАМАХ Надзея Цярэнцьеўна, н. у 1902 у в. Масцішча, калгасніца калгаса «Камінтэрн», рэпрэсіравана ў 1941.

АКУЛІЧ Іван Сігізмундавіч, н. у 1909 у в. Баравішча, рахункавод калгаса, рэпрэсіраваны ў 1937.

АЛЁХНА Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1902 у в. Казловічы, рэпрэсіраваны ў 1941.

АНДРЫЕЎСКІ Васіль Рыгоравіч, н. у 1916 у в. Навабеліца, рэпрэсіраваны ў 1936.

АПУХОЎСКАЯ Зоя Іванаўна, н. у 1915 у в. Дварэц, статыстка, рэпрэсіравана ў 1944.

АПУХОЎСКАЯ Ірына Мікалаеўна, н. у 1910 у Глуску, настаўніца, рэпрэсіравана ў 1944.

АРЦЁМЧЫК Параска Акулаўна, н. у 1907 у в. Бабірова, рэпрэсіравана ў 1945.

АСМЫКОВІЧ Іван Дзянісавіч, н. у 1890 у в. Слабада, рэпрэсіраваны ў 1930.

АСТАШКА Аляксандр Апанасавіч, н. у 1890 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1938.

АСТРЭЙКА Пётр Ігнатавіч, н. у 1894 у в. Баравішча, калгаснік, рэпрэсіраваны ў 1937.

АСТРЭЙКА Сабін Віктаравіч, н. у 1913 у в. Заазер'е, рэпрэсіраваны ў 1933.

АСТРЭЙКА Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1885 у в. Баравішча, калгаснік, рэпрэсіраваны ў 1937.

АЎЧЫННІКАЎ Цярэнцій Іванавіч, н. у 1887 у в. Дуброва, рэпрэсіраваны ў 1932.

БАБІНІЧ Даніла Дзянісавіч, н. у 1897 у в. Шкава, рэпрэсіраваны ў 1930.

БАБКОВА Аляксандра Макараўна, н. у 1891 у в. Макавічы, рэпрэсіравана ў 1944.

БАСЯК Конан Цітавіч, н. у 1906 у в. Клетнае, рэпрэсіраваны ў 1930.

БЕРАЗОЎСКАЯ Марыя Лявонцьеўна, н. у 1898 у в. Бярэжкі, рэпрэсіравана ў 1944.

БОРМАНСКІ Пётр Станіслававіч, н. у 1889 у Полацку, рэпрэсіраваны ў 1937.

БУРДЭНКА Іосіф Венядзіктавіч, н. у 1883 у в. Усцярхі, рэпрэсіраваны ў 1930.

БУЦЯНКОЎ Іван Паўлавіч, н. у 1874 у в. Забалоцце, рэпрэсіраваны ў 1933.

ВЕРАШЧАК Васіль Якаўлевіч, н. у 1922 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1939.

ВЕЧАР Адам Іосіфавіч, н. у 1884 у в. Парэчча, рэпрэсіраваны ў 1930.

ВІННІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1891 у в. Леньчыцы, рэпрэсіраваны ў 1944.

ГАВАРОЎСКІ Альберт Іосіфавіч, н. у 1912 у в. Масцішча, рэпрэсіраваны ў 1935.

ГАЛІНСКАЯ Кацярына Нічыпараўна, н. у 1915 у Глуску, рэпрэсіравана ў 1944.

ГАЎРЫЛЕНКА Фёдар Філімонавіч, н. у 1915, рэпрэсіраваны ў 1937.

ГЛАЗ Лявонцій Сямёнавіч, н. у 1890 у в. Калацічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ГЛАЗ Сяргей Лявонцьевіч, н. у 1898 у в. Калацічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ГОЛУБ Барыс Фёдаравіч, старшыня Макавіцкага сельсавета, рэпрэсіраваны ў 1938.

ГОЛУБ Іван Мацвеевіч, н. у 1885 у в. Даколь, рэпрэсіраваны ў 1940.

ГОЛУБ Цімафей Акулавіч, н. у 1882 у в. Рудня, рэпрэсіраваны ў 1940.

ГРАХОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1888 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1938.

ГРЫГОР'ЕЎ Міхаіл Еўдакімавіч, н. у 1883 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1929.

ГУБКІН Франц Іванавіч, н. у 1907 у Полацку, рэпрэсіраваны ў 1936.

ГУДВІЛОВІЧ Мікалай Варфаламеевіч, н. у 1907 на х. Падлучы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ГУРЫНОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1879 у в. Жукавічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ДАШКЕВІЧ Валянціна Мікалаеўна, н. у 1927 на х. Жацелеў, рэпрэсіравана ў 1929.

ДАШКЕВІЧ Вера Васільеўна, н. у 1902 на х. Жацелеў, рэпрэсіравана ў 1929.

ДАШКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1889 на х. Жацелеў, рэпрэсіраваны ў 1929.

ДЗЯДЗЮЛЯ Паліна Кірылаўна, н. у 1921 у в. Балашэвічы, рэпрэсіравана ў 1945.

ДОЎГІ Васіль Мацвеевіч, н. у 1880 у в. Макавічы, рэпрэсіраваны ў 1932.

ДОЎГІ Герасім Мацвеевіч, н. у 1887 у в. Макавічы, рэпрэсіраваны ў 1932.

ДРАКО Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1892 у в. Саўкава, рэпрэсіраваны ў 1932.

ДУБІНА Анастасія Уласаўна, н. у 1908 у в. Карніца, рэпрэсіравана ў 1945.

ЕРМАЛОВІЧ Юльян Іванавіч, н. у 1888 у в. Калацічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЕРМАЧЭНКА Ганна Міхайлаўна, н. у 1910 у в. Лошыца, рэпрэсіравана ў 1944.

ЖАЛКОЎСКІ Альбін Іосіфавіч, н. у 1897 у в. Цагельня, рэпрэсіраваны ў 1936.

ЗАЎЭР Карл Індрыкавіч, н. у 1883 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1937.

ЗУБЕЦ Лукер'я Андрэеўна, н. у 1907 у м. Гарадок, рэпрэсіравана ў 1945.

ЗУБЕЦ Рыгор Іванавіч, н. у 1878 у м. Гарадок, рэпрэсіраваны ў 1930.

КАМІНСКІ Іван Уладзіміравіч, н. у 1895 у в. Рабкі, рэпрэсіраваны ў 1921.

КАНЦЭВІЧ Нікадзім Сямёнавіч, н. у 1898 у в. Барысаўшчына, рэпрэсіраваны ў 1930.

КАПІЦКІ Варфаламей Цімафеевіч, н. у 1897 у в. Гальчын, рэпрэсіраваны ў 1937.

КАРАНЕЦ Сава Пятровіч, н. у 1888 у в. Балашэвічы, рэпрэсіраваны ў 1945.

КАРАТКОВА Алена Савельеўна, н. у 1917 у Калінінскай вобл., рэпрэсіравана ў 1923.

КАРОЛЬКА Васіль Паўлавіч, н. у 1903 на х. Дуброва, рэпрэсіраваны ў 1941.

КАРПОВІЧ Якаў Антонавіч, н. у 1893 у в. Сямежава, рэпрэсіраваны ў 1939.

КІСЯЛЕВІЧ Пётр Архіпавіч, старшыня калгаса «Чырвоны пераможца», рэпрэсіраваны ў 1937.

КЛІМОВІЧ Фядора Максімаўна, н. у 1902 у в. Зелянковічы, рэпрэсіравана ў 1945.

КОРБУТ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1887 у в. Сялец, рэпрэсіраваны ў 1944.

КОТАЎ Адам Андрэевіч, н. у 1912 на х. Кляшчоўка, рэпрэсіраваны ў 1944.

КОЎЗУН Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1907 у в. Бубнаўка, рэпрэсіраваны ў 1937.

КРУК Пётр Герасімавіч, н. у 1888 у в. Казловічы, рэпрэсіраваны ў 1939.

КРУКОЎСКАЯ Алена Андрэеўна, н. у 1906 у в. Малкава, рэпрэсіравана ў 1929.

КРУКОЎСКАЯ Алена Іванаўна, н. у 1862, рэпрэсіравана ў 1929.

КРУКОЎСКІ Васіль Канстанцінавіч, н. у 1928 у в. Малкава, рэпрэсіраваны ў 1929.

КРУКОЎСКІ Іван Парфенавіч, н. у 1902 у в. Малкава, рэпрэсіраваны ў 1929.

КРУКОЎСКІ Канстанцін Парфенавіч, н. у 1899 у в. Малкава, рэпрэсіраваны ў 1929.

КРЭЗА Дзмітрый Давыдавіч, н. у 1896, рэпрэсіраваны ў 1930.

КУДРЭЙКА Іван Яўсеевіч, н. у 1886 у в. Заракуша, рэпрэсіраваны ў 1941.

КУЧЫНСКІ Сцяпан Эдвардавіч, н. у 1888 у Петрыкаўскім раёне, рэпрэсіраваны ў 1937.

ЛАБАЦЭВІЧ Альберт Антонавіч, н. у 1860 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1920.

ЛУБКО Пётр Іванавіч, н. у 1892 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1944.

ЛУКАШЭВІЧ Пётр Міхайлавіч, н. у 1885 у с. Угрыні Пінскага павета, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЛУЦКОВІЧ Кірыла Данілавіч, н. у в. Сасноўка, калгаснік калгаса «Чырвоная Арэса», рэпрэсіраваны ў 1937.

ЛЯШЧЭНЯ Павел Пятровіч, н. у 1895 на х. Западар'е, рэпрэсіраваны ў 1930.

МАЖЭЙКА Пётр Фёдаравіч, н. у 1936, рэпрэсіраваны ў 1949.

МАЛАКОВІЧ Якім Ануфрыевіч, н. у 1904 у в. Зубарэвічы, рэпрэсіраваны ў 1937.

МАЛЫ Сямён Іцкавіч, н. у 1906 у в. Загалле, рэпрэсіраваны ў 1932.

МАРЦІНОВІЧ Феня Яўсееўна, н. у 1923 у в. Бярозаўка, рэпрэсіравана ў 1944.

МАТУСЕВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1896 у в. Зубарэвічы, рэпрэсіраваны ў 1933.

МАТУСЕВІЧ Пётр Васільевіч, н. у 1909 у в. Зубарэвічы, рэпрэсіраваны ў 1944.

МАХАНЬКА Максім Фёдаравіч, н. у 1889 у в. Слаўкавічы, рэпрэсіраваны ў 1935.

МАХНАЧ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1899 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1945.

МАЦВЕЙКАЎ Купрыян Якаўлевіч, н. у 1916 у в. Зімніца Журавіцкага раёна Гомельскай вобл., рэпрэсіраваны ў 1944.

МАШЧЫЦКІ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1887 у в. Бярэжкі, рэпрэсіраваны ў 1930.

МЕЛЬНІК Іван Аляксандравіч, н. у 1870 у в. Гарадок, рэпрэсіраваны ў 1930.

МІХНЕВІЧ Венядзікт Адольфавіч, н. у 1904 у в. Масцішча, рэпрэсіраваны ў 1935.

МІХНЕВІЧ Зянон Эдуардавіч, н. у 1909 у в. Масцішча, рэпрэсіраваны ў 1935.

МІШУРА Іван Арцёмавіч, н. у 1917 у в. Жалвінец, рэпрэсіраваны ў 1937.

НАУМОВІЧ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1934 у в. Дасціжэнне, рэпрэсіраваны ў 1947.

НЕКРАШЭВІЧ Якаў Андрэевіч, н. у 1904 у в. Андрэеўка, рэпрэсіраваны ў 1937.

НЕМЕЦ Аляксандр Канстанцінавіч, н. у 1918 у в. Уюнішча, рэпрэсіраваны ў 1944.

НІЧЫПАРОВІЧ Іван Іванавіч, н. 1901 у в. Даколь, рэпрэсіраваны ў 1944.

НОВІКАЎ Васіль Фролавіч, н. у 1905 у в. Цяснова, рэпрэсіраваны ў 1941.

НОВІКАЎ Дзмітрый Уладзіміравіч, н. у 1900 у в. Цяснова, рэпрэсіраваны ў 1941.

НОВІКАЎ Іван Уладзіміравіч, н. у 1907 у в. Цяснова, рэпрэсіраваны ў 1941.

ОСІН Павел Васільевіч, н. у 1892 у в. Малая Баранаўка, рэпрэсіраваны ў 1937.

ПАДАЛЯК Сцяпан Цітавіч, н. у 1901 у в. Зелянковічы, рэпрэсіраваны ў 1940.

ПАРХІМОВІЧ Аляксей, жыў у в. Краснае, старшыня калгаса «Чырвоны шлях», рэпрэсіраваны ў 1938.

ПАТАПЕНКА Уладзімір Лазаравіч, н. у 1889 у в. Зелянковічы, рэпрэсіраваны ў 1937.

ПАТАЧЫЦ Пётр Дарафеевіч, н. у 1874 у в. Сельцы, рэпрэсіраваны ў 1941.

ПАЎЛАЎ Пётр Іосіфавіч, н. у 1894 у в. Баравішча, калгаснік, рэпрэсіраваны ў 1933.

ПЕРАГУД Ігнат Іванавіч, н. у 1877 у в. Жукавічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

ПЛЯЦІНСКІ Адам Іванавіч, н. у 1882 у в. Зазер'е, рэпрэсіраваны ў 1933.

ПРАКОФ'ЕЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1906 у г. Масква, урач Глускай бальніцы, рэпрэсіраваны ў 1937.

ПРЫБЫШ Пётр Сяргеевіч, н. у в. Дуброва, сакратар Макавіцкага сельскага Савета, рэпрэсіраваны ў 1938.

ПЫШКО Іосіф Казіміравіч, н. у 1886 у в. Казіміравічы, рэпрэсіраваны ў 1937.

ПЯТРЭНЯ Іван Карнеевіч, н. у 1903 у в. Макавічы, рэпрэсіраваны ў 1932.

ПЯТРЭНЯ Іван Фядосавіч, н. у 1888 у в. Макавічы, рэпрэсіраваны ў 1932.

ПЯХОТА Марыя Сямёнаўна, н. у 1924 у в. Сельцы, рэпрэсіраваны ў 1944.

РАМАНОЎСКІ Каленік Сямёнавіч, н. у 1897 у в. Бубнаўка, рэпрэсіраваны ў 1939.

РУДНІК Ірына Яўціхіеўна, н. у 1910 у в. Хваставічы, рэпрэсіравана ў 1944.

РЫБАК Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1883 у г. Бабруйск, рэпрэсіраваны ў 1930.

РЫБАК Пётр Сцяпанавіч, н. у 1933 у в. Яўсеевічы, рэпрэсіраваны ў 1952.

РЫБАК Соф'я Дзям'янаўна, н. у 1901 у в. Яўсеевічы, рэпрэсіравана ў 1927.

РЫБАК Сцепаніда Сцяпанаўна, н. у 1935 у в. Яўсеевічы, рэпрэсіравана ў 1952.

САВІЦКІ Антон Канстанцінавіч, н. у 1877 у в. Застава Жукавічы, рэпрэсіраваны ў 1930.

СІЛЬМАН Эля-Лейзар Абрамавіч, н. у 1904 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1925.

СЛЕСАРОНАК Ігнат Мацвеевіч, н. у 1884 у в. Замасточча, рэпрэсіраваны ў 1937.

СОКАЛ Андрэй Якаўлевіч, н. у 1921 у в. Даколь, рэпрэсіраваны ў 1932.

СОКАЛ Пётр Васільевіч, н. у 1888 у в. Нова-Андрэеўка, рэпрэсіраваны ў 1938.

СТАТКЕВІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1909 у в. Зацішша, рэпрэсіраваны ў 1938.

СТАЎРОВІЧ Аляксей Іванавіч, н. у 1875 у г. Барысаў, рэпрэсіраваны ў 1937.

СТРАЛКОЎСКІ Павел Мітрафанавіч, н. у 1911 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1944.

СУЛІМА Феафіл Іванавіч, н. у 1895 у в. Брады, рэпрэсіраваны ў 1930.

СУШКО Іван Філарэтавіч, н. у 1901 у в. Клетнае, рэпрэсіраваны ў 1947.

СУШЧЫНСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1892 у в. Забродцзе, рэпрэсіраваны ў 1930.

СЦЕЛЬМАШОК Сцяпан Дзмітрыевіч, н. у 1912 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1944.

СЯНЬКО Фёдар Вікенцьевіч, н. у 1889 у в. Свіславічы, рэпрэсіраваны ў 1948.

ТАРАХОВІЧ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1916 у в. Харомцы, рэпрэсіраваны ў 1938.

ТОЛСЦІК Антаніна Пракопаўна, н. у 1910 у в. Казловічы, рэпрэсіравана ў 1947.

ТОЛСЦІК Іван Іванавіч, н. у 1897 у в. Казловічы, рэпрэсіраваны ў 1940.

ТУМІЛОВІЧ Браніслаў Францавіч, н. у 1898 у в. Малкава, рэпрэсіраваны ў 1932.

ТУТУР Іван Сільвестравіч, н. у 1877 у в. Усцярхі, рэпрэсіраваны ў 1928.

ТЫЧЫНА Ефрасіння Міхайлаўна, н. у 1910 у в. Сялец, рэпрэсіравана ў 1930.

ТЫЧЫНА Лідзія Міхайлаўна, н. у 1922 у в. Сялец, рэпрэсіравана ў 1930.

ТЫЧЫНА Міхаіл Іванавіч, н. у 1882 у в. Сялец, рэпрэсіраваны ў 1930.

ТЫЧЫНА Феафіл Іванавіч, н. у 1902 у в. Сялец, рэпрэсіраваны ў 1930.

ТЫЧЫНА Яўгенія Майсееўна, н. у 1911 у в. Сялец, рэпрэсіравана ў 1930.

УМІНСКІ Сігізмунд Людвігавіч, н. у 1895 у в. Юзафова, рэпрэсіраваны ў 1937.

ФЕЛЬДБЕРГ Карл Фрыцавіч, н. у 1902 г. на х. Вяцер, рэпрэсіраваны ў 1938.

ФЁДАРАЎ Іван Навумавіч, н. у 1923 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1939.

ФІШМАН Майсей Айзікавіч, н. у 1909 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1927.

ХАЛАСТОВІЧ Антон Максімавіч, н. у 1886 у в. Жукавічы, рэпрэсіраваны ў 1944.

ХАРЛАНЧУК Васіль Мікалаевіч, н. у 1892 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1938.

ХАРТАНОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1913 у в. Слаўкавічы, рэпрэсіраваны ў 1946.

ХАРТАНОВІЧ Фёдар Марцінавіч, н. у 1888 у в. Ярэмічы, рэпрэсіраваны ў 1946.

ЦАГЕЛЬНІК Іван Дзмітрыевіч, н. у 1897 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Агнеса Міхайлаўна, н. у 1929 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1927 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Браніслава Міхайлаўна, н. у 1919 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

А.В.Ермаліцкі.

ЧАРНЫШЭВІЧ Маргарыта Пятроўна, н. у 1889 рэпрэсіравана ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1888, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Пётр Міхайлавіч, н. у 1921 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Ядвіга Міхайлаўна, н. у 1925 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

ШАСТАКОВІЧ Пётр Пятровіч, н. у 1882 у в. Зубарэвічы, рэпрэсіраваны ў 1938.

Воіны-землякі, якія загінулі ў канцы 1930-х гадоў у час грамадзянскай вайны ў Іспаніі (1936 — 1938), вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь (1939) і ў савецка-фінляндскую вайну (1939 — 1940)

БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГРЫЦЭНЯ Марцін Фёдаравіч, н. у 1912 у в. Згода, працаваў у калгасе, загінуў 4.1.1940 у Фінляндыі.

СКУБЕЙ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1917 у в. Згода, працаваў у калгасе, радавы, загінуў 20.2.1940 у Фінляндыі.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ГЛУСК

БЕРДНІКЕВІЧ Антон Мікалаевіч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1939, радавы, загінуў 20.2.1940 у Фінляндыі.

КРАЎЧАНКА Мітрафан Палікарпавіч, н. у 1911, служачы, загінуў 29.9.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

РАБЕЦ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1910, служачы, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

ЗАВАЛОЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

РАМАНОЎСКІ Кузьма Венядзіктавіч, н. у 1916 у в. Сімanавічы, працаваў у калгасе, сяржант, загінуў 6.1.1940 у Фінляндыі.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ФАЛЕЦКІ Пётр Паўлавіч, н. у 1912 у в. Поўстка, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

КАЛАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАЯРКА Пётр Сямёнавіч, н. у 1910 у в. Калюга, працаваў у калгасе, малодшы сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 23.2.1940 у Фінляндыі.

ДЗЯШЧЭНЯ Юстын Аляксандравіч, н. у 1908 у в. Калюга, служачы, афіцэр-танкіст, у 1937 змагаўся ў Іспаніі, быў паранены, памёр ад ран у в. Калюга.

ДОЎГІ Іван Васільевіч, н. у 1910 у в. Макавічы, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у лютым 1940 у Фінляндыі.

ЕРМАЛІЦКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1913 у в. Макавічы, малодшы камандзір, загінуў 16.1.1940 у Фінляндыі.

КІСЯЛЕВІЧ Логвін Якаўлевіч, н. у 1909 у в. Пагост, працаваў у калгасе, радавы, загінуў 25.9.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

ТЫЧЫНА Яўгенія Майсееўна, н. у 1911 у в. Сялец, рэпрэсіравана ў 1930.

УМІНСКІ Сігізмунд Людвігавіч, н. у 1895 у в. Юзафова, рэпрэсіраваны ў 1937.

ФЕЛЬДБЕРГ Карл Фрыцавіч, н. у 1902 г. на х. Вяцер, рэпрэсіраваны ў 1938.

ФЁДАРАЎ Іван Навумавіч, н. у 1923 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1939.

ФІШМАН Майсей Айзікавіч, н. у 1909 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1927.

ХАЛАСТОВІЧ Антон Максімавіч, н. у 1886 у в. Жукавічы, рэпрэсіраваны ў 1944.

ХАРЛАНЧУК Васіль Мікалаевіч, н. у 1892 у Глуску, рэпрэсіраваны ў 1938.

ХАРТАНОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1913 у в. Слаўкавічы, рэпрэсіраваны ў 1946.

ХАРТАНОВІЧ Фёдар Марцінавіч, н. у 1888 у в. Ярэмічы, рэпрэсіраваны ў 1946.

ЦАГЕЛЬНІК Іван Дзмітрыевіч, н. у 1897 у в. Слабодка, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Агнеса Міхайлаўна, н. у 1929 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1927 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Браніслава Міхайлаўна, н. у 1919 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

А.В.Ермаліцкі.

ЧАРНЫШЭВІЧ Маргарыта Пятроўна, н. у 1889 рэпрэсіравана ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1888, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Пётр Міхайлавіч, н. у 1921 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіраваны ў 1930.

ЧАРНЫШЭВІЧ Ядвіга Міхайлаўна, н. у 1925 на х. Дабрамыслі, рэпрэсіравана ў 1930.

ШАСТАКОВІЧ Пётр Пятровіч, н. у 1882 у в. Зубарэвічы, рэпрэсіраваны ў 1938.

Воіны-землякі, якія загінулі ў канцы 1930-х гадоў у час грамадзянскай вайны ў Іспаніі (1936 — 1938), вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь (1939) і ў савецка-фінляндскую вайну (1939 — 1940)

БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГРЫЦЭНЯ Марцін Фёдаравіч, н. у 1912 у в. Згода, працаваў у калгасе, загінуў 4.1.1940 у Фінляндыі.

СКУБЕЙ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1917 у в. Згода, працаваў у калгасе, радавы, загінуў 20.2.1940 у Фінляндыі.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ГЛУСК

БЕРДНІКЕВІЧ Антон Мікалаевіч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1939, радавы, загінуў 20.2.1940 у Фінляндыі.

КРАЎЧАНКА Мітрафан Палікарпавіч, н. у 1911, служачы, загінуў 29.9.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

РАБЕЦ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1910, служачы, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

ЗАВАЛОЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

РАМАНОЎСКІ Кузьма Венядзіктавіч, н. у 1916 у в. Сімanавічы, працаваў у калгасе, сяржант, загінуў 6.1.1940 у Фінляндыі.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ФАЛЕЦКІ Пётр Паўлавіч, н. у 1912 у в. Поўстка, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

КАЛАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАЯРКА Пётр Сямёнавіч, н. у 1910 у в. Калюга, працаваў у калгасе, малодшы сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 23.2.1940 у Фінляндыі.

ДЗЯШЧЭНЯ Юстын Аляксандравіч, н. у 1908 у в. Калюга, служачы, афіцэр-танкіст, у 1937 змагаўся ў Іспаніі, быў паранены, памёр ад ран у в. Калюга.

ДОЎГІ Іван Васільевіч, н. у 1910 у в. Макавічы, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у лютым 1940 у Фінляндыі.

ЕРМАЛІЦКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1913 у в. Макавічы, малодшы камандзір, загінуў 16.1.1940 у Фінляндыі.

КІСЯЛЕВІЧ Логвін Якаўлевіч, н. у 1909 у в. Пагост, працаваў у калгасе, радавы, загінуў 25.9.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

Л.К.Коўзун.

С.М.Харытончык.

ПАТАЧЫЦ Кірэй Андрэевіч, н. у 1910 у в. Калюга, працаваў у калгасе, загінуў 6.11.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

РАХОЎСКІ Антон Марцінавіч, н. у 1905 у в. Калацічы, працаваў у калгасе, загінуў 13.1.1940 у Фінляндыі.

КАТКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КОЎЗУН Лявонцій Кузьміч, н. у 1920 у в. Катка, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у лютым 1940 у Фінляндыі.

КОЎЗУН Піліп Мітрафанавіч, н. у 1917 у в. Катка, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у лютым 1940 у Фінляндыі.

ХАРЫТОНЧЫК Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1916 у в. Катка, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

ЮНЕВІЧ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1916 у в. Катка, афіцэр, загінуў у Фінляндыі.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

МАТВІЁНАК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1903, у Чырв. Арміі з 1930, маёр, загінуў у 1939.

МЕДЗЬВЯДОК Сямён Герасімавіч, н. у 1914, афіцэр, загінуў у 1940.

КЛЯТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАСЯКОЎ Георгій Ёсіпавіч, н. у 1914 у в. Барбарова, калгаснік, сяржант, камандзір аддзялення, загінуў 10.1.1940 у Фінляндыі.

БАСЯКОЎ Ягор Ёсіпавіч, н. у 1903 у в. Барбарова, радавы, загінуў 2.3.1940 у Фінляндыі.

МАРЦІНОВІЧ Іван Акопавіч, н. у 1907 у в. Барбарова, працаваў у калгасе, загінуў 17.2.1940 у Фінляндыі.

МАРЦІНОВІЧ Мікалай Ф., н. у 1907 у в. Барбарова, загінуў 7.3.1940 у Фінляндыі.

СОКАЛ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1919 у в. Клетнае, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

СЛАЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

СМЫЧНІК Васіль Цімафеевіч, н. у 1918 у в. Заеліца, працаваў у калгасе, радавы, загінуў у верасні 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

ХВАСТАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГЛАЗ Пётр Мікалаевіч, н. у 1916 у в. Заполле, працаваў у Глускай МТС, радавы, загінуў 28.9.1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Украіну.

МУХА Сямён Навумавіч, н. у 1913 у в. Хваставічы, працаваў у калгасе, радавы, загінуў 16.1.1940 у Фінляндыі.

* * *

МАРОЗАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1912, радавы, загінуў у сакавіку 1940 у Фінляндыі.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У першыя дні

Вялікая Айчынная вайна... Яна ўварвалася на прасторы нашай Радзімы, як вогненны смерч, які панёс, закруціў у віхуры тысячы, мільёны людзей, ламаючы іх лёсы, адбіраючы жыцці. 22 чэрвеня 1941 года, крывавы світанак... У 4 гадзіны раніцы полымя вайны запалыхала ўздоўж усёй заходняй граніцы Савецкага Саюза. У вогненным смерчы, які абрушыўся на нашу зямлю, гінулі гарады і вёскі, тысячы бязвінных людзей. І нараджалася вялікая нянавісць да ворага, вера ў неадольныя сілы народа, які разгроміць чужынцаў. Той час стаў гісторыяй, яе яркай і найбольш уражлівай старонкай мужнасці і стойкасці ўсіх, хто сваімі ўчынкамі, сваімі справамі садзейнічаў найхутчэйшаму разгрому фашысцкіх захопнікаў, набліжаў Дзень Перамогі.

З першых дзён вайны Беларусь стала арэнай цяжкіх кровапралітных баёў. Услед за магутнымі ўдарамі артылерыі і авіяцыі на яе тэрыторыю рынуліся танкавыя і матарызаваныя дывізіі ворага, пачалося ажыццяўленне гітлераўскага плана «Барбароса». З першага дня вайны раёнам жорсткіх атак стаў Заходні фронт. 3-я, 4-я і 10-я арміі процістаялі фашысцкім войскам групы армій «Цэнтр». У прыватнасці, у паласе абароны 4-й арміі Заходняй асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту; камандуючы арміі генерал-маёр А.А.Карабкоў), у напрамку галоўнага ўдара, наступалі адборныя сілы 4-й нямецкай арміі пад камандаваннем генерал-фельдмаршала фон Клюге. Вораг меў больш як пяцікратную перавагу ў жывой сіле, амаль трохкратную ў танках, больш як трохкратную ў артылерыі і дзвюхкратную ў авіяцыі. План гітлераўцаў заключаўся ў тым, каб ажыццявіць прарыў праз «смаленскія вароты», накіравацца да Масквы і захапіць яе да 7 жніўня. Значная перавага ў жывой сіле і ў тэхніцы дазволіла нямецка-фашысцкім войскам на многіх участках хутка пераадолець супраціўленне нашых войскаў. Раз'яднанасць, няведанне абстаноўкі, адсутнасць суцэльнага фронту абароны і моцных рэзерваў паблізу напрамкаў галоўных удараў ворага давалі яму магчымасць абыходзіць вузлы супраціўлення нашых войскаў і наносіць ім удары на флангах і з тылу. У выніку гэтага часці і падраздзяленні Заходняга фронту вымушаны былі ці біцца ў акружэнні, ці адыходзіць на ўсход. Такое становішча склалася і ў 4-й арміі. З-пад Брэста, дзе яна стойка і ўпарта

абаранялася, а пасля з цяжкімі баямі стрымлівала прасоўванне ворага, яе часці і падраздзяленні, групы воінаў і камандзіраў адыходзілі ўсё далей на ўсход. Перад мужнасцю і гераізмам нашых воінаў нават вораг скідаў шапку. Вось што адзначаў пазней былы начальнік штаба 4-й нямецкай арміі, супраць якой змагалася наша 4-я армія, генерал Г.Блюментрыт: «Пачатковая бітва ў чэрвені 1941 года ўпершыню паказала нам Чырвоную Армію. Нашы страты даходзілі да 50 працэнтаў. Пагранічнікі... абаранялі старую крэпасць у Брэсце... да апошняга, нягледзячы на найцяжэйшыя бамбёжкі і абстрэлы з буйнакаліберных гармат. Там мы зведалі, што значыць змагацца па рускаму спосабу...» (Сандалов Л.М. На московском направлении. М., 1970. С. 113).

З баямі 26 чэрвеня нашы войскі пакідалі Слуцк. Спроба наладзіць тут абарону, прыцягнуўшы дадатковыя сілы, асаблівага эфекту не прынесла. Перад 3-й танкавай дывізіяй генерала Модэля адкрываўся шлях на Бабруйск. Тэатр ваенных дзеянняў набліжаўся да Глускага раёна.

У паласе 4-й арміі самым небяспечным з'яўляўся прарыў па Варшаўскай шашы. Было вырашана арганізаваць абарону на р. Пціч. Начальнік штаба 4-й арміі генерал-палкоўнік Л.М.Сандалаў успамінаў: «...Генерал Попов, сформировав сводный отряд из нескольких разрозненных подразделений, выехал на автомашинах по Варшавскому шоссе к мосту через р. Птичь. Командование всеми частями и отрядами на р. Случь было возложено на полковника Тутаринова...

С утра 27 июня противник сбил наши войска севернее и южнее Слуцка, потеснил их восточнее р. Случь и полностью овладел городом. Однако развить наступление в быстрых темпах ему не удалось. Отряды полковника Тутаринова, заблаговременно создавшие у себя в тылу многочисленные заграждения, оказали упорное сопротивление...

Чтобы сломить сопротивление отрядов Тутаринова на Варшавском шоссе, немецкое командование выслало в обход их с севера танки с пехотой. Эти танки пробились к середине дня в район Старых Дорог и совершенно неожиданно для нас опять появились возле командного пункта армии. На командном пункте находились в тот момент только командарм, я и несколько штабных командиров. Все остальные работники управления армии во главе с членом Военного Совета выехали в Бобруйск для подготовки там новых оборонительных рубежей.

Мы едва успели сесть в машины и под огнем противника по Варшавскому шоссе вырваться за р. Птичь к сводному отряду 28-го стрелкового корпуса. Генералу Попову было приказано немедленно разрушить мост, по которому мы только что промчались. Мост полили бензином и на наших глазах подожгли. Однако до того, как он успел сгореть, появились вражеские танки, сбили наши слабые заслоны и относительно легко перебрались на противоположный берег Птичи. Дальнейшее их продвижение было задержано составом корпусного управления под руководством начальника штаба полковника С.Г.Лукина и заместителя командира корпуса по политической части полкового комиссара В.А.Зубова». (Тамсама. С. 119—121).

Аднак сілы былі няроўныя, прыйшлося адступіць. Камандаванне і штаб 4-й арміі Заходняга фронту ў гэты час ужо дасягнулі Бабруйска і ўключыліся ў арганізацыю абароны горада.

Нямецкія перадавыя часці цяснілі нашы войскі. У раёне в. Завалочыцы, дзе гарэў мост цераз р. Пціч, варожыя танкі не адважыліся пераправіцца. Пастрачыўшы з кулямётаў па прырэчных кустах, фашысты вымушаны былі звярнуць з шашы і шукаць абходны шлях. Танкі, бронетранспарцёры, мата-

цыклы рынуліся прасёлачнай дарогай цераз Заполле, пераадольваючы да Гарадка цяжкі пясчаны ўчастак, каб зноў выйсці на шашу. Усю ноч ніхто ў вёсцы не заснуў ад рокату матораў, гулу машын, грамыхання праходзячай тэхнікі...

Раніцай наступнага дня запольскія падлеткі знайшлі непадалёку ад берага ракі каля згарэўшай легкавой машыны цяжка параненага ваеннага. Мікалай і Яўген Нікалайчыкі перанеслі яго ў вёску і на агародзе, у цяністым садзе, у акопе, куды хаваліся ў час варожых бамбёжак, абсталявалі «лазарэт». Сюды штодня наведвалася мясцовая медсястра Аляксандра Аляксандраўна Сяргейчык. Уся вёска ведала, дзе хаваецца паранены, але запаляне нікому не прагаварыліся...

Камандаванне Заходняга фронту паспрабавала 28 чэрвеня выправіць становішча пад Бабруйскам, але праціўнік імкліва рухаўся ўперад. Напярэдадні немцы захапілі Глуск. Каб змяніць сітуацыю і не даць ворагу авалодаць горадам на Бярэзіне, прадугледжвалася нанесці ўдары з поўначы па Слуцку і Старых Дарогах і адначасова з боку Бабруйска на Слуцк войскамі 4-й арміі. Такі манеўр дапамог бы расчляніць варожую групоўку, якая пачала канцэнтравацца пад Бабруйскам. Для выканання гэтага задання ўводзілася дадаткова рэзервовая 214-я паветрана-дэсантная брыгада і 210-я матарызаваная дывізія. Аднак камандаванне фронту не ведала ўсёй складанасці абстаноўкі ў гэтым раёне ў той

А.А.Карабкоў.

час, і разлік камандуючага Дз.Р.Паўлава аказаўся нерэальным. Пастаўленая ім задача засталася нявыкананай, бо ў 4-й арміі ўжо не было баяздольных войскаў, каб разгарнуць наступленне. Рэшткі разбітых часцей арміі адыходзілі за Днепр на перафарміраванне. Таму толькі 214-я паветрана-дэсантная брыгада змагла прыняць удзел у ажыццяўленні пастаўленай задачы. Дэсантнікі былі перакінуты на аўтамашынах з-пад Баранавіч пад Бабруйск. Месцам баявых дзеянняў брыгады стаў і Глускі раён.

Далейшы лёс камандзіра 4-й арміі Аляксандра Андрэевіча Карабкова склаўся трагічна. 8 ліпеня яго выклікалі ў штаб фронту і ў армію ён больш не вярнуўся. За няўмелае кіраванне войскамі і іх разгром у прыгранічных баях А.А.Карабкоў быў адхілены ад камандавання, асуджаны ваенным трыбуналам і расстраляны. У пасляваенны час ён быў рэабілітаваны (пасмяротна).

Т.А.Матусевіч.

Дэсантнікі выканалі сваю задачу

Амаль месяц 214-я паветрана-дэсантная брыгада вяла ў тыле ворага абарончыя баі, затрымліваючы рух гітлераўскіх войскаў і не даючы ім магчымасці замацавацца на захопленай тэрыторыі. Каля Глуска дэсантнікі ўзарвалі мост цераз Пціч і разграмілі фашысцкі гарнізон. На шашы Слуцк — Бабруйск наладзілі заса-

саду і знішчылі абоз праціўніка — 30 падвод з патронамі і харчаваннем.

Брыгада дзейнічала на паўночны захад ад Парыч, а таксама на поўнач ад Ратміравіч. У канцы ліпеня супраць дэсантных батальёнаў фашысты сканцэнтравалі вялікія сілы, атакуючы іх у напрамках Парычы — Бабруйск і Глуск — Бабруйск.

Брыгада ўступіла ў бой з двума палкамі гітлераўцаў. Храбра змагаліся дэсантнікі, бой працягваўся з 9 гадзін раніцы да позняй ночы. Тады камандзір брыгады загадаў узводу разведчыкаў высветліць сілы праціўніка ў напрамку Парыч і Азарыч, куды павінны былі рухацца батальёны дэсантнікаў.

Брыгада прасоўвалася на поўдзень Палесся. У ліпені — жніўні яна правяла дзесяткі жорсткіх баёў, паспяхова выконваючы ўскладзеныя на яе задачы. Пазней перадыслацыравалася на Украіну і працягвала весці баі ў тыле ворага. Затым перасекла лінію фронту і злучылася з асноўнымі сіламі Чырвонай Арміі.

І ў акружэнні грозная сіла

Цяжкім, але гераічным быў баявы шлях і старэйшага злучэння Чырвонай Арміі — 24-й Самара-Ульянаўскай Жалезнай стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра Кузьмы Мікітавіча Галіцкага. Яна з баямі адступала ад нашых заходніх рубяжоў: абараняла Ліду, Ашмяны, трапляла ў акружэнне і выходзіла з яго, каб злучыцца з асноўнымі сіламі Чырвонай Арміі.

Нарэшце дывізія прарвалася на Палессе. Наступіў час, калі закончыліся снарады, гаўбіцы сталі лішняй абузай; дывізія панесла вялікія страты, было шмат раненых. Генерал Галіцкі сабраў камандзіраў часцей, растлумачыў абстаноўку. Было прынята рашэнне знішчыць усю цяжкую матэрыяльную частку і прабівацца на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Аб гэтым саставілі і падпісалі акт.

Дывізія адступала па маршруту Старыя Дарогі — Глуск — Азарычы — Мазыр. Рухаліся трыма арганізаванымі атрадамі на чале з камандзірамі 274-га, 7-га і 108-га стралковых палкоў, якія мелі на ўзбраенні і гарматы 160-га артпалка. Наперадзе ішла разведка. На пяці матацыклах адправіліся разведчыкі пад камандаваннем лейтэнанта Е.К.Аляшова, каб дакладна ўстанавіць лінію фронту, выявіць яе найбольш слабыя месцы, намеціць участкі прарываў.

Каля Глуска гітлераўцы навязалі 24-й дывізіі бой. Патрэбна было, здзейсніўшы манеўр, пазбегнуць удару моцнага ворага. Дапамаглі мясцовыя жыхары, якія падказалі найбольш верны шлях адыходу. Дывізія рэзка змяніла маршрут. Яе часці пайшлі на поўдзень ляснымі дарогамі, а некаторыя батальёны — балотамі. Наперадзе рухаліся разведвальныя атрады лейтэнантаў Г.А.Алейніка, І.Г.Сляпнёва, Е.К.Аляшова. На паўднёвы ўсход ад Глуска яны сустрэліся з разведкай 232-й стралковай дывізіі 66-га стралковага корпуса.

Так 14 ліпеня 1941 г., здзейсніўшы бясприкладны подзвіг у тыле ворага, знішчыўшы ў абарончых баях тысячы гітлераўцаў, 24-я стралковая дывізія прарвалася ў раён баявых дзеянняў сваіх войскаў каля Азарыч і Карпілаўкі. Аб мужнасці і гераізме яе камандната і асабовага саставу ў жніўні 1941 г. пісала «Правда» ў сваім перадавым артыкуле: «Злучэнне генерал-маёра Галіцкага адно з першых прыняло на сябе ўдар германскіх танкаў і адбіла яго, знішчыўшы агнём артылерыі 265 танкаў. А калі нямецкія танкавыя і матарызаваныя дывізіі, прарваўшыся на суседніх участках, акружылі наша злучэнне, генерал Галіцкі загадаў прабівацца на ўсход. Днём і ноччу ішлі храбрацы па лясах і балотах Савецкай Беларусі, знішчаючы нямецкія базы, сеючы паніку, нападаючы з тылу на варожыя часці і штабы. Калі байцы зрасходавалі боепрыпасы, яны «пераўзброіліся» адбітай германскай зброяй. Дзве трэці асабовага саставу свайго злучэння вывеў генерал-маёр Галіцкі з акружэння, нанёсшы ворагу значна большыя страты, чым панёс сам. (Андрющенко Н.К. На земле Белоруссии летом 1941 года. Мн., 1985. С. 55–56).

К.М.Галіцкі.

У цесным узаемадзеянні

Летам 1941 г. на тэрыторыі Глускага раёна ў паўднёва-ўсходняй яго частцы вёў абарончыя баі 66-ы стралковы корпус. Яго часці займалі абарону на берагах Прыпяці і Пцічы на паўночны захад ад Парыч.

Артылерыйскім агнём падтрымліваў байцоў корпуса зводны механізаваны атрад пад камандаваннем падпалкоўніка Л.В.Курмышова. Прыбыўшы ў ліпені 1941 г. у саставе бронецягніка і падраздзялення пяхоты на тэрыторыю Акцябрскага раёна каля Ратміравіч, атрад Курмышова ўстанавіў цеснае ўзаемадзеянне з партызанамі, і асабліва з атрадам Ц.П.Бумажкова. Граніца баявых дзеянняў гэтага партызанскага фарміравання прасцірала ся далёка за межы Акцябрскага раёна. Яго групы прабіраліся па тылах германскіх войскаў у Парыцкі, Глускі. Любанскі, Старадарожскі і Бабруйскі раёны.

Байцы зводнага атрада Курмышова, у якім налічвалася 250 чалавек, разам з партызанамі пранікалі на занятыя ворагам тэрыторыі, вялі разведку, нападалі ноччу на штабы, знішчалі сувязь, баявую тэхніку, жывую сілу, ачышчалі ад захопнікаў населеныя пункты. Паспяхова 25—26 ліпеня 1941 г. была праведзена аперацыя па вызваленні Глуска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каб падтрымаць кавалерыстаў 32-й дывізіі, якія пачалі свой працяглы рэйд у варожым тыле і ў першы ж яго дзень выбілі немцаў з Глуска, замацаваць гэты поспех, з атрада Л.В.Курмышова была паслана група байцоў, якую ўзначаліў капітан А.А.Недагораў. Воінскае падраздзяленне, узброенае вінтоўкамі і станкавым кулямётам, на працягу двух дзён вяло баі з асобнымі атрадамі і групамі нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне в. Балашэвічы і Глускай МТС. Але праціўнік кінуў сюды на дапамогу атрады кавалерыі і некалькі бронетранспарцёраў з пяхотай, падтрымаў іх дзеянні авіяцыяй. Фашысты атакавалі Глуск, адкрыўшы моцны артылерыйскі і кулямётны агонь. Атрад А.А.Недагорава вымушаны быў адступіць і заняць абарону на р. Пціч у напрамку Глуск — Акцябрскі. У Глуск зноў уварваліся гітлераўцы.

Л.В.Курмышоў.

Зводным атрадам Курмышова і партызанамі-бумажкоўцамі было ажыццёўлена некалькі ўдалых аперацый на тэрыторыі Акцябрскага і Глускага раёнаў. Найбольш значная з іх — знішчэнне буйнога штаба гітлераўскай дывізіі ў в. Воземля, дзе было забіта больш як 70 нямецкіх салдат і афіцэраў, захоплена шмат трафейнай зброі, боепрыпасаў, а таксама гарматы, цягачы, вызвалена ад расстрэлу група савецкіх ваеннапалонных, мясцовых актывістаў.

У пачатку жніўня партызаны атрада Бумажкова працягвалі нарошчваць удары па ворагу. Яны вывелі са строю ў Халопенічах неэвакуіраваны спіртзавод, правялі іншыя аперацыі.

Рэйд кавалерыі

У тыя суровыя дні ліпеня 1941 г., калі нямецкія танкі рваліся да Смаленска, Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання вырашыла нанесці войскамі 21-й арміі контрудар у агульным напрамку на Бабруйск, выйсці ў тыл магілёўскай групоўкі праціўніка і прымусіць яго адцягнуць частку сваіх сіл са смаленскага напрамку. Акрамя іншых мер, што па замысле Стаўкі павінны былі зняць пагрозу прарыву пад Смаленскам, прадугледжвалася ўвесці зводную кавалерыйскую групу, якой прадстаяла ажыццявіць рэйд у тыл групы армій «Цэнтр». Гэтую аперацыю ўсклалі на 32-ю, 43-ю і 47-ю кавалерыйскія дывізіі (камандзіры Бацкалевіч, Кузьмін, Сідзельнікаў).

13 ліпеня на станцыю Васілевічы (чыгуначны ўчастак Гомель — Калінкавічы)

А.І.Бацкалевіч.

пачалі прыбываць воінскія эшалоны з кавалерыйскімі палкамі, артылерыяй, танкамі. Стаялі спякотныя дні. Бесперапынна дзейнічала варожая авіяцыя. Але разгрузка ішла днём і ноччу. Лясныя масівы хавалі кавалерыю. Сем дзён праходзіла канцэнтрацыя нашых дывізій у 10—12 кіламетрах ад перадавой. Аднак вораг яе не выявіў.

У хатцы лесніка сабраліся на нараду камандзіры кавалерыйскіх злучэнняў. Іх выклікаў сюды генеральны інспектар кавалерыі РККА, герой грамадзянскай вайны генерал-палкоўнік А.І.Гарадавікоў. Ён паведаміў, што ўсе тры прыбыўшыя дывізіі зводзяцца ў адну кавалерыйскую групу. Вырашыўшы арганізацыйныя пытанні, Гарадавікоў давёў да прысутных загад Стаўкі ад 18 ліпеня 1941 г., падпісаны генералам арміі Жукавым, дзе ўказвалася: «У сувязі з хуткім прасоўваннем у праціўніка, безумоўна, стварылася напружанае становішча з тылам. У гэтай абстаноўцы ўсялякія дзеянні па тыле і камунікацыях праціўніка могуць зрабіць уплыў на поспех аперацыі». Коннікам прадстаяла прарваць абарону ворага і імклівым рэйдам па яго тыле ў напрамку Асіповічы — Беразіно перарэзаць камунікацыі, нанесці ўдар па рэзервах. Выхад групы ў варожы тыл не ўяўляў асаблівай цяжкасці. Наша 232-я стралковая дывізія ў тыя дні вяла баі пад Парычамі, 75-я — у раёне Жыткавіч. Прамежак паміж імі (каля 60 кіламетраў) слаба прыкрываўся асобнымі часцямі і партызанамі. Рэгулярных войскаў праціўніка, акрамя разведкі, тут таксама не было. Кавалерыйскай групе паставілі задачу — выйсці ў тыл ворага ад Азарыч на Глуск. У пачатку рэйду група нацэльвалася на дзеянні на шашэйных дарогах Слуцк — Бабруйск і Мінск — Бабруйск, а таксама на чыгуначных напрамках Асіповіцкага вузла. Канчатковым пунктам рэйда з'яўлялася Орша.

Усе тры кавалерыйскія дывізіі, якія ўваходзілі ў групу, былі лёгкія. У кожнай каля 3000 чалавек, у асноўным па тры палкі (у 32-й чатыры), адзін аблегчаны артполк, абоз першага разраду і крыху аўтатранспарту. Такім чынам, кожная група валодала дастатковай рухомасцю, асабліва пры дзеяннях у лясах, была здольная да хуткіх і нечаканых налётаў, аднак працяглага бою з танкамі праціўніка і налётаў яго авіяцыі вытрымаць не магла.

Усю ноч з 23 на 24 ліпеня ішла падрыхтоўка, вялася ўзмоцненая разведка пярэдняга краю праціўніка, які праходзіў па р. Пціч. А на світанні ўсе тры дывізіі з ходу фарсіравалі водны рубеж на фронце ў 10—12 кіламетраў і, знішчаючы заслоны ворага, рушылі па лясных дарогах у напрамку Глуска, Старых Дарог, Асіповіч.

Уперад вырвалася 32-я кавалерыйская дывізія пад камандаваннем палкоўніка Аляксандра Іванавіча Бацкалевіча. У ноч на 24 ліпеня ёй прадстаяла фарсіраваць Пціч каля Халопеніч, а да канца дня авалодаць Глускам. Ад Пцічы падымаўся белаваты туман. Неўзабаве разведка дывізіі натрапіла на стаянку партызанскага атрада Ц.П.Бумажкова, сакратара Акцябрскага райкома КП(б)Б Палескай вобласці. Яго праваднікі дапамаглі пераправіцца цераз Пціч і перадалі звесткі аб праціўніку. Рэйд пачаўся.

Коннікі без перашкод прайшлі адлегласць да Глуска. Палкі дывізіі на чале з камандзірамі Г.К.Шаўчэнкам, І.Г.Кузьміным і А.В.Казарэзам вырваліся ўперад і ў другой палове дня з ходу атакавалі раённы цэнтр. Конная лавіна неслася суцэльнай сцяной, змятаючы ўсё на сваім шляху. Немцы ў паніцы разбягаліся. Кавалерысты поўнасцю разгромілі мотапяхотны полк гітлераўцаў, які знаходзіўся тут на адпачынку, знішчылі больш як 300 салдат і афіцэраў, захапілі некалькі танкаў і аўтамашын, іншую ваенную амуніцыю. Але панеслі страты і кавалерысты. Сярод загінуўшых быў начальнік штаба 153-га палка маёр Жалтоў. Ён памёр ад ран і быў пахаваны на тэрыторыі Глускай бальніцы. Пасля Вялікай Айчыннай вайны яго прах

перазахаваны на воінскіх могілках у в. Хваставічы. Да канца дня Глуск быў ачышчаны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Жыхары мястэчка з вялікай радасцю сустракалі сваіх збавіцеляў.

У той час, калі 32-я дывізія паспяхова пачала свой рэйд і наносіла ўдары па ворагу, часці 43-й і 47-й дывізій пасля фарсіравання р. Пціч атакавала на маршы нямецкая авіяцыя. Ім прыйшлося маскіравацца ў лясах Акцябрскага раёна і чакаць цемнаты, каб рушыць уперад. Таму штаб групы, які знаходзіўся пры 32-й дывізіі, атрымаўшы такое данясенне, вымушаны быў спыніцца на паўднёвы захад ад Глуска і пад прыкрыццем 121-га палка чакаць падыходу адстаўшых часцей.

Да зыходу дня кавалерысты размяшчаліся ў наступных населеных пунктах Глушчыны: 65-ы і 153-і палкі ў в. Барысаўшчына, 86-ы — у Пагосце, 121-ы полк (рэзерв камандуючага групай) — у в. Краснае.

Разам з коннікамі дывізіі знаходзілася некалькі партызан-разведчыкаў з атрада Бумажкова. Раніцай 25 ліпеня яны паведамілі, што з боку Старых Дарог у напрамку дыслакацыі штаба кавалерыйскай групы рухаецца калона гітлераўцаў — каля палка пяхоты. Камандзір 121-га кавпалка І.С.Паўлаў выдзеліў каля дзесятка станкавых кулямётаў і накіраваў падраздзяленне аўтаматчыкаў на ўчастак дарогі Бабірова — Макавічы, замаскіраваўшы іх на левым фланзе нічога не падазраваўшых фашыстаў. Калі калона наблізілася да месца засады, нашы воіны адкрылі моцны кулямётна-аўтаматны агонь. Вораг не вытрымаў, нават не паспеў арганізаваць абарону. У гэтым кароткім паядынку было знішчана каля двух батальёнаў пяхоты праціўніка. Захопленая трафейная зброя была перададзена мясцовым партызанам.

Да сярэдзіны дня падышлі часці 43-й і 47-й дывізій. Кавалерыйская група працягвала рэйд. Быў аддадзены загад: 32-й дывізіі перарэзаць шашу Слуцк — Бабруйск. Кожнаму яе палку ставілася канкрэтная задача, на якім адрэзку магістралі дзейнічаць: 86-му — у раёне Яўсеевіч, 65-му — каля Сіманавіч, 153-му выйсці на Горнае. А 121-ы кавполк І.С.Паўлава разам з часцямі астатніх дзвюх дывізій атрымаў загад авалодаць Старымі Дарогамі.

Па ўсім відаць, вораг не чакаў, што ў яго тыле з'явіцца некалькі дывізій савецкай конніцы. Сярод гітлераўцаў пачалася паніка. Выкарыстаўшы гэта, байцы 43-й і 47-й дывізій у ноч з 25 на 26 ліпеня рушылі ў напрамку Старых Дарог і, здзейсніўшы 60-кіламетровы марш, з ходу захапілі раённы цэнтр. У гэтай аперацыі вялікую дапамогу войскам аказалі партызаны-глушчане, якія правялі коннікаў бязлюднымі шляхамі, што дало магчымасць нанесці нечаканы ўдар па варожым гарнізоне.

26 ліпеня 32-я дывізія зноў рушыла наперад, перасекла шашэйную дарогу ў раёне Глушы і імклівым маршам дасягнула станцыі і пасёлка Ясень. У ноч на 28 ліпеня сіламі 86-га палка была занята станцыя Татарка.

27 ліпеня 121-ы полк гэтай дывізіі зноў прыняў бой з варожай групай у раёне Бабірова — Макавічы, дзе праціўнік панёс значны ўрон. Але былі значныя страты і ў кавалерыстаў, да таго ж канчаліся боепрыпасы. Таму ў тую ж ноч коннікі палка атрымалі загад рухацца на поўдзень, у раён населеных пунктаў Амур — Слаўкавічы.

Прарыў савецкай кавалерыі ў тыл занепакоіў гітлераўскае камандаванне. Захопам шашы Слуцк — Бабруйск былі перарэзаны камунікацыі 2-й танкавай і 2-й палявой армій праціўніка. Камандуючы групай армій «Цэнтр» фельдмаршал фон Бок, не маючы сіл для ліквідацыі гэтага прарыву, звярнуўся за дапамогай да галоўнакамандуючага сухапутнымі войскамі фельдмаршала Браухіча. Супраць кавалерыстаў былі накіраваны дзве мотадывізіі, узмоцненыя танкамі. Са Слуцка былі кінуты юнкеры дзвюх афіцэрскіх школ і частка італьянскай дывізіі. Іх баявыя дзеянні падтрымлівала авіяцыя. Пасля цяжкага бою нашы воіны вымушаны былі пакінуць Старыя Дарогі і адысці ў лясы.

Кавалерыйскія дывізіі на працягу трох сутак правялі шэраг баявых аперацый у напрамку Слуцка і Асіповіч, панеслі страты і не мелі папаўнення. І ўсё ж у ходзе баёў вораг адчуў іх сілу. Асабліва яскрава гэта назіралася на чыгуначных камунікацыях, дзе затрымліваўся падыход рэзерваў праціўніка.

Становішча групы ўскладнялася: толькі на кароткі тэрмін аказаліся баяздольнымі танкі (зрасходавалі гаручае і боепрыпасы). 27 ліпеня штаб групы страціў сувязь з камандаваннем фронту: у час варожай бамбёжкі была разбіта радыё-

станцыя, страчана сувязь з палкамі 32-й дывізіі, якія вялі баі ў Асіповіцкім раёне і на подступах да Асіповіч.

На пошукі кавалерыйскай групы камандаванне фронту накіравала звяно самалётаў. Лётчыкі хутка выявілі яе месцазнаходжанне, адзін самалёт удала прызямліўся непадалёку. Перадаўшы інфармацыю аб становішчы на фронце, лётчык атрымаў данясенне пра сітуацыю, якая склалася ў кавалерыстаў, і паляцеў назад.

Абстаноўка пагаршалася з кожным днём: варожая авіяцыя бесперапынна наносіла ўдары па групе, а танкавыя і механізаваныя часці сціскалі кальцо акружэння 43-й і 47-й дывізій, займаўшых абарону на поўдні Глушчыны — у Акцябрскім і Парыцкім раёнах. Як сведчылі даныя разведкі і звесткі партызан, немцы паставілі перад сабой мэту — пакончыць з групай, якая, уварваўшыся ім у тыл, перашкаджала ажыццяўленню намечанай задачы: рухацца ўперад, да Масквы. Таму былі прыняты вычарпальныя меры, каб завяршыць акружэнне раёна, дзе знаходзілася група. І гэта, можна сказаць, амаль што ўдалося. Тым не менш конныя палкі 43-й і 47-й дывізій прарвалі блакаду, выйшлі з акружэння, фарсіравалі раку Пціч і злучыліся з часцямі 3-й арміі.

Але ў тыле ворага яшчэ заставаліся і паранейшаму паспяхова дзейнічалі 65-ы, 86-ы і 153-ці палкі 32-й кавалерыйскай дывізіі. Вораг блакіраваў іх месцазнаходжанне: выставіў моцныя заслоны на дарогах Бабруйск — Слуцк і Бабруйск — Асіповічы. Тут патрулявалі групы танкаў, матацыклістаў, з паветра за дывізіяй сачыла авіяцыя і бесперапынна бамбіла воінскія падраздзяленні. Але кавалерыстам удалося прарваць кальцо блакады ў асіповіцкіх лясах, нанесці тут значны ўрон ворагу і выйсці ў Парыцкі раён. Выдатнымі праваднікамі кавалерыстаў аказаліся жыхары Глушчыны партызаны Юркевіч, Варава, Пінчук і іншыя.

Атрады коннікаў штодзённа вялі баі з ворагам і неслі вялікія страты. Па цяжкіх дарогах, па лясах і балоцістых мясцінах 32-я дывізія, нарэшце, выйшла к Азарычам, прарвала тут фронт праціўніка і далучылася да часцей 66-га стралковага корпуса, трымаўшых абарону на гэтым участку.

Так закончыўся рэйд коннай групы па тылах ворага, які працягваўся каля двух тыдняў. І хоць за гэты час пастаўленыя задачы не былі выкананы цалкам (прабіцца на Оршу не ўдалося), кавалерыйскія дывізіі нанеслі некалькі ўдараў па камунікацыях ворага, амаль тыдзень утрымлівалі дарогу Слуцк — Бабруйск, разбурылі чыгуначныя станцыі, 6 буйных мастоў, знішчылі многа варожых салдат і афіцэраў. Баявыя дзеянні дывізій сумесна з ударамі, нанесенымі па ворагу 21-й арміяй, адцягнулі на сябе значную частку войскаў праціўніка, звязалі іх боем, стварыўшы сур'ёзную пагрозу камунікацыям 2-й нямецкай арміі.

Гітлераўскі генерал Філіпі пазней пісаў: «Тут у канцы ліпеня кавалерыйскія злучэнні праціўніка... прарваліся да аўтамагістралі Слуцк — Бабруйск. Сумесна з некалькімі пяхотнымі злучэннямі яны скавалі цэлы корпус (43-ці армейскі) у раёне паўночней Мазыра, а таксама затрымалі груз 35-га армейскага корпуса на Мазыр...»

І хаця біты фашысцкі генерал наўмысна ўводзіў чытача ў зман, называючы некалькі нашых пяхотных злучэнняў, якія быццам бы дзейнічалі сумесна з кавгрупай, тым не менш поспех нашых войскаў ён не ў сілах утаіць.

Некаторая частка кавалерыстаў пасля рэйду засталася на тэрыторыі Глускага раёна і ў складзе партызанскіх атрадаў працягвала барацьбу з фашыстамі.

У матэрыялах Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны ў г. Падольску захоўваецца спіс узнагароджаных пасмяротна воінаў 32-й кавалерыйскай дывізіі. Гэта сяржанты П.П.Саўчанка. Я.І.Бублікаў, Ф.І.Дражынін, падпалкоўнік Перакростаў, палітрук Ф.І.Козыраў, Ц.Ц.Расадзін, капітан Д.С.Скрыпко, старшына М.А.Цюрэеў, якія ўдастоены ордэна Чырвонай Зоркі; лейтэнант Расткоў, сяржант Сумелка ўзнагароджаны медалём «За адвагу», палітрук І.Н.Кудзін, сяржант Я.С.Сарокін, Э.Э.Сангінаў, Т.Т.Дзюмін, Г.Я.Лысенка — медалём «За баявыя заслугі».

З-за адсутнасці звестак месца пахавання гэтых воінаў не ўстаноўлена, як не ўстаноўлены і прозвішчы кавалерыстаў, якія загінулі на тэрыторыі Глускага раёна. На брацкіх магілах у розных вёсках ім устаноўлены помнікі, на якіх, на вялікі жаль, няма ніводнага прозвішча пахаваных тут людзей, а ўказана толькі колькасць загінуўшых: Гарадок — 2, Даколь — 46, Зелян-

ковічы — 21, Зубарэвічы — 9, Катка — 47, Макавічы — 25, Макраны — 44, Сіманавічы — 171, Сельцы — 53. Пошукавая работа па ўвекавечванні памяці загінуўшых кавалерыстаў працягваецца.

М.М.Данілаў, Р.М.Кісялевіч.

22 чэрвеня 1941 года. Была нядзеля...

Па-святочнаму выглядаў Глуск у гэты дзень. Ажыўлена і многалюдна было ў цэнтры мястэчка. З усіх гаспадарак, школ раёна прыбывалі спартыўныя каманды, удзельнікі раённых спаборніцтваў. Маладосць, здаровы выгляд хлопцаў і дзяўчат, якія кучкаваліся на спартыўнай пляцоўцы, міжволі прыцягвалі позіркі людзей. Усюды чуліся смех, жарты. Вясёлая таўкатня, усмешкі на тварах. Спартыўныя баталіі праходзілі на тэрыторыі цяперашняга сквера і былі ў самым разгары. І раптам...

З успамінаў Івана Фёдаравіча Баглая, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

Мы з аднакласнікам Георгіем Казаком (пазней адзін з актыўных падпольшчыкаў Глушчыны) удзельнічалі ў гэты дзень у спартыўных спаборніцтвах і беглі дыстанцыю на 400 метраў. Але не паспелі дасягнуць фінішу, як з гучнагаварыцеляў, устаноўленых на месцы цяперашняга універмага, было аб'яўлена аб нападзенні фашысцкай Германіі на нашу краіну. Людскі натоўп кінуўся да чорных рупараў, што прынеслі такую жудасную вестку. Адразу ж прапаў святочны настрой, спахмурнелі твары. Пасля выступлення па радыё В.М.Молатава глушчане збіраліся невялікімі групамі і бурна абмяркоўвалі пачутае. Чуліся воклічы: «Нарэшце-такі раздавім фашысцкую гадзіну». А мне лезла ў галаву адна думка: «Жыццё наша зламана».

З успамінаў Мікалая Гаўрылавіча Падаляка, былога сакратара камсамольскай арганізацыі калгаса «Чырвоная зорка», удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

Вестка аб вайне застала мяне ў Глуску. Цяжка перадаць агарнуўшыя нас пачуцці. Не верылася, што над Радзімай навісла суровая небяспека і вораг стукае ў наш дом... Людзі разумелі, якую пагрозу нясуць фашысты. Аб іх злачынствах мы добра ведалі з газетных матэрыялаў, яшчэ з часоў вайны ў Іспаніі і ў іншых краінах Еўропы. На маю думку, разгубленасці сярод кіруючых работнікаў раёна ў той час не было.

У канцы дня я вярнуўся ў Касарычы, дзе мяне ўжо чакала павестка з патрабаваннем тэрмінова прыбыць у сельскі Савет. Тут я ўбачыў многіх знаёмых сакратароў камсамольскіх арганізацый суседніх калгасаў. Старшыня Каткаўскага сельсавета Антон Коўзун паставіў перад намі задачу: арганізаваць з ліку камсамольцаў і моладзі групу садзейнічання, устанавіць патруляванне на дарогах, затрымліваць усіх падазроных асоб, правяраць дакументы, байцоў, якія адсталі ад сваіх часцей, а таксама мужчын прызыўнога ўзросту накіроўваць у пункт збору.

Нам выдалі зброю. Я атрымаў карабін і дзве гранаты. Група садзейнічання, якую ўзначальваў я, пастаўленую задачу выканала, было праведзена мноства дзяжурстваў, адпраўлена на зборны пункт некалькі дзесяткаў чалавек, мабілізаваных у армію.

З успамінаў Аляксандры Іванаўны Гункевіч, былой партызанкі 130-й брыгады «Помста»

«Хоць адасплюся», — думала я, вяртаючыся дамоў пасля шумнага выпускнога балю ў глускай беларускай СШ № 1, куды мяне запрасілі выпускнікі. Мы былі амаль аднаго ўзросту: я, работнік райана, і толькі

М.Г.Падаляк.

А.І.Гункевіч.

што закончыўшыя сярэднюю школу хлопцы і дзяўчаты.

Прачнулася, ахопленая нейкай невядомай трывогай ад узрушаных галасоў, жаночага плачу, што ўрываліся з вуліцы праз акно. Выскачыла ў двор. Што здарылася?

— Вайна, — пачула адзінае слова.

Праз некалькі хвілін спяшалася да ваенкамата: адчувала, што мне патрэбна быць зараз тут, хоць я і не ваеннаабавязаная. Аказалася, што такія ж думкі прывялі сюды многіх іншых жыхароў мястэчка: каля венкамата стаяў немалы натоўп.

Райваенкома маёра Левіна на месцы не аказалася. Як паведаміў дзяжурны, маёр зараз у райкоме партыі на нарадзе. Мы засталіся чакаць яго.

Праз некалькі гадзін я ўжо ведала, што мне рабіць: даручылі праводзіць па вёсках мабілізацыю моладзі ў армію. І пакуль існавалі ў Акцябрскім раёне «вароты» — адзіны шлях зносін з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі, я не спыняла гэтай работы.

Ворагу нічога не пакідаць

Як толькі стала вядома аб нападзе фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз, у райкоме партыі склікалі нараду партыйнага, савецкага і камсамольскага актыву раёна. Перад прысутнымі выступілі сакратар райкома партыі Аляксандр Максімавіч Канавалёнак, старшыня райвыканкома Ларыён Піліпавіч Палтаран, ваенком маёр Левін і іншыя. Распрацавалі і прынялі план правядзення мабілізацыі мужчын старэйшага прызыўнога узросту, стварылі знішчальны батальён з 70 чалавек, кіраўнікамі якога сталі Канавалёнак і Палтаран.

У першыя ж дні вайны праціўнік у шэрагу раёнаў Беларусі высадзіў узброеныя дэсант, у тыл Чырвонай Арміі накіраваў сігналістаў, якія б указвалі на важнейшыя аб'екты для гітлераўскай авіяцыі. Таму ў Глускім раёне ў сельскіх Саветах ствараліся групы і атрады садзейнічання з ліку калгасна-саўгаснага і гаспадарчага актыву, моладзі. У іх задачу ўваходзілі ахова грамадскіх аб'ектаў, прамысловых прадпрыемстваў, гандлю, дзяржаўных устаноў, барацьба з марадзёрамі, фашысцкімі дыверсантамі і парашутыстамі, кругласутачнае назіранне за тэрыторыяй раёна з тым, каб вораг быў своечасова выяўлены і знішчаны. Арганізаваныя пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх органаў узброеныя добраахвотныя фарміраванні разам з насельніцтвам правялі велізарную работу па стварэнні завалаў, воўчых ям і іншых перашкод для ворага на грунтовых дарогах.

Праз пару дзён у раёне з'явіліся першыя групы бежанцаў, потым іх паток узмацнеў. Прымаліся меры, каб людзей накарміць, забяспечыць вопраткай, аказаць пры неабходнасці медыцынскую дапамогу. У мястэчку былі разгорнуты два медсанбаты: адзін каля будынка райбальніцы, другі — на месцы цяперашняга раённага вузла сувязі. Жыхары Глуска прыносілі сюды хлеб, малако, садавіну, гародніну, іншыя прадукты харчавання.

Ішла эвакуацыя раённых арганізацый, сельскагаспадарчай тэхнікі, і ў першую чаргу з МТС, грамадскай жывёлы, сыравіны і прадуктаў. Але не хапала транспарту. Эвакуацыя ў большасці выпадкаў ішла сваім ходам. З раёна на поўдзень краіны гналі статкі жывёлы, але станавілася ўсё больш відавочным, што поўнасцю правесці эвакуацыю не ўдасца: фронт набліжаўся. Тады паступіла распараджэнне: у калгасах і саўгасах раздаць найбольш каштоўную маёмасць па дварах — калгаснікам, рабочым, служачым, каб нажытае дабро не дасталося ворагу. Значная частка яго пазней была выкарыстана партызанамі. У касарыцкім калгасе «Чырвоная зорка» гэтай работай, напрыклад, займаліся старшыня калгаса Сямён Пятровіч Русін і калгасны рахункавод Карп Давыдавіч Пацай, у в. Зорка — старшыня калгаса Якаў Іванавіч Марус і інш.

Адпраўку лепшай тэхнікі Рудабельскай МТС з Халопеніцкай брыгады арганізоўваў брыгадзір, малады камуніст Віктар Мітрафанавіч Багдановіч. Па яго распараджэнні нядаўна набыты новы гусенічны трактар пагнаў на ст. Ратміравічы трактарыст Сямён Багук, якому яшчэ ўдалося адправіць тэхніку па чыгунцы. Другі, крыху горшы калёсны трактар і машыну-палутарку схавалі ў лясным гушчары.

Па ўказанні абласных партыйных органаў большасць раённых арганізацый, у тым ліку райкам партыі і райвыканком, выехалі ў Акцябрскі раён, адкуль, пасылаючы сваіх упаўнаважаных, вырашалі многія складаныя пытанні ваеннага часу.

Т.А.Матусевіч.

Верныя воінскаму абавязку

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны фашысты наступалі асабліва напорыста. Бо вайна ўсё яшчэ здавалася ім лёгкай прагулкай і, нягледзячы на нечаканую асечку пад Брэстам, фашысты па-ранейшаму верылі ў хуткі парад у Маскве. Таму задача і на гэты раз перад лётчыкамі экіпажа капітана А.М.Шустава была сфармулявана проста: наносіць адчувальныя ўдары па наступаючых войсках праціўніка з паветра. Разам з камандзірам экіпажа на заданне вылецелі лётчык старшына А.В.Ігнацьеў і штурман капітан М.К.Есіпаў.

Гэты экіпаж выконваў загад па бамбардзіроўцы варожых сіл у раёне Пінска. Хутка лётчыкі заўважылі буйны атрад гітлераўцаў. У пікіруючым палёце некалькі разоў абстралялі калону, трапна адбамбіліся. Пры гэтым знішчылі нямала тэхнікі, жывой сілы праціўніка. Словам, заданне выканалі бліскуча.

— Вяртаемся на аэрадром, — аддаў загад капітан А.М.Шустаў. Але ледзь паспеў ён гэта сказаць, як усе адчулі моцны ўдар: адзін са снарадаў варожай зеніткі трапіў у самалёт.

— Пашкоджаны рулі кіравання, — далажыў камандзіру старшына, — губляем вышыню. Будзем прыгаць з парашутам?

Але ў камандзіра экіпажа ўзнікла іншае рашэнне: да Бабруйскага аэрадрома, адкуль вылецелі лётчыкі, заставалася некалькі мінут палёту, яшчэ можна зрабіць спробу выратаваць баявую машыну.

Спачатку ўсё ішло нармальна і, здавалася, мэта вось-вось будзе дасягнута. Але нечакана з правага боку да пашкоджанага самалёта працягнуліся вогненныя ніткі — гэта варожыя знішчальнікі напалі на безабаронную машыну. Полымя ахапіла самалёт, і праз некалькі хвілін моцны выбух скалануў усё наваколле. Так над в. Клетнае ў першыя дні вайны загінуў гераічны экіпаж, да канца выканаўшы свой абавязак перад Радзімай.

У.М.Чабан.

...А мы такія маладыя

На пяты дзень вайны ў Глускім раёне з'явіліся фашысты. Але тэрыторыя Каткаўскага і Слаўкавіцкага сельсаветаў заставалася яшчэ свабодная. Мабілізацыя працягвалася. У Катку, на прызыўны пункт, які размясціўся ў будынку мясцовай школы, збіраліся атрымаўшыя павесткі аб мабілізацыі жыхары Глушчыны. Адсюль іх шлях ляжаў на Лоеў і далей. Групамі па 20 чалавек, пехатой на чале са старшым групы, яны выходзілі з вёскі па ўказаным маршруце. Так ужо былі адпраўлены дзве групы прызваных у армію мужчын. Трэцяя, апошняя, чалавек 400, вызначалася тым, што ў яе складзе ў асноўным была моладзь, камсамольцы. Частку гэтай групы ваенком Левін даручыў весці афіцэру, які ўжо меў баявыя навыкі ў савецка-фінляндскай вайне.

З успамінаў Аляксея Фаміча Тарасевіча

Да вайны А.Ф.Тарасевіч, жыхар в. Розлевічы, закончыў школу маладых камандзіраў. Удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, мужна ваяваў у савецка-фінляндскую вайну. У час Вялікай Айчыннай вайны камандаваў узводам. Фарсіраваў Днепр, удзельнічаў у баях за Херсон, Запарожжа, Нікалаеў, Адэсу, на Сандамірскім плацдарме.

Пасля вайны працаваў намеснікам старшыні калгаса. Кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, іншых баявых і працоўных узнагарод.

У ліпені 1941 года, калі з раёна адпраўлялася, відаць, апошняя група прызыўнікоў, ваенком Левін выклікаў мяне ў ваенкамат (ён размяшчаўся разам з прызыўным пунктам) і прызначыў старшым групы, якую патрэбна было прывесці ў г. Карачаў Бранскай вобласці. З гэтага загаду пачалася, па сутнасці, мая баявая эпапея. Ваенком параіў выбраць больш бяспечны маршрут. Узяўшы напрамак на п. Акцябрскі, мы пайшлі затым на Азарычы, Хойнікі, Васілевічы, Лоеў... Ішлі пераважна лесам, пастаянна звяраючы курс па карце. Так паступова і прыйшлі ў Карачаў. У групе было прыкладна 150 чалавек, у Карачаве яе расфарміравалі па часцях. Гэта былі пераважна маладыя людзі, камсамольцы, якіх пасля развяла вайна па розных шляхах-дарогах.

П.Ц.Юневіч.

Ю.Н.Фуксон.

В.І.Ясючэня.

З успамінаў Пятра Цімафеевіча Юневіча

П.Ц.Юневіч закончыў вайну малодшым лейтэнантам-палітработнікам. Давялося яму прыняць удзел у разгроме Японіі. Да гэтага былі курсы сувязістаў у Белгарадзе, баі пад Варонежам, Харкавам, на Арлоўска-Курскай дузе. Пасля вайны быў замполітам у МТС, працаваў старшынёй, намеснікам старшыні калгаса, доўгі час на савецкай рабоце.

Павесткі мы атрымалі ў сярэдзіне ліпеня. Мы — гэта дзесяткі юнакоў камсамольскага ўзросту. На прызыўны Каткаўскі пункт прыехалі хлопцы са Слаўкавіцкага, Бярозаўскага, Клятнянскага сельсаветаў. То быў, калі мяне не падводзіць памяць, апошні прызыў на тэрыторыі раёна. Мяркуйце самі, калі ў дзень прызыву ў 12 гадзін дня яшчэ былі мы, то ў 13 — ужо немцы, прыехаўшыя на матацыклах, бронетранспарцёрах. І толькі тое, што здагадаліся знішчыць мост каля Халопеніч, перашкодзіла фашыстам затрымаць нашу групу. Многае тут вырашылі рашучасць, аператыўнасць, асабістая мужнасць яе кіраўніка А.Ф.Тарасевіча. У многім дзякуючы яму паспяховым быў наш марш да Карачава.

З успамінаў Юрыя Навумавіча Фуксона

Праз усю вайну прайшоў Ю.Н.Фуксон. Першае сур'ёзнае баявое хрышчэнне атрымаў каля г. Калач, што стаіць на выгібе р. Дон. Менавіта тут сем цяжкіх дзён адбівала мотастралковая брыгада, у якой ён служыў, атакі нямецкіх танкаў. Затым былі абарона Сталінграда, вызваленне Краснаармейска, баі за Адэсу, Днепрапятроўск, Малдавію. Варшава, Лодзь, Люблін, Кракаў таксама праляглі на яго баявым маршруце. Вайну закончыў у Берліне. Доўгі час працаваў на ніве культуры, настаўнічаў.

Калі пачалася вайна, быў я студэнтам-першакурснікам Мінскага педінстытута. Час якраз канікулярны, таму і апынуўся спачатку ў родным Глуску, а потым у складзе той апошняй прызыўной групы. З райцэнтра на прызыўны пункт нас прыйшло 14 чалавек, астатнія, а іх большасць, былі з вёсак раёна. Але пазнаёміліся і здружыліся хутка. Многіх і сёння памятаю: Мікалай Падаляк, Сцяпан Багам'я, Павел Адзінец, Міхаіл Юневіч, Багук... Мы былі такія маладыя! Са свайго юнацтва, як кажуць, без раскачкі, пакрочылі ў сталасць. Вайна для нас стала суровым выпрабаваннем. І мы гордыя тым, што вытрымалі яго з гонарам.

З успамінаў Васіля Іосіфавіча Ясючэні

Нямала выпрабаванняў выпала за гады вайны на долю В.І.Ясючэні. Але галоўнае тое, што вынес ён іх дастойна, ніколі не здрадзіў свайму сумленню, не згубіў чалавечай годнасці.

Яму давялося ваяваць на многіх франтах — Паўднёва-Заходнім, Паўднёвым, Паўночна-Каўказскім, Закаўказскім. Тысячы кіламетраў, мноства гарадоў, вялікіх і малых, пакінуў за спіной мужны воін. Многія гады яго жыцця потым былі звязаны з арміяй, з работай па выхаванні яе воінаў, з партыйнай работай.

Я добра памятаю эпізод, аб якім ідзе размова, як і тых хлопцаў, разам з якімі пачалася мая ваенная дарога. Памяць аб былым і перажытым па-ранейшаму жыве ў сэрцах ветэранаў, хвалюе іх і трывожыць. Наша жыццё было кроўна звязана з жыццём Радзімы. Таму заўсёды былі гатовы памерці за яе свабоду і незалежнасць, і без лішніх роздумаў уносілі свой пасільны ўклад у агульную перамогу. Усяму лепша-

му мы вучыліся ў старэйшых пакаленняў. Вобраз ваенкома Левіна не сатрэцца ў памяці таксама. Сустрэў ён нас тады і амаль з кожным пагутарыў. Таленавіты ваенны, сапраўдны патрыёт сваёй Радзімы, ён усяляў у нас упэўненасць у непазбежнай перамозе над ворагам, шчыра, па-бацькоўску клапаціўся аб кожным.

Калі стала вядома, што вораг прасунуўся далёка на ўсход, Левін вырашыў весці нас на поўдзень, на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Ноччу па трывозе ўсе падняліся, кожны атрымаў па 75 руб. грашовага забеспячэння, і пешым парадкам мы рушылі ў п. Акцябрскі, потым далей, у Карачаў. Калі прыбылі ў пункт назначэння, нас, маладых, неабстраляных, некаторы час абучалі ваеннай справе і толькі ў пачатку 1942 года адправілі на фронт. Там я і прыняў баявое хрышчэнне.

Сарваная сесія

З успамінаў Ганны Іванаўны Парахаўнік, жыхаркі г.п. Глуск

У 1938 годзе я скончыла Макавіцкую сямігодку. Была перарасткам, бо ў нашай сям'і расло некалькі дзяцей, меншых за мяне, і бацькі ў школу мяне не пускалі: патрэбна было дапамагаць маці. І ўсё ж прыйшоў час вучобы ў школе. Тут мяне прынялі ў камсамол. Маю актыўнасць у грамадскім жыцці, арганізатарскія здольнасці прыкмецілі яшчэ са школы і прапанавалі пайсці працаваць піянерважатай. Накіравалі на шасцімесячную курсавую перападрыхтоўку ў Слаўкавіцкую сямігодку. Дырэктарам школы там працаваў Мікалай Сямёнавіч Лугін, настаўнікамі Царык з Жалвінца, Мікалай Барысенка, Антаніна Валодзька, Аляксандра Герасімаўна Захарык, яе муж Канстанцін Мікалаевіч Аўгусцінскі, Верамейчык, пачатковыя класы вяла Ганна Марцінаўна Букс. Школа была своеасаблівым ачагом культуры для мясцовага насельніцтва. Тут часта наладжваліся розныя тэматычныя вечары. Памятаю, наша школа заняла першае месца ў раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці і была адпраўлена на абласны агляд у г. Мазыр. У гэты час я ўжо вучылася завочна на 2-м курсе Мазырскага педвучылішча. Патрэбна было якраз ехаць на другую летнюю сесію. Я прыехала да бацькоў на выхадны дзень, каб узяць неабходныя рэчы ў дарогу. У Макавіцкай школе вечарам быў выпускны баль. Безумоўна, я не магла пакінуць без увагі такую падзею: весялілася, многа танцавала з сяброўкамі.

Світала. Здалёк ледзь чутна даносілася нейкае грамыханне. Здавалася, што недзе бушуе навальніца ці грыміць гром. І толькі днём, калі з Глуска вярнуліся вяскоўцы, што ездзілі на базар, у Макавічах даведаліся пра пачатак вайны. Але тады ніхто яшчэ не ўяўляў усёй яе сілы і трагізму, не думаў, якой яна будзе жахлівай. Нагадвалася савецка-фінляндская вайна. Як вядома, у ёй удзельнічалі нямногія. Таму думалася, што і зараз будзе нешта падобнае. Але хутка такія думкі развеяліся. У раёне была аб'яўлена мабілізацыя, і ў дзень адпраўкі мужчын на прызыўны пункт па вёсцы паплылі жаночы плач, галашэнне, як па нябожчыках. Ад усяго гэтага на сэрцы рабілася трывожна і сумотна, агортваў нейкі жах. Праз пару дзён у вёсцы сабралі ўсіх камсамольцаў і загадалі несці ахову каля тэлефоннай лініі Макавічы — Краснае. У начной цемры нам было боязна, кожны шорах прымушаў быць напагатове.

Жыццё яшчэ цякло ў ранейшым рэчышчы, рытм яго быў адносна спакойны. Пра вайну неяк не думалася, старэйшыя вяскоўцы лічылі, што немец яшчэ далёка, а можа, сюды і не дойдзе.

Атрыманы за некалькі дзён да гэтых падзей выклік на сесію прымушаў прыняць нейкае рашэнне, і мы з сяброўкай пачалі

Г.І.Парахаўнік.

пакаваць у дарогу свае чамаданы. Прыйшлі ў Глуск, і тое, што тут убачылі, нас быццам працвярэзіла: натоўпы бежанцаў, магазіны паўпустыя, пад нагамі хрупаціць бітае шкло, вакол валяецца смецце, вецер разносіць шматкі нейкіх папер. Твары людзей строгія, без усмешак. З размоў прахожых да нашага слыху часта далятала прозвішча нейкага Каваленкі, якога недзе забілі немцы.

Стала зразумела, што ніякай сесіі ў нас больш не будзе. Мы пайшлі назад у Макавічы. Па дарозе сустрэлі старога дзеда на падводзе, які ехаў у Слуцк і ўзяўся падвезці нас. Дарога ішла лесам, мы ехалі і размаўлялі з гаваркім дзедам. Да слыху пачаў даносіцца нейкі гул. Падумалася: «Мабыць, тэхніку з Глускай МТС гоняць». Гул нарастаў, ён быў чуцен усё бліжэй і бліжэй. Мы ў здзіўленні пераглянуліся: хто ж пагоніць цераз лес трактары, калі недалёка добрая дарога. І раптам ледзь не закрычалі ад нечаканасці і страху: з-за павароту на нас з лесу выскачыў магутны танк з крыжам на баку. Немцы! Мы проста аслупянелі. Падвода стала, конь спалохана касіў вокам, перабіраў нагамі, гатовы выскачыць з аглобляў. За першым танкам з'явіліся яшчэ чатыры. Яны спыніліся. У першым адкрыўся люк, з яго вылез танкіст і на ломанай рускай мове спытаў, ці ёсць у «Калатачи» рускія салдаты. Што мы адказалі, не памятаю, бо наша ўвага была прыцягнута да іншых танкаў. З іх вылазілі нямецкія салдаты, некаторыя падышлі бліжэй да падводы, нешта паміж сабой гаварылі, смяяліся. Кроў стыла ў жылах ад гэтага смеху, страх скаваў цела, язык адзеравянеў... Калі мы прыйшлі ў Макавічы, то ўбачылі тут такія ж танкі, такіх жа здаравенных салдат у чужой форме. Нават падумалася, ці не тыя самыя, што сустрэліся ў лесе? Сэрца трывожна сціснулася. Вось яна, вайна...

Знайшлі ў Чувашыі прытулак

З успамінаў Анатоля Уладзіміравіча Ляшчынскага

Прыкладна праз тыдзень пасля аб'яўлення вайны з пасёлка Халопенічы Глускага раёна на дзвюх аўтамашынах эвакуіраваліся 12 сямей мясцовых камуністаў.

Праз колькі дзён дабраліся да Гомеля, але там прабылі нядоўга. 9 жніўня чатыры сям'і (Мышакоў, Зеленкаўцоў, Коўзунаў і нашу, бо астатнія раз'ехаліся тым часам у розныя куткі Беларусі), пагрузіліся ў эшалон. Ноччу цягнік крануўся ў далёкую і невядомую дарогу ў тыл.

Толькі 28 жніўня мы дабраліся да пункта прызначэння — чыгуначнай станцыі Канаш у Чувашыі. Там пераклалі на падводы свае небагатыя пажыткі і накіраваліся ў в. Ямбулатава Янцікаўскага раёна, што стала нашым месцам пражывання на цэлыя тры з лішнім гады.

Нас пасялілі ў доме даволі пажылых людзей. Яны жылі ўдваіх, сын Сцяпан быў на фронце.

Адразу ж узяліся за калгасную работу. А яе было празмерна многа. Давялося ўпрагацца і мне.

Дзесьці ў студзені 1942 г. нам выдалі зароблены на працадні. А паколькі з верасня і да канца года іх у нас назбіралася нямнога, то і атрымалі мы не надта шмат. Выпала на працадзень па тры кілаграмы жыта, ячменю і чачавіцы. Бульбы наогул не было. Праўда, добрай падтрымкай з'яўляўся паёк за тое, што мы былі бежанцамі, бацька ваяваў на фронце.

Пасля новага 1942 г. мы атрымалі першую вестку ад бацькі. Ён цудам змог нас адшукаць. Пісаў, што разам з войскам адступаў аж да самага Сталінграда.

Сяк-так дацягнулі да вясны. А як толькі сышоў снег, пачалі на бульбянішчы збіраць перамёрзлую бульбу. Якія смачныя ляпёшкі атрымліваліся з яе! Крыху пазней пайшлі лебяда, крапіва і конскае шчаўе.

З горам і бядой дачакаліся новага ўраджаю. Спадзявацца ж на падтрымку ад калгаса не даводзілася, бо краіна жыла адным лозунгам: «Усё для фронту, усё для перамогі». Па гэтай прычыне з засекаў калгасных свірнаў вымяталі ўсё, за выключэннем насеннага фонду і таго, што прызначалася на аплату працы калгаснікаў.

Восенню 1942 г. я пайшоў у пяты клас, а да нашага ад'езду з Чувашыі закончыў яшчэ і шосты.

Сярод лета 1944 г. у сяло прыехаў з

вызваленай Беларусі Антон Коўзун. Увесь у ордэнах і медалях. Быў камісарам партызанскага атрада. Ён забраў сваю сям'ю і паехаў на радзіму. Астатнім тром сем'ям давялося чакаць выкліку ад родзічаў з Беларусі, бо проста так на радзіму не пускалі.

Нарэшце доўгачаканы выклік Мышакі, Зеленкаўцы і мы атрымалі. Склаўшы на двое саней сваё «багацце», 14 снежня 1944 г. выехалі з в. Ямбулатава на чыгуначную станцыю Урмары.

Гомель я не пазнаў. Стаялі адны каробкі будынкаў. Затым быў Бабруйск, дзе нашы спадарожнікі развіталіся з намі і падаліся на Глуск. А мы з Бабруйска паехалі ў Старыя Дарогі, як было пазначана ў пропуску-выкліку...

Толькі праз 31 год мне ўдалося на два дні наведацца ў чувашскае сяло Ямбулатава. Сустрэлі мяне надзвычай ветліва і гасцінна. Было пра што ўспомніць, было пра што пагаварыць.

Першыя сполахі партызанскай вайны

У канцы чэрвеня нямецкія бронемехпадраздзяленні праніклі ў Глускі раён па некалькіх напрамках. Уварваўшыся ў мястэчка, фашысты знішчылі некаторыя грамадскія будынкі: спалілі кааперацыі, сталовую, клуб, памяшканне Асаавіяхіма. Але вораг адразу ж сутыкнуўся з мужнасцю і стойкасцю мясцовага насельніцтва, а ў шэрагу месцаў заваёўнікам далі адчуць, што не збіраюцца сустракаць іх хлебам-соллю. Простыя, кволыя на выгляд жанчыны-тэлефаністкі Глускага перагаворнага пункта не пакінулі сваіх месцаў, калі варожыя бронемашыны з'явіліся на цэнтральнай вуліцы мястэчка. Яны, не зважаючы на небяспеку, працягвалі інфармаваць абком партыі аб абстаноўцы, звязваліся з кіраўніцтвам раёна, якое ў гэты час знаходзілася ў Акцябрскім раёне, перадаючы паступіўшыя яму ўказанні ад абласнога камітэта партыі.

Глускі знішчальны батальён адышоў у лясы, што падступаюць да Акцябрскага раёна, і злучыўся з мясцовым знішчальным батальёнам, якім камандаваў першы сакратар Акцябрскага райкома партыі Ціхан Піменавіч Бумажкоў.

Немцы, захапіўшы Глуск, доўга ў ім не затрымліваліся. Праз некалькі дзён перадавыя атрады ворага, якія спыніліся тут на кароткі адпачынак, рушылі далей, пакінуўшы ў раёне ў напрамку да Бабруйска толькі патрульную ахову. У райцэнтр выехала кіраўніцтва раёна для арганізацыі работы па далейшай эвакуацыі народнай гаспадаркі.

Байцы Глускага знішчальнага батальёна працягвалі сачыць за пранікненнем варожых часцей на тэрыторыю раёна, і ў першую чаргу танкаў, бронемашын, рабілі ўсё, каб неяк затрымаць іх прасоўванне і не даць ворагу замацавацца на тэрыторыі раёна.

Былі разабраны ўсе масты і перакапаны дарогі ад Глуска да Каткі, узарвана некалькі мастоў ад райцэнтра да Гарадка ў напрамку да Бабруйска, дзе размяшчаўся нямецкі штаб. Узнікла неабходнасць знішчыць і Бярозаўскі мост, каб не прапусціць нямецкія танкі далей, дзе яшчэ ўтрымліваліся пазіцыі часцямі Чырвонай Арміі. У групу падрыўнікоў увайшлі Сямён Васільевіч Маханька, які перад вайной працаваў старшынёй Слаўкавіцкага сельсавета, а затым быў вылучаны інструктарам райкома партыі ў Акцябрскі раён; камандзір узвода Глускага знішчальнага атрада Канстанцін Кіеевіч Каваленка — загадчык аргінструктарскага аддзела Глускага райкома партыі; Марк Маркавіч Філітараў — загадчык камунальнай гаспадаркі Акцябрскага райвыканкома і камсамолец Васіль Катарскі — справавод райваенкамата. Падрыўнікі яшчэ не справіліся з заданнем, як заўважылі, што да моста падыходзяць нямецкія танкі. Фашысты, што ехалі на першай машыне, адкрылі па смельчаках кулямётны агонь. Мост быў узарваны, але варожыя кулі скасілі Каваленку.

У хуткім часе Глускі знішчальны атрад быў расфарміраваны. Многія яго байцы атрымалі загад вярнуцца ў свой раён для арганізацыі падпольнай работы і развіцця партызанскага руху. Частка актывістаў партыйна-савецкай работы арганізавала партызанскі атрад, які ўзначаліў Мітрафан Сямёнавіч Марціновіч. Камісарам быў назначаны сакратар Глускага райкома партыі Аляксандр Максімавіч Канавалёнак. У атрад увайшлі 45 чалавек.

Партызаны наносілі па ворагу адчувальныя ўдары. Яны знішчылі нямала варожай тэхнікі і жывой сілы праціўніка. На тэрыторыі Глускага і Парыцкага раёнаў з 6 па 9 ліпеня 1941 г. чырвонаармейцы і добраахвотнікі падбілі каля 30 нямецкіх танкаў і бронемашын. Гэта былі першыя сполахі нарастаючай партызанскай вайны. На першым сваім этапе яна была цесна ўвязана з дзеяннямі рэгулярных часцей Чырвонай Арміі. Сакратар Глускага райкома партыі А.М.Канавалёнак, паведамляючы ў ЦК КП(б)Б аб дзеяннях свайго партызанскага атрада летам 1941 г., прыводзіць нямала яркіх прыкладаў баявога ўзаемадзеяння з войскамі Чырвонай Арміі. Атрад ахоўваў і ўтрымліваў масты, па якіх пераходзілі нашы часці, уступаў у баі з гітлераўцамі, што імкнуліся прарвацца да гэтых перапраў, прадастаўляў праваднікоў у распараджэнне воінскіх падраздзяленняў, што накіроўваліся ў тыл праціўніка для выканання спецыяльных заданняў, дапамагаў ім вяртацца назад, штодзённа вёў разведку ў інтарэсах камандавання Чырвонай Арміі. Толькі за перыяд з 29 чэрвеня па 2 жніўня партызаны Глускага атрада правялі звыш 300 пошукаў, сабралі і перадалі савецкаму камандаванню многа важных разведданых.

Дакументы сведчаць

З ПАВЕДАМЛЕННЯ САКРАТАРА ПАЛЕСКАГА АБКОМА КП(б)Б Ф.М. ЯЗЫКОВІЧА Ў ЦК КП(б)Б АБ БАРАЦЬБЕ ПАРТЫЗАН І ЗВЕРСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГЛУСКІМ І АКЦЯБРСКІМ РАЁНАХ

Не раней 26 ліпеня 1941 г.*

Противник был выбит из Глусска в 11 час. вечера 24 июля, остались отдельные (вражеские) группы в окружающих населенных пунктах и в Глусской МТС.

25 июля в 4 час. утра через гор. поселок Глусск прошли части группы Городовикова. В районе Глусска велись бои с противником. Имелось много убитых и раненых со стороны противника, с нашей стороны убит командир 80-го кавалерийского полка. Для закрепления в Глусск была послана подполковником Курмышевым группа наших бойцов во главе с капитаном Недогоровым, имея на вооружении винтовки и 1 станковый пулемет. Эта группа 25—26 июля вела борьбу с отдельными отрядами и группами противника в районе дер. Валашевичи и Глусской МТС. Однако, к 5 час. вечера 26 июля противник с отрядами кавалерии (около 200 чел.), 5—6 бронемашинами, пехотой и 1 самолетом атаковал гор. Глусск, открыл артиллерийский и пулеметный огонь. В результате отряд капитана Недогорова был вынужден оставить Глусск и занять оборону на р. Птичь в направлении Глусск — Октябрь. Наши части под командованием генерал-полковника Городовикова вышли на шоссе Бобруйск — Слуцк, разбили части противника в районе Городка, Глусского района, и 26 июля вели бои в районе дер. Симановичи.

Жители гор. поселка Глусск Рогалевич Анна Иосифовна, Гулковская Елена Андреевна, Рыжкова Полина и другие нам рассказали о зверствах, учиненных немецкими грабителями в Глусске и на территории района. Немецкие оккупанты превратили гор. поселок Глусск в сплошное кладбище. Все магазины разграблены, сожжена столовая и дом обороны, государственные ценности и имущество полностью разграблены или уничтожены. Произведен поголовный грабеж местного населения. Весь скот, ценное имущество и деньги, принадлежащие населению, разграблены. Фашистскими убийцами производилось дикое насилие над женщинами. Гражданку Минц, после дикого изнасилования, в лесу расстреляли. Фашистскими бандитами были также расстреляны Левин Иосиф, Клейнер Шлема, Загальский Файка и др.

В дер. Пятенка Клетнянского сельсовета и ряде других населенных пунктов Глусского района фашистская сволочь производила такие же поголовные грабежи, насилия. У колхозника Шумского Кузьмы Михайловича забрали единственного кабана. По неполному подсчету, из этой деревни немцами вывезено 50 коров, около 100 свиней, много овец и другого мелкого скота, принадлежащего колхозникам.

*Датуецца па змесце дакумента.

По Глусскому району партизанский отряд в количестве 25 чел. (командир отряда тов. Мартинович Митрофан Семенович) повседневно деморализует в тылу части противника.

Хорошо действует лесник дер. Косаричи Глусского района тов. Якубенко Алексей. 16 июля 1941 г. с группой партизан им был сделан внезапный налет на разъезд противника, в результате чего был уничтожен 1 танк и убито 5 мотоциклистов.

Отрядом тов. Мартиновича взорваны все 4 моста на р. Птичь (Бояновские мосты). Однажды тов. Мартинович зашел в дер. Косаричи Глусского района к своей матери покушать (не был дома уже 15 дней). В это время в деревню заехал вражеский танк с немцами для грабежа населения. 1 из них остался в машине, а 2 других пошли по домам заниматься грабежом и сбором яиц. В то время, когда он, Мартинович, сел в доме кушать, появились на дворе 2 вооруженных немца. Но он не растерялся. Двумя выстрелами из винтовки через окно он убил обоих немцев. Третий, находящийся в машине, бросился на машине удирать. Тов. Мартинович благополучно ушел из дому, а деревня после этого была разграблена немцами. Видеть его в деревне никто не видел.

В гор. поселке Глусск 21 июля 1941 г. убит старик, сторож городского сада, Клейнер Шлема при следующих обстоятельствах. Городской сад немцами был завален ненужным разным хламом, засорен. Немцы захотели приспособить его для своего развлечения. Поручили старику, сторожу сада, тов. Клейнеру произвести уборку. Он его частично убрал, но устал, сел отдохнуть. В это время появившиеся обратно фашистские людоеды начали ругать его за то, что он не успел убрать им сада. Тогда сторож тов. Клейнер заявил: «Вы не хозяева, придут мои хозяева, тогда буду убирать». Немцы на месте его расстреляли.

В местечке устраивались пьянки, собирали женщин, которых заставляли силой пить с ними и танцевать. Грабежом немцы занимались главным образом вечером. Днем все прятались. В это время врывались бандиты-фашисты в квартиры, ограбляли их дочиста и насиловали беззащитных женщин...

Немецкие фашисты населению рассказывали различные небылицы и дикости о нашей Красной Армии, о захвате Москвы, Ленинграда и Киева, а также о том, что им уже якобы все давно было продано и они только оформляют это, хотя население во все эти враки не верило. С исключительной жадностью население читало привезенные нами наши газеты, а также выслушивало наши беседы, и от радости многие плакали. В своих беседах мы рассказывали им, как нужно вести борьбу с немецкими фашистами, а не быть пассивными наблюдателями. В деревнях рассказывали, как нужно поступать с колхозным урожаем и скотом.

В настоящее время Глусск снова занят немцами.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 82–85.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ГЛУСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б А.М.КАНАВАЛЁНКА Ў ЦК КП(б)Б АБ ДЗЕЯННЯХ ГЛУСКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ З 29 ЧЭРВЕНЯ ПА 2 ЖНІЎНЯ 1941 г.

8 августа 1941 г.

Партизанский отряд все время проводил работу в тылу противника. Метод работы: главным образом разведка о действиях противника в тылу и на фронте, оказание помощи воинским частям проводниками из числа партизан, боевые действия отряда путем обстрела отдельных групп и подразделений противника, действия по преграждению пути для продвижения противника — уничтожение мостов, порча дорог и переправ. Местонахождение отряда: были в разных местах Глусского и Октябрьского районов, в лесах и деревнях. В отряде насчитывалось 45 чел. Состав людей: большинство из райпартактива.

Боевые действия отряда

5 июля с.г. около Глуска в лесу отряд встретился с 2 немецкими бронированными грузовыми автомашинами, нагруженными людьми (до 30 чел. каждая), с прицепами к ним — противотанковыми пушками. Отряд (немцев) был обстрелян из автоматов и отрезан от воинской части, расположенной в 1,5 км от отряда. При обстреле немцев последние возвратились назад, потери которых точно не известны, но по словам жителей Глуска были убитые и раненые немцы.

В дер. Баяново Глусского района 6 чел. из отряда встретили группу мотоциклистов, позади

которых шли бронемашины. Партизаны их обстреляли, немцы вернулись обратно в дер. Березовку. В обстреле участвовал второй секретарь Глусского райкома КП (б)Б тов. Борасов.

2 августа с.г. на отряд внезапно напала немецкая колонна пехоты, более 200 чел. вооруженных автоматами и минометами. Отряд в это время охранял переправу для воинских частей через мосты около спиртзавода «Холопеничи». Два раза завязывалась перестрелка. Партизаны обстреливали из ручных пулеметов и из винтовок, а немцы из пулеметов и минометов. Продвижение немцев было остановлено, и обоз Красной Армии в количестве 80 автомашин, груженных боеприпасами, был пропущен через мосты, после чего партизаны отошли, разорив мосты.

Убитых со стороны партизан не оказалось, потери противника не установлены. В этот же день 1 группа (во главе с тов. Каминским Миной Никифоровичем) отняла у немцев 17 ящиков патронов (15 тыс.) и привезла их в отряд. А тов. Юркевич Виктор Афанасьевич в лесу около деревни Березовка поймал 4 немецкие лошади, которые были сданы в части Красной Армии.

15 июля отрядом в лесу около Глуска был пойман живьем 1 немец и передан частям Красной Армии. 2 июня в дер. Лучицы Копаткевичского района отрядом был посажен аэростат, который передан воинской части. С 6 по 17 июля отряд в количестве 28 человек сражался вместе с полком тов. Степанова и под его командой в районе дер. Оземля, Шкава, Ратмировичи, где врагу нанесены большие потери убитыми, ранеными и пленными. Захвачены трофеи — автомашины, мотоциклы и оружие.

В разведке во время этих действий тов. Зозарев — наш нач. пожарной дружины — один убил 2 мотоциклистов. Во время боевых действий товарищи из партизан были активными разведчиками.

Группа — тт. Потапенко Александр Тарасович, Пинчук Конон Федорович и Кныш (рабочий совхоза «Заволочицы») — пробралась в глубокий тыл и обстреляла расположение штаба противника в совхозе «Заволочицы» Симоновичского сельского Совета. При преследовании скрылись в лесу. Тов. Потапенко в отряд явился, а Пинчук и Кныш неизвестно где делись.

Разведывательная работа

Отряд ежедневно вел разведывательную работу, особенно на территории Глусского района и в районах Старых Дорог, Любани, Осипович и Бобруйска, сведениями которого пользовались главным образом воинские части — отряд тов. Курмышева, кавалерийская группа тов. Бацколевича, полк Степанова и др. Количество сделанных разведок описать трудно, их было более 300, по несколько разведок в день. Не было дня без посылки в разведку.

Особенно проявили себя в разведке: Сташевский Константин — директор Глусского лесхоза, который сделал 20 разведок расположения огневых точек противника, был два раза обстрелян во время разведки, кроме этого тов. Сташевский как зам. начальника отряда проявлял инициативу в организации разведок и вылазок; Каминский Мина Никифорович был послан в разведку в Глуск на длительное время, где прожил более 10 дней во время пребывания там немцев, сообщал ценные сведения о действиях немцев в Глуске; Станкевич Константин Степанович сделал 27 разведок в тыл врага и дал ценные сведения о расположении частей противника и о действиях его по деревням; Голомако Иосиф Николаевич — бригадир колхоза — сделал более 30 разведок, главным образом расположения противника по деревням.

Работа по оказанию помощи частям Красной Армии

Оказание помощи войскам Красной Армии проводилось главным образом предоставлением проводников и разведчиков, которые по лесным тропинкам проводили воинские части, двигавшиеся в тыл противника для выполнения отдельных оперативных указаний и возвращавшиеся обратно в советский тыл.

Для прохода войскам кавалерии отрядом в одну ночь было построено 3 моста в дер. Холопеничи. Один мост приходилось строить под обстрелом самолета.

Тов. Скавыш Адам Яковлевич — помполит Рудобельской МТС — провел кавалерийскую дивизию на расстояние более 60 км. до мест Старые Дороги и вывел ее обратно к нашим войскам после того, как у нее иссякли боевые запасы. Дивизия выведена с малыми потерями по лесным тропинкам и удачно переправлена через р. Птичь вброд. Тов. Потапенко вывел вторую дивизию тоже удачно по лесам и отыскал брод через р. Птичь. Тт. Юркевич,

Варава Иван, Пинчук Марк и другие много раз являлись проводниками отдельных групп в разные направления. Они же были проводниками для связи с 241-й дивизией, находящейся в окружении в Осиповичском районе.

Более мелкие разведки по деревням Глусского района вели все члены партизанского отряда (по выявлению продвижения сил противника, о действиях его в деревнях). Они же выявляли настроение людей по колхозам.

Работа по преграждению путей для продвижения противника

Отряд много сделал по заграждению путей для продвижения противника. В дер. Холопеничи разобраны и спалены 3 моста, они же два раза и построены. Уничтожались тогда, когда противник появлялся, а строились тогда, когда нужно было переправлять наши воинские части. Один раз строили под обстрелом и два раза разбирали тоже под обстрелом.

16 июля после уничтожения мостов в Холопеничах не дали возможности переправиться более 100 немецким машинам, которые должны были выбирать другой путь для переправы. Два раза уничтожались мосты за Глуском по направлению Городка, в Крапивне и по направлению Макович. Уничтожали и строили мосты в дер. Баяново и Славковичи.

Секретарь Глусского РК КП(б)Б Коноваленок

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 94—97.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941), дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Аб'ява нямецка-фашысцкіх акупацыйных улад.

Для ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі ў раён прыбылі айнзаткаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатура, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы. Уся неабмежаваная ўлада належала нямецкім палявым і мясцовым камендантам.

Для больш эфектыўнага правядзення сваёй злачыннай палітыкі акупанты жадалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для прыдання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную так званую мясцовую ўладу — гарадскую і раённую ўправы на чале з бургамістрамі, на тэрыторыях былых сельсаветаў былі створаны валасныя ўправы, якія ўзначальвалі бургамістры, у кожную вёску прызначылі стараст.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы супраць партызан і падпольшчыкаў гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Гарнізоны з такой паліцыі былі ўстаноўлены амаль ва ўсіх буйных вёсках. Разам і пад кіраўніцтвам акупацыйных улад яны пачалі наводзіць «новы парадак». У раёне прайшлі масавыя вобыскі, арышты, расстрэлы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы «трэцяга рэйха» адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічна цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы і культуры беларускага народа. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — воз. Чырвонае на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стане на 4 снежня 1941). Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Часткі Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую, у тым ліку і Глушчыну, усходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

У.І.Лемяшонак.

* * *

Пасля адыходу з тэрыторыі Глускага раёна рэгулярных воінскіх часцей асобны Глускі партызанскі атрад пад камандаваннем М.С.Марціновіча ў верасні 1941 г., па сутнасці, спыніў свае дзеянні, бо частка партызан выйшла з воінскімі часцямі за лінію фронту, астатнія ўліліся ў атрад «Чырвоны Акцябр», які дзейнічаў у Акцябрскім раёне. Але барацьба не спынялася. Яе працягвалі групы воінаў, якія ўсё яшчэ прабіваліся на ўсход да сваіх, і патрыёты з ліку мясцовага насельніцтва.

Фашысты ўстанавілі ў раёне жорсткі акупацыйны рэжым. З аднаго боку, яны імкнуліся завуаліраваць гэта рознымі прапагандысцкімі заявамі накшталт таго, што немцы прыйшлі ў Савецкую краіну, каб выратаваць яе насельніцтва ад бальшавізму, даць людзям культуру і дабрабыт, а з другога — фашысцкі «новы парадак» усё больш яўна набываў рысы рэжыму рабаўніцтва і насілля, ваенна-паліцэйскага тэрору. Гітлераўцы праводзілі на захопленых тэрыторыях палітыку фізічнага знішчэння «непаўнацэнных» народаў. 17 чэрвеня 1941 г. Гітлер выдаў загад, які быў даведзены да ведама ў арміі за дзень да нападу Германіі на Савецкі Саюз. Фашысты здзекваліся, грабілі і забівалі ўсіх, хто трапляўся ім пад руку. Для знішчэння людзей яны стварылі цэлую сістэму канцэнтрацыйных лагераў. Вось некаторыя з іх, якія меліся ў Бабруйску, куды захопленае мірнае насельніцтва адпраўлялася з 2 перасыльных лагераў Глуска: дулаг № 130, шталаг № 373, афлаг XXI-A, філіялы гэтага лагера — ст. Татарка, ст. Ясень, ст. Бабруйск-Усходні, ст. Бабруйск-Заходні, ст. Цялуша; Бабруйскі працоўны лагер СД, Бабруйскае гета і інш.

Восенню 1941 г. па ўсёй Беларусі была праведзена акцыя па знішчэнні жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. У Глуску гэты

чорны дзень настаў 2 снежня. Было аб'яўлена, каб усе яўрэі сабраліся ў гарадскім парку для рэгістрацыі. Потым парк ачапілі з усіх бакоў аўтаматчыкі, адных пагрузілі ў машыны, іншых пагналі пешшу ў бок Мыслоцінскай гары. Тут фашысцкія ахвяры ўбачылі падрыхтаваныя ваеннапалоннымі велізарныя траншэі і ўсё зразумелі. Ваеннапалонных тут жа расстралялі. Падышла чарга да яўрэяў. Крыкі, плач, галашэнне — усё заглушалі незмаўкальныя чэргі аўтаматаў. У наступныя дні была сабрана новая партыя яўрэяў і расстраляна ў Глуску на тэрыторыі арцелі «Спатры».

Знішчалі яўрэяў некалькі дзён. Усяго за час фашысцкай акупацыі раёна загінула 1187 яўрэяў. Восенню 1943 г. і ў пачатку 1944 г. гітлераўцы паспрабавалі замесці сляды жорсткіх злачынстваў, спальваючы астанкі сваіх ахвяр і маскіруючы месцы пахаванняў.

Грубае насілле, створаны фашыстамі новы архіпелаг канцлагераў — лагераў смерці, гета, працоўных лагераў СД — страшэннай удушлівай сеткай ляглі на людзей. Весткі аб зверствах акупантаў даходзілі да мірных жыхароў. З'яўляючыся сведкамі тэрору над сваімі суайчыннікамі, яны ўспрымалі ўсё гэта як велізарнае псіхалагічнае выпрабаванне, прыніжэнне чалавечай годнасці. Расло незадавальненне, абурэнне, гнеў і пачуццё помсты за здзекі над людзьмі, якія перараслі ў супраціўленне ворагу.

Аперацыя «Бамберг»

«Бамберг» (Bamberg) — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызанскіх атрадаў «гарнізона Ф.І.Паўлоўскага» і цывільнага насельніцтва ў Акцябрскім, Глускім, Любанскім, Капаткевіцкім, Бабрускім раёнах 20 сакавіка — 4 красавіка 1942 г.

Праводзілася сіламі 3 пяхотных і 1 артылерыйскага палкоў, 2 асобных паліцэйскіх батальёнаў, кавалерыйскага эскадрона і 1 авіяэскадрыллі 51-й бамбардзіровачнай авіяэскадры «Эдэльвейс». 20 сакавіка карнікі выйшлі на зыходныя пазіцыі і пачалі суцэльнае блакіраванне Акцябрска-Любанскай партызанскай зоны. 31 сакавіка праціўнік пачаў канцэнтраванае наступленне-прачэсванне ў напрамку Рудобелка — Карпілаўка. З боку Глуска на паўднёвы ўсход праз в. Зубарэвічы (Глускі раён) у напрамку в. Воземля рухаўся 420-ы ландверны батальён, які ў вёсках Растаў, Ратміраў і чыгуначнай станцыі Ратмітравічы расстраляў і павесіў 68 жыхароў. З процілеглага боку на паўночны захад ад вёсак Савічы, Колкі, Лучыцы, Кашэвічы (Капаткевіцкі раён) 102-і славацкі полк пры падтрымцы 315-га паліцэйскага батальёна, пераадольваючы супраціўленне невялікіх партызанскіх атрадаў (баі за 2 км на поўнач ад в. Бубнаўка, на паўднёвы ўсход ад в. Парэчча, у раёне в. Карпілаўка), трымаў пад кантролем дарогу Кашэвічы — Глуск і чыгуначны ўчастак Кашэвічы — Рабкор.

У ходзе наступлення карнікі расстралялі 606 чалавек і, як мяркуецца, знішчылі пры прачэсванні і ўціхамірванні яшчэ 2000 чалавек. З захаду на ўсход з Любані праз Ямінск, Сялец, Загалле (Любанскі раён) і Забалацце ў напрамку Карпілаўкі рухаўся наперад 747-ы полк 707-й дывізіі вермахта, узмоцнены 102-м кавалерыйскім эскадронам. У першы дзень гітлераўцы расстралялі і павесілі каля 300 савецкіх грамадзян, у тым ліку жанчын, дзяцей і чырвонаармейцаў, якія не выйшлі з акружэння. З боку Парыч і в. Палессе (Парыцкі раён) у заходнім напрамку вёў прачэсванне і карна-грабежніцкія аперацыі 727-ы пяхотны полк, які прайшоў праз вёскі Раманішчы, Заазершчына да Воземлі і чыгункі (у тым ліку некалькі вёсак Парыцкага раёна) і расстраляў больш за 730 савецкіх грамадзян.

Усяго ў ходзе карнай аперацыі «Бамберг» гітлераўцы спалілі больш за 3600 жылых дамоў, расстралялі, павесілі і спалілі каля 5600 жыхароў, захапілі больш за 3000 галоў жывёлы, каля 200 т збожжа і фуражу. Ад рук карнікаў пацярпела амаль 80 вёсак...

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 56—57.

Полымя нянавісці і гневу

У канцы 1941 г. — пачатку 1942 г. на Глушчыне адначасова з арганізацыяй знішчальных груп і атрадаў ішоў актыўны працэс стварэння падпольных груп і арганізацый. У населеных пунктах раёна засталося нямала мужчын і юнакоў, каго не паспелі прызваць у армію, і многія мясцовыя патрыёты ўключыліся ў падпольную і партызанскую барацьбу. У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б ад 30 чэрвеня 1941 г. аб падрыхтоўцы да пераходу на падпольную работу партарганізацый раёнаў, якія знаходзіліся пад пагрозай фашысцкай акупацыі, і дырэктывай ЦК КП(б)Б ад 1 ліпеня 1941 г. партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага Палескі абком КП(б)Б накіраваў у Глускі раён для разгортвання падпольнай работы і партызанскага руху групу камуністаў: Пятра Раманавіча Чарнушына, Конана Фёдаравіча Пінчука, Усціна Мікітавіча Шваякова, Мікалая Барысавіча Храпко, Віктара Мітрафанавіча Багдановіча, Лявона Раманавіча Храпко і інш.

Абапіраючыся на мясцовых жыхароў Жалвінецкага сельсавета, П.Р.Чарнушын за кароткі час здолеў стварыць падпольную арганізацыю, якая пачала актыўна дзейнічаць ужо ў канцы 1941 г. У яе ўваходзілі падпольшчыкі Ф.Ц.Мішур, В.А.Чабан, М.І.Храпко, Я.Марголін, В.П.Бабіч, В.Л.Мішур і інш. Падпольныя арганізацыі былі створаны і дзейнічалі таксама ў Бярозаўскім, Каткаўскім і іншых сельсаветах.

Застаўшыся на акупіраванай тэрыторыі, камуніст, былы старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец» Апанас Мікалаевіч Тоўсцік не разгубіўся. Ён пачаў Вялікую Айчынную вайну самастойна, не чакаючы ўказанняў і цыркуляраў, а па абавязку свайго сумлення. Цэлымі днямі прападаў у лесе, збіраў тут зброю, надзейна яе хаваў, як кажуць, да пары да часу. І калі ў канцы лета з ім устанавіў сувязь упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па арганізацыі партызанскага руху Мікалай Барысавіч Храпко (да вайны ён працаваў галоўным бухгалтарам Рудабельскай і Глускай МТС і Тоўсцік добра ведаў яго), вакол Апанаса Мікалаевіча ўжо склалася патрыятычная падпольная група, у якую ўвайшлі яго сыны Мікалай і Аркадзь, камуністы, камсамольцы і іншыя патрыёты з вёсак Сцяпанаўка, Чыкілі, Старое Сяло: Антон Лазаравіч Кулік, Іван Вікенцьевіч Крэпскі, Іван Ігнатавіч Сысой і інш. Яны, як і іх важак, збіралі на месцах баёў зброю. Так патрыёты набылі 5 кулямётаў, 5 аўтаматаў, 40 вінтовак, шмат гранат і патронаў. Потым усё гэта перадалі партызанам.

У в. Крукаўшчына мясцовую моладзь згуртаваў для падпольнай работы Міхаіл Міхайлавіч Залескі, сакратар камсамольскай арганізацыі, настаўнік пачатковай школы. Падпольшчыкі збіралі зброю, звесткі для партызан, запісвалі праслуханыя па радыёпрыёмніку паведамленні аб становішчы на фронце, выпускалі і распаўсюджвалі лістоўкі, вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва. Пры зручных выпадках знішчалі фашыстаў і іх памагатых.

Пяцёра аднагодкаў з в. Клетнае і пас. Красны Георгій і Кацярына Акулічы, Аркадзь Яльніцкі, Георгій Казак і Мікалай Вайцяховіч стварылі падпольную патрыятычную групу, важаком якой стаў Георгій Казак.

Нелегальныя арганізацыі і групы дзейнічалі таксама ў Завалочыцах, Гарадку і іншых вёсках. Яны праводзілі вялікую агітацыйную работу сярод мясцовых жыхароў, рыхтавалі людзей да адкрытай узброенай партызанскай барацьбы — выхаду ў лес. Падпольная барацьба аб'яднала людзей розных нацыянальнасцей, узростаў, прафесій, партыйных і беспартыйных, мужчын і жанчын — усіх, каму былі дарагія свабода і незалежнасць роднай зямлі, хто гатовы быў аддаць за гэта нават жыццё. Іх падтрымлівала ўсё патрыятычна настроенае насельніцтва. Займалася вялікае полымя нянавісці і гневу.

Важную ролю ў развіцці ўсенароднага супраціўлення адыгралі ваеннаслужачыя Чырвонай Арміі, якія па розных прычынах апынуліся ў гэты час на Глушчыне. Некаторыя групы чырвонаармейцаў збіраліся перайсці лінію фронту і злучыцца з воінскімі часцямі. Але малаўзброеныя, знясіленыя ад бясконцых сутычак з фашыстамі байцы хутка зразумелі, што ажыццявіць свой намер ім зараз не пад сілу. Патрэбна ўзбройвацца і весці вайну з ворагам у яго тыле. Так на Глушчыне затрымаліся і па-

чалі дзейнічаць групы Ф.М.Анісімава, Дз.Ц.Гуляева, Б.М.Цыкункова, Г.М.Сталярова і інш. Ваеннаслужачыя з дапамогай мясцовых жыхароў збіралі вакол сябе патрыятычныя сілы, здабывалі зброю, перадавалі партызанам свае веды і баявыя навыкі, распрацоўвалі і ажыццяўлялі баявыя аперацыі. Яны, па сутнасці, сталі ядром, з дапамогай якога невялікія і раз'яднаныя спачатку баявыя групы перараслі ў моцныя, баяздольныя атрады. Так, ужо ў студзені — лютым 1942 г. на тэрыторыі Глускага раёна дзейнічалі партызанскія групы і атрады, якія ўзначальвалі А.Г.Балахонаў, У.М.Шваякоў, М.Б.Храпко, У.Ц.Шантар, Дз.Ц.Гуляеў, Б.М.Цыкункоў і інш. У сваю чаргу гэтыя атрады далі імпульс для арганізацыі новых партызанскіх фарміраванняў у Глускім і суседніх раёнах.

Партызанскі рух з'яўляўся грознай сілай для ворага. Верхаводы Германіі, развязваючы вайну з Савецкім Саюзам, яўна недаацанілі гэтага фактару і вымушаны былі прызнаць, што падавіць народнае супраціўленне толькі спецыяльнымі ваеннымі метадамі тут немагчыма. Начальнік штаба вярхоўнага камандавання Германіі фельдмаршал Кейтэль у загадзе ад 16 верасня 1941 г. прама прызнаваў, што з самага пачатку ваеннай кампаніі супраць савецкай Расіі ва ўсіх акупіраваных Германіяй абласцях узнік камуністычны паўстанцкі рух. Фельдмаршал падкрэсліваў, што рух носіць разнастайны характар, пачынаючы з прапагандысцкіх выступленняў і пакушэнняў на асобных ваеннаслужачых нямецкай арміі і заканчваючы адкрытымі мяцяжамі і арганізаванай партызанскай вайной.

Сам Гітлер у загадзе ад 6 верасня 1942 г. вымушаны быў прызнаць, што ўдзельнікі партызанскіх атрадаў на Усходзе вельмі небяспечныя і з'яўляюцца сур'ёзнай пагрозай камунікацыям, якія ідуць да фронту.

Кейтэль катэгарычна запатрабаваў у найкарацейшыя тэрміны пусціць у ход самыя крутыя меры, каб агнём і мячом падавіць выступленні партызан.

І праціўнік такія меры прымаў. Каб абясшкодзіць свае тылы, ён кінуў супраць партызан некалькі ахоўных, а таксама знятых з усходняга фронту дывізій і іншыя вайсковыя фарміраванні. Характар іх «баявых» дзеянняў вызначаўся правядзеннем шматлікіх карных аперацый супраць партызан і грамадзянскага насельніцтва. У першую чаргу знішчэнню падлягалі камуністы, камсамольцы, дэпутаты Саветаў і іншыя актывісты, мірныя жыхары, якія дапамагалі партызанам, вялі падпольную работу. Не без дапамогі здраднікаў пачаліся аблавы, вобыскі, арышты.

М.Б.Храпко.

І.М.Кулікоўскі.

А.Я.Жулега.

П.Р.Чарнушын.

За сувязь з партызанамі фашысцкімі катамі былі замучаны і знішчаны суддзя Глускага раёна Андрэй Васільевіч Грыневіч, урач райбальніцы Аляксандр Сцяпанавіч Забродскі, яго жонка Вольга Антонаўна з 93-гадовай маці Паўлінай Забела, сын Барыс, дачка Марыя. Фашысты павесілі ў Глуску камуністку-падпольшчыцу з Завалочыц Ганну Прахоцкую, падпольшчыкаў з в. Зелянковічы Адама Міхайлавіча Голуба, Станіслава Сямёнавіча Лукашэнку, расстралялі камсамольцаўпадпольшчыкаў з в. Клетнае Георгія Казака, Аркадзя Яльніцкага і Мікалая Вайцяховіча, партызанскую сувязную з Паршчахі Хрысціну Слезіну, яе аднавяскоў-

цаў Герасіма Канстанцінавіча Рыбака, Міхаіла Цімафеевіча Жлобіча, Канстанціна Іванавіча Рыбака і многіх іншых.

Доўгі час паспяхова дзейнічала падпольная арганізацыя ў в. Старое Сяло, якой кіраваў старшыня мясцовага калгаса Аляксей Сямёнавіч Чабан. У яе ўваходзілі Алёхна Архіп Іванавіч, Алёхна Кузьма Васільевіч, Алёхна Аляксей Сямёнавіч, Сысой Васіль Іванавіч. Падпольшчыкі падтрымлівалі пастаянную сувязь з камандзірам партызанскага атрада імя Шчорса У.М.Шваяковым, дапамагалі партызанам зброяй і ў значнай ступені харчаваннем, вывучалі настрой мужчын прызыўнога ўзросту з мэтай адпраўкі іх у партызанскія атрады. Аднак не ўбярагліся: здраднік выдаў падпольшчыкаў. Раніцай на Вялікдзень 1942 г. усе былі арыштаваны і пасля жорсткіх допытаў расстраляны.

Фашысцкія карнікі бязлітасна распраўляліся нават з тымі, хто не мог аказаць ім узброенага супраціўлення: старымі, жанчынамі, дзецьмі. Зімой 1942 г. яны ўчынілі масавыя расстрэлы мірных жыхароў у вёсках Бабровічы, Барбарова, Замасточча, Слабодка, Слаўкавічы... Немцы падпалілі в. Малінава, а ў Стражах і Зорцы разам з хатамі спалілі ў агні і іх гаспадароў. Зверскія расправы над насельніцтвам не былі самавольствам асобных воінскіх камандзіраў, а з'яўляліся часткай планамернага выканання злачыннай праграмы фашыстаў па знішчэнні савецкага народа.

Вясной 1942 г. супраць партызан была кінута кадравая франтавая дывізія, якая стаяла на адпачынку ў Бабруйску, і пры падтрымцы артылерыі, танкаў і авіяцыі яна павяла сапраўднае наступленне на Акцябрскі раён. Пачало сціскацца кальцо акружэння. Сілы былі занадта няроўныя, і савет камандзіраў атрадаў вырашыў баёў не прымаць, а вывесці атрады з акружэння і на новых месцах працягваць партызанскую вайну. У сувязі з гэтым некаторыя атрады лясных байцоў з Глушчыны перадыслацыраваліся ў іншыя раёны. Атрады У.М.Шваякова і М.Б.Храпко перайшлі ў раён глускіх вёсак Уюнішча і Крукаўшчына. Так што аперацыя ворага па знішчэнні партызан правалілася.

Дакументы сведчаць

З ДАВЕДКІ БЫЛОГА САКРАТАРА ГЛУСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б П.Р.ЧАРНУШЫНА АБ РАБОЦЕ РАЙКОМА

Глусский подпольный РК КП(б)Б по постановлению Полесского подпольного обкома КП(б)Б был создан в августе м-це 1943 г. в составе 5 членов: Жулего Анатолия Яковлевича, Чернушина Петра Романовича, Станкевича Владимира Адамовича, Куликовского Ивана Михайловича и Шумовского Станислава Францевича[1].

С первых дней оккупации по постановлению Полесского обкома КП(б)Б в район были направлены тт. Чернушин Петр Романович, Пинчук Конон Федорович, Шваяков Устин Никитич, Станкевич Владимир Адамович, Храпко Николай Борисович, Храпко Леон Романович и другие для организации партийной подпольной работы и партизанского движения.

Созданные подпольные партийные и комсомольские организации явились ядром развития партизанского движения.

Особенно активно действовали подпольные партийные организации Жалвинецкого с/совета, в состав которой входили тт. Чернушин Петр Романович, Мишур Федор Тимофеевич, Чабан Василий Антонович, Морголин Ефим, Храпко Марина Ивановна, Бабич Василий Павлович, Мишур Василий Леонович, Мишур Филимон Макарович и др. Козловичского с/с в составе тт. Гутковского, Боглая Ивана, Толстика Алексея Терентьевича, Толстика Петра Андреевича, Толстика Афанасия Николаевича, Толстика Николая Афанасьевича и др.;

[1]Глускі падпольны райком КП(б)Б быў створаны 4 жніўня 1943 г. Палескім падпольным абкомам КП(б)Б. Сакратаром райкома быў зацверджаны камісар партызанскага атрада імя В.І.Чапаева А.Я.Жулега. 15 лістапада 1943 г. Палескі падпольны абком КП(б)Б зацвердзіў сакратаром райкома Дз.Н.Удалога. У сакавіку 1944 г. Дз.Н.Удалы выбыў за лінію фронту. Сакратаром райкома стаў П.Р.Чарнушын (Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944: Краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1975. С.227—228). С.Ф.Шумоўскі з'яўляўся рэдактарам газеты «Сацыялістычная вёска» — орган Глускага падпольнага РК КП(б)Б і ў склад членаў райкома не ўваходзіў.

Березовского с/совета, Славковичского с/совета, Катковского с/совета и др.

В результате проводимой работы подпольными партийными и комсомольскими организациями в январе — феврале 1942 г. на территории района уже действовали партизанские отряды, в которых насчитывалось по 150—200 человек. Среди них: отряд Балахонова (командир отряда т. Балахонов Александр Гаврилович[1]). Позже этот отряд назывался «За Советскую Родину», где в последнее время командиром был тов. Бабич Василий Павлович, отряд Шваякова (командир отряда т. Шваяков Устин Никитич). Позже отряд именовался имени Щорса, командир отр. т. Никифоров Василий Павлович; отряды тт. Гуляева, Храпко и др.

На базе этих отрядов были созданы бригады: бригада № 100 Полесского соединения — командир бригады т. Куликовский Иван Михайлович, комиссар т. Удалой Дмитрий Нефедович, в последнее время Чернушин Петр Романович, нач. штаба т. Игуменов Петр Егорович; бригада им. Пархоменко — комбриг Львов Алексей Васильевич, комиссар т. Храпко Николай Борисович, нач. штаба т. Романов Яков Семенович. На территории Славковичского с/совета дислоцировались бригады тт. Гуляева, Розова и др.

Со времени создания Глусского подпольного РК КП(б)Б в ведении последнего была бригада № 100 Полесского соединения...

В состав бригады входило 1700 человек, из них членов и кандидатов ВКП(б) — 211 человек, комсомольцев — 319 человек.

Партийно-политическая работа.

Систематически проводились заседания райкома КП(б)Б, на которых обсуждались вопросы внутрипартийной, массово-политической работы и боевой деятельности отрядов и бригады.

Райком КП(б)Б имел свой печатный орган — районную подпольную газету. «Сацыялістычная вёска», редактор т. Шумовский Станислав Францевич, которая систематически выпускалась (2 раза в неделю), распространялась среди партизанских отрядов и населения района. Одновременно в отрядах выпускались боевые листки и стенные газеты, листовки.

В деревнях силами коммунистов, комсомольцев и агитаторов проводились собрания, распространялись сводки Совинформбюро, листовки, газеты и другая литература.

Под руководством РК КП (б)Б работал подпольный РК ЛКСМБ (секретари Г.К.Тычина (8.1941—14.9.1944), А.М.Макейчик (14.9.1943—28.6.1944).

Велась работа по разложению вражеских гарнизонов (Глусска, дер. Клетков, дер. Болашевичи и др.).

Бригада в целом и отряды в отдельности участвовали в ряде боев, засадах, в рельсовой войне, в подрыве железнодорожных и шоссейных мостов, эшелонов, техники и т.д.

С частями Советской Армии бригада в полном составе соединилась в ночь с 24 на 25 июня 1944 года на территории Катковского с/совета Глусского района.

При соединении Советской Армии была оказана большая помощь в сохранении переправ через р. Птичь (Холопеничи—Октябрь).

Бывший секретарь Глусского подпольного РК КП(б)Б

П. Чернушин

24 декабря 1948 года

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4392. Воп.1. Спр. 1. Л. 22—23.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

З ДАВЕДКІ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГЛУСКІМ РАЁНЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

С ноября 1941 г. в деревне Чикили действовала партийно-комсомольская подпольная группа. Организатором ее был бывший председатель местного колхоза, кандидат в члены партии Толстик Афанасий Николаевич. В группу входили коммунисты, комсомольцы и молодежь деревни Чикили и окружающих населенных пунктов.

Подпольная группа вела активную деятельность по разъяснению положения дел на фронтах, проводила работу по разложению полицейского гарнизона в дер. Козловичи, в

[1]А.Г.Балахонаў загінуў у красавіку 1942 г.

результате чего все полицейские с оружием в начале 1942 г. перешли в партизанские отряды тт. Храпко Н.Б., Шваякова У.Н. Члены подпольной группы собирали оружие, патроны и передавали в партизанские отряды. Кроме того, в отряды направлялись десятки бойцов и командиров, оставшихся в окружении, бежавших из плена г. Бобруйска и других мест. Всего в партизанские отряды было направлено около 60 человек молодежи, передано 5 пулеметов, до 40 винтовок, 5 автоматов, много боеприпасов.

Активное участие в деятельности подпольной группы принимали сыновья Толстика Афанасия Николаевича Николай и Аркадий, Кулик Антон Лазаревич, Крепский Иван Викентьевич, Сысой Иван Игнатьевич и другие. На квартире у Кулика Антона был радиоприемник, по которому принимались из Москвы сводки о событиях на фронтах и распространялись через листовки в деревне Чикили и соседних деревнях.

В конце 1941 г. патриоты собрались на совещание, где обсуждали вопрос о помощи фронту. Выступил Толстик Афанасий Николаевич, который с большой радостью сообщил последние новости о положении на фронте, о том, что враг под Москвой остановлен и разгромлен. Здесь же была показана газета «Правда» и несколько листовок, сброшенных с самолета. Было принято предложение продолжать собирать разведданные о полицейских гарнизонах, добывать оружие, предупреждать население о карательных операциях немецко-фашистских захватчиков, прятать зерно, скот.

Весной 1942 г. многие подпольщики ушли в партизанские отряды. Деревня Чикили стала входить в партизанскую зону. Здесь проходили частые бои с карательными отрядами. В марте 1943 г. часть подпольщиков была схвачена немцами и расстреляна. Но на территории Козловичского сельсовета продолжало действовать подполье, собирались и проводились собрания по населенным пунктам и сессии сельсовета. На первой сессии в мае 1942 г. председателем сельсовета был избран Толстик Афанасий Николаевич.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2952. Воп. 35. Спр. 10. Л. 10—11.

Непахісныя ў барацьбе

З успамінаў М.М.Залескага, былога сакратара падпольнай камсамольскай арганізацыі в. Крукаўшчына

У 1939 г., пасля заканчэння педкурсаў у Глуску, мяне накіравалі ў в. Уюнішча настаўнікам пачатковай школы. У той час я быў ужо камсамольцам, і моладзь Крукаўшчыны абрала мяне сакратаром камсамольскай арганізацыі.

22 чэрвеня 1941 г. у Глуску у парку адпачынку праходзілі спартыўныя спаборніцтвы дапрызыўнай моладзі, у якіх удзельнічаў і я. Прыйшла чарга выходзіць мне на старт. Прыбягаю да фінішу, але мяне ніхто не сустракае. Усе чамусьці спяшаліся на вуліцу, да гучнагаварыцеля. Калі падбег да натоўпу, пачуў галасы: «Вайна. Напалі фашысты».

У райкоме камсамола ніхто нічога не мог сказаць, што будзем рабіць далей. Каля райваенкамата стыхійна ўзнік мітынг, чуліся воклічы: «Хутчэй на фронт! Бязлітасна біць фашыстаў». А высока ў небе групамі праляталі самалёты.

Пад вечар мы прыйшлі дамоў. У вёсцы пра страшную навіну ніхто яшчэ не ведаў. Ноччу ў лесе з уключанымі фарамі працавалі леспрамгасаўскія машыны. Пралятаючыя нямецкія самалёты скінулі сюды некалькі запальных бомбаў.

Раніцою мяне з вінтоўкай-драбавіком выклікалі ў сельсавет. Там сабраліся з такімі ж дубальтоўкамі паляўнічыя. Старшыня Казловіцкага сельскага Савета Мікалай Аляксандравіч Мукамолаў паставіў задачу: прачасаць лес, над якім ноччу ляталі нямецкія самалёты, каб выявіць, ці не скінулі парашутыстаў-дыверсантаў. Праблукалі мы па лесе амаль цэлы дзень і знайшлі толькі некалькі абгарэлых частак ад запальных бомбаў.

Назаўтра ўсёй вёскай праводзілі ў ваенкамат першую партыю мабілізаваных вяскоўцаў. А яшчэ праз дзень апоўдні ўздрыганулася ўсё наваколле: у Бабруйскай крэпасці ўзарвалі парахавы склад. Нямецкія войскі набліжаліся. Сельскія актывісты вырашылі рухацца на ўсход, у напрамку Парыч для злучэння з адыходзячымі часцямі Чырвонай Арміі. Частка людзей засталася для падпольнай работы. Мне і фельчару з в. Чыкілі Івану Вікенцьевічу Крэпскаму пакінулі сельсаветаўскі радыёпры-

ёмнік. Потым я наведваў фельчара, мы перапісвалі зводкі Саўінфармбюро і распаўсюджвалі іх сярод аднавяскоўцаў.

Неяк праз нашу вёску прайшла на ўсход група чырвонаармейцаў. Яе камандзір распытаў мяне пра камсамольскія справы і пакінуў для нас газету «Правда» ад 3 ліпеня са зваротам Сталіна да савецкага народа. Гэты зварот мы прачыталі на першым камсамольскім сходзе і пачалі, дзе толькі можна, збіраць зброю і хаваць яе.

А між тым фашысты ўсталёўвалі ў раёне сваю акупацыйную ўладу. У Глуску пачала дзейнічаць камендатура, быў назначаны бургамістр, са здраднікаў і былых злачынцаў, якія прапанавалі свае паслугі, стваралі паліцыю. Усталёўваўся «новы парадак», за любое, нават дробязнае непадпарадкаванне акупацыйным уладам жыхарам раёна пагражала смерць. Ва ўсіх населеных пунктах на хатах, на грамадскіх пабудовах стракацелі загады нямецкага камандавання: за пераапрананне чырвонаармейцаў і камандзіраў — смерць! За захоўванне зброі — смерць! За ўтойванне радыёпрыемнікаў ад нямецкіх улад — смерць! Хутка ў Казловічах з'явіліся паліцаі і бургамістр, тут быў створаны гарнізон. Хадзіць у Чыкілі да Івана Вікенцьевіча стала цяжэй, прыходзілася абыходзіць Казловічы бокам.

Але мы з Крэпскім не спынялі прыём зводак Саўінфармбюро, а камсамольцы разносілі іх па вёсках. Асабліва актыўна дапамагалі браты Рыгор і Віктар, Іван Сінкевіч, Антаніна Паўлава. Яна прыйшла пехатою з-пад Брэста, дзе працавала настаўніцай, муж — камандзір пагранічнай заставы, загінуў у першых баях з ворагам. Антаніна адразу ж далучылася да нас, актыўна ўключылася ў падпольную работу. З нашымі лістоўкамі і зводкамі трапляла нават пад Бабруйск, дзе ў в. Емяльянаў Мост жылі яе сваякі. Аднойчы ў лютым 1942 г. Антаніна вярталася адтуль дамоў і ў адной з вёсак убачыла прывязанага да плоту каня. У санях ляжалі тры вінтоўкі, кажух, белыя паліцэйскія павязкі, а з хаты несліся гучныя п'яныя галасы. Толькі адну хвіліну раздумвала Антаніна. І вось яна ўжо імчыць па саннай дарозе, вёска засталася далёка ззаду. Так наш тайнік папоўніўся яшчэ трымя вінтоўкамі.

Вярнуўся ў в. Доўгі Лес Станіслаў

М.М.Залескі.

В.М.Залескі.

Р.М.Залескі.

А.В.Паўлава.

І.М.Сінкевіч.

Паўлавіч Вішнеўскі. Аэрадром, дзе ён служыў, немцы разбамбілі. Калі Станіслаў дабіраўся дамоў, па дарозе яго схапілі паліцаі. Атрымаўшы загад расстраляць затрыманага, адзін з іх павёў Станіслава за вёску, даў у рукі рыдлёўку і загадаў капаць магілу. Улучыўшы зручны момант, Станіслаў паласнуў рыдлёўкай па галаве паліцая і, захапіўшы яго вінтоўку, глухімі сцежкамі падаўся дамоў.

Цяпер у нашай арганізацыі налічвалася дзесяць падпольшчыкаў. Гэта Бачынскі

Іван Адамавіч, Вішнеўскі Станіслаў Паўлавіч, Залескі Міхаіл Міхайлавіч, Залескі Рыгор Міхайлавіч, Залескі Віктар Міхайлавіч, Корбут Рыгор Іванавіч, Паўлава Антаніна Васільеўна, Сінкевіч Іван Мікалаевіч, Хацько Мікалай Канстанцінавіч і Хацько Вольга Канстанцінаўна.

У пачатку восені з намі звязаўся ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б Мікалай Барысавіч Храпко. Ад яго мы даведаліся, што ў раёне ствараюцца партызанскія групы, якія разгортваюць узброеную барацьбу з акупантамі. М.Б.Храпко станоўча адазваўся аб нашай рабоце, сказаў, што падпольшчыкі нашай арганізацыі — гэта баявы рэзерв партызанскага атрада, які ён зараз стварае, што ён будзе падтрымліваць з намі сувязь і вызначаць задачы. А пакуль патрэбна больш расказваць людзям аб сапраўдным становішчы на фронце, выкрываць хлуслівую фашысцкую прапаганду. Мы былі ўзрушаны такой ацэнкай нашай дзейнасці, значыць, мы на правільным шляху. Але тут, як на грэх, перастаў працаваць наш радыёприёмнік. Як быць далей?

Падпольшчыцы Вользе Хацько пашанцавала: праз сваякоў у Глуску яна адшукала радыёприёмнік. Але як яго вывезці з райцэнтра, калі вакол немцы і паліцаі?

Дапамог нам былы старшыня калгаса Скіндзер, якому немцы загадалі даставіць у Глуск дзве скрыні бульбы. Іван Бачынскі і я падладзіліся да Скіндзера ў памочнікі. Нарэшце бульба ссыпана, выпісаны квітанцыі, падводы накіраваліся ў цэнтр Глуска. Каля Дома культуры нас сустрэла Вольга з сябрамі. Яны непрыкметна паклалі прыёмнік мне ў скрыню, і мы паехалі назад.

Так мы зноў сталі слухаць Маскву. Неўзабаве нашай радасці не было межаў: Чырвоная Армія разграміла ворага пад Масквой і адкінула яго ад сцен сталіцы больш чым на 300 кіламетраў. Вызвалены Маскоўская і Тульская вобласці, дзесяткі гарадоў, сотні вёсак гэтых і іншых абласцей. Аб гэтым жыхарам суседніх вёсак паведамілі нашы лістоўкі.

У пачатку лютага 1942 г. з намі звязаліся партызаны з атрада М.Б.Храпко, які знаходзіўся ў в. Колбік Акцябрскага раёна. У атрад мы перадалі 1 аўтамат, 12 вінтовак, 28 гранат, шмат патронаў, рэвальвер.

Мне доўга карцела пабываць у в. Глебава Рудня Бабруйскага раёна, дзе жыла мая цётка. Нарэшце такі выпадак здарыўся. Тут удалося сустрэцца з мясцовай моладдзю. З гутаркі даведаўся, што хлопцы і дзяўчаты з вёскі сабралі многа зброі і шукаюць партызан. Я расказаў ім пра атрад Храпко, абяцаў перагаварыць з імі і паведаміць аб усім у Глебаву Рудню. Адсюль камсамольцы-падпольшчыкі перадалі ў партызанскі атрад шэсць вінтовак, тры скрынкі патронаў і шэсць ручных гранат. А ў сакавіку Віктар, Гена і Галя Барысевічы, Лёня Паралескі, Цэзар Драпей і яшчэ некалькі падпольшчыкаў сталі партызанамі суседняга атрада. Нам жа зрабіць гэта пакуль не дазвалялі. «Яўка ў атрад толькі па выкліку!» — папярэдзіў мяне камандзір атрада. М.Б.Храпко растлумачыў, што дае нам новае даручэнне: прымаць у Крукаўшчыне сувязных ад падпольшчыкаў з Бабруйска, Глуска, Брожы. Данясенні, што паступалі ад іх, перадаваліся ў штаб атрада. Многіх, хто да мяне прыходзіў на сустрэчу, нават не ведаў прозвішчаў.

У чэрвені наша падпольная арганізацыя амаль поўнасцю ўлілася ў партызанскія атрады Храпко і Шваякова. Сакратаром замест мяне засталася Антаніна Паўлава.

Нескароныя

Нянавісць мясцовага насельніцтва нямецкія захопнікі адчулі з першых жа дзён свайго знаходжання ў в. Катка. Кінутай гранатай быў знішчаны легкавы аўтамабіль, у якім ехалі фашысцкія афіцэры, чатыры з іх былі забіты, а шафёр паранены. Ворагам удалося схапіць смельчака. Ім аказаўся камсамолец Казік Галіцкі, выхаванец дзіцячага дома, які жыў у пас. Пціч і працаваў на спіртзаводзе. Але фашысты так і не даведаліся, хто кіраваў яго дзеяннямі, чые заданні ён выконваў. Казіка павесілі.

А неўзабаве ў акно нямецкай камендатуры, якая размяшчалася на тэрыторыі Халопеніцкага спіртзавода, зноў паляцела граната. Яна, праўда, не ўзарвалася, але ворагі пераканаліся, што Казік быў не адзін.

Яны пачалі шукаць тых, хто асмеліўся

ўзняць на іх руку. Фашысты схапілі камсамольцаў Мікалая Шчэкала і Мікалая Мурэнку. Яны вынеслі неверагодныя здзекі і катаванні, але нічога не сказалі.

На дапамогу акупантам прыйшлі здраднікі. Яны падказалі, што ў вёсцы жыў камуніст Іосіф Іванавіч Мышак. Пры з'яўленні немцаў ён знік з вёскі са сваімі сынамі Міхаілам і Уладзімірам. Разам з іншымі жыхарамі яны стварылі знішчальную групу. Аднойчы ў час прыходу народных мсціўцаў у вёску ворагам удалося іх схапіць.

Арыштаваных доўга дапытвалі, але ніхто не выдаў Мышака. Некаторыя з іх, напрыклад, былы бухгалтар спіртзавода Фёдар Бялугін, ведалі, што Мышак камуніст, але не выдалі яго.

Тады фашысты заявілі, што за гэта будзе расстраляна група жыхароў вёскі. Мышак зразумеў, што фашысты пойдуць на такое, іх словы не проста пагроза, што за яго могуць загінуць ні ў чым не вінаватыя людзі, і заявіў каменданту:

— Я член партыі бальшавікоў з 1917 года.

Іх вывелі на расстрэл. Перад гэтым фашысты сагналі на месца пакарання амаль усіх жыхароў вёскі. Іосіф Мышак звярнуўся да каменданта, каб яму дазволілі сказаць некалькі слоў. Фашысты ўсміхаліся, прадчуваючы пацеху: маўляў, хай гаворыць.

— Людзі, — разнёсся над натоўпам голас Іосіфа Мышака. — Праз некалькі мінут мы загінем ад рук гэтых вылюдкаў.

Казік Галіцкі.

І.І.Мышак.

Але не пра гэта я хачу вам сказаць... Фашыстам не ўдалося захапіць нашу краіну, бо з усіх яе куткоў на барацьбу з ворагам узнімаюцца тысячы, мільёны такіх, як вы. Поспехі фашыстаў — гэта часовая з'ява. Пройдзе час, і савецкія людзі пакараюць тых, хто сее смерць на нашай зямлі. Смялей бярыцеся за зброю, і перамога прыйдзе хутчэй.

Немцы не разумелі, што гаварыў камуніст, і далі закончыць яму сваю думку. А ён працягваў:

— Нас расстраляюць, але мы не адны, нас мільёны барацьбітоў. І яны адпомсцяць за ўсе пакуты нашага народа і за нас...

Горда памерлі патрыёты, сярод якіх быў і сын Мышака — Міхаіл. Жыхары Каткі не забылі загінуўшых герояў. У цэнтры вёскі на брацкай магіле ўзвышаецца помнік.

Ц.С.Яльчык.

Падпольшчыкі з Завалочыц

У канцы 1941 г. — пачатку 1942 г. у Завалочыцах пачала дзейнічаць падпольная антыфашысцкая група, створаная трактарысткай, маладой камуністкай Ганнай Прахоцкай. Яшчэ ў першыя месяцы вайны разам з сяброўкамі яна выратавала жыццё многім байцам і афіцэрам Чырвонай Арміі. Патрыёткі хавалі іх ад акупантаў, аказвалі пасільную медыцынскую дапамогу, рызыкуючы сваім жыццём. Бліжэйшымі памочнікамі Прахоцкай сталі Вольга і Аляксандр Кругловы, Мікалай Кавалеўскі, сын Паўлік... У навакольных лясах і балотах яны збіралі зброю, чысцілі яе, змазвалі і хавалі, каб перадаць партызанам.

Ганна і яе сябры распаўсюджвалі сярод мясцовых жыхароў звесткі з паведамленняў Саўінфармбюро, лістоўкі, што даходзілі з Бабруйска і ў іх вёску. А галоўнае — у размовах з аднавяскоўцамі яны выказвалі цвёрдую ўпэўненасць, што адступленне нашай арміі часовае, што рана ці позна прыйдзе перамога. Гэта ўзнімала настрой у людзей, клікала на барацьбу з акупантамі.

Як і іншым жыхарам вёскі, Ганне Прахоцкай і Вользе Кругловай фашысты даручылі штодзённую ўборку воінскага склада. У адным з яго адсекаў знаходзіліся боепрыпасы. Жанчыны, даведаўшыся аб гэтым, сталі праяўляць у рабоце старан-

Г.М.Прахоцкая.

В.І.Круглова.

насць: патрэбна было заваяваць поўнае давер'е гітлераўцаў. Гэта ім хутка ўдалося. Старанныя, працалюбівыя прыбіральшчыцы не выклікалі ніякай падазронасці ў немцаў. Праз некаторы час Ганна і Вольга сталі, па сутнасці, паўнапраўнымі гаспадынямі склада.

Вось яны — патроны... Россыпам, у драўляных і цынкавых скрынках.

Ганна сказала:

— Патроны патрэбна вынесці.

— Ды што ты! — спалохана пляснула рукамі Вольга. — Іх жа тут незлічоная колькасць! Ды і як вынесеш столькі?

Праз некалькі дзён сяброўкі вырашылі ажыццявіць даволі рызыкоўны план. Разлічвалі на цягу гітлераўскіх салдат да спіртнога. Хутка Ганна і Вольга ўпэўніліся ў тым, што «рус шнапс» дзейнічае безадказна, надоўга знімаючы ахову ад варот склада. Спачатку сяброўкі выносілі патроны пад сукенкамі, у спецыяльна пашытых мяшочках. Затым пасмялелі: сталі прыходзіць на склад з сумкамі і хавалі ў іх па цэлай цынкавай скрынцы. Ведалі жанчыны, што іх чакае ў выпадку, калі фашысты зловяць з патронамі. Іх лёс неадкладна быў бы вырашаны, але жаданне зрабіць хоць што-небудзь карыснае, каб дапамагчы сваім на вайне, было такім велізарным, што яны пагарджалі небяспекай. Патроны затым былі перададзены ў партызанскі атрад імя Варашылава.

І ўсё-такі фашыстам удалося схапіць Прахоцкую, калі яна, здабыўшы для партызан каштоўныя звесткі, вярталася са Старога Сяла. Пасля тыдня допытаў, катаванняў, так нічога і не дабіўшыся ад яе, фашысты вынеслі Прахоцкай смяротны прыгавор.

У лютым 1943 г. партызанскія атрады У.К.Якавенкі і У.М.Шваякова, зрабіўшы засаду каля в. Старое Сяло, ушчэнт разбілі карны атрад глускага гарнізона колькасцю каля двухсот чалавек. Так яны адпомсцілі за смерць патрыёткі.

В.В.Круглова.

Ім не было і васемнаццаці

Кім бы сталі яны, хлапчукі ваеннага 1941-га? Хто ведае, магчыма, былі б яны капітанамі далёкіх плаванняў, лётчыкамі, настаўнікамі ці хлебаробамі... Светлыя юнацкія мары-летуценні абарвала вайна. Георгію Казаку і Аркадзю Яльніцкаму не было і васемнаццаці, калі ім прыйшлося ахвяраваць жыццём.

У Чырвоную Армію хлопцаў не ўзялі, сказалі, што занадта маладыя. Але яны не маглі бяздзейнічаць і шукалі свае спосабы барацьбы з акупантамі. Што ж, калі змагацца, то не голымі рукамі. Аркадзь і Жора сталі збіраць у лесе зброю, патроны. Усё гэта чысцілі, змазвалі і хавалі ў тайніках. У размовах паміж сабой не раз абмяркоўвалі, як знойдуць партызан і разам з імі стануць граміць фашыстаў.

У невялікай вёсцы, дзе ўсе на віду, не было тайнай тое, што Жора Казак камсамолец і больш таго — узначальваў у свой час школьную камсамольскую арганізацыю глускай СШ № 1. Сваіх адносін да нямецка-фашысцкіх акупантаў ён і яго сябар Аркадзь Яльніцкі таксама не таілі. Таму вакол іх паступова склалася невялікая патрыятычная група з ліку знаёмых хлопцаў і дзяўчат. У яе ўвайшлі Георгій Акуліч, яго сястра Каця і Мікалай Вайцяховіч. За старшага выбралі Георгія Казака.

Аднойчы ўся група сабралася ў Георгія Акуліча ў пас. Чырвоны. Бацька яго Дзмітрый Ігнатавіч падтрымліваў сувязь з партызанамі і малоў муку, рабіў крупы, і ўсё гэта дастаўлялася ў атрад Усціна Шваякова. Тут, у доме старога Акуліча, і адбылося знаёмства камсамольцаў з пасланцом партызанскага атрада Аляксандрам Іосіфавічам Мілевічам, які пазней стаў камісарам.

— Пойдзем да вас біць фашыстаў! — загарэліся вочы ў Георгія Казака і Аркадзя Яльніцкага.

Але Мілевіч выказаў зусім іншую думку: заставацца дома, каб працягваць збіраць для партызан зброю, звесткі аб узбраенні і колькасці варожых войскаў, весці сярод насельніцтва растлумачальную работу.

— Заданне цяжкае і адказнае, — працягваў А.І.Мілевіч, — і хто не ўпэўнены ў сабе, скажыце аб гэтым зараз жа.

Але жаданне дапамагаць партызанам было вышэй за іншыя пачуцці. Ніхто, вядома, не адмаўляўся. Падлічылі сабраныя трафеі. Аказалася, што камсамольцы схавалі 2 кулямёты, 4 вінтоўкі, 2 скрынкі патронаў і некалькі гранат. А.І.Мілевіч пайшоў у атрад не з пустымі рукамі.

Праз некаторы час Георгій Казак зноў сустрэўся з Мілевічам, але на гэты раз ужо ў сваёй хаце. Партызанам была адпраўлена новая партыя зброі. Прыходзілі новыя сувязныя, і кожны раз вярталіся яны ў лес з боепрыпасамі.

Магчыма, група не захоўвала патрэбнай канспірацыі, бо нечакана здарылася бяда. У адзін з лютаўскіх дзён 1942 г. неяк у в. Клетнае прыехала група людзей, якія назваліся партызанамі. Незнаёмцы хадзілі па хатах і агітавалі ісці ў партызаны. Дайшла чарга і да Мікалая Вайцяховіча. Не паспеў Мікалай апамятацца, як яго рукі былі ў момант скручаны за спіной, а «лагодныя партызаны» ператварыліся ў паліцэйскіх.

У пас. Чырвоны былі арыштаваны Георгій Казак і Аркадзь Яльніцкі. Патрыётаў адвезлі ў Глуск у гестапа, дзе доўга катавалі, але нічога так і не дабіліся.

Г.Дз.Акуліч.

Г.Дз.Казак.

Зімой цямнее рана, аднак у лютым ужо дзень павялічваў, і ў чатыры гадзіны дня, калі Георгія Казака і Аркадзя Яльніцкага вялі на расстрэл, было яшчэ відна. Босыя, у парванай адзежы, што ледзь прыкрывала цела, яны нетаропка ступалі па снезе. Георгій падтрымліваў Аркадзя, які ўжо не мог ісці сам. Сведкамі гэтай жудаснай карціны былі многія жыхары Глуска. Якую мэту праследавалі фашысты, калі вялі хлопцаў глускімі вуліцамі да могілак, адмовіўшыся ад звычайнага спосабу дастаўкі сваіх ахвяр да месца пакарання, было няцяжка здагадацца. Фашысты як бы папярэджвалі, што так будзе з кожным, хто паспрабуе дапамагаць партызанам.

Кім бы яны сталі, падлеткі цяжкіх гадоў вайны? Хто ведае, але яны былі сапраўднымі патрыётамі і памерлі, як героі.

Т.А.Матусевіч.

Дакументы сведчаць

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЦШПР АБ АДНАЎЛЕННІ ПАРТЫЗАНАМІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў РАЁНАХ І НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ БЕЛАРУСІ І ЗНІШЧЭННІ ІМІ ЖЫВОЙ СІЛЫ І ТЭХНІКІ ПРАЦІЎНІКА Ў МАІ — ЧЭРВЕНІ 1942 г.

16 чэрвеня 1942 г.

... Партизанские отряды, действующие в районах Глуска, Любани, Октябрьского и Копаткевичей, на 13 июня 1942 года освободили от оккупантов 418 населенных пунктов, установив в них Советскую власть. Партизанами уничтожено 3 карательных отряда противника.

Отряды Гуляева, Розова, Патрина и Лукашевича, действуя совместно в районе Глуска, Любани, Копаткевичей, 15 мая 1942 г. внезапно напали на карательный отряд противника, истребив в бою 3 офицера и 72 солдата. Отряд Гуляева 22 мая 1942 г. вел бой с противником, истребив 4 офицера и 37 (рядовых) гитлеровцев. Отрядом Розова 10 июня 1942 г. по дороге Любань—Глуск уничтожена 1 штабная автомашина. В операции истреблено: 1 генерал, 10 офицеров и 4 солдата противника. Захвачено 2 пулемета, несколько десятков винтовок и штабные документы...

Отряд Храпко Глусского района, ведя отдельные бои, истребил 58 фашистов. [В результате] организованного крушения ж.-д. эшелона с боеприпасами и живой силой противника в 68 вагонов 8 мая 1942 года на участке ж.д. Жлобин—Мозырь убито 90 фашистов и сожжен 1 ж.-д. состав противника.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941— июль 1944):Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 186—187.

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА У.Ц.ШАНТАРА ШТАБУ ЗЛУЧЭННЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ МІНСКАЙ І ПАЛЕСКАЙ АБЛАСЦЕЙ АБ АРГАНІЗАЦЫІ АТРАДА І ЯГО БАЯВЫХ АПЕРАЦЫЯХ У 1942 г.

Не раней 1 студзеня 1943 г.

Партизанский отряд организовался в октябре месяце 1941 г. в дер. Холопеничи Катковского сельского Совета. Организатор отряда Шантар В.Т.

Численность членов отряда: на 1 января 1942 г. насчитывалось 35 чел., на 1 февраля 1942 г. насчитывалось в отряде 112 чел. В связи с отходом членов отряда для организации новых отрядов и по другим причинам на 1 января 1943 г. насчитывается членов отряда 81 чел., из них коммунистов — 8 чел., комсомольцев — 13 чел.

БОЕВЫЕ ДЕЙСТВИЯ ОТРЯДА С НАЧАЛА ЕГО ОРГАНИЗАЦИ И ДО 1 ЯНВАРЯ 1943 г.

В ноябре и декабре месяцах 1941 г. проводились работы по раздаче общественного имущества колхозникам из колхозов, вылавливании и уничтожении ставленников германского фашизма на территории Катковского и Клетненского сельсоветов.

За 1942 г.

... 3. 5 февраля 1942 г. пользуясь полученными сведениями от связного нашего отряда, подпольно работавшего в г. Бобруйске, что подготовлен немцами и полицией поход для борьбы с партизанами Катковского сельсовета, где и находился наш отряд, мы в тот же день организовали засаду на движущуюся большую группу немцев и полиции. Как было установлено, их было 400 чел. В результате завязался бой с далеко не равными силами — нас было в то время в засаде 70 чел. Во время боя с противником на помощь нам прибыла по вызову группа бойцов отряда тов. Храпко. Бой закончился победой над немцами. На поле боя в дер. Заракуша оказалось убитыми до 50 чел. и ранено до 70 чел. немцев. Захвачены трофеи; несколько винтовок, кухня и много патронов, а также на поле боя осталось убито 18 лошадей из немецкого обоза. А потом, как стало известно отряду, оставшиеся немцы по прибытии в Глуск после боя расстреляли до 30 полицейских, якобы удравших с поля боя...

5. В начале марта 1942 г. наш отряд вместе с другими отрядами партизан участвовал в бою с большой группой немцев в д. Барборов. Было убито 7 немцев и несколько ранено, захвачено 7 подвод немецкого обоза с продовольствием...

Командир отряда Шантар
Комиссар отряда Пинчук

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 223. Л. 3—5.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ДЗ.Ц.ГУЛЯЕВА АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ ПАРТЫЗАНСКАЙ ГРУПЫ Е.Т.ХАЎКІНА (ПАЗНЕЙ АТРАДА ДЗ.Ц.ГУЛЯЕВА) У МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ З 15 ЛІПЕНЯ 1941 г. ПА 1 СТУДЗЕНЯ 1943 г.

5 студзеня 1943 г.

1. Отряд зародился 15 июля 1941 г. из группы тов. Хавкина в количестве 8 чел., вышедших из немецкого окружения. Группа через небольшой промежуток времени выросла до 19 чел.

... 5 ноября 1941 г. в районе нашего расположения Станьково появился немецкий карательный отряд. Приняв бой из засады, группа уничтожила 9 немцев, из них 2 офицера. После этого группа двинулась на восток. По дороге на магистрали Москва—Варшава уничтожена машина с 6 гитлеровцами, после чего группа остановилась в Глусском районе, где и начала боевые действия...

13 декабря 1941 г. группа участвовала совместно с другими отрядами в операции по уничтожению полиции в районе Нежина. Пулеметчик Дидиченко метким огнем уничтожил 2 полицейских и, забрав оружие и боеприпасы, жестоко преследовал остальных.

25 января 1942 г. группой была уничтожена полиция в количестве 6 чел. в дер. Малые Головчицы.

Вооружение группы состояло: ручных пулеметов — 2, автоматов —5, винтовок — 13.

На 1 января 1943 года состав отряда — 109 человек. Вооружение отряда на 1 января 1943 г. 50-мм миномет — 1, станковый пулемет «максим» — 1, ручных пулеметов — 5, автоматов — 5, винтовок — 63.

8 апреля 1942 г. главным штабом был послан для командования отрядом тов. Гуляев Д.Т. По прибытии тов. Гуляева в отряд начались боевые действия отряда.

12 апреля 1942 года в дер. Сторожки отобрано у немцев 40 голов скота, убито 2 немца, ранены 1 офицер и 1 солдат, после чего офицер скончался.

16 мая 1942 года отряд в составе нескольких отрядов держал бой с немцами и полицией. Отрядом убито 3 солдата, 1 обер-лейтенант, 5 полицейских. Захвачено 2 тыс. патронов, велосипед, 2 винтовки и обоз с немецким имуществом. В бою отличились: пулеметчик Бевз, Дидиченко, Привалов, пулеметный расчет станкового пулемета (Хавкин, Борозненок, Мартинович, Фактор).

17 мая 1942 г. отделение тов. Дидиченко в дер. Гостина разогнало полицию, тов. Дидиченко из ручного пулемета расстрелял нач. полиции, захвачена 1 винтовка.

18 мая 1942 г. отрядом был обстрелян немецкий ж.-д. эшелон с живой силой по ж.д. Старые Дороги—Уручье.

6 июня 1942 г. с засадой между Клетным и дер. Барборово уничтожено 30 немцев, ранено 10 немцев, убит комендант мест. Глуск. Взяты один 20-зарядный пулемет и винтовки. Наши потери: двое храбро погибли в бою — Петров Сергей Иванович и Шаркевич Леонид, ранены: Кофтик Павел, Гуляев Д.Т. (командир отряда). Отличились в бою Журавлев (мелким огнем уничтожил 6 немцев), Русин, Володько.

5 июля 1942 года отряд напал на немецкий гарнизон в д. Барборово. Немцы разбежались. Убито 2 немца.

9 июля 1942 г. отряд напал на полицию в дер. Хоромцы. Полиция разбежалась, из которой часть после перешла в партизаны.

18 июля 1942 г. на пути к д. Катка сожжено 2 моста по дороге Глуск—Октябрьский на р. Доколька, после чего отряд напал на немецкий гарнизон в д. Катка. В 12 час. дня отряд ворвался в деревню. Выбить немцев не удалось, так как они окопались и им помогла бомбардировкой и стрельбой с воздуха авиация.

1 августа 1942 г. в результате боя разбита полиция в д. Маковичи. Убито 6 полицейских, взято 6 винтовок.

3 августа 1942 г. нападение отряда на охрану моста через р. Доколька. В результате был сожжен мост.

17 августа 1942 г. отрядом был принят бой с «добровольцами» в дер. Барборово. 2 раза деревня переходила из рук в руки. Убито 37 «добровольцев». Наши потери: 2 убито и 4 ранено. В бою отличились: Парецков, Бевз, Фактор, Рыженков, Попов, Кравцов, Руденко.

19 августа 1942 г. отрядом в составе отрядов был завязан бой с «добровольцами» в дер. Хоромцы. Бой продолжался с утра до вечера. «Добровольцы» разбежались по лесной чаще, разбившись на мелкие группы.

10 сентября 1942 г. комбинированное наступление «добровольцев» на партизанские гарнизоны. Отряд принял 3 боя. Уничтожено 17 «добровольцев». В бою отличились: Кравцов, Руденко, Кидин, Журавлев, Дидиченко, Володько. 20 сентября 1942 г. бой в Малиновском лесу. Заминировав дорогу, уничтожили 10 «добровольцев». В засаде уничтожено 107 чел. «добровольцев». Отличились в бою отделения Дидиченко, Белякова, Твердохлебова, Кравченко.

14 октября 1942 г. засадой по дороге Глуск—Бобруйск уничтожено 2 автомашины, 8 немцев, 11 полицейских, взяты 1 ручной пулемет и винтовки. Отличились в бою Кидин, Рыженков, Кравцов с отделением.

6 ноября 1942 г. нападение отрядом на охрану моста по дороге Глуск—Бобруйск. В результате боя уничтожено 5 немцев, 5 полицейских, разрушена связь — 2 км.

25 ноября 1942 г. отряд участвовал в составе отрядов на главном направлении по разгрому полиции в Октябрьском районе дер. Ломовичи. Уничтожено 12 дзотов и 48 полицейских. Ранен в голову в этом бою тов. Кидин В.П. Отличились в бою: Кидин В.П., отделение Кравцова, отделение Белякова.

9 декабря 1942 г. отряд участвовал в боевой операции по взрыву моста на ж.д. Житковичи — Гомель на р. Бобрик. Отряд делал засаду между (стн.) Старушки — Копцевичи, взорвал ж.д. полотно, обстрелял эшелон, шедший на подкрепление на мост, заставил развернуться противника и принять бой с нами. В бою отличились подрывники Борозненок, Володько...

Командир отряда	Д.Гуляев
Комиссар	А.Легостаев
Нач. штаба отряда	С.Поляков

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941— июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 508—511.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА М.Б.ХРАПКО МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДА З ЛІСТАПАДА 1941 г. ПА СНЕЖАНЬ 1942 г.

Не раней 30 мая 1943 г.

... В первый период времени партизанский отряд состоял из 30 чел. Из них коммунистов — 12 чел., комсомольцев — 10, беспартийных — 8. К концу марта 1942 г. партизанский отряд насчитывал 70 чел. На вооружении имелось: 2 станковых пулемета, 3 РПД и 58 винтовок...

К концу марта 1942 г. были освоены населенные пункты: дер. Перекалье, Ковбик, Залесье, Вятер, Зеленковичи, Зубаревичи, Березовка, Косаричи, Ратмировичи, Черные Броды и другие.

3 мая 1942 г. в районе стн. Мирадино на ж.д. Минск — Бобруйск спущен под откос в[оинский] эшелон с живой силой и техникой противника...

5 июня 1942 г. из засады на дороге Паричи — Качай — Болото уничтожено 22 фашиста.

10 июня 1942 г. в 23 часа 20 мин. в районе стн. Мирадино на ж.д. Минск — Бобруйск спущен под откос воинский эшелон. От взрыва горючего эшелон полностью сгорел, уничтожен паровоз, 50 автомашин и 40 чел. немецкой команды.

27 июня 1942 г. немцы и полиция в количестве 150 чел. ворвались в дер. Незнанье, Козловичского сельсовета Глусского района с целью ограбления жителей. Партизаны нашего отряда решительным налетом выбили фашистов из деревни, тем самым избавили население от расправы и грабежа.

27 июля 1942 г. в 1 час 45 мин. в районе стн. Мирадино на ж.д. Минск — Бобруйск произведено крушение воинского эшелона...

К концу июня 1942 г. отряд состоял из 6 взводов: взвода разведки, 4 линейных и 1 хозяйственного взводов. Общая численность отряда 130 чел. Из них коммунистов — 23, комсомольцев — 27. На вооружении имелось 3 станковых пулемета, 4 РПД, 110 винтовок.

К этому времени освоены населенные пункты: дер. Крюковщина, Козловичи, Устерхи, Застенок, Приплавы, Клещевка, Степановка, Чикили, Долгий Лес, Старое Село Глусского района, Полесской обл., дер. Петровичи, Гороховка, Макаровка Бобруйского района, Могилевской обл. Осваивались стн. Брожа, гор. Бобруйск, мест. Глуша и др.

14 июля 1942 г. отражено нападение фашистов на дер. Устерхи Глусского района. Потеряв значительное количество убитыми и ранеными, немцы ушли в гарнизон Глуск.

17 июля 1942 г. в 5 час. 15 мин. в районе дер. Сычково на ж.д. Бобруйск — Осиповичи спущен под откос в[оинский] эшелон...

27 июля 1942 г. в результате 6-часового боя бойцами нашего отряда отражено нападение фашистов, пытавшихся занять дер. Устерхи Глусского района, при этом уничтожено 68 фашистов.

14 августа 1942 г. в 1 час 00 мин. на 19-м разъезде между стн. Ясень и Мирадино по ж.д. Минск — Бобруйск спущен под откос в[оинский] эшелон, разбито 30 вагонов с живой силой и 10 платформ с автомашинами.

14 августа 1942 г. оккупанты силами батальонов «Днепр», «Березина», «Двина» и немецкого соединения «Гольфельд» окружили район нашего расположения между дер. Зеленковичи, Зубаревичи, Вьюнищи, Устерхи, Крюковщины, Козловичи, Незнанье и Лучки. Наш отряд совместно с другими отрядами после боя пробился из окружения со всем личным составом отряда и с полным вооружением. После выхода из окружения наш отряд совместно с другими отрядами с 19 по 22 августа 1942 г., переправившись через р. Птичь, участвовал в разгроме немецко-полицейских гарнизонов: Холопеничи, Катка, Слободка, Бере-

зовка Глусского района, в результате чего немецко-полицейские гарнизоны были полностью разбиты и ликвидированы. Уничтожены дзоты и склады. Наш отряд захватил винтовки, пулеметы, патроны, ротную походную кухню и другие в[оинские] вещи.

1 сентября 1942 г. в 22 часа в районе стн. Мирадино на ж.д. Бобруйск—Осиповичи спущено под откос 2 встречных в[оинских] эшелона.

11 сентября 1942 г. в 1 час 30 мин. в районе стн. Мирадино на ж.д. Минск—Бобруйск спущен под откос в[оинский] эшелон. Разбито 58 вагонов с живой силой и 8 платформ с танками и автомашинами.

22 сентября 1942 г. в 2 часа на ж.д. в районе между Татаркой и Осиповичами спущен под откос в[оинский] эшелон. Уничтожены паровоз, 22 вагона, 13 платформ с автомашинами и 2 цистерны с горючим.

К концу декабря 1942 г. отряд состоял в количестве 196 чел., из них коммунистов — 31 чел., комсомольцев — 65 чел. На вооружении имелось 3 станковых пулемета, 6 РПД и 150 винтовок...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4059. Воп. 1. Спр. 16. Л. 1—5.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ 37-й ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ А.Я.ПАРХОМЕНКІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ КАМАНДЗІРУ МІНСКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ В.І.КАЗЛОВУ АБ БАЯВОЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БРЫГАДЫ ЗА СНЕЖАНЬ 1943 г.

Не пазней 31 снежня 1943 г.

... За декабрь в отрядах нашей бригады проведено 4 партийных собрания. На собраниях рассматривались вопросы приема в кандидаты и члены ВКП(б) лучших партизан, ход изучения коммунистами доклада тов. Сталина и ряд других вопросов по воспитанию коммунистов в духе беззаветной преданности Родине. Принято в партию 5 чел.

Проведено 4 комсомольских собрания, на которых рассматривались вопросы о политико-моральном состоянии комсомольских организаций, об изучении доклада и приказа тов. Сталина о 26-й годовщине Великой Октябрьской социалистической революции, о приеме лучшей молодежи партизан в ряды ВЛКСМ. Принято в ВЛКСМ 6 чел...

В результате проводимой большой работы по воспитанию наших партизан и партизанок в духе преданности нашей партии и Советской Родине наши партизаны, командиры и политработники мужественно выполняли приказы командования 37-й гвардейской стрелковой дивизии, обеспечивая фланги расположения частей Красной Армии и ведя фронтовые бои с немецко-фашистскими регулярными частями.

За этот период отрядом им. Кирова (тов. Голодова) проведено 10 боев, из которых 5 последних велись с крупными силами танков и пехоты противника, а также и самоходной артиллерией противника.

За этот период проводилась большая работа партизан и мирного населения по завалам и перекопкам дорог, ведущих к линии фронта. Проведена большая работа в части помощи Красной Армии в пополнении. Отправлено за линию фронта 122 партизана, не имевших оружия, и мирных жителей из партизанских скрытых резервов — 88 чел.

Результатом сплоченности и взаимовыручки среди партизан нашей бригады служит тот факт, что партизаны, несмотря на тяжелые условия окружения в дер. Ковчицы 2-е, вынесли с поля боя и пронесли на себе (более чем 40 км) раненых в количестве 15 чел., не бросая оружия своего, ни раненых своих товарищей.

Нами проведена большая работа по спасению мирного населения от угона их в немецкое рабство. Места, где прячется мирное население в лесах, охраняются вооруженными группами партизан. В дер. Зеленковичи, Зубаревичи, Славковичи расположены отряды, которые не дают возможности противнику восстанавливать дороги, идущие через эти районы к линии фронта, и грабить мирное население.

Проводится также большая политическая работа среди населения в части помощи наступающей Красной Армии. За этот месяц из деревни Тумаровка нами был отправлен обоз с хлебом — 100 пуд. и 15 голов скота для 37-й гвардейской стрелковой дивизии.

Оказана большая помощь населению в части отправки его за линию фронта. Всего отправлено семей партизан и мирных жителей дер. Устерхи, Крюковщина и Зубаревичи — 420 чел. со всем их имуществом, обозы обеспечены вооруженной охраной.

За этот месяц проведена большая работа по разложению полицейских гарнизонов и по

расчистке тыла от контрреволюционных предательских элементов в зонах расположения бывших полицейских гарнизонов в дер. Язвинцы, Малимоны, Тумаровка, Ковчицы 1-е, Ковчицы 2-е и Заболотье.

В гор. Бобруйск систематически засылается литература, а также направляются и наши люди, которые проводят большую разъяснительную работу.

БОЕВАЯ БДИТЕЛЬНОСТЬ

1. Пущен под откос один вражеский эшелон, при этом уничтожено: 1 паровоз и 11 вагонов с военным грузом.

2. Уничтожено вражеских автомашин: на шляху Бобруйск—Паричи —14, в гор. Бобруйске нашими людьми путем подложенных мин уничтожено 2 автомашины, в районе дер. Спорное — 2, в районе д. Брожка — 1, в районе Обча — 1, на шляху Брожа—Петровичи — 4, всего за месяц уничтожено 24 вражеских автомашины.

В дер. Ковчицы 2-е из ПТР подбито и уничтожено 2 немецких (средних) танка и один мотоцикл.

4. В гор. Бобруйске нашими людьми по Шоссейной улице взорвано бензохранилище, при этом сгорело: гараж и 200 бочек бензина (около 40 т), а также взорван авиамотор.

5. В гор. Бобруйске по ул. Шоссейной, 119, путем подложенной мины нашими людьми взорвана одна самоходная пушка противника.

6. На шляху Бобруйск—Паричи уничтожено 2 трактора-тягача и сожжено 15 бочек с бензином.

7. На шляху Брожа—Петровичи уничтожен автобус и два прицепа.

8. На шоссейных и грунтовых дорогах уничтожено 4 деревянных моста протяжением 32 м.

9. На шляху Бобруйск—Паричи и Богушевка—Паричи уничтожено телефонно-телеграфной связи — 9400 м.

10. Проведено 12 открытых боев с немецко-фашистскими захватчиками, причем 5 боев проведено с крупными регулярными частями пехоты и танков противника в дер. Ковчицы 2-е.

11. За месяц убито 340 немецких солдат и офицеров, ранено немецких солдат и офицеров — 32.

12. Нами пойманы в качестве живого «языка» — главный врач немецкой дивизии и фельдшер и переданы 37-й гвардейской стрелковой дивизии.

13. Захвачено: один исправный мотоцикл на шляху Брожа—Богушевка и зенитная пушка на прицепе подбитой автомашины на дороге Бобруйск—Паричи и передана 37-й гвардейской стрелковой дивизии.

Командир 37-й партизанской бригады им. Пархоменко Львов
Комиссар бригады Храпко
Нач. штаба бригады Романов

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Материалы и документы. Мн., 1980. Т. 2. С. 603—605.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ № 258 ІМЯ В.В.КУЙБЫШАВА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ РАЗГРОМЕ АТРАДАМ Г.М.СТАЛЯРОВА НЯМЕЦКАГА ГАРНІЗОНА Ў ВЁСЦЫ БАРБАРОВА 12 ЧЭРВЕНЯ 1942 г.

Не раней 28 чэрвеня 1944 г.[1]

... Операция проведена по приказу командира отряда — 12 июня 1942 г. разгромить немецко-полицейский гарнизон дер. Барбаров. 10 июня выслана разведка в район Барбаров с задачей: точно установить количество и вооружение гарнизонов, где расставлены огневые точки противника. Разведка при наблюдении и опросе населения установила, что гарнизон численностью 40—45 чел., при вооружении — 2 станковых пулемета, 2 РП, 1 миномет —расположен в дер. Барбаров. Пулеметы размещены: 1 станковый, 1 ручной [на] кладбище, второй станковый пулемет — на чердаке крайнего дома, простреливает подходы к дер. Барбаров.

[1]Датуецца па часе заканчэння справаздачнага перыяду.

Командир отряда решил: стрелковое отделение и приданный станковый пулемет выслать на опушку леса, что западнее дер. Барбаров, с задачей привлечь на себя основные силы противника, продемонстрировать там наступление. Отделение выслать северо-западнее дер. Барбаров с задачей в случае подкрепления из мест. Глуска задержать его, а в случае отхода противника обстрелять его. Основные силы отряда 40–45 чел. со станковым пулеметом при 2 ручных пулеметах сосредоточить скрытно в кустах, что восточнее дер. Барбаров, откуда и нанести главный удар противнику с целью захвата деревни и разгрома гарнизона.

К 4.00 12 июня 1942 г. исходное положение отрядом и группами было занято. В это время группа, действовавшая западнее дер. Барбаров, начала скрытно пробираться к деревне. Сняв 2 часовых, открыла огонь из станкового пулемета по станковому пулемету противника. Немцы начали выбегать из помещений, но уже восточная окраина деревни была занята группой партизан. Заняв оборону в деревне, немцы перешли в контратаку. В это же время основные силы атаковали немцев во фланг. Немцы, не ожидая удара, потеряв несколько человек, начали отходить на Глуск, по дороге на Баяново. В это время их встретило из засады огнем отделение, находившееся северо-западнее Барбаров. Немцы, бросив обоз, побежали полем на дер. Баяново. К 5.15 деревня была занята партизанами. Особенно отличился в этом бою расчет станкового пулемета тов. Демиденко, который умелым ведением огня выбил противника с кладбища и принял на себя весь основной удар немцев. В результате боя убито 21 и ранено 8 гитлеровских солдат и офицеров.

Потери отряда: 1 чел. убит и 4 чел. ранено...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 117. Л. 28–29.

Спакойнага жыцця захопнікам не было

З успамінаў Станіслава Францавіча Шумоўскага, былога партызана атрада імя С.М.Будзённага, рэдактара падпольнай раённай газеты «Сацыялістычная вёска»

У канцы красавіка 1942 г. у Цэнтральны штаб партызанскага руху былі выкліканы камандзіры і камісары атрадаў. З прамовай перад імі выступіў першы сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б і камандзір Мінскага партызанскага злучэння Васіль Іванавіч Казлоў. Ён паведаміў, што немцы рыхтуюцца да вясенняга наступлення на фронце. Задача партызан у бліжэйшы час актывізаваць баявыя дзеянні, граміць варожыя гарнізоны, узмацніць удары па камунікацыях праціўніка.

Раз'ехаўшыся па сваіх атрадах, камандзіры і камісары давялі змест прайшоўшай размовы да партызан, якія адобрылі намеры аб неабходнасці ўзмацнення ўдараў па ворагу. Вясна ў тым годзе была дружная. У пачатку мая ўжо зазелянелі лясы, увайшлі ў берагі рачулкі і рэчкі, прасохлі дарогі. Кожны гай, кожны куст мог схаваць партызан ад варожага вока.

Першым было вырашана разграміць клятнянскі паліцэйскі гарнізон. У ноч на 5 мая партызаны абышлі Клетнае з усіх бакоў. Узводу, якім я камандаваў, загадалі перакрыць дарогу непадалёку ад пасёлка Краснае. Роўна ў тры гадзіны ночы партызаны павінны былі зняць паліцэйскіх вартавых. Але замест іх партызаны сустрэлі двух патрульных. У перастрэлцы яны былі забіты. Партызаны кінуліся да каравульнага памяшкання, у вокны паляцелі гранаты. Пачаўся пажар. Але большасць паліцэйскіх знаходзілася ў хаце на суседняй вуліцы. Схапіўшы зброю, яны, не ўступаючы ў бой, кінуліся да ракі, пераплылі яе і зніклі.

Пачуўшы перастрэлку, гітлераўцы ў глускім гарнізоне захваляваліся. Угору ўзвілося з розных месцаў некалькі ракет. Мы з нецярпеннем чакалі з'яўлення немцаў, але яны, мабыць, не захацелі падстаўляць свой лоб пад партызанскія кулі.

На світанку мы пакінулі Клетнае. А праз два тыдні такі ж лёс напаткаў і дакольскі паліцэйскі гарнізон. Тут мы сустрэлі адчайнае супраціўленне, але партызанскі напор быў настолькі імклівым і смелым, што на працягу нейкай паўгадзіны паліцэйскія былі разбіты.

У выніку разгрому гэтых гарнізонаў партызанскі раён расшырыўся на дзесяткі кіламетраў. Ноччу з вёсак, дзе раней кантроль ажыццяўлялі паліцэйскія і немцы і дзе яны ўстанавілі так званы свой «новы

С.Ф.Шумоўскі.

парадак», бургамістры і старасты, да вялікай радасці жыхароў, кінуліся шукаць прытулку ў Глуску. Пацягнулася пад ахову моцнага нямецкага гарнізона ўся нечысць, што верай і праўдай служыла акупантам.

Цяпер па вёсках раз'язджалі партызанскія палітработнікі, якія праводзілі сходы і расказвалі людзям праўду аб падзеях на фронце, аб жыцці на Вялікай зямлі, заклікалі шырэй разгортваць усенародную барацьбу супраць ворага. І гэтыя заклікі знайшлі водгук. Па адным і групамі, са зброяй і без яе прыходзілі да нас людзі ў атрад. Колькасны яго склад на працягу двух месяцаў вырас у чатыры разы.

Партызаны ўсё часцей і часцей сталі наносіць удары па аўтамабільнай дарозе Масква — Варшава. Група падрыўнікоў нашага атрада на працягу аднаго месяца пусціла пад адхон варожыя эшалоны на чыгункі Слуцк — Асіповічы. Пазбягаючы ўдараў партызан, акупанты вымушаны былі спыніць рух на дарозе Чырвоная Слабада — Бабруйск.

Актыўнымі баявымі дзеяннямі летам 1942 г. партызаны прымусілі акупантаў зняць з фронту значную колькасць салдат і афіцэраў і размясціць іх у выглядзе гарнізонаў у найбольш важных пунктах раёна. Так у ліпені 1942 г. узніклі нямецкія гарнізоны ў Даколі, Клетным, Катцы.

Акупанты зганялі сялян на пабудовы гарнізонных умацаванняў. Яны загадвалі разбіраць калгасныя, а часам і асабістыя пабудовы сялян, каб абносіць высокімі двайнымі сценамі памяшканні, дзе размяшчаліся немцы і паліцэйскія. Гэта пераважна былі будынкі школ. Паміж двайнымі сценамі насыпалі пясок, а зверху сцен нацягвалася некалькі радоў калючага дроту. У сценах рабіліся амбразуры, да якіх з будынка па ўнутранай частцы двара вялі траншэі. Подступы да сцен былі перагароджаны некалькімі радамі калючага дроту. Свабодным заставаўся толькі адзін праход, праз які захопнікі звязваліся са знешнім светам. Звычайна на гэтым праходзе днём і ноччу стаяў нямецкі вартавы. На будынках, у якіх размяшчаліся гарнізоны, паўсюдна былі пабудаваны назіральныя вышкі, службу назірання на іх неслі таксама немцы. Знешняя вартавая служба даручалася паліцэйскім. З іх ліку звычайна выстаўляліся і сакрэтныя пасты. Яны ж за рэдкім выключэннем неслі і патрульную службу.

Але ні высокія двайныя сцены, ні калючы дрот, ні вышкі — нішто не ратавала захопнікаў ад караючай рукі партызан.

Бой на Залатой горцы

З успамінаў Барыса Мітрафанавіча Цыкункова, былога камандзіра партызанскага атрада імя С.М.Будзённага

Аднойчы сувязная атрада паведаміла аб тым, што ў Глуск прыбыла варожая вайсковая часць і чакаецца замена нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у Клетным і Барбарове. Было вырашана аб'яднацца з партызанскім атрадам Дзмітрыя Гуляева і падрыхтаваць ворагу «сюрпрыз».

На нараду ў штаб сабраліся камандзіры атрадаў, рот і ўзводаў. Доўга раіліся, як лепш правесці аперацыю. Быў распрацава-

ны план дзеяння двух атрадаў. У вызначаны час яны рушылі ў паход. Спыніліся на ўзлеску сасновага бору. Камандзіры аддавалі партызанам дадатковыя распараджэнні і апошнія ўказанні. Потым яны звярнуліся да ўдзельнікаў аперацыі.

У сваім звароце да партызан я сказаў, што перад намі стаіць задача: па-баявому «развітацца» з ад'язджаючымі і «гасцінна» сустрэць новых, што трэба вось гэтую Залатую горку, як завуць яе з даўніх часоў, ператварыць у крывавую для фашысцкіх захопнікаў. Задача адказная і складаная, але выканаць яе мы павінны паспяхова.

На досвітку партызаны атрада Гуляева размясціліся на ўзлеску невялікага гаю, а будзёнаўцы — у кустах на схіле Залатой горкі. На другім баку ўзгорка ўжо добра быў відаць і рэдкі беразняк, паросшы хмызам, і асобныя невялікія хвоі. З боку вёскі Клетнае пачулася нямецкая мова. Пастух прагнаў цераз дарогу невялікі статак кароў. І зноў — цішыня.

Але вось дазорныя паведамілі, што з вёскі Барбарова рухаецца калона немцаў. Праз нейкі момант яны паказаліся. Узброеныя фрыцы ахоўвалі нарабаванае дабро. Па абодвух баках шашы рухалася нямецкая разведка. Часам хто-небудзь з разведкі спыняўся, разглядаў у бінокль схіл узгорка і, нічога не заўважыўшы, падаваў каманду рухацца далей.

Затаіўшы дыханне, баючыся адным неасцярожным рухам выдаць сябе, пільна сачылі партызаны за кожным крокам варожых салдат, падпускаючы іх усё бліжэй і бліжэй. Калі калона падышла на адлегласць 10—15 метраў, дружны агонь народных мсціўцаў абрынуўся на ворага: застукалі кулямёты, аўтаматы і мінамёты. Збянтэжыўшыся і разгубіўшыся, немцы павярнулі назад, але і тут іх сустракалі трапныя кулі партызан. А тыя, каго яшчэ не падпільнавала смерць, пачалі прыходзіць у сябе і адкрылі ў адказ моцную страляніну.

На дапамогу ворагам з вёскі Барбарова падышло падмацаванне. Бой з кожнай мінутай разгараўся. Падкошаны куляй, упаў Ігнат Дроб.

А бой не сціхаў. З тылу па ворагу ўдарыў узвод партызан, які ўзначальваў сакратар партыйнай арганізацыі Гаўрон. На дапамогу гітлераўцам падышла яшчэ адна група з нямецка-паліцэйскага гарнізона, але яе разбілі гуляеўцы. Праз некаторы час у неба ўзвілася зялёная ракета — сігнал адыходзіць. Страляніна спынілася, толькі вецер разганяў клубы парахавога дыму ды на дарозе валяліся трупы нямецкіх салдат і афіцэраў.

Захапіўшы вялікую колькасць розных трафеяў, дакументаў і пячатку палявога камандзіра, раздаўшы насельніцтву нарабаванае дабро, партызаны вярталіся на свае стаянкі.

Каткаўская аперацыя 1942 года

Такую назву атрымалі баі партызан атрадаў М.П.Бумажкова, А.П.Пакуша, У.Ц.Шантара, Р.І.Краўца, М.Б.Храпко супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Глускім і Акцябрскім раёнах у жніўні 1942 г.

З гарнізона в. Катка (больш за 400 гітлераўцаў), які прыкрываў дарогу на Глуск, акупанты часта ўрываліся ў Акцябрска-Любанскую партызанскую зону, рабавалі і забівалі жыхароў бліжэйшых вёсак. Штаб партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей прыняў рашэнне разграміць гарнізон у в. Катка.

Аперацыяй кіраваў намеснік камандзіра партызанскага злучэння М.П.Канстанцінаў. 9 жніўня 1942 г. разведка партызан данесла аб выхадзе 300 варожых салдат з 2 пушкамі з в. Катка ў в. Харомцы. Раніцай 10 жніўня атрады Бумажкова, Пакуша, Краўца і Шантара раптоўным ударам выбілі праціўніка з в. Харомцы. Потым сумесна з атрадам Храпко пераправіліся цераз р. Пціч і з 19 да 22 жніўня разбілі варожыя гарнізоны ў вёсках Халопенічы, Слабодка, Бярозаўка і авалодалі в. Катка. Вёску Харомцы партызаны ўтрымлівалі да снежня 1943 г. У выніку гэтай аперацыі Акцябрска-Любанская партызанская зона расшырылася больш чым на 20 км^2.

Р.А.Чарнаглазава.

Грамілі партызаны гарнізоны

З успамінаў С.В.Маханькі, былога камісара 123-й партызанскай брыгады імя 25-годдзя БССР, і Сцяпана Апанасавіча Пракопчыка, былога камісара партызанскага атрада імя 25-годдзя ВЛКСМ

Маханька Сямён Васільевіч, нарадзіўся 25.10.1909 г. у в. Слаўкавічы Глускага раёна, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Палескай вобласці. Член КПСС з 1939 г.

З 1936 г.на савецкай рабоце, з 1939 г. — інструктар Акцябрскага РК КП(б)Б. З чэрвеня 1941 г. камісар знішчальнага батальёна ў Акцябрскім раёне. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камісар атрада «Чырвоны Кастрычнік» (жнівень 1941 — студзень 1942), камісар, адначасова ў красавіку — кастрычніку 1943 г. в.а. камандзіра партызанскай брыгады 123-й Акцябрскай імя 25-годдзя БССР.

Пасля вайны працаваў на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце. У 1952 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б. Памёр у маі 1973 г.

...Ко дню 24-й годовщины Великого Октября мы провели операцию по разгрому вражеского гарнизона в районе Холопеничского спиртзавода Глусского района.

В складах спиртзавода хранилось большое количество зерна. Для его охраны из Глуска в Холопеничи прибыла рота гитлеровцев. Командование отряда разработало план операции по разгрому вражеского гарнизона. Вечером партизаны переправились через р. Птич и подошли к поселку спиртзавода. Одна группа во главе с Трофимом Жулега пошла в направлении складов, вторая во главе с Маханько — туда, где находились вражеские солдаты. Охрана около складов и в караульном помещении была уничтожена. Ни одному фашисту не удалось уйти. В деревни Холопеничи, Катка, Косаричи, Зарекуша были посланы группы партизан, чтобы поднять местное население для вывозки хлеба. В результате 800 тонн хлеба, отнятого оккупантами у крестьян, было возвращено им. Немало фашистов полегло в этом бою...

В бою за д. Косаричи партизаны также показали чудеса храбрости. Особенно отличился один из партизан отряда Храпко (фамилию партизана сейчас трудно вспомнить). Он находился в д. Косаричи в разведке. При внезапном нападении фашистов на деревню он не мог из нее уйти и скрылся на чердаке сарая с ручным пулеметом. Вечером, при натиске партизан, немцы начали отступать в направлении Глуска. Когда они выехали за деревню, партизан из сарая открыл по ним огонь из пулемета. На поле боя немцы оставили много трупов.

Через некоторое время фашисты снова бросили на партизан карательный отряд до 300 человек. Каратели прибыли в деревню Бобровичи. Возле клуба они расстреляли около 70 человек местного населения. Партизаны, узнав о приближении карательного отряда, поспешили выйти ему навстречу. И вот в д. Бобровичи завязался бой. Враг, не выдержав натиска партизан, начал бежать в направлении д. Замосточье, где находился отряд Ливенцева. Дорога на Глуск была отрезана. Стоял март, но морозы были сильные. Фашисты начали замерзать. На рассвете партизаны завязали с ними бой. Противник понес большие потери.

Гитлеровцы много раз пытались уничтожить партизанскую зону, но безуспешно. Крупную карательную экспедицию они предприняли в начале марта 1942 г. Уже 28 февраля нам стало известно, что из района Бобруйска на Октябрьский движется полк фашистов. Партизанские отряды Храпко, Шантара и Шваякова встретили их в д. Косаричи. Фашисты бросились в атаку большими группами, бой длился весь день. Вечером перешли в атаку партизаны. Гитлеровцы не выдержали натиска народных мстителей и побежали. Весь вражеский обоз был уничтожен...

На следующий день каратели явились в д. Косаричи и в отместку за свои неудачи расстреляли 30 стариков, сожгли часть деревни...

Фашисты снова и снова пытались уничтожить партизанскую зону... В июне 1942 г. с этой целью гитлеровское командование начало сосредотачивать большое

количество солдат и полицейских в д. Березовка Глусского района. Штаб нашей бригады разработал план разгрома гарнизона противника в Березовке. В проведении этой операции принимали участие также отряды Храпко, Шваякова, действовавшие на территории Глусского района. Отряды Храпко и Шваякова зашли с правой стороны реки Птичь, а бригада Павловского — с левой.

Напали на Березовку внезапно и с криками «ура!» устремились в атаку. Фашисты в это время спали.

В результате боя 150 гитлеровцев были убиты. Мы взяли много лошадей, оружия, патронов, 3 станковых пулемета и походную кухню.

В жестокой битве с врагом партизанское движение росло и ширилось с каждым днем и превратилось в грозную для него силу.

С.В.Маханька.

Б.М.Цыкункоў.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941—1944 годы). Мн., 1961. С. 293—306.

Змагалася моладзь

У верасні 1942 г. пачаў дзейнічаць Бабруйскі падпольны райком партыі (сакратар Д.М.Лемяшонак). У 1943 г. ён размяшчаўся ў лесе, непадалёку ад в. Зелянковічы, тут жа знаходзіліся Бабруйскі падпольны райком камсамола і рэдакцыя газеты «Бобруйский партизан». Бабруйскі падпольны райком партыі распаўсюджваў свой уплыў і на партыйцаў і камсамольцаў Глушчыны.

Сакратаром Бабруйскага падпольнага райкома камсамола быў назначаны малады камуніст Міхаіл Ігнатавіч Семісалаў, палітрук роты з атрада Віктара Лівенцава. І калі ён у красавіку 1943 г. гераічна загінуў, яго на гэтай пасадзе замяніў намеснік камісара па камсамоле атрада імя Шчорса Мікалай Тоўсцік, у недалёкім мінулым член партыйна-камсамольскай падпольнай групы в. Чыкілі.

Што датычыць арганізацыйнага згуртавання глускай моладзі, то тут пачатак ужо быў зроблены. Яшчэ ў ліпені 1941 г. ЦК ЛКСМБ і Палескі абком камсамола пакінулі для работы у тыле ворага сакратаром Глускага падпольнага райкома камсамола Рыгора Кліменцьевіча Тычыну, які ў 1939—1940 гг. працаваў загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі райкома камсамола. Перад ім была пастаўлена задача: стварыць падпольны камсамольскі орган і далучыць юнакоў і дзяўчат да барацьбы

Помнік у гонар Бабруйскіх падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыі раённай газеты «Бобруйский партизан».

Р.К.Тычына.

супраць акупантаў. Са жніўня 1941 г. Глускі падпольны райком камсамола пачаў дзейнічаць: у многіх вёсках стварыліся падпольныя групы з камсамольцаў і моладзі. З кастрычніка 1941 г. цэнтрам камсамольскай работы стаў атрад народных мсціўцаў на чале з У.Ц.Шантарам.

Пазней асноўная база Глускага падпольнага райкома ЛКСМБ знаходзілася ў партызанскіх атрадах, якія ўвайшлі ў сакавіку 1943 г. у 225-ю партызанскую брыгаду, і ў 100-й брыгадзе. У верасні 1943 г. Р.К.Тычына быў пераведзены на іншую работу. Падпольны райком камсамола ўзначаліў А.М.Макейчык.

Склад Глускага падпольнага райкома камсамола: сакратары — Тычына Рыгор Кліменцьевіч (жнівень 1941 — 14.9.1943); Макейчык Аляксандр Макаравіч (14.9.1943 — 13.4.1944; сакратар па прапагандзе — 21.3.1943 — 14.9.1943), Рынейскі Баляслаў Валяр'янавіч (сакратар па прапагандзе — 14.9.1943 — 28.6.1944).

Члены райкома камсамола: Рынейскі Баляслаў Валяр'янавіч (жнівень 1941 — 19.9.1943); Санчукоўскі Віктар Пятровіч (жнівень 1941 — 11.4.1944, загінуў); Макейчык Аляксандр Макаравіч (сакавік 1942 — 21.3.1943); Сысой Уладзімір Васільевіч (21.3.1943 — 28.6.1944); Крук Ігнат Цімафеевіч (14.9.1943 — 11.4.1944, загінуў).

Камсамольцы хадзілі ў атаку

З успамінаў Баляслава Валяр'янавіча Рынейскага, былога сакратара Глускага падпольнага райкома ЛКСМБ

У вёсках раёна па рашэнні падпольнага райкома камсамола ствараліся падпольныя групы, якія ўзначальвалі такія смелыя і адважныя людзі, як Георгій Казак, Аркадзь Яльніцкі, Міхаіл Залескі, Антаніна Паўлава і іншыя.

Каштоўныя весткі прыносіў у наш атрад і камсамолец з в. Сялец Іван Кулакоўскі. Доўгі час ён хаваў у сваёй хаце параненага савецкага лётчыка, якога знайшоў у лесе у беспрытомнасці. А тады, калі лётчык паправіўся, Іван дапамог яму дабрацца да сваіх.

Аднойчы ўвечары Іван позна вяртаўся дамоў. Але ўбачыць сваіх бацькоў яму так і не давялося: па даносе здрадніка яго каля хаты сустрэлі немцы і арыштавалі. Бацькі хацелі дапамагчы сыну выратавацца ад смерці, але таксама былі схоплены: бацьку і маці расстралялі разам з сынам.

Шмат юнакоў і дзяўчат прыйшло ў партызанскія атрады, каб непасрэдна ўдзельнічаць у барацьбе з ворагам. Многа моладзі ўваходзіла ў склад падрыўных груп, дзе асабліва патрабавалася вытрымка, смеласць і знаходлівасць.

У маі 1942 г. наша камсамольска-маладзёжная група папрасілася на заданне: пусціць пад адхон варожы эшалон. Старанна рыхтаваліся мы да выканання аперацыі, вывучалі ахову чыгункі, дзе і ў які час мяняюцца ахоўнікі, калі лепш падкласці міну.

І вось мы на месцы. Кожны член дыверсійнай групы ведае, што ён павінен рабіць. Камандзір групы Рыгор Русін яшчэ раз правярае гатоўнасць усіх. Пацяклі хвіліны чакання. Амаль побач прайшлі ахоўнікі, але нічога падазронага не заўважылі. Здалёк пачуўся пранізлівы свіст, і праз некалькі хвілін паказаўся эшалон. Прапусціўшы нагружаную платформу, якую немцы заўсёды ставілі ўперадзе цягніка, я шмаргануў за шнур. Выбух склануў паветра, і ўсё наваколле асвяціла полымя пажару. Апамятаўшыся, фашысты адкрылі агонь, але наша дыверсійная група была ўжо далёка ад месца аперацыі.

Партызанскі атрад імя Будзённага ад іншых адрозніваўся тым, што асноўную яго частку складала моладзь і камсамольцы. Ва ўсіх баях з немцамі яны вызначаліся асаблівай мужнасцю і смеласцю. Вось імё-

ны маладых герояў: Барыс Грамыка, Павел Дроб, Барыс Корбут, Адам Багам'я, Аня Пухальская, Уладзімір Радзько, Уладзімір Марціновіч і многія іншыя. На жаль, не ўсе з іх вярнуліся дамоў, убачылі дзень вызвалення, дзеля якога ішлі ў бой і паміралі.

Было гэта ў ліпені 1944 г. У в. Жывунь Любанскага раёна прыйшла на заданне невялікая група партызан атрада, але знайшоўся здраднік, які выдаў іх ворагам. Маладыя хлопцы змагаліся да апошняга патрона. Адзін партызан цудам застаўся жывы. Ён дабраўся да сваіх і паведаміў, што здарылася.

Праз некалькі дзён стала вядома, што немцы вырашылі напасці на в. Зорка Глускага раёна. Для гэтага ім патрэбна было пераправіцца цераз канал паміж вёскамі Чапаева і Жывунь, але там была застава партызан, і варты ўзнялі трывогу.

Камандзір атрада Барыс Мітрафанавіч Цыкункоў хутка сабраў групу байцоў-камсамольцаў і зрабіў засаду. Напружана сачылі за набліжэннем ворага аўтаматчык Барыс Грамыка, кулямётчыкі Васіль Ермакоў, Уладзімір Букс, Жорж Акуліч, Павел Кацуба і Уладзімір Радзько. Яны падпусцілі гітлераўцаў бліжэй і адкрылі агонь. Скошаныя трапнымі выстралами, фашысцкія карнікі падалі на зямлю, астатнія павярнулі назад.

У першых радах

Сваімі важакамі моладзь выбірала самых аўтарытэтных, смелых, бясстрашных, хто мог і ў баі, і ў паходзе асабістым прыкладам уздзейнічаць на іншых, аператыўна і настойліва выконваць баявыя заданні. Менавіта такімі рысамі характару валодаў член Глускага падпольнага райкома ЛКСМБ Віктар Санчукоўскі. Гібель бацькі, маці і сястры, якіх гітлераўцы публічна пакаралі смерцю на станцыі Концавічы Петрыкаўскага раёна, не зламала волі патрыёта. Да снежня 1943 г. на яго рахунку было ўжо 15 варожых эшалонаў, пушчаных над адхон. Вясной 1944 г., вяртаючыся з баявога задання, Віктар спыніўся ў вёсцы. Неўзабаве дом, у якім ён знаходзіўся, акружылі гітлераўцы. Упэўненыя ў лёгкай перамозе, яны прапанавалі партызану здацца. Той адказаў аўтаматнымі чэргамі. Тады фашысты сталі закідваць дом гранатамі. Цяжка паранены, камсамольскі важак працягваў весці агонь па ворагу. У гэтым няроўным паядынку ён знішчыў да 15 гітлераўцаў, але і сам загінуў. Віктар Санчукоўскі пасмяротна быў узнагароджаны вышэйшай узнагародай Радзімы — ордэнам Леніна.

У 99-й партызанскай брыгадзе імя Дз.Ц.Гуляева добра ведалі памочніка камісара брыгады па камсамоле Яўгена Цюрына. У ліпені 1942 г. ён быў камандзіраваны ЦК ВЛКСМ у распараджэнне ЦК ЛКСМБ і пасля абучэння ў спецшколе з групай партызан яго накіравалі ў тыл праціўніка ў Мінскую вобласць на кіруючую камсамольскую работу. Яўген быў адважным хлопцам, ён не раз выконваў заданні ЦК ЛКСМБ па наладжванні сувязі з падпольнымі абкомамі камсамола. У студзені 1943 г. яго накіравалі ў 99-ю партызанскую брыгаду. Моладзі прыйшоўся па душы здольны, ініцыятыўны важак і адважны баец. Яўгену споўніўся толькі 21 год, але аўтарытэт у яго быў як у сталага, вопытнага партызана. Ён неаднаразова ўдзельнічаў у адкрытых баях з ворагам, выконваў рызыкоўныя заданні па разведцы праціўніка, бясстрашна пранікаў у варожыя гарнізоны. 15 сакавіка 1943 г. у цяжкім баі з фашыстамі каля Глуска Яўген загінуў. Таварышы з воінскімі ўшанаваннямі пахавалі яго ў в. Слаўкавічы.

Адным з вопытных падрыўнікоў лічыўся сярод моладзі сакратар падпольнага райкома камсамола Баляслаў Рынейскі. Група пад яго камандаваннем часта наносіла ўдары па варожых камунікацыях, такіх, як аўтадарога Варшава — Масква. На працягу аднаго месяца ў 1942 г. яна пусціла пад адхон тры варожыя эшалоны на ўчастку чыгункі Слуцк — Асіповічы. У выніку актыўных дзеянняў партызанскіх падрыўнікоў акупанты вымушаны былі спыніць рух па аўтамабільнай дарозе Чырвоная Слабада — Бабруйск.

Т.А.Матусевіч.

Партызанскі рух нарастаў

Лясныя байцы працягвалі дзейнічаць у Глускім і суседніх раёнах, наганяючы страх на фашыстаў і паліцаяў. Характэрна, што ўжо ў канцы 1941 г. у ходзе баявых дзеянняў на камунікацыях праціўніка, па разгроме гарнізонаў і апорных пунктаў фашыстаў у раёне пры актыўнай падтрымцы насельніцтва сталі закладвацца асновы партызанскіх зон. Спачатку гэта былі невялікія астраўкі вызваленай ад гітлераўцаў і кантралюемай савецкімі патрыётамі тэрыторыі. З часам яны разрасталіся, станавіліся базамі далейшага развіцця ўсенароднага партызанскага руху. Адна з першых такіх зон узнікла восенню 1941 г. побач з Глушчынай — на тэрыторыі Акцябрскага і Любанскага раёнаў. У яе ўваходзілі і населеныя пункты Глускага раёна. Таму не дзіўна, што тут таксама былі вёскі, куды немцы нават не адважваліся сунуць носа. Свабоднай ад захопнікаў была Слаўкаўшчына.

К сярэдзіне 1942 г. партызаны Акцябрска-Любанскай зоны трымалі пад сваім кантролем значную частку тэрыторыі раёна. Атрадамі, якія базіраваліся на Слаўкаўшчыне і з'яўляліся тут гаспадарамі становішча, былі разгромлены клятнянскі і дакольскі нямецка-паліцэйскія гарнізоны. У выніку гэтага яшчэ больш пашырылася партызанская зона. Гітлераўцы ўрываліся сюды толькі буйнымі сіламі.

Моцныя групоўкі партызан размяшчаліся і ва ўсходняй частцы раёна. К канцу вясны 1942 г. партызанскія атрады М.Б.Храпко і У.М.Шваякова вызвалілі ад немцаў і паліцаяў Зелянковічы, Зубарэвічы, Бярозаўку, Ратміравічы і іншыя вёскі. Гэты раён стаў сапраўдным партызанскім краем, дзе народныя мсціўцы аднавілі дзейнасць органаў савецкай улады і вырашалі розныя пытанні жыцця мясцовага насельніцтва. У тыле ворага летам 1942 г. адбылася сесія Казловіцкага сельскага Савета.

Праходзіла яна ў в. Зелянковічы, якая па праву лічылася своеасаблівай сталіцай партызанскага краю. Прысутнічалі камандзіры і палітработнікі, партызаны, стаўшыя дэпутатамі яшчэ да вайны. Усяго сабралася каля шасцідзесяці чалавек.

Сесія праходзіла па-дзелавому, без залішняй паспешлівасці (працягвалася каля трох гадзін).

Паводле ўспамінаў камандзіра атрада імя Кірава М.Б.Храпко, галоўная сутнасць была не столькі ў самой сесіі, як у тым, каб даць адчуць людзям, што не фашысты, а савецкая ўлада з'яўляецца сапраўдным гаспадаром на роднай зямлі.

У пачатку 1943 г. яшчэ больш узрасло баявое майстэрства камандзіраў і народных мсціўцаў. 1942 г. паказаў, што ворага можна біць і біць моцна.

Калі пад Сталінградам ішлі напружаныя баі, народныя мсціўцы Глушчыны правялі шэраг паспяховых аперацый па падрыве мастоў на важных чыгуначных магістралях. Вось адзін з такіх прыкладаў. Мост даўжынёй больш за 150 м з чатырма пралётамі знаходзіўся на захад ад станцыі Пціч. Па ім праходзіла двухкалейка. Мост кругласутачна ахоўваўся двума узводамі салдат, якія размяшчаліся ў чатырох дзотах. На ўзбраенні праціўніка меліся кулямёты і пушка. Подступы да моста былі добра ўмацаваны. За 800 м ад моста на станцыі Пціч размяшчаўся ворожы гарнізон да 750 салдат і афіцэраў. Акрамя таго, праціўнік мог хутка падкінуць падмацаванне з суседніх гарнізонаў. І ўсё ж, нягледзячы на гэтыя перавагі, аб'яднанымі намаганнямі партызанскіх атрадаў М.П.Бумажкова, Дз.Ц.Гуляева, А.П.Патрына, А.П.Пакуша, Г.М.Сталярова і іншых, агульнай колькасцю да 1300 чалавек, 3 лістапада 1942 г. была паспяхова праведзена аперацыя па ўзрыве гэтага моста. Стратэгічна важная для ворага чыгунка на 18 сутак выйшла са строю, а з улікам знішчэння на гэтай магістралі іншых мастоў рух на ёй перарваўся больш чым на 3 тыдні. Калі ўлічыць, што да ўзрыву моста па чыгунцы праходзіла штодзённа па 25—30 цягнікоў у бок фронту, то за час перарыву руху праціўнік не змог прапусціць па гэтай дарозе больш за 500 эшалонаў.

Паражэнне фашысцкіх войскаў пад Сталінградам, усеабдымнае полымя партызанскай вайны на часова акупіраванай тэрыторыі ўшчэнт зрывалі фашысцкія планы грабяжу і разбою. Выхад з гэтага становішча вораг шукаў на шляху ўзмацнення палітыкі генацыду і «выпаленай зямлі».

Пачатак 1943 г. увайшоў у гісторыю Глушчыны як час зверскіх распраў фашысцкіх галаварэзаў з грамадзянскім на-

сельніцтвам. Яны захоплівалі жывёлу, зерне, бульбу, іншую сельскагаспадарчую прадукцыю, грабілі маёмасць, насільна адпраўлялі працаздольнае насельніцтва на катаржныя работы ў Германію. Застаўшыхся спальвалі жывымі або расстрэльвалі. Усе пабудовы пажыраў агонь.

20 студзеня 1943 г. страшны лёс напаткаў ціхія глускія вёсачкі, што туліліся між лясоў: Амур, Белая, Масты, Паршчаха, Восы, Калёсы... Яны былі спалены датла разам з іх жыхарамі. У пякельным агні загінулі старыя, жанчыны, дзеці. Вырвацца ўдалося нямногім.

Вестка пра спаленыя вёскі разам з жыўшымі ў іх людзьмі абляцела Глушчыну. Гэта падзея супала з прыняццем у партызанскіх фарміраваннях Мінска-Палескага злучэння прысягі. Паўсюдна праходзілі ўрачыстыя мітынгі, на якіх перад строем сваіх баявых таварышаў кожны партызан даваў урачыстую клятву не шкадаваць сіл, а калі спатрэбіцца, і самога жыцця для свяшчэннай барацьбы з азвярэлым ворагам.

У першай палавіне 1943 г. працягвалася стварэнне буйных партызанскіх фарміраванняў на базе атрадаў, якія ўжо дзейнічалі. На тэрыторыі Глускага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны змагаліся з ворагам 225-я (камандзіры М.П.Бумажкоў, У.З.Пуцята), 100-я Глуская брыгады (камандзір І.М.Кулікоўскі), 37-я брыгада імя А.Я.Пархоменкі (камандзіры П.М.Канавалаў, А.В.Львоў), 123-я Акцябрская брыгада імя 25-годдзя БССР (камандзір Ф.І.Паўлоўскі), 99-я брыгада імя Героя Савецкага Саюза Дз.Ц.Гуляева (камандзіры І.М.Кулікоўскі, А.Ц.Чайкоўскі, У.К.Якавенка), 121-я брыгада імя А.Ф.Брагіна (камандзір К.Ф.Пушчын), 161-я брыгада імя Р.І.Катоўскага (камандзіры А.С.Шашура, загінуў, А.І.Кудашаў), 258-я брыгада імя В.У.Куйбышава (камандзір Г.М.Сталяроў) і іншыя.

Партызанамі праводзілася велізарная

Партызаны 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі. Стаяць справа налева: трэці М.Б.Храпко, чацвёрты А.В.Львоў.

М.М.Урыцкі.

растлумачальная работа сярод насельніцтва Глушчыны. Ва ўмовах варожай акупацыі, калі фашысцкая прапаганда імкнулася шляхам паклёпу, запалохвання падавіць волю патрыётаў да барацьбы, кожная вестка аб баявых поспехах Чырвонай Арміі ўсяляла ў іх сэрцы бадзёрасць, умацоўвала веру ў перамогу над захопнікамі.

Тысячы глушчан выконвалі свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай, гераічна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. І радасныя весткі аб перамогах пад Масквой, а потым пад Сталінградам былі данесены партызанамі да іх родных і блізкіх, якія засталіся на акупіраванай тэрыторыі. Яны сталі для іх гаючай сілай, узняўшай дух, маральныя сілы ў справядлівым гневе супраць фашыстаў.

Чырвоная Армія рыхтавалася нанесці ворагу новы сакрушальны ўдар пад Курскам. Фашысты канцэнтравалі тут сілы, спрабуючы ўзяць рэванш у вайне. Перамога пад Курскам, заявіў Гітлер, павінна з'явіцца факелам для ўсяго свету. У Германіі была праведзена татальная мабілізацыя, яе армія атрымала папаўненне як у жывой сіле, так і ў ваеннай тэхніцы, — тэхніцы, на якую рабілася галоўная стаўка фашысцкага камандавання. Яе прадстаўлялі танкі «тыгр», «пантэра», самаходныя ўстаноўкі «фердынанд», самалёты-знішчальнікі.

Але ўжо было відавочна, што тэатр вайны пераносіцца на захад, і не за гарамі той час, калі Чырвоная Армія пачне новае генеральнае наступленне на фронце. У чаканні яго фашысты ў спешцы будавалі ўмацаванні, рыхтаваліся ўсімі сіламі процістаяць новаму ўдару савецкіх войскаў.

У гэтых умовах перад партызанскімі фарміраваннямі Глушчыны паўсталі новыя складаныя задачы. Галоўная з іх — нанесці масіраваныя ўдары па камунікацыях праціўніка. І да гэтага партызанскія дыверсіі на чыгунках былі адчувальнымі для ворага. Але зараз трэба было павесці самую сапраўдную «рэйкавую вайну», адначасова ў розных месцах разбурыць сотні кіламетраў чыгункі, каб практычна кожны партызан мог прыняць удзел у гэтай аперацыі.

Партызанскім атрадам былі пастаўлены дакладныя задачы. Але каб «рэйкавая вайна» праходзіла паспяхова, без людскіх страт, патрэбна было навучыць людзей падрыўной справе. Летам на Глушчыну прыбыў спецыяльны пасланец ад Цэнтральнага штаба партызанскага руху Майсей Міронавіч Урыцкі, знаток і майстар чыгуначных дыверсій, піянер «рэйкавай вайны» ў Беларусі. Урыцкі меў на сваім рахунку некалькі эшалонаў, падарваных на мінах, выраблены ім самім. Зараз яму трэба было навучыць падрыўной справе дзесяткі мінёраў. Яны, у сваю чаргу, павінны былі стаць інструктарамі-настаўнікамі падрыўной справы ў сябе ў атрадах: даць кожнаму партызану хоць бы мінімум ведаў, неабходных для «рэйкавай вайны».

За кароткі тэрмін многія лясныя байцы авалодалі майстэрствам мінёра і справы ў іх ішлі не горш, чым у іх настаўніка. Лепшымі падрыўнікамі лічыліся Міхаіл Дабрынін, Аляксандр Краснікаў, Васіль Рудзько, Міхаіл Пятроўскі, Аляксей Сяргееў, Андрэй Сіманенка, Дзмітрый Новікаў і многія іншыя. Менавіта гэтыя людзі, на чале невялікіх груп па 5—6 чалавек, рабілі смелыя налёты на чыгунку і пускалі пад адхон варожыя цягнікі.

Заслужаная слава ішла следам і за камсамольска-маладзёжнай дыверсійнай групай пад камандаваннем ураджэнца в. Паршчаха Мікалая Антонавіча Семенчука, з атрада імя Варашылава 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева. На асабістым рахунку Семенчука ў пачатку 1944 г. было дзевяць пушчаных пад адхон чыгуначных саставаў праціўніка. Гэтак жа мужна і самааддана, помсцячы за гібель маці і бацькі, спаленых у в. Паршчаха, змагаліся малодшыя Семенчукі — Яўген і Антаніна.

У атрады авіяцыяй, якая выкарыстоўвала партызанскі аэрадром у Зыславе, дастаўляліся тысячы тон грузаў, у тым ліку ўзбраенне, боепрыпасы, медыкаменты і харчаванне. Было нямала і неабходнага

для «рэйкавай вайны» рыштунку — толавых шашак, узрывальнікаў, бікфордава шнура.

Народныя мсціўцы па загадзе камандавання Цэнтральнага штаба партызанскага руху зрабілі некалькі паўсюдных выхадаў на чыгуначнае палатно. У выніку імі былі падарваны дзесяткі воінскіх эшалонаў і бронецягнікоў праціўніка, большая частка якіх накіроўвалася да Курскай дугі.

Пачалася буйнейшая за ўсю гісторыю вайны бітва...

Бязмежнай была радасць партызан, калі стала вядома пра разгром фашыстаў на Курскай дузе, бо кожны адчуваў, што і ён на далёкай глускай зямлі ўносіў сваю часцінку ў гэты агульны поспех.

Пастаяннымі ўдарамі па варожых камунікацыях і гарнізонах партызаны адцягвалі на сябе значныя сілы праціўніка, наносілі яму немалы матэрыяльны і маральны ўрон.

У сярэдзіне верасня 1943 г. штаб злучэння зноў вырашыў нанесці чарговы масіраваны ўдар па чыгуначных камунікацыях ворага пад назвай «Канцэрт». Гэта быў час, калі, выкарыстоўваючы поспех нашых войскаў на Курскай дузе, Цэнтральны і Заходні франты пачалі ў верасні вызваленне беларускай зямлі.

«Нашай 37-й брыгадзе, — успамінаў яе камісар М.Б.Храпко, — дасталася знаёмая дарога Бабруйск — Асіповічы, участак паміж станцыямі Ясень і Мірадзіна, а да яго ад лагера больш за 100 кіламетраў.

Цяпер рыхтавацца было лягчэй, у нас ужо меўся вопыт, падрыхтаваныя і выпрабаваныя кадры падрыўнікоў. І ў маральных адносінах мы сталі мацнейшымі: дакладнасць, зладжанасць першага паходу, яго эфектыўнасць дзейнічала на ўсіх, як самая таленавітая агітацыя.

...Другія суткі крочыць брыгада, мерае лясныя вёрсты. Вядуць яе разведчыкі Віктар Пелагейка, Дзмітрый Драздоў і Станіслаў Стрычык. Гэтыя лясы яны ведаюць, як сваю хату. Другая ноч у дарозе, а дождж лье як з вядра і цемень...

Каля трох гадзін ночы калона спынілася. Да чыгункі засталося 500 метраў. І адразу ж, згодна зацверджанаму плану, камандзіры разгарнулі свае атрады і павялі на адведзеныя ўчасткі.

1240 узрываў зрабілі мы ў тую ноч, больш трох кіламетраў чыгуначнага палатна знішчылі. Чыгунка на гэтым участку не працавала 12 сутак».

М.А.Семянчук.

А.А.Семянчук.

Я.А.Семянчук.

У.К.Якавенка.

Улада акупантаў абапіралася на воінскую сілу, сканцэнтраваную ў варожых гарнізонах. На Глушчыне іх было нямала. Вось чаму кожны разгромлены партызанамі гарнізон азначаў істотнае паслабленне гэтай улады. Можна смела сказаць, што галоўнымі аб'ектамі партызанскіх «клопатаў» былі нароўні з чыгункай варожыя гарнізоны.

Летам 1943 г., успамінаў камандзір 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева У.К.Якавенка, атрадам імя Кірава, Шчорса, Варашылава і Будзённага была пастаўлена задача разграміць варожы гарнізон у вёсцы Балашэвічы Глускага раёна. Пагодлівым чэрвеньскім ранкам народныя мсціўцы ва ўмоўлены час атакавалі ворага. Захопленыя знянацку гітлераўцы ў паніцы адступілі. Некалькі партызан атрымалі раненні, але ўсе былі вынесены з-пад агню праціўніка. Атрады пачалі адыход з Балашэвіч да Усцярхоў. Ледзь толькі вёска засталася ззаду, як група партызанскага прыкрыцця нечакана была абстраляна

Р.С.Краўчанка.

ворагам. Зноў разгарэўся бой... Гітлераўцы ўшчыльную падступілі да абозу з параненымі, але байцы аховы адну за адной адбівалі атакі фашыстаў...

У 1943 г. партызанамі былі разгромлены варожыя гарнізоны ў вёсках Катка, Слабодка, Халопенічы. У гэтай бліскуча выкананай аперацыі ўдзельнічалі народныя мсціўцы атрадаў Патрына, Пакуша, Гуляева, Цыкункова і Юневіча.

Часам у агульных аперацыях супраць акупантаў у складзе 101-й брыгады імя А.Неўскага ўдзельнічаў і атрад імя І.М.Харсеева, якім камандаваў наш зямляк Рыгор Сяргеевіч Краўчанка.

У жніўні 1943 г. Палескі абком партыі завяршыў утварэнне падпольных партыйных органаў на ўсёй тэрыторыі вобласці. 4 жніўня быў зацверджаны і Глускі падпольны райком КП(б)Б, які дзейнічаў да чэрвеня 1944 г. У яго склад увайшлі сакратары: А.Я.Жулега (4.8.1943 — 8.11.1943), Дз.Н.Удалы (15.11.1943 — сакавік 1944), П.Р.Чарнушын (сакавік 1944 — 28.6.1944), члены райкома: І.Р.Гаўрон, У.А.Станкевіч, У.М.Шваякоў, І.М.Кулікоўскі, Р.І.Ціслюкоў, А.Р.Касцюкевіч, А.І.Рудэнка.

Месцазнаходжанне падпольнага райкома партыі было спачатку ў 100-й Глускай партызанскай брыгадзе (камбрыг І.М.Кулікоўскі), а пазней у 225-й брыгадзе (камбрыг У.З.Пуцята).

Друкаваным органам падпольнага райкома партыі стала газета «Сацыялістычная вёска», а яе рэдактарам быў зацверджаны Станіслаў Францавіч Шумоўскі. Падпольныя райкомы партыі і камсамола, рэдакцыя раённай газеты ў 1943 г. знаходзіліся ў лесе каля в. Зорка. Падпольная раёнка пачала выходзіць са жніўня 1943 г. і друкавалася ў падпольнай друкарні райкома. Усяго ў тыле ворага было выпушчана 5700 экзэмпляраў газеты і надрукавана 12 500 экзэмпляраў лістовак на розныя тэмы.

У ходзе жорсткіх баёў на заходнім напрамку ў апошнія месяцы 1943 г. паміж Бабруйскам і Мазыром у раёне Парыч на

Партызаны атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі на захопленай у ворага танкетцы.

лініі фронту стварыўся «калідор», слаба ўмацаваны сіламі гітлераўцаў. Па ім сяляне Глушчыны адпраўлялі для Чырвонай Арміі прадукты харчавання. Толькі са Слаўкавіцкага сельсавета ў воінскія часці было накіравана больш за тысячу пудоў зерня і мукі, сто галоў жывёлы. Гэтым жа шляхам многія жыхары Глускага раёна папоўнілі рады Чырвонай Арміі. Яе камандаванне дапамагло партызанам узбраенне і амуніцыяй.

Спрабуючы адвесці ўдар з тылу, гітлераўцы зрабілі ў пачатку 1944 г. яшчэ адну спробу знішчыць партызан, якія дыслацыраваліся ў Глускім, Асіповіцкім, Любанскім, Старадарожскім і іншых сумежных раёнах. У лютым супраць 258-й партызанскай брыгады імя В.У.Куйбышава, атрада імя В.І.Чапаева, 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага, 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага былі кінуты знятыя з фронту воінскія часці агульнай колькасцю да 35 тысяч салдат з артылерыяй, авіяцыяй і танкамі. У выніку вялікай перавагі ў жывой сіле і тэхніцы гітлераўцам удалося блакіраваць партызанскія брыгады ў раёне загальскіх балот. За гады акупацыі захопнікам толькі тройчы ўдавалася прайсці ў нескароныя вёскі зоны. У гэты раз іх расправа над ні ў чым не вінаватымі людзьмі была жудаснай. Гітлераўцы разам з паліцаямі ўварваліся ў в. Заеліца, сагналі ўсіх жыхароў у хлеў і, адабраўшы моладзь для адпраўкі ў фашысцкае рабства, жывымі спалілі 100 старых, жанчын і дзяцей. Стаялі такія моцныя маразы, што па балоце прайшлі нямецкія танкі і іншая тэхніка. У цяжкіх умовах партызаны вялі з ворагам жорсткія баі да палавіны красавіка 1944 г. У час фашысцкай блакады загінулі многія народныя мсціўцы і мірныя жыхары, якія жылі ў партызанскай зоне. Але ў канцы красавіка некаторым партызанскім атрадам 161-й брыгады імя Катоўскага ўдалося прарваць кальцо блакады, выйсці ў тыл праціўніка і нанесці яму значны ўрон у жывой сіле і тэхніцы.

Т.А.Матусевіч.

Ляцелі пад адхон эшалоны

З успамінаў Піліпа Іванавіча Мазуркевіча, былога партызана 100-й брыгады імя С.М.Кірава, жыхара в. Калацічы

Пра «рэйкавую вайну», якая праводзілася летам 1943 года партызанамі Беларусі, напісана шмат. А мне давялося самому прымаць удзел у правядзенні гэтай аперацыі нашай брыгадай. У поўным складзе, а гэта шэсць атрадаў, за выключэннем каравула і гаспадарчых узводаў, 2 жніўня партызаны выйшлі на падрыў чыгункі ў раёне станцыі Вярхуціна. Маючы пры сабе зброю, кожная рота несла яшчэ і сякеры, пілы, рыдлёўкі, лямпы, гаечныя ключы і інш. Я ўпершыню ўбачыў сваю брыгаду на маршы ў поўным складзе. Доўгая пешая калона партызан, якія ідуць атрадамі, у людзей — самае рознае ўзбраенне, вопратка, ды і ўзрост далёка не аднолькавы, але ўсе ў вясёлым, прыўзнятым настроі.

Да чыгункі выйшлі з захадам сонца. Ахова, што размяшчалася ў бункерах і дзотах, заўважыўшы падыход партызан у такой колькасці, разбеглася. І хоць да гэтай аперацыі ўсе мы рыхтаваліся даўно, усё ж узрыўчаткі для падрыву чыгункі многа не назапасілі: узрыўныя работы праводзіла толькі спецыяльная група партызан, а ўсе астатнія «працавалі» як і чым хто мог: раскручвалі стыкі рэек, выцягвалі «кастылі», а рэйкі кідалі пад адхон, вываротчвалі шпалы і перапілоўвалі іх папалам, рыдлёўкамі раскопвалі насып, раскідваючы ў кювет і балота.

Дзейнічалі доўга і спакойна. Такая ж дыверсія праводзілася і іншымі партызанамі на ўчастку дарогі Слуцк — Асіповічы.

Выканаўшы задачу, наша брыгада вярнулася на ранейшае месца дыслакацыі. Але

П.І.Мазуркевіч.

25 партызан засталіся ў бліжэйшай вёсцы, а раніцай наступнага дня пад камандай камандзіра ўзвода Івана Фёдаравіча Санкевіча накіраваліся да месца правядзення дыверсіі. Усе разумелі, што фашысты прымуць меры, каб хутчэй аднавіць разбураную дарогу. Наша задача заключалася ў тым, каб перашкодзіць гэтаму.

Калі мы падпаўзлі бліжэй да дарогі і затаіліся, то ўбачылі нечаканую для сябе карціну: на чыгуначным палатне многа жанчын, падлеткаў, юнакоў, ваеннапалонных. Адлегласць да іх невялікая і добра чуваць нямецкія каманды. Мы ляжым і рашаем, як быць у такой сітуацыі, каб не параніць сваіх жа мірных жыхароў. Аб гэтым думае і наш камандзір, вельмі цывільны чалавек. Нарэшце, перадаецца па ланцугу каманда — страляць вышэй галоў. Прагучала першая аўтаматная чарга, затым другая, трэцяя...

Работа на палатне імгненна спынілася, людзі разбягаюцца хто куды. Нікога ўжо няма тут, толькі немцы ды паліцаі вядуць у нашым напрамку бесперапынны агонь. Мы ж страляем з інтэрваламі: беражом патроны... Так працягваецца амаль паўгадзіны, потым гучыць каманда на адыход. К вечару партызаны групы вярнуліся на базу ў вёску Плюсна.

Званок у партызанскай школе

З успамінаў Надзеі Яфрэмаўны Акуліч, былой партызанкі атрада імя В.І.Чапаева 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі

Памяць вяртае ў лета 1942 г., калі ў Зелянковічах адбылася сесія дэпутатаў Казловіцкага сельскага Савета. Адным з пунктаў прынятага на ёй рашэння быў запіс — адкрыць партызанскія школы ў вёсках Зелянковічы і Крукаўшчына.

Мяне выклікалі ў штаб партызанскага атрада да камандзіра М.Б.Храпко. Тут я ўбачыла сваю сяброўку з Крукаўшчыны Антаніну Паўлаву. Акрамя камандзіра ў хаце быў яшчэ і камісар атрада Васіль Емяльянавіч Голадаў.

— Вось што, паважаныя настаўніцы, — сказаў Мікалай Барысавіч, — камандаванне атрадаў прызначае вас загадчыцамі школ у Зелянковічах і Крукаўшчыне. Вайна вайной, а дзяцей трэба вучыць. Ты, Васіль Емяльянавіч, дапамагай у арганізацыі усіх спраў Паўлавай, а Надзеі Яфрэмаўне падсобіць Балоцін.

Н.Я.Акуліч.

Кожны разумеў, што гэта будзе нялёгкая справа. Школьны будынак і мэбля ў ім захаваліся. Але ж патрэбны школьныя прылады і, нарэшце, падручнікі. Дзе ўсё ўзяць?

Але нас супакоілі: будзем рашаць усе гэтыя задачы агульнымі намаганнямі.

Вярталася дамоў і ўстрывожаная, і ўзрушаная. Думка аб тым, што ў нейкіх двух дзесятках кіламетраў ад Глуска і яшчэ на меншай адлегласці ад Балашэвіч, дзе меліся буйныя нямецкія гарнізоны, а інакш кажучы, пад самым носам у фашыстаў, будзе працаваць савецкая школа, усяляла нейкі азарт, і хацелася, нягледзячы ні на што, здзейсніць задуманае.

У першую чаргу трэба было вырашыць, хто будзе вучыць дзяцей. Да вайны школа была сямігодкай, таму будзе працаваць некалькі класаў. Хутка настаўнікі знайшліся: Марыя Данілаўна Булка, Ніна Іванаўна Булка, Еўдакія Іванаўна Пелагейка. Разам склалі спіс вучняў па класах. Алена Антонаўна Грышановіч далучылася да настаўнікаў з в. Крукаўшчына.

Важак камсамольцаў з атрада Шваякова Яфім Яўсеевіч Балоцін, сам па прафесіі настаўнік, паклапаціўся, каб стварыць хоць бы якую-небудзь вучэбную базу. Баявыя групы стараліся прынесці з кожнай аперацыі што-небудзь для школы: сшыткі, нават метадычныя дапаможнікі, алоўкі, падручнікі. У гэтай справе вельмі дапамагалі камсамольскія арганізацыі парты-

занскіх атрадаў Шваякова і Храпко. Настаўнік з в. Поблін Ісідар Лаўрэнавіч Дудар, даведаўшыся пра партызанскія школы, перадаў нам свае даваенныя запасы: больш як 500 сшыткаў, шмат навучальных дапаможнікаў і прылад. Падрыхтоўка ішла вельмі хутка.

Першага кастрычніка 1942 г. школа пачала працаваць. Ніколі не сатрэцца гэты дзень у памяці. На момант забылася, што ідзе вайна, што навокал разбурэнне, галеча і смерць. Дзеці, як і ў мірны час, то па адным, а то чародкамі ішлі ў школу. Да рэчаіснасці вяртала іх адзенне: яно, безумоўна, не было такім прыгожым, як у даваенныя гады. Але адчуванне нечага ўзвышанага і прыгожага, разуменне важнасці падзеі, якую мы перажывалі ў той момант, доўга не пакідалі мяне. І не толькі мяне адну. Сабраліся дарослыя, прыйшлі партызаны, чые дзеці былі залічаны ў школу.

І вось разнесліся пералівы званка. Пачаўся першы ўрок. Ён, безумоўна, таксама адрозніваўся ад першага ўрока мірных дзён. Я бачыла па вачах дзяцей і дарослых, аб чым яны жадаюць зараз пачуць. Як там, на фронце? Ці моцна трымаюцца нашы? Адказы на гэтыя нявыказаныя пытанні дала толькі што атрыманая па радыёпрыёмніку зводка Саўінфармбюро. Потым такая практыка стала няпісаным правілам — выкарыстоўваць у вучобе свежыя зводкі ваенных дзеянняў на фронце. Іх чыталі ў голас на вялікім перапынку.

Камандаванне атрада дазволіла мне, як дырэктару школы, прыходзіць з пропускам на радыёстанцыю і ў навушніках слухаць і запісваць перадачы з Масквы.

Людзі ведалі, што я маю доступ да партызанскага радыёпрыёмніка, часта натоўпам збіраліся ці на двары, ці на вуліцы, каб пачуць свежыя навіны.

Безумоўна, немцы даведаліся пра нашу школу і вырашылі сцерці яе з твару зямлі. То па адным, а аднойчы аж 9 самалётаў наляцелі адразу на вёску і пачалі бамбіць. Пыл, дым, пажарышчы... Не стала нашай любімай школы і многіх вучняў... Самалёты знішчылі Зелянковічы, а адна з бомбаў трапіла прама ў школьны будынак.

Але дзеці пасля гэтага ўсё роўна прыходзілі на школьны двор, дзе пад шапкамі стогадовых дрэў мы працягвалі заняткі ў партызанскай школе. Часам яны пераносіліся ў зямлянку. У гэтай школе дзеці вучыліся не толькі грамаце, яны праходзілі навуку патрыятызму, любві да сваёй Айчыны.

Глыбокай восенню 1943 г. атрады Шваякова і Храпко былі адазваны ў распараджэнне штаба злучэння. Партызанская школа ў Зелянковічах спыніла сваю дзейнасць, а я стала партызанкай атрада імя В.І.Чапаева. Тут, у санчасці ў в. Завалёны Акцябрскага раёна, вучылася ў доктара Паўла Сямёнавіча Слінько даглядаць і лячыць параненых байцоў. Потым я стала разведчыцай.

Для хутчэйшай перамогі

З успамінаў Антаніны Васільеўны Янкоўскай

Вялікі ўклад у перамогу над ворагам унеслі ўсе жыхары в. Крукаўшчына. Яны абагравалі і кармілі партызан, шылі і мылі ім адзенне, вязалі рукавіцы і шкарпэткі, рамантавалі зброю і абутак.

Сціплая і непрыкметная Агата Бахановіч звязала сотні рукавіц і шкарпэтак, камсамолка Вера Навіцкая і кандыдат у члены ВКП(б) Любоў Навіцкая сшылі дзесяткі кажушкоў і маскіровачных халатаў. Надзея Сташэўская, Надзея Гулевіч, Ганна Дайгод і іншыя выпеклі дзесяткі пудоў хлеба. Пажылыя мужчыны Адам Бачынскі, Міхаіл Нікановіч, Мікалай Дайгод і іншыя дубілі скуры і рамантавалі абутак і зброю, вырошчвалі хлеб і гадавалі жывёлу для народных мсціўцаў.

Дзядзька Яўсей

Пасля адступлення савецкіх войскаў у раёне в. Чыкілі засталося шмат рознай зброі і боепрыпасаў. Калгаснік Яўсей Андрэевіч Лях старанна падабраў яе і схаваў у лесе.

Са стварэннем партызанскага атрада імя Шчорса ён перадаў зброю партызанам. У далейшым Яўсей Андрэевіч працягваў збіраць боепрыпасы і зброю.

У 1943 г. з Масквы цераз лінію фронту

была перакінута група чэкістаў для работы ў тыле ворага. Групу ўзначальваў Хрыстафор Прыбыль. Ён стварыў партызанскі атрад разведчыкаў, які трымаў сувязь з Масквой і з падпольнай арганізацыяй Бабруйска.

65-гадовы Яўсей Андрэевіч становіцца сувязным гэтага атрада. Ён адпусціў вялікую бараду і ў немцаў не выклікаў ніякіх падазрэнняў.

Х.С.Прыбыль у сваёй кнізе «Асобае заданне» з любоўю расказвае пра партызанаў-разведчыкаў, пра савецкіх людзей, якія аказвалі падтрымку партызанам: «Пасля разгрому трох прадуктовых складоў у нас наступілі цяжкія дні. Масква патрабавала павышэння баявой актыўнасці і мы яе павышалі. Нам спадарожнічала надвор'е — амаль штодзённа ішоў снег, лютавалі мяцеліцы. Разведчыкі хадзілі ў Бабруйск, кантралявалі дарогі, часта наладжвалі засады. Ішлі на заданне з адным сухаром, які быў разлічаны на суткі. Людзі схуднелі і аслаблі. Прыйшоў дзень, калі быў з'едзены апошні кавалак хлеба. І ўсё ж атрад працягваў існаваць.

Неяк на базу прыйшоў наш сувязны з в. Чыкілі, нізенькі дзядок, дзядзька Яўсей. Я прапанаваў яму шклянку кіпячонай вады без цукру і хлеба. Ён адмовіўся ад пачастунку. Пасядзеў крыху моўчкі, потым устаў, надзеў шапку і сказаў:

— Дай мне, камандзір, двух хлапцоў памацней.

— Гэта навошта? Можа «дабываку» схапіць задумаў?

Дзядзька Яўсей перад гэтым расказваў, што ў вёсцы з'явіўся «дабывака», у якога пад палой ён заўважыў пісталет і гранату.

— Ды не. За бульбай сходзім.

Дзядзька Яўсей паказаў разведчыкам раскіданы склеп, які размясціўся на водшыбе вёскі.

— Гэта я сам крыху разбурыў, каб немцы і паліцаі не пранюхалі, — хітра ўсміхнуўся ён, разграбаючы снег і салому. — Вось тут усё ваша.

У склепе была глыбокая яма, якая даверху была напоўнена бульбай. Разведчыкі спачатку адмовіліся ад такога дарагога падарунка.

— Бярыце, бярыце, бульба мая. Вёскай так парашылі — мяне пракормяць, — дзядзька Яўсей сам пачаў насыпаць мяшкі.

Склеп Яўсея стаў нашай асноўнай прадуктовай базай. І кожны дзень, калі атрымлівалі па некалькі бульбін на абед, разведчыкі з удзячнасцю ўспаміналі сівога Яўсея і чыкілёўскіх сялян».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Яўсей Андрэевіч працаваў у калгасе імя Арджанікідзе і карыстаўся заслужанай павагай у сваіх аднавяскоўцаў.

Ц.М.Тоўсцік.

Дакументы сведчаць

ПРАТАКОЛ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЖЫХАРОЎ в. СЦЯГ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЛАЎКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

29 жніўня 1943 г.

Повестка дня:

1. Хлебопоставки партизанским отрядам.
2. Письмо белорусских воинов к белорусскому народу.
3. Международное положение.

СЛУШАЛИ: Доклад т. Самойлика М.И. о хлебопоставках по д. Стяг Коллективизации.

ПОСТАНОВИЛИ: Мы, граждане д. Стяг Коллективизации, обязуемся на добровольных началах сдать партизанскому отряду Грабко по 1 кг из засеянной сотки разных культур в самый ближайший срок.

СЛУШАЛИ: Доклад т. Самойлика М.И. письмо воинов-белорусов к белорусскому народу.

ПОСТАНОВИЛИ: Мы, граждане д. Стяг Коллективизации обязуемся всеми мерами и средствами помогать партизанским отрядам и Красной Армии в быстрейшем разгроме немецких оккупантов и изгнании их из своей Советской Родины.

Слушали т. Самойлика о международном положении. Зачитали сводку Совинформбюро. Потери противника на фронте в период летнего наступления.

Председатель (подписи)

Члены

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 272. Л. 5.

ПРАТАКОЛ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЖЫХАРОЎ в. СЛАЎКАВІЧЫ

30 жніўня 1943 г.

Повестка дня:

1. Роль партизанского движения в борьбе за освобождение Родины от немецко-фашистских оккупантов и задачи трудящихся.

2. Выборы комиссии содействия по помощи партизанскому отряду.

По первому вопросу докладчик т. Альхимович указал, что партизанское движение есть одно из условий победы над врагом-фашизмом, о росте партизанского движения, об органической связи партизанской борьбы с борьбой всего населения, о практических связях населения с партизанской борьбой и единстве ударов, наносимых врагу нашей армией и партизанами и т.д. и помощи населения партизанским отрядам.

Высказались Наумович Константин, который заявил: «Партизаны наши защитники, здесь говорят, что нужно помочь партизанам хлебом, я считаю, что по 1 кг с сотки мало. Я согласен сдать и по 2 кг, а когда придет сюда наша освободительница — Красная Армия, то найду, чем встретить по-отцовски.

Стрела Татьяна — Я согласна всем помочь нашим партизанам и у нас есть чем помочь.

Ризман Павел — Я думаю, что у нас не имеется ни одного человека, который отказался бы от помощи партизанам. Я считаю, что за чем к нам сегодня обращаются, мы в состоянии удовлетворить. Среди нас находятся люди, которые и больше дадут...

ПОСТАНОВИЛИ: Общее собрание граждан д. Славковичи заверяет т. Сталина и в его лице нашу РККА, что все как один всегда будем вести борьбу с врагом нашим — фашистами до тех пор, пока ни одного немца не останется на нашей земле.

Мы добровольно обязуемся помогать нашим защитникам-партизанам продуктами питания, инвентарем, собственным трудом и всем, что будет на пользу в борьбе с фашистами.

Для обеспечения хлебом, крупой и другими продуктами мы обязуемся дать партизанскому отряду им. Буденного (командир Цыкунков) по одному кг с сотки.

Для решения всех вопросов по помощи партизанскому отряду хлебом и другими продуктами собрание считает необходимым избрать комиссию содействия в составе 5 человек (постановление принято единогласно).

Слушали по образованию комиссии содействия по оказанию материальной помощи (партизанскому) отряду.

ПОСТАНОВИЛИ: Простым большинством голосов оказались избранными в состав комиссии содействия Козловский Владимир, Гаврон Иосиф, Ризман Павел, Жовнерчик Анастасия, Балтушкин Михаил.

Председателем комиссии избрали В.Козловского.

Председатель (подписи)

Члены

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 272. Л. 8—10.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Сям'я патрыётаў

У сям'і Макейчыкаў, што жылі ў Зубарэвічах, было чацвёра дзяцей — тры сыны і адна дачка. Калі пачалася вайна, ні ў каго з іх не было ваганняў, што рабіць. Толькі змагацца!

Першым устанавіў сувязь з партызанамі атрада Храпко Аляксандр і неўзабаве стаў з імі ў адзін строй. Яго назначылі палітруком узвода. Крыху пазней перавялі ў брыгаду І.М.Кулікоўскага намеснікам камісара па камсамоле. Акрамя таго, Аляксандр Макейчык з сакавіка 1942 г. з'яўляўся членам Глускага падпольнага райкома ЛКСМБ, з сакавіка 1943 г. — сакратаром райкома па прапагандзе, а з верасня гэтага ж года ўзначаліў райком камсамола. Жыццё мужнага важака моладзі, якога ўсе любілі і паважалі, абарвалася 13 красавіка 1944 г. у баі з фашыстамі.

Бацьку арыштавалі адразу, як толькі Аляксандр пайшоў у партызаны. Паліцэйскія так яго збілі, што праз некалькі дзён, у лютым 1942 г., Макар Малафеевіч памёр.

У непахіснай барацьбе з ворагам гартаваліся характары і двух меншых сыноў Макейчыкаў — Паўла і Івана. Спачатку яны былі сувязнымі партызан, а ў жніўні 1942 г. сталі байцамі атрада імя Кірава.

І.М.Макейчык.

А.М.Макейчык.

Маці, пасля таго, як абодва меншыя сыны пайшлі ў партызаны, была арыштавана і дастаўлена ў глускае гестапа. Дамоў Варвара Ільінічна больш не вярнулася.

Сваю лепту ва ўсенародную барацьбу з ворагам унесла і дачка Макейчыкаў — Алена. Калі браты сталі партызанамі, яна замяніла іх як сувязная атрада імя Кірава. Алена Макараўна да дня вызвалення раёна ад акупантаў добрасумленна выконвала ўсе заданні камандавання 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі.

Іван Макейчык пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ваяваў з фашыстамі, пакуль не закончылася вайна. З яе ён прыйшоў інвалідам 2-й групы, часта хварэў і ў 1980 г. памёр.

Т.А.Матусевіч.

Неўзабаве пасля прыходу ў атрад у баі з фашыстамі ў раёне в. Рымаўцы Бабруйскага раёна Павел загінуў.

Партызанскія арляняты

Так любоўна называлі народныя мсціўцы падлеткаў, якія разам з дарослымі прымалі ўдзел ва ўсенароднай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Іх было нямала...

Валянцін Філіпчык, ураджэнец в. Гарадок Завалочыцкага сельсавета, пачаў гэтую барацьбу ў няпоўных трынаццаць гадоў.

Бацька Канстанцін Фаміч Філіпчык перад вайной працаваў дырэктарам саўгаса «Завалочыцы», фашысты яго расстралялі. Каб змагацца з ненавісным ворагам і помсціць за бацьку, уся сям'я Філіпчыкаў спачатку дапамагала бабруйскім падпольшчыкам, а потым, калі ўзнікла небяспека правалу, пайшла ў партызаны. Георгія Філіпчыка залічылі ў атрад Дзмітрыя Сезіка, а Анастасію Георгіеўну, дачку Надзю і самага меншага сына Валянціна — у атрад імя Фурманава, якім камандаваў Васіль Шчэрбіч.

Каб удзельнічаць у баявых аперацыях разам з дарослымі, Валянцін пайшоў на хітрасць — прыбавіў сабе гады, і яго залічылі ў разлік станковага кулямёта. Праз пару дзён ён ужо прымаў удзел у баі ў Стасеўцы.

Пры падрыве чыгункі Георгій Філіпчык загінуў. Яго смерць для сям'і была цяжкім ударам.

З таго часу Валянцін Філіпчык змагаўся з гітлераўцамі за траіх: за сябе, за бацьку і за брата...

Міша Лубкоў быў вельмі ўдзячны сваёй настаўніцы па нямецкай мове Валянціне Міхайлаўне Аторынай, якая сяму-таму навучыла яго ў сёмым класе: хлопец разумеў, аб чым ідзе гаворка, калі размаўлялі немцы, і сам мог сказаць па-нямецку некалькі простых фраз. Відаць, гэта акалічнасць і стала вызначальнай, калі глускаму каменданту сельскагаспадарчай камендатуры палкоўніку Гофману спатрэбіўся работнік для хатніх спраў. Міша добра спраўляўся са сваімі абавязкамі, і Гофману гэта спадабалася. Пазней ён перадаў хлопца ў Завалочыцы свайму прыяцелю Оту Фішэру.

Тут Міша, як і ў Глуску, чысціў каменданту боты, калоў дровы, даглядаў каня. Фішэр любіў ездзіць вярхом, і, калі садзіўся, абавязкова праводзіў чыстай хусцінкай па спіне каня. Калі хусцінка цямнела, Міша атрымліваў тры ўдары плёткай, у канец якой быў ушыты кавалак волава.

Хлопец ненавідзеў фашыста і ўсё думаў, як яму адпомсціць.

Нарэшце, прыдумаў... Перастаў грубіць немцу, стаў мяккім, клапатлівым, словам — цішэй вады, ніжэй травы.

Камендант прыкмеціў перамены ў Мішыных паводзінах і сам таксама палагоднеў. Аднойчы ён даў хлопцу свой ключ і сказаў, каб ён з гэтага часу прыбіраў таксама і яго пакой.

Часавы, які стаяў каля ўвахода ў рэзі-

дэнцыю каменданта, кожны раз правяраў Мішын чамаданчык, з якім ён прыходзіў на работу, там ляжалі шчоткі для чысткі абутку, вакса і іншыя патрэбныя для прыбірання рэчы. Але хутка абодва амаль што пасябравалі: Міша прыносіў Гансу то мёд, то яйкі, то масла. І праз два месяцы той ужо давяраў Лубкову як свайму.

Прыбіраючы ў пакоі каменданта, Міша знайшоў у шафе, якая не зачынялася, аўтамат і касеты з патронамі, гранаты, пісталет-браўнінг.

Аднойчы летнім днём 1943 г. да Фішэра прыехаў у госці яго прыяцель з Глуска. З гэтай нагоды быў наладжаны банкет. Міша разам з прыслугай дапамагаў накрываць святочны стол, насіў з кухні гарэлку, каньяк, закускі. Пад вечар немцы добра асалавелі. Аднаго павёз у камендатуру ад'ютант, а другі патрабаваў да сябе Мішу, каб пачаставаць каньяком. Прыслуга паступова разышлася...

Засталіся Міша і Фішэр.

Пасля двух кілішкаў каньяку каменданта зусім развязло. Ён схіліўся над сталом і пачаў драмаць. Тады Міша падышоў да яго і два разы стрэліў з браўнінга ў патыліцу. Зачыніў пакой на ключ, а сам падаўся з чамаданам, у якім заўсёды насіў свае рэчы для ўборкі, на двор. Толькі на гэты раз замест іх у чамаданчыку ляжала ўся зброя з шафы завалочыцкага каменданта. У канцы сядзібы хлопец ускочыў на каня і падаўся ў лес да партызан...

Вайна ахінула сваім чорным крылом сям'ю жыхара в. Зелянковічы Фядота Патапенкі. Сам Фядот у пачатку 1942 г. стаў партызанам атрада імя Кірава, камандаваў узводам. Але жыццё яго аказалася кароткім: у баі з фашыстамі партызан загінуў, а яго сям'я ў час карнай экспедыцыі была знішчана: жонку і маці расстралялі, сясцёр Ганну і Варвару замучылі. Толькі двум яго сынам — дзевяцікласніку Рыгору і піянеру Валодзю ўдалося пазбегнуць расправы, дзякуючы дапамозе цёткі Веры Патапенка.

Усе трое прыйшлі ў партызанскі атрад імя Шчорса. Вера і Рыгор сталі байцамі, а дзевяцігадовы Валодзя — выхаванцам атрада.

Храбры дыверсант і разведчык Рыгор Патапенка неўзабаве загінуў, гэта здарылася вясной 1943 г. пры падрыве чыгункі. Валодзя цяжка перажываў смерць свайго

В.К.Філіпчык.

М.Я.Лубкоў.

У.Ц.Голуб.

Віктар Гаўрылін.

адзінага брата. Партызаны атрада праяўлялі асаблівыя клопаты да хлапчука, каб ён не адчуваў адзіноты. Начальнік штаба атрада Я.Я.Балоцін прапанаваў Валодзю стаць яго ад'ютантам. Валодзя вельмі ўзрадаваўся гэтай прапанове. Хутка хлапчуку пашылі ў атраднай майстэрні патрэбнае адзенне, падабралі каня для верхавой язды. Многія партызаны прыходзілі палюбавацца, калі Валодзя ехаў вярхом. Выдатны ад'ютант з яго атрымаўся!

У партызанскіх атрадах змагаліся разам з бацькамі падлеткі Валодзя Голуб, сын удзельніка грамадзянскай вайны Цярэнція Яўхімавіча Голуба, і Віктар Гаўрылін. Бацька Віктара быў старшынёй аднаго з калгасаў на Глушчыне, і калі пачалася вайна, ён разам з жонкай і падлеткам-сынам пайшоў партызаніць. Віктар Гаўрылін у свае чатырнаццаць гадоў рабіў адну агульную справу з дарослымі — граміў фашыстаў. У атрадзе Б.М.Цыкункова гэта быў самы малады баец.

Вызначыўся ў баях і былы вучань Гарадкоўскай сярэдняй школы Міхаіл

Елін, які перад вайной закончыў 7 класаў. Сам ён родам з Заполля Завалочыцкага сельсавета. Добраахвотнік-партызан атрада імя Шчорса Міша ў баях і аперацыях на чыгунцы дзейнічаў надзвычай смела і мужна. У атрадзе яго прынялі ў камсамол.

Браты Арон і Яфім Хархурыны, піянеры Сямён і Соня Духітэйны, навучэнцы Альбін Леановіч з в. Людвінова, Лугін Мікалай з Бабірова, Вольга Кавальчук з Бабруйска і многія іншыя падлеткі. Яны мужалі ў баях, а калі патрэбна было, не шкадавалі жыцця дзеля перамогі.

Т.А.Аляксандрава.

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Глускага раёна

ПАЛЕСКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ

Створана 15.3.1943 г. паводле ўказання ЦК КП(б)Б і загаду Беларускага штаба партызанскага руху. Кіраўніцтва: сакратары Палескага падпольнага абкома КП(б)Б Ф.М.Языковіч, І.Дз.Вятроў, М.І.Малінін, камандзіры Ф.М.Языковіч, І.Дз.Вятроў, начальнікі штаба А.М.Бяленчык, К.М.Бакун, Р.М.Дарожка, М.Л.Пінязік, Р.І.Слепаў. З мая 1942 г. да сакавіка 1943 г. партызанскія атрады, якія дзейнічалі на поўначы Палескай вобласці, ўваходзілі ў злучэнне партызанскіх атрадаў Мінскай і Палескай абласцей.

Партызанская брыгада 100-я Глуская

Створана ў верасні 1943 г. на базе атрадаў Б.М.Цыкункова (пазней імя Будзённага, арганізаваны ў красавіку 1942 г.), П.Я.Ігуменава (пазней «За Савецкую Радзіму», арганізаваны ў студзені 1942 г. на базе групы А.Г.Балахонава, якая дзейнічала з 1941 г.), І.А.Бабіча (пазней імя Калініна, арганізаваны ў студзені 1943 г.). Камандзір І.М.Кулікоўскі, камісары А.Я.Жулега, Дз.Н.Удалой, П.Р.Чарнушын, начальнік штаба П.Я.Ігуменаў.

Ф.М.Языковіч.

Партызанская брыгада 123-я Акцябрская імя 25-годдзя БССР

Створана ў маі 1942 г. Камандзіры брыгады Ф.І.Паўлоўскі, С.В.Маханька, І.М.Мярзляк, камісары С.В.Маханька, С.І.Бацішчаў, Я.А.Татараў, начальнікі штаба Р.І.Бар'яш, І.Р.Жулега, А.Р.Волкаў, Ф.А.Лосеў.

МІНСКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ

Створана ў лістападзе 1941 г. — лютым 1942 г. пад кіраўніцтвам Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б на тэрыторыі паўднёвых раёнаў Мінскай вобласці. Адначасова ў паўночных раёнах Палескай вобласці сфарміравалася злучэнне партызанскіх атрадаў (камандзір Ф.І.Паўлоўскі). У красавіку 1942 г. яны аб'ядналіся ў злучэнне партызанскіх атрадаў Мінскай і Палескай абласцей. З утварэннем Палескага партызанскага злучэння (сакавік 1943 г.) рэарганізавана ў Мінскае партызанскае злучэнне.

Камандзіры В.І.Казлоў, Р.Н.Мачульскі, І.А.Бельскі, начальнікі штаба П.М.Канавалаў, К.М.Бакун, М.П.Куксаў, Р.В.Гнусаў.

Партызанская брыгада 37-я імя А.Я.Пархоменкі

Створана ў студзені 1943 г. на базе атрадаў М.Б.Храпко (пазней імя Кірава, арганізаваны ў студзені 1942 г.), У.М.Шваякова (пазней імя Шчорса, арганізаваны ў студзені 1942 г.), П.Я.Ігуменава (пазней «За Савецкую Радзіму»), У.К.Якавенкі (пазней імя Варашылава), М.П.Сезіка (пазней імя Чапаева). У брыгадзе створаны атрады імя Фурманава (чэрвень 1943 г., камандзіры В.А.Шчэрбіч, В.І.Бурчак, В.Л.Кучугура, камісары М.С.Лінчук, М.К.Лемеш, начальнік штаба А.В.Платоненка) і імя Арджанікідзе (лістапад

І.Дз.Вятроў.

В.А.Шчэрбіч.

У.С.Мірошнікаў.

С.К.Ляшчэня.

А.Ц.Чайкоўскі.

У.С.Жлобіч.

В.Я.Харахорын.

А.М.Трацэнка.

1943 г., камандзіры В.П.Нікіфараў, Н.С.Капінскі, камісар П.С.Грынь, начальнікі штаба Г.П.Созінаў, У.С.Мірошнікаў). Камандзіры брыгады П.М.Канавалаў, А.В.Львоў, камісары С.К.Ляшчэня, М.Б.Храпко, начальнікі штаба Я.М.Качанаў, С.В.Сыракваш, Я.С.Раманаў.

Партызанская брыгада 99-я імя Дз.Ц.Гуляева

Створана ў студзені 1943 г. на базе атрадаў Дз.Ц.Гуляева, У.Ц.Шантара, А.П.Пакуша, Б.М.Цыкункова, М.Ц.Грабкі. Камандзіры І.М.Кулікоўскі, А.Ц.Чайкоўскі, У.К.Якавенка, камісары А.Ц.Чайкоўскі, М.К.Панцялеенка, начальнікі штаба В.М.Сярэдзін, В.М.Каракулін. У верасні 1943 г. у брыгаду ўвайшоў атрад імя Варашылава (арганізаваны ў красавіку 1942 г., да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, потым у партызанскай брыгадзе 37-й імя Пархоменкі, камандзіры Я.М.Качанаў, У.К.Якавенка, В.М.Каракулін, У.С.Жлобіч). У ліпені 1943 г. у складзе брыгады створаны 3-і атрад (пазней імя Г.К.Жукава), у верасні — атрад імя Воранава (камандзір В.Я.Харахорын, камісар А.М.Трацэнка, начальнік штаба І.С.Корбут). У снежні 1943 г. — студзені 1944 г. брыгада перадыслацыравана ў Целяханскі раён.

Партызанская брыгада 161-я імя Р.І.Катоўскага

Створана ў студзені 1943 г. на базе атрадаў А.С.Шашуры (пазней імя Пархоменкі, арганізаваны ў красавіку 1942 г.), Ф.М.Анісімава (пазней імя Дзяржынскага, арганізаваны ў сакавіку 1942 г.), імя Чэлюскінцаў (пазней імя Шашуры, арганізаваны ў красавіку 1942 г.). Камандзіры А.С.Шашура (загінуў), А.І.Кудашаў, камісары А.І.Кудашаў, П.І.Разувакін (загінуў), М.С.Паланейчык, начальнік штаба В.Р.Лабзін.

Партызанская брыгада 225-я

Створана ў сакавіку 1943 г. на базе атрадаў У.Ц.Шантара (пазней імя Гастэлы, арганізаваны ў лістападзе 1941 г.), М.П.Бумажкова (пазней імя Суворава, ар-

А.П.Пакуш.

Б.К.Зялёнка.

В.М.Багдановіч.

К.Ф.Пінчук.

Я.І.Іваноў.

Я.Я.Балоцін.

ганізаваны ў студзені 1942 г.) і А.П.Пакуша (пазней імя Чапаева, пачаў стварацца ў ліпені 1941 г. у Акцябрскім раёне, сфарміраваны ў лютым 1942 г.). Камандзіры брыгады М.П.Бумажкоў, У.З.Пуцята, камісары Б.К.Зялёнка, У.С.Станкевіч, начальнікі штаба У.З.Пуцята, А.Я.Шчацько.

Партызанская брыгада 121-я імя А.Ф.Брагіна

Створана ў кастрычніку 1943 г. Камандзір К.Ф.Пушчын, камісар В.М.Якіменка, начальнік штаба М.П.Шардыка.

Партызанская брыгада 258-я імя В.У.Куйбышава

Створана ў снежні 1943 г. Камандзір Г.М.Сталяроў, камісар В.І.Смірноў, начальнікі штаба В.П.Волгаў, В.С.Дунаеў.

Атрад У.Ц.Шантара (з кастрычніка 1943 г. прысвоена імя М.Ф.Гастэлы)

Арганізаваны ў лістападзе 1941 г. на базе ініцыятыўнай групы У.Ц.Шантара — Т.Ц.Жулегі, выдзеленай атрадам «Чырвоны Кастрычнік» Акцябрскага раёна, і з жыхароў в. Халопенічы Глускага раёна.

У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў атрадзе налічваліся 94 партызаны. Камандзіры атрада: Шантар Уладзімір Цімафеевіч (лістапад 1941 — чэрвень 1943), Багдановіч Віктар Мітрафанавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944), Юневіч Павел Міхайлавіч (чэрвень 1944). Камісары: Жулега Трафім Цярэнцьевіч (лістапад 1941 — студзень 1942), Пінчук Конан Фёдаравіч (чэрвень 1942 — верасень 1943), Станкевіч Уладзімір Адамавіч (верасень 1943 — кастрычнік 1943), Адзінец Ізот Навумавіч (кастрычнік 1943 — май 1944), Лобах Павел Сцяпанавіч (май 1944 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Лобах Павел Сцяпанавіч (верасень 1943 — май 1944), Адзінец Андрэй Мікалаевіч (май 1944 — чэрвень 1944).

З гэтага атрада ў студзені 1942 г. была вылучана ініцыятыўная група з 15 чалавек, якую ўзначаліў М.П.Бумажкоў з мэтай стварэння асобнага атрада. З красавіка ён пачаў дзейнічаць самастойна.

Атрад У.М.Шваякова (пазней атрад імя М.А.Шчорса)

Арганізаваўся на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам «Чырвоны Кастрычнік» у кастрычніку 1941 г., партыйна-савецкага актыву і ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння.

У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 350 партызан. Камандзіры атрада: Шваякоў Усцін Мікітавіч (студзень 1942 — жнівень 1943), Вежнавец Васіль Мікалаевіч (жнівень 1943 — люты 1944), Нікіфараў Васіль Паўлавіч (люты

1944 — чэрвень 1944). Камісары: Левітан Міхаіл Сямёнавіч (студзень 1942 — сакавік 1942, загінуў), Іваноў Якаў Ільіч (ліпень 1942 — май 1943), Мілевіч Аляксандр Іосіфавіч (май 1943 — ліпень 1943), Глінскі Аляксандр Данілавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Сезік Мацвей Пятровіч (люты 1942 — верасень 1942), Цярэнцьеў Сяргей Акакіевіч (верасень 1942 — май 1943), Лях Трафім Васільевіч (май 1943 — сакавік 1944), Балоцін Яфім Яўсеевіч (сакавік 1944 — чэрвень 1944).

Атрад М.П.Сезіка

У верасні 1942 г. з атрада Шваякова была вылучана ініцыятыўная група на чале з М.П.Сезікам для арганізацыі новага атрада. Да групы далучыліся жыхары вёсак Чыкілі, Казловічы, Сцяпанаўка Глускага і Гарохаўка Бабруйскага раёнаў. 28 кастрычніка 1943 г. атраду прысвоена імя В.І.Чапаева. У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў атрадзе налічвалася 205 партызан. Камандзір атрада Сезік Мацвей Пятровіч (верасень 1942 — чэрвень 1944). Камісары: Панкратаў Пётр Іванавіч (верасень 1942 — кастрычнік 1943), Папоў Фёдар Цімафеевіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944). Начальнік штаба Маніцын Васіль Васільевіч (верасень 1942 — чэрвень 1944).

Атрад М.Б.Храпко (28 кастрычніка 1943 г. атраду прысвоена імя С.М.Кірава)

У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 274 партызаны. Камандзіры атрада: Храпко Мікалай Барысавіч (студзень 1942 — жнівень 1943), Голадаў Васіль Емяльянавіч (жнівень 1943 — снежань 1943, загінуў), Царык Максім Кірылавіч (студзень 1944 — люты 1944, загінуў), Шпрыгаў Уладзімір Фёдаравіч (люты 1944 — чэрвень 1944). Камісары: Голадаў Васіль Емяльянавіч (студзень 1942 — жнівень 1943), Буянаў Пётр Мікітавіч (жнівень 1943 — люты 1944, загінуў), Гуткоўскі Міхаіл Рыгоравіч (люты 1944 — красавік 1944), Тасмінскі Іосіф Ігнатавіч (красавік 1944 — чэрвень 1944), намеснік камісара па камсамоле Харламаў Аляксей Паўлавіч. Начальнікі штаба: Сыраквашын Сяргей Васільевіч (студзень 1942 — ліпень 1943), Кальянаў Васіль Андрэевіч (жнівень 1943 — снежань 1943), Міцялін Уладзімір Пятровіч (снежань 1943, загінуў), Драздоў Дзмітрый Васільевіч (студзень 1944 — чэрвень 1944).

В.В.Маніцын.

І.І.Тасмінскі.

А.П.Харламаў.

С.В.Сыраквашын.

Дз.В.Драздоў.

Атрад Г.М.Сталярова (з кастрычніка 1943 г. насіў імя В.І.Чапаева)

Сфарміраваны ў снежні 1941 г. 10 жніўня 1941 г. група ваеннаслужачых (11 чалавек), якія трапілі ў акружэнне, паклала пачатак арганізацыі гэтага атрада.

Б.Ф.Любанец.

І.С.Корбут.

Пазней да яе далучыліся патрыёты в. Слаўкавічы Глускага раёна, групы ваеннаслужачых на чале з Мядзведзевым і Хаўкіным. У снежні 1941 г. групы аформіліся ў атрад. З яго для арганізацыі новых атрадаў выдзеліліся групы А.Ц.Чайкоўскага, Дз.Ц.Гуляева, В.С.Статкевіча, П.М.Кандрусёва.

У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 93 партызаны.

Камандзіры атрада: Сталяроў Георгій Мікалаевіч (снежань 1941 — снежань 1943), Гнідзін Рыгор Аляксеевіч (снежань 1943 — чэрвень 1944). Камісары: Гуляеў Дзмітрый Цімафеевіч (красавік 1942 — май 1942), Смірноў Віталь Іванавіч (чэрвень 1942 — снежань 1943), Мацанаў Анатоль Станіслававіч (снежань 1943 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Волгаў Васіль Паўлавіч (снежань 1942 — снежань 1943), Мартыновіч Раман Мікалаевіч (снежань 1943 — чэрвень 1944).

У снежні 1943 г. атрад імя В.І.Чапаева ўвайшоў у склад 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, створанай у адпаведнасці з загадам штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці, якая дзейнічала ў Любанскім, Старадарожскім, Старобінскім раёнах Мінскай, Акцябрскім і Глускім раёнах Палескай абласцей.

Атрад Б.М.Цыкункова (з кастрычніка 1943 г. прысвоена імя С.М.Будзённага)

Сфарміраваны 23 красавіка 1942 г. Б.М.Цыкунковым, Б.Ф.Любанцом, П.С.Корбутам і інш. з жыхароў Слаўкавіцкага і Дакольскага сельсаветаў Глускага раёна. З 10 студзеня 1943 г. па 6 верасня 1943 г. дзейнічаў у складзе 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева Мінскай вобласці. У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 184 партызаны.

Камандзір атрада Цыкункоў Барыс Мітрафанавіч (красавік 1942 — чэрвень 1944). Камісары: Любанец Барыс Фёдаравіч (красавік 1942 — сакавік 1943), Альхімовіч Мікалай Міронавіч (сакавік 1943 — жнівень 1943), Жукаў Іван Мікалаевіч (жнівень 1943 — снежань 1943), Гаўрон Іосіф Рыгоравіч (снежань 1943 — май 1944), Далганаў Анатоль Нічыпаравіч (май 1944 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Корбут Іван Сцяпанавіч (красавік 1942 — люты 1943), Рэпін Пётр Паўлавіч (люты 1943 — сакавік 1944), Леўчанка Міхаіл Анісімавіч (сакавік 1944 — чэрвень 1944).

6 верасня 1943 г. увайшоў у 100-ю Глускую брыгаду.

Атрад імя Дз.Ц.Гуляева

У маі 1942 г. з атрада Г.М.Сталярова была вылучана група партызан на чале з Дз.Ц.Гуляевым, у якую ўліліся жыхары вёсак Слаўкаўшчыны і іншых прылягаючых да яе мясцін. Так у Глускім раёне ўтварылася яшчэ адно партызанскае фарміраванне.

Атрад Дз.Ц.Гуляева да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, да 25 чэрвеня — у складзе 99-й брыгады Мінскай вобласці, затым у складзе 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага Мінскага злучэння. 9 верасня 1943 г. атраду прысвоена імя камандзіра брыгады Героя Савецкага Саюза Дз.Ц.Гуляева. У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў ім налічвалася 165 партызан.

Камандзіры атрада: Гуляеў Дзмітрый Цімафеевіч (май 1942 — чэрвень 1943), Рыжэнка Сяргей Рыгоравіч (чэрвень 1943 — верасень 1943), Баразнёнак Венядзікт Андрэевіч (верасень 1943 — ліпень 1944, камісар Легастаеў Мікалай Цімафеевіч (жнівень 1943 — ліпень 1944). Начальнікі штаба: Палякоў Сяргей Міхайлавіч (май 1942 — ліпень 1943), Тузлукоў Іван Ціханавіч (жнівень 1943 — ліпень 1944).

Атрад «За Савецкую Радзіму»

У ваенную восень 1941 г. у Глускім і Акцябрскім раёнах дзейнічала таксама партызанская група А.Г.Балахонава. У студзені 1942 г. яна сфарміравалася ў партызанскі атрад, які пазней атрымаў назву «За Савецкую Радзіму» (ці атрад

П.Я.Ігуменава). У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 141 партызана.

Камандзіры атрада: Балахонаў Аляксандр Гаўрылавіч (студзень 1942 — красавік 1942, загінуў), Праходскі Міхаіл Лявонцьевіч (красавік 1942 — верасень 1942), Ігуменаў Пётр Ягоравіч (верасень 1942 — верасень 1943), Бабіч Васіль Паўлавіч (верасень 1943 — снежань 1943, чэрвень 1944), Юневіч Павел Міхайлавіч (снежань 1943 — чэрвень 1944). Камісары: Цымкоўскі Зяма Мендзелевіч (студзень 1942 — ліпень 1942), Караблін Васіль Піліпавіч (студзень 1943 — ліпень 1943), Плыткевіч Ісак Пятровіч (ліпень 1943 — кастрычнік 1943), Пінчук Конан Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — студзень 1944), Захарынскі Іван Ільіч (студзень 1944 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Бабіч Васіль Паўлавіч (студзень 1942 — верасень 1943), Кусянкоў Міхаіл Ціханавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

Атрад І.А.Бабіча

На базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай з гэтага партызанскага фарміравання, 1 студзеня 1943 г. арганізаваўся атрад І.А.Бабіча, якому пазней было прысвоена імя М.І.Калініна. На дзень злучэння яго з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 89 партызан.

Камандзір атрада Бабіч Іван Антонавіч (студзень 1943 — чэрвень 1944). Камісары: Чарнушын Пётр Раманавіч (май 1943 — люты 1944), Макейчык Аляксандр Макаравіч (люты 1944 — красавік 1944, загінуў), Рынейскі Баляслаў Валяр'янавіч (красавік 1944 — чэрвень 1944). Начальнік штаба Паточыц Яўстрат Гаўрылавіч (студзень 1943 — чэрвень 1944).

Атрад А.П.Пакуша (з кастрычніка 1943 г. атрад імя В.І.Чапаева)

Пачаў арганізоўвацца ў ліпені 1941 г. па ініцыятыве А.П.Пакуша і А.Я.Жулегі ў Ляскавіцкім сельсавеце Акцябрскага раёна. Канчаткова атрад сфарміраваўся ў лютым 1942 г. У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў ім налічваліся 204 партызаны. Камандзір атрада Пакуш Антон Пятровіч (люты 1942 — чэрвень 1944). Камісары: Жулега Анатоль Якаўлевіч (люты 1942 — верасень 1943), Кузьміч Антон Вікенцьевіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Пуцята Уладзімір Захаравіч (чэрвень 1942 — сакавік 1943), Чэрнікаў Павел Міхайлавіч (красавік 1943 — верасень 1943), Дубоўскі Мікалай Сяргеевіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

В.П.Бабіч.

І.І.Захарынскі.

І.А.Бабіч.

Б.В.Рынейскі.

Я.Г.Паточыц.

У.З.Пуцята.

Са студзеня па сакавік 1943 г. атрад А.П.Пакуша знаходзіўся ў складзе 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева Мінскай вобласці. Затым стаў састаўной часткай 225-й брыгады Палескай вобласці.

На тэрыторыю раёна распаўсюджвалі таксама свае дзеянні народныя мсціўцы з

іншых атрадаў, якія дзейнічалі ў суседніх з Глушчынай раёнах.

У сувязі з колькасным ростам і павышэннем баявых магчымасцей атрадаў яны сталі больш цесна ўзаемадзейнічаць паміж сабой. Партызаны часцяком наносілі ўдары па ворагу сумеснымі намаганнямі, што дазваляла больш паспяхова і ўпэўнена праводзіць аперацыі супраць фашысцкіх захопнікаў.

Сакратар падпольнага райкома

Пётр Раманавіч Чарнушын нарадзіўся ў 1915 г. у в. Жалвінец Глускага раёна ў сялянскай сям'і. У 1933—1936 гг. вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пасля працаваў настаўнікам у школах Плешчаніцкага і Глускага раёнаў. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны быў загадчыкам Глускага раённага аддзела народнай адукацыі. Член КПСС з мая 1941 г. У партызанах з лютага 1942 г. — камандзір узвода, камісар атрада. Камісар 100-й Глускай партызанскай брыгады. Адначасова з сакавіка 1944 г. узначальваў Глускі падпольны райком КП(б)Б. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў на партыйнай рабоце ў Магілёўскай вобласці. Быў узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА № 19 ПАСЯДЖЭННЯ ГЛУСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б АД 9 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

СЛУШАЛИ: о боевой и диверсионной деятельности отрядов им. Суворова бригады № 225 и им. Калинина бригады № 100.

Докладывали командиры отрядов тт. Бабич В.П., Бабич И.А., комиссары отрядов тт. Костюкевич А.Г., Рынейский Б.В.

Высказались: тт. Путято, Станкевич, Бабук, Чернушин, Куликовский, Цыкунков, Дорошкин, Пакуш.

Постановили: 1. РК КП(б)Б отмечает, что за последнее время боевая и диверсионная деятельность отрядов значительно ослабла. Плохо организована ближняя и дальняя разведка и контрразведка. Отсутствует систематическая политико-воспитательная работа среди партизан и мирного населения. Имеются факты мородерства со стороны партизан, недисциплинированности, различного рода нездоровые, враждебные разговоры. Командование отрядов, об этом зная, не принимают никаких мер воспитания и наказания.

В связи с неорганизованным выходом с блокады отр. им. Калинина до сих пор еще не собран. Отдельные группы этого отряда бродят по лесу, занимаются мородерством и хулиганством. Командование отрядов не руководило в достаточной мере боевой, диверсионной деятельностью, а партийные и комсомольские организации не мобилизовали боевой состав на выполнение активных боевых действий...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4392. Воп. 1. Спр. 1. Л. 12.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

«Дзмітрый Гуляеў быў асобай незвычайнай...»

ГУЛЯЕЎ Дзмітрый Цімафеевіч, Герой Савецкага Саюза, нарадзіўся 5.11.1915 г. у сяле Іванаўка Аляксандраўскага раёна Кіраваградскай вобласці. Член КПСС з 1939 г. Вучыўся ў Маскоўскім ваенна-палітычным вучылішчы. У партызанах з ліпеня 1941 г. Са жніўня 1941 г. да красавіка 1942 г. — камісар атрада імя Я.Дз.Гарбачова, з мая 1942 г. — камандзір атрада, сфарміраванага з жыхароў Слаўкавіч і суседніх вёсак Глушчыны. У студзені 1943 г. атрад увайшоў у 99-ю партызанскую брыгаду, якой азней было прысвоена яго імя. З чэрвеня 1943 г. — камандзір 101-й імя Аляксандра Неўскага партызанскай брыгады. Загінуў у баі 5 верасня 1943 г. каля в. Панічы Старобінскага раёна.

Вялікая Айчынная вайна па-рознаму распарадзілася лёсам людзей, кінутых у яе горан. Не ўсім суджана было да канца прайсці яе вогненнымі вёрстамі і пераможцамі вярнуцца на радзіму. У кожнага свой, ім самім выбраны, шлях. У малодшага палітрука Дзмітрыя Гуляева, які вывеў

жменьку байцоў, застаўшыхся ў жывых, у слаўкавіцкія лясы, гэта быў шлях барацьбы, бясстрашнасці і вернасці Радзіме. Ветэраны вайны са слаўкавіцкіх вёсак, усе тыя, каму давялося быць побач з ім, разам дзяліць радасці і нягоды сумеснага партызанскага жыцця, лічаць за шчасце, што звёў іх разам нялёгкі ваенны лёс. Высокі, стройны, малады, з правільнымі рысамі твару, шэрымі вачыма, з адкрытай і мяккай усмешкай, ён быццам выпраменьваў дабрату, прыветлівасць.

Дз.Ц.Гуляеў.

«У баях Дзмітрыю Гуляеву не было роўных. Байцы і камандзіры яго атрада, а затым брыгады бязмежна верылі ў яго камандзірскі талент, любілі яго і з верай у перамогу ішлі за ім на самыя складаныя і цяжкія баявыя аперацыі». Гэтыя словы належаць Уладзіміру Кірылавічу Якавенку, партызанскаму камбрыгу, які разам з Гуляевым бок у бок змагаўся супраць фашыстаў, і іх шляхі часта перасякаліся. А вось што пісаў аб ім былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі, камандзір партызанскага злучэння Герой Савецкага Саюза Р.Н.Мачульскі: «Дзмітрый Гуляеў быў асобай незвычайнай. Абаяльны, рашучы, смелы, ён ведаў усе тонкасці вядзення партызанскай вайны і таму, нягледзячы на незвычайную асабістую бясстрашнасць, умеў у патрэбную мінуту праявіць разумную асцярожнасць. Гэта быў, бадай, адзін з найбольш здольных партызанскіх военачальнікаў».

Атрад Гуляева быў настолькі падрыхтаваны да баявых дзеянняў, з такой лёгкасцю пераадольваў велізарныя адлегласці, што мог нечакана паявіцца там, дзе яго зусім не чакалі. Раёнам яго дыслакацыі з'яўляўся Слаўкавіцкі сельсавет, а базай — пасёлак Чапаева. За суткі партызаны іншы раз праходзілі глухімі дарогамі і сцежкамі да сямідзесяці кіламетраў. Скажам, днём былі ў Чапаеве, а праз суткі маглі апынуцца ў Барысаўшчыне ці ў Макавічах. Знянацку нападалі на ворага і знікалі ў невядомым напрамку, каб праз некаторы час зноў напомніць аб сабе.

Атрад хутка рос, у яго ўліваліся многія жыхары навакольных вёсак. Гуляеў уважліва прыглядаўся да людзей, імкнуўся зразумець кожнага, з кім прадстаяла ісці ў бой. Таму для кожнай аперацыі прадумана падбіраў людзей, дзе, хто і якое месца зойме ў выкананні агульнай задачы. Ён да драбніц абдумваў усе дэталі будучага бою, намячаў месца, час аперацыі. Усё гэта было важна, а ва ўзаемасувязі давала поспех. Раптоўнасць, хуткасць, націск былі любімымі прыёмамі камандзіра.

Імкненне як мага хутчэй прагнаць фашыстаў з савецкай зямлі прымушала яго не даваць літасці нават самому сабе, ісці туды, дзе было найбольш цяжка, весці атрад на небяспечныя і рызыкоўныя аперацыі і перамагаць. Аднак рызыка яго грунтавалася на цвярозым разліку, знаходлівасці, сапраўдным таленце военачальніка.

У штабе злучэння даўно ўжо разумелі, што Дзмітрый Гуляеў «перарос» камандзіра атрада, што яму па плячы больш цяжкая, больш адказная пасада.

І сёння яго нязгасны вобраз жыве ў сэрцах і памяці былых партызан, яго верных баявых сяброў і таварышаў, жыхароў нашага раёна, дзе пралягалі шляхі-дарогі бясстрашнага партызанскага камандзіра.

Т.А.Матусевіч.

Родам з Веснава

Нарадзіўся Іван Мікалаевіч Тараховіч у в. Веснава за год да Кастрычніцкай рэвалюцыі. З дзяцінства марыў быць ваенным і стаў ім. Да вайны І.М.Тараховіч даслужыўся да звання лейтэнанта і працаваў у Грэскім райваенкамаце. Калі пачалася вайна, кіраваў падполлем у гэтых жамясцінах, а ў красавіку 1942 г. з групы ва-

І.М.Тараховіч.

А.В.Львоў.

еннаслужачых, трапіўшых у акружэнне, а таксама з жыхароў вёсак Свідзічы і Харытонаўка стварыў на Міншчыне ў Капыльскім раёне партызанскі атрад, які ўжо ў наступным месяцы ўвайшоў у склад брыгады імя Варашылава.

Партызанская клічка І.М.Тараховіча была Дунаеў. Слава пра дунаеўцаў разнеслася не толькі на Капыльшчыне, але і за яе межамі. Яно і зразумела: камандзір атрада — адважны і энергічны чалавек, пад кіраўніцтвам якога было здзейснена нямала аперацый народных мсціўцаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Актыўныя дзеянні партызан не давалі ворагу спакою, і ён канцэнтруе значныя сілы для карнай экспедыцыі. Яе мэта — акружыць і знішчыць у Старыцкім лесе атрад імя В.І.Чапаева колькасцю 300 чалавек — пад камандай лейтэнанта І.М.Тараховіча, а таксама іншыя партызанскія фарміраванні, агульнай колькасцю не менш чым 500 чалавек.

Супраць гэтай жменькі партызан карнікі выставілі 7 тысяч салдат з 12 сярэднімі і лёгкімі танкамі, 8 бронемашынамі, 8 супрацьтанкавымі гарматамі, дывізіёнам 76-мм гармат і каля 20 мінамётаў рознага калібру.

Бой пачаўся на досвітку 7 лістапада 1942 г., якраз у дзень 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, і працягваўся да 18 гадзін. За гэты час было адбіта 12 атак пяхоты праціўніка. У выніку Старыцкага бою вораг, не дабіўшыся не толькі знішчэння, але нават і акружэння партызанскіх атрадаў, паўторнага наступлення не пачаў і адышоў у напрамку Слуцк — Мінск, забраўшы падбітую тэхніку, параненых і забітых салдат і афіцэраў.

Гэта была першая карная экспедыцыя немцаў, якая падтрымлівалася вялікай колькасцю тэхнікі, супраць партызан Капыльшчыны. У баях асабліва вызначыўся наш земляк Іван Мікалаевіч Тараховіч (Дунаеў), які загінуў смерцю храбрых у гэтым змаганні. І было яму тады толькі 26 гадоў. Пасля гібелі мужнага афіцэра яго імя было прысвоена двум партызанскім атрадам, якія дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

В.А.Васілеўскі, С.Ф.Анташкевіч.

Усім смярцям назло

ЛЬВОЎ Аляксей Васільевіч, нарадзіўся 17.3.1918 г. у в. Цімошына Верхнятоемскага раёна, Архангельскай вобласці. Рускі. З сялян. Член КПСС з мая 1941 г. У 1941 г. закончыў Іванаўскае ваенна-палітычнае вучылішча. З першага дня Вялікай Айчыннай вайны — на фронце. Са жніўня 1941 г. — камандзір партызанскай групы. З лістапада 1941 г. па студзень 1943 г. — камісар атрада імя М.М.Громава, затым камісар 64-й брыгады імя В.П.Чкалава, з чэрвеня 1943 г. — камандзір 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі. Узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. З 1978 г. персанальны пенсіянер. Ганаровы грамадзянін г.п. Глуск.

У жыцці Аляксея Васільевіча Львова былі выпадкі, калі смерць, здавалася, пазірала ўжо ў вочы. І ўсё ж яна па нейкай невядомай прычыне адступала: жыві яшчэ, чалавеча. З-пад Гродна маладзенькі палітрук кулямётнай роты, а потым камандзір роты 121-й стралковай дывізіі, якая трапіла ў акружэнне, дайшоў да Любанскага раёна. Вырвацца з варожага кальца так і не ўдалося: скончыліся боепрыпасы, і было загадана невялікімі групамі прабівацца да сваіх. Па дарозе да невялікай групы Львова ўвесь час далучаліся байцы, як і ён сам, трапіўшыя ў акружэнне. Такіх груп, рассеяных па Любанскім, Глускім, Акцябрскім лясах у той час было нямала. І з кіраўнікамі асобных з іх у жніўні 1941 г. сустрэўся сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б В.І.Казлоў, які расказаў аб задачы, пастаўленай на той час партыяй: на акупіраванай тэрыторыі паўсюдна арганізоўваць супраціўленне ворагу.

Аляксею Львову было дваццаць пяць, калі ён атрымаў назначэнне на пасаду камандзіра партызанскай брыгады. Але ў той час маладосць з'яўлялася паняццем адносным. Галоўным у выбары пры назначэнні Львова камбрыгам было: баявы вопыт, майстэрства весці бой, высокія чалавечыя якасці і чулыя адносіны да людзей. Сам многа разоў рызыкаваў, хадзіў на валасок ад смерці, аднак не любіў неапраўданых учынкаў. Разумеў, якая велізарная адказнасць ускладзена на яго плечы, — адказнасць за баявыя дзеянні брыгады, за жыццё людзей.

У брыгадзе на той час налічвалася больш за тысячу чалавек, пяць партызанскіх атрадаў.

Партызанскі рух на тэрыторыі Глускага раёна да таго моманту дасягнуў вялікага размаху. Тысячы народных мсціўцаў змагаліся з ворагам. Цэлыя сем'і і нават вёскі ішлі ў партызаны. Іх удары па ворагу станавіліся ўсё больш адчувальнымі.

Летам 1943 г. лясныя байцы з брыгады № 37 імя А.Пархоменкі, якой камандаваў А.В.Львоў, разграмілі брожскі і балашэвіцкі гарнізоны, пад в. Нязнанне разбілі атрад эсэсаўцаў. Брыгада дзейнічала тады ў асноўным паміж Бярэзінай і Пціччу, граміла варожыя гарнізоны, учыняла дыверсіі на аўтамабільных дарогах і чыгункі, вяла разведку ваенных аб'ектаў і камунікацый праціўніка.

Асабліва вялікі ўрон нанеслі партызаны брыгады пры правядзенні «рэйкавай вайны» напярэдадні і ў час Курскай бітвы. Ставілася задача на ўчастку чыгункі Мірадзіна — Ясень узарваць тысячы рэек, каб паралізаваць рух, і тым самым зрабіць немагчымым своечасовую дастаўку ў дзеючую армію праціўніка жывой сілы, тэхнікі, боепрыпасаў, паліва, харчавання.

У ноч з 4 на 5 жніўня партызаны брыгады Львова выйшлі на намечаную аперацыю. Пад праліўным дажджом пераадолелі шлях з-пад Зубарэвіч ва ўказанае месца.

І вось узвілася зялёная ракета. Партызаны кінуліся на насып. Лічаныя секунды спатрэбіліся байцам, каб устанавіць зарады. Ударылі выбухі. Праз суцэльны гром разрываў прарваўся трэск кулямётаў — гэта спецыяльныя групы падаўлялі агонь фашысцкіх дзотаў. Зноў гучыць каманда — і партызаны зноў на насыпе. Паветра скаланаюць дзесяткі выбухаў. Так паўтаралася некалькі разоў.

У тую ноч было знішчана каля дзвюх тысяч рэек. Рух на гэтым участку магістралі спыніўся на два тыдні...

Гэты і многія іншыя эпізоды вялікай лясной адысеі заўсёды ўспамінаюць партызаны брыгады, калі збіраюцца разам. Іх застаецца ўсё менш і менш, ды і самі яны ўжо не тыя дваццацігадовыя юнакі, а сівыя, пастарэлыя ветэраны. 28 чэрвеня ў дні вызвалення Глушчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў яны збіраюцца на глускай зямлі, каб успомніць былое ваеннае ліхалецце.

Т.А.Матусевіч.

Яго імя насіў атрад

Лейтэнант Міхаіл Цярэнцьевіч Грабка знаходзіўся на фронце. І менавіта там аднойчы даведаўся, што Цэнтральны штаб партызанскага руху праводзіць запіс добраахвотнікаў з жыхароў Беларусі, жадаючых змагацца ў глыбокім тыле ворага. Ён разумеў, што добраахвотнікаў выклікаюць на справы не з лёгкіх... Але Міхаіл Цярэнцьевіч доўга не раздумваў: там, на Палессі, у яго засталіся родныя і блізкія. І магчымасць быць да іх бліжэй, змагацца з фашыстамі ў роднай Беларусі проста не магла быць не выкарыстана ім. І ён адным з першых запісаўся ў добраахвотнікі.

У Маскве ў Цэнтральным штабе партызанскага руху пасля адпаведнай падрыхтоўкі ён на чале групы такіх жа добраахвотнікаў з 11 чалавек летам 1942 г. перайшоў лінію фронту. Разам з ім у тыл ворага пайшлі Яўген Аніско, Рыгор Гаронкін, Іван Кратэнак, Сцяпан Клішанцаў, Сяргей Гарнашэвіч, Пётр Ізотаў, Пётр Рогаў, Канстанцін Зуеў, Канстанцін Марчанка, дзяўчаты-камсамолкі Праскоўя Козырава і Вольга Груздова.

У верасні, прайшоўшы сотні кіламетраў па акупіраванай тэрыторыі, прыбылі да месца назначэння. Штаб злучэння партызанскіх атрадаў Мінскай і Палескай абласцей накіраваў групу ў Глускі раён, дзе была родная вёска М.Ц.Грабкі — Халопенічы. Камісарам у

групу, якая павінна была ў бліжэйшы час вырасці ў партызанскі атрад, камандаванне злучэння накіравала Антона Яўстратавіча Коўзуна, які перад вайной працаваў старшынёй Каткаўскага сельсавета, а начальнікам штаба — Івана Якаўлевіча Прывалава.

Атрад арганізаваўся даволі хутка, у яго ахвотна ішлі жыхары многіх бліжэйшых вёсак, і асабліва з Халопеніч і Каткі. У лістападзе 1942 г. ляснымі байцамі сталі Серафім Багук, Васіль Маслаў, Міхаіл Багдановіч, Піліп Грабка, Аляксандр Лясун, Фёдар Тараўкоў, Аляксандр Маркін і іншыя. Многія з іх прыйшлі са зброяй, а Маслаў — з ручным кулямётам. З суседняга атрада перайшоў і родны брат Міхаіла Цярэнцьевіча Аляксандр.

У даволі сціслыя тэрміны зноў створаны атрад стаў моцнай баявой адзінкай, наносіў ворагу адчувальныя ўдары. Усё часцей і часцей партызаны выходзілі на чыгунку і шашэйныя дарогі, дзе паспяхова праводзілі дыверсіі. Добра абучаны, дысцыплінаваны, атрад стаў на абарону мірнага насельніцтва ад грабяжу і насілля фашыстаў.

Адной з самых буйных партызанскіх аперацый 1942 г. быў захоп і падрыў чыгуначнага моста цераз р. Пціч на дарозе Брэст—Гомель. На гэту аперацыю сярод іншых выйшаў у поўным складзе і атрад Грабкі. Мінёры Васіль Лесік, Васіль Альшанскі і Вольга Груздова прымалі непасрэдны ўдзел у падрыве моста.

У жніўні 1943 г. атраду Грабкі была пастаўлена задача па блакіроўцы ўчастка чыгункі на перагоне Асіповічы—Старыя Дарогі, каб спыніць рух нямецкіх эшалонаў да лініі фронту. Штурмавыя групы атрада знішчылі масты, і толькі пасля гэтага байцы змаглі паспяхова справіцца са сваёй прамой задачай: узарвалі сотні метраў чыгуначных рэек.

Атрад рыхтаваўся да новых удараў па варожых камунікацыях. Для падаўлення фашысцкіх дзотаў не хапала гранат. Тады камандаванне атрада прыняло рашэнне самім выплаўляць тол з мін і снарадаў, якія знаходзілі на месцах былых баёў. Вядома, справа гэта была вельмі небяспечная. Але прыходзілася рызыкаваць. Больш таго, сам камандзір М.Ц.Грабка і партызан Мартман сканструявалі самаробную гранату з даволі хітрым узрывальнікам, які спрацоўваў ад удару гранаты па любым цвёрдым прадмеце. Трэба было навучыць карыстацца ёй лясных байцоў. Праўда, абышлося гэта вельмі дарагой цаной.

Паказваючы, што трэба рабіць, каб самаробная граната ўзарвалася, Грабка, стукнуўшы яе аб ствол дрэва, чамусьці запаволіў рух рукі, каб шпурнуць гранату, і ў гэты момант адбыўся выбух. Камандзір атрада загінуў на вачах партызан.

Партызаны цяжка перажылі гэты трагічны выпадак. На агульным сходзе яны адзінадушна вырашылі прысвоіць імя Грабкі свайму выпрабаванаму ў баях атраду. Нягледзячы на гібель камандзіра, гэту зброю паспяхова выкарыстоўвалі партызаны ў баях.

Лясныя байцы атрада імя М.Ц.Грабкі прайшлі цяжкімі баявымі дарогамі аж да самага Брэста.

Засталіся ў загінуўшага камандзіра жонка і чацвёра дзяцей. Ужо ёсць унукі. На магіле героя ўстаноўлены помнік, і кожны год аднавяскоўцы ў Дзень Перамогі прыносяць да яго жывыя кветкі, ушаноўваючы светлую памяць аднаго з тых, хто аддаў сваё маладое жыццё ў барацьбе за вызваленне Радзімы.

Ц.С.Яльчык.

Некалькі эпізодаў з жыцця Усціна Шваякова

Нарадзіўся Усцін Мікітавіч Шваякоў у Буда-Кашалёўскім раёне ў 1914 г. Тут жа і працаваў з 1934 г., а пазней быў накіраваны ў Глускі райаддзел міліцыі.

У ліпені 1941 г. у в. Малын Акцябрскага раёна, якую з чатырох бакоў агортвалі лясы ды балоты, склалася партызанская група пад кіраўніцтвам У.М.Шваякова.

У студзені 1942 г. група афармілася ў асобную баявую адзінку — партызанскі атрад, дзе акрамя камандзіра Шваякова быў ужо камісар М.С.Левітан, штаб і розныя спецслужбы. К вясне атрад налічваў звыш трохсот байцоў, не лічачы гаспадарчага ўзвода і медсанслужбы.

На рахунку атрада У.М.Шваякова мноства смелых і рашучых аперацый па знішчэнні нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Адна з іх праведзена сумеснымі сіламі народных мсціўцаў трох атрадаў — Шваякова, Храпко і Лівенцава ў в. Воземля. Як стала вядома партызанам, сюды прыбыў батальён гітлераўцаў. Ставілася мэта — разграміць яго.

У дзень намечанай аперацыі атрад Шваякова выйшаў да чыгункі і зрабіў тут засаду. Раніцай дазорныя паведамілі, што калоны ворага колькасцю да 300 салдат выступілі з Воземлі і рухаюцца ў напрамку засады. І калі да гітлераўцаў засталося не больш як трыццаць метраў, па сігнале камандзіра на іх абрушыўся шквал агню. Завязаўся бой. На дапамогу падышлі іншыя партызанскія групы і ўдарылі па ворагу з тылу. Фашысты не вытрымалі такога магутнага націску і адступілі, пакінуўшы на полі бою каля 50 чалавек забітымі. За гэту аперацыю Усцін Мікітавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Атрад вырас, а зброі не хапала. Многія партызаны здабывалі яе ў баях з акупантамі. Вясной у атрадзе мелася 8 ручных кулямётаў Дзегцярова, 2 «максімы» і палкавы мінамёт. Але гэтага было вельмі недастаткова, каб наносіць адчувальны ўрон фашыстам. Зброю збіралі на месцах былых баёў, але яна часта патрабавала рамонту. Па ініцыятыве Шваякова ў атрадзе арганізавалі майстэрню па рамонце зброі. Знайшліся і добрыя майстры.

Расказанае — толькі некалькі эпізодаў з жыцця камандзіра партызанскага атрада імя Шчорса Усціна Шваякова. За гады вайны іх было мноства: з жорсткімі, кровапралітнымі баямі, з гібеллю сяброў і таварышаў. 6 жніўня 1943 г. У.М.Шваякоў быў цяжка паранены і эвакуіраваны ў савецкі тыл.

У.М.Шваякоў.

Пасля папраўкі яго прызначылі старшым оперупаўнаважаным Палескага абласнога ўпраўлення НКУС па барацьбе з бандытызмам.

У 1945 г. Шваякова прызначылі намеснікам старшыні Глускага райвыканкома, годам пазней перайшоў на гаспадарчую работу і працаваў дырэктарам торфапрадпрыемства «Бярозаўка», Глускай электрастанцыі, старшынёй калгаса імя Чкалава (в. Жалвінец), намеснікам старшыні Глускага сельпо, займаў розныя адказныя пасады, на якіх яскрава праявіўся яго талент арганізатара і ўмелага кіраўніка, сумленнага чалавека.

Памёр У.М.Шваякоў у 1985 г., пахаваны ў Глуску. Яго імя носіць адна з вуліц старажытнага Глуска.

В.А.Васілеўскі.

Падпольшчык, камісар, камандзір

Калі пачалася вайна, Васілю Емяльянавічу Голадаву было 26 гадоў. Да гэтага часу ён паспеў закончыць Саратаўскае ваеннае вучылішча і стаць кадравым афіцэрам. Затым былі гарады Рцішчаў, Гомель, дзе і праходзіў службу ў якасці палітрука ў розных часцях. Апошняе пісьмо ад яго жонка атрымала, па яе сведчанні, якраз за два дні да пачатку вайны. Затым год маўчання. Аляксандра Дзмітрыеўна зрабіла спецыяльны запыт. Адказ прыйшоў аж ад М.І.Калініна, які паведаміў, што Голадаў жывы і здаровы, знаходзіцца на выкананні важнага задання, а за баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Леніна і партызанскім медалём.

І сапраўды, трапіўшы пасля цяжкіх баёў у самым пачатку вайны ў акружэнне, Голадаў затым быў прыкметнай асобай у Бабруйскім падполлі, крыху пазней заняў важнае месца і ў партызанскім руху на Глушчыне, з'яўляўся камісарам, а потым камандзірам партызанскага атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

Лістапад — снежань 1943 года... Перад брыгадай была пастаўлена задача заняць частку «парыцкага кліну» — вузкага калідора даўжынёй 20 км, які абараняўся да гэтага байцамі 37-й гвардзейскай страл-

ковай дывізіі 65-й арміі. Аднак з-за недахопу сіл існавала пагроза яго ліквідацыі праціўнікам.

Брыгада заняла частку левага боку калідора, і кожны яе партызанскі атрад заняў свой пэўны ўчастак. Так, атрад імя Чапаева пад камандаваннем М.П.Сезіка «прапісаўся» каля в. Вуглы, а справа ад яго аказаліся байцы атрада Голадава.

Праз створаны калектыўнымі намаганнямі пралом у абароне праціўніка ў партызанскую зону перакідвалася зброя, боепрыпасы, радыёапаратура, амаль усё неабходнае для баявых дзеянняў партызан. Гэтыя «вароты» шырока выкарыстоўваліся для дзеянняў армейскіх разведчыкаў, разведвальных груп і сувязных. Праз іх у армію прыбывала новае папаўненне з акупіраванай ворагам тэрыторыі.

Праціўнік не мог прымірыцца з такой сітуацыяй. На світанку 15 снежня рэгулярныя часці гітлераўцаў ударылі па апорных пунктах атрада імя Кірава з яўным намерам прарвацца ў тыл 37-й дывізіі. За дзень партызанам давялося вытрымаць некалькі атак, а ноччу, у гадзіны кароткага перапынку, кіраўцы з дапамогай насельніцтва ўладкавалі і замініравалі завалы на ўсіх лясных дарогах.

Увесь наступны дзень вораг зноў атакаваў партызанскія пазіцыі. Па сутнасці, кіраўцы не мелі ніякай перадышкі. Ім давялося цяжэй за ўсіх, і камандзір брыгады Аляксей Васільевіч Львоў загадаў Голадаву звузіць свой участак, перадаўшы частку яго партызанам атрада імя Чапаева. Наступнай ноччу камандзіры перагрупавалі свае атрады, эвакуіравалі параненых, умацавалі разбітыя пазіцыі. Адпачыць і перадыхнуць не ўдалося.

19 снежня немцы пачалі артылерыйскую падрыхтоўку, пасля якой увялі ў бой танкі, бронетранспарцёры і пад іх прыкрыццём пусцілі пяхоту. Такі масіраваны ўдар дазволіў праціўніку ўклініцца ў абарону. Партызаны з супрацьтанкавых ружжаў і бутэлькамі з запальнай сумессю знішчалі танкі, адсякаючы пяхоту. Было загадана камандзірам стаяць да апошняга патрона. Голадаў у гэтым баі быў паранены. Аднак, нягледзячы на гэта, працягваў камандаваць атрадам, які засеў у дзотах і бліндажах, і вёў бой фактычна ўжо акружаны фашыстамі... У тым баі Васіль Голадаў загінуў. А байцы яго атрада працягвалі змагацца да таго моманту, пакуль не паступіў загад адступіць.

Ю.Ф.Былінскі.

Яе помняць на Глушчыне

Марына Фядосаўна Малаковіч нарадзілася ў в. Зубарэвічы Глускага раёна ў 1903 г. З ранняга дзяцінства яна спазнала працу. У сям'і з 17 душ было нялёгка. Але цяга да ведаў — з'ява ў сям'і яе бацькі, героя Плеўны і Шыпкі Фядоса Максімавіча Малаковіча, не выпадковая. Дзеці вельмі адказна ўспрымалі ідэі пабудовы новага грамадства. Такой выраслa і Марына.

Яе імя ў ліку першых камсамольцаў Глушчыны. У дваццатыя гады Марына працавала старшынёй бюро юных піянераў Глускага райкома камсамола, інструктарам Бабруйскага акругкома. У 1927 г. уступіла ў Камуністычную партыю.

Арганізатарскія здольнасці, талент выхавацеля прывялі яе ў Маскву ў Акадэмію імя Крупскай. Пасля вучобы Марына Фядосаўна працавала метадыстам Беларускага інстытута масавага завочнага навучання ў Мінску, затым выкладчыкам у Інстытуце савецкага права, навуковым работнікам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яна выкладала гісторыю партыі ў Беларускім юрыдычным інстытуце.

Помсты патрабавала яе сэрца, калі Марына бачыла на вуліцах Мінска фашысцкіх захопнікаў. Гэта святая помста і прывяла яе ў ліпені 1941 г. у Мінскае партыйнае падполле. Тут дзейнасць Марыны самая разнастайная. Яна праводзіць прапагандысцкую работу сярод насельніцтва, распаўсюджвае лістоўкі, здабывае звесткі аб фашысцкіх войсках, а таксама зброю і перапраўляе ўсё гэта ў партызанскі атрад «Сцяг», з якім была звязана.

Гэта яна, Марына Малаковіч, выратоўвае жыццё вядомаму беларускаму вучонаму Мікалаю Міхайлавічу Нікольскаму, якому не ўдалося эвакуіравацца на ўсход з занятага фашыстамі Мінска. Летам 1942 г. М.Ф.Малаковіч даставіла вучонага ў партызанскі атрад.

Гэта яна, Марына Малаковіч, са сваімі баявымі сяброўкамі А.С.Старасцінай і раз-

ведчыцай партызанскага атрада «Сцяг» Г.Ф.Фінскай схіліла да пераходу на бок партызан нямецкага інжынера ваенна-паветраных сіл палкоўніка Карла Круга. У вялікім пузатым партфелі Карла Круга, з якім ён з'явіўся да партызан, былі карты камунікацый паветраных сіл нямецкай арміі, план наступлення немцаў на Арлоўска-Курскай дузе і план аперацыі «Цытадэль».

Марына Малаковіч працавала да восені 1941 г. настаўніцай у Калодзішчах, дзе ў гэты час дзейнічала некалькі асобных падпольных груп: на чыгунцы, у лазарэце, у цэнтры пасёлка, у прылягаючых вёсках. Адна з іх «Маладзёжная» была створана непасрэдна пры ўдзеле М.Ф.Малаковіч. Яна і з'яўлялася яе кіраўніком.

Пазней М.Ф.Малаковіч занялася аб'яднаннем дзеянняў незалежных адна ад адной падпольных груп і стварэннем Каладзішчанскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі. Гэта ёй удалося. Каладзішчанскае падполле мела цесныя кантакты з Мінскім падполлем, з партызанскімі брыгадамі «Дзядзькі Колі», «За Савецкую Беларусь», імя Шчорса. Кожная падпольная група ў Калодзішчах ажыццяўляла свой кірунак падпольнай работы, і ад гэтага баявая актыўнасць падполля яшчэ больш узрасла.

Падпольшчыкі перапраўлялі партызанам зброю, медыкаменты, дакументы нямецкага ўзору, збіралі сродкі ў фонд абароны краіны, перадавалі іх на Вялікую зямлю. Сумеснымі сіламі праводзіліся дыверсіі на варожых камунікацыях і ў месцах дыслакацыі варожых часцей.

Дзякуючы стараннаму падбору людзей, добрай канспірацыі і прадуманай сувязі, аж да сярэдзіны 1943 г. гітлераўцы не маглі

М.Ф.Малаковіч з дзецьмі.

«напасці на след» арганізацыі. І толькі ў ліпені 1943 г. па даносе аднаго з паліцэйскіх былі арыштаваны некаторыя падпольшчыкі, а ў жніўні ўдалося схапіць і кіраўніка арганізацыі М.Ф.Малаковіч. Ёй суджана было зведаць усе жахі зверскіх катаванняў і здзекаў у фашысцкіх засценках. Яна загінула, але не выдала ворагу сваіх таварышаў па барацьбе. Пасмяротна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Імем М.Ф.Малаковіч названа вуліца ў пас. Калодзішчы Мінскага раёна.

Мемарыяльная дошка ў в. Зелянковічы на будынку мясцовай бібліятэкі нагадвае жыхарам пра слаўныя справы іх зямлячкі.

* * *

Дачка М.Ф.Малаковіч Ірына ўжо ў наш час напісала кнігу «Партрэт маці» (Мн., 1985 г.). Сярод кніг аб Вялікай Айчыннай вайне твор Ірыны Малаковіч заняў дастойнае месца.

Т.А.Аляксандрава.

Подзвіг не забыты

У цяжкі ваенны час у барацьбу з акупантамі ўключыліся тысячы савецкіх патрыётаў. Быў сярод іх і Сяргей Аляксандравіч Мельнік. Ён нарадзіўся ў в. Гарадок у сялянскай сям'і. З дзіцячых гадоў была ў хлопчыка цяга да навукі, асабліва медыцынскай. Спачатку паспяхова скончыў двухкласнае вучылішча, потым Магілёўскае фельчарскае. У 17 гадоў пачаў працаваць на фельчарскім пункце ў в. Ляскавічы. Потым вучыўся ў Мінскім медінстытуце, вярнуўся ў Глускі раён, працаваў хірургам у райбальніцы. Яго, як добрага спецыяліста, у 1935 г. Міністэрства аховы здароўя БССР накіравала галоўным урачом санаторыя «Чэрніца» Віцебскай вобласці.

Але вайна змяніла ўсе планы. З першых яе дзён Сяргей Аляксандравіч на фронце, зведаў горыч адступлення, дайшоў да Магілёва, трымаў тут гераічную абарону горада на Дняпры і па волі лёсу застаўся

С.А.Мельнік.

ў акупіраваным ворагам горадзе. Там стаў падпольшчыкам. У Магілёўскай абласной бальніцы, дзе зараз размешчана бальніца хуткай медыцынскай дапамогі, доўгі час дзейнічала падпольная група медыцынскіх работнікаў. Узначальваў яе ўраджэнец Магілёўшчыны Макар Паўлавіч Куўшынаў.

Падпольная група медыкаў у складанейшых умовах выратоўвала жыццё параненым байцам Чырвонай Арміі, а потым накіроўвала іх у партызанскія атрады, арганізоўвала ім уцёкі, вывозіла за горад пад выглядам памерлых, падбірала і рассылала ў партызанскія атрады ўрачоў і медсясцёр, перасылала лекі, хірургічныя інструменты, перавязачныя матэрыялы, зберагала ад вывазу ў Германію моладзь, распаўсюджвала лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, збірала разведданыя. Так, у другой палавіне 1942 г. і першай палавіне 1943 г. у партызанскія атрады штомесячна адпраўлялася медыкаментаў і перавязачных матэрыялаў на некалькі тысяч рублёў. Сотні байцоў Чырвонай Арміі лячыліся і хаваліся ў абласной бальніцы.

10 мая 1943 г. па даносе фашысцкага агента кіраўніка групы і некалькіх урачоў, у тым ліку і С.А.Мельніка, арыштавалі. Больш за месяц фашысты катавалі мужных падпольшчыкаў, але яны не выдалі сваіх таварышаў і загінулі як сапраўдныя патрыёты. 24 ліпеня 1943 г. яны былі атручаны ў газавай камеры.

Вечная памяць палымяным патрыётам Савецкай Радзімы!

А.П.Шаўрук.

У атрадзе легендарнага Каўпака

Наш зямляк з в. Вільча Мікалай Міхайлавіч Курс уступіў у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на ўкраінскай зямлі ў складзе легендарнага партызанскага злучэння, якім камандаваў двойчы Герой Савецкага Саюза Сідар Арцёмавіч Каўпак. Вось кароткія запісы, зробленыя ім у дзённіку партызанскіх паходаў.

9 сентября 1941 года. В середине дня приехала в Путивль из Харькова группа белорусов. Они были там на краткосрочных курсах минеров. В связи со сложившейся на фронте обстановкой их перебросили к Путивлю. Здесь командование предложило им выбор: или влиться в обороняющие город части генерала Чеснова, или идти в партизаны. Почти вся группа присоединилась к армейской части, а четверо решили остаться у нас. Это коммунисты Курс, Юхновец, Терехов и Островский.

Николай Курс рассудительный, вдумчивый. У него фигура гимнаста и красивое правильное лицо.

21 сентября 1941 года. Разведчики обнаружили поблизости нашего лагеря минное поле, оставленное при отступлении Красной Армии, но еще не разминированное гитлеровцами. Поручили Курсу выяснить, можно ли снять мины с этого поля и использовать их для диверсионной работы.

Николай Михайлович Курс — большой души человек, умный, из рабочей семьи. Он окончил институт, служил в армии, демобилизовался в звании лейтенанта, а последние годы работал директором средней школы в белорусском городе Речица.

22 сентября 1941 года. Утром построил весь личный состав и огласил первый приказ по Путивльскому партизанскому отряду. Отряд разбился на четыре боевые группы: две оперативные, командир первой — Карпенко, второй — Васильев, группа минеров — командир Юхновец, группа разведчиков — командир Попов. Курс назначался начальником штаба.

В ночь он ушел на разведку минного поля. Оно отделено от леса проезжей дорогой, по которой все время курсируют немецкие автомашины и мотоциклисты.

Николаю Михайловичу предстоит под покровом темноты перебраться через дорогу, залечь на минном поле, замаскироваться, дождаться утра и при дневном свете найти мину и разрядить ее.

Все мы очень волновались. Ведь Курс никогда не был профессиональным минером, и несчастье могло произойти в любую секунду. Не знаю, кто больше пережил в те часы: он, лежа на минном поле, или мы, ожидая его возвращения.

Но вот, наконец, Николай Михайлович вернулся. Вид его говорил о том, что вылазка удачна. Он принес мину и сейчас же начал объяснять ее устройство. Тут же приняли решение разминировать все поле. Выполнение этой задачи возложили на Курса и минеров Юхновца, Терехова и Островского.

31 октября 1941 года. В штаб поступило сообщение: гитлеровцы заканчивают восстановление взорванных нами двух мостов на Клевени, возле Вязенки. Решили разрушить их снова. Под прикрытием группы Кириленко партизаны Курс, Юхновец, Терехов, Островский и Полижуха в полночь взорвали четыре моста... При возвращении с задания заложили несколько мин по дороге Путивль—Берюх. На одной из них подорвалась грузовая машина, битком набитая солдатами.

10 февраля 1942 года. Продолжали операции по очистке сел от оккупантов. Пямыселкин и Курс с двенадцатью бойцами разгромили полицейское управление в селе Погребки Кролевецкого района. Захватили в плен старосту и начальника полиции.

5 марта 1942 года. Штаб подвел итоги боевой деятельности соединения с 20 ноября 1941 г. по 5 марта 1942 г. Отмечая доблесть и мужество, проявленные личным составом в боях с немецко-фашистскими захватчиками, командование представило к награждению орденом Ленина Руднева, Курса, Островского, Юхновца и Павловского...

19 марта 1942 года. Вот уже четыре дня

С.А.Каўпак.

М.М.Курс.

партизаны от темна до темна ищут под снегом оружие. На полях, в долинах, в ярах, в лесу набрали несколько десятков винтовок и более 15 тысяч патронов... По данным разведки Хомутовского отряда, села Старшее, Седино и поселок Старшенькое заняты гитлеровцами. Объединенный штаб зоны поручил Хомутовскому отряду уничтожить там фашистов. В помощь выделена одна оперативная группа с Кулабакой и Курсом, усиленная одним батальоном минеров и 45-мм пушкой...

Совместными усилиями немцы были разгромлены. Но и партизаны понесли большие потери. Нашу разведку гитлеровцы пропустили к поселку, а когда к месту засады подошла вся группа, они открыли пулеметный огонь. Погибли двенадцать человек, в том числе помощник начальника штаба соединения Николай Михайлович Курс. Тяжело смириться с мыслью, что больше нет среди нас этого мужественного человека, настоящего коммуниста. Хлопцы в шутку называли его профессором минного дела. Ни одна ответственная операция по минированию не проходила без его участия...

Воевал он отчаянно, бил оккупантов беспощадно, всегда рвался в самую гущу боя.

Друкуецца па кн.: Ковпак С.А. Из дневника партизанских походов. М., 1964. С. 31—33, 37—38, 51, 52, 102.

Вызваленне

Набліжаўся дзень поўнага выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі. Чырвоная Армія пачала ажыццяўленне стратэгічнай наступальнай аперацыі пад кодавай назвай «Баграціён». Састаўной часткай яе першага этапу з'яўлялася Бабруйская аперацыя, у ходзе якой намячалася вызваленне Бабруйска, Глус-

ка і іншых населеных пунктаў войскамі правага крыла 1-га Беларускага фронту, якім камандаваў генерал арміі К.К.Ракасоўскі. Ударнай сілай тут выступалі 3-я, 28-я, 48-я і 65-я арміі (камандуючыя генерал-лейтэнанты А.В.Гарбатаў, А.А.Лучынскі, П.Л.Раманенка, генерал-палкоўнік П.І.Батаў), конна-механізаваная група генерал-лейтэнанта І.А.Пліева, 1-ы і 9-ы танкавыя карпусы, якімі камандавалі генерал-маёры танкавых войскаў М.Ф.Паноў і Б.С.Бахараў. Войскі фронту падтрымлівала 16-я паветраная армія генерал-палкоўніка авіяцыі С.І.Рудэнкі, а таксама некаторыя іншыя воінскія злучэнні. Ставілася задача: ударамі з двух раёнаў (з-пад Рагачова ў напрамку Бабруйск — Асіповічы, а таксама на поўдзень ад Парыч у напрамку Старыя Дарогі — Слуцк) акружыць і разграміць жлобінска-бабруйскую групоўку ворага, а потым развіць наступленне ў напрамку Мінска і Баранавіч.

Асноўная цяжкасць наступлення заключалася ў тым, што войскам 1-га Беларускага фронту трэба было дзейнічаць у цяжкапраходнай лясістай і моцна забалочанай мясцовасці. Але апошняе мела і свае станоўчыя моманты, бо праціўнік менш за ўсё чакаў удару савецкіх войскаў менавіта ў гэтым раёне. Таму абарона яго тут была ачаговая, а не суцэльная.

У стварэнні перадумоў для паспяховага ажыццяўлення намечанага плана наступлення важная роля адводзілася партызанам. Ім патрэбна было перад пачаткам стратэгічнай Беларускай аперацыі ў перыяд з 20 па 23 чэрвеня правесці масавае разбурэнне чыгункі з тым, каб паралізаваць перавозкі праціўніка ў самы адказны момант на важнейшых участках фронту. І народныя мсціўцы гэта заданне выканалі паспяхова.

24 чэрвеня на Бабруйска-Слуцкім напрамку пачалося наступленне войскаў 1-га Беларускага фронту. Аб гэтым абвясцілі магутныя ўдары бамбардзіровачнай авіяцыі на абодвух участках. На працягу дзвюх гадзін не змаўкала артылерыйская кананада: абарончыя збудаванні праціўніка на пярэднім краі былі разбураны, падаўлена сістэма яго агню.

Тэрыторыя Глускага раёна знаходзілася ў асноўным у паласе дзеянняў 28-й арміі і конна-механізаванай групы, з якімі тут узаемадзейнічалі таксама воіны 65-й арміі і 1-га гвардзейскага танкавага корпуса. У першы ж дзень наступлення войскі 28-й арміі генерала А.А.Лучынскага прарвалі абарону праціўніка па лініі фронту да 30 км і ўглыбіню ад 5 да 10 км. Танкісты 1-га танкавага корпуса генерала М.Ф.Панова і 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса з групы І.А.Пліева пад камандаваннем генерала С.М.Крывашэіна паглыбілі прарыў яшчэ больш.

Склалася спрыяльная абстаноўка, каб на другі дзень наступлення выкарыстаць больш рухомыя сілы для ўдару, — кавалерыстаў з конна-механізаванай групы. Завязаліся жорсткія баі з ворагам коннікаў 4-га Кубанскага кавалерыйскага корпуса.

Часцям 50-й гвардзейскай (камандзір генерал-маёр А.С.Уладычанскі) і 96-й гвардзейскай стралковай Ілавайскай ордэна Леніна Чырванасцяжнай (камандзір генерал-маёр С.М.Кузняцоў) дывізій штабам 28-й арміі была пастаўлена задача — наступаць у напрамку Глуска і авалодаць раённым цэнтрам. У авангардзе наступлення ішоў 295-ы полк 96-й дывізіі (камандзір палка А.М.Валошын), які неўзабаве замацаваў свае пазіцыі ў раёне вёсак Зелянковічы і Зубарэвічы. Пераадольваючы шалёнае супраціўленне ворага, савецкія воіны імкліва рухаліся наперад.

Адышоўшы на запасныя пазіцыі пад Глуск, гітлераўцы сустрэлі перадавыя атрады наступаючых савецкіх войскаў шквалам агню, выкарыстоўваючы доўгачасовыя ўмацаванні, дзоты, траншэі, агнявыя пазіцыі. Камандаванне 28-й арміі аддало загад — акружыць Глуск з усіх бакоў. Райцэнтр стаў вузлом, куды сышліся ўдары некалькіх воінскіх злучэнняў.

Знаходзячыся ўперадзе наступаючых, танкавыя часці Краснаградскага мехкорпуса развівалі наступленне ў двух напрамках: 19-я брыгада пад камандаваннем палкоўніка У.В.Яршова рухалася на Зубарэвічы — Бярозаўку, тут перапраўлялася цераз Пціч і трымала далейшы курс на Вайцяхова — Веснава — Даколь; 37-я мехбрыгада (камандзір палкоўнік Кулікоў) павінна была выйсці з-пад Зелянковіч на Жалвінец, пераадолець водны рубеж Пцічы і рухацца на Гарадок — Глушу. Выхад конна-механізаванай групы І.А.Пліева на гэты ўчастак і паспяховае яе наступлен-

не на заходнім напрамку стваралі рухомы знешні фронт акружэння ў раёне Бабруйска.

Танкі імкліва рухаліся наперад, ламаючы агнём сваіх гармат супраціўленне ворага. 19-я і 37-я мехбрыгады да канца дня 25 чэрвеня прайшлі з баямі 25 кіламетраў і захапілі пераправу цераз р. Пціч каля в. Гарадок, перарэзалі шашу Бабруйск — Слуцк. Танкісты забяспечвалі паспяховае прасоўванне ў напрамку Глуска байцам 295-га, 293-га, 291-га, 148-га, 150-га і 152-га палкоў 96-й і 50-й стралковых дывізій. На ўсім шляху да раённага цэнтра баі ішлі з неаслабляльнай сілай.

Паспяховаму развіццю наступлення ў гэтым напрамку садзейнічалі імклівыя і дакладныя дзеянні кубанцаў-кавалерыстаў у складзе 9-й, 10-й і 30-й дывізій, якія праследавалі ворага ў напрамках: Зубарэвічы — Даколь — Карніца — Бараціна, Зелянковічы — Глуск — Сіманавічы і Зелянковічы — Хваставічы — Пагост — Бабірова — Слуцк.

Авангард 10-й кавалерыйскай дывізіі — 40-ы кавалерыйскі полк падпалкоўніка І.І.Галавашчанкі — з ходу фарсіраваў р. Пціч у раёне в. Падлужжа. Праціўнік пры гэтым аказаў сур'ёзнае супраціўленне, і палку давялося ўсю ноч на 27 чэрвеня адбіваць моцныя контратакі 35-й пяхотнай дывізіі і ўтрымліваць плацдарм разам з танкамі, забяспечваючы фарсіраванне ракі галоўнымі сіламі дывізіі і правага фланга групы. Раніцай полк, падтрыманы агнём з усходняга берага ракі, перайшоў у атаку, захапіў в. Рылавічы і прымусіў праціўніка адысці ў паўночна-заходнім напрамку.

У ходзе праследавання эскадроны палка абышлі з захаду Глуск і разам з суседнімі часцямі рашуча атакавалі яго.

З наступаючымі перадавымі часцямі Чырвонай Арміі ў гэты час актыўна ўзаемадзейнічалі партызаны. 225-я брыгада пад камандаваннем У.З.Пуцяты паводле загаду камандавання партызанскага злучэння Палескай вобласці ў ноч на 26 чэрвеня перайшла блакіраваную праціўнікам дарогу Парэчча — Катка — Глуск, фарсіравала р. Пціч і пад раніцу злучылася з часцямі 43-га стралковага корпуса ў раёне халопеніцкіх мастоў, а потым узаемадзейнічала з гэтымі часцямі.

121-я брыгада імя А.Ф.Брагіна з 27 чэрвеня выконвала задачу па ўтрыманні пераправы цераз Пціч і вяла баі з адыходзячымі разбітымі падраздзяленнямі праціўніка, мініравала прасёлачныя дарогі на ўчастку Катка — Бабровічы — Слаўкавічы.

Народныя мсціўцы 258-й брыгады імя В.В.Куйбышава на шляху адступлення падраздзяленняў акупантаў наладжвалі засады ў лесе каля вёсак Бабровічы і Малкава. Фашысты, што рухаліся паўз лес каля в. Малкава, былі сустрэты трапным партызанскім агнём. Становішча аказалася бязвыхадным. Уцякаючы, немцы знішчылі сваю баявую тэхніку і адступілі цераз балота. Але выратавацца ўдалося нямногім. Партызаны рухаліся наперад — насустрач часцям 48-й стралковай дывізіі і злучыліся з імі 28 чэрвеня каля вёсак Халопенічы, Бабровічы і Малкава.

Такога ж манеўра прытрымліваліся і партызаны 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, перад якімі стаяла задача — выйсці 28 чэрвеня да р. Пціч і забяспечыць тут пераправу савецкім воінам. Нечаканае з'яўленне народных мсціўцаў на пазіцыях немцаў выклікала сярод іх паніку: уцякалі, хто куды. Партызаны хутка разведалі брады, наладзілі пераправы, і часцямі Чырвонай Арміі Пціч была з ходу фарсіравана.

100-я Глуская брыгада разбіла штаб нямецкага артылерыйскага палка, які рухаўся па дарозе Бабровічы — Малкава. 28 чэрвеня партызаны злучыліся з воінамі 48-й дывізіі ў раёне в. Харомцы. Наступленне развівалася далей.

Раніцай 27 чэрвеня байцы 295-га стралковага палка 96-й гвардзейскай дывізіі, якім камандаваў падпалкоўнік А.М.Валошын, падышлі да паўднёва-ўсходняй часткі Глуска і сумесна з коннікамі-кубанцамі 40-га кавалерыйскага палка завязалі бой з часцямі 35-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне гітлераўцаў, савецкія воіны адбівалі адну вуліцу за другой. На паўднёвай ускраіне райцэнтра ўпарты бой вялі байцы 293-га стралковага палка, якім камандаваў П.І.Сіненка.

У гэты ж час гвардзейцы 50-й гвардзейскай стралковай дывізіі, часці 1-га Краснаградскага і 4-га гвардзейскага Кубанскага кавалерыйскага карпусоў, абыходзячы Глуск справа і злева, акружалі групоўкі праціўніка і вызвалялі адзін за другім населеныя пункты Глускага раёна.

Вялікую дапамогу наступаючым на Глуск часцям аказвалі лётчыкі 299-й штурмавой авіядывізіі, якія нанеслі бомбавыя ўдары па агнявых кропках ворага ў раёне сярэдняй школы ў паўночна-ўсходняй частцы райцэнтра, дзе былі размешчаны нямецкія казармы, а таксама па цэнтры мястэчка і ў раёне касцёла.

Наступаючую на Глуск пяхоту і конніцу падтрымлівалі агнём гвардзейцы-артылерысты 183-га палка пад камандаваннем маёра Самафалава. Пасля ўдараў авіяцыі і артабстрэлу, не вытрымаўшы націску пяхоты і конніцы, баючыся поўнага акружэння, вораг пачаў адыход з вялікімі стратамі ў жывой сіле і тэхніцы ў напрамку Варшаўскай шашы — у раён Гарадка, Завалочыц, Сіманавіч і далей на Старыя Дарогі, Слуцк.

Бой за Глуск працягваўся каля пяці гадзін. Нарэшце, у 14 гадзін дня райцэнтр быў ачышчаны ад гітлераўцаў, а к зыходу дня 28 чэрвеня вызвалена ўся тэрыторыя Глускага раёна.

У выніку баёў за Глуск праціўнік страціў да ста чалавек салдат і афіцэраў — забітымі, параненымі, палоннымі. У ліку захопленых трафеяў былі два склады з боепрыпасамі, склад ГЗМ, некалькі танкаў і бронетранспарцёраў, батарэя 75-міліметровых гармат, шмат мінамётаў, кулямётаў і іншага ваеннага рыштунку.

Найбольш моцныя баі ў час вызвалення раёна адбыліся ў раёне вёсак Зелянковічы, на пераправах цераз р. Пціч каля вёсак Халопенічы, Карма, Бярозаўка, Падлужжа, Жалвінец, Рудня, а таксама за населеныя пункты Дасціжэнне, Падзамша, Баянава, Гарадок, Зубарэвічы і ў розных іншых месцах раёна з асобнымі групамі гітлераўцаў з разбітых воінскіх часцей, якія адчувалі свой крах і імкнуліся выйсці з акружэння.

Многія салдаты і афіцэры, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Глуска і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за праяўленыя мужнасць і адвагу, выдатнае выкананне пастаўленай задачы па разгроме ворага былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Камандзір 295-га палка А.М.Валошын удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

На глускую зямлю прыйшло вызваленне. Але ўперадзе было яшчэ 316 дзён і начэй суровых выпрабаванняў. Яшчэ будуць падаць на родную зямлю, абняўшы яе ў апошні раз, салдаты Вялікай Айчыннай, і будуць паштальёны насіць у хаты «пахаронкі». Будуць заходзіцца ад плачу жанчыны-ўдовы і дзеці-сіроты. Не дачакаюцца з фронту сваіх сыноў матулі і бацькі. На шляхах вайны будзе яшчэ шмат крыві і смерці, пакуль каля пакоранага рэйхстага не сальюцца ў пераможным залпе апошнія стрэлы вайны. За плячыма многіх глушчан праляжа шлях да Берліна.

Т.А.Матусевіч.

Дакументы сведчаць

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДАВАННЯ 100-й ГЛУСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ КАМАНДЗІРУ ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ Р.М.ДАРОЖКУ АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Не раней 26 чэрвеня 1944 г.[1]

1. Доношу, что задача, поставленная бригаде по удержанию переправы через р. Птичь и содействию наступлению частей Красной Армии на этом участке, выполнена.

2. Бригада, получив приказ 26 июня 1944 года, достигла рубежа дер. Слободка. Установив засады, беспрерывно держала под обстрелом мост. В результате на левом берегу образовались пробки обоза врага, которые полностью захвачены частями Красной Армии.

3. Резерв бригады действовал на путях отхода противника от Холопеничей на Баяново и Хоромцы. В результате боевых действий бригады части противника, его транспорт и обозы были отрезаны и захвачены частями Красной Армии.

4. В результате взаимодействия с группой Минского соединения, действующей в районе березовского моста, части Красной Армии успешно заняли райцентр Глуск.

Командир бриг[ады] 100 Куликовский

Комиссар бригады 100 Чернушин

Нач. штаба бр[игады] Игуменов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4139. Воп. 1. Спр. 28. Л. 264.

[1]Датуецца па змесце дакумента.

З ГІСТОРЫІ 100-й ГЛУСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Бригада, находясь в тылу противника, всегда ставила командование Красной Армии в известность о происходившем изменении противника и особенно в отношении его огневых точек, баз, аэродромов и типов самолетов на них. Бригада вела бой с противником совместно с частями Красной Армии во время последнего наступления по удержанию мостов на р. Птичь в районе совхоза «Холопеничи». При соединении с Красной Армией в д. Бобровичи был проведен митинг, на котором выступили командир полка Красной Армии, начальник политотдела дивизии, бойцы и партизаны. Бригада вышла на соединение с развернутыми знаменами в полном составе.

Командование Красной Армии вынесло благодарность партизанам в отношении оказанной помощи при форсировании реки Птичь и сохранении мостов. Противник был в панике, ибо ему неожиданно был нанесен удар с тыла. В результате он оставил много трофеев в данном районе, а также угоняемое население в д. Заболотье, которое было довольно избавлением от фашизма.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 229. Л. 68.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

ВЫПІСКА З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 15-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

26 чэрвеня 1944 г.

Противник, оставляя небольшие группы прикрытия, продолжал отход в северо-западном направлении.

Командир дивизии решил: преследовать противника в общем направлении. Хутора Клещевка, Подвязье. Боевой порядок: справа 676-й сп., слева 321-й сп., 47-й сп — во втором эшелоне.

В 5.00 26.06 полки выступили по маршруту: Вьюнище, Крюковщина и далее в направлении д. Жолвинец.

В 14.00 части, сбивая мелкие группы прикрытия противника, прошли Вьюнище и продолжали преследование.

К 16.00 676-й сп (3-й сб) вышел на восточный берег р. Лиса, встретил сопротивление противника и завязал бой.

Противник силой 162-й учебной роты, при поддержке двух фердинандов, трех полевых орудий и минометной батареи (сев. Подвязье) оборонял переправу через р. Лиса в районе Застенок Устерхи. Под прикрытием артогня группа саперов противника успела заминировать мосты через р. Лиса с целью подрыва. Но решительными действиями 3-го сб 676-го сп и в результате короткого артминометного налета нашей артиллерии противник был частью уничтожен, частью рассеян из районов переправ и взорвать мосты не смог. Вскоре, во взаимодействии с подвижной группой 35 мехбригады 1-го Красноградского мехкорпуса, батальоны 676-го сп к 19.00 переправились через р. Лиса и начали преследовать противника в с.з. направлении восточнее д. Балашевичи.

Соседи: справа 37-я гв. сд, слева 54-я сд.

Наши потери: убито 7, ранено 8.

Потери противника: убито, ранено и пленено 28 солд. и офицеров противника.

КП штадива — Устерхи

27 чэрвеня 1944 г.

Не давая возможности противнику оторваться после короткого отдыха, 47 к. сп. с частями 1 КМК в 19.00 26.06 сбил мелкие группы противника, совершил марш в направлении д. Жолвинец и в 4.00 27.06 на плечах противника форсировал р. Птичь в районе Жолвинец и вырвался на шоссе Глуск — Городок, этим отрезал путь отхода частей противника из Глуска, захватив обоз противника, в т. числе 6 автомашин с различным имуществом.

28 чэрвеня 1944 г.

Части дивизии продолжали преследование противника по маршруту: совхоз Дворец, Заполье, Заволочицы, Симоновичи, Евсеевичи, Мосты, Осы, Колесы, Ячнево, Михалевщина, Осово.

В 0.30 29.06.1944 года передовой отряд дивизии вышел в соприкосновение с противником на ближайших подступах к г. Осиповичи и завязал бой на его юго-западной окраине.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 15 сд. Воп. 1. Спр. 63. Л. 12.

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 96-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ ДЫВІЗІІ

27 чэрвеня 1944 г.

Расширив плацдарм на западном берегу р. Птичь и ведя бои на подступах к Глуску, части дивизии к 12.00 с боем заняли Березовку, Згоду, Жуковичи, Подлужье, Розлевичи и вышли на рубеж:

— 295 гв. сп. — 1 км северо-западнее д. Жуковичи

— 293 гв. сп. — 1,5 км сев.-зап. Згода

— 291 гв. сп. — двигается во втором эшелоне по маршруту дивизии.

На подступах к г. Глуск противник оказал яростное сопротивление. Его артиллерия и минометы сосредоточенным огнем по боевым порядкам наступающих частей препятствовали нашему продвижению вперед.

— 295 гв. стр. п., преследуя отходящего противника по маршруту: высота 145,7 — х. Романовичи и преодолевая его боевое сопротивление, вплотную подошел к юго-восточной окраине Глуска, завязал тяжелые уличные бои и, освободив от противника южную часть города, к 14.00 вышел на рубеж 1 км севернее Достижение и маршруту на Погост.

— 293 гв. сп. преследует противника по маршруту: отм 145,9 — 1 км северо-восточнее д. Подзамша, после короткого, но упорного боя ворвался на южную окраину Глуска и в результате пятичасового боя, совместно с другими частями, полностью очистил город от противника и к 18.00 вышел на рубеж восточнее д. Красное-Погост.

— 291 гв. сп. двигался во втором эшелоне дивизии.

— убито и пропало без вести — 98 чел., ранено 380 солдат и офицеров дивизии.

Потери противника:

— убито, ранено и пленено — 1075 солдат и офицеров.

Захвачено трофеев: лошадей — 75, винтовок — 300, автоматов — 115, пулеметов — 100, минометов — 8, пушек разн. кол. — 36, танков и бронетранспортеров — 6, автомашин — 11, мотоциклов — 5, раций — 9, артскладов и др. боеприпасов — 19, продскладов — 8, повозок — 26, кабеля — 270 км. ГСМ — 20 тон.

Командир 96-й гв. стр. див.
генерал-майор Кузнецов.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 70. Л. 11—14.

БАЯВОЕ ДАНЯСЕННЕ КАМАНДАВАННЯ 32-га ГВАРДЗЕЙСКАГА КАВАЛЕРЫЙСКАГА ПАЛКА КАМАНДЗІРУ 9-й КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ

Время отправл. 27.06.44 г. в 4.00
Лес южн. 400 м д. Зуборевичи.

1. С 2.00 27.06.1944 г. окруженная группа противника, скрывавшаяся в лесу, пыталась прорваться к переправе из Зуборевич на Березовку, открыла ружейно-пулеметный огонь и трижды предпринимала попытки прорвать оборону полка.

По показаниям пленного группа состоит из 70—80 солдат и офицеров.

2. Подразделениями полка атаки противника отбиты и группа рассеяна. Произвожу прочесывание леса.

3. В результате боя полк имеет следующие потери: убито рядового и сержантского состава — 4 чел., ранено — 1 чел., ранено офицеров — 2 чел.

4. Уничтожено немецких солдат и офицеров — 20 чел., взят в плен обер-лейтенант.

Командир 32-го гв. кавполка гв. майор Шахтаев.
Начальник штаба гв. майор Ярошенко.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ 10-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ

28 чэрвеня 1944 г.

Части и подразделения дивизии совершили боевой марш согласно приказу командования и в течение суток имели встречи с противником.

40-й гвардейский кавалерийский полк, где командир гвардии подполковник тов. Головаченко, зам. командира гвардии майор Дегтярев, вел бой за м. Глуск, который был освобожден к 14.00 27.06.44.

В боях за Глуск отличился 4-й эскадрон этого полка, где командиром лейтенант Чайлыгин, который недавно принят в кандидаты ВКП(б). Он повел свой эскадрон на немецкие окопы и первым ворвался в город, обратив немцев в бегство. Тов. Чайлыгин погиб в бою.

Героизм и отвагу проявил расчет батареи 45-мм пушек, действовавший в районе д. Подлужье, где командовал батареей гвардии младший лейтенант Литвак, член ВКП(б). Батарея успешно отражала контратаки врага. Но вот Литвак поднялся во весь рост и с возгласом «За Родину!» повел бойцов в атаку. Противник был выбит из занимаемых рубежей. Тов. Литвак в этом бою был убит и с почестями похоронен в д. Жуковичи.

В течение 27.06.44 части подразделений дивизии форсировали р. Птичь...

При продвижении частей дивизии местное население оказывает радостную встречу со слезами на глазах, встречая воинов хлебом-солью...

Начальник политотдела Тимошенко

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 3544. Воп. 1. Спр. 14. Л. 95–96.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 28-й АРМІІ ПАЛКОЎНІКА НАСАЧОВА НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 1-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ГАЛАДЖАВУ

...Немецкие власти силой отнимали у родителей детей под видом отправки их в юношеские поселения. На самом деле фашистские мерзавцы брали у детей кровь для переливания раненым солдатам и офицерам, а затем уничтожали их. Всего, по предварительным данным, в Глусском р-не немцы увезли свыше 2000 детей в возрасте от 8 до 16 лет...

Особенно бесчинствовали немцы в последние дни перед своим отступлением под ударами Красной Армии...

Подавляющее большинство населения с нетерпением ждало прихода Красной Армии и встретило наши части как освободителей, радостно приветствовало бойцов и офицеров. Особенно трогательная встреча произошла в селе Заболотье Глусского р-на частей 130-й стрелковой дивизии. Население села вышло на улицу, организовалась стихийная демонстрация, появились красные флаги. Женщины, старики и дети обнимали и целовали воинов. Командиру полка подполковнику Иткулову и его бойцам жители села поднесли хлеб и соль. Здесь же на улице произошел митинг. Выступившие на митинге граждане Каладишин Казимир Станиславович, Говорунская Зинаида Михайловна и другие рассказали бойцам и офицерам об ужасах немецкой оккупации, горячо благодарили советских воинов за спасение, за возвращение к жизни.

В селе Сикоричи Глусского р-на в дупле дерева бойцы 1-й мотобригады нашли письмо от советских людей, которых немцы угоняли на каторгу. В этом письме говорилось: «Здравствуйте, дорогие отцы и братья! Шлем мы вам искренний любящий привет и желаем вам скорой победы. Нас гонят, как скот, под винтовками, с большим горем и слезами. Постарайтесь освободить нас от арийской рассы. Стояли мы в д. Сикаричи, 600 человек девчат и ребят.

До свидания, милые братья и родные отцы. Просим освободить нас и мы тоже будем стараться убегать».

Это письмо удвоило ярость бойцов и офицеров, с новой энергией они стали преследовать и громить врага. Стремительно продвигаясь вперед, наши части освободили большое количество мужчин и женщин, которых немцы угоняли в Германию на каторгу.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 41. Л. 85–86.

На глускай зямлі

З успамінаў Героя Савецкага Саюза А.М.Валошына

Андрэй Максімавіч Валошын нарадзіўся ў 1906 г. у с. Каможына Кегічоўскага раёна Харкаўскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1941 г., ваяваў на Паўднёва-Заходнім фронце камісарам батальёна. Абараняў Маскву, удзельнічаў у баях пад Сталінградам.

У чэрвені 1944 г. — камандзір 295-га стралковага палка 96-й гвардзейскай стралковай Ілавайскай дывізіі, удзельнічаў у баях за вызваленне Глуска.

З узнагароднага ліста гвардыі падпалкоўніка А.М.Валошына: «В ходе дальнейшего наступления т. Валошин 26–27.6.44 г. глубоким обходом неожи-

А.М.Валошын.

данно вышел в тыл вражеской группировки, усиленной тремя батареями тяжелой артиллерии, в районе д. Зеленковичи — Зуборевичи, разгромил ее и захватил орудия. Это дало возможность всей армии и наступающей группе 27.6.44 г. стремительно форсировать р. Птичь, с ходу овладеть г. Глуском и вести дальнейшее преследование врага».

За праяўленыя гераізм і мужнасць у гэтых баях А.М.Валошыну Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны гвардыі палкоўнік А.М.Валошын закончыў ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе, доўгі час працаваў выкладчыкам у гэтай вышэйшай навучальнай установе. З 1959 г. у адстаўцы.

Жыў у Маскве, потым у Калінінскай вобл. Ганаровы грамадзянін г.п. Глуск. Яго імя носіць адна з вуліц Глуска. Памёр у 1980-х гадах.

Мы знаходзіліся на зямлі свабадалюбівага і няскоранага беларускага народа. Я добра памятаю тую цёмную чэрвеньскую ноч, якая схавала ад вачэй усё: лясы, палі, дарогі...

Разведчыкі, напружваючы слых і зрок, рухаліся на значнай адлегласці наперадзе і па флангах палка, які, прыняўшы меры бездакорнай маскіроўкі, імкліва прасоўваўся да Ратміравіч. Яны знаходзіліся ў тыле ворага. Ззаду і па баках былі чутны рэзкія выбухі артылерыі і кулямётаў, парушаючы спакой ночы.

На досвітку за паўтара кіламетра на ўсход ад гэтага населенага пункта полк спыніўся. А вярнуўшыся, разведчыкі так далажылі абстаноўку:

— Праціўнік раскватараваны па дамах. Паводзіць сябе бяспечна, і таму патрулёў можна зняць ціха, без асаблівай цяжкасці.

І амаль адразу першы і другі батальёны, якія мелі вялікі вопыт вядзення начных баёў, пачалі рухацца на Ратміравічы. Як і прадбачыла разведка, бой быў кароткі. Фашысты менш за ўсё чакалі нападзення ў тры гадзіны ночы і таму капітулявалі амаль без адзінага выстралу. Многія з іх уцякалі, амаль не паспеўшы нацягнуць на сябе верхнюю вопратку, кідалі машыны, гарматы...

У 10 гадзін раніцы падышлі танкі, прыдадзеныя 4-у гвардзейскаму кавалерыйскаму корпусу. Наш жа полк да іх прыходу займаўся ўзвядзеннем супрацьтанкавай абароны, таму што чакалася далейшае наступленне на в. Зелянковічы. Бой за вёску быў таксама кароткі. Праціўнік, напалоханы першым рашучым ударам, не аказаў асаблівага супраціўлення, і на працягу гадзіны нашы войскі авалодалі Зелянковічамі.

...Прайшлі дзесяцігоддзі, але ніколі не забудзецца ў памяці эпізод, звязаны з гэтай старонкай маёй баявой эпапеі. Як сёння бачу, з левага боку вуліцы гэтай вёскі, у самым яе канцы, стаіць невялікі прысадзісты домік з маленькімі вокнамі, накрыты саломай. І вось з яго веснічак выходзіць невысокага росту бабуля. У яе руках хлеб-соль. А мы якраз на гэтай ускраіне вёскі паявіліся раней іншых. Падышла да нас, прывіталася і скрозь слёзы радасці спытала:

— Хто з вас старшы?

Усе паказалі на мяне. Тады яна нізка пакланілася і сказала, аддаючы хлеб-соль:

— Вазьміце, мае дарагія! Гэты святы хлеб прынясе вам шчасце. Я — маці, бабуля, прабабуля дзякую вам за тое, што вы вярнулі нам свабоду, а разам з ёю і радасць, за тое, што асушылі вы нашы вочы ад слёз і пазбавілі нас ад цяжкага гора. І, як маці, сынкі, жадаю вам перамагчы і здаровымі вярнуцца дадому. Гэты хлеб не толькі ад мяне, але і ад усіх маіх аднавяскоўцаў. Прыміце наш зямны паклон.

Я заўважыў, як у гэты момант на вачах многіх салдат, бачыўшых усе жахі вайны, былі слёзы. І я ведаў, што яны яшчэ больш рашуча будуць біць ворага.

Не чакаючы падыходу суседняга палка, мы працягвалі наступленне. Потым уступіў у бой з пяхотай і танкамі праціўніка на ўсходняй ускраіне Зубарэвіч 2-і стралковы батальён. Бой чакаўся адказны і важны. Праз гэтую вёску праходзіла дарога да пераправы на рацэ Пціч.

У 14 гадзін гітлераўцы пры падтрымцы танкаў пачалі контратаку. Завязаўся жорсткі бой. Тры фашысцкія танкі былі

падбіты палкавымі гарматамі, а варожая пяхота масіраваным агнём прыціснута да зямлі. Адбіўшы контратаку, другі батальён зноў перайшоў у наступленне. Бой працягваўся ўжо на вуліцах вёскі. Галоўная задача заключалася ў тым, каб не даць ворагу ўзарваць масты цераз Пціч, якія мелі важнае значэнне для хуткага прасоўвання нашых войскаў. І вырашэнне яе капітан Аркадзь Бывальцаў даручыў камандзіру ўзвода разведкі гвардыі лейтэнанту Сяргееву. Яна фармулявалася так:

— Авалодаць мастамі і трывала ўтрымліваць іх да падыходу батальёна.

Зрабіць гэта было выключна цяжка. У вёсцы варожая пяхота, танкі, аўтамашыны і павозкі. Пачаўшы хуткае адступленне, гітлераўцы стварылі каля мастоў сапраўдны затор. Знаходзячыся ў такой абстаноўцы, Сяргееў прааналізаваў некалькі варыянтаў. Лепшым з іх палічыў: паслаць для выканання задання некалькі разведчыкаў. Ім было даручана перабрацца на заходні бераг ракі, замаскіравацца паблізу мастоў і перакрыць шлях руху па іх да падыходу ўзвода. І задача была выканана цудоўна.

Ужо пасля вызвалення вёскі Зубарэвічы адзін з разведчыкаў радавы Ільін расказваў начальніку разведкі:

— Нялёгка давялося. У нас з Пятровым былі дзве супрацьтанкавыя, каля дзесятка супрацьпяхотных гранат і тысячы дзве патронаў. Спачатку падбілі на апошнім мосце аўтамашыну, каб затрымаць пераправу тэхнікі. Потым раптоўна ўбачылі вялікую машыну з пяхотай, аж страшнавата на імгненне стала. Але страх прайшоў, калі адкрылі агонь па ёй. А граната, кінутая Пятровым, давяршыла справу. Фашысты пачалі прыгаць у ваду, і тут сустракалі іх аўтаматнымі выстраламі. Гарэўшая на мосце машына стала добрай перашкодай для адступлення фашыстаў.

Можа выклікаць здзіўленне, як два разведчыкі затрымалі рух цэлай групы фашыстаў. Між тым нічога дзіўнага тут не было. Галоўнай перавагай нашых разведчыкаў было тое, што яны былі добра замаскіраваны і знаходзіліся ў надзейным укрыцці, таму фашысты не змаглі іх адразу заўважыць. А калі агледзеліся, было ўжо позна, паколькі пачалі наступленне нашы роты. Так ужо ў 16 гадзін поўнасцю вызвалены былі і Зубарэвічы. Пры гэтым было захоплена нямала каштоўных трафеяў ворага. Сярод іх спраўныя танкі, артылерыйскія гарматы, аўтамашыны, сродкі радыёсувязі і інш.

Пасля такога нечаканага ўдару праціўнік згубіў здольнасць выкарыстаць такі выгадны для сябе рубеж мясцовасці, як рака Пціч з забалочанымі подступамі да яе. Ён разрозненымі групамі паспешна адыходзіў у раён Глуска.

Мы ж, у сваю чаргу, паспяхова фарсіравалі з наступленнем цемры раку і да самага Глуска прасоўваліся, па сутнасці, без баёў. А на наступны дзень, 27 чэрвеня, 295-ы гвардзейскі стралковы полк падышоў да яго ўсходняй ускраіны і заняў зыходную пазіцыю для наступлення. У гадзіну дня пры падтрымцы артылерыі, ва ўзаемадзеянні з адным з падышоўшых кавалерыйскіх палкоў 4-га гвардзейскага корпуса, ён атакаваў праціўніка, які засеў у гарадскім пасёлку. Усяго дзве гадзіны спатрэбілася нашым воінам для таго, каб выбіць ворага з замацаваных пазіцый. Пры гэтым таксама не абышлося без трафеяў. Сярод іх былі два танкі «пантэра», батарэя 75-міліметровых пушак, 7 кулямётаў, мінамётная батарэя, 8 павозак з рознай маёмасцю і многае інш. І як бы ў прыдачу да ўсяго гэтага, трапіла ў палон каля двух дзесяткаў напужаных фашыстаў.

З вялікай радасцю сустрэла насельніцтва Глуска сваіх вызваліцеляў. Кветкі, ажыўленая гаворка, радасныя твары людзей, пацалункі. А што можа быць прыемней для салдата, чым бачыць радасныя пачуцці людзей, якія яшчэ толькі гадзіну назад выпрабоўвалі ўсе цяжкасці фашысцкага зняволення.

Ды толькі многа часу для эмоцый не засталося. Усіх чакалі наперадзе сотні, тысячы кіламетраў франтавых, нялёгкіх дарог.

Кавалерыстаў сустракалі з радасцю

З успамінаў Р.Л.Прыміна, былога начальніка штаба 40-га кавалерыйскага палка

Рыгор Лазаравіч Прымін нарадзіўся 22.8.1911 г. у Ельскім раёне Гомельскай вобласці. У Чырвонаай Арміі служыў з 1933 г. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Украіны і Беларусі ў складзе 4-га гвардзейскага Кубанскага казачага кавалерыйскага корпуса. 26.6.1944 г. 40-ы гвардзейскі кавалерыйскі

Р.Л.Прымін.

П.І.Мішарын.

полк, начальнікам штаба якога з'яўляўся Р.Л.Прымін, вызваліў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г.п. Глуск. 7.7.1944 г. пад Баранавічамі Р.Л.Прымін быў цяжка паранены, стаў інвалідам вайны.

Узнагароджаны 10 баявымі ордэнамі і медалямі, у тым ліку ордэнам Чырвонага Сцяга, чатырма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней. У адстаўку выйшаў у званні палкоўніка ў 1963 г. У апошнія гады жыў у Маскоўскай вобласці. 15.4.1987 г. Р.Л.Прымін трагічна загінуў.

Яго імя прысвоена адной з вуліц г.п. Глуск.

Напярэдадні наступлення камандуючы конна-механізаванай групы генерал І.А.Пліеў даручыў мне ўзначаліць узмоцнены перадавы атрад 10-й кавалерыйскай дывізіі. Нам трэба было першымі ўвайсці ў прарыў абароны праціўніка, ачысціць ад яго подступы да р. Пціч, каб забяспечыць плацдарм для фарсіравання галоўным сілам дывізіі.

Пераадольваючы на сваім шляху контратакі ворага, наш атрад праз лясныя масівы і топкія балоты пачаў хутка прасоўвацца ў напрамку да Глуска. У 15 гадзін 26 чэрвеня мы падышлі да берагоў р. Пціч. На заходнім беразе яе праціўнік падрыхтаваў моцны прамежкавы абарончы рубеж. Усе масты цераз раку былі ўзарваны.

Разведка на чале з капітанам Казловым, пабываўшы ў в. Падлужжа, устанавіла сілы праціўніка, сярод мясцовых жыхароў знайшла правадніковў. З іх дапамогай ноччу была фарсіравана ўплаў рака, а праз некаторы час захоплена в. Падлужжа. Адбіваючы атакі праціўніка, наш атрад панёс страты, загінулі 6 баявых таварышаў, сярод іх і камандзір супрацьтанкавай батарэі лейтэнант Бялоў.

З раніцы 27 чэрвеня да нас далучыўся 40-ы кавалерыйскі полк, які павёў рашучае наступленне на Рылавічы і пасля ўпартага бою авалодаў вёскай. Было знішчана 60 фашыстаў і 40 чалавек узята ў палон.

Немцы ў паніцы адступалі на захад. Эскадроны палка працягвалі праследаваць ворага. Яны абышлі з захаду Глуск і ў 10 гадзін раніцы 27 чэрвеня, пачаўшы рашучую атаку, уварваліся ў Глуск. Ва ўзаемадзеянні з іншымі наступаючымі часцямі праціўнік быў разгромлены. Фашысты аказаліся прыціснутымі да ракі і здаліся ў палон.

З'яўленне коннагвардзейцаў і іншых воінаў арміі жыхары Глуска сустрэлі з велізарнай радасцю. На іх знявечаны выгляд цяжка было пазіраць, але радасці людзей не было канца, нас цалавалі, абдымалі, дзякавалі за вызваленне.

Пасля кароткага адпачынку з наступленнем цемнаты было адноўлена наступленне палка на Старыя Дарогі.

Пераправа, пераправа...

З успамінаў П.І.Мішарына, былога камандзіра ўзвода 18-га асобнага механізаванага сапёрнага батальёна

Пётр Іванавіч Мішарын нарадзіўся 3.1.1923 г. у с. Караболка Каслінскага раёна Чэлябінскай вобласці. З лютага 1942 г. на фронце.

У складзе 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса камандзір сапёрнай роты П.І.Мішарын у чэрвені 1944 г. прымаў удзел у вызваленні Глуска і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Узнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны служыў у дарожна-будаўнічых войсках, займаўся інжынерным абсталяваннем марскіх узбярэжжаў. Падпалкоўнік у адстаўцы. Жыве ў г. Обнінск Калужскай вобласці.

Ганаровы грамадзянін г.п. Глуск.

Да фарсіравання р. Пціч мы рыхтаваліся загадзя. Я займаўся інжынернай разведкай. Нам было вядома, што масты ёсць у раёне г.п. Глуск і в. Гарадок. Але яны былі на вялікай адлегласці адзін ад аднаго, і мы не ведалі, ці ўцалелі яны. Таму нам была пастаўлена задача знайсці брод для пераправы тэхнікі. У ноч з 26 на 27 чэрвеня за 2—3 км на поўнач ад Глуска даволі лёгка і без страт быў знойдзены і абазначаны брод. Суцэльнай лініі абароны на

р. Пціч у праціўніка не было. Брод скарыстала 19-я механізаваная брыгада, напрамак дзеяння якой быў на Глушу і Старыя Дарогі.

Пасля гэтага мы накіраваліся да драўляных мастоў. Іх вораг узарваць не паспеў. Сапёры хутка абследавалі іх у пошуках падвязаных зарадаў, і перадавы атрад 219-й брыгады па разбітай, з глыбокай каляінай дарозе рушыў на Глуск. На скрыжаванні дарог каля яго паўднёвай ускраіны атрад збіў заслон праціўніка і далей накіраваўся на Пагост.

Закончыўшы работу на мастах, мы далучыліся да перадавога атрада 37-й механізаванай брыгады і ўвайшлі ў горад.

Наступала грозная браня

У трэцім палку 37-й механізаванай брыгады ваяваў у чэрвені 1944 г. азербайджанец Наджаф Рафіеў. За плячыма камандзіра танкавага ўзвода быў Паўднёва-Заходні і Паўночна-Каўказскі франты. І вось зараз 1-ы Беларускі. Тры гады вайны пакінулі назаўсёды на целе мужнага танкіста свае адмеціны — сляды ад трох цяжкіх раненняў.

25 чэрвеня брыгада пачала наступленне па вызначаным маршруце ў Глускім напрамку. Наперадзе — вёска Зелянковічы. Танкістам вядома, што тут у немцаў моцныя ўмацаванні.

Фашысты сустрэлі нашы танкі і пяхоту шквалам артылерыйскага і кулямётнага агню. Стала зразумела, што авалодаць з ходу гэтым населеным пунктам не ўдасца, будуць вялікія страты. Тады трэці танкавы полк рушыў у абход нямецкай абароны і зайшоў у варожы тыл, знішчаючы ўсё на сваім шляху.

Узвод Рафіева ўвесь час ішоў уперадзе. Удача спадарожнічала яму ў баях. За першай перамогай новая — захоплена в. Селішча.

— Параніла камроты, — пачулася ў навушніках шлема. — За камандзіра Рафіеў... І зноў танкісты праследуюць адступаючага ворага. Пад гусеніцы танкаў трапляюць варожыя батарэі, аўтамашыны, абозы з награбленым дабром.

Хуткая і вёрткая «трыццацьчацвёрка» Рафіева за дзень прайшла 40 кіламетраў. Танкі яго роты з ходу адолелі пераправу цераз р. Пціч і неўзабаве выйшлі на шашу Бабруйск—Глуск, закрыўшы фашыстам шлях да адступлення. Толькі ў гэтым баі танкісты роты Рафіева захапілі 20 аўтамашын з ваеннымі грузамі, 2 легкавушкі.

Гэтак жа імкліва і смела дзейнічаў Наджаф Рафіеў і ў наступныя дні. 27 чэрвеня танкі пад яго камандаваннем дасягнулі в. Гарадок і знішчылі тут 20 аўтамашын, шматлікі абоз, шмат жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Праследуючы адступаючыя варожыя часці, танкісты разам з Рафіевым захапілі ўчастак шашы Бабруйск—Слуцк, дзе паралізавалі рух фашыстаў, здабылі багатыя трафеі.

За праяўленыя ў гэтых і наступных баях смеласць, мужнасць і гераізм Наджафу Рафіеву 26 верасня 1944 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Т.А.Аляксандрава.

* * *

З успамінаў В.С.Навалокіна, былога намесніка камандзіра 9-га танкавага палка 19-й механізаванай танкавай брыгады

Васіль Сямёнавіч Навалокін нарадзіўся ў 1912 г. у Маскве. Яго жыццёвы шлях з 1934 г. непарыўна звязаны з Чырвонай Арміяй. Вучыўся ў Маскоўскім танкава-тэхнічным вучылішчы. Перад вайной працаваў намеснікам начальніка палітаддзела танкавай брыгады.

У Вялікую Айчынную вайну В.С.Навалокін змагаўся з ворагам у складзе асобных войскаў і 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса. Яго баявы шлях прайшоў праз Сталінград, Харкаў, вогненную Курскую дугу, Белгарад, Кіраваград, Гомель, Слонім, Брэст, Варшаву, Берлін. У чэрвені 1944 г. удзельнічаў у баях за вызваленне Глуска і раёна. Узнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі.

Н.Р.Рафіеў.

Баі за вызваленне Глуска і раёна сталі састаўной часткай Баранавіцка-Слонімскай аперацыі, якую ажыццяўлялі войскі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем Маршала Савецкага Саюза К.К.Ракасоўскага.

1-му Краснаградскаму механізаванаму корпусу на чале з генерал-лейтэнантам С.М.Крывашэіным была пастаўлена задача: да канца першага дня агульнага наступлення выйсці ў раён вёсак Уюнішча, Воземля і сваімі перадавымі атрадамі захапіць пераправу цераз р. Пціч, на другі дзень авалодаць Глушай, Глускам, Асіповічамі, а далей рухацца на Слуцк.

Для наступлення выдзяляліся два маршруты, на яго флангах дзейнічалі кавалерыйскія часці генерала І.А.Пліева. У напрамку Зелянковічы — Селішча — Заполле наступала 37-я механізаваная брыгада пад камандаваннем палкоўніка М.І.Кулікова; у другім эшалоне за ёй рухалася 35-я механізаваная брыгада на чале з палкоўнікам М.В.Гаўрылавым. На левым флангу ў першым эшалоне наступала 19-я механізаваная брыгада пад камандаваннем У.В.Яршова, а ў другім эшалоне — 219-я танкавая брыгада на чале з палкоўнікам М.Г.Хлюпіным.

24 чэрвеня 1944 г. пасля моцнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі войскі 28-й арміі перайшлі ў наступленне і на працягу ўсяго дня вялі прарыў тактычнай абароны фашыстаў. Да раніцы 25 чэрвеня гэта ўдалося: па лініі фронту ўтварылася брэш да 3 км і ўглыб ад 5 да 10 км. Стварыліся ўмовы, каб увесці ў бой і наш корпус.

Роўна ў 5 гадзін 25 чэрвеня корпус пачаў рухацца па сваіх напрамках, маючы наперадзе моцныя перадавыя атрады мотапяхоты з танкамі, артылерыяй і сапёрамі.

Першае сур'ёзнае супраціўленне сустрэла 37-я мехбрыгада ў раёне в. Зелянковічы. Аднак, дзякуючы ўмеламу манеўру 3-га танкавага палка і мотапяхоты брыгады, якія зрабілі абходны манеўр, танкісты выйшлі ў тыл праціўніка. Населены пункт застаўся ўбаку, а вораг, не чакаўшы ўдару ў спіну, панёс значныя страты.

Брыгада працягвала наступленне. Смела і рашуча дзейнічалі ў гэтых баях байцы і камандзіры. Так, батарэя старшага лейтэнанта П.П.Скачкова 294-га мінамётнага палка, апярэдзіўшы фашыстаў, з ходу адкрыла трапны агонь, знішчыла варожую батарэю і пяць машын з пяхотай. Дзве гарматы батарэі праціўніка пры гэтым былі разбіты. Самаадданасць праявіў сувязны 4-й батарэі радавы Бухараў, які атрымаў раненне, закрыўшы сваім целам камандзіра.

У 16 гадзін 25 чэрвеня часці 37-й механізаванай брыгады вялі бой за вёску Селішча. З-за балоцістай мясцовасці наступленне прыпынілася, і ў бой, у абход 37-й мехбрыгады, была ўведзена 35-я мехбрыгада.

У гэтых баях выдатна праявілі сябе танкісты старшы лейтэнант А.П.Волкаў, лейтэнант Н.Р.Рафіеў, Н.П.Шырокаў, В.Н.Шопелеў, механік-вадзіцель М.М.Андрэйчанка, аўтаматчык Атколаў, камандзіры батарэі капітаны Пятроў і Крывалапаў.

У гэты час 19-я мехбрыгада ў 16 гадзін дагнала адступаючага праціўніка каля в. Гадуны, але фашысты, не прыняўшы бою, паспешна адыходзілі ў напрамку в. Шкава. У 19 гадзін быў захоплены замініраваны мост цераз р. Шкава. Разам з падрыўнікамі ў 22 гадзіны брыгада завязала бой на ўскрайку вёсак Воземля і Засценак, дзе знаходзіўся штаб 35-й нямецкай пяхотнай дывізіі. У гэтых баях вораг аказаў упартае супраціўленне. Бой працягваўся да 13 гадзін 26 чэрвеня. Пасля фашысты пачалі адыходзіць у напрамку в. Зубарэвічы, пакінуўшы ў Воземлі і Засценку вялікую колькасць забітых салдат і афіцэраў і шмат ваеннай тэхнікі.

У баях за Воземлю і Засценак вызначыліся воіны 19-й мехбрыгады: камандзір 1-га мотастралковага батальёна капітан Штанько, лейтэнант Беражко, старшыны Барышаўцаў, Горыкаў, радавыя Паплаўскі, Пустомлін, Патапаў, сяржант Салтыкоў, які захапіў у палон нямецкага каменданта в. Воземля; танкісты старшыя лейтэнанты Грыцэнка, Фостхулаеў, Мядзведзеў, Мішчанка, сяржанты Захараў, Пачэнскі, Баранаў, Зямноў, Ціцын, артылерысты В.С.Мілер, Скачкоў, аўтаматчыкі Клёнаў, Баравікоў, батарэя мінамётнага палка старшага лейтэнанта Скачкова.

37-я мехбрыгада працягвала наступленне і да канца дня 26 чэрвеня захапіла пераправу цераз р. Пціч у раёне в. Жалвінец, а на досвітку 27 чэрвеня з ходу авалодала Гарадком, перарэзала шашу Слуцк —

Бабруйск і тым самым адрэзала шляхі адыходу фашыстаў з Бабруйска.

Для ўмацавання гэтай брыгады вечарам 26 чэрвеня ўступіла ў бой з другога эшалона 35-я мехбрыгада. Танкісты дзейнічалі рашуча, да раніцы 27 чэрвеня яны вызвалілі Глушу і ў другі раз перарэзалі шашу Слуцк — Бабруйск.

Дзеяннямі 35-й і 37-й мехбрыгад быў створаны рухомы знешні фронт акружэння фашысцкіх войскаў у раёне Бабруйска.

У баях асабліва вызначыліся разведчыкі старшага лейтэнанта Грыгаровіча, танкісты старшага лейтэнанта А.П.Волкава, лейтэнанта В.Бакуленкі. 26 чэрвеня 19-я мехбрыгада, знаходзячыся на левым маршруце корпуса, выйшла да р. Пціч і вяла ўпартыя баі за пераправу на паўночным захадзе ад в. Зубарэвічы, але поспеху не мела. Яе 9-ы танкавы полк пад камандаваннем капітана М.Н.Бартоўскага вырваўся наперад, рашучым манеўрам збіў ахову каля замініраванага і разбуранага моста ў раёне в. Бярозаўка і захапіў пераправу. Пад маім кіраўніцтвам сапёры хутка аднавілі мост. Танкі выйшлі на правы бераг, а мотапяхота брыгады, не чакаючы ўзвядзення пераправы, працягвала наступленне.

Другая пераправа цераз Пціч была захоплена перадавым атрадам 37-й мехбрыгады 26 чэрвеня позна ноччу на ўсходняй ускраіне Глуска. Камендантам гэтай пераправы быў лейтэнант П.І.Мішарын, камандзір сапёрнага ўзвода 18-га асобнага механізаванага сапёрнага батальёна. Раніцай 27 чэрвеня ён забяспечваў пераправу 37-й мехбрыгады.

19-я мехбрыгада з баямі прабілася наперад. Да 12 гадзін 28 чэрвеня яна авалодала в. Вольніца і атрымала загад змяніць напрамак руху. Ёй патрэбна было наступаць далей у бок Любані і да канца дня авалодаць гэтым раённым цэнтрам.

Танкісты 9-га палка паспяхова рухаліся наперад. Вызваліўшы в. Заполле і разграміўшы тут варожую засаду, яны асядлалі дарогу Глуск — Глуша і, рухаючыся далей на захад, стварылі рэальную пагрозу акружэння глускага гарнізона праціўніка, што, безумоўна, садзейнічала часцям 28-й арміі і 37-й мехбрыгадзе 27 чэрвеня вызваліць Глуск.

19-я мехбрыгада некалькі адставала ў сваім руху ад правага фланга корпуса, але паспяховыя баі ў наступныя дні дазволілі ёй выйсці на ўзровень часцей корпуса, што дзейнічалі на правым маршруце.

Наступленне часцей 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса працягвалася.

Аперацыя закончылася перамогай

З успамінаў У.Сазановіча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

Воіны 54-й Макееўскай стралковай дывізіі летам 1944 г. прымалі ўдзел у вызваленні многіх беларускіх гарадоў і вёсак, у тым ліку і Глушчыны. 26 чэрвеня яе камандзір генерал-маёр М.М.Данілаў паставіў баявую задачу: выйсці ў тыл да фашыстаў, фарсіраваць р. Пціч, захапіць Глуск і ўтрымліваць захоплены рубеж да поўнага падыходу галоўных сіл злучэння. З гэтай мэтай быў створаны перадавы атрад, у які ўвайшлі рота аўтаматчыкаў пад камандаваннем гвардыі старшага лейтэнанта Сплаўскага, узвод 82-міліметровых мінамётаў. Камандзірам перадавога атрада быў назначаны гвардыі капітан Батрак.

У ноч на 27 чэрвеня 1944 г. воіны на 8 аўтамашынах разам з правадніком з мясцовых жыхароў выйшлі ў фланг абароны ворага і рушылі па лясной дарозе на захад. Ужо на досвітку гвардзейцы дасягнулі безыменнай вышыні, якая знаходзілася на невялікай адлегласці ад р. Пціч. У гэты момант разведка далажыла, што група немцаў выйшла з Зарэчча і перапраўляецца на лодках цераз Пціч. Мост цераз яе быў ужо падарваны. Дэталёва прааналізаваўшы абстаноўку, гвардыі капітан Батрак прыняў рашэнне: ротай аўтаматчыкаў пачаць фарсіраваць водную перашкоду супраць вёскі Калацічы і адрэзаць асноўны шлях адыходу праціўніка. Не меўшы магчымасці пераправіць артылерыю на заходні бераг ракі, 76-міліметровая батарэя размясцілася ў лесе, недалёка ад в. Зарэчча.

У 5 гадзін 40 мінут асноўныя сілы перадавога атрада без адзінага выстралу фарсіравалі Пціч і, не сустрэўшы фашыс-

таў у Калацічах, выйшлі на паўднёва-заходнюю ўскраіну вёскі. Два аддзяленні аўтаматчыкаў рушылі ў абход вёскі справа, а галоўныя сілы, маскіруючыся ў траве, пайшлі на Глуск. Аднак немцы, заўважыўшы нашых байцоў, адкрылі па іх агонь з кулямётаў і аўтаматаў. Па ўстаноўленаму сігналу батарэя 45-міліметровых гармат адкрыла агонь. Пад прыкрыццём артылерыстаў штурмуючая група кароткімі перабежкамі працягвала рухацца ўперад. Фашысты ўзмацнілі агонь, уключыўшы ў бой два мінамёты. У гэты момант камандзір атрада капітан Батрак выклікаў на прамую наводку ўсю батарэю 76-міліметровых гармат.

Гвардзейцы хутка і дакладна адкрылі агонь і знішчылі значную колькасць пяхоты праціўніка. Адзін снарад неспадзявана трапіў у касцёл на ўсходняй ускраіне пасёлка. Пачуўся моцны выбух. Як потым высветлілася, у касцёле фашысты абсталявалі склад з боепрыпасамі. Пад прыкрыццём дыму рота рушыла ў атаку і ўвайшла ў пасёлак. Немцы з баямі адыходзілі па яго палаючых вуліцах.

Чырвонаармеец Гайфулін выбег з зоны пажару і даў сігнал перанесці агонь на заходнюю ўскраіну і могілкі. Узвод аўтаматчыкаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Бандарэнкі без асаблівых цяжкасцей увайшоў у пасёлак. Пасля непрацяглага бою немцы вымушаны былі адступіць да шашы, якая знаходзілася пад прыцэльным агнём разведчыкаў і артылерыстаў.

Нарэшце Глуск быў узяты. Гэта дазволіла нашым часцям навесці пераправу і фарсіраваць Пціч. У выніку бою, які працягваўся паўтары гадзіны, гарнізон праціўніка быў амаль поўнасцю знішчаны.

Вызначыліся ў ходзе наступлення

Аляксандр Андрэевіч Вылегжанін, начальнік штаба артылерыі 28-й арміі, нарадзіўся ў 1914 г. у в. Ванееўцы Шабалінскага раёна Кіраўскай вобласці. З першых дзён вайны на фронце.

Артылерысты Вылегжаніна ўдзельнічалі ў прарыве розных ліній абароны, дапамагалі фарсіраваць многія рэкі, у тым ліку і р. Пціч. Вызвалялі раённы цэнтр Глуск, і ў гэтым немалая заслуга палкоўніка А.А.Вылегжаніна.

Потым ён ваяваў у Польшчы, у Літве. Закончыў вайну пад Прагай. Пасля вайны А.А.Вылегжаніну было прысвоена званне генерал-маёра, ён служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Памёр у 1966 г.

С.І.Зорын.

Камандзір 19-й механізаванай брыгады палкоўнік **Уладзімір Васільевіч Яршоў** вызначыўся, як і яго брыгада, у аперацыі «Баграціён». Пад яго камандаваннем танкісты дзейнічалі надзвычай энергічна і смела, імкліва развіваючы наступленне і хутка пераадольваючы водныя перашкоды. Уступіўшы ў баі з 25 чэрвеня 1944 г., брыгада здзейсніла абходны манеўр і зламала супраціўленне праціўніка на рубяжы в. Шкава. Потым удала фарсіравала Пціч і авалодала г.п. Глуск.

Не губляючы хуткасці і манеўранасці, танкісты брыгады перарэзалі шляхі адыходу праціўніка з поўдня і выйшлі на прамую лінію да Слуцка. У гэтых баях У.В.Яршоў праявіў сябе як смелы і рашучы камандзір, паказаў добрыя тактычныя навыкі ў кожнай бітве. Баявымі поспехамі брыгада цалкам была абавязана свайму камандзіру. За выкананне пастаўленай задачы палкоўнік У.В.Яршоў быў удастоены высокай узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга.

Сяргей Іванавіч Зорын, нарадзіўся ў 1915 г. у в. Крукаўскае-Ільіно Благавешчанскага раёна Башкірыі. Удзельнік баёў на Карэльскім перашыйку ў час савецка-

фінляндскай вайны. Праявіў сябе смелым, мужным воінам.

Свае лепшыя якасці праявіў старшына і ў баях за вызваленне нашага раёна, за што быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Як паведамлялася ва ўзнагародным лісце, 27.6.1944 г. Зорын Сяргей Іванавіч у баі за в. Гарадок у складзе экіпажа гусеніцамі танка знішчыў 3 агнявыя кропкі, 11 салдат і афіцэраў, захапіў 2 аўтамашыны і склад гаруча-змазачных матэрыялаў.

Аднак галоўныя ўзнагароды чакалі мужнага танкіста наперадзе. У студзені 1945 г. у баях за авалоданне г. Эксен яго танк першым уварваўся ў раён абароны праціўніка, знішчыў вялікую колькасць агнявых кропак ворага. За праяўленыя ў гэтым баі мужнасць і гераізм С.І.Зорын быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Яго імем названа трамвайнае дэпо ў г. Уфа, дзе ён працаваў многія гады. Памёр С.І.Зорын у лютым 1954 г.

Першае баявое хрышчэнне **Анатоль Мікалаевіч Бацьянаў** прыняў пад Масквой, другое — пад сценамі Сталінграда. Потым яго баявы шлях пралёг пад Курскам, Харкавам і ў Данбасе.

Гэта быў вельмі цікавы чалавек, геолаг, сібірак. Ён выдатна страляў, ведаў многія прыёмы самба, у патрэбны час мог заўсёды прывесці «языка». У многім яму дапамагаў былы вопыт паляўнічага. І наогул быў чалавек рэдкай мужнасці і вельмі ўмелы воін.

Салдацкі почырк разведчыка ведалі многія. Мужна змагаўся воін і на тэрыторыі Беларусі. Аб яго дзеяннях у раёне г.п. Глуск расказаў яго ўзнагародны ліст: на чале разведгрупы старшына А.М.Бацьянаў у першых радах уварваўся ў пасёлак. Прыняўшы бой, сам знішчыў нямала ворагаў, у тым ліку нямецкага афіцэра, а таксама ўмела кіраваў дзеяннямі сваіх таварышаў.

За гэту і наступныя аперацыі А.М.Бацьянаў далучыў да сваіх ранейшых узнагарод — медаля «За адвагу», ордэнаў Чырвонай Зоркі і Славы III ступені — другі ордэн Чырвонай Зоркі.

Загінуў А.М.Бацьянаў, абясшкоджваючы міну на месце цераз р. Шпрэе ў Германіі.

Прыйшоў час збавення

З успамінаў Марыі Мікалаеўны Шапко, жыхаркі г.п. Глуск

Вайна не абышла сваім горам ні адну хату, ні адну сям'ю. Рознага нагледзеліся мы ў Глуску ў час акупацыі. Не дай Бог нікому такога. Баяліся ўсяго: кожнага шораху, кожнага стуку. Страшна было нават па сваім двары прайсці. Маглі выстраліць проста так — і ўсё, табе канец.

А колькі людзей перавешалі? За нішто. Выконвалі сваю «работу» фашысты абавязкова прынародна, каб іншыя баяліся.

Літаральна перад самым вызваленнем Глуска бачым: немцы перапалохаліся, забегалі. Пачалі зганяць народ у кучу. Чуем, прыйшлі і на нашу вуліцу, стукаюць ў кожную хату. Загадваюць хутчэй выходзіць. Я з малым дзіцем на руках, яшчэ тры сястры, маці, бацька і кватарант хуценька сабралі клуначкі і выйшлі на вуліцу. Нас і пагналі ў бок цяперашняй ветлячэбніцы. Народу сабралася шмат. Здагадваемся, што немцы адступаюць і нешта страшнае хочуць зрабіць з мірнымі жыхарамі. Таму людзі, не баючыся нават куль, пачалі разбягацца, хто куды. Мы ўсёй сям'ёй кінуліся ў бок в. Мыслоціна. Па нас стралялі наўздагон. На шчасце, нікога не паранілі.

Дабраліся мы да лесу, а там ужо поўна народу. Неяк і не страшна стала, агулам лягчэй бяду пераносіць. У лесе нас застала ноч. З боку Глуска чутны былі стралянніна, выбухі. Сям-там выбівалася полымя агню, слупы дыму. У Глуску ішоў бой.

Раніцай ужо даведаліся, што Глуск свабодны ад немцаў і мы можам вярнуцца ў свае хаты.

Прыйшлі і не пазналі свой пасёлак. Многа разбураных хат, у двух месцах, у напрамку вуліцы Луначарскага (бліжэй да рэчкі) і санаторна-лясной школы бушаваў пажар. Наша хата засталася цэлай, толькі шыбы былі павыбіваныя. Але гэта ўжо здалося дробяззю. Галоўнае, што самі жывымі засталіся.

Глушчане — Героі Савецкага Саюза

ВОІНСКІ ТАЛЕНТ ТАНКІСТА

Сцяпан Фёдаравіч Шутаў нарадзіўся 30 студзеня 1902 г. у в. Дварэц у сялянскай сям'і, дзе ў яго было яшчэ чатыры браты і шэсць сясцёр. У 14 гадоў паступіў рабочым на шклозавод у Глушы.

У 1917—1918 гг. у складзе Гарадоцкага і Асіповіцкага атрадаў Чырвонай гвардыі, у партызанскім атрадзе Бабруйскага павета прымаў удзел у баях з войскамі нямецкіх і польскіх акупантаў. У 1920 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію.

У 1924 г. павятовым камітэтам партыі ён рэкамендуецца на вучобу ў Аб'яднаную ваенную школу імя ВЦВК. Да 1940 г. Сцяпан Фёдаравіч знаходзіўся на пасадах камандзіра ўзвода, памочніка камандзіра і камандзіра кавалерыйскага эскадрона, танкавай роты. У гэтыя ж гады вучыўся на кароткатэрміновых курсах, на акадэмічных курсах удасканальвання камсаставу.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны застаў С.Ф.Шутава ў Сярэднеазіяцкай ваеннай акрузе, дзе ён праходзіў вайсковую службу. Праз месяц, у ліпені 1941 г., ён быў ужо на фронце. Змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на Заходнім, Волхаўскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Украінскіх франтах.

Воінскі талент Шутава асабліва яскрава праявіўся ў перыяд камандавання 20-й танкавай брыгадай.

...У ноч на 3 кастрычніка 1943 г. ад камандзіра корпуса паступіў загад: назаўтра абавязкова пераправіцца цераз Дзяснy, а затым Днепр, каб надалей ва ўзаемадзеянні з часцямі 38-й арміі наступаць у абход Кіева ў паўднёва-заходнім напрамку.

Ад танкістаў патрабавалася вытрымка, знаходлівасць, вынослівасць і смеласць. Пераправачных сродкаў амаль ніякіх, а на аперацыю адведзены выключна кароткі тэрмін, і пераправіцца трэба непрыкметна. Тады і ўзнікла рызыковае рашэнне пераадолець Дзясну ўброд. Менш гадзіны патраціліна разведку. Даўжыня броду 200 метраў, глыбіня да двух — так далажылі разведчыкі Сямён Крывенка і Іван Гарбуноў, перамераўшы дно. Вынікі несуцяшальныя, глыбіня ў два разы перавышае дапушчальную норму для фарсіравання ракі з ходу. Але выхад і з такога становішча быў знойдзены.

Экіпажы, не губляючы часу, рыхтавалі танкі да незвычайнай пераправы: задраілі люкі, праканапацілі дзіркі, выхлапныя трубы падоўжылі брызентавымі рукавамі. Адкрытымі заставаліся толькі люкі вежы. Першым даў згоду весці танк пад вадой малодшы лейтэнант Шапашнікаў. Гвардыі падполкоўнік Шутаў знаходзіўся на самым адказным участку, кіруючы работамі на пераправе. Тоячы хваляванне, ён сачыў, як танк усё глыбей і глыбей пагружаўся ў ваду, як Шапашнікаў, стоячы на вежы, падае каманды механіку-вадзіцелю.

Нарэшце Т-34 выбраўся на супрацьлеглы бераг. За ім пайшоў другі, трэці танк... і так больш за 70 прайшло іх цераз шырокую і глыбокую раку без моста і паромаў.

Такую ж аператыўнасць праявілі танкісты брыгады Шутава і пры фарсіраванні Дняпра. Праўда, на гэты раз дапамагалі мясцовыя рыбакі-калгаснікі, якія паднялі з дна ракі некалькі барж і прыстасавалі іх пад паромы. Танкісты брыгады Шутава пад артылерыйскім агнём гітлераўцаў першымі пераправіліся цераз Днепр. Хутка ўвесь корпус сканцэнтраваўся на Люцежскім плацдарме. Тут таксама брыгада пад камандаваннем Шутава паказала выдатнае воінскае майстэрства.

Кіеў... Там засталася сям'я — жонка і два сыны. Больш як два гады Шутаў не ведаў пра іх лёс. Ці жывыя?

Нарэшце прыйшла доўгачаканая каманда: загадана авалодаць Кіевам 5—6 лістапада. На рашаючым напрамку наступлення камандзір корпуса зноў паставіў брыгаду С.Ф.Шутава. Пройдзе час і ў «Гісторыю другой сусветнай вайны» будуць упісаны такія радкі: «Высокае воінскае мастэрства і гераізм у баях на вуліцах горада паказалі воіны 38-й арміі і 20-й гвардзейскай танкавай брыгады падпалкоўніка С.Ф.Шутава, удастоенага за храбрасць і воінскае майтэрства, праяўленыя ў баях за Кіеў, звання Героя Савецкага Саюза».

...У ноч на 6 лістапада 1943 г. танкі гвардыі падпалкоўніка Шутава, знішчаючы агнём і гусеніцамі супрацьтанкавыя гарматы ворага, першымі імкліва праскочылі па бульвары Шаўчэнкі, Крашчаціку, прарваліся да цэнтра горада.

На наступную ноч, выкарыстаўшы кароткую перадышку, Сцяпан Фёдаравіч паспяшаўся на вуліцу Галі Цімафеевай, дзе жыла яго сям'я. Але дома нікога не было. Толькі праз два тыдні сустрэўся ён з жон-

кай і малодшым сынам Анатолем, які нарадзіўся ў 1941 г. і якога ён пабачыў упершыню. Са старэйшым Уладзімірам бацька ўбачыўся пасля вызвалення вёскі Бражанцы, дзе той чатыры месяцы хаваўся ад гітлераўцаў.

Пасля Кіева была вызвалена Правабярэжная Украіна. Брыгада палкоўніка Шутава ўдзельнічала ў акружэнні і знішчэнні Корсунь-Шаўчэнкаўскай групоўкі ворага. І зноў танкісты паказалі добрую вывучку, вынослівасць.

У жніўні 1944 г. пачалася Яска-Кішынёўская аперацыя. Палкоўніку Шутаву неабходна было дзейнічаць на правым флангу танкавай арміі і аператыўна авалодаць нафтавым раёнам Румыніі — Плаешці. Ужо першы дзень аперацыі прынёс танкістам баявы поспех. Дзеянні разгортваліся імкліва. Танкісты 20-й брыгады з ходу пераадолелі заняты праціўнікам хрыбет Марэ і за два дні з баямі прайшлі больш за сто кіламетраў. А 30 жніўня разам з танкістамі іншых брыгад 5-га гвардзейскага корпуса пасля жорсткіх баёў занялі Плаешці, пазбавіўшы Германію важнай крыніцы здабычы нафты.

Прадстаўляючы С.Ф.Шутава да прысваення звання двойчы Героя Савецкага Саюза, камандзір 5-га гвардзейскага Сталінградскага танкавага корпуса генерал-маёр Савельеў адзначаў: «20-я гвардзейская танкавая брыгада пад камандаваннем тав. Шутава на першым этапе аперацый адыграла галоўную ролю ў корпусе па выхаду на шырокі аператыўны прастор.

Брыгада тав. Шутава разграміла моцную танкавую групоўку, перагарадзіўшы шлях ворагу, знішчыўшы пры гэтым 30 цяжкіх танкаў праціўніка. У наступных баях брыгада тав. Шутава разам з іншымі часцямі корпуса рашучым штурмам прабівала абарону праціўніка і паспяхова завяршала кожны бой.

За выключную асабістую храбрасць, рашучасць і ўмелае кіраўніцтва баямі тав. Шутаў дастойны прысваення звання двойчы Героя Савецкага Саюза».

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 верасня 1944 г. С.Ф.Шутаў узнагароджаны другім медалём Залатая Зорка і ордэнам Леніна. Гэта вестка дайшла да палкоўніка ў час баёў у Трансільванскіх Альпах.

Восенню 1944 г. Шутаў назначаецца на пасаду намесніка камандзіра 9-га гвардзейскага механізаванага корпуса 6-й гвардзейскай танкавай арміі. З новым назначэннем маштабы работы і адказнасць значна ўзраслі. Аднак стылю кіраўніцтва войскамі на полі бою палкоўнік Шутаў не мяняў. Танкісты, пехацінцы, артылерысты і цяпер бачылі яго на самых адказных участках. Сам ён, напрыклад, кіраваў начным боем танкаў у гарах, перапраўляй цераз бурную горную раку, узяццем буйнога населенага пункта... У адным з баёў за вызваленне Венгрыі Сцяпана Фёдаравіча цяжка параніла. Давялося ампутаваць левую руку. Былі перабіты і абедзве нагі. Шутаў быў тэрмінова адпраўлены ў Маскву, дзе праходзіў курс лячэння ў шпіталі.

С.Ф.Шутаў.

У 1945 г. у сувязі з раненнем звольніўся ў запас. Вярнуўшыся ў родную Беларусь, знаходзіўся на партыйнай і савецкай рабоце. Сцяпан Фёдаравіч быў членам партыйнай камісіі пры ЦК КПБ, яго выбіралі дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1946—1947 гг. працаваў намеснікам міністра сацыяльнага забеспячэння БССР.

Апошнія гады Сцяпан Фёдаравіч жыў у Кіеве. Ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці: выступаў у воінскіх часцях, на прадпрыемствах, у калгасах, піянерскіх атрадах, напісаў кнігу «Чырвоныя стрэлы».

17 красавіка 1963 г. С.Ф.Шутаў памёр. У 1949 г. у вёсцы Дварэц, дзе нарадзіўся двойчы Герой Савецкага Саюза С.Ф.Шутаў, ва ўрачыстай абстаноўцы быў устаноўлены яго бюст. Па рашэнні раённага камітэта партыі і райвыканкома і са згоды родных у студзені 1975 г. бюст героя быў перанесены ў раённы цэнтр і ўстаноўлены ў гарадскім скверы. Яго імем названы вуліцы ў Кіеве, Бабруйску, Глуску.

С.Ф.Анташкевіч.

ЯГО НАЗЫВАЛІ МАЙСТРАМ РАЗВЕДКІ

РЫБАК Ульян Аляксандравіч нарадзіўся 1.1.1920 г. у в. Яўсеевічы Глускага раёна. Герой Савецкага Саюза (1945), член КПСС з 1944 г. З 1941 г. на Ленінградскім, Варонежскім, Цэнтральным, 1-м і 4-м Украінскіх франтах. Памочнік камандзіра разведвальнага ўзвода старшына У.А.Рыбак вызначыўся ў снежні 1944 г. у час разведкі сіл праціўніка ў Карпатах. З разведчыкамі ўзвода знішчыў 75 і ўзяў у палон 40 гітлераўцаў, здабыў каштоўныя звесткі пра ворага. За вайну захапіў 57 «языкоў», знішчыў 10 танкаў і больш за 200 гітлераўцаў. Да 1979 г. працаваў на Завалочыцкім спіртзаводзе. Яго імем названа вуліца ў г.п. Глуск.

З артыкула М.Салаўёва ў газеце «Рэспубліка» за 16 красавіка 1994 г.

О разведчике Рыбаке знали многие, боевые товарищи сочинили стихи:

Разведчик храбрый и толковый
Фашистам спуску не дает:
Ульян всегда придет с уловом,
У Рыбака всегда клюет.

Началась его боевая жизнь 23 июня 1941 г. на Карельском перешейке. В светлую короткую ночь ушел Рыбак с товарищами на поиск. Неудачно сложился он для разведчиков — враг их обнаружил. Пришлось отходить, да еще от танка отбиваться. Что с ним сделаешь? Рыбак смог, выбрав удобный момент, бросить бутылку с зажигательной смесью. Она точно легла в цель, и вражеская машина вспыхнула. Экипаж танка попал в руки разведчиков.

На фронтах Великой Отечественной войны Ульян Рыбак воевал от первого до последнего дня, а 9 мая встретил среди боевых друзей, побывал на параде Победы 24 июня 1945 г. на Красной площади в Москве. Вспоминая об этом, К.С.Москаленко, впоследствии маршал Советского Союза, писал:

У.А.Рыбак атрымлівае Зорку Героя Савецкага Саюза.

«В другом ряду я увидел старшину Ульяна Александровича Рыбака, для которого война началась 22 июня 1941 г., а закончилась в Праге. Еще на Карельском фронте У.А.Рыбак подбил и уничтожил гранатами и бутылками с горючей смесью 10 вражеских танков. Потом стал разведчиком. На его счету было 57 добытых «языков», около 200 вражеских солдат и офицеров он уничтожил. За свои подвиги разведчик был награжден Золотой Звездой Героя, орденами Ленина, Красного Знамени, Отечественной войны I степени, Славы II и III степеней, медалями «За боевые заслуги», «За отвагу».

В боевой биографии разведчика Рыбака были бои на украинской земле, форсирование Днепра осенью 1943 г. От рубежа к рубежу, от реки к реке шел Рыбак дорогами войны, пока не вступил в Карпаты. Тут он провел свою последнюю операцию.

...На командный пункт 226-й Глухово-Киевской Краснознаменной, орденов Суворова и Кутузова стрелковой дивизии неожиданно прибыл маршал С.К.Тимошенко. Представителя ставки на 4-м Украинском фронте сопровождал генерал армии И.Е.Петров. Маршал приказал комдиву вызвать старшину Рыбака. Генерал-майор Н.А.Кропотин не удивился этому — разведчика хорошо знали на фронте, а его авторитет среди солдат был необыкновенно высок.

Старшина Рыбак спокойно и уверенно доложил маршалу о себе. Тот, поздоровавшись с Ульяном, сказал:

...Задание такое, — карандаш в руке Тимошенко пересек линию фронта, остановился на венгерской территории. — Тут вот, по полученным данным, упрятали фашисты танковую армию СС. Вы должны установить ее дислокацию.

Вместе с Рыбаком ушли на задание разведчики А.Бронников, П.Ковалев, Н.Маликов, Н.Логинов, В.Сухих, Б.Суркис и радист Н.Власенко, чтобы постоянно

поддерживать связь со штабом, сообщать о продвижении группы.

Не скоро подошли разведчики к имению, у которого надо было начинать поиск. Укрылись на высотке, а утром не поверили своим глазам. К одному из строений потянулись враги. Насчитали человек триста. Многое стало понятно, но старшина решил понаблюдать. И не зря — на обед фашисты пошли также дружно, но в комбинезонах.

— Идут прямо от машин, — уверенно сказал Рыбак на ухо Ковалеву.

И разведчики стали выбираться с высотки, присоединились к группе Александра Бронникова, которая контролировала дорогу. Сопоставив собранное, пришли к выводу — это танкисты той части врага, которую им приказал разыскать маршал Тимошенко. Доложили в штаб. Оттуда Рыбаку передали приказ взять «языка», желательно офицера, и возвращаться назад. Задание выполнили разведчики Николай Логинов, Борис Суркис и Павел Ковалев, ближе всех оказавшиеся к направившемуся в кустарник офицеру. С гауптманом разведчики двинулись в обратный путь. Но на самой линии фронта случилось непредвиденное: при переходе офицер, услышав немецкую речь, стал вырываться, вытолкнул кляп, заорал во все горло. Разведчики бросились вперед. Вспыхнули ракеты, застрочил пулемет... Ульян Рыбак пришел в сознание в госпитале. Там узнал, что 24 марта 1945 г. его удостоили за проведение этой операции высшей степени отличия.

НА РУБЯЖАХ БЕССМЯРОТНАСЦІ

КАЛІНКОЎСКІ Сцяпан Антонавіч нарадзіўся ў 1918 г. у в. Даколь Глускага раёна. З першых дзён вайны на фронце, ваяваў на Паўночна-Заходнім, 1-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах.

Механік-вадзіцель танка ст. сяржант С.А.Калінкоўскі вызначыўся пры вызваленні Польшчы. Пры наступленні зімой 1945 г. у складзе экіпажа знішчыў 2 варожыя мінамётныя батарэі, 120 павозак і 11 аўтамашын з боепрыпасамі, многа жывой сілы праціўніка.

22 студзеня 1945 г. у час правядзення разведкі экіпаж яго танка ўварваўся ў населены пункт Кольмар, перарэзаў шлях варожаму чыгуначнаму эшалону і захапіў склады.

23 студзеня авалодаў пераправай цераз р. Нотаць і ўтрымліваў яе да падыходу падмацавання.

26 студзеня С.А.Калінкоўскі загінуў. 24 сакавіка 1945 г. быў пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Навечна занесены ў спісы вайсковай часці. Яго імем названа вуліца ў Глуску.

219-я танкавая брыгада 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса, дзе ваяваў наш зямляк, не ўдзельнічала ў вызваленні Глушчыны. Брыгада ішла ў другім эшалоне. Маршрут танкістаў праз пару дзён пралёг цераз Старыя Дарогі, Баранавічы, Слонім.

Асабліва праявіла брыгада сябе ў баях за вызваленне Польшчы. Экіпаж танка, механікам-вадзіцелем якога быў Сцяпан Калінкоўскі, за кароткі час прайшоў без аварый, паломак і вымушаных прыпынкаў звыш 300 кіламетраў і знішчыў на сваім шляху больш як сто нямецкіх павозак і 11 аўтамашын з боепрыпасамі, дзве варожыя мінамётныя батарэі, некалькі дзесяткаў фашыстаў. Упарадзе яго чакалі баі за гарады Кутна, Клодава і Кольмар, дзе танкісты асабліва вызначыліся.

22 студзеня 1945 г. экіпаж танка атрымаў заданне разведаць пярэдні край абароны праціўніка пад горадам Кольмар, выявіць агнявыя кропкі. Галоўны разлік рабіўся на раптоўнасць. І сапраўды, ён цалкам апраўдаўся. Як толькі «трыццацьчацвёрка» нечакана з'явілася на варожых пазіцыях, тут узнікла паніка. Танк на скорасці імчаўся па траншэях, акопах і варонках. Але фашысты хутка апамяталіся і адкрылі моцны агонь. Адзін з варожых снарадаў трапіў у танк. Машына спынілася. З варожых пазіцый раздаліся воклічы радасці.

Мінуты, праведзеныя танкістамі ў

С.А.Калінкоўскі.

амаль што акружаным танку, здаліся вечнасцю. Пра смерць ніхто не думаў, думалі, як будуць адбівацца. Але да гэтага не дайшло. Умелыя Сцяпанавы рукі здзейснілі цуд. Танк рушыў уперад і ўварваўся на чыгуначную станцыю. З чыгуначных рэек ён збіў паравоз, які цягнуў эшалон, нагружаны аўтамашынамі і боепрыпасамі. Чыгуначнае палатно аказалася надзейна забарыкадаваным. На станцыі, як і ў горадзе, узнялася паніка. Потым знішчылі воінскі склад і паспяхова вярнуліся да сваіх. Горад Кольмар неўзабаве быў узяты савецкімі войскамі.

219-я брыгада спяшалася да г. Чарнікаў — населенага пункта паблізу польска-германскай граніцы, які размешчаны каля р. Нотаць.

Танк Калінкоўскага, узнімаючы снежны пыл, імчаў па ўказаным маршруце. За дзве гадзіны прайшлі больш за 60 кіламетраў.

У пачатку прыцемкаў танк нечакана з'явіўся каля ракі. Мост, на здзіўленне, быў цэлы, фашысты корпаліся каля яго. Нядоўга раздумваючы, пераканаўшыся парай фраз з камандзірам, Калінкоўскі накіраваў танк на мост. Імгненне — і машына на другім беразе. Толькі тут фашысты заўважылі савецкі танк. А праз некалькі хвілін мост цераз Нотаць узляцеў у паветра. Танк аказаўся ў пастцы. Прыйшлося прыняць няроўны бой.

Танкісты ўтрымлівалі пераправу, прыкрываючы сваім агнём падышоўшых затым сапёраў, якія аднаўлялі мост. А раніцай, яшчэ да світання, галоўныя сілы 219-й брыгады бесперашкодна пераправіліся цераз Нотаць. Лёс горада, які трэба было ўзяць, быў вырашаны.

Сцяпан Калінкоўскі на сваім танку адным з першых перасёк польска-германскую граніцу. Танкісты вялі цяжкія баі. Ім прыйшлося трымаць няроўны паядынак — адна «трыццацьчацвёрка» супраць трох варожых танкаў і аўтаматчыкаў. Але яе экіпаж цвёрда ўтрымліваў свой рубеж, знішчыўшы больш за 30 салдат і 2 варожыя танкі. Гітлераўскаму «фаустніку» ўдалося падбіць наш танк. Экіпаж пакінуў машыну. Паранены Калінкоўскі адбіваўся ад насядаючых гітлераўцаў да апошняга...

Т.А.Матусевіч.

Далёка ад Радзімы

Ляцелі познім вечарам. «Кукурузнікі» для многіх членаў аператыўнай групы аказаліся цеснаватымі, такім прыйшлося выбраць сабе найбольш падыходзячае месца — плоскасці самалёта, да якіх перад палётам яны былі прывязаны. Гэтая «камфартабельнасць» прымусіла многіх партызан дружна рассмяяцца.

Лінія фронту нечакана выступіла з цемнаты ўспышкамі гармат, яркім полымем пажараў.

З кабіны выглянуў пілот.

— Падлятаем да Кошвецы-Прэскаў. Падрыхтавацца.

Яшчэ некалькі мінут, і да зямлі плывуць адзін за другім белаватыя дзьмухаўцы парашутаў. Цішынёй, якая магла ў любую хвіліну разарвацца нечаканымі стрэламі, сустрэла групу славацкая зямля.

Лес, горы — мясцовасць амаль такая ж, як і на радзіме, дзе кожны з партызан ужо прайшоў патрэбную загартоўку ў барацьбе з ворагам. Узяць хоць бы камандзіра групы Кірылу Гаўрылавіча Іванова. Нялёгкія баі ў першыя дні вайны, адступленне, фашысцкі палон, які аказаўся нядоўгім, удалыя ўцёкі, падпольная работа ў горадзе Наваград-Ровенскі — вось асноўныя вехі яго баявога шляху. Затым гады партызанскай барацьбы на Украіне, за час якіх грудзі адважнага падрыўніка ўпрыгожылі заслужаныя ўзнагароды — ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалі. І вось новае заданне: у тыле ворага, на славацкай зямлі, арганізаваць партызанскі атрад і весці тут дыверсійна-разведвальную работу.

У першыя ж дні групу напаткала няшчасце: загінулі, сутыкнуўшыся з варожай засадай, чацвёра партызан. Але гэта не зламала дух застаўшыхся дзесяці.

Першыя ж дывершіі, праведзеныя імі, прыцягнулі ўвагу мясцовага насельніцтва. Славакі перадавалі адзін аднаму радасныя весткі. У гутарках з разведчыкамі многія з іх выказвалі жаданне далучыцца да партызан. Неўзабаве група папоўнілася першымі такімі добраахвотнікамі. Гэта былі чэхі Ян Гулаш, Марцін Гойдаш, Войтэк, Ванчо, салдаты славацкай арміі Ян

Маткут, Штэфан Голуб і інш. Атрад рос з кожным днём, і к маю 1945 г. у ім налічвалася ўжо 360 чалавек.

Былі арганізаваны новыя групы падрыўнікоў. Яны ўзрывалі масты, чыгуначнае палатно. Такім чынам на некаторы час затрымлівалася дастаўка варожых сіл і харчавання да лініі фронту. У штаб перадаваліся неабходныя даныя аб варожых камунікацыях. Радзіма не забывала сваіх пасланцоў: аўтаматы, патроны, міны, узрыўчатку, сілкаванне для рацый, пісьмы ад родных і блізкіх дастаўлялі партызанам з Вялікай зямлі самалёты...

Камандзір разведкі Ружыцкі, вярнуўшыся аднойчы з задання, расказаў, што ў адным з пасёлкаў знаходзіцца варожы завод, які выпускае бронешчыты і іншыя дэталі для танкаў. Там жа размяшчалася і электрастанцыя.

Разведка вялася некалькі дзён. Перапрануўшыся ў форму рабочага, Ян Гулаш пайшоў у пасёлак і ўдакладніў даныя аб ахове завода.

У ноч на 21 верасня 1944 г. група партызан з 26 чалавек непрыкметна падышла да ваколіцы рабочага пасёлка. Тут яе чакаў праваднік. Адны накіраваліся да электрастанцыі, каб узарваць яе, другія затым павінны былі ўварвацца ў цэхі і знішчыць усё абсталяванне завода.

Вораг не чакаў такога дзёрзкага нападу партызан. Хутка абяззброіўшы ахову, падрыўнікі заклалі скрынкі з толам у турбіну і генератар. Моцны выбух скалануў паветра. Гэтак жа паспяхова справілася са сваім заданнем і другая група. Партызаны ўжо вярталіся на базу, калі новы выбух зноў парушыў начную цішыню. Аперацыя была выканана бліскуча.

Тысячы кіламетраў прайшоў са сваім атрадам па чэхаславацкай зямлі Кірыла Гаўрылавіч Іваноў. Дзесяткі смелых дыверсій, ажыццёўленых у глыбокім тыле ворага, запісалі партызаны на свой рахунак. Як родных, самых дарагіх людзей, сустракалі іх у вызваленых сёлах, бо яны, гэтыя нязломныя людзі, неслі на сваіх штыках доўгачаканую свабоду.

Раніцай 31 сакавіка 1945 г. атрадныя разведчыкі сустрэліся ў сяле Клак з байцамі Румынскага корпуса. Радаснай была сустрэча. Спаткаліся салдаты-пабрацімы, якія ў час суровых выпрабаванняў жылі адзіным імкненнем — перамагчы фашысцкіх захопнікаў.

Новымі ўзнагародамі ўпрыгожыўся баявы шлях партызанскага камандзіра Іванова. Побач з ордэнам Айчыннай вайны II ступені закрасаваліся ордэны, якіх удастоіў савецкага патрыёта чэхаславацкі ўрад. Зорка партызана і Чэхаславацкі крыж занялі дастойнае месца сярод іншых узнагарод, заслужаных Івановым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Т.А.Матусевіч.

Ляталі ў небе сокалы

З успамінаў М.П.Осіна, былога лётчыка 484-га знішчальнага авіяцыйнага палка

Мікалай Паўлавіч Осін нарадзіўся ў Разанскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1920-я гады бацькі пераехалі ў Беларусь, жылі ў в. Гарадзішча Хваставіцкага сельсавета Глускага раёна. Пасля заканчэння ў 1939 г. педкурсаў Осін працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Старадарожскім раёне. У 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію, закончыў Мінскую ваенна-лётную школу, атрымаў званне малодшага лейтэнанта. Праз чатыры дні пачалася Вялікая Айчынная вайна.

М.П.Осін прымаў удзел у абароне Масквы, змагаўся ў небе Сталінграда, вызваляў ад ворага Беларусь і сваю родную Глушчыну. Гвардыі старшы лейтэнант, камандзір звяна лётчыкаў-знішчальнікаў М.П.Осін здзейсніў 136 баявых вылетаў, удзельнічаў у 82 паветраных баях, асабіста збіў шэсць самалётаў праціўніка і толькі аднойчы страціў свой самалёт.

Закончыў вайну ў Кёнігсбергу. За плячамі М.П.Осіна больш за 50 гадоў настаўніцкай працы ў сельскіх школах. Жыве ў в. Заполле Завалочыцкага сельсавета.

М.П.Осін.

За некалькі дзён да пачатку аперацыі «Баграціён» нам паведамілі, што наш асобны 484-ы знішчальны авіяцыйны полк будзе падтрымліваць войскі 28-й і 65-й армій.

22 чэрвеня мы атрымалі загад правесці паветраную разведку ў раёне абароны праціўніка ў напрамку Майсееўка — Зелянковічы — Катка — Глуск — Палажэвічы — Старыя Дарогі — Асіповічы — Глуша — Бабруйск.

Усё тое, што напярэдадні нам удалося сфатаграфаваць, атрымала высокую ацэнку камандавання. Атрыманыя данясенні і фотасхемы нямецкай абароны былі тэрмінова перанесены на карты і разасланы ў вайсковыя штабы. Гэта дало магчымасць устанавіць глыбіню абароны праціўніка, характар яго абарончых умацаванняў, стан перапраў, колькасць і размяшчэнне рэзерваў, іх перамяшчэнне. Даныя разведкі значна аблегчылі дзеянні наземных войскаў, якія пачалі развіваць імклівае наступленне.

Перад намі стаяла задача весці разведку, прыкрываць і падтрымліваць наступаючыя войскі, наносіць удары па дарогах, якія вялі ў Парычы, Глуск, Бабруйск.

На наступны дзень наступлення 1-га Беларускага фронту нам загадалі падтрымліваць конна-механізаваную групу генерал-лейтэнанта І.А.Пліева, якую спрабаваў затрымаць вораг. Але гэты намер быў сарваны, часці групы хутка выйшлі да р. Пціч у раёне майго роднага Глуска і месцамі фарсіравалі раку. Група Пліева абышла Глуск з захаду і працягвала рухацца наперад, пакінуўшы разгром глускага гарнізона часцям, якія накіроўваліся за ёй. 27 чэрвеня часці 28-й арміі генерала Лучынскага авалодалі гэтым населеным пунктам.

Мне асабліва прыемна было пачуць гэтую навіну, бо разумеў, што ў вызваленне майго роднага краю ўкладзена часцінка і маёй ратнай працы.

Заглянуць дамоў так і не змог: былі вельмі гарачыя дні, мы імкліва рухаліся наперад, дзе нас чакаў Мінск.

Не, не загінуў салдат

Неяк Аляксандр Мартынавіч Васілеўскі, жыхар в. Карніца, атрымаў пісьмо, якое прачытаў з вялікім здзіўленнем і хваляваннем. Яго пераслалі ў райваенкамат, куды звярнуўся адзін з былых аднапалчан Васілеўскага — палкоўнік Кузняцоў. Ён пісаў: «Для ўвекавечвання памяці былога камандзіра ўзвода 3-га асобага гвардзейскага матацыклетнага палка Аляксандра Мартынавіча Васілеўскага, загінуўшага ў баях 10 снежня 1942 г. каля саўгаса № 79 Суравікоўскага раёна Валгаградскай вобласці і там жа пахаванага, просім паведаміць, хто з родных загінуўшага жыве і дзе жыве...»

Толькі трэці раз перачытаўшы змест, Аляксандр Мартынавіч адарваўся ад невялікага лістка, выклікаўшага столькі эмоцый. Адразу ўспомніўся той даўні эпізод. Жорсткі, кровапралітны бой пад Сталінградам.

Узвод, якім камандаваў А.М.Васілеўскі, ішоў у атаку на правым флангу. Наступленне развівалася паспяхова. Немцам з кожнай хвілінай усё складаней было стрымліваць наступальны парыў. Але асабіста для Аляксандра Мартынавіча, як гэта нярэдка бывае на вайне, усё вырашыла хвіліна. Адзінае, што памятае, — кароткі, моцны ўдар у грудзі. А за ім — правал, пустата.

Ачнуўся ўжо ў шпіталі. І то, як яму пазней сказалі, толькі на трэція суткі. Шанцаў выжыць было значна менш, чым памерці. Вельмі ўжо рана сур'ёзная — прастрэлена лёгкае. Відаць, тады і палічылі яго забітым.

Ды толькі выжыў салдат. І не толькі выжыў, але, здавалася, здзейсніў немагчымае: праз некаторы час вярнуўся ў строй.

Пасля першага ранення (акрамя яго было яшчэ чатыры) Аляксандр Мартынавіч ваяваў у складзе 1-га Украінскага фронту. Спачатку вызваляў нашу тэрыторыю, потым былі дарогі Польшчы, Чэхаславакіі, Германіі. Асаблівыя мужнасць і гераізм праявіў у баях на Сандамірскім плацдарме, за фарсіраванне Нэйсе і Одэра ўзнагароджаны польскім медалём.

А пасля вызвалення Браціславы жыхары горада на вокладцы часопіса «Праўда» ўбачылі фотаздымак, на якім савецкі старшы лейтэнант (а гэта быў Васілеўскі) сфатаграфаваны разам са славацкімі дзецьмі, хлопчыкам і дзяўчынкай, пажадаўшымі пасядзець у калясцы яго матацык-

ла. Сімпатычны, статны, высокі, ён не мог не стаць «ахвярай» настойлівага фотажурналіста Курта Райха.

Вось так, пасля таго як аднапалчане палічылі яго забітым і пахаваным, наш зямляк прайшоў яшчэ доўгі баявы шлях. Пераканаўчы доказ таму — ордэны Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, дзевяць медалёў. І палкоўнік Кузняцоў, відаць, да вялікага свайго здзіўлення, атрымаў адказ не ад афіцыйных інстанцый, а ад самога А.М.Васілеўскага. Таго самага, якога лічыў гераічна загінуўшым.

І нічога, што недзе пад Валгаградам узвышаецца абеліск, на якім залатымі літарамі выбіта прозвішча Аляксандра Мартынавіча...

Некалькі гадоў таму ветэран памёр. І засталося пасля салдата тое, што звычайна бывае даражэй за ўсё, — удзячная чалавечая памяць.

Н.Б.Сандамірскі.

Бессмяротны подзвіг марака

Аб гэтым подзвігу ў адным з архіўных дакументаў гаворыцца: «29—30 сакавіка 1943 г. атрад маракоў-разведчыкаў пад камандаваннем капітана Юневіча высадзіўся на варожы бераг, пранік у глыбокі тыл ворага і здабыў выключна каштоўныя звесткі. Сваю задачу атрад выканаў бліскуча. Пры адыходзе севераморцы былі акружаны вялікай групай фашыстаў. Некалькі дзён цягнуўся няроўны бой. Разведчыкі знішчылі больш як 200 гітлераўцаў. У крытычны момант капітан Юневіч выклікаў агонь артылерыі на сябе».

Гэтыя радкі пра нашага земляка з вёскі Замасточча Аляксандра Якаўлевіча Юневіча. У гады вайны ён камандаваў ротай 63-й Чырванасцяжнай брыгады марской пяхоты.

...Брыгада дыслацыравалася на паўвостравах Сярэдні і Рыбачы. Ішлі доўгія і цяжкія баі з часцямі нямецка-фашысцкай групы «Поўнач». Вораг займаў галоўныя вышыні на хрыбце Муста-Тунжуры. У напружаных баявых буднях самыя адказныя заданні выконвалі разведчыкі брыгады.

Было гэта ў канцы сакавіка 1943 года... Атрад Юневіча выканаў баявое заданне, перадаў у штаб патрэбныя звесткі і з баямі вяртаўся назад. Было знішчана каля 200 фашыстаў, узарвана некалькі агнявых кропак. Юневіч дакладваў камандзіру 63-й брыгады марской пяхоты палкоўніку Крылову: «Заданне выканаў паспяхова. У час адыходу быў заўважаны праціўнікам, асвечаны ракетамі і абстраляны. Адыходжу ад агню ворага. Пранік у глыбіню ад берага больш чым на кіламетр».

Тым часам гітлераўцы кінулі супраць адважных разведчыкаў значныя сілы, выратавалі акружыць і ўзяць іх у палон. Севераморцы адбівалі па 5—6 атак за дзень. Разведчыкаў станавілася ўсё менш і менш. Капітан Юневіч дакладваў у штаб брыгады: «Адбіў некалькі атак. Маю страты — 11 забітых і 2 параненых».

Пад вечар другога дня фашысты наблізіліся ўшчыльную. Маракі кінуліся ў рукапашны бой. Гітлераўцы адступілі. Праз некаторы час бой успыхнуў зноў. Разведчыкі расстрэльвалі апошнія патроны. З сарака засталося ў жывых толькі дваццаць, а вораг насядаў.

Капітан Юневіч уключыў радыёстанцыю, паведаміў сваім каардынаты атакуючага ворага. Хутка на савецкім баку завухкалі гарматы, над галовамі маракоў праляталі снарады. Адзін за адным яны разрываліся над сопкамі ўперадзе варожых пазіцый. Юневіч перадаў папраўку. Снарады пачалі рвацца ў самай гушчы праціўніка.

Раптам пачулася частая аўтаматная стралянінa. Зусім побач. Учапіўшыся ў трубку, капітан громка закрычаў:

— Каардынаты... — Прашу агонь на мяне... Бывайце, сябры!

А.Я.Юневіч.

Агонь на мяне! Агонь на мяне! Вы чуеце? Памылкі няма, агонь на нас!..

Некалькі хвілін стаяла цішыня, як перад бурай. І вось грымнуў гром. Паветра ўскалыхнулася ад узрываў. Паляцелі ўверх кавалкі горнай зямлі. Праз некалькі хвілін сопкі не стала відаць: яе зацягнула дымам...

З жывых застаўся толькі адзін матрос Бакін. Яго, цяжка параненага, падабралі нашы байцы праз некалькі дзён у заліве на бервяне. Ён і расказаў, як загінулі маракі-севераморцы і разам з імі наш зямляк капітан Аляксандр Юневіч.

Г.К.Янкоўскі.

Служылі землякі ў адным палку

Якім шчасцем было для салдата сустрэць на фронце земляка! Асобным жыхарам нашага раёна ў гэтым сэнсе проста пашанцавала, бо ў час прызыву ў армію яны трапілі ў адно вайсковае падраздзяленне, дзе, як спяваецца ў адной ваеннай песні, «хлеб і соль дзялілі папалам». Гэта быў 487-ы полк 143-й стралковай дывізіі. Воляй лёсу Сцяпан Фаміч Тупіца з Вайцяхова, Карней Уладзіміравіч Юневіч з Жукавіч, Іван Васільевіч Царык з в. Заполле Хваставіцкага сельсавета, Міхаіл Мікалаевіч Кудзёлка з Барысаўшчыны, Нікан Яфрэмавіч Багук з Халопеніч, Васіль Пятровіч Глаз з в. Калацічы і Васіль Сцяпанавіч Лазараў з в. Заполле аказаліся ў адным палку, у адной дывізіі, часта сустракаліся і па-геройску ваявалі. Менавіта аб гэтым сведчаць іх узнагародныя лісты, якія па сённяшні дзень захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі ў г. Падольск.

Вось кароткія з іх вытрымкі.

Тупіца Сцяпан Фаміч, н. у 1910 г., стралок 2-й роты. У наступальным баі на в. Плуды Варшаўскага ваяводства 10 кастрычніка 1944 г. дзейнічаў у складзе стралковага аддзялення і паказаў сябе смелым, адважным і рашучым воінам. Нягледзячы на масіраваны артылерыйскі агонь праціўніка, С.Ф.Тупіца ўпарта прасоўваўся ўперад разам з байцамі свайго аддзялення. Ён уварваўся ў траншэі, занятыя ворагам, дзе навязаў немцам рукапашны бой, забіў аднаго немца і быў паранены. За гэты бой С.Ф.Тупіца ўзнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

Юневіч Карней Уладзіміравіч, н. у 1910 г., чырвонаармеец, другі нумар станковага кулямёта 3-й роты. У час наступлення палка на крэпасць Прага (прадмесце Варшавы) 14 верасня 1944 г. праявіў смеласць і адвагу. Воін дзейнічаў у складзе разліку, выявіў засеўшых з кулямётам фашыстаў, якія не давалі магчымасці прасоўвацца ўперад нашай пяхоце.

Карней Уладзіміравіч скрытна ад ворага абышоў яго, наблізіўся на кароткую адлегласць і агнём свайго кулямёта падавіў кулямётную кропку ворага, знішчыўшы пры гэтым трох нямецкіх салдат. У гэтым баі Юневіч быў паранены, а пазней узнагароджаны медалём «За адвагу».

Царык Іван Васільевіч, н. у 1925 г., стралок 7-й роты. У баі за в. Плуды Варшаўскага ваяводства праявіў узоры мужнасці і рашучасці. Першым узняўся ў атаку на ворага і, уварваўшыся ў траншэю праціўніка, завязаў бой. У выніку фашысты не вытрымалі і кінуліся ўцякаць, пакінуўшы займаемы рубеж. За гэты бой І.В.Царык быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Кудзёлка Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1925 г., чырвонаармеец-зараджаючы 76-мм гарматы. Пры прарыве варожай абароны ў раёне в. Стара Варшаўскага ваяводства 15 студзеня 1945 г. агнём сваёй гарматы знішчыў кулямётную кропку ворага і 5 нямецкіх салдат. За гэты баявы подзвіг воін быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Багук Нікан Яфрэмавіч, н. у 1918 г., стралок 5-й роты. У наступальным баі, мэтай якога быў прарыў абароны праціўніка ў раёне в.Стара Варшаўскага ваяводства 15 студзеня 1945 г., першым узняўся ў атаку, уварваўся ў нямецкую траншэю. У рукапашнай схватцы знішчыў двух варожых салдат. За гэты бой воін быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Другую такую ж узнагароду ён неўзабаве заслужыў у новым баі з ворагам.

Глаз Васіль Пятровіч, н. у 1925 г., стралок 8-й роты. 2 лютага 1945 г. удзельнічаў у баі за г.Дойч-Кроне. Смелы воін выявіў кулямётную кропку, якую вырашыў знішчыць. Ён скрытна падпоўз да яе і за-

кідаў гранатамі. Ад нямецкай кулі быў паранены. За гэты баявы подзвіг В.П.Глаз быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Лазараў Васіль Сцяпанавіч, н. у 1925 г., малодшы сяржант, камандзір аддзялення 1-й роты. Удзельнічаў у баі ў Памераніі за г. Дойч-Кроне 5 лютага 1945 г., праявіў мужнасць, смеласць, уменне весці бой. Нягледзячы на моцны агонь праціўніка, ён сваім аддзяленнем пераадолеў супраціўленне ворага і ўварваўся на варожыя пазіцыі. У рукапашнай сутычцы знішчыў асабіста 6 гітлераўцаў, пры гэтым быў паранены сам. За смелыя дзеянні ў гэтым баі мужны воін быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Падрыхтавала Т.А.Аляксандрава.

Апошні бой — ён цяжкі самы...

З успамінаў Мікалая Васільевіча Мельнікава, жыхара г.п. Глуск, удзельніка баёў за Берлін

Высокія і крутыя берагі Ландверг-канала, скаваныя цэментам, аддзялялі нас ад апошняга ачага супраціўлення акружанага берлінскага гарнізона. Гэтыя 300 метраў былі апошнім водным рубяжом, апошняй перашкодай на шляху да рэйхстага.

Пяхота пачала пераправу. Яна, прыціснутая да зямлі, размясцілася ў варонках ад снарадаў, за развалінамі дамоў. Уся артылерыя, нават буйнога калібру, страляла прамой наводкай. Усё было гатова да апошняга штурму. Бой не змаўкаў. Здавалася, быццам усё, што ахоплівала вока, страляла. Ірваліся снарады, міны, трашчалі кулямёты і аўтаматы. З рэжучым вушы віскатам разрываліся фаустпатроны, абдаючы салдат полымем і асколкамі. Рассыпаліся каменныя будынкі старажытных берлінскіх дамоў, якія былі ўзведзены сотні год таму, а зараз хавалі пад сабой людзей і вуліцы.

Вось з акна чацвёртага паверха стала відаць нямецкая гармата, яе заўважылі нашы артылерысты. Кароткая каманда, і нямецкі разлік разам з гарматай накрылі абломкі цэглы. Відовішча жудаснае. Здавалася, што дзень ператварыўся ў ноч. Дымам і пажарам, свінцом і жалезам, шумам мататаў і скрыгатам сталі клакатаў Берлін.

Разам з усімі наступалі і гвардзейцы генерал-маёра Шугаева. Чакалі ночы, каб пад яе покрывам наладзіць пераправу і даць магчымасць перайсці на другі бок людзям і тэхніцы.

Ноч наступіла непрыкметна, як звычайна прыходзяць вясеннія ночы. Яна была хмурая і цёмная. Нізкія хмары навіслі над Берлінам. Аднак такая ноч была нам памочніцай — пад яе аховай лягчэй працаваць сапёрам.

ПЯТРЭНЯ Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1923, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, схоплены фашыстамі 9.11.1943 і расстраляны ў Глуску.

ПЯХОТА Сямён Усцінавіч, н. у в. Сельцы, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

СІРАЖ Васіль Іосіфавіч, н. у 1914, в. Жалвінец, партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў у 1943.

СЯРГЕЙЧЫК Фёдар Кузьміч, н. у 1914, в. Жалвінец, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 13.3.1942 у в. Воземля Акцябрскага р-на.

ФІЛІППОВІЧ Васіль Васільевіч, н. у 1918, в. Сельцы, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, па даносе здрадніка расстраляны фашыстамі ў 1942 у Глуску.

ХРАПКО Мікіта Васільевіч, н. у 1910, в. Жалвінец, партызан 100-й Глускай брыгады, загінуў 4.9.1942.

ХРАПКО Уладзімір Ільіч, н. у 1921, в. Жалвінец, партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў у 1943.

ЦАРЫК Максім Кірылавіч, н. у 1914, в. Жалвінец, камандзір атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у баі 9.2.1944 пад г.п. Старобін Мінскай вобл.

КАТКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДЗІНЕЦ Уладзімір Пракопавіч, н. у 1906, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў у сакавіку 1944.

БАГАМ'Я Канстанцін Мікітавіч, н. у 1905, в. Бабровічы, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў у красавіку 1944.

БАГУК Гаўрыла Ігнатавіч, н. у 1910, в. Халопенічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў у снежні 1942 у в. Смыковічы Акцябрскага р-на.

БАГУК Гаўрыла Якаўлевіч, н. у 1918, в. Халопенічы, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў 30.3.1942.

БАГУК Герасім Данілавіч, н. у 1927, в. Бабровічы, загінуў у 1944.

БАГУК Сямён Васільевіч, н. у 1906, в. Бабровічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, прапаў без вестак у красавіку 1944.

БАРАНКОЎ Стафан Аверкавіч, н. у 1921, в. Халопенічы, загінуў 5.4.1942.

М.К.Царык.

ВАРАВА Аляксандр Фаміч, н. у 1910, в. Бабровічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 16.4.1944.

ГАЛІЦКІ Казімір Уладзіміравіч, н. у 1918, в. Катка, павешаны фашыстамі ў жніўні 1941.

Помнік загінуўшым землякам у в. Калюга.

П.С.Кругаль.

ГРАБКА Даніла Дзям'янавіч, н. у 1927, в. Катка, загінуў 18.4.1944.

КАТАРСКІ Іван Раманавіч, н. у 1924, в. Касарычы, партызан 123-й Акцябрскай брыгады імя 25-годдзя БССР, загінуў 24.8.1943.

КРУГАЛЬ Пётр Сямёнавіч, н. у 1925, в. Катка, загінуў 22.4.1944.

КРУГЛОЎ Ілья Фёдаравіч, н. у 1917, в. Халопенічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 8.1.1944.

КРУГЛОЎ Пётр Кузьміч, н. у 1924, в. Бабровічы, загінуў 5.6.1944.

ЛЕПІН Уладзімір Карпавіч, н. у в. Халопенічы.

ЛЫСАК Васіль Апанасавіч, н. у 1923, в. Касарычы, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 1.3.1943.

МУРЭНКА Мікалай, загінуў у 1941.

МЫШАК Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1922, в. Халопенічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў у красавіку 1942.

НІКАЛАЁНАК Піліп Данілавіч, н. у 1882, в. Халопенічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 20.1.1944.

ПАЦАЙ Рыгор Яўхімавіч, н. у 1902, в. Касарычы, сувязны-разведчык атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

ПІНЧУК Іосіф Андронавіч, н. у 1874, в. Касарычы, загінуў у верасні 1942.

САМУЙЛІК Сямён М., н. у 1901, в. Бабровічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады.

СЛАБАДНІК Мікалай, н. у 1903, в. Бабровічы, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады.

ТУРЛЫКА Мікалай Гаўрылавіч, н. у 1926, в. Касарычы, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў 15.4.1944.

ШЭКАЛЬ Мікалай, загінуў у жніўні 1941.

ЮНЕВІЧ Іван Цімафеевіч, н. у 1924, в. Замасточча, партызан 123-й Акцябрскай брыгады імя 25-годдзя БССР, загінуў 9.5.1944 ва ўрочышчы Чорнае Акцябрскага р-на.

ЮНЕВІЧ Нічыпар Яўхімавіч, н. у 1914, в. Замасточча, партызан 123-й Акцябрскай брыгады імя 25-годдзя БССР, схоплены фашыстамі і расстраляны.

ЮНЕВІЧ Павел Фаміч, н. у 1924, в. Касарычы, загінуў 27.4.1943, пахаваны ў в. Карпілаўка Акцябрскага р-на.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЁХНА Фёдар Сямёнавіч, н. у 1912, в. Старое Сяло, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 8.12.1942.

ГРЫЦЭНЯ Аляксандр Усцінавіч, н. у 1912, в. Вільча, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады.

ГРЫЦЭНЯ Іван Іванавіч, н. у 1923, в. Вільча, партызан 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 15.10.1942, пахаваны ў в. Вольніца Глускага р-на.

ДЫБА Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1911, в. Бервы, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, памёр ад ран 21.7.1944 у шпіталі г. Бабруйск.

ЁШЧЫК Іван Аляксандравіч, н. у 1923, в. Вільча, загінуў 8.12.1942.

КУРС Канстанцін Карпавіч, н. у 1918, в. Вільча, загінуў 3.3.1944.

КУРС Мікалай Міхайлавіч, н. у 1923, в. Вільча, намеснік нач. штаба партызанскага злучэння С.А.Каўпака, загінуў 15.3.1942.

КУРС Мікалай Фядосавіч, н. у 1923, в. Вільча, загінуў у 1943.

ЛЯДЗЯН Іван Адамавіч, н. у 1921, в. Бервы, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.5.1944.

МІШУР Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1923, в. Вільча, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 26.2.1943, пахаваны ў в. Залессе Акцябрскага р-на.

ПРЫГАРА Сяргей Еўдакімавіч, н. у 1915, в. Балашэвічы, сувязны-разведчык, схоплены фашыстамі і расстраляны.

ШАЎСТРУК Ігнат Хрысанавіч, н. у 1918, в. Вільча, партызан 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 26.2.1943, пахаваны ў в. Залессе Акцябрскага р-на.

ЮШКЕВІЧ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1922, в. Вільча, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў у сакавіку 1942.

КЛЯТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1922, в. Бярэжкі, партызанскі сувязны, схоплены фашыстамі і расстраляны ў маі 1942.

ВАЙЦЯХОВІЧ Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1925, в. Клетнае, падпольшчык, сувязны атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, схоплены фашыстамі і ў лютым 1942 расстраляны ў Глуску.

ВАЛОДЗЬКА Сцяпан Тамашавіч, н. у в. Барбарова.

ВАЛОДЗЬКА Уладзімір Тамашавіч, н. у в. Барбарова.

ГРАМЫКА Іван Мікітавіч, н. у в. Малінава.

ГРАМЫКА Павел Паўлавіч, н. у 1911, в. Цяснова, партызан атрада імя М.І.Кутузава 25-й брыгады імя П.К.Панамарэнкі, параненым быў захоплены ў палон, расстраляны фашыстамі 6.11.1943 у Глуску.

ДАМАШЭЎСКІ Мікалай Максімавіч, н. у 1923, в. Байлюкі, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў у студзені 1942.

ДРОБ Мікалай Яфрэмавіч, н. у 1882, в. Даколь, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў у маі 1944.

ДРОБАЎ Павел Мікалаевіч, н. у 1918, в. Даколь, камандзір падрыўной групы атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 10.4.1944.

ЗЕЛЯНКОЎ Максім Яфрэмавіч, н. у 1924, в. Баянава, загінуў 12.4.1944.

КАЗАК Георгій Дзмітрыевіч, н. у 1924, пас. Красны, кіраўнік падпольнай камсамольскай арганізацыі ў в. Клетнае, сувязны-разведчык атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, арыштаваны гітлераўцамі, дастаўлены ў Глуск у гестапа, пасля допытаў і катаванняў 17.2.1942 расстраляны на глускіх могілках.

ЛУГІН Аляксей Анісімавіч, н. у 1921, в. Барбарова, партызан атрада імя В.І.Чапаева 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, схоплены фашыстамі ў верасні 1942 і павешаны ў Глуску.

ЛУГІН Кузьма Якаўлевіч, н. у 1906, в. Барбарова, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 28.2.1942.

ЛУГІН Мікалай Прохаравіч, н. у 1923, в. Барбарова, партызан атрада імя Дз.Ц.Гуляева 101-й брыгады імя А.Неўскага, загінуў 24.1.1944 каля в. Махначы Старадарожскага р-на.

МАРЦІНОВІЧ Іван Майсеевіч, н. у 1921, в. Баянава, партызан 225-й брыгады.

МАРЦІНОВІЧ Мікалай Майсеевіч, н. у 1912, в. Баянава, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 3.5.1942.

РАДКЕВІЧ Васіль Іосіфавіч, н. у 1926, в. Байлюкі.

СІНЬКЕВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1910, в. Веснава, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у баі ў в. Перакалле Акцябрскага р-на, пахаваны ў в. Залессе гэтага ж р-на.

СОКАЛ Андрэй Сідаравіч, н. у 1918, в. Нова-Андрэеўка, партызан 100-й Глускай брыгады, загінуў 18.6.1944.

СОКАЛ Іван Данілавіч, н. у 1906, в. Старына, загінуў 12.4.1944.

СУШКО Пётр Прохаравіч, н. у 1915, в. Бярэжкі, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 11.5.1944 у Любанскім р-не.

ШАРАМЕТ Мацвей Пятровіч, н. у 1922, в. Вайцяхова, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942.

ЯЛЬНІЦКІ Аркадзь Мікалаевіч, н. у 1925, в. Клетнае, падпольшчык, сувязны-разведчык атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, арыштаваны фашыстамі, дастаўлены ў Глуск у гестапа, пасля здзекаў і катаванняў расстраляны 17.2.1942 на глускіх могілках.

СЛАЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АГАРАДНІЙЧУК Дзмітрый Майсеевіч, н. у 1921, в. Луціграва Бярдзічаўскага р-на Жытомірскай вобл., Украіна, мал. сярж., разведчык штаба 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 1.3.1944 у в. Слаўкавічы, пахаваны ў Любанскім р-не.

АХРАМЕЙКА Мікалай Іванавіч, н. у 1913, в. Слаўкавічы, партызан-кулямётчык, загінуў 10.1.1944.

БАРЫСЕВІЧ Нікан Елізаравіч, н. у 1891, в. Малкава.

БЕРАЗОЎСКІ Мяфодзій Іванавіч, н. у 1905, в. Слаўкавічы, партызан 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, прапаў без вестак 18.3.1944.

БЕРАЗОЎСКІ Сяргей Іванавіч, н. у 1924, в. Слаўкавічы, партызан 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, прапаў без вестак 8.4.1944.

БЯЛУГА Васіль Захаравіч, н. у 1914, в. Амур, загінуў 18.11.1943.

ДЗЕШКАВЕЦ Іван Максімавіч, н. у 1889, в. Слаўкавічы, сувязны атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, памёр ад хваробы ў 1943, пахаваны ў лесе каля в. Слаўкавічы.

ДЗЕШКАВЕЦ Кацярына Мікалаеўна, н. у 1926, в. Слаўкавічы, партызанская сувязная, схоплена ў Глуску фашыстамі і расстраляна.

ДЗЕШКАВЕЦ Мікалай Максімавіч, н. у 1902, в. Слаўкавічы, партызанскі сувязны, схоплены фашыстамі ў 1942 і расстраляны ў Глуску.

ЕРМАЛІЦКІ Міхаіл Адамавіч, н. у 1923, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя В.І.Чапаева 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава.

ЗЯЛЁНКА Мікалай Яўцехавіч, н. у 1884, в. Зорка, загінуў у час варожай блакады ў 1944.

ЗЯЛЁНКА Пётр Паўлавіч, н. у 1906, в. Слаўкавічы, партызан 100-й Глускай брыгады, загінуў 13.4.1944.

ЗЯЛЁНКА Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1924, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 13.11.1943 у Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл.

КОРБУТ Аркадзь Мінавіч, н. у 1913, в. Слаўкавічы, партызан 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, прапаў без вестак 5.3.1944.

ЛЮБАНЕЦ Майсей Аляксандравіч, н. у 1902, в. Сцяг, партызан атрада імя К.Я.Варашылава 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, памёр ад тыфу ў 1944, пахаваны ў в. Сцяг.

МАЕЎСКІ Іосіф Валяр'янавіч, н. у 1903, в. Зорка, загінуў у час варожай блакады ў 1944.

НОВІКАЎ Фёдар Дзянісавіч, н. у 1919, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 13.11.1943.

РУХАВЕЦ Пётр Мікалаевіч, н. у 1901, в. Зорка, схоплены фашыстамі ў 1942 і расстраляны.

РЫМАШЭЎСКІ Антон Аляксандравіч, н. у 1894, в. Малінава, партызан 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, прапаў без вестак 9.4.1944.

СТАЛІНЕВІЧ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1922, ст. Ратміравічы, разведчык штаба 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 4.3.1944.

СУХАЎ Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1915, в. Слаўкавічы, загінуў 29.3.1944.

ТКАЧЫК Міron Пятровіч, н. у 1906, в. Зорка, партызан атрада імя М.М.Воранава 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў у кастрычніку 1943.

УРБАНОВІЧ Казімір Казіміравіч, н. у 1926, в. Слаўкавічы, партызан 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, загінуў 8.2.1944.

ШЫНКЕВІЧ Кацярына Міхайлаўна, н. у 1920, в. Зорка, медсястра атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінула ў 1944.

ХВАСТАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БРАТЧЭНЯ Емяльян Мікітавіч, н. у 1924, партызан 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у сакавіку 1944.

ВАСІЛЕЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч, н. у в. Заполле, партызан 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 9.6.1944.

ГАЛАМАКА Сцяпан І., н. у 1912, в. Мыслоціна, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў 14.4.1944.

ГЕРАСІМОВІЧ Ганна Іванаўна, н. у 1922, в. Заполле, партызанка 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінула 23.11.1942.

КАСЬКО Пётр Іванавіч, н. у в. Хваставічы.

КУРАЛЕНЯ Пётр, н. у 1927, в. Вольніца.

ЛЕАНОВІЧ Альбін Іосіфавіч, н. у 1925, в. Людвінова, партызан атрада імя Дз.Ц.Гуляева 101-й брыгады імя А.Неўскага, загінуў 5.9.1943, пахаваны ў Салігорскім р-не.

ЛІСІЦА Сяргей Пятровіч, н. у 1927, в. Дуброва, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 7.5.1944.

МАНЬКО Аляксей Піліпавіч, н. у 1893, в. Вольніца, загінуў у 1942.

МАЦАКОЎСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1907, в. Веснава.

МІКУЛЬСКАЯ Алена Усцінаўна, н. у 1890, в. Людвінова, загінула ў сакавіку 1944.

МУХА Кацярына Васільеўна, н. у в. Мыслоціна.

НАВІЧОНАК Сцяпан Антонавіч, н. у 1912, в. Дуброва, загінуў у 1943.

ПЕШЧУР Іван Фёдаравіч, н. у 1924, в. Вольніца, схоплены фашыстамі і расстраляны ў 1942.

ПРЫБЫШ Андрэй Васільевіч, н. у 1913, в. Вольніца, партызанскі сувязны, схоплены фашыстамі ў 1942 і расстраляны ў Глуску.

ПЯТРЭНЯ Мікалай Ільіч, н. у в. Дуброва, партызан атрада імя Л.М.Даватара 64-й брыгады імя В.П.Чкалава, загінуў у 1944.

САБАЛЕЎСКІ Васіль Васільевіч, н. у 1915, в. Баравішча.

САНЬКО Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1909, в. Баравішча, загінуў у 1942.

САЧОК Васіль Іванавіч, н. у 1921, в. Дуброва, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 19.12.1943 у баі пад в. Коўчыцы 2-я Гомельскай вобл.

СІНЬКЕВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1919, в. Веснава, загінуў у 1942.

СТРЭЛЬСКІ Васіль Максімавіч, н. у 1915, в. Людвінова, загінуў у 1943.

СЫЦЬКА Канстанцін Карлавіч, н. у 1896, в. Баравішча.

ТАРАХОВІЧ (ДУНАЕЎ) Іван Мікалаевіч, н. у 1916, в. Веснава, камандзір атрада імя В.І.Чапаева 27-й брыгады імя В.І.Чапаева, загінуў 7.11.1942 у баі каля в. Старына Капыльскага р-на Мінскай вобл.

ТАТУР Антон Сцяпанавіч, н. у 1918, в. Баравішча, загінуў у 1944.

***

ГОЛАДАЎ Васіль Емяльянавіч, н. у 1915, Расія, са студзеня 1942 камісар, са жніўня 1943 камандзір атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 19.12.1943 у баі за «Рудабельскія вароты» каля в. Слабодка Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ГУЛЯЕЎ Дзмітрый Цімафеевіч, н. 5.11.1915, с. Іванаўка Аляксандраўскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна. Закончыў Чаркаскі дарожна-будаўнічы тэхнікум (1934), вучыўся ў Маскоўскім ваенна-палітычным вучылішчы. У партызанах з ліпеня 1941, са жніўня 1941 да красавіка 1942 камісар атрада імя Я.Дз.Гарбачова, з мая 1942 камандзір атрада, сфарміраванага з жыхароў Слаўкавіч і суседніх вёсак Глушчыны. У студзені 1943 атрад увайшоў у 99-ю брыгаду, якой пазней было прысвоена яго імя, з чэрвеня 1943 камандзір 101-й імя А.Неўскага партызанскай брыгады. Загінуў у баі 5.9.1943 каля в. Панічы Старобінскага (цяпер Салігорскі) р-на. Пахаваны ў г.п. Старобін. У 1944 Дз.Ц.Гуляеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

ЖУК Канстанцін Навумавіч, н. у 1926, в. Тарасавічы Асіповіцкага р-на, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 16.4.1944, пахаваны на Голым востраве Загальскага сельсавета Любанскага р-на.

ЗУБАРЭВІЧ Уладзімір, н. у пас. Глуша Бабруйскага р-на, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у верасні 1943 у баі каля в. Круглоніва Бабруйскага р-на.

КАВАЛЕНКА Міхаіл, н. у 1923, пас. Глуша Бабруйскага р-на, камандзір аддзялення атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у верасні 1943 у баі каля в. Круглоніва Бабруйскага р-на.

КАЛПАКОВА Марыя, н. у Бабруйскім р-не, партызанка атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінула 19.12.1943 у баі пад в. Коўчыцы 2-я Гомельскай вобл.

КРУК Ігнат Цімафеевіч, н. у 1916, в. Раскачы Бабруйскага р-на, з чэрвеня 1943 камандзір аддзялення атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў 11.4.1944, пахаваны ў Любанскім р-не.

ЛАЗАРАЎ Андрэй, н. у 1913, пас. Глуша Бабруйскага р-на, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у верасні 1943 у баі каля в. Круглоніва Бабруйскага р-на.

МАРГАЛЕЕЎ Мухід Мухідавіч, кавалерыст з групы Гарадавікова, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў у в. Крукаўшчына.

НІКАЛАЕЎ, н. у 1920, уцёк з Бабруйскага лагера ваеннапалонных, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

І.К.Лось.

СЕДЗІК Васіль Аляксеевіч, н. у 1914, Акцябрскі р-н Гомельскай вобл., загінуў у маі 1944.

ХРАПКО Надзея Якаўлеўна, н. у 1927, партызанка 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінула ў лютым 1944.

ЧАПУРЫН Аляксей, н. у г. Валгаград, Расія, памёр ад ран.

ШВЯДКО Якаў Рыгоравіч, н. у 1905, г. Краснадар, Расія, ст. лейт., камандзір узвода 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 2.3.1943.

Партызаны, якія пахаваны на тэрыторыі Глускага раёна

БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

ДЗЕРБЯНЁЎ Іван Пятровіч, н. на ст. Верхатуры Свярдлоўскай вобл., Расія, загінуў 30.10.1943.

ЛУГІН М.

ЛУГІН Н.Ф.

МАЛАКОВІЧ.

НАЖОЎ Пётр Ціханавіч, н. у г. Саратаў, Расія, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 25.10.1943.

СЕМЯНЧУК.

ВЁСКА ЗЕЛЯНКОВІЧЫ

ВОРАНАЎ.

ГАЦУК Іван Аляксеевіч, н. у 1900, в. Атрошкавічы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., кулямётчык атрада імя В.І.Чапаева 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 18.2.1943 у в. Круглоніва Бабруйскага р-на.

ГОЛУБ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1921, в. Вільча Глускага р-на, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у лютым 1943.

ДЫМ Даніла Ігнатавіч, н. у пас. Ільінскі Нытвенскага р-на Пермскай вобл., Расія, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.10.1943.

ЛОСЬ Іван Канстанцінавіч, н. у 1913, в. Ласі Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 8.12.1942.

МІХЛЮК Максім Піліпавіч, н. у 1913, в. Слабодка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, камендант в. Чыкілі, загінуў 19.8.1943 каля в. Чыкілі.

НІКІТКА Аляксей Карпавіч, н. у 1922, в. Орсічы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя Дз.А.Фурманава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.6.1943 каля в. Нязнанне Глускага р-на.

ПАДАЛЯК Рыгор Іванавіч, н. у 1923, в. Зелянковічы, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.8.1943.

ПЯТРОВІЧ Пётр Андрэевіч, н. у 1914, в. Тарасаўка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 26.1.1943.

САВІЧ Цярэнцій Адамавіч, н. у 1913, в. Вільча Глускага р-на, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у лютым 1943.

САКАЛОЎ В.І.

САРОКІН Сцяпан Іванавіч, н. у 1905, г. Бабруйск Магілёўскай вобл., палітрук атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.10.1943.

СТРУК Павел Макаравіч, н. у 1922, в. Макараўка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., разведчык атрада імя В.І.Чапаева 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 18.2.1943 у в. Круглоніва Бабруйс-



В.І.Пепік.

А.Ф.Вашукевич.

кага р-на, абараняючы мірных жыхароў вёскі ад угону ў Германію.

СЫРОЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1920, уцёк з Бабруйскага лагера ваеннапалонных, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у чэрвені 1943.

ЮНАШАЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1923, в. Брожа Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., камандзір аддзялення атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 20.1.1943.

ВЁСКА ЗУБАРЭВІЧЫ

АРЗАМАСЦАЎ Іван Сяргеевіч, н. у 1918, Туркменістан, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 20.2.1944.

БАРЫШНЫ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1905, в. Лахва Брэсцкай вобл., лейт., камандзір узвода, Беларускі штаб партызанскага руху, загінуў 21.1.1943.

БЕЛЫ Герасім Іванавіч, н. у 1923, в. Стасеўка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя Д.А.Фурманава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 24.11.1943.

ЖАРКІХ Васіль Кірылавіч, н. у 1912, Воронежская вобл, Расія, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 21.1.1943.

КАНАВАЛАЎ Аляксандр Васільевіч, н. у 1923, г. Нежын Чарнігаўскай вобл., Украіна, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 24.11.1943.

КОРН Барыс Леанідавіч, н. у 1922, г. Масква, Расія, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 24.11.1943.

МАЗАЛЕЎСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1913, г.п. Глуск, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 6.8.1942.

МІРОНАЎ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1915, с. Пракопаўка Саратаўскай вобл., Расія, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 16.3.1943.

ПЕПІК Віктар Іванавіч, н. у 1905, в. Слабодка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., працаваў настаўнікам, з кастрычніка 1943 партызан атрада імя Дз.А.Фурманава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 24.11.1943.

ШАЛКОЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1921, с. Нова-Данілаўка Акімаўскага р-на Запарожскай вобл., Украіна, загінуў 23.1.1942.

ЗАВАЛОЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛАЯ (не існуе)

КАЛЕНІК Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1917, в. Убалацце Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 27.9.1943.

ПАРХІМЧЫК Надзея Іларыёнаўна, н. у в. Белая, партызанка 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінула ў сакавіку 1944 у в. Масты Глускага р-на.

ВЁСКА ЗАВАЛОЧЫЦЫ

БУЗАК Усцін Карпавіч, н. у 1902, в. Заполле Глускага р-на, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 16.6.1943.

ВАШУКЕВІЧ Апанас Фёдаравіч, н. у 1908, г. Бабруйск Магілёўскай вобл., камісар атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 18.3.1944 каля в. Заполле Завалочыцкага сельсавета Глускага р-на.

ЖЛОБІЧ Міхаіл Цімафеевіч, н. у в. Паршчаха Глускага р-на, партызанскі сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1941.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Гаўрылавіч, н. у 1916, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 16.3.1943.

ЛЕАКУМОВІЧ П.Х., загінуў у 1944.

НІКАЛАЙЧЫК Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1926, в. Заполле Завалочыцкага сельсавета Глускага р-на, партызан атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у снежні 1943.

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Пятровіч, загінуў 6.3.1944.

ПУШЫК Уладзімір Паўлавіч, загінуў 15.3.1944.

РЫБАК Герасім Канстанцінавіч, н. у в. Паршчаха Глускага р-на, партызанскі сувязны, схоплены фашыстамі ў 1941 і павешаны ў Глуску.

РЫБАК Канстанцін Іванавіч, партызанскі сувязны, схоплены фашыстамі ў 1941 і расстраляны ў Глуску.

ТАПАРКОЎ Канстанцін Цярэнцьевіч, н. у 1921, Казахстан, партызан атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у снежні 1943 каля в. Туркі Глускага р-на.

ФРАЛОЎ Валянцін Максімавіч, н. у 1923, Татарстан, Расія, партызан атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у сакавіку 1944.

ВЁСКА МАСТЫ (не існуе)

КАВАЛЬЧУК Вольга Яфімаўна, н. у 1926, в. Старынкі Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызанка атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінула ў сакавіку 1944.

ЛЕУС Соф'я Марцінаўна, н. у 1923, в. Завалочыцы Глускага р-на, партызанка атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінула ў сакавіку 1944.

РАБАЦЕНЬ Павел Герасімавіч, н. у 1928, в. Дойнічава Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл, партызан атрада імя А.Я.Пархоменкі 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 22.3.1944.

ШАЎРУК Іван Рыгоравіч, н. у 1922, пас. Глуша Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 22.6.1943.

ВЁСКА ПАРШЧАХА (не існуе)

Партызанскія могілкі за 2 км на захад ад былой вёскі

БУГІН Рафаіл Міхайлавіч, н. у 1920, г. Кіраў Кіраўскай вобл., Расія, ст. лейт., партызан 1-й Бабруйскай брыгады, загінуў 14.4.1943.

ЖЛОБІЧ Паліна Сямёнаўна, н. у в. Сіманавічы Глускага р-на, сувязная-разведчыца 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, забіта фашыстамі ў студзені 1943, калі хацела папярэдзіць жыхароў в. Паршчаха аб карнай экспедыцыі.

ЖЫЖКІН Рыгор Гаўрылавіч, н. у 1913, партызан атрада імя А.С.Шашуры 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 6.6.1943.

ЛОРЧАНКА, мал. лейт., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 27.9.1942.

МАЛЕЦ Васіль Іванавіч, н. у 1913, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 19.3.1943.

СЕМІСАЛАЎ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1915, с. Дабрэнька Краснаградскага р-на Харкаўскай вобл., Украіна, партызан 1-й Бабруйскай брыгады, першы сакратар Бабруйскага падпольнага райкома ЛКСМБ, загінуў 14.4.1943.

ВЁСКА СІМАНАВІЧЫ

БЛОЦКІ Кірыла Паўлавіч, загінуў 6.3.1944.

ДЗЕКТАР Міхаіл Іванавіч, загінуў 6.3.1944.

ПАТАПОВІЧ Барыс Пятровіч, партызан асобнага Глускага атрада, схоплены фашыстамі ў верасні 1941 і расстраляны.

САВІЧ Пётр Мітрафанавіч, н. у 1902, в. Сіманавічы, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 17.9.1943.

ВЁСКА СЛАВІНА (не існуе)

АНДРАШЧУК Васіль Іосіфавіч, н. у 1916, партызан атрада імя А.С.Шашуры 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 6.3.1944.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЗЛОВІЧЫ

ЗОЗАРАЎ Васіль Васільевіч, н. у 1915, г.п. Глуск, камандзір узвода атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 15.5.1943.

Г.К.Рыбак.

М.І.Семісалаў.

Помнік на партызанскіх могілках у в. Крукаўшчына.

МІШУР Філімон Макаравіч, н. у 1900, в. Жалвінец Глускага р-на, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў 23.2.1943.

МАРОЗ Міна Андрэевіч, н. у 1909, в. Казловічы, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 28.4.1943.

ЧАБАН Іван Ціханавіч, н. у 1914, в. Жалвінец Глускага р-на, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў 23.2.1943.

ВЁСКА КЛЯШЧОЎКА

ЛАДОНЬКА Іван Фёдаравіч, н. у 1920, в. Кляшчоўка, партызан атрада імя М.І.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 26.7.1942.

ВЁСКА КРУКАЎШЧЫНА

Партызанскія могілкі

БОЛБАС Нічыпар Мікалаевіч, н. у 1922, в. Слабодка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942 каля в. Усцярхі Глускага р-на.

ВІНАГРАДАЎ Леанід Фадзеевіч, н. у 1914, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 28.7.1943.

ГЕРАСІМАЎ Г., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у 1943.

ІВАНОЎ В., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у 1943.

КОЖЫЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1924, в. Круглоніва Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., з чэрвеня 1942 партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.6.1943.

ЛЯВОНАЎ Яўген Сямёнавіч, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942.

НІКІТКА Іван Паўлавіч, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 30.6.1943.

НОСАЎ Рыгор Андрэевіч, н. у г. Вольск Саратаўскай вобл., Расія, служыў на пагранзаставе, кантужаны, быў захоплены фашыстамі, уцёк з палону, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 12.8.1943.

З пісьма Р.А.Носава сястры Клаўдзіі

«Дорогая Клава! Если бы вы только могли представить, как фашистские звери издеваются над людьми!.. Недавно я ходил с группой партизан на боевую операцию и видел собственными глазами сожженные деревни вместе с их жителями. Всех их построили на улице: стариков, детей и женщин с мужчинами — на одной стороне, а парней и девчат — на другой. Последних погрузили на автомашины и увезли для отправки в Германию, а остальных загнали в сарай, обложили его соломой и подожгли. Всего в сарае сгорело заживо более 400 человек...»

З пісьма да маці Агаф'і Іванаўны

«... Сейчас фашисты объявили приказ, в котором говорится, что вся молодежь с 15-ти до 25-ти лет должна «добровольно» ехать на работу в Германию. Кто добровольно не поедет, будет на месте расстрелян. Но я верю, что фашистский зверь будет уничтожен в его логове...»

***

Храбра і самаадданa змагаўся з ворагамі Рыгор Носаў. У адным з баёў, які адбыўся ў лесе ў чэрвені 1942 г. каля в. Чыкілі, ён з таварышамі поўнасцю знішчыў групу карнікаў і прынёс на партызанскую базу сем аўтаматаў, знятых з забітых. За гэты бой Рыгор атрымаў падзяку ад камандзіра атрада. Загінуў ён у жніўні 1943 г. каля в. Усцярхі. Гэта была партызанская зона, у вёсцы працаваў млын, дзе партызаны малолі зерне для сваіх патрэб. Ахоўваў млын узвод партызан. Вечарам 11 жніўня ў нарад у в. Усцярхі заступіў і Рыгор Носаў. На світанку вялікая група нямецкіх салдат акружыла вёску. Разгарэўся бой. Партызаны, хоць іх і было значна менш, не адступілі. Пачуўшы страляніну ў раёне партызанскага млына, камандзір атрада імя Кірава М.Б.Храпко паслаў падмацаванне. Партызаны разгромілі няпрошаных гасцей. На полі бою вораг пакінуў забітымі больш за 30 сваіх салдат. Партызаны страцілі шасцярых таварышаў, у т.л. і Рыгора Носава.

Ю.Ф.Былінскі.

ПЯТРОЎ Барыс, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у 1943.

СІНЯКОЎ Генадзь Васільевіч, н. у 1926, ст. Ясень Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, паранены 1.7.1943 каля в. Поблін, патануў у р. Пціч.

СЯДЗЮК І., партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у 1943.

ФЯДЗЮК Георгій Андрэевіч, н. у 1923, г. Полацк Віцебскай вобл., разведчык штаба 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 2.3.1944 каля в. Рагалі Бабруйскага р-на.

ЦЫГАНКОЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1922, в. Зубарэвічы Глускага р-на, працаваў дырэктарам Макавіцкай сярэдняй школы, партызан атрада імя

С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942.

ШАРАМЕТ Мацвей Пятровіч, н. у 1922, в. Вайцяхова Глускага р-на, працаваў дырэктарам Парыцкай сярэдняй школы, партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942.

ВЁСКА НЯЗНАННЕ

МІРОНАЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1898, Цвярская вобл., Расія, ст. лейт., партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 5.4.1942, пахаваны ў лесе каля вёскі.

ВЁСКА УСЦЯРХІ

АКІМАЧКІН Канстанцін, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.7.1942 каля в. Усцярхі.

НІКІТКА Рыгор Паўлавіч, н. у 1929, в. Орсічы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 11.8.1943.

ВЁСКА УЮНІШЧА

АШУРКА Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1923, в. Рагалі Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя В.І.Чапаева 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, памёр ад тыфу 19.2.1943.

БОЛБАС Рыгор Сяргеевіч, н. у 1922, в. Слабодка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя Дз.А.Фурманава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 23.10.1943.

БУЦЬКО Сяргей Мікалаевіч, н. у 1923, г. Бабруйск Магілёўскай вобл., партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у маі 1942.

БЯЛЬКО Максім Нічыпаравіч, н. у 1914, Гомельская вобл., партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 4.3.1943.

ВАЛОДЗЬКА Сяргей, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

ГОЛУБЕЎ Мікалай Кузьміч, н. у 1921, Цвярская вобл., Расія, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 28.4.1943.

ДУБЕНКА Мікалай Філіпавіч, н. у 1920, с. Бярозаўка Александрыйскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 27.6.1943 каля в. Макаравічы Бабруйскага р-на.

ЗЛОБІН Фёдар Аляксандравіч, н. у 1918, партызан 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 3.7.1943.

ЗМЕЕЎ Мітрафан, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

ЛЕВАНОВІЧ Мікалай, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

А.М.Цыганкоў.

В.Валасевіч.

ПАРХІМЧЫК, н. у пас. Глуша Бабруйскага р-на, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 3.7.1943.

ПУЦЬКО Сцяпан Іванавіч, н. у 1916, в. Поўстка Глускага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 12.7.1942.

САВЕЛЬЕЎ Мікалай Андрэевіч, н. у 1920, Курская вобл., Расія, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

СТРЭЛЬЧАНКА Надзея, партызанка 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

СЯМАШКА Мацвей Адамавіч, н. у 1910, в. Аляксандраўка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі.

ВЁСКА ЧЫКІЛІ

ВАЛАСЕВІЧ Вольга, н. у 1923, в. Воля Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., медсястра 1-й Бабруйскай брыгады, загінула ў маі 1943.

КРЫСАЎ В.І.

КУРГАНСКАЯ Л.Г.

ПАПОЎ Ф.

ПАЎЛАЎ А.Д.

ПАХОМАЎ А.В.

ПІХБОЎРЫКАЎ М.К.

ПУТЫСА С.І.

САКУН В.П.

САЛАЎЁЎ Н. А.

СІРАЖ Васіль Іосіфавіч, працаваў настаўнікам у в. Калюга, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў 29.12.1942.

ТОЎСЦІК Апанас Карнеевіч, н. у 1898, в. Чыкілі, загінуў 17.3.1943.

ТОЎСЦІК Іван Раманавіч, н. у 1920, в. Чыкілі, партызан атрада імя В.І.Чапаева 100-й Глускай брыгады, загінуў 19.8.1943.

Загінулі, каб жылі мы

Камсамольска-маладзёжны атрад імя Чапаева 37-й партызанскай брыгады імя Пархоменкі ў 1942 г. стаяў у лесе каля вёсак Чыкілі і Сцяпанаўка. Аднойчы вечарам, калі партызаны, вяртаючыся з задання, спыніліся ў Чыкілях, да камандзіра атрада М.І.Сезіка падышоў хлапец, жыхар вёскі, які назваўся камсамольцам Іванам Тоўсцікам.

— Таварыш камандзір, прыміце мяне ў атрад. Біць буду гадаў. У мяне і зброя ёсць, — сказаў ён, звяртаючыся да камандзіра.

Івана залічылі партызанам ва ўзвод, якім камандаваў Сцяпан Шарэц. Прыклады мужнасці і гераізму дэманстраваў камсамолец у кожным баі...

Помнік на брацкай магіле партызан у в. Чыкілі.

Іван Тоўсцік быў добрым агітатарам. З першага дня ён пасябраваў з камсамольскім важаком Васілём Баравым. Разам хадзілі на баявыя аперацыі, разам праводзілі агітацыйную работу ў навакольных вёсках — Зелянковічах, Зубарэвічах, Уюнішчы, выпускалі партызанскую газету «Бі акупантаў!», баявыя лісткі. Не раз перад боем газета ці баявы лісток узнімалі дух байцоў, накіроўвалі іх на паспяховае выкананне заданняў.

У жніўні 1943 г. Іван Тоўсцік адправіўся ў сваю вёску, каб наведаць бацькоў. Там ён амаль нос у нос сутыкнуўся з фашыстамі. Завязаўся няроўны бой. Ворагі падалі пад трапнымі стрэламі Івана. Ён страляў, пакуль не скончыліся патроны. Раптам варожая куля апякла плячо юнака. Іван працягваў адбівацца, але траціў сілы. Кінуў адну гранату, другую. А з трэцяй устаў ва ўвесь рост.

— Падыходзьце, здаюся, — крыкнуў ён.

Але ворагі не спяшаліся. З апошніх сіл Іван кінуў гранату і ўпаў, скошаны аўтаматнай чаргой. У сваім апошнім баі мужны патрыёт знішчыў 13 фашыстаў.

ЦЮРЫН А.М.

ЧАБАН Васіль Антонавіч, н. у 1906, в. Жалвінец Глускага р-на, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў 29.12.1942.

ШЧЫЛЁЎ А.А.

ЮЛІН С.І.

КАЛАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЖАЛВІНЕЦ

ХРАПКО Фёдар Рыгоравіч, н. у 1902, в. Жалвінец, партызан атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў у ліпені 1942 у лесе каля вёскі.

ВЁСКА КАЛЮГА

ГРЫНЕВІЧ Андрэй Васільевіч, н. у 1910, в. Калюга, працаваў у Глуску суддзёй, з чэрвеня 1941 партызан асобнага Глускага атрада, у жніўні схоплены фашыстамі ў Глуску і замучаны.

ГРЫНЕВІЧ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1925, в. Калюга.

КАВАЛЕНКА Канстанцін Кірэевіч, н. у 1912, працаваў загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Глускага райкома партыі, ст. палітрук, камандзір узвода Глускага знішчальнага атрада, загінуў 28.6.1941 пры падрыве моста ў в. Бярозаўка Глускага раёна.

ВЁСКА МАКАВІЧЫ

АДНАМАХ Аркадзь Адамавіч, н. у 1926, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у красавіку 1944.

ГАШЫНСКІ Рыгор Навумавіч, н. у 1917, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў 6.5.1943.

ЕРМАЛІЦКІ Іван Васільевіч, н. у 1908, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў 14.3.1943.

КУМАГЕР Васіль Паўлавіч, н. у 1924, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у 1944.

КУРАЛЕНЯ Канстанцін Карпавіч, н. у 1924, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у красавіку 1944.

КУРАЛЕНЯ Цімафей Яфімавіч, н. у 1924, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у красавіку 1944.

ПЯТРЭНЯ Мікіта Іванавіч, н. у 1925, в. Макавічы, партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у сакавіку 1943 у час варожай блакады.

ВЁСКА ПАГОСТ

САЧОК Канстанцін Карпавіч, н. у 1925, в. Макавічы Глускага р-на Магілёўскай вобл., партызан атрада імя М.І.Кутузава 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у 1943.

КАТКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАБРОВІЧЫ

ФІЛІМОНАЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у в. Калацічы Глускага р-на, камандзір узвода атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, загінуў 20.10.1942.

ВЁСКА КАСАРЫЧЫ

ЖУК Фёдар Паўлавіч, партызан, атрад Баяніцкі 25-й брыгады імя П.К.Панамарэнкі.

ШНЧУК Марк Адамавіч, н. у 1915, в. Касарычы, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у красавіку 1942.

САМУЙЛІК Логвін Антонавіч, н. у 1916, в. Катка Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў 8.1.1942.

СІДАРЭНКА Георгій Пятровіч, н. у 1914, Светлагорскі р-н Гомельскай вобл., партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, памёр ад ран 6.2.1944.

ПАСЁЛАК ПЦІЧ

БАГАМ'Я Севасцьян Васільевіч, н. у 1921, в. Катка Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, у час разведкі

А.В.Грыневіч.

І.В.Ермаліцкі.

С.В.Багам'я.

схоплены паліцаямі, дастаўлены ў в. Катка і публічна павешаны 15.3.1942.

БАРАНОК Сцяпан Казіміравіч, н. у 1916, в. Халопенічы Глускага р-на, сувязны-разведчык, схоплены фашыстамі і расстраляны 5.4.1942.

ГРАБКА Міхаіл Цярэнцьевіч, н. у 1907, в. Халопенічы Глускага р-на, камандзір атрада 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 10.9.1943.

КАЗЛОЎСКІ Яфім Антонавіч, н. у 1910, в. Халопенічы Глускага р-на, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 12.9.1942.

КАЦУБА Павел Дзям'янавіч, н. у 1924, в. Дзятлавічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл., партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 10.1.1944.

МЫШАК Іосіф Іванавіч, н. у 1887, в. Халопенічы Глускага р-на, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 5.8.1941.

МЫШАК Міхаіл Іосіфавіч, н. у в. Халопенічы Глускага р-на, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 5.8.1941.

НОЗІК Іцка Лейбавіч, н. у 1923, г.п. Глуск, партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 29.3.1942.

ЧАРНАВОКІ Серафім Мінавіч, н. у 1925, в. Дзятлавічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл., партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 10.1.1944.

В.А.Браварэнка.

ШАНТАР Васіль Лаўрэнавіч, н. у 1912, г. Бабруйск Магілёўскай вобл., партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў 25.8.1943.

ВЁСКА СЛАБОДКА

МАРКІН Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1921, Расія, камандзір аддзялення 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 5.8.1943.

СЕБЯЛЯВА Іван Іванавіч, партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 5.8.1943.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВІЛЬЧА

ГАНЧАРОВА Алена Мікалаеўна, сувязная-разведчыца атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, схоплена фашыстамі і 3.3.1943 пазверску замучана.

КУРС Марыя Аляксандраўна, н. у 1920, сувязная-разведчыца атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай брыгады, схоплена фашыстамі і 3.3.1943 пазверску замучана.

КЛЯТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДАКОЛЬ

ПЕРМЯКОЎ Васіль, загінуў у 1943.

ВЁСКА КЛЕТНАЕ

УСАЎ Арцём Трафімавіч, загінуў 12.2.1943.

ХАРАШУН Пётр Емяльянавіч, загінуў 6.3.1943.

СЛАЎКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАЕЛІЦА

БАСАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1915, Новасібірская вобл., Расія, партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 12.9.1943.

ПАРХІМЧЫК Аляксандр Цітавіч, н. у 1919, в. Белая Глускага р-на, партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 12.9.1943.

СУЧАКА Антон Трафімавіч, н. у 1915, в. Коханаўка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 12.9.1943.

ВЁСКА ЗОРКА

ЛОСІК Фёдар Яўсеевіч, н. у 1911, в. Макарычы Старадарожскага р-на Мінскай вобл., партызан атрада імя К.Я.Варашылава 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у 1943.

ВЁСКА СЛАЎКАВІЧЫ

АЗРАЕЎСКІ Альберт Францавіч, н. у 1924, в. Завалочыцы Глускага р-на, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 3.2.1944.

АНУЛАЎ Іван Іванавіч, н. у 1916, г. Карачаў Бранскай вобл., Расія, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 3.2.1944.

АХРАМЕЙКА Пётр Іванавіч, н. у 1924, в. Слаўкавічы, партызан-разведчык, загінуў 13.4.1944.

БАСАЛЫГА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1925, в. Бабірова Глускага р-на, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 3.2.1944.

БЕЎЗ Дзмітрый Яфімавіч, н. у 1917, с. Івангорад Кіеўскай вобл., Украіна, лейт., памочнік камандзіра атрада імя Дз.Ц.Гуляева 101-й брыгады імя А.Неўскага, загінуў у сакавіку 1943 каля в. Баянава Глускага р-на.

БРАВАРЭНКА Вера Аляксандраўна, н. у 1926, г. Бабруйск Магілёўскай вобл., партызанка 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінула 11.9.1943.

ВОЛКАЎ Уладзімір Сяргеевіч, н. у 1912, камандзір аддзялення атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 3.2.1944.

ГРАМЫКА Іван Мікалаевіч, н. у 1921, в. Цяснова Глускага р-на, фельчар атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 18.8.1942 у в. Барбарова Глускага р-на.

ГРАМЫКА Канстанцін Іванавіч, н. у 1901, в. Цяснова Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 7.7.1943.

ДОЎГІ Пётр Мікітавіч, н. у 1925, в. Тарасавічы Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., партызан 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 18.11.1943.

ДРОБ Ігнат Сямёнавіч, н. у 1907, в. Даколь Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 6.6.1942.

ДРОБАЎ Ігнат Дзмітрыевіч, н. у 1907, в. Даколь Глускага р-на, камандзір аддзялення 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 6.6.1942.

ДУБІКАЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1921, с. Вадап'янава Варонежскай вобл., Расія, камандзір аддзялення 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 11.11.1943.

ЖОЎНЕР А.І., загінуў у 1943.

ЗЯЛЁНКА Васіль Еўдакімавіч, н у 1924, в. Зорка Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 10.1.1944.

КАСЬКО Андрэй Іосіфавіч, н. у 1907, в. Зорка Глускага р-на, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 15.3.1943.

КОШАЛЬ Аляксей Сцяпанавіч, н. у 1901, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 7.7.1943.

КОШАЛЬ Віктар Якаўлевіч, н. у 1914, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 14.1.1944.

ЛАЎРОЎ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1915, сяржант, партызан атрада імя Дз.Ц.Гуляева 101-й брыгады імя А.Неўскага, загінуў 18.9.1942.

ЛЯЛЬКІН Леанід Анатольевіч, н. у 1923, в. Зелянковічы, разведчык атрада імя А.Неўскага 25-й брыгады імя П.К.Панамарэнкі, загінуў 4.6.1943.

Л.А.Лялькін.

У дваццаць юнацкіх год

Здарылася гэта ў пачатку лета 1943 г. на Любаншчыне. Атрадная разведка атрымала заданне здабыць звесткі ў в. Чырвоная Горка аб сілах праціўніка і іх размяшчэнні. Леанід таксама ўдзельнічаў у гэтай аперацыі. Ноччу разведчыкі адправіліся ў дарогу. Перад світаннем падышлі да вёскі. З невялікага лясочка, дзе яны размясціліся, партызанам былі выразна бачны крайнія пабудовы. Навокал было ціха і спакойна. Здаецца, нішто ў гэтую чэрвеньскую раніцу не нагадвала аб вайне. Але так толькі здалося на нейкую хвіліну, бо нават у гэтай невялікай вёсачцы вайна затаілася ў падманлівай летняй цішыні.

Лёня Лялькін папрасіўся ў старшага групы пайсці ў разведку. Незаўважаным прабраўся ён у вёску, праз нейкі час вызначыў месцазнаходжанне варожых дзотаў. Можна было ўжо і вяртацца... Толькі на гэты раз удача здрадзіла хлопцу. Калі ён перабягаў вуліцу, каб агародамі падацца да лесу, дзе засталіся таварышы, яго заўважылі фашысты і ўзнялі стральніну. Лёня бег, а ўслед яму грымелі аўтаматныя чэргі. Адной з іх прашыла ногі хлопца. Ён, як падкошаны, упаў у траву і страціў прытомнасць.

У такім стане яго і захапілі фашысты. Любой цаной рашылі яны дазнацца ад юнака, дзе размяшчаецца партызанскі атрад. Але Лёня маўчаў.

Жудасную расправу ўчынілі тады над ім ворагі, спрабуючы неверагоднымі здзекамі прымусіць партызана загаварыць. Лёню выкалалі вочы, з ног садралі скуру і раны пасыпалі соллю. Але мужны партызан, так і не выдаўшы нікога, памёр ад нечалавечых здзекаў. Мясцовым жыхарам фашысты загадалі пахаваць партызана. Але разведчыкі прабраліся ноччу ў вёску і забралі цела загінуўшага сябра, перанеслі яго ў Слаўкавічы, дзе аддалі яму апошнія ўшанаванні і пахавалі.

Т.А.Аляксандрава.

МАТУЗАЎ Леанід Рыгоравіч, н. у 1923, г. Гомель, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у красавіку 1944.

МЕДЗЬВЯДОК Іван Сямёнавіч, н. у 1927, г. Калінкавічы Гомельскай вобл., партызан атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, памёр ад хваробы 14.1.1944.

МЕСНІК Аркадзь Кузьміч, н. у 1915, в. Слаўкавічы, оперупаўнаважаны атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 22.10.1943.

НАНЗЭВІЧ Уладзімір Людвігавіч, н. у 1918, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 258-й брыгады імя В.У.Куйбышава, загінуў 11.5.1944.

ПЯТРОЎ Сяргей, загінуў у чэрвені 1942.

РЭЙЗМАН Прохар Іванавіч, н. у 1901, в. Слаўкавічы, партызан атрада імя С.М.Будзённага 100-й Глускай брыгады, загінуў 25.9.1942.

САЎЧУК Іраклій Мікалаевіч, загінуў у маі 1944.

СІВЕЦ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1920, г. Кіеў, Украіна, камандзір узвода 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 18.11.1943.

СТРЭЖ Лук'ян Міхайлавіч, н. у 1902, в. Зорка Глускага р-на, загінуў ў 1943.

СЯРГЕЙЧЫК Павел Цімафеевіч, н. у 1921, в. Заполле Завалочыцкага сельсавета Глускага р-на, камандзір аддзялення атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, памёр ад хваробы 4.7.1944.

Ф.І.Уманец.

СЯРЭДЗІН Васіль Максімавіч, н. у 1904, Расія, кап., нач. штаба 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў у студзені 1944.

ЦЮРЫН Яўген Іванавіч, н. у 1920, в. Сямчана Клінскага р-на Маскоўскай вобл., Расія, памочнік камісара па камсамолу 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева, загінуў 15.3.1943 у раёне Глуска.

ХАЎКІН Яфім Цімафеевіч, н. у 1917, палітрук роты атрада імя Д.Ц.Гуляева 101-й брыгады імя А.Неўскага, загінуў у 1943 каля в. Малінава Глускага р-на.

ШАРКЕВІЧ Леанід, загінуў 6.6.1942.

ШАСЦЮК Аркадзь Рыгоравіч, н. у 1925, в. Зорка Глускага р-на, партызан атрада імя К.Я.Варашылава 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у 1943.

ШРЭЙТАР Генадзь Канстанцінавіч, н. у 1926, в. Іванаўка Старадарожскага р-на Мінскай вобл., партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 3.2.1944.

ЯЎСЕЕЎ Рыгор Цітавіч, н. у 1913, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў у сакавіку 1944.

ХВАСТАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕСНАВА

СОКАЛ Дзмітрый, загінуў у 1942.

ВЁСКА ДУБРОВА

БАБРЫЦКІ Сцяпан, н. у ст. Цеменбекская Каўказскага р-на Краснадарскага краю, Расія, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 23.11.1942.

БРАТЧЭНЯ Емяльян Мікітавіч, н. у 1924, в. Прусы Старадарожскага р-на Мінскай вобл., партызан 100-й брыгады імя С.М.Кірава, загінуў у сакавіку 1944.

ГЕРАСІМОВІЧ Ганна Іванаўна, н. у 1926, в. Заполле Завалочыцкага сельсавета Глускага р-на, партызанка атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінула 23.11.1942.

КАРТУН Канстанцін Фёдаравіч, н. у 1914, в. Слопішча Старадарожскага р-на Мінскай вобл., радавы Беларускага штаба партызанскага руху, загінуў 11.4.1944.

ЛАЎРУШКІН Аляксандр Барысавіч, н. у 1914, Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл., партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 23.11.1942.

ПЯТРЭНЯ Марфа Данілаўна, партызанка атрада ім Л.М.Даватара 64-й брыгады імя В.І.Чапаева, загінула ў 1944.

ПЯТРЭНЯ Мікалай Мікалаевіч, партызан атрада імя Л.М.Даватара 64-й брыгады імя В.І.Чапаева, загінуў у 1944 разам з маці М.Д.Пятрэня.

ТАКАРЭНКА Пётр Іванавіч, н. у 1918, Херсонская вобл., Украіна, партызан атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 23.11.1942.

ШТЫЛЁЎ Дзмітрый, Расія, начальнік разведкі атрада імя Ф.Э.Дзяржынскага 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага, загінуў 23.11.1942.

ВЁСКА МЫСЛОЦІНА

ЛЕВІН Іван Паўлавіч, н. у 1916, Расія, партызан атрада імя М.І.Калініна 100-й Глускай брыгады, загінуў 5.6.1944 у в. Мыслоціна.

ВЁСКА ХВАСТАВІЧЫ

Воінскія могілкі

ПАНКРАТАЎ Пётр Іванавіч, камісар атрада імя В.І.Чапаева 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі, загінуў у кастрычніку 1943.

УМАНЕЦ Фёдар Іларыёнавіч, н. у 1910, с. Краснае Кіраваградскай вобл., Украіна, ваентэхнік 1-га рангу, памочнік па гаспадарч. частцы камандзіра батальёна 7-га танкавага палка 36-й танкавай дывізіі, не выйшаў з акружэння, з 1941 партызан атрада імя М.Ф.Гастэлы 225-й брыгады, загінуў у красавіку 1942.

Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

БОЛБАС Лук'ян Сяргеевіч, н. у 1903, калгаснік, расстраляны ў маі 1943 у Глуску за сувязь з партызанамі.

ЛУГІН Антон Міхайлавіч, расстраляны ў сакавіку 1942 за сувязь з партызанамі.

ЛУГІН Макар Данілавіч, н. у 1912, расстраляны ў сакавіку 1942 за сувязь з партызанамі.

ЛУГІН Яўхім Фёдаравіч, н. у 1921, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

ЛУГІНА Соф'я Емяльянаўна, н. у 1898, расстраляна ў сакавіку 1942 у Глуску за сувязь з партызанамі.

ЛЯПКО Лук'ян Андрэевіч, н. у 1889, расстраляны ў сакавіку 1942 у Глуску за сувязь з партызанамі.

МАЛАКОВІЧ Пётр Мікалаевіч, н. у 1925, расстраляны ў маі 1942 за сувязь з партызанамі.

МАЛАКОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1926, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

МАРЦІНОВІЧ Кірыла Андрэевіч, н. у 1890, расстраляны гестапа 27.8.1942 за дапамогу партызанам.

МАРЦІНОВІЧ Піліп Сцяпанавіч, н. у 1905, расстраляны ў в. Бярозаўка.

МЯДЗЬВЕДСКАЯ Вера Іванаўна, н. у 1929, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі.

МЯДЗЬВЕДСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1922, расстраляны ў маі 1942 за сувязь з партызанамі.

РАДЗЬКО Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1926, загінуў у канцлагеры.

РЭЗНІК Валянціна Леанідаўна, н. у 1932,

РЭЗНІК Тамара Леанідаўна, н. у 1933, захоплены ў якасці заложнікаў як дзеці партызана і расстраляны ў 1942.

СЕМЕЖ Апанас Ільіч, н. у 1891, расстраляны ў маі 1942 за сувязь з партызанамі.

СЕМЕЖ Пётр Трафімавіч, н. у 1917, загінуў у канцлагеры ў Германіі.

ЧУРУН Вера Гаўрылаўна, н. у 1900, расстраляна ў сакавіку 1942 за сувязь з партызанамі.

ЧУРУН Пётр, н. у 1900, расстраляны ў сакавіку 1942 за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА ЗГОДА

ГАНЧАРЭВІЧ Аляксандр Браніслававіч, н. у 1919, у Чырв. Арміі з 1939, рад., стралок, прапаў без вестак у лютым 1944.

ГОЛАЎ Мікалай Іванавіч, загінуў у 1945.

ГОРДЗІН Мікалай Елізаравіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1941, прапаў без вестак у верасні 1941.

ГРЫНЯВЕЦКІ Фелікс Станіслававіч, н. у 1905, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ГУБІН Фёдар Якаўлевіч, н. у 1905, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у лютым 1945.

ГУЦЯНКОЎ Канстанцін Васільевіч, н. у 1913, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ДАБРАВОЛЬСКІ Іван Іванавіч, н. у 1922, быў у партызанах, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, загінуў 27.6.1944.

ДАШКЕВІЧ Антон Аляксандравіч, н. у 1920, у Чырв. Арміі з 1940, рад., стралок, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ДЖЫШЫАШВІЛІ Георгій Рыгоравіч, н. у 1919, у Чырв. Арміі з 1939, рад., стралок, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ДЗЯДЗЮЛЯ Рыгор Кірылавіч, н. у 1903, загінуў 18.8.1944 у Польшчы.

ДЗЯШКОВІЧ Цімафей Спірыдонавіч, н. у 1905, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у лістападзе 1941.

ДРАНЬ Павел Пракопавіч, гв. рад., загінуў 4.2.1944 у Светлагорскім р-не Гомельскай вобл.

ДУБОВІК Іван Антонавіч, н. у 1925, гв. рад., стралок, загінуў 20.8.1944 пад Варшавай, Польшча.

ДУБОЎСКІ Фёдар Лук'янавіч, н. у 1912, рад., стралок, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Яўстафій Лявонавіч, н. у 1920, у Чырв. Арміі з 1940, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЖУКОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1912, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЗМАЧЫНСКІ Адам Лявонавіч, н. у 1920, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ІВІНСКІ Іван Іванавіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ІСАЕЎ Аляксей Дзмітрыевіч, н. у 1922, лейт., камандзір узвода, загінуў 27.12.1942, пахаваны ў г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобл., Расія.

КАЗАК Ігнат Мікалаевіч, н. у 1907, рад., стралок, прапаў без вестак 30.11.1941.

КАЗЛОЎСКІ Аляксандр Фаміч, н. у 1920, у Чырв. Арміі з 1940, рад., стралок, прапаў без вестак у снежні 1944.

КАПАЧОЎ Іван Іванавіч, н. у 1907, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у красавіку 1944.

КАРОЛЬ Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1922, прапаў без вестак у верасні 1944.

КАСІНСКІ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1922, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у маі 1945.

КАСЦЮКЕВІЧ Антон Кірэевіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

КЛІМОВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1924, рад., стралок, загінуў 15.2.1943, пахаваны ў в. Глафіраўка Лутугінскага р-на Луганскай вобл., Украіна.

КОРШУН Мікалай Дзмітрыевіч, н. у 1916, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

КРУГЛОЎ Васіль Цярэнцьевіч, н. у 1915, быў у партызанах, у Чырв. Арміі з 1943, рад., стралок, прапаў без вестак у ліпені 1944.

КУЛДАШЫН Дзмітрый Ільіч, н. у 1913, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944 у Бранскай вобл., Расія.

КУРГАНСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, загінуў 10.10.1944 пад Варшавай, Польшча.

КУШАЛЬ Дарафей Іванавіч, н. у 1900, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЛАБОВІЧ Генадзь Фадзеевіч, н. у 1924, мал. сярж., камандзір аддзялення, загінуў 9.4.1945 пад Кёнігсбергам.

ЛАПАЦЕНКА Дзмітрый Фёдаравіч, н. у 1911, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЛАПІЦКІ Сава Рыгоравіч, н. у 1918, лейт., камандзір роты, загінуў 9.2.1942, пахаваны ў в. Кузіна Чудаўскага р-на Наўгародскай вобл., Расія.

ЛІНЕВІЧ Андрэй Сямёнавіч, н. у 1913, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЛОБАХ Мікалай Васільевіч, н. у 1912, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1943.

ЛЫСЕНКА Кузьма Кірылавіч, н. у 1910, рад., загінуў 29.8.1944 пад Варшавай, Польшча.

ЛЯДЗЯН Васіль Сцяпанавіч, н. у 1906, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ЛЯДЗЯН Яўген Міхайлавіч, н. у 1923, рад., стралок, прапаў без вестак у снежні 1944.

МАЙСЕЕНКА Уладзімір Аляксеевіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

МАЛАКОВІЧ Георгій Емяльянавіч, н. у 1910, мал. палітрук, прапаў без вестак у ліпені 1941.

МАЛЫШКІН Мікалай Міхайлавіч, н. у 1919, быў у партызанах, у Чырв. Арміі з 1943, рад., стралок, загінуў 25.12.1943.

МАРГЕЛАЎ Васіль Прохаравіч, н. у 1911, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

МАРКАЎ Ігнат Фядосавіч, н. у 1913, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

МАРМАЛАД Архіп Іванавіч, н. у 1925, рад., стралок, памёр ад ран 16.6.1945, пахаваны ў г. Каўнас, Літва.

МАРОЗ Ціт Фёдаравіч, н. у 1897, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у снежні 1944.

МАЦЫЁН Мікалай Людвігавіч, н. у 1922, у Чырв. Арміі з 1941, прапаў без вестак у красавіку 1944.

МІНІЧ Аляксей Навумавіч, н. у 1918, у Чырв. Арміі з 1938, сярж., камандзір аддзялення, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

МІХАЙЛАЎ Іван Цітавіч, н. у 1926, рад., стралок, загінуў 26.1.1945 у Польшчы.

МІХАЛЬЧУК Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1939, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

МУРЧА Лявон Карлавіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1943, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

НЕКРАШЭВІЧ Андрэй Сямёнавіч, н. у 1922, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

НОВІК Фёдар Трафімавіч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1939, лейт., камандзір танка, прапаў без вестак у снежні 1944.

НОВІКАЎ Іван Іванавіч, н. у 1903, у Чырв. Арміі з 1941, ст. палітрук, прапаў без вестак у чэрвені 1941.

НЯВЕРКА Міхаіл Лукіч, н. у 1907, у Чырв. Арміі з 1941, сярж., камандзір аддзялення, прапаў без вестак у лістападзе 1944.

ПАДАЛЯК Рыгор Андрэевіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1941, прапаў без вестак у снежні 1941.

ПАДДУБСКІ Фама Сямёнавіч, н. у 1911, мал. сярж., артылерыст, прапаў без вестак 3.7.1942.

ПАЛЮКОЎ Максім Іванавіч, н. у 1914, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, загінуў 12.6.1943, пахаваны ў в. Кандуля Тосненскага р-на Ленінградскай вобл., Расія.

ПАРАШЫН Васіль Аляксеевіч, н. у 1920, у Чырв. Арміі з 1945, рад., стралок, загінуў 11.4.1945 у Аўстрыі.

ПАЎЛАЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1913, рад., стралок, загінуў 7.3.1942 у палоне.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Міхаіл Адамавіч, н. у 1915, рад., стралок, прапаў без вестак у ліпені 1944.

ПІМЕНАЎ Рыгор Уладзіміравіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПЛЫХОЦКІ Віктар Аляксандравіч, н. у 1908, уцёк з канцлагера, рад., стралок, прапаў без вестак у маі 1945.

ПЛЫШЭЎСКІ Антон Андрэевіч, н. у 1910, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у снежні 1944.

ПРАКАПЕНКА Пётр Дзям'янавіч, н. у 1906, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПРОХАРАЎ Рыгор Прохаравіч, н. у 1902, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ПРЫВАР Мікалай Арцёмавіч, н. у 1918, рад., стралок.

РАМАНАЎ Кузьма Мікалаевіч, н. у 1901, ст. сярж., загінуў 30.1.1945 ва Усх. Прусіі.

РОШЧЫН Іван Фёдаравіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у красавіку 1945.

РУДЗЬКО Яфрэм Дзянісавіч, н. у 1902, інтэндант 3-га рангу, інструктар забеспячэння, прапаў без вестак у 1943.

САВІЦКІ Іосіф Пятровіч, н. у 1913, рад., стралок, загінуў 22.1.1945.

СІДАРЭНКА Фёдар Маркавіч, н. у 1910, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у ліпені 1944.

СІНКЕВІЧ Сцяпан Васільевіч, мал. сярж., загінуў 7.5.1944, пахаваны ў г. Бельцы, Малдова.

СКРЫПЧАНКАЎ Дзмітрый Севасцьянавіч, н. у 1900, загінуў 21.10.1943, пахаваны ў в. Азёры Кабяляцкага р-на Палтаўскай вобл., Украіна.

СТАРАВОЙТАЎ Сяргей Герасімавіч, рад., стралок, загінуў 1.2.1945 у Памераніі, Германія.

СТАРЖЫНСКІ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1914, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СТАТКЕВІЧ Павел Пятровіч, загінуў 21.1.1945.

СТУПЕНЬ Сяргей Фаміч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1942, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СЦЕПАНЮК Ульян Андрэевіч, н. у 1906, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

СЦЕПЧАНКА Іван Фёдаравіч, н. у 1919, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

СЯМЁНАЎ Мікіта Маркавіч, н. у 1913, у Чырв. Арміі з 1940, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

СЯРГЕЕЎ Дзмітрый Яўсеевіч, н. у 1914, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

ТАЛЬКО Уладзімір Іванавіч, н. у 1920, рад., стралок, загінуў у 1945, пахаваны на ст. Лоухі ў Карэліі, Расія.

ТУРУЦІН Сцяпан Ягоравіч, н. у 1919, лейт., камандзір узвода, загінуў 12.4.1942.

ФІЛІППЁНАК Віктар Ільіч, н. у 1921, рад., стралок, загінуў 10.10.1944 пад Варшавай, Польшча.

ФІЛІПОВІЧ Цярэнцій Іванавіч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак у маі 1944.

ФІЛІПЧЫК Якаў Лук'янавіч, н. у 1906, рад., стралок, загінуў 25.8.1944 пад Варшавай, Польшча.

ФУНДАМЕНТ Антон, н. у 1925, рад., стралок, загінуў 17.10.1944, пахаваны ў в. Гута Падгурна Сяроцкага павста Варшаўскага ваяв., Польшча.

ХЛІСТУНОЎ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1921, рад., кавалерыст, прапаў без вестак 16.7.1941.

ХРАМЕНКА Яўген Данілавіч, н. у 1904, у Чырв. Арміі з 1941, ст. лейт., ад'ютант камандзіра батальёна, загінуў у 1941.

ЦАЛЕБЯНОК Ягор Сцяпанавіч, н. у 1900, у Чырв. Арміі з 1941.

ЦЕРАШКЕВІЧ Іван Нічыпаравіч, н. у 1912, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЦІМКО Савелій Сцяпанавіч, н. у 1906, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЦІТОЎ Васіль Малафеевіч, н. у 1921, гв. рад., тэлефаніст, загінуў 3.4.1945 пад Гданьскам, Польшча.

ЦЫРКІН Рыгор Антонавіч, н. у 1920, служыў у Польскай стралковай дывізіі імя Т.Касцюшкі, загінуў 15.9.1944 пад Варшавай, Польшча.

ЧАЛНАКОЎ Мікалай Стафанавіч, н. у 1921, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, прапаў без вестак у лютым 1945.

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ЧАРТКОЎ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1916, рад., стралок, памёр ад ран 21.1.1942, пахаваны ў г. Грозны, Чэчэнская Рэспубліка.

ЧАЧУХА Міхаіл Лазаравіч, н. у 1912, у Чырв. Арміі з 1940, рад., стралок.

ЧУГАЙЛА Аркадзь Андрэевіч, н. у 1916, у Чырв. Арміі з 1937, мал. сярж., камандзір аддзялення, прапаў без вестак у сакавіку 1944.

ЧУЙКО Гаўрыла Канстанцінавіч, н. у 1901, гв. рад., стралок, загінуў 18.8.1944 у Польшчы.

ЧЫЖЫК Міхаіл Ціханавіч, н. у 1908, у Чырв. Арміі з 1941, рад., стралок, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШМІГЕЛЬСКІ Павел Іосіфавіч, н. у 1906, рад., стралок, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

ШУЛЯКОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1903, палітрук роты, загінуў 29.11.1941.

ШУЛЯКОЎСКІ Мяфодзій Іпалітавіч, н. у 1909, у Чырв. Арміі з 1941, мал. сярж., камандзір аддзялення, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЧАРБАКОЎ Аляксей Міхайлавіч, н. у 1913, мал. лейт., камандзір узвода, прапаў без вестак 30.6.1943.

ШЫНКЕВІЧ Іван Дзянісавіч, н. у 1915, у Чырв. Арміі з 1944, рад., стралок, загінуў 18.8.1944, пахаваны ў в. Вулкі пад Варшавай, Польшча.

ШЭР Міхаіл Хаімавіч, н. у 1917, рад., стралок, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЮДОВІЧ Арсеній Іванавіч, н. у 1924, рад., стралок, загінуў 12.10.1944 пад Варшавай, Польшча.

ЯНКОЎСКІ Ананій Рыгоравіч, н. у 1904.

ЯНКОЎСКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1909.

ЯНКОЎСКІ Пётр Рыгоравіч, н. у 1915.

ЯНКОЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1906.

ЯНКОЎСКІ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1918.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

З руін і папялішчаў

Гады нямецкага нашэсця і ваенныя дзеянні нанеслі раёну страшэнныя разбурэнні. За час свайго «гаспадарання» фашысты спалілі цалкам або часткова многія вёскі, знішчылі 1747 дамоў калгаснікаў, рабочых і служачых, у зямлянках былі вымушаны жыць каля 600 сем'яў. Не захавалася цэлым ніводнага прадпрыемства: абсталяванне на іх было разрабавана і знішчана. Фашысты спалілі больш як 400 калгасных будынкаў, многія школы, фельчарска-акушэрскія пункты і бальніцы, установы культуры, амаль поўнасцю знішчылі пагалоўе жывёлы калектыўных гаспадарак, маёмасць якіх таксама была разграблена. Страты, нанесеныя народнай гаспадарцы раёна, нават па няпоўных даных у цэнах таго часу, склалі каля 945 млн. руб. 1700 чалавек апынуліся на катарзе ў Германіі.

Вайна прынесла гора літаральна ў кожную сям'ю. Безумоўна, думкі пра гэта азмрочвалі радасць вызвалення, але доўгачаканая свабода, пераход да мірнага жыцця, хоць вайна яшчэ і не закончылася, надавалі людзям сілы, напаўнялі іх сэрцы ўпэўненасцю, умацоўвалі веру ў хуткую перамогу. Было вельмі цяжка, аднак людзі разумелі, што патрэбна не толькі залечваць раны, нанесеныя вайной, але і хутчэй наладзіць мірнае жыццё. Неабходна было таксама ўсімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі разбіць хутчэй ненавіснага ворага. Менавіта гэта задача вынікала з рэзалюцыі шматлюднага мітынгу працоўных, які адбыўся 30 чэрвеня 1944 г. у раённым цэнтры сумесна з партызанамі. На ім жыхары раёна горача дзякавалі Чырвонай Арміі, яе воінам, што вызвалілі Глушчыну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны далі слова ўсе свае намаганні накіраваць на аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі раёна. Вялікую работу ў гэтым напрамку правяла аператыўная група, якая ўвайшла ў раён разам з часцямі Чырвонай Арміі. Яна хутка вырашала першачарговыя гаспадарчыя задачы і аказвала ўсебаковую дапамогу армейскім часцям, якія рухаліся з баямі на захад. Рамантаваліся дарогі, аднаўляліся масты і пераправы, сродкі сувязі. Быў адноўлены Глускі райком партыі. Партыйны орган узначаліў Сямён Кузьміч Кучэрын. Першага ліпеня на аб'яднаным пасяджэнні райкома КП(б)Б і райвыканкома быў зацверджаны раённы Савет дэпутатаў працоўных. Адначасова падабраны і назначаны старшыні сельскіх Саветаў, старшыні калгасаў. Многія звенні партыйнай, савецкай і гаспадарчай ра-

боты ўзначалілі ўчарашнія партызаны, тыя, чые арганізатарскія і чалавечыя якасці прайшлі ўсебаковую праверку ў суровым гарніле вайны. Старшынёй райвыканкома быў назначаны Іван Міхайлавіч Кулікоўскі, былы камандзір 100-й Глускай партызанскай брыгады, намеснікам — яго баявы таварыш Іван Ільіч Захарынскі, камісар атрада «За Савецкую Радзіму» гэтай жа брыгады. Райземаддзел узначаліў Павел Міхайлавіч Юневіч, дырэктарам Глускай МТС стаў працаваць Рыгор Кліменцьевіч Тычына, Рудабельскай — В.М.Багдановіч, старшынёй пасялковага Савета — Антон Яўстратавіч Коўзун, загадчыцай райсабеса — Раіса Яфімаўна Раткевіч, яе баявая сяброўка настаўніца Марыя Рыгораўна Луц — інструктарам РК ЛКСМБ.

У гэты ж час быў прыняты шэраг пастаноў, што мабілізавалі працоўных раёна на вырашэнне першачарговых задач ва ўмовах гаспадарання ваеннага часу. 22 ліпеня быў створаны знішчальны батальён у Глуску і групы садзейнічання па раёне. Гэта выклікалася неабходнасцю барацьбы з астаткамі гітлераўцаў, іх прыслужнікаў і іншымі злачыннымі элементамі. У батальёне і групах налічвалася 292 чалавекі, а ў склад кіраўніцтва імі ўваходзілі Кузьміцкі, П.Р.Чарнушын, А.Л.Быкаў, якія з'яўляліся адпаведна камандзірам, начальнікам палітчасці і начальнікам штаба.

Такім жа чынам была створана раённая камісія па ўліку нанесенага вайной урону, у якую ўвайшлі С.К.Кучэрын (старшыня), І.М.Кулікоўскі (намеснік), Міхаіл Альшэўскі, рэдактар раённай газеты, С.Ф.Шумоўскі і іншыя. Камісія правяла расследаванне фактаў знішчэння грамадзян нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў г.п. Глуск і раёне ў перыяд акупацыі. На падставе даных гэтай камісіі на нарадзе раённага актыву былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па аднаўленні жыццёва важных аб'ектаў і прадпрыемстваў, калгасаў, школ, культурна-асветных устаноў і гандлёвай сеткі раёна. Не хапала грашовых сродкаў, абсталявання, кваліфікаваных кадраў, але ўсюды кіпела творчая праца.

Р.Я.Раткевіч.

М.Р.Луц.

Ужо ў гэтым жа месяцы далі ток дзве электрастанцыі, уступілі ў дзеянне хлебапякарня, два паравыя млыны, дзве цыркуляркі, дзве крупадзёркі, ваўначоска і сукнавальня. Выпусцілі першую прадукцыю Завалочыцкі спіртзавод, гарбарны і два маслазаводы, кравецкая і шавецкая арцелі, механічная майстэрня. Пачалі працаваць раённая бальніца на 70 ложкаў, амбулаторыя, аптэка, сем медпунктаў на вёсках, 16 лазняў і цырульня.

Асаблівыя перамены адчуваліся на вёсцы. Ва ўсіх 86 калгасах былі выбраны праўленні гаспадарак, брыгадзіры, рэвізійныя камісіі. Многія пасады займалі жанчыны. Ім прыходзілася шмат працаваць, бо жанчыны, старыя і падлеткі тады складалі на вёсцы асноўную рабочую сілу. Самай цяжкай для іх была першая пасляваенная пасяўная, калі мужчыны яшчэ ваявалі, а пачынаць трэба было з нуля. Але натхняла жаданне аднавіць гаспадарку.

Некаторы час даводзілася нават служыць цяглавай сілай: восем жанчын у плуг, дзевятая — за плугам, бо ў калгасах раёна не было ні коней, ні валоў, ні кароў.

Адразу ж пасля вызвалення пачалося аднаўленне дзвюх МТС: Глускай

і Рудабельскай. Вялікія цяжкасці прыйшлося зведаць пры рамонтных работах, і ў першую чаргу з-за адсутнасці кваліфікаваных спецыялістаў. Хоць і не так хутка, як таго хацелася, але справа ўсё ж зрушылася з месца: укамплектоўваліся разабраныя ці прыхаваныя ў пачатку вайны трактары і іншая сельскагаспадарчая тэхніка, што паступала з іншых месцаў.

А ў сярэдзіне ліпеня па вёсках разнеслася радасная вестка: пачалі працаваць МТС, на палі выйшлі першыя адрамантаваныя трактары.

Літаральна праз два тыдні пасля вызвалення ўключыліся ў работу працаўнікі саўгаса «Завалочыцы» — старэйшай гаспадаркі раёна. Яе ў гэты час узначаліў Парфірый Яфімавіч Лупсякоў — чалавек працавіты, сумленны, добразычлівы. З агульнай колькасці 278 рабочых 218 складалі жанчыны. Гэта яны даглядалі саўгасную жывёлу, апрацоўвалі 700 га сельгасугоддзяў, аралі, сеялі, баранавалі, слязамі і салёным потам паліваючы змардаваную вайной зямлю. Да крывавых мазалёў касілі, цяжкімі цапамі абмалочвалі снапы.

А з усходу ішла дапамога. У вызваленую Беларусь з паўднёвых рэспублік спяшаліся эшалоны са збожжам, тэхнікай, і калектыўныя гаспадаркі Глушчыны сталі паступова ажываць.

Тэрмінова трэба было вырашыць і яшчэ адну складаную праблему. У раёне засталіся без жылля каля 1800 сем'яў. Многім з іх доўгі час давялося жыць амаль што пад адкрытым небам. Таму аператыўна ствараліся будаўнічыя брыгады ў калгасах, якія асабліва пацярпелі ад вайны.

Велізарную дапамогу ў гэтай справе аказвала дзяржава. На аднаўленне і будаўніцтва жылых дамоў у вёсках і раённым цэнтры адпускаліся грашовыя сродкі ў выглядзе крэдытаў. Акрамя таго, для сем'яў загінуўшых воінаў, інвалідаў вайны, удоў і сірот жыллё ўзводзілася за кошт дзяржавы. Будавалі ў асноўным старыя, жанчыны і дзеці, бо мужчыны яшчэ ваявалі на фронце. Дастаткова сказаць, што ў ліпені 1944 г. была праведзена мабілізацыя ваеннаабавязаных. У выніку яе дзве тысячы чалавек з ліку працоўных раёна ўліліся ў баявыя злучэнні Чырвонай Арміі, прымалі ўдзел у канчатковым разгроме ворага.

Сведчаннем бязмежнай удзячнасці сваім вызваліцелям з'явіўся збор насельніцтвам Глушчыны падарункаў параненым байцам, якія лячыліся ў шпіталях. Напрыклад, з раёна ў дапамогу аднаму са шпіталяў было накіравана 50 камсамольцаў. Яны збіралі для параненых агародніну, дзяжурылі ў палатах, дапамагалі медыцынскім работнікам.

Ураджай, сабраны з участкаў, засеяных у перыяд акупацыі, жыхары раёна накіравалі для Чырвонай Арміі. Збіраліся сродкі ў Фонд абароны, і кожны імкнуўся ўнесці свой уклад у гэту справу. Жыхары Хваставіцкага сельсавета на вясковых сходах прынялі рашэнне аб зборы сродкаў на фарміраванне эскадрыллі самалётаў «Савецкая Беларусь». Жылося цяжка, не хапала самага неабходнага, але людзі гатовы былі вынесці любы цяжар, аддаць нават апошняе, што мелі, толькі б хутчэй прыйшла перамога. Яна была для кожнага даражэй за ўсё.

Май 1945 г. прынёс доўгачаканую перамогу. Вярталіся дамоў воіны-вызваліцелі і пачыналі будаваць новае жыццё.

Перамога над ворагам дала новы імпульс развіццю народнай гаспадаркі раёна. Ужо к канцу 1945 г. былі адноўлены і працавалі на поўную магутнасць пяць прадпрыемстваў: у іх ліку прамкамбінат і 4 арцелі. Выпуск прадукцыі арцелі «Прагрэс» у IV квартале 1945 г. склаў 128%, а арцелі «Перамога» за такі ж перыяд — 126%. За першае паўгоддзе 1946 г. прадукцыі на суму 126 тыс. руб. выпусціў прамкамбінат, а арцель «Чырвоны пекар» — на 200,6 тыс.

руб., што ў сярэднім склала 184%. Выдатныя працоўныя здабыткі былі ў калектываў арцелі «Прагрэс», торфазавода «Бярозаўка», леспрамгаса. Усяго ў 1946 г. прамысловымі прадпрыемствамі раёна было выпушчана прадукцыі на 735 тыс. руб. Калектыву арцелі «Прагрэс» на працягу двух кварталаў прысуджаўся пераходны Чырвоны сцяг абкома КПБ і аблвыканкома.

Толькі няпоўныя два гады прайшло пасля заканчэння вайны, а ў раёне за адзін дзень выпускалася 25 пар абутку, 5 тыс. штук цэглы, 150 т мукі, больш за 100 кг сметанковага масла, выпякалася 5 т хлеба.

За гэты тэрмін многае было зроблена і на ніве народнай асветы: працавалі ўсе школы, дзе навучаліся 6411 юнакоў і дзяўчат.

І.І.Гаўрылаў, Т.А.Матусевіч.

На баявую эскадрыллю

З успамінаў Надзеі Сцяпанаўны Пракопчык, былога сакратара Хваставіцкага сельскага Савета

Адразу ж пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мяне выклікалі ў сельсавет і прапанавалі пасаду сакратара. Старшынёй выбралі былога партызана Андрэя Іванавіча Дзядзюлю, чалавека строгага, рашучага, прынцыповага. На першай жа сесіі дэпутатаў першым пунктам запісалі: «Разгарнуць работу сярод насельніцтва па зборы сродкаў у фонд Чырвонай Арміі».

Лёгка сказаць «разгарнуць работу»... А на самай справе патрэбна было пабываць у дзесятках вёсак, бо ў Хваставіцкі сельсавет тады ўваходзілі восем вёсак: Калацічы, Хваставічы, Дасціжэнне, Заполле, Поблін, Кляшчоўка, Мыслоціна, Балашэвічы.

Адказнымі за правядзенне гэтай важнай работы былі старшыня, сакратар сельскага Савета і дэпутат Аксіння Іванаўна Буневіч.

У Глускім аддзяленні Дзяржбанка адкрылі спецыяльны рахунак.

У калгасе «Рассвет», што знаходзіўся ў Хваставічах, работу па зборы сродкаў узначаліў старшыня гаспадаркі Пётр Фёдаравіч Муха. У гэтым калгасе было тады пяць дзядоў, з дзесятак жанчын і падлеткі. Усё і ўсе навідавоку, жылі людзі вельмі цяжка. Таму прымусу не было аніякага: хто колькі мог, столькі і ўносіў у створаны фонд. Старшыня калгаса П.Ф.Муха пералічыў 400 руб., рахункавод калгаса Марыя Радзюкевіч — 220 руб., калгаснікі Есіп Екавец, Ціт Муха, Рыгор Буневіч — па 200 руб.

Сродкі паступалі ў створаны фонд увесь час. Памятаю, з Балашэвіч прыйшоў Сямён Пятровіч Доўбік, цікавіўся, ці можна здаць у фонд збожжа. Яму адказалі, што можна. Праз некалькі дзён калгаснік пералічыў на спецрахунак 220 руб. і ўнёс 80 кілаграмаў збожжа. З в. Поблін Ева Сямёнаўна Трыбуш і Ганна Фёдараўна Шарамет здалі аблігацыі на сумму 300 руб.

У зборы сродкаў прынялі актыўны ўдзел члены ўсіх васьмі гаспадарак. І вось 15 кастрычніка 1944 г. мы падпісалі акт аб прыёме сабраных сродкаў. Па сельскім Савеце калгаснікі ўнеслі грошай — 19 235 руб., аблігацый дзяржаўных пазык на 7900 руб., збожжа — 2648 кг. У аддзяленні Дзяржбанка нам выдалі квітанцыю аб залічэнні сродкаў на рахунак № 350 з запісам: «У фонд Чырвонай Арміі на пабудову эскадрыллі самалётаў «Савецкая Беларусь».

У цяжкі для краіны час сельскія працаўнікі праявілі сябе сапраўднымі патрыётамі, чым маглі, набліжалі доўгачаканы Дзень Перамогі.

Н.С.Пракопчык.

Дакументы сведчаць

А К Т

15 кастрычніка 1944 г.

Комиссия в составе председателя сельского Совета Дедюли Андрея Ивановича, секретаря сельского Совета Буневич Надежды Степановны, депутата сельского Совета Буневич Аксиньи Ивановны составили настоящий акт о следующем:

Нами приняты и проверены подписные листы от колхозов Хвастовичского сельского Совета по внесению средств колхозниками на построение эскадрильи самолетов имени «Советской Белоруссии», а также приняты внесенные средства: деньги и облигации. Подписные листы нами проверены и налично принятые средства полностью соответствуют.

Всего внесено колхозниками по сельскому Совету:

денег — 19 235 (девятнадцать тысяч двести тридцать пять) рублей;

облигаций — 7900 (семь тысяч девятьсот) рублей.

Имеются подписные ведомости на 2648 (две тысячи шестьсот сорок восемь) килограммов зерна.

О чем нами составлен настоящий акт.

Дедюля Андрей

Буневич Надя

Буневич Аксинья (Росписи)

Бабруйскі дзяржаўны занальны архіў. Ф. 2148.

Аднаўленне

З успамінаў Веры Рыгораўны Крупскай, жыхаркі в. Малінава

У час вайны ўсе нашы мужчыны знаходзіліся ў партызанскіх атрадах. У лясах хаваліся ад гітлераўцаў і іх сем'і. Раз'юшаныя фашысты і паліцаі спалілі ўсю нашу вёску, засталася толькі адна хата.

Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў малінаўцы адразу ж прыняліся за будаўніцтва. Рабілі зямлянкі, сякія-такія невялікія пабудовы, хаткі. З жыллём неяк уладкаваліся і адразу ж узяліся за аднаўленне калгаса. Сіл для гэтага ў нас было вельмі мала. У вёсцы засталіся толькі жанчыны, дзеці-падлеткі, чатыры састарэлыя мужчыны, астатнія пайшлі на фронт. Старшынёй калгаса выбралі аднаго з іх — Зміцера Багам'ю. Калгас назвалі па-ранейшаму «Серп і молат».

В.Р.Крупская.

— А ў нас жа ні сярпа, ні молата, — з горыччу гаварылі калгаснікі. І самі ж сябе суцяшалі:

— Нічога, абжывёмся.

Але абжывацца было вельмі цяжка. Успамінаю першую пасляваенную пасяўную. Як падступіцца да зямлі? Некалькі гадоў тут нічога не сеялася, не аралася, удзірванела яна ўся. Паспрабавалі рыдлёўкай капаць. Але ж ці многа асіліш? Дзве соткі за дзень ці крыху больш. А час ідзе. Тады вырашылі, што будзем плугі самі цягаць. Успамінаць той час вельмі цяжка. Глядзіш на поле, а там, у розных месцах, кучкі жанчын, па 9—10 чалавек цягнуць плуг, а адна ідзе ззаду. Няспорная была работа.

Неяк аралі мы ў такой «вупражцы» — я, Альшэўская, Каця Марціновіч, Зоя Марціновіч і іншыя жанчыны, а Валодзя, мой брат-падлетак, быў за аратага. Праязджаў міма нас райваенком Паноў, паглядзеў на нашу невясёлую работу, паківаў галавой, потым напісаў брату запіску аб тым, каб яму выдалі ў Бабірове некалькі коней, што пры наступленні пакінулі нашы часці. Так мой брат Валодзя Грамыка, Леанід Званковіч і Пятро Шчура прыгналі ў калгас 6 коней. Пасля гэтага справы пайшлі крыху весялей.

Пазней за нашым калгасам, каб аказваць дапамогу ў яго аднаўленні, быў замацаваны ўпаўнаважаны райкома партыі кіраўнік Глускага аддзялення Дзяржбанка Аляксандр Фёдаравіч Матусевіч. Нямала зрабіў гэты чалавек, каб хоць крыху паставіць калгас на ногі. Ён дабіўся, каб малінаўцам выдзелілі насенне для сяўбы, якое атрымлівалі са станцый Залессе і Ратміравічы. Прыносілі насенне зноў жа на сабе. Таццяна Басякова, Матруна Грамыка, Арына Касцюкевіч, Зоя Марціновіч, Ефрасіння Шэйка, Дар'я Шчура, Матруна Бурчык, Марыя Грамыка, я і некаторыя іншыя жанчыны хадзілі пехатою за 30 кіламетраў, каб набраць ношку насення. Хто — 10, хто — 15 і больш кілаграмаў, бо ад гэтага залежала колькасць запісаных нам працаднёў.

Памятаю, 9 мая 1945 года група жанчын зноў пайшла на досвітку на станцыю, каб прынесці насенне. Прыйшлі, сталі чакаць, калі нам яго адпусцяць. Раптам пачалася страшная страляніна. Мы перапужаліся, выбеглі са станцыі, бачым, салдаты на чыгуначным палатне салютуюць і крычаць усім:

— Перамога! Канец вайне!

Цяжка апісаць нашы пачуцці, якія перажылі ў тыя хвіліны. Мы абніmаліся, цалаваліся, плакалі... Столькі чакалі гэты дзень, і вось, нарэшце, дачакаліся! Ішлі назад, а ў кожнай вёсцы — мітынгі, навокал бязмежная людская радасць. Прыйшлі дамоў, а тут таксама мітынг. Старшыня калгаса нас абняў, расцалаваў кожную:

— Ну, жанчынкі, хутка вашым і маім пакутам канец.

Калгас рос і мацнеў

З успамінаў Антона Цімафеевіча Патапенкі, жыхара в. Зелянковічы

Мне ніколі не забыць пасляваенных гадоў, калі многія нашы вёскі, калгасныя і грамадскія будынкі ляжалі ў руінах. У 1945 годзе, як толькі я вярнуўся з вайны, мяне абралі старшынёй калгаса. У калгасе ў той час засталося толькі дзве каровы, не было цягла, людзям не было дзе жыць, уся вёска была спалена гітлераўцамі. Здавалася, што ніколі не выйсці нам з той галечы. Аднак, дзякуючы агульным намаганням калгаснікаў, урадавай палітыцы, накіраванай на аказанне ўсямернай дапамогі калгаснаму ладу, наш калгас рос і мацнеў.

Некаторую дапамогу ў тэхніцы мы атрымлівалі ад Рудабельскай МТС. Зямлю так-сяк апрацоўвалі, а ўгнаіць яе не было чым. Не было жывёлы, не было і арганічных угнаенняў. А пра мінеральныя нават не магло быць і гаворкі. Гектар збожжавых даваў тады 3—4 цэнтнеры зерня.

Паступова пачаліся змены, калгас стаў на ногі.

Неадкладныя задачы

За два няпоўныя гады, што прайшлі пасля заканчэння вайны, шмат было зроблена і на ніве народнай асветы: працавалі ўсе школы, у якіх займаліся 6411 вучняў.

У шэрагу першачарговых задач, якія трэба было неадкладна вырашыць у раёне, стаяла ажыццяўленне ўсеагульнага сямігадовага навучання.

А паралельна паўставала таксама пытанне ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. У Глускім раёне праводзіўся ўлік гэтай катэгорыі людзей, арганізоўваліся школы і групы для іх навучання. У рабоце па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва актыўны ўдзел прымалі грамадскія арганізацыі, настаўнікі, культработнікі, урачы, аграномы. У выніку праведзенай работы к канцу 1958 г. у раёне з 487 непісьменных былі абучаны 483 чалавекі.

Згодна з перапісам 1959 г. пісьменнасць насельніцтва ва ўзросце 9—49 гадоў у Беларусі склала 99%, пры гэтым пісьменнасць гарадскога насельніцтва раўнялася 99,1%, а сельскага — 99%. Паспяхова былі вырашаны пытанні ліквідацыі непісьменнасці і ў Глускім раёне.

М.В.Сафонаў.

Жыццё, як паўнаводная рака...

На розных этапах развіцця раёна ў пасляваенныя гады былі ўзлёты і падзенні, шпаркая хада і таптанне на месцы, перамогі і адступленні. За ўсім гэтым стаяць людзі — залаты фонд раёна. Гэта яны пераадолелі ваенную разруху і зрабілі свой край квітнеючым. Зямны паклон ім за здзейсненае. Асаблівай удзячнасці заслугоўваюць кадры кіраўнікоў усіх звенняў, тыя, каму было даручана кіраванне калектывамі, хто нёс на сабе асабліва цяжкі груз адказнасці за ўсё зробленае. І сёння помняць у вёсках тых, хто ў першыя гады пасля вызвалення ўсклаў на свае плечы нялёгкую ношу калгасных клопатаў.

Апанас Мікалаевіч Тоўсцік зноў, як і да вайны, узначаліў у Чыкілях калгас «Чырвоны пуцілавец». Людзі верылі свайму старшыні, таму і даручылі яму кіраваць гаспадаркай. Калі ж былога партызана стала падводзіць здароўе, з 1953 г. застаўся ён намеснікам старшыні калгаса і не адыходзіў ад спраў калектыву да апошніх дзён жыцця.

С.Н.Багам'я.

Старшыні калгаса «Праўда» Р.Л.Зайцаў і Р.С.Лапцеў.

Калгас «Чырвоны востраў», што ў Бабровічах, ужо к канцу першай пасляваеннай пяцігодкі дасягнуў даваеннага ўзроўню па вырошчванні сельгаспрадукцыі. Але больш хуткае развіццё гаспадаркі пачалося, калі старшынёй калгаса пачаў працаваць у 1952 г. былы франтавік Сцяпан Нікіфаравіч Багам'я. Яго энергія, высокія арганізатарскія здольнасці, кампетэнтнасць, памножаныя на добрасумленную працу аднавяскоўцаў, прынеслі выдатныя вынікі. Калгас па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі пачаў займаць адно з першых месцаў у Бабруйскай вобласці, стаў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. С.Н.Багам'я быў неўзабаве ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За 26 гадоў знаходжання ў старшынёўскім корпусе яшчэ не адна ўзнагарода, у тым ліку і другі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, упрыгожыла яго жыццёвы шлях, а людзі давяралі яму пасаду старшыні калгаса аж да самага выхаду на пенсію.

У Мікалая Гаўрылавіча Падаляка стаж кіраўніка гаспадаркі крышачку не дасягнуў да 30 гадоў. А пачаўся ён з пачатку лютага 1949 г., калі былога 25-гадовага франтавіка выбралі старшынёй калгаса «Бальшавіцкая перамога», уся грамадская маёмасць якога складалася з аднаго каня, 13 цялят, некалькіх кароў. Не было ніводнай чаго-небудзь вартай пабудовы. Пазней калгас аб'яднаўся яшчэ з двума, так утварыўся калгас імя Калініна. Шматлікія ўзнагароды яго кіраўніка — яскравае сведчанне таго, якіх рубяжоў дасягнула гаспадарка за мінулыя гады.

Адзін са старэйшых кіраўнікоў-аграрнікаў і Рыгор Сцяпанавіч Лапцеў, які знаходзіўся на пасадзе старшыні калгаса «Праўда» амаль чвэрць стагоддзя. Гаспадарка, якую ён узначальваў, была адной з лепшых у раёне. Спецыяльнай сельскагаспадарчай адукацыі Р.С.Лапцеў не меў, яго галоўны універсітэт — само жыццё. Перадаўшы эстафету дастойнаму пераемніку Рыгору Лукічу Зайцаву, ён амаль 20 гадоў працаваў у роднай гаспадарцы спецыялістам па кадрах.

У памяці рабочых саўгаса «Завалочыцы» захоўваецца прозвішча першага пасляваеннага дырэктара Парфірыя Яфіма-

П.Я.Лупсякоў.

Ф.Ф.Сысой.

У.А.Алёхна.

С.Я.Кандрацьеў.

Т.Н.Раеўская.

Н.К.Захарэвіч.

П.П.Маслаў.

П.М.Юневіч.

віча Лупсякова. Яго жыццё нельга было аддзяліць ад калектыву. Тыя ж бяссонныя ночы, дні адраджэння з руін і папялішчаў. Адкуль толькі сілы браліся? П.Я.Лупсякоў памёр за рабочым сталом. Людзі, уражаныя і яго жыццём, і яго смерцю, пажадалі, каб Парфірый Яфімавіч Лупсякоў быў пахаваны каля канторы саўгаса, побач з брацкай магілай воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі пры вызваленні раёна. Так аднавяскоўцы падкрэслілі роўнасць гераізму ваеннага і мірнага часу.

Крыху пазней саўгасную эстафету ўзяла ў свае рукі Лідзія Кірылаўна Карцель. На той жа дырэктарскай пасадзе аддала гаспадарцы больш як 26 гадоў. Землякі Л.К.Карцель ведаюць, чаго дасягнулі ў саўгасе дзякуючы яе намаганням, бо пры ёй пачалася мэтанакіраваная забудова вёскі,вырашаліся многія сацыяльныя пытанні.

Такая ж багатая гаспадарчая практыка і ў Фаіны Фёдараўны Сысой. Спачатку аграном, затым намеснік старшыні, сакратар партарганізацыі, а потым і старшыня калгаса «Звязда». Пры яе непасрэдным удзеле мянялі аблічча вёскі, багацела калгасная ніва, словам, гаспадарка не займалася «бегам на месцы». І сёння не адышла Ф.Ф.Сысой ад спраў калгаса — яна член праўлення, мае званне заслужанай калгасніцы.

Нельга не адзначыць яшчэ адну з жанчын-кіраўнікоў — такую ж няўрымслівую, смелую ў вырашэнні гаспадарчых спраў. Гэта Таісія Несцераўна Раеўская, якая прайшла шлях ад тэхнолага маслазавода да яго кіраўніка. Дзякуючы яе намаганням прадпрыемства, дзе спачатку ўсе працэсы па вырабе прадукцыі выконваліся ўручную, з уводам у дзеянне новых карпусоў ператварылася ў адно з вядучых у Міністэрстве малочнай прамысловасці рэспублікі. Тут былі створаны ўсе ўмовы для работы і адпачынку працоўных. Прадукцыя завода не залежвалася, паступала ў многія гарады былога Саюза і нават на Кубу. У 1985 г. па выніках рэспубліканскага агляду сыраробчы ўчастак Глускага масласырзавода заняў першае месца, а потым першынство было прысуджана ўся-

Т.К.Міцькова.

А.Р.Палякоў.



А.М.Тычына.

му калектыву, сама ж Т.Н.Раеўская ўзнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Дружбы народаў. Ардэнаносцамі сталі многія перадавікі завода.

Унесла свой уклад у развіццё калгасаў і саўгасаў раёна і Ніна Канстанцінаўна Захарэвіч, якая доўгі час працавала загадчыцай раённай насеннай станцыі. Зараз яна на пенсіі, але і сёння пазайздросціш гэтай жанчыне ў яе напорыстасці, уменні пераадольваць цяжкасці.

Творчым падыходам да вырашэння розных жыццёвых праблем вызначалася работа начальніка райсельгасупраўлення Аляксандра Іларыёнавіча Скараходава, такіх важакоў гаспадарак, як Уладзімір Архіпавіч Алёхна, Іван Фёдаравіч Баглай, Ісай Купрыянавіч Бурынаў, Барыс Іосіфавіч Гелер, Ісак Сідаравіч Грышчанка, Рыгор Лукіч Зайцаў, Сяргей Яўгенавіч Кандрацьеў, Васіль Сцяпанавіч Круцько, Пётр Пятровіч Маслаў, Майсей Міронавіч Урыцкі, Павел Якаўлевіч Цмыг, Віктар Фёдаравіч Юр'еў, а таксама кіраўнікоў прадпрыемстваў — Паўла Міхайлавіча Юневіча, Аляксандра Гаўрылавіча Пастушонка, Івана Сцяпанавіча Долбіка, Мікалая Пятровіча Саўчанкі, Усціна Мікітавіча Шваякова, Лізаветы Адамаўны Яўпак і многіх іншых.

А колькі старанных, сапраўдных рупліўцаў стаяла на кадравай лесвіцы ступенькай ніжэй — працавалі спецыялістамі, брыгадзірамі, загадчыкамі фермаў, звеннявымі! У кожнага была свая вышыня, за якой ішло людское прызнанне, але ўтрымліваць гэту вышыню было куды цяжэй, чым заваяваць. Шмат сіл і энергіі аддалі за тое, каб называцца перадавымі, Тамара Кандратаўна Міцькова, Леанід Іванавіч Хурсан, Леанід Кірылавіч Ахрэмчык, Арсеній Рыгоравіч Палякоў, Надзея Якаўлеўна Радзько, Марыя Мікалаеўна Скубей, Любоў Рыгораўна Храпко, Павел Данілавіч Шарамет, Аркадзь Сяргеевіч Беразун, Анатоль Пятровіч Баярка, Міхаіл Паўлавіч Жураўскі, Пётр Васільевіч Долбік, Мікалай Аляксандравіч Кабановіч, Уладзімір Пятровіч Сыцька, Аляксандр Мітрафанавіч Тычына, Мікалай Аляксандравіч Нікалайчык, Станіслаў Вікенцьевіч Станішэўскі і інш. Усіх нават цяжка пералічыць, і хай мне даруюць, што я не магу зрабіць гэтага.

Ад кожнага чалавека, калі жыццё пражыта не марна, застаецца след на зямлі і ўдзячная людская памяць. Ужо няма ў жывых Рамана Сямёнавіча Палуяна, а многія пабудовы ў раёне, узведзеныя, калі ён быў старшынёй міжкалгасбуда, і сёння напамінаюць аб гэтым чалавеку. А якім цудоўным выхавацелем моладзі быў ён! Колькім даў пуцёўку ў жыццё! Колькіх паставіў на шлях ісціны! Ён ніколі не адмаўляўся ад сустрэч з моладдзю, бо лічыў, што гэта справа іх, былых франтавікоў і партызан, перадаваць маладым той ваенны і жыццёвы вопыт, які набыло старэйшае пакаленне, і толькі ў шчырых размовах з ветэранамі моладзь здабывае такія якасці, як патрыятызм, інтэрнацыяналізм, любоў да роднай зямлі.

Вельмі адказна ставіліся да справы выхавання падрастаючага пакалення і лічылі сваім ганаровым абавязкам удзельнічаць у гэтай рабоце ветэраны вайны Аляксей Пятровіч Астапчук, Фёдар Пятровіч Былінскі, Антаніна Васільеўна Янкоўская, Іосіф Міхайлавіч Кісялёў, Яфім Яўсеевіч Балоцін, Уладзімір Адамавіч

Станкевіч, Марына Іванаўна Храпко, Васіль Аляксеевіч Цэлінаў, Васіль Іосіфавіч Ясючэня, Пётр Філімонавіч Яльніцкі, Аляксандр Яфімавіч Кавалёў і многія іншыя. Сёння гэту справу працягваюць Герой Савецкага Саюза Ульян Аляксандравіч Рыбак, Аляксандр Міхайлавіч Трыфанаў, Цярэнцій Савіч Яльчык, Рыгор Іванавіч Грыневіч, Мікалай Паўлавіч Осін, Васіль Іванавіч і Паліна Іванаўна Бруевічы, Анатоль Аляксандравіч Дубінскі, Яўген Мікалаевіч Гусакоў, Антон Мікалаевіч Каржанеўскі і шмат іншых ветэранаў.

У раёне жыве больш за 8 тысяч пенсіянераў — прыблізна трэцяя частка ад усёй колькасці жыхароў. Прытым гэта тая частка, якая з прычыны сваіх дэмаграфічных асаблівасцей мае тэндэнцыю росту. Колькі сёння праблем у іх жыцці! Але скардзяцца ў рэдкім выпадку. Толькі можна падзівіцца, адкуль яны чэрпаюць сілы — і фізічныя, і духоўныя: шчыруюць на сваіх агародах, вырошчваюць жывёлу, дапамагаюць дзецям, унукам, а многія яшчэ і ў мастацкай самадзейнасці ўдзельнічаюць.

Вялікі ўклад у станаўленне раёна, ажыццяўленне комплексных праграм яго сацыяльна-эканамічнага развіцця ўнеслі ў розныя перыяды жыцця Глушчыны партыйныя, савецкія, камсамольскія работнікі, грамадскія актывісты, дэпутаты. Сярод іх сакратары райкома партыі Васіль Вікенцьевіч Юхнавец, Васіль Іванавіч Варывончык, Васіль Іванавіч Гнядзько, Мікалай Данілавіч Зелянкоў, Леанід Якаўлевіч Сіманаў, Мікалай Аляксандравіч Саўкоў, Яўгенія Барысаўна Разуева, Рыгор Андрэевіч Кірдун, Мікалай Міхайлавіч Шаўчэнка, Юрый Фёдаравіч Былінскі, Тамара Іванаўна Рыбіна, Павел Віктаравіч Яўпак; старшыні райвыканкомаў М.А.Маннікаў, Уладзімір Іосіфавіч Санковіч, Георгій Аляксандравіч Бачароў, Сяргей Яўгенавіч Кандрацьеў; камсамольскія важакі Аляксандр Барысавіч Лабейка,Мікалай Фёдаравіч Капусцін, Аляксандр Апанасавіч Гуло, Любоў Кірылаўна Маркавец, Ніна Якаўлеўна Марусеева, Анатоль Ціханавіч Глаз, Тамара Цімафееўна Мароз і інш. Многа творчых задумак, клопатаў аб далейшым уздыме эканомікі раёна выношваў першы сакратар райкома партыі Леанід Канстанцінавіч Рашатнёў, але трагічная смерць у поўным росквіце сіл не дала магчымасці ажыццявіць гэтыя намеры.

З імем старшыні райвыканкома Яўгена Фёдаравіча Фядорчанкі звязаны адзін з найбольш значных і прыкметных перыядаў у развіцці раёна, калі на першы план была пастаўлена не вытворчая, а сацыяльная сфера жыцця чалавека. Гэтыя пытанні вылучаў у якасці першаступенных у сваёй рабоце і старшыня райвыканкома Віктар Уладзіміравіч Шчэцька. У пачатку 1999 г. ён прызначаны старшынёй Асі-

Свінакомплекс калгаса «Праўда».

Цэх па вытворчасці сыру Глускага масласырзавода.

М.Ц.Марціновіч.

М.І.Свірыдаў.

В.А.Басякова.

І.М.Койпіш.

повіцкага райвыканкома. Пры яго ўдзеле ў апошнія гады прыкметна палепшыліся эстэтычны выгляд населеных пунктаў, вытворчая культура на прамысловых прадпрыемствах. Глускі раён адзін з нямногіх у рэспубліцы, дзе жыллёвае будаўніцтва стала прыярытэтным напрамкам, дзе сацыяльныя праблемы вырашаюцца паслядоўна, мэтанакіравана. У раёне няма ні адной калгаснай ці саўгаснай цэнтральнай сядзібы, да якой бы не вяла асфальтаваная дарога. Ды і да кожнай вёскі, фермы, механізаванага двара ў любую пару года лёгка дабрацца па чорнай асфальтаванай стужцы. Праводзіцца ўдумлівая планамерная работа па эфектыўным выкарыстанні зямлі, вырашаюцца іншыя набалелыя пытанні.

Новы старшыня Глускага райвыканкома Мікалай Пятровіч Дзядзюля працягвае ўзяты курс. Ён значны час працаваў у асобных гаспадарках раёна, быў першым намеснікам старшыні райвыканкома, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання. Праблемы землякоў — яго штодзённы клопат.

Добрая памяць засталася на Глушчыне аб старшынях сельскіх Саветаў: Каткаўскага — Мікалаю Трафімавічу Грабку, Сіманавіцкага — Мікалаю Аляксандравічу Мукамолаву, Хваставіцкага — Якаву Уладзіміравічу Марголіну, Міхаілу Максімавічу Галамаку і іншых; аб сакратарах партыйных арганізацый Івану Майсеевічу Балтушкіну, Васілю Ігнатавічу Галамаку, Мікалаю Іванавічу Кандрусевічу, Міхаілу Цімафеевічу Марціновічу, Міхаілу Іосіфавічу Свірыдаву, Данілу Трафімавічу Слуку і многіх іншых, хто бачыў свой доўг у служэнні людзям.

Гісторыя краіны, як у кроплі расы, адбівалася ў лёсах жыхароў Глушчыны. Усё тое, што ажыццяўлялася на яе прасторах, успрымалася як свая кроўная справа. Калі прагучаў заклік аб асваенні цалінных зямель, многія жыхары раёна горача адгукнуліся на яго. Удзел у асваенні цаліны прынялі трактарыст калгаса «Зара камуны» В.Л.Дзядзюля, загадчык фермы калгаса «Зара» А.Д.Кабернік, шафёр калгаса «Гвардыя» А.І.Фіц і інш. За сваю сумленную працу яны былі ўзнагароджаны медалём «За асваенне цалінных зямель». У 1957 г. дэлегатамі на І Сусветны фестываль моладзі, які праводзіўся ў Маскве, былі пасланы перадавая станочніца прамкамбіната, сакратар камсамольскай арганізацыі прадпрыемства Яўгенія Леанідаўна Сікіржыцкая і малады палявод з калгаса імя Калініна, студэнтка-завочніца Белдзяржуніверсітэта Ната Адамаўна Тарасевіч, якая цесна звязала свой лёс з камсамолам, а ў 1980-я гады працавала дырэктарам Каткаўскай сярэдняй школы, стала выдатнікам народнай асветы СССР. Дарэчы, гэтага гонару ўдастоены таксама Ада Іванаўна Мардусевіч, былы дырэктар глускай СШ № 1, настаўніца Галіна Максімаўна Каранкевіч.

На ўсё жыццё запомніўся 1969 г. перадавой даярцы калгаса «Зара» Вользе Ануфрыеўне Басяковай. Яна прымала ўдзел у рабоце III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў, а ўжо на IV Усесаюзным з'ездзе паўнамоцных прадстаўнікоў калгаснага сялянства, які адбыўся 23—25 сакавіка 1988 г., наш раён прадстаўляла Ірына Міхайлаўна Койпіш, трактарыстка калгаса «Дружба». Згадзіцеся, жанчын-механізатараў сустрэнеце не так ужо і часта. А тут механізатар першага класа, які паста-

янна імкнецца падтрымліваць сваю высокую прафесіянальную рэпутацыю. Гэта, вядома, нялёгка, калі ўсе твае калегі — выключна мужчыны. Але Ірыне Міхайлаўне ўдалося заваяваць сярод іх вялікі аўтарытэт. Сапраўды, мала таго, што на рабоце працуе бездакорна, дык яшчэ і на дамашнім «фронце» паспявае, як-ніяк пяцёра дзяцей, гаспадарка. За сумленную працу І.М.Койпіш узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалём.

Жыццё не стаіць на месцы. Сённяшнюю старонку багатай гісторыі зямлі глускай пішуць прадстаўнікі новых пакаленняў, якія ўзялі ў свае рукі эстафету бацькоў.

Вядучая роля ў гэтым належыць кіруючым работнікам. І гэта сапраўды так. Поспех прыходзіць да руплівых. Сённяшняе пакаленне кіраўнікоў працоўных калектываў дастойна прадстаўляюць старшыні калгасаў «Слаўгарадскі» — Яўген Мікалаевіч Дзем'янкоў, «Гвардыя» — Яўген Фёдаравіч Долбік, «Зара» — Мікалай Іванавіч Капорыкаў, «Зара камуны» — Віктар Андрэевіч Сысой, начальнікі ПМК-249 — Васіль Рыгоравіч Меснік, раёна электрасетак — Уладзімір Іосіфавіч Багарэвіч, дырэктары масласырзавода — Іван Міхайлавіч Глаз, плодаагародніннага — Леанід Фёдаравіч Грашчанкаў, АТ «Райсельгасхімія» — Аляксандр Міхайлавіч Баброўнік, райаграпрамтэхснаба — Аляксандр Мікалаевіч Дайнека, райпаліўзбыта — Аляксандр Пятровіч Кураленя, старшыня райспажыўсаюза Галіна Данілаўна Атлас, дырэктар СШ № 1 Валянціна Мікалаеўна Кураленя, загадчыкі аддзяленняў райбальніцы — Уладзімір Аляксандравіч Цісіневіч і Мальвіна Аўгустаўна Саломка, загадчыца дзіцячага сада № 3 г.п. Глуск Таццяна Сяргееўна Кандрацьева і дзесяткі іншых кіраўнікоў розных рангаў.

Канкрэтнымі здабыткамі вызначаюцца

Я.Ф.Долбік.

М.І.Капорыкаў.

многія радавыя працаўнікі, падабенства якіх у адным — творча падыходзіць да любой справы, даводзіць яе да канца з паспяховым вынікам. Усё часцей на фермы прыходзяць мужчыны і дасягаюць добрых вынікаў. Яўген Гаваройскі, малады даяр з Бабровіцкай фермы калгаса «Зара», у 1998 г. выйшаў у лідэры, надаіўшы ад кожнай каровы па 3911 кг малака. Ладзяцца справы ў жывёлавода Аляксандра Цітавіча Пацалуева і даглядчыка цялят Сяргея Гулевіча з калгаса «Зара камуны». У гаспадарцы склалася дынастыя Гулевічаў — за Сяргеем прыйшоў на ферму брат Віктар, а пасля і сястра Марына, якой даручылі загадваць фермай.

Добрая слава ідзе пра Івана Артуравіча Маркевіча з калгаса «Слаўгарадскі», Міхаіла Паўлавіча Каўхуту з саўгаса «Вільча». Высокія працоўныя набыткі ў механізатараў Алега Малевіча і Аляксандра Багука, у будаўнікоў Мікалая Цярэнцьевіча Васілеўскага і Аляксандра Рыгоравіча Гурына. Сваёй працай яны даказваюць, што поспех прыходзіць не сам па сабе, а толькі да больш настойлівых, адказных і паслядоўных, здольных падпарадкоўваць пастаўленай мэце ўсе свае сілы.

Т.А.Матусевіч.

Дарогу адольвае той, хто ідзе

Аднаўленне і ўзбуйненне калгасаў, іх узрастаючая тэхнічная аснашчанасць плюс самаадданая праца людзей вывелі сельскую гаспадарку раёна на новыя рубяжы. У 1953 г. на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР прымала ўдзел і група перадавікоў з Глушчыны. Гэта былі ў асноўным жывёлаводы з калгасаў імя Мічурына (Клятнянскі сельсавет), імя Сталіна (Хваставіцкі сельсавет), імя Леніна (Сіманавіцкі сельсавет), імя Чкалава (Жалвінецкі сельсавет). Сярод іх даярка А.І.Мар-

ціновіч, цялятніцы В.З.Аксюціна і К.І.Бабіч, свінарка А.П.Буневіч, конюхі П.Ф.Гізун і С.І.Важнік. Сваім вопытам дзяліліся таксама прадстаўнікі земляробчай галіны — брыгадзіры паляводчых брыгад калгаса імя Мічурына П.М.Басякоў, С.Т.Марціновіч, Е.І.Адзінец і механік-камбайнер з Глускай МТС Е.І.Мазалеўскі. Калгасы і саўгасы раёна за перыяд аднаўлення значна павялічылі пасяўныя плошчы, вытворчасць збожжа, бульбы, павысілі культуру земляробства. На фермах сельскія працаўнікі атрымлівалі больш малака і мяса. Узнікла неабходнасць у далейшым развіцці для патрэб сельскай гаспадаркі перапрацоўчых прадпрыемстваў. У 1956 г. у Глуску быў пабудаваны плодаагароднінны завод з некалькімі цэхамі. Расшырыў вытворчыя плошчы маслазавод, што дало магчымасць укараніць на ім механізацыю працаёмкіх тэхналагічных працэсаў.

Амаль адной з першых задач, якія выносіліся на парадак дня ў той час, было ўзнаўленне матэрыяльнай базы народнай адукацыі і культуры. Працавалі 5 сярэдніх, 9 сямігадовых і 39 пачатковых школ, дзіцячы дом, які быў рэфармаваны ў школу-інтэрнат, 3 дашкольныя ўстановы. У многіх школах меліся бібліятэкі. Агульная колькасць вучняў складала каля 7,5 тыс. чалавек. У Глуску ў 1960 г. была адкрыта музычная школа. У кожным з 12 сельскіх Саветаў раёна дзейнічалі хаты-чытальні, а ў райцэнтры — Дом соцкультуры, Дом культуры арцелі «КІМ», 2 бібліятэкі, не лічачы прафсаюзных. У райцэнтры працавала стацыянарная кінаўстаноўка, гледачоў сельскай мясцовасці абслугоўвалі некалькі гукавых кінаперасовак.

Але далейшае гаспадарчае і культурна-асветнае развіццё раёна запаволілася, калі ў канцы снежня 1962 г. было праведзена новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне БССР. Рэарганізацыя закранула і Глускі раён, ён страціў самастойнасць, а яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Бабруйскага раёна.

30 ліпеня 1966 г. раён быў зноў адноўлены, што паслужыла новым штуршком для паляпшэння ўмоў жыцця працоўных раёна, росту іх дабрабыту.

У другой палавіне 1960-х гадоў на Глушчыне пачалося маштабнае наступленне на балоты, якія займалі чацвёртую частку ўсіх зямель. Меліярацыя, праведзеная ў 1920—1930-я гады на невялікіх плошчах, толькі часткова рашыла гэту праблему. На асушаных тарфяніках у першыя пасляваенныя гады вырошчваліся ў асноўным тэхнічныя культуры — каноплі і кок-сагыз. Цяпер жа належала правесці асушэнне велізарных тэрыторый, раскарчаваць сотні гектараў зямель, занятых хмызнякамі і драбналессем. Праводзіла ўпарадкаванне зямель Глускае будаўніча-мантажнае ўпраўленне (БМУ) меліярацыі, якое ўзначальваў І.С.Долбік, заслужаны меліяратар БССР. Людзі і магутная тэхніка ў іх руках — дзесяткі трактароў, экскаватараў, карчавальнікаў, бульдозераў, цяжкіх дыскавых барон і іншых меліярацыйных прылад — павялі бітву з адвечнымі балотамі

Глуская раённая бальніца. 1958 г.

і дрыгвой. Акрамя гэтага, меліяратары ў паўднёва-ўсходняй частцы Глуска ўзводзілі вытворчую базу, пабудавалі некалькі шматкватэрных дамоў, дзіцячы сад, сталовую, магазін. У канцы восьмай пяцігодкі меліяратары асушылі і перадалі гаспадаркам раёна больш як 8 тыс. га тарфянікаў. На гэтых землях хлебаробы вырошчвалі высокія ўраджаі збожжавых, бульбы, агародніны, шматгадовых траў.

Усё далей у мінулае адыходзілі гады ваеннай разрухі. У 1970 г. прамысловыя прадпрыемствы Глушчыны дасягнулі новых поспехаў у вытворчай дзейнасці. Яны за чатыры гады выканалі заданні восьмай пяцігодкі па выпуску валавой прадукцыі.

Прыкметныя змены адбываліся і ў сельскай гаспадарцы. Карэнным чынам мяняўся характар працы: на змену мускульнай сіле чалавека прыходзілі тэхніка і розныя механізмы. Толькі на ўзбраенні сельскіх механізатараў знаходзілася каля 400 трактароў, 236 аўтамабіляў, 97 збожжа- і 58 бульбаўборачных камбайнаў, шмат іншага прычаднога і навяснога інвентару. Гаспадаркі раёна хутка рухаліся па шляху далейшага ўздыму эканомікі і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. У 1970 г. хлебаробы раёна выканалі два планы продажу дзяржаве збожжа і датэрмінова выканалі гадавы план рэалізацыі малака. Укараняліся перадавыя прыёмы працы, вопыт лепшых гаспадарак. Узраслі грашовыя даходы калгасаў: яны склалі амаль 8 млн. руб.

У раёне вызначыліся дасягненні ў развіцці аховы здароўя: працавалі 3 участковыя сельскія і адна раённая бальніцы на 125 месцаў, насельніцтва атрымлівала медыцынскую дапамогу таксама на 18 фельчарска-акушэрскіх пунктах, дзейнічалі супрацьтуберкулёзны дыспансер, 2 урачэбна-лабараторныя ўчасткі, дзіцячая і жаночая кансультацыі, раённая санэпідстанцыя, 3 амбулаторыі.

Усё больш шматгранным станавілася духоўнае жыццё працоўных. Дзейнічалі раённы і два прафсаюзныя дамы культуры, 15 сельскіх і 31 калгасны клуб, 22 чырвоныя куткі, 15 бібліятэк з агульным кніжным фондам больш як 312 тыс. экзэмпляраў. Пастаяннымі чытачамі бібліятэк з'яўляліся каля 20 тыс. чалавек. Аб росце культурных запатрабаванняў працоўных сведчылі і такія факты: многія жыхары раёна стваралі ўласныя бібліятэкі, у дамы глушчан штодзённа прыходзіла каля 30 тыс. экзэмпляраў газет і часопісаў. Вечарамі людзі не заседжваліся дома, а ішлі на агеньчык клубаў, дзе працавалі шматлікія гурткі, дзе можна было паглядзець кінафільм. У раёне працавалі 36 стацыянарных кінаўстановак, больш за 10 з іх дэманстравалі шырокафарматныя стужкі. Усе населеныя пункты былі электра- і радыёфікаваны, мелі трывалыя транспартныя зносіны з райцэнтрам.

Школьная сетка раёна налічвала ў тыя гады 61 школу, ў тым ліку 10 сярэдніх, 16 васьмігадовых, 35 пачатковых. Асобныя з іх перайшлі ў новыя тыпавыя памяшканні. На ніве народнай асветы працавалі 559 настаўнікаў і выхавальнікаў, многія з іх аддалі справе ліквідацыі непісьменнасці ўсё сваё жыццё. Дырэктары Гарадкоўскай, СШ № 1 г.п. Глуска, Зоркаўскай, школы-

Глуская раённая паліклініка. 1958 г.

інтэрната М.К.Гардзіенка, А.В.Паўлава, Н.С.Круцько, І.І.Сысой і загадчык райана Ц.С.Яльчык першымі ў раёне былі ўдастоены ганаровага звання заслужанага настаўніка Беларускай ССР.

Кожная пяцігодка мела свае адметныя рысы. На працягу дзевятай пяцігодкі (1971—1975) у раёне шырокім фронтам вялося капітальнае будаўніцтва: у Глуску былі ўзведзены новы масласырзавод і мэблевая фабрыка, некалькі шматпавярховых дамоў. Мянялі сваё аблічча вёскі. У Макавічах і Клетным вучні пачалі заняткі ў новых тыпавых школах. Гаспадаркі ўпэўнена нарошчвалі вытворчасць сельгаспрадукцыі. Самаадданая праца калгаснікаў і рабочых саўгасаў была адзначана высокай узнагародай — у 1973 г. раён становіцца пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва жывёлаводаў і атрымлівае пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС, ЦК ВЛКСМ. Калектывы калгаса «Дружба», саўгасаў «Глускі» і «Завалочыцы» ўвайшлі ў лік лідэраў гэтага спаборніцтва. Іх узнагародзілі сцягамі Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР, ЦК прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. За праяўленую працоўную доблесць у выкананні прынятых сацабавязацельстваў перадавікі вытворчасці, особныя спецыялісты і кіраўнікі гаспадарак (усяго 50 чалавек) былі ўдастоены розных урадавых узнагарод.

Аднак на фоне працоўных перамог і дасягненняў нельга было не заўважыць, што цяжкасці ў эканоміцы краіны выклікалі многія негатыўныя тэндэнцыі, абвастрылі нявырашаныя пытанні, якія былі характэрнымі і для Глушчыны. Пусцелі вёскі, людзі кідалі гаспадарыць на зямлі і падаваліся ў горад у пошуках лепшага жыцця. Адмоўная дэмаграфічная сітуацыя і іншыя праблемы не маглі не адбіцца на сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ў наступныя гады. І хоць многае рабілася для таго, каб некалькі зняць вастрыню асобных пытанняў, аднак поўнасцю вырашыць іх не ўдалося. Гэта яскрава назіралася ў пазнейшы час. Гаспадаркі раёна, хоць і дасягнулі значнага росту ўсіх відаў прадукцыі, але не выйшлі на рубяжы, намечаныя планамі адзінаццатай пяцігодкі. Было здадзена жылля больш, чым за дзве папярэднія пяцігодкі. Прыкметна змянілася, узрасла культура населеных пунктаў. Іх вуліцы, як і міжгаспадарчыя дарогі ў раёне, былі заасфальтаваны. Цэнтральная сядзіба калгаса «Зара» в. Катка сёння нагадвае сваім абліччам гарадскі пасёлак. Тут у 1983 г. уступіла ў эксплуатацыю новая сярэдняя школа, пабудаваны тыпавы двухпавярховы дзіцячы сад, лазня, гандлёвы цэнтр з рэстаранам, Дом культуры, двухпавярховыя катэджы. Мала чым адрозніваюцца і вёскі Клетнае, Балашэвічы, Завалочыцы, Калацічы, Турыно, Даколь і многія іншыя населеныя пункты.

Інтэнсіўна вялося капітальнае будаўніцтва і ў райцэнтры. У яго паўднёвай частцы вырас новы жылы мікрараён. У гарадскім пасёлку пабудаваны шматпавярховыя дамы з усімі выгодамі, у якіх атрымалі кватэры або палепшылі свае жыллёвыя ўмовы больш як 370 сем'яў. Узводзіліся карпусы новай райбальніцы

Аўтастанцыя ў г.п. Глуск. 1968 г.

з паліклінікай, музычнай школы, ствараласа зона адпачынку з фізкультурна-аздараўленчым комплексам, вялося будаўніцтва аўтабазы, расшырыліся вытворчыя магчымасці камбіната бытавога абслугоўвання. Былі пабудаваны кінатэатр «Арыён», магазіны сельгаспрадуктаў, дзіцячага адзення і культтавараў, універсам, рэстаран і шэраг іншых аб'ектаў. У Глуску ў 1987 г. уступіў у строй дзіцячы сад больш як на 200 месцаў, з яго ўводам у райцэнтры была поўнасцю вырашана праблема ўладкавання дзяцей у дашкольныя ўстановы. Іх у той час імкнуліся пабудаваць амаль ва ўсіх гаспадарках.

Адным з асноўных напрамкаў эканамічнага развіцця раёна з'яўлялася павышэнне жыццёвага ўзроўню працоўных. Аб вырашэнні гэтай адказнай задачы сведчаць такія факты: у 1984 г. насельніцтву раёна прададзена тавараў на 20 299 тыс. рублёў, што значна перавышала паказчыкі мінулай пяцігодкі. За гэты перыяд устаноўлена каля 300 тэлевізараў, 950 новых радыёкропак, газіфікавана больш тысячы кватэр, у вёсках пракладзены водаправод. Узраслі ўклады насельніцтва ў ашчадныя касы, і ў пачатку 1985 г. яны дасягнулі звыш 26 млн. руб. У асабістым карыстанні грамадзян раёна знаходзілася 570 легкавых аўтамабіляў, 1600 матацыклаў.

Ва ўсіх працоўных калектывах былі створаны спартыўныя арганізацыі, якія аб'ядналі ў сваіх радах каля 3 тыс. аматараў фізкультуры і спорту.

Час залячыў раны мінулай вайны. Ён для жыхароў Глушчыны быў нялёгкім. Многія з іх увайшлі ў гісторыю раёна, праславіўшыся самаадданай працай. Далёка за межамі Глушчыны стала вядома пра выдатныя працоўныя дасягненні звеннявых Надзеі Кірылаўны Рудніцкай, Аляксандры Аляксандраўны Шаплыка і меліяратара Васіля Іванавіча Барысіка. Яны праславіліся рэкорднымі ўраджаямі і добрасумленнай працай, за што ім было прысвоена званне Герояў Сацыялістычнай Працы.

Усё сваё жыццё звязала з жывёлагадоўляй Марыя Мікалаеўна Скубей. Яе працоўнай прыстанню стаў саўгас «Завалочыцы». Падзякі, прэміі неаднаразова атрымлівала яна ад дырэкцыі за сваю старанную працу. А потым яе ўзнагародзілі ордэнам Леніна. Следам за сваёй настаўніцай атрымала ордэн Леніна і лепшая саўгасная даярка Наталля Канстанцінаўна Невяроўская, якая адной з першых у раёне пераадолела 3-тысячны рубеж па надоях малака ад каровы. Такой жа ўзнагародай была адзначана і праца старэйшай даяркі з калгаса «Радзіма» Марыі Ільінічны Ляпко.

Глуская зямля надзвычай шчодрая на таленты, на людзей творчай стрункі, у якіх,

Перадавыя даяркі раёна. 1991 г.

як кажуць, дар Божы. У гэтай кагорце — пісьменнікі і мастакі, артысты і кампазітары, прадстаўнікі розных кірункаў у навуцы. Дзе б яны цяпер ні жылі, яны памятаюць, што Глушчына — іх радзіма, памятаюць і не парываюць з ёй сувязей.

У працоўных буднях ад старэйшых да малодшых жывой эстафетай перадаюцца лепшыя традыцыі, яны як невычэрпная крыніца, што жывіць сабой усё наваколле. Таму так цесна пераплялося ў жыцці працоўных раёна мінулае і сучаснае, спадчына нашых продкаў і набыткі іх нашчадкаў. Аднолькава цікава і займальна з удзелам шырокай грамадскасці праходзяць на Глушчыне святы Масленіца, Купалле, Дажынкі, дзе захоўваюцца багатыя народныя традыцыі, і святы, народжаныя сучасным жыццём, што ўшаноўваюць чалавека працы, яго поспехі і здабыткі. Якое б мерапрыемства ні праводзілася — злёты перадавікоў народнай гаспадаркі, сустрэчы з ветэранамі вайны, фестывалі мастацкай самадзейнасці, творчыя сустрэчы з вядомымі землякамі і г.д., — яно заўсёды напоўнена моцным выхаваўчым эфектам, які пакідае свой адметны след у жыцці людзей.

Асаблівая павага да тых, хто не шкадуючы свайго жыцця адстойваў свабоду, гонар і незалежнасць Радзімы. Святкаванне Дня Перамогі, Дня вызвалення — гэта заўсёды хвалюючая і незабыўная падзея не толькі для ветэранаў вайны, але і для ўсіх жыхароў Глушчыны, якія бясконца ўдзячны былым салдатам і партызанам за велічны подзвіг, здзейснены ў гады вайны. Шчырым прызнаннем іх велізарных заслуг, памяццю аб гераічным мінулым з'яўляецца той факт, што асобныя вуліцы гарадскога пасёлка названы імёнамі добра вядомых у раёне людзей, ім прысвоена званне ганаровых грамадзян Глуска. Такія адносіны да гераічных традыцый народа ўзбагачаюць духоўнае жыццё жыхароў раёна, станоўча ўплываюць на выхаванне ў моладзі высокіх маральных якасцей.

Складаныя працэсы, якія назіраліся ў гады перабудовы эканомікі і грамадскага жыцця ў краіне, закранулі і Глушчыну. Пасля прыняцця ў Беларусі Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў раёне пачалося адраджэнне духоўнага жыцця, новы змест набывала работа выхаваўчых і культурных устаноў. Вяртанне да гістарычнага мінулага беларускай дзяржавы, яе мовы і культуры дало магчымасць не толькі вучням школ, але і дарослым глыбей зразумець гэтыя працэсы, выхоўваць пачуцці гонару і павагі да свайго народа і яго здзяйсненняў. Аднак станаўленне рэальнага суверэнітэту нашай рэспублікі аказалася працэсам даволі складаным. Разрыў сувязей з іншымі рэгіёнамі былога Саюза, пе-

Святкаванне Дня Перамогі ў г.п. Глуск. 1988 г.

Сустрэча партызан 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі. 1994 г.

раход да рыначных адносін балюча ўдарылі і па эканоміцы Глускага раёна, дзе таксама сталі відавочнымі крызісныя з'явы. Многія прамысловыя прадпрыемствы не маглі працаваць з поўнай нагрузкай, у выніку чаго людзі страчвалі работу, перасталі рэгулярна атрымліваць зарплату. Рэзка ўпала гандлёвае забеспячэнне тавамі першай неабходнасці. Былі ўведзены картачкі на набыццё гэтых тавараў. Але найбольшыя выпрабаванні выпалі на долю сельскай гаспадаркі. Рэзкае скарачэнне паставак матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, інвестыцый сялу адыгралі сваю адмоўную ролю. Паказчыкі развіцця гэтай галіны народнай гаспадаркі ў пачатку 1990-х гадоў па многіх пазіцыях вярнуліся да ўзроўню 20 — 25-гадовай даўнасці. І гэта, зразумела, адбывалася не таму, што людзі сталі горш працаваць. Яны не страцілі працавітасці, адданасці выбранай справе, нялёгкаму вясковаму жыццю і не гублялі веры ў тое, што яно зноў наладзіцца.

1992 г. быў адным з самых нялёгкіх. Моцная засуха ў дадатак да іншых негатыўных з'яў стварыла крайне неспрыяльныя ўмовы для развіцця калгасаў і саўгасаў. Але своечасова прынятыя кіраўніцтвам раёна меры дазволілі прыпыніць рэзкае зніжэнне вытворчасці прадукцыі палёў і фермаў. Калгасы і саўгасы раёна паспяхова справіліся з выкананнем дзяржаўных заказаў па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі.

Летам таго ж года згарэлі дзве глускія вёскі — Калюга і Сельцы. Аднак намаган-

Будаўніцтва новага мікраёна ў Глуску.

нямі людзей яны хутка адрадзіліся і пачалі сваё жыццё ў новым вымярэнні.

Хоць са збоямі, але раён жыў, працаваў, развіваўся. У гэтыя гады працягвалася жыллёвае будаўніцтва. За грашовыя сродкі жыллёва-будаўнічага кааператыва былі ўзведзены тры дамы на 70, 30 і 80 кватэр. У райцэнтры будавалася яшчэ адна — трэцяя па ліку — сярэдняя школа з плавальным басейнам, праведзена рэканструкцыя плодаагародніннага завода. Хоць і не ў поўным маштабе, аднак выдзяляліся сродкі на падтрымку аховы здароўя, адукацыі, культуры.

Пасля 26 красавіка 1986 г. адлік часу для многіх беларусаў пачаўся па-новаму. Жыхарам Глушчыны пашанцавала: тэрыторыя раёна аказалася чыстай, не забруджанай радыенуклідамі. Таму і з'явіўся ў раёне калгас, пераселены са Слаўгарадчыны на глускую зямлю разам з яго людзьмі і ўсёй маёмасцю, што належала гаспадарцы. Так нарадзіўся калгас «Слаўгарадскі», які размясціўся побач з калгасам імя Чапаева. Шмат жылля для перасяленцаў з забруджанай зоны за мінулыя гады было пабудавана ў саўгасе «Завалочыцы».

У раёне праводзіцца вялікая работа па ажыццяўленні зямельнай рэформы. Па стане на 1 студзеня 1998 г. створана 30 фермерскіх гаспадарак, у карыстанні якіх знаходзяцца 654 га зямлі. Акрамя таго, расшырылі да 1 га свае прысядзібныя ўчасткі многія жыхары сельскай мясцовасці, набылі зямлю ў прыватную ўласнасць звыш адной тысячы чалавек. Ідзе раздзяржаўленне маёмасці, развіваецца прадпрымальніцтва. На масласырзаводзе і ў райсельгасхіміі створаны акцыянерныя таварыствы. Рыначныя адносіны ўсё больш інтэнсіўна пранікаюць у эканоміку раёна, паступова становяцца прывычнай з'явай жыцця. Дарогу адольвае той, хто ідзе.

Т.А.Матусевіч.

У нафтавым патоку Беларусі — і глускі ручаёк

У 1970—1980-я гады ў розных мясцінах на Глушчыне геолагі шукалі адказ на пытанне: ці ёсць тут нафта. Многія спецыфічныя прыкметы гаварылі аб тым, што гэтыя прагнозы небеспадстаўныя. Сапраўды, спадзяванні разведчыкаў зямных нетраў хутка апраўдаліся: Глушчына аказалася ў ліку шчасліўчыкаў, дзе ёсць запа-

Нафтавая свідравіна каля в. Бабровічы.

сы «чорнага золата». Яны выяўлены ў некалькіх месцах, дзе адразу ж пачалася прамысловая здабыча нафты. На тэрыторыі Каткаўскага сельсавета каля дзесяці гадоў таму было адкрыта першае нафтавае радовішча — Барысаўскае. Зараз тут дзейнічаюць тры свідравіны, адна з іх побач з в. Бабровічы. Адсюль на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод у суткі паступае каля 120 кубаметраў нафты. У 1998 г. геолагі зноў парадавалі глушчан добрай навіной. Мазырская геолагаразведвальная экспедыцыя адкрыла на тэрыторыі Слаўкавіцкага сельсавета, суседняга з Каткаўскім, новае радовішча — Драздоўскае, у якім здабыча нафты вядзецца з чатырох свідравін. Сёлета да іх далучылася яшчэ адна. У нафтавым патоку Беларусі шырыцца і глускі ручаёк.

Пасланне ў XXI стагоддзе

З успамінаў Мікалая Васільевіча Мельнікава, жыхара г.п. Глуск

На шматпакутнай глускай зямлі ёсць нямала сімвалаў, звязаных з рознымі гістарычнымі падзеямі яе мінуўшчыны і сучаснасці. Адзін з іх — помнік Воінскай Славы, узведзены ў гонар 30-годдзя вызвалення Глушчыны ад гітлераўскіх захопнікаў. У дзень адкрыцця ў нішы яго п'едэстала была замуравана капсула з тэкстам «Запавета нашчадкам».

Мне, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны, кавалеру ордэнаў Вялікай Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, удзельніку баёў за Берлін, выпаў гонар зрабіць гэта. Памятаю словы «Запавета нашчадкам», які будзе ўскрыты 30 чэрвеня 2044 года ў дзень 100-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аб чым жа ідзе размова ў пасланні ў XXI стагоддзе? «Гэтым урачыстым актам мы аддаём належнае тым, хто ў жорсткіх баях адстаяў гонар і свабоду сваёй Радзімы, хто мужна змагаўся з каварным ворагам, хто ў імя Перамогі бясстрашна ішоў на ратны подзвіг. Хай помнік, узведзены ў гонар тых, хто загінуў на полі бою, хто быў замучаны і расстраляны ў фашысцкіх засценках, заўсёды нагадвае вам, нашым нашчадкам, аб велічы і славе подзвігу воінаў і партызан — волатаў XX стагоддзя. Мы хочам, каб іх імёны засталіся навечна ў вашых сэрцах...»

У «Запавеце нашчадкам» расказана, як самааддана і мужна людзі ўзнімалі з руін і папялішчаў сваю краіну, як непазнавальна змяніла сваё аблічча беларуская зямля, а яе маленькая часцінка — наш глускі край стаў квітнеючым. «Мазолістыя рукі палескіх людзей не толькі адрадзілі ўсё, што было знішчана фашысцкімі акупантамі, але стварылі новыя гарады, сёлы, пабудавалі такія заводы, прадукцыю якіх ведаюць амаль ва ўсім свеце».

У дакуменце названа невычарпальная крыніца сілы народа: гэта перамога ідэалаў свабоды, братэрства, дружбы народаў, якія насялялі вялікую краіну — Савецкі Саюз.

Мы завяшчалі нашым нашчадкам берагчы мір, любіць сваю Бацькаўшчыну, працу, упрыгожваць зямлю садамі і нівамі, будаваць на ёй гарады, храмы навукі і мастацтва, памятаць герояў, загінуўшых дзеля свабоды і шчасця новых пакаленняў.

Апошнія пражытыя гады ўжо не ў поўнай меры адпавядаюць той сітуацыі, пра якую гаворыцца ў «Запавеце нашчадкам». Не стала Савецкага Саюза, не так заможна і шчасліва жыве наш беларускі народ, ды і мы, глушчане. Гэта выклікае боль у сэрцы, бо за шчасце людское заплачана вельмі дарагой цаной — загінуў кожны чацвёрты беларус. І такія ахвяры не могуць быць марнымі.

Я ведаю: пройдзе час і праз прызму гадоў будуць добра бачны нашы памылкі і правільныя рашэнні. Чаго будзе больш, меркаваць вам. Але што б ні здарылася, вечнымі каштоўнасцямі на зямлі застануцца Мужнасць, Патрыятызм, Сяброўства, Дабрыня, Любоў, якія для кожнага чалавека павінны быць пуцяводнай зоркай на яго жыццёвым шляху.

Мы сумленна імкнуліся рабіць усё дзеля дабрабыту нашай любай Беларусі, яе незалежнасці і росквіту. Любіце і беражыце яе так, як гэта рабілі мы. Не забывайце сваёй Бацькаўшчыны, сваёй годнасці, свайго народа.

Спорт — у працы памочнік

Вялікая ўвага ў раёне надаецца развіццю спорту і фізічнаму выхаванню працоўных. У 1950—1960-х гадах асноўнай спортпляцоўкай была вуліца. Стадыёнаў не было, школы мелі невялікія класы, абсталяваныя 2—3 наборамі спартыўных снарадаў плюс турнік і некалькі лесвіц у школьным двары. Спортінвентару зусім не густа, усё трымалася на энтузіязме выкладчыкаў фізкультуры і жаданні падлеткаў бегаць, скакаць, гуляць з мячом...

І толькі праз пэўны час сітуацыя паступова пачала змяняцца. З прыходам у школы выпускнікоў інстытута фізкультуры І.А.Малюкевіча, В.С.Доўгага, Ю.Ф.Былінскага папулярнымі становяцца баскетбол, лёгкая атлетыка, штанга... Прыходзяць і першыя поспехі на абласных, а зрэдку і на рэспубліканскіх спаборніцтвах. Асабліва ў штангістаў, дзе падрыхтавана некалькі майстроў і кандыдатаў у майстры спорту.

Яшчэ больш паспяховы ў гэтым плане сённяшні дзень, калі створана добрая спартыўная база для таго, каб фізкультурай і спортам мог займацца кожны, хто жадае. Патэнцыяльныя магчымасці для гэтага ёсць: у раёне працуюць 10 спартзалаў, 4 прыстасаваныя памяшканні, стралковы цір, стадыён, 13 футбольных і мноства іншых пляцовак. А які цудоўны плавальны басейн здадзены ў Глуску ў эксплуатацыю! Ён стаў адным з любімых месцаў для пасялковай дзетвары.

Спартыўную работу вядуць каля чатырох дзесяткаў спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Усё разам узятае дае добрыя вынікі. Так, у 1996—1997 гг. 5 выхаванцаў спартыўных камандаў раёна вучыліся ў школах алімпійскага рэзерву. Жыхарка Глуска Алена Іваненка — майстар спорту і сярэбраны прызёр чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы. А Сяргей Бахановіч у той жа дысцыпліне выйшаў на ўзровень першага разраду і лічыцца перспектыўным спартсменам. Бронзавым прызёрам рэспубліканскага першынства сярод юнакоў быў цяжкаатлет Сяргей Калыбін, а чэмпіёнам у гэтым жа відзе спорту стаў наш зямляк Васіль Лазовік, які даказаў, што ён мацнейшы ў рэспубліцы сярод моладзі. Вялікія надзеі ў Магілёўскім вучылішчы алімпійскага рэзерву ўскладаюцца на Багдана Кісялевіча, магчымасці якога ацэньваюцца як вельмі перспектыўныя. У свой час нямала спартсменаў выступала з нашага раёна ў складзе абласных і рэспубліканскіх камандаў па гандболе. Цяпер іх дастойна прадстаўляе ў зборнай Беларусі наш зямляк Уладзімір Гольдзін, які паспяхова іграў у замежных камандах.

Але вялікі спорт — доля таленавітых адзіночак. Таму ў раёне добра разумеюць сутнасць праблемы. Яна заключаецца не столькі ў дасягненні колькі-небудзь прыкметных поспехаў, як у аздараўленні людзей наогул, каб даць магчымасць весці больш змястоўны, здаровы лад жыцця. У гэтым напрамку і вядзецца асноўная работа.

Н.Б.Сандамірскі.

Гарачае лета 1992 года

Трагедыя вёсак Калюга і Сельцы

Небывалая засуха летам 1992 г. нанесла вялікія страты народнай гаспадарцы рэспублікі. Агонь знішчыў тысячы гектараў лесу, сенажацей і выпасаў. Не абмінула бяда і наш раён.

11 жніўня, прыкладна пасля гадзіны дня, загарэліся вёскі Калюга і Сельцы Калаціцкага сельсавета. Гарэлі дамы, прыбудовы, хлявы, стагі і хатняя жывёла. Літаральна за паўгадзіны агонь знішчыў 32 дамы ў Калюзе і 12 у Сельцах. У агні загінулі дзве жанчыны-пенсіянеркі. А вакол гарэлі лясы, тарфянікі, жытнёвыя палі.

На барацьбу са стыхіяй былі кінуты ўсе сілы — пажарныя, тэхніка і людзі з калгасаў і саўгасаў, прадпрыемстваў і арганізацый раёна. Агульнымі намаганнямі стыхія была ўтаймавана і не дапушчана пагроза знішчэння навакольных вёсак Макавічы, Юзафова, Паляна, Гарадок, Дварэц.

Трагедыя пагарэльцаў ускалыхнула ўсю рэспубліку. На наступны дзень выканком раённага Савета прыняў шэраг мер па аказанні дапамогі жыхарам вёсак Калюга і Сельцы, якія пацярпелі ў час пажару.

Было арганізавана рассяленне людзей

В.Ф.Кебіч у час сустрэчы з жыхарамі вёсак Калюга і Сельцы.

па гаспадарках раёна, дзе ў той час мелася свабоднае жыллё. Аддзел народнай адукацыі райвыканкома ўзяў на сябе клопаты аб бясплатным забеспячэнні пагарэльцаў ложкамі і пасцельнымі прыналежнасцямі. Пацярпеўшым была аказана грашовая дапамога для набыцця неабходных тавараў і выплачаны кожнаму сярэднямесячны заработак за жнівень. У аграпрамбанку быў адкрыты спецыяльны рахунак па зборы сродкаў у дапамогу пагарэльцам.

28 жніўня на месцы трагедыі прызямліўся верталёт з прадстаўнічай урадавай дэлегацыяй, якую ўзначальваў старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Францавіч Кебіч. Пасля азнаямлення з сітуацыяй было прынята рашэнне аб адраджэнні спаленых вёсак Калюга і Сельцы ўжо да маразоў з тым, каб забяспечыць кожную пацярпеўшую сям'ю добраўпарадкаваным катэджам.

У першыя дні верасня, пасля расчысткі пагарэлішча брыгадай грамадзянскай абароны, у вёсках Калюга і Сельцы пачалі работу будаўнікі 25 будаўнічых арганізацый амаль з усіх раёнаў Магілёўскай вобласці, а таксама з Салігорска і Светлагорска і каля 70 адзінак тэхнікі. За тры месяцы ім трэба было пабудаваць 40 дамоў сядзібнага тыпу, ФАП, лазню, магазін, правесці электралінію, водаправод і іншыя камунікацыі. Агульнае кіраўніцтва будоўляй ажыццяўляла ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Глускага райвыканкома.

Будаўнікі зрабілі сваю справу — у сярэдзіне лістапада 40 дамоў былі здадзены пад ключ, а іх гаспадары пачалі спраўляць навасэлле.

Аб жудаснай трагедыі беларускіх вёсак і ўсенароднай падтрымцы пацярпеўшых напамінае мемарыяльная дошка, устаноўленая перад в. Калюга. На ёй высечаны словы: «Вёска Калюга загінула ў агні пажару 11 жніўня 1992 года. Воляй беларускага народа яна паўстала з папялішча ў новым, яшчэ лепшым абліччы. Урад рэспублікі, будаўнікі з многіх рэгіёнаў і гарадоў Беларусі ўзвялі гэты пасёлак за два месяцы. Жывіце, людзі, у міры і згодзе. Шчасця вам на доўгія гады!»

С.Ф.Анташкевіч.

Гэта рана баліць і баліць

Пасля 26 красавіка 1986 г. адлік часу для многіх беларусаў пачаўся па-новаму, бо гэта дата як бы падзяліла наша жыццё на два адрэзкі — «да» і «пасля» Чарнобыля.

Нам, глушчанам, пашанцавала: тэрыторыя раёна аказалася чыстай, не забруджанай радыенуклідамі. Мы можам хадзіць у лес па грыбы і ягады, ужываць без боязі іншыя прадукты харчавання, садавіну і

Я.М.Дзем'янкоў.

агародніну, не думаючы, што яны могуць стаць свайго роду атрутай.

А ёсць жа мясціны, цэлыя раёны, вёскі, дзе людзям жыць немагчыма, адкуль трэба выязджаць... І панесла, закруціла чарнобыльская бяда тысячы нашых суайчыннікаў, вырвала іх з даўно абжытых, родных куткоў, параскідала па розных мясцінах. Вось так апынуўся ў нашым раёне цэлы калгас, пераселены са Слаўгарадчыны разам з яго людзьмі і ўсёй маёмасцю, што належала гаспадарцы.

Пераехалі. З болем, з гарачымі слязамі пакідалі родную зямлю, таму што нябачная воку радыяцыя стала смяротнай пагрозай для іх. На землях калгаса былі ўчасткі, дзе яе ўзровень складаў 5 рэнтген у гадзіну. Дастаткова папрацаваць тут восем гадзін, каб атрымаць гранічную дозу апраменьвання. І вось слаўгарадчане пусцілі карані на глускай зямлі. А каб не забыліся, адкуль яны родам, дзе ляжаць іх продкі і адкуль ідзе радаслоўная, новаму калгасу далі назву «Слаўгарадскі». Я гутару са старшынёй калгаса Яўгенам Мікалаевічам Дзем'янковым.

— *Евгений Николаевич, что пережили, когда узнали о чернобыльской беде?*

— А сначала ничего и не знали. Средства информации в то время всячески замалчивали истинное положение и размеры постигшей нас катастрофы, ее влияние на нашу жизнь. Почувствовали неладное, когда начали пригонять армейскую технику и солдат для проведения в населенных пунктах и на колхозных землях дезактивации. Своей техникой проводили известкование почв. Этот метод в первое время практиковался повсеместно якобы для «удержания» на месте радионуклидов. Запретили засевать приусадебные участки, начали всем нам платить двойные оклады, в магазинах, как в столичных, всего вдоволь. Вот тогда стало доходить, что просто так, за здорово живешь, власть на такие меры не пойдет. Люди стали волноваться, требовать разъяснений, чтобы знать, что ожидает каждого, его детей, семью. Стали группами приезжать ученые, проводить с нами встречи, рассказывать, что к чему. И все же определенности не было никакой: можно жить здесь в таких условиях или же нет. Утверждали, что можно. Но ходили глухие слухи о том, что московские ученые приезжали на загрязненные территории с полным запасом своих харчей. Что больше десяти дней никто здесь не задерживался. Местную пищу старались не употреблять. Вот и решай, как быть. Знали мы из школьных учебников о последствиях взрыва атомных бомб, сброшенных во время войны на Хиросиму и Нагасаки. Но у нас все было по-другому, ни взрывов, ни разрушений, все мирно, тихо и спокойно. Так же светило солнце, зеленела трава. И разум не воспринимал, что эта земля таит для каждого из нас недобрую силу. Не хотелось в это верить. А может, и нет никакой опасности? Немного погодя, в центре колхоза, в деревне Кульшичи, развернулось небывалое дотоле строительство, рос поселок на 25 домов. Дом культуры на загляденье, заасфальтировали все дороги, начали проектирование новых производственных помещений. Но уже в то время, когда шло это строительство, народ кое-что стал понимать и начал потихоньку разъезжаться. Вижу, такое дело — поехал к первому секретарю райкома партии. Для кого строим? Ведь людей не обманешь... Рассказываю ему, что народ все равно не удержать на месте, давайте, дескать, этот поселок построим в самом Славгороде. За свою «инициативу» чуть не поплатился. Тогда разные ярлыки быстро навешивали: ты и дезертир, и смалодушничал, и Бог знает что еще. Чуть ли не врагом посчитали.

— *А как хозяйственные дела шли? Ведь продукция производилась на загрязненной территории.*

— Производство пришлось свертывать, молоко все время шло с большим содержанием радионуклидов. Стали выращивать скот на мясо. Результат тот же — мясо непригодное к употреблению. Нашу про-

дукцию не хотели принимать. Снизили в хозяйстве поголовье скота. Пришлось урезать площади под всеми культурами и переключиться на семеноводство трав. Становилось ясно, что в таких условиях невозможно ни жить, ни работать. Встал вопрос о переселении.

— *Евгений Николаевич, почему выбор пал именно на Глусский район?*

— Нам было предложено несколько вариантов, считалось, наиболее выгодных: Горки, Шклов, Круглое. Ездили, смотрели и все что-то не устраивало. Побывали в Глуске. А время идет. И решили: хватит ездить, выбирать. Надо определяться. В Заелице для нас стали интенсивно строить поселок. Хорошо, что к этому времени еще не вырезали весь скот. В колхозы имени Кирова, имени Чапаева передали в то время в аренду 100 голов телок. Дойное стадо в основном удалось сохранить, от него предстояло расширить животноводство на новом месте. В 1990 г. нам уже было известно, что к следующей зиме 90 домиков поселка будут готовыми. В первую очередь решили переселить на новое место все молодые семьи с детьми. Весь 1991 г. уже работали на два фронта: и в Заелице, и в Кульшичах. Весной забрали с собой механизаторов-холостяков и поехали готовить общежитие (пока только оно было построено), чтобы проводить первую посевную на глусской земле. Одновременно еще сеяли кое-что и на Славгородчине. Поэтому все лето и весну работали вахтовым методом: комплектовали группы, каждая из которых, отработав неделю — другую в Глуске, возвращалась в Славгород. В основном уже все специалисты были задействованы на новом месте. В первую очередь строили жилье, три сараяклюшечника для скота. Мастерских не было. Кругом голое поле. Ремонты техники проводили под открытым небом: это что касается простейших неполадок. Более сложные поломки устраняли в мастерских наших соседей, а то и в «Райсельхозтехнике». Чтобы ускорить переезд и в зимнее время не разморозить отопление в квартирах, обучали все мужское население профессии кочегара. И к зиме перевезли первые 90 семей. Вот так началось заселение поселка. Поселок строится за счет средств Госкомчернобыля и предназначен для переселенцев из загрязненной зоны. Поэтому было категорически запрещено выделять квартиры посторонним лицам. Но мы столкнулись с такой проблемой, что пришлось идти на нарушение этого запрета: почти два года оставались незаселенными около 60 квартир. На протяжении этого срока осуществлялся настоящий их грабеж: снимались окна, сантехника, взрывались полы и т.д. Поэтому райисполком принял решение о том, чтобы разрешить колхозу выделять пустующее жилье другим работникам, которые в дальнейшем могли связать свою судьбу с нашим колхозом или деревней Заелица. 39 квартир — это индивидуальные дома, их государство прекратило финансировать, когда увидели, что нет желающих для переселения в здешние места. И они были переданы колхозу в недостроенном виде. Нам пришлось изыскивать средства, чтобы окончить это строительство.

— *В каком же состоянии сейчас поселок? Какие объекты уже введены в эксплуатацию, а что еще нет?*

— Полностью окончено строительство жилья — это 290 квартир, и все они заселены. По соцкультбыту следующая картина: функционируют детский сад, школа, готовится к сдаче в этом году больничный корпус. А вот строительство торгового центра заморозили и нет каких-либо перспектив для его окончания. Дом культуры, который нужен нам как воздух, в комплексе с административным зданием «зарезали». В прошлом году сдан животноводческий городок из 7 сараев-клюшечников, уже работает зернокомплекс. Правда, две сушилки строили собственными силами. К счастью, в то время еще были кое-какие денежные средства. Учитывая, что поселок и другие хозяйственные объекты сдавались по мере готовности, по частям, не удалось все стыковать и свести воедино: местами не выполнено благоустройство, не окончен еще и стадион. Таким образом, не доведен до полной готовности весь облик поселка, его вид.

— *Как обстоят дела в хозяйстве сейчас? На какие параметры удалось выйти?*

— За колхозом закреплено 1800 гектаров сельхозугодий и 834 гектара пашни. Земли нам явно не хватает. Отдаем еще населению под приусадебные участки и пастбища порядка 250 гектаров. В связи с недостатком земли нам ни в одном году

не удалось создать прочную кормовую базу, что особенно отразилось на ходе зимовки в текущем году.

Естественно, какой бы скот ни был — породистый или нет, его нужно хорошо кормить. Поэтому главное внимание будет уделяться кормовой базе. Возвращаемся к испытанной культуре — кукурузе, ее посевы расширяем вдвое, т.е. до 100 гектаров. Без корнеплодов нечего надеяться на высокие надои. Значит, под эти культуры тоже нужно отвести площади, как и тем же бобовым, даже в ущерб зерновым. Займемся по-хозяйски лугами и пастбищами: дадим сюда часть удобрений.

За счет улучшения кормовой базы надеемся увеличить производство мяса на 20 процентов и довести его до 120 тонн. В растениеводстве планируем получить урожайность зерновых по 25—30 центнеров: это при условии, что обещанные государством удобрения до нас дойдут.

— *У вас, говорят, есть неплохие наработки по овощам?*

— Да, это так. Моркови, к примеру, в прошлом году вырастили 400 тонн. Наша продукция нашла своего потребителя далеко за пределами района — в Минске, Бобруйске. Ею обеспечили многие рестораны, воинские части. Это культура, которая дает нашему хозяйству хорошую финансовую подпитку. Расширяем также посевы столовой свеклы.

— *Что еще помогает пополнять колхозную кассу?*

— Неплохо идет торговля. Мы открыли два колхозных магазина: один в Глуске, другой — в Заелице. Они дают в месяц до 150 миллионов рублей товарооборота. Торговля — дело выгодное, поэтому оканчиваем ремонт и берем в аренду помещение в Бобруйске, чтобы здесь открыть еще один магазин.

Отказываемся от традиционной переработки молока и мяса через маслосырзавод и мясокомбинат и думаем организовать ее на месте, в двух колхозных цехах. Сейчас идет наладка оборудования. Будем выпускать масло расфасованным в небольшие пачки, а также колбасные изделия.

Конечно же, пошли на такой шаг не от хорошей жизни. Переработчики дерут сегодня с колхозов семь шкур. К этому следует добавить, что и мясокомбинат, и маслосырзавод нерегулярно рассчитываются за сданную продукцию. Вот такое «раздевание» аграриев и заставило нас заниматься переработкой мяса и молока, иметь более быстрый денежный оборот.

Есть еще одна причина, которая подталкивает нас к тому, чтобы иметь свои подсобные производства: это создание дополнительных рабочих мест. Ведь сегодня в деревне свыше 100 человек безработных. В канцелярии колхоза лежит более 30 заявлений с просьбой о трудоустройстве. Это люди разных специальностей — от бухгалтера до педагога. Естественно, не все желают идти, скажем, в животноводство, хотя и сюда мы кого попало не берем. Живут у нас в поселке люди из Глуска, нигде не работают, живут за счет коммерческих поездок «туда-сюда», ищут «легкий» хлеб. Придет время — осядут. Но есть и другие, которые нуждаются сегодня в куске хлеба. Конечно, колхоз не богадельня, но дать человеку шанс заработать, чтобы прокормить себя, семью, чтобы не идти воровать — в этом наш долг, наша обязанность. Эти вопросы, безусловно, для нас на сегодня очень важные.

— *У вас в хозяйстве есть еще и пруды...*

— Их «зеркало» составляет 50 гектаров. Рассчитываем, что в этом году уже получим товарную рыбу. Зарыблено 30 гектаров прудов, 15 гектаров еще очистим в текущем году и тоже запустим мальков.

— *Евгений Николаевич, прошло более пяти лет, как вы и ваши земляки прописались на глусской земле. Как прижились здесь люди? Как проходит процесс психологической адаптации? Что можно сказать об этом?*

— Однозначно ответить очень трудно. Судите сами, первые годы, если кто из стариков умирал, возили хоронить на Славгородчину. Сейчас такие случаи все реже и реже. Видимо, люди начинают свыкаться с мыслью, что они здесь надолго осели, возможно, на века. А, естественно, где мы, там и могилы наших близких. Но сказать, что так быстро забыли прежние места, не могу, не позволяет совесть. Случись где-нибудь какая-то осечка, сразу же сравнение через слово: «А у нас там было не так», «А у нас было лучше». Постоянные перебои с теплом в квартирах лишний раз бередят эту незаживающую рану. Болит она и болит. Ведь раньше каждый жил в

своем доме, как хотел, так его и отапливал. Сейчас же отопление централизованное. Как коммунальники запасутся на зиму топливом, так и обеспечиваются квартиры колхозников теплом. Скажу, не кривя душой, не ахти как обеспечиваются. Но мы ничем дело поправить не можем. У нас нет средств, чтобы улучшить отопление квартир. Как не в силах мы сейчас и баню запустить. Хотя добротное помещение и пустует, однако люди не могут помыться. Стараемся успешнее решать другие хозяйственные вопросы. Колхозники получают бесплатно зерно, солому, им бесплатно обрабатывают приусадебные участки. Они обеспечиваются, и опять же бесплатно, продуктами, которые получаем по бартеру. Применяем пониженные расценки для тружеников хозяйства при продаже им продукции животноводства. Словом, делаем все, чтобы людям жилось легче, чтобы они все реже сравнивали, как жили до Чернобыля и как после него.

Запісала Т.А.Матусевіч.

Радзіма. 1996. 27 крас.

* * *

Наша даведка

Па выніках працы за 1998 г. калгасу «Слаўгарадскі» прысуджана: 1-е месца за павелічэнне вытворчасці збожжавых і зернебабовых, дзе атрымана з кожнага гектара пасяўной плошчы па 21,6 ц зерня; 1-е месца за павелічэнне вытворчасці малака, дзе на 100 га сельгасугоддзяў атрымана па 416,6 ц, надой на карову склаў 3277 кг; 1-е месца за павелічэнне вытворчасці мяса, дзе на 100 га сельгасугоддзяў атрымана па 69,5 ц.

У СЭРЦЫ МАІМ І СМУТАК, І БОЛЬ!

Ці прыжыліся на глускай зямлі былыя жыхары Слаўгарадчыны, якіх чарнобыльская трагедыя прымусіла шукаць паратунку ў іншых краях?

ГЛУШАКОЎ Юрый Міхайлавіч, механізатар:

— Цяжка адразу сказаць, прыжыліся мы тут ці не. Ужо адно тое, што пераехалі цэлай вёскай, многае значыць. Свае людзі, сярод якіх нарадзіўся і вырас, якія заўсёды цябе зразумеюць. Тут жывуць і іншыя родзічы. Неяк больш заняты работай і ўласнымі праблемамі. Так што асабліва перажываць па мінулым не прыходзіцца. Калі на рабоце, то гэта адыходзіць на задні план. Толькі міжволі, самі па сабе ўспыхваюць успаміны. Часта сніцца вёска дзяцінства. Безумоўна, калі б настаў такі час і сказалі: выбірай сабе месца жыхарства, то я б, не задумваючыся, разам з сям'ёй пераехаў бы назад у Кульшычы.

АРЛОЎ Міхаіл Мікалаевіч, вадзіцель:

— У Заеліцы мы атрымалі трохпакаёвы катэдж. Непадалёк ад нас жывуць мае і жончыны бацькі — пенсіянеры. Жонка працуе ў школе тэхнічкай. Шосты год жывём тут, а ўсё роўна адчуваем сябе нібы чужымі. Маленькая самастойная дзяржава на чужой зямлі. Ніколі не забудзецца вёска, дзе нарадзіўся і вырас. Вялікая яна была, прыгожая. Лясы на свае дары ў нас багацейшыя, чым тут. Ды і былі мы бліжэй да райцэнтра — усяго 12 кіламетраў. Увогуле ж, здаецца, прыжыліся ў Заеліцы. З мясцовымі ладзім нармальна. Думаю, што пройдуць гады, вырасце новае пакаленне слаўгарадчан на Глушчыне і боль паціху сунімецца. Чалавек да ўсяго прывыкае.

ГАРУЧКА Міхаіл Васільевіч, пенсіянер:

— Разбурылі нашы гнёзды. Радыяцыя вымусіла перасяліцца. Цяжка ўсведамляць, што нас, пажылых людзей, абдурылі. Абяцалі не браць платы за новыя хаты. Потым жа прыйшлося выкупляць кватэру. Па тых часах выплацілі 12 тысяч за дом. У чатырохпакаёвым катэджы жывём удваіх з жонкай. Безумоўна, плацім вялікія грошы за ацяпленне. Кажуць, ёсць лішняя жылая плошча. Зімой штомесячна плачу па 240 тысяч рублёў. Удваіх з жонкай атрымліваем прыкладна 900 тысяч рублёў пенсіі. У Кульшычах была свая хата і за ацяпленне не трэба было плаціць — палілі самі. Тут жа плацім, лічы што за холад, а не за цяпло. Нас, людзей пенсійнага ўзросту, падобныя беспарадкі проста выводзяць з сябе. Каб быў маладзейшы, не задумваючыся, паехаў бы назад. Не толькі мяне, але і маіх вяскоўцаў не задаволіла не перамена месца жыхарства (жыць можна ўсюды), а самі адносіны да перасяленцаў. Тыя бытавыя ўмовы, у якіх мы аказаліся. Перш чым зрываць нас з наседжаных месцаў, трэба было ўсё разлічыць і прадумаць. Мы хочам жыць у нармальных умовах.

ЖАРЫКАВА Наталля, фуражыр:

— Чарнобыльская катастрофа рэзка павярнула ўсё наша жыццё. Я разам з іншымі пераехала са сваёй сям'ёй на Глушчыну. Дзякуй нашаму кіраўніку калга-

са, што ён не даў, каб нас перасялілі часткамі, адрывалі адзін ад аднаго. У сваім калектыве, з людзьмі, якіх добра ведаеш, любыя цяжкасці здаюцца лягчэйшымі. У новым калгасе я некалькі гадоў працавала паляводам, цяпер фуражырам. Ніякай работы не цураюся, бо ў гаспадарцы няма лепшай і горшай работы, ёсць работа неабходная і гэта ўсім патрэбна разумець.

Падрастаюць нашы дзеці — дзве дачкі і сын. Безумоўна, чарнобыльская катастрофа адбілася на іх здароўі, бо нам прыйшлося жыць у моцна забруджанай радыенуклідамі зоне цэлых пяць гадоў. Цяпер даць бы дзецям узмоцненае харчаванне, больш фруктаў, але фінансавае становішча моцна стрыножвае ўсе нашы спадзяванні. Безумоўна, псіхалагічная адаптацыя — працэс доўгі. Мы адчуваем, як з нейкай насцярожанасцю адносяцца да нас іншыя людзі. Нас спачатку баяліся, наслухаўшыся па радыё розных перадач. Гаварылі, што мы свецімся. Але ж мы перад гэтымі людзьмі нічым не правініліся: наша бяда — Чарнобыль, і не дай Бог пажадаць камунебудзь перажыць тое, што мы перажылі і перажываем. Сардэчны чалавек зразумее наш душэўны стан, нашу тугу па радзіме, якую ў нас адняў Чарнобыль. На глускай зямлі чамусьці я ўвесь час бачу адны і тыя ж сны — сваю родную вёску.

Л.М.Канашэвіч, В. М.Чучвал.

Радзіма. 1996. 27 крас.

Патрыярхі лясоў Глушчыны

Сапраўдным багаццем Глушчыны з'яўляюцца лясы, якія займаюць больш за палавіну яе тэрыторыі. Наш раён на Магілёўшчыне — адзін з найбольш багатых па запасах драўніны. Мы любім абуджэнне лесу вясной і залітыя сонцам шчодрыя зялёныя шаты летам, чырвона-залацісты ўбор у асеннюю пару і суровую маўклівасць заснежаных лясных абшараў зімой. Лясы ў нашым раёне прасціраюцца ўсюды: то кудлатыя бярозавыя гаі, то чырванаствольныя сосны ў барах чаргуюцца з непралазнымі маладымі пасадкамі хвойніку. Лясы дораць жыхарам Глушчыны мноства ягад і грыбоў, дзічыны. Але сярод раслінага свету глускіх лясоў найбольшае захапленне выклікае дуб, які лічыцца лясным доўгажыхаром. Некалькі дубоў-волатаў шматвяковага ўзросту ёсць і на Глушчыне. Іх можна сустрэць у лесе за в. Лучкі, каля в. Падкаленда, у Зубарэвічах і іншых месцах. Дубовыя гаі з дамешкамі ясеня, вольхі, асіны, граба, бярозы, клёна, елкі складаюць дубровы. Іх на Глушчыне некалькі, і самыя каштоўныя з іх аб'яўлены помнікамі прыроды мясцовага значэння і перададзены пад ахову Глускаму лясгасу. Найбольшыя плошчы дубровы займаюць у лясах Слаўкавіцкага лясніцтва. Напрыклад, дуброва кіслічнікавая, што ва ўрочышчы Замошша размешчана на плошчы 25 га. На пяць дамешкаў (бяроза, вольха чорная, асіна, ясень, граб) тут прыходзіцца пяць дубоў. Узрост іх 180 гадоў, вышыня 29 м, дыяметр 52 см. Дуброва сыцевая займае некалькі паніжаныя месцы з багатымі вільготнымі дзярнова-падзолістымі глебамі ва ўрочышчы Задоўжжа. Яна раскінулася на плошчы 18 га. Узрост волатаў 160 гадоў, вышыня 32 м, дыяметр 52 см. У суседнім квартале на плошчы 8,2 га дубы растуць разам з елкай, грабам, асінай і бярозай. Ва ўрочышчы Карма дуброва займае 18 га, у яе складзе дуб, клён, асіна, вольха і бяроза. Узрост яе 140 гадоў, вышыня дрэў 28 м. Вельмі прыгожая дуброва за тры кіламетры ад в. Сіманавічы ва ўрочышчы Долбішча ў Завалочыцкім лясніцтве. Плошча яе невялікая — 5,5 га, размешчана ў пойме р. Пціч. Побач са 140-гадовымі дубамі растуць бярозы, якім па 40 гадоў. Вышыня дубоў 20—25 м, дыяметр 55 см. Глускія лясы не абмяжоўваюцца толькі пералічанымі дубровамі. У Слаўкавіцкім лясніцтве ёсць дзялянкі, дзе можна (і дазволена) штогод высякаць для гаспадарчых патрэб да 2 тыс. кубаметраў дубу. Потым гэтыя плошчы займуць маленькія саджанцы з пітомніка лясгаса. І толькі праз сто гадоў з іх можна будзе атрымаць дзелавую драўніну.

У.А.Алёхна, С.Ф.Анташкевіч.

Сінякова алея

Народная мудрасць вучыць: чалавек павінен за сваё жыццё пасадзіць дрэва. А калі больш? Вось так, як гэта зрабіў Сцяпан Іванавіч Сіняк. Паабапал дарогі, што вядзе да в. Зелянковічы, увагу кожнага прыцягваюць стромкія кучаравыя бярозы. Гадоў ім ужо нямала, зялёныя кроны так разрасліся, што сплятаюцца, утвараючы прыгожую цяністую алею. Ва ўсіх навакольных вёсках старыя і малыя ведаюць гэтую алею пад імем — алея Сіняка. Ішоў 1945 год. Толькі што абвясцілі аб перамозе над фашысцкай Германіяй. Наступіў доўгачаканы мір. Людзі, вытрымаўшы цяжкія ваенныя гады, з велізарнай энергіяй узяліся аднаўляць разбураную гаспадарку. Вярнуўся ў гэты час да сваёй сям'і ў в. Поўстка і Сцяпан Іванавіч Сіняк. Працаваў дарожным майстрам у Глускім ДЭУ. У абавязкі Сіняка ўваходзіла сачыць за станам дарогі Глуск — Рэчыца на ўчастку ад Глуска да в. Зелянковічы. Шлях гэты, як і ўсе іншыя, быў знявечаны вайной. Хутка пад кіраўніцтвам Сцяпана Іванавіча пачалі аднаўляць разбураныя масты, засыпаць варонкі, капаць вадасцёкавыя канавы. Праз два гады дарога была прыведзена ў належны парадак. Людзі, ці ехалі яны на машыне, ці на кані, ці ішлі пешшу, добрым словам ўспаміналі дарожнага майстра Сцяпана Сіняка. Пра былую вайну напаміналі толькі дзве магілкі савецкіх салдат. Сцяпан Іванавіч даглядаў і за імі: абгарадзіў, змайстраваў побач лаўкі і кожны раз, праходзячы міма, ускладаў на іх узгорачкі букеты палявых кветак. Быў ва «ўладаннях» Сіняка і самы цяжкі ўчастак. У адным месцы дарога праходзіла праз поле. Зімой яе пастаянна заносіла снегам, летам размывала дажджамі. І вырашыў Сцяпан Іванавіч пасадзіць паабапал шляху дрэвы. Шмат асенніх дзён затраціў ён на тое, каб перанесці з лесу маладыя бярозкі і пасадзіць іх абапал дарогі. А колькі клопатаў выпала на долю Сіняка. Кожнае дрэўца трэба было падвязаць, паліць. А тут яшчэ часта шкодзіла калгасная жывёла. Аднойчы знайшоўся вылюдак, які ўзняў руку на маладое дрэўца. Ехаў ён з Зелянковіч і, каб падагнаць каня, узяў ды і зламаў бярозку.

С.І.Сіняк.

Гэта заўважылі рабочыя-дарожнікі, якія чысцілі канаву. Яны затрымалі злачынца і паклікалі Сіняка. Прысаромлены, папрасіў праезджы рыдлёўку і пайшоў у лес. Вярнуўся са стромкай асінкай і пасадзіў яе на месцы зламанай бярозкі. З таго часу трапеча яна адзінокая на ветры сваім лісцем у адным радзе з беластволымі бярозамі. Пазней тая дарога страціла сваё першапачатковае значэнне. Скараціліштатную адзінку дарожнага майстра. Сцяпан Іванавіч даўно пайшоў на пенсію. Але людзі і цяпер памятаюць яго алею, называючы Сіняковай. Памятаюць чалавека, які любіў прыроду, сваю справу.

С.Ф.Анташкевіч.

Музеі баявой і працоўнай славы

Вёсцы Катка проста пашанцавала, што яе жыхаром з'яўляецца ветэран вайны і працы, заслужаны настаўнік рэспублікі Цярэнцій Савіч Яльчык. Як былы франтавік, які прайшоў нялёгкімі дарогамі вайны ад першага і да апошняга яе дня, як педагог, дырэктар сярэдняй школы, ён не мог не ведаць, што значыць ў справе гартавання характару моладзі патрыятычнае выхаванне. Менавіта гэтую накіраванасць і мае мясцовы музей баявой і працоўнай славы, які ён стварыў. Цяжка, няпроста было. Ц.С.Яльчыку дапамагалі ў яго задумах чырвоныя следапыты Каткаўскай сярэдняй школы. І цярплівасць, настойлівасць, упартасць у дасягненні мэты, важнасць задачы далі свой плён. У 1981 г. у Катцы пры шырокім удзеле грамадскасці адбылося ўрачыстае адкрыццё калгаснага музея. Тут нямала экспанатаў далёкай, нават старажытнай гісторыі. Матэрыялы дарэвалюцыйнага перыяду, часоў першых дзесяцігоддзяў савецкай ўлады. І ўсё ж асноўная каштоўнасць музея — стэнды, дзе расказваецца аб гераічным удзеле землякоў у Вялікай Айчыннай вайне, аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі, сённяшніх здзяйсненнях калгаса «Зара». Безумоўна, не абышлося і без матэрыяльнай дапамогі гаспадаркі. Былы старшыня калгаса, цяперашні старшыня Каткаўскага сельскага Савета Дзмітрый Кірылавіч Гаўрыленка з першых жа крокаў стварэння музея прасякнуўся важнасцю таго, што настаўнік разам са школьнікамі робіць вельмі важную і патрэбную справу. Дапамагаў і транспартам, і фінансамі. Музей у Катцы жыве, дзейнічае, выхоўвае... У ім нярэдка бываюць самыя розныя наведвальнікі, асабліва моладзь. І ўсе адзінадушна адзначаюць, колькі сіл і энергіі ўклаў Ц.С.Яльчык у тое, каб музей працаваў. У прыватнасці, аб гэтым сведчаць сотні запісаў у кнізе водгукаў. Апошні, да прыкладу, з'явіўся зусім нядаўна. Яго пакінулі дэлегаты Бабруйскага гарадскога савета ветэранаў вайны. Іх проста ўзрушыла тое, што ўбачылі тут. Ім цяжка было паверыць, што ў вёсцы можна стварыць такі цудоўны музей. Яго існаванне стала неад'емнай часткай гісторыі Глушчыны.

Н.Б.Сандамірскі.

У пачатку 1980-х гадоў у Завалочыцах адкрыўся музей баявой і працоўнай славы. Яго экспанаты збіралі многія актывісты краязнаўства мясцовай школы і саўгаса. Але першую скрыпку ўсё ж ігралі Уладзімір Іванавіч Атліванчык (былы завуч школы), Мікалай Міхайлавіч Шаўчэнка (тады працаваў сакратаром парткома саўгаса), Казімір Аляксеевіч Краскоўскі (старшыня прафкома). Апошні да самай смерці быў звязаны з музеем — адказваў за яго работу, працаваў грамадскім экскурсаводам. Галоўная каштоўнасць музея — экспанаты, якія расказваюць аб працоўных і ратных справах людзей саўгаса. Са шматлікіх фотаздымкаў пазіраюць убеленыя сівізной ветэраны, што першымі ўклалі свае цагліны ў падмурак гаспадаркі. І далей на стэндах — тыя ж знаёмыя твары, толькі значна маладзейшыя. Гэта ўжо іх дзеці, што працягвалі справу бацькоў у мірныя дні. Калі ж настаў час і радзіма паклікала на дапамогу, многія ўзялі ў рукі зброю, каб абараніць ад чужынцаў родную зямлю. Адны ваявалі на фронце, другія пайшлі ў партызаны. Лясныя сцежкі прывялі да народных мсціўцаў Прохара і Любоў Высеўкаў, звялі ў адзіную дарогу лёсы ліхога камандзіра брыгаднай разведкі Аляксандра Аляксанава і яго баявой сяброўкі Алены Купрыянаўны. У партызанскай брыгадзе імя Дзмітрыя Гуляева ваявалі Мікалай, Яўген і Антаніна Семенчукі.

У гады ваеннага ліхалецця ў рады народных мсціўцаў пайшлі Эдуард Вількс, Мікалай Ахаевіч, Аляксандра Гункевіч, Іван Швед, Іван Невяроўскі і многія іншыя жыхары саўгаса. Тутэйшая зямля падарыла Радзіме двух Герояў Савецкага Саюза — Сцяпана Шутава і Ульяна Рыбака — легендарнага танкіста і бясстрашнага разведчыка. Але дзе правесці тую мяжу, што аддзяляе героя ад звычайнага салдата? Усе яны вынеслі на сваіх плячах цяжар вайны — і генерал, і радавы. За ўсімі следам хадзіла смерць і магла ў любую хвіліну апусціць на кожнага сваю жорсткую руку. Таму ўсім ім — і мёртвым, і жывым — зямны паклон ад новых пакаленяў жыхароў саўгаса! І створаны ў Завалочыцах музей — толькі маленькая часцінка гэтай удзячнасці.

Т.А.Аляксандрава.

З гісторыі школ Глушчыны

Першыя парасткі народнай адукацыі на Глушчыне ўзышлі ў пачатку XIX ст. Доўгі шлях станаўлення пачаўся з саслоўных пачатковых школ рознага тыпу (царкоўнапрыходскія, земскія, народныя вучылішчы, гімназіі і інш.). Вядома, яны былі малалікія, бо далёка не ўсе дзеці сялян і рамеснікаў мелі магчымасць вучыцца, не хапала педагагічных кадраў, каб адкрыць падобныя школы ў кожнай вёсцы. Карэнныя змены ў народнай адукацыі адбыліся толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Замест саслоўнай стваралася новая адзіная працоўная школа 1-й (адпавядала малодшым класам) і 2-й (старэйшыя класы) ступеней. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў ішло далейшае ўдасканальванне сістэмы народнай адукацыі, у аснове якой спачатку было абавязковае пачатковае, потым сямігадовае і сярэдняе навучанне. Цяпер у раёне працуюць 11 сярэдніх (з іх 3 у Глуску), 6 базавых (з якіх адна санаторнага тыпу) і 3 пачатковыя школы. Заняткі вядуць 544 настаўнікі, з якіх 300 прыходзіцца на школы райцэнтра. 372 педагогі маюць вышэйшую адукацыю, рас-

М.У.Шарамет (трэці злева) дэманструе прыстасаванне, зробленае гурткоўцамі.

це іх прафесіянальнае майстэрства — 12 маюць вышэйшую катэгорыю, 158 — першую і 195 — другую.

БЯРОЗАЎСКАЯ ШКОЛА

У 1902 г. жыхары в. Бярозаўка на сельскім сходзе вырашылі адкрыць «школку». Настаўнікам запрасілі жыхара з суседняй в. Розлевічы Савелія Фёдаравіча Кадуша, які закончыў Поблінскае царкоўнапрыходскае вучылішча. Для «школкі» нанялі хату. У пачатку зімы парог школы пераступілі сялянскія дзеці — у асноўным хлопчыкі. Падручнікаў было мала: адзін на трох вучняў. Дзеці вывучалі рускую мову, арыфметыку, гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, спевы і Закон Божы. Два разы ў месяц у школу наведваўся свяшчэннік з Поблінскага царкоўнапрыходскага вучылішча, каб праверыць, як вывучаецца Закон Божы. За работу С.Ф.Кадуш атрымліваў ад бацькоў вучняў плату — адзін рубель у месяц, акрамя таго, у іх па чарзе сталаваўся. Праз год Кадуша змяніў жыхар Бярозаўкі Канстанцін Платонавіч Малаковіч, які быў на галаву вышэй Кадуша па адукацыі, бо закончыў гарадское вучылішча ў Пецярбургу. Пазней тут выкладалі Пётр Васільевіч Малаковіч і Авяр'ян Платонавіч Малаковіч. У 1912 г. па распараджэнні мясцовых улад наёмная школа ў Бярозаўцы была закрыта. Бацькі павінны былі адпраўляць сваіх дзяцей на вучобу ў Поблінскае царкоўнапрыходскае вучылішча. Праз восем гадоў пачатковая школа ў Бярозаўцы аднавіла сваю дзейнасць у хаце селяніна Барыса Храпко. Настаўнічала ў той год Марыя Васільеўна Станкевіч, потым да яе далучылася сястра Алена. У пачатковай школе адкрылі два класы, дзе было 12 вучняў, пазней школа стала чатырохкласнай, заняткі ў ёй вёў Алесь Сцяпанавіч Бабак. У канцы 1920-х гадоў у Бярозаўцы было пабудавана памяшканне для пачатковай школы, у якой пачалі вучыцца 30 вучняў. З імі па ўсіх прадметах займаўся настаўнік Сцяпан Ціханавіч Хартановіч. У 1932 г. на базе пачатковай школы быў адкрыты 5-ы клас сямігодкі, першы выпуск якой адбыўся ў 1936 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў школе працаваў дружны, зладжаны калектыў на чале з дырэктарам Сяргеем Апанасавічам Лісоўскім, завучам Лідзіяй Харытонаўнай Бялінскай. У чэрвені 1941 г. настаўнікі школы П.К.Марціновіч і Петухоў пайшлі на фронт, С.А.Лісоўскі, Р.Н.Мінкевіч і Л.Х.Бялінская, а таксама вучні старэйшых класаў Н.Крук, Н.Малаковіч, Л.Малаковіч і іншыя неўзабаве сталі партызанамі. У вайну памяшканне школы згарэла, таму пасля вызвалення заняткі зноў праводзіліся ў наёмных памяшканнях. Педагагічны калектыў папоўніўся новымі сіламі, дырэктарамі школы ў розны час працавалі С.А.Лісоўскі, П.К.Марціновіч, Ф.І.Раўковіч, С.С.Штапенка, Г.І.Слук. У 1960 г. школа стала васьмігадовай, а з 1963 г. — сярэдняй. За гэты перыяд яе матэрыяльна-тэхнічная база значна палепшылася. Са студзеня 1977 г. вучні пачалі заняткі ў новым вучэбным корпусе, разлічаным на 392 навучэнцы. У школе абсталяваны сучасныя кабінеты па ўсіх прадметах, для іх набыты наглядныя і тэхнічныя сродкі навучання. Тут працуюць 19 педагогаў на чале з дырэктарам А.В.Падбярозным. Многія педагогі — сапраўдныя наватары вучэбна-выхаваўчага працэсу. Так, настаўнік вытворчага навучання Міхаіл Уладзіміравіч Шарамет, пра «сакрэты» работы якога пісалі ў свой час і саюзныя «Известия», і рэспубліканская «Настаўніцкая газета», больш як пятнаццаць гадоў таму сабраў вакол сябе вясковых падлеткаў. Сёння ўжо нават цяжка пералічыць, што «накапілася» ў тэхнічным «багажы» гурткоўцаў: міні-трактар, самаходная касілка для ўборкі заліўных лугоў, універсальны станок, здольны выконваць некалькі аперацый па рэзцы, зварцы, шліфоўцы металу, для намоткі трансфарматарных катушак і вырабу металічнай сеткі, і іншыя агрэгаты, якія сканструявалі сваімі рукамі гурткоўцы.

ГЛУСКАЯ СШ № 2

Час яе нараджэння — 1920-я гады, калі замест грамадскай гімназіі, якая працавала ў Глуску пасля Лютаўскай рэвалюцыі, узніклі дзве школы 2-й ступені, дзе маглі бясплатна набываць веды ўсе дзеці школьнага ўзросту. З Бабруйска запрасілі выкладчыкаў ранейшай казённай гімназіі фізіка Яўгена Канстанцінавіча Успенскага (пазней дэкан фізіка-матэматычнага факультэта БДУ) і настаўніка рускай мовы і літаратуры Валяр'яна Мітрафанавіча Абаза. Прыбылі і іншыя маладыя педагогі. Аднак змест работы школ змяніўся мала:

за невялікім выключэннем дзеці займаліся па старых падручніках, не было новых праграм, таму кожны настаўнік самастойна вызначаў методыку работы. Зразумела, што ўсё гэта не адпавядала новым патрабаванням школьнага навучання, і хутка ў аснову новай школы была пакладзена сямігодка, а ў Глуску паступова азначыліся беларуская сямігадовая школа, так званая школа сялянскай моладзі (ШСМ), яўрэйская і руская сямігодкі. Беларуская сямігодка стала базавай школай, а з 1934 г. у Глуску была адкрыта першая ў раёне сярэдняя школа. У 1939—1940 гг. замест ранейшай яўрэйскай сямігодкі пачала працаваць руская сярэдняя школа. Будынак яе размяшчаўся побач з цяперашнім вузлом сувязі. У Вялікую Айчынную вайну будынкі школы былі пашкоджаны і вучням прыходзілася вучыцца ў розных месцах: па вуліцы Кірава 6—7 класы, па вуліцы Сацыялістычнай 8—9 класы, па вуліцы Жыжкевіча старэйшыя класы. У 1962 г. СШ № 2 перасялілася ў новае памяшканне ў раёне в. Хваставічы. Калектыў школы вядомы ў раёне сваімі вопытнымі, сталымі кадрамі. Яе настаўнікі Марыя Майсееўна Буеўская, Ганна Нікандраўна Кандрацьева, Іван Іванавіч Захарэнка, Марыя Арцёмаўна Малашук атрымалі званне заслужанага настаўніка Беларусі. Настаўніцы Кацярына Міхайлаўна Глебка, Ніна Іванаўна Ермаліцкая, Маргарыта Іванаўна Радчанка ўдастоены ордэнаў СССР, многія педагогі атрымалі значкі «Выдатнік народнай адукацыі».

ГЛУСКАЯ САНАТОРНАЯ ШКОЛА-ІНТЭРНАТ

У 1950-я гады на паўночнай ускраіне Глуска размяшчалася школа-інтэрнат для дзяцей з мнагадзетных сем'яў і сірот. У 1959 г. узведзены трохпавярховы спальны корпус. Тут пачала працаваць і глуская беларуская СШ № 1. Дырэктарам яе ў той час быў Міхаіл Адамавіч Мікульскі, пасля яго пераводу на работу ў Бабруйск педагагічны калектыў узначаліла Антаніна Васільеўна Янкоўская (Паўлава). Тут працавалі настаўнікі Мая Шоламаўна Лешына, Мікалай Аляксандравіч Понтус, Захар Сямёнавіч Юркевіч, Вольга Львоўна Ліўшыц, Міхаіл Іванавіч Чорны, Клаўдзія Аляксандраўна Грышына і інш. У 1961 г. глуская СШ № 1 была ператворана ў агульнаадукацыйную школу-інтэрнат. Многія гады жыцця аддалі сваім выхаванцам Алена Фларыянаўна Лянсберг, Надзея Адамаўна Шылава, Валянціна Васільеўна і Валянцін Васільевіч Зайцавы, Ганна Іванаўна Парахаўнік, Агаф'я Емяльянаўна Буневіч, Вольга Марцінаўна Цэлінава, Валянціна Васільеўна Арцюх, Фаіна Андрэеўна Кашкурэвіч, Васіль Апанасавіч і Ганна Іванаўна Лаўрыновічы, Вольга Іванаўна Калошка, Людміла Іванаўна Варатніцкая, Лілія Віктараўна Падгурская,

Настаўнікі і вучні глускай СШ № 2.

Лідзія Сцяпанаўна Рымашэўская, Віктар Канстанцінавіч Тарасевіч, Міхаіл Аляксандравіч Войтка, Эдуард Сямёнавіч Глебка, Надзея Андрэеўна Саковіч, Міхаіл Іларыёнавіч Багук... З 1962 г. і да выхаду на пенсію яе нязменным кіраўніком быў Іван Ігнатавіч Сысой, заслужаны настаўнік Беларусі. З 1979 г. установа пераўтворана ў санаторную школу-інтэрнат для дзяцей з захворваннямі органаў стрававання. Тут створаны ўсе ўмовы для лячэння і навучання дзяцей.

ГЛУСКАЯ ШКОЛА МАСТАЦТВАЎ

У жніўні 1960 г. у будынку на перасячэнні вуліц Камсамольскай і Кірава адкрылася Глуская музычная школа. У верасні ў класах фартэпіяна і баяна пачалі займацца 64 вучні. З цягам часу адкрыліся класы па акардэоне, цымбалах, скрыпцы, домры, духавых інструментах. Першымі, хто павёў дзяцей у свет чароўных гукаў, былі Галіна Сяргееўна Былінская, Любоў Андрэеўна Усеваладава і Саул Львовіч Каплан. Пазней да іх далучыліся Таццяна Мікалаеўна Варава, Лізавета Раманаўна Алфімава і інш. Дырэктар Г.С.Былінская, выпускніца Магілёўскага музычнага вучылішча імя Рымскага-Корсакава, аддала школе больш за трыццаць гадоў і прыклала шмат намаганняў, каб у школе склаўся трывалы калектыў музычных работнікаў. Набыўшы музычную адукацыю, вярнуліся працаваць выпускнікі школы Ганна Аркадзьеўна Кацнельсон, Таццяна Мікалаеўна Макарэвіч і інш. У сценах Глускай музычнай школы зараджаўся талент будучага кампазітара Валерыя Іванова. У пачатку 1980-х гадоў школа перабралася ў новы двухпавярховы будынак. З 1996 г. яна некалькі змяніла свой музычны профіль, стала называцца школай мастацтваў, тут былі адкрыты класы харэаграфіі, тэатральнага мастацтва, духавых інструментаў.

ГЛУСКІ ДЗІЦЯЧА-ЮНАЦКІ КЛУБ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

У жніўні 1963 г. у Глуску пачала працаваць дзіцяча-юнацкая спартыўная школа (ДзЮСШ). Адкрыліся аддзяленні лёгкай атлетыкі, баскетбола і валейбола. Першым дырэктарам быў Іосіф Адамавіч Малюкевіч, завучам — Сямён Львовіч Хархурын, трэнерамі Віктар Сцяпанавіч Доўгі, Марыя Канстанцінаўна Рабчэўская, Уладзімір Антонавіч Чымбург, Аркадзь Кіпель. У 1969 г. з'явілася аддзяленне па гандболе, з таго часу падрыхтавана больш за 70 прызёраў абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў. Значных поспехаў дасягнулі ў спорце выхаванцы школы Уладзімір Гольдзін (гандбол), Алена Іваненка (лёгкая атлетыка — штурханне ядра), Сяргей Калыбін, Васіль Лазовік (цяжкая атлетыка) і інш. У студзені 1999 г. ДзЮСШ пераўтворана ў дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі. Колькасць вы-

Каманда Глускай ДзЮСШ — прызёр абласной спартакіяды школьнікаў. 1977 г.

хаванцаў няўхільна расце: калі ў 1963 г. тут займаліся 205 падлеткаў і працавалі 5 трэнераў, то ў 1999 г. адпаведна 694, штатных трэнераў 8 і 10 сумяшчальнікаў. Дырэктар Анатоль Фёдаравіч Мішур, начальнікі аддзелаў Віктар Іванавіч Вежнавец, Іван Лявонцьевіч і Марыя Канстанцінаўна Рабчэўскія, Сяргей Валянцінавіч Зайцаў і іншыя робяць усё, каб выхаванцы клуба набывалі добрую спартыўную форму.

ДАКОЛЬСКАЯ ШКОЛА

У в. Даколь да 1917 г. толькі два жыхары — Андрэй Ермакоў і Пётр Заяц — закончылі гімназію. Людзі жылі тут бедна, цесна туліліся адна да адной на адзінай вясковай вуліцы невялікія сялянскія хаткі з саламянымі стрэхамі, над якімі ў цэнтры вёскі ўзвышалася званіца мясцовай царквы. Яна належала да Крываносаўскага прыхода. Да 1908 г. у вёсцы існавала земская школа, у адзіным класе якой вучыліся 25 дзяцей больш заможных гаспадароў. Размяшчалася яна ў хаце Харытона Зайца, з вучнямі займаўся К.Гацько. У 1908 г. земская школа была рэарганізавана ў чатырохкласнае вучылішча, для якога пабудавалі спецыяльнае памяшканне. Тут вучыліся 70—80 дзяцей, бацькі якіх былі найбольш прагрэсіўнымі і разумелі значэнне адукацыі ў жыцці чалавека. З вучнямі займаліся настаўнікі Іван Мікалаевіч Жук, П.Д.Герасімовіч і яго жонка. Пасля 1917 г. у вёсцы была адкрыта школа 1-й ступені, прыток у якую павялічыўся амаль удвая. З 1929 г. школа перарасла ў сямігодку. Дырэктарам працаваў Аўгусцін Канстанцінавіч Галаўня, настаўнікамі Міхаіл Іосіфавіч Юрцэвіч, Ванда Канстанцінаўна Галаўня, Алена Сцяпанаўна Некрашэвіч, М.І.Раманчык і інш. У 1934 г. для патрэб школы было пабудавана новае памяшканне. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны дырэктарам працаваў Н.Майдэль. Вайна спыніла дзейнасць школы, многія настаўнікі былі прызваны ў армію. Фашысты выкарысталі школьны будынак пад свой гарнізон, класы ператварылі ў канюшню, у сучаснай лабаранцкай, па словах многіх сведкаў, катавалі нявольнікаў. Будынак школы абгарадзілі драўлянымі ўмацаваннямі вышынёй да 3 метраў з калючым дротам. Вакол было мноства акопаў. Спатрэбілася нямала сіл і сродкаў, каб пасля вызвалення прывесці школьныя пабудовы і двор у належны стан. Больш за 200 вучняў наведвалі ў тыя гады Дакольскую сямігодку, якая з 1951 г. была пераўтворана ў сярэднюю школу. Дырэктарамі ў ёй у гэты час працавалі Іосіф Францавіч Сташэўскі, Надзея Паўлаўна Каблаш, М.К.Тычына, С.І.Віхман, І.Ф.Малаковіч. У 1950—1970-я гады школу ўзначальваў былы партызан, сакратар падпольнага райкома камсамола Баляслаў Валяр'янавіч Рынейскі, пазней — Вера Данілаўна Бародзіч, Надзея Андрэеўна Дроб і інш. Выхаванцы школы ганарацца тым, што тут вучыўся Герой Савецкага Саюза С.А.Калінкоўскі. У школе захоўваюцца матэрыялы, прысвечаныя герою. Калектыў школы не забывае сваіх калег-ветэранаў, якія аддалі навучанню дзяцей па 25 і больш гадоў свайго жыцця. Сярод іх Марыя Рыгораўна Галяс, Канстанцін Мікітавіч Кіпель, Васіль Іванавіч і Надзея Паўлаўна Аліферы, Валянціна Міхайлаўна Заяц, Софія Іванаўна Шарамет, Лідзія Платонаўна Філіповіч, Надзея Аляксандраўна Сокал, Тамара Іванаўна Абрамовіч, Валянціна Міхайлаўна Атрошкіна і інш.

ЗАВАЛОЧЫЦКАЯ ШКОЛА

У пачатку 1960-х гадоў у Завалочыцах працавала васьмігадовая школа, яе адзіны будынак размяшчаўся каля сажалкі, насупраць канторы саўгаса «Завалочыцы». Вядома, многае не адпавядала патрабаванням навучання. Ішлі размовы аб будаўніцтве ў вёсцы новай школы. У 1965 г. будаўнікі «Міжкалгасбуда» пачалі ўзводзіць за вёскай цагляны будынак сярэдняй школы. У той час настаўнікамі пачатковых класаў працавалі сёстры Ніна і Марыя Окруты, Марыя Лук'янаўна Пятроўская, Кацярына Рыгораўна Нікалайчык, Ганна Іванаўна Мікульская, Зінаіда Фёдараўна Нікалайчык, Станіслаў Іосіфавіч Жалкоўскі, Дзмітрый Барысавіч Леванькоў, Міхаіл Сямёнавіч Мігас, Уладзімір Мікалаевіч Жарнаклёў, Зінаіда Фёдараўна Кузьмянкова, Іван Васільевіч Белавушка, Канстанцін Сцяпанавіч Багдановіч. У школе працавалі таксама былыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Паўлавіч Осін і Сцяпан Васільевіч Сяргейчык. Пазней у школу прыйшлі Людміла Васільеўна Белавушка, Тамара Парфенаўна Храпко. Уліліся ў педкалектыў сем'і Цыганковых: фізік Міхаіл Піліпавіч з жонкай Ган-

най Емяльянаўнай, настаўніцай пачатковых класаў; яго брат матэматык Мікалай Піліпавіч з жонкай-матэматыкам Анастасіяй Кузьмінічнай Афанасенка. Гэта яна праз некалькі гадоў стала школьнай зоркай, чый вопыт і майстэрства, высокі прафесіяналізм леглі ў скарбонку не толькі школы, але і настаўніцтва ўсёй рэспублікі. У 1969 г. А.К.Афанасенка было прысвоена званне заслужанага настаўніка рэспублікі. Міхаіл Аляксандравіч Храпко амаль 40 гадоў узначальваў школьны калектыў, доўгі час з ім побач працаваў Уладзімір Іванавіч Атліванчык. У 1970-я гады ў школу прыйшло новае папаўненне — хімік-біёлаг Валянціна Аляксандраўна Шаўрук, гісторык Зінаіда Сцяпанаўна Дарошка, фізрук Алег Барысавіч Карпачоў і інш. Сёння дырэктарам школы працуе яе выпускнік Аляксандр Пятровіч Курс, які заняў пасаду ў 24 гады. Жыццё школьнага калектыву нельга ўявіць у адрыве ад саўгаса «Завалочыцы». Гэта два берагі адной ракі. Цяжка саўгасу — дапамагае школа, не ладзіцца што ў школе — ідзе на падмогу саўгас. Як бы ні было цяжка з грашыма, дырэкцыя саўгаса пастаянна выдзяляе сродкі для правядзення ў школе рамонту, харчавання вучняў, аплачвае паездкі дзяцей на экскурсіі, выдзяляе для гэтага саўгасны транспарт. Цяжка ўявіць, як бы развівалася мясцовая мастацкая самадзейнасць без настаўніка Алега Барысавіча Карпачова і яго баяна. У тым, што хор Завалочыцкага сельскага Дома культуры атрымаў званне народнага, ёсць і яго заслуга.

КАТКАЎСКАЯ ШКОЛА

Сярод народных вучылішчаў, адкрытых на Глушчыне ў пачатку XX ст., упамінаецца Каткаўскае. З 1 кастрычніка 1909 г. яно размяшчалася ў сялянскай хаце з дзвюх палавін: у адной жыў гаспадар Апанас Слесаронак, а на другой вучыліся дзеці трох класаў, якія ў той час называліся аддзяленнямі: 1-е, 1-е старэйшае і 3-е аддзяленні. Вучылішча наведвалі 54 вучні, займаўся з імі настаўнік Міхаіл Шаўчук. Ён утрымліваўся на сродкі дзяржавы і харчаваўся па чарзе ў бацькоў навучэнцаў. У вучылішча хадзілі дзеці, у асноўным хлопчыкі, з вёсак Катка, Халопенічы, Слабодка, Бабровічы і маёнтка Халопенічы. Да 1917 г. тут вывучалі арыфметыку, геаграфію, гісторыю, рускую і царкоўнаславянскую мовы, чыстапісанне, спевы, гімнастыку, Закон Божы. Апошні прадмет быў пад пільнай увагай бацюшкі Касарыцкай царквы Лукашэвіча. Беларуская мова падвяргалася ганенню: паступова насельніцтва павінна было яе забыць і ўжываць толькі рускую мову. Акрамя Каткаўскага, у гэты перыяд працавала Касарыцкае народнае вучылішча, дзе былі 4 аддзяленні. Імкненне жыхароў Каткі да навукі было велізарным, таму ў 1914 г. на сабраныя насельніцтвам грошы пабудавалі новую школу, дзе

Педагагічны калектыў Завалочыцкай сярэдняй школы. 1995 г.

меліся тры класныя пакоі, дзве кватэры для настаўнікаў і прыбіральшчыцы, а таксама гаспадарчыя пабудовы — хлеў і калодзеж. У будаўніцтве школы не прымалі ўдзелу жыхары в. Бабровічы, таму, калі пачаліся заняткі, каткаўскі староста адправіў усіх дзяцей з гэтай вёскі дамоў, і больш у школу іх не прымалі. Ужо ў 1931 г. Каткаўская пачатковая школа была пераведзена ў сямігадовую і называлася школай сялянскай моладзі (ШСМ). Яе першым дырэктарам прызначылі Міхаіла Паўлавіча Шпілеўскага. У школу хадзілі дзеці з Каткаўскага, Ляскавіцкага, Клятнянскага сельсаветаў. У вёсках Бабровічы, Замасточча, Касарычы, Слабодка, Халопенічы працавалі пачатковыя школы. З 1938 г. Каткаўская школа стала сярэдняй. У гады вайны асноўнае памяшканне было знішчана, а ў школьным садзе нямецка-фашысцкія акупанты зрабілі для сваіх салдат могілкі. З 1 верасня 1944 г. у школах Каткаўскага сельсавета былі адноўлены заняткі: яны пачаліся ў Халопеніцкай, Замастоцкай, Бабровіцкай, Слабодскай, Каткаўскай пачатковых і ў Касарыцкай сямігадовай школах. І зноў, як некалі, заняткі праводзіліся па хатах, а Касарыцкая школа размясцілася ў памяшканні ўчастковай бальніцы. З цягам часу матэрыяльная база народнай адукацыі ў сельсавеце значна ўмацавалася. З 1949 г. у Катцы ўжо працавала сямігадовая школа, дырэктарам якой з'яўляўся Цярэнцій Савіч Яльчык. Пад яго кіраўніцтвам для школы набылі яшчэ адно памяшканне, але класных пакояў не хапала, заняткі працягваліся і ў хатах калгаснікаў Харытона Самуйліка, Ганны Адзінец, Нічыпара Слесаронка. Восенню 1953 г. у вёсцы пачалі ўзводзіць будынак новай школы. На будоўлі ў вольны час працавалі многія настаўнікі і вучні, іх бацькі. У 1957 г. заняткі пачаліся ў новай сярэдняй школе. Яе кантынгент значна пашырыўся за кошт навучэнцаў Касарыцкай сярэдняй школы, якая з гэтага перыяду стала сямігадовай. Жыццё патрабавала новых змен у школьным вучэбна-выхаваўчым працэсе, таму ў 1962 г. пачынаецца будаўніцтва яшчэ аднаго школьнага будынка, а ў 1982 г. — новага тыпавога корпуса. У Каткаўскай сярэдняй школе зараз працуе новае пакаленне настаўнікаў, але ўсе яны добра памятаюць, як многа ў свой час зрабілі для развіцця народнай адукацыі іх старэйшыя калегі — заслужаны настаўнік Беларусі Цярэнцій Савіч Яльчык, дырэктары Васіль Пятровіч Маслаў і Ната Адамаўна Тарасевіч, выдатнік народнай адукацыі СССР, завуч Георгій Іванавіч Давыдоўскі, Анастасія Нічыпараўна Багдановіч, Лідзія Васільеўна Крэйза, Алена Рыгораўна Палякова, Лідзія Кузьмінічна Грабка і многія іншыя.

КЛЯТНЯНСКАЯ ШКОЛА

Вёска Клетнае ў Вялікую Айчынную вайну з'яўлялася моцным абарончым рубяжом, які праходзіў ад будынка школы да ўскрайку лесу. Гэта была суцэльная глыбокая траншэя з бліндажамі і амбразурамі для вядзення агню з кулямётаў і стралковай зброі. У перыяд фашысцкай акупацыі многія жыхары сельсавета былі расстраляны і вывезены ў фашысцкае рабства, у тым ліку і дырэктар школы Прохар Канцавы. Але прыйшло вызваленне ад фашысцкай няволі. Дзеці 1 верасня 1944 г. прыйшлі на заняткі ў школу, многія з іх былі пераросткамі. Уся мэбля тут аказалася самаробнай — гэта былі збітыя з дошак сталы і вакол кожнага па некалькі табурэтаў. На сталах замест сшыткаў убачылі парэзаныя на кавалкі газеты, грубую паперу, часам пісалі нават на бяросце, ды не ручкамі ці алоўкамі, а гусінымі пёрамі. Чарніла замянялі адвар з жалудоў ці сок чырвоных буракоў. Міхаіл Іванавіч Гункевіч, дырэктар школы, як мог, латаў дзіркі ў гаспадарча-фінансавых справах школы. Школьнае жыццё некалькі ажывілася, калі ў 1946 г. дырэктарам школы прызначылі былога франтавіка, афіцэра Савецкай Арміі Івана Іванавіча Захаранку (пазней — заслужаны настаўнік Беларусі). Класныя памяшканні ацяпляліся слаба, не было электрасвятла. Дровы нарыхтоўвалі ў лесе настаўнікі разам з вучнямі. Цяжкія ўмовы жыцця прымушалі многіх кідаць школу і ісці працаваць. Жыццё паступова наладжвалася, сямігадовая, а крыху пазней і сярэдняя адукацыя, за якую бацькі плацілі яшчэ на працягу амаль усіх 1950-х гадоў, сталі ў нашым грамадстве абавязковымі. Колькасць навучэнцаў у гэты час у Клятнянскай школе дасягнула 400 чалавек, у класах стала вельмі цесна. Таму ў пачатку 1960-х гадоў былі пабудаваны яшчэ некалькі памяшканняў, а ў пачатку 1972 г. будаўнікі заклалі фундамент новай сярэд-

Л.В.Мажэйка.

М.І.Зіневіч.

няй школы. Прайшлі гады. Школьны калектыў пакінулі педагогі не аднаго пакалення, на змену ім прыйшлі больш маладыя, няўрымслівыя, настойлівыя. Але сённяшнія настаўнікі школы захоўваюць памяць аб тых, хто працаваў у больш складаных умовах, чым яны цяпер, хто аддаваў цеплыню свайго сэрца высакароднай справе выхавання дзяцей. Гэта Іван Дзмітрыевіч Сцепановіч, Пётр Рыгоравіч Шылаў, Сяргей Уладзіміравіч Духан, Віктар Антонавіч Гушча, Валерый Аляксеевіч Кучынскі, Валянціна Пятроўна Петрыкавец, Аляксандр Міхайлавіч Трыфанаў, Юлія Мікалаеўна Рынейская, Ганна Пракопаўна Станкевіч, В.І.Басякоў, М.І.Басякова, В.Ф.Рудзінскі, А.У.Рудзінская, А.Н.Марціновіч, Л.І.Басякова, Т.К.Марціновіч, Я.Г.Валодзька і многія іншыя. Іх традыцыі беражліва захоўвае новая змена.

МАКАВІЦКАЯ ШКОЛА

У в. Макавічы ў пачатку XX ст. вучылася зусім мала дзяцей. Не кожны мог заплаціць настаўніку ці пакарміць яго. Таму толькі пяцёра жыхароў вёскі — С.Л.Аношка, А.П.Гараймовіч, А.К.Пятрэня, К.Л.Пятрэня і С.К.Скіндзер — мелі адукацыю па 2—3 класы пачатковай школы. У 1923 г. у Макавічах была адкрыта беларуская пачатковая школа, у якую прыйшлі 65 вучняў. З імі працаваў адзін настаўнік — Лукаш Васільевіч Мажэйка. Заняткі праводзіліся ў наёмным памяшканні ў дзве змены, не хапала падручнікаў і школьных прылад, але цяга да навукі дапамагала пераадольваць цяжкасці. У 1925 г. сяляне вёскі актыўна дапамагалі ў будаўніцтве новай школы. Праз год тут ужо вучыліся 105 дзяцей з вёсак Арэхаўка, Масцішча, Макавічы, пас. Дуброва, працавалі два настаўнікі. У 1929 г. школа стала сямігадовай і значна пашырылася за лік вёсак Пагост, Сельцы, Калюга, Юзафова, Бабірова, Баравішча, Вольніца, Краснае, а яшчэ праз год школа рэарганізавана ў сярэднюю. У сувязі з гэтым яе вучэбная плошча пашырылася. Пры школе пачала працаваць майстэрня, дзе вучні набывалі навыкі цесляра. Школьны калектыў лічыў сваім абавязкам дапамагаць мясцоваму калгасу «Чырвоны шлях» у час уборкі ўраджаю і на праполцы сельгаскультур. У гэты час загадчыкамі школы працавалі Л.В.Мажэйка, Рыгор Васільевіч Мельнік, настаўнікамі — Надзея Фёдараўна Бахановіч, Алесь Міхайлавіч Цыганкоў, М.І.Зіневіч, Д.Я.Грыневіч, К.Т.Кіпель, В.Ф.Коршук, Гурыновіч, Курылава, Прыхота і інш. У час Вялікай Айчыннай вайны многія настаўнікі і былыя вучні актыўна змагаліся з ворагам. У партызанскім атрадзе імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі быў і дырэктар школы А.М.Цыганкоў. У час бою каля в. Усцярхі яго цяжка параненага ўзялі ў палон. Доўга здзекаваліся фашысты з партызана, адрэзалі нос, вушы, выкруцілі рукі, але нічога ад яго не даведаліся. Тады яны адрэзалі яму язык. Партызаны пахавалі мужнага патрыёта з воінскімі ўшанаваннямі ў в. Крукаўшчына. За праяўленыя мужнасць і адвагу А.М.Цыганкоў 4 лістапада 1965 г. быў узнагароджаны пасмяротна медалём «За адвагу». Загінуў на фронце і настаўнік Аляксей Іванавіч Савіцкі. Варожыя кулі абарвалі жыццё былых выхаванцаў школы Аркадзя Аднамаха, Цімафея Куралені, Васіля Кумагера і інш. Мужна змагаліся ў радах Савецкай Арміі Мікалай Парахаўнік, Сяргей Кураленя, Рыгор Кісялевіч, Валянцін Расцюшэўскі. Былы выхаванец школы (нарадзіўся ў в. Арэхаўка Старадарожскага р-на) Іван Барысавіч Непачаловіч стаў лётчыкам, зрабіў больш за 200 баявых вылетаў, у час якіх было знішчана шмат ваеннай тэхнікі і жывой сілы праціўніка. За праяўленую воінскую доблесць у 1945 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У час вайны асноўны будынак Макавіцкай школы згарэў, таму ў мірны час школа «вандравала» па наёмных хатах — размяшчалася ў Таццяны Пятрэні і Ефрасінні Кісялевіч, а ў 1945 г. была нават пераведзена ў пас. Дуброва. Усе

цяжкасці жыцця таго часу мужна пераносілі настаўнікі Н.Ф.Бахановіч, Е.Т.Сцепанец, І.А.Шарлега, А.Н.Кабановіч, былыя выпускнікі школы, якія набылі педагагічную адукацыю, — Клаўдзія Іванаўна Скіндзер і Лідзія Сцяпанаўна Рымашэўская. Вярнуліся з арміі Міхаіл Іванавіч Зіневіч і Аляксандр Якаўлевіч Кураленя. Абодва яны, а таксама Міхаіл Адамавіч Мікульскі, пэўны час узначальвалі педагагічны калектыў. У пачатку 1970-х гадоў Макавіцкая школа заняла новы трохпавярховы будынак. Сённяшні калектыў настаўнікаў імкнецца паспяхова вырашаць галоўную задачу — дабівацца гарманічнага развіцця асобы вучня, выхоўваць у ім агульначалавечыя каштоўнасці.

І.Б.Непачаловіч.

СТАРАСЕЛЬСКАЯ ШКОЛА

У 1910 г. у в. Старое Сяло працавала народнае вучылішча, вучнямі якога з'яўляліся 30 хлопчыкаў з навакольных вёсак. Дагэтуль дзяцей найбольш заможных сялян вучылі пісаць і чытаць Фёдар Міронавіч Алёхна і Сямён Іванавіч Тоўсцік, абодва тутэйшыя, кожны меў па 3 класы пачатковай школы. У гады савецкай улады шырока праводзілася работа па ліквідацыі непісьменнасці, але не хапала сродкаў і педагагічных кадраў, каб у кожнай вёсцы пабудаваць школу. У Старым Сяле яна таксама размяшчалася ў наёмным памяшканні. З дзецьмі займаўся настаўнік Іван Аляксандравіч Ясноўскі, які ведаў беларускую мову, любіў яе і стараўся, каб роднай мовай добра валодалі яго выхаванцы. Пазней загадчыкамі школы працавалі Мікалай Кірылавіч Хонскі (1934, настаўніцай яго жонка Аляксандра Аляксандраўна Шумкоўская), Міхаіл Апанасавіч Сухан (1937), Іван Аляксандравіч Адзінец (1939—1941), школу наведвалі 95 вучняў. Мірнае жыццё парушыла Вялікая Айчынная вайна. Многія былыя выхаванцы школы сталі на абарону роднай зямлі. Сямён Алёхна, Іван Сысой, браты Васіль і Фёдар Алёхны, Іван Сысой і іншыя загінулі ў барацьбе з ворагам. Школа аднавіла сваю дзейнасць восенню 1944 г. у наёмным памяшканні і да 1957 г. заставалася пачатковай. З многімі цяжкасцямі ў сваёй рабоце сустракаліся ў першыя пасляваенныя гады загадчыкі школы Надзея Сцяпанаўна Ворах, Вольга Данілаўна Сысой, Мікалай Данілавіч Сысой, Дзмітрый Ціханавіч Чабан, Рыгор Аляксандравіч Корбут, хапіла праблем і на долю Міхаіла Іосіфавіча Свірыдава, Уладзіміра Іосіфавіча Басякова. Дзякуючы настойлівасці і клопатам Юстына Іларыёнавіча Баброўніка Старасельская сямігадовая школа (пасля яна стала васьмігадовай) перасялілася ў спецыяльна пабудаванае памяшканне. Пазней дырэктарамі школ працавалі Анатоль Піліпавіч Жаркевіч, Іосіф Браніслававіч Агрызка, Анатоль Мікалаевіч Цішкоў. Амаль чвэрць стагоддзя бяззменным кіраўніком школы з'яўляецца Соф'я Іванаўна Вайдэр.

УСЦЯРХОЎСКАЯ ШКОЛА

У в. Усцярхі дзяцей пачалі вучыць грамаце ў 1930-я гады, спачатку ў хаце жыхара вёскі Рыгора Лазаравіча Вілюгі, крыху пазней для пачатковай школы спецыяльна выдзелілі будынак. Тады тут працавалі настаўнікі Кроль, Туравец, Кірдун, Караткевіч, Шчорс, Пушынская і інш. У канцы 1930-х гадоў у в. Засценак Усцярхі пачалося будаўніцтва школы-сямігодкі, але ў час вайны фашысты спалілі гэтае памяшканне, і дзецям зноў давялося «вандраваць» па вясковых хатах. Складанасці школьнага навучання таго часу дзялілі са сваімі вучнямі настаўнікі М.Тычына, С.Літвінаў, П.І.Дудар, В.Скварцоў. Пачатковыя школы працавалі таксама ў вёсках Крукаўшчына і Уюнішча, пакуль іх наогул не закрылі ў 1972 г. Тут вучылі дзяцей настаўніцы С.Мізгар і Н.Курылава. У пачатку 1970-х гадоў школа стала васьмігадовай. У педагагічны калектыў прыйшло новае добра падрыхтаванае папаўненне: Ф.М.Чалнакоў, А.М.Дробава, С.М.Ла-

В.М.Сысой.

В.Д.Сысой.

гун, І.Л.Гулевіч, Л.С.Ржэуцкая, Г.Ласоцкая, П.М.Муха, Н.С.Марус і інш. Прыйшоў час, калі школе, нарэшце, пашанцавала. Калгас «Зара камуны» ўзначаліў Віктар Андрэевіч Сысой — чалавек, якому блізкія і зразумелыя клопаты і праблемы школы. Калгас узвёў за свае сродкі новую школу, а потым не шкадаваў грошай на тое, каб з мастацкім густам аформіць усе класныя пакоі, калідоры, тэрыторыю. Намаганнямі старшыні калгаса ў праект школы былі ўнесены змены, дзякуючы чаму з'явілася спартыўная зала, памяшканні для трэніровак. Школа стала адной з лепшых у Магілёўскай вобласці.

ЧЫКІЛЁЎСКАЯ ШКОЛА

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі населеныя пункты сённяшняга Казловіцкага сельсавета адносіліся да Брожскай воласці Бабруйскага павета, дзе мелася толькі адно царкоўнапрыходскае вучылішча. З в. Чыкілі ў вучылішчы займаліся двое — Ціт Аўрамавіч Алёхна і Ціт Макаравіч Тоўсцік. Школы для насельніцтва пачалі адкрываць пры савецкай уладзе. Пры кожнай з іх працавалі лікбезы (гурткі па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых). Спачатку чыкілёўская моладзь займалася пачаргова па сялянскіх хатах. Першым школьным настаўнікам быў Мікалай Уладзіміравіч Сінкевіч, жыхар в. Крукаўшчына, навучанне дарослых праводзіў Ц.М.Тоўсцік. У 1923 г. з усёй вастрынёй паўстала пытанне аб будаўніцтве школьнага будынка. Толькі вось дзе яго ўзводзіць — у Чыкілях ці ў Казловічах? Магчыма, палеміка зацягнулася б надоўга, калі б не чыкілёўцы: яны аказаліся больш ініцыятыўнымі

Выпускнікі Чыкілёўскай сярэдняй школы. 1958 г.

і дружнымі. Жыхары гэтай вёскі Герман Кірэевіч Тоўсцік, Лазар Мікалаевіч Кулік і Ціт Аўрамавіч Алёхна першымі на сваіх конях пачалі вазіць з лесу бярвенні для будынка школы, збіраць і падвозіць каменне для яе фундамента, і ўжо да восені наступнага года памяшканне было здадзена пад ключ Міхаілу Сямёнавічу Лядзяну, які прыехаў настаўнічаць у Чыкілі. У школе меліся два класныя пакоі і кватэры для двух настаўнікаў. М.С.Лядзян працаваў у Чыкілях да 1934 г., быў адным з першых арганізатараў калектыўнай гаспадаркі і нават нейкі час з'яўляўся бухгалтарам створанага калгаса «Чырвоны пуцілавец». На жаль, ён загінуў у Вялікую Айчынную вайну. З 1934 г. Чыкілёўская школа стала сямігадовай. Для яе калгас пабудаваў яшчэ адно памяшканне. Дырэктарам школы прызначылі Івана Апанасавіча Сухана. Разам з ім у гэты час працавалі Васіль Купрыянавіч Крэйза, Анатоль Міхайлавіч Барай, Даніла Кірэевіч Белавушка, Уладзімір Кузьміч Каваленка, Станіслаў Францавіч і Антаніна Сямёнаўна Шумоўскія, Яўгенія Аляксандраўна Дудар. Калі пачалася савецка-фінляндская вайна, усе настаўнікі школы былі мабілізаваны ў армію. У час фашысцкай акупацыі будынак школы быў абрабаваны, паўразбураны. Давялося прыкласці нямала сіл, каб прывесці школьныя памяшканні ў парадак. Настаўніцкі калектыў з 1944 г. узначаліў Васіль Марцінавіч Сысой, завучам працаваў Уладзімір Кузьміч Каваленка, настаўнікамі — Анатоль Андрэевіч Зайцаў, Юлія Цімафееўна Трыбуш, Кацярына Цімафееўна Алёхна, Анастасія Рыгораўна Муха, Таццяна Цімафееўна Тоўсцік, піянерважатай Ганна Марцінаўна Сысой. У 1949 г. школа папоўнілася новымі педкадрамі. З гэтага часу дырэктарам школы працаваў Канстанцін Андрэевіч Гуткоўскі, завучам — Антаніна Васільеўна Паўлава. З 1954 г. школа атрымала статус сярэдняй, яе настаўніцкі калектыў узначаліла А.В.Паўлава. Школа дала пуцёўку ў жыццё больш як 400 выхаванцам. Многія з іх закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы. З дыпломамі настаўнікаў вярнуліся ў родную вёску Ганна Андрэеўна Уласік, Іван Савельевіч Мароз, Марыя Іосіфаўна Нікітка, Віктар Цімафеевіч Сысой, Ева Цімафееўна Сысой, Ядвіга Аляксееўна Сысой, Надзея Апанасаўна Кулік, Галіна Цітаўна Алёхна. Шмат добрых спраў у летапіс школы ўпісалі Галіна Герасімаўна Тоўсцік, Ніна Лук'янаўна і Павел Іванавіч Пасько, Рыгор Іванавіч і Настасся Васільеўна Клімовічы, Валянціна Міхайлаўна Мароз, Аляксандра Афанасьеўна Грышчанка, І.Б.Агрызка, А.П.Жаркевіч, І.А.Жаркевіч, Іван Іванавіч Калошка, Алена Фёдараўна Лях, Васіль Астапавіч Мароз і многія іншыя. З памяншэннем колькасці навучэнцаў школа з 1981 г. стала васьмігадовай, потым паступова пераўтварылася ў пачатковую, а ў 1986 г. наогул была закрыта. У яе будынках пэўны час размяшчаўся ваенна-спартыўны лагер для дапрызыўнай моладзі.

Т.А.Матусевіч.

Вызначыліся працай

Глушчына заўсёды славілася працавітымі людзьмі. Многія яе ўраджэнцы былі ў ліку тых, хто памнажаў славу Айчыны. Гэта выявілася найбольш яскрава ў гады мірнай стваральнай працы, калі сотні яе працаўнікоў былі ўдастоены ганаровых званняў, высокіх урадавых узнагарод, дэманстравалі свае здабыткі на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, прадстаўлялі сваіх землякоў у дзяржаўных органах улады.

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

БАРЫСІК Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1926 г. у в. Горнае. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля перамогі над ворагам працягваў службу ў Савецкай Арміі, у 1950 г. дэмабілізаваўся і вярнуўся ў родныя мясціны. Закончыў курсы па падрыхтоўцы машыністаў экскаватараў. Чалавекам найвялікшай адказнасці зарэкамендаваў ён сябе ўсюды, дзе даводзілася працаваць, але вялікая слава прыйшла да яго тады, калі звязаў свой далейшы лёс з меліярацыяй. З 1959 г. працаваў у Старадарожскай машынна-меліярацыйнай станцыі. Заслужаны меліяратар БССР (1965). Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1967—1972 гг. Ганаровы грамадзянін

В.І.Барысік.

Л.К.Ахрэмчык.

М.Л.Васілеўскі.

г. Старыя Дарогі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (двойчы).

РУДНІЦКАЯ Надзея Кірылаўна, нарадзілася ў 1918 г. у в. Барбарова. Пасля вызвалення раёна працавала ў калгасе, з 1947 г. узначальвала звяно па вырошчванні збожжавых культур. Затым пераехала на новае месцажыхарства ў Бабруйскі раён, працавала звеннявой у калгасе імя XXII з'езда КПСС. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1948 г. за атрыманне высокіх ураджаяў збожжавых культур. Памерла ў 1966 г.

ШАПЛЫКА Аляксандра Аляксандраўна, нарадзілася ў 1893 г. у в. Макавічы. Тут прайшло дзяцінства, тут вырасла і працавала ў калгасе. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пераехала на Любаншчыну, узначаліла звяно па вырошчванні кок-сагызу ў калгасе «Чырвоная змена». За вялікія ўраджаі гэтай важнай тэхнічнай культуры А.А.Шаплыка ў 1949 г. удастоена звання Героя Сацыялістычнай Працы.

УЗНАГАРОДЖАНЫЯ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

АХРЭМЧЫК Леанід Кірылавіч, нарадзіўся ў 1937 г. у в. Барысаўшчына. Пасля заканчэння сельскагаспадарчага тэхнікума быў накіраваны на работу ў саўгас «Глускі». І тут спаўна раскрыліся рысы яго як маладога спецыяліста, сапраўднага хлебароба. Комплексная брыгада, якую ён узначальваў чатыры гады, з адстаючай выйшла ў перадавыя, і ў гэтым Л.К.Ахрэмчык бачыў не сваю асабістую заслугу, а тых людзей, якія працавалі з ім побач, — жывёлаводаў, механізатараў, паляводаў. Яго арганізатарскія здольнасці не маглі быць не заўважанымі: у 1973 г. малады брыгадзір атрымаў першую сваю ўзнагароду — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пасля заканчэння сельскагаспадарчай акадэміі Л.К.Ахрэмчык працаваў галоўным аграномам саўгаса, вырас у аднаго з найбольш вопытных спецыялістаў раёна. Прызнаннем яго заслуг на гэтай пасадзе была высокая ўзнагарода Радзімы — ордэн Леніна. Цяжкая хвароба не дала да канца раскрыцца яго здольнасцям. Памёр у 1997 г.

ВАСІЛЕЎСКІ Мікалай Лявонавіч, нарадзіўся ў 1933 г. у в. Карніца. Калі пасталеў, пайшоў працаваць у калгас, бо іншага месца для сябе не шукаў. Любіў зямлю, прыроду, з якімі быў звязаны штодзённа, размераны, спакойны рытм вясковага жыцця. Вывучыўся на механізатара і, як кажуць, прыкіпеў душой да тэхнікі, ведаў яе да драбніц, на слых распазнаваў яе стан, таму і працавала яна надзейна. Але перавагу чамусьці аддаваў камбайнам — збожжа- і бульбаўборачным. Да ўборкі, што вянчала працу калгасных хлебаробаў, ставіўся вельмі адказна; разумеў, што ў гаспадарцы з ёй звязваюць усе надзеі, нездарма ж кажуць: не той ураджай, што ў полі, а той, што ў засеках. Таму М.Л.Васілеўскаму як лепшаму механізатару штогод даручалі прымаць удзел ва ўборачным канвееры, дзе ён заўсёды дабіваўся высокіх намалотаў збожжа і накопваў не адну сотню тон клубняў. У 1970 г., напрыклад, намалаціў звыш 1000 т збожжа, накапаў больш як 800 т бульбы. За старанную працу атрымліваў розныя ўзнагароды: дыпломы, граматы, падзякі. У 1971 г. за высокія паказчыкі ўзнагароджаны ордэнам Леніна. М.Л.Васілеўскі на пенсіі, жыве ў в. Зарэсце Магілёўскага раёна.

ЖЛОБІЧ Леанід Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Сіманавічы. Трактарыст машынна-дарожнай станцыі ў г. Бабруйск, з 1960 г. трактарыст саўгаса «Дойнічава» Бабруйскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

КЛІМОВІЧ Васіль Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Рылавічы. Падрос, стаў займацца той жа справай, што бацькі і ўсе родзічы ў вёсцы, працаваў на зямлі, араў, сеяў, убіраў ураджай у мясцовым калгасе імя Калініна. Але мірнай працы перашкодзіла вайна. Васіль пайшоў у партызанскі атрад імя Кірава, якім камандаваў М.Б.Храпко. Пасля вызвалення раёна ад фашыстаў служыў у арміі. Дэмабілізаваўшыся, вярнуўся ў свой жа калгас, закончыў курсы і стаў лепшым у гаспадарцы механізатарам. Працаваў сумленна, старанна, быў адзначаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, іншымі ўзнагародамі. Але вяршыня яго працоўнай біяграфіі — 1974 г., калі камбайнер В.К.Клімовіч стаў пераможцам абласнога спаборніцтва, намалаціўшы за сезон 700 т збожжа. У 1975 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1993 г.

ЛАДОНЬКА Міхаіл Карпавіч, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Кляшчоўка ў сялянскай сям'і. Усё сваё свядомае жыццё звязаў з зямлёй, з родным калгасам, з яго справамі. Тут ён з радавога палявода вырас да вядомага механізатара-універсала, сапраўднага майстра хлебнай нівы. Ён з аднолькавым поспехам валодаў любой сельскагаспадарчай тэхнікай. У час жніва звычайна садзіўся на камбайн, працаваў самаддана, паказваў, на што здольны і сам, і тэхніка ў яго руках. У 1972 г. праславіўся на жніве, калі намалаціў за сезон у сваім калгасе «Звязда» 560 т збожжа ды яшчэ і калгасу «Праўда» падсабляў ва ўборцы. І там у свой актыў прыплюсаваў яшчэ больш як 150 т. У тым годзе ён атрымаў сваю першую ўзнагароду — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, а праз пяць гадоў — ордэн Леніна. Памёр у 1987 г.

ЛЯПКО Марыя Ільінічна, нарадзілася ў 1931 г. у в. Баянава ў сялянскай сям'і. У час Вялікай Айчыннай вайны падлеткам знаходзілася ў партызанскім атрадзе, якім камандаваў У.М.Шваякоў. Сваю працоўную дзейнасць пачала ў 1947 г. у мясцовым калгасе звеннявой па вырошчванні кок-сагызу і на розных палявых работах.

В.К.Клімовіч.

М.К.Ладонька.

М.І.Ляпко.

Н.К.Невяроўская.

У 1960 г. узяла для догляду групу цялят, пазней стала даяркай, як і яе маці Вольга Мацвееўна. На ўсё жыццё запомніла мацярынскае пажаданне: «Так працуй, Марыйка, каб мне за тваю работу ніколі саромецца не даводзілася, працуй сумленна, тады і поспехі прыйдуць, і павага людская цябе не мінe». Па мацярынскім наказе і працавала на ферме аж да 1990 г., нават будучы пенсіянеркай. За высокія паказчыкі ў працы ўдастоена высокай урадавай узнагароды — ордэна Леніна. Жыве ў Асіповіцкім раёне.

НЕВЯРОЎСКАЯ Наталля Канстанцінаўна, нарадзілася ў 1922 г. у в. Забалацце. Працоўны шлях пачала з 1935 г. паляводам у саўгасе «Харомцы». Праз два гады сям'я пераехала ў Завалочыцы, дзе Н.К.Невяроўская стала жывёлаводам. Выбраная прафесія даяркі аказалася адзінай на ўсё жыццё — да 1977 г. Першую ўзнагароду — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга — яна атрымала ў 1958 г., крыху пазней узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». У 1960-я гады яе прозвішча

П.Ц.Прышчэпаў.

І.М.Радкевіч.

А.В.Скіндзер.

М.М.Скубей.

становіцца вядомым ва ўсім раёне: Н.К.Невяроўская адной з першых сярод даярак пераўзышла 3-тысячны рубеж па надоі малака ад каровы. Потым яе працоўныя поспехі сталі яшчэ больш значныя. Яна неаднаразова ўдзельнічала ў Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, узнагароджана залатым і двума бронзавымі медалямі выстаўкі. У 1971 г. удастоена высокай узнагароды — ордэна Леніна, у 1973 г. — ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі. У той жа год надаіла па 5300 кг малака ад кожнай каровы. На пенсіі, жыве ў в. Завалочыцы.

ПРЫШЧЭПАЎ Пётр Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Верхняя Алба Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і калгаснікаў. У 1948 г. прызваны ў армію. Дэмабілізаваўшыся, падаўся ў Мінск на курсы экскаватаршчыкаў. Пасля заканчэння вучобы працаваў у Жлобінскай лугамеліярацыйнай станцыі. Тады ў меліяратараў быў раз'язны характар работы. Так Пётр Цімафеевіч і «калясіў» па розных раёнах рэспублікі, пакуль не трапіў на Глушчыну. З 1953 г. стаў працаваць у Глускай ПМК меліярацыі. У 1991 г. ветэран стаў пенсіянерам. Увесь гэты час П.Ц.Прышчэпаў заслужана ўваходзіў у кагорту лепшых меліяратараў. За 1965—1970 гг. выканаў два пяцігадовыя заданні. У 1971 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. Жыве ў Глуску.

РАДКЕВІЧ Іван Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1927 г. у в. Нова-Андрэеўка. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прызваны ў армію, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Германіі і закончыў вайсковую службу ва Уральскай ваеннай акрузе. Яго цягнула да тэхнікі, таму і стаў трактарыстам-экскаватаршчыкам. Пачаў працаваць у ПМК-86. З удзелам І.М.Радкевіча ў раёне асушаліся многія балоты. Работай яго былі задаволены. За працу меў шматлікія ўзнагароды: падзякі, граматы. Вялікіх поспехаў у працы дасягнуў у 1961—1965 гг., а ў 1971 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

СКІНДЗЕР Алена Венядзіктаўна, нарадзілася ў 1916 г. у в. Макавічы. У 1941 г. закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, была накіравана ўрачом на Жлобіншчыну, дзе яе і застала вайна. У гады вайны А.В.Скіндзер удзельнічала ў партызанскім руху на Беларусі, з красавіка 1944 г. узначаліла Пірэвіцкі ўрачэбны ўчастак, што на Жлобіншчыне. Пазней стала загадчыцай Пірэвіцкай сельскай бальніцы. Чалавек з няўрымслівым характарам і неспакойным сэрцам Алена Венядзіктаўна многа зрабіла для паляпшэння аховы здароўя сельскіх працаўнікоў, за што ў 1961 г. і была ўзнагароджана ордэнам Леніна, крыху пазней стала заслужаным урачом БССР. З 1963 г. працавала намеснікам галоўнага ўрача паліклінікі ВКК г. Жлобін. Памерла ў 1965 г.

СКУБЕЙ Марыя Мікалаеўна, нарадзілася ў 1913 г. у в. Завалочыцы. З 1927 г. працавала ў жывёлагадоўлі мясцовага саўгаса. Праз 10 гадоў стала брыгадзірам малочнатаварнай фермы і знаходзілася на гэтай пасадзе аж да 1969 г. Поспехі, якія прыйшлі на ферму, нельга было не заўважыць. Калектыў неаднаразова з'яўляўся ўдзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі, а сама М.М.Скубей у 1955 г. была ўзнагароджана медалём выстаўкі. За самаадданую працу ў 1966 г. яе ўзнагародзілі ордэнам Леніна. Цяпер на пенсіі.

ТУЗІК Андрэй Іванавіч, нарадзіўся ў 1905 г. у в. Калацічы. Усё сваё жыццё зай-

маўся развіццём сувязі. Да вайны працаваў у Петрыкаўскім лінейна-тэхнічным участку (ЛТУ) сувязі, а з кастрычніка 1944 г. — у Глуску. Перш чым стаць кіраўніком, прайшоў многія рабочыя ступені: манцёра, тэхніка, памочніка начальніка. У 1962 г. назначаны начальнікам Глускага ЛТУ сувязі. Пасля скасавання раёна працаваў манцёрам Бабруйскага эксплуатацыйна-тэхнічнага вузла сувязі. За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў сямігадовага плана па развіцці сродкаў сувязі, тэлебачання і радыёвяшчання ў 1966 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. І пасля гэтага ён яшчэ працягваў працаваць намеснікам начальніка Глускага ЛТУ сувязі, а з 1976 г. пайшоў на пенсію. Памёр у 1993 г.

ХУРСАН Леанід Іванавіч, нарадзіўся ў 1939 г. у г. Бабруйск у сям'і настаўніка. Бацька загінуў на фронце, сям'я пераехала на радзіму, у в. Барбарова. Пасля службы ў арміі вярнуўся ў калгас, дзе спачатку працаваў паляводам, потым учотчыкам комплекснай брыгады. А з 1967 г. узначаліў гэта вытворчае падраздзяленне і дабіўся ў яго дзейнасці прыкметных поспехаў. Ураджайнасць збожжавых у брыгадзе Л.І.Хурсана была самая высокая ў калгасе. Пачаў з 9—11 ц, а за пяць год узняў яе да 32,1 ц. Такім быў вынік доўгай, настойлівай працы. І як прызнанне яго заслуг на пасадзе кіраўніка сярэдняга звяна — узнагароджанне ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Л.І.Хурсан двойчы ўдзельнічаў у Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. Узнагароджаны медалём выстаўкі. Працаваў старшынёй Клятнянскага сельскага Савета. Памёр у 1998 г.

ШАКАЛІС Антаніна Савельеўна, нарадзілася ў 1935 г. у Манастыршчынскім раёне Смаленскай вобласці, Расія. У 1958 г. скончыла Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. З гэтага часу працавала галоўным заатэхнікам саўгаса «Завалочыцы». Дзякуючы яе намаганням у жывёлагадоўлі гаспадаркі адбыліся прыкметныя зрухі. У 1966 г. за высокія паказчыкі ў працы ўзнагароджана ордэнам Леніна. У 1973—1986 гг. працавала дырэктарам Магілёўскага аблплемтрэста. Памерла ў 1986 г.



А.І.Тузік.



Л.І.Хурсан.

А.С.Шакаліс.

УЗНАГАРОДЖАНЫЯ ОРДЭНАМ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

БЕРАЗУН Аркадзь Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1925 г. у в. Нежын Любанскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сельскагаспадарчага тэхнікума працаваў у калгаснай вытворчасці. Значны час узначальваў паляводчую брыгаду ў калгасе імя Чапаева (зараз аграфірма «Слаўкавічы»). Добрае веданне справы, умелае кіраўніцтва брыгадай вывелі яе ў перадавыя па вырошчванні высокіх ураджаяў збожжавых культур і бульбы. У 1971 г. узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Пенсіянер. Жыў у г. Бабруйск.

ГЕЛЕР Барыс Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1910 г. у Гомельскай вобласці. Да вайны закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум, атрымаў спецыяльнасць агранома. У час Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце. У пасляваенныя гады значны час працаваў на Глушчыне — спачатку дырэктарам Глускай МТС, а з 1958 г. старшынёй калгаса «Радзіма», зарэкамендаваў сябе вопытным кіраўніком, чулым і ўважлівым да патрэб людзей. У калгасе «Радзіма», які ён узначальваў больш за дзесяць гадоў, на вялікіх плошчах была праведзена мелія-

Л.К.Карцель.

Р.С.Палуян.

Ф.І.Філіповіч.

рацыя забалочаных зямель, што дазволіла значна павысіць ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, умацаваць эканоміку гаспадаркі, вырашыць многія сацыяльныя праблемы. У 1971 г. за высокія паказчыкі ў развіцці калгаса ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Жыве ў Ізраілі.

ДАВЫДКОВІЧ Міхаіл Лазаравіч, нарадзіўся ў 1922 г. у Глуску. Закончыў Глускую сярэднюю школу. У 1939 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Вялікая Айчынная вайна застала яго ў Варонежскай вобласці. Ваяваў пад Растовам, Данецкам, Адэсай. Баявы шлях адважнага камандзіра гарматнага разліку пралёг да сталіцы Аўстрыі — Вены, а яго грудзі ўпрыгожылі многія ўзнагароды. За смеласць і мужнасць, праяўленыя пры фарсіраванні Буга, быў адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга, за ўзяцце Вены — ордэнам Славы III ступені. Разам з баявым разлікам прымаў удзел ва ўрачыстым парадзе, які адбыўся на плошчы вызваленай Вены. М.Л.Давыдковіч доўгі час працаваў у спажывецкай кааперацыі, узначальваў раённую нарыхтоўчую кантору, дабіўся значнага павелічэння аб'ёмаў нарыхтовак сельскагаспадарчай сыравіны. У 1971 г. узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Жыве ў г. Барысаў.

КАРЦЕЛЬ Лідзія Кірылаўна, нарадзілася ў 1930 г. у в. Малыя Амговічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Працоўную дзейнасць пачала ў 15 гадоў, вырасла да кіраўніка самай буйной гаспадаркі ў Глускім раёне — саўгаса «Завалочыцы», вопыт якога пераймалі многія гаспадаркі. Л.К.Карцель узначальвала саўгас 26 гадоў. Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы 1966, 1986), «Знак Пашаны», медалямі. Двойчы выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Некалькі гадоў з'яўлялася членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Жыве ў в. Завалочыцы.

МАРАЧКОЎ Мікалай Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1941 г. у в. Цяснова. Ад бацькоў пераняў любоў да зямлі, да прафесіі хлебароба, што і вывела яго ў лік першых механізатараў калгаса «Гвардыя». Таму, калі ў гаспадарцы вызначалі звеннявых па вырошчванні бульбы, выбар выпаў на М.Ф.Марачкова. Праз некаторы час імя перадавога звеннявога-бульбавода стала вядома ва ўсім раёне. Па 270 ц бульбы і больш складала ўраджайнасць у яго звяне. Старанная праца звеннявога адзначана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны». Жыве ў в. Цяснова.

ПАЛУЯН Раман Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Валосавічы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Фашысцкае нашэсце перапыніла мірную працу. Ён прайшоў многімі ваеннымі дарогамі: абараняў Адэсу, Крым, Каўказ, вызваляў Польшчу. За ратныя подзвігі меў баявыя ўзнагароды. Працаваў у Глуску дырэктарам арцелі «Прагрэс», прамкамбіната. З 1966 г. узначаліў «Міжкалгасбуд», дзе праявіў арганізатарскія здольнасці. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1992 г.

ФІЛІПОВІЧ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1915 г. у в. Зубарэвічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, яго ратны шлях адзначаны некалькімі баявымі ўзнагародамі. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў родныя мясціны, дапамагаў адраджаць разбу-

раную вайной гаспадарку. Працаваў трактарыстам у МТС, потым у калгасе «Рассвет». Ф.І.Філіповіч сярод калгаснікаў валодаў велізарным аўтарытэтам, які заваяваў сваімі сумленнымі адносінамі да працы, сапраўдным майстэрствам у рабоце. Неаднаразова адстойваў гонар лепшага аратага ў раёне, у спаборніцтвах аратых вобласці і рэспублікі займаў прызавыя месцы. Яму выпаў гонар называцца заслужаным аратым рэспублікі. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1983 г.



Я.А.Райхман.

Ц.М.Сяргейчык.



А.Ф.Марціновіч.

ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ СССР

РАЙХМАН Якаў Аронавіч, нарадзіўся ў 1924 г. у Глуску. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1977). Доктар тэхнічных навук (1979). Закончыў Глускую сярэднюю школу, Маскоўскі энергетычны інстытут (1952). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Да 1959 г. працаваў у Падмаскоўі, затым у Мінску, спачатку на заводзе вылічальных машын імя Арджанікідзе, з 1963 г. у канструктарскім бюро дакладнага электроннага машынабудавання канцэрна «Планар». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені (двума), Чырвонай Зоркі, многімі медалямі. Жыве ў Мінску.

СЯРГЕЙЧЫК Цімафей Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1899 г. у в. Заполле. Народны артыст Беларусі (1944), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). Закончыў Беларускую драматычную студыю ў Маскве (1926). У 1919—1923 гг. удзельнічаў у чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Быў адным з заснавальнікаў Беларускага тэатра імя Якуба Коласа. У 1926—1975 гг. з'яўляўся акцёрам гэтага тэатра, стварыў на яго сцэне дзесяткі запамінальных вобразаў. Майстар сцэнічнага пераўвасаблення. Творчасці ўласціва высокае майстэрства, жывая праўда, глыбокае пранікненне ў вобраз, уменне спалучаць індывідуальныя рысы характару героя з яго сацыяльнай сутнасцю. Ц.М.Сяргейчык работу акцёра спалучаў з выкладчыцкай дзейнасцю, быў мастацкім кіраўніком студыі-тэатра, выкладаў майстэрства акцёра. Аўтар тэатральных успамінаў «Нататкі акцёра» (1966). Ганаровы грамадзянін Віцебска. Памёр у 1977 г

ЛАЎРЭАТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

ВАСІЛЕЎСКІ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1942 г. у в. Мыслоціна. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1978). З 1960 г. працаваў прасаўшчыком на Сечынскім домабудаўнічым камбінаце, затым з 1968 г. брыгадзір прасаўшчыкоў, аператар-прасаўшчык вытворчага аб'яднання «Бабруйскдрэў».

ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

МАРЦІНОВІЧ Аляксандр Фаміч, нарадзіўся ў 1950 г. у Глуску ў сям'і служачых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978). Закончыў глускую СШ № 2, Мінскі радыётэхнічны інстытут. Працаваў на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл» — майстрам цэха, інжынерам, старшым інжынерам-тэхнолагам, галоўным інжынерам, намеснікам дырэктара. З 1997 г. працуе на вытворчым аб'яднанні «Гарызонт». Жыве ў Мінску.

Г.І.Слук.

В.А.Шыманскі.

В.К.Іваноў.

Ф.М.Янкоўскі.

ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ ІМЯ Н.К.КРУПСКАЙ

СЛУК Галіна Іванаўна, нарадзілася ў 1938 г. у в. Дабравольца Парыцкага раёна ў сям'і настаўнікаў. Лаўрэат прэміі імя Н.К.Крупскай (1986). Закончыла Брожскую СШ Бабруйскага раёна, філалагічны факультэт Магілёўскага педінстытута. Працоўную дзейнасць пачала на Глушчыне ў 1956 г. старшай піянерважатай Бярозаўскай СШ, потым працавала настаўніцай, намеснікам дырэктара, у 1972—1994 гг. дырэктар гэтай школы. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Пенсіянерка. Жыве ў в. Згода.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСІ

Заслужаны будаўнік

ШЫМАНСКІ Васіль Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1927 г. у г. Капыль Мінскай вобласці. З 1944 г. служыў у Савецкай Арміі. З 1951 г. вучыўся ў Мінскай школе дзесятнікаў-будаўнікоў. З 1952 г. працаваў у Глускім БМУ меліярацыі экскаватаршчыкам, з 1986 г. — на пенсіі. У 1974 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Званне прысвоена ў 1975 г. Жыве ў Глуску.

Заслужаны дзеяч мастацтваў

ІВАНОЎ Валерый Кірылавіч, нарадзіўся ў 1948 г. у Глуску. Закончыў глускія сярэднюю і музычную школы, музычнае вучылішча, Беларускую кансерваторыю (1975) класа кампазіцыі дацэнта П.Падкавырава. З 1977 г. выкладае ў Беларускай акадэміі музыкі. Кампазітарскую дзейнасць пачаў з лірычных песень, пазней пачаў пісаць і патрыятычныя творы. Член Саюза кампазітараў Беларусі з 1977 г. Асобнае месца ў творчасці В.К.Іванова займае вакальна-сімфанічная паэма «Элегія аб чацвёртай бярозе». За яе, а таксама песні аб камсамоле і моладзі ў 1978 г. удастоены звання лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. У 1989 г. за цыкл песень «Будзьце абавязку верныя» ўзнагароджаны сярэбраным медалём імя А.В.Аляксандрава. Піша аркестравую, камерна-інструментальную, вакальную музыку, а таксама для спектакляў, радыёспектакляў, тэлефільмаў. Ім створана музыка да кінафільмаў «Справа для сапраўдных мужчын» (1983), «Не забудзьце выключыць тэлевізар» (1986). Званне прысвоена ў 1988 г. Жыве ў Мінску.

Заслужаныя дзеячы навукі

ЗУБЕЦ Васіль Марцінавіч, нарадзіўся ў 1907 г. у в. Гарадок. Беларускі вучоны ў галіне меліярацыі. Доктар тэхнічных навук (1969), прафесар (1970). Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1932). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1954 г. — першы намеснік міністра, міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. У 1959—1977 гг. дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і воднай гаспадаркі. Навуковыя працы па эксплуатацыі асушальных, асушальна-ўвільгатняльных сістэм, метадах і спосабах меліярацыі, рэгуляванні воднага рэжыму, навуковай арганізацыі працы. Званне прысвоена ў 1973 г.

ЯНКОЎСКІ Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Клетнае. Закончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум (1936), Мінскі настаўніцкі інстытут (1939), Гродзенскі педагагічны інстытут (1948). Доктар філалагічных навук (1970), прафесар (1970). Пасля заканчэння педтэхнікума

працаваў настаўнікам Буцавіцкай школы Мінскага раёна. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну — разведчык, начальнік разведкі партызанскага атрада «Грозны» на Міншчыне. Быў цяжка паранены. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў адказным сакратаром рэдакцыі глускай раённай газеты «Сацыялістычная вёска», настаўнікам у Глускай сярэдняй школе, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Радашковіцкай сярэдняй школе, вучыўся ў аспірантуры. З 1953 г. працаваў выкладчыкам, у 1956—1982 гг. — загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага. Друкаваўся з 1954 г. У кандыдацкай дысертацыі «Глускія гаворкі» (1954) дэталёва апісаў фанетычную і марфалагічную сістэму глускіх гаворак, растлумачыў узнікненне асобных дыялектных рыс. Аўтар каля 300 навуковых прац, у т.л. «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы», «Дыялектны слоўнік», «Крылатыя словы і афарызмы», «Пытанні культуры мовы», «Беларускае літаратурнае вымаўленне», «Гістарычная граматыка беларускай мовы» і інш. Выдаў кнігі навел, апавяданняў, літаратурных мініяцюр «Абразкі», «Прыпыніся на часіну», «І за гарою пакланюся», «Радасць і боль», «Само слова гаворыць». Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі. Званне прысвоена ў 1972. Памёр у 1989 г.

Заслужаны меліяратар

ДОЛБІК Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Новыя Юрковічы Любанскага раёна Мінскай вобласці. У 1939 г. закончыў Мінскі гідратэхнікум, пасля быў прызваны ў армію, дзе яго і застала вайна. Удзельнічаў у многіх вызваленчых аперацыях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасля вайны працаваў у Любанскім раёне, займаўся меліярацыяй. З 1961 г. узначаліў Глускае БМУ меліярацыі, дзе працаваў да 1976 г. І.С.Долбік унёс значны ўклад у развіццё раёна, правядзенне асушальных работ на велізарных забалочаных плошчах калгасаў і саўгасаў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Званне прысвоена ў 1971 г. Памёр у 1977 г.

І.С.Долбік.

А.К.Афанасенка.

М.М.Буеўская.

Заслужаныя настаўнікі

АФАНАСЕНКА Анастасія Кузьмінічна, нарадзілася ў 1930 г. у в. Пятровічы Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла фізіка-матэматычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. З 1954 г. працавала настаўніцай Касарыцкай СШ, настаўніцай, завучам, дырэктарам Каткаўскай СШ, інспектарам райана. З 1967 г. — у Завалочыцкай СШ. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», была дэлегатам VI з'езда настаўнікаў Беларусі. Званне прысвоена ў 1978 г. Жыве ў в. Завалочыцы.

БУЕЎСКАЯ Марыя Майсееўна, нарадзілася ў 1930 г. у в. Камаровічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Слуцкае педвучылішча і Магілёўскі педагагічны інстытут. З 1952 г. па 1993 г. працавала настаўніцай матэматыкі ў глускай СШ № 2. Званне прысвоена ў 1978 г. Жыве ў Глуску.

ВАЛАДЗЬКО (ПАРАХНЕВІЧ) Таццяна Міхайлаўна, нарадзілася ў 1931 г. у в. Барбарова. Закончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1955). У 1955—1982 гг. працавала настаўніцай Варатынскай СШ Баб-

М.К.Гардзіенка.

Г.Н.Кандрацьева.

В.Ф.Кульбіцкі.

М.А.Малашук.

С.К.Мікульская.

І.І.Сысой.

руйскага раёна. Званне прысвоена ў 1968 г. Жыве ў в. Варатынь Бабруйскага раёна.

ГАРДЗІЕНКА Міхаіл Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Княжыца Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Мазырскі настаўніцкі, Магілёўскі педагагічны (1959) інстытуты. З 1950 г. працаваў настаўнікам Касарыцкай СШ. З 1954 г. завуч, у 1960 — 1988 гг. дырэктар Гарадоцкай школы. Званне прысвоена ў 1967 г. Жыве ў в. Гарадок.

КАНДРАЦЬЕВА Ганна Нікандраўна, нарадзілася ў 1927 г. у Маскве ў сям'і навуковага работніка. Закончыла геаграфічны факультэт Маскоўскага педагагічнага інстытута. З 1952 г. настаўніца гомельскай СШ № 16, з 1953 г. настаўніца глускай СШ № 2. Званне прысвоена ў 1976 г. Жыве ў Глуску.

КРУЦЬКО Надзея Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1925 г. у в. Слаўкавічы. Закончыла Бабруйскае педвучылішча (1946), Мінскі педагагічны інстытут. З 1950 г. працавала настаўніцай пачатковай школы ў в. Заграбелле Акцябрскага р-на, потым у Слаўкавіцкай школе, з 1954 г. — дырэктарам, з 1965 г. — настаўніцай Зоркаўскай пачатковай школы. Званне прысвоена ў 1967 г. Жыве ў Бабруйску.

КУЛЬБІЦКІ Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Поблін. Закончыў Бабруйскае педвучылішча, Магілёўскі пединстытут (1960). Працаваў загадчыкам і настаўнікам Лужыцкай пачатковай школы Ашмянскага раёна. З 1953 г. і да выхаду на пенсію працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы глускай СШ № 1. Званне прысвоена ў 1974 г. Жыве ў Глуску.

МАЛАШУК Марыя Арцёмаўна, нарадзілася ў 1919 г. у в. Юзафова. Закончыла Віцебскае педвучылішча, Мінскі пединстытут. Працавала настаўніцай пачатковых класаў у Талачынскім раёне Віцебскай вобласці, у Днепрапятроўскай вобласці (Украіна). З 1945 г. і да выхаду на пенсію настаўніца пачатковых класаў у глускай СШ № 2. У 1966 г. узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Званне прысвоена ў 1968 г. Памерла ў 1988 г.

МІКУЛЬСКАЯ Соф'я Кузьмінічна, нарадзілася ў 1929 г. у в. Белічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, з 1954 г. працавала настаўніцай хіміі і біялогіі глускай СШ № 1, затым — Макавіцкай СШ. Званне прысвоена ў 1973 г. Жыве ў в. Макавічы.

МІКУЛЬСКІ Міхаіл Адамавіч, нарадзіўся ў 1923 г. у в. Людвінова. Закончыў Мінскі пединстытут (1957). З 1940 г. настаўнік гісторыі ў Старадарожскім раёне Мінскай вобласці. Удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну. З 1944 г. настаўнік, дырэктар сямігадовай

школы ў Глускім раёне. З 1949 г. загадчык Глускага райана, з 1955 г. намеснік старшыні Глускага райвыканкома. З 1963 г. загадчык Бабруйскага райана. У 1977—1994 гг. дырэктар Ленінскай СШ Бабруйскага раёна. Званне прысвоена ў 1974 г.

СЫСОЙ Іван Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1922 г. у в. Прыварацце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Мінскі настаўніцкі і Мінскі педагагічны (1959) інстытуты. Працаваў у Глускай школе-інтэрнаце, з 1962 г. — дырэктар. Званне прысвоена ў 1968 г. Памёр у 1989 г.

СЯНЮК Соф'я Сямёнаўна, нарадзілася ў 1918 г. у в. Масты. Закончыла педкурсы пры Глускім райана (1939), Бабруйскае педвучылішча (1946). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працавала настаўніцай пачатковых класаў Сіманавіцкай васьмігадовай школы. Званне прысвоена ў 1971 г. Жыла ў г. Навагрудак.

ЯЛЬЧЫК Цярэнцій Савіч, нарадзіўся ў 1921 г. у в. Катка. Закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, загадчыкам райана, у 1966—1985 гг. дырэктар Каткаўскай СШ, арганізатар і доўгі час загадчык музея народнай славы ў в. Катка. Званне прысвоена ў 1967 г. Жыве ў Мінску.

ЯНКОЎСКАЯ Антаніна Васільеўна, нарадзілася ў 1923 г. у в. Крукаўшчына. Закончыла Усцярхоўскую СШ, Бабруйскі педрабфак (1940), курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, Мінскі настаўніцкі інстытут (1948), Мінскі педінстытут (1953). У 1940—1941 гг. працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў г. Кольна Беластоцкай вобласці. Актыўная ўдзельніца партызанскага руху на Глушчыне (гл. артыкулы «Непахісныя ў барацьбе», «Званок у партызанскай школе»). Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў працавала інструктарам па школах Бабруйскага райкома камсамола. У 1945—1978 гг. на педагагічнай рабоце. Працавала дырэктарам Чыкілёўскай і глускай № 1 сярэдніх школ. Званне прысвоена ў 1960 г. Памерла ў 1991 г.

Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання

ШЫЛАЎ Яўген Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1926 г. у в. Рудня. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, мае баявыя ўзнагароды. Пасля дэмабілізацыі працаваў у спажыўкааперацыі на розных пасадах: загадчык магазіна, старшыня Завалочыцкага саўгасрабкаапа, дырэктар гандлёвай зоны. Званне прысвоена ў 1968 г. Пенсіянер. Жыве ў в. Завалочыцы.

Ц.С.Яльчык.

А.В.Янкоўская.

Я.Ц.Шылаў.

М.А.Парахаўнік.

Заслужаны работнік культуры

ПАРАХАЎНІК Мікалай Афінагенавіч, нарадзіўся ў 1921 г. у в. Макавічы. Закончыў Макавіцкую сямігодку, Гомельскі фінансава-эканамічны тэхнікум (1939). У 1939 г. прызваны ў армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ваяваў у Прыбалтыцы, пад Масквой і Сталінградам, Варонежам і Курскам, Харкавам, прымаў удзел у Яска-Кішынёўскай аперацыі, вызваляў Венгрыю, доўгачаканую перамогу сустрэў у Аўстрыі. У пасляваенны перыяд большую частку свайго жыцця М.А.Парахаўнік прысвяціў раёну, у 1950—1984 гг. з невялікімі перапынкамі працаваў рэдактарам глускай раённай газеты. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971). Званне прысвоена ў 1982 г. Жыве ў г.п. Глуск.

Н.Ф.Шпілеўскі.

М.І.Бобрык.

Е.Р.Брэус.

А.С.Сямёнаў.

Заслужаны сувязіст

ШПІЛЕЎСКІ Напалеон Флер'янавіч, нарадзіўся ў 1926 г. у в. Турыно. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вызваляў Варшаву, браў Берлін, яго баявы шлях адзначаны ордэнамі і медалямі. Пасля вайны з 1951 г. працаваў у раённым вузле сувязі, унёс значны ўклад у справу радыёфікацыі раёна, быў адным з лепшых электраманцёраў цэха сувязі. Званне прысвоена ў 1972 г. Памёр у 1991 г.

Заслужаныя ўрачы

БОБРЫК Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1901 г. у Глуску. Вучыўся спачатку ў школе Глуска, затым у г. Бабруйск. Працаваў у розных установах раёна: сакратаром аддзела Глускага рэўкома (1920), настаўнікам сярэдняй школы (1920—1921). У 1921 г. паступіў на медыцынскі факультэт Беларускага універсітэта, паспяхова закончыў яго ў 1926 г. і застаўся працаваць у факультэцкай хірургічнай клініцы. У 1937 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, быў старшым хірургам палявых эвакашпіталяў № 21 і № 12 Заходняга фронту. Пасля вайны ўзначальваў кафедру агульнай хірургіі Віцебскага, потым Мінскага медыцынскіх інстытутаў, працаваў дырэктарам Рэспубліканскага анкалагічнага дыспансера. М.І.Бобрык — заснавальнік хірургічнага лячэння злаякасных пухлін некаторых органаў страваванння. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1946) і «Знак Пашаны». Званне прысвоена ў 1948 г. Памёр у 1956 г.

БРЭУС Ефрасіння Рыгораўна, нарадзілася ў 1913 г. у Глуску. У 1936 г. закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, працавала ўрачом у Мінску. Калі пачалася вайна, добраахвотна ўступіла ў Чырвоную Армію. Працавала хірургам эвакашпіталя. Прайшла ваенны шлях у складзе Цэнтральнага, Заходняга, 2-га Беларускага франтоў ад Масквы да Берліна. Узнагароджана некалькімі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны працавала ў Мінску ўрачом-тэрапеўтам. З 1951 г. галоўны ўрач гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера, мела восем друкаваных работ навуковага характару. Званне прысвоена ў 1960 г. Памерла ў 1983 г.

СЯМЁНАЎ Аляксандр Сцяпанавіч, нарадзіўся 1.6.1885 г. У 1913 г. закончыў Харкаўскі універсітэт і працаваў у земскай бальніцы ў Глуску. З 1914 г. трапіў на фронт. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актыўна ўдзельнічаў у рабоце салдацкіх рэвалюцыйных камітэтаў. У красавіку 1918 г. вярнуўся ў Глуск і працаваў урачом. Удзельнічаў у рабоце 1-га з'езда ўрачоў Беларусі, 1-га Усерасійскага з'езда сельскіх участковых урачоў. З першага дня Вялікай Айчыннай вайны ў Чырвонай Арміі, на розных урачэбных пасадах. З 1946 г. працаваў галоўным урачом раённай бальніцы. Званне прысвоена ў 1950 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1951). Адна з вуліц Глуска носіць яго імя.

З успамінаў прафесара Івана Анісімавіча Інсарава

Среди работников здравоохранения, внесших значительный вклад в медицинское обслуживание сельского населения, почетное место принадлежит заслуженному врачу Белорусской ССР Александру Степановичу Семенову, 53 года проработавшему в Глусском районе Могилевской области.

А.С.Семенов родился 1 июня 1885 г. в семье свя-

С.І.Грахоўскі.

І.М.Грышын.

К.Г.Кавалёў.

кома камсамола. У 1984—1987 гг. старшыня Бабруйскага райвыканкома, у 1987—1991 гг. першы сакратар Бялыніцкага РК КПБ. З лістапада 1991 г. працаваў намеснікам дырэктара па кадрах, камерцыйных пытаннях вытворчага аб'яднання «Бабруйскмэбля». У студзені 1995 г. выбраны старшынёй Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1997 г. З мая 1999 г. — намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома.

ГРАХОЎСКІ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся 25.9.1913 г. у мястэчку Нобель Зарэчненскага раёна Ровенскай вобласці, Украіна. Беларускі пісьменнік. Дзяцінства і юнацтва правёў у Глуску, куды маці вярнулася ў 1914 г. Тут закончыў сямігодку. Працоўны шлях пачаў у 1930 г. на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Да вайны закончыў літфак Мінскага педінстытута (1935), працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» і на Беларускім радыё. У 1936 г. беспадстаўна арыштаваны, асуджаны на 10 гадоў і сасланы на лесараспрацоўкі ў Горкаўскую вобласць. Пасля вызвалення і зняцця судзімасці ў 1946—1949 гг. настаўнічаў ва Урэччы Слуцкага раёна. У 1949 г. арыштаваны паўторна і высланы ў Новасібірскую вобласць. У 1955 г. поўнасцю рэабілітаваны. У 1956 г. вярнуўся ў Мінск. Працаваў на Беларускім радыё, у рэдакцыях «Бярозкі» і «Вясёлкі», старшынёй секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў, сакратаром камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР. Друкуецца з 1926 г. Актыўная творчая дзейнасць пачалася толькі пасля рэабілітацыі. З 1956 г. выйшлі 53 кнігі паэзіі, прозы, перакладаў твораў А.Пушкіна, А.Блока, Р.Тагора, Р.Гамзатава, Нэруды, Рыльскага, Сасюры, Варанько, М.Дудзіна і многіх іншых савецкіх і зарубежных аўтараў. Вершы С.Грахоўскага перакладаліся на англійскую, французскую, польскую, балгарскую, рускую, украінскую, грузінскую, таджыкскую і іншыя мовы народаў былога СССР. Крыніцай натхнення, сюжэтаў, вобразаў герояў была і застаецца Глушчына. С.Грахоўскі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992), Літаратурнай прэміі імя А.Куляшова (1983), заслужаны работнік культуры Беларусі (1983). Ганаровы грамадзянін Глуска з 1995 г.

ГРЫШЫН Ігар Мікалаевіч, нарадзіўся 19.4.1933 г. у Мінску. Беларускі вучоны ў галіне хірургіі. Акадэмік і прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1997). Доктар медыцынскіх навук (1975), прафесар (1977). Заслужаны дзеяч навукі (1989). Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1957). У 1950-я гады працаваў у глускай раённай бальніцы. З 1973 г. у Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў (з 1978 г. загадчык кафедры і кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра клінічнай і эксперыментальнай хірургіі). Навуковыя працы па хірургіі страваводa, крывяносных сасудаў, печані і жоўцевывадных шляхоў, падстраўнікавай залозы, эндакрыннай сістэмы, хірургічнай гастраэнтэралогіі і практalогіі. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1993 г. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1998 г.

КАВАЛЁЎ Кузьма Гаўрылавіч, нарадзіўся 22.9.1907 г. у с. Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. У чэрвені 1944 г. з'яўляўся начальнікам сувязі 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса, войскі якога вызвалялі г.п.Глуск і раён. Пасля вайны палкоўнік у адстаўцы, жыў у г. Рэутаў, працаваў на

А.І.Гурын.

22 июня 1941 г. фашистская Германия вероломно напала на Советский Союз. Мирный труд советских людей был прерван, началась тяжелая, длительная кровопролитная война. 23 июня А.С.Семенов был призван в Красную Армию. С болью в сердце он расставался со своим Глуском, со ставшим родным ему коллективом, думая, как и большинство из нас, что это ненадолго и что скоро наступит расплата с врагом. Скоро были призваны и остальные врачи: одни из них были в Красной Армии, другие — в рядах партизан Белоруссии. А.С.Семенов находился на разных врачебных должностях в Красной Армии, был демобилизован 26 июля 1946 г. и снова возвратился в Глуск.

Населенные пункты района сильно пострадали за годы войны и вражеской оккупации. Работали только 3 врача да несколько средних медицинских работников. А.С.Семенову не было времени для размышления: надо использовать свой опыт и немедленно приступать к работе. Он был назначен главным врачом районной больницы. А в деревнях много больных сыпным тифом, малярией, дизентерией: во много раз, по сравнению с 1940 г., увеличилась заболеваемость туберкулезом, чесоткой, детскими инфекционными болезнями: корью, скарлатиной, дифтерией. Многие деревни были сожжены, и народ жил в землянках. Тяжелые были годы, но народ был счастлив — наступил мирный созидательный труд. Постепенно залечивались раны. Восстановлены были предприятия местной промышленности, окрепли колхозы и совхозы, строились школы и Дома культуры. Расширилась больница до 125 коек, выделена самостоятельная поликлиника, открыты 3 сельские участковые больницы на 25 коек в каждой, 2 самостоятельные врачебно-амбулаторные участка, 18 фельдшерско-акушерских пунктов. Ликвидированы заболевания малярией, трахомой, дифтерией, детским параличом (полиомиелитом). Как изменилась к лучшему жизнь народа за годы после Великой Октябрьской революции! Однажды в 1950-е годы во время беседы со мной Александр Степанович размечтался, стал вспоминать первые врачебные шаги в 1913—1914 гг., ту бедность, которая была вокруг. Да разве можно сравнивать настоящее положение с тем проклятым царским прошлым! Глаза его светились большой человеческой радостью, а на лице была приятная улыбка. «Я счастлив, что проработал в одной больнице 43 года, и думаю, что если здоровье не подведет, проработаю еще немало». Подумав несколько, добавил: «не понимаю, почему нынешние молодые врачи, даже выходцы из деревни, неохотно едут работать на село, а если и приедут, то чувствуют себя не как хозяева, а как гости. Я очень счастлив и не жалею о прожитом». Это был энтузиаст, подвижник, всегда полный оптимизма. Недавно мне пришлось беседовать со старыми сослуживцами Александра Степановича: медицинской сестрой Анастасией Афанасьевной Кисляк, врачом Галиной Львовной Фейгиной, бывшей партизанкой, работавшей с Александром Степановичем вместе с 1939 г. акушеркой Анной Федоровной Кошелевой, врачом Степаном Трофимовичем Бреусом, медсестрой Ольгой Николаевной Шмигельской и некоторыми другими... С большой теплотой отзываются об Александре Степановиче все, кто знал его и кому приходилось работать вместе с ним. Благородный труд А.С.Семенова высоко оценен партией и правительством: ему присвоено почетное звание заслуженного врача Белорусской ССР, в 1951 г. награжден высшей наградой Родины — орденом Ленина, имел несколько боевых медалей. Он честно выполнил врачебную клятву, данную в 1913 г. при получении диплома. Умер Александр Степанович Семенов 17 марта 1966 г. и похоронен в Глуске. Одна из улиц районного центра названа его именем...

Друкуецца паводле часопіса «Здравоохранение Белоруссии». 1976, № 9.

Заслужаны ветэрынарны ўрач

ГУРЫН Аляксандр Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1914 г. у в. Кнышы. Працаваў пастухом у мясцовым калгасе імя Кірава, потым майстрам Гарадоцкага масласырзавода, рабочым саўгаса «10 год БССР» Любанскага раёна. У 1939 г. закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут і быў накіраваны на работу ў Саратаўскую вобласць. З 1939 г. служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны некаторы час працаваў пры савецкім пасольстве ў Нарвегіі па эвакуацыі ваеннапалонных. Вярнуўся на радзіму, працаваў ветурачом у саўгасе «Завалочыцы», старшынёй калгаса «Ленінскі шлях», ветурачом калгаса «Праўда». З 1966 г. і да выхаду на пенсію быў галоўным ветурачом раёна. Званне прысвоена ў 1968 г. Памёр у снежні 1974 г.

Заслужаная артыстка Расіі

БЕЛАЯ Зоя Аляксандраўна, нарадзілася ў 1924 г. у Глуску. У 1931 г. бацькі пераехалі у Маскву. Закончыла сярэднюю школу. У 1941—1943 гг. працавала ў эвакуацыйным шпіталі медсястрой. Потым вучылася ў студыі пры Маскоўскім тэатры аперэты. Першая выканаўца галоўных роляў у многіх савецкіх аперэтах, стварыла запамінальныя жаночыя вобразы. Для яе спецыяльна пісалі вакальныя партыі кампазітары Ю.Мілюцін, І.Коўнер, Ц.Хрэннікаў, І.Дунаеўскі. Памерла ў 1992 г.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР

БАГДАНОВІЧ Віктар Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1911 г. у в.Катка. Закончыў сельскую пачатковую школу. Працаваў 10 гадоў пастухом грамадскага статка, з 1927 г. — цесляром саўгаса «Харомцы». Служыў у арміі. У 1937 г. вучыўся на трактарных курсах, потым працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады Рудабельскай МТС. У Вялікую Айчынную вайну — актыўны арганізатар і ўдзельнік партызанскага руху на Глушчыне. Пасля вызвалення раёна вярнуўся на работу ў Рудабельскую МТС, працаваў дырэктарам, брыгадзірам трактарнай брыгады, старшым механікам. З 1958 г. — брыгадзір трактарнай брыгады калгаса імя Дзяржынскага, у 1963 — 1979 гг. — калгаса «Зара». Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР трох скліканняў.

ПАТАПЕНКА Аляксей Тарасавіч, нарадзіўся ў 1903 г. у в. Катка. Адзін з актывістаў калгаснага будаўніцтва ў Слаўкавіцкім сельсавеце. У 1929 г. уступіў у калгас імя Сталіна. З 1934 г. узначаліў яго, зрабіўшы гаспадарку перадавой у раёне. У 1935 г. узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Неаднаразова ўдзельнічаў ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, быў дэлегатам Надзвычайнага VIII Усесаюзнага з'езда Саветаў (1936), які прыняў новую Канстытуцыю СССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР

ЗЯЛЁНАЯ (ЛЫСАК) Валянціна Васільеўна, нарадзілася ў 1941 г. у в. Касарычы. Закончыла Каткаўскую сярэднюю школу (1958), Віцебскае тэхналагічнае вучылішча. Працоўны шлях пачала ў 1961 г. у Глускім камбінаце бытавога абслугоўвання насельніцтва швачкай цэха індывідуальнага пашыву адзення. Дасканала авалодала спецыяльнасцю, значна перавыконвала нормы выпрацоўкі, перадавала вопыт і майстэрства маладым, карысталася вялікім аўтарытэтам у калектыве. У 1971 г. выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 8-га склікання. Жыве ў Глуску.

З.А.Белая.

В.М.Багдановіч.

В.В.Зялёная (Лысак).

Я.Ф.Няхлебава.

А.С.Сокал.

НЯХЛЕБАВА Яфім'я Фамінічна, нарадзілася ў в. Бабровічы. У 1960-я гады пе-

радавая даярка калгаса імя Дзяржынскага. У 1963 г. выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 6-га склікання.

САХАР Еўдакія Іванаўна, нарадзілася ў в. Уюнішча. Працоўную дзейнасць пачала ў 1934 г. даяркай калгаса «Новае Уюнішча», працавала загадчыцай калгаснай пчалапасекі, малочнатаварнай фермы. У 1949 г. выбрана старшынёй калгаса «Новая Крукаўшчына». У 1950—1956 гг. — намеснік старшыні калгаса «Зара камуны», працавала брыгадзірам, калгаснікай. У 1947 г. выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 2-га склікання.

СОКАЛ Адам Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Старына Клятнянскага сельсавета. Закончыў Жыліцкую сельскагаспадарчую школу. Пасля службы ў Савецкай Арміі з 1955 г. працаваў рабочым Бабруйскай машынна-меліярацыйнай станцыі, затым машыністам-экскаватарщчыкам Глускага БМУ меліярацыі. Высокапрадукцыйна выкарыстоўваючы тэхніку, дабіўся значных вытворчых паказчыкаў пры добрай якасці работ. У 1967 г. выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 7-га склікання. Памёр у 1998 г.

Знакамітыя землякі

АКУЛІЧ Іван Людвігавіч, нарадзіўся ў 1946 г. на х. Пуцякова Макавіцкага сельсавета. Доктар эканамічных навук (1990), прафесар (1990), акадэмік (1994). Вучыўся ў Макавіцкай сярэдняй школе, пасля пераезду бацькоў на месцажыхарства ў Глуск — у Глускай вячэрняй школе рабочай моладзі, на курсах пры райсельгастэхніцы. У 1963 г. паступіў у Рыжскі універсітэт на факультэт прыкладной матэматыкі, які паспяхова закончыў і быў прыняты ў аспірантуру. Пасля яе заканчэння працаваў у Рыжскім універсітэце, многа і плённа займаўся ўкараненнем гаспадарчага разліку, стаў кандыдатам эканамічных навук. Працуе ў Беларускім эканамічным універсітэце на кафедры маркетынгу. Аўтар каля 30 кніг, больш за 200 навуковых публікацый у розных эканамічных выданнях, падручніка па эканоміцы. Жыве ў Мінску.

І.Л.Акуліч.

Л.І.Арцішэўскі.

А.П.Астапчук.

АРЦІШЭЎСКІ Леанід Іванавіч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Дарошкавічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Кандыдат медыцынскіх навук (1960), дацэнт (1965), прафесар. У 1929 г. бацька, ветэрынарны фельчар, перавёз сям'ю ў в. Веснава Глускага раёна, дзе працаваў да 1938 г. Удзельнік партызанскага руху на Гомельшчыне. У 1954 г. закончыў глускую СШ № 1 (1954), Мінскі медыцынскі інстытут (1960). Быў пакінуты аспірантам кафедры агульнай хірургіі інстытута, у 1970—1978 гг. загадчык кафедры агульнай хірургіі. Аўтар 140 навуковых работ. Мае 3 рацыяналізатарскія прапановы. Акрамя многіх урадавых узнагарод адзначаны медалямі М.І.Пірагова і ВДНГ СССР. Жыве ў Мінску.

АСТАПЧУК Аляксей Пятровіч, нарадзіўся ў 1907 г. у в. Раманаў Дзяржынскага раёна Жытомірскай вобласці, Украіна. У 1929 г. прызваны ў Чырвоную Армію, з якой назаўсёды звязаў свой лёс. Закончыў

танкавае вучылішча і Ленінградскія бранятанкавыя курсы па ўдасканальванні каманднага саставу. Служыў камандзірам браневіка, вучэбнага танка, танкавай, курсанцкай і афіцэрскай рот, батальёна. Вялікая Айчынная застала яго ў г.п. Камянец пад Брэстам. З цяжкімі баямі танкісты адступалі да Смаленска, дзе ў адным з баёў Аляксей Пятровіч быў цяжка паранены і кантужаны. Пасля частковага выздараўлення яму даручылі рыхтаваць ваенныя кадры ў Харкаўскім танкавым вучылішчы. У 1943 г. за выкананне спецыяльнага задання ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Пасля вайны працаваў ваенным камісарам Чуйскага аб'яднанага ваенкамата ў Кіргізіі. Пасля выхаду ў адстаўку ў званні палкоўніка доўгі час жыў у Глуску, вёў вялікую работу па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Памёр у 1992 г.

БОБРЫК Янка (Іван Іванавіч), нарадзіўся ў 1905 г. у Глуску. Беларускі савецкі паэт. У 1929 г. закончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ, аспірантуру Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе (1934). Працаваў настаўнікам у Міласлаўцкай сямігадовай школе Клімавіцкага раёна, навуковым супрацоўнікам Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе, Белдзяржкіно, Упраўленні па справах мастацтваў Ленінградскага гарвыканкома. Удзельнік абароны Ленінграда. Памёр 25.8.1942 г. у блакадным Ленінградзе.

Друкаваўся з 1924 г. Разам з А.Звонакам і Я.Туміловічам выдаў зборнік вершаў «Пунсовае ранне» (1926). Аўтар паэмы «Галіна» (1930). Выступаў у друку з апавяданнямі і нарысамі.

З успамінаў Сяргея Іванавіча Грахоўскага

Вершы паэта-маладнякоўца Янкі Бобрыка ў 1920-я гады часта друкаваліся ў «Маладняку», «Чырвонай змене», літаратурным дадатку «Сталёвы ўзлёт», «Узвышшы», «Звяздзе» і «Беларускай вёсцы». У 1926 годзе разам з Алесем Звонакам і Янкам Туміловічам ён выдаў маленькі зборнік «Пунсовае ранне», у 1930 годзе ў «Маладняку» апублікаваў паэму «Галіна».

На гэтым абрываецца яго паэтычная біяграфія. Але ўсё сваё кароткае жыццё Янка Бобрык жыў літаратурай, шмат сіл аддаў развіццю беларускай кінематаграфіі, да апошніх дзён пісаў вершы і грунтоўныя даследаванні.

І.І.Бобрык.

І.П.Булгакаў.

... Па стане здароўя яго знялі з ваеннага ўліку, але ў жніўні 1941 года камуніст Янка Бобрык дамогся, каб яму дазволілі стаць добраахвотнікам народнага апалчэння. Бобрык капаў акопы, рабіў умацаванні, адбіваў атакі фашыстаў. Яму некалькі разоў прапаноўвалі эвакуіравацца ў тыл, упрошвала жонка Наталля Вячаславаўна Вішнеўская (паэтэса-маладнякоўка) разам ехаць у Горкаўскую вобласць. «Я нікуды не паеду. Памяраць, дык у Ленінградзе», — нязменна адказваў Янка.

У канцы ліпеня 1942 года зусім знясіленага Янку Бобрыка на вуліцы падабралі санітары і адправілі ў бальніцу імя Куйбышава. 25 жніўня Янка Бобрык памёр і пахаваны на Піскароўскіх могілках.

Не вянуць кветкі на плітах Піскароўскіх могілак. Вечны агонь у гонар мужнасці ленінградцаў гарыць і на магіле нагага паэта Янкі Бобрыка.

БУЛГАКАЎ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў 1920 г. у с. Івана-Лебядзянаўкі Тамбоўскай вобласці. Самадзейны мастак. Закончыў Івана-Лебядзянаўскую сямігадовую школу, Арлоўскае мастацкае вучылішча, вучыўся ў Маскоўскім вышэйшым цэнтральным мастацка-прамысловым вучылішчы, у 1940 г. быў прызваны на вайсковую службу. Служыў у Брэсцкай крэпасці. На світанні 22 чэрвеня 1941 г. у складзе Брэсцкага гарнізона адбіваў першыя атакі нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пад моцнымі ўдарамі пераўзыходзячых сіл праціўніка 4-я армія, дзе змагаўся І.П.Булгакаў, была падзелена на групы, якія адыходзілі ў глыб краіны. І.П.Булгакаў працягваў ваяваць пад Бабруйскам, дзе быў кантужаны, і ў непрытомным стане трапіў у палон. З Бабруйскага лагера ваеннапалонных яму ўдалося ўцячы. Наладзіў кантакты з партызанамі, і па іх загадзе пачаў аднаўленне глускай царквы, якая ў хуткім часе стала месцам сустрэчы партызанскіх сувязных. Пасля вызва-

У.Л.Гулевіч.

В.А.Захарынскі.

У.І.Малевіч.

лення раёна займаўся мастацкай працай. У снежні 1944 г. быў рэпрэсіраваны, асуджаны ваенным трыбуналам на 15 гадоў. Пакаранне адбываў у Бабруйску, Оршы, Марыінску, Іванаве Кемераўскай вобласці. У 1947 г. вызвалены з-за адсутнасці матываў злачынства. Працаваў на розных работах. Адначасова ў вольныя мінуты займаўся мастацкай творчасцю, неаднаразова наладжваў выстаўкі сваіх работ. У 1972 г. прыняты ў члены мастацкага фонду БССР і СССР. У 1992 г. творчая персанальная выстаўка, прысвечаная 50-годдзю Вялікай Перамогі, экспанавалася ў Глуску, Бабруйску, Магілёве, Горках, Касцюковічах, Краснаполлі Магілёўскай вобласці. І.П.Булгакаў жыве ў Глуску.

ГУЛЕВІЧ Уладзімір Лявонавіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Усцярхі. Закончыў Усцярхоўскую сямігадовую, Бабруйскую сярэднюю школы, Кіеўскае вышэйшае ваеннае вучылішча самаходнай артылерыі (1956), Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна (1961). Служыў у Беларускай ваеннай акрузе, пазней — намеснік камандуючага Закаўказскай, Забайкальскай ваенных акруг. У 1985—1991 гг. працаваў намеснікам міністра абароны па сувязі Міністэрства абароны СССР. У 1992 г. у званні генерал-лейтэнанта выйшаў у адстаўку. Жыве ў Маскве.

ЗАХАРЫНСКІ Вячаслаў Адамавіч, нарадзіўся ў 1950 г. у Глуску. Беларускі мастак-жывапісец. Член Беларускага саюза мастакоў (з 1979). Закончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1971), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1978). У мастацкіх выстаўках удзельнічаў з 1974 г. Асноўныя творы: палатно «Ефрасіння Полацкая»; серыі «Пацукі», «Фарысеі», «Грэшнікі», «Святыя», «Лэдзі», «Архідэі» і інш. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, мастацкім цэнтры «Жыльбел», у галерэях у Польшчы, Італіі і інш. Творчасць земляка закранае актуальныя агульначалавечыя праблемы сацыяльнага, філасофска-рэлігійнага кірунку. Жыве ў Мінску.

КУЛЬБА Фёдар Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1902 г. у в. Усцярхі. Кандыдат хімічных навук (1940), прафесар (1961). Сярэднюю адукацыю атрымаў у Глуску, закончыў народнае вучылішча, вышэйшае пачатковае вучылішча і школу II ступені. Закончыў Ленінградскі тэхналагічны інстытут імя Ленсавета (1930) і аспірантуру. Працаваў на паркалёвай фабрыцы старшым хімікам і адначасова займаўся навукова-педагагічнай работай у Ленінградскім хіміка-тэхналагічным інстытуце. З 1932 г. перайшоў туды на пастаянную работу. У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у радах абаронцаў Ленінграда, на 2-м Прыбалтыйскім фронце. Пасля дэмабілізацыі займаўся навуковай, выкладчыцкай і адміністрацыйнай работай у Ленінградскім тэхналагічным інстытуце, дэкан факультэта, намеснік дырэктара і прарэктар па вучэбнай рабоце. Меў шматлікія ўзнагароды.

МАЛЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1938 г. у в. Заполле. Паэт. Закончыў глускую сярэднюю школу № 1, Усць-Каменагорскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў у Казахстане, працаваў дырэктарам васьмігадовай, а пазней сярэдняй школ. З 1971 г. жыў і працаваў на Бабруйшчыне, з 1987 г. — інспектарам райана. Часта наведваў Глушчыну. «Природа милого мне края стихи заставила писать», — так сказаў пра сябе наш зямляк. Выйшлі

зборнікі вершаў паэта «Запоздалая мелодия»(1991), «Одинокая береза» (1993), «Февральское солнце» (1994). Памёр у 1998 г.

Живу, где сеют рожь и клевер,
Где пахнет мятою земля.
Кому-то дорог юг иль север,
А мне лишь Глущина моя.

У всех есть родина одна,
Ее никто не выбирает.
И пусть богата, пусть бедна —
Она нам самая родная.

Плакучей осенью, зимою —
Она мила и хороша,
Мы связаны одной судьбою,
Ее частица и душа.

Бежит, петляя лесом, лугом,
И днем, и ночью Птичь-река.
Она молчит в дни зимней вьюги,
Весной тесно ей в берегах.

Здесь каждый куст прибрежной ивы
По-братски смотрит на меня.
И я средь них хожу счастливый,
Считаюсь тоже им родня.

Люблю, когда весенний вечер
Несет прохладу от реки.
И в темном небе, будто свечи,
Зажгутся звезды-светлячки.

Сиренью пахнет где-то рядом.
В кустах прибрежных соловей,
Волнуя песней-серенадой,
Задел струну души моей.

Видны сады, селенья, пашни
По обе стороны реки.
Сменился утром день вчерашний —
Веселым, звонким, говорким.

Спешат куда-то спозаранку
И взрослые, и детвора.
И так без права на отставку
Торопит новая пора.

Идти отныне нам с тобою
Дорогой трудностей вперед,
Чтоб хлеба полюшко ржаное
Родило вдоволь каждый год.

Достичь высоких урожаев
Желанны цель, мечта и честь.
Задача сложная, большая
Решится, коль стремленье есть!

А.Н.Марціновіч.

М.А.Маханька.

МАРЦІНОВІЧ Аркадзь Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1920 г. у в. Барбарова. Беларускі пісьменнік. Закончыў Мінскае педагагічнае вучылішча (1939), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1955) . Працаваў настаўнікам, у рэспубліканскім перыядычным друку, у выдавецтве «Беларусь», літаратурным кансультантам СП БССР, галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1939—1946 гг. служыў у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнах. Тройчы паранены. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі. Працаваў у газеце «Калгасная праўда» (1946—1957), «Літаратура і мастацтва» (1957—1964), выдавецтве «Беларусь» (1964—1971). У 1974—1981 гг. галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Першыя вершы апублікаваў у 1936 г. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Надзея» (1960), «Водгулле» (1963), «Прасека» (1967), «Панарама» (1970), «Няхай ідзе дождж» (1973), зборніка вершаў «Чырвоныя ветразі» (1965), раманаў «Не шукай слядоў сваіх» (1979), «Груша на Голым полі» і інш. Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Жыве ў Мінску.

МАХАНЬКА Маргарыта Аляксееўна, нарадзілася ў 1942 г. у в. Крукаўшчына. Кандыдат медыцынскіх навук (1974). Закончыла Чыкілёўскую сярэднюю школу (1958), Мінскі медыцынскі інстытут (1964), аспірантуру пры Віцебскім медінстытуце (1971). Працавала ў Глускім раёне ўрачом Клятнянскай участковай і Глускай раённай бальніц, у г. Кіеве загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення бальніцы № 1, з 1975 г. — у Кіеўскім навукова-даследчым інстытуце клінічнай медыцыны —

Я.У.Машынская-Гельтман.

М.І.Нікалайчык.

М.А.Пігулеўскі.

малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам, кансультантам. З мая 1992 г. — урач-тэрапеўт, пасля намеснік галоўнага ўрача па лячэбнай рабоце Глускай раённай бальніцы. З 1997 г. на пенсіі. Жыве ў Глуску. Аўтар звыш 20 навуковых работ, сааўтар многіх метадычных медыцынскіх рэкамендацый.

МАШЫНСКАЯ-ГЕЛЬТМАН Ядвіга Уладзіславаўна, нарадзілася ў 1886 г. у Глуску. Паэтэса-перакладчыца, грамадскі дзеяч, педагог. Вучылася ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве (1904—1907). Студэнткай прымала актыўны ўдзел у маладзёжным рэвалюцыйна-дэмакратычным руху. Да гэтага часу адносяцца і яе першыя вершы, прысвечаныя рэвалюцыйнай барацьбе моладзі («Адозва», 1906 г.). З 1917 г. працавала ў Мінску, стала актыўным членам «Польскага сацыялістычнага аб'яднання». У 1921—1931 гг. выкладала ў польскім педтэхнікуме і ў педагагічным інстытуце ў Мінску, прымала ўдзел у рабоце польскага сектара Акадэміі навук БССР. У 1932—1937 гг. выкладала польскую мову ў Ваеннай Акадэміі імя Фрунзе ў Маскве. У 1937 г. рэпрэсіравана і выслана ў Казахстан. У 1920-я гады стала першым складальнікам падручнікаў і буквара для польскіх школ у Беларусі, часта выступала ў перыядычным друку з апавяданнямі, нарысамі — «Першая кніга для чытання», «Другая частка лемантара» (1926), «Другая кніга для чытання» (1928). Пераклала на польскую мову асобныя вершы і паэму Я.Купалы «Над ракой Арэсай», «Выбраныя апавяданні» Ц.Гартнага (1929), «Выбраныя вершы» А.Александровіча (1932), аповесці «Салавей» З. Бядулі (1931), «Дрыгва» Я.Коласа (1936), урыўкі з паэмы Я.Коласа «Сымон-музыка». Член польскай секцыі Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, член Саюза пісьменнікаў СССР. Памерла ў 1946 г.

НІКАЛАЙЧЫК Мікалай Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Заполле Завалочыцкага сельсавета. Доктар юрыдычных навук (1984), прафесар (1986). Закончыў Гарадоцкую сярэднюю школу, Мінскі юрыдычны інстытут (1953), аспірантуру. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1942 г. да ліпеня 1944 г. у партызанскім атрадзе імя Дзяржынскага 161-й брыгады імя Катоўскага. Разведчык. Да 1949 г. служыў у Савецкай Арміі, быў паранены. З 1949 г. працаваў у органах МУС БССР. У 1954—1967 гг. выкладаў у Магілёўскай спецшколе транспартнай міліцыі, у 1967—1987 гг. — у Мінскай вышэйшай школе міліцыі МУС БССР, у 1987—1996 гг. у Горкаўскай вышэйшай школе МУС Расіі. Працуе ў НДІ праблем крыміналогіі, крыміналістыкі і судовых экспертыз. Мае дзяржаўныя ўзнагароды. Жыве ў Мінску.

ПІГУЛЕЎСКІ Мікалай Андрэевіч, нарадзіўся ў 1917 г. у Глуску. Кандыдат тэхнічных навук (1969). Вучыўся ў Глускай сямігадовай школе, Харкаўскім хімікаэлектраалюмініевым тэхнікуме. Закончыў механіка-тэхналагічны факультэт Беларускага тэхналагічнага інстытута (1939). У пачатку вайны ваяваў у Прыбалтыцы, каля Пулкава пад Ленінградам. Інжынер-фартыфікатар увесь час знаходзіўся на «гарачых» участках: будаваў розныя ўмацаванні, электразагароды, мінныя палі. У адным з баёў у пачатку 1942 г. быў кантужаны, трапіў у палон. Удалося ўцячы. Пасля доўгіх блуканняў дабраўся да Беларусі. Стаў партызанам. Каб удакладніць,

як ён з-пад Ленінграда трапіў у Беларусь, камандаванне брыгады самалётам адправіла яго ў Маскву. Там арышт — асобая нарада вынесла меру пакарання — 20 гадоў папраўча-працоўных работ. Толькі праз 12 гадоў быў вызвалены і рэабілітаваны. Працаваў у навукова-даследчым інстытуце Белпрадпрама — начальнікам канструктарскага бюро, пазней галоўным канструктарам. Аўтар больш за 70 вынаходніцтваў, якія знайшлі шырокае прымяненне ў розных галінах народнай гаспадаркі рэспублікі. А на міжнародных выстаўках адзначаны сярэбранымі і залатымі медалямі. Жыве ў Мінску.

ПЛАТОНАЎ Расціслаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1930 г. у г. Слуцк Мінскай вобласці. Доктар гістарычных навук (1982), прафесар (1984). У 1947 г. з бацькамі пераехаў у Глуск. Закончыў Глускую СШ (1950), аддзяленне журналістыкі філфака (1955) і аспірантуру (1961) Белдзяржуніверсітэта. У 1955—1958 гг. працаваў у г. Клецк Мінскай вобласці — адказным сакратаром раённай газеты «Да новых перамог», 1-м сакратаром Клецкага РК ЛКСМБ. У 1962 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1962 г. на партыйнай рабоце: лектар, кіраўнік лектарскай групы Мінскага абкома КПБ. Выкладаў у Белдзяржуніверсітэце, дзе ў 1968 г. атрымаў вучонае званне дацэнта. У 1970—1971 гг. — загадчык кафедры Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. У 1971—1974 гг. у аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. У 1974—1980 гг. сакратар Мінскага абкома КПБ, дэпутат Мінскага аблсавета. У 1980—1991 гг. дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, адначасова ў 1991 г. 1-ы намеснік галоўнага рэдактара навукова-інфармацыйнага бюлетэня «Партийный вестник». З 1992 г. галоўны навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы. У 1981—1990 гг. дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, член ЦК КПБ. Даследуе праблемы палітычнага і духоўнага жыцця ў Беларусі ў 1920—1930-я гады, народнай барацьбы ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ідэалагічнай дзейнасці Кампартыі Беларусі ў 1960—1980-я гады. Аўтар некалькіх кніг, у т.л. «Палітыкі. Ідэі. Лёсы» (1996), «На крутым павароце: ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929—1931 гг.» (1999), больш за 300 артыкулаў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, 2 медалямі і інш.

Р.П.Платонаў.

С.А.Пржылуцкі.

ПРЖЫЛУЦКІ Сцяпан Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1905 г. у в. Лучкі. Закончыў Краснабярэжскі тэхнікум (1926), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1930). У 1929—1930 гг. удзельнічаў у правядзенні калектывізацыі. У 1931 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі з 1932 г. працаваў у Дзяржземтрэсце Наркамзема Крымскай АССР. У 1940 г. мабілізаваны ў Чырвоную Армію. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі на Крымскім і Паўднёвым франтах, удзельнічаў у баях на Керчанскім паўвостраве, цяжка паранены. У 1943 г. дэмабілізаваны і накіраваны на адзін з ваенных заводаў у Сібір начальнікам аддзела кадраў. Пасля вайны доўгі час працаваў у Крыме, у міністэрствах сельскай гаспадаркі і нарыхтовак СССР, саўгасаў СССР і РСФСР. Па яго настойлівай просьбе накіраваны дырэктарам створанага саўгаса «Паўднёвы» Растоўскай вобласці, які размяшчаўся на цалінных землях Сальскага стэпу. Тут талент кіраўніка, жыццёвы вопыт, веданне справы далі свой плён: саўгас за тры гады дасягнуў высокіх вынікаў ва ўсіх галінах эканомікі, стаў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве, а С.А.Пржылуцкі быў узнагароджаны ордэнам Леніна (1957).

СУРМА Генадзь Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1946 г. у Глуску. Член Беларускага саюза мастакоў (1994). Закончыў глускую СШ № 1, Мінскае мастацкае вучылішча імя А.К.Глебава (1971). Малюнку і жывапісу вучыўся ў народнага мастака І.П.Бул-

Г.Ф.Сурма.

А.А.Тоўсцік.

Л.А.Тоўсцік.

гакава, у вядомых беларускіх мастакоў Ю.Ф.Выхадцава, А.В.Луцэвіча і Л.П.Дубара. Працуе ў станковым жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажу і нацюрморта. З 1971 г. — удзельнік абласных, рэспубліканскіх і замежных выставак, міжнародных пленэраў. Член Саюза мастакоў Беларусі з 1994 г. Правёў сем персанальных выставак у Польшчы, Германіі і Брэсце. Асноўныя творы: кампазіцыі «Цёплыя дажджы», «Цярэспальская брама», «Вясна ў крэпасці», «Апошнія промні», «Нёман», «Бэз. Вечар» і інш. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Брэсцкім краязнаўчым музеі, музеі «Брэсцкая крэпасць-герой», карцінных галерэях Беларусі, а таксама ў прыватных калекцыях Польшчы, Германіі, Францыі, ЗША, Даніі, Бельгіі, Японіі, Ізраіля і іншых краін. Жыве ў Брэсце.

ТОЎСЦІК Аркадзь Апанасавіч, нарадзіўся ў 1925 г. у в. Чыкілі. Журналіст, грамадскі дзеяч. Вучыўся ў глускай СШ № 2. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1957). У Вялікую Айчынную вайну прымаў удзел у партызанскім руху. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прызваны ў армію, удзельнічаў у барацьбе супраць узброенага бандытызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі. З 1950 г. працаваў інструктарам Бабруйскага абкома ЛКСМБ, 1-м сакратаром Чырвонаслабодскага РК ЛКСМБ, адказным арганізатарам ЦК ЛКСМБ. У 1953—1960 гг. загадчык аддзела, намеснік рэдактара газеты «Чырвоная змена». З 1960 г. — на партыйнай рабоце: інструктар аддзела прапаганды і агітацыі, загадчык сектара друку, выдавецтваў і паліграфіі, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК Кампартыі Беларусі. У 1973—1986 гг. працаваў рэдактарам газеты «Звязда». Член ЦК КПБ у 1976—1990 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 9-га, 10-га і 11-га скліканняў. У 1973—1987 гг. старшыня праўлення Саюза журналістаў БССР. Удзельнічаў у рабоце XXIX сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (1974). Мае шматлікія дзяржаўныя ўзнагароды, два медалі імя Юліуса Фучыка Міжнароднай арганізацыі журналістаў. Заслужаны работнік культуры (1979). З 1987 г. на пенсіі. Працуе ў Беларускім фондзе культуры, займаецца пытаннямі вяртання ў краіну беларускіх нацыянальных каштоўнасцей, якія ў розныя часы былі вывезены з Беларусі. Аўтар некалькіх кніг.

ТОЎСЦІК Леанід Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1914 г. у в. Чыкілі. Кандыдат педагагічных навук (1974). Дацэнт (1978). Закончыў Гарадоцкую няпоўную сярэднюю школу (1930), педкурсы пры Рагачоўскім педтэхнікуме (1932), рабфак (1936) і фізіка-матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта (1941). Працоўную дзейнасць пачаў у 1932 г. настаўнікам, завучам НСШ у вёсках Міхнавічы, Крышычы Палескай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны як студэнт быў эвакуіраваны ў Саратаўскую вобласць, працаваў настаўнікам матэматыкі. З 1942 г. на фронце. Баявы шлях пачаў ад Сталінграда, ваяваў на Варонежскім, Стэпавым, 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Вайну закончыў у Аўстрыі. З 1946 г. уся працоўная дзейнасць звязана з Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытутам. Працаваў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта (1951—1958), загадчыкам кафедры (1958—1964). Аўтар больш за 30 навуковых работ. Памёр у 1981 г.

ТОЎСЦІК Мікалай Апанасавіч, нарадзіўся ў 1921 г. у в. Чыкілі. Кандыдат эканамічных навук (1968). Закончыў Чыкілёўскую СШ, Мінскі педагагічны інстытут (1957). Працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам Гарнавішчанскай пачатковай школы на Палессі. У 1939—1941 гг. служыў у Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну быў партызанам, намеснікам камісара атрада імя Шчорса 37-й партызанскай брыгады, сакратаром падпольнага Бабруйскага райкома камсамола, у 1944—1947 гг. — першым сакратаром Бабруйскага райкома ЛКСМБ. З 1948 г. на савецкай і партыйнай рабоце ў Бабруйскім, Клічаўскім, Слаўгарадскім раёнах і г. Магілёве. У 1983—1997 гг. дацэнт кафедры эканомікі Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 4-га і 12-га скліканняў. У 1962—1966 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Член рэспубліканскага Савета ветэранаў вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга (двума), «Знак Пашаны» і інш.

ХРАПКО Васіль Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1930 г. у в. Бярозаўка. Закончыў сярэднюю школу, Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя Дзяржынскага. Служыў у Североморску, Маскве. У 1982 г. прысвоена воінскае званне контрадмірала. Памёр у 1984 г.

ЯНКОЎСКІ Мікалай Архіпавіч, нарадзіўся ў 1934 г. у в. Клетнае. Кандыдат філалагічных навук (1968). Дацэнт (1972). Закончыў Клятнянскую сямігадовую школу (1950), глускую СШ № 2 (1953), гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педінстытута (1958). Некалькі гадоў працаваў у школах: настаўнікам Плюскай СШ Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці (1958—1959), дырэктарам Веснаўскай сямігадовай школы (1959—1960) і Слаўкавіцкай СШ (1960—1961) Глускага раёна. У 1961—1964 гг. вучыўся ў аспірантуры, у 1964—

М.А.Тоўсцік.

В.М.Храпко.

М.А.Янкоўскі.

А.Ц.Глаз.

1975 гг. працаваў на кафедры беларускай літаратуры Гомельскага педінстытута. Кандыдацкую дысертацыю «Паэтыка беларускіх прыказак» абараніў 26.2.1968 г. у Белдзяржуніверсітэце. У Гомелі актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, кіраваў літаратурна-творчым аб'яднаннем «Крыніцы», быў сакратаром рэдкалегіі зборніка «Беларуская літаратура». З 1975 г. жыў у г. Гродна, працаваў у Гродзенскім дзяржуніверсітэце, кіраваў літаб'яднаннем «Беларускія галасы». Аўтар шматлікіх прац, у т.л. «Паэтыка беларускіх прыказак» (1971), «Паэтыка беларускай народнай прозы» (1983). Памёр у 1995 г.

Ганаровыя грамадзяне Глуска

ВАЛОШЫН Андрэй Максімавіч, Герой Савецкага Саюза (1945). Ганаровы грамадзянін Глуска з 1974 г. (гл артыкул «На глускай зямлі»).

ГЛАЗ Анатоль Ціханавіч, нарадзіўся ў 1951 г. у в. Калацічы. Закончыў глускую СШ № 1, Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1974), Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. Працоўную дзейнасць пачаў у 1974 г. галоўным аграномам калгаса імя Чапаева Глускага раёна. Быў другім, першым сакратаром Глускага РК ЛКСМБ, з 1978 г. другі, з 1980 г. першы сакратар Магілёўскага аб-

С.І.Грахоўскі.

І.М.Грышын.

К.Г.Кавалёў.

кома камсамола. У 1984—1987 гг. старшыня Бабруйскага райвыканкома, у 1987—1991 гг. першы сакратар Бялыніцкага РК КПБ. З лістапада 1991 г. працаваў намеснікам дырэктара па кадрах, камерцыйных пытаннях вытворчага аб'яднання «Бабруйскмэбля». У студзені 1995 г. выбраны старшынёй Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1997 г. З мая 1999 г. — намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома.

ГРАХОЎСКІ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся 25.9.1913 г. у мястэчку Нобель Зарэчненскага раёна Ровенскай вобласці, Украіна. Беларускі пісьменнік. Дзяцінства і юнацтва правёў у Глуску, куды маці вярнулася ў 1914 г. Тут закончыў сямігодку. Працоўны шлях пачаў у 1930 г. на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Да вайны закончыў літфак Мінскага педінстытута (1935), працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» і на Беларускім радыё. У 1936 г. беспадстаўна арыштаваны, асуджаны на 10 гадоў і сасланы на лесараспрацоўкі ў Горкаўскую вобласць. Пасля вызвалення і зняцця судзімасці ў 1946—1949 гг. настаўнічаў ва Урэччы Слуцкага раёна. У 1949 г. арыштаваны паўторна і высланы ў Новасібірскую вобласць. У 1955 г. поўнасцю рэабілітаваны. У 1956 г. вярнуўся ў Мінск. Працаваў на Беларускім радыё, у рэдакцыях «Бярозкі» і «Вясёлкі», старшынёй секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў, сакратаром камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР. Друкуецца з 1926 г. Актыўная творчая дзейнасць пачалася толькі пасля рэабілітацыі. З 1956 г. выйшлі 53 кнігі паэзіі, прозы, перакладаў твораў А.Пушкіна, А.Блока, Р.Тагора, Р.Гамзатава, Нэруды, Рыльскага, Сасюры, Варанько, М.Дудзіна і многіх іншых савецкіх і зарубежных аўтараў. Вершы С.Грахоўскага перакладаліся на англійскую, французскую, польскую, балгарскую, рускую, украінскую, грузінскую, таджыкскую і іншыя мовы народаў былога СССР. Крыніцай натхнення, сюжэтаў, вобразаў герояў была і застаецца Глушчына. С.Грахоўскі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992), Літаратурнай прэміі імя А.Куляшова (1983), заслужаны работнік культуры Беларусі (1983). Ганаровы грамадзянін Глуска з 1995 г.

ГРЫШЫН Ігар Мікалаевіч, нарадзіўся 19.4.1933 г. у Мінску. Беларускі вучоны ў галіне хірургіі. Акадэмік і прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1997). Доктар медыцынскіх навук (1975), прафесар (1977). Заслужаны дзеяч навукі (1989). Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1957). У 1950-я гады працаваў у глускай раённай бальніцы. З 1973 г. у Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў (з 1978 г. загадчык кафедры і кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра клінічнай і эксперыментальнай хірургіі). Навуковыя працы па хірургіі страваводa, крывяносных сасудаў, печані і жоўцевывадных шляхоў, падстраўнікавай залозы, эндакрыннай сістэмы, хірургічнай гастраэнтэралогіі і практалогіі. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1993 г. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1998 г.

КАВАЛЁЎ Кузьма Гаўрылавіч, нарадзіўся 22.9.1907 г. у с. Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. У чэрвені 1944 г. з'яўляўся начальнікам сувязі 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса, войскі якога вызвалялі г.п.Глуск і раён. Пасля вайны палкоўнік у адстаўцы, жыў у г. Рэутаў, працаваў на

адным з прадпрыемстваў горада старшым інжынерам. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1969 г.

КІТЧАНКА Павел Сямёнавіч, Герой Савецкага Саюза, былы камандзір танкавага батальёна 219-й Крамянчугскай танкавай брыгады, удзельнік баёў за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1969 г.

КРЫВАШЭІН Сямён Майсеевіч, нарадзіўся ў 1899 г. у Варонежы. Генерал-лейтэнант танкавых войскаў (1943), Герой Савецкага Саюза (1945). Закончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1931), Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1952). У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны, вайны ў Іспаніі (1936—1937), баёў каля воз. Хасан (1938), вызвалення Заходняй Беларусі (1939), савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). З 1941 г. на Цэнтральным, Калінінскім, 1-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах, камандзір 1-га Краснаградскага механізаванага корпуса. Удзельнік Курскай бітвы, Вісла-Одэрскай, Берлінскай аперацый. Часці корпуса пад яго камандаваннем вызначыліся пры фарсіраванні р. Шчара, вызваленні Слоніма, Брэста, Варшавы, у бітве за Берлін. Да 1953 г. у Савецкай Арміі. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1969 г. і Брэста з 1974 г. Памёр у 1978 г.

ЛЬВОЎ Аляксей Васільевіч, былы камандзір 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі (1943—1944). Ганаровы грамадзянін Глуска з 1974 г. (гл. артыкул «Усім смярцям назло»).

МІШАРЫН Пётр Іванавіч, удзельнік баёў за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1984 г. (гл. артыкул «Пераправа, пераправа...»).

РАМАНОЎСКІ Уладзімір Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1949 г. у в. Сіманавічы. Закончыў Сіманавіцкую васьмігадовую школу. Працоўную дзейнасць пачаў у 1964 г. рабочым саўгаса «Завалочыцы». У 1968 г. закончыў электратэхнікум сувязі ў г. Мінск. Служыў у Савецкай Арміі, пасля дэмабілізацыі ў 1972 г. займаў розныя пасады, пачынаючы ад электрамеханіка да начальніка вузла сувязі ў г. Бабруйск. У 1978 г. закончыў Усесаюзны завочны інстытут сувязі. У 1987 г. выбіраўся старшынёй выканаўчага камітэта Ленінскага раённага Савета дэпутатаў г. Бабруйск. У

П.С.Кітчанка.

У.Ф.Раманоўскі.

П.І.Сіненка.

1992 г. закончыў Акадэмію народнай гаспадаркі пры ўрадзе Расійскай Федэрацыі. У снежні 1994 г. выбраны старшынёй Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1997 г.

РАФІЕЎ Наджафкулі Раджабалі аглы, нарадзіўся 21.4.1912 г. у г. Ардубад Нахічэванскай АССР. Удзельнік баёў на Беларусі ў Айчынную вайну, вызваляў г.п. Глуск і раён. У Чырвонай Арміі з 1935 г., на фронце з 1941 г., малодшы лейтэнант, танкіст. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. За шэраг баёў (у т.л. і на Глушчыне), у час якіх была знішчана вялікая колькасць жывой сілы і тэхнікі праціўніка, удастоены звання Героя Савецкага Саюза (1944). Ганаровы грамадзянін Глуска з 1969 г. Памёр у 1970 г. (гл. артыкул «Наступала грозная браня»).

СІНЕНКА Панцялей Іванавіч, нарадзіўся 26.7.1904 г. у с. Нікалаеўск Валнавахскага раёна Данецкай вобласці. Закончыў Харкаўскае пяхотнае вучылішча (1931), Харкаўскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча (1934), служыў у Іркуцку. У лютым 1942 г. добраахвотна пайшоў на фронт,

В.У.Шчэцька.

ваяваў пад Сталінградам. Служыў камандзірам 148-га гвардзейскага стралковага палка 50-й гвардзейскай стралковай дывізіі, якая вызваляла Глускі раён. У 1950—1954 гг. узначальваў аб'яднаны райваенкамат у Варонежскай вобласці. Зволены ў запас па стане здароўя. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Суворава і інш. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1984 г.

ШЧЭЦЬКА Віктар Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1955 г. у в. Растоў Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Бабруйскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1974), Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі (1982). Працоўную дзейнасць пачаў у саўгасе «Парэчча» Акцябрскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі, пасля дэмабілізацыі ў 1976 г. працаваў старшым эканамістам Акцябрскага міжкалгасбуда. З 1977 г. яго жыццё і працоўная дзейнасць цесна звязаны з Глушчынай: працаваў эканамістам у калгасах імя Кірава, «Дружба», з 1983 г. старшынёй калгаса імя Чапаева. У 1987 г. выбраны старшынёй Глускага райвыканкома. Са студзеня 1999 г. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1999 г.

ЯКАВЕНКА Уладзімір Кірылавіч, нарадзіўся ў 1919 г. у в. Паромаўка Валадарска-Валынскага раёна Жытомірскай вобласці, Украіна. Пасля заканчэння ў 1938 г. мясцовага тэхнікума механічнай апрацоўкі дрэва быў накіраваны на работу ў Жытомірскую працоўную калонію НКУС. Працаваў інструктарам, майстрам зборачнага цэха, намеснікам начальніка, начальнікам сушыльнага цэха. У Чырвоную Армію прызваны ў кастрычніку 1939 г. Служыў матарыстам у авіяпалку. Скончыў авіяшколу і ў снежні 1940 г. накіраваны ў г. Ржэў стралком-бамбардзірам скарасных бамбардзіроўшчыкаў. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У час бамбёжкі танкавай калоны праціўніка самалёт У.К.Якавенкі быў падбіты, а ён цяжка паранены. Пасля вымушанай пасадкі лячыўся ў сельскай бальніцы, а потым мясцовыя жыхары пераправілі яго ў Бабруйск. Там Якавенка ўступіў у падпольную антыфашысцкую арганізацыю і ў лістападзе 1941 г. пайшоў у партызанскі атрад, у якім вырас да камандзіра роты. Быў камісарам, камандзірам атрада імя Варашылава. У верасні 1943 г. узначаліў партызанскую брыгаду № 99 імя Дз.Ц.Гуляева. З 1944 г. на гаспадарчай рабоце. З 1959 г. старшыня Гомельскага гарвыканкома. З 1965 г. старшыня праўлення Белспажыўсаюза, з 1970 г. і да выхаду на пенсію працаваў намеснікам старшыні праўлення Цэнтрасаюза СССР. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1960—1961, член Рэвізійнай камісіі КПБ у 1961—1966, член ЦК КПБ у 1966—1971. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—1971. Пайшоўшы на заслужаны адпачынак, займаўся падрыхтоўкай мемуараў аб партызанскім руху ў Беларусі. Аўтар успамінаў «На акупіраванай зямлі» (1969), «Партызанскае міжрэчча» (1976). «Партызанкі» (1980), «Партызанскія арляняты», «Партызанскі камбрыг» (1984) і інш. Ганаровы грамадзянін Глуска з 1984 г. Памёр у 1996 г.

В.А.Васілеўскі.

Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Глушчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку

БАЯК Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1948 г. у Глуску. Закончыў глускую СШ № 2 (1966), Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае лётнае вучылішча (1970). Старшы лейтэнант, служыў у Венгрыі. У верасні 1973 г. загінуў пры выкананні асобага задання. Пахаваны ў Глуску.

САЧОК Сяргей Уладзіміравіч, нара-

дзіўся ў 1967 г. у в. Дуброва. У 1982 г. закончыў 8 класаў Макавіцкай сярэдняй школы, курсы трактарыстаў пры райсельгастэхніцы, у 1985 г. — Глускую завочную школу рабочай моладзі. Працаваў трактарыстам у калгасе «Расія». У 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію. З лютага 1986 г. служыў у Афганістане старшым радыёмайстрам. У канцы жніўня, выконваючы баявое заданне, быў цяжка паранены. Памёр 28.8.1986 г. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў час службы, пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў в. Дуброва.

В.І.Баяк.

С.У.Сачок.

ТУПІЦА Раман Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1958 г. у в. Поблін. Закончыў Бярозаўскую сярэднюю школу (1975), Саратаўскае вышэйшае ваенна-авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў (1980). З кастрычніка 1982 г. служыў у Афганістане, потым працягваў службу ў СССР. У снежні 1985 г. як вопытны, ужо абстраляны ў афганскім небе лётчык накіраваны ў Афганістан і прызначаны камандзірам верталёта. Аднойчы яму даручылі высадзіць групу спецыяльнага прызначэння, якая павінна была абследаваць выяўлены ў раёне пустыні Рэгістан караван. Пры аглядзе спецгрупа знайшла вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў, якія перапраўляліся мяцежнікам. Палёт за палётам праходзілі амаль кожны дзень. У лютым 1986 г. пасля высадкі тактычнага паветранага дэсанта верталёт Рамана Тупіцы трапіў пад моцны агонь ПВА мяцежнікаў. Умела манеўруючы машынай, пры паўторным заходзе экіпаж верталёта знішчыў агнём з бартавой зброі дзве баявыя кропкі, якія перашкаджалі астатнім экіпажам правесці паспяховую пасадку дэсанта. Выконваючы чарговае баявое заданне, Р.І.Тупіца 29.6.1986 г. загінуў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў в. Поблін. Імем Р.І.Тупіцы названа адна з вуліц у Глуску.

Р.І.Тупіца.

Яны таксама ветэраны

Больш за 60 нашых землякоў выконвалі воінскі абавязак у Афганістане. Яны былі салдатамі і дзейнічалі так, як і належыць салдатам — сумленна, мужна і па-геройску. Таму зразумела, што ў многіх ёсць баявыя ўзнагароды. Ордэнам Чырвонай Зоркі ўзнагароджаны радавы Ю.П.Герман, капітан-верталётчык А.Г.Тычына. Медаль «За адвагу» ў малодшага лейтэнанта І.М.Губарава, малодшага сяржанта Ю.П.Дрэйгала, радавога В.І.Гошкі. Шэсць ветэранаў-«афганцаў» узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі», чатыры — «За адзнаку ў ахове дзяржаўных граніц», а верталётчык А.І.Старасотнікаў — медалём «За адзнаку ў ваеннай службе».

Ён лятаў у небе Афганістана больш за год і, зразумела, амаль штодня рызыкаваў жыццём. Закончылася ваенная служба, але рызыкі не стала менш — пачаўся Чарнобыль. А.І.Старасотнікаў у маі 1986 г. разам з іншымі верталётчыкамі «адвісеў» 20 дзён над рэактарам Чарнобыльскай АЭС, замяраючы радыяцыйны фон наваколля і тутэйшай зямлі. Потым — «новая вахта» на забруджанай тэрыторыі — дэзактывацыя верталётнай тэхнікі. Прыведзеныя факты толькі дапаўняюць характарыстыку гэта-

Мікрараён Глуска, які завецца «На сямі вятрах».

га мужнага чалавека. Менавіта ён і ўзначальвае раённую арганізацыю воінаў-інтэрнацыяналістаў, зрабіўшы яе не фармальным, а дзейсным аб'яднаннем, дзе клапоцяцца аб патрэбах усіх яго членаў.

У Глуску для іх пабудаваны спецыяльны 18-кватэрны жылы дом. Атрымалі былыя воіны кватэры і ў іншых жылых дамах. Сёння няма ніводнага воіна-«афганца», чыя просьба аб выдзяленні кватэры не была б задаволена. Райваенкамат, грамадскасць, кіраўніцтва раёна ніколі не пакідаюць іх, як і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, адзін на адзін з малымі і вялікімі праблемамі, паўсядзённымі клопатамі.

Н.Б.Сандамірскі.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Фальклорныя набыткі Глушчыны

КАЛЯНДАРНЫЯ СВЯТЫ

Аснову духоўнай культуры беларускага народа, як і любога іншага, складае абрадавая паэзія, цесна знітаваная з гадавым цыклам жыццядзейнасці працоўнага чалавека. Фальклорная спадчына — гэта няпісаная гісторыя роду чалавечага, тыя асноўныя этапы яго станаўлення, якія паўтарае кожнае новае пакаленне ў сваім зямным існаванні. Гэта — актыўны дыялог з прыродай, скіраваны на тое, каб заручыцца яе спагадай і падтрымкай, і адначасова святое яе ўшанаванне. Фальклорная творчасць — гэта магія слова чароўнага, з дапамогай якога ўшаноўвалі сваіх продкаў, клапаціліся аб захаванні сябе і свайго роду, аб паляпшэнні дабрабыту. Кожнае свята — гэта свята ўсяго роду. Таму на святкаванні не было пасіўных гледачоў і актыўных удзельнікаў. Прадстаўнік пэўнага ўзросту выконваў сваю адметную ролю, тым самым непасрэдна далучаўся да родавай урачыстасці.

Каляды. У старажытнасці новы гадавы цыкл пачынаўся ў дзень веснавога раўнадзенства, а з другой палавіны XVI ст. (калі ўся Еўропа перайшла на новае летазлічэнне — грыгарыянскі каляндар) пачатак года быў перанесены на дзень зімовага сонцастаяння, да якога і былі прымеркаваны Каляды.

Жанчыны вёсак Старое Сяло, Катка, Слабодка, Касарычы расказвалі, што Каляды былі вялікім і доўгачаканым святам, у падрыхтоўцы якога прымалі ўдзел і малыя, і дарослыя. Вёска ажывала пасля чатырохтыднёвага посту, пад час якога забараняліся гульні і ігрышчы, трэба было прытрымлівацца строгіх абмежаванняў у ежы. Асноўнымі стравамі гэтага часу, расказала Яўгенія Фядосаўна Вежнавец (1917 г.н., в. Старое Сяло), былі бульба з расолам, грыбы і капуста. У пятніцу ж наогул дазвалялася падсілкавацца толькі хлебам і вадой: адзін раз да ўсходу сонца, другі раз — позна вечарам. Таму пасты, асабліва Піліпаўскі і Вялікі, заўсёды з'яўляліся своеасаблівым фізічным і духоўным выпрабаваннем-ачышчэннем людзей, якія рыхтаваліся да новага жыццёвага цыкла (язычніцкі аспект), да моманту нараджэння Ісуса Хрыста — адзінага і ўсемагутнага збавіцеля хрысціянскіх вернікаў. Аднак якім бы працяглым і складаным ні быў пост, ён заўсёды заканчваўся разгавеннем. Напярэдадні Каляд забівалі кабаноў (старадаўні водгаласак язычніцкага ахвярапрынашэння багам прыроды і душам продкаў), рабілі кілбасы, вешалі іх на жэрдцы каля печы. Як яны цешылі вока дзетак! Ці не таму так паэтычна апяваюцца ў паставых перадкалядных песнях:

Калядкі блізка,
Кілбаскі нізка.
Высока вісяць,
Няможна дастаць.

Запісана ў 1992 г. у в. Слабодка ад Маркінай.

Святкаванне пачыналася вечарам 6 студзеня (па новым стылі). К.В.Курэцкая (1922 г.н., в. Старое Сяло) успамінала, што з раніцы жанчыны завіхаліся каля печы, прыбіралі ў хаце, нажом дабяла выскрабалі стол і лавы, гатавалі няцотную колькасць страў, галоўнай сярод якіх была куцця — ячная каша, закрашаная салам. Да вячэры куццю ставілі на рытуальную лаву ў чырвоны кут. Прычым чыгунок ставілі не на голую лаву, а на пучок сена, зверху клалі бохан хлеба. Вечаровым прыцемкам ладзілі святочны стол. Бацька прыносіў яшчэ адзін пучок сена, якім усцілалі доўгі стол, маці накрывала яго льняным абрусам, ставіла розныя прысмакі. Садзіліся за стол адпаведна даўняй завядзёнцы: мужчыны — з правага боку, уздоўж сцяны, маці з дочкамі і нявесткамі — з левага боку, бліжэй да сярэдзіны хаты, каб зручней было падаць яшчэ што-небудзь са страў. Але перш чым сесці вячэраць, хрысціліся і ставілі дадатковыя талеркі для памёршых. Бацька чытаў доўгую малітву, затым браў патрошку куцці і клаў на талеркі продкаў, прыгаворваючы: «Лажу кашу дзеду Івану. Лажу кашу бабе Насці...» Так паўтаралася столькі разоў, колькі сваіх продкаў памятала і ўшаноўвала сям'я. Затым пачыналася святочная трапеза. Кожнаму члену сям'і трэба было абавязкова пакаштаваць усе стравы, тым самым як бы далучыцца да радаводнай сувязі з продкамі і заручыцца іх падтрымкай на ўвесь год. Заканчвалася вячэра агульнай падзякай лёсу за мажлівасць сустракаць пачатак новага года. Усе прысутныя хрысціліся і гаварылі: «Дзякуем Хрысту Богу, Айцу і Сыну, і Святому Духу. Амінь». Недаедзеныя стравы са стала не прыбіралі, а пакідалі на ноч. Гэты звычай нагадвае сабой традыцыю памінальных свят, пад час якіх ежу пакідалі на стале да раніцы з верай у тое, што ноччу будуць сілкавацца душы продкаў. Пасля вячэры старэйшыя члены сям'і лажыліся адпачываць, а моладзь ішла на вячоркі. Асноўныя падзеі разгортваліся назаўтра вечарам, калі хлопцы-калядніkі распачыналі абход вёскі. Звычайна па вёсцы хадзілі некалькі гуртоў, якія папярэдне дамаўляліся паміж сабой аб святочных маршрутах. Ураджэнец в. Старое Сяло К.Ф.Сысой (1930 г.н.) адзначыў, што часцей за ўсё калядніkі хадзілі з «казой», «жоравам» і «канём», якія ў язычнікаў сімвалізавалі дабрабыт, пачатак новага цыкла прыроднага абуджэння, вялікую і дружную сям'ю. Побач прысутнічаў і сімвал новай, хрысціянскай, культуры — шасці- або васьміканцовая зорка, якую рабілі са старога рэшата, у якім выразалі адпаведную колькасць адтулін і затым мацавалі да іх рознакаляровыя «рагі», упрыгожаныя стракатымі папяровымі стужкамі. У сярэдзіну рэшата ставіліся іконка і свечка. Адвячоркам хлопцы збіраліся ў адным месцы, пераапраналіся ў старых, апошні раз паўтаралі словы святочных песень, муштравалі «казу». Да чаго ж зводзіўся асноўны сэнс калядных абходаў? Большасць славянскіх культуролагаў пагаджаецца з тым, што пераапранутая ў старых моладзь сімвалізавала продкаў, якія наведвалі сваіх сародзічаў і віншавалі іх на пачатку новага жыццёвага цыкла, замаўлялі на дабрабыт. Сённяшні перанос калядных і іншых святкаванняў на школьную сцэну, у клуб, на гарадскую пляцоўку разбурае натуральную эстэтыку свята: парушаецца сацыякультурная шматзначнасць, часавая і прасторавая прымеркаванасць, звужаецца функцыянальны спектр. Свята ператвараецца ў звычайную гульню-забаву з-за таго, што большасць выканаўцаў і арганізатараў ужо не ведаюць ці не разумеюць адвечны сэнс старадаўніх песень і рытуалаў. Таму ў нашых умовах кожнае свята ўяўляе сабой канцэрт мастацкай самадзейнасці. На самай жа справе абход калядніkаў зімой, валачобнікаў вясной, купальнікаў летам, багатнікаў восенню быў чароўна-магічнай дзеяй. Так рытуальным дзеяннем, аздобленым магічным словам, святочны гурт яднаў вясковую абшчыну, суродзічаў, жадаў ім шчасцівага году і дабрабыту:

А ці дома, дома сам пан гаспадар?
Святы вечар добрым людзям[1].
А калі ён дома, хай выйдзе на двор,
Хай выйдзе на двор ды зірне ў шчыры бор.
У шчырым бару шуміць і гудзе,
І шуміць і гудзе, два раёчкі ідзе.

[1]Прыпеў «Святы вечар добрым людзям» паўтараецца пасля кожнага радка.

Першы раёчак да нясе вашчочак,
А другі раёчак нясе мядочак,
Ці свечы сукаці да дачок аддаваці,
Сыту сыціці ды сыноў жаніці.

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад Марфы Антонаўны Сысой.

Хлопцы-каляднікі заходзілі з гэтай песняй у двор, звярталіся да гаспадара за дазволам зайсці пакалядаваць у хаце. Калі гаспадар даваў згоду, шумная кампанія ўвальвалася ў хату, вітала дамачадцаў і распачынала песню-замову пра «казу», якая кулялася на падлозе, спрабавала рагамі пакалоць дзяцей. Пасля непрацяглай гульні «каза» раптам валілася на падлогу мёртвай, што сімвалізавала заканчэнне старога года. Тым часам хлопцы падхоплівалі новую песню, у якой распавядалася пра тое, з якой мэтай завітала гэта незвычайная госця ў хату і як гасцінным гаспадарам зноўку ажывіць яе:

О-го-го каза,
О-го-го сера,
Дзе рогі дзела?
— На соль праела.
Соль дарагая, мера скупая.
Ох ты, козанька,
Не будзь гордзенька,
Расхадзіся ты
Па ўсяму двару,
Пакланіся нізенька
Як гаспадару, як гаспадыні,
Дайце казе сена.
Каб каза прысела.
Дайце казе сала,
Каб каза ўстала.
На печы аўёс —
Вялікі парос.
На палу жыта —
Нагамі збіта.
А ў том жыце перапе́ліца
Вывела дзяцей —
Люба глядзець.
Меншыя, большыя
паляцелі, а серадзельшыя засірацелі.
Казача, казача,
Вазьмі маю доч.
Дару табе пару сабак
І сала кум'як,
І мех мякіны,
Тону пярыны,
І куль саломы —
Бывайце здаровы.

Запісана ў 1992 г. у в. Старое Сяло ад Праскоўі Мікалаеўны Алёхна.

Аднак продкі-калядоўшчыкі клапаціліся не толькі пра дабрабыт сям'і, але і пра яе захаванне і прадаўжэнне. Калі ў сям'і быў хлопец, то яму спецыяльнай песняй жадалі ўзяць шчаслівы шлюб:

За варотмі вінаград, за варотмі зялёны.
Святы вечар добрым людзям[1].
А хто той вінаград ды сцярэгці будзе?
А сцярэгці будзе малады Ванечка.
Сцярог ночку, сцярог другую,
А на трэцю ночку сільненька заснуў.
А прыйшлі да яго два браткі яго:
— А ўставай, Ванечка, а ўставай маладзенькі,
Ужэ ж твой вінаград пташкі аб'елі,
Ужэ ж тваю дзевачку дружкі абселі.
— Я паэтаму не дбаю, я сваю спазнаю.
А ў маёй дзевачкі руцвяны вяночак,
Руцвяны вяночак, залаты пярснёчак,
Па плечках коскі развіваюцца
А пад вачыма слёзкі праліваюцца.

Запісана у 1991 г. у в. Старое Сяло ад Кацярыны Сцяпанаўны Сысой.

Адпаведнай песняй ушаноўвалася і дачка гаспадароў:

Ой, ясна, красна каліна ў лузе,
Святы вечар добрым людзям.
Ой красней, ясней, Кацечка, у бацькі.
Па двару хадзіла — увесь свет адгасіла.
У сені ўвайшла — чаравічкі зарыпелі,
На парог увайшла — скрыпкі зайгралі,
А ў хату ўвайшла — у хату баяры.
Купкі спаўняюць, дай Кацечку ўмаўляюць:
— Я не князёўна, я не папоўна,
Простая мужычка, Дзям'янава дачка.

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад К.С.Сысой.

З гісторыі беларускай культуры вядома, што пасля прыняцця хрысціянства яго асноўныя святы прымяркоўваліся да найважнейшых свят язычніцкага календара. Адначасова з Калядамі сталі святкаваць Раство Хрыстова. Новыя духоўна-культуралагічныя рэаліі паўплывалі на сюжэты традыцыйных песень. У народным асяроддзі ўзнікае новае кола калядных пе-

[1]Прыпеў «Святы вечар добрым людзям» тут і далей паўтараецца пасля кожнага радка.

сень, якія ўяўляюць нешта сумежнае паміж замовамі-велічаннямі і духоўнымі вершамі, у якіх пераважала ўласна хрысціянская тэматыка:

Ой, у полі, у полі ды стаяла цэркаўка,
Святы вечар добрым людзям.
Што ў той цэркаўцы свечы гарэлі,
Свечы гарэлі, іскорка ўпала,
Іскорка ўпала, сіня мора стала.
Што ў том сіням моры сам Бог купаўся.
Ісусам Хрыстом да Святым Ражаством,
А Святое Ражаство радасці прынясло,
А святое Васілле развесяліла.

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад К.С.Сысой.

Праз тыдзень святкавалася другая куцця, якую называюць «багатай». У тым самым чыгунку з тоўчанага, дранага ячменю варылася каша, гатавалася мяса, пякліся мучныя або бульбяныя бліны, варылася капуста, смажыліся кілбасы. І назва пераднавагодняй вячэры («багатая куцця»), і мноства разнастайных страў мелі глыбокі магічны сэнс: шчодры стол, верылі продкі, павінен забяспечыць такое ж багатае сталаванне на працягу ўсяго года. З надыходам цемнаты зноўку збіраліся калядоўшчыкі, цяпер ужо дзяўчаты-«цыганкі», якія вадзілі з сабой каня і насілі звязду, у сярэдзіне якой ставілі сем свечак. Асаблівасць абходу вёскі дзяўчатамі — «затанцоўванне шчодрыка» пад вокнамі хаты. Дарэчы, сярод «цыганак» мог знаходзіцца і пераапрануты хлопец. Калі дзяўчаты заходзілі ў чарговы двор, калядніцы запявалі:

Шчадрую, шчадрую,
Кілбасу чую.
А ты, дзягначка,
Ідзі ў клетачку,
Набяры аўса,
Наверх кілбаса.
Скарэй дарыце,
Нас не марыце,
Кароткі світкі,
Памерзлі лыткі.

Запісана ў 1992 г. у в. Касарычы ад В.Н.Турлыка.

А тым часам «цыганка» вытанцоўвала каля хаты. Яна рухалася па кругу, але твар яе пастаянна быў скіраваны на кутняе акно хаты. Адзенне «цыганкі» вылучалася багата аздобленымі рознакаляровымі стужкамі, гузікамі, пацеркамі. Вольга Ніканаўна Багук з в. Халопенічы расказала, што абавязковым атрыбутам «цыганкі» была вялікая квяцістая хусціна з махрамі, перакінутая цераз плячо. Да махроў прывязвалі шаршуны для шуму, святочнасці. Няма сумненняў, што і сам характар дзеі, і яе слоўна-музычнае суправаджэнне, і характар затанцоўвання (углядацца ў вокны-вочы хаты) адлюстроўваюць надзвычай глыбокі пласт язычніцкай культуры, характэрная асаблівасць якой у магічнай накіраванасці.

Калядныя віншаванні гаспадароў былі надзвычай разнастайнымі і ўвабралі ў сябе галоўныя прынцыпы народнай педагогікі. Гасцінным і ветлівым гаспадарам дзякавалі яшчэ адной велічальнай песняй, на заканчэнне якой гучалі рэчытатыўныя пажаданні:

Дай, Бог, праважаці
І на лета даждаці,
У радасці, у карысці,
У добрым здароўі.

Калі ж гаспадары не запрашалі гасцей у хату, то ў іх адрас ляцеў праклён:

Цынкі, цынкі,
Каб памерзлі вашы свінкі.
Татарынкі, татарынкі,
Няхай воўк паесць усе свінкі.
Не дала масла,
Штоб карова згасла.
Не дала сала,
Штоб свіння не ўстала.
Я цябе дзядзька закалядую,
Дзянначка памрэ,
Возьмеш другую.

Запісана ў 1992 г. у в. Слабодка ад Алены Рыгораўны Далідовіч.

Жыхарка в. Слабодка Домна Мікітаўна Логін успамінала, што кожны перадняваго дні вечар напаўняўся дзявочымі варожбамі. Варажылі на дровах, на «калах» агароджы, на блінах, на выявах ад ценю спаленай паперы.

Трэцяя куцця прымяркоўвалася да «крашчэння» (19 студзеня) і называлася «поснай». Абходаў вёскі ў гэты вечар не рабілі, але святочная вячэра ладзілася. Распачынаў яе бацька. Ён чэрпаў лыжкаю куццю, ішоў да дзвярэй, адкрываў іх і звяў:

— Мароз, Мароз! Хадзі к нам куццю

куццяваць, каб не марозіў гарбузоў, гуркоў, буракоў!

Затым маці налівала бацьку чарку гарэлкі і гаварыла:

— Во табе спаўна, будзе год поўны!

Вячэра цягнулася нядоўга. Пасля яе бацька браў бохан хлеба, соль, свечку і разам з роднымі абходзіў усе гаспадарчыя пабудовы, ставячы на сценах і дзвярах крэйдай па тры крыжы.

Доўгімі калядныміі вечарамі занятак знаходзіўся ўсім. Дзеці ў прысутнасці бабуль і дзядуль гулялі ў розныя рухавыя гульні. Хлопцы і дзяўчаты збіраліся асобна ў якой-небудзь хаце, каб удосталь натанцавацца або пазабаўляцца. Як адзначалі многія жанчыны, у гады іх дзявоцтва танцавалі больш прыгожа — павольна, пластычна. Былі і рухавыя, хуткія танцы, але ўсе «ад душы». У асноўным танцавалі польку, матлёт, лявоніху, кракавяк, вальс, падыспан. А каб даць адпачынак музыку, пачыналі правіць «шчодрыя гульні». Напрыклад, хлопец станавіўся на лаву і пачынаў прызнавацца ў каханні адной з дзяўчат. Праз нейкі час тая, каму прызначаліся словы кахання, падыходзіла да прамоўцы-каханага — і цалавала яго. Затым на лаву станавіўся другі хлопец, і ўсё паўтаралася. Захапляліся і жартоўнай гульнёй «У фатографа». Пасярод хаты ставілі стул, на яго садзілася дзяўчына. Вакол яе ўсе станавіліся ў круг і пачыналі хадзіць «па сонцы». Хто-небудзь з хлопцаў прасіў дзяўчыну ўстаць, а затым сесці. Пасля некалькі разоў паўторанай просьбы-каманды адзін з удзельнікаў гульні непрыкметна адносіў стул убок. Калі дзяўчына не здагадвалася пра падвох, то падала на падлогу. Потым яе месца займала другая ўдзельніца гульні.

Калядныя гульні і ігрышчы выконвалі ў жыцці вясковай моладзі вельмі важную сацыяльную ролю. Перш за ўсё яны ядналі новае пакаленне, якому лёсам было наканавана падхапіць радаводную эстафету. Адразу ж пасля Каляд пачынаўся мясаед — час найбольш спрыяльны для вяселляў. Магчыма, апошняя акалічнасць садзейнічала ўзнікненню бясконцага мноства варыянтаў народнай варажбы. Старанавагодняя ноч або ноч перад Вадохрышчам ператварала вёску ў тэатр магіі і цудадзейства. Дзяўчаты варажылі, спрабуючы знайсці адказ на шматлікія пытанні, што хвалявалі іх. Па колькасці ўзятых у бярэмя дравін або ахопленых рукамі штыкецін («калоў») чыталі сваю будучыню: замужжа («цот») ці далейшае дзявоцтва («няцот»). Камячылі паперу, клалі на сподак і палілі, затым рэшткі спаленага падносілі да свечкі, а па канфігурацыі ценю на сцяне разгадвалі свой лёс. Блізкай да гэтай была варажба з растопленым воскам. Яго вылівалі ў шклянку з вадой. Калі застылая форма нагадвала труну — чакай смерці, дарогу або твар чалавека — выйсці замуж. Варажба на люстэрках магла дапамагчы ўбачыць выяву суджанага. Апоўначы пад ложак або лаву ставілі шклянку з вадой. Калі колькасць вады заставалася той жа, значыць, можна спадзявацца на замужжа; калі ж вады аказвалася менш, то гэта прадказвала непрыемнасці (усе варыянты варажбы расказала Домна Мікітаўна Логін).

Стрэчанне. Адзначалася 15 лютага, лічыцца, што ў гэты дзень зіма з летам сустракаецца. Галоўнае абрадавае дзеянне свята заключалася ў асвячэнні спецыяльнай свечкі, зробленай напярэдадні. Больш заможныя гаспадары, якія трымалі сваіх пчол, рабілі свечкі самі з плаўленага воску. Жыліцу часцей за ўсё сукалі з кужалю. Затым на працягу ўсяго года свечка выконвала ролю свяшчэннага ахоўна-засцерагальнага амулета. Звычайна яна захоўвалася ў скрыні — як мага далей ад ліхога чалавечага вока. Даставалі і запальвалі толькі з нагоды важных сямейных падзей: калі сеялі яравую збажыну, садзілі бульбу, збіралі ўраджай, калі нараджалася дзіця ці памірaў стары чалавек. Важную ролю выконвалі свечкі і ў вясельнай абраднасці мясцовых жыхароў. Д.М.Логін расказвала, што грамнічнымі свечкамі сваты лучылі маладых перад ад'ездам да царквы. Сваты звярталіся да бацькоў жаніха:

— Благаславіце, ацец і маці, каго Бог здарыў у гэтай хаце свечы злучаці!

Бацькі ў адказ тройчы паўтаралі:

— Бог благаславіць!

Усе прысутныя ўважліва сачылі за тым, як гарэлі свечкі. Калі свечка гарэла ўстойліва і ярка, прадказвалі маладым добрае жыццё; калі ў каго агеньчык патухаў, то зазначалі, што яго чакае «кароткае жыццё».

Найбольш сталыя жанчыны раёна памятаюць, што ў канцы зімы і пачатку вясны святкавалі **Масленку.** Цэнтральным днём масленічнага тыдня быў чацвер, які называўся Уласс. У гэты дзень мужчыны аб'язджалі коней-першагодкаў. Вечарам жа ўсіх дамачадцаў чакала святочнае частаванне: ячныя, аржаныя, грачнёвыя і бульбяныя бліны. У пятніцу блінамі частавалі гасцей, а ў суботу маладыя зяці (якія пажаніліся ў апошні мясаед) хадзілі або ездзілі да цешчаў на бліны. Такі даволі просты абрад узаемнага віншавання і падзякі выконваў важную ролю далейшага паяднання двух родаў, наладжвання паміж імі прыязных, свайцкіх адносін. У апошні дзень Масленкі спраўлялі загавіны на пост. Найбольш набожныя жанчыны нават выпальвалі патэльні, каб на іх не засталося ні кроплі жывёльнага тлушчу.

Пачынаўся Вялікі сямітыднёвы пост, які моцна ўплываў на характар вясковага жыцця. Праваслаўная царква забараняла праводзіць розныя гульні і ігрышчы, ладзіць вячоркі са спевамі і танцамі. Не дазвалялася спраўляць вяселлі. У пост людзі адмаўляліся ад ежы жывёльнага паходжання. Такім чынам чалавек праходзіў даволі складанае фізічнае і духоўнае выпрабаванне, рыхтуючыся да найвялікшага свята, — уваскрашэння Ісуса Хрыста.

Эмацыянальна-экспрэсіўная стрыманасць у паводзінах людзей зусім не азначала, што вёска выбівалася са звыклага рытму жыцця. Чалавек працаваў, рыхтаваўся да вясны. Гаспадарлівыя рукі даводзілі да ладу калёсы, плугі, бароны, іншыя прылады працы. Гаспадыні спяшаліся наткаць столькі палатна, каб яго хапіла на новыя сарочкі ўсім дамачадцам. Ткаліся прыгожыя святочныя ручнікі, дываны, посцілкі, ад якіх хата на Вялікдзень ператваралася ў чыстую і цудадзейную святліцу. І хоць балела спіна, душа ўсё ж радавалася прыгажосці вытканых арнаментаў. А калі радавалася, то цяжка было ўстрымацца ад ціхай, працяжнай, крыху сумнаватай песні:

У майго брата да новая хата,
Новая хата да на памосце,
Ідзе сястра к брату ў госці:
А брат кажа:
— Прымай, жана, хлеб і соль са стала,
Бо ідзе ў госці сястра.
А сястра гэта ўсё чула
І на парозе памякнула:
— Пастой, братка, не ўлякайся,
С хлебам-соллю не хавайся,
А я ўчора павячэрала,
А сёння паснедала,
Свайго братку адведала,
Не так братку, як дзетак тваіх,
Што няма ў мяне сваіх.

Запісана ў 1992 г. у в. Старое Сяло ад П.М.Алёхна.

Вербніца. За тыдзень да Вялікадня мясцовыя жыхары адзначалі свята ўшанавання дрэва, якое першым рэагавала на пацяпленне і тым самым сімвалізавала пачатак новага жыцця. Сяляне зразалі некалькі галінак вярбы, асвячалі іх у царкве, прыходзілі дадому і некалькі разоў сцёбалі імі ўсіх дамачадцаў, пачынаючы перш за ўсё з дзетак, і прыгаворвалі:

Не я б'ю,
Вярба б'е,
Святы дзень
Да Вялікадзень.

Затым з гэтай вярбой хадзілі на могілкі. У час пасяўной некалькі галінак утыкалі ў канцы жытнёвых палеткаў. Летам запальвалі сухую галінку, каб перасцерагчыся ад перуна і маланкі.

Вялікдзень. Ён займаў важнае месца ў структуры беларускага народнага календара. Вядома, што да 1583 г. у большасці еўрапейскіх народаў, у тым ліку і ў славян, год пачынаўся з дня веснавога раўнадзенства. Нашы продкі-язычнікі ўшаноўвалі ў гэты дзень Ярылу, Бога Сонца. У сярэдневякоўі да яго прымеркавалі святкаванне хрысціянскага Вялікадня. І хаця Вялікдзень адзначаецца ў розны час (пасля першай поўні, што надыходзіць пасля дня веснавога раўнадзенства), менавіта пасля яго сяляне браліся за веснавыя работы. Свята пачыналася з усяночнага богаслужэння, у час якога асвячаліся «паска», чырвоныя яйкі, соль, вяндліна. З храма людзі спяшаліся дадому, бо верылі, што тым самым паспрыяюць лёгкаму ацёлу каровы, а пчолы дадуць больш раёў. Важным момантам набажэнства з'яўляецца ўзняцце апоўначы абраза Ісуса Хрыста. У гэты момант трэба было мець пры сабе некалькі яловых галінак, якія асвячаліся ў царкве, а летам запальваліся ў навальніцу, каб засцерагчы хату і па-

будовы ад маланкі. Святочныя падзеі доўжыліся два дні — нядзелю і панядзелак. У першы дзень Вялікадня па вёсцы хадзілі валачобнікі. Іх абход выконваў тую ж ролю, што і калядоўшчыкаў: паяднаць род і вясковую абшчыну, пажадаць ім дабрабыту, плёну ў працы, фізічнай моцы і здароўя, каб спраўна сабраць будучы ўраджай. Святочныя песні, захаваныя ў народнай памяці, розняцца па часе стварэння і тэматыцы. Адны з іх як бы расшыфроўваюць змест рытуальнага дзеяння, якое бярэ пачатак у сівой даўніне, але не вельмі зразумела нам:

Жыў дзед і бабка,
Была ў іх курка-рабка,
Нанесла яец каробку і карабец.
Прыйшлі да іх унучкі,
Усе валачобнічкі.
Усім далі па яечку,
Адной сіраце не выйшла.
Пайшла сірата за новыя варата.
Вярніся, сірата, за новыя варата,
Дадзім хлеба лусту
Шчэ й шаўковую хусту.

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад Васіля Аляксеевіча Алёхны.

Другія адлюстроўваюць жыццёвы шлях Сына Божага Ісуса Хрыста, яго распяцце на крыжы, смерць і ўваскрашэнне, вестку аб якім і неслі па вёсцы валачобнікі:

На першы дзень, на Вялікдзень,
Маці сына нарадзіла.
На другі дзень, на Вялікдзень,
Маці сына ў свет пусціла.
На трэці дзень, на Вялікдзень,
Сама пайшла, гукаючы,
Свайго сыночка шукаючы.
Цераз поле шырокае
Ляжыць кладка вельмі гладка.
Сустракае тры ангелы:
— Вы, ангелы маладыя,
Ці не бачылі майго сына,
Майго сына Ісуса Хрыста?
Адзін кажа: «Я не бачыў».
Другі кажа: «Я й чуць не чуў».
Трэці кажа: «Не тоймася,
Не тоймася, прызнаймася!
Твайго сына на муку ўзялі,
На крыж ручкі разапялі,
Прастым гвоздзем прыбівалі
І кроў гарачу пралівалі».

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад М.А.Сысой.

Ад М.А.Сысой пашчасціла запісаць малавядомую на Беларусі песню валачобнікаў пра цмока. Сюжэт песні надзвычай старажытны. У ім адлюстраваны абрад ахвярапрынашэння багам свайго племені (у дзень веснавога раўнадзенства) найпрыгажэйшых дзяўчат. Шматвяковае існаванне песні ўвабрала ў сябе і больш познія зрухі ў культуры славянскіх народаў, перш за ўсё пашырэнне хрысціянства, якое прынесла з сабой новы светапогляд, новую свядомасць, новыя ўзаемаадносіны з акаляючай прыродай і Сусветам:

Была зямля не свянцона,
Былі людзі ні хрышчоны,
Не верылі Госпаду Богу,
Да верылі лютаму цмоку.
Дай цмоку ўсю аброку,
Дай кожны дзень па чалавеку,
Ішло яно ў іх па чарзе.
Прыйшла чарга да й да цара:
Ці сам ідзі, ці дачку шлі,
Ці сыночка маленькага,
Ці дружочка вярненькага.
Я і сам не іду, і дачку не ішлю,
І ні сыночка вярненькага.

Ёсць у міне служаначка.
Служаначка паслушная,
Надзявайся ў чыстае белле
Да ідзі ж ты ў чыстае поле
І к сінему мору,
Да і стань на калені.
Ручкі ты накрыж паклаўшы,
Госпада Бога папрасіўшы:
— Ратуй, Божа, ад наглай смерці,
Ад наглай смерці неспадзяванай.
Святы Юрай цераз поле,
Люту цмоку цераз мора
Святы Юрай пікай пора.

Вялікаднем заканчваўся самы працяглы пост, таму вёска з самага рання ажывала, напаўнялася песнямі валачобнікаў, вясёлай гаманой дзяцей. Яны спяшаліся адведаць сваіх бабуль і хросных бацькоў, якія шчодра адорвалі ўнукаў і хрэснікаў чырвонымі яйкамі. А пасля гэтага на вулічным узвышшы распачынаўся святочны вір. Хлопчыкі і мужчыны паасобку ачышчалі ад смецця пляцоўкі і пачыналі качаць яйкі, гуляць у біткі. Колькі было радасці, смеху, шчаслівых хвілін перамогі!

На другі дзень, у панядзелак, у вёсках раёна спраўлялі веснавыя **Дзяды** — ушанаванне памёршых суродзічаў. Цэлымі

сем'ямі ішлі на могілкі, каб прыбраць магілы продкаў. Жанчыны падмяталі смецце, мужчыны наразалі дзёран і абкладвалі ім магілы, хлопцы насілі свежы жаўтапес. Пасля ўпарадкавання ладзілася непрацяглая памінальная трапеза. Хлопчыкі малявалі свянцоным яйкам пасярэдзіне магілкі крыж, жанчыны расцілалі белы льняны абрус і раскладвалі пачастунак.

Аднак больш працяглае агульнародавае ўшанаванне продкаў звычайна адбывалася на дзевяты дзень пасля Вялікадня, на **Радаўніцу**. Перад тым, як распачаць новы цыкл сельскагаспадарчых работ, жывыя заручаліся падтрымкай сваіх прашчураў, бо верылі, што іх душы непасрэдна звязаны з тым светам, ад якога залежыць і стан надвор'я, і здароўе жывых, і плоднасць скаціны.

У любым куточку Беларусі можна пачуць прыказку: «Вясновы дзень год корміць». Працоўны чалавек закладваў асновы свайго восеньскага дабрабыту. Шматвяковы вопыт земляробства дазволіў нашым продкам распрацаваць падрабязны каляндар, у якім былі вызначаны найбольш спрыяльныя і найбольш неспрыяльныя дні для правядзення тых ці іншых работ. М.А.Кабернік (в. Слабодка) пераконвала, што бульбу не трэба садзіць у «мужчынскія» дні: панядзелак, аўторак і чацвер. Спрыяльнымі ж лічацца толькі «жаночыя» дні: серада, пятніца, субота. У гэтыя ж дні пажадана садзіць агуркі і цыбулю. У чацвер за грады лепш не бярацца, бо ўсё пасаджанае з'ядуць чэрві. Такія ж абмежаванні тычыліся і іншых бакоў гаспадарчай дзейнасці. Напрыклад, да Благавешчання нельга было чапаць зямлю і гарадзіць новы плот, бо лічылася, што летам не будуць ісці дажджы. На Благавешчанне гаспадыні хавалі верацёны, каб не сустракаць у лесе вужоў і гадзюк. І толькі пасля гэтага надзвычай вялікага свята вёска пакрысе ажывала. Можна было падправіць гнілы плот, дазвалялася распачынаць ворыва. Прычым, адпраўляючыся заворваць поле, гаспадар клаў у торбу адзін з хрэсчыкаў, якія выпякаліся на Серадапосце, — у сераду на чацвёртым тыдні Вялікага сямітыднёвага посту.

Прыкметы пабудовы беларускага народнага календара сведчаць аб тым, што кожнае свята гадавога цыкла мяняе характар дзейнасці чалавека. Свята можа фіксаваць або пачатак пэўных работ, або неабходнасць іх заканчэння («Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшоў Ілья — апала два. Прыйшоў Барыс — за соху бярысь»). Адпаведная роля належала і **Юр'еву дню** (6 мая), калі першы раз выганялі ў поле скаціну. Цяжка знайсці ў побыце сялян-беларусаў яшчэ адну хатнюю жывёліну, якая б ушаноўвалася так пачціва, як карова. Выключная роля каровы ў гаспадарцы паспрыяла ўзнікненню цэлага шэрагу магічна-ахоўных рытуалаў і вялікага цыклу магічнай паэзіі.

Яшчэ да ўсходу сонца «тавар» (статак) выганялі на юраўскую расу. Трэба было, каб каровы пахадзілі па жыце і як бы набраліся моцы ад палеткаў. Але асноўны клопат гаспадыні тычыўся выгану каровы да статку. Яе заганялі на сярэдзіну двара, тройчы абносілі свянцоным велікодным яйкам, а з правага боку сыпалі «крастом соллю», каб перасцерагчы ад сурокаў. У варотах гаспадар клаў замкнёны замок, велікоднае яйка і соль. Трэба было, каб карова пераступіла праз гэтыя рэчы. На вуліцу карову выганяла гаспадыня, тройчы пасцёбаўшы яе асвячонай галінкай вярбы, змочанай у свянцонай вадзе, і прыгаворваючы:

Каб была здарова, як вярба,
А багата, як зямля,
А малака было, як вады.

Многія гаспадыні акрамя гэтага кароценькага пажадання-перасцярогі ціхенька шапталі замовы:

Я сваю кароўку на пашу выганяю,
Юр'я і Міколу на помач прызываю,
Юр'еву расу сабіраць,
Мікольную траўку сабіраць.
Дай жа мне, кароўка,
Па бака малака,
Па капытцы масла.

Запісана ў 1993 г. у в. Слаўкавічы ад М.А.Марус.

Калі ж карова выходзіла на вуліцу, жанчына брала яе след і кідала назад у двор. Гэтым рытуалам нібы забяспечвалася штовечаровае вяртанне яе дадому. Часавая прымеркаванасць да Юр'я першага выгану жывёлы ў поле паслужыла асновай для ўзнікнення своеасаблівых прыказак: «Да Юр'я павінна быць сена і ў дур-

ня, а на Міколу падавай і вілы пахавай». Але асабліва шырока вядома з'едлівая прыказка пра здвоенае святкаванне Юр'я (веснавога і зімовага): «Два Юр'і — абодва дурні: адзін халодны, другі галодны».

Тройца. З'яўляецца заключным этапам у цыкле веснавых свят і абрадаў і адзначаецца на сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Гэта шматпланавае свята, яно як бы працягвала традыцыю Вербніцы, ушаноўваючы дрэвы клён, бярозу, сокам якіх селянін наталяў смагу і ў доўгі перадвелікодны пост, і ў час касавіцы. Галінкамі клёну вяскоўцы ўпрыгожвалі вуліцы, вароты, дзверы хаты, юшку грубкі і печы, вокны, бэлькі, бажніцу. А на двары перад кожным акном хаты хлопцы ставілі «май» — у рост чалавека бярозкі.

Адметнай асаблівасцю веснавых абрадаў з'яўляецца ваджэнне карагодаў, гісторыя ўзнікнення якіх цесна звязана з магічна-ахоўнымі рытуаламі. Цяжка сказаць, чаго ў іх было больш: ці жадання разбудзіць зямлю, ці паяднаць у адну статусную групу прадстаўніц розных вясковых родаў. Вучоныя здавён адзначаюць, што для вуснай паэзіі славянскіх народаў характэрна цеснае знітаванне матываў сельскагаспадарчага накірунку з матывамі кахання і шлюбу.

Адзінства сямейнай і сельскагаспадарчай тэматыкі грунтуецца на светапоглядна-ай сістэме нашых продкаў. Лічылася, што рытуальныя ігрышчы і гульні моладзі — фізічна найбольш актыўнай часткі абшчыны, на якую ўскладваецца абавязак працягу свайго роду — спрыялі ўрадлівасці зямлі, абуджалі яе да новага жыцця. Моладзь перадшлюбнага ўзросту вірылаюрыла, чакаючы восеньскіх Пакроваў са спадзяваннем на згоду бацькоў справіць вяселле. А ў маладзіц тым часам галава балела аб сваім. Пакуль што яшчэ нязвыкла жылося ў чужой сям'і, сэрца смуткавала па сваіх родных. Душэўны неспакой міжволі адзываўся песняй-успамінам, песняй-прывітаннем:

Ой, у лузе, ой, у лузе
Трава палягла.
Трава палягла,
Ой, да мяне, маладзеньку,
Журба абняла.
Журба абняла,
Ой, як засну, так забуду,
Прачнуся — на ўме.
Прачнуся — на ўме,
Ой, е ў мяне братачка
ў чужой старане.
У чужой старане
Ён жа седзявячы да ці
Мяне ўспамяне.
Мяне ўспамяне,
— Ой, вячэрай, мой братачка,
Вячэрала я.
Вячэрала я,
Да ела горку каліначку,
Што ў лузе цвіла.
Што ў лузе цвіла.
Да каму горка каліначка,
А мне салодка.
А мне салодка.
Да каму ж блізка радзімачка,
Мне далёка.

Запісана ў 1977 г. у в. Барбарова ад Н.К.Марціновіч.

У Глускім раёне ў розныя часы давялося запісаць не толькі ўласна народныя абрадавыя песні, звязаныя са старадаўнім земляробчым цыклам, але і творы больш позняга часу, у якіх асэнсоўваюцца матывы хрысціянскай рэлігіі. Так, Д.М.Алёхна праспявала песню, змест якой раскрывае народнае ўяўленне аб змесце і характары хрысціянскай Тройцы:

Вой, пакайцеся, хрысціяне, пакайцеся,
Вой, будзе вам час — урэм'я.
Да зямля з небам уздрыгнецца*,
Да дробны дожджык разальецца,
Белы камень распадзецца,
Пацякуць рэчкі вадзяныя*,
Пойдуць затворы земляныя*.
Тады Ісус Хрыстос з неба сойдзе.
Ён жа сойдзе памаленьку,
Да возьмя трубу жаласненьку,
Ён затрубіць жаласненька,
Ён пабудзіць мірну душу.

Да ўстань, устань і змірна душа.
І змірна душа.
Ужэ ж мы Богу саграшылі,
Да навек пекла заслужылі,
А тое ж пекла вельмі пекна:
Смала кіпіць, агонь гарыць,
Агонь гарыць ясны — дым няшчасны.

*Адзначаныя радкі спяваюцца два разы.

Агонь гарыць смутны — дым пакутны,
Ой, Божа ж мой мілюсенькі,
Што б я знала да ведала,
Атцу-маці ножкі мыла, ножкі мыла,
Да сама, сама тую ваду піла.

Запісана ў 1991 г. у в. Старое Сяло ад Дар'і Мікітаўны Алёхна.

Тройца і Русальны тыдзень заканчвалі вялікі цыкл прыгожых веснавых свят, зместам сваім звязаных з асноўнымі земляробчымі клопатамі гэтага часу. Таму невыпадкова ў траецкіх абрадах і паэзіі на першы план выходзіла занепакоенасць людзей пра захаванне і працяг свайго роду. Гэтыя ж матывы падхоплівае і святкаванне **Купалля**, якое адзначалася ў час летняга сонцавароту (у ноч на 24 чэрвеня па с.ст. або на 7 ліпеня па н.ст., што, безумоўна, ужо не адпавядала важнейшай прыроднай сузалежнасці). Асноўная святочная дзея адбывалася на ўзлеску побач з рэчкай або возерам. Да месца, на якім апоўначы распальваўся купальскі агонь, хлопцы зносілі ўсялякую старызну. Дзяўчаты з кветак плялі прыгожыя вянкі. Пасля таго, як заканчваліся асноўныя будзённыя гаспадарчыя клопаты, увесь вясковы люд, пераапрануўшыся ў святочнае адзенне, ішоў да месца запальвання рытуальнага вогнішча. Для здабывання агню нашы продкі крыж-накрыж клалі дзве лучыны, у сярэдзіну якіх устаўляўся яшчэ адзін брусок. Дужы хлопец энергічна круціў гэты брусок у далонях да таго часу, пакуль не з'яўляўся агеньчык. Запаленыя лучыны перадаваліся старэйшаму, найбольш паважанаму чалавеку вёскі, які, быццам чарадзей, падыходзіў да вялікага конусападобнага лаўжа і падпальваў яго. Усё навакольле тым часам напаўнялася гоманам, крыкамі моладзі, песнямі. Полымя шугала ў самае неба. Усё новую і новую сілу надавалі яму старэйшыя вяскоўцы. Ідучы на свята, яны бралі з сабой засохлы «май», які пасля Тройцы не выкідвалі, а спецыяльна захоўвалі ў кашарах да Купалля. Засохлыя бярозкі кідалі ў агонь па чарзе, сем'ямі.

Пакуль пачцівая частка вяскоўцаў выконвала ачышчальны рытуал, моладзь вадзіла вакол вогнішча карагоды, спявала песні:

Наша Купалачка купалася,
На беражочку абдувалася,
На каменьчыку сушылася.
Наша Ганулька журылася,
Як на пасадзе садзілася:
— У мяне свёкарка не родны татка,
У мяне свякроўка не родна мамка.
Ой, будзяць мяне ранюсенька,
Шлюць па вадзіцу маладзіцу.
А я, малада, паслушна была:
Узяла вядзёркі, пастукала,
Ой, пастукаўшы, сама лягла.
— Не ліха робіш, сам зробіш.
Не ліха робіш, сам зробіш.
Не трасца трасе — сам прынясеш.

Запісана ў 1938 г. у в. Усцярхі.

Як толькі агонь прытухаў, дзяўчаты пачыналі смажыць яечню, якой частавалі хлопцаў і дарослых мужчын. А тыя не супраць былі ўзяць святочную чарку гарэлкі. Пасля вячэрняй трапезы зноўку бясконца звінелі песні, пачыналіся скокі праз вогнішча. Моладзь бралася за рукі і з разгону сягала цераз агонь. За гэтымі, здавалася б, проста забаўляльна-гульнёвымі скокамі хаваўся рытуальны пераход пэўнай часткі вясковай моладзі ў іншы сацыяльны статус — перадшлюбны ўзрост. Менавіта такім пераходам і абумоўлена тэматыка большасці купальскіх песень:

Ой, вы, кумушкі, вы, галубушкі,
Вы й куміцеся, вы й любіцеся,
Вы любіцеся, вы любіце мяне.
Як пойдзеце вы ў вішнёвы сад цвяты зрываць,
Вы сарвіце мне.
Як будзеце вянкі віць,
Дык савійце мне.
А будзеце на мора пускаць,
Дык пусціце мой.
Усе вянкі плывуць,
А мой утануў,
Усе дружкі дамоў ідуць,
А мой не прыйшоў.

Запісана ў 1992 г. у в. Старое Сяло ад П.М.Алёхна.

Гэты дзявоцкі клопат шукаў надзейнага падмацавання і ў начной варажбе. Далейшы лёс дзяўчаты маглі вызначыць, пускаючы вянкі на ваду. Калі паплыве — чакай увосень сватоў, калі ж патоне — гэта прадказвала нядолю. Найбольш нецярплівыя і смелыя ішлі варажыць на скрыжаванне дарог (як на мяжу двух сусветаў: свайго і чужога, а можа продкаў-

прашчураў, якія ўсё ведалі і маглі падказаць ці прадказаць наканаванае шчасце). Яны звярталіся з просьбай-замовай да трыпутніка, які сябраваў з усімі вятрыскамі і ўсё ведаў:

Прыдарожнік прыгожы,
Расцеш пры дарозе,
Бачыш старога і малога,
Пакажы мілога.

Пры гэтым трэба было рукі трымаць за спінай, нізка прыгнуцца дадолу і зубамі вырваць трыпутнік. Гэта чароўная зёлка разам з кветкавым вянком клалася на ноч пад падушку. Лічылася, што яны дапамогуць ноччу ў сне ўбачыць свайго суджанага. Купальская ноч, як і ноч калядная, была ва ўяўленнях нашых продкаў своеасаблівай мяжой. Іх аб'ядноўвала недакладнае вызначэнне самога стану Бога Сонца. Узімку тры дні сонцастаяння бачыліся днямі безабароннасці, адкрытасці, нявызначанасці. Гэта як і пахаванне або народзіны. Чалавек займаў супярэчлівую пазіцыю паміж жыццём продкаў і жыццём сучаснікаў. Хрэсьбіны або пахаванне чалавека канчаткова фіксавалі змену статуса і адпаведна вымагалі пэўных нормаў паводзін. Купальская ноч нітавала паміж сабой нябачнае мінулае і непразрыстае будучае. Чалавек як бы атрымліваў магчымасць адначасова размаўляць з мінулым, а праз яго знаходзіць адказы на будучае. Вось гэта раздваенне па-свойму скарыстоўвалі людзі рознай сацыякультурнай арыентацыі.

Жанчыны старэйшага ўзросту ўспаміналі пра тое, што многія знахаркі, шаптухі, народныя лекаркі збіралі апоўначы або перад усходам сонца лекавыя зёлкі, якія ў сукупнасці з магічным словам тварылі цуд: дапамагалі паставіць на ногі, здавалася б, безнадзейна хворага чалавека. Але жыццёвая дыялектыка трымалася на тым, што дабро заўсёды процістаяла злу. Гэты прынцып вельмі выразна рэалізоўваўся і ў купальскую ноч. Знахары звярталіся за дапамогай да душ продкаў, да станоўчых, жыццядайных сіл прыроды, каб з іх дапамогай нейтралізаваць, абясшкодзіць уладароў ночы, смерці, вампіраў нашых жыццёвых сіл. Такое супрацьстаянне ў многім вызначае менталітэт духоўнага космасу беларусаў. Замовы, паданні, легенды, казкі, прыказкі, народныя жарты ў большасці сваёй вырашаюць праблему гэтага супрацьстаяння. Пераходнасць культуралагічнай сітуацыі (купальская ноч — пераход ад росквіту прыроды да яе незваротнай смерці) абумовіла нараджэнне цэлага шэрагу легенд, асноўнымі персанажамі якіх сталі ваўкалакі, пярэваратні, ведзьмакі. Амаль у кожнай вёсцы раёна бытуе легенда аб тым, што ў купальскую ноч жанчыны-вядзьмаркі ператвараюцца ў жаб, каб непрыкметна патрапіць у хлеў і адабраць малако ў каровы або зрабіць якую-небудзь іншую шкоду. Так, Д.М.Логін расказвала, што пераўвасабленнем валодала яе ятроўка (жонка роднага брата). Купальскім адвячоркам яна пайшла за вёску на «чортаву мясціну», нажом абвяла вакол сябе прамавугольнік, затым у кожны вугал яго ўбіла па коліку і тройчы перакулілася праз галаву. Тым самым жанчына-чарадзейка ператварылася ў жабу. Пасля гэтага яна паспрабавала непрыкметна трапіць у хлеў суседзяў, каб адабраць малако ў каровы. А суседскія мужчыны ведалі пра ваўкалацтва ятроўкі, таму селі ў хляве і сталі сцерагчы нянрошаную госцю. Роўна апоўначы ўбачылі, як у хлеў ускочыла жаба. Яны схапіліся за вілы. Адзін з іх прыцэліўся і спрытным ударам пракалоў жабе нагу. Назаўтра раніцай яны даведаліся, што іх суседка ляжыць дома з параненай нагой. Ніякія лекі ёй не дапамаглі. Праз тры дні яна сканала.

У Глускім раёне вядомы звычай пускаць у купальскую ноч па вёсцы запаленае кола. Магчыма, гэта быў абрад усеагульнага ачышчэння і асвячэння вёскі свяшчэнным агнём рытуальнага вогнішча. У адзін з такіх купальскіх вечароў мужчыны в. Касарычы ўбачылі, як па вёсцы коціцца вогненнае кола, але святлася яно незвычайным агнём. Тады мужчыны перагарадзілі вуліцу жэрдкай. Як толькі кола прыпынілася, наткнуўшыся на жэрдку, адзін з мужчын хуценька працягнуў скрозь кола вяроўку. Здарылася так, што праз два дні памерла іх суседка. Павер'е аб тым, што жанчыны-вядзьмаркі маглі «перакінуцца» ў палаючае кола, шырока вядома ў гэтай мясцовасці. Каціласа гэта зачараванае кола па вёсцы і несла з сабой няшчасце. Толькі надзвычай смелыя людзі маглі адважыцца спыніць яго і перасцерагчы аднавяскоў-

цаў ад чаравання і ператварэння іх у носьбітаў змрочнай сілы. М.А.Кабернік расказвала, што ў купальскую ноч расцвітае папараць-кветка, прычым абавязкова там, дзе карова пакінула свой след. Жанчына нагадала легенду і аб тым, што ў адзін момант з кветкай папараці расцвітае і арэшнік. Але толькі шчаслівы чалавек мог убачыць іх цвіценне, пасля чаго ён станавіўся яснабачным. Незвычайная кветка адорвала чалавека цудоўнай здольнасцю разумець мову раслін, дрэў, жывёл, вады, камення, зямлі, а таксама прадказаць лёс суродзічаў і аднавяскоўцаў.

СЯМЕЙНЫЯ АБРАДЫ

Раней гаворка ішла пра асноўныя святы гадавога кругавароту. Святочны кругаварот задаваў дакладны рытм жыццю, перамяжоўваючы цяжкую працу і агульнавясковы адпачынак.

Найбольшай прыгажосцю, урачыстасцю, разнастайнасцю заўсёды вылучалася беларускае вясковае вяселле. Гісторыі культуры Глускага раёна пашчасціла: у 1977 г. фальклярыст Акадэміі навук В.Скідан зрабіў падрабязнае апісанне мясцовага абраду вяселля, спасылаючыся на ўспаміны жанчын в. Зелянковічы А.А.Патапенка (1914 г.н.), С.І.Патапенка (1894 г.н.), М.П.Патапенка (1935 г.н.), Г.М.Патапенка (1902 г.н.), К.П.Булка (1903 г.н.), М.М.Падаляк (1903 г.н.), У.Д.Патапенка (1900 г.н.), П.С.Закрэўскай (1910 г.н.). Выкарыстоўваючы матэрыялы В.Скідана і ўласныя запісы, зробленыя ўлетку 1992 г., паспрабую аднавіць асноўныя моманты і дэталі глускага вяселля.

Колішняе вяселле мела некалькі этапаў. Перадвясельны цыкл ахопліваў заручыны, часцей за ўсё вяселлі пачыналі гуляць пасля Пакроваў або пасля Вадохрышча. Доўгая, расцягнутая на некалькі тыдняў, вясельная ўрачыстасць распачыналася заручынамі. Адвячоркам, як толькі сцямнее, радня хлопца збіралася ехаць у сваты. Звычайна ехалі тры-чатыры чалавекі з самай блізкай радні: старшым сватам быў хросны бацька, сватамі маглі быць родны брат або родны дзядзька. Ехалі сваты не з пустымі рукамі: бралі з сабой каравай, у сярэдзіну якога ўлепвалі дразінку солі. Прычым вясковыя жанчыны далікатна заўважалі: калі збіраліся жаніць хлопца, у якога бацькі былі жывыя, то каравай рабілі з белай, пшанічнай мукі, калі жанілі сірату, то пяклі чорны або шэры з пытляванай мукі. Каравай загортвалі ў белы гасцявы ручнік, нёс яго з сабой старшы сват.

Ва ўсіх мясцовасцях Беларусі дыялог сватоў і бацькоў заручаемай дзяўчыны мог нагадваць гаворку паляўнічых, рыбаловаў або купцоў, якія прыехалі за дарагім заморскім таварам. Ва ўсім гэтым іншасказанні бачыліся тры прычыны, якія адлюстроўвалі як саму гісторыю фарміравання вясельнага абраду, так і шматлікія забароны і перасцярогі, якіх дакладна прытрымліваліся ў народзе. Па-першае, каб не сурочыць справу і не нашкодзіць самім сабе, сваты не мелі права адразу ж раскрываць свой намер. Па-другое, дыялог у форме добра знаёмага акту купліпродажу фіксуе адзін з найбольш старажытных варыянтаў стварэння сям'і, калі нявесту сапраўды выкуплялі ў яе бацькоў. Аб гэтым яскрава сведчыць рытуал выкупу нявесты дружкамі маладога перад тым, як маладыя паедуць да вянца. Патрэцяе, да сённяшняга дня сярод беларусаў існуе павер'е, якое забараняе называць імя чалавека, каб зноў-такі не нашкодзіць яму. Усё гэта разам узятае вымагала ад удзельнікаў рытуала не толькі ў час заручын, але і ў некаторых іншых выпадках, пераводзіць гаворку ў план іншасказання: «У вас ёсць цялічка, а ў нас сянцэ. Дзе сянцэ, там і цялічка. Ну як, гаспадар, што скажаш на гэта?» Дзяўчына адразу ж здагадвалася, пра што ідзе гаворка. Калі яна была супраць, то магла збегчы з хаты. Праўда, тады на дапамогу прыходзілі сябры жаніха. Калі ж дзяўчына сваімі паводзінамі паказвала, што не супраць жаніха, то яна чакала вельмі адказнага моманту. Старшы сват разгортваў ручнік і клаў на засланы белым абрусам стол свой каравай, побач ставіў шкляны «жураў» з гарэлкай, каб лягчэй ішла справа. Старшы сват наліваў чарку гарэлкі і пачынаў таргавацца. Вось у гэты момант у хату ўваходзіў жаніх і клаў на чарку грошы. Калі нявеста была не супраць прапанаванага замужжа, яна брала грошы і выпівала чарку, што ўспрымалася як канчатковая згода на вяселле. Торг адразу змяняў напружанасць на задаволенасць.

Услед за маладой з той самай чаркі выпівалі старшы сват, бацька і маці дзяўчыны, дружка хлопца. Задаволеныя госці гучна, з гонарам абвяшчалі: «Наша маладая, наша!» Адразу ж пасля першай чаркі распачынаўся другі этап перадвясельнай дзеі — «заповіны». Бацька або старэйшы брат заручонай хуценька бег па гасцей: хроснага бацьку маладой, яе бабку-павітуху, стрыечных братоў і сясцёр, суседзяў. Пакуль госці збіраліся за сталом, кожнага, хто пераступіў парог хаты, дзявоцкі хор сустракаў песняй:

Завуць мяне на заповіны,
Там дзверы да закроены;
Завуць мяне на заручыны,
Там дзверы да закручаны.
А мы дзверы адкруцім,
Да Надзечку заручым.
Завуць мяне на заповіны,
Няма ў мяне да жуковіны;
Ой, вы, дзевачкі, знайце —
Мне жуковіну дайце.

Першы і самы адказны крок быў зроблены. Прынцыповая дамоўленасць атрымана. Але ж на гэтым сваты не супыніліся. Другую чарку, як правіла, пілі за дагавор паміж сватамі аб тым, хто і што дасць сваім дзецям. Старшы сват паціху насядаў. «А што ты дасі сваёй дачцэ?» — пытаўся ён у бацькі нявесты.

Абяцалі рознае: хто хату, хто каня або карову, хто грошы. Аднак лічылася, што гэты дагавор толькі папярэдні, канчаткова ён замацоўваўся рытуальным, перад усім родам, абяцаннем пры дзяльбе каравая напрыканцы вяселля. Трэцюю чарку бралі за ўдакладненне пераліку гасцей і за падарункі, сярод якіх у беларусаў абавязковым быў рытуальны ручнік. Нявеста павінна была падрыхтаваць да замужжа ад дваццаці пяці да сарака розных па арнаментальным аздабленні ручнікоў. Першы з іх будзе належаць асноўнаму завадатару — старшаму свату. Гэта частка заручын адбывалася наступным чынам.

Сталы для гасцей ставілі ў адзін рад ад чырвонага кута і да парога. Гасцей з боку маладога садзілі ўздоўж сцяны, а гаспадары хаты і іх радня рассаджваліся з супрацьлеглага боку. Але госці садзіліся так, каб старшы сват сеў насупраць нявесты. Сват наліваў дзяўчыне кілішак. Тая ўставала, нахілялася над сталом і праз стол завязвала старшаму свату спецыяльна падрыхтаваны для яго ручнік. Павязваўся ён з левага пляча пад правую руку так, каб вузел крыху выдаваў наперад. Даўней такім жа ганаровым знакам перавязвалі і швагра — брата маладога. Нарачонаму ж нявеста клала на галаву хусціну. Калі разам з маладым прыходзілі яго бацькі, то паміж імі і бацькамі маладой таксама адбываўся абмен падарункамі, які ў народзе называлі «перапой». Заручыны распачыналі падрыхтоўку двух родаў да вяселля. З гэтага моманту ні адзін з родаў не меў права адмовіцца ад вяселля. У колішнія часы, як толькі дасягалася дамоўленасць аб заручэнні маладых, сват разам з жаніхом ішлі ў царкву і прасілі святара, каб той у наступную нядзелю прылюдна абвясціў, што такая-та маладая пара збіраецца ўзяць шлюб, а вянчанне адбудзецца праз два тыдні. Пасля гэтага абодва бакі старанна рыхтаваліся да маючага адбыцца вяселля.

Вясельны этап распачынаўся ў суботу з вельмі адказнага этапу — выпякання каравая. Адзін з асноўных прынцыпаў народнай культуры — «падобнае выклікае падобнае» — прасочваўся тут літаральна ў кожнай дэталі, на кожным кроку. Людзі верылі, што тыя, каму даручаць выпякаць карав' й (іх лёс, шчаслівая доля, колькасць дзяцей, павага з боку аднавяскоўцаў), абавязкова паўплываюць на лёс будучай сям'і. Таму і ставіліся з усёй адказнасцю да кожнай драбнічкі. Старшай каравайніцай часцей за ўсё выбіралася хросная маці, але пры ўмове, што на гэты момант яна не была ўдавой. Каравайніц было чатыры — пяць. А каб маладыя жылі ў згодзе, сябравалі з суседзямі, кожная з каравайніц прыносіла з сабой самую лепшую муку, самае жоўтае масла і самыя буйныя яйкі. Цеста для каравая вымешвалі доўга і старанна. Тады ён атрымліваўся высокім, пышным, а значыць, такімі багатымі будуць маладыя. Цікава, што рукі каравайніцы мачалі (каб не прыліпала цеста) не ў ваду, а ў гарэлку, якую затым вылівалі пад ногі коням перад ад'ездам маладых да вянца. Колькасць караваяў абавязкова была цотная — шэсць: адзін большы (асноўны) у форме месяца, а астатнія пяць — круглыя, нібы сонца. Акрамя каравая пяклі яшчэ штук сорак або шэсцьдзесят невялічкіх караваяў для

дзяцей, якія прыбягуць сустракаць маладых з храма. Асаблівае стаўленне да кожнай дэталі каравайнага абраду заўважалася нават у такіх дзеяннях, як падрыхтоўка печы да выпечкі каравая. Увесь стары попел вымяталі толькі бярозавым венікам. Палілі ў печы часцей за ўсё бярозавымі, сасновымі або дубовымі дровамі, але ні ў якім разе яловымі ці асінавымі. Пакуль рыхтавалі печ і ўчынялі цеста, каравайніцы і прысутная моладзь разпораз падхоплівалі абрадавыя песні, прысвечаныя і тым, хто завіхаўся вакол рытуальнага печыва, і самому караваю:

Каравайніца п'яна,
Да ўсё цеста пакрала:
То ў мех, то ў кішэню —
Сваім дзеткам на вячэру.

* * *

Ой, чыя-то хата топіцца,
Шаўковыя да дымы ідуць?!
Там Надзечцы каравай пякуць —
Ручкамі да бяленькімі,
Персцянямі залаценькімі.
Караваю, мой раю, —
Каля цябе харашэ йграю.

Кожны крок каравайніц — падрыхтоўка дзяжы, замес цеста, пасадка каравая ў печ — суправаджаўся спецыяльным рытуальным дыялогам паміж каравайніцамі і бацькамі маладой. Жанчыны, распачынаючы кожны новы этап дзеяння, пыталіся дазволу ў гаспадароў:

— Ці благаславіце каравай учыняць?

— Бог благаславіць! — тройчы гучна адказвалі бацькі.

Спечаны каравай загортвалі ў белы ручнік, клалі на вечка дзяжы і адносілі ў камору, дзе ён захоўваўся да заканчэння вясельнай урачыстасці.

У гэты ж дзень багата клопату было і ў моладзі. У хаце нявесты яе сяброўкі завівалі вянок, а ў хаце маладога — елку. Вянок для маладой купляў яе суджаны. Дружкам трэба было толькі падагнаць, падшыць яго. Да вянка прышывалі фату і брыжы — складзены ў тры ярусы каснік. І зноў-такі кожнае чарговае дзеянне «закасяння» суправаджалася дазволам-благаславеннем маці нявесты. Трэба было вянок уставіць у брыжы — чакалі мацярынскай згоды; каб нітку працягнуць праз вушка іголкі або распачаць падгонку фаты — неабходна была бацькоўская згода, прычым сакральныя словы матулінага благаславення кожны раз паўтараліся тройчы. Адным з найбольш адказных момантаў вяселля было расплятанне касы маладой. Гэты рытуал сімвалізаваў пераход нявесты-дзяўчыны ў статус жанчыны — прадаўжальніцы свайго роду. Зразумела, што і гэта абрадавае дзеянне суправаджалася вялікай колькасцю песень:

Да стаяла, буяла
У агародзе канапелечка,
Да не даў ёй ветрычак
Яшчэ болей пастаяці,
Лісцікам да памахаці.
Адбіў ёй лісточак.
Да на жоўты пясочак.
Да гуляла, красавалася
Надзечка ў сваёй мамкі,
Да не даў ёй Колечка
Яшчэ болей пагуляці,
Коскаю да памахаці.
Расплёў ёй косачку,
Разліў ёй слёзачку.
Каса мая да русенькая,
Сляза мая гарачэнькая.
Як мы Надзечцы вянкі вілі,
Да ўсе лужэчкі сцягнулі —
Да шукалі каліначкі з веткамі:
Разлука Надзечцы з дзеўкамі.
— Дай, мамачка, іголку,
Дай нітачку шоўку
Прышпіліць вяночак
На шаўковы платочак.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць яшчэ на адну дэталь убранства маладой. Звычайна ў час расплятання касы пад вянок клалі намітку (мясцовыя назвы — кітайка, хустачка, сетка) або тонкай работы празрыстае палатно. На гэту акалічнасць вельмі рэдка звяртаюць увагу нават прафесійныя збіральнікі-этнографы. Навошта ж клалі намітку? Жанчыны в. Касарычы адказалі: «Каб не сурочылі». Маладую засцерагалі ад нядобрага вока: прыкрывалі доўгай часткай фаты яе касу, а твар — і найперш вочы (як асноўны канал узаемаадносін з людзьмі, гасцямі) — закрывалі наміткай або тонкай пялярынкай.

Тут прасочваецца значнае падабенства некаторых абрадавых дзеянняў у вясельным і памінальным рытуальна-абрадавым комплексах. Адразу ж пасля смерці чалавека хто-небудзь з родных дзяцей або

блізкіх дарослых людзей заплюшчваў яму вочы, каб нябожчык не выглядзеў каго-небудзь з жывых і не забраў на той свет. Вясельны абрад таксама сімвалізаваў сітуацыю пераходу, «смерць» у адным статусе і перанараджэнне ў іншым. Таму, каб не нашкодзіць нявесце, яе твар і вочы прыкрывалі тонкай празрыстай пелярынай. Маладая часова станавілася «сляпой», і ў песнях яе параўноўвалі з выдрай (мелася на ўвазе, што вочы яе як бы выдраныя):

Да сядзела выдра з выдраю,
Сядзела над вадою:
— Да ці добра ж табе, мая выдрыца,
Седзячы над вадою?
— Да патуль добра, патуль харашэ,
Пакуль дожджык не пойдзе:
Дожджык пойдзе — берагі пойме
Да мяне, выдрыцу, змочыць.
Гаварыла сястра з сястрою,
Седзячы за скам'ёю:
— Да ці добра табе, сястрыца,
Седзячы за скам'ёю?
— Датуль добра, датуль харашэ,
Пакуль Колечка не едзе;
Колечка едзе ў чырвоным кіце.
А мне завязаны вочы.
Завязалі вочы з цёмнае ночы
Белаю кітайкаю,
А ён грозіцца, прыгражаецца
Чорнаю нагайкаю.

Амаль у кожнай мясцовасці асаблівай пашанай на вяселлі карысталася нявеста-сірата. У яе адзенні і некаторых момантах абрадавых паводзін быў шэраг спецыфічных асаблівасцей. Напрыклад, да сённяшняга часу ва ўпрыгожанні вянка маладой-сіраты не прысутнічае чырвоны колер, а толькі белы. Тое ж самае тычылася і дружак маладых. У гэты ж дзень нявеста-сірата наведвала мясцовыя могілкі, каб ушанаваць памяць сваіх продкаў. Аб гэтым і словы песні:

Да стаялі садочкі ў тры радочкі:
У первым садзе зязюля кукуе,
У другом садзе салавей шчабеча,
У трэцім садзе Надзечка ходзіць,
Надзечка ходзіць, свайго бацьку просіць:
— Хадзі, хадзі, бацюхна, на маё вяселле,
На маё вяселле да на сіроцкае.
— Весяліся, дзіцятка, весяліся, Надзечка,
А я тут ляжу за трыма замкамі:
Первы замочак — зялёны дзярночак,
Другі замочак — жоўты пясочак,
А трэці замочак — сасновая дошчачка —
Не можна ўстаці да майго дзіцяці,
К майму дзіцяці парадачак даці.

Пакуль у маладой ішло расплятанне касы, дружына маладога займалася падрыхтоўкай да абраду, які называецца «завіванне елкі». Хлопцы высякалі невялічкую елачку, якую ўпрыгожвалі рознакаляровымі стужкамі і замацоўвалі іх так надзейна, каб па дарозе нічога не згубілася.

У старыя часы вясельны картэж складаўся з чатырох — пяці, а то і васьмі вазоў, убраных рознакаляровымі папяровымі стужкамі і галінкамі елак. Асабліва пекна ўбіралі вазок, на якім ехаў малады. Дугу шчыльна апляталі елкаю, да яе мацавалі галасісты званок і «шамкі» — маленькія металічныя бразготкі. Усё гукавое начынне надавала вясельнаму поезду незвычайную ўрачыстасць, далёка несла вестку аб важнай падзеі ў жыцці новай сям'і. Аднак шумавое аздабленне мела больш глыбокі сэнс — адагнаць усялякую нячыстую сілу, каб яна «не праходзіла дарогу». Вельмі дрэннай прыкметай лічылася, калі вясельнаму картэжу перабягаў дарогу заяц. Таму нават існавалі песні, якія выконваліся, калі малады ехаў па маладую, і асноўным персанажам быў касавокі:

Сядзіць зайчык пад ёлачкаю —
Вочкі трэ,
Тудою едзе малады Колечка — яго б'е.
— За што, пра што, малады Колечка,
Мяне б'еш?
Ці я твае вараныя коні папудзіў.
Ці я тваю Надзечку папудзіў?
Папудзілі вараных коней галубцы,
Папудзілі маладую Надзечку малайцы (або: хлопцы).

Затое лічылася добрым знакам, калі вясельнаму поезду некалькі разоў перагародзяць дарогу аднавяскоўцы. Нарэшце гучныя званочкі данеслі вестку — едзе «бяседа» маладога. Дружына маладой хуценька зачыняла вароты. Сваты павінны выкупіць іх. З воза злазіў хросны бацька, а хросная маці падавала яму каравай у выглядзе паўмесячыка з прывязанымі да яго двума абаранкамі. Калі выкуп задавальняў дружыну маладой, то вароты расчыняліся. Госці падыходзілі да засланага абрусам стала. Па абодва яго бакі станавіліся старшыя. Сваты маладой і маладога, кожны трымаў на ручніку

каравай — «паўмесячык». Дружына маладога імкліва падхоплівала:

А ў нашага свата
Да цясовая хата,
Печ яго пабяляная,
Чэсць яго да каханая.
Пакажыце сваё золата,
Да што ўчора яно купленае,
Да мы яго патаргуем,
Да к свайму прыраўнуем:
Ваша бяла да бялёсенька
Да к нашаму раўнёсенька.

Сваты здароўкаліся, а затым з жартамі ўздымалі караваі як мага вышэй. Прысутныя сачылі за разгортваннем дзеі і меркавалі: чый каравай апынецца вышэй, той з маладых і будзе верх у жыцці трымаць. Затым сваты выконвалі вельмі цікавы і адказны рытуал, абрадавая сімволіка якога ўзмацняла сэнс таго, што адбывалася ў дварэ. Сваты прыкладвалі адзін каравай да другога («паўмесяц» да «паўмесяца» і ўтваралася адзінае цэлае — «сонца»), перавязвалі іх хусцінай, на якую яшчэ дадаткова нанізвалі чатыры абаранкі. У некаторых выпадках сваты злівалі і прыхопленую з сабой гарэлку: сцвярджалі, што яна набывала пры гэтым чароўную моц і ёй можна было лячыць нават бяздзетнасць.

Дружына маладога рвецца хутчэй завалодаць маладой, якая знаходзіцца ў адной з суседніх хат. Там заканчвалі яе прыбіраць, заставалася толькі прымацаваць «карону». Таму, каб неяк затрымаць сватоў, жанчыны выводзілі з хаты падстаўную бабулю ў масцы, а затым ужо якую-небудзь дзяўчыну-модніцу або «цыганку». Нарэшце, справа даходзіла і да самой нявесты. За яе таргаваліся доўга, цану запрошвалі высокую. Але і гэта справа вырашана. Сват працягвае нявесце хустачку, тая бярэцца за адзін канец, сват — за другі, і так яны выходзяць з хаты, у якой яна хавалася ад «войска» маладога, і ідуць дадому. Для маладых там ужо накрыты стол. Старшы сват садзіцца ў кут, побач з ім нявеста і яе сяброўкі. Насупраць, праз стол, у такім жа парадку садзіцца дружына маладога. Госці, каму можна было, выпівалі па чарцы гарэлкі, а пасля гэтага, ужо непасрэдна перад ад'ездам у царкву, маладую садзілі на пасад — на ўслон, які быў засланы вывернутым кажухом. Тым часам родны брат маладой расплятаў ёй касу ў песенным суправаджэнні сяброўак:

Расплёў брат косачку,
Разліў ёй слёзачку.
Каса мая да русенькая,
Сляза мая гарачэнькая.

Пасля пасаду маладыя браліся за рукі і падыходзілі да бацькоў. Маці і бацька бралі па бохану хлеба, загортвалі іх у канцы ручніка, уздымаючы сярэдзіну высока ўгору. Утваралася нешта накшталт аркі — небасхілу, брамы вечнасці, праз якую і праходзілі маладыя, адпраўляючыся да храма. Пасля храмавага заручэння вясельны поезд вяртаецца да хаты маладой. Тут адбываецца апошняя вячэра нявесты ў хаце роднай матулі. Заканчвалася яна дзяльбой каравая і адорваннем маладых. Дарылі хто што мог — карову, цялушку, парася, грошы. У гэты час кожны імкнуўся выказаць маладым прыгожае паэтычнае пажаданне, у якім было ўсё: клопат пра дабрабыт, здароўе дзяцей, багатую гаспадарку. Вось толькі некаторыя прыклады:

Дарую маладым 10 рублёў
І восемь капеек медзі,
Каб былі ў вас дзеці
Здаровыя, як мядзведзі.

Дарую грошы, —
Я на іх добра пагаравала, —
Хачу, каб маладая
Маладога пацалавала.

Я два дні сеяла пшаніцу, —
Хочаце — жніце, хочаце — не жніце,
А мянс за няньку вазьміце.

Дарую маладому
Чыгун паронак,
Каб не любіў чужых жонак.
А маладой — чыгун буракоў,
Каб не любіла чужых мужыкоў.

Дарую маладому лапці і аборы,
Каб не любіў чужой Фядоры.

Дзяльба каравая скончана. Госці збіраюцца ехать да маладога. Жаночы хор спявае тым часам развітальную песню:

Каменная печачка
Вечар гарыць,
Вечар гарыць да не выгарыць,
Каменнейка да не распаліць.
Маладая Надзечка
Вечар сядзіць,
Вечар сядзіць да не заплача,

Матачкі да не разжаліць.
Разжалю матачку,
Седзячы на покуце.

У доме маладога шаноўных і доўгачаканых гасцей сустракалі з радасцю і задавальненнем. Каб маладыя не ступалі на голую зямлю, свякроў засцілала ў варотах прыгожую посцілку. Першым на яе станавіўся сын, затым нявеста. Прычым даўней нявестка станавілася на вечка дзяжы, але толькі пры той умове, калі яна захавала цнатлівасць. Бацькі сустракалі маладых перад парогам хаты. Маці трымала на ручніку хлеб-соль, а бацька — два кілішкі і бутэльку гарэлкі. Бацька тройчы наліваў маладым, а яны толькі прыгублівалі і выліваліі гарэлку праз левае плячо. Затым маладыя цалавалі каравай і атрымлівалі дазвол прайсці ў хату. Малады браў маладую на рукі і пераносіў яе праз парог так, каб яна нічым не датыкнулася да гэтай сакральнай зоны чалавечага жытла. У напрамку па гадзіннікавай стрэлцы маладыя ішлі ў чырвоны кут хаты, пад абразы.

Вяселле ў маладога магло доўжыцца два, а то і тры дні — усё залежала ад сямейнага дастатку. Заканчвалася вяселле зноў-такі дзяльбой каравая маладога і здыманнем фаты з маладой. Але, калі свякроў была ўдавой, то гэты рытуал выконвала ятроўка (дзеверава жонка). Гулялі амаль усю ноч, а зранку збіраліся разам паснедаць і ад душы патанчыць вальс, польку, карапет, падыспан, кракавяк, «На рэчаньку». У нядзелю пасля абеду дзялілі каравай, і госці, каму трэба было ісці на працу ў панядзелак, паціху разыходзіліся. А вось старыя спраўлялі ў гэты дзень «разгрэбіны». Сутнасць звычаю была ў наступным. Калі госці прыходзілі на вяселле, то неслі з сабой па адным або тры літры гарэлкі і пяць-шэсць місак гатовай закускі. У панядзелак усё гэта даядалася і дапівалася, і госці разбіралі-«разграбалі» свой посуд, сваё начынне. Роўна праз тыдзень маладыя разам з бацькамі маладога і сватамі ехалі ў водведкі. Бацькоў маладога як самых пачэсных гасцей садзілі на покуці. У адрас маладой гучала песня:

Вецер вее, павявае,
Маці ў дачкі пра жыццё пытае.
— Пытай, маці, у шэрай вуці:
Шэрая вуці на моры начуе,
На моры начуе — усё горачка чуе.

Яшчэ праз тыдзень ужо бацькі маладой ехалі на пярэзвы да бацькоў маладога. На гэтым шматдзённая вясельная ўрачыстасць заканчвалася. Пачыналася будзённае жыццё са сваімі турботамі і чаканнем папаўнення ў сям'і.

І.І.Крук.

Запісана на Глушчыне

ВОРАН

Пад ракітай салдат убіты ляжаў.
Гэй, гэй, сабля войстрая ў руках,
Дзве гранаты, наган.
Галава ў яго ўся пабіценькая,
А грудзь бела яго ўся прастрэляная.
Гэй, гэй, а грудзь бела яго
Ўся прастрэляная.
У галавах у яго конь вараны стаіць,
На грудзях у яго крыж шырокі ляжыць.
Гэй, гэй, крыж шырокі ляжыць.
Ой ты, конь, ты, мой конь,
Конь вараны ты мой,
Не бяжы, а ляці к атцу, мацеры роднай.
Гэй, гэй, к атцу, мацеры роднай.
Не кажы ты, мой конь,
Што я ўбіты ляжу.
Гэй, гэй, а скажы ты, мой конь,
Што жанаты хаджу.
Ажаніла мяне, куля быстрая,
А звянчала мяне сабля войстрая.
Гэй, гэй,звянчала мяне сабля войстрая.
А звянчала мяне сабля войстрая.
Асвяцела мяне палкавая свяча.
Гэй, гэй, палкавая свяча.

Запісала Р.Ф.Сокал ад Г.Г.Каранкевіч, 1922 года нараджэння, жыхаркі в. Калюга.

УСТРЭЧАННЕ

Зіма з летам,
Зіма з летам
Встрэчалася.
Лета ў зімы,
Лета ў зімы
Пыталася:
«Як ты, зіма,
Як ты, зіма,
Зімавала?
Сваё врэм'е,
Сваё врэм'е

Прабувала?»
А мне лету,
А мне лету
Думу думаці,
Усяму полю,
Усяму полю,
Каб было ўсіх чым карміці.

Запісала Р.Ф.Сокал у 1996 г. ад А.Г.Прыгара, 1920 года нараджэння, жыхаркі в. Зарэчча.

ЮР'Я

Юр'ева маці па зямлі хадзіла,
Юр'я за ручку вадзіла.
Юр'ева маці па небу хадзіла,
З Юр'ем гаварыла.
Юрай, мой Юрай,
Дай ключы Пятру
Землю адмыкаці,
Траву выпускаці,
Статак накарміці,
Людзям на здароўя,
Ліху безгалоўе.

ТРОЙЦА

Да была Тройца Пятровачка —
Не выспалася малодачка.
Сукала шнуркі шаўковыя
На чаравічкі замшовыя.
Прыйшла Тройца із дарогі,
Пытае ў людзей, ці здаровы.
Прыйшла Тройца з высокага неба
І пытае ў людзей, што вам трэба.
Ой, нам трэба хлеб, пшаніца,
Тады мы будам весяліцца.
«Наце хлеба вам, наце пшаніцу,
А я пайду Богу пакланіцца».

ЖНІЎНАЯ

А я жыта зажынала,
Дадомачку апаздала —
На цёплую вячэрачку,
На мягкую пасцелечку.
Ой, жнеечкі загудзелі,
Палуднаваць захацелі.
Хоць гудзеце не гудзеце,
Палуднаваць не будзеце.
Як дажнемся мы да дуба,
Палуднаваць тады будам.
Як дажаліся да елі,
Палуднаваць мы паселі.
А сонейка-калясочак
Закацілася за лясочак,
Закацілася за бор, за бор.
Пара жнейка дамоў, дамоў.
У старых бабак ручкі зябнуць,
А ў малодачак дзеткі плачуць.
Малы святочкі, носяць снапочкі,
Святыя Ганны бабкі стаўляюць,
Святыя Ганны бабкі стаўляюць.
Святы Барыска бабкі злічае.

Запісала Р.Ф.Сокал ад фальклорнага гурту ў в. Хваставічы ў 1997 г.

* * *

Ой ты, ластаўка, ты, касастая,
Ты ж, касастая, да й прыгожая,
Не лятай рана ў чыстае поле,
Ты не ві гнязда па-пад стрэшаню.
Табе ў том гняздзе не зімаваці,
Толькі лецечка пералетаваць.
Ой ты, дзевачка, ой ты, красная,
Дай табе ў татачкі не векаваці,
Толькі лецечка пералетаваць.

Запісала Р.Ф.Сокал ад В.П.Варакса, 1921 года нараджэння, жыхаркі в. Дасціжэнне.

Вясельныя песні

СПЯВАЮЦЬ, КАЛІ МАЛАДЫ ЕДЗЕ ЗА МАЛАДОЙ:

Ой, на дварэ дробныя дажджэ, плюхота.
Маладому Валодзячку жаніцца ахвота.
Яго родна мамка стаіць у варотах,
Не веліць:
— Не едзь, не едзь, маё дзіцятка, жаніцца,
Ты свае вараныя коні патоміш,
Ты сваю шубу баброву памочыш.
— У майго сьця на дварэ зялёныя яварэ.
Я пад яварам свае вараныя коні напасу,
На явары шубу баброву пасушу.

СПЯВАЮЦЬ, КАЛІ ПРЫВЯЗУЦЬ МАЛАДУЮ Ў ХАТУ СВЕКРЫВІ:

Паўз сад да дарожачка,
У саду да галубачка,
Тудой ехаў да Сярожачка,
Узяў тую да галубачку,
Пасадзіў яе пад шубачку
Да завёз яе дадомачку,
Пусціў яе панадвор'ячку.
Ён ёю і ўцяшаецца,
У сваёй мамкі да пытаецца:
— Мамка, мая родная,
Ой, ці мілая табе мая галубачка?
— Мне, сынок, яна міла,
Нада, каб дзела рабіла.

* * *

Прыляцела сарока здалёка.
Села пава на куце,
Палажыла белы ручкі на стале:
— Белы ручкі ў маёй мамачкі,
Ой, ці будуць белы ручкі ў свёкаркі
Нявеяну грэчку сеючы,
Нявеяна проса таўкучы?

Счуў малады Іван у каморы:
— Я ж твае ручкі, Манька, асвабаджу,
Пасцель белу пасцялю,
Цябе, маладую, у камору спаць павяду.

Запісала Л.М.Драбовіч ад А.С.Мароз, 1924 года нараджэння, жыхаркі в. Сцяпанаўка.

Дзіцячы фальклор

ЛАСКА

Ласка, ласка,
Дзе ты была?
— У Бога жыла.
Што рабіла?
— Кросны ткала.
Што зарабіла?
— Кусочак сала.
Дзе тое сала?
— Кошка ўкрала.
Дзе тая кошка?
— Пад печку пайшла.
Дзе тая печка?
— Краскамі зарасла.
Дзе тыя краскі?
— Дзеўкі парвалі.
Дзе тыя дзеўкі?
— Хлопцы пабралі.
Дзе тыя хлопцы?
— На вайну пайшлі.
Дзе тая вайна?
— Няма!

Запісала Л.М.Драбовіч ад К.М.Мароз, 1928 года нараджэння, жыхаркі в. Сцяпанаўка.

МАША І МЯДЗВЕДЗЬ

Жыла-была дзевачка Маша. Пайшла яна з сяброўкамі ў лес чарніцы збіраць. Знайшлі дзевачкі невялічкую лапінку ягад, сабралі ўсе, ды пайшлі далей шукаць. Кусцік за кусцік, чарнічка за чарнічку, так і не заўважыла Маша, як заблудзілася. Стала яна крычаць. Ніхто з сяброўак не адгукваецца, звала, звала Маша, асіпла. А ўжо і змяркацца пачало. Цёмна ў лесе стала, страшна. Спужалася дзевачка, заплакала. Пачала скрозь слёзы звать: «Хто ў бары, хто ў лесе, прыйдзі ка мне нанач!» Ніхто не адклікаецца. Толькі страшна гудзе лес ды рэха адгукаецца. Яшчэ раз крыкнула Маша: «Хто ў бары, хто ў лесе, прыйдзі ка мне нанач!» І раптам да яе данеслася: «Я ў бары, я ў лесе, іду к табе нанач!» Узрадавалася Маша, пачала крапчэй звать: «Хто ў бары, хто ў лесе, прыйдзі ка мне нанач!» — «Я ў бары, я ў лесе, іду к табе нанач».

Глядзіць Маша, а з лесу вылазіць вялізны мядзведзь. Страшна дзевачцы стала, але ж думае, не адна буду. Мядзведзь ёй і кажа: «Пайшлі да мяне жыць». Што зробіш, трэба ісці. Прывёў мядзведзь дзевачку ў бярлогу. А там цёмна, гразна. Узялася Маша, прыбрала ўсё. Дала мядзведзю чарніц і хлеба, які брала з сабой у лес. Наеўся мядзведзь і загадаў слаць пасцель.

— А як мне слаць? — пытае дзевачка.

— Рад каменя, рад палення, ступу пад голаву, карытам накрыцца.

Цяжка было дзевачцы, але ж паслала, мядзведзь і заснуў. А Маша расплакалася, яшчэ страшней ёй стала, дамоў захацелася. Але як дабрацца ў вёску?

А жыла ў бярлозе пад печкай мышка. Яна таксама баялася мядзведзя. Маша дала ёй хлебныя крошкі. Паела мышка і кажа:

— Не плач, Маша, я цябе завяду дамоў.

Узрадавалася дзевачка і хуценька, пакуль спаў мядзведзь, выслізнула з мышкай з бярлогі.

Вывела мышка Машу з лесу, прывяла да хаты. Узрадаваліся бацькі. Накармілі мышку і вырашылі пакінуць яе ў сябе. З той пары і жывуць мышы побач з чалавекам.

Запісала Л.М.Драбовіч ад А.А.Мароз, жыхаркі в. Сцяпанаўка.

Характэрныя асаблівасці гаворак Глускага раёна

Грунтоўных прац, прысвечаных даследаванню глускіх гаворак, не было амаль да сярэдзіны 1950-х гадоў. У пачатку 80-х гадоў XIX ст. з'явіліся паасобныя заўвагі аб іх у М.Янчука. Яго разважанні — літаральна некалькі старонак — грунтаваліся пераважна на тэкстах народных песень, частку з якіх даслаў вучонаму настаўнік з м. Гарадок М.Ф.Давідоўскі. На гэты ж песенны матэрыял спасылаўся і П.В.Шэйн. Праўда, ён закрануў толькі прыватныя моманты. Акадэмік Я.Ф.Карскі таксама не абышоўся ў сваіх працах без заўваг аб глускіх гаворках. Ён лічыў іх аднастайнымі ўмерана-акаючымі, што прылягаюць да мяжы з так званымі беларуска-палескімі гаворкамі. У 1930-я гады навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі АН БССР у Глускім раёне сабралі досыць багаты матэрыял. Аб гэтым сведчыць паведамленне фальклярыста М.Я.Грынблата, які ў 1938 г. сам удзельнічаў у экспедыцыі ў Глускі раёне. Аднак у час Вялікай Айчыннай вайны амаль усё набытае фальклярыстамі на Глушчыне загінула.

Найбольш важкі ўклад у вывучэнне гаворак Глускага раёна ўнёс Ф.М.Ян-

коўскі, які на аснове сабраных матэрыялаў абараніў кандыдацкую дысертацыю. Збор і даследаванне матэрыялаў пачаліся ў 1948 г. Назіранні за мовай вяліся ў хатніх умовах, на працы ў полі, на сенажаці, рыбнай лоўлі, калгасным сходзе ці пасяджэнні праўлення калгаса. Матэрыялы запісваліся ад прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якія з'яўляюцца носьбітамі традыцыйнай гаворкі, ад людзей сярэдняга і малодшага пакалення, у тым ліку ад вучняў. Ф.М.Янкоўскі прыйшоў да пераканання, што мяжа дыялектных адрозненняў глускіх гаворак дзеліць раён на паўднёвую і паўночную часткі і праходзіць з захаду на ўсход па яго сярэдзіне, г.зн. цераз Глуск. У паўднёвай частцы вучоны збіраў узоры гаворак у вёсках Байлюкі, Барбарова, Вайцяхова, Даколь, Зубарэвічы, Касарычы, Клетнае, Нова-Андрэеўка, Поблін, Розлевічы, Слаўкавічы, Халопенічы, а ў паўночнай — Вільча, Вольніца, Гарадок, Дуброва, Жалвінец, Калацічы, Сіманавічы.

Задача даследавання — даць па магчымасці дэталёвае апісанне фанетычнай і марфалагічнай сістэм глускіх гаворак.

ФАНЕТЫКА

Гаворкі паўднёвай і паўночнай частак раёна характарызуюцца няярка выражаным тыпам сістэмы галосных.

Галосны **«у»** ўжываецца пасля цвёрдых, мяккіх, зацвярдзелых зычных. У паўднёвай частцы раёна націскное **«у»** адпавядае **«ы»** ў сярэдзіне і ў канцы слова: *буў, забуласа, вуган, кабула, вуйшаў* (*быў, забыласа, выган, кабыла, выйшаў*). Пад уплывам літаратурнай нормы гэта яркая рыса гаворак паўднёвай часткі раёна пачынае хутка знікаць. Яна захоўваецца пераважна ў мове сталых людзей, што пражылі бязвыезна доўгае жыццё ў гэтай мясцовасці. Адзін мужчына з в. Слаўкавічы зазначыў, што даўней усе гаварылі «бабу, муло, пуднёс», а «бабы, мыла, паднёс» — толькі шляхта да вучоныя. У гаворках жа паўночнай часткі раёна (вёскі Вільча, Сіманавічы, Жалвінец, Дуброва, Пагост, Калацічы, Гарадок) як пад націскам, так і не пад націскам вымаўляецца *«бы, вы, мы, пы»*, а не *«бу, ву, му, пу»*. У паўднёвай частцы раёна сустракаецца **«ў»** (кароткае) на месцы ненаціскнога пачатковага складу **«вы»**: *не ўнось* (*не вынось*), *пайшлі ўпіваць* (*пайшлі выпіваць*), *ні ўпісвай* (*ні выпісвай*). Гэта з'ява ў лінгвістычнай літаратуры аб беларускіх гаворках пакуль што не знайшла дастатковага асвятлення. Сустракаецца **«о»** на месцы **«е»**, але непаслядоўна, звычайна ў канчатку: *складом* (*складзём*), *жном* (*жнём*). Паслядоўна ва ўсіх вёсках раёна з устаўным **«в»** ужываецца слова *радыё* і гучыць *радзіво*. У паўднёвых гаворках гэтак жа гучыць слова *раён* (*райвон*). Зрэдку ў мове прадстаўнікоў старэйшага пакалення ў гаворках вёсак поўдня раёна ў дзеяслоўным суфіксе **-ава-** сустракаецца **«у»**: *спарадкувала, расходувалі, папалуднувалі*. У канцавым адкрытым складзе ў гаворках усіх вёсак поўдня галоснаму **«о»** адпавядае **«о»**: *малого, купіло, рэшато, матачко, складно*. Гаворкі вёсак паўночнай часткі раёна ў гэтых адносінах адрозніваюцца ад паўднёвых гаворак. Там ненаціскное канцавое **«о»** супадае з **«а»** і вышэйпамянёныя прыклады гучаць *малога, купіла, рэшата, матачка, складна*. Як зазначаў акадэмік Я.Ф.Карскі, мена **«ц»** і **«ч»** з'яўляецца рысай часткі паўночных рускіх гаворак, а таксама «заўважаецца ў паўночных і паўночна-ўсходніх ускраінах» Беларусі. Аб гэтай з'яве ў беларускіх паўднёва-заходніх гаворках у лінгвістычнай літаратуры пытанне не ўзнімалася, а між іншым ёсць патрэба звярнуць увагу на асобныя выпадкі. **«Ц»** на месцы **«ч»** ужываецца ў словах *цурка, цурбан, цыбук*, а таксама ў словах тыпу *вулічка, маладзічка*, якія гучаць *вуліцка, маладзіцка, рукавіцка, спадніцка, паліцка, настаўніцка*, хаця паралельна існуюць *настаўнічка, рукавічка* і г.д. У словах іншамоўнага паходжання **«ф»** замяняецца іншымі гукамі або спалучэннем гукаў:

1) на месцы **«ф»** ужываецца **«п»**: *шкап, картоплі, штрап* (паўсюдна ў раёне);

2) на месцы **«ф»** ужываецца **«х»**: *хунт* (ва ўсіх вёсках), *кухайка, хурман*;

3) на месцы **«ф»** ужываецца **«хв»**: *хвіга, канхвета, ахвіцэр, хварбы* і адзіны выпадак, калі вымаўляецца **«кв»** — *квасоля*. Пад уплывам літаратурнай нормы ў мове моладзі, мясцовай інтэлігенцыі, з аднаго боку, такія замены назіраюцца значна радзей, а з другога — сустракаюцца выпадкі гіпердыялектызму: *фуліган, футар, фромавы, фолько, фоць бы што*

(*хуліган, хутар, хромавы, хвалько, хоць бы што*).

Ацвярдзенне «*с*» перад «*а*» ў зваротнай часціцы, так званае аканне паслядоўна назіраецца ў паўднёвай частцы раёна ў мове прадстаўнікоў старэйшага пакалення: *стараўса, утаміўса, спяшаўса*. Калі ж хочуць крышачку пакпіць, то пра сакуноў гавораць: «*Наеўса, напіўса, лёг спаць і накрыўса*». Але пад уплывам літаратурнай мовы пачынаецца «памякчэнне» ў вымаўленні: *стараўся, утаміўся, спяшаўся*. Мяккія гукі «**б**», «**в**», «**м**», «***п***» у гаворках поўдня перад «**а**», «**о**» ацвярдзелі, напрыклад: *м'ёд, жараб'я, м'ясо, сарам'яжы, п'яць, заў'ёз, заў'язаны*. Гук «**л**» носьбітамі традыцыйных гаворак перад зычнымі «**н**», «**ц**», «**ч**» часта вымаўляецца цвёрда: *пілнаваць, двухстволнае ружжо, сілно* (*пільнаваць, двухствольнае ружжо, сільно*).

МАРФАЛОПЯ

Гаворкі паўднёвай часткі Глускага раёна ў фанетычным сэнсе ў многім адрозніваюцца ад гаворак паўночнай часткі. Яркіх марфалагічных рыс, якімі адрозніваюцца паўночныя гаворкі ад паўднёвых, значна менш. У паўднёвай частцы раёна сустракаецца назоўна-вінавальны склон парнага ліку назоўнікаў жаночага роду, але толькі пры лічэбніках: *дзве хаце, абедзве капе*. Сустракаецца таксама форма назоўна-вінавальнага склону парнага ліку назоўнікаў ніякага роду пры лічэбніках *дзве, абедзве*: *дзве вядрэ ўліла*. Намнога радзей сустракаецца форма парнага ліку пры лічэбніках *два, абедзве, тры, чатыры* ў гаворках паўночнай часткі раёна. Яны гучаць у мове прадстаўнікоў старэйшага пакалення і прытым толькі ў назоўніках жаночага роду: *дзве ўдаве, тры капе*. Назіраецца адметная з'ява: у назоўнікаў мужчынскага роду, якія абазначаюць неадушаўлёныя прадметы, вінавальны склон адзіночнага ліку супадае з родным склонам: *найшоў грыба, даць гурка, пазычыў чырвонца*. У глускіх гаворках займеннік **хто** адносіцца толькі да тых адушаўлёных прадметаў, якія абазначаюць асоб. Да адушаўлёных прадметаў, якія абазначаюць жывёл, птушак, рыб, адносіцца толькі займеннік **што**: *Хто разгадае загадку? Што там вядзецца? Мо ўдод смярдзючы звіў гняздо?* Часам у глускіх гаворках да жаночага роду адносяцца назоўнікі мужчынскага роду: *літра, метра, танка*. Паўднёвыя гаворкі вылучаюцца тым, што маецца клічная форма назоўнікаў другога скланення, якія абазначаюць назвы асоб. Гэта рыса характэрна мове людзей старэйшага ўзросту: *сястро, матко, цётачко*. Гаворкам жа паўночнай часткі раёна, для якіх тыповым выступае поўнае аканне, клічная форма не ўласціва. У творным склоне множнага ліку ў назоўніках першага скланення часам сустракаюцца варыяцыі канчаткаў: *вулей з пчалыма* і *вулей з пчалмі*. Цікавая з'ява назіраецца пры ўжыванні назоўнікаў-прозвішчаў на **-ко**. Незалежна ад таго, хто з'яўляецца носьбітам (мужчына ці жанчына), яны скланяюцца, як назоўнікі другога скланення: у *Каська Андрэя* і ў *Каська Юстыны, Круцьку Івану* і *Круцьку Антаніне* і г.д. Даволі распаўсюджанай у паўднёвай частцы з'яўляецца сцягнутая форма прыметніка: *старэйша дачка, суконна світа, шырока канава*. А чым далей на поўнач раёна, тым часцей сустракаецца нясцягнутая форма прыметнікаў: *цёмная ночка, сіняя сукенка*. Калі ў паўднёвых вёсках замест канчатка **-ы** ў прыметніках ужываецца **-у** (*сіву, слабу*), то ні ў адной вёсцы паўночнай часткі такое не назіраецца (*сівы, слабы*).

Для глускіх гаворак характэрна, што складаныя дзеясловы будучага часу маюць дзве формы — аналітычную і сінтэтычную. Аналітычная складаецца з дзеяслова **буду** і неазначальнай формы дзеяслова (*буду жыць, буду любіць*). Сінтэтычная ж форма ўтвараецца шляхам дадавання да інфінітыва своеасаблівых канчаткаў **-му**, **-меш**, ***-ме*** і іншых (*жыцьму, любіцьму*). Што тычыцца паўднёвых гаворак, то ім характэрны як аналітычная, так і сінтэтычная формы, чаго нельга сказаць пра паўночную частку, дзе выкарыстоўваецца толькі аналітычная форма. Хіба толькі ў вёсках, што стаяць на памежжы паўднёвай і паўночнай частак, зрэдку ў мове пажылых людзей сустракаецца сінтэтычная форма. Паралельна з прыслоўямі **куды**, **туды**, **сюды** (радзей **куда**, **туда**, **сюда**), што бытуюць у гаворках усіх вёсак, існуюць формы *кудой, тудой, сюдой*. Апошнія сустракаюцца як у моўных выразах носьбітаў традыцыйных гаворак, так і ў мове людзей адукаваных. Прыслоўі

тут і **там** аднолькава ўжываюцца і з суфіксам **-ака** і без яго: *тутака*, *тамака*. А прыслоўі **недзе**, **некі** найчасцей ужываюцца з устаўным **«й»**: *нейдзе*, *нейкі*. Прыслоўе **тады** часам ужываецца з устаўным **«г»**: *тагды*.

Падсумоўваючы ўсё вышэйпададзенае аб сучасных гаворках Глушчыны, можна сказаць, што пад уздзеяннем літаратурнай мовы, міграцыйных працэсаў, пашырэння ўплыву сродкаў масавай інфармацыі дыялектныя гаворкі ўсё больш і больш засвойваюць літаратурныя нормы.

В.У.Ляшчынскі.

Народныя калектывы Глушчыны

Вакальны ансамбль «Крынічанька». Створаны ў 1974 г. дырэктарам Глускай музычнай школы Галінай Сяргееўнай Былінскай пераважна з выкладчыкаў гэтай школы. У рэпертуары «Крынічанькі» — песні беларускіх і савецкіх кампазітараў, народныя песні. Радуе слухачоў сваім прыгожым голасам Фаіна Рытвінская. Званне народнага калектыву было прысвоена 29 снежня 1984 г., а ў 1997 г. пацверджана паўторна. Кіраўнікі ансамбля — выкладчык школы мастацтваў Аксана Віктараўна Мельнік і акампаніятар Алег Мікалаевіч Пагаржэльскі — робяць усё, каб ансамбль прыносіў жыхарам раёна асалоду сваімі выступленнямі.

Хор Завалочыцкага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1974 г. У вытоках яго заснавання стаяў К.А.Краскоўскі — чалавек улюблёны ў песню, ініцыятыўны, вельмі зацікаўлены ў арганізацыі свайго, саўгаснага хору. Першым мастацкім кіраўніком (ён жа і акампаніятар) стаў настаўнік Завалочыцкай сярэдняй школы Алег Барысавіч Карпачоў. З цягам часу хор набыў шырокую вядомасць. Асабліва прыкметнымі сталі яго поспехі пасля 1979 г., калі калектыў узначаліла выпускніца харавога аддзялення Магілёўскага культасветвучылішча Таццяна Іванаўна Дубашынская. Завалочыцкі хор не раз станавіўся лаўрэатам абласных аглядаў-конкурсаў, атрымліваў заслужаныя ўзнагароды. У 1995 г. рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь калектыву было прысвоена званне народнага самадзейнага калектыву. У яго рэпертуары — беларускія і рускія народныя песні, творы беларускіх і рускіх кампазітараў. Хорам вывучаны і інсцэніраваны абрады «Сватанне ў Завалочыцах», «Зажынкі», «Дажынкі», «Купалле». Касцяк калектыву складаюць сям'я Міхаіла Аляксандравіча Храпко (ён сам, жонка Тамара Парфенаўна, дочкі Наталля і Таццяна), Анастасія Кузьмінічна Афанасенка (заслужаная настаўніца Рэспублікі Беларусь), Ганна Маркаўна Шымчык, Людміла Георгіеўна Фёдарава і інш. Канцэртныя выступленні самадзейных артыстаў добра вядомы за межамі раёна. І ў саўгасе ні адно свята, ні адна ўрачыстасць не праходзяць без выступлення народнага калектыву.

Г.С.Былінская.

К.А.Краскоўскі.

Аматарскае аб'яднанне «Зносіны». Бярэ сваю радаслоўную з аднайменнага клуба, арганізаванага цэнтральнай раённай бібліятэкай у 1988 г. сярод пажылых жыхароў Глуска. Яго арганізатарамі ставілася мэта прыцягнуць гэтых людзей да актыўнай грамадскай работы, задаволіць іх духоўныя патрэбы. Таму і работа клуба будавалася адпаведным чынам: праводзіліся штотыднёвыя пасяджэнні клуба па рознай тэматыцы, ажыццяўлялася шэфства над адзінокімі старымі людзьмі, апека хворых членаў клуба, сумеснае абмеркаванне найбольш важных грамадска-палітычных падзей і г.д. У 1990 г. пры клубе «Зносіны» ўзнік фальклорны калектыў, у які першапачаткова ўвайшлі 18 удзельнікаў клуба. Яго першым мастацкім кіраўніком стала загадчыца аддзела куль-

Вакальная група Завалочьщкага хору.

Аматарскае аб'яднанне «Зносіны» ў час правядзення «Глускіх вячорак» на рэспубліканскім тэлебачанні.

туры райвыканкома Ганна Мікалаеўна Кажушка, пазней — Іна Мікалаеўна Кірына. Удзельнікі групы — частыя госці на вёсцы. З аднолькавым поспехам яны выступаюць перад аўдыторыяй любога ўзросту: ветэранамі, працаўнікамі. Асабліва цёпла іх заўсёды прымаюць сельскія жыхары, якім даспадобы рэпертуар фальклорнай групы: народныя песні, прыпеўкі, успаміны далёкага мінулага. Іх з вялікім майстэрствам выконваюць салісты групы. Самадзейнымі артыстамі сабраны, распрацаваны і выконваюцца «Глускія вячоркі», з якімі аб'яднанне «Зносіны» выступала па рэспубліканскім тэлебачанні. У канцы 1995 г. аматарскаму аб'яднанню было прысвоена званне народнага самадзейнага калектыву. Яго мастацкімі кіраўнікамі з'яўляліся ў розныя гады Р.Ф.Сокал, Н.В.Бычкоўская, Л.І.Якіменка, а цяпер — В.Д.Урублеўская.

З успамінаў Зоі Васільеўны Цвірко (Харланчук), самадзейнай спявачкі, жыхаркі г.п. Глуск

У мастацкую самадзейнасць я прыйшла амаль адначасова з пачаткам працоўнай дзейнасці ў красавіку 1947 г. Калі ж улічыць, што яшчэ і сёння спяваю ў складзе ансамбля пры раённым аб'яднанні «Зносіны», то мой пеўчы стаж складае больш як паўстагоддзя. Ён пачынаўся ў арцелі «КІМ». Сюды на працу прывяла мяне старэйшая сястра Ліза, тут я вучылася майстэрству ткачыхі па вырабе драўнянастружкавай спатры. Ішлі гады. Арцель змяняла назвы (прамкамбінат, мэблевая фабрыка), асартымент прадукцыі. Маю больш за 40 гадоў працоўнага стажу, выгадавала двух сыноў. Вядома, памятаю многіх сяброў па захапленні. Гэта ў першую чаргу Марыя Кісялевіч, сёстры Вольга і Марыя Солтан, Ганна Зайцава, Леаніда Савіцкая, Сямён Эпштэйн, Вольга Круглова, муж і жонка Анатоль і Кацярына Гукі, Барыс Рабкін, Аляксандра Каваленка-Нозік, Антаніна Курылава і многія іншыя. Ніколі не забуду, як разам з той жа Савіцкай і яшчэ Ганнай Фаставец запрасілі нас удзельнічаць у конкурсным адборы ў знакаміты хор Цітовіча. І, што цікава, усе ўтраіх паспяхова прайшлі адбор, нас афіцыйна прынялі ў хор. А што здзіўляцца? Самадзейнасць у нас у тыя гады адменная была. І ў Бабруйску (ён тады абласным цэнтрам быў) першыя месцы займалі, і ў Мінску не менш паспяхова выступалі, прывозілі адтуль дыпломы і іншыя ўзнагароды за выканаўчае майстэрства. Памятаю, у тэатры Янкі Купалы выступалі, Доме афіцэраў, драматычным рускім тэатры, многіх іншых сталічных залах. Жыццё склалася так, што не змаглі паехаць працаваць у хор Цітовіча. Словам, памятаю многае і многіх. Сярод іх Марыя Каранец, Галіна Кірдун, Аркадзь Гендзялевіч, Міхаіл Войтка, Лідзія Астапчук, Галіна Былінская, выдатна акампаніраваў баяніст Барыс Грышын. Але быў чалавек, пра якога мне некалькі слоў хацелася б сказаць асобна. Бо гэта ў многім дзякуючы яго адданасці справе, энтузіязму, прафесіяналізму мастацкая самадзейнасць на пэўным этапе дасягнула такіх прыкметных поспехаў. Маю на ўвазе спачатку мастацкага кіраўніка, а потым да самай пенсіі дырэктара раённага Дома культуры Барыса Навумавіча Сандамірскага. Мы ведалі, што, закончыўшы да вайны Маскоўскае тэатральнае вучылішча, ён некаторы час працаваў прафесіянальным акцёрам. Толькі Вялікая Айчынная вайна, удзельнікам якой ён быў, у яго жыццё, як і ў жыццё многіх прадстаўнікоў майго пакалення, унесла істотныя перамены. І, думаю, Глуску ў гэтым плане проста пашчасціла. Пасля прыходу Сандамірскага ў сферу культуры мастацкая самадзейнасць раёна вельмі хутка набыла новыя рысы. Калі раней больш

З.В.Цвірко.

Б.Н.Сандамірскі.

спявалі ды танцавалі, то Барыс Навумавіч прывіў густ да паэзіі, мастацкага чытання, тэатральнага мастацтва. Вялікай папулярнасцю карысталіся ў гарадскім пасёлку тэатральныя пастаноўкі, прычым і рэпертуар змяняўся даволі часта. Бывала, у год ставілі па два спектаклі. І быў нават час, калі ў вышэйшых інстанцыях абмяркоўвалася пытанне аб прысваенні драматычнаму калектыву звання народнага. Ужо і камісія прыязджала, дала станоўчую ацэнку, і толькі крыху пазнейшыя перашкоды арганізацыйнага характару, якія не залежалі ад самадзейных артыстаў, не прывялі да таго заканамернага вынікy. Калі ішлі спектаклі, то звычайна глядзельная зала РДК была поўная. З пастаноўкамі нярэдка выязджалі і ў вёскі раёна. Ставіліся пераважна п'есы вядомых савецкіх драматургаў Аляксея Арбузава, Віктара Розава, творы класіка Аляксандра Астроўскага. Шмат радасці выклікалі гумарыстычныя сцэнкі, у пастаноўцы якіх Барыс Навумавіч заўсёды паказваў сябе сапраўдным майстрам. Ён чула і ўмела працаваў з моладдзю, падрыхтоўваў сабе дастойную змену, і калі пайшоў на пенсію, эстафету ўдала прынялі яго вучні, больш маладыя работнікі культуры.

Фальклорна-этнаграфічны ансамбль Хваставіцкага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1986 г. Яго першым мастацкім кіраўніком была Святлана Мікалаеўна Радзюкевіч. Менавіта ў 1986 г. мастацкі калектыў Дома культуры прыняў удзел у абласным конкурсе і за арыгінальнае выкананне народных песень стаў яго дыпламантам. Тады і ўзнікла думка сур'ёзна заняцца фальклорнай спадчынай Глушчыны, збіраць яе песні і актыўна ўключаць у рэпертуар ансамбля. Асабліва актывізавалася работа з прыходам у калектыў Раісы Фёдараўны Сокал, чалавека, які ўнёс значны ўклад у развіццё мастацкай самадзейнасці на Глушчыне, які ведае і многія гады запісвае народныя песні і звычаі. Калектыў як бы набыў сваё другое дыханне: значна расшырыўся рэпертуар, у выкананні фальклорна-этнаграфічнага калектыву загучалі абрадавыя, былінныя песні, адрадзіліся такія народныя абрады, як «Каляды», «Шчодрыкі», «Стрэчанне», «Гуканне вясны», «Купалле». Заслужанае прызнанне калектыў атрымаў у 1996 г. на аглядзе-конкурсе аўтэнтычнага фальклору ў г. Кіраўск Магілёўскай вобласці, дзе яго выступленне было адзначана дыпломам. Калектыў здабыў шырокую вядомасць, яго запрасілі ў г. Асіповічы, дзе самадзейныя артысты паказалі народны звычай «Выпяканне каравая ў хаце маладой перад вяселлем». І зноў новая перамога. Адсюль фальклорна-этнаграфічны ансамбль атрымаў пуцёўку на Міжнародны фестываль народнай песні «Славянскі кірмаш» у г. Чэхаў Тульскай вобласці. У кастрычніку таго ж года калектыву было прысвоена ганаровае званне народнага. Ансамбль часта выступае з канцэртамі ў Глускім і Бабруйскім раёнах, удзельнічае ў раённых і абласных фестывалях і аглядах-конкурсах.

У.А.Шулякоўскі.

Народнае мастацтва Глушчыны

Кажуць, што чараўнік — гэта чалавек, які робіць штосьці незвычайнае, а потым дорыць гэта людзям. Наша глуская зямля не абдзелена такімі людзьмі. Шмат у вялікіх і маленькіх вёсачках жыве сапраўдных чараўнікоў. Чараўніца, з якой мы хочам вас пазнаёміць, жыве ў в. Балашэвічы. Увесь вольны час Валянціна Сямёнаўна Долбік аддае любімаму занятку — ткацтву. Шмат пакрывал, сурвэтак выткала за сваё жыццё яна і раздарыла родным і знаёмым.

Прыгожы дом, што стаіць на скрыжаванні вуліц у в. Старына, вабіць сваім непаўторным хараством. Акуратна пафарбаваны, з разнымі ліштвамі на вокнах, па якіх «скачуць» казачныя вавёркі, ён міжволі прыцягвае ўвагу прахожых. Створана гэта зачараванне рукамі Васіля Цярэнцьевіча Ермакова.

На сцяне ў доме Емяльянавых, што жывуць у Глуску, вісіць адмысловы габелен. На палотнішчы «рассыпаны» незвычайныя кветкі: блакітныя, сінія, чырвоныя, бардовыя... Да іх так і хочацца дакрануцца. Яны быццам жывыя. Асаблівае захап-

ленне выклікае тое, што гэты дыван ручной работы. Аўтар усіх незвычайных цудаў — Кацярына Канстанцінаўна.

Разьба па дрэве стала захапленнем для выпускніка Віцебскага педінстытута Леаніда Леанідавіча Уласіка. Яго работы ўпрыгожваюць вуліцы ў вёсках Сцяпанаўка, Старое Сяло, інтэр'еры ў многіх школах, дзіцячых садах, адміністрацыйных будынках раёна.

Жыве ў в. Гарадок вышывальшчыца Валянціна Андрэеўна Астроўская. З яе ўмелых рук выходзяць цуда-карціны. Нават цэлыя дываны атрымліваюцца. У асноўным сюжэты для гэтых вышываных рэчаў жанчына чэрпае з розных казак.

Дом у Глуску, дзе жыве Марыя Пятроўна Савіцкая, напоўнены святлом і ўтульнасцю. Шмат розных вышыванак упрыгожваюць пакоі хаты. На адным з ручнікоў кветкі не вышыванья, а тканья. Быў час, калі жанчына займалася ткацтвам. Потым паступова з'явілася новае захапленне — вязанне.

Далёка за межамі Глушчыны вядомы работы самадзейнага мастака Сяргея Аляксеевіча Апухоўскага, якія адлюстроўваюць прыгажосць родных мясцін.

У майстэрні Дакольскай сярэдняй школы можна ўбачыць вырабы, якія па праву прэтэндуюць на творы мастацтва. Выразаныя з дрэва свяцільнікі, маскі, вешалка і многае іншае — работы членаў гуртка, якім кіруе Міхаіл Аляксандравіч Тылец. У кожнай рэчы, зробленай рукамі настаўніка і яго вучняў, бачны творчасць, фантазія, мастацкія здольнасці.

У душы Кацярыны Іванаўны Грынявецкай з в. Бабірова жыве мастак. Жанчына вельмі любіць кветкі. Матэрыялам для іх служыць гусінае пяро. Карзіны з такімі кветкамі ўпрыгожваюць усе пакоі. Увогуле хата Грынявецкіх напамінае музей. Вочы разбягаюцца ад таго хараства, што развешана на сценах, расстаўлена на падлозе, мэблі.

Мастакі Глушчыны. Колькі іх! Кожны дорыць сваім умельствам радасць людзям. Гэта ткачыхі Ганна Яфімаўна Арцёмчык і Зінаіда Іванаўна Белавушка з в. Горнае, Матрона Пятроўна Дзядзюля і Кацярына Фёдараўна Дзядзюля з в. Балашэвічы, Надзея Сцяпанаўна Парахаўнік з в. Мыслоціна, Таццяна Кандрацьеўна Харытончык з в. Касарычы, Надзея Васільеўна Анікеева з в. Слаўкавічы, Кацярына Мікалаеўна Валодзька з в. Падлужжа. Ткацтвам і вышываннем займаецца Надзея Якаўлеўна Радзько з в. Баянава. Прыгожыя вышыванкі атрымліваюцца ў Вольгі Барысаўны Прыгара з в. Падлужжа, у Тамары Аркадзьеўны Янкоўскай і Валянціны Ламашкі з в. Клетнае, у Ганны Андрэеўны Вігуры і Валянціны Сяргееўны Кудзёлка з в. Бабірова, у Кацярыны Ісакаўны Захарчанка з в. Катка, у Надзеі Іванаўны Сокал і Валянціны Крупскай з в. Даколь, у Вольгі Сямёнаўны Сідаровіч з в. Дуброва, Веры Сцяпанаўны Лацэвіч з в. Касарычы. Кацярына Іванаўна Кудзёлка з в. Бабірова не толькі вышывае, але і вяжа, займаецца ткацтвам, выбіваннем дываноў іголкай. Вышывае, вяжа і захапляецца макрамэ Іна Аляксееўна Барысік з в. Бабірова. Прыгожыя вазы, посуд з пап'е-машэ атрымліваюцца ў Святланы Каранкевіч з в. Калацічы. Павел Логвінавіч Ляпко з в. Падлужжа займаецца пляценнем з лазы, пляце з лазы лапці і Іван Канстанцінавіч Грамыка з в. Клетнае. Разьбе па дрэве аддаюць свой вольны час Анатоль Аляксеевіч Мягкоў з в. Бярозаўка і Аляксандр Сяргеевіч Жукаў з в. Слаўкавічы, жывапісу — Аляксандр Шпакоўскі з в. Згода. Вырабы з запалак робіць Васіль Канстанцінавіч Прыгара з в. Падлужжа. Вязаннем займаюцца Людміла Мікалаеўна Чабус з в. Слаўкавічы і Людміла Лук'янаўна Муха з в. Мыслоціна, макрамэ — Аліна Васільеўна Сініцына з в. Слаўкавічы, выбіваннем дываноў іголкай — Глафіра Кузьмінічна Кіпель з в. Нова-Андрэеўка.

В.М.Чучвал.

У Глуска — свой герб

У 1996 г. Глуску споўнілася 600 гадоў. Рыхтуючыся адзначыць гэтую дату, аддзел культуры райвыканкома звярнуўся да кіраўніцтва раёна з прапановай распрацаваць гістарычны герб Глуска. Атрымаўшы згоду, узяліся за справу. Беларускі навукова-даследчы інстытут справаводства і архіўнай справы Нацыянальнай акадэміі

Герб Глуска.

Так выглядаў Глускі касцёл — помнік архітэктуры XVII ст. перад вайной. Знаходзіўся на тэрыторыі замчышча. Разбураны ў час Вялікай Айчыннай вайны. Здымак 1930-х гадоў.

навук Рэспублікі Беларусь аказаў пэўную дапамогу, даручыўшы падрыхтоўку эскіза навуковаму супрацоўніку А.К.Цітову. У аснову быў пакладзены фрагмент малюнка-сілуэта, узяты з тапаграфічнай карты XVII ст. Тамаша Макоўскага. На ёй Глуск пазначаны як населены пункт з пэўным сімвалам — адбіткам замкавай вежы і часткі пабудоў, што належалі тагачаснаму Глускаму замку. Эскіз вынеслі на ўсеагульнае абмеркаванне жыхароў Глуска і, не сустрэўшы пярэчанняў, у снежні 1996 г. рашэннем райвыканкома зацвердзілі як асноўны. Потым ён быў зафіксаваны як афіцыйная эталонная выява — герб у Дзяржаўнай геральдычнай службе Рэспублікі Беларусь.

Выява герба Глуска ўяўляе сабой пазалочаны шчыт, на якім у чырвоным колеры адлюстравана галоўная гістарычная славутасць Глуска — замкавая вежа і прылягаючая да яе частка цаглянай пабудовы — сцяны. Райвыканкомам распрацавана і зацверджана адпаведнае палажэнне аб выкарыстанні герба Глуска.

У.А.Шулякоўскі.

Помнікі гісторыі і культуры Глушчыны

г.п. Глуск

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ПАТРЫЁТАЎ. Вул. Горкага, на могілках. Пахаваны савецкія патрыёты Георгій Казак і Аркадзь Яльніцкі, якіх 17.2.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БЮСТ ШУТАВА Сцяпана Фёдаравіча. На плошчы Леніна, у скверы. У 1952 г. пастаўлены на радзіме героя ў в. Дварэц Глускага р-на, перанесены ў г.п. Глуск у 1975 г.

Скульптурны партрэт (бронза, граніт; вышыня бюста 1,1 м, пастамента 2,9 м) двойчы Героя Савецкага Саюза С.Ф.Шутава ўстаноўлены на пастаменце ў выглядзе каніраванай калоны на стылабаце.

Просты, адкрыты твар, горда прыўзнятая галава, шырокі разварот плячэй з плаўным закругленым зрэзам, выявы баявых узнагарод на грудзях ствараюць вобраз чалавека, які ўсё сваё жыццё прысвяціў служэнню народу, Радзіме. У кампазіцыю помніка ўключаны 2 бронзавыя вазы.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Вул. Горкага, на могілках. Пахаваны 12 мірных жыхароў, якіх 14.4.1942 г. пасля катаванняў расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Вул. Горкага, на могілках. Пахаваны 5 мірных жыхароў, якіх 31.3.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Вул. Горкага, на могілках. Пахаваны 2 мірныя жыхары, якіх 29.4.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Бюст двойчы Героя Савецкага Саюза С.Ф.Шутава.

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. На 7-м км аўтамабільнай дарогі Глуск — Бабруйск. Савецкі воін загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ЖЫЖКЕВІЧУ Дзмітрыю Андронавічу. Вул. Жыжкевіча, 1, на будынку райваенкамата. Устаноўлена ў 1969 г. на ўшанаванне памяці сакратара першага Глускага валаснога Савета Дз.А.Жыжкевіча, якога ў 1918 г. расстралялі палякі. Яго імем названа адна з вуліц г.п. Глуск.

МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС ЗЕМЛЯКАМ. На паўднёвай ускраіне пасёлка, на скрыжаванні вуліц М.Горкага і аўтамабільнай дарогі Бабруйск — Мінск.

У Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі Глускага раёна дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б (4.8.1943 — 28.6.1944) і ЛКСМБ (жнівень 1941 — 28.6.1944), 17 партызанскіх атрадаў, у якіх супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў змагаліся 1200 патрыётаў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны ваявалі 6597 жыхароў раёна. 4725 чалавек загінулі ў баях з ворагам. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ўраджэнцам раёна С.Ф.Шутаву (двойчы), С.А.Калінкоўскаму, У.А.Рыбаку. За гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Глускага раёна фашысты расстралялі ці закатавалі 3126 мірных жыхароў раёна, цалкам спалілі вёскі Паршчаха, Масты, Белыя, Станічы, Славіна, Амур, Уюнішча, знішчылі 2 МТС, грамадскія будынкі калгасаў, саўгасаў, школы, клубы, бібліятэкі, 1777 жылых дамоў.

У 1974 г. на ўшанаванне памяці землякоў створаны мемарыяльны комплекс (скульптар І.Краўчанка; бетон, металізацыя; вышыня скульптуры 5 м). У цэнтры пляцоўкі (20х24 м) на насыпным узгорку — скульптура маладой жанчыны. На выцягнутых руках яна трымае меч, увенчаны лаўровай галінкай. Выразны сілуэт, абагульненая пластыка формаў, дынамізм кампазіцыі надаюць скульптуры манументальнасць. З трох бакоў да ўзгорка вядуць лесвіцы, якія пераходзяць у бетанаваныя дарожкі з кветкавымі газонамі. Абапал адной з дарожак, што ідзе ў бок шашы, размешчаны 6 блокаў з надпісамі-інфармацыяй.

ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу. На вул. Сацыялістычнай, каля будынка райвыканкома. Скульптура У.І.Леніна ўстаноўлена ў 1974 г.

в. Бабірова, Завалочыцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну паблізу вёскі. У 1953 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 87 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Бабровічы, Каткаўскі сельсавет

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 27 мірных жыхароў, якіх 27.2.1944 г. загубілі нямецка-фашысцкія карнікі. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 130 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору. У 1966 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

в. Балашэвічы, Кіраўскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 58 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.У 1969 г. пастаўлена стэла.

в. Бараціна, Хваставіцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 13 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Барбарова, Клятнянскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 54 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Барысаўшчына, Калаціцкі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 35 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Белыя (не існуе), Завалочыцкі сельсавет

МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ. Вёска Белыя знаходзілася за 5 км ад в. Яўсеевічы. У 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі яе разам з жыхарамі (18 жыхароў, 12 двароў). У 1961 г. на месцы былой вёскі пастаўлены абеліск.

в. Бярозаўка, цэнтр сельсавета

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. За 2 км на ўсход ад вёскі, каля дарогі на в. Ратміравічы. Пахаваны 14 партызан, якія загінулі ў 1919 г. у баях супраць войскаў буржуазнай Польшчы. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На могілках. Пахаваны 3 жыхары вёскі, расстраляныя нямецка-фашысцкімі карнікамі ў 1942 г. У 1945 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА КУКАНАВА Васіля Васільевіча. На могілках. Савецкі воін В.В.Куканаў загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК КАЛІНІНУ Міхаілу Іванавічу. Каля будынка праўлення калгаса імя М.І.Калініна. Бюст М.І.Калініна ўстаноўлены ў 1979 г.

в. Веснава, Хваставіцкі сельсавет

МАГІЛА СОКАЛА Дзмітрыя. На могілках. Савецкі воін Дз.Сокал загінуў у 1942 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

в. Вільча, Кіраўскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАНАК. На могілках. Пахаваны партызанскія сувязныя атрада «За Савецкую Радзіму» 100-й Глускай партызанскай брыгады М.А.Курс і А.М.Ганчарова, якія ў час выканання баявога задання вясной 1944 г. былі схоплены і па-зверску закатаваны фашыстамі. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ГАЛАМАКІ Цімафея Антонавіча. На могілках. Удзельнік партызанскага руху ў Бабруйскім і Рагачоўскім паветах у грамадзянскую вайну. Ц.А.Галамака забіты польскімі легіянерамі ў 1920 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. На могілках. Воін (прозвішча не ўстаноўлена) загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Гарадок, Завалочыцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 2 воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

КАЗЬМАДЗЯМ'ЯНАЎСКАЯ ЦАРКВА. На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1814 г. з дрэва. Будынак складаецца з прамавугольнага асноўнага аб'ёму, пяціграннай апсіды, трох'яруснай званіцы і бабінца. Накрыта двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. З боку галоўнага фасада званіца (васьмярык на чацверыку), завершаная паўсферычным купалам. Над асноўным аб'ёмам — васьмігранны самкнуты купал на гранёным светлавым барабане. Сцены прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, якія абрамлены ліштвамі з сандрыкамі. Вуглавыя часткі будынка ўмацаваны драўлянымі лапаткамі. Галоўны ўваход вырашаны ў выглядзе стылізаванага порціка. Унутраная прастора царквы развіта па падоўжнай восі. Светлавы барабан з васьмігранным самкнутым скляпеннем падтрымліваецца 8 слупамі. У дэкоры інтэр'ера шырока выкарыстана разьба па дрэве.

Казьмадзям'янаўская царква ў в. Гарадок.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства з выкарыстаннем стылізаваных элементаў класіцызму.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 62 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1982 г. пастаўлены абеліск.

в. Даколь, Клятнянскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ і ПЕРМЯКОВА Васіля. На могілках. Пахаваны 6 воінаў і партызан В.Пермякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Дуброва, Хваставіцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны 6 партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА КАРТУНА Канстанціна Фёдаравіча. На могілках. Савецкі салдат К.Ф.Картун загінуў у 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ПАРТЫЗАНА. На могілках. Партызан (прозвішча не ўстаноўлена) загінуў у 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ПАРТЫЗАНКІ. На могілках. Партызанка (прозвішча не ўстаноўлена) загінула ў 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ПЯТРЭНІ Марфы і ПЯТРЭНІ Мікалая Мікалаевіча. На могілках.

Пахаваны партызаны атрада імя Л.М.Даватара 64-й партызанскай брыгады імя В.П.Чкалава маці і сын — М. і М.М.Пятрэні, якія загінулі ў 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Жалвінец, Калаціцкі сельсавет

МАГІЛЫ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магілах пастаўлены 3 абеліскі.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 75 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Жукавічы, Бярозаўскі сельсавет

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. На могілках. Воін (прозвішча не ўстаноўлена) загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Завалочыцы, цэнтр сельсавета

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. Каля канторы саўгаса «Завалочыцы» пахаваны 54 воіны і партызаны, якія загінулі ў 1943—1944 гг. паблізу вёскі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Заеліца, Слаўкавіцкі сельсавет

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. Пахавана каля 150 жыхароў в. Заеліца і суседніх населеных пунктаў, якіх 5.2.1944 г. спалілі жывымі нямецка-фашысцкія карнікі. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Замасточча, Каткаўскі сельсавет

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 73 жыхароў вёскі, якіх 1.3.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Заполле, Завалочыцкі сельсавет

МАГІЛА САВЕЦКАГА ЛЁТЧЫКА. На могілках. Лётчык Чырвонай Арміі загінуў у 1944 г. у паветраным баі. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Заракуша, Каткаўскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 62 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1972 г. пастаўлены абеліск.

в. Зелянковічы, Бярозаўскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У цэнтры вёскі, каля школы. Пахаваны 31 воін і 6 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — воіны кавалерыйскай групы генерал-палкоўніка А.І.Гарадавікова, якія загінулі ў ліпені 1941 г. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА МАЛАКОВІЧУ Луке Фядосавічу і МАЛАКОВІЧ Марыне Фядосаўне. Устаноўлена ў 1965 г. на будынку бібліятэкі.

ПОМНІК У ГОНАР БАБРУЙСКІХ ПАДПОЛЬНЫХ РАЙКОМАЎ КП(б)Б І ЛКСМБ, РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БОБРУЙСКИЙ ПАРТИЗАН». У цэнтры вёскі, каля будынка школы. У 1965 г. у гонар Бабруйскіх падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыі газеты «Бобруйский партизан» пастаўлены абеліск.

в. Зубарэвічы, Бярозаўскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны 9 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўсходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 112 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1972 г. пастаўлены абеліск.

в. Калацічы, цэнтр сельсавета

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 45 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1972 г. пастаўлены абеліск.

в. Калюга, Калаціцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны 5 партызан, якія загі-

нулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1944 гг. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 30 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Карніца, Хваставіцкі сельсавет

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. За 1 км на поўнач ад вёскі, у лесе. Воін (прозвішча не ўстаноўлена) загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Карпавічы, Кіраўскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На паўночнай ускраіне вёскі, каля аўтамабільнай дарогі Бабруйск — Глуск. На ўшанаванне памяці 14 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Касарычы, Каткаўскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка пошты. На ўшанаванне памяці 94 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1972 г. пастаўлены абеліск.

в. Катка, цэнтр сельсавета

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. Каля будынка выканкома сельсавета, у скверы. Пахавана каля 70 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод іх воіны 32-й кавалерыйскай дывізіі, партызаны атрадаў М.Б.Храпко, Дз.Ц.Гуляева, а таксама 123-й партызанскай брыгады імя 25-годдзя БССР. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам.

в. Клетнае, цэнтр сельсавета

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. Каля праўлення калгаса «Радзіма», у скверы. Пахаваны 10 воінаў, што загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і экіпаж самалёта — капітаны А.М.Шустоў, М.К.Есіпаў і старшына А.В.Ігнацьеў, якія загінулі ў 1941 г. у паветраным баі з ворагам. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

в. Краснае, Калаціцкі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 22 жыхароў в. Краснае і засценка Дуброва, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Крукаўшчына, Казловіцкі сельсавет

ПАРТЫЗАНСКІЯ МОГІЛКІ. На паўднёвай ускраіне вёскі. У 8 брацкіх магілах пахаваны 14 партызан атрада імя М.А.Шчорса і імя С.М.Кірава 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943—1944 гг. каля в. Крукаўшчына. У 1961 г. на могілках пастаўлены помнік — скульптура жанчыны, якая ўскладае кветкі.

в. Макавічы, Калаціцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны 27 воінаў і партызан, якія загінулі каля вёскі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод іх — партызаны Глускага атрада і атрада Дз.Ц.Гуляева. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ГАШЫНСКАГА Рыгора Навумавіча. На могілках. Партызан 100-й брыгады імя С.М.Кірава Р.Н.Гашынскі 6.5.1944 г. загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ЕРМАЛІЦКАГА Івана Васільевіча. На могілках. Партызан 2-га атрада імя І.М.Кутузава 100-й партызанскай брыгады імя С.М.Кірава І.В.Ермаліцкі загінуў 30.9.1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка школы. На ўшанаванне памяці 53 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. пастаўлены абеліск.

в. Макраны, Калаціцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, у лесе. Пахаваны 44 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля вёсак Барысаўшчына і Макраны. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 15 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Мыслоціна, Хваставіцкі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 77 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1970 г. пастаўлена стэла з рэльефнай выявай воіна.

в. Пагост, Калаціцкі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка школы. На ўшанаванне памяці 31 аднавяскоўца, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1970 г. пастаўлены абеліск.

в. Падлужжа, Бярозаўскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях пры вызваленні Глускага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1946 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Паршчаха (не існуе), Завалочыцкі сельсавет

МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ. Паршчаха знаходзілася за 8 км на паўночны ўсход ад в. Яўсеевічы. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яе разам з жыхарамі (72 чалавекі, 26 двароў). Вёска не адрадзілася. У 1970 г. на месцы спаленай вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

в. Поблін, Бярозаўскі сельсавет

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 45 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1984 г. пастаўлены абеліск.

в. Пціч, Каткаўскі сельсавет

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 47 мірных жыхароў, якіх 25.1.1944 г. спалілі жывымі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК САВЕЦКІМ ВОІНАМ І ПАРТЫЗАНАМ. На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці воінаў 43-га стралковага корпуса 28-й арміі 1-га Беларускага фронту і партызан Палескага злучэння, якія ў чэрвені 1944 г. вялі баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў за пераправу цераз р. Пціч. У 1969 г. пастаўлены абеліск і стэла з барэльефнай выявай воіна і партызана.

в. Розлевічы, Бярозаўскі сельсавет

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. На могілках. Воін загінуў у 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1945 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Рудня, Завалочыцкі сельсавет

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 8,5 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны 53 жыхары, якіх закатавалі ці расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Сельцы, Калаціцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 24 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Сіманавічы, Завалочыцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. За 0,6 км на поўдзень ад вёскі каля шашы Масква — Брэст. Пахаваны 175 воінаў і партызан, што загінулі ў 1941—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — воіны коннамеханізаванай групы пад камандаваннем генерал-лейтэнанта І.А.Пліева 1-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні Глускага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ПАТАПОВІЧА Барыса Пятровіча. На могілках. Партызан Б.П.Патаповіч расстраляны ў верасні 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1972 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Слабодка, Каткаўскі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны партызаны, якія загінулі ў баях супраць войскаў буржуазнай Польшчы ў 1920 г. У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Слаўкавічы, цэнтр сельсавета

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. Каля будынка школы. Пахаваны 48 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — партызаны Глускага атрада і 99-й партызанскай брыгады імя Дз.Ц.Гуляева. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік і скульптура партызана.

ПОМНІК У ГОНАР ГЛУСКІХ ПАДПОЛЬНЫХ РАЙКОМАЎ КП(б)Б І ЛКСМБ, РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ВЁСКА». У цэнтры вёскі, у скверы. У наваколлі вёскі ў 1943 г. дыслацыраваліся глускія падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ і рэдакцыя газеты «Сацыялістычная вёска» — орган Глускага падпольнага райкома КП(б)Б. У 1977 г. у гонар глускіх падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыі газеты «Сацыялістычная вёска» пастаўлена стэла.

в. Усцярхі, Казловіцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ. За 0,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе каля дарогі Глуск — Рэчыца, пахаваны 2 лётчыкі, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у паветраным баі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА П'ЯНКОВА Пятра Сямёнавіча. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе. Камандзір узвода 37-й механізаванай брыгады 1-га Украінскага фронту лейтэнант П.С.П'янкоў загінуў 26.6.1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА. На могілках. Воін загінуў у 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Уюнішча, Казловіцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. На могілках. Пахаваны 14 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод іх партызаны атрада імя С.М.Кірава 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Хваставічы, цэнтр сельсавета

ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ. На могілках. У 38 магілах пахаваны каля 50 воінаў і партызан, якія загінулі на тэрыторыі сельсавета ў 1941—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных камісар атрада імя В.І.Чапаева 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі П.І.Панкратаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 0,6 км на захад ад вёскі на Мыслоцінскай гары. Пахавана каля 2 тыс. мірных жыхароў, савецкіх ваеннапалонных і партызан, якіх у гады Вялікай Айчыннай вайны закатавалі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Чыкілі, Казловіцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА ПАРТЫЗАН. Каля будынка клуба. Пахаваны 16 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных партызаны атрада імя М.А.Шчорса 37-й брыгады імя А.Я.Пархоменкі. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Юзафова, Калаціцкі сельсавет

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 2 воіны, якія загінулі ў 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1971 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 6 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 г. пастаўлены абеліск.

в. Яўсеевічы, Завалочыцкі сельсавет

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 8 км на паўночны ўсход ад вёскі. Пахаваны 72 жыхары в. Паршчаха, якіх спалілі нямецка-фашысцкія карнікі ў 1943 г. У 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ЖЛОБІЧ Паліны Сямёнаўны. За 8 км на паўночны ўсход ад вёскі, на ўскраіне лесу, на месцы былой в. Паршчаха. Партызанская сувязная П.С.Жлобіч забіта нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 г. , калі спрабавала папярэдзіць жыхароў вёскі аб наступленні карнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 32 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1965 г. пастаўлены абеліск.

З гісторыі населеных пунктаў

АМУР (да 1964 г. Шумяцічы), вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 г. фальварак, 1 двор, 33 жыхары, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 25 жыхароў, у 1917 г. 115 (з іх 33 палякі). 6.10.1922 г. створана сельскагаспадарчая арцель «Іскра», а ў 1929 г. арганізаваны калгас «Амур», які ў 1936 г. аб'ядноўваў 44 гаспадаркі. У 1940 г. 24 двары, 77 жыхароў. У студзені 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. У 1996 г. 22 двары, 32 жыхары, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

АРЫЖНЯ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома па рукапісных і друкаваных крыніцах з пачатку XX ст. У 1907 г. засценак, 16 двароў, 99 жыхароў, у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. хутары, 19 гаспадарак, 119 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Майскі прамень», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 13 гаспадарак. У 1996 г. 5 двароў, 7 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

БАБІРОВА, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Цэнтр калгаса імя С.М.Кірава. Вядома з XVIII ст. У 1790 г. 8 двароў, належала Быкоўскім. З 1793 г., паводле 2-га падзелу Рэчы Паспалітай, у складзе Расійскай імперыі. У 1847 г. 32 двары, 230 жыхароў, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць Б.Беліновіча. У 1897 г. сяло, 68 двароў, 427 жыхароў, меліся хлебазапасны магазін, заезны двор, царква. У 1907 г. адкрыта земская школа. У 1909 г. 84 двары, 468 жыхароў, аднайменны засценак налічваў 21 двор, 153 жыхары, у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 108 двароў, 711 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 57 вучняў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шлях да сацыялізму», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 29 гаспадарак.

У вёсцы размешчаны вытворчыя брыгады, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, збожжасклад і зернесушыльная ўстаноўка, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчага інвентару, установка па прыгатаванні вітамінай мукі, установка па перапрацоўцы кармоў для жывёлы. Ёсць аддзяленне ашчаднага банка, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, 8-гадовая школа, бібліятэка з фондам больш за 7,9 тыс. кніг, хлебапякарня, кафэ, два магазіны, спартыўная пляцоўка, аддзяленне сувязі. У 1996 г. 245 двароў, 524 жыхары.

БАБРОВІЧЫ, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома з 1568 г. як сяло ў Навагрудскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1845 г. 14 двароў, 108 жыхароў, у складзе маёнтка Халопенічы Бабруйскага павета, уласнасць Лапаў. Пасля рэформы 1861 г. сюды перасяліліся 12 сялянскіх сем'яў. У 1897 г. 37 двароў, 289 жыхароў, у складзе Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 65 двароў, 433 жыхары. 1.10.1924 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 78 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. У 1926 г. 81 двор, 423 жыхары. У 1931 г. 13 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны востраў». Летам 1931 г. у выніку пажару згарэла 50 двароў. У хуткім часе вёска была адбудавана. У 1940 г. калгас меў 200 кароў, 150 авечак, 100 коней, 4 малатарні, былі пабудаваны калгасны двор і клуб. У 1996 г. 93 двары, 152 жыхары, у складзе калгаса «Зара».

БАЙЛЮКІ, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1692 г. прысёлак, 10 дымоў, у Дакольскім войтаўстве Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1727 г. вёска Баўлухі, 8 двароў, 4 жыхары мужчынскага полу, у складзе маёнтка Глуск, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 14 двароў, 80 жыхароў, у скла-

дзе маёнтка Машніцы Бабруйскага павета, уласнасць А.Быкоўскага. У 1897 г. 24 двары, 136 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны выселак, 1 двор, 5 жыхароў. У 1907 г. 24 двары, 158 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 205 жыхароў (з іх 15 яўрэяў). У 1926 г. 31 двор, 198 жыхароў. У 1931 г. 20 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны партызан». У 1942 г. гітлераўцы загубілі 27 жыхароў. У 1996 г. 26 двароў, 57 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

БАЛАШЭВІЧЫ, вёска ў Кіраўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Вільча». Вядома ў 1560 г. як сяло ў Глускай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1571 г. 10 жыхароў мужчынскага полу. У 1581 г. у складзе маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. У 1692 г. сяло, 62 дымы, шляхецкая ўласнасць. У 1708 г. цэнтр войтаўства ў Глускім графстве. У 1724 г. 33 двары, 40 валок зямлі, уласнасць князя Радзівіла. У 1758 г. 55 двароў, 35 валок зямлі, здадзена ў арэнду Станіславу Вейняловічу. У 1765 г. 67 двароў, 39 валок зямлі. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У пачатку XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Глуск Бабруйскага павета. Прыватнае ўладанне графа І.Юдыцкага, у другой чвэрці XIX ст. — І.Бжастоўскага, В.Грынеўскага, І.Свіда. У 1844 г. 52 двары, 226 жыхароў, у складзе маёнтка Зарэчча, уласнасць пана Наразіўша. У 1897 г. 128 двароў, 712 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1907 г. 135 двароў, 766 жыхароў. У 1917 г. 148 двароў, 860 жыхароў (з іх 9 яўрэяў). У студзені 1918 г. у час акупацыі вёскі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага быў сфарміраваны партызанскі атрад, у які ўвайшло 250 жыхароў. У 1923 г. адкрыта школа (у 1925 г. — 81 вучань). У 1926 г. 170 двароў, 881 жыхар. У 1932 г. сяляне вёсак Балашэвічы і Зарэчча аб'ядналіся ў калгас «15 гадоў Кастрычніка», які ў 1936 г. меў 1564 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку 786 га ворнай зямлі. Саўгас «Вільча» створаны ў 1969 г.

У вёсцы размешчаны вытворчая брыгада, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, устаноўка па перапрацоўцы кармоў, збожжасклад, ёсць Дом культуры, 8-гадовая школа, аддзяленне сувязі, аддзяленне ашчаднага банка, магазін, сталовая, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка з фондам 6,1 тыс. кніг, аўтаматычная тэлефонная станцыя. У 1996 г. 219 двароў, 470 жыхароў.

БАРАВІШЧА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з 1616 г. як сяло ў складзе маёнтка Дубровіцкі Глускай воласці Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1897 г. 26 двароў, 70 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў хутар Баравішча (ён жа Курган), 2 двары, 11 жыхароў. У 1907 г. 5 двароў, 29 жыхароў. У 1917 г. 14 двароў, 95 жыхароў (з іх 20 палякаў). У 1926 г. хутары, 45 двароў, 267 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 22, у 1936 г. 59 гаспадарак. У 1996 г. 7 двароў, 12 жыхароў, у складзе калгаса «Расія».

БАРАЦІНА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. У 1917 г. 52 двары, 261 жыхар (з іх 2 яўрэі), у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 46 двароў, 259 жыхароў. У 1935 г. арганізаваны калгас імя Дзімітрова, які ў 1937 г. аб'ядноўваў 40 гаспадарак. У 1996 г. 9 двароў, 11 жыхароў, у складзе калгаса «Дружба».

БАРБАРОВА (раней г. Пад'елле), вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як маёнтак Бабруйскага павета. У 1870 г. маёнтак належаў М.Гатоўскаму. У 1909 г. 33 жыхары, у складзе Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1912 г. адкрыта земская школа, для якой вяскоўцы купілі будынак. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. быў 91 вучань. У 1925 г. дзейнічалі харавы і драматычны гурткі. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня. У 1931 г. арганізаваны калгас «3-і рашаючы», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 77, а ў 1936 г. 116 гаспадарак. У 1942—1943 гг. гітлераўцы загубілі 77 жыхароў. У 1996 г. 84 двары, 159 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

Каля вёскі, на поўдні, у вадазборы р. Даколька знаходзіцца радовішча торфу плошчай каля 100 га.

Радзіма беларускага пісьменніка А.Н.Марціновіча, Героя Сацыялістычнай Працы Н.К.Рудніцкай.

БАРЫСАЎШЧЫНА, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з 1597 г. як сяло

Барысавічы ў Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць, 6 гаспадарак. У 1626 г. у складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі Глускай воласці Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства. У 1790 г. 36 двароў, уваходзіла ў Рэчыцкі павет Мінскага ваяводства ВКЛ, цэнтр маёнтка, уласнасць пана Воўк-Ланеўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета. У 1847 г. 15 двароў, 115 жыхароў. Мелася каталіцкая капліца. У 1897 г. 34 двары, 256 жыхароў, побач быў аднайменны маёнтак, 7 двароў, 71 жыхар, меўся вадзяны млын. У 1907 г. у сяле 57 двароў, 282 жыхары, у маёнтку 55 жыхароў. У 1917 г. у сяле 73 двары, 406 жыхароў (з іх 2 палякі), у маёнтку 67 жыхароў. У 1921 г. дзейнічаў вадзяны млын.

У 1926 г. у вёсцы 83 двары, 405 жыхароў, у былым маёнтку 10 двароў, 74 жыхары. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа, арганізаваны калгас «Чырвоная ніва», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 30 гаспадарак, а ў 1940 г. меў 934 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у т.л. 315 га ворнай зямлі. Гітлераўцы загубілі 5 жыхароў. У 1996 г. 88 двароў, 141 жыхар. У складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

За 2 км на поўдзень ад вёскі, на левым беразе р. Камарынка (прыток р. Пціч), захаваўся бескурганны могільнік бронзавага веку.

БАЯНАВА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1790 г. 11 двароў, прыватная ўласнасць. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У XIX ст. належала Быкоўскім, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета. У 1897 г. 32 двары, 183 жыхары. Побач быў аднайменны маёнтак, 2 двары, 15 жыхароў, вадзяны млын, заезны двор. У 1916 г. адкрыта аднакласная школа, у вёсцы ў гэты час было 35 двароў, 206 жыхароў, у маёнтку 22 жыхары. У 1917 г. у вёсцы 38 двароў, 224 жыхары, у маёнтку 16 жыхароў.

У 1922 г. адкрыта школа, для якой быў выдзелены нацыяналізаваны памешчыцкі будынак. У 1924 г. створана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г. вёска, 51 двор, 262 жыхары, і пасёлак, 4 двары, 27 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны маяк», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 52 гаспадаркі, а ў 1937 г. меў 1118 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 84 гаспадаркі.

У 1942 – 1943 гг. гітлераўцы загубілі 35 жыхароў. Каля вёскі партызаны ў 1942 г. падарвалі мост цераз раку. У 1996 г. 58 двароў, 100 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

БЕРВЫ, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1621 г. вёска, 21 двор, дзяржаўная ўласнасць, у Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. У 1790 г. 13 двароў, мелася карчма. У 1897 г. 10 двароў, 65 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. тут быў хутар, 2 двары, 11 жыхароў. У 1908 г. 15 двароў, 86 жыхароў. У 1917 г. 19 двароў, 121 жыхар (з іх 13 палякаў).

У 1926 г. 23 двары, 123 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «1 Жніўня», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 19 гаспадарак, а ў 1935 г. меў 226 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 31 гаспадарку. У 1940 г. 30 двароў, 159 жыхароў. У кастрычніку 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 3 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. У 1996 г. 12 двароў, 15 жыхароў, у складзе саўгаса «Вільча».

БЛІЗНІЦЫ, вёска да 1948 г. (зараз не існуе) у Клятнянскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст., калі тут быў засценак, 7 двароў, 54 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 12 двароў, 63 жыхары (з іх 60 палякаў).

БРАДЫ, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1847 г. вёска Чорныя Броды, 9 двароў, 81 жыхар, у складзе казённага маёнтка Брожа. У 1897 г. хутар Брады (ён жа Турын), 2 двары, 13 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 1 двор, 7 жыхароў. У 1926 г. вёска, 19 двароў, 102 жыхары. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1996 г. 12 двароў, 19 жыхароў, у складзе калгаса «Дружба».

БЯРОЗАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя М.І.Калініна. Вядома з XIX ст. У 1838 г. вёска, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, 49 рэвізскіх душ, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 20 двароў, 146 жыхароў, у складзе маёнтка Бярозаўка Бабруйскага павета, належала В.Лянкевічу.

У 1877 г. у маёнтку дзейнічаў вінакурны завод (у 1890 г. 8 рабочых). У 1887 г. 32 двары, 226 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У маёнтку Бярозаўка (ён жа

Толін) 8 двароў, 79 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 32 двары, 242 жыхары, у маёнтку 55 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 44 двары, 294 жыхары, у маёнтку 91 жыхар; адкрыта школа.

У 1919 г. у баі супраць польскіх інтэрвентаў у наваколлі загінулі 14 партызан, якія пахаваны ў брацкай магіле за 2 км на ўсход ад вёскі.

20.7.1920 г. у былым панскім маёнтку быў створаны саўгас, які меў 147 га зямлі. Дзейнічаў вадзяны млын. 8.5.1925 г. арганізавана сельскагаспадарчая арцель «Серп». У 1926 г. 55 двароў, 317 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Бальшавіцкая перамога», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 62, а ў 1935 г. 117 гаспадарак, меў 935 га сельгасугоддзяў, з іх 545 га ворнай зямлі. У 1934 г. пабудаваны магазін, у 1936 г. узведзены новы будынак для школы. У 1937 г. адкрыты ветэрынарны пункт. У ліпені 1943 г. партызаны разгромілі варожы гарнізон, які знаходзіўся ў вёсцы.

У Бярозаўцы размешчаны паляводчая брыгада, ферма буйной рагатай жывёлы, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, установка па вырабе вітамінаў мукі, піларама, кузня, вытворчыя склады з зернесушыльнай установкай, ёсць фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, бібліятэка з фондам больш за 11 тысяч кніг, сярэдняя школа, аўтаматычная тэлефонная станцыя. У 1996 г. 138 двароў, 352 жыхары.

Радзіма аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай і Палескай абласцей у Вялікую Айчынную вайну, камісара 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі М.Б.Храпко.

БЯРЭЖКІ, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Бярэжкі (яна ж Горкі), 4 двары, 82 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. засценак, 10 двароў, 82 жыхары. У 1917 г. 14 двароў, 78 жыхароў (з іх 6 палякаў). У 1930-я гады сяляне ўступілі ў калгас. У 1996 г. 14 двароў, 25 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

ВАЙЦЯХОВА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1677 г. вёска аддадзена кляштару і касцёлу бернардзінцаў у Глуску. У 1790 г. 25 двароў, належала графу Юдыцкаму. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета. У 1897 г. 4 двары, 28 жыхароў. У 1907 г. 26 двароў, 136 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 29 двароў, 167 жыхароў (з іх 10 палякаў). У 1926 г. 36 двароў, 185 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны працаўнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 20 гаспадарак. У 1942 г. гітлераўцы загубілі 3 жыхароў. У 1996 г. 47 двароў, 78 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

ВЕСНАВА (да 1964 г. Добчыцы), вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1727 г. вёска Весна, 12 двароў, 13 жыхароў мужчынскага полу, памешчыцкае ўладанне. У 1874 г. заснаваны вінакурны завод, на якім у 1884 г. устаноўлена паравая машына. У 1879 г. у маёнтку Веснава былі ўжо 2 вінакурныя заводы (15 рабочых). У 1897 г. вёска Весна, 16 двароў, 121 жыхар, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў маёнтак, 4 двары, 25 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 18 двароў, 108 жыхароў, у маёнтку 35 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 20 двароў, 145 жыхароў. Дзейнічаў вінзавод.

13.1.1921 г. на былых памешчыцкіх землях створаны саўгас. У 1930 г. саўгас меў 515 га зямлі, ён уваходзіў у Мінскі свінагадоўчы трэст. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Зорка», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 29, а ў 1936 г. 52 гаспадаркі. У 1939 г. у саўгасе былі адкрыты дзіцячыя яслі.

У 1996 г. 80 двароў, 300 жыхароў, у складзе калгаса «Дружба». Радзіма аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну У.М.Тараховіча.

ВІЛЬЧА, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Вядома з сярэдзіны XVI ст., вёска Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватная ўласнасць. У 1583 г. вядома як сяло Волча ў Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1597 г. налічвала 41 гаспадарку. У 1790 г. цэнтр маёнтка, 34 двары, уласнасць Вольскага.

З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета. У час вайны 1812 г. атрад рускіх на чале з маёрам Герсанам 15 верасня каля вёскі разбіў калону французскіх войскаў. У 1847 г. 29 двароў, 167 жыхароў, належала А.Ратынскаму. У 1874 г. адкрыта школа (з 1903 г. земская), пабудавана для яе памяшканне.

У 1886 г. сяло, 25 двароў, 210 жыхароў, мелася царква. У 1897 г. 56 двароў, 404 жыхары, дзейнічаў хлебазапасны магазін. У маёнтку 8 двароў, 64 жыхары, меўся вінакурны завод (заснаваны ў 1885 г., 6 рабочых, паравая машына), ветраны млын, заезны двор. У 1907 г. у сяле 67 двароў, 446 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 18 жыхароў. У 1917 г. у сяле 84 двары, 433 жыхары (з іх 18 палякаў), у маёнтку 1 двор, 5 жыхароў, у засценку 5 двароў, 26 жыхароў.

У час польскай акупацыі каля вёскі ішлі баі партызан 2-га партызанскага атрада супраць палякаў. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 76 вучняў, меліся харавы і драматычны гурткі, дзейнічала бібліятэка.

5.3.1923 г. створана кааператыўнае таварыства «Пралетарый». У 1926 г. вёска, 110 двароў, 478 жыхароў, і хутар, 17 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Перамога», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 42 гаспадаркі, а ў 1934 г. меў 1500 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 92 гаспадаркі.

У 1942 г. гітлераўцы расстралялі 6 жыхароў вёскі. У 1996 г. 67 двароў, 107 жыхароў, у складзе саўгаса «Вільча».

ВОЛЬНІЦА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з 1516 г. як сяло Вольніца ў Глускай воласці, уласнасць царквы. У 1602 г. 26 дымоў, у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы Глускай воласці Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства. Меўся млын. У 1692 г. 17 дымоў. У 1784 г. 19 двароў, у складзе маёнтка Палажэвічы Глускага графства, у Навагрудскім павеце Навагрудскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1838 г. 49 рэвізскіх душ, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1844 г. пабудавана царква. У 1865 г. і 1890 г. сяляне праводзілі самавольныя парубкі памешчыцкага лесу. У 1885 г. 17 двароў, 126 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1897 г. 33 двары, 201 жыхар, хлебазапасны магазін. У 1905 г. адкрыта земская школа, для якой у 1912 г. пабудавана памяшканне. У 1907 г. 36 двароў, 218 жыхароў. У 1917 г. у сяле 48 двароў, 294 жыхары, у маёнтку, што знаходзіўся побач, 1 двор, 15 жыхароў. У 1917 г. быў выбраны аб'яднаны сельскі камітэт вёсак Вольніца і Міжлессе. Вясковы сход сумесна з сельскім камітэтам накіраваў у 1918 г. у газету «Савецкая праўда» пісьмо, у якім абвяшчаў аб сваёй падтрымцы савецкай улады і непрызнанні так званай Беларускай Рады. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. было 34 вучні, дзейнічалі бібліятэка і драматычны гурток. У 1930 г. арганізаваны калгас «Пралетарый», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 59 гаспадарак. У 1996 г. 66 двароў, 164 жыхары, у складзе калгаса «Расія».

ГАРАДЗІШЧА, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з 1626 г. як сяло ў складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі Глускай воласці Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1846 г. вёска, 12 двароў, у складзе маёнтка Дварэц Бабруйскага павета.

У 1847 г. налічвала 12 двароў, 93 жыхары, у складзе маёнтка Глуша Бабруйскага павета, уласнасць Марка Грыцэнкі. У 1886 г. сяло, 11 двароў, 109 жыхароў, мелася царква.

У 1897 г. 2 вёскі — у адной 29 двароў, 179 жыхароў, царква, у другой — 2 двары, 12 жыхароў. У 1907 г. 40 двароў, 245 жыхароў. У 1917 г. 48 двароў, 281 жыхар, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 54 двары, 272 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоная ніва», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 44 гаспадаркі, а ў 1940 г. меў 260 га сельскагаспадарчых угоддзяў. У 1996 г. 23 двары, 26 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Царковішча, на левым беразе р. Пціч захавалася селішча ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі.

ГАРАДЗІШЧА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядомы з XIX ст. У пачатку XX ст. тут быў засценак, 4 двары, 29 жыхароў. У 1917 г. фальварак, 1 двор, 63 жыхары, побач аднайменны хутар, 7 двароў, 38 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 8 двароў, 47 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 7 двароў, 9 жыхароў, у складзе калгаса «Праўда».

ГАРАДОК, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. У 1814 г. тут пабудавана з дрэва царква, якая зараз з'яўляецца помнікам народнага драўлянага дойлідства з выкарыстаннем стылізаваных элементаў класіцызму. У

1846 г. мястэчка, у складзе маёнтка (станы Глуск, Глуск Пагарэлы) Дварэц Бабруйскага павета, уласнасць Л.Быкоўскага, 30 двароў. Гэтаму ж памешчыку належала і аднайменнае сяло, у якім у 1847 г. было 24 двары, 148 жыхароў. У 1861 г. у мястэчку 314 жыхароў. У 1886 г. сяло, 27 двароў, 81 жыхар, меліся школа, 2 крамы, яўрэйская малітоўная школа, пабудавана з дрэва другая царква. У мястэчку ў 1897 г. 48 двароў, 324 жыхары, вадзяны млын, заезны двор, 3 лаўкі, у сяле 52 двары, 337 жыхароў, хлебазапасны магазін, лаўка, царква. Побач быў маёнтак, 1 двор, 6 жыхароў. У 1909 г. 75 двароў, 578 жыхароў, цэнтр воласці Бабруйскага павета. У 1911 г. у сяле 99 двароў, 466 жыхароў (з іх 2 рускія, 6 палякаў, 36 яўрэяў), у мястэчку 66 двароў, 473 жыхары (з іх 463 яўрэі) і ў маёнтку 1 двор, 4 жыхары.

У студзені 1918 г., калі вёска была акупіравана легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага, тут быў сфарміраваны партызанскі атрад, у які ўвайшло каля 70 вяскоўцаў. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня, у 1923 г. — бальніца.

У 1926 г. сяло, 75 двароў, 459 жыхароў, і мястэчка, 66 двароў, 456 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камуніст», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 66 гаспадарак, у 1936 г. меў 337 га сельскагаспадарчых угоддзяў. Дзейнічаў паравы млын. У 1942—1943 гг. гітлераўцы загубілі 89 жыхароў. У 1996 г. 66 двароў, 113 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

Каля заходняй і паўднёвай ускраін размешчана радовішча пяску (перспектыўныя запасы 771 тыс. м^3).

Радзіма беларускага вучонага ў галіне меліярацыі доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР В.М.Зубца.

ГОРНАЕ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. фальварак пры Маскоўска-Варшаўскай шашы, 2 двары, 33 жыхары, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 27 жыхароў. У 1917 г. было некалькі хутароў, у адным 15 двароў, 35 жыхароў, у другім 21 двор, 59 жыхароў.

У 1926 г. хутары: Горнае, 1 двор, 5 жыхароў, Горнае-1, 7 двароў, 54 жыхары, Горнае-2, 12 двароў, 85 жыхароў. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пуцілавец», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 18 гаспадарак. У 1996 г. 35 двароў, 52 жыхары, у складзе калгаса імя С.М.Кірава.

ДАКОЛЬ, вёска ў Клятнянскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Гвардыя». Вядома з 1558 г. як сяло Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У 1579 г. уласнасць царквы. У 1692 г. 42 дымы, цэнтр войтаўства, шляхецкая ўласнасць.

У 1724 г. 30 двароў, 24 валокі зямлі, цэнтр войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, уласнасць князя Радзівіла. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1847 г. 49 двароў, 240 жыхароў, у складзе маёнтка Веснава Бабруйскага павета Мінскай губерні. Належала Э.Быкоўскаму. У 1886 г. сяло, 45 двароў, 314 жыхароў, мелася царква.

Летам 1891 г. сяляне аказалі супраціўленне ўладам пры размежаванні іх зямель. У 1897 г. 85 двароў, 502 жыхары, хлебазапасны магазін. Побач быў аднайменны выселак, 2 двары, 6 жыхароў. У 1905 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), для якой у 1910 г. пабудавана памяшканне. У 1907 г. 95 двароў, 525 жыхароў. У 1919 г. 119 двароў, 756 жыхароў (з іх 36 яўрэяў).

На базе дарэвалюцыйнай школы створана пачатковая школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 67 вучняў. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня, у 1923 г. — фельчарскі пункт. У 1926 г. 161 двор, 792 жыхары. У 1928 г. 23 гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны араты», які ў 1940 г. меў 745 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку 360 га ворнай зямлі, аб'ядноўваў 127 гаспадарак. У 1936 г. узведзены новы будынак для школы. У 1937 г. пабудаваны магазін. У 1942—1943 гг. гітлераўцы загубілі 58 жыхароў.

У вёсцы размешчаны вытворчыя брыгады, ферма буйной рагатай жывёлы, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, устаноўка па перапрацоўцы кармоў, піларама, склады і зернесушыльная ўстаноўка, лясніцтва, ёсць магазін, сталовая, аддзяленне сувязі, Дом культуры, дзіцячы сад-яслі, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, бібліятэка з фондам больш за 6,6 тыс. кніг, аўтаматычная тэлефонная станцыя. У 1996 г. 147 двароў, 395 жыхароў.

Радзіма Героя Савецкага Саюза С.А.Калінкоўскага, механіка-вадзіцеля

танка, які вызначыўся ў 1945 г. пры вызваленні Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ДАСЦІЖЭННЕ, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Узнікла ў 1920-я гады. У 1933 г. арганізаваны калгас «Чырвонае дасягненне», які ў 1935 г. аб'ядноўваў 24 гаспадаркі, меў 135 га сельскагаспадарчых угоддзяў, абслугоўваўся Глускай МТС. У 1996 г. 42 двары, 82 жыхары, у складзе калгаса «Праўда».

ДЗЯРЖЫНСКІ, пасёлак у Каткаўскім сельсавеце. Узнік у 1920-я гады ў выніку перасялення сялян з хутароў на былыя памешчыцкія землі. Для пасёлка ў 1926 г. быў выдзелены вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі.

У 1931 г. арганізаваны калгас імя Ф.Э.Дзяржынскага, які ў 1933 г. аб'ядноўваў 29 гаспадарак, меў 350 га сельскагаспадарчых угоддзяў. У 1996 г. 20 двароў, 36 жыхароў, у складзе калгаса «Зара».

ДВАРЭЦ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з 1560 г. як сяло ў Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1926 г. у складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі. У канцы XVIII ст. цэнтр маёнтка, прыватная ўласнасць Быкоўскіх. У 1847 г. вёска, 9 двароў, 51 жыхар, цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыка, мелася каталіцкая капліца.

У 1860 г. цэнтр аднайменнага маёнтка ў Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1907 г. 60 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 1 двор, 76 жыхароў (з іх 28 палякаў). Побач быў аднайменны хутар, 3 двары, 23 жыхары.

У 1922 г. у былым панскім маёнтку створаны саўгас «Праца», які ў 1926 г. меў 251 га зямлі. У 1926 г. хутары, 4 двары, 31 жыхар. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Дварэц». У 1996 г. 49 двароў, 100 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

Радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза палкоўніка С.Ф.Шутава. У Вялікую Айчынную вайну танкавая брыгада пад яго камандаваннем вызначылася ў 1943 г. у баях пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Кіева.

ДОЎГІ ЛЕС, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 11 двароў, 16 жыхароў, у складзе калгаса «Звязда».

ДУБРОВА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Расія». Вядома з 1579 г. як сяло ў Глускай воласці Навагрудскага павета, уласнасць царквы. У 1602 г. 23 дымы, у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы, шляхецкая ўласнасць. У 1792 г. 30 дымоў. У 1784 г. у складзе маёнтка Палажэвічы, у Глускім графстве Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1847 г. 8 двароў, 25 жыхароў, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета Мінскай губерні, прыватная ўласнасць К.Маслоўскага. У 1870 г. вёска налічвала 93 жыхары мужчынскага полу.

У 1897 г. 55 двароў, 322 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меліся хлебазапасны магазін і двор. Побач быў аднайменны фальварак, заезны двор. У 1907 г. у вёсцы 50 двароў, 370 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 79 двароў, 494 жыхары, у фальварку 7 двароў, 67 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета.

1.4.1919 г. адкрыта школа, якой быў перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1925 г. у школе было 50 вучняў, дзейнічалі драматычны і харавы гурткі. У 1926 г. вёска, 108 двароў, 592 жыхары, і засценак, 8 двароў, 53 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Дуброва», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 89, а ў 1937 г. 116 гаспадарак.

У вёсцы размешчаны фермы буйной рагатай жывёлы і птушкагадоўчая, майстэрня па рамонце сельгастэхнікі, установка па перапрацоўцы кармоў, збожжасклад з сушыльнай установкай, піларама, ёсць паштовае аддзяленне, аддзяленне ашчаднага банка, прамтаварны і харчовы магазіны, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, бібліятэка з фондам больш за 8,9 тыс. кніг, 8-гадовая школа, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сталовая. У 1996 г. 158 двароў, 365 жыхароў.

ЖАЛВІНЕЦ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з 1597 г. як сяло, 12 гаспадарак, у Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць.

У XIX ст. вёска ўваходзіла ў склад маёнтка Барысаўшчына Бабруйскага павета, уласнасць Воўк-Ланеўскіх. У 1870 г. 86 жыхароў мужчынскага полу.

У 1877 г. сяляне аказалі супраціўленне ўладам пры правядзенні адмежаван-

ня іх зямель — каморнік не быў дапушчаны да землямерных работ. У 1897 г. 70 двароў, 487 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін, 2 разы на год праводзіліся кірмашы. У 1907 г. 107 двароў, 743 жыхары. У 1908 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), для якой у 1913 г. узведзены будынак. У 1917 г. 138 двароў, 701 жыхар. У студзені 1919 г. у час акупацыі вёскі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага быў сфарміраваны партызанскі атрад (каля 70 чалавек).

На базе дарэвалюцыйнай школы створана пачатковая школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 92 вучні. У 1926 г. 150 двароў, 696 жыхароў, адкрыта хата-чытальня. У 1931 г. арганізаваны калгас імя В.М.Молатава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 101 гаспадарку, меў вадзяны млын.

У час Вялікай Айчыннай вайны гітлераўцы закатавалі 18 жыхароў. У 1996 г. 64 двары, 87 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск». На правым беразе р. Пціч, ва ўрочышчы Селішча, захавалася селішча позняга этапу зарубінецкай культуры. Да таго ж часу адносіцца і селішча, што за 0,3—0,4 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Старыя клады, на левым беразе р. Пціч.

ЖУКАВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1677 г. сяло ў валоданні касцёла бернардзінцаў у Глуску. У 1692 г. 13 дымоў, у складзе маёнтка Глуск Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць.

У 1724 г. 10 двароў, 2 валокі зямлі, вёска Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла. У 1727 г. 11 двароў, 7 жыхароў мужчынскага полу, уладанне памешчыка. У 1756 г. 16 двароў. У 1758 г. 12 двароў, знаходзілася ў арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. у Бабруйскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета. У 1798 г. 11 двароў, 62 жыхары. У 1838 г. 6 двароў, 42 жыхары, належала Адаму Шаевічу, 1 двор, 6 жыхароў — В.Грынеўскаму. У 1897 г. 22 двары, 163 жыхары, у 1907 г. 20 двароў, 205 жыхароў, у 1917 г. 25 двароў, 129 жыхароў, у Рудабельскай воласці. У 1926 г. 29 двароў, 169 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя М.І.Калініна, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 33 гаспадаркі, а ў 1935 г. меў 717 га сельгасугоддзяў, аб'ядноўваў 42 гаспадаркі. У 1996 г. 18 двароў, 37 жыхароў, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

ЗАВАЛОЧЫЦЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Завалочыцы». Вядома з 1626 г. як сяло ў складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У XVIII ст. цэнтр маёнтка, прыватная ўласнасць. У 1790 г. маёнтак налічваў 70 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У XIX ст. маёнтак належаў Быкоўскім. Мелася каталіцкая царква.

У 1838 г. 15 жыхароў мужчынскага полу. У 1860 г. цэнтр аднайменнага маёнтка Бабруйскага павета Мінскай губерні, уласнасць памешчыка. У 1888 г. у маёнтку заснаваны вінакурны завод, дзе ў 1890 г. працавала 10 рабочых, мелася паравая машына. У 1897 г. 21 двор, 277 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. Меўся заезны двор. У 1917 г. 230 жыхароў (з іх 104 палякі).

У 1922 г. у былым маёнтку Завалочыцы створаны першы ў раёне саўгас (38 рабочых). Гаспадарка мела 662 га зямлі, 30 плугоў, 1 трактар, 18 коней, 15 валоў, 69 кароў. У 1930 г. зямельная плошча саўгаса ўжо складала 1189 га. У адным будынку з канторай саўгаса размяшчалася і школа, якая была адкрыта ў 1924 г. З 1927 г. у вёсцы дзейнічала метэаралагічная станцыя. У 1928 г. пабудавана невялікая гідраэлектрастанцыя. Дзейнічалі млын, лесапільня. У 1931 г. пабудавана майстэрня па рамонце трактароў і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Саўгас уваходзіў у Мінскі малочнапрамысловы трэст. У 1933 г. за ім было замацавана 3208 га зямлі. У 1933 г. адкрыты дзіцячыя яслі. У 1944 г. пачаў дзейнічаць саўгасны маслазавод.

У Завалочыцах размешчаны комплекс буйной рагатай жывёлы, спіртзавод, машынны двор, піларама, установка па перапрацоўцы кармоў для жывёлы, збожжасклад, ёсць аддзяленне сувязі, аддзяленне ашчаднага банка, Дом культуры, магазіны, сярэдняя школа, дзіцячы сад, бібліятэка з фондам больш за 8,6 тыс. кніг, амбулаторыя, аўтаматычная тэлефонная станцыя, спартыўная пляцоўка. На грамадскіх пачатках дзейнічае музей баявой і працоўнай славы. У 1996 г. 296 двароў, 695 жыхароў.

ЗАЕЛІЦА, вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Заеліца (яна ж Стражы), 46 двароў, 284 жыхары, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны заезны двор, 1 двор, 6 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 224 жыхары.

У 1926 г. 87 двароў, 429 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. 5.2.1944 г. гітлераўцы зажыва спалілі 92 жыхароў в. Заеліца і 58 жыхароў у суседніх вёсках (пахаваны ў магіле ў цэнтры вёскі). У 1996 г. 384 двары, 938 жыхароў, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

ЗАЛЕССЕ, былая вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з 1626 г. як сяло ў складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі, шляхецкая ўласнасць. У 1798 г. 20 двароў, 115 жыхароў, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1917 г. хутар, 1 двор, 8 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1921 г. 5 двароў, 30 жыхароў, у 1926 г. 10 двароў, 51 жыхар. Уваходзіла ў склад калгаса «Зара камуны».

ЗАМАСТОЧЧА, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. Узнікла ў выніку перасялення сюды 4 прыгонных сялян з вёскі Касарычы. Спачатку мела назву Новыя Касарычы. Вёска маёнтка Касарычы Бабруйскага павета, уласнасць барона Урангеля. У 1847 г. 15 двароў, 192 жыхары. У 1897 г. вёска Замасточча (яна ж Новае Сяло) пры тракце Бабруйск—Мазыр, 33 двары, 284 жыхары, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 71 двор, 423 жыхары. У 1920 г. часткова спалена палякамі. У красавіку 1924 г. створана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г. 86 двароў, 517 жыхароў. Восенню 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвонае Замасточча», у які першапачаткова ўвайшло 9, у 1932 г. 12 гаспадарак. У 1936 г. калгас меў 2 жняркі, 2 конныя малатарні, 4 сарціроўкі, 2 конныя сеялкі і іншую сельскагаспадарчую тэхніку. За першыя 10 гадоў калгас узвёў шмат гаспадарчых і грамадскіх будынкаў, у тым ліку канюшню, кароўнік, цялятнік, навес, гумно, сушылку, кузню, грамадскую лазню, яслі. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа, для якой калгас таксама пабудаваў памяшканне.

Нямецка-фашысцкія захопнікі поўнасцю знішчылі гаспадарку калгаса. На франтах загінула 30 вяскоўцаў. У 1996 г. 44 двары, 72 жыхары, у складзе калгаса «Зара».

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з 1597 г. як сяло, 11 дымоў, у Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1602 г. у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы. У 1756 г. 76 двароў, 36 жыхароў мужчынскага полу. У 1846 г. 39 двароў, у складзе маёнтка Дварэц, уласнасць Л.Быкоўскага. У 1897 г. былі 2 вёскі — у адной 76 двароў, 494 жыхары, у другой — 1 двор, 5 жыхароў. У 1909 г. 96 двароў, 627 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 111 двароў, 628 жыхароў (з іх 4 палякі, 32 яўрэі). У 1926 г. 120 двароў, 648 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас імя К.Я.Варашылава, які ў 1936 г. меў 900 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 84 гаспадаркі. У 1996 г. 66 двароў, 91 жыхар, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1758 г. 26 двароў, у складзе маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла, у арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 20 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У пачатку XIX ст. вёска Бабруйскага павета, належала графу Юдыцкаму. У 1838 г. перайшла да С.Свіда. У 1845 г. цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 32 двары, 225 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў маёнтак Заполле (ён жа Востраў), 2 двары, 20 жыхароў, вадзяны млын. У 1917 г. 54 двары, 334 жыхары. У 1926 г. 70 двароў, 363 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «XVII партз'езд». У 1996 г. 73 двары, 135 жыхароў, у складзе калгаса «Праўда».

ЗАРА (раней Ключ), пасёлак у Клятнянскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст., калі тут быў хутар, 1 двор, 7 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 2 двары, 15 жыхароў (з іх 6 палякаў). У 1930-я гады пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 4 двары, 5 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

ЗАРАКУША, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома з 1597 г. як сяло, 13 дымоў, у Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1602 г. 19 дымоў, у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы. У 1847 г. 14 двароў, 109 жыхароў, вёска маёнтка Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні, уласнасць барона Урангеля. У 1897 г. 45 двароў, 271 жыхар, у Ляскавіц-

кай воласці Бабруйскага павета. У 1909 г. 41 двор, 288 жыхароў. У 1917 г. 66 двароў, 398 жыхароў (з іх 11 яўрэяў). У 1926 г. 61 двор, 314 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Новазаракуша», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 12 гаспадарак. У 1940 г. 89 двароў, 378 жыхароў. У сакавіку 1942 г. гітлераўцы спалілі 58 двароў, загубілі 29 жыхароў. У 1996 г. 53 двары, 85 жыхароў, у складзе калгаса «Зара».

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. 6 двароў, 20 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. у маёнтку быў 51 жыхар, на хутары Зарэчча-1 — 1 двор, 6 жыхароў, на хутары Зарэчча-2 — 2 двары, 14 жыхароў. У 1926 г. пасёлак, 9 двароў, 53 жыхары. У 1932 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «15 гадоў Кастрычніка». У 1936 г. пабудаваны крухмальны завод. У 1996 г. 25 двароў, 57 жыхароў, у складзе саўгаса «Вільча».

ЗАСЦЕНАК ДУБРОВА, пасёлак у Калаціцкім сельсавеце. Вядомы з XIX ст. У 1846 г. 1 двор, 4 жыхары, у складзе маёнтка Сямны Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1917 г. засценак, 8 двароў, 48 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1996 г. 7 двароў, 9 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

ЗАСЦЕНАК УСЦЯРХІ, вёска ў Казловіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Зара камуны». Вядома з пачатку XX ст. У 1917 г. засценак, 26 двароў, 281 жыхар (з іх 22 палякі, 11 яўрэяў), у Глускай воласці Бабруйскага павета.

У 1930 г. арганізаваны калгас «Зара камуны», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 43 гаспадаркі, а ў 1936 г. меў 800 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 97 гаспадарак.

У вёсцы размешчана ферма буйной рагатай жывёлы, ёсць магазіны, аддзяленне ашчаднага банка, аддзяленне сувязі, сталовая, 8-гадовая школа, спартыўная пляцоўка, бібліятэка з фондам больш за 9 тыс. кніг. У 1996 г. 94 двары, 284 жыхары.

ЗГОДА, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як маёнтак Бабруйскага павета. У 1870 г. маёнтак належаў Уладзіславу Герману. У 1897 г. уладальніцкая сядзіба, 3 двары, 41 жыхар, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1909 г. 19 жыхароў, у 1917 г. 1 двор, 39 жыхароў (з іх 13 палякаў), у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. хутар, 4 двары, 25 жыхароў. У 1930-я гады сяляне ўступілі ў калгас. У ліпені 1943 г. партызаны разгромілі варожы гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У 1996 г. 19 двароў, 33 жыхары, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

За 1 км на ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Пціч захавалася стаянка бронзавага веку.

ЗЕЛЯНКОВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з 1560 г. як вёска Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. 18 двароў, меўся млын. У 1639 г. 18 двароў, 50 валок зямлі, у трыманні Пятра Трызны. У 1671 г. 25 двароў. У 1776 г. пабудавана драўляная царква. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1798 г. 17 двароў, 118 жыхароў, непадалёку быў фальварак. У 1847 г. сяло, 25 двароў, 240 жыхароў, у складзе маёнтка Брожа Бабруйскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1885 г. 226 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У 1887 г. у сяле 72 двары, 430 жыхароў, на аднайменным хутары 4 двары, 38 жыхароў. У 1890 г. адкрыта школа граматы, ператвораная ў 1913 г. у царкоўнапрыходскую, а ў 1915 г. у земскую. У 1917 г. у сяле 128 двароў, 666 жыхароў (з іх 16 яўрэяў), на хутары 8 двароў, 55 жыхароў.

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені. У 1925 г. у школе было 55 вучняў, 4 дзесяціны зямлі. У 1926 г. вёска, 89 двароў, 648 жыхароў, і хутар, 6 двароў, 40 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «11 гадоў вызвалення БССР ад палякаў», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 25 гаспадарак, а ў 1938 г. меў 750 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 204 гаспадаркі. Першым старшынёй калгаса быў удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый Л.Ф.Малаковіч (загінуў у барацьбе супраць фашыстаў у 1943 г.). У 1937 г. пабудавана для школы новае памяшканне. У 1940 г. 189 двароў, 805 жыхароў. У ліпені 1941 г. Палескі абком КП(б)Б накіраваў у Глускі раён групу камуністаў на чале з М.Б.Храпко для арганізацыі партызанскіх атрадаў. З іх удзелам у зелян-

ковіцкіх лясах былі створаны і пачалі баявыя дзеянні атрады У.М.Шваякова, М.Б.Храпко, М.П.Сэзіка, якія са студзеня 1943 г. дзейнічалі ў складзе 37-й партызанскай брыгады імя А.Я.Пархоменкі. Летам 1942 г. партызаны разгромілі фашысцкі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У лістападзе 1942 г. гітлераўцы спалілі вёску (178 дамоў), загубілі 61 жыхара. Значны час вёска ахоўвалася партызанамі і жыла па савецкіх законах. Тут жа адбылася першая сесія суседняга Казловіцкага сельсавета, на якой вырашалі пытанні ўборкі хлеба, дапамогі сялянам і аб адкрыцці школы. Дзеці вяскоўцаў і партызан вучыліся ў 3 класах школы. Вясковец І.Л.Дудар перадаў школе 500 сшыткаў, шмат падручнікаў і школьных прылад. Выкладанне вялі 4 настаўнікі. Непадалёку ў лесе базіраваліся Бабруйскія падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, выдавалася газета «Бабруйскі партызан». У 1996 г. 114 двароў, 233 жыхары, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

За 0,3—0,5 км на ўсход ад вёскі ва ўрочышчы Мікуліна, каля балота, знаходзіцца селішча раннефеадальнага часу.

ЗОРКА, вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Вядома з пачатку 1920-х гадоў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 46 двароў, 72 жыхары, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

ЗУБАРЭВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з 1529 г. як сяло ў Бабруйскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1677 г. у валоданні касцёла бернардзінцаў. У 1844 г. 13 двароў, 97 жыхароў; цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць С.Кялчэўскага.

У 1897 г. 2 вёскі: Зубарэвічы-1 і Зубарэвічы-2, 59 двароў, 409 жыхароў, у Рудабельскай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. Меўся хлебазапасны магазін. Побач былі маёнткі Зубарэвічы-1, 2 двары, 15 жыхароў, вадзяны млын, сукнавальня, і Зубарэвічы-2, 1 двор, 6 жыхароў, сядзіба Зубарэвічы-2, 2 двары, 12 жыхароў, кузня. У 1910 г. адкрыта земская школа. У 1917 г. у вёсцы 133 двары, 781 жыхар (з іх 7 палякаў, 18 яўрэяў), у маёнтку 10 жыхароў, у Рудабельскай воласці Бабруйскага павета.

2.3.1922 г. створана сельскагаспадарчае кааператыўнае таварыства. У былым памешчыцкім будынку размясціліся фельчарскі пункт (створаны ў 1923 г., у 1933 г. ператвораны ва ўрачэбны ўчастак) і школа, у якой у 1925 г. быў 61 вучань. У 1926 г. 96 двароў, 770 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя В.М.Молатава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 70 гаспадарак, у 1940 г. меў 800 га сельгасугоддзяў, з іх 375 га ворнай зямлі.

У 1942—1943 гг. гітлераўцы спалілі вёску (100 двароў). У 1996 г. 90 двароў, 174 жыхары, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

Радзіма аднаго з арганізатараў Мінскага камуністычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну М.Ф.Малаковіч і ўдзельніка партызанскага руху ў Беларусі ў грамадзянскую вайну, дзяржаўнага дзеяча БССР П.Дз.Малаковіча.

ЗЯЛЁНКА, пасёлак у Бярозаўскім сельсавеце. Узнік у 1920-я гады. У 1917 г. хутар, 2 двары, 8 жыхароў (з іх 1 паляк). У 1930-я гады сяляне ўступілі ў калгас, зараз у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета. Вядома з 1560 г. як сяло Старыя Казловічы, у Бабруйскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1621 г. 27 двароў, у Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, дзяржаўная ўласнасць. У 1639 г. 2 сялы: Старыя Казловічы, 27 двароў, 58 жыхароў мужчынскага полу, 20 валок зямлі, і Новыя Казловічы, 27 двароў, 82 жыхары мужчынскага полу, 28 валок зямлі, знаходзіліся ў трыманні Пятра Трызны. У 1765 г. мелася карчма. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1847 г. 195 жыхароў, у складзе маёнтка Брожа Бабруйскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1858 г. Казловічы-1 мелі 17 зямельных участкаў, Казловічы-2 — 18 зямельных участкаў. У 1897 г. у Казловічах-1 (яны ж Старое Сяло) 47 двароў, 531 жыхар, у Казловічах-2 (калонія) 54 двары, 365 жыхароў, малітоўны дом. У 1908 г. у в. Казловічы-1 67 двароў, 422 жыхары, у в. Казловічы-2 69 двароў, 451 жыхар; у 1913 г. адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1917 г. у в. Казловічы-1 90 двароў, 527 жыхароў (з іх 6 яўрэяў), у в. Казловічы-2 71 двор, 455 жыхароў.

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. — 74 вучні). У 1926 г. у в. Казловічы-1 (Старое Сяло) 110 двароў, 567

жыхароў, у в. Казловічы-2 (яна ж Зайцы) 71 двор, 360 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «VI з'езд Саветаў», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 16 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 520 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 107 гаспадарак. У 1942—1943 гг. гітлераўцы расстралялі 54 жыхароў. Летам і восенню 1942 г. многія вяскоўцы пайшлі ў партызанскі атрад імя В.І.Чапаева, які быў сфарміраваны на базе ініцыятыўнай групы, вылучанай атрадам імя М.А.Шчорса. Да 8.1.1943 атрад дзейнічаў самастойна, а са студзеня 1943 г. у складзе 37-й партызанскай брыгады.

У Казловічах размешчана ферма па адкорме цялушак, ёсць аддзяленне сувязі, магазін. У 1996 г. 21 двор, 32 жыхары, у складзе калгаса «Зара камуны».

КАЛАЦІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і эксперыментальнай базы «Глуск».

Вядома з 1597 г., 37 дымоў, у Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1602 г. у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы, меліся 2 млыны. Потым вядома як мястэчка Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ. У 1758 г. 23 двары, у складзе маёнтка Глуск, уласнасць князя Радзівіла, у арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 24 двары. У 1790 г. цэнтр маёнтка, які налічваў 191 двор, уласнасць графа Юдыцкага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета. У 1797 г. в. Калацічы, 82 жыхары мужчынскага полу, у Бабруйскім павеце, уладанне Д.Радзівіла.

У 1838 г. 16 двароў, 73 жыхары, валодаў С. Свід. Потым належала Абуховічам. У 1897 г. 18 двароў, 117 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў фальварак, 22 двары, 135 жыхароў, заезны двор. У 1907 г. у вёсцы 23 двары, 140 жыхароў, у фальварку 13 двароў, 110 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 28 двароў, 150 жыхароў, у фальварку 26 двароў, 163 жыхары, на хутары 1 двор, 5 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У студзені 1918 г. у час акупацыі легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага ў вёсцы быў арганізаваны партызанскі атрад, у які ўвайшло каля 200 жыхароў.

У 1926 г. у вёсцы 74 двары, 337 жыхароў, у засценку 24 двары, 63 жыхары. Для школы, якая працавала ў вёсцы, было пабудавана памяшканне. У 1934 г. арганізаваны калгас імя І.В.Сталіна, які ў 1936 г. аб'ядноўваў 75 гаспадарак. Непадалёку ад вёскі дзейнічала Калаціцкая МТС. Саўгас «Глускі» (створаны ў 1963 г.) ператвораны ў эксперыментальную базу «Глуск» (1984).

У вёсцы размешчаны вытворчая брыгада, машынны двор, дрэваапрацоўчая майстэрня, ўстаноўка па перапрацоўцы кармоў, ферма буйной рагатай жывёлы, ёсць аддзяленне сувязі, Дом культуры, аддзяленне ашчаднага банка, сталовая, магазін, дзіцячы сад-яслі, бібліятэка з фондам больш за 7,7 тыс. кніг, пачатковая школа. У 1996 г. 268 двароў, 668 жыхароў.

Радзіма беларускага пісьменніка А.Р.Абуховіча.

КАЛЁСЫ, вёска да 1964 г. (зараз не існуе) у Завалочыцкім сельсавеце. Вядома ў пачатку XX ст., калі тут быў засценак, 11 двароў, 60 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 13 двароў, 68 жыхароў. 20.1.1943 г. фашысты спалілі вёску разам з жыхарамі. Пасля вайны не адрадзілася.

КАЛЮГА, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з 1626 г. як сяло ў складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі Глускай воласці Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1692 г. 16 дымоў, у Пагосцкім войтаўстве Навагрудскага павета. У 1708 г. сяло ў Глускім графстве. У 1727 г. 20 двароў, 15 жыхароў мужчынскага полу, у складзе маёнтка Глуск, уласнасць памешчыка. У 1758 г. 19 двароў, вёска ў складзе маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла, у арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 21 двор. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета Мінскай губерні. У 1838 г. 4 двары, 25 жыхароў належалі І.Умінскаму, 9 двароў, 49 жыхароў — Райкевічу, 3 двары, 22 жыхары — Казлоўскаму, 6 двароў, 29 жыхароў — І.Навамейскаму. У 1847 г. 3 вёскі: Калюга-1, 16 двароў, 98 жыхароў, Калюга-2, 5 двароў, 39 жыхароў, і Калюга-3, 8 двароў, 54 жыхары. У 1897 г. 52 двары, 364 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1907 г. у сяле 70 двароў, 399 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 25 жыхароў. У 1916 г. адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1917 г. у вёсцы 90 двароў, 503

жыхары (з іх 5 яўрэяў), у маёнтку 40 жыхароў.

У 1926 г. у вёсцы 94 двары, 380 жыхароў, у былым маёнтку 7 двароў, 42 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Камуніст», які ў 1937 г. аб'ядноўваў 150 гаспадарак. Меў 1370 га сельскагаспадарчых угоддзяў.

У 1992 г. у выніку пажару вёска згарэла. У хуткім часе адбудавана. У 1996 г. 48 двароў, 93 жыхары, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

КАРНІЦА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Карніца (яна ж Выгада), 20 двароў, 133 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У 1907 г. 23 двары, 149 жыхароў; у 1917 г. 30 двароў, 194 жыхары. У 1926 г. 36 двароў, 210 жыхароў. У 1934 г. арганізаваны калгас імя С.М.Кірава, які ў 1936 г. аб'ядноўваў 41 гаспадарку.

За 1 км на поўнач ад вёскі пахаваны савецкі воін, які загінуў у 1941 г. У 1996 г. 43 двары, 83 жыхары, у складзе калгас «Дружба».

КАРПАВІЧЫ, вёска ў Кіраўскім сельсавеце, вядома з XIX ст. У 1838 г. сяло, 51 рэвізская душа, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 13 двароў, 114 жыхароў, у складзе маёнтка Вільча Бабруйскага павета, уласнасць Р.Ратынскага. У 1897 г. 27 двароў, 196 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 37 двароў, 341 жыхар, у 1917 г. 56 двароў, 311 жыхароў. У 1926 г. 69 двароў, 698 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шлях сацыялізму», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 35 гаспадарак.

У 1996 г. 30 двароў, 52 жыхары, у складзе саўгаса «Вільча».

КАСАРЫЧЫ, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома з сярэдзіны XVI ст. як цэнтр маёнтка Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства ВКЛ, прыватная ўласнасць.

У 1639 г. сяло ў Глускай воласці. У 1660 г. шляхецкая ўласнасць. У 1692 г. 53 дымы ў Навагрудскім павеце, мелася царква. У 1712 г. пабудавана новая драўляная царква. У 1790 г. маёнтак налічваў 104 двары, належаў Вішчынскім. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі вёска Бабруйскага павета. У XIX ст. маёнткам валодаў барон Урангель. У 1862 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1891 г. у школе навучаліся 42 хлопчыкі і 6 дзяўчынак. У 1885 г. 25 двароў, 260 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1886 г. сяло, 25 двароў, 260 жыхароў. З 1894 г. пачало дзейнічаць мукамольнае прадпрыемства, якое ў наступным годзе было абсталявана паравой машынай. У 1897 г. 74 двары, 460 жыхароў, меліся хлебазапасны магазін, лаўка. Побач была царкоўная сядзіба, 3 двары, 30 жыхароў, заезны двор, 2 двары, 16 жыхароў, маёнтак, 3 двары, 42 жыхары, паравы млын. У 1907 г. у сяле 601 жыхар; у 1917 г. у сяле 82 двары, 517 жыхароў (з іх 3 яўрэі), у маёнтку 43 жыхары, у Ляскавіцкай воласці.

У 1923 г. адкрыты фельчарскі пункт. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, якой у 1922 г. выдзелена 3,5 дзесяціны зямлі, у 1924 г. перададзены былы царкоўны будынак, у 1925 г. было 115 вучняў.

29.12.1924 г. створана рыбалоўная арцель. У 1926 г. у вёсцы 108 двароў, 487 жыхароў, у фальварку 17 двароў, 62 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 36 гаспадарак, а ў 1937 г. — 153.

Летам 1942 г. партызаны атрадаў А.І.Патрына, М.Б.Храпко, Дз.Ц.Гуляева, Г.М.Сталярова разграмілі фашысцкі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У 1967 г. да вёскі далучаны пасёлкі Касарычы і Каткаўскі. У 1996 г. 63 двары, 121 жыхар, у складзе калгаса «Зара».

КАТКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Зара». Вядома з XIX ст. як вёска маёнтка Халопенічы Бабруйскага павета, уласнасць Лапаў. У 1870 г. было 84 жыхары мужчынскага полу. У 1897 г. сяло пры тракце Бабруйск — Мазыр, 64 двары, 460 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны фальварак, 1 двор, 9 жыхароў. У 1907 г. у сяле 66 двароў, 473 жыхары, у фальварку 1 двор, 16 жыхароў. У 1917 г. у сяле 96 двароў, 639 жыхароў, у фальварку 2 двары, 11 жыхароў. У 1913 г. адкрыта земская школа і пабудавана для яе памяшканне. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. вучыліся 123 вучні, дзейнічалі харавы і драматычны гурткі. У 1926 г. у сяле 122 двары, 627 жыхароў, у фальварку 21 двор. У 1931 г. арганізаваны калгас

імя Ф.Э.Дзяржынскага, які ў 1933 г. аб'ядноўваў 29 гаспадарак. У 1936 г. пабудаваны магазін і новае памяшканне для школы. У 1940 г. 117 двароў, 542 жыхары.

У жніўні 1942 г. гітлераўцы спалілі вёску (92 двары), загубілі 26 жыхароў. 58 вяскоўцаў загінулі на франтах.

У вёсцы размешчаны ферма буйной рагатай жывёлы, машынны двор, склады з зернесушыльнай установкай, сталярнацяслярская майстэрня, установка па перапрацоўцы кармоў, піларама, кармацэхі, ёсць швейны цэх, гандлёвы комплекс, сталовая, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад-яслі, аддзяленне ашчаднага банка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, Дом культуры, бібліятэка з фондам больш за 12 тыс. кніг, сярэдняя і музычная школы, музей баявой і працоўнай славы. У 1996 г. 222 двары, 629 жыхароў.

КАСТРЫЧНІК, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. У 1926 г. 38 двароў, 193 жыхары. У гэтым жа годзе адкрыты школа і хатачытальня. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1934 г. узведзены будынак для школы. У 1996 г. 5 двароў, 6 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

КІРАЎСКАЕ (да 1961 г. Дзікае), пасёлак, цэнтр сельсавета. Каля сучаснага пасёлка раней быў невялікі хутар Дзікае. На балоце побач з возерам Дзікае ў 1930-я гады былі выяўлены вялікія запасы торфу, а ў 1956 г. з пашырэннем торфараспрацовак пачаў стварацца пасёлак, у якім зараз размешчаны ўчастак торфапрадпрыемства «Рэдкі рог». Ёсць аддзяленне сувязі, Дом культуры, гандлёвы цэнтр, сталовая, аддзяленне ашчаднага банка, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка з фондам больш за 6,9 тыс. кніг. У 1996 г. 73 двары, 133 жыхары.

Пад слоем торфу Дзікага балота выяўлена радовішча сапрапеляў (запасы 1,9 млн. м^3).

КЛЕТНАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». Вядома з 1692 г. як прысёлак, 13 дымоў, у Дакольскім войтаўстве Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1727 г. 8 двароў, 4 жыхары мужчынскага полу, у складзе маёнтка Глуск. У 1838 г. 30 рэвізскіх душ, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 28 двароў, 123 жыхары, у складзе маёнтка Машніцы, уласнасць А.Быкоўскага. У 1885 г. 16 двароў, 110 жыхароў, мелася царква. Сяляне ў 1885 г. правялі самавольную высечку памешчыцкага лесу. У 1897 г. 37 двароў, 230 жыхароў, меліся хлебазапасны магазін, лаўка, заезны двор, царква, у 1917 г. 58 двароў, 328 жыхароў. У 1926 г. 83 двары, 433 жыхары. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа і арганізаваны калгас імя В.У.Куйбышава. Быў пабудаваны вадзяны млын, а ў 1936 г. магазін. У 1937 г. адкрыты ветэрынарны пункт.

У 1942 г. гітлераўцы загубілі 13 жыхароў. У 1950 г. пабудавана гідраэлектрастанцыя магутнасцю 15 кВт.

У вёсцы размешчана вытворчая брыгада, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, машынны двор, установка па перапрацоўцы кармоў, участак па вырабе будаўнічых дэталей з драўніны, ёсць аддзяленне сувязі, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, дзіцячая музычная школа, бальніца, ветэрынарны ўчастак, сталовая, аддзяленне ашчаднага банка, сярэдняя школа, бібліятэка з фондам больш за 9 тыс. кніг, гандлёвы цэнтр. 17.7.1967 г. да вёскі далучаны пасёлак Янкі Купалы. У 1996 г. 153 двары, 374 жыхары.

КЛЯШЧОЎКА, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. хутар, 2 двары, 7 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 1 двор, 6 жыхароў; у 1917 г. засценак, 10 двароў, 78 жыхароў. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа і створаны калгас «Чырвоная Кляшчоўка», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 12 гаспадарак, а ў 1938 г. меў 458 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку 187 га ворнай зямлі, аб'ядноўваў 40 гаспадарак. У 1996 г. 36 двароў, 57 жыхароў, у складзе калгаса «Звязда».

КНЫШЫ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1621 г. сяло Кнышавічы, 29 двароў, дзяржаўная ўласнасць, у Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета. У 1765 г. 14 двароў. У 1838 г. 31 рэвізская душа, у Бабруйскім павеце. У 1846 г. 9 двароў, вёска маёнтка Дварэц Бабруйскага павета, уласнасць А.Быкоўскага. У 1897 г. 17 двароў, 167 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 35 двароў, 277 жыхароў. У 1913 г. адкрыта школа. У 1917 г. 47 двароў, 260 жыхароў. У 1926 г. вёска, 50 двароў, 219

жыхароў, і пасёлак, 6 двароў, 35 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 12 двароў, 16 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

За 1 км на паўночны захад ад вёскі, на правым беразе р. Пціч, каля дарогі ў в. Гарадок захавалася стаянка бронзавага веку.

КРАСНАЕ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. як маёнтак Бабруйскага павета, уласнасць Р.Струміна. У 1897 г. маёнтак Краснае (ён жа Новы Двор), 2 двары, 28 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 1 двор, 10 жыхароў, у 1917 г. 1 двор, 29 жыхароў (з іх 18 палякаў). У 1926 г. 3 двары, 7 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны ўсход», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 43 гаспадаркі. Дзейнічаў вадзяны млын. У 1996 г. 27 двароў, 46 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

КРАСНЫ, пасёлак у Клятнянскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. У 1917 г. маёнтак, 1 двор, 29 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1930-я гады пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 9 двароў, 12 жыхароў, у складзе калгаса «Гвардыя».

КРУКАЎШЧЫНА, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з другой палавіны XIX ст., калі тут быў засценак Бабруйскага павета. У 1909 г. засценак налічваў 12 двароў, 108 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 19 двароў, 118 жыхароў (з іх 6 палякаў). У 1926 г. 25 двароў, 97 жыхароў, арганізаваны калгас «Новая Крукаўшчына», які ў 1936 г. аб'ядноўваў 33 гаспадаркі. У 1996 г. 17 двароў, 25 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

ЛІПКА, вёска да 1949 г. (зараз не існуе) у Клятнянскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст., калі тут быў хутар, 1 двор, 7 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЛУЧКІ, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з 1756 г. як вёска ў складзе маёнтка Глуск, з'яўлялася ўладаннем памешчыка. У 1790 г. цэнтр маёнтка, які налічваў 45 двароў, у Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць графа Юдыцкага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, маёнтак Бабруйскага павета. У 1798 г. 1 двор, 5 жыхароў. У XIX ст. прыватная ўласнасць Свідаў. У 1897 г. 6 двароў, 49 жыхароў; у 1907 г. 7 двароў, 72 жыхары. У 1917 г. засценак, 15 двароў, 97 жыхароў (з іх 13 палякаў). У 1926 г. 15 двароў, 73 жыхары. У 1926 г. жыхары вёсак Лучкі і Падзамша аб'ядналіся ў калгас «Рэўузрыў», які ў канцы 1930-х гадоў насіў імя С.Арджанікідзе. У 1996 г. 21 двор, 42 жыхары, у складзе калгаса «Праўда».

ЛЮДВІНОВА, былая вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як маёнтак Людвінава Бабруйскага павета. У 1848 г. маёнтак налічваў 15 двароў, 115 сялян, уласнасць Фаленскай. У другой палавіне XIX ст. маёнткам валодаў Рабцэвіч. У 1897 г. вёска Людвінова (яна ж Шчыты), 15 двароў, 101 жыхар. У 1907 г. вёска Шчыты Людвінова, 10 двароў, 32 жыхары. У 1909 г. хутар, 2 двары, 17 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 23 двары, 151 жыхар, у Глускай воласці. У 1930 г. арганізаваны калгас імя П.Я.Войкава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 28 гаспадарак, потым у складзе калгаса «Расія».

МАКАВІЧЫ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з 1560 г. у Глускай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1692 г. 12 двароў, у складзе прыватнафеадальнага валодання Глуск у Навагрудскім павеце Навагрудскага ваяводства. У 1724 г. налічвала 16 валок зямлі, вёска Пагосцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне князя Радзівіла. У 1727 г. 13 двароў, 14 жыхароў мужчынскага полу, уласнасць памешчыка, меўся млын. У 1756 г. 14 двароў.

У 1758 г. у вёсцы 8 двароў, здадзена ў арэнду Станіславу Вейняловічу. У 1765 г. 17 двароў. У 1790 г. цэнтр маёнтка, які налічваў 26 двароў, належаў Дашкевічам. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1844 г. 22 двары, 119 жыхароў, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць Асецімскіх. Мелася карчма. У 1897 г. 43 двары, 272 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У другой вёсцы пад такой жа назвай былі 16 двароў, 94 жыхары, заезны двор. У 1907 г. у вёсцы 49 двароў, 335 жыхароў, у засценку 10 двароў, 96 жыхароў; у 1917 г. у вёсцы 69 двароў, 374 жыхары, у засценку 19 двароў, 132 жыхары (з іх 11 палякаў).

У 1931 г. адкрыта пачатковая школа і арганізаваны калгас імя Кліма Варашылава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 64 гаспадаркі, а ў 1940 г. меў 270 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 76 гаспадарак. У 1936 г. адкрыты фельчарскі ўчастак, пабудаваны магазін.

Летам 1942 г. партызаны атрада Я.І.Патрына, М.Б.Храпко, Дз.Ц.Гуляева, Г.М.Сталярова разгромілі фашысцкі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У 1996 г. 136 двароў, 267 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

МАКРАНЫ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. маёнтак, 8 двароў, 35 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 1 двор, 66 жыхароў (з іх 43 палякі). У 1926 г. 2 двары, 26 жыхароў. У 1931 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас «1 Мая», у які ў 1935 г. уваходзіла 40 гаспадарак, мелася 380 га сельскагаспадарчых угоддзяў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.

У 1996 г. 20 двароў, 21 жыхар, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

МАЛІНАВА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з сярэдзіны XIX ст., калі тут у 1847 г. быў заснаваны засценак. У 1857 г. засценак Малінаў, уласнасць памешчыка. У 1897 г. вёска, 17 двароў, 136 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1909 г. засценак налічваў 10 двароў, 89 жыхароў. У 1917 г. 21 двор, 161 жыхар (з іх 23 палякі).

У 1922 г. адкрыта пачатковая школа, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні, у 1923 г. было 19 вучняў. У 1926 г. 21 двор, 150 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Серп і молат», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 59 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 360 га сельскагаспадарчых угоддзяў, 74 гаспадаркі. Дзейнічаў паравы млын. У 1940 г. 48 двароў, 236 жыхароў. У 1942 г. гітлераўцы спалілі 41 двор, загубілі 24 жыхары. Пасля вайны адбудавана. У 1996 г. 34 двары, 66 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

МАЛКАВА, вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. аколіца, 23 двары, 151 жыхар, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. Меўся паравы млын. У 1907 г. 25 двароў, 241 жыхар. У 1917 г. засценак, 42 двары, 221 жыхар (з іх 138 палякаў, 8 яўрэяў). У 1926 г. 37 двароў, 187 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвонай Арміі праўда», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 42 гаспадаркі, а ў 1936 г. меў 528 га сельскагаспадарчых угоддзяў. У 1996 г. 10 двароў, 17 жыхароў, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

МАСЦІШЧА, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1857 г. засценак у Бабруйскім павеце. У 1897 г. 4 двары, 32 жыхары, у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета. Побач быў яшчэ адзін засценак пад назвай Масцішча Падрэюлей, 5 двароў, 33 жыхары, і фальварак Масцішча, 4 двары, 24 жыхары, ветраны млын. У 1917 г. у засценку Масцішча-1 9 двароў, 56 жыхароў, на хутары Масцішча-2 5 двароў, 36 жыхароў (з іх 19 палякаў). У 1926 г. вёска, 38 двароў, 216 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камінтэрн», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 23 гаспадаркі, а ў 1936 г. меў 260 га сельскагаспадарчых угоддзяў. У 1996 г. 19 двароў, 32 жыхары, у складзе калгаса імя С.М.Кірава.

МЫСЛОЦІНА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XVI ст. У 1597 г. сяло ў Глускай воласці Навагрудскага павета,13 дымоў. У 1692 г. 18 дымоў. У 1724 г. 21 двор, 6 валок зямлі, вёска Дакольскага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла. У 1758 г. 25 двароў, у арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 26 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета, прыватная ўласнасць графа Юдыцкага. У 1838 г. 6 двароў, 38 жыхароў, належала Катлубаям, 8 двароў, 72 жыхары — І.Свіду. У 1897 г. 23 двары, 170 жыхароў. Меўся хлебазапасны магазін. Побач быў аднайменны хутар, 6 двароў, 36 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 41 двор, 265 жыхароў, на хутары 5 двароў, 22 жыхары (з іх 20 палякаў). У 1926 г. 55 двароў, 305 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвонае Мыслоціна», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 26 гаспадарак, з 1933 г. абслугоўваўся Глускай МТС. У 1996 г. 98 двароў, 179 жыхароў. У складзе калгаса «Праўда».

НОВА-АНДРЭЕЎКА (да 1964 г. Адэль), вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1838 г. вёска Андрэеўка, 43 рэвізскія душы, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 21 двор, 117 жыхароў, у складзе маёнтка Машнічы Бабруйскага павета, уласнасць

А.Быкоўскага. У 1909 г. 26 двароў, 244 жыхары. У 1917 г. 57 двароў, 329 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 61 двор, 373 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны франтавік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 31 гаспадарку. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа. У 1996 г. 51 двор, 85 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

НЯЗНАННЕ, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з 1798 г. як вёска, 3 двары, 20 жыхароў, у Бабруйскім старостве Бабруйскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1838 г. 19 жыхароў. У 1897 г. 5 двароў, 56 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. тут быў хутар, 13 двароў, 87 жыхароў. У 1917 г. 18 двароў, 116 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 17 двароў, 103 жыхары. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 4 двары, 5 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

ПАГАРЭЛАЕ, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. пасёлак, 6 двароў, 42 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. засценак, 7 двароў, 40 жыхароў, у 1917 г. 7 двароў, 61 жыхар. У 1926 г. 16 двароў, 75 жыхароў. У 1931 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас імя І.В.Сталіна, які быў створаны сумесна з сялянамі вёскі Пяценка. У 1942 г. гітлераўцы загубілі 3 жыхароў. У 1996 г. 14 двароў, 25 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

ПАГОСТ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з 1571 г. як сяло ў Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1581 г. у складзе маёнтка Глуск. У 1677 г. сяло плаціла падаткі касцёлу бернардзінцаў у Глуску. У 1692 г. 14 гаспадарак. У 1708 г. у Глускім графстве, цэнтр войтаўства. У 1724 г. 20 двароў, 15 валок зямлі, цэнтр маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла. У 1727 г. 18 двароў, 14 жыхароў мужчынскага полу. У 1-й палавіне XVIII ст. у Пагосцкім войтаўстве адбываліся значныя сялянскія хваляванні. У 1758 г. 21 двор. У арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 24 двары. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета, прыватнае ўладанне графа Юдыцкага. У 1838 г. 29 двароў, занятых жыхарамі, і 4 пустыя, 103 жыхары мужчынскага полу, належала Т.Валоўскай. У 1847 г. налічвала 36 двароў, 219 жыхароў, уваходзіла ў склад маёнтка Краснае, уласнасць Р.Струміна. У 1897 г. 49 двароў, 338 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны хутар, 2 двары, 13 жыхароў. У 1907 г. 56 двароў, 381 жыхар. У 1917 г. у сяле 72 двары, 421 жыхар, у фальварку 12 жыхароў і на хутары 1 двор, 4 жыхары. У 1926 г. у вёсцы 81 двор, 407 жыхароў, на хутары 3 двары, 19 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пераможац», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 33 гаспадаркі. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа. У 1996 г. 84 двары,133 жыхары, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

ПАДЗАМША, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. У 1897 г. 3 двары, 34 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. тут быў маёнтак, 1 двор, 33 жыхары. У 1917 г. 1 двор, 86 жыхароў (з іх 55 палякаў).

У былым памешчыцкім маёнтку ў 1920 г. была арганізавана народная гаспадарка (камуна), якая мела 411 дзесяцін зямлі. У гэты час тут дзейнічалі паравы млын і сукнавальня. У 1926 г. 18 двароў, 86 жыхароў. У 1929 г. жыхары вёсак Падзамша і Лучкі аб'ядналіся ў калгас «Рэўузрыў», які ў канцы 1930-х гадоў быў вядомы пад назвай імя С.Арджанікідзе. У 1996 г. 43 двары, 99 жыхароў, у складзе калгаса «Праўда».

ПАДКАЛЕНДА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 11 двароў, 19 жыхароў, у складзе калгаса «Праўда».

ПАДЛУЖЖА, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1765 г. вёска Полаж, 5 двароў, дзяржаўная ўласнасць, у Бабруйскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства.

У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Згода Бабруйскага павета Мінскай губерні, прыватная ўласнасць. У 2-й палавіне XIX ст. налічвала 22 двары. Частка вяскоўцаў апрача земляробства займалася пчалярствам. У 1897 г. 44 двары, 295 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. Побач быў выселак, 1 двор, 9 жыхароў. У 1907 г. 53 двары, 343 жыхары. У 1916 г. адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1917 г. 50 двароў, 328 жыхароў. У 1926 г. 84 два-

ры, 428 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Камсамольская перамога», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 54 гаспадаркі. У 1996 г. 62 двары, 115 жыхароў, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

На ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р. Пціч, знаходзіцца старажытнае селішча. За 0,4 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Замікальшчына, на правым беразе р. Пціч — другое селішча, а за 0,5 км на захад ад вёскі, на правым беразе р. Пціч, на пясчаных узгорках — стаянка эпохі неаліту і бронзавага веку.

ПАЛЯНА, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. фальварак, 1 двор, 6 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 25 жыхароў, у 1917 г. 31 жыхар. У 1996 г. 28 двароў, 71 жыхар, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

ПАРШЧАХА, былая вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст., калі тут быў фальварак, 1 двор, 8 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 14 двароў, 143 жыхары. 20.1.1943 г. фашысты спалілі вёску разам з жыхарамі. Пасля вайны не адрадзілася.

ПОБЛІН, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1692 г. прысёлак Кольчыцкага войтаўства Навагрудскага павета, 14 дымоў, шляхецкая ўласнасць. У 1724 г. 11 двароў, 4 валокі зямлі, у складзе Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла. У 1758 г. 14 двароў. У арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 13 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, у Бабруйскім павеце, належала графу Юдыцкаму. У 1798 г. 26 двароў, 153 жыхары, меўся млын. У 1838 г. 23 двары, 168 жыхароў. У 1862 г. пабудавана драўляная царква. У 1884 г. адкрыта школа граматы. У 1885 г. сяло, 25 двароў, 260 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меліся млын, 2 царквы. У 1899 г. школа граматы ператворана ў царкоўнапрыходскую, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1903 г. былі 2 царкоўнапрыходскія школы — асобна для хлопчыкаў і для дзяўчынак. У 1897 г. 66 двароў, 420 жыхароў, вадзяны млын, хлебазапасны магазін. У 1907 г. 67 двароў, 395 жыхароў. У 1917 г. 77 двароў, 462 жыхары (з іх 4 яўрэі).

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. было 22 вучні. Пры школе дзейнічала хата-чытальня. У 1926 г. 85 двароў, 460 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Юны барацьбіт», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 47 гаспадарак. У 1996 г. 65 двароў, 122 жыхары, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

За 1 км на поўнач ад вёскі размешчана селішча позняга этапу зарубінецкай культуры. На паўночна-заходняй ускраіне, на правым беразе р. Пціч, захавалася старажытная стаянка.

ПОЎСТКА, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з XVII ст. У 1692 г. прысёлак, 12 дымоў, у Кольчыцкім войтаўстве Рэчыцкага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1724 г. 15 двароў, 4 валокі зямлі, вёска Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. Уласнасць князя Радзівіла. У 1727 г. в. Пустка, 18 двароў, 19 жыхароў мужчынскага полу, у складзе маёнтка Глуск, уласнасць таго ж памешчыка. У 1758 г. 20 двароў, знаходзілася ў арэндзе Станіслава Вейняловіча, У 1765 г. 21 двор. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У XIX ст. вёска маёнтка Усцярхі Бабруйскага павета, прыватная ўласнасць. У 1897 г. 188 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1907 г. 30 двароў, 218 жыхароў. У 1917 г. 38 двароў, 224 жыхары. У 1926 г. 43 двары, 300 жыхароў. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа. Вяскоўцы ў 1930-я гады ўступілі ў калгас. У 1996 г. 60 двароў, 138 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

ПРЫВАРАЦЦЕ, вёска ў Кіраўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. хутар, 6 двароў, 47 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 12 двароў, 66 жыхароў. У 1917 г. хутар Праварожае, 15 двароў, 86 жыхароў. У 1926 г. 17 двароў, 103 жыхары. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 14 двароў, 17 жыхароў, у складзе калгаса «Звязда».

ПРЫПЛАВЫ, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска, 8 двароў, 52 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. хутар, 14 двароў, 85 жыхароў. У 1917 г. засценак, 8 двароў, 51 жыхар. У 1926 г. 9 двароў, 41 жыхар. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі

ў калгас. У 1996 г. 10 двароў, 20 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

ПЦІЧ (да 1969 г. Халопеніцкі спіртзавод), пасёлак у Каткаўскім сельсавеце. Вядомы з пачатку 1930-х гадоў як пасёлак Халопеніцкага спіртзавода.

На франтах загінулі 20 вяскоўцаў. Размешчаны спіртзавод, лясніцтва. У 1996 г. 48 двароў, 83 жыхары, у складзе калгаса «Зара».

ПЯЦЕНКА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. У 1835 г. тут пабудавана драўляная царква. У 1847 г. 4 двары, 36 жыхароў, у складзе маёнтка Рылавічы Бабруйскага павета, належала Тышкевічам. У 1886 г. сяло, 5 двароў, 48 жыхароў, дзейнічала царква. У 1897 г. 11 двароў, 63 жыхары. Раз на год праводзіўся кірмаш. Побач быў аднайменны хутар, 5 двароў, 34 жыхары. У 1907 г. у вёсцы 17 двароў, 79 жыхароў, на хутары 6 двароў, 27 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 16 двароў, 101 жыхар, у засценку 8 двароў, 45 жыхароў (з іх 4 палякі). У 1926 г. вёска, 17 двароў, 106 жыхароў, і засценак, 8 двароў, 51 жыхар. Разам з жыхарамі суседняй в. Пагарэлае вяскоўцы арганізавалі ў 1931 г. калгас імя І.В.Сталіна, які ў 1936 г. аб'ядноўваў 53 гаспадаркі. Для школы, якая дзейнічала ў вёсцы, у 1934 г. узведзены новы будынак. У 1996 г. 14 двароў, 17 жыхароў, у складзе калгаса «Радзіма».

РОЗЛЕВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1677 г. сяляне частку сваіх прыбыткаў аддавалі на карысць касцёлу бернардзінцаў у Глуску. У 1682 г. 13 дымоў. У XVIII ст. вёска Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне князя Радзівіла. У 1758 г. 16 двароў. У арэндзе Станіслава Вейняловіча. У 1765 г. 15 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, у Бабруйскім павеце, належала графу Юдыцкаму. У 1798 г. 9 двароў, 60 жыхароў. У 1847 г. 6 двароў, 31 жыхар, цэнтр маёнтка, уласнасць І.Райкевіча. У 2-й палавіне XIX ст. налічвалася 11 двароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся пчалярствам. У 1897 г. 8 двароў, 66 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў фальварак, 3 двары, 15 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 12 двароў, 77 жыхароў, у фальварку 2 двары, 12 жыхароў. У 1917 г. 16 двароў, 108 жыхароў (з іх 3 яўрэі). У 1926 г. 16 двароў, 88 жыхароў. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа і арганізаваны калгас «Чырвоная Беларусь», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 29 гаспадарак. У 1996 г. 36 двароў, 57 жыхароў, у складзе калгаса імя М.І.Калініна.

РУДНЯ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як вёска ў складзе маёнтка Завалочыцы Бабруйскага павета, уласнасць Быкоўскіх. У 1844 г. 9 двароў, 56 жыхароў. У 1897 г. 17 двароў, 139 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 27 двароў, 205 жыхароў, у 1917 г. 34 двары, 209 жыхароў. У 1926 г. 38 двароў, 216 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1966 г. 22 двары, 66 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

РЫЛАВІЧЫ, да 1968 г. вёска ў Бярозаўскім сельсавеце (зараз не існуе). Вядома з XVIII ст. У 1724 г. 14 двароў, 4 валокі зямлі, вёска Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватная ўласнасць князя Радзівіла. У 1758 г. 18 двароў, здадзена ў арэнду Станіславу Вейняловічу. У 1765 г. 19 двароў. У 1790 г. 20 двароў, належала графу Юдыцкаму. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, у Бабруйскім павеце. У 1838 г. у вёсцы 9 двароў, 79 жыхароў, належала Тышкевічам, 1 двор, 4 жыхары — Яну Аскерку, 1 двор, 7 жыхароў — А.Кастравіцкай. У 1909 г. 17 двароў, 102 жыхары, непадалёку быў аднайменны фальварак, 3 двары, 37 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 22 двары, 118 жыхароў.

СЕЛЬЦЫ, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1724 г. 9 двароў, вёска Пагосцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне князя Радзівіла. У 1758 г. 15 двароў, здадзена ў арэнду Станіславу Вейняловічу. У 1765 г. 16 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, у Бабруйскім павеце Мінскай губерні, уласнасць графа Юдыцкага. У 1838 г. 5 двароў, 35 жыхароў, належала Т.Тышкевічу, 4 двары, 20 жыхароў — А.Шчуку, 3 двары, 22 жыхары — С.Свіду. У 1844 г. 4 двары, 22 жыхары, у складзе маёнтка Сельцы Бабруйскага павета. У 1897 г. 23 двары, 141 жыхар, у Глускай воласці Бабруйска-

га павета. Меўся хлебазапасны магазін. Побач быў аднайменны маёнтак, 3 двары, 31 жыхар. У 1907 г. у вёсцы 31 двор, 191 жыхар, у фальварку 1 двор, 10 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 37 двароў, 234 жыхары, у маёнтку 14 жыхароў.

У 1926 г. 51 двор, 258 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоныя Сельцы», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 32 гаспадаркі.

У 1992 г. у выніку пажару вёска амаль цалкам згарэла. У хуткім часе адбудавана. У 1996 г. 63 двары, 117 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

СІМАНАВІЧЫ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XVI ст. У 1560 г. сяло ў Глускай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1571 г. 7 дымоў, у 1597 г. 13 дымоў. У XVIII ст. у складзе маёнтка Завалочыцы Бабруйскага павета Мінскай губерні, уласнасць Быкоўскіх. У 1844 г. 42 двары, 302 жыхары. У 1886 г. сяло, 45 двароў, 374 жыхары, якія апрача земляробства займаліся пчалярствам, меліся царква і паштовая станцыя. У 1897 г. 98 двароў, 634 жыхары, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. Побач былі аднайменны пасёлак, 3 двары, 17 жыхароў, вадзяны млын, шашэйная старожка, 1 двор, 12 жыхароў, паштовая станцыя, 2 двары, 23 жыхары. У 1907 г. у вёсцы 129 двароў, 917 жыхароў, на паштовай станцыі 11 жыхароў, на старожцы 9 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 186 двароў, 948 жыхароў (з іх 5 палякаў, 16 яўрэяў), на паштовай станцыі 7 двароў, 33 жыхары, на шашэйнай старожцы 2 двары, 4 жыхары.

У 1921 г. дзейнічаў вадзяны млын. 15.2.1925 г. створана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г. 201 гаспадарка, 981 жыхар. У 1931 г. адкрыта пачатковая школа і арганізаваны калгас імя С.М.Будзённага, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 64 гаспадаркі, а ў 1938 г. меў 875 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 203 гаспадаркі.

У 1996 г. 191 двор, 290 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

За 0,5 км на захад ад паўднёва-ўсходняй ускраіны вёскі, ва ўрочышчы Селішча, размешчана селішча ранняга жалезнага веку і раннефеадальнага часу (VI—VIII і X—XIII ст.). За 0,1—0,2 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Цёмшавае поле, на правым беразе р. Пціч знаходзіцца другое селішча, якое адносіцца да позняга этапу зарубінецкай культуры. На тэрыторыі гэтага селішча размешчаны бескурганы могільнік ранняга жалезнага веку.

СЛАБОДКА, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома з 1602 г. як сяло, 6 дымоў, у складзе маёнтка Глуск Пагарэлы Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1845 г. 5 двароў, 44 жыхары, у складзе маёнтка Халопенічы Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 г. вёска пры тракце Бабруйск—Мазыр, 25 двароў, 152 жыхары, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны маёнтак, 3 двары, 48 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 21 двор, 183 жыхары, у маёнтку 1 двор, 39 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 30 двароў, 226 жыхароў (з іх 4 яўрэі), у маёнтку 93 жыхары.

На могілках пахаваны партызаны, якія загінулі ў 1920 г. у баях супраць польскіх акупантаў. У 1926 г. вёска Слабодка-1, 34 двары, 168 жыхароў, вёска Слабодка-2, 32 двары, 124 жыхары, былы маёнтак, 18 двароў, 95 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Бальшавік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 39 гаспадарак. На франтах загінулі 16 вяскоўцаў. У 1996 г. 38 двароў, 63 жыхары, у складзе калгаса «Зара».

СЛАБОДКА, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1844 г. вёска, 10 двароў, 77 жыхароў, у складзе маёнтка Ксавярполле Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1917 г. 41 двор, 203 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1935 г. арганізаваны калгас «Сцяг працы», які ў 1937 г. аб'ядноўваў 37 гаспадарак. У 1996 г. 10 двароў, 22 жыхары, у складзе калгаса «Дружба».

СЛАЎКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і аграфірмы «Слаўкавічы». Вядома з пачатку XVII ст., уваходзіла ў склад маёнтка Дарогі Слуцкага княства Навагрудскага ваяводства ВКЛ, уласнасць князя Радзівіла. У 1677 г. было 94 двары і 38 валок зямлі. У 1699 г. 111 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1796 г. пабудавана Казьмадзям'янаўская царква.

У 1838 г. сяло, 206 рэвізскіх душ, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1845 г. 67 двароў, 396 жыхароў, цэнтр маёнтка. У 1885 г. 63 двары, 408 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1890—1893 гг. сяляне самавольна

пасвілі сваю жывёлу на памешчыцкіх угоддзях. У 1897 г. 138 двароў, 843 жыхары, меліся царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, заезны двор, 2 лаўкі. Побач была царкоўная сядзіба, 2 двары, 10 жыхароў, і маёнтак, 10 двароў, 78 жыхароў, вінакурны завод. У 1906 г. сялянскае выступленне супраць прыгнёту памешчыка было падаўлена атрадам казакоў, які прыбыў з Бабруйска. У 1907 г. у сяле 130 двароў, 910 жыхароў, у маёнтку 103 жыхары. У 1911 г. адкрыта земская школа, для якой у 1914 г. пабудавана памяшканне. У 1917 г. у сяле 198 двароў, 1184 жыхары (з іх 19 палякаў, 40 яўрэяў), у маёнтку 306 жыхароў.

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені. У 1926 г. 234 двары, 1835 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя І.В.Сталіна, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 45 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 1163 га сельгасугоддзяў, аб'ядноўваў 140 гаспадарак. У 1935 г. пачала дзейнічаць прамысловая арцель «2-я пяцігодка».

Вёска па сутнасці з'яўлялася цэнтрам партызанскага руху на Глушчыне. У навакольлі ў 1943 г. дыслацыраваліся Глускія падпольныя райкомы КП(б)Б, ЛКСМБ і рэдакцыя газеты «Сацыялістычная вёска» — орган Глускага падпольнага райкома КП(б)Б. Фашысты закатавалі 37 вяскоўцаў.

У вёсцы размешчаны паляводчая брыгада, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, машынны двор, установка па перапрацоўцы кармоў і піларама, ёсць Дом культуры, аддзяленне сувязі, лясніцтва, аддзяленне ашчаднага банка, магазін, сярэдняя школа, бібліятэка з фондам больш за 10,2 тыс. кніг, аўтаматычная тэлефонная станцыя. У 1996 г. 197 двароў, 496 жыхароў.

СТАРОЕ СЯЛО, вёска ў Кіраўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Звязда». Вядома з XIX ст. У 1897 г. урочышча Старое Сяло (яно ж Завод), 1 двор, 7 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 15 двароў, 93 жыхары. У 1917 г. засценак, 18 двароў, 118 жыхароў (з іх 6 палякаў). У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У лістападзе 1941 г. у вёсцы пачала дзейнічаць падпольная група.

У вёсцы размешчаны вытворчая брыгада, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, машынны двор, установка па перапрацоўцы кармоў, піларама, зерняскладз зернесушыльнай установкай, ёсць клуб, стацыянарная кінаўстаноўка, фельчарска-акушэрскі пункт, 8-гадовая школа, бібліятэка з фондам больш за 5,8 тыс. кніг, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, магазін. У 1996 г. 137 двароў, 342 жыхары.

СТАРЫНА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. хутар, 1 двор, 6 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. вёска ў Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 6 двароў, 25 жыхароў. У 1917 хутар, 1 двор, 6 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1931 г. арганізаваны калгас «Новае жыццё», які ў 1937 г. меў 385 га сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку 150 га ворнай зямлі, аб'ядноўваў 68 гаспадарак. У 1996 г. 48 двароў, 98 жыхароў, у складзе калгаса «Гвардыя».

СЦЯГ (да 1967 г. Заграбелле), вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 52 двары, 81 жыхар, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

СЦЯПАНАЎКА, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1798 г. вёска, 5 двароў, 53 жыхары, дзяржаўная ўласнасць у Бабруйскім старостве Бабруйскага павета. Меўся млын. У 1838 г. 61 жыхар. У 1847 г. 9 двароў, 95 жыхароў, у Бабруйскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. У 1897 г. 31 двор, 234 жыхары, у 1907 г. 38 двароў, 270 жыхароў. У 1917 г. 57 двароў, 336 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 57 двароў, 295 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас. У вёсцы дзейнічалі падпольшчыкі, якія ў лістападзе 1941 г. перадалі партызанам 6 кулямётаў, 5 аўтаматаў, ротны мінамёт з камплектам мін, больш за 50 вінтовак, шмат гранат і патронаў. Многія вяскоўцы пайшлі ў верасні 1942 г. у партызанскі атрад, які быў сфарміраваны на базе ініцыятыўнай групы, вылучанай атрадам імя М.А.Шчорса. Да 8.1.1943 г. атрад дзейнічаў самастойна (28.10.1943 г. прысвоена імя В.І.Чапаева), са студзеня 1943 г. у складзе 37-й партызанскай брыгады. У 1996 г. 61 двор, 133 жыхары, у складзе калгаса «Зара камуны».

СЯЛЕЦ, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з 1571 г. як сяло ў Глускай

воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1626 г. у складзе маёнтка Глуск Дубровіцкі. У 1677 г. сяляне частку свайго прыбытку аддавалі на карысць касцёлу бернардзінцаў у Глуску. У 1692 г. 7 дымоў. У 1708 г. у Глускім графстве. У 1727 г. 12 двароў, 7 жыхароў мужчынскага полу, уласнасць памешчыка. У 1798 г. 21 двор, 102 жыхары. У 1897 г. засценак, 20 двароў, 121 жыхар, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 15 двароў, 118 жыхароў. У 1917 г. 22 двары, 149 жыхароў (з іх 7 палякаў).

У 1920 г. адкрыта школа, у якой у 1923 г. было 18 вучняў. У красавіку 1924 г. створана меліярацыйнае таварыства «Сялецкае». У 1926 г. 28 двароў, 165 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Кастрычнік», які ў 1940 г. меў 500 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 41 гаспадарку. У 1996 г. 28 двароў, 55 жыхароў, у складзе калгаса «Гвардыя».

ТУРКІ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. сядзіба, 4 двары, 23 жыхары. У пачатку XX ст. тут быў фальварак, 1 двор, 11 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 1 двор, 27 жыхароў (з іх 7 палякаў). У 1926 г. 5 двароў, 35 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. Меўся цагельны завод. У 1996 г. 9 двароў, 12 жыхароў, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

ТУРЫНО, вёска ў Хваставіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Дружба». Вядома з XVII ст. У 1688 г. вёска ў Мінскім ваяводстве, уласнасць памешчыка. У 1705 г. 45 двароў, 166 жыхароў мужчынскага полу. У 1838 г. 11 рэвізскіх душ. У 1847 г. 12 двароў, 46 жыхароў, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць Казлоўскіх. У 1897 г. 8 двароў, 54 жыхары, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. Непадалёку знаходзіўся аднайменны засценак, дзе было 24 двары, 173 жыхары. У 1907 г. у вёсцы 11 двароў, 80 жыхароў, у засценку 22 двары, 204 жыхары. У 1917 г. у засценку 10 двароў, 62 жыхары, на хутары 22 двары, 150 жыхароў (з іх 87 палякаў). У 1926 г. вёска, 7 двароў, 33 жыхары, засценак, 17 двароў, 108 жыхароў, і хутар, 8 двароў, 48 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Будаўнік сацыялізму», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 25 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 699 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 61 гаспадарку.

У вёсцы размешчаны вытворчая брыгада, фермы буйной рагатай жывёлы і авечкагадоўчая, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, устаноўка па перапрацоўцы кармоў, зерняскладі і зернесушыльны агрэгат, ёсць аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, клуб, стацыянарная кінаўстаноўка, пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, бібліятэка з фондам больш за 13 тыс. кніг. У 1996 г. 77 двароў, 240 жыхароў.

УСЦЯРХІ, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома ў пачатку XVIII ст. У 1724 г. 7 двароў, 2 валокі зямлі. Вёска Кольчыцкага войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне князя Радзівіла. У 1758 г. у вёсцы 11 двароў, здадзена ў арэнду Станіславу Вейняловічу. У 1765 г. 13 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1847 г. 16 двароў, 96 жыхароў, цэнтр маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць К.Паўляцовай. Мелася каталіцкая капліца. У 1857 г. вёска ў Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1888 г. адкрыта школа граматы, у якой у 1890 г. навучалася 8 хлопчыкаў. У 1897 г. 35 двароў, 138 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны засценак, 34 двары, 226 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 39 двароў, 204 жыхары, у засценку 28 двароў, 257 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 44 двары, 254 жыхары, у засценку 26 двароў, 281 жыхар (з іх 22 палякі, 11 яўрэяў). У 1926 г. у вёсцы 50 двароў, 340 жыхароў, у засценку 40 двароў, 250 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны волат», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 25 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 750 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 76 гаспадарак. У 1937 г. дзейнічаў паравы млын.

У 1942—1943 гг. гітлераўцы спалілі вёску (37 жыхароў). Пасля вайны адбудавана. У 1950 г. узведзена гідраэлектрастанцыя магутнасцю 20 кВт. У 1996 г. 33 двары, 69 жыхароў, у складзе калгаса «Зара камуны».

Радзіма аднаго з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў грамадзянскую вайну С.Л.Вілюгі.

УЮНІШЧА, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1880-я гады дзейнічала школа граматы, але ў 1890 г. яна была закрыта. У 1897 г. вёска, 29 двароў, 139 жыхароў, у Глускай воласці Бабруй-

скага павета. У пачатку XX ст. тут быў засценак, 12 двароў, 244 жыхары. У 1917 г. 32 двары, 152 жыхары (з іх 15 палякаў). У 1926 г. 30 двароў, 175 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Новае Уюнішча», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 18 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 410 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 45 гаспадарак. У 1940 г. 48 двароў, 192 жыхары.

У кастрычніку 1944 г. фашысты поўнасцю спалілі вёску, загубілі 23 жыхары. У 1996 г. 2 двары, 3 жыхары, у складзе калгаса «Зара камуны».

За 0,5 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, захавалася старажытнае селішча.

ХАЛОПЕНІЧЫ, вёска ў Каткаўскім сельсавеце. Вядома ў XVIII ст. У 1790 г. 26 двароў, цэнтр маёнтка Навагрудскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне Камара. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У XIX ст. цэнтр маёнтка Бабруйскага павета Мінскай губерні, уласнасць Лапаў. У 1845 г. 28 двароў, 246 жыхароў. Каля вёскі дзейнічаў вінакурны завод (заснаваны ў 1836 г.). У 1897 г. вёска, 336 жыхароў, у Ляскавіцкай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. Побач былі аднайменныя дом арандатара вадзянога млына, 1 двор, 13 жыхароў, маёнтак, 4 двары, 89 жыхароў, вінакурны завод, старожка каля моста цераз р. Пціч, 1 двор, 10 жыхароў. У 1907 г. у вёсцы 44 двары, 359 жыхароў, у маёнтку 67 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 67 двароў, 478 жыхароў (з іх 13 яўрэяў). У маёнтку 165 жыхароў, дзейнічаў вінзавод.

Пачала дзейнічаць працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. быў 51 вучань. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня. У 1920 г. створаны саўгас, які ў 1930 г. апрацоўваў 482 га зямлі, уваходзіў у Мінскі малочнапрамысловы трэст. З 1927 г. дзейнічала метэаралагічная станцыя. У 1930-я гады арганізаваны калгас «Сталінец». У 1934 г. адкрыты дзіцячая пляцоўка і яслі. У маі 1938 г. на базе саўгаса «Халопенічы» была створана Рудабельская МТС, якая першапачаткова налічвала 28 трактароў. З 26.3.1945 г. гэта МТС атрымала назву Каткаўскай (рэарганізавана 31.3.1958 г.). У 1936 г. рэканструяваны вінзавод, дзейнічаў вадзяны млын. У 1940 г. 128 двароў, 515 жыхароў.

У лістападзе 1941 г. з жыхароў вёскі і групы партызан, вылучанай атрадам «Чырвоны Кастрычнік», быў сфарміраваны партызанскі атрад імя М.Ф.Гастэлы. У студзені 1942 г. атрад увайшоў у гарнізон Ф.І.Паўлоўскага, з красавіка 1942 г. дзейнічаў самастойна, у студзені — сакавіку 1943 г. у складзе 99-й брыгады імя Дз.Ц.Гуляева. У 1944 г. фашысцкія карнікі спалілі 103 двары, загубілі 55 жыхароў. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 44 вяскоўцы. Пасля вайны адбудавана. У 1996 г. 69 двароў, 112 жыхароў, у складзе калгаса «Зара».

За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадзішча, захавалася гарадзішча мілаградскай і ранняга этапу зарубінецкай культуры, датуецца 2-й палавінай 1-га тысячагоддзя да н.э. — пачаткам 1-га тысячагоддзя н.э. За 0,7 км на паўднёвы ўсход ад гарадзішча знаходзіцца селішча ранняга жалезнага веку і эпохі феадалізму.

ХВАСТАВІЧЫ, вёска, цэнтр Хвастовіцкага сельсавета і калгаса «Праўда». Вядома з XVI ст. У 1559 г. сяло ў Глускай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1692 г. 24 двары, у складзе прыватнафеадальнага валодання Глуск Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства. У 1724 г. у вёсцы налічвалася 20 валок зямлі, уваходзіла ў Дакольскае войтаўства маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, прыватнае ўладанне князя Радзівіла. У 1927 г. сяло Фаставічы, 18 двароў, 16 жыхароў мужчынскага полу, уласнасць памешчыка. У 1756 г. 23 двары. У 1758 г. 24 двары, у арэндзе Станіслава Вайняловіча. У 1765 г. 22 двары, 19 валок зямлі. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска Бабруйскага павета Мінскай губерні, належала графу Юдыцкаму.

У 1841 г. у маёнтку, што быў паблізу, заснаваны вінакурны завод (у 1890 г. 7 рабочых). У 1844 г. 17 двароў, 85 жыхароў, цэнтр маёнтка, уласнасць Бжастоўскага. У 1860 г. 38 двароў, 287 жыхароў, у складзе аднайменнага маёнтка Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 37 двароў, 239 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У маёнтку ў гэты час было 4 двары, 28 жыхароў, вінакурны завод, вадзяны млын. У маі 1906 г. сяляне зрабілі патраву памешчыцкіх пасеваў. Вяскоўцы Е.Муха, М.Муха, М.Буневіч арганізавалі выступленне супраць памешчыка, за што былі арыштаваны і зняволены ў бабруйскую турму. У

1907 г. у сяле 46 двароў, 275 жыхароў, у маёнтку 21 жыхар. У 1917 г. у сяле 57 двароў, 343 жыхары, у маёнтку 72 жыхары. У 1926 г. вёска, 62 двары, 242 жыхары, і пасёлак, 14 двароў, 83 жыхары. У маі 1931 г. арганізаваны калгас «Рассвет», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 18 гаспадарак.

У вёсцы размешчаны фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, сталярна-цяслярская майстэрня, збожжасклад з зернесушыльнай установкай, склад штучных угнаенняў, установка па перапрацоўцы кармоў, ёсць Дом культуры, стацыянарная кінаўстаноўка, аддзяленне сувязі, бібліятэка з фондам больш за 8,7 тыс. кніг. У 1996 г. 169 двароў, 379 жыхароў.

ЧАПАЕВА, вёска ў Слаўкавіцкім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 31 двор, 50 жыхароў, у складзе аграфірмы «Слаўкавічы».

ЧЫКІЛІ, вёска ў Казловіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1838 г. 30 рэвізскіх душ. У 1858 г. вёска (8 зямельных участкаў) у складзе казённага маёнтка Брожа Бабруйскага павета. У 1897 г. 30 двароў, 215 жыхароў, у Брожскай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 37 двароў, 222 жыхары. У 1917 г. 47 двароў, 294 жыхары (з іх 8 яўрэяў). У 1926 г. 55 двароў, 308 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пуцілавец», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 57 гаспадарак, а ў 1936 г. меў 509 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 72 гаспадаркі. З лістапада 1941 г. да пачатку 1944 г. у вёсцы дзейнічала падпольная група. У верасні 1942 г. вяскоўцы, што пайшлі ў лес, склалі аснову партызанскага атрада імя В.І.Чапаева, які да 8.1.1943 г. дзейнічаў самастойна, а затым у складзе 37-й партызанскай брыгады. У 1950 г. пачала дзейнічаць цеплавая электрастанцыя магутнасцю 15 кВт. У 1996 г. 61 двор, 134 жыхары, у складзе калгаса «Зара камуны».

ЦЯСНОВА, вёска ў Клятнянскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1858 г. сяло Цясноў у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1897 г. фальварак Цяснова (ён жа Вялікая Цесна), 4 двары, 22 жыхары. У 1917 г. вёска, 42 двары, 268 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1931 г. арганізаваны калгас «Баявік», які ў 1936 г. меў 452 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 40 гаспадарак. У 1996 г. 44 двары, 93 жыхары, у складзе калгаса «Гвардыя».

ЮЗАФОВА, вёска ў Калаціцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1798 г. фальварак, 1 двор, у складзе маёнтка Глуск. У XIX ст. маёнтак у Глускай воласці Бабруйскага павета, уласнасць Навамейскага. У 1889 г. заснавана вінакурнае прадпрыемства, на якім у 1897 г. працавала 6 рабочых. Побач знаходзіўся аднайменны засценак, у пачатку XX ст. налічваў 10 двароў, 38 жыхароў. У 1897 г. 1 двор, 6 жыхароў, у фальварку 3 двары, 20 жыхароў, у Глускай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. вёска, 18 двароў, 123 жыхары (з іх 19 палякаў), і фальварак, 2 двары, 30 жыхароў. У 1926 г. у вёсцы 22 двары, 190 жыхароў, у былым маёнтку 4 двары, 25 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ударнік». У 1996 г. 28 двароў, 38 жыхароў, у складзе эксперыментальнай базы «Глуск».

ЯСЕНЦЫ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Буда Ясенская, 11 двароў, 78 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 11 двароў, 110 жыхароў, у 1917 г. 14 двароў, 146 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1996 г. 9 двароў, 14 жыхароў, у складзе калгаса імя С.М.Кірава.

ЯЎСЕЕВІЧЫ, вёска ў Завалочыцкім сельсавеце. Вядома з XVI ст. У 1597 г. сяло, 16 гаспадарак, у Глускай воласці Навагрудскага павета, шляхецкая ўласнасць. У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Завалочыцы Бабруйскага павета, уласнасць Быкоўскіх. У 1844 г. 28 двароў, 191 жыхар. У 1897 г. 55 двароў, 437 жыхароў, у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 73 двары, 574 жыхары, у 1917 г. 102 двары, 485 жыхароў. У 1918 г. адкрыта школа, у якой у 1925 г. было 39 вучняў. У 1926 г. 96 гаспадарак, 496 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя У.І.Леніна, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 15 гаспадарак, а ў 1937 г. меў 208 га сельскагаспадарчых угоддзяў, аб'ядноўваў 60 гаспадарак. У 1996 г. 67 двароў, 92 жыхары, у складзе саўгаса «Завалочыцы».

Радзіма Героя Савецкага Саюза У.А.Рыбака, які вызначыўся ў снежні 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Карпатах.

У.І.Пашкевіч, Т.Р.Чуракова.

СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

авіяц. —	авіяцыйны
арт. —	артылерыйскі
в. (д.) —	вёска (деревня)
в/ч —	вайсковая часць
вобл. (обл.) —	вобласць
Воп. —	вопіс
г. —	год, горад
гл. —	глядзі
г.п. —	гарадскі пасёлак
гв. —	гвардзейскі, гвардыі
інш. —	іншыя
кав. —	кавалерыйскі
кап. —	капітан
Л. —	ліст
лейт. —	лейтэнант
м. —	мястэчка
мал. (мл.) —	малодшы
МТС —	машынна-трактарная станцыя
н. (р.) —	нарадзіўся
нам. (зам.) —	намеснік (заместитель)
отд. —	отдельный
пам. —	памочнік
п/п —	палявая пошта
палк. —	палкоўнік
пас. —	пасёлак
ППЛ —	папраўча-працоўны лагер
р. —	рака
рад. (ряд.) —	радавы
РВК —	райваенкамат
р-н —	раён
с. —	сяло
С. —	старонка
сд —	стралковая дывізія
сп —	стралковы полк
Спр. —	справа
с/с —	сельсавет
ст. —	стагоддзе, старшы, станцыя
старш. —	старшына
стралк. —	стралковы
сярж. (серж.) —	сяржант
Т. —	том
танк. —	танкавы
Ф. —	фонд
х. —	хутар
Чырв. —	Чырвоная (Армія)
яфр. (ефр.) —	яфрэйтар